Да чытача

Жыткаўшчына — у гэтым слове чуецца «жыццё, жыць»... Самабытны палескі край здаўна прыцягвае ўвагу навукоўцаў і спецыялістаў — этнографаў і фальклярыстаў, гісторыкаў і батанікаў, эканамістаў і аграрнікаў, аматараў прыроды. Надзвычай вялікую цікавасць уяўляе найстаражытнейшы горад Беларусі Тураў, крыніца шматлікіх легенд і паданняў...

Пра Тураў напісана нямала гістарычных і навукова-пазнавальных кніг і навуковых прац, але Жыткаўшчына наогул апісана мала. Спадзяёмся, што гэты прабел пэўным чынам папоўніць гісторыка-дакументальная хроніка Памяці, прысвечаная Жыткавіцкаму раёну. Кніга стваралася на працягу некалькіх гадоў навукоўцамі, літаратарамі, гісторыкамі, аматарамі-краязнаўцамі, каму не абыякавы лёс свайго краю, на падставе шматлікіх дакументаў, літаратурных крыніц, сведчанняў перыядычнага друку, успамінаў тых, хто сэрцам і душой звязаны з роднай зямлёй і яе гісторыяй. Хроніка — гэта даніна памяці тым, хто бараніў Радзіму ад ворагаў, хто ўздымаў яе з руін і попелу, хто навек застаўся на палях бітваў, згарэў у полымі мінулай вайны...

У гісторыка-дакументальнай хроніцы выкарыстаны дакументы і матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага архіва, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі ў Маскве, філіяла дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці ў г. Мазыры, Брэсцкага абласнога архіва, Тураўскага краязнаўчага музея, дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, Цэнтральнага архіва Савецкай Арміі, Цэнтральнага ваенна-марскога архіва і інш.

Выдавецтва ўдзячна рэспубліканскай камісіі (старшыня М. І. Дзямчук) і арганізацыйна-метадычнаму цэнтру па выданню гісторыка-дакументальных хронік Памяці пры Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь (кіраўнік А. Л. Петрашкевіч), а таксама супрацоўнікам архіваў, музеяў, бібліятэк, усім установам і прыватным асобам, якія аказвалі садзеянне ў працы над кнігай.



Жыткавіцкі раён размешчаны на захадзе Гомельскай вобласці. Утвораны 17 ліпеня 1924 г. Плошча 2,9 тыс. кв. кіламетраў. Населеных пунктаў 108, у тым ліку горад Жыткавічы (цэнтр раёна) і гарадскі пасёлак Тураў — адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі, у XII — XIII ст.— сталіца Тураўскага княства. 13 сельскіх саветаў: Азяранскі, Браніслаўскі, Верасніцкі, Дзякавіцкі, Ленінскі, Людзяневіцкі, Марохараўскі, Мілевіцкі, Пераройскі, Рудненскі, Рычоўскі, Чырвоненскі, Юркевіцкі, Жыткавіцкі гарадскі і Тураўскі пасялковы саветы. На 1.1.1994 г. у раёне пражывала 51 884 чал.; у Жыткавічах — 15 917, у Тураве — 3429 чал.

Раён размешчаны на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся, на нізіннай раўніне на вышыні 140—150 м над узроўнем мора. Карысныя выкапні: Тураўскае радовішча гаручых сланцаў (1181 млн. т), радовішча бурага вугалю (25 млн. т), радовішча будаўнічага каменя ў Жыткавічах (159,6 млн. т), радовішчы торфу з запасамі 126,7 млн. т, у тым ліку радовішчы Булеў Мох (52,6 млн. т), Межы (46,4 млн. т), Ржышча-Ліпкі (15,2 млн. т), радовішчы кааліну (17,7 млн. т), у тым ліку радовішчы Дзедаўка (8,5 млн. т) і Беразіна (7,7 млн. т). Сярэдняя тэмпература студзеня — 5,9 °С, ліпеня — 18,4 °С. Ападкаў 584 мм у год. Вегетацыйны перыяд 197 дзён. Працякае буйнейшая водная артэрыя Беларусі рака Прыпяць, якая ўваходзіць у сістэму Дняпроўска-Бугскага воднага шляху, з прытокамі Сцвіга, Свінавод, Случ, Скрыпіца, Навуць. У межах раёна размешчана возера Чырвонае (Жыд, ці Князь-возера), самае вялікае на Палессі (43,6 кв. км), в. Белае (15,6 кв. км). Пад сельгасугоддзямі занята 62,8 тыс. га, у тым ліку пад ворывам — 27,7 тыс. га.

Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 37, сельгасугоддзяў — 32. Пад лесам занята 57,2 % плошчы раёна. Асноўныя землекарыстальнікі — 13 калгасаў і 6 саўгасаў.

Выдаецца раённая газета «Новае Палессе».

Пад крыламі белага птаха

У высокім небе, здаецца, пад самым сонцам, кружацца буслы. Пад іх вольнымі крыламі — жытнёвыя палі, белыя дахі хат, родныя гнёзды на іх... Пад крыламі буслоў — Палессе.

Колер нашай зямлі — блакітна-зялёны: абсяг лесу пад сінімі нябёсамі, паплавы і азёры, блакітныя стужкі рэк. Родны край, бацькоўская зямля... Твае спакойныя, роўныя фарбы лечаць і суцяшаюць. Дзе яшчэ ёсць такая цішыня пад высокімі нябёсамі, такі спакой і бязмежнасць...

Жыткаўшчына — край зямлі ў глыбіні Палесся, павіты рэкамі, закалыханы хвалямі азёр. У кожнай мясцовасці свой краявід, свая біяграфія, непаўторная і своеасаблівая. Хіба можна не любіць гэтую зямлю, не зачароўвацца сінявокім краем, дзе вольна ляжыць сівы і песенны Тураў, дзе ціхі, скрозь драўляны, загадкавы пасёлак Ленін з трагічным лёсам з незапамятных часоў носіць вядомае імя, дзе ўвачавідкі растуць гмахі новабудоўляў Жыткавіч...

...«Спакойна і павольна, як у зачараваным сне, утуліўшыся ў балоты, нясе Прыпяць сухадоламу Дняпру сваю багатую даніну,— так апісваў Якуб Колас галоўную раку Палесся, якая праклала свой шлях праз увесь раён.— Не спяшаецца яна выносіць дабро палескіх балот... Але калі разгуляецца вецер над зялёнаю шчэццю лясоў, над круглымі купамі-шапкамі кучаравай лазы, над бародаўкамі-купінамі жорсткай асакі, тады яна няветла пахмурнее, задрыжыць, затрасецца тысячамі хваль і сярдзіта шпурляе чаўны і чайкі-душагубкі, ды голасна ўсхліпвае ў прыбярэжных чаротах, як маці ўскрай магілы, дзе пахаваны яе дзеці».

Над прыпяцкімі прасторамі павявае вецер стагоддзяў... Тут шумеў у незапамятныя часы стольны град Тураў

Мемарыяльны знак у гонар 1000-годдзя Турава

Шырока разліваецца Прыпяць вясной, калі чароды птушак запаўняюць неба. Сінімі агеньчыкамі ўспыхваюць у красавіку пралескі, зялёным дымком ахутваюцца бярозкі, залацістая лотаць цнатлівым дываном пакрывае ціхія пратокі. Зямля дыхае глыбока, на поўныя грудзі...

Калышуцца пад ветрам чароты на беразе самага вялікага возера Палесся Чырвонага, або Князь-возера. Асабліва прыгожае яно ўвечары, на схіле летняга дня, калі заходзіць сонца — быццам распальвае ваду да залацістага колеру, і само патанае ў ёй...

Шмат легенд ходзіць у народзе пра Чырвонае. Казачныя палацы нібы і цяпер у ціхае надвор'е відаць на дне. Дзе тут міф, дзе рэальнасць — цяжка адрозніць.

Легенды жывуць, набываюць новы змест...

Магчыма, ёсць і яшчэ недзе такія маляўнічыя і чыстыя азёры, як Белае. Але тут, на Жыткаўшчыне, упэўнены — ніякае другое не можа параўнацца з Белым. На берагах яго шумяць стогадовыя меднаствольыя сосны-волаты. Плёскаюць у пясок берага хвалі — і такая цішыня, такі спакой навокал! Добра на Белым і ўлетку, і ўвосень, у пару «бабінага лета», калі неба прачэрчваюць чароды птушак, што адлятаюць у вырай...

Усё цячэ, усё мяняецца... Над краем веюць новыя, свежыя ветры. Яны нясуць гаркаваты пах сівой мінуўшчыны, калі шумелі над краем другія ветры, калі славуты мудрэц епіскап Кірыла Тураўскі чытаў на Тураўскай кафедры свае сусветна вядомыя малітвы, словы, павучанні. Тураўшчына — радзіма Кірылы Тураўскага, менавіта тут, у Тураве, пад час жыцця і асветніцкай дзейнасці «Златавуста, які ярчэй за ўсіх зіхацеў на Русі», закладваліся асновы праваслаўнай царквы на Беларусі.

...Зямля мая, пакутная, родная — заўсёды новая, радасная пад прамянямі ранішняга сонца!.. Тут спачывае прах бацькоў, яна шчодра паліта крывёй і потам змагароў за сваю долю; сюды адносяць нас сны, успаміны, наша неспакойная памяць. Чалавек без успамінаў, без радзімы — нібы птушка без крылаў. Як птушкі кожную вясну прылятаюць з выраю ў родныя мясціны, дзе яны нарадзіліся, выраслі, дзе ўпершыню спрабавалі крылы ў палёце, так і памяць зноў і зноў вяртае нас да прастораў радзімы...

Васіль Феранц

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

На старажытнай тураўскай зямлі

Тураўшчына — гістарычна надзвычай багаты край. Вялікая колькасць старажытных помнікаў у міжрэччы Прыпяць — Сцвіга тлумачыцца галоўным чынам спрыяльнымі фізічна-геаграфічнымі ўмовамі гэтай мясцовасці. Яна размяшчаецца у старадаўняй азёрнай катлавіне, якая ў пасляледнікоў час была запоўнена магутным слоем антрапагенных адкладанняў. Міжрэчча узвышаецца на 3—6,5 м над летнім узроўнем Прыпяці і размяшчаецца ў сярэднім на вышыні да 125 м над узроўнем мора. Глебы ў міжрэччы ў асноўным чарназёмна-карбанатныя, вельмі ўрадлівыя, яны значна адрозніваюцца па сваім складзе ад іншых глеб Палесся. Таўшчыня слою чарназёму дасягае тут 0,8—1,2 м. Агульная працягласць чарназёмных зямель на поўдзень ад Прыпяці, на тэрыторыі сучасных Жыткавіцкага і Столінскага раёнаў, складае 60—70 км, шырыня іх — 2—10 км.

Урадлівыя землі Тураўшчыны прыцягнулі ўвагу чалавека яшчэ ў глыбокай старажытнасці і былі асвоены вельмі рана. Можна меркаваць, што пачатак земляробства на тэрыторыі сучаснай Тураўшчыны адносіцца яшчэ да бронзавага веку, аб чым сведчаць знаходкі крамянёвых сярпоў і іншыя рэчы. Відавочна, падсечная сістэма земляробства была вельмі рана зменена ворыўнай.

На Тураўшчыне — каля Турава і Пагоста — знойдзены рэшткі прадстаўнікоў жывёльнага свету, чацвярцічнай фауны, у прыватнасці маманта. Па знаходках некаторых крамянёвых прылад працы на невялікіх пясчаных узгорках каля вёсак Хільчыцы і Буразь можна меркаваць, што гэтая мясцовасць пачала засяляцца з эпохі мезаліту. У эпоху неаліту і бронзы тут размяшчаўся шэраг пасяленняў, якія знаходзіліся на ўзвышшах і ў некаторых месцах па берагах рэк. Гэтыя мясціны ў жалезным веку былі зручнымі тэрыторыямі для будаўніцтва гарадзішчаў, а таксама могільнікаў. Асноўным тыпам пасяленняў у жалезны век і ў раннефеадальны перыяд з'яўляліся адкрытыя — селішчы.

Даследаванні міжрэчча Прыпяці і Сцвігі паказваюць, што большасць стаянак і амаль усе селішчы размешчаны па берагах старых руслаў рэк. Можна меркаваць, што кожнае такое пасяленне было пакінута людзьмі, відавочна, пасля таго, як мянялася русла Прыпяці ці Сцвігі, і зноў узводзілася на беразе новага русла.

Вывучэнне археалогіі Тураўшчыны пачалося яшчэ ў дарэвалюцыйны час. Тады раскопвалі галоўным чынам курганы раннефеадальнага перыяду, помнікі каменнага і бронзавага вякоў не даследаваліся. Таму

асаблівую навуковую цікавасць мелі работы А. З. Кавалені і С. С. Шутава ў 1927 г., якія разам з тураўскімі краязнаўцамі абследавалі і апісалі каля дзесяці стаянак старажытнага чалавека і селішчаў, правялі раскопкі бескурганнага могільніка ва ўрочышчы Казаргаць каля вёскі Буразь, у чатырох кіламетрах на паўднёвы захад ад Турава. Гэта першы помнік такога тыпу на тэрыторыі Беларусі, выяўлены ў даваенны час. Устаноўлена, што ён належыць да ранняга перыяду зарубінецкай культуры. У час раскопак было ўскрыта 19 пахаванняў, выкананых па абраду спальвання, якія датуюцца ў межах II ст. да н. э. і I ст. н. э. Тады ж былі раскапаны таксама курганы каля Рычова. Некаторыя рэчы, выяўленыя пры раскопках, захоўваюцца ў сектары археалогіі Інстытута гісторыі АН Беларусі.

У 1952—1954 гг. археолаг Ю. В. Кухарэнка праводзіў раскопкі могільніка ранняга перыяду зарубінецкай культуры ў вёсцы Вароніна, абследаваў таксама шэраг іншых помнікаў. У выніку вывучэння археалагічных аб'ектаў на Палессі ў 1961 і ў 1964 гг. Л. Д. Побаль выявіў некалькі дзесяткаў новых археалагічных помнікаў, галоўным чынам жалезнага веку. Знойдзены шэраг могільнікаў, на адным з іх каля вёскі Сямурадцы раскапана 25 пахаванняў зарубінецкай культуры. Там даследаваны таксама два курганы, якія ўтрымлівалі матэрыялы VI—IX ст. У Тураве і Тураўшчыне працавалі многія экспедыцыйныя групы па даследаванні розных эпох. У выніку гэтых работ удалося адкрыць у Тураве і за яго межамі архітэктурныя помнікі эпох мезаліту, неаліту, бронзы, розных культур жалезнага веку і раннефеадальнага перыяду. Больш дэталёва былі даследаваны помнікі жалезнага веку і эпохі феадалізму. Вывучэнне адпаведнага матэрыялу дазволіла аднесці іх да такіх археалагічных культур, як мілаградская, ранні і позні этапы зарубінецкай культуры, старажытнасці другой палавіны I тысячагоддзя н. э. Такім чынам, на археалагічным матэрыяле гэтай часткі Палесся можна прасачыць развіццё культур усіх гістарычных перыядаў, і найбольш поўна — эпохі жалезнага веку.

Каменны і бронзавы вякі

Археалагічныя матэрыялы Тураўшчыны дазваляюць меркаваць, што на гэтай тэрыторыі чалавек упершыню з'явіўся не пазней эпохі мезаліту (8—5 тыс. гадоў да н. э.). Стаянкі старажытных людзей знойдзены на ўзвышшах каля вёсак Хільчыцы і Буразь. Выяўлены крамянёвыя канцавыя шкрабкі, наканечнікі стрэл з бакавой выемкай, трапецападобныя прылады працы, апрацаваныя з чатырох бакоў, і іншыя прадметы, якія адносяцца да эпохі мезаліту.

У эпоху неаліту (4—3 тыс. гадоў да н. э.) насельніцтва тут размяшчалася даволі густа. Да гэтага перыяду адносяцца восем стаянак: па дзве ў Знаменцы, Хільчыцах і Сямурадцах, у Рычове і ў Буразі. Можна меркаваць, што культура плямён, што жылі на тэрыторыі сучаснай Тураўшчыны, мала адрозніваласа ад другіх раёнаў Палесся. Былі распаўсюджаны крамянёвыя прылады працы і зброя — нажавідныя пласцінкі, наканечнікі стрэл, розныя тыпы керамікі, упрыгожанай разнастайнымі арнаментамі і ўзорамі. Паверхня пасудзін аздаблялася арнаментам — адбіткам драбназубчатага штампа, уціскам адступаючай лапатачкі, радамі выемак, насечак і прамавугольных адбіткаў, прачэрчаных гарызантальных ліній. Абпальванне керамікі нераўнамернае, у выніку са знешняга боку пасудзіны мелі светла-карычневы колер, знутры — шэры і чорны. Акрамя таго, маецца



кераміка з ямачна-грабеньчатым арнаментам, якая набліжаецца да такіх рэчаў больш усходніх плямён, і арнамент, які быў распаўсюджаны сярод плямён сярэднедняпроўскай культуры. Тэрыторыя Тураўшчыны ў эпоху неаліту магла быць зонай стыку розных у этнічных адносінах людзей.

Да бронзавага веку (II тысячагоддзе — пачатак I тысячагоддзя да н. э.) адносіцца 15 стаянак: тры ў Сямурадцах, па дзве ў Знаменцы, Хільчыцах, Запясоччы, Старажоўцах, у Рычове і Буразі. Акрамя таго, крамянёвыя сярпы знойдзены ў Тураве і ў Рыдчы. Відавочна, што ў эпоху бронзы людзі амаль усюды жылі на тых самых стаянках, што ўзніклі ў эпоху неаліту. Новыя пасяленні лакалізаваліся на больш нізкіх берагах рэк.

На стаянках звычайна знаходзяць кераміку, крамянёвыя прыла-

Курганны могільнік каля в. Сямурадцы

ды працы. Гліна, абпальванне і прымесі ў вырабах эпохі бронзы мала чым адрозніваюцца ад неалітычных. Асаблівасці ёсць толькі ў элементах арнаментаў: больш познія вырабы ўпрыгожаны адбіткамі шнура, прамавугольнымі ўцісканнямі, ёлачнымі ўзорамі і інш. У некаторых пасудзін патоўшчаныя венчыкі. Усе пасудзіны кругладонныя, а ў сярэдзіне эпохі бронзы пачалі з'яўляцца пласкадонныя. У якасці прымесі ў гліну дабаўлялі жарству.

Прылады працы — каменныя сякеры, крамянёвыя нажавідныя пласцінкі, шкрабкі. Выраблялiся яны ў асноўным з шэрага каменя. Людзі эпохі бронзы займаліся земляробствам, аб чым сведчаць крамянёвыя сярпы. Адзін такі серп знойдзены на левым беразе Прыпяці каля Турава. Ён зроблены з цёмна-сіняга крэменю, даўжыня — каля 17 см. Два больш плоскія сярпы знойдзены ў раскопках каля Рыдчы — з боку ляза крыху ўвагнутыя, маюць гарбатую спінку, выраблены з крэменю светла-шэрага колеру. Такія вырабы лічацца ўкладышамі ў драўляную аснову сярпа.

У выдувах некаторых стаянак эпохі бронзы разам з керамікай выяўлены скапленні кальцыніраваных касцей. Гэта дае аснову меркаваць, што сярод плямён эпохі бронзы быў распаўсюджаны абрад спальвання трупаў. У перыяд бронзавага веку жыццё кіпела на тэрыторыі сучаснай Тураўшчыны, Прыпяць была і карміцелькай, і дарогай, і бажаством старажытных людзей...

Жалезны век

Жалезны век на Палессі, як і ў агульным на тэрыторыі паўднёвай Беларусі, пачаўся прыкладна ў VII—V ст. да н. э. Да гэтага перыяду адносяцца гарадзішчы-сховішчы, якія, можна меркаваць, узводзіліся тут з самага пачатку распаду першабытна-абшчынных адносін. Яны маюць вялікія памеры, на пляцоўцы, як правіла, няма культурнага слою. Гарадзішчы размяшчаліся параўнаўча далёка ад берага ракі, на адлегласці 1—4 км, сярод балот, таму іх называюць балотнымі. Яны выкарыстоўваліся на працягу ўсяго жалезнага веку. Такія гарадзішчы маглі быць выкарыстаны і для гаспадарчых патрэб, напрыклад, для захавання жывёлы ў час паводкі. Для гэтай мэты ў некаторых выпадках старажытныя гарадзішчы выкарыстоўваюцца і цяпер.

Гарадзішчы ў ваколіцах Турава, якія найбольш захаваліся, размешчаны каля вёсак Бечы, Перароўскі Млынок, Боркі, Перароў. Гарадзішчы каля вёсак Знаменка, Рычоў, Хільчыцы не захаваліся, аб іх нагадваюць толькі назвы ўрочышчаў: Гарадзішча, Гарадзец. Такія помнікі звычайна бедныя на знаходкі, нават тыя, якія добра захаваліся. Напрыклад, на ўзараных двух пляцоўках гарадзішча каля вёскі Бечы плошчай 9,5 га знойдзена толькі некалькі дробных кавалкаў грубаляпных пасудзін, абломак жалезнага наканечніка кап'я.

Памеры гарадзішчаў-сховішчаў даволі вялікія, відавочна, што ўзводзіліся яны не адным пакаленнем

старажытных людзей. Даўжыня знешняй часткі вала гарадзішча каля Бечы дасягае звыш 1400 м. Насыпаць такі вал было справай вельмі нялёгкай. Нездарма вакол яго можна знайсці сляды некалькіх паселішчаў.

Селішчы з'яўляліся асноўным тыпам пасяленняў на працягу жалезнага веку і ў больш позні перыяд.



Жалезныя прылады працы, прадметы побыту, узбраенне:
1 — булаўка для верхняга адзення; 2, 3, 4 — наканечнікі стрэл; 5 — булава; 6 — шпора (фрагмент); 7 — замок; 8, 16—18 — ключы; 9 — спружынныя нажніцы (фрагмент); 10 — бляшка; 11, 13 — вастрыё асцей; 12 — ножык; 14 — долата; 15 — акоўка драўлянай рыдлёўкі; 19 — фрагмент сярпа

Жыхары іх займаліся рознымі вытворчасцямі, у прыватнасці вырабам глінянага посуду ляпным спосабам. У якасці прымесі дабаўлялі пясок, жарству, а часам шамот. Абломкі такіх пасудзін выяўляюцца на ўсіх гарадзішчах Палесся. Знаходзяць таксама крыцы, шлак, рэшткі домніц, жалезныя прылады працы, а часам і крамянёвыя прадметы, якія, можна меркаваць, выкарыстоўваліся і ў жалезным веку.

Археалагічныя матэрыялы дазваляюць меркаваць, што тэрыторыю Тураўшчыны — сучаснага Жыткавіцкага раёна — у жалезным веку засялялі плямёны наступных культур: мілаградскай (VII—III ст. да н. э.), зарубінецкай (II ст. да н. э.— I ст. н. э.), а таксама ранне і сярэдневяковыя плямёны пражскай і тыпу Лукі Райкавецкай культур. Выяўлена некалькі дзесяткаў паселішчаў, на якіх знойдзены прадметы гэтых культур. Для жалезнага веку характэрны бескурганныя могільнікі, пахаванне ў якіх праводзілася з абрадам спальвання трупа. Курганы на месцы пахаванняў пачалі ўзводзіцца не раней чым у трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э.

Мілаградская культура склалася ў канцы бронзавага і пачатку жалезнага вякоў. Плямёны гэтай культуры амаль поўнасцю займалі басейн Прыпяці. На Тураўшчыне знойдзена 11 паселішчаў з матэрыяламі мілаградскай культуры: чатыры — каля вёскі Сямурадцы, па два — у Хільчыцах, Знаменцы, а таксама ў Буразі, Верасніцы і ў Пагосце. Каля Пагоста выяўлены бескурганны могільнік, у якім раскапана мілаградскае пахаванне ў падоўжанай яме, у якой знаходзіліся спаленыя косці нябожчыка. Разбураныя мілаградскія пахаванні знойдзены і ў Сямурадцах.

Асноўнымі відамі гаспадарчай дзейнасці людзей, як можна меркаваць па знаходках, што адносяцца да мілаградскай культуры, з'яўлялася земляробства і жывёлагадоўля. Косці ў могільніках, у якіх выконваўся абрад трупаспальвання, напрыклад, належаць толькі хатняй жывёле. Жалезныя прылады працы, відавочна, яшчэ не выцеснілі каменныя. Жыхары былі знаёмы з бурштынам, аб чым сведчаць знаходкі ў Пагосце. Пасудзіны былі кругладоннымі, добра абпаленымі. Колер керамікі — брудна-карычневы. Для посуду характэрны прамыя або адагнутыя вонку венчыкі, зрэдку ўпрыгожаныя па краі насечкай. На шыйках многіх пасудзін нанесены арнамент у выглядзе круглых ямак, зроблены палачкай. Ранняя мілаградская кераміка знойдзена таксама ў Хільчыцах: на пасудзіне, акрамя круглых ямак, на шыйцы налеплены невялікі валік, тулава арнаментавана вертыкальнымі паглыбленнямі, што характэрна для керамікі позняга бронзавага веку.

На 17 паселішчах — чатыры ў Сямурадцах, па два ў Старажоўцах, Азяранах, Знаменцы, Хільчыцах, у Буразі, Вароніне, Верасніцы, Крэмна і ў Пагосце знойдзены археалагічныя матэрыялы, якія адносяцца да зарубінецкай культуры (другая палова III тысячагоддзя да н. э.— пачатак II ст. н. э.). Акрамя таго, выяўлена сем бескурганных могільнікаў, у якіх вяліся раскопкі: у Вароніне, Сямурадцах, Буразі і ў Пагосце. Археалагічныя матэрыялы, выяўленыя пры раскопках, сведчаць аб тым, што жыхары на гэтай тэрыторыі ў эпоху зарубінецкай культуры займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй. Асноўным тыпам паселішчаў былі адкрытыя селішчы. Памеры іх, калі меркаваць па плошчы распаўсюджвання керамікі,— ад 1 да 10 га і больш. Праследжваецца культурны слой таўшчынёй 0,1—0,6 м. Сярод плямён быў распаўсюджаны абрад спальвання памёршых. На чатырох раскапаных



Ювелірныя вырабы і прадметы ювелірнай вытворчасці:
1 — фібула (засцёжка верхняга адзення); 2, 5 — бранзалеты; 3, 4, 6, 7, 11—17 — бронзавыя крыжыкі; 8 — падвеска панікадзіла; 9 — шыферны крыжык; 10, 20 — кніжныя спражкі; 18 — спражка; 19 — бронзавы бубенчык; 21 — ліцейная формачка; 22—23 — ювелірныя пінцэты; 24 — шыферная прасліца з выявай чалавечага твару; 25 — пісалы; 26—28 — тыгілёк і льячкі; 29 — свінцовы грузік для рыбалоўных сетак; 30 — шахматная фігурка — конь (косць)

могільніках выяўлена 98 пахаванняў, якія знаходзіліся ў круглых і прадаўгаватых ямах, даўжыня якіх ад 1,1 да 2,5 м, шырыня — ад 0,5 да 1,6 м. У яму пры пахаванні клалі гліняны посуд, жалезныя і бронзавыя рэчы, шкляныя пацеркі і інш. Могільнік у Сямурадцах адрозніваецца ад іншых тым, што ў ім знаходзіўся дробны посуд, відаць, зроблены спецыяльна для пахавання, у той час, калі ў іншых могільніках знойдзена звычайнае хатняе начынне. Відавочна, у басейне Сцвігі жыла асобная група зарубінецкіх плямён. Распаўсюджаны быў таксама абрад ахвярапрынашэння, аб чым сведчаць знаходкі касцей хатняй жывёлы ў раскапаным пахаванні ў Пагосце.

Сярод плямён зарубінецкай культуры Тураўшчыны былі развіты рамёствы па вырабе прадметаў з гліны,



Касцяныя вырабы:

1, 10, 11 — гузікі; 2—3 — грабеньчыкі; 4—6, 12—14 — шахматныя фігуркі; 7—9 — накладкі рукаятак; 15—17 — навершы рукаятак; 16, 18, 23 — муфтачкі; 19, 24 — цюркі; 20 — кальцо; 21—22 — рукаяткі; 25, 27 — дэкаратыўныя вырабы; 26 — нарыхтоўка; 28 — двухзубае вастрыё; 29—33 — праколкі

металу, косці, рога і каменя. Найбольш прадстаўлена ганчарная вытворчасць. Пасудзіны добра абпаленыя, пласкадонныя, выраблялiся ляпным спосабам, частка сасудаў мае шэрае або брудна-карычневае глянцаванне. Увесь посуд можна раздзяліць на некалькі груп: гаршкі, міскі, кружкі і стопкі. Міскі — новая група керамікі, якая ўзнікла ў час зарубінецкай культуры. Яны часткова захаваліся ў цэлым выглядзе. Памеры іх невялікія, дыяметр у верхняй частцы і вышыня да 15 см, сценкі акруглыя, зрэдку прыкметна невялікая рабрыстасць, венца загнутае ў сярэдзіну, прамое або злёгку адагнутае вонку. Некалькі місак зроблены на высокай круглай падстаўцы.

Распаўсюджаны таксама кружкі з ручкай. Дыяметр і вышыня іх каля 8 см. Знойдзены таксама абломкі таўстасценнага посуду з шурпатай паверхняй. Такі посуд характэрны для пахаванняў у Польшчы, відавоч-

на, што плямёны Палесся мелі кантакты з плямёнамі басейна Віслы.

На зарубінецкіх паселішчах Тураўшчыны знойдзены гліняныя плоскія крышкі са слабым лашчэннем і скавародкі, а таксама іншыя вырабы з гліны, у прыватнасці прасліцы — у Пагосце, Сямурадцах, Хільчыцах. Адно з іх мае арнамент, зроблены ногцем, астатнія гладкія. Такія прасліцы характэрны для помнікаў зарубінецкай культуры. На селішчы ў Пагосце выяўлены фрагменты грузіка, які характэрны для плямён Смаленшчыны і цэнтральнай Беларусі, басейна верхняй Волгі і Акі. У Сямурадцах знойдзены фрагменты жалезнага тапара і каменнага песціка.

На месцы пасяленняў у могільніках знойдзены бытавыя прадметы і ўпрыгажэнні з металу: у Вароніне — дзве бронзавыя спіралькі, у Сямурадцах — фрагмент жалезнага нажа, спражка, у Пагосце — рэдкая ў Палессі падковападобная фібула, ажурная бронзавая падвеска ў выглядзе лапкі качкі даўжынёй 2 см. Многія прадметы датуюцца сярэдзінай III ст. да н. э.— сярэдзінай II ст. да н. э. Цікавасць выклікае рэдкая для тэрыторыі Беларусі бронзавая правінцыяльна-рымская фібула, знойдзеная ў могільніку ў Сямурадцах. Яна адносіцца да I—II ст. н. э.

Антычнымі вырабамі з'яўляюцца шкляныя пацеркі, 9 з якіх выяўлены ў пахаваннях у Сямурадцах. Знаходзяцца яны ў многіх могільніках. Пацеркі паступалі сюды з грэчаскіх гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я, з Ольвіі, дзе ў раскопках знаходзяць такі ж тып упрыгажэнняў.

Раннефеадальная эпоха

У раннефеадальны час значная частка сучаснага Палесся ўваходзіла ў склад Тураўскай зямлі. Да гэтага перыяду адносіцца замчышча ў Тураве, 25 паселішчаў Тураўшчыны — чатыры ў Знаменцы, тры ў Запясоччы, па два ў Хільчыцах, Крэмна, Азяранах, Пагосце, Чэрнічах, Сямурадцах, у Буразі і Вароніне, Верасніцы, Тураве, Дварцы, Старажоўцах, а таксама шэраг курганоў і курганных могільнікаў. Да часу прыняцця ўсходнеславянскімі плямёнамі хрысціянства адносяцца знаходкі каменных крыжоў.

Паселішчы ў раннефеадальную эпоху (X—XIII ст. н. э.) размяшчаліся ў асноўным на тых самых месцах, што і ў жалезным веку. На іх знаходзяць ганчарную кераміку, некаторыя іншыя вырабы. У курганах у ваколіцах Рычова, Турава, Рыдчы, Старажоўцаў, Хільчыц, Сямурадцаў выяўлены разнастайныя рэчы — кераміка, шкляныя пацеркі, вырабы з металу і інш. Вядома, што яшчэ 50—60 гадоў назад такія курганы былі каля вёсак Бечы, Хваенск, Вільча, Малешаў, Чэрнічы, але яны не захаваліся.

Асобную групу старажытнасцей складаюць каменныя крыжы. Вядомы чатыры такія знаходкі, да сённяшняга дня захаваліся два крыжы — у Пагосце і ў Тураве на Барысаглебскіх могілках.

Знаходкі на дзядзінцы старажытнага Турава — кераміка, вырабы з жалеза, бронзы, шкла, каменя, косці, рога сведчаць аб багатай культуры старажытнарускага горада, яго шырокіх сувязях з другімі гарадамі і землямі Кіеўскай Русі. Выдатным помнікам старажытнарускага будаўніцтва з'яўляюцца рэшткі храма XII ст., выяўленыя на тэрыторыі крамля ў Тураве. Тут знойдзены княжацкія пахаванні ў каменных саркафагах.

Археалагічныя матэрыялы, якія адносяцца да другой чвэрці I тысячагоддзя н. э., знойдзены на васьмі паселішчах: тры ў Знаменцы, па два ў Сямурадцах і Хільчыцах і ў Буразі. Гэты перыяд пакуль што мала

даследаваны на Палессі. У гэты час назіраецца ў некаторай ступені «агрубленне» керамікі, пасудзіны вырабляюцца больш таўстасценнымі, па версе венчыкаў робіцца насечка, з'яўляецца наляпны валік па тулаве. Такі посуд быў распаўсюджаны на Тураўшчыне разам з іншымі тыпамі керамічных вырабаў. Разам з грубаляпным посудам вырабляўся і глянцаваны. Для гэтага этапу развіцця культуры характэрны таксама гаршкі, падобныя на слоік.

Матэрыяльныя помнікі, якія адносяцца за VI—IX ст. н. э., выяўлены на тэрыторыі Тураўшчыны ў Хільчыцах, Знаменцы, Буразі, Верасніцы, Сямурадцах. Сярод плямён гэтага часу былі распаўсюджаны два абрады пахавання са спальваннем трупа: грунтавыя і курганныя. Спальванне ў адным з раскапаных курганоў у Сямурадцах праводзілася ў сярэдняй частцы круга, выкапанага ў мацерыку. Тут знойдзены буйныя фрагменты гаршка, бронзавыя рэчы. Посуд меў слабую прафіліроўку, прамы ці злёгку адагнуты венчык, крыху завужанае днішча. У гліне прыкметны жарства і пясок, абпальванне добрае. У Сямурадцах разам з абломкамі гаршка ляжаў жалезны нож. Распаўсюджаны таксама ляпныя пасудзіны з моцна адагнутымі венчыкамі. Адна такая раструшчаная пасудзіна знойдзена ў Знаменцы.

Археалагічныя помнікі

Бечы. Гарадзішча сярод балота ва ўрочышчы Гарадзец, на адлегласці 1 км на поўдзень ад вёскі, у 3 км на ўсход ад Сцвігі. Пляцоўка гарадзішча складаецца з двух частак, раздзеленых валам: меншая — 2,6 га, большая — 6,8 га, прыкметны выхады з яе з двух бакоў. Гарадзішча абкружана валам, вышыня якога цяпер складае 1—2 м, шырыня 10—12 м. З заходняга боку вал разбураны траншэяй часу мінулай вайны.

Бечанскае гарадзішча — найбольш буйное ў Беларусі. Агульная даўжыня з поўначы на поўдзень 420 м, з захаду на ўсход — 390 м. Тут знойдзены абломкі грубаляпнога посуду, які адносіцца да раняга жалезнага веку. У Тураўскім краязнаўчым музеі захоўваецца жалезны наканечнік кап'я, знойдзены на гарадзішчы жыхаром Бечаў Аліфярцом. Гарадзішча нагадвае вялікае ўмацаванне без культурнага слою скіфскіх часоў і можа лічыцца гарадзішчам-сховішчам раняга жалезнага веку.

Знаменка (Слепцы). Стаянкі першабытнага чалавека эпохі неаліту і бронзы, паселішча жалезнага веку і эпохі феадалізму, відавочна, гарадзішча, бескурганныя могільнікі ва ўрочышчы Гарадзец, у 200 м на паўночны ўсход ад вёскі. Гарадзішча не захавалася, хоць у Тураўскім музеі ёсць фатаграфія, на якой відны рэшткі вала. Плошча ўрочышча — каля 0,5 км^2, яно з усіх бакоў абкружана старымі русламі Сцвігі. Тут у вялікай колькасці знаходзяць абломкі керамікі, чарапкі посуду ад эпохі неаліту да раняга феадалізму, разнастайныя крамянёвыя прылады працы. Разам са скапленнем керамікі ў асобных месцах знойдзены кальцыніраваныя косці, асабліва ў паўночна-ўсходнім баку. Такія скапленні характэрны для ўсіх культур жалезнага веку. У заходнім баку стаянкі выяўлены крамянёвы ўкладыш сярпа і скрабок, у процілеглым баку разам з кальцыніраванымі касцямі знойдзена кераміка мілаградскай культуры.

Стаянкі людзей эпохі неаліту і бронзы, паселішча і могільнік жалезнага веку і паселішча эпохі феадалізму, відавочна, гарадзішча ва ўрочышчы Гарадзец, ці жывёламогільнік знаходзяцца ў 1—1,5 км на захад ад Знаменкі, з усіх бакоў абкружа-

ныя забалочанай старыцай Сцвігі. Даўжыня ўрочышча 400 м, шырыня — 200 м, агульная плошча — 7—8 га. У заходняй частцы выяўлена вялікая колькасць керамікі ад эпохі неаліту да Кіеўскай Русі, у розных месцах, дзе прыкметны значныя выдувы, знаходзяць кальцынірааныя косці. Ва ўсходнім баку ўрочышча знойдзена 36 чарапкоў ляпнога посуду VII—VIII ст. У фонд Тураўскага краязнаўчага музея адсюль узята значная колькасць рэчаў і рэшткаў посуду. Знаходкі з урочышча, якія адносяцца да мілаградскай і зарубінецкай культур, сярэдзіны і другой паловы I тысячагоддзя, захоўваюцца таксама ў фондах сектара археалогіі Інстытута гісторыі АН Беларусі.

Паселішча раннефеадальнага часу паміж Сцвігай і старыцай Прыпяці на адлегласці 0,7—0,9 км ад Знаменкі плошчай 50×40 м. Культурны

слой перамешаны з пяском, яго магутнасць 0,4—0,5 м. Знаходзіцца вялікая колькасць ганчарнай керамікі з хвалістым і лінейным арнаментам. Паселішча ў значнай меры разбурана ў выніку ветравой эрозіі.

Тураў. Курган ва ўрочышчы Бабруйкава гара ў 3 км на паўднёвы ўсход ад гарадскога пасёлка, сярод поля. Вышыня да 4 м, дыяметр — 15—18 м. Каля кургана выворваюцца косці людзей.

На тэрыторыі сучаснага Турава знойдзены археалагічныя матэрыялы розных перыядаў. На левым беразе Прыпяці М. Багаем ў 1950 г. знойдзены вялікі серп бронзавага веку, выраблены з чорнага каменя. Інспектар акрана Лец у 1926 г. выявіў каля Турава на беразе Прыпяці сляды стаянкі першабытнага чалавека. У ваколіцах пасёлка не раз знаходзілі косці маманта. У Тураве была знойдзена урна вытанчанай формы, вышынёй 42 см, з прахам чалавека.

Тураў — адзін з самых старажытных гарадоў Палесся. Тураўскае Замчышча складаецца з двух частак, раздзеленых глыбокім ровам. Меншая пляцоўка — 0,75 га, большая — каля 1,5 га. У некаторых месцах відны сляды рова. Вышыня Замчышча над узроўнем вады ракі каля 10 м. У раскопках выяўлены ў вялікай колькасці вырабы са шкла, паходжанне якіх з Кіева і сярэднеземнаморскіх гарадоў. Датуюцца яны XII—XIII ст. У паўночна-заходнай частцы гарадзішча захаваліся рэшткі старадаўніх умацаванняў. З боку Струменя на працягу больш кіламетра можна прасачыць культурны слой, які адносіцца да розных эпох. У 1909 г. на Барыса-глебскіх могілках знойдзены каменны саркафаг, які складаўся з шасці шыферных пліт. Такія ж саркафагі былі выяўлены пазней пры раскопцы руін храма XII ст. на Замчышчы.

На востраве Балонне, на левым беразе Струменя, у заходнім і паўднёвым баках у вялікай колькасці знойдзена ганчарная кераміка эпохі феадалізму. Тут у раннефеадальны час размяшчалася, відавочна, паселішча. Не выключана, што на гэтым месцы была частка пасаду старажытнага Турава. Фрагменты ганчарных пасудзін з вострава захоўваюцца ў Тураўскім краязнаўчым музеі.

Рычоў. Паселішча плошчай да 1 га паміж вёскамі Рычоў і Буразь сярод балот ва ўрочышчы Першая Горка (Гарадзішча). Вышыня — каля 2 м. Тут знаходзяць прадметы эпохі каменнага веку, усіх перыядаў жалезнага веку і раннефеадальнага часу. У 100 м на поўдзень ад ўрочышча знаходзіцца Другая Горка, дзе выяўлены чарапкі ляпнога посуду.

Стаянка людзей каменнага веку ў паўночным баку Рычова. У эпоху ранняга феадалізму тут узнік курганны могільнік з многіх курганоў, які з'яўляецца адным з самых вялікіх усходнеславянскіх могільнікаў на Палессі. У свой час у ваколіцах Рычова знаходзілася звыш 200 курганоў, большая частка якіх разбурана, да нашага часу захавалася толькі некалькі дзесяткаў. Адзін курган стаіць у лесе на дарозе з Рычова ў Бярэжцы. Курганы круглыя, вышыня іх да 1,5 м, дыяметр 9—15 м. Пры раскопках некаторых з іх знойдзены рэчы, якія даюць звесткі аб культуры славянскіх плямён Тураўшчыны X—XIII ст.

Буразь (урочышча Казаргаць). Група археалагічных помнікаў уздоўж правага берага высахшага русла рэчкі Езда, якая яшчэ нядаўна ўпадала ў Прыпяць каля Турава: стаянка людзей каменнага веку, паселішчы розных перыядаў жалезнага веку і раннефеадальнага часу, а таксама бескурганны могільнік зарубінецкай культуры, на якім упершыню ў Беларусі было раскопа-

на 19 пахаванняў, выкапаных па абрадзе спальвання трупаў. У пахаваннях выяўлены розныя прадметы з металу, у некаторых знойдзена па тры пасудзіны. Канцавыя скрабкі могуць сведчыць аб тым, што тут была стаянка людзей эпохі мезаліту. Розныя крамянёвыя прылады працы, разнастайныя тыпы керамікі адносяцца да эпох неаліту і бронзы. Сустракаецца ямчата-накольчатая, грабенчатая, шнуравая кераміка, глянцаваная і грубаляпная кераміка зарубінецкай культуры, а таксама шурпатая, таўстасценная і з наляпным валікам другой чвэрці I тысячагоддзя н. э. Гэты помнік цяпер знішчаны кар'ерам.

Значная частка яго разбурана ў выніку ветравой эрозіі, у выдувах сустракаюцца кальцыніраваныя косці, абломкі крамянёвых прылад працы, фрагменты посуду, а таксама рэшткі пахаванняў.

Хільчыцы. Стаянка людзей каменнага веку, паселішча жалезнага і раннефеадальнага часу, бескурганны і курганны могільнікі ва ўрочышчы Горка на адлегласці 1,5 км на паўночны захад ад вёскі. У 20-х гадах тут налічвалася каля 50 курганных пахаванняў, з цягам часу разбураных ветрам. Адзначана каля 20 пахаванняў, выкананых па абрадзе трупаспальвання.

Рэшткі гарадзішча жалезнага веку ва ўрочышчы Прыстань у 1 км на поўнач ад вёскі — доўгая пясчаная дзюна, якая цягнецца на 2,5—3 км уздоўж забалочанай поймы. Можна меркаваць, што гарадзішча мела круглую форму памерам 50×40 м, з напольнага боку было абкружана падковападобным валам. Сустракаецца кераміка, якая адносіцца да мілаградскай, зарубінецкай, а таксама пражскай культур. Гэта дае падставу меркаваць, што паселішча было заснавана людзьмі мілаградскай культуры, выкарыстоўвалася плямёнамі больш позніх культур у другой палове I тысячагоддзя н. э.

Вароніна. Паселішча ранняга жалезнага веку і эпохі феадалізму на правым беразе старыцы рэчкі Варонінай ва ўрочышчы Сад. У сучасны момант на гэтым месцы агароды сялян. Ва ўрадлівай зямлі на адлегласці да 0,5 км уздоўж старога русла знаходзяць ляпную кераміку жалезнага веку, ганчарную кераміку раннефеадальнага часу.

Паселішча зарубінецкай культуры ва ўрочышчы Ніва, на правым беразе старыцы рэчкі Варонінай. У абрыве з боку берага відаць, што культурны пласт цягнецца на працягу 200 м, яго магутнасць 0,6—0,7 м. Знаходзяць ляпную кераміку, абпаленую гліну, косці і зубы жывёлы.

Могільнік зарубінецкай культуры ў цэнтры вёскі знойдзены выпадкова, пры капанні ям. Раскрыта 52 пахаванні ранняга этапу зарубінецкай культуры, выкананыя з абрадам спальвання трупа. У прадаўгаватых ямах знойдзена 43 гаршкі, 39 місак, 3 кубкі, 3 абломкі посуду, 13 вялікіх бронзавых шпілек, 2 падковападобныя засцежкі, 4 бранзалеты, 2 пярсцёнкі, 1 шкляная пацерка, 1 кавалак аплаўленага шкла і іншыя рэчы, якія захоўваюцца ў Маскве, у Гомельскім і Тураўскім краязнаўчых музеях.

Паселішча ранняга жалезнага веку на адлегласці 0,5 км на поўнач ад вёскі, на левым беразе рэчышча Струменя. Зверху засыпана пяском таўшчынёй 0,6—0,8 м. З боку абрыву старыцы праследжваецца культурны слой магутнасцю 0,25—0,3 м, зрэдку знаходзяць рэчы, у прыватнасці выяўлена 2 фрагменты грубаляпнога посуду ранняга жалезнага веку.

Сляды паселішча жалезнага веку на левым беразе рэчкі Варонінай, якая цяпер высахла. Паселішча знаходзілася на ўзвышаным полі паміж дзвюма старыцамі, плошча яго некалькі гектараў. Поле цяпер

ворыўнае. Зрэдку выворваюцца фрагменты ляпнога посуду жалезнага веку.

Верасніца. Паселішча жалезнага веку і раннефеадальнага часу на правым беразе старыцы Прыпяці пад назвай Шырокае возера. З боку рэчкі селішча працягваецца больш чым на 1 км, культурны слой яго складае 0,2—0,3 м. На невялікіх агаленнях з боку ракі выяўлена кераміка, блізкая да мілаградскай культуры, а таксама зарубінецкая, раннеславянская VI—IX ст. і ранняга феадалізму. У 1953 г. каля калгаснага двара было знойдзена некалькі пасудзін, блізкіх да пасудзін з могільніка ў Вароніна.

З літаратуры вядомы звесткі, што ў Верасніцы быў знойдзены каменны крыж. У Тураўскім краязнаўчым музеі захоўваецца шэраг рэчаў і фрагментаў рэчаў з Верасніцкага паселішча.

Запясочча. Сляды паселішча на правым беразе старыцы Прыпяці пад назвай Раздзеры, у 0,5—0,6 км на ўсход ад вёскі. У агаленнях пад слоем пяску таўшчынёй да 0,3 м праследжваецца праслойка культурнага пласта. Сляды другога паселішча ў 0,4—0,5 км на паўночны захад ад першага на левым беразе старыцы Прыпяці. У некаторых месцах у час вясенняй паводкі размыты культурны слой даўжынёй да 20 м, у якім знаходзяць кераміку ранняга жалезнага веку, узята сем фрагментаў грубаляпнога посуду. Трэцяе паселішча — у 0,5—0,7 м на паўночны захад ад другога, на левым беразе старыцы Прыпяці. Уздоўж старыцы на працягу звыш 100 м праследжваецца культурны слой таўшчынёй да 0,2 м. Адсюль узяты фрагменты грубаляпнога посуду ранняга жалезнага веку.

Паселішча ў 1—1,5 км на паўночны захад ад вёскі на левым беразе старыцы Прыпяці ва ўрочышчы Аржышча. Культурны слой у агаленнях магутнасцю 0,2—0,3 м. Выяўлена кераміка жалезнага веку і раннефеадальнага часу.

Сляды стаянкі людзей эпохі бронзы, паселішча жалезнага веку і раннефеадальнага часу ва ўрочышчы Ракіта, на правым беразе Ліньскага возера. Мяркуючы па знаходках, паселішча цягнецца ўздоўж старыцы Прыпяці ў даўжыню на 0,9—1 км. У некаторых месцах відны невялікія агаленні, дзе праследжваецца культурны слой таўшчынёй 0,3—0,4 м. Знойдзены фрагменты посуду бронзавага веку, рэшткі прылад працы і кераміка жалезнага веку.

Сляды стаянкі людзей бронзавага веку і паселішча раннефеадальнага часу ва ўрочышчы Лука, на паўночнай ускраіне вёскі. Плугам разворана стужка 100—150 м, шырынёй 2—3 м, дзе знойдзены фрагменты посуду эпохі бронзы і раннефеадальнага часу.

Ёсць звесткі, што па левы бок дарогі на Вароніна знаходзіліся тры курганы.

Дварэц. Паселішча жалезнага веку і эпохі феадалізму ва ўрочышчы Заградка на правым беразе Струменя пры ўпадзенні ў Прыпяць. Зямля чорная, урадлівая, значная частка паселішча перакапана. Культурны слой мае таўшчыню 0,2—0,25 м. Узяты рэшткі грубаляпнога посуду, кераміка, абломкі прылад працы раннефеадальнага часу. Ёсць звесткі, што на месцы вёскі размяшчаўся загарадны замак Тураўскіх князёў, меўся насып, сляды якога знайсці цяпер немагчыма.

Сляды паселішча ранняга жалезнага веку ва ўрочышчы Зарэчка, на левым беразе старыцы Прыпяці. З боку старыцы ў агаленнях на працягу 150—200 м можна прасачыць культурны слой таўшчынёй 0,15—0,2 м.

Крэмна. Паселішча жалезнага веку і эпохі ранняга феадалізму

ва ўрочышчы Сямёнава, на правым беразе возера. У агаленнях з боку ракі яно прасочваецца на 250—300 м. Таўшчыня культурнага слою — 0,4—0,5 м. Вялікая колькасць знаходак выяўлена ў размывах каля ракі — фрагменты грубаляпнога посуду зарубінецкай культуры і раннефеадальнага часу.

Такое ж паселішча ва ўрочышчы Заарэшнік, у 150—200 м на паўночны захад ад вёскі. Яно цягнецца ўздоўж правага берага старыцы Прыпяці. У асобных месцах вада размыла краі помніка, дзе праследжваецца культурны слой магутнасцю 0,2—0,25 м. Заходняя частка паселішча зарасла хмызняком. Адсюль узяты фрагменты грубаляпнога посуду, ганчарныя абломкі посуду, брусок. У 1989 г. у час уборкі бульбы каля развілкі дарог з Крэмна на Тураў быў знойдзены гаршчок, «падобны на шклянку». Можна меркаваць, што тут размяшчаецца бескурганны могільнік.

Паселішча раннефеадальнага часу ў 0,7—0,9 км на ўсход ад вёскі, паміж левым берагам Сцвігі і старыцай. Паселішча моцна разбурана ветрам. Культурны слой цёмна-шэрага колеру, перамешаны з пяском, яго магутнасць 0,4—0,5 м. У агаленнях знаходзяць вялікую колькасць ганчарнай керамікі з хвалістым і лінейным арнаментамі. У краязнаўчай літаратуры ёсць упамінанне аб двух курганах у ваколіцах Крэмна.

Паселішча ранняй зарубінецкай культуры і эпохі ранняга феадалізму на правым беразе вадаёма, каля Вялікай Тоні, ва ўрочышчы Сямёнава. Даўжыня — 250—300 м. Паселішча жалезнага веку, бескурганны могільнік і паселішча эпохі ранняга феадалізму ва ўрочышчы Заарэшнік, у 150—200 м на паўночны захад ад вёскі,на беразе старыцы Прыпяці.

Пагост. Паселішча жалезнага веку ў 1 км на паўночны захад ад Знаменкі, непадалёку ад урочышча Сляпецкія пяскі. З усіх бакоў абкружана старыцамі Сцвігі. Плошча паселішча 1,5—2 га, глеба цёмна-шэрая. У розных месцах знойдзены ляпная кераміка, фрагменты грубаляпнога посуду.

На пясчаным беразе Прыпяці знойдзены фрагменты посуду бронзавага веку. Пры чыстцы русла Прыпяці на бераг былі выкінуты косці маманта, якія знаходзяцца цяпер ў Тураўскім краязнаўчым музеі. Паселішча і могільнік ранняга жалезнага веку знаходзяцца ў паўночнай частцы Пагоста, ва ўрочышчах Панскае поле і Сырэц. Агульная даўжыня паселішча ўздоўж старыцы Прыпяці звыш кіламетра. Тут суцэльнай паласой шырынёй 100—150 м сустракаюцца абломкі посуду і іншыя рэчы. Таўшчыня культурнага слою 0,4—0,5 м. Фрагменты посуду дазваляюць аднесці іх да зарубінецкай і мілаградскай культур. Знойдзена ручка і буйны фрагмент сценкі амфары і іншыя рэчы раннефеадальнага часу.

На вуліцах вёскі ў час раскопак у 1961 г. было пракладзена шэсць траншэй. Устаноўлена, што пахаванні размяшчаліся на даволі значнай глыбіні. У адной з траншэй паміж сядзібамі І. Торчыка і Д. Маляўка адкрыты два пахаванні часоў зарубінецкай культуры, дзе знойдзены кальцынірaваныя косці чалавека, а таксама жывёлы, што дае падставы меркаваць аб звычаі класці ў магілу і спальваць разам з нябожчыкам хатніх жывёл. Знойдзены таксама розныя рэчы, посуд і абломкі прадметаў побыту, ў адной з магіл — да 500 абломкаў. Старажылы расказваюць, што ў гэтым месцы ў 1935—1936 гг. пры выбарцы гліны былі знойдзены «макотрыкі», якія, відавочна, адносяцца да разбураных пахаванняў зарубінецкай культуры. Ва ўсіх пахаваннях знойдзена вялікая колькасць керамікі і рэштак розных прадметаў.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

Паселішча жалезнага веку і эпохі феадалізму ва ўрочышчах Вузкае і Грабелька, у 1 км на захад ад Пагоста, на правым беразе старыцы Прыпяці. Знойдзена шмат абломкаў ляпной і ганчарнай керамікі, фрагменты грубаляпных і ганчарных пасудзін, крамянёвы нож.

Чэрнічы. Паселішча жалезнага веку і эпохі ранняга сярэдневякоўя ва ўрочышчы Балонне, у 0,3—0,6 км на паўночны захад ад вёскі. На паверхні знаходзіцца вялікая колькасць керамікі. Такое ж паселішча ва ўрочышчы Старое Сяло на ўзвышаным плато. Расказваюць, што ў даўнія часы менавіта тут размяшчалася вёска Чэрнічы, якая потым перамясцілася на 0,5 км паўночней. Багатыя знаходкі керамікі розных гістарычных перыядаў — ад ранняга жалезнага веку да позняга феадалізму.

Азяраны. Стаянка людзей эпохі бронзы, паселішча жалезнага веку і эпохі феадалізму ў 0,6 км на паўночны захад ад вёскі ва ўрочышчы Закорчын, на правым беразе Сцвігі. Таўшчыня культурнага слою 0,3—0,4 м. Знаходкі выяўляюцца ўздоўж берага ракі на працягу 150—200 м.

Рыдча. У літаратуры адзначаны сем курганоў непадалёку ад вёскі па дарозе на Рычоў. У Тураўскім краязнаўчым музеі знаходзяцца два крамянёвыя сярпы, знойдзеныя тут.

Знаменка (Слепцы). Паселішча жалезнага веку ў 0,3—0,8 км ад вёскі ва ўрочышчы Востраў, на левым беразе старыцы Сцвігі. Сустракаецца керамiка, характэрная для зарубінецкай культуры. У паўднёва-заходняй частцы паселішча знойдзены жалезныя крыцы, шлак. Сустракаюцца фрагменты ганчарных пасудзін раннефеадальнага часу.

Сямурадцы. Стаянка, паселішча і бескурганны могільнік ва ўрочышчы Малая Ляхавіца, у 800 м ад правага берага Сцвігі плошчай 350 × × 150 м. У выдувах знаходзяць разнастайныя пласцінкі, шкрабкі, абломкі пасудзін позненеалітычнай эпохі, керамiку бронзавага веку. Да жалезнага веку адносяцца больш сотні вялікіх абломкаў ляпнога посуду, якія выяўлены на паселішчы. Знойдзена керамiка зарубінецкай і мілаградскай культур, шмат іншых рэчаў розных гістарычных перыядаў.

У 30—40 м на поўдзень ад паселішча ў пойме ёсць курган, вышыня якога звыш 0,5 м, дыяметр 10—12 м. Шэраг археалагічных помнікаў знаходзіцца на берагах старых рэчышчаў Сцвігі. Адзін з іх — ва ўрочышчы Дуброва, побач з паўночна-заходняй ускраінай Сямурадцаў. Можна меркаваць, што тут знаходзіцца бескурганны могільнік эпохі бронзы. Сустракаецца керамiка гэтага перыяду, кальцыніраваныя косці.

Ва ўрочышчах Дуброва і Ніўкі знойдзены сляды трох паселішчаў і трох бескурганных могільнікаў каля іх. У могільніках, у 25 пахаваннях, выяўлена вялікая колькасць кальцыніраваных касцей, керамікі, абломкаў рэчаў побыту і прылад працы, 16 пасудзін рознага прызначэння цэлыя, 5 удалося часткова рэстаўрыраваць. Яны датуюцца II ст. да н. э.— II ст. н. э. Могільнікі ў Сямурадцах — адзін з найбольш важных і цікавых помнікаў зарубінецкай культуры.

У ваколіцах Сямурадцаў захавалася таксама 11 курганоў. Вышыня іх ад 0,5 да 1,5 м, дыяметр — 6—10 м, адзін больш буйны: у вышыню да 3 м, у дыяметры каля 15 м. 9 курганоў часткова разбураны ў час вайны. Два найбольш паўночныя курганы раскапаны навуковымі супрацоўнікамі секцыі археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР у 1964 г.

У 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Барочак, знаходзіцца вялікая пясчаная ўзгоркавая мясцовасць, якая займае плошчу ў

некалькі дзесяткаў гектараў. У яе заходняй частцы зрэдку знаходзяць абломкі керамікі эпохі неаліту і бронзы, фрагменты грубаляпнога посуду жалезнага веку, скрабкі і абломкі крэменю, ганчарная кераміка раннефеадальнага часу.

Сляды паселішча жалезнага веку на заходняй ускраіне вёскі, ва ўрочышчы Сад, на беразе высахшага рэчышча. Выяўлена грубаляпная гладкасценная кераміка, якая захоўваецца ў сектары археалогіі Інстытута гісторыі АН Беларусі.

Паселішча і бескурганны могільнік жалезнага веку у 1,5—2 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе Сцвігі. Археалагічныя знаходкі выяўляюцца на плошчы 150×350 м. Паселішча абкружана забалочанай поймай, якая ў старажытнасці была руслам ракі. У паўднёвай частцы знойдзены скапленні попелу і вугалю, як можна меркаваць, на месцы жытла. У супрацьлеглым баку сустракаюцца кальцыніраваныя косці, абломкі керамікі, у тым ліку грубаляпная кераміка мілаградскага тыпу, грубаляпная і чорна-глянцаваная зарубінецкага тыпу, а таксама блізкая да Хатомеля. Адна са сценак чорна-глянцаванай пасудзіны мае арнамент у выглядзе прачэрчаных ліній.

Старажоўцы. Стаянка людзей эпохі бронзы, паселішча і могільнік жалезнага веку ў 2 км ад вёскі, непадалёку ад урочышча Вялікая Ляхавіца. Знаходкі ўздоўж барознаў разворанага поля сустракаюцца на плошчы 400×50 м. Узята кераміка эпохі бронзы, жалезнага веку, зарубінецкай культуры, выяўлены кальцыніраваныя косці, абломкі крэменю.

Паселішча жалезнага веку і курган у 0,5 км ад маста праз раку Сцвіга, на правым беразе. Культурны слой мае шэрую афарбоўку. У розных месцах знойдзена грубаляпная кераміка жалезнага веку, у тым ліку зарубінецкай культуры, кальцыніраваныя косці.

З паўднёвага боку паселішча ўздоўж старыцы ў рад размешчаны чатыры курганы вышынёй да 1,5 м, дыяметрам да 12 м. Ёсць звесткі, што ў даваенны час у заходняй частцы вёскі быў яшчэ адзін курган.

Стаянка людзей бронзавага веку, паселішча і могільнік жалезнага веку на правым беразе Сцвігі, ва ўрочышчы Цярэбша. Знаходкі сустракаюцца на плошчы 250×450 м. Паселішча з усіх бакоў абкружана старымі рускамі Сцвігі. У паўночным баку ў шэрым пяску відны плямы з шэра-чорнай зямлёй і вугалем. Тут знойдзены кальцыніраваныя косці, кераміка эпохі бронзы, жалезнага веку і раннефеадальнага часу.

Боркі. У літаратуры неаднаразова ўпамінаецца гарадзішча каля вёскі, у больш даўніх крыніцах — два гарадзішчы на паўночным захадзе ад Борак. У «Памятнай кніжцы Мінскай губерні» за 1878 г., у «Мінскіх Епархіяльных ведамасцях» (1879 г.) гарадзішча ўпамінаецца ва ўрочышчы Барэшчына, яшчэ адно — у лесе графа Комара, ва ўрочышчы Гулебшчына. Ёсць звесткі аб гарадзішчы, якое знаходзілася у 8 км на паўночным захадзе ад Борак, ва ўрочышчы Гарадок. Плошча яго каля 1,5 га, форма эліптычная, вышыня валаў каля 1 м. Тут і цяпер знаходзяць кераміку розных гістарычных перыядаў.

Перароўскі Млынок. Гарадзішча ў 3 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе Прыпяці, ва ўрочышчы Гарадзішча, непадалёку ад возера Сіверскае. Пляцоўка падоўжанаавальнага абрысу, памеры яе 80×
×40 м, абнесена валам вышынёй да 1,5 м, шырынёй 5—7 м.

Перароў. Гарадзішча ва ўрочышчы Свінуха, на правым беразе Прыпяці, у 2,5 км на паўднёвы захад ад вёскі. Форма гарадзішча круглая, дыяметр каля 60 м, вакол — балоты.

Вышыня вала — 1—1,7 м, шырыня 8—10 м. Знаходак не выяўлена.

Сяляне расказваюць, што на адлегласці 1 км ад левага берага Прыпяці, на беразе возера Плюшчын, на сенажаці пры будаўніцтве кашары для жывёлы былі выкапаны вялікія абломкі посуду, аналагічныя керамічы з пахаванняў у Пагосце.

Хваенск. Па звестках даследчыкаў, на паўночным захадзе ад пасёлка ёсць два курганы. Адзін — Вольгіна магіла, другі — Яўгенін Курган.

Вільча. Ёсць звесткі, што непадалёку ад вёскі размяшчалася група курганоў. Захаваліся рэшткі некаторых з іх каля старадаўніх могілак. Там жа — старажытны каменны крыж з выявамі лацінскіх літар. На пясчаных выдзьмах на левым беразе Случы на плошчы 30×40 м — знаходкі рэшткаў ляпной керамікі мілаградскай культуры VII—III ст. да н. э., расшчапанага каменя.

Непакольня. Хутар каля лесу, побач — курган.

Малы Малешаў. Курган ва ўрочышчы Крывавая Ніва — курганны могільнік XI—XII ст. У мінулым такіх пахаванняў у ваколіцах вёскі налічвалася звыш дзесяці, у выніку гаспадарчай дзейнасці яны разбураны. На кургане ўстаноўлены ахоўны знак Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Вятчын. Гарадзішча балотнага тыпу ва ўрочышчах Рудня і Акоп, у 5 км паўночней вёскі, у 7 км ад возера Чырвонае.

Дзякавічы. Гарадзішча балотнага тыпу мілаградскай і зарубінецкай культур паміж в. Дзякавічы і Буда, сярод лесу і балота, на паўночным беразе Чырвонага возера. Там жа сярэдневяковае паселішча. Паміж Дзякавічамі і Пухавічамі — урочышча Замак (Замчышча). У краязнаўчай літаратуры неаднаразова ўпаміналася, што на востраве Чырвонага возера (Князь-возера) існавала ўмацаванне, якое зацягнулася балотам (патанула ў вадзе возера).

Пагібелька. Два балотныя гарадзішчы на ўсход ад Жыткавіч, на поўдзень ад Чырвонага возера, у 5 км на поўдзень ад в. Бялёў, ва ўрочышчы Акоп.

Жыткавічы. Гарадзішча балотнага тыпу на рацэ Жыткаўка (Гніліца), у напрамку в. Млынок і Кольна. Такое ж гарадзішча сярод лесу ў 7 км ад горада.

Града. У ваколіцы вёскі налічвалася каля дзесяці курганоў. Паводле адных меркаванняў, гэта вайсковыя пахаванні, па другіх — месцы рудаплавільных печаў у лесе. Цяпер разбураны. Ёсць звесткі аб знаходках каменнага тапара, гарматных ядраў.

Л. Д. Побаль

Сляды сівой даўніны

У красавіку — маі 1989 г. група супрацоўнікаў Цэнтральна-палескага археалагічнага атрада Інстытута гісторыі АН Беларусі ў складзе В. С. Вяргей, Н. Н. Крывальцэвіча і В. Я. Кудрашова правяла абследаванне старажытных помнікаў па берагах Прыпяці і яе прытокаў — Случы, Скрыпіцы і Сцвігі. Гэтая тэрыторыя з разгалінаванай сеткай водных артэрый і ўрадлівымі глебамі здаўна прываблівала чалавека, яна была заселена яшчэ каля 11 тыс. гадоў назад, у эпоху мезаліту. Тут выяўлены дзесяткі старадаўніх паселішчаў і могільнікаў, матэрыялы якіх з'яўляюцца важнай крыніцай звестак гісторыі насельніцтва поўдня Беларусі на працягу шматтысячагадовага дапісьмовага перыяду. Але далёка яшчэ не ўсе археалагічныя помнікі адкрыты навукоўцамі і краязнаўцамі, шмат іх гіне ў час гаспадарчых работ. Экспедыцыя мела мэту правесці пошукі невядомых помнікаў старажытнасці і абследаваць стан іх захавання.

Хільчыцы, правы бераг р. Прыпяці. Паселішча эпох неаліту (V—III тысячагоддзі да н. э.) і жалеза (VIII ст. да н. э.— VIII ст. н. э.) у 0,4 км на поўдзень ад вёскі, на невысокім круглым у плане пясчаным уз-

вышшы сярод поплава. Тут знойдзены прылады працы з крэменю, рэшткі глінянага посуду, багата ўпрыгожанага ямкамі, адбіткамі грэбеня, і гладкасценных. Шматслойнае паселішча размешчана на пясчаным узвышшы правага берага р. Прыпяць ва ўрочышчы Муравін у 2,5—3 км на паўднёвы захад ад вёскі. У пачатку 1980 гадоў раскопкі на 1 м праводзіў Г. М. Залашка і, акрамя іншых матэрыялаў, выявіў серыю бронзавых наканечнікаў стрэл скіфскага тыпу VII—VI ст. да н. э. Культурны пласт селішча не здзірванелы, на яго паверхні сабраны звыш 300 вырабаў з крэменю (наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, пласціны), фрагменты ляпной керамікі эпох неаліту, бронзы, мілаградскай і зарубінецкай культур жалезнага веку, рэшткі вырабаў з бронзы, у тым ліку скіфскі наканечнік стралы. Сярод найбольш цікавых матэрыялаў вылучаюцца фрагменты посуду позняй бронзы лебядоўскага тыпу (даволі рэдкая знаходка на Беларусі), развал зарубінецкага гаршка з насечкамі па краі вянца.

Доўгая Дуброва, р. Скрыпіца. Паселішча эпох неаліту, бронзы (II тысячагоддзе да н. э.), жалезнага веку і Кіеўскай Русі ў 1,5—2 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Горка. Людзі сяліліся на двух невялікіх узвышшах, абкружаных з усіх бакоў забалочанымі нізінамі, якія зараслі хмызняком і лесам. На паверхні культурнага пласта, часткова пашкоджанага кар'ерам, сабраны прылады працы і загатоўкі з крэменю, фрагменты ляпнога посуду эпох неаліту і бронзы, упрыгожаныя геаметрычным арнаментам (адбіткі шнура, наколы і г. д.), рэшткі танкасценных з добра загладжанай паверхняй горшчыкаў з жарствой у цесце, якія адносяцца да славянскай пражскай культуры VI—VIII ст. н. э.

Людзяневічы. На поўнач ад вёскі, на выцягнутым з захаду на ўсход пясчаным узвышшы, якое зарасло хваёвым лесам, а таксама ва ўрочышчы Кузьмова Гара знойдзены рэшткі грубалепленых гладкасценных сасудаў з дамешкамі дробнай жарствы, якія датуюцца I тысячагоддзем н. э. На паўночны захад ад вёскі, непадалёку ад сучасных могілак, выяўлены сляды старажытнага паселішча плошчай 90×80 м, на якім знойдзены апрацаваныя крамянёвыя вырабы і фрагменты грубаляпнога таўстасценнага посуду, якія адносяцца да эпох бронзы і жалезнага веку.

Браніслаў. У паўночна-заходняй частцы вёскі, каля напаўразбуранай цаглянай вежы, выяўлены рэшткі грунтавога могільніка сярэдневяковага перыяду. Па расказах мясцовых жыхароў, на беразе старога русла р. Скрыпіцы знаходзіліся рэшткі круглага падковападобнага земляного ўмацавання вышынёй да 8 м і дыяметрам да 100 м, у культурным пласце якога знаходзілі разнастайныя прылады працы, зброю, побытавыя рэчы. У 1977 г. земляны вал выкарыстаны на дарожны насып.

Загацце. У сярэдзіне вёскі прыкметны рэшткі пясчанага ўзвышша, у значнай меры пашкоджанага кар'ерам. На захад, каля жывёлагадоўчай фермы, прасочваюцца рэшткі пахавання перыяду сярэдняй бронзы: кальцыніраваныя косці, рэшткі ляпнога посуду. Непадалёку знойдзены фрагменты ляпной керамікі гэтага ж часу і частка шліфаванай крамянёвай сякеры-кліна. У кар'еры і побач з ім выяўлены культурны слой паселішча з матэрыяламі эпох неаліту і ранняй бронзы. Сабраны фрагменты ляпной керамікі, упрыгожаныя геаметрычным арнаментам, крамянёвыя адбойнікі, ножападобныя пласціны.

Ёсць звесткі, што ў 1937 г. пры будаўніцтве дома ў вёсцы выкапаны цэлы гліняны гаршчок, два бронзавыя спіральныя бранзалеты.

Князь-Бор. Паселішча эпох неаліту, бронзы і жалезнага веку у 0,4 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Агаркава, паабапал дарогі на в. Поўчын. Размешчана на краі тэрасы ўздоўж старарэчышча, вышыня яго дасягае 1,5—2 м, плошча каля 1 га, разворваецца. На паверхні культурнага пласта сабраны рэшткі неалітычнага посуду, упрыгожаныя грабеньчатымі і накольчатымі арнаментамі, фрагменты посуду бронзавага веку з лінейным, шнуравым арнаментам, гладкасценная грубаляпная кераміка эпохі жалеза, прылады працы і загатоўкі з крэменю.

Поўчын. Паселішча на левым беразе Прыпяці, насупраць Верасніцы. Грубаляпная неарнаментаваная кераміка эпохі жалеза з апрацаванага крэменю ў 1,5 км на паўночны захад ад вёскі, на пясчаным узвышшы, абкружаным з усходу і поўдня старарэчышчам. Культурны пласт разворваецца, находкі сустракаюцца на плошчы каля 1 га.

Кольна. У 2,5 км на поўдзень ад вёскі на левым беразе р. Скрыпіцы ляжыць выцягнутая з усходу на захад пясчаная грыва 900×60—200 м. У заходняй частцы тут яшчэ ў 60-я гады У. Ф. Ісаенка адкрыў рэшткі паселішчаў эпох неаліту, бронзы, жалезнага веку і больш позняга часу. У час абследавання помніка ў абгаленнях культурнага пласта сабраны разнастайныя крамянёвыя вырабы, фрагменты ляпнога посуду, упрыгожанага геаметрычным арнаментам, эпох неаліту і бронзы, рэшткі гладкасценнай керамікі жалезнага веку, ганчарных гаршкоў.

У час археалагічных разведак 1989 г. у 3,5—4 км на паўднёвы ўсход ад Кольна, на правым беразе р. Скрыпіцы, на ўзвышшы плошчай 400×400 і вышынёй да 4 м выяўлены паселішчы эпох неаліту, бронзы, жалезнага веку і перыяду Кіеўскай Русі. Культурны пласт, які дасягаў таўшчыні 0,4—0,9 м, у значнай меры знішчаны кар'ерам. Раннеганчарная кераміка X—XII ст. канцэнтравалася ў паўночнай частцы ўзвышша, дзе, відаць, размяшчалася асноўная тэрыторыя селішча. Больш раннія паселішчы займалі паўднёвыя і заходнія схілы. Тут сабрана вялікая колькасць фрагментаў керамікі эпох неаліту і бронзы, звыш двухсот крамянёвых вырабаў, сярод іх — наканечнікі стрэл, нажы, абломак сярпа.

Азяраны. Селішча VI—X ст. у 0,5 км на ўсход ад вёскі, паабапал дарогі на Хваенск, на невысокай пясчанай грыве. Займае плошчу 200×300 м, разворваецца. На паверхні культурнага пласта знойдзены рэшткі грубаляпнога гладкасценнага посуду раннеславянскай пражскай культуры і культуры тыпу Лукі Райкавецкай.

Хваенск. У 1—1,5 км на ўсход ад вёскі ва ўрочышчы Рэчышча абследавана паселішча эпох неаліту і бронзы, адкрытае ў 1979 г. У. А. Літвінавым. Размешчана на невысокім пясчаным узвышшы на надпоплаўнай тэрасе правага берага Прыпяці, займае плошчу 40×60 м, часткова пашкоджана кар'ерам. У абгаленнях культурнага пласта сабрана неалітычная кераміка з грабеньчатым і накольчатым арнаментам, рэшткі ляпнога посуду эпох бронзы, упрыгожаныя насечкамі, рыскамі, адбіткамі шнура, расшчапаны крэмень.

Перапоў. Раннеславянскае селішча VI—X стст. н. э. з матэрыяламі пражскай і тыпу Лукі Райкавецкай культур у 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі на правым беразе Прыпяці. Плошча каля 3 га, разворваецца. На паверхні культурнага пласта знойдзены рэшткі грубаляпнога і раннеганчарнага посуду.

Другое паселішча плошчай каля 1 га — у 1 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Панскае Поле, на поўнач ад дарогі на Перапоўскі Млынок. На паверхні культурнага пласта знойдзены фрагменты ляпной кера-

мікі мілаградскай культуры жалезнага веку, якая датуецца VII—III ст. да н. э.

Пераройскі Млынок. Раннеславянскае паселішча VI—X стст. н. э., у 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Бутава. Размешчана на правым беразе Прыпяці, выцягнута з усходу на захад, займае плошчу 200×100 м, разворваецца. На паверхні культурнага пласта сабраны рэшткі грубаляпнога і раннеганчарнага посуду пражскай і тыпу Лукі Райкавецкай культур.

Другое паселішча плошчай 250×20 м гэтага ж часу і з аналагічнымі матэрыяламі размяшчалася ў 0,4 км на ўсход, аддзяляецца ад яго вузкай балоцістай лагчынай.

Хлупін. Раннеславянскае паселішча другой паловы I тысячагоддзя н. э. у 3 км на паўночны захад ад вёскі, на тэрасе правага берага Прыпяці. На паверхні культурнага пласта сабраны рэшткі грубаляпнога і раннеганчарнага посуду пражскай і тыпу Лукі Райкавецкай культур.

Другое старажытнае паселішча плошчай 300×200 мм — у 1 км на захад ад вёскі, на поўдзень ад дарогі на Пераройу, за мастом праз р. Бекаўка, разворваецца. У больш нізкай частцы паселішча канцэнтруецца грубаляпная і раннеганчарная кераміка пражскай і тыпу Лукі Райкавецкай культур. Бліжэй да вёскі знойдзены рэшткі ляпнога посуду з добра загладжанай і глянцаванай паверхняй зарубінецкай культуры II ст. да н. э.— I ст. н. э. і фрагментаваныя прасліцы.

Селішча Хлупін-3 знаходзіцца на паўночны ўсход ад вёскі, займае плошчу 400×300 м, разворваецца. На паверхні культурнага пласта знойдзена грубаляпная і раннеганчарная кераміка пражскай і тыпу Лукі Райкавецкай культур, якая датуецца VI—X ст. н. э. Фрагменты неарнаментаванага неалітычнага посуду з раслінными дамешкамі ў гліне і вырабы з крэменю знойдзены ў 0,8 км на паўночны захад ад вёскі, на пясчаным узвышшы. Культурны пласт у значнай меры пашкоджаны кар'ерам.

У заходнім баку старадаўняга селішча размешчаны невялікія старадаўнія могілкі, на якіх можна назіраць цікавыя этнаграфічныя асаблівасці. Драўляныя крыжы, якія стаяць з двух бакоў ад уваходу, у некалькі пластоў упрыгожаны вышываными фартухамі, ручнікамі, рознакаляровымі стужкамі і нагадваюць фігуры жанчын у багатых строях. Надмагільныя крыжы ўпрыгожаны не так пышна.

Каля 20 новых помнікаў археалогіі ад неаліту да сярэдневякоўя было адкрыта ў час пошукавых работ у парэччы Прыпяці ў Жыткавіцкім раёне, што значна пашырае ўяўленне аб гісторыі насельніцтва рэгіёна ў дапісьмовы час. Большасць выяўленых старажытных паселішчаў узнікла ў другой палове I тысячагоддзя н. э. і звязана з шырокім рассяленнем усходняга славянства на Палессі. Менавіта ў гэты час сягаюць вытокі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, набіраюць сілу працэсы, якія прывялі да фарміравання на тэрыторыі Беларусі Тураўскага і Полацкага княстваў. На жаль, старажытныя паселішчы і могільнікі кожны год знікаюць, яны гінуць пад нажамі бульдозераў, руйнуюцца каўшамі экскаватараў, глыбокае ворыва перамешвае культурны пласт. Зусім знішчаны ў апошнія часы вядомыя з 1920 г. раннеславянскае гарадзішча каля в. Хільчыцы (адно з пяці выяўленых на Палессі ўмацаваных паселішчаў гэтага перыяду), шматслойнае паселішча ва ўрочышчы Казаргаць каля в. Буразь, знікае курганны могільнік каля в. Рычоў, гудуць цяжкія грузавікі праз гарадзішча старадаўняга Турава...

В. С. Вяргей

Вялікае і магутнае Тураўскае княства

У надзвычай багатай гісторыі Тураўскай зямлі можна выдзеліць два вялікія перыяды. Першы з іх датычыцца часу існавання племяннога княжання дрыгавічоў, што стварылася на этнічнай аснове ва ўмовах распаду першабытна-абшчыннага ладу. Другі ахоплівае час існавання Тураўскага феадальнага княства. Умоўнай мяжой паміж гэтымі перыядамі можна прызнаць канец X ст., калі ў Старажытнай Русі адбылася радыкальная адміністрацыйная рэформа, якая змяніла прынцыпы фарміравання кіраўніцтва княствамі на падставе развіцця феадалізму.

Княжанне дрыгавічоў

Найбольш старажытныя звесткі аб тэрыторыі і насельніцтве Тураўскай зямлі змяшчаюцца ў ранняй, недатаванай частцы старажытнейшага рускага летапісу, так званай «Аповесці старажытных часоў». Скончаны ў 1113 г. Нестарам, манахам-летапісцам Кіева-Пячэрскага манастыра, ён пачынае датаванае выкладанне з 852 г. Падзеі папярэдніх часоў не маюць дакладнай датыроўкі, яны дайшлі да летапісца ў выглядзе вусных паданняў і маюць напаўлегендарны характар. Несумненна, аднак, што Нестару былі вядомы мясцовыя хронікі папярэдніх часоў, працы візантыйскіх аўтараў, біблейскія і агіяграфічныя сказанні аб жыцці тых або іншых гістарычных асоб. На падставе вывучэння і супастаўлення дадзеных розных крыніц Нестар паспрабаваў найбольш глыбока зазірнуць у папярэднія стагоддзі славянскай гісторыі і выкласці яе падзеі ў лагічнай узаемасувязі і паслядоўнасці. Паводле яго паведамлення, тэрыторыю Тураўскай зямлі да ўтварэння Тураўскага княства засялялі дрыгавічы, адно з усходнеславянскіх плямённых аб'яднанняў, якія шырока рассяліліся на тэрыторыі Усходняй Еўропы у канцы I тысячагоддзя н. э. Дакладны час рассялення заставаўся невядомым летапісцу, таму звесткі аб ім выкладзены ў недатаванай частцы «Аповесці старажытных часоў». Апавядаючы аб прыходзе славян з Дуная, іх легендарнай прарадзімы, і рассяленні іх на шырокай прасторы Усходняй Еўропы, ён гаворыць, што «...друзии седоша межи Припетью и Двиною и наркомася дреговичи...»[1]. Вядома, такі паказ рэгіёна рассялення дрыгавічоў не можа быць названы дакладным. У паўночным раёне гэтай тэрыторыі ў басейне Заходняй Дзвіны рассяляліся крывічы. Не паказаны таксама ўсходняя і заходняя межы рассялення дрыгавічоў.

Амаль кожнае вядомае па летапісе ўсходнеславянскае племя мела свае этнічныя (племянныя) жаночыя ўпрыгажэнні, так званыя скроневыя кольцы, характэрныя толькі для аднаго племені. Па распаўсюджанні гэтых племянных упрыгажэнняў, выяўленых пры раскопках пахавальных курганоў, можна вызначыць тэрыторыю таго ці іншага усходнеславянскага племені значна дакладней, чым па агульным летапісным апісанні. Такая работа па ўдакладненні межаў рассялення ўсходнеславянскіх плямёнаў была ў асноўным праробпена яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя[2]. Аднак асобныя дэталі рассялення плямёнаў давялося ўдакладняць для розных плямёнаў у больш позні час.

Для дрыгавічоў характэрным племянным упрыгажэннем былі буйныя металічныя каралі, аздобленыя дробнымі шарыкамі срэбранай зерні. Часцей за ўсё яны мелі ажурны (карункавы) цыліндрычны корпус з меднага тонкага дроту. Значна радзей сустракаецца суцэльны корпус бочкападобнай формы з меднай (бронзавай) пласцінкі. Па распаўсюджанні такіх караляў можна вы-

значыць, што паўночная мяжа рассялення дрыгавічоў (з крывічамі) праходзіла паўночней Мінска, прыкладна па лініі ад Заслаўя на Лагойск і Барысаў, усходняя (з радзімічамі) — у асноўным па Дняпры, паўднёвая (з драўлянамі і валынянамі) праходзіла на поўдзень ад Прыпяці, прыкладна ў раёне сучаснай дзяржаўнай граніцы Беларусі, а заходняя (з заходнеславянскім племенем мазаўшан) пераходзіла на заходні бераг р. Заходні Буг. Левабярэжнае Панямонне таксама было заселена дрыгавічамі[3].

Звяртаюць на сябе ўвагу неаднаразовыя ўпамінанні ў летапісе аб прыналежнасці ўсходнеславянскіх плямёнаў да адной этнічнай групы. Гэта адзінства летапісец падкрэслівае пры апісанні рассялення плямёнаў пасля іх прыходу з легендарнай дунайскай прарадзімы, аб прыналежнасці палян, драўлян, наўгародцаў, палачан, дрыгавічоў, севяран, бужан да адной моўнай агульнасці — «се бо токмо словенск язык в Руси»[4], што сведчыць аб разуменні летапісцам важнасці гэтай праблемы.

Кампактнасць рассялення, прыналежнасць да адзінай моўнай агульнасці, аднолькавы ўзровень эканамічнага і сацыяльнага развіцця пераканаўча сведчаць аб прыналежнасці ўсходнеславянскіх плямёнаў да адной этнічнай агульнасці. У той жа час летапісец вылучае рысы, па якіх асобныя плямёны адрозніваліся адно ад другога — «...имянуть бо обычая своя и законы отець своих, и предания, кождо своя норов...»[5] Адзначаныя летапісцам агульныя рысы і асаблівасці асобных усходнеславянскіх плямёнаў з поўнай адпаведнасцю варта аднесці да дрыгавічоў. Яны, несумненна, належалі да агульнасці ўсходнеславянскіх плямёнаў, і, відавочна, мелі свае характэрныя племянныя рысы (моўныя дыялектныя асаблівасці, мясцовыя вераванні, паданні, звычаі і г. д.).

Дрыгавічы належалі да ліку найбольш развітых усходнеславянскіх плямёнаў, адначасова і разам з якімі іх успамінае летапісец у ранніх успамінах у недатаванай частцы летапісу. Яны, як і паляне, відавочна, жылі родавым ладам, пры якім племя складалася з некалькіх вялікіх патрыярхальных кроўных сем'яў на чале са старэйшым рода[6]. Аднак у гэтым грамадстве ў плямёнах і родах ужо адбываецца вылучэнне пастаянных родавых і племянных старэйшын, знаці, правадыроў, ідзе паступовае разбурэнне першабытнаабшчыннага ладу. Унутры грамадства ўзнікае і развіваецца маёмасная і грамадская няроўнасць. Летапісец успамінае Кія, легендарнага заснавальніка горада Кіева, яго братоў Шчэка і Харыва і сястру Лыбедзь, якія «валодалі» родам сваім. І крыху пазней летапісец гаворыць: «...И по сеи братьи погаша держати род их княжение в полях, а в деревлях свое, а дреговичи свое, а словени свое в Новегороде, а другое на Полоте, иже и полочане, от сих же и кривичи...»[7]. Існаванне такога адзінага для ўсяго племені княжання сведчыць аб распадзе патрыярхальнага родавага грамадства, развіцці феадальных адносін, пры якіх адбываецца больш трывалае аб'яднанне родаў у адзінае племя на чале з племяннымі правадырамі — князямі, якія падпарадкавалі сабе родавых старэйшын. Паведамленні аб адзіных племянных княжаннях і князях — прамое сведчанне распаду першабытнаабшчыннага ладу ўсходнеславянскіх плямёнаў, у якіх ужо далёка зайшоў працэс складвання феадальнага грамадскага ладу, самастойнага фарміравання феадальнай дзяржаўнасці. У княжанне дрыгавічоў мясцовыя племянныя князі, відавочна, збіралі даніну, ўзначальвалі ваенную дружыну і

мясцовае апалчэнне, ажыццяўлялі судовыя функцыі на падставе звычаёвага права.

Час існавання племяннога княжання ў дрыгавічоў, як і ва ўсіх усходніх славян, дакладна не вядомы. Аднак несумненна, што яно папярэднічала ўтварэнню феадальных княстваў. Акадэмік Б. А. Рыбакоў датуе час іх існавання ва ўсходніх славян VI—VIII стст.[8] Відавочна, што змена племянных княжанняў феадальнымі княствамі адбывалася неадначасова і найбольш хутка яна ажыццяўлялася ў больш развітых плямёнаў. Аднак яшчэ ў сярэдзіне X ст. летапісец неаднаразова гаворыць пра драўлянскага князя Мала[9], а Уладзімір Манамах успамінае аб сваім паходзе на вяцічаў і іх князя Хадоту ў 70-х гг. XI ст.[10] Відавочна, у дрыгавічоў племянное княжанне на чале з племянным князем працягвала існаваць яшчэ ў X ст. Дакладныя звесткі аб дрыгавічах у гэты перыяд у летапісе адсутнічаюць. Немагчыма вызначыць час утварэння ў іх племяннога княжання. Няма звестак і аб часе іх падпарадкавання і ўключэння ў склад Кіеўскай Русі. Аднак ужо Канстанцін Багранародны ў сваім творы «О народах» (849 г.) называе дрыгавічоў у ліку плямён, што плоцяць дань Кіеўскай Русі[11]. Гэта першы датаваны ўспамін пра дрыгавічоў у пісьмовых крыніцах. Яно сведчыць аб шырокай вядомасці дрыгавічоў у старажытным свеце.

Летапісныя звесткі аб Тураве

Тураў упершыню ўпамінаецца ў летапісе пад 980 г. У гэтым запісе гаворыцца аб тым, што «...Рогволад (полацкі князь — П.Л.) бе пришед из заморья и имяше свою волость Полотьсце, а Тур Турове, от него же и туровци прозвашася...»[12] Перш за ўсё трэба звярнуць увагу на тое, што Тураў названы побач з Полацкам, адным са старажытнейшых гарадоў Кіеўскай Русі (862 г.) і сталіцай самастойнага княства. Як відаць, становішча і значэнне Турава было блізкім да таго, якое займаў Полацк. Дзіўным, аднак, выглядае супадзенне імені, як мяркуюць некаторыя даследчыкі, варажскага князя Тура з назвай горада. Да таго ж ні адзін са шматлікіх гарадоў Старажытнай Русі не быў названы іменем прышлых варажскіх князёў. Таксама трэба ўлічваць шматлікасць мясцовых назваў з коранем «тур» (Турыя, Турыйск, Тураўля і г. д.). Такія назвы ёсць і ў Закарпацці, і на тэрыторыі Чэхаславакіі, дзе ніколі не было варагаў. Відавочна, гэтыя назвы маюць мясцовае паходжанне і не звязаны з іменем і дзейнасцю варажскіх князёў. Як відаць, і назву Турава правільней звязваць з шырока распаўсюджаным іменем або прозвішчам мясцовага князя, як, напрыклад, у «Слове о полку Игореве» празваны буй-турам Усевалад, брат Ігара Святаславіча, князь Курскі. Хутчэй за ўсё, гэта быў князь мясцовай дынастыі дрыгавіцкага племяннога княжання, які княжыў у Тураве і выконваў абавязкі племяннога князя, але знаходзіўся ў залежнасці ад вялікага князя кіеўскага і выплочваў яму даніну. Як відаць, гэта быў адзін з апошніх племянных князёў у дрыгавічоў.

У хуткім часе ў жыцці дрыгавічоў адбываюцца буйныя зрухі. У канцы X ст. узмацняецца ўлада вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча. Гэтаму садзейнічалі яго ўдачлівыя паходы на яцвягаў (983 г.), радзімічаў (984 г.), балгар (985 г.), пад Корсунь (987 г.), развіццё дыпламатычных зносін з Візантыяй, Польшчай, прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства на Русі (988 г.), развіццё эканомікі і рост гарадоў. Узмацненне ўлады вялікага князя кіеўскага прывяло да аслаблення ўлады племянных князёў.



Яны трапілі ў поўную залежнасць ад кіеўскага князя, які стаў паўнаўладным валадаром усіх падпарадкаваных і ўключаных у склад Кіеўскай Русі зямель.

Тураўскае княства

У 988 г. у Кіеўскай Русі адбываюцца надзвычай важныя рэформы адміністрацыйнага кіравання вялікім княствам кіеўскім і асобнымі племяннымі княствамі. У гэтым годзе вялікі князь кіеўскі Уладзімір Святаславіч падзяліў усю тэрыторыю Кіеўскай Русі на ўдзелы паміж сваімі дванаццацю сынамі. Тым самым было спынена вылучэнне прадстаўнікоў мясцовых дынастычных ліній (родаў) мясцовай племяннай знаці на прастолы мясцовых племянных княжанняў. Гэтая рэформа сведчыла аб далейшым развіцці феадальных адносін, узмацненні цэнтральнай княскай улады, здольнасці вялікага князя кіеўскага самастойна прымаць радыкальныя рашэнні, не звяртаючы ўвагі на мясцовыя традыцыі.

Княствы сынам Уладзіміра Святаславіча выдзяляліся ў межах ранейшых племянных княжанняў, але назвы яны атрымлівалі адпаведна імені сталічнага горада. Аснову тэрыторыі вылучаных княстваў складалі тэрыторыі племянных княжанняў. Аднак яны далёка не поўнасцю адпавядалі этнічнай тэрыторыі рассялення плямёнаў. Больш моцныя феадальныя княствы імкнуліся пашырыць свае межы за кошт уключэння тэрыторый з іншым этнічным насельніцтвам. Слабыя княствы страчвалі пры першапачатковым выдзяленні і ў далейшай палітычнай барацьбе свае землі. На ўсходзе частка дрыгавіцкіх тэрыторый з горадам Брагінам у XII ст. ужо ўваходзіла ў склад Кіеўскага княства, а Рэчыца з прылеглымі тэрыторыямі — у склад Чарнігаўскага княства. На поўдні ў Пагарынні Дубровіца,



Старажытны Тураў (рэканструкцыя П. Ф. Лысенкі, мастак Я. Г. Каробушкін)

Сцепань і Чартарыйск, на землях валынян, уваходзілі ў склад Тураўскага княства. Сярэдняе Пабужжа з гарадамі Бярэсцем, Драгічынам Надбужскім у XI—XII ст. уваходзілі ў склад Тураўскага княства, а з другой паловы XII ст.— Валынскага княства. На поўначы частка дрыгавіцкай тэрыторыі з гарадамі Мінскам, Лагойскам і Барысавам адышлі да Полацкага княства.

Выдзяленне княстваў ажыццяўлялася адпаведна іх важнасці і старшынству сыноў. Старэйшы сын Уладзіміра Святаславіча Вышаслаў атрымаў найбольш значнае Наўгародскае княства, другі сын, Ізяслаў — Полацкае. Тураўскае княства дасталося трэцяму па старшынству сыну Уладзіміра — Святаполку. Ён і стаў першым гістарычна вядомым сапраўдным тураўскім князем. Яго маці «Гракіня» была раней жонкай старэйшага брата Уладзіміра Святаславіча, кіеўскага князя Яраполка Святаславіча, які загінуў ў 980 г. у г. Родне ад рук падасланых забойцаў у ходзе барацьбы Уладзіміра за кіеўскі прастол.

Вылучэнне Турава трэцяму па старшынству сыну Уладзіміра Святаславіча падкрэслівае яго важнае значэнне сярод астатніх княстваў Старажытнай Русі на тых жа падставах, што і іншыя княствы. Яго тэрыторыю складалі землі папярэдняга племяннога княжання дрыгавічоў. Сталіцай стаў горад Тураў, як можна меркаваць, племянны цэнтр княжання дрыгавічоў. Яго князем стаў сын вялікага князя кіеўскага

Уладзіміра Святаславіча.

Відавочна, першапачаткова прызначаныя князі знаходзіліся ў становішчы пасаднікаў вялікага князя кіеўскага, якому яны абавязаны былі выплачваць даніну і ў адносінах да якога знаходзіліся ў падначаленым становішчы. Аднак эканамічныя сувязі новых княстваў з Кіевам былі слабымі, аснову іх складала натуральная феадальная гаспадарка. У той жа час нядаўнія традыцыі існавання самастойных племянных княстваў з мясцовай племянной старэйшынай і княскімі дынастыямі, мясцовымі звычаямі і асаблівасцямі стымулявалі імкненне да іх выдзялення са складу Кіеўскай Русі. Сепаратысцкія імкненні раней за ўсё пачалі праяўляцца ў найбольш моцных і аддаленых ад Кіева Наўгародскім і Полацкім княствах. Такія ж тэндэнцыі выспявалі і ў Тураўскім княстве хутка пасля яго выдзялення Святаполку. Старажытнарускія летапісы не ўтрымліваюць звестак аб яго канфлікце з Уладзімірам Святаславічам. Аднак польскі храніст Дзітмар (Цітмар) паведамляе, што Святаполк быў жанаты на дачцэ польскага караля Баляслава Харобрага, разам з якой на Русь прыехаў яе духоўнік біскуп Калабжэгскі Рэйнберг. У далейшым Дзітмар піша, што Святаполк, яго жонка і Рэйнберг былі арыштаваны і пасаджаны у турму, дзе Рэйнберг памёр. Лёс жонкі Святаполка невядомы, а сам ён хутка быў вызвалены і паселены ў Вышгарадзе пад наглядам бацькі. Даследчыкі лічаць, што жаніцьба Святаполка адбылася ў 1009—1010 гг., што змова мела на мэце вызваленне Тураўскага княства ад падпарадкавання Кіеву і арышт змоўшчыкаў адбыўся ў 1012 г.[13] Можна меркаваць, што выхадам Турава з падпарадкавання Кіева Баляслаў Харобры імкнуўся аслабіць Кіеўскую Русь, і змову з гэтай мэтай магла падтрымліваць мясцовая тураўская феадальная вярхушка, якая імкнулася да большай самастойнасці і незалежнасці ад Кіева.

Падштурхоўвалі Святаполка да выхаду з Кіеўскай Русі і матывы асабістага парадку. Напярэдадні арганізацыі змовы пасля смерці яго старэйшых братоў Наўгародскага князя Вышаслава і Полацкага князя Ізяслава ён заставаўся старэйшым з сыноў Уладзіміра. Аднак Наўгародскае княства пасля смерці Вышаслава было перададзена не яму, а малодшаму брату Яраславу. Да таго ж Уладзімір выказваў намеры перадаць кіеўскі вялікакняжацкі прастол другому малодшаму брату Святаполка — Барысу. Крыўда Святаполка была таксама адной з прычын яго ўдзелу ў змове.

Далейшы лёс Святаполка звязаны з гадамі працяглай і крывавай барацьбы за кіеўскі вялікакняжацкі прастол. Раптоўна ў 1015 г., 15 ліпеня, у час падрыхтоўкі паходу на Яраслава Наўгародскага, які адмовіўся плаціць даніну Кіеву, у сяле Берастове пад Кіевам памёр Уладзімір Святаславіч. З дапамогай вышгародскіх баяр кіеўскі вялікакняжацкі прастол заняў Святаполк Уладзіміравіч. Ён подкупамі імкнуўся схіліць на свой бок кіяўлян. Як сведчанне свайго вялікакняжацкага стану, ён загадаў адчаканіць сярэбраную манету з надпісам: «Святаполк на столе, а это его сребро».

Аднак становішча Святаполка здаецца яму недастаткова надзейным, а браты Барыс і Глеб занадта небяспечнымі сапернікамі. Ля горада Пераяслаўля на р. Альце ноччу ў шатры ў час малітвы падасланымі забойцамі князь Барыс, які вяртаўся з паходу на печанегаў і адпусціў дадому кіеўскую дружыну, не жадаючы пачынаць узброеную барацьбу са старэйшым братам Святаполкам, быў забіты. Пад Смален-

скам на Смядыні забіты мурамскі князь Глеб, які ехаў на пахаванне бацькі ў лодцы. А ў Карпатах, уцякаючы ў Венгрыю, быў забіты Святаслаў.

Пад выглядам помсты за забітых братоў і пакарання Святаполка ў барацьбу за кіеўскі прастол уступіў Наўгародскі князь Яраслаў Уладзіміравіч... «и пошел на Святополка. Услышав же, что Ярослав идет, Святополк собрал бесчисленное количество воинов, русских и печенегов, и вышел против него к Любечу на тот берег Днепра, Ярослав же был на этом... Пришел Ярослав на Святополка и стали тот и другой по обе стороны Днепра, и не решались начать бой ни эти против тех, ни те против этих, и стояли три месяца друг против друга... А наступали уже заморозки. Святополк стоял между двумя озерами и всю ночь пил с дружиною своею. Ярослав же наутро, приготовив дружину свою к бою, на рассвете переправился. И высадившись на берег, они оттолкнули ладьи от берега и пошли в наступление и сошлись обе стороны. Была битва жестокая и не могли из-за озера печенеги прийти на помощь: и прижали Святополка с дружиною к озеру, и вступили они (воины Святополка) на лед, и подломился под ними лед, и одолевать начал Ярослав. Увидев это, Святополк обратился в бегство, и одолел Ярослав. Святополк же бежал в Польшу...»[14]. Ён спадзяваўся на дапамогу свайго цесця Баляслава Харобрага.

У 1018 г. польскае войска рушыла на ўсход. Сустрэча з дружынамі Яраслава адбылася на р. Заходні Буг каля г. Валыні. Летапісец так апавядае пра наступныя падзеі: «Пришел Болеслав са Святополком и с поляками на Ярослава. Ярослав же, собрав Русь и варягов, и словен (новгородских), пошел навстречу Болеславу и Святополку и пришел к Волыню, и стали они по обе стороны Буга... Сев на коня, пустился он (Болеслав — П.Л.) в реку, а за ним воины его: Ярослав же не успел собрать воинов, и победил Болеслав Ярослава, Ярослав же бежал с 4 мужами в Новгород...»[15].

Яраслаў, прыбегшы ў Ноўгарад, хацеў уцякаць за мора. Аднак наўгародцы, баючыся помсты Святаполка і імкнучыся затрымаць Яраслава, пасяклі сякерамі падрыхтаваныя да адплыцця княскія лодкі і сабралі грошы для найму новых варажскіх дружын.

Тым часам Святаполк пасля перамогі на Бугу, апіраючыся на польскае войска, заняў Кіеў. Палякі, размешчаныя ў Кіеве і навакольных гарадах на пракорм, грабілі і прыгняталі мясцовае насельніцтва. Паўстаўшыя жыхары пачалі знішчаць польскія гарнізоны і прымусілі Баляслава Харобрага вярнуцца ў Польшчу.

А да Кіева ў гэты час падступіла войска Яраслава, і Святаполк, не маючы сілы для абароны і не спадзяючыся на дапамогу палякаў, вымушаны быў уцякаць да печанегаў. У 1019 г. Святаполк прыйшоў з вялікім войскам печанегаў, і Яраслаў выступіў насустрач пад Пераяслаў, на рэчку Альту, дзе быў забіты Барыс. Летапісец так апавядае пра гэту бітву: «...противники двинулись друг на друга, и покрыли поле Летьское множеством воинов. Была же тогда пятница; на восходе солнца сошлись противники и бой был жестокий, какого не было на Руси, и за руки хватая друг друга, рубились, и сходились трижды так, что по низинам кровь текла. К вечеру же одолел Ярослав, а Святополк бежал»[16].

У рускіх летапісах у падзеях 1015—1019 гг. Святаполк намаляваны толькі чорнымі фарбамі. Летапісец называе яго акаянным забойцам. Тлумачыцца гэта перш за ўсё імкненнем летапісца ў дабрачынным

святле паказаць вялікага князя кіеўскага Яраслава, заснавальніка летапісання, і ачарніць яго палітычнага праціўніка і саперніка Святаполка. Буйнейшы знаўца старажытнарускіх летапісаў А. А. Шахматаў прыйшоў да высновы, што «...рукой летописца управляли политические страсти и мирские интересы». Надзвычай ярка гэта адлюстравана ў адмоўнай характарыстыцы Святаполка. Самыя завостраныя маральныя і палітычныя абвінавачванні «льстивого», па словах акадэміка Б. А. Рыбакова, кіеўскага летапісца накіраваны ў яго адрас. Несумненна, яны прадыктаваны палітычнымі меркаваннямі і не заўсёды адпавядаюць сапраўднасці. Святаполк загінуў за межамі старажытнарускіх зямель, не перанёсшы цяжкага псіхічнага надлому ад апошняга паражэння. Са смерцю Святаполка скончыўся першы кароткачасовы (988—1019 гг.) перыяд у існаванні Тураўскага феадальнага княства, які характарызаваўся вылучэннем са складу Кіеўскай Русі, імкненнем набыць самастойнасць, барацьбой Святаполка за кіеўскі прастол.

Пасля смерці Святаполка (1019 г.) Тураўскае княства зноў аказваецца ў складзе Кіеўскай дзяржавы, у руках самаўладнага кіеўскага князя Яраслава Уладзіміравіча, які аб'яднаў у сваіх руках амаль усе землі і княствы Старажытнай Русі. Адносную самастойнасць Тураўскае княства набывае пры наступным падзеле земляў Старажытнай Русі паміж сынамі Яраслава Уладзіміравіча. Тураў і Тураўскае княства зноў атрымлівае трэці па старшынству сын Яраслава Уладзіміравіча Ізяслаў. Дакладны час гэтага падзелу невядомы, але летапісец паведамляе ў 1052 г. пра смерць яго старэйшага сына Уладзіміра ў Ноўгарадзе, а гаворачы аб скананні Яраслава ў 1054 г., паведамляе: «Изяславу тогда Турове князящю...»[17]. Як відаць, выдзяленне Яраславам княстваў сваім сынам адбылося да 1052 г.

Ізяслаў Яраславіч пасля смерці бацькі застаўся старэйшым сярод братоў і заняў кіеўскі прастол, пакідаючы за сабой і Тураўскае княства. Летапісы адлюстроўваюць яго лёс і дзейнасць як вялікага князя і не паведамляюць аб падзеях у Тураўскім княстве. Як відаць, яно знаходзілася ў цесным саюзе з Кіеўскім княствам і падзяляла лёс свайго уладара. Калі ў 1073 г. Ізяслаў быў выгнаны з Кіева братамі Святаславам Чарнігаўскім і Усеваладам Пераяслаўскім, Кіеў заняў Святаслаў, а Тураў аддаў Усеваладу. Ізяслаў уцёк у Польшчу, а ў 1076 г. пасля смерці Святаслава вярнуўся ў Кіеў, аднак у барацьбе за Валынскае княства быў забіты 3 кастрычніка 1078 г. Летапісец, вельмі расчулены яго смерцю, у вялікім артыкуле ў пахвалу Ізяслава адзначае яго шматлікія дабрачынасці і паведамляе: «плакася о нем весь город Киев...»[18].

Вялікім князем кіеўскім стаў Усевалад Яраславіч, які пакінуў старэйшаму сыну Ізяслава, Яраполку,— Тураўскае, Уладзіміру — Валынскае княствы, а малодшаму, Святаполку,— Наўгародскае. Яраполк вёў доўгую і ўпартую барацьбу за Валынскае княства з мясцовымі князямі і кіеўскім князем Усеваладам. Ад апошняга пацярпеў паражэнне і ўцёк у Польшчу. У 1087 г. ён вярнуўся, памірыўся з Усеваладам Кіеўскім, аднак у хуткім часе загінуў ад падасланых забойцаў у барацьбе за Валынскае княства. Тураўскае княства заняў яго брат Святаполк, пакінуўшы за сабой і Наўгародскае. Ён быў жанаты на візантыйскай царэўне Варвары, якая прывезла з сабой адукаваных царкоўных служыцеляў і дзеячоў культуры і адкрыла ў Тураве жаночы Варварынскі манастыр.

У 1093 г. памёр вялікі князь кіеўскі Усевалад Яраславіч. Тураўскі князь Святаполк, як сын Ізяслава, старэйшага сына Яраслава, заняў кіеўскі прастол. Святаполк разам з Уладзімірам Усеваладавічам Манамахам шмат зрабілі для ўмацавання Русі, паспяхова абараняліся ад прычарнаморскіх стэпавых вандроўнікаў — полаўцаў, правялі вядомы з'езд рускіх князёў у Любечы (1097 г.), які выпрацаваў асноўны прынцып наследаванняў княстваў — «Кожны валодае сваёй вотчынай...»[19]. Згодна пастанове з'езду, Святаполк, як князь Тураўскі, атрымліваў вялізную тэрыторыю «...об оне стороне Припети» з гарадамі Туравам, Пінскам, Бярэсцем, а таксама Пагарынню, а як вялікі князь кіеўскі — Кіеўскае княства і Наўгародскую зямлю да яго. Дзейнасць Святаполка ў якасці вялікага князя кіеўскага добра адлюстравана ў летапісе, а дзейнасць як князя тураўскага засталася ў цяню. Вядома толькі, што ў Кіеў ён прывёз з сабой сваю тураўскую «дружыну», «маладую», «новую», чым пакрыўджаны кіеўскі летапісец за старую кіеўскую дружыну. Вядомы гісторык В. Н. Таціщчаў прыводзіць цікавую характарыстыку Святаполка: «Сей князь великий был ростом высок, сух, волосы черноваты и прями, борода долгая, зрение острое. Читатель был книг и вельми памятен, за многое бо лета бывше мог сказать, яко написанное. Болезней же ради мало ел и весьма редко и то по нужде для других упился. К войне не был охотник, и хотя на кого скоро осердился, но скоро и запамятовал. При том был вельми сребролюбив и скуп... многи христиане торгу и ремесла лишились...»[20].

Святаполк Ізяславіч памёр у 1113 г. Яго сын Мсціслаў актыўна ўдзельнічаў у барацьбе за Валынскае княства, а ў 1097 г. быў пасаджаны на Уладзімірскае княства, абараняючы якое, загінуў у 1099 г. Другі сын Святаполка, Яраслаў, у 1102 г. па загаду бацькі паланіў стрыечнага брата Яраслава Яраполчыча, які імкнуўся асесці ў Бярэсці. У 1112 г. Яраслаў хадзіў на яцвягаў і перамог іх. Калі пасля смерці бацькі кіеўскі прастол заняў Уладзімір Усеваладавіч Манамах, Яраслаў Святаполчыч, пераканаўшыся ў яго намеры перадаць Кіеўскае і Тураўскае княствы Мсціславу Уладзіміравічу, уздымаецца на барацьбу з Уладзімірам Манамахам, губляе Уладзімір, бяжыць у Венгрыю, у 1123 г. вяртаецца з вялізным войскам, абкладвае Уладзімір, але гіне ад рук падасланых забойцаў[21].

Так скончыўся другі перыяд у гісторыі Тураўскага княства — перыяд знаходжання ў руках Яраслава Уладзіміравіча, яго сына Ізяслава і нашчадкаў Ізяславічаў. Для Тураўскага княства ў гэты час характэрны захаванне самастойнасці, спадчыннай княскай дынастыі, вялікае значэнне сярод іншых княстваў у старажытнай Русі.

* * *

Пасля смерці Святаполка кіеўскі вялікакняжацкі прастол заняў Уладзімір Усеваладавіч Манамах, які пакінуў за сабой і Тураўскае княства. У 1125 г., пасля смерці Уладзіміра Манамаха, кіеўскі прастол заняў яго сын Мсціслаў Уладзіміравіч, а на Тураўскі прастол, пакінуўшы Смаленскае княства, перайшоў трэці па старшынству сын Уладзіміра Манамаха Вячаслаў Уладзіміравіч. У далейшым ён пераходзіў на пераяслаўскі прастол і вяртаўся на тураўскі (1133, 1134 гг.), займаў кіеўскі прастол (1139 г.) і саступаў яго Усеваладу Ольгавічу чарнігаўскаму (1142 г.). З заняццем тураўскага прастола Усеваладам Ольгавічам у гісторыі Тураўскага княства

наступае кароткі, але драматычны перыяд яго пастаянных перадач і драблення для задавальнення інтарэсаў саюзнікаў ці праціўнікаў вялікага князя. У 1142 г. Усевалад Ольгавіч прымушаны даць братам «...Игореви Городечь, Юргови Рогачев, а Святославу Клеческ и Черторыеск...», а стрыечным братам Уладзіміру і Ізяславу Давыдавічам «...да Берестий, Дорогичин и Вщиж и Ормину»[22]. Пасля смерці Усевалада Ольгавіча 1 жніўня 1146 г. на кіеўскі прастол кіеўляне запрасілі Ізяслава Мсціславіча, унука Уладзіміра Манамаха. Гэта выкарыстаў яго дзядзька Вячаслаў Уладзіміравіч, ён вярнуўся ў Тураў і вярнуў Тураўскаму княству гарады, разданыя ў 1142 г. Усеваладам Ольгавічам. Незадаволены самавольствам дзядзькі, Ізяслаў Мсціславіч у той жа год пасылае на Тураў свайго брата Расціслава і Святаслава Усеваладавіча, якія занялі горад, узялі ў палон епіскапа тураўскага Акіма і пасадніка Жыраслава Яванкавіча, якія, як відаць, былі прыбліжанымі стараннікамі Вячаслава Уладзіміравіча. Апошні быў пераведзены ў Перасопніцу, а Тураў аддадзены Яраславу, сыну Ізяслава Мсціславіча. У 1149 г. гарады Тураўскага княства Слуцк і Клецк былі заняты Святаславам Ольгавічам, князем Ноўгарад-Северскім, саюзнікам Юрыя Уладзіміравіча Даўгарукага, які ўключыўся ў барацьбу за кіеўскі прастол і заняў яго.

У 50-я гады на кіеўскім прастоле адбываецца хуткая змена прадстаўнікоў двух асноўных дынастый — Манамашычаў і чарнігаўскіх Святаславічаў. У 1155 г. Кіеў зноў займае Юрый Уладзіміравіч Манамашыч (Даўгарукі), які аддае Тураў свайму сыну Барысу. У 1158 г. Юрый Уладзіміравіч памёр, на кіеўскі прастол вярнуўся Ізяслаў Давыдавіч чарнігаўскі.

1158 г.— паваротны ў гісторыі Турава. У гэты год адбыліся падзеі, якія змянілі становішча Тураўскага княства, што склалася на гэты час. Аб гэтых падзеях ёсць змястоўны расказ у летапісе: «Том же лете иде Изяслав на Ярославича к Турову и с ним иде Ярослав из Лучьска, и Андреевич Ярополк и Галичьская помочь, и Ростиславичь Рюрик с Смолняны, и Владимир Мстиславич, тому бо искаху Турова, и Полчане, пришедшие к Турову пожгоша села около его, и воеваша Берендичи около Пиньска и за Припетью, и бьяхуться крепко, выходячи из города и много бываше язвеных, и многу молбу створиваше Гюрги Ярославичь высылая из города к Изяславу, река, брате прими мя в любовь к собе. Изяслав же того не всхоте, но всяко хотяше под ним взяти Туров и Пинск. И стояше около города недель 10. И быть мор в коних. И тако не успевше ему ничтоже взвратишася в свояси не створивше с ним мира»[23].

Гэты запіс патрабуе пэўных тлумачэнняў і ўдакладненняў. Ізяслаў, які ішоў паходам на Тураў і прыцягнуў да ўдзелу ў паходзе іншых князёў і залежных ад Кіева аселых вандроўнікаў (бярэндзічаў) — гэта вялікі князь кіеўскі Ізяслаў Давыдавіч, раней, у 1155 г., выгнаны з Кіева Юрыем Даўгарукім і вярнуўшыйся ў Кіеў пасля яго смерці; Яраславіч, або Юрый Яраславіч — унук Святаполка Ізяславіча, князя тураўскага і кіеўскага, а таксама сын Яраслава Святаполчыча, які загінуў у 1123 г. пад г. Уладзімірам ад рук падасланых забойцаў, прыйшоўшы з вялікім венгерскім войскам, каб забраць бацькоўскае Тураўскае княства і свае правы на кіеўскі прастол. Аб асабістых валоданнях Юрыя Яраславіча летапісец не паведамляе. Вядома, што ў 1149—1154 гг. ён як бліжэйшы і ўплывовы дарадчык Юрыя Уладзіміравіча Манамаха быў служылым

князем, не меўшым сваёй зямлі і княства. Невядома, калі ён захапіў Тураў. Хутчэй за ўсё, гэта адбылося пасля смерці кіеўскага князя Юрыя Уладзіміравіча Манамаха, калі наступны кіеўскі князь Ізяслаў Давыдавіч быў заняты справамі свайго зацверджання на кіеўскім прастоле, а тураўскі князь (з 1155 г.) Барыс Юр'евіч выехаў у Кіеў на пахаванне свайго бацькі Юрыя Уладзіміравіча. Як можна меркаваць, Юрый Яраславіч выбраў вельмі зручны час для аднаўлення на тураўскім прастоле дынастыі Ізяславічаў.

Звярнуць трэба ўвагу і на тое, што ў гэтым запісе Тураў упершыню і неаднаразова названы горадам, што значыць быў агароджаны абарончымі збудаваннямі. Як відаць, яны былі надзвычай моцнымі, таму што не паддаліся намаганням моцнага аб'яднанага войска шасці князёў на чале з кіеўскім і прымусілі іх да нябачнай па працягласці ў гісторыі Старажытнай Русі аблогі (10 тыдняў). Трэба адзначыць і надзвычай жорсткі характар баявых дзеянняў («бьяхуться крепко»), калі «многа язвеных (параненых) бываше», і актыўны характар абароны, ужываўшай вылазкі — «выходячи из города». Несумненна, стойкая абарона ад магутнага войска і доўгай аблогі магла быць арганізавана Юрыем Яраславічам толькі пры гарачай падтрымцы тураўцаў, якім, як відаць, надакучылі хуткія змены на тураўскім прастоле часовых валадароў, што клапаціліся больш аб сваіх інтарэсах, чым дбалі аб мясцовым насельніцтве. Да таго ж у тураўцаў, як відаць, захаваліся добрыя ўспаміны аб княжыўшых тут Ізяславічах, і ім імпанавалі асабістыя якасці Юрыя Яраславіча, разумнага дарадчыка, умелага дыпламата, мужнага і вопытнага военачальніка.

Спалучэнне інтарэсаў тураўцаў і Юрыя Яраславіча прывяло да безвыніковасці аблогі, і кіеўскі князь с саюзнікамі «...не успевши ему ничтоже взвратишася в свояси...» На тураўскім прастоле была адноўлена дынастыя Ізяславічаў, Тураўскае княства зноў набыло самастойнасць і незалежнасць.

Падзеі 1158 г. замыкаюць трэці перыяд у гісторыі Тураўскай зямлі і пачынаюць наступны перыяд — існаванне незалежнага адноўленага княства з самастойнай устойлівай дынастыяй. Аднак далейшыя паведамленні летапісаў сведчаць, што ранейшага значэння Тураўскае княства ўжо не набыло. На кіеўскім прастоле сядзяць прадстаўнікі іншых дынастый, а вакол Тураўскага княства ўзмацніліся суседнія Чарнігаўскае і Уладзіміра-Валынскае. У гэтых умовах становішча Тураўскага княства стабілізавалася толькі пасля таго, як узімку 1160 г. адбыўся другі беспаспяховы паход на Тураў пяці князёў, што стаялі аблогай тры тыдні і «...не вспевше ему ничтоже взвратишася в свояси»[24]. Толькі ў 1162 г. «...створи мир Ростислав (вялікі князь кіеўскі — П. Л.) с Гюргем с Ярославичем»[25], што азначала канец працяглай барацьбы за аднаўленне самастойнасці Тураўскага княства і юрыдычнае афіцыйнае прызнанне яго.

Далейшы лёс Юрыя Яраславіча невядомы. У летапісах больш няма паведамленняў, звязаных з яго імем. Відаць, дамогшыся галоўнай мэты — аднаўлення Тураўскага княства і дынастыі Ізяславічаў на тураўскім прастоле, ён прымаў актыўны ўдзел у агульнарускіх справах. Як можна меркаваць, працягваў заставацца на тураўскім прастоле, бо пазней летапісец успамінае яго сыноў, што атрымалі надзелы на зямлі Тураўскага княства. Час падзелу Тураўскай зямлі на асобныя княствы невядомы, таксама як і час смерці Юрыя Яраславіча. Аднак ужо ў 1162 г., затым у 1190 г. летапісец

успамінае Святаполка Гюргевіча тураўскага. Пад 1168 г. успамінаецца «Глеб Юрьевич ис Турова», але без тытула тураўскі, які з'явіўся ў Кіеў па загаду кіеўскага князя Расціслава. У 1183 г. ён удзельнічаў у паходзе Святаслава Усеваладавіча на полаўцаў, а ў 1187 г. як родзіч кіеўскага князя Рурыка Расціславіча ездзіў у Суздаль за нявестай яго сына. Сярод удзельнікаў паходу 1183 г. названы таксама «...Ярослав, князь Пиньский». У зборы князёў у Кіеве, што праводзіў у 1170 г. Мсціслаў Ізяславіч, успамінаецца «...Гюргевич Иван ис Турова». У 1190 г. летапісец успамінае, што «в Пинески» адбылася «Ярополча свадба».

Такім чынам, з летапісу вядома, што ў тураўскага князя Юрыя Яраславіча было пяць сыноў: Святаполк, Глеб, Іван, Яраслаў і Яраполк. З тытулам тураўскі названы Святаполк (1162, 1190 гг.), Глеб (1195 г.), Иван (1170 г.). з дадаткам «ис Турова». Князем пінскім названы Яраслаў (1183 г.). У Пінску ў 1190 г. адбываецца «Ярополча свадба», магчыма, ужо пінскага князя. Глеб Юр'евіч у 1183 г. названы як князь дубровіцкі. Такім чынам, на падставе гэтых летапісных успамінаў можна ўстанавіць, што Тураўскае княства падзялялася паміж сынамі Юрыя Яраславіча на княствы Тураўскае, Пінскае і Дубровіцкае.

Час падзелу Тураўскага княства ў летапісе не прыводзіцца. Можна меркаваць, што ён адбыўся пасля смерці Юрыя Яраславіча. Вядома, што ў 1167 г. ён быў яшчэ жывы і аддаваў замуж сваю дачку Малфрыд за Усевалада, сына Яраслава Ізяславіча. А ўжо ў падзеях 1174 г. тураўскія і пінскія князі названы паасобку. Такім чынам, падзел Тураўскай зямлі хутчэй за ўсё адбыўся пасля смерці Юрыя Яраславіча недзе паміж 1167 і 1174 гг.

Летапіс не паведамляе аб якіх-небудзь падзеях на Тураўскай зямлі ў другой палове XII ст. Як можна меркаваць, Юрый Яраславіч і яго сыны не ўдзельнічалі ў феадальных звадах, не вялі міжусобных войнаў паміж сабой і з суседзямі, як відаць, яны прытрымліваліся добрасуседскіх адносін і жылі ў дружбе паміж сабою. Гэта гаворыць аб іх міралюбівым характары, разуменні неабходнасці міру з суседзямі, дыпламатычным майстэрстве паводзін у складаных феадальных адносінах. Такая палітыка была неабходнай для забеспячэння самастойнасці Тураўскага княства, захавання на яго прастоле нашчадкаў Юрыя Яраславіча.

Гісторыя Тураўскага княства ў XIII ст. слаба адлюстравана ў старажытных летапісах. Па сутнасці, у іх няма звестак аб гістарычных падзеях, якія адбываліся на гэтай тэрыторыі. У летапісе знаходзім толькі асобныя ўспаміны аб князях Тураўскай зямлі, што прымалі ўдзел у падзеях агульнарускага характару. У 1204 г. яны пад агульнай назвай «Ис Турова Святополчичи» успамінаюцца як удзельнікі паходу на полаўцаў. Пад 1207 г. ёсць звесткі аб князях з Турава і Пінска — у запісах аб падзеях, звязаных з барацьбой за кіеўскі вялікакняжацкі прастол. У 1243 г. успамінаюцца тураўскія і пінскія князі, што прымалі ўдзел у паходзе на літоўскага князя Тройдэна. У 1274 г. названы «князи Туровские» — удзельнікі паходу на Літву.

Крыху часцей успамінаюцца пінскія князі. У падзеях 1204 г. названы Уладзімір пінскі. У 1229 г. ён па даручэнні галіцкага князя Данілы і яго брата валынскага князя Васільке Раманавіча абараняе Бярэсце ў час іх паходу на Польшчу. Пад 1228 г. летапіс называе пінскага князя Расціслава, які скардзіцца на захоп у Чартарыйску яго сыноў, як відаць, Данілам галіцкім. У

1262 г. пінскія князі Фёдар, Дзямід і Юрый удзельнічалі ва ўрачыстасцях з выпадку перамогі валынскага князя Васілька над літоўцамі пад Нобелем. У 1292 г. летапіс прыводзіць звесткі аб смерці пінскага князя Юрыя Уладзіміравіча, што дазваляе пабудаваць прыкладны генеалагічны рад нашчадкаў Юрыя Яраславіча на пінскім княстве — яго сыны Яраслаў (1183), Яраполк (1190), потым Уладзімір пінскі (1204, 1229), Расціслаў (1228), князі Фёдар, Дзямід, Юрый (1262), магчыма, сыны Уладзіміра (ці Расціслава ?), а ў канцы XIII ст.— Юрый Уладзіміравіч. З прыведзеных звестак відаць, што ў XIII ст. тураўскія і пінскія князі прымаюць удзел у агульнарускіх падзеях, падтрымліваючы прэтэндэнтаў у барацьбе за кіеўскі вялікакняжацкі прастол, у паходах на Літву ці адбіцці літоўскіх нашэсцяў. Увесь гэты час яны не праводзяць самастойнай палітыкі, а ўдзельнічаюць у мерапрыемствах больш магутных суседзяў — вялікіх князёў кіеўскіх і уладзімір-валынскіх.

У час мангола-татарскага нашэсця асноўны напрамак войскаў Батыя прайшоў на поўдзень ад Тураўскай зямлі. Летапіс не называе тураўскіх гарадоў сярод разбураных ці знішчаных у час гэтага нашэсця. Але няма і поўнага спісу загінуўшых гарадоў, толькі агульнае паведамленне «и инии мнозие». Магчыма, сюды трапілі і некаторыя гарады Тураўскай зямлі.

Страшэнны разгром старажытнарускіх княстваў у час мангола-татарскага нашэсця ў сярэдзіне XIII ст., несумненна, адмоўна адбіўся на іх здольнасці адстаяць сваю незалежнасць і самастойнасць. Заслоненае старажытнарускімі княствамі ад мангола-татарскага нашэсця, у гэты час узмацняецца на паўночным захадзе ад Тураўскай зямлі Літоўскае княства. Аслабленыя княствы на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Украіны рознымі шляхамі паступова трапілі ў залежнасць ад яго. Тураўскія землі былі ўключаны ў склад Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIII — пачатку XIV стст. пры Віцені (1293—1316) і Гедыміне (1316—1341). У гісторыі Тураўскай зямлі пачынаецца новы перыяд.

* * *

Гісторыя Тураўскай зямлі будзе не поўнай, калі засярэдзіцца толькі на падзеях палітычнага характару і абысці пытанні эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця. Перш за ўсё трэба адзначыць, што па эканамічным развіцці, сацыяльным ладзе і культурных дасягненнях Тураўская зямля знаходзілася на тым узроўні, што і астатнія старажытнарускія княствы раннефеадальнага часу.

Аснову эканомікі Тураўскай зямлі, як і ўсюды ў той час, складала сельская гаспадарка. Звыш 90 % насельніцтва Тураўскай зямлі жыло ў сельскай мясцовасці і асноўным заняткам яго было земляробства. Археалагічныя раскопкі гарадоў сведчаць, што земляробства было вельмі пашыраным заняткам і гарадскога насельніцтва. У час раскопак знойдзены шматлікія прылады апрацоўкі зямлі (жалезныя наканечнікі сохаў і рал, драўляныя ралы і рыдлёўкі), уборкі ўраджаю (сярпы, косы), пераапрацоўкі ўраджаю (каменныя жорны, драўляныя нажныя ступы і таўкачы, трапачкі для апрацоўкі ільну). Пры расчыстцы зямлі пад пасевы ад лесу выкарыстоўвалі сякеры, пры абмалоце зерневых культур — розныя калатушкі, пры нарыхтоўцы кармоў на зіму для хатняй жывёлы — граблі і драўляныя вілы.

У культурных пластах розных археалагічных помнікаў сустракаюцца рэшткі зерневых культур. На

1262 г. пінскія князі Фёдар, Дзямід і Юрый удзельнічалі ва ўрачыстасцях з выпадку перамогі валынскага князя Васілька над літоўцамі пад Нобелем. У 1292 г. летапіс прыводзіць звесткі аб смерці пінскага князя Юрыя Уладзіміравіча, што дазваляе пабудаваць прыкладны генеалагічны рад нашчадкаў Юрыя Яраславіча на пінскім княстве — яго сыны Яраслаў (1183), Яраполк (1190), потым Уладзімір пінскі (1204, 1229), Расціслаў (1228), князі Фёдар, Дзямід, Юрый (1262), магчыма, сыны Уладзіміра (ці Расціслава ?), а ў канцы XIII ст.— Юрый Уладзіміравіч. З прыведзеных звестак відаць, што ў XIII ст. тураўскія і пінскія князі прымаюць удзел у агульнарускіх падзеях, падтрымліваючы прэтэндэнтаў у барацьбе за кіеўскі вялікакняжацкі прастол, у паходах на Літву ці адбіцці літоўскіх нашэсцяў. Увесь гэты час яны не праводзяць самастойнай палітыкі, а ўдзельнічаюць у мерапрыемствах больш магутных суседзяў — вялікіх князёў кіеўскіх і уладзімір-валынскіх.

У час мангола-татарскага нашэсця асноўны напрамак войскаў Батыя прайшоў на поўдзень ад Тураўскай зямлі. Летапіс не называе тураўскіх гарадоў сярод разбураных ці знішчаных у час гэтага нашэсця. Але няма і поўнага спісу загінуўшых гарадоў, толькі агульнае паведамленне «и инии мнозие». Магчыма, сюды трапілі і некаторыя гарады Тураўскай зямлі.

Страшэнны разгром старажытнарускіх княстваў у час мангола-татарскага нашэсця ў сярэдзіне XIII ст., несумненна, адмоўна адбіўся на іх здольнасці адстаяць сваю незалежнасць і самастойнасць. Заслоненае старажытнарускімі княствамі ад мангола-татарскага нашэсця, у гэты час узмацняецца на паўночным захадзе ад Тураўскай зямлі Літоўскае княства. Аслабленыя княствы на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Украіны рознымі шляхамі паступова трапілі ў залежнасць ад яго. Тураўскія землі былі ўключаны ў склад Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIII — пачатку XIV стст. пры Віцені (1293—1316) і Гедыміне (1316—1341). У гісторыі Тураўскай зямлі пачынаецца новы перыяд.

* * *

Гісторыя Тураўскай зямлі будзе не поўнай, калі засярэдзіцца толькі на падзеях палітычнага характару і абысці пытанні эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця. Перш за ўсё трэба адзначыць, што па эканамічным развіцці, сацыяльным ладзе і культурных дасягненнях Тураўская зямля знаходзілася на тым узроўні, што і астатнія старажытнарускія княствы раннефеадальнага часу.

Аснову эканомікі Тураўскай зямлі, як і ўсюды ў той час, складала сельская гаспадарка. Звыш 90 % насельніцтва Тураўскай зямлі жыло ў сельскай мясцовасці і асноўным заняткам яго было земляробства. Археалагічныя раскопкі гарадоў сведчаць, што земляробства было вельмі пашыраным заняткам і гарадскога насельніцтва. У час раскопак знойдзены шматлікія прылады апрацоўкі зямлі (жалезныя наканечнікі сохаў і рал, драўляныя ралы і рыдлёўкі), уборкі ўраджаю (сярпы, косы), пераапрацоўкі ўраджаю (каменныя жорны, драўляныя нажныя ступы і таўкачы, трапачкі для апрацоўкі ільну). Пры расчыстцы зямлі пад пасевы ад лесу выкарыстоўвалі сякеры, пры абмалоце зерневых культур — розныя калатушкі, пры нарыхтоўцы кармоў на зіму для хатняй жывёлы — граблі і драўляныя вілы.

У культурных пластах розных археалагічных помнікаў сустракаюцца рэшткі зерневых культур. На

падставе гэтых знаходак можна меркаваць, што насельніцтва Тураўскай зямлі вырошчвала жыта, пшаніцу, ячмень, авёс, гарох, сачавіцу, проса, лён, каноплі. Асноўнай сістэмай земляробства было двухполле і трохполле, калі частка апрацаванай зямлі заставалася «адпачываць» пад парам. Ужывалася таксама пры падрыхтоўцы новых палёў падсечнае земляробства, калі высякалі і выпальвалі ўчасткі лесу або застарэлы хмызняк на пакінутых на пэўны час асвоеных палях пры пералогу. Урадлівасць зерневых культур была адносна невысокай, прыкладна 5—6 ц з 1 га.

Другой важнай галіной сельскагаспадарчай дзейнасці была жывёлагадоўля. Косткі дамашніх жывёлін у раскопках складаюць каля 80 працэнтаў. Найбольш распаўсюджана была буйная рагатая жывёла, менш — свінні, дробная рагатая жывёла (авечкі, козы), коні, сабакі. Па сваіх памерах яны былі больш дробнымі, чым сучасныя.

Важнейшае месца ў гаспадарчай дзейнасці насельніцтва займала рамесная вытворчасць. Найбольш важным і неабходным яе відам былі выраб і апрацоўка жалеза — асноўнага матэрыялу, з якога рабілі розныя прылады працы, зброю, шматлікія і разнастайныя прадметы штодзённага ўжытку. Высакаякасныя вырабы, як правіла, выраблялі гарадскія рамеснікі, якія валодалі высокім тэхналагічным і складаным майстэрствам апрацоўкі. Больш простыя вырабы былі даступны для сельскіх кавалёў. Гарадскія і сельскія кавалі атрымлівалі метал у выглядзе крыц (зліткаў) ад сельскіх металургаў, якія мелі металургічныя печы-домніцы недалёка ад месцаражджэння дзярновых, балотных або азёрных жалезных руд і недалёка ад лесу. У лесе атрымлівалі неабходны для «варкі» жалеза вугаль. Цестападобная маса адноўленага металу сцякала на дно домніцы, адкуль яе вымалі пасля заканчэння працэсу, пракоўвалі для адціскання шлакаў і ў выглядзе ляпёшкападобнай крыцы пастаўлялі кавалям-рамеснікам. Кавалі прымянялі розныя тэхналагічныя прыёмы ў высакаякаснай апрацоўцы металу — выраб сталі метадам навуглярождвання крычнага жалеза, наварку стальнога ляза на жалезную аснову, закалку, закалку з водпускам, рэзку, пайку, зварку, пакрыццё палудай, розныя спосабы слясарнай апрацоўкі.

На Тураўскай зямлі было развіта таксама ювелірнае рамяство. Ювеліры-рамеснікі выраблялі дротавыя і пласцінчатыя пярсцёнкі і бранзалеты, адлівалі гузікі, каралі. Аб мясцовым характары ювелірнай вытворчасці сведчаць знаходкі тыгелькоў для плаўлення металу, льячак для яго разліву, каменных ліцейных формачак, ювелірных пінцэтаў.

На прафесійным узроўні выраблены касцяныя рэчы — рукаяткі, накладкі, муфты, гузікі. Асобныя з гэтых вырабаў дасягаюць высокамастацкага ўзроўню. Аднак большасць касцяных вырабаў (праколкі, рукаяці, накладкі) маглі быць выраблены ў хатніх умовах. Пры апрацоўцы касцяных вырабаў ужывалі нажы, пілы, сякеры, напільнікі і нават такарныя станкі.

Шырока былі распаўсюджаны ў Тураве апрацоўка скуры і выраб розных рэчаў з яе. У раскопах нярэдка сустракаюцца пласты абзоленай поўсці і кары, што застаюцца пры апрацоўцы скуры. Шмат рэшткаў скуранога абутку — поршняў, туфляў, ботаў, сустракаюцца скураныя рукавіцы, аплікацыі, дзіцячыя мячы, ножны, кашалькі, футаралы. Знойдзены драўляныя калодкі, якія ўжываліся пры вырабе абутку, шылы.

Вельмі пашыраным матэрыялам для вырабу прадметаў хатняга

ўжытку была гліна. З яе выраблялі кухонны (гаршкі, патэльні) і сталовы посуд (міскі, кубкі, збаны, макотры і г. д.). З гліны фармавалі цэглу, рабілі печы. Аднак найбольш складаныя вырабы выходзілі з рук рамеснікаў (бандарны і тачоны посуд, грабяні і г. д.).

У гаспадарчай дзейнасці насельніцтва Тураўскай зямлі значную ролю адыгрывалі паляванне, рыбалоўства, бортніцтва і хатнія промыслы. Косткі дзікіх жывёлін у матэрыялах раскопак складаюць каля 20 % ад агульнай колькасці — лася, аленя, дзіка, зубра. Значна менш костак драпежных жывёлін (мядзведзь, воўк), футравых (бабёр, куніца, лісіца). У раскопках нямала сустракаецца прылад рыбалоўства (кручкі, блешні, восці, гліняныя і свінцовыя грузілы і г. д.), а таксама костак і лускі рыб — асятроў, шчупакоў, самоў, ляшчоў, акунёў, судакоў, плотак і інш. Часам уражваюць вельмі буйныя памеры костак і лускі.

Насельніцтва Тураўскай зямлі займалася таксама і хатнімі штодзённымі промысламі — прадзеннем і ткацтвам. У раскопках шмат знойдзена верацён і праслікаў, рэшткаў гарызантальных ткацкіх станкоў, шарсцяной і камбінаванай тканіны, лямцу і вырабаў з яго, вязаных іголкай рукавіц і пальчатак. Тканіны часта афарбоўваліся ў чырвоны, жоўты, зялёны, карычневы колеры натуральнымі раслінными ці мінеральнымі фарбавальнікамі.

Значную ролю ў гаспадарцы Тураўскай зямлі адыгрываў мясцовы і транзітны гандаль. Каб аплачваць падаткі ці купляць высакаякасныя прылады ў гарадскіх рамеснікаў, сельскае насельніцтва вымушана было прадаваць частку прадуктаў сваёй вытворчасці. Гандлёвымі сувязямі Тураўская зямля была звязана і з больш аддаленымі землямі. З суседняй тэрыторыі драўлян прывозілі праслікі (грузікі для верацёнаў) з так званага валынскага шыферу — мяккага слаістага сланцу ружовага колеру. З Кіева дастаўлялі шкляныя рознакаляровыя бранзалеты, каралі, шкляны сталовы посуд, з Прычарнамор'я — віно і аліўкавы алей у вялікіх гліняных пасудзінах — амфарах, з Прыбалтыкі — бурштын і асобныя металічныя ўпрыгажэнні. Асабліва ўражвае вялікая колькасць фрагментаў рознакаляровага і распіснога шкляного посуду з візантыйскіх і бліжнеўсходніх майстэрняў. Як вельмі рэдкую знаходку трэба адзначыць вялікія шыферныя пахавальныя саркафагі, знойдзеныя ў Тураве. Несумненна, прывознага паходжання каляровы метал, які ўжывалі мясцовыя ювеліры, а таксама высокамастацкія і каштоўныя рэчы з розных матэрыялаў. З Тураўскай зямлі вывозілі прадметы звычайнага славянскага экспарту — мёд, воск, футра.

У час існавання Тураўскага княства значна ўскладнілася сацыяльная структура грамадства. Замест сялян-абшчыннікаў і родавай старэйшыны пры існаванні першабытнага ладу ў княжанні дрыгавічоў узнікаў феадальны лад на чале з князем і яго акружэннем. У яго структуру ўваходзілі пасаднік, які замяшчаў князя і ўзначальваў мясцовую адміністрацыю ў час яго працяглай адсутнасці, баяры і дружына, прадстаўнікі княжацкай адміністрацыі, агнішчанін, цівун, ралейны староста. Асноўную частку насельніцтва складалі вольныя сяляне-абшчыннікі. Аднак паступова павялічвалася група феадальна-залежнага насельніцтва — радовічы, закупы, чэлядзь, халопы. Узрастае маёмасная няроўнасць, сацыяльная дыферэнцыяцыя.

Існавала ў Тураве веча, гараджане мелі права голасу ў вырашэнні сур'ёзных пытанняў. Кірыла Тураўскі, як вядома з яго жыція, стаў

епіскапам тураўскім па просьбе князя «і людзей горада». Звычайна епіскап прызначаўся кіеўскім мітрапалітам пасля ўзгаднення з князем.

Ганаровай і адказнай была пасада тысяцкага, які ўзначальваў гарадскі полк (апалчэнне). Тураўскі тысяцкі Іванка ўдзельнічаў у паходзе ў 1127 г. на Полацкую зямлю з воінамі, якія названы ў летапісе «отракамі». У 1146 г. кіеўскі князь Ізяслаў паслаў супраць Вячаслава свайго брата і пляменніка з войскам, яны адабралі Тураў у Вячаслава, схапілі епіскапа Іакіма і пасадніка Жыраслава. Баярын Жыраслаў, сын тураўскага тысяцкага Іванкі, у свой час быў вядомы далёка за межамі Тураўскага княства, быў пасаднікам у Ноўгарадзе.

Хуткаму развіццю культуры спрыяла прыняцце ў 988 г. хрысціянства і яго шпаркае распаўсюджванне на Кіеўскай Русі, а разам з ім — пісьменнасці, манументальнага царкоўнага дойлідства, стварэнне мясцовых пісьмовых твораў, царкоўнай музыкі і харавых спеваў. У Тураве была заснавана адно з першых епіскапстваў у Старажытнай Русі, што яшчэ раз падкрэслівае яго важнае значэнне[26]. Распаўсюджанне хрысціянства на Тураўскай зямлі суправаджалася будаўніцтвам цэркваў і адкрыццём манастыроў. Ёсць звесткі аб тым, што жонка Святаполка Ізяславіча Варвара заснавала ў Тураве жаночы Варварынскі манастыр[27]. «Сказание о Мартинемнихе» апавядае аб падзеях, якія быццам бы адбываліся ў Тураве ў мужчынскім манастыры[28].

Адна з найбольш яркіх і высокіх праяў развіцця культуры звязана з пачаткам і развіццём манументальнага дойлідства. Часцей за ўсё гэта былі пабудовы царкоўнага прызначэння. Рэшткі буйнога трохнефнага трохапсіднага храма XII ст. раскапаны ў Тураве ў час археалагічных даследаванняў у 1963 г.[29] Час будаўніцтва храма (другая палова XII ст.) супадае з аднаўленнем на тураўскім прастоле патомкаў наследнай дынастыі Ізяславічаў і з часам епіскапства славутага дзеяча старажытнарускай праваслаўнай царквы Кірылы Тураўскага. Гэты храм па архітэктурнай кампазіцыі вельмі блізкі да храмаў Кіеўскай і Уладзімірскай архітэктуры, аднак мае рысы несумненнай архітэктурнай своеасаблівасці. Толькі адсутнасць на сённяшні дзень аналагічных храмаў не дазваляе гаварыць аб існаванні самастойнай тураўскай архітэктурнай школы.

Трэба адзначыць адносную беднасць збудаваннямі манументальнай архітэктуры гарадоў Тураўскай зямлі ў параўнанні з Кіевам, Ноўгарадам, Чарнігавам, Полацкам, Смаленскам. Адмоўную ролю ў гэтым адыгралі частыя пераходы тураўскіх князёў на кіеўскі вялікакняжацкі прастол. Пераходзячы ў Кіеў, яны там будавалі прыгожыя храмы і засноўвалі манастыры. Ізяслаў Яраславіч, напрыклад, побач са старажытным горадам часоў Яраслава заснаваў Дзімітраўскі манастыр з храмам, а яго сын Яраполк Ізяславіч пабудаваў у гэтым манастыры царкву ў імя святога Пятра. Другі сын Ізяслава Святаполк у тым жа манастыры пабудаваў багаты і прыгожы храм у імя св. Міхаіла з пазалочанымі купаламі. З летапісу вядома, што ў Кіеве існавала таксама старадаўняя Турава бажніца на Падоле, якая, паводле падання, была пабудавана князем Турам, легендарным заснавальнікам Турава.

Сведчаннем высокага ўзроўню культуры з'яўляецца шырокае распаўсюджанне пісьменнасці, узнікненне мясцовых цэнтраў навучання і мясцовага летапісання, стварэнне мясцовых паданняў і пісьмовых твораў. У 1866 г. у Тураве ў Спаса-Прэабражэнскай царкве выяўлены рэшткі Евангелля XI ст., пісанага

старажытным уставам на пергаменце. Гэтая знаходка аднаго са старэйшых твораў на Русі сведчыць аб раннім распаўсюджанні ў Тураве пісьменнасці. Магчыма, тут, у сталіцы аднаго з важнейшых княстваў, а таксама епархіі, склаўся цэнтр старажытнай культуры і пісьменнасці. Можна меркаваць, што жонка Святаполка Ізяславіча грачанка Варвара прыбыла ў Тураў разам са сваім акружэннем — адукаванымі прыбліжанымі, што садзейнічала павышэнню культурнага ўзроўню насельніцтва горада. Варта ўспомніць, што сам Святаполк Ізяславіч, згодна летапіснай характарыстыцы, «...читатель был книг и вельми памятен, за многое бо лета бывшее мог сказать, яко написанное». Трэба нагадаць, што яшчэ ў дзіцячым узросце Святаполк на сцяне Сафіі Кіеўскай пакінуў усхваляванае кранаючае дзіцячае маленне — «Господи помози рабе своей моей маменьке».

Аб пашырэнні пісьменнасці ў Тураве сведчаць таксама знаходкі завостраных металічных сцержанькоў — пісал з лапатачкамі на канцы. Вострым канцом такога пісала пісалі па тонкім слаі воску, нанесенага на дошчачку-цэру, а лапатачкай сціралі непатрэбны запіс.

Аднак, несумненна, самым пераканаўчым сведчаннем высокага ўзроўню развіцця культуры на Тураўскай зямлі з'яўляецца жыццё і шматгадовая дзейнасць Кірылы Тураўскага, епіскапа і выдатнага царкоўнага дзеяча, асветніка і прамоўцы, пісьменніка і паэта. Такога ўзроўню і маштабу творчая асоба магла вырасці і скласціся толькі ва ўмовах высокакультурнага асяроддзя.

П. Ф. Лысенка

1. Повесть временных лет (далей ПВЛ). М.—Л. 1950, ч. I.
2. *Спицин А. А.* Расселение восточнославянских племен по археологическим данным. Журнал Министерства народного просвещения. М., 1898. № 8.
3. Полное собрание русских летописей (далее ПСРЛ), т. II. М.— Л., 1962, стб. 5, 8.
4. ПСРЛ, т. II, стб. 10.
5. *Лысенко П. Ф.* Дреговичи.— Мн.: Навука і тэхніка, 1991.
6. ПСРЛ, т. II, М.— Л, 1962, стб. 7.
7. ПСРЛ, стб. 8.
8. История СССР с древнейших времен до наших дней, т. I, М., 1966, с. 482.
9. ПСРЛ.
10. ПВЛ, ч. I, М.— Л. 1950, с. 159.
11. Известия византийских писателей о Северном Причерноморье. М.— Л, 1934, с. 10.
12. ПСРЛ, т. II, стб. 63, 64.
13. *Королюк В. Д.* Западные славяне и Киевская Русь в X—XI вв. М., 1964, с. 217—229.
14. ПВЛ, ч. I, с. 295—296.
15. ПВЛ, ч. I, с. 296.
16. ПВЛ, ч. I, с. 297.
17. ПСРЛ, т. II, стб. 150.
18. ПСРЛ, т. II, стб. 198.
19. ПСРЛ, т. II, стб. 231.
20. *Татищев В. Н.* История Российская, т. II, с. 128.
21. ПСРЛ, т. II, стб. 287.
22. ПСРЛ, т. II, стб. 312.
23. ПСРЛ, т. II, стб. 492.
24. ПСРЛ, т. II, стб. 510.
25. ПСРЛ, т. II, стб. 520.
26. *Голубинский П.* История русской церкви, т. I, М., 1901, с. 334.
27. Творения святого отца нашего Кирилла епископа Туровского. К., 1880, с. 8—10, 47.
28. *Преос. Макарий.* История русской церкви. Киев, 1880, с. 300—301.
29. *Каргер М. К.* Новый памятник зодчества XII в. в Турове. КСИА, вып. 100. М., 1965, с. 131—138.

Святаполк Тураўскі і Баляслаўна

Адной з самых загадкавых фігур у старажытнарускай гісторыі не без падстаў лічыцца тураўскі князь Святаполк, якому народны погалас даў крыўднае прозвішча Акаянны, Каін. Колькі напісана і сказана пра злачынства — сапраўднае ці мнімае, колькі довадаў на карысць князя і супраць яго. І ўсе па-свойму пераканаўчыя, доказныя — колькі людзей, столькі меркаванняў... Аспрэчваецца кожны яго ўчынак, кож-

ная падзея біяграфіі, якая, магчыма, і не вельмі станоўчая, акрамя гісторыі рамантычнага кахання да дачкі польскага караля Баляслава І Храбрага, якое шмат у чым вызначыла жыццёвы лёс Святаполка Тураўскага.

...У 988 г. Уладзімір Кіеўскі хрысціў Русь. Першымі хрысціянамі сталі яго верныя баяры, дружына, былыя жонкі і шматлікія нашчадкі. Адразу пасля гэтага Уладзімір разаслаў сыноў у розныя гарады сваёй дзяржавы на княжанне. Першынец Уладзіміра ад скандынаўкі Аловы да гэтага часу памёр, старэйшым сынам аказаўся Святаполк. Каб далучыць Святаполка да вырашэння дзяржаўных спраў, Уладзімір накіраваў яго ў самы багаты і прэстыжны горад — Тураў. Княжычу было каля дванаццаці гадоў, калі ён разам з надзейным апекуном пакінуў Кіеў. З цягам часу Святаполк не мог не адкрыць для сябе, што шмат у чым багацце і дабрабыт княства залежыць ад таго, у якіх адносінах князь знаходзіцца з суседзямі. Бліжэйшым суседам Святаполка Тураўскага аказалася Польшча. Яе кароль Баляслаў І Храбры быў бы даволі сур'ёзным супраціўнікам у выпадку вайны. Святаполк стаў шукаць дружбы з польскім каралём. Пад час візіту ў Польшчу тураўскі князь убачыў адну з дачок Баляслава.

Вельмі прыглянулася князёўна Святаполку. Так спадабалася, што князь ужо не ўяўляў сабе далейшага жыцця без яе. Ды і Баляслаў нічога не меў супраць такога саюзу з багатым і прэстыжным суседнім княствам.

Невыпадкова разам з нявестай у Тураў прыбыў капелан Рэйнберг, былы біскуп Калабрэжскі. Хітры святар з першага дня стаў прывіваць Святаполку праз яго маладую жонку прапольскія і пракаталіцкія погляды. Баляслаўна аказалася дастаткова ласкавай і пяшчотнай, каб схіліць мужа да сваёй веры. І хутка Святаполк стаў шчырым прыхільнікам каталіцызму. Ён нават не супраць, каб польскія ксяндзы вялі місіянерскую дзейнасць у яго княстве. Святаполк, жонка, яе духоўнік і цесць абмяркоўваюць ужо магчымасць палітычнага адасаблення Тураўскай зямлі ад Кіева...

Верныя людзі даносяць Уладзіміру, што старэйшы сын рыхтуецца здрадзіць... Уладзімір загадвае схапіць Святаполка і Баляслаўну, з-за якой той зусім страціў розум, і разам з Рэйнбергам зняволіць іх у Кіеўскай цямніцы.

Больш года муж і жонка праводзяць за кратамі. Баляслаў патрабуе адпусціць на волю дачку і зяця. Але Уладзімір няўмольны. Толькі пасля смерці Рэйнберга, які ўяўляўся Уладзіміру галоўным вінаўнікам канфлікту з сынам, стары князь згаджаецца выслухаць тлумачэнні Святаполка. Здаецца, яму ўдаецца ўпэўніць бацьку ў тым, што не збіраецца здраджваць. Уладзімір вызваляе Святаполка з Баляслаўнай з-пад стражы, паставіўшы ўмовай нявыезд іх са сталіцы.

Хваробы адольваюць Уладзіміра. Ён чуе сваю хуткую смерць і не хоча, каб Святаполка зноў аблыталі салодкім павуціннем палякі. Баляслаўна, перастаўшы быць правадніком ідэй бацькі і духоўніка, становіцца ціхмянай, любячай жонкай.

У 1015 г. памірае Уладзімір. Святаполк займае яго месца на кіеўскім прастоле. Але не суджана яму ўтрымаць уладу. Сын Рагнеды, наўгародскі князь Яраслаў, які яшчэ пры жыцці бацькі выказваў непавінаванне Кіеву, адмовіўся прызнаць законнымі правы Святаполка. Нанятыя невядома кім людзі забілі князя Барыса Растоўскага, потым князя Глеба Мурамскага, сыноў Уладзіміра. Пры невысветленых абставі-

нах загінуў таксама князь Святаслаў Драўлянскі. Яраслаў Наўгародскі аб'явіў аб тым, што Святаполк мае дачыненне да забойства братоў. Яму паверылі, бо ў вачах людзей Святаполк застаўся сынам, які зрабіў замах на правы бацькі, за гэта быў зняволены ў цямніцы.

У 1016 г. разам з тымі, хто застаўся яму верным, Святаполк вымушаны быў прыняць бой ля Любеча, навязаны Ярославам. Быў разбіты і збег у Польшчу, да цесця. Усё адбылося настолькі імкліва, што Святаполк не паспеў нават узяць з сабою любімую жонку. Баляслаўна зноў трапіла ў вязніцу, на гэты раз у наўгародскую.

Калі Святаслаў збіраў у Польшчы войска для паходу на Русь, дзве страсці вялі яго ў гэтым паходзе: прага ўлады і каханне, імкненне вызваліць жонку. Разам са Святаполкам на Русь у 1018 г. пайшоў сам Баляслаў Храбры. На рацэ Буг палякі разбілі Яраслава. Наўгародскі князь збег з поля бою толькі з чатырма дружыннікамі. Баляслаў і Святаполк захапілі паўднёвыя землі Русі і хутка ўступілі пераможцамі ў Кіеў, захапіўшы ў палон сясцёр Яраслава і некалькіх высокапастаўленых, адданых яму баяраў. Святаполк адправіў у Ноўгарад пасла з прапановай абмяняць усіх іх на Баляслаўну. Але атрымаў адмову... Баявы пыл яго пачаў знікаць. У прыступе меланхоліі, разлучаны з жонкай, Святаполк палаяўся з цесцем, не страціўшым ні энергічнасці, ні амбіцыйнасці. Баляслаў вырашыў пакінуць Кіеў, захапіўшы палонных і, дарэчы, усю княжацкую казну.

Святаполк застаўся адзін. Пачало здаваць здароўе — ці ад нервовых стрэсаў, ці гады пачалі браць сваё — няўмольны час... Даведаўшыся, што Яраслаў, сабраўшы дружыну наўгародцаў і ворагаў, ідзе адваёўваць Кіеў, Святаполк бяжыць да печанегаў і з іх дапамогай робіць апошнюю спробу ўтрымаць уладу. Адбылася крывавая бітва на рацэ Альце, якая працягвалася больш сутак. У рэшце рэшт воіны Святаполка не вытрымалі. На полі бою ў Святаполка адняліся ногі. Верныя людзі вынеслі на насілках разбітага паралюшам князя, правезлі праз усю Русь ажно да граніцы з Польшчай. Святаполк быў не ў сабе, яму ўсё здавалася, што даганяюць няўмольныя забойцы... Хутка ён памёр.

Аб лёсе Баляслаўны нічога не вядома. Яе муж не змог абвергнуць абвінавачванні ў забойстве братоў, і ўвайшоў у гісторыю пад імем Святаполка Акаяннага. Калі ён і сапраўды быў жорсткім забойцам, лёс, сапраўды, не знайшоў нічога горшага, як пакараць яго, адабраўшы ў барацьбе за ўладу адзінае, што было па-сапраўднаму дарагім — каханую жанчыну.

І. А. Масляніцына

Гарадзішча старажытнага Турава

Гарадзішча старажытнага Турава — Замкавая гара, Замчышча — знаходзіцца на паўночна-заходняй ускраіне горада ля дарогі на в. Запясочча. Яно ўзвышаецца на раўнінным нізінным рэльефе нізкай прыпяцкай поймы, здаўна прыцягваючы ўвагу мясцовага насельніцтва, аматараў старажытнасцей. Найбольш раннія паведамленні аб Замкавай гары ў Тураве сустракаюцца ў нататках вядомага падарожніка, этнографа і даследчыка старажытнасцей П. І. Шпілеўскага. У час свайго падарожжа па Беларусі ў 1857 г. ён пісаў: «Самая большая насыпь, известная под именем Туры, тянется на значительном простран-

нах загінуў таксама князь Святаслаў Драўлянскі. Яраслаў Наўгародскі аб'явіў аб тым, што Святаполк мае дачыненне да забойства братоў. Яму паверылі, бо ў вачах людзей Святаполк застаўся сынам, які зрабіў замах на правы бацькі, за гэта быў зняволены ў цямніцы.

У 1016 г. разам з тымі, хто застаўся яму верным, Святаполк вымушаны быў прыняць бой ля Любеча, навязаны Ярославам. Быў разбіты і збег у Польшчу, да цесця. Усё адбылося настолькі імкліва, што Святаполк не паспеў нават узяць з сабою любімую жонку. Баляслаўна зноў трапіла ў вязніцу, на гэты раз у наўгародскую.

Калі Святаслаў збіраў у Польшчы войска для паходу на Русь, дзве страсці вялі яго ў гэтым паходзе: прага ўлады і каханне, імкненне вызваліць жонку. Разам са Святаполкам на Русь у 1018 г. пайшоў сам Баляслаў Храбры. На рацэ Буг палякі разбілі Яраслава. Наўгародскі князь збег з поля бою толькі з чатырма дружыннікамі. Баляслаў і Святаполк захапілі паўднёвыя землі Русі і хутка ўступілі пераможцамі ў Кіеў, захапіўшы ў палон сясцёр Яраслава і некалькіх высокапастаўленых, адданых яму баяраў. Святаполк адправіў у Ноўгарад пасла з прапановай абмяняць усіх іх на Баляслаўну. Але атрымаў адмову... Баявы пыл яго пачаў знікаць. У прыступе меланхоліі, разлучаны з жонкай, Святаполк палаяўся з цесцем, не страціўшым ні энергічнасці, ні амбіцыйнасці. Баляслаў вырашыў пакінуць Кіеў, захапіўшы палонных і, дарэчы, усю княжацкую казну.

Святаполк застаўся адзін. Пачало здаваць здароўе — ці ад нервовых стрэсаў, ці гады пачалі браць сваё — няўмольны час... Даведаўшыся, што Яраслаў, сабраўшы дружыну наўгародцаў і ворагаў, ідзе адваёўваць Кіеў, Святаполк бяжыць да печанегаў і з іх дапамогай робіць апошнюю спробу ўтрымаць уладу. Адбылася крывавая бітва на рацэ Альце, якая працягвалася больш сутак. У рэшце рэшт воіны Святаполка не вытрымалі. На полі бою ў Святаполка адняліся ногі. Верныя людзі вынеслі на насілках разбітага паралюшам князя, правезлі праз усю Русь ажно да граніцы з Польшчай. Святаполк быў не ў сабе, яму ўсё здавалася, што даганяюць няўмольныя забойцы... Хутка ён памёр.

Аб лёсе Баляслаўны нічога не вядома. Яе муж не змог абвергнуць абвінавачванні ў забойстве братоў, і ўвайшоў у гісторыю пад імем Святаполка Акаяннага. Калі ён і сапраўды быў жорсткім забойцам, лёс, сапраўды, не знайшоў нічога горшага, як пакараць яго, адабраўшы ў барацьбе за ўладу адзінае, што было па-сапраўднаму дарагім — каханую жанчыну.

І. А. Масляніцына

Гарадзішча старажытнага Турава

Гарадзішча старажытнага Турава — Замкавая гара, Замчышча — знаходзіцца на паўночна-заходняй ускраіне горада ля дарогі на в. Запясочча. Яно ўзвышаецца на раўнінным нізінным рэльефе нізкай прыпяцкай поймы, здаўна прыцягваючы ўвагу мясцовага насельніцтва, аматараў старажытнасцей. Найбольш раннія паведамленні аб Замкавай гары ў Тураве сустракаюцца ў нататках вядомага падарожніка, этнографа і даследчыка старажытнасцей П. І. Шпілеўскага. У час свайго падарожжа па Беларусі ў 1857 г. ён пісаў: «Самая большая насыпь, известная под именем Туры, тянется на значительном простран-



Гарадзішча Замкавая гара (план)

стве по правую сторону Припяти; название это, говорят, сохранилось в память бывшего некогда на ней семибашенного замка (Турабашня), обведенного рвами, следы рвов отчасти заметны и теперь. Но от развалин замка не осталось ни одного камня. На месте их построена церковь...»[1]

Пакінуў свае нататкі, заўвагі і меркаванні аб Замкавай гары ў Тураве вядомы аматар старажытнасцей генерал М. Гаусман. У кнізе «Исторический очерк местечка Турова», якая выйшла ў 1877 г., ён пісаў: «...Насыпная гора в конце местечка к западу, на которой теперь Ильинская церковь, построенная от казны в 1851 г. Гора имеет длины во все стороны 8 долю версты, в вышину к югу имеет около 3 саженей, а к северу — не более 2. С этой стороны уже много отмыто горы речкою Струменем в весеннее время. Здесь видны истлевшие гробы и человеческие кости. (В 1850 г., когда копали в горе рвы под фундамент церкви, то выкопано несколько горшков, наполненных рыбьею чешуею.) Насыпь, как видно с той стороны, где отмыта гора, производилась в следующем порядке: сначала насыпано речного песку, после, насыпав больше сажени, местами клался уголь. Выше этого настилался всякий груз, кости разных животных и черепки из горшков втрое толще против нынешних. Еще выше

этого слой из бересты (березовой коры), а по верху этого слой из рыбьей чешуи, преимущественно язьей, впрочем, это не во всей горе. В этом слое находится множество костей осетра, что доказывает, что было некогда огромное количество осетров в р. Припяти. Из этого правдоподобно можно заключить, что в том месте, где теперь Туров, до основания еще города существовали большие рыбацкие курени и стан звероловов, иначе откуда бы основатель горы мог набрать столько костей животных и рыбьей чешуи, а также черепков из горшков, или эта гора насыпана после, но это противно преданию об основании Турова; гора эта окружена водою со всех сторон, хотя, впрочем, в настоящее время летом часто бывает и сухо. С севера речкою Струменем, с запада речкою Ездою, тут же возле горы, впадающей в Струмень, с юга и востока нарочно, как делают вокруг крепостей, копаным рвом. Гора разделяется копаным рвом на две части, на восточную и западную, вероятно, для того, что в случае неустойки воинов на одной части горы еще можно было бы защищаться на другой по подъеме моста через ров. Гора эта в древности, вероятно, называлась валом, и теперь улица, идущая прямо горы, называется Провальною, а впоследствии уже начала называться Замок. На горе этой первоначально был княжеский дворец...»[2]

У апісанні Замкавай гары звяртае ўвагу цікавасць і імкненне аўтара даць тлумачэнне складу яе пластоў. Аўтар прыходзіць да памылковага вываду, што гара насыпана штучна і адразу, тады не існавала навуковага тлумачэння паходжання культурнага пласту паселішчаў шляхам паступовага шматгадовага накаплення адыходаў дзейнасці чалавека.

У жніўні 1909 г. у Тураве пабывалі члены Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта А. Я. Снітка, А. М. Паноў і Д. В. Скрыжанка з нагоды таго, што вясной 1908 г. у час рыцця магілы для пахавання нябожчыцы на могілках Барыса і Глеба недалёка ад капліцы знойдзена каменная скрыня-саркафаг з рэшткамі даўняга



Тураў. Гравюра XIX ст. (па малюнку Н. Орды)

пахавання. У паведамленні аб даследаваннях яны прыводзяць апісанне Замкавай гары і яе забудовы, расказы мясцовых жыхароў аб рэштках даўніх каменных пабудоў.

У 1926 г. апісанне тураўскага гарадзішча надрукаваў А. Крукоўскі ў часопісе «Наш край». Ён дае звесткі аб знешнім выглядзе гарадзішча, яго форме і памерах, прыводзіць яго план, паведамляе мясцовыя легенды і паданні аб гістарычных помніках.

Навуковае даследаванне гарадзішча ў Тураве пачалося ў 20-я гады. У 1927 г. навуковы супрацоўнік секцыі археалогіі Інбелкульту А. Д. Каваленя і член секцыі археалогіі цэнтральнага бюро краязнаўства С. С. Шутаў праводзілі абследаванні Турава і яго наваколля. У 1929 г. шурфоўку гарадзішча праводзіў загадчык аддзела археалогіі Інбелкульту Ляўданскі.

Даследаванне гарадзішча на шырокай плошчы пачалося ў 60-я гады. У 1961 г. пачала работу экспедыцыя Інстытута археалогіі АН СССР, якой кіравала М. Д. Палубаярынава. У 1962, 1963, 1968 гг. даследаванні на дзядзінцы праводзіў археалагічны атрад Інстытута гісторыі АН БССР. Ускрыта плошча 528 кв. м. У 1963 г. раскопкі вялікага храма XII ст. на тэрыторыі навакольнага горада правёў М. К. Каргер.

Старажытны Тураў, рэшткі гарадзішча якога ўзвышаюцца над нізінным рэчышчам Прыпяці і поплавам Язды на 4—6 м, быў размешчаны на правым беразе Прыпяці ля ўпадзення ў яго рэчкі Язды. Гэты мыс быў значна ніжэйшым, сучасная яго вышыня ўключае пласты так званага культурнага слою, што на працягу стагоддзяў адкладваўся ў час існавання тут жылля. Таўшчыня гэтага пласта ў даследаваных месцах дасягае 4—4,5 м. План размяшчэння Турава быў падпарадкаваны рэльефу мясцовасці: з поўначы горад абмяжоўвала Прыпяць, з захаду — Язда з балоцістым поплавам. Плошча горада нагадвала чвэрць плошчы круга — форма, звычайная і найбольш распаўсюджаная для старажытных гарадоў усходняй Еўропы.



Храм у Тураве (план)

Горад меў даволі дасканалую сістэму абарончых збудаванняў, што забяспечвала бяспеку яго жыхарам, удала спалучала прыродныя абарончыя сродкі (рэкі Прыпяць, Язда, балоцістыя поймы) і штучныя збудаванні. З усходняга і паўднёвага боку старажытны Тураў быў абмежаваны паўкруглым абарончым

ірвом, запоўненым вадой. Такі ж паўкруглы роў падзяляў агульную плошчу горада на дзве часткі — дзядзінец і навакольны горад. Дзядзінец займаў найбольш умацаваную мысавую частку горада. Вакол яго размяшчаўся навакольны горад, аддзелены ад дзядзінца абарончым ірвом. Апрача абарончых ірвоў бяспеку гарадоў Старажытнай Русі звычайна забяспечвалі абарончыя земляныя валы з драўлянымі сценамі і вежамі на іх, што ўзводзіліся адразу за ірвом з унутранага боку. Абарончыя збудаванні старажытнага Турава да гэтага часу не даследаваны. Аднак, мяркуючы па летапісным паведамленні 1158 г. аб дзесяцітыднёвай беспаспяховай аблозе і неаднаразовых прыступах да Турава кіеўскага князя Ізяслава з войскамі саюзных князёў, абарончая сістэма яго была надзейнай і непрыступнай і, верагодна, мела апрача запоўненых вадой ірвоў таксама земляныя абарончыя валы з драўлянымі абарончымі збудаваннямі (вежы, сцены). Дадатковай падставай для меркавання аб існаванні такіх валоў служыць невялікае валападобнае павышэнне па знешнім напольным краі навакольнага горада і з заходняга краю дзядзінца, а таксама круглае павышэнне ў паўднёвым рагу дзядзінца.



Археалагічны знак «Гарадзішча» ў Тураве

Старажытны Тураў меў адносна невялікія памеры. Яго дзядзінец і навакольны горад займаюць плошчу каля 2,5 га, з іх дзядзінец — каля 1 га. Тут трэба ўлічваць два істотныя моманты. Перш за ўсё — невялікія памеры дзядзінцаў характэрны для найбольш старажытных гарадоў. Трэба мець на ўвазе, што насельніцтва Турава размяшчалася не толькі на дзядзінцы і ў навакольным горадзе, а рассялялася на прылеглай тэрыторыі. Маючы на ўвазе, што на ўскрытай плошчы 768 кв. м (10 % ад плошчы дзядзінца) выяўлена каля 10 жылых пабудоў, у кожнай з якіх пражывала ў сярэднім 5 чалавек, агульная колькасць жыхароў на дзядзінцы дасягала 500 чалавек. Плошча навакольнага горада прыкладна ў два разы перавышала плошчу дзядзінца. Дапускаючы, што яна была таксама шчыльна заселена, можна меркаваць, што на ёй жыло да 1000 чалавек. Такім чынам, агульная колькасць жыхароў на дзядзінцы і ў навакольным горадзе дасягала 1500 чалавек. Улічваючы, што старажытныя прадметы знаходзяцца за межамі старога гарадзішча на адлегласці 300—400 м, можна дапускаць, што колькасць насельніцтва прылеглага да гарадзішча пасаду была ўдвая большай, агульная колькасць жыхароў Турава дасягала 5—6 тыс. чалавек. У параўнанні з вялікімі гарадамі старажытнай Русі — Кіевам (50 тыс.) і Ноўгарадам (30—40 тыс.), з сярэднімі гарадамі —

Чарнігавам, Смаленскам, Полацкам, якія налічвалі па некалькі дзесяткаў тысяч чалавек, Тураў быў адносна невялікім горадам.

За час існавання пасялення на гарадзішчы старажытнага Турава адклаўся культурны пласт з адыходаў будаўніцтва, паўсядзённага побыту, рэшткаў гаспадарчай і вытворчай дзейнасці, жылых і гаспадарчых пабудоў. На месцы пасялення за многія гады, як было выяўлена ў час раскопак, ён «нарос» на таўшчыню 2,3—2,8 м. Па колеру, шчыльнасці і структуры пласты звычайна адрозніваюцца адзін ад другога. На дзядзінцы старажытнага Турава культурны слой падзяляецца на пяць такіх пластоў.

Характэрнай асаблівасцю культурнага слою дзядзінца старажытнага Турава з'яўляецца адсутнасць у ім гідраізалюючых праслоек гліны або гною, якія дзякуючы сваёй шчыльнасці перашкаджалі б пранікненню атмасфернага кісларoду і садзейнічалі захаванню рэчаў і матэрыялаў. У гэтым слоі Тураўскага дзядзінца амаль зусім сатлелі рэчы з дрэва, скуры, іржа поўнасцю знішчыла чорныя металы, не захаваліся медзь і бронза. Добра захаваліся рэчы са шкла, каменя, косці.

У раскопах 1961—1962 гг. пабудовы адносіліся да двух розначасовых будаўнічых ярусаў, што змянялі адзін другога. У раскопе ў 1968 г. такіх ярусаў было выяўлена шэсць, а ўсяго — 35 пабудоў, з іх 24 былі жылымі. Усе яны належаць да тыпу наземных аднакамерных пабудоў зрубнай канструкцыі, усе рублены ў просты вугал галоўным чынам з дрэў хваёвых парод. Зрэдку пад вугламі і сценамі былі падкладкі з кароткіх бярвенняў. Пабудовы мелі памеры 4×4,5, 4×4,4, 4×4, 4,5×4,5 м. Найбольш буйная жылая пабудова мела плошчу каля 25 кв. м. У чатырох выяўлены рэшткі драўлянай, у адной — глінабітнай падлогі. Дрэва захавалася толькі ў выглядзе драўлянай парахні, сатлела і раздзялілася на асобныя валокны.

У раскопках выяўлены рэшткі 10 печаў, з іх сем былі глінабітнымі, тры зроблены з цэглы таўшчынёй 4—5 см, шырынёй 16—18 см, даўжынёй 24—27 см. Глінабітныя печы з'явіліся раней, цагляныя — не раней другой паловы XII ст.

У раскопках выяўлены тры скляпы, адзін, які належаў да часу засялення гарадзішча, памерам 2,6×2 м меў драўляны зруб і падлогу з дошак. Другі, абшыты дошкамі, меў падлогу з дошак, высланую бяростай. У ім шмат абломкаў гліняных таўстасценных амфар — пасудзін ёмістасцю каля 27 л, у якіх прывозілі з Прычарнамор'я, з Візантыі вінаграднае віно ці аліўкавы алей. Ад трэцяга застаўся толькі драўляны насціл.

У 1963 г. ускрыты рэшткі буйнога збудавання манументальнай архітэктуры царкоўнага прызначэння. Гэта трохнефны трохапсідны храм памерам 28,5×17,3 м з апорамі на шасці ўнутраных слупах, складзены з шырокай тонкай цэглы-плінфы. Заўважаны сляды даўніх рамонтных работ. Храм меў слабы падмурак, які стаў прычынай яго разбурэння, як відаць, не меў тынкоўкі і фрэскавых роспісаў; падлога, магчыма, была з керамічных плітак. У цэнтры храма адкапаны тры вялікія шыферныя саркафагі са слядамі пахаванняў.

Вялікую цікавасць і навуковае значэнне для вывучэння гісторыі старажытнага Турава і яго насельніцтва маюць розныя рэчы і знаходкі, выяўленыя ў культурным слоі, якія сведчаць аб штодзённым жыцці жыхароў старажытнага Турава, яго заняткаx, умовах жыцця, узроўні эканамічнага і культурнага развіцця і мясцовай вытворчасці, гандлёвых і культурных сувязях з бліжэйшымі суседзямі і аддаленымі краінамі.

Несумненна, што сувязі былі даўнімі, трывалымі і ўзаемавыгаднымі. Гэтаму спрыяла само выгаднае на той час геаграфічнае размяшчэнне Турава, дзякуючы чаму і мог узнікнуць горад яшчэ задоўга да пачатку канца першага тысячагоддзя, таму што дакладная дата заснавання яго невядомая і вызначыць яе не ўяўляецца магчымым, пачатак летазлічэння ад першага ўпамінання Турава ў Іпаццеўскім летапісу пад 980 г. з'яўляецца, як вядома, умоўным. Замкавая, або Турава, гара і сёння з'яўляецца найбольш цікавай і адзінай славутасцю старажытнага горада, якая захавалася да нашых дзён. Яна неадольна прываблівае вучоных, гісторыкаў, аматараў роднага краю, даследчыкаў, і толькі мясцовыя жыхары, прывыкшыя да яе як звычайнага рэльефу мясцовасці, прахо-дзяць міма, затрымліваючы позірк хіба што на новым, магутным сілуэце помніка Кірылу Тураўскаму, які ўзведзены тут нядаўна, вясной 1993 г. Тым не менш у глыбіні душы кожнага тураўца тоіцца пачуццё гордасці за свой славуты край. Колькі засталося іх, карэнных, гістарычных тураўцаў пасля шматлікіх войнаў, варожых набегаў, неаднаразовай жудаснай разні, акупацыі і шматгадовага прыгнёту, што на працягу стагоддзяў праносіліся над краем і не разу не абміналі Тураў?.. Толькі раскопкі старадаўняй гары, шматлікія знаходкі на ёй могуць сведчыць сёння аб узроўні жыцця і культуры былой сталіцы магутнага княства, роду заняткаў яе жыхароў, умовах існавання, аб тых трагедыях, што адбываліся ў горадзе.

Раскопкі гарадзішча пад час экспедыцыі П. Ф. Лысенкі ў 1968 г.

Найбольш часта сустракаюцца рэшткі глінянага посуду і костак жывёлы. Асабліва важнае значэнне маюць знаходкі рэчаў з жалеза і сталі, з якіх выраблялiся прылады працы, інструменты, прадметы хатняга ўжытку і ўзбраення. З жалеза звычайна рабілі аснову прылады, на яе рабочы кант ці паверхню наварвалі палоскі сталі. Жалеза забяспечвала трываласць прылады, стальная палоска (лязо) добрыя рабочыя якасці. Па такім прынцыпе выраблялiся сярпы, косы, сякеры, долаты, свярдзёлкі, нажніцы і іншыя прылады працы. У нажах стальная пласцінка спачатку ўварвалася паміж дзвюх жалезных, а пасля наварвалася да асновы касой зваркай ці ў тарэц асновы. Найбольш простыя прадметы хатняга ўжытку выраблялiся цалкам з жалеза (дзвярныя кольцы, прабой, скобы, цвікі, вядзёрныя абручы і інш.). Прычынай абмежаванага ўжывання сталі былі складанасці яе атрымання з жалеза.

Да ліку цікавых знаходак адносяцца нешматлікія вырабы з каляровых металаў, большасць з іх — жаночыя ўпрыгажэнні. У пластах XI—XVI стст. знойдзены 8 драцяных і пласцінчатых бранзалетаў, 4 пярсцёнкі, 10 скроневых кольцаў, падвескі, спражкі, абломкі бронзавага начыння. З бронзы зроблены і прадметы царкоўнага культу — чатырохканцовы крыжык-цельнік, бронзавы крыж-складзень, бронзавая іконка. З каляровых металаў выраблялiся спражкі, зашчапкі для кніг, посуд, упрыгажэнні, прадметы культавага прызначэння. Вялікую цікавасць прадстаўляюць чатыры невялікія авальныя пласкавыпуклыя свінцовыя абразкі з выявамі багародзіцы, велікамучаніцы, прападобнай і свяціцеля (магчыма, гэта выява Кірылы Тураўскага). З свінцу выраблялiся дэкаратыўныя разеткі, грузілы для рыбалоўных прылад. Найбольшую цікавасць прадстаўляюць знаходкі ліцейных тыгелькоў, льячак, формачак, ювелірных пінцэтаў, што сведчыць аб мясцовай апрацоўцы каляровых металаў.

Абразкі-ўстаўкі з Турава. XIII ст. (волава)

У Тураве сабрана ў час раскопак даволі вялікая калекцыя прадметаў з косці высокамастацкага ўзроўню апрацоўкі. Гэта розныя накладкі, праколкі, рукаяткі, гузікі, шахматныя фігуркі, грабеньчыкі і г. д. Многія з іх упрыгожаны высокамастацкім арнаментам з рознымі выявамі. З косці выраблялі лыжачкі, іголкі, асобныя дэталі складаных лукаў і г. д.

Нямала сустракаецца ў раскопках розных шкляных вырабаў, найбольш часта — абломкі шкляных каляровых бранзалетаў, любімага ўпрыгажэння гараджанак. За 4 гады раскопак іх сабрана звыш 1600. Па колеру яны бірузовыя, карычневыя, зялёныя, жоўтыя, чорныя, фіялетавыя, чырвоныя, па форме — круглыя, кручаныя, трохвугольныя, пласкавыпуклыя. Шкляныя бранзалеты прывозілі з Кіева, дзе існавалі майстэрні па іх вырабе. Са шкляных упрыгажэнняў знойдзены шкляныя каляровыя пярсцёнкі і ўстаўкі да металічных пярсцёнкаў. У культурным пласце сабрана таксама шмат фрагментаў шклянога посуду (кубкі, бакалы, шклянкападобныя сасуды) з краін усходняга Міжземнамор'я, а таксама фрагментаў аконнага шкла. Мала знойдзена прадметаў са скуры — кашалькі, похвы для нажоў, фрагменты абутку, рукавіцы, што, аднак, не служыць доказам нешырокага іх ужывання ў жыцці тураўцаў, а з'яўляецца вынікам дрэннага іх захавання ў культурным пласце. Амаль няма драўляных рэчаў і прылад, якімі карысталіся тураўцы. Толькі ў раскопе 1968 г. знойдзены дубовыя донцы невялікіх бочак дыяметрам каля 60 см.

Адной з найбольш частых знаходак з'яўляюцца розныя керамічныя вырабы, у асноўным абломкі гліняного посуду, цэглы, паліўных плітак, галоўным чынам гаршкоў, місак, кубкаў, каўшоў. Цэгла мае



Манета тураўскага князя Святаполка

памеры 3,5—5×16—21×24—27 см. Такая цэгла пачала вырабляцца з другой паловы XII ст. Паліўныя пліткі памерам 10×10×1 см выкарыстоўваліся для вымошчвання падлогі. З гліны выраблялі грузілы рыбалоўных сетак. Знойдзены гліняны паліваны падсвечнік кубічнай формы. Вельмі многа костак дзікай і хатняй жывёлы.

Археалагічныя знаходкі з тураўскага гарадзішча сведчаць аб занятках і паўсядзённым жыцці тураўцаў. Абсалютная большасць жалезных вырабаў, несумненна, мясцовага паходжання. Тураўскія кавалі прымянялі складаныя прыёмы апрацоўкі і вырабу высакаякасных прылад працы і прадметаў штодзённага ўжытку. Працвітала таксама мясцовае рамяство, апрацоўка косці, дрэва, выраб керамічных рэчаў. З хатніх промыслаў былі пашыраны прадзенне і ткацтва. Развіты ў Тураве быў гандаль. З Валыні прывозілі праслікігрузікі на верацёны з мяккага каменя-сланцу, з Кіева — шкляныя вырабы, з Прычарнамор'я — віно і аліўкавы алей, з Прыбалтыкі — бурштын. Сустракаецца посуд з усходняга Міжземнамор'я і Сярэдняй Азіі.

Вялікае значэнне мелі земляробства і жывёлагадоўля. У ніжніх пластах знойдзены абгарэлыя зярняты жыта, пшаніцы, сачавіцы, ільну і проса. Зярняты пустазелля сведчаць аб азімых пасевах жыта. Разводзілі жыхары буйную і дроб-

ную рагатую жывёлу, коней, свіней, сустракаюцца косткі сабакі і кошкі і некаторых іншых жывёлін.

У Тураве былі развіты паляванне і рыбалоўства. У паляўнічай здабычы былі лось, алень, казуля, дзік, зубр. Сустракаюцца косткі мядзведзя, куніцы, выдры, лісіцы, часцей — бабра. Аднак колькасць костак дзікай жывёлы складае толькі чвэрць ад агульнай іх колькасці, знойдзеных на гарадзішчы.

Высокага ўзроўню дасягнула культура старажытнага Турава. Па насычанасці асобнымі катэгорыямі находак тураўскаму гарадзішчу няма роўных сярод іншых гарадоў Беларусі.

П. Ф. Лысенка

1. *Штилевский П.* Мозырщина (из путешествий по Западно-русскому краю) // Архив исторических и практических сведений, относящихся до России. Спб, 1859.

2. *Гаусман Михаил.* Исторический очерк местечка Турова, прежней столицы Туровского княжества. Минск, 1877.

3. *Седова В. В.* Отчет о работе Верхнеднепровского отряда славянской экспедиции Института археологии АН СССР в 1961 г. Архив Института истории АН Беларуси, д. 115.

4. *Каргер М. К.* Новый памятник зодчества XII в. в Турове // КСИА, вып. 100, 1965.

Гербы гарадоў, якія ўваходзілі ў склад Тураўскай зямлі





ДНЕВНИК РАСКОПКИ В М. ТУРОВЕ МОЗЫРСКОГО У. МИНСКОЙ ГУБ.

24 августа 1909 г. Члены Минского Церковного Историко-Археологического комитета А. Я. Снитко, А. М. Панов и Д. В. Скрыпченко, снабженные открытым листом Императорской Археологической комиссии за № 1205, удостоверением Минского Губернатора за № 4247 и удостоверением Минской Духовной Консистории за № 10740 о неимении препятствия на производство раскопки саркофага, обнаруженного на Туровском кладбище,— прибыли в Туров с целью проверить на месте появившееся в Минской прессе известие об обнаруженных весной 1909 г. на Борисоглебском кладбище саркофагах.

По собранным на месте сведениям оказалось, что в Страстную Субботу хоронили крастьянку Агриппину, и так как в это время был разлив рек и почти все кладбище находилось под водой, могилу пришлось копать при самой Св.-Кирилловской кладбищенской церкви — куда не доходила вода. Разрывая землю, наткнулись на каменную гладкую плиту и так как с похоронами спешили, то новой могилы копать не стали, а похоронили Агриппину таким образом, что часть изголовья гроба пришлась над плитой.

Чтобы проверить эти показания и убедиться, на какого рода плиту наткнулись местные жители, члены Комитета решили провести пробную раскопку.

...Выбрав более свободное место между двумя могилами, в расстоянии 100 см от южной стороны церкви и 200 см от ее восточного угла, приступили к копанию колодца. Почва темно-серая, рыхлый суглинок, все время попадаются кости в беспорядке, остатки гробов, так как земля на бугре сплошь перекопана и одно погребение следует за другим на одном и том же месте... Чтобы дойти до плиты, за изголовьем гроба Агриппины углубились еще на 47 см и наткнулись на каменную плиту, она оказалась на глубине 127 см. Обнаруженную часть плиты осторожно очистили от земли, оказалось, что она красного цвета и расколота. Исследуя при помощи железного щупа почву вокруг, легко было убедиться, что под плитой имеются каменные вертикальные стенки. В обнаженной горизонтальной плите была замечена треугольная отколовшаяся часть — этот кусок был осторожно поднят, что дало возможность увидеть на дне гробницы костяки, причем череп лежал сбоку в опрокинутом положении. Отверстие снова закрыли отколовшимся куском и продолжали раскопку. По окончании этой работы, уже поздно вечером, оказалось, что найдена горизонтальная шиферная плита длиной 229 см, шириной 96 см и толщиной около 5 см. Плита имеет большую продольную трещину, края этой трещины несколько прогнулись внутрь гроба... По снятии частей верхней плиты оказалось, что она представляет собой крышку каменного ящика, состоящего из четырех вертикальных красивых шиферных плит, утвержденных на такой же шиферной плите, образующей дно. Верхняя плита была с напуском и лежала не только на вертикальных плитах, но еще на трех железных штабах, запущенных за наружные края вертикальных плит. Эти штабы сильно проржавели и несколько вогнулись в середину. При более подробном исследовании гробницы оказалось, что на дне ее имеется слой земли толщиной около 1 см. Этой землей засыпаны кости и лишь более толстые их части выдаются. Затылочная кость отбита, на лбу пробоина. Нижняя челюсть осталась на месте, но на ней лежит треугольный кусок от верхней плиты. Предплечья сложены на груди, причем правое находится над левым. Между бедряными костями заметны в слое земли воронки. В земле сверкают тонкие золотые нити, они расположены по всему костяку, доходя до голеней. На уровне плеч их больше, местами нити длиннее, образуя как бы кисточки. В других местах нити так расположены, что видно, что они были в какой-то узкой ткани, по всей вероятности, служили утокой галуна... На ночь саркофаг



Саркафаг XII ст., адкапаны ў Тураве ў 1963 г. пад час экспедыцыі М. К. Каргера (музей у Пінску)

был закрыт досками. На следующий день, 25 августа, решено было извлечь саркофаг из земли и оставить его в прежнем виде в притворе церкви.

...Вертикальные стенки имеют 83 см высоты и состоят из четырех красных шиферных плит, две продольные имеют в головах вертикальные пазы, куда запущена головная доска. В ногах имеет такой паз только одна плита... Эти четыре плиты еще впущены в соответствующие желобки нижней доски и по всем швам залиты очень прочной известкой.

Нижняя плита сделана из того же материала, что и прочие, и одинаковых размеров с верхней, кроме упомянутых желобков и выдолбленного диска с дырами, в ней высечено два желобка. Толщина ее неравномерна, тыльная сторона очень грубо отделана. Все плиты не шлифованы, а обделаны долотом.

При вынимании из земли плит верхняя еще больше раскололась, в настоящее время она утратила свой первоначальный вид, распавшись на несколько малых частей; также и одна железка штаба сломалась, остальное извлечено вполне благополучно и все сложено в притворе церкви св. Кирилла у левой стены в таком виде, в каком саркофаг находился в земле. Части верхней плиты сложены на саркофаг, а в него положены найденные в нем кости, за исключением черепной чашки, бедряной и большой берцовой кости, каковые вместе с большей частью золотых ниток взяты в Минск и имеют быть возвращены в Туров для хранения в саркофаге вместе с остальными костями.

* * *

...До сих пор самое возвышенное место в местечке при слиянии речки Езды и Струмени носит название «Замковая гора». Вне всякого сомнения, что в прежнее время, в эпоху удельного периода, в Турове должен был быть замок. Но и в 18 веке такой еще существовал, об этом свидетельствует дарственная запись Антония Сапеги от 1725 г. на имя настоятеля Туровской Ильинской церкви, в коей Сапега называется воеводиной виленской, старостиной разных замков, и в конце записи помечено, что документ писан в «Замке Туровском». Этот документ хранится у настоятеля Гуровской Св.-Ильинской церкви о. Антония Вечерко.

Название «Замковая гора» тоже давнего происхождения, так, у того же священника имеется план м. Турова от 1554 г., где гора у слияния Езды и Струменя носит имя «Замковой». Эта возвышенность разделена оврагом на две неровные половины. На меньшей, ближайшей к реке, расположена усадьба г-жи Татур и земская больница. На большей — церковь св. Ильи, построенная в 50-х годах прошлого столетия (говорят, Ильинская древняя церковь находилась прежде в местечке), затем здание народного училища и церковно-приходской школы, остальное пространство занято садами и огородами. От местечка гора отделяется огромным рвом, через который построен мост. Больничный барак построен в самом овраге, нынче значительно засыпанном землей, свезенной с большого холма. Овраг теперь совершенно сух, но даже не старые люди помнят, когда в нем стояла вода.

На этих двух холмах, вне всякого сомнения, и стоял замок, хотя все сообщения местных жителей говорят о признаках постройки прежних времен лишь на большом холме.

Так, старейший обыватель Турова рассказывал, что в детстве, гуляя на горе, он заметил

(аршинах в 6 от угла больничного барака) в овраге на склоне большого холма длинное и узкое окно в каменной стене, которая в то время была обнажена. Он пробовал исследовать помещение, освещенное этим окном, при помощи шеста аршин в 6 длиной, но пола не нащупал. Несколько ближе к Струменю один еврей на склоне к оврагу заметил в почве среди мусора отверстие и брошенный им камень в эту расщелину упал где-то глубоко в воду. Года три тому назад местный учитель народного училища, желая распланировать верх горы под сад, стал свозить землю с горы в овраг, и при этой работе наткнулся на остатки кирпичного здания с круглым основанием. Предполагают, что это остатки башни. Местные крестьяне разобрали кирпичи и вывезли их для своих нужд. Битые кирпичи валяются по всему городу и теперь. Кирпичи были почти квадратной формы, по обломкам можно судить, что они были 18 $^1/_2$ см шириной и 8 $^1/_3$ см высотой. При разрушении остатков башни крестьяне нашли несколько человеческих костяков. На улице перед церковью много кирпичей и удар по земле гулко отдается, как над пустотой...

Нельзя не упомянуть, что расположенная около Замковой горы, за рвом, базарная площадь была в прежнее время кладбищем, здесь постоянно в земле встречаются кости, местами из-под земли торчат камни, вероятно, надмогильные плиты и также, говорят, во время больших дождей вымываются целые костяки из почвы, однажды был обнаружен скелет священника; рассказчик, однако, не умел объяснить, по каким признакам было сделано такое определение.

На Крестовой улице, против места, где в старину была Ильинская церковь, у дома Якима Домашкевича, указывают колодезь, ныне запущенный, без верхнего сруба, под названием «туров колодезь». Улица, параллельная базару, носила название «Провальной», далее была улица «Замковая» (на этой улице стоит Петропавловская церковь).

Владельцем Турова во времена Речи Посполитой был, вероятно, господарь — король, ибо большинство крестьян туровских — казенные. Часть их в Заятели и до сих пор считают себя «владычными». Меньшая часть местечка принадлежала Мостовским. В начале же 18 в. городом владели Сапеги...

Народ в Турове религиозный, нравственный (например, краж бывает очень мало, сараи и скот не принято запирать на замки, число незаконнорожденных ничтожно по сравнению с другими местностями). Крестьян много грамотных. Один, по виду бедный крестьянин, в лаптях, церковный попечитель Михаил Струк настолько грамотен, что с успехом исполняет обязанность псаломщика в отсутствие последнего. Крестьяне читают книги, интересуются прошлым Турова, очевидно, и женщины грамотные... Народ знает о св. Кирилле и убежден, что святитель погребен в Турове, при этом нужно отметить, что люди настроены мистически. Приходилось слышать много рассказов о сновидениях, в которых являлся святитель и указывал место своего погребения. Женщины видят ночью свет в кладбищенской церкви.

...По вопросу о месте погребения Туровского духовного оратора не мешает иметь в виду и то предание, что во время татарского нашествия мощи святого были спрятаны, дабы они не подверглись осквернению со стороны неверных и слышанное мною утверждение покойного Минского археолога И. Татура, что св. Кирилл погребен в Минске там, где ныне Кафедральный собор.

В оное время (1632 г.) Туров имел до 70 церквей, что дает основание думать, что город прежде был значительно больше теперешнего и, по всей вероятности, включал в свои границы все находящиеся по соседству деревни. Из числа бывших в Турове 70 церквей ныне имеются следующие церкви (и римско-католический костел за городом).

1) Кладбищенская церковь Всех Святых. В ней имеются резные царские врата художественной работы в стиле ренессанс. Из икон западно-русского письма: Христос, Богородица, Косьма и Демиан, Архангел, весьма поврежденная; в притворе — Богородица, Христос и Собор Архангела Михаила...

Согласно Арх. Николаю, в былые времена на этом месте был Борисо-Глебский монастырь, разоренный татарами и более уже не возобновленный; в нем в XII в. подвизался преподобный Мартин, которому явились Борис и Глеб. Ахр. Николай также говорит, что в Борисоглебском монастыре подвизался на столпе св. Кирилл во второй половине XII в. Без ссылки на источник автор указывает, что св. Кирилл погребен на Борисоглебском кладбище; это кажется нам весьма правдоподобным, т. к. известно, что св. Кирилл под конец жизни оставил кафедру епископскую и снова стал подвизаться, вероятно, что он вернулся в тот же монастырь.

Хотя теперь под именем Борисоглебского кладбища известно совсем другое место, но авторитет Арх. Николая, а также то, что в мою бытность в Турове один крестьянин на вопрос «где и какие церкви находятся в местечке», указал мне церковь «Глеба-Бориса» в том месте, где ныне находится церковь Всех Святых, заставляет меня заключить, что в народе сохранилось исстари правильное название церкви, а название Всех Святых появилось позже. Поэтому и место погребения св. Кирилла следует искать на Всесвятском кладбище.

Минская старина, вып. 2, 1911 г.

Тураў — князь ці рэчка Тур?..

Найбольш старажытнымі летапіснымі цэнтрамі беларускага этнічнага яднання, а потым першапачатковага дзяржаўнага станаўлення з'яўляюцца Полацк на поўначы Беларусі і Тураў на поўдні. Агульнапрызнана, што ўласнае імя горада Полацк (мясцовае Полацак, старажытныя Полотескъ, Полотскъ і інш.) утварылася ад назвы рэчкі Палата — невялікага прытоку Заходняй Дзвіны, дзе было заснавана пасяленне, якое потым стала горадам. Але калі ўласнае імя Полацк мае выразную, бясспрэчную, матываваную геаграфічную сувязь па аснове з назвай рэчкі, то ва ўласным імі Тураў бачаць звычайна аснову зусім іншага характару.

Найбольш вядомымі з'яўляюцца два тлумачэнні. Першае — уласнае імя Тураў паходзіць ад асабовага імя заснавальніка старажытнага горада, якое падаецца фактычна ў летапісе 980 г. У ім упамінаецца Тур (ці Туры), які разам з Рагвалодам «пришел из заморья...». Падставай для такога тлумачэння з'яўляецца і тое, што шэраг старажытных беларускіх гарадоў маюць найменні ад уласных імёнаў: Мсціслаў, Заслаўе, Барысаў, Давыд-гарадок, Петрыкаў... Але ці быў у жыцці князь Туры, які «имяше власть свою в Туровъ»? Гэта ўпамінанне аб ім — адзінае ў вядомых старажытных летапісах, што недастаткова, каб лічыць валадара з такім імем рэальнай гістарычнай асобай і выводзіць назву Тураў ад імя Тур (Туры).

Другое пашыранае тлумачэнне наймення Тураў паходзіць ад назвы дзікай жывёліны (тур). Беларускі этнограф і публіцыст другой паловы XIX ст. П. У. Шпілеўскі пісаў: «...натуральней і праўдападобней будзе выводзіць назву Тураў не ад імя варажскага князя Тур, а ад назвы жывёліны тур на наступных падставах: па-першае, мы сустракаем масу назваў сёл, вёсак, рэк, палёў, урочышчаў і г. д. з коранем «тур» на ўсёй прасторы славянскіх пасяленняў, і выводзіць гэтыя назвы не ад славянскага, а ад варажскага кораня — неверагодна, па-другое, у землях дрыгавічоў было мноства тураў, на якіх палявалі кіеўскія князі...» Але такое прамалінейнае непасрэднае вывядзенне наймення Тураў ад назвы жывёліны з'яўляецца занадта спрошчаным і гістарычна слаба матываваным.

Існуе сцвярджэнне аб роднаснасці наймення Тураў да слова тура (тур) — вежа. Але, па-першае, мяркуючы па старабеларускіх пісьмовых крыніцах, слова тура абазначала перасоўнае збудаванне для аховы воінаў пры штурме гарадскіх сцен і валоў, а таксама для здзяйснення падкопаў пад іх. «Люди городъ осадятъ и туры поставятъ»,— адзначаецца ў адной са старых грамат (1563 г.). А, па-другое, і самае галоўнае,— гэтыя туры разам з іх назвай з'яўляюцца даволі познімі сярэдневяковымі запазычаннямі (слова тура мае французскамоўнае паходжанне).

Мяркуюць таксама, што на месцы, дзе ўзнік Тураў, у глыбокай язычніцкай старажытнасці было капішча — месца пакланення і ахвяравання тагачаснага навакольнага люду ідалу-заступніку, які меў уласнае імя Тур. Але ў пантэоне шматлікіх язычніцкіх багоў нашых продкаў такое імя сучасным даследчыкам старажытнай гісторыі не сустракалася.

Існуе і мясцовая легенда пра паходжанне Турава і яго назвы. Паводле яе, у час набегу нейкіх «туркаў» адзін з іх, відаць, даволі значная фігура, перабіраючыся па тонкім лёдзе на кані недзе там, дзе потым паўстаў Тураў, ці сам праваліўся пад лёд і ўтапіўся, ці ён сваю багатую шапку ўтапіў (згубіў). Відаць,

гэта проста народны жарт, разлічаны на даверлівых аматараў старажытных казак, які пабудаваны на відавочным сугуччы найменння Тур і слова турак.

Усе прыведзеныя тлумачэнні паходжання назвы Тураў цікавыя, але не пераканаўчыя.

Нашы далёкія продкі ў перыяд пераходу ад вандроўнага жыцця да аседлага сяліліся на ўзвышаных мясцінах каля вады, без якой немагчыма было жыццё. Нашы славутыя старыя гарады — Полацк, Слуцк, Віцебск, Мінск, Пінск, Клецк, Чачэрск, Друцк, Орша і іншыя зусім не выпадкова маюць назвы, утвораныя ад назваў рэчак. Такія найменні сталіц розных валоданняў у перыяд іх станаўлення з'яўляліся найбольш пашыранымі. Вельмі магчыма, што і старажытнае найменне Тураў не выпала з гэтага правіла.

У Тураве бытуе легенда аб паходжанні назвы Тураў ад рэчкі Тураўлянка, якая ўпадала ў Прыпяць. Але даследчыкам тапанімаў, нават мясцовым краязнаўцам пра існаванне каля Турава ці ў яго наваколлі рэчкі з назвай Тур да нядаўняга часу не было вядома. Быў у Прыпяці некалі яшчэ адзін прыток Тур. Пад гэтай назвай цяпер выступае частка амаль замытай ілам і пяском пратокі з р. Сцвіга ў Прыпяць даўжынёй каля двух кіламетраў каля в. Пагост, што размешчана паміж дзвюма рэкамі недалёка ад вусця Сцвігі.

Паводле ўспамінаў старэйшых жыхароў в. Пагост, яшчэ ў даваенныя часы Тур быў досыць шырокай, дастаткова глыбокай і чыстай пратокай. Уздоўж берагоў рос белы гарлачык. У пратоцы лавілі рыбу, яна служыла месцам выбельвання палотнаў і г. д. Злучаная з рукавом Сцвігі каналам Сцвіжанец, пракладзеным некалі штучна сіламі вяскоўцаў, пратока Тур утварала водны шлях, які злучаў вёску з абедзвюма рэкамі і скарачала пераезд з адной у другую. Тур з'яўляўся прыстанню на Прыпяці і Сцвізе, асабліва пры сплаве лесу.

У даваенныя часы на прыстані каля Тура дзейнічаў храм «Сцефанаўская царква», ці «Белая царква» (сцены былі белыя). На Узвіжанне (канец верасня) маліцца ў «Белую цэркву» і на «ярмалак» у Пагост дабіраліся пехатою, на вазах, па вадзе не толькі з Тураўшчыны і з блізкага наваколля, але і з «усяго свету» (за 50—70 км і нават з-пад Кіева), як сцвярджалі дзяды (тысячы людзей «покатам спалі на саломе ў кожнай хаце па 20—30 чалавек»). Прыцягваў не толькі святочны царкоўны малебен і «ярмалак». Дабіраліся сюды, каб пакланіцца слыннай праваслаўнай святыні, якая была тут — «чэснаму крыжу». Гэты вырублены з каменя крыж (падобны па значнасці крыж быў толькі ў Петрыкаве) знаходзіўся тут, відаць, з часоў першахрысціцеляў Тураўшчыны. Паводле падання, ён прыплыў сюды па Прыпяці знізу супраць цячэння «сваім ходам» і «ўзнёсся» на ўзвышаную мясціну над Прыпяццю. Яго некалькі разоў пераносілі ў вёску, да царквы, але за ноч ён «сам вяртаўся назад». На гэтай мясціне пабудавалі каплічку, у якой крыж захоўваўся да нашых часоў.

Легенды, якія авяваюць гэты крыж, яго «нежаданне» злучыцца з царквой, нарэшце, выбар свайго месца «ўзнясення» наводзіць на роздум, што ўсё гэта з'яўляецца адлюстраваннем таго, што было вельмі важным і святым для насельніцтва яшчэ да хрышчэння. Сустракаўся ў Пагосце мясцовы люд з бліжэйшага наваколля з наезджым з «усяго свету» народам, напэўна, па вельмі даўняй традыцыі. Ці не з'яўляўся гэты кірмаш непасрэдным працягам штогадовых асенніх святаў ураджаю ў цэнтры Палесся (асенняга «менавішча») яшчэ з язычніцкага мінулага? Святаў з гасцямі-купцамі з да-

лёкіх краёў, з купляй-продажам рамесніцкіх вырабаў і гародніны, вясёлымі ігрышчамі?

Не проста і немагчыма выразна ўявіць сабе зараз, як выглядаў Тураўскі «пагост» у тыя далёкія часы, якое меў значэнне. Магчыма, ён быў толькі «месцам гасцявання» ці «галоўным пасяленнем» у гэтым кутку Палесся? Як выглядала Прыпяць, якім быў Тур, куды і як вяла гэтая важная некалі водная дарога? Магчыма таксама, што рукаў Прыпяці Струмень, што падмывае зараз Тураў, і ёсць частка былой рэчкі Тур...

Першапачатковы і раннефеадальны Тураў — не зусім тое, што мы цяпер уяўляем. Гэта было адзінства, пэўны комплекс жыллёвых, гаспадарчых, абарончых, абрадавых і іншых збудаванняў тагачасных насельнікаў лепшага кутка Палесся, аднаго з найбольш старажытных аазісаў на ўсходнеславянскіх землях. І старажытная пратока Тур мела асаблівае значэнне ў фарміраванні і падтрыманні гэтага адзінства, была адкрытымі і зручнымі «варотамі» ў яго і з яго і галоўнай воднай дарогай. Тур стаў асновай яго найменння ці, дакладней, азначэння (асабовая назва Тураў з'яўляецца па сваёй граматычнай прыродзе прыметнікам). Зразумела, гэта быў не горад на дзесяткі кіламетраў «ад Прыпяці да Сцвігі», як сцвярджаецца ў легендзе пра старажытны Тураў (ці Хіль-горад) з палацамі, дзесяткамі храмаў, шумнымі вуліцамі і г. д. Аднак гэта легенда — досыць верагоднае адлюстраванне першапачатковай тапаграфіі Турава як адзінага гаспадарчага комплексу паселішчаў. Тое, што выступае зараз як звычайныя ўласныя назвы найбольш старых вёсак на Тураўшчыне, зусім выразна сведчыць, што першапачаткова гэта былі назвы састаўных частак Турава паводле іх прызначэння. Так, в. Дварэц — у мінулым звычайная назва гаспадарчай часткі двара князя, в. Заяцелле — частка яе двара за Яцелем (Яцель — даліна з водным шляхам каля Тураўскага замчышча), в. Пагост — месца, дзе князь або яго чаляднікі збіралі з мясцовага люду і «гасцей» даніну. Усё гэта — Тураў, яго састаўныя часткі..

А. А. Крывіцкі, М. А. Саскевіч

Кірыла Тураўскі

Надзвычай прыцягальнай асобай ў гісторыі культуры Беларусі з'яўляецца Кірыла Тураўскі, чалавек вельмі высокай адукаванасці, епіскап Тураўскі, аўтар многіх прамоў (слоў), павучанняў і малітваў, выдатны паэт, філосаф і прапаведнік. Яго дзейнасць і творчасць з'явіліся вяршыняй культурнага жыцця Тураўскага княства.

Тураў быў адным з найстаражытнейшых цэнтраў пісьменства і летапісання. Паводле звестак з гістарычнай літаратуры (Иконников В. С. Опыт русской историографии. Киев, 1908, т. 2), у Тураве ў час епіскапства Кірылы і яго пераемніка Лаўрэнція пры епіскапскай кафедры і саборным храме вяліся летапісныя запісы. Частка гэтых запісаў увайшла ў Кіеўскі і Галіцка-Валынскі летапісы. У Тураве ствараліся таксама арыгінальныя жыццяпісы. Тут было заснавана адно з першых епіскапстваў Старажытнай Русі (каля 1169 г.). Кірыла стаў трэцім епіскапам горада. Вядома, што жонка Святаполка Ізяславіча Варвара заснавала ў Тураве Варварынскі манастыр; паданне аб Мартыне расказвае аб існаванні ў XII ст. ў Тураве мужчынскага манастыра. Пры археалагічных даследаваннях у 1963 г. у горадзе выяўлены храм XII ст. Блізкі

лёкіх краёў, з купляй-продажам рамесніцкіх вырабаў і гародніны, вясёлымі ігрышчамі?

Не проста і немагчыма выразна ўявіць сабе зараз, як выглядаў Тураўскі «пагост» у тыя далёкія часы, якое меў значэнне. Магчыма, ён быў толькі «месцам гасцявання» ці «галоўным пасяленнем» у гэтым кутку Палесся? Як выглядала Прыпяць, якім быў Тур, куды і як вяла гэтая важная некалі водная дарога? Магчыма таксама, што рукаў Прыпяці Струмень, што падмывае зараз Тураў, і ёсць частка былой рэчкі Тур...

Першапачатковы і раннефеадальны Тураў — не зусім тое, што мы цяпер уяўляем. Гэта было адзінства, пэўны комплекс жыллёвых, гаспадарчых, абарончых, абрадавых і іншых збудаванняў тагачасных насельнікаў лепшага кутка Палесся, аднаго з найбольш старажытных аазісаў на ўсходнеславянскіх землях. І старажытная пратока Тур мела асаблівае значэнне ў фарміраванні і падтрыманні гэтага адзінства, была адкрытымі і зручнымі «варотамі» ў яго і з яго і галоўнай воднай дарогай. Тур стаў асновай яго найменння ці, дакладней, азначэння (асабовая назва Тураў з'яўляецца па сваёй граматычнай прыродзе прыметнікам). Зразумела, гэта быў не горад на дзесяткі кіламетраў «ад Прыпяці да Сцвігі», як сцвярджаецца ў легендзе пра старажытны Тураў (ці Хіль-горад) з палацамі, дзесяткамі храмаў, шумнымі вуліцамі і г. д. Аднак гэта легенда — досыць верагоднае адлюстраванне першапачатковай тапаграфіі Турава як адзінага гаспадарчага комплексу паселішчаў. Тое, што выступае зараз як звычайныя ўласныя назвы найбольш старых вёсак на Тураўшчыне, зусім выразна сведчыць, што першапачаткова гэта былі назвы састаўных частак Турава паводле іх прызначэння. Так, в. Дварэц — у мінулым звычайная назва гаспадарчай часткі двара князя, в. Заяцелле — частка яе двара за Яцелем (Яцель — даліна з водным шляхам каля Тураўскага замчышча), в. Пагост — месца, дзе князь або яго чаляднікі збіралі з мясцовага люду і «гасцей» даніну. Усё гэта — Тураў, яго састаўныя часткі..

А. А. Крывіцкі, М. А. Саскевіч

Кірыла Тураўскі

Надзвычай прыцягальнай асобай ў гісторыі культуры Беларусі з'яўляецца Кірыла Тураўскі, чалавек вельмі высокай адукаванасці, епіскап Тураўскі, аўтар многіх прамоў (слоў), павучанняў і малітваў, выдатны паэт, філосаф і прапаведнік. Яго дзейнасць і творчасць з'явіліся вяршыняй культурнага жыцця Тураўскага княства.

Тураў быў адным з найстаражытнейшых цэнтраў пісьменства і летапісання. Паводле звестак з гістарычнай літаратуры (Иконников В. С. Опыт русской историографии. Киев, 1908, т. 2), у Тураве ў час епіскапства Кірылы і яго пераемніка Лаўрэнція пры епіскапскай кафедры і саборным храме вяліся летапісныя запісы. Частка гэтых запісаў увайшла ў Кіеўскі і Галіцка-Валынскі летапісы. У Тураве ствараліся таксама арыгінальныя жыццяпісы. Тут было заснавана адно з першых епіскапстваў Старажытнай Русі (каля 1169 г.). Кірыла стаў трэцім епіскапам горада. Вядома, што жонка Святаполка Ізяславіча Варвара заснавала ў Тураве Варварынскі манастыр; паданне аб Мартыне расказвае аб існаванні ў XII ст. ў Тураве мужчынскага манастыра. Пры археалагічных даследаваннях у 1963 г. у горадзе выяўлены храм XII ст. Блізкі



Кірыла Тураўскі

па архітэктуры да сабораў Кіева і Уладзіміра Тураўскі храм пачаў будавацца ў другой палавіне XII ст., відаць, у час епіскапства Кірылы і аднаўлення на тураўскім троне Юрыем Яраславічам дынастыі Ізяславічаў.

Кірыла нарадзіўся ў Тураве ў 1130 г. у сям'і заможных бацькоў, меў магчымасць атрымаць добрую адукацыю. Яго настаўнікам быў, відаць, грэк, які навучыў Кірылу і грэчаскай мове. Асветнік карыстаўся некаторымі грэчаскімі творамі, напрыклад Феафілакта Балгарскага, у арыгінале. Адукацыя і асвета Кірылы былі духоўныя. Ён рос, вучыўся і жыў у Тураве, тут праявіў свой талент. У гэты час на тураўскай кафедры ўстанавілася пераемнасць епіскапаў, якая садзейнічала ажыўленню хрысціянскай асветы ў горадзе, цэнтрам якой, верагодна, стаў епіскапскі манастыр. Паводле падання, любоў да асветы і непрыняцце тленнай славы і багацця мірскога жыцця прывялі яго, сына заможных бацькоў, у манастыр. Гэта быў, відаць, багаты кнігамі Барысаглебскі епіскапскі манастыр, дзе Кірыла прыняў пастрыг.

Аскетычнае жыццё яго ў манастыры суправаджалася пастаянным чытаннем кніг. Затым Кірыла рашаецца на новы крок. Ён замуроўваецца ў вежу (стоўп), дзе праводзіць час у малітвах, пастах, чытанні кніг і напісанні твораў. У Старажытнай Русі да Кірылы Тураўскага прыкладаў стоўпніцтва не было. Праўда, была распаўсюджана такая форма падзвіжніцтва, як затворніцтва ў пячору. Подзвіг стоўпніцтва праслаўлены на ўсходзе двума сірыйскімі падзвіжнікамі — Сімяонам Стоўпнікам (459 г.) і Сімяонам Дзіўнагорцам (596 г.).

Стоўп Кірылы Тураўскага быў невялікай слупападобнай вежай. Ён не быў такім адкрытым, як стоўп сірыйскіх падзвіжнікаў, і не такім цёмным, як падземная пячора з ледзь бачным акенцам у кіеўскіх манахаў. У сваё новае жыллё Кірыла перанёс і любімыя кнігі. Ад чытання ён пераходзіў да напісання твораў. Незакрыты ад святла стоўп даваў магчымасць яму назіраць людское жыццё. Такая абстаноўка зрабіла пэўны адбітак на характары яго твораў. Уладзімір Караткевіч пісаў пра Кірылу Тураўскага: «Юнак, які ідзе ў манахі, жыццялюб (успомніце ягоныя радкі), які ідзе ў аскеты аж да таго, што замуроўваецца ў вежы. Паэт, які збіраецца ў біскупы і ўсю сілу свайго красамоўства аддае «казанням» (павучанням) і «словам»... І стаў гэты паэт «Златавустам», пачаў вялікае наша Пісьменства, уславіў свой горад, які да дня яго нараджэння быў ужо сто пяцьдзесят год, як упершыню адзначаны ў ле-

тапісе, а значыць, існаваў задоўга да таго...»

Кірыла не мог свяціць толькі ў пустэльніцтве. Ён быў вядомы ў Тураве яшчэ і да манастыра. Паступленне яго ў манастыр стала падзеяй для ўсяго Турава і ваколіц. Жыццё ў стаўпе павялічыла агульную цікавасць да асобы пустэльніка. Без сумнення, тураўцы хадзілі да стаўпа Кірылы, як кіяўляне да пячэры Антонія. У час Кірылы па агульным звычаі на Русі князь і народ епархіяльнага горада выбіралі епархіяльнага епіскапа. Такія выбары асабліва праводзіліся ў горадзе з самастойным княствам. А Тураў быў такім горадам з 1162 г., г. зн. з часу Юрыя Яраславіча. Кірыла прыняў епіскапскі сан у 1169 г., што служыла ўзвышэнню князя і наогул горада.

Пачатак епіскапскай дзейнасці Кірылы знамянальны яго ўдзелам у справе Феадорца (1169 г.). Феадор, або Феадорац, па адных звестках, быў рускі, пляменнік кіеўскага баярына Пятра Барыславіча, па іншых — грэк, пляменнік смаленскага епіскапа Мануіла. Трапіўшы ў давер да ўладзіміра-суздальскага князя Андрэя Багалюбскага, ён хацеў дасягнуць пры ім вышэйшай іерархічнай пасады, заснаваць ва Уладзіміры новую кафедру, незалежную ад кіеўскай мітраполіі. Заняўшы праз некаторы час суздальскую, уладзімірскую і растоўскую кафедры і не прызнаючы над сабою ўлады кіеўскага мітрапаліта, Феадор утварыў раскол у адзінай да таго часу мітраполіі. У 1168 ці 1169 г. войскі Андрэя Багалюбскага нібыта па натхненні Феадора ўзялі прыступам Кіеў і тры дні рабавалі яго. У самім Уладзіміры праціўнікі задумы Феадора былі жорстка пакараны. Урэшце князь, не сцярпеўшы ўчынкаў Феадора, адправіў яго на суд да мітрапаліта Канстанціна. Феадор быў спачатку асланы, а пасля пазбаўлены жыцця. Кірыла Тураўскі ў сваіх творах ганьбіў раскольніка, ён шмат разоў пісаў звароты да Андрэя Багалюбскага, каб утаймаваць Феадорца.

Тураўскі свяціцель пакінуў нам несумненны помнік прамоўніцкага майстэрства. У прамовах Кірыла выступае не простым самавукам, а адукаваным майстрам. Тым самым ён зноў вылучаецца сярод папярэднікаў, сучаснікаў і паслядоўнікаў (за выключэннем Іларыёна).

Тураўскі мысліцель любіў засяродзіцца ў самім сабе, у сваіх кнігах, доследах, сузіраннях. З гэтымі сузіраннямі з'яўляецца ён перад народам у сваіх прамовах. Ён добра ведаў духоўныя кнігі, з якіх браў думкі і цэлыя месцы для сваіх прамоў. У яго тлумачэннях дамінуе прыём алегорыі, даведзены да вытанчанасці. Прамоўца не столькі раскрывае гістарычны змест ці сэнс падзеі, колькі праслаўляе яе як лірык і панегірыст. З гэтай рысай прамоўніцтва Кірылы Тураўскага цесна звязана маляўнічасць асобных месц у яго творах. Бліскуча выпісаны з'явы прыроды: «Сегодня весна красуется, оживляя земное естество; бурные ветры, тихо повевающие, содействуют росту плодов, и земля, питающая семена, зеленую траву рождает» (Антология мировой философии, т. I. М. 1969).

Паводле звестак, якія падае епіскап Яўген у «Твореніях святого отца нашего Кирилла епископа Туровского» (Кіеў, 1880), Кірыла Тураўскі пакінуў епіскапства не пазней 1182 г. і жыў пасля гэтага нядоўга. Пакінуць яго, верагодна, прымусіла любоў да кніжных заняткаў і засяроджанага жыцця. Акрамя прамоў Кірылы яшчэ вядомы яго павучанні, якія характарызуюць аўтара як засяроджанага, паглыбленага ва ўнутраны свет мысліцеля.

Значную частку напісаных Кірылам твораў складаюць малітвы і каноны. Жывая і малітоўная творчасць пачалася ў Старажытнай Русі з са-

мага пачатку хрысціянства. У Тураве была царква Св. Міколы, верагодна, манастырская, пры якой Кірыла дажываў свае апошнія гады. Год яго смерці дакладна не ўстаноўлены, дзень смерці — 28 красавіка, які лічыцца днём яго памяці ў Пралогу XVI ст. Мошчы Кірылы Тураўскага, па мясцовым паданні, знаходзіліся на могілках Барысаглебскага епіскапскага манастыра.

Памяць аб Кірыле пачалі шанаваць адразу пасля яго смерці і хутка яго кананізавалі. А ўжо ў XIII ст. шанаванне Св. Кірылы распаўсюдзілася далей Тураўскай зямлі.

Творы Кірылы Тураўскага з'яўляюцца ў беларускім друку XVI—XVIII ст. Яго малітвы тройчы змешчаны ў старажытным малітваслове, які друкаваўся ў Вільні (1596, 1602 і 1635 гг.). Малітваслоў меў загаловак: «Молитвы повседневные з многихъ св. отець церкви Христова учителей и письма греческого вь кратць избраны». Адно «слова» Кірылы ўключана ў «Евангелие толковое» Кузьмы Мамоніча (Вільня, 1595). Некалькі прамоў ўвайшлі ў супрасельскі «Златоуст» (1797).

Найбольш вядомая частка літаратурнай спадчыны Кірылы Тураўскага — прамовы, якія належаць да разраду ўрачыстага красамоўства. З'яўленне ў XII ст. цыкла гэтых прамоў было вялікай падзеяй у гісторыі прамоўніцкай прозы Старажытнай Русі. Адны «словы» паэта — «в неделю цветоносную» і на «Вознесение» — напісаны на двунадзесятыя святы, усе астатнія — на нядзельныя дні першага круга нядзель царкоўнага года, ад Вялікадня і да Пяцідзесятніцы. Мяркуецца, што ўвесь цыкл быў напісаны, верагодна, у 60-я гады XII ст. «Словы» Кірылы мелі асаблівы характар або пісаліся адпаведна царкоўнаму ўставу. Яны прызначаліся для вымаўлення ў храме ва ўрачыстай абстаноўцы святочнага богаслужэння. Змест іх традыцыйны, як традыцыйнае і само свята. У кожным «слове» паслядоўна развіваюцца адны і тыя ж тэмы: ухваленне свята, тлумачэнне яго рэлігійнага сэнсу, успаміны аб падзеі, у гонар якой устаноўлена свята.

У сціслых рамках зададзенага зместу тураўскі святіцель здолеў напісаць такія выдатныя творы, якія надоўга прыцягнулі да сябе ўвагу старажытнарускага чалавека. Кожны радок прамоў паэта стварае атмасферу незвычайнай па ўздыме святочнай урачыстасці, падымае дух чалавека на вышэйшую ступень. Паводле даследчыка І. П. Яроміна, «словы» Кірылы Тураўскага — творы рытарычнага мастацтва, надзвычай складанага і тонкага, карані якога ідуць да святочных «дэкламацый» антычных сафістаў Пратагора, Горгія. Шырока выкарыстоўваючы алегорыі, Кірыла стварае іх пачуццём, радасна ўсхваляваным у святочнай абстаноўцы і больш адпавядаючым яго паэтычнай, чым багаслоўскай, сутнасці.

У старажытнарускай літаратуры XII ст. існавалі летапісны і агіяграфічны жанры апавядання. «Словы» Кірылы Тураўскага ўвялі ў літаратуру той эпохі яшчэ адзін тып апавядання — рытарычны. У літаратурную спадчыну Кірылы Тураўскага ўваходзяць таксама павучанні. Прамовы Кірылы напісаны ў адным з найстаражытнейшых жанраў хрысціянскай літаратуры. Бліскучага росквіту гэты жанр дасягнуў у такіх майстроў прамоўніцкага майстэрства, як Іван Златавуст, Рыгор Разіянзін, Епіфаній Кіпрскі. Даследчыкамі ўстаноўлена, што Кірыла Тураўскі ўважліва вывучаў іх творы не толькі ў перакладзе, але і ў арыгінале. Творы класікаў прамоўніцкай прозы былі для Кірылы крыніцай натхнення. Узятае ў сваіх папярэднікаў выдатны майстар перапрацоўваў і падпарадкоўваў сваёй задуме.

Даследчыкі адзначаюць уклад Кірылы Тураўскага як прамоўцы ў распрацоўку літаратурнай мовы Старажытнай Русі. Славянская мова аўтара здолела адлюстраваць усё: і маляўнічыя, рэльефна выпісаныя з'явы прыроды, і нязменна ўсхваляваны ў пэўныя моманты настрой прамоўцы, і турботную лірыку плачу Божай маці, і павучальны характар «казанняў» Кірылы Тураўскага.

Тагачасныя падзеі рэчаіснасці знайшлі водгук у павучаннях Кірылы. Так, размова аб душы і целе — памфлет супраць дзеянняў Феадорца, епіскапа Растоўскага, і, магчыма, князя Андрэя Багалюбскага. А ў «Слове о сьнятии тела Христова с креста, и о мироносицах» аўтар выступае як патрыёт свайго горада: «...буди покрьв граду нашему от всякого зла, подавая князю на противныя победу и заступая его от всех видимых и невидимых враг...».

Аповесць аб душы і целе (сляпым і кульгавым) была напісана ў 60-я гады XII ст., не раней 1160—1162 і не пазней 1169 г. У аснову аповесці ўзяты шырока вядомы і папулярны ў сусветнай літаратуры аналог пра сляпога і кульгавага. У пераказе Кірылы Тураўскага гэты аналог, па меркаванні Івана Франка, найбліжэй да версіі з Вавілонскага Талмуда; размова імператара Антаніна з рабінам (І. Франко. Притча про сліпця и хромця. Статья по славяноведению, 1906).

Аповесць аб бестурботным цару і яго мудрым дарадчыку нагадвае аповесць аб душы і целе. Гэта паданне таксама ўсходняга паходжання, паводле акадэміка Сухамлінава, сюжэт яго ўзяты Кірылам Тураўскім у лёгкай перапрацоўцы з рамана пра Верлаама і Іасафа. Пры перакладзе аповесці Кірыла, як гэта яму ўласціва, карыстаецца алегорыямі. У аповесці Кірылы дарадчык вядзе цара на вялікую гару да пячоры з мноствам «оружиа». Гэтым «оружиа» з'яўляюцца дабрачыннасці. Імі валодае чалавек, апрануты ў рыззё, якому Хрыстос у вобразе прыгожага маладога хлапца падносіць кубак з віном — выказвае пашану. Акцэнт аўтар робіць на наступным: чалавек у жыццёвых «помыслах» павінен мець «духовнаа оружиа». Паводле Кірылы, «...духовнаа оружиа на противнаго дьявола си суть: пост, молитва, слёзы, въздержание, чистота, любы, смеренье, покорение люботрудне и несьние». Дабрачыннасці ляжаць у аснове ўчынкаў, па якіх мяркуюць аб чалавеку: «Не ризами светлыми буди славен, но делы добрыми».

У сваіх павучаннях пісьменнік неаднаразова выказвае думку аб неабходнасці ўзаемасувязі розуму чалавека і яго дабрачыннасцей. Розум павінен скіроўваць у бок добрых учынкаў. У сваю чаргу, дабрачынным можна быць толькі з дапамогай розуму. Па меркаванні Кірылы як філосафа, разумны пачатак дазваляе бачыць сапраўдную глыбіню свету і павінен вызначаць духоўную дзейнасць чалавека. «Сладко бо медвеный сот и добро сахар, абоего же добрее книгий розум: сия ибо суть скровища вечныя жизни»,— так гаворыць аўтар пра кнігу як крыніцу мудрасці. Разумны пачатак і пазнанне, лічыць філосаф, неабходны чалавеку і ў жыццёвых справах: «Аще бо мира сего властели и в житисных тружающиеся вещех человети прилежно требують книжнаго поучения...»

Светапогляд Кірылы Тураўскага наскрозь жыццясцвярджальны і аптымістычны. У яго творах часта ўжываюцца словы «веселие», «радость». Як творамі, так і ўсёй сваёй дзейнасцю прапаведнік ставіў мэту не толькі асабістага духоўнага ўдасканалення, але і ўздзеяння на іншых людзей для іх удасканалення — «ради ползы их».

Істотнымі ў творах Кірылы з'яў-

ляюцца і іншыя дэмакратычныя ідэі. «Богатьство, иже мимо течет,— не прилагайте сердца»,— вучыць ён. Адной з дабрачыннасцей з'яўляецца «нищелюбие». Аб «спасени крестиан», «спасени душ наших писаных» не раз гаворыць аўтар. Прытым гаворыць на аптымістычнай ноце. Бадай самы светлы, мажорны матыў гучыць у яго «Слове по Пасце», дзе столькі радасна-ўсхваляванага пачуцця: «Ныня ратаи слова словесныя уньца к духовному ярму приводяще, крестное рало в мысьленых браздах погружающе, и бразду покаяния прочертающе, семя духовное всыпающе, надежами будущих благ веселяться».

У сваіх творах Кірыла, апрача алегорый, якімі карыстаецца часта для большай нагляднасці думкі, часам робіць адступленні ў сэнсе прамых выказванняў і парад: «Не спасет бо ся рече, царь многогою силою, и всяка власть к греху причтена есть».

Некаторы песімістычны настрой адчуваецца ў гімнаграфічных творах Кірылы Тураўскага. Простыя па форме яго малітвы і каноны нагадваюць споведзь. Яны прасякнуты глыбокімі пачуццямі і думкамі аб чалавеку. Паэт вядзе жывую, сардэчную, прачулую размову з прабліскамі сапраўднага лірызму. Аналіз унутранага свету чалавека перадаецца псіхалагічнымі назіраннямі: «как предстану пред лицом твоим», «как измерю я теперь свае падение», трапнымі параўнаннямі: «...да не буду я, как одежда, источенная молью, как железо, снедаемое ржавчиной».

Літаратурную сваю задачу Кірыла вызначыў наступнымі словамі: «прославити», «воспети», «возвеличити», «украити славесы», «похвалити». Ён прама пісаў пра задачу мастацтва як форму праслаўлення. У «Слове на седьмую неделю по Пасце» Кірыла Тураўскі пісаў: «Историцы и ветеа, рекше летописци и песнотворци, прикланяють своа слухы и бывшая между царей рати и ополченіа, да украсять словесы слцшацкая и вьзвеличать крепко храбровавшая и мужествовавшая по своей цари, и не давших в брани клещи врагомь, и тех славяще похвалами венчаеть».

Мастацка-вобразныя сродкі і рытміка-сінтаксічныя канструкцыі, сіла пафасу і лірызму паэта «з божай ласки» Кірылы Тураўскага часта не ўступалі сіле паэтычнасці бессмяротнага «Слова аб палку Ігаравым».

Літаратурная дзейнасць Кірылы Тураўскага аказала істотны ўплыў

МОЛИТВЫ
НАВСЮСЕДМИЦУ.
ТВорінїє Сто Оц̃а
Наше Кѵрїла ннока
Молитва Внеделю
По оутрнн.
Слава тебѣ гн
бже мой, ако
сподобилъмѧ
есн видѣтн
день преславнаго въ
скрсенїи твое. въй
же свободнесн сѵщїѧ
въ адѣ, свѧзаныѧ

на культурныя традыцыі Беларусі. У свой час заснавальнік беларусазнаўства, акадэмік Я. Ф. Карскі паказаў культурна-гістарычную пераемнасць сярэдневяковай Беларусі і Старажытнай Русі. Выдатны беларускі паэт і глыбокі крытык Максім Багдановіч называў старажытнарускую, перыяду Кіеўскай Русі, культуру мацярынскай і пісаў, што «беларускі народ, цалкам увайшоўшы ў Літоўскае гасударства, развіваўся, як і раней, на старым карані, вытвараючы такім парадкам культуру, незалежную ад культуры вялікарускай і з самага ж пачатку адразняўшуюся ад яе» (Максім Багдановіч. Збор твораў, т. 2, Мінск, 1968).

Культурная дзейнасць беларускіх асветнікаў XVI і XVII стст. Францыска Скарыны, Васіля Цяпінскага, Афанасія Філіповіча, Сімяона Полацкага прадаўжала лінію духоўнай традыцыі Кірылы Тураўскага і іншых мысліцеляў Старажытнай Русі. Традыцыі прамоўніцкага майстэрства Кірылы Тураўскага ўспрыняў паэт-сілабіст Сімяон Полацкі. У яго трактоўцы, напрыклад, вясна з'яўляецца сімвалам адраджэння часовай прыгажосці прыроды, а свята Вялікадня — гэта адраджэнне ісціны, праўды і вечнай духоўнай прыгажосці.

Кірыла Тураўскі стаіць каля вытокаў нашага пісьменства і старажытнай культуры. Яго творы не страцілі актуальнасці і ў наш час. Яны выйшлі за межы вузкай прафесійнай з'явы і дасягнулі ўзроўню агульначалавечых культурных каштоўнасцей. Гэта — узор сапраўднай літаратурнай творчасці і глыбокай філасофскай думкі. Актуальнымі з'яўляюцца адказныя і беражлівыя адносіны ў іх да мовы і літаратурнага слова. Святіцель Кірыла Тураўскі — прыклад высокай духоўнасці, светач нашай культуры.

Рускай праваслаўнай царквой у 1984 г. установлена Святкаванне Сабора Беларускіх святых у дзень памяці ўсіх святых, «в земле Белорусской просиявших». Сярод Беларускіх святых — Кірыла Тураўскі. Да 1000-годдзя хрышчэння Русі ў 1987 г. былі выдадзены дзве пласцінкі «Пахвала Белорусским святым», куды ўключаны і «Тропарь святителю Кириллу Туровскому».

В. І. Мікута

КІРЫЛА ТУРАЎСКІ

Зіма ў той год лютавала,
Мяцеліца глуха мяла,
Грахоўныя думы шаптала,
Грахоўныя сеці пляла.
А сцюжы,
Траскучыя сцюжы,
Ліхія памочнікі зла,
Да дна вымарожвалі душы
Ад ласкі,
Дабра і цяпла.
Марозы пахаджвалі з ляскам,
І людзі ў княстве лясным
Чакалі жаданае Пасхі,
Чакалі жаданай вясны,
Нарэшце яе дачакалі,
Сустрэлі,
Затым правялі,
Паціху душой адтавалі,
З надзеяй галовы ўзнялі.
Усмешка панурасць змяніла,
У позірках любасць гасціць,
«Напэўна,
Пара наступіла
І божае ў душы пусціць.
А што называецца божым?
Даруй мяне,
Праведны Бог.
Усё, што разумна,
Прыгожа —
І праца,
І спеў,
І любоў.
Што з радасцю кожны
прымае,
Што ў неба ўзносіць без
крыл».—
Так ціха ўслых разважае
З сабою ўладыка Кірыл...
І вось урачыста і густа
Званы раскалыхваюць раць,
На пропаведзь да Златавуста
У царкву запрашаюць міран.
І словы яго акрылялі
Чуллівыя душы славян.
І словы яго паўтаралі
Не раз на крывавых палях:
«О, Божа,
Ад роднага краю

Ліхую бяду адвядзі!
Пазбаў мяне вечнага раю,
А толькі з нябёсаў сыдзі,
Сыдзі,
Нашым весям і градам
Навекі спакой прынясі,
Спасі іх ад хлада і глада,
Ад мора і сечы спасі...»
Не раз і не два паўтаралі
Так словы з малітвы тае,
У Айчыне сябе растваралі
І долю прымалі яе.
Назаўтра за гэтую долю
Бязлітасны бой павядуць.
І мо на крывавае поле
Галовы свае пакладуць.

Мікола Янчанка

Из молитв Кириллы Туровского

«Молитва в понедельник после утрени»

...Вспоминая минувшее время жизни моей, сознаю себя преступником, ибо разумею, что более чем кто-либо другой сотворил дел злых и не должных и Богу неугодных: — и боюсь, как бы огонь, спадший с неба, не сжег меня и преисподняя пропасть не поглотила бы меня живого. Но зная долготерпение и пучину человеколюбия Божия, я не отчаиваюсь, ибо Бог не наводит казни на достойного мук, но ожидает моего покаяния.

Я дивлюсь сам на себя, до какой степени расхищен я плотскими похотями и пребываю в делах, которые я ненавижу,— и мысля, что не следует, как бы руками раззоряю благодать Божию, ожидающую моего обращения.

...Ибо я знаю свое естество тленное и скоро гибнущее: быть может, я не доживу до вечера и порадуется враг мой обо мне, говоря: «человек суете уподобился и дни его прошли как тень».

«Молитва в четверт после вечерни»

...Не дай бесу порадоваться надо мною, ибо Ты знаешь удобопреклонную ко греху природу человеческую, но какими знаешь судьбами спаси меня. Ибо во мне нет ни одного нравственного качества, служащего к моему спасению, но весь я нищ, весь убог без Твоёй помощи, раздражителен по природе и свиреп естеством, похотлив ко греху, имею злую волю, помню зло, забываю добро. Я — клятвопреступник, обидчик больше всех, скор на брань и медлителен на примирение, ревностен ко блуду и ленив к молитве, люблю изобильное естие и питие и ненасыщен по причине своего немилосердия, все доброе я отверг от себя и все неподобающее



Пачатковая старонка «слова» Кірылы Тураўскага «Вознесение Господне»

вселилось в меня. Но Ты, Господи, без заслуги милующий человеческий род, без заслуги спаси меня.

«Молитва в пятницу после утрени»

...От рождения моего и доныне я совершил все злое и даже ни на один день не показал истинного покаяния. Если я час каюсь, то год беззаконствую...

Я далеко отошел от Твоего божественного дому, добровольно поработился бесу похоти и, оставив ангельское брашно, пресытился беззаконными яствами,— предпочел питаться свинскими желудями временных сластей. Я изведал оскомину греховного вкушения, которое на малое время услаждает, а на веки мучению предает; я тяжко изнемогаю от мысленного голода, но и доселе не обратился как некогда блудный сын: не приобрел я ни мытарева покаяния ... ни слез блудницы ... ни исповедания разбойника.

...Ибо вся правда человеческая, как полотно из паутины, легко раздираемое и уничтожаемое.

Слово Кирила недостойного мниха по пасце, похваление въскресения...

...Ныне солнце, красуяся, к высоте въсходить, и, радуяся, землю огреваеть,— взиде бо нам от гроба праведное солнце Христос и вся верующая ему спасаеть. Ныне луна, с вышняго съступившие степени, большему светилу честь подаваеть... Ныне зима греховная покаяниемь престала есть и лед неверия богоразумемь растаяся... Днесь весна красуеться оживляющи земное естьство, и бурьянии ветри тихо повевающе плоды гобьзують, и земля семена питающи зеленую траву ражаеть. Весна убо красная есть вера Христова, яже крещениемь поражаеть человеческое пани естьство, бурнии же ветри — грехотворнии помыслы, иже покаяниемь претворьшеся на добродетель душенополезныя плоды гобьзують... Ныне новоражаеми агньци и уньци, быстро путь перуще, скачють и скоро к матерям възвращающеся веселяться, да и пастыри свиряюще веселиемь Христа хвалять... Ныне древа леторасли испущають, и цветы благоухания процвитають... Ныне реки апостолския наводняються, и язычныя рыбы плод пущають, и рыбари глубину божия въчеловечения испытавше, полну церковную мрежно ловитвы обретають... Ныне мнишьского образа трудолюбивая бчела свою мудрость показающи вся удивляеть; яко же бо они в пустынях самокормиемь живуще аньгелы и человеки удивляють, и си на цветы възлетающи медвены сты стваряють, да человеком сладость и церкви потребная подасть. Ныне вся доброгласныя птица церковных ликов гнездящеся веселяться...

Еремин И. П. «Литературное наследие Кирилла Туровского».— Труды отдела древнерусской литературы. М.— Л., 1955, т. XI, т. XII; М.— Л., 1956, т. XIII, т. XV.

Епископ Минский и Туровский. «Творения святого отца нашего Кирилла Туровского». Киев, 1888.

Слова святога Кірылы Тураўскага аб кніжным чытанні і навуцы

Паслухайце, братове, і ўразумейце, дзеці, як належыць вам вераваць у адзінага Бога, у Тройцы існага,— у Бацьку і Сына і Духа Святога,— і спадзявацца на яго аднаго, і павучацца, схіліўшыся да святых кніг — Евангелля, Апостала, Парамійніка, Псалтыра і іншых, а да адрочаных кніг не звяртацца ніколі. Адрочаныя ж: астраномія і Заралік, Соннік, Зёльнік, Чароўнік, Птушыныя Чары, Громнік, Каляднік і Жэрабнік. Бо прароцтвы ілжывыя ў іх, на святых паклёпы ўводзяцца. Кнігамі гэтымі д'яблаў прывабліваюць і гутараць з імі. У параўнанні са святымі кнігамі гэтыя маняць і невукаў дураць. А ім падобныя кнігі... халдзейскія і элінскія байкі — таксама кашчунныя. А калі запытае яе вар'ят, чаму святыя трымалі гэтыя кнігі,— ты адказвай: святыя мелі розум добры і некрывадушны, дадзены ім ад Бога; чытаючы гэтыя кнігі, жылі не паводле вучэння іх, а па слову прарока і апосталаў. Ерэтыкі ж і святыя кнігі чыталі, але, не маючы добрага розуму ад Бога,— здрадзілі і сталі адступнікамі Божымі, і ўсмярдзела душа іх ад гэтага смуроду, зруйнаваўся прастол, на якім спачываў іхні розум, і не стала месца яму, і ён ад іх збег, а ўсяліўся ў іх д'яблавы розум. І распладзілася ў ерэтыках вучэнне д'яблава, і пачалі зневажаць яны Бога, не разумеючы кніжных прыпавесцяў, не слухаючы разумных, не прымаючы правільнага вучэння і настаўнікаў ненавідзячы, якія навукай сваёй прыводзілі іх да вечнага жыцця (а той, хто не слухае і не скараецца,— ідзе да вечнай пакуты). Яшчэ раней Павел-апостал наказваў аддаць непакорлівых і непаслухмяных

д'яблу на катаванне. А святыя бацькі, не здолеўшы розум вар'яцкі і непакорны гэтых ерэтыкаў наставіць вучэнню кніжнаму,— не аддавалі іх сатане на пакуту, а праклінялі, бо ведалі, што той іх не пакарае, а чакае іх вечная мука, калі будуць скаваны яны разам з д'яблам, настаўнікам іх, бо ён — непакорны настаўнік для ўсіх непакорных. Так піша і Павел да святых, епіскапаў і святароў: «Калі хто спакусіцца невуцтвам кніжным, навучыце таго; калі ж не паслухае вас і не скарыцца пасля першага і другога пакарання — хай будзе пракляты!» Калі ж зараз многія марнасловы не скараюцца і пасля сотага — што станецца з тымі! Хіба не будуць яны разам з праклятымі?

Мы ж, братове, станем пакорлівыя і паслухмяныя, будзем выконваць Боскія наказы кніг святых, у мудрасць іх паглыбляючыся; не п'яным розумам, а цвярозым ушануем жыццё з усімі ўміронымі праведнікамі дзеля Хрыста Ісуса, Госпада нашага, Якому ўзносім хвалу.

Пераклад Аляксея Мельнікава

МАЛЕННЕ КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА

О, Божа,
Злітуйся над імі,
Дай памяць ім...
Успомняць хай
Імя забытае Радзімы,
Імя сваё
І родны край...
Дай памяць ім,
Што ўсё забылі...
О, Божа,
Злітуйся над імі...
Успышкай гнеўнай бліскавіцы
Ім шлях у цемры асвятлі.
Не дай жа ім зусім забыцца
На ўсё святое на зямлі.
Успышкай гнеўнай бліскавіцы
Ім шлях да праўды асвятлі...
О, Божа,
Злітуйся над імі,
Вярні ім памяць і любоў,
Вярні ім мову,
Каб нямымі
Не йшлі на споведзь,
Дзе грахоў
Адпушчана ім будзе многа...
Малю цябе
Пад небам строгім —
Вярні ім памяць і любоў...
О, Божа,
Літасцівым будзь.
Цяжкі да ачышчэння пуць...
Дай ім увесь прайсці яго,
Не помні зла ім і даўгоў.
Няхай свой крыж яны нясуць.
Цяжкі да ачышчэння пуць...
О, Божа,
Літасцівым будзь...
Прабач ім чэрствасць іману,
Прабач, о, Божа, іх віну,
Прабач цяжкія іх грахі.
Не дай жа ім спаліць страхі
Над новым днём сваёй Радзімы
У непрытомнасці сваёй...
Не дай ім захлынуцца ў дыме
І смагу наталіць слязой...
О, Божа,
Злітуйся над імі...

Міхась Башлакоў.
З паэмы «Лілея на цёмнай вадзе».

* * *

На думку нашчадкаў, святы КірылаТураўскі меў іканапіснае аблічча: «подобием надсед, власы с ушей, брада с Николину, но не курчевата, проста, ризы святительские, в оморфе, в руках книга»... Іканапісны партрэт вялікага старца нечым падобны да Льва Талстога ў яго познія гады. Гэтак жа, як і Леў Талстой, на зыходзе жыцця ён пісаў строга і проста, выразна і дакладна, незвычайна пранікнёна, з бясконцай павагай да чалавека і духоўнай любоўю да бога, з верай у людзей, іх спрадвечнае дабро і імкненне да адзінасці, і ў той жа час да прызнання сваёй асабістай нязначнасці і мізэрнасці ў сусвеце, адмаўлення адмысловай значнасці сваіх твораў, акрамя малітоўных вершаў...

...Тураў з'яўляўся адным з самых старажытных цэнтраў кнігапісання ўсходніх славян. Тут была шырока распаўсюджана пісьменнасць. Аб гэтым сведчаць знойдзеныя пры археалагічных раскопках «пісалы»



Кірыла Тураўскі (мастак Я. Г. Каробушкін)

(прыстасаванні для пісьма на бяросце), а таксама надпісы на бытавых рэчах. Захавалася дзесяць аркушаў Тураўскага евангелля, якое па палеаграфічных асаблівасцях адносіцца да XI ст. Яно было знойдзена ў 1865 г. Н. Сакаловым у царкве Спаса — Прэабражэння ў Тураве і ў тым жа годзе паступіла ў Віленскую публічную бібліятэку, дзе знаходзіцца і сёння. Гэтая знаходка сведчыць, што ў Тураве ўжо ў XI ст. вялася перапіска царкоўных кніг.

У XI ст. у Кіева-Пячэрскім манастыры Феадосій Пячэрскі ўводзіць Студзійскі Устаў, паводле якога бібліятэку павінен мець кожны манастыр. Гэта садзейнічала стварэнню кніжных цэнтраў у манастырах Старажытнай Русі.

Найбольш доказным наконт існавання кніжнага цэнтра ў Тураве з'яўляецца «Слова пра Марціна, мніха тураўскага». Тут упамінаецца епіскап тураўскі Георгій, які вызваліў Марціна ад службы кухара па старасці. Кірыла Тураўскі стаў епіскапам пасля Георгія. Праз некаторы час быў заснаваны Барыса-глебскі епіскапскі манастыр. Каб паказаць асаблівае заступніцтва святых пакутнікаў Барыса і Глеба, для Барысаглебскага манастыра было напісана «Слова пра Марціна, мніха тураўскага». У ім апавядаецца пра наведванне Барысам і Глебам хворага старца Марціна, які жыў адзін у келлі манастыра. Пасля сустрэчы са святымі Барысам і Глебам Марцін падняўся і стаў здаровы...

СЛОВО В ДЕНЬ ПАМЯТИ ПРЕПОДОБНОГО МАРТИНА ТУРОВСКОГО

...Жаждою любви и стремления ко Христу горело сердце нашего соотечественника святого праведного Мартина Туровского, память которого мы совершаем ежегодно 27 июня.

Он был простым поваром при епископах Туровских, известных святителях и просветителях земли Белорусской — Игнатии, Иоакиме, Симеоне и Георгие. Господь сподобил его видеть их святую жизнь, слышать их святые молитвы о спасении народа белорусского.

То благодатное воздействие, которое оказала жизнь святителей на душу своего верного слуги преподобного Мартина, явило свой благий плод: вся сокровенная в духе жизнь угодника была подвигом постоянного послушания воле Божией.

Будучи в преклонных летах, праведный старец не смог далее нести послушания по архиерейскому дому. Святитель Георгий, возблагодарив верного слугу за неизменное и ревностное служение, отпустил его с миром. Но старец не пожелал оставить обитель святых страстотерпцев Бориса и Глеба, где провел он столько лет под их благодатным молитвенным покровом.

В один из дней Великого поста Господь удостоил праведного старца принять ангельский чин и стать монахом сей святой обители. Не оставляя прежнего послушания при архиерейском доме, святой Мартин нес также и другие труды по обители. Однако силы иссякали, а подвиги были велики. Частые недуги все более и более беспокоили старца. Тяжелая болезнь приковала его к постели.

Однажды преподобный Мартин лежал недвижимым в своей келье и, не в силах сдержать все усиливающиеся боли в животе, слезно молился. Усердно призывая святых покровителей Бориса и Глеба, он вдруг увидел их воочию.

Вот как об этом чудесном посещении рассказывает святитель Кирилл, епископ Туровский: «На третий день вошли к нему святые мученики Борис и Глеб явно, в своем подобии, как написаны на иконе, и говорят: «Чем болеешь, старче?» Он же им рассказал о своем недуге. И говорят они: «Хочешь ли воды?» И отвечал старец: «О, господине, уже давно ее я желаю». И, взяв сосуд, один из них принес старцу воды.

Один из них затем возлил ее на старца. И говорит старец: «Чьи вы дети?» Отвечали они: «Ярославовы». И подумал старец: «Ярослава Георгиевича слуги,— и говорит,— Господь Бог сотворит вам многие годы, господине мой, возьмите соль и хлеб и ядите, я же не могу служити вам».

Они же отвечали: «Не беспокойся, старче, мы уже уходим, а ты больше не болей»... И стали невидимы... Старец стал к удивлению своему здравым и встал сам, прославляя Бога и святых мучеников».

Так Господь сподобил Своего угодника чудесного исцеления.

Оставшиеся годы своей жизни святой Мартин провел в постоянном служении благодарения Богу за Его великие и богатые милости, в несении подвига служения ближним своим, за что особенно его полюбили приходящие в обитель паломники, в усердных молитвах о народе нашем православном и о спасении всего Белорусского края.

Скончался Преподобный в 1150 г.

Минские Епархиальные ведомости, 1989 г., № 15.

ПРЕПОДОБНЫЙ ЛАВРЕНТИЙ, ЗАТВОРНИК ПЕЧЕРСКИЙ, ЕПИСКОП ТУРОВСКИЙ, СВЯТОЙ ЗЕМЛИ БЕЛОРУССКОЙ

После искушения, постигшего преподобных затворников Печерских Исаакия и Никиту, приобрел известность подвизавшийся в том же святом Печерском монастыре блаженный Лаврентий, который также возымел дерзновение, как добрый воин Христов, однеми собственными силами вести борьбу с противоборствующим душегубителем-диаволом, врагом подвижников. Он пожелал посвятить себя молитве в строгом затворе, утвердившись в той мысли, что именно о затворническом житии Господь говорит в словах: «Когда молишься, войди в комнату твою, затвори за собою дверь и помолись Отцу твоему, Который втайне, и Отец твой, видящий тайное воздаст тебе явно» (Мф. 6, 7). Но преподобные отцы решительно не советовали ему делать это в святом Печерском монастыре, где диавол наиболее строил козни спасающимся отцам. Они вспоминали, как здесь враг одолел Исаакия и Никиту, боровшихся с ним наедине, в затворе; их обоих, едва лишь после многих молитв, привели в чувство. Тогда Лаврентий, простившись с братией, отошел в монастырь святаго великомученика Димитрия, построенный князем Изяславом, и там подвизался в затворе.

Он начал вести самую строгую жизнь и проявлять величайшую ревность о своем спасении, предпринимая с каждым днем все большие труды, умерщвляя все страстныя вожделения воздержанием и голодом, искореняя их мечом духовным, то есть силою молитвы, и угашая разжжённыя стрелы врага водою своих слез. Так, по благодати Божией, он не только сам избежал бесовских стрел, но и получил от всещедраго Господа дар чудесно исцелять различныя язвы и недуги людей, а равно изгонять бесов.

Раз к преподобному Лаврентию, среди многих других, был приведен из Киева для исцеления один человек, одержимый бесом, настолько свирепым и сильным, что то дерево, которое с трудом могли понести десять человек, он один брал легко и отбрасывал вдаль. Блаженный затворник, желая прославления благодатию своему духовному отечеству, святому Печерскому монастырю, повелел отвести этого человека туда. Тогда бесноватый начал вопить:

— К кому ты посылаешь меня? Я не смею даже приблизиться к пещере, так как в ней почивает много святых. В самом же монастыре есть тридцать святых черноризцев, которых я боюсь,— а с прочими я веду борьбу.

Когда бесноватый поведал это о благодати, почивающей на святом Печерском монастыре, блаженный снова повелел отвести его туда насильно, чтобы лучше удостовериться во всем, сказанном им. Ведшие бесноватаго, зная, что он никогда не бывал в Печерском монастыре и никого не знает там, спрашивали его:

— Кто эти подвижники, которых ты боишься?

В это время всех братий в Печерском монастыре было сто восемнадцать.

Бесноватый перечислил по именам тридцать из них и сказал:

— Все они одним словом могут изгнать меня.

Тогда ведшие его сказали ему снова:

— Мы хотим заключить тебя в пещере.

Он на это ответил им:

— Какая мне польза вести борьбу с мертвыми? Ибо они имеют гораздо большее дерзновение молиться Богу о своих черноризцах и о всех приходящих к ним. Если же вы хотите видеть мою способность вести борьбу, то ведите меня в монастырь: кроме указанных тридцати мужей я могу бороться со всеми остальными.

Затем он начал показывать свои способности, произнося речи по-еврейски, римски, гречески, словом, на всех языках, которых он никогда и не слышал. Провожавшие его устрашились и много дивились изменению его речи и способности говорить на разных языках. После этого, прежде чем они вошли в монастырь, нечистый дух оставил безноватого; исцелившийся начал со смыслом рассуждать, и бывшие с ним пришли в радость. Затем все вместе они вошли во святую чудотворную Печерскую церковь воздать хвалу Богу. Узнав об этом, игумен пришел со всею братиею в церковь. Исцеленный не знал ни игумена, ни кого-либо из тех тридцати мужей, имена которых называл во время беснования. Тогда стали спрашивать его:

— Кто исцелил тебя?

Он, взирая на чудотворную икону Пресвятыя Богородицы, ответил:

— С нею встретили нас святые мужи, числом тридцать, и я исцелился.

При этом имена всех их он помнил, а в лицо не знал ни одного. Тогда они все вместе воздали хвалу Богу, Его Пречистой Матери и святым угодникам Его.

Так прославилось святое место Печерской обители по благоустроению Божию, возвещенному блаженным затворником Лаврентием, который по прошествии некотораго времени перешел в сию обитель.

В 1182 г. преподобный Лаврентий был возведен из Печерского монастыря на кафедру Туровскую, став преемником святителя Кирилла Туровского.

В сане епископа он упоминается в Ипатьевской летописи, когда участвовал при поставлении пресвитера Василия в архимандрита Печерского. Время управления святителя Лаврентия Туровской епархией приблизительно совпадает со временем княжения Святополка Юрьевича, одного из замечательных туровских князей. Предполагают, что последние годы своей жизни преподобный Лаврентий провел в Киево-Печерском монастыре, куда удалился из любви к затворничеству. Точное время его кончины неизвестно. По другим сведениям, преподобный Лаврентий преставился в Туровском Борисоглебском монастыре. Местное туровское предание гласит, что из этого монастыря в XII в. были взяты нетленныя мощи в Киево-Печерскую обитель. Должно быть, это мощи преподобнаго Лаврентия, который завещал перенести его тело в Киевские пещеры.

В старинных рукописных святцах между святыми, почивающими в Ближних (Антониевых) пещерах, первым указан «святой Лаврентий, епископ Туровский».

В «Иконописном подлиннике» о святом Лаврентии сказано: «Подобием надсед, брада, аки Богословля, раздвоилася, клобук на плечах, риза преподобническая, бос».

Память преподобнаго Лаврентия, святителя Туровского, совершается также 28 сентября (Собор преподобных отцов Киево-Печерских, в Ближних пещерах) и во 2-ю Неделю Великаго поста (Собор всех преподобных отцов Киево-Печерских).

Алексий Шинкевич, священник

ЛИТЕРАТУРА

Жития святых на месяц иануарий. Киево-Печерская Успенская лавра, 1881.
Минея. Январь. Часть вторая. Издание Московской патриархии, 1983.
Настольная книга священнослужителя. Т. 2. Издание Московской патриархии, 1978.

Хто аўтар «Слова аб палку Ігаравым»?

Агульнапрызнана і бясспрэчна найвышэйшая ступень літаратурнай таленавітасці аўтара «Слова аб палку Ігаравым». Гэта быў, безумоўна, геніяльны літаратар, які абапіраўся ў сваёй творчасці на традыцыі айчыннага народнага гераічнага летапісу, на песенную паэзію Баяна і адначасова на дасягненні старажытнагрэчаскай і візантыйскай культур. Яшчэ К. Маркс указваў: «Песня носіць гераічна-хрысціянскі характар»[1].

Аб палітычных поглядах стваральніка паэмы яскрава сведчыць

[1] *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. Т. 29, с. 16

яе тэкст. Усхваленне ратных спраў князёў, іх мужнасці і подзвігаў праходзіць нібы другім планам. Галоўныя помыслы аўтара, яго сапраўдная прывязанасць, яго боль — гэта Русь, Руская зямля. Аўтар «Слова» нават не звонку княжацкіх групіровак і інтарэсаў, ён над імі — у апярэджваючай свой час трактоўцы самога разумення Русі і спробе выразіць важнейшую ідэю нацыянальнага аб'яднання. Паход Ігара ён выкарыстоўвае як урок, як прыклад пагубных вынікаў разрозненых дзеянняў, для яго сітуацыя 1185 г.— прадвеснік яшчэ больш буйных бед, якія абрынуліся на краіну некалькімі дзесяцігоддзямі пазней.

Істотная прымета асобы аўтара «Слова», якая вынікае з твора,— яго сацыяльнае становішча. Бліскучы літаратар, паэтычная натура, знаўца і аматар песенніка Баяна, эрудыт і кніжнік, які адолеў грэчаскую мудрасць, перакананы хрысціянін, гісторык і дасведчаны палітык з агульнарускай пазіцыяй і з поўнай незалежнасцю ад княжацкіх родавых інтарэсаў... Безумоўна, ён належаў да інтэлектуальнай эліты, стаяў блізка да кіруючых вярхоў. Напісанне такога твора — гэта не імгненны бляск, не аднаразовая ўспышка таленту, літаратар такога маштабу павінен быць вядомым сучаснікам і па іншых творах і справах. Дык хто ж ён быў, дзе шукаць яго — сярод князёў, баяр ці рэлігійных дзеячоў?

...Быў такі чалавек у Старажытнай Русі, які пакінуў значны след у гісторыі. Не князь і не баярын — чалавек надзвычай высока адукаваны, таленавіты, епіскап, літаратар, мудрэц, «Златауст, паче всех воссиявший нам на Руси»... Гэта — Кірыла Тураўскі, які жыў і дзейнічаў у горадзе на Прыпяці Тураве.

Тураўскае княства ў канцы XII ст. займала прамежкавае геаграфічнае становішча адносна паўночных, паўднёвых, усходніх і заходніх зямель тагачаснай Русі. Кірыла — выхадзец з заможнай сям'і, пасля таго, як атрымаў духоўную адукацыю, быў прызначаны ў родным горадзе епіскапам. Арыенціровачныя даты яго жыцця — з пачатку 30-х да канца 80-х гадоў XII ст.— якраз супадаюць з прыкладным часам напісання твора, які не мог быць створаны раней 1185 г.

Многія даследчыкі знаходзяць аналогію ў літаратурных прыёмах вядомых твораў Кірылы Тураўскага і аўтара «Слова». С. К. Шамбінага ўдакладняе: «Пластычнасць вайсковай повесці Кірыл перавёў на духоўную алегорыю... Прыёмы выкладання Кірылы вельмі блізкія да «Слова аб палку Ігаравым». Уважліваму даследчыку відавочна: «праявы паэтычнага бачання, схільнасць да гістарычных прыкладаў і аналогій, выкарыстанне прамой мовы, ужыванне алегорый, зваротаў да сіл прыроды — усё гэта, чым яскрава вызначаецца «Слова аб палку Ігаравым», характэрна для твораў Кірылы Тураўскага — епіскапа, асветніка, пісьменніка». І вельмі магчыма, што сусветна вядомы літаратурны шэдэўр мае канкрэтнага аўтара, якім мог быць не менш славуты асветнік мінулага, выдатны сын Беларусі Кірыла Тураўскі.

Б. І. Зотаў

КРАТКОЕ ИЗВЕСТИЕ О ТУРОВСКОМ ЕВАНГЕЛИИ

Хотя и несомненно, что памятники славянорусской письменности существовали еще и в IX в., но из древнейших, ранних, доселе найденных, мы имеем: Остромирово Евангелие, Святославовы Изборники, Толковую Псалтирь, Супрасльскую рукопись и тринадцать слов Григория Богослова. Все это относится к XI в. К этому почтенному ряду присоединилось



Застаўка да Тураўскага евангелля



Старонка Тураўскага евангелля XI ст.

в 1865 г. Евангелие Туровское, найденное в Турове Минской губернии. Туровским названо оно по месту открытия в Турове и еще в начале XVI в. принадлежало Туровской Преображенской церкви, как это видно из двух записей князя Константина Ивановича Острожского, помещенных на полях Евангелия. Открыто оно Н. И. Соколовым, который был послан в археографическую поездку И. П. Корниловым, управляющим Виленским Учебным Округом. Первая догадка об отнесении Туровского Евангелия к XI в. принадлежит Н. И. Соколову и подтверждена свидетельствами академиков И. И. Срезневского и А. Ф. Бычкова. Вот отзыв И. И. Срезневского: «Что книга была писана в XI в., доказывается и рисунком букв и правописанием. По рисунку букв она подходит ближе всего к Остромирову Евангелию и к Воскресенскому списку Пандекта Антиохова. По правописанию сходна она более с этой последней рукописью... Отклонений от чтения Остромирова Евангелия очень не много».

Туровское Евангелие имеет формат малой четверки (4 вершка в ширину, менее 5 в длину), состоит из 10 листов или 20 страниц. Писано в страницу, по 18 строк, без кустодий и переносных знаков. Пергамент плотный, лощеный, с линейками, штифтом проведенными, поля ограничены такими же линейками. Цвет чернил каштановый, киноварь употреблена в заголовках евангелий и в прописных начальных буквах, с синею и темно-зеленою раскраской, местами перешедшую в голубую и зеленоватую...

Евангелие это — недельное, апракос. Как выше видно, оно неполное, сохранилось в малом отрывке, начинающемся 89-ю главою (без начала) от Иоанна... Кроме того, вся 4-я страница занята записью князя Острожского, а также поля стр. 12-й — записью того же князя...

Петр Гильтебрандт
(Предисловие к «Туровскому Евангелию XI века». Вильно, 1869.)

Тураўскія крыжы

Налічваецца больш дзесяці каменных крыжоў, якія знаходзіліся ў Тураве і навакольных вёсках — Пагост, Верасніца, Перароў, Хлупін, Старажоўцы, а таксама адзін крыж Жыткавіцкай царквы на могілках. Па павер'ях, Жыткавіцкі крыж быццам штогод павялічваўся ў памерах.

Вышыня крыжоў ад 1 да 2 м, шырыня 0,6—0,7 м. Найбольш вядомы так званы Тураўскі, ці Святы, крыж. Ён стаяў на могілках вёскі Пагост, на беразе ракі Прыпяці. У 1979 г. перавезены ў Гомельскі абласны краязнаўчы музей. Вышыня яго 2 м, шырыня 0,7 м. У Гомельскім абласным краязнаўчым музеі захоўваюцца таксама два крыжы з Барысаглебскіх могілак (вышыня 1 м, шырыня 0,6 м). Некалькі крыжоў знаходзіцца ў Тураўскай царкве.

У Пагосце і Верасніцы над крыжамі былі пабудаваны капліцы. Існавала павер'е, што яны абаранялі ад хвароб і іншых напасцей. На крыжы вешалі стужкі, лампадкі, пакрывалі хусткамі, прыносілі да іх манеты, сувоі, прадукты і пакідалі ля падножжаў. Да крыжоў накіроўваліся крэсныя ходы, асабліва на Узвіжанне.

Існуе шмат легенд, якія сведчаць, што Тураўскія крыжы прыплылі ў час прыняцця хрысціянства на Русі супраць цячэння па Дняпры і Прыпяці з Кіева, і калі іх перанялі ў Тураве, вада зрабілася крывёю...

Л. У. Дучыц

Старажытны крыж на могілках у в. Вільча

* * *

Каля в. Вільча — каменны крыж. Па апавяданнях насельніцтва, ён пастаўлены на магілцы нейкага шведскага князя, забітага ў час шведскай (Паўночнай) вайны. Каля х. Доўгая Дуброва на балоце знаходзілі, па звестках старажылаў, рэшткі судна і каля в. Белае знаходзілі фрагменты посуду, косткі.

На в[озеры] Князь блізка да сярэдзіны сустракаюцца на дне цагліны, з аднаго боку абкураныя, там жа назіраюцца ўбітыя на дно палі, паводле доследаў тэхнікаў, на плошчы 90×50 м.

...У Тураўскім р. у абходзе № 14 Тураўскага лясніцтва, у 5 км ад в. Боркі ёсць «Жукава Магіла», на якой быў раней камень... Паводле легенды, тут загінуў народны герой.

Каменныя крыжы: у Тураве — 2, у Пагосце — 1, у Верасніцы — 1, а ўсяго — 4; каменная труна ў Тураве. Месц пахавання на тэрыторыі раёна знойдзена 3, каля Пагосту, Сляпцоў і паміж в. Хільчыцы і Буразь.

«Наш край», 1929 г., № 8—9.

КАМЕННЫ КРЫЖ У ПАГОСЦЕ

З колісьнёго так росказваюць: тоды ў селе екіх тры роды було. Осеньнёе ночы камённые крэсты по рэцэ плылі, тры брацыця іх плыло, не меньш. Да проці ж воды. Одзін проці Семурэдзец увазнёсса, другі проці Пагоста, трэці проці Турова. Удзень людзі агледзелі ёго да на собе ў цэркоў занеслі — вона ў концэ села стояла, дзе зарэ клуб, коло Тура. Аж крэст за ноч назад явіўса. Поп пабачыў да сказаў: «Ето божы крэст. Трэ цэркоў нову зробіць, дзе вон увазнёсса». Зробілі людзі цэркоўку дзераўяну кругом каменя, з куполом, алтарэм. Поп посьвеціў. А над рэкою на шпілю зробілі крэст на подставі, метры на поўторы...

Сталі людзі наеждаць кажын год к стому дню. Ето шчыталося «Уваздвіжэнне»; уздвінуцца ўсе людзі сюды на поклон чэсному крэсту. Наеждало, шо божэ мой! Возамі, лодкамі, пехотою шлі... з Пінска, з Городка, з Лельчыц, Петрыкова, Мозыра, з ўсёго свету. По 20—30 чоловек начавала ў кожнай хаці, покотом на подлозі спалі. А колькі ў селе хатоў?

Раненько ў вялікой цэркві служаць, і йдуць селом к каменной божой мацеры. Дзьве божых мацеры по тры чоловекі неслі, два звонары, малые корогі по одному чоловеку несло. Ідуць, а звоны звоняць. Зайдуць у цэркоўку. У правым вуглу, к сонцу чэсны крэст стоіць, свечкі коло ёго гараць. Велікі-велікі крэст, чоловек п'яць подымалі. Як бы на чоловека выдае: і голова, і плечы, і рукі ў ёго, а ўнізу ек стоўп. Цоловалі чэсны крэст коло грудзей. На ёго навешаюць, шо божэ мой! І краму, і палотна, і хвартукоў!.. Прынесе хто хустку, шо вона сто рублей варта. Не шкодуе... Шо обхорошаць ёго! І грошы — ні копейкі. Покладзе, так покладзе!..

Ярмолок буў кругом цэркоўкі. Петрыкоўцы — чоботы, городчукі — жэлезяц'е, туроўцы — крам, полешукі — грыбы сушаные, чорніцы. Усе було, усе, шо на сьвеці е.

Ек перэд Уваздвіжэннем коней уночы хлопчакі пасьціл, то обруці поотрэзваюць; трубу, шо воўкоў пужаць, украдуць у другом табуні... Ек хто засне, то ёго світу пропаляць, шапку ў огонь кінуць да згорыць. А на другу ноч усе ў новух шапках — на ярмолку ўкрадуць...

Расказаў у 1984 г. Герман Фёдар Рыгоравіч

Тураўскія легенды

Тураў з яго больш як тысячагадовай гісторыяй — нібы акно ў Палессе. У старажытныя часы Тураўшчына была заселена вельмі шчыльна. Ад бронзавага веку захавалася вялікая колькасць помнікаў матэрыяльнай культуры, некаторыя з іх знойдзены недалёка ад Турава, каля в. Хільчыцы, дзе была буйная стаянка людзей бронзавага веку. Хільчыцкае пасяленне, а дакладней, цэлая група пасяленняў, якія вядуць сваю гісторыю ад эпохі неаліту, працягвала існаваць і значна пазней, у жалезным веку, што паслужыла асновай для з'яўлення падання пра «горад Хіл», папярэднік Турава. Народны погалас гаворыць, што гэта было вялікае пасяленне, заснаванае ў незапамятныя часы, яно займала тэрыторыю ад р. Сцвігі да Прыпяці і праіснавала ажно да ўзнікнення феадальнага ладу...

Дрыгавічскія плямёны мелі сваіх князёў, якія падпарадкоўваліся князям кіеўскім, што аб'ядналі землі вакол Кіева, цэнтра новай еўрапейскай дзяржавы — Кіеўскай Русі... Уладзімір яшчэ пры жыцці раздаў сваім сынам надзелы — у дрыгавічоў стаў княжыць у Тураве старэйшы сын Святаслаў, Ізяславу ён аддаў Полацк, Станіславу — Смаленск. Пасля смерці Уладзіміра і Яраслава гісторыя Русі да сярэдзіны XIII ст. становіцца гісторыяй некалькіх асобных княстваў. Важная роля належала Тураўскай зямлі, якая з'яўлялася звязуючым звяном паміж Руссю і Польшчай. Па Прыпяці праз Тураў ішоў водны шлях з Польшчы ў Кіеў... На думку многіх вучоных, у X і XI ст. Тураў з'яўляўся другім па значэнні пасля Кіева ў Старажытнай Русі. Значэнне Турава ўпала пасля перанясення вялікакняжацкай палітыкі на паўднёвыя ўскраіны Расіі, у палавецкія стэпы. Калісьці адзінае Тураўскае княства драбілася на ўдзелы з цэнтрамі ў Пінску, Нясвіжы, Дубровіцы, Валкавыску... У XIII ст. Турава-Пінская зямля страчвае палітычную самастойнасць і трапляе ў залежнасць да буйных княстваў — Галіцка-Валынскага і Літоўскага, у склад якога яна ўрэшце рэшт і ўвайшла. Уся гісторыя Турава-Пінскай зямлі цесна звязана з агульнабеларускай гісторыяй. З канца XV ст. Туравам валодаў князь М. Л. Глінскі, пазней — князі Астрожскія, вядомыя магнаты Сапегі і Патоцкія.

У першай трэці XV ст. спыняецца старажытная дынастыя тураўскіх князёў і горад перайшоў ва ўладанне князя Свідрыгайлы, затым з 1508 па 1620 г. князёў Астрожскіх. Нападзенне на Тураў у 1502 і 1521 гг. татар прымусіла Астрожскіх пабудаваць на гары ўмацаваны замак. Насыпаная ў старадаўнія часы гара і цяпер называецца Замкавая, або Турава. У XVII ст. Тураў некалькі разоў падвяргаўся нападам і спустошэнням, насельніцтва яго зменшы-

лася не менш чым у чатыры разы і вельмі не скора дасягнула ранейшага ўзроўню.

У XVIII ст. Тураў становіцца графствам. Большай яго часткай валодае маршалак галоўнага літоўскага трыбунала Іван Салагуб. У горадзе налічвалася каля пяцісот дамоў, некалькі цэркваў, сінагога. Тураў, як і ў старажытны час, падзяляўся на мястэчка і два прадмесці — Заяцелле і Запясочча. Горад меў больш як тры вярсты ў даўжыню і звыш вярсты ў шырыню. Над наваколлем плыў гул тураўскіх цэркваў — Прэабражэнскай, Раждественскай, Ільінскай, Мікалаеўскай, Міхайлаўскай, Петрапаўлаўскай і Усесвяцкай. Пажар у 1834 г. знішчыў іх — цэрквы былі драўляныя, захаваліся толькі Прэабражэнская і могільнікавая Усесвяцкая, пабудаваная ў 1810 г. У ёй захоўваюцца найстаражытнейшыя помнікі Турава, каменныя крыжы, паходжанне якіх паданні звязваюць з перыядам хрысціянізацыі ў краі.

...Асноўная ўвага ўсіх легендарных паданняў звернута да Тураўскай, або Замкавай, гары, якую часта называюць Замчышчам. Яна размешчана ў паўночна-заходняй частцы горада, там, дзе выпрамленае рэчышча ракі Язды зліваецца з адным з рукавоў Прыпяці — некалі паўнаводным Струменем. Гэта паўночная натуральная граніца гарадзішча. З паўднёвага і ўсходняга бакоў яна была абаронена валамі і рвом, што дзялілі яго на дзве часткі — дзядзінец і навакольны горад. Месцамі рэшткі гэтага рва бачны і да гэтага часу. На самым краі дзядзінца добра праглядваецца курганавіднае ўзвышэнне, якое сярод старажылаў Турава называлася проста курганом. Некаторыя даследчыкі лічаць яго рэшткамі ахоўнай вежы, але і не менш абгрунтавана перадаюцца з пакалення ў пакаленне меркаванні аб тым, што курган насыпаны ў часы татарскага нашэсця.

Старажытны горад меў свой працяг на левым беразе ракі Струмень, дзе дастаткова бачны сляды былога пасялення. Па сведчанні мясцовых аматараў даўніны мінулага стагоддзя, значная частка дзядзінца і горада была размыта водамі Струменя ўжо да сярэдзіны XIX ст. Гэта дазволіла зрабіць першыя археалагічныя знаходкі, што пралілі некаторае святло на культуру і быт старажытных тураўлян. У 1889 г. археолаг В. З. Завітневіч распачаў спецыяльнае даследаванне гарадзішча. З таго часу раскопкі тут вядуцца рэгулярна. Вучоным удалося выявіць рэшткі шматлікіх драўляных пабудоў каменнага храма, саркафага, знайсці вялікую колькасць прадметаў матэрыяльнай культуры.

...Мясцовыя майстры добра ведалі многія рамёствы — ганчарства, разьбу па косці, апрацоўку металаў, ювелірную справу і іншыя. На поўдзень ад княжацкага палаца знаходзіўся старажытны Барысаглебскі сабор, на захад ад сабора, за ракой Яздой, на ўзвышаным месцы стаяла епіскапскае, «уладарова» падвор'е, таму гэтае месца да самага апошняга часу называлася ў народзе проста «Уладарова». Ад сабора да падвор'я ішла насыпная плаціна, што забяспечвала ў любы час года бесперапынныя зносіны паміж імі. «Уладарова» — адзін з галоўнейшых цэнтраў усёй старажытнарускай адукацыі, кніжнасці, літаратуры. Выхаванцам гэтага цэнтра быў і знакаміты пісьменнік Кірыла, епіскап Тураўскі.

Стагоддзямі ў горадзе захоўвалася і адна са старажытнейшых кніг Русі — пергаментнае Тураўскае евангелле, вывезенае адсюль у 1865 г., цяпер яно знаходзіцца ў Вільнюсе, у бібліятэцы Акадэміі навук. Рукапіс датуецца XI ст. На яго лістах ёсць нямала запісаў, самы старажытны з якіх адносіцца да

1508 г. У запісе гаворыцца, што 2 мая 1508 г. «при дръжаве... короля... Жикгимоньта,— я кнзь Костентин Ивановичъ Острозкый пан виленский, гетьмань... короля Жикгимоньта, староста луцкый и брасловскый и веницкый, маршалок волынской земли, и з женою моею княгинею Татьяною, и з сыном нашим Ильею, надали есмо в Турове и записали у Евангелии ко цркви... к Преображению... надали есмо сад с пасекою, и поле с сеножатьми, и с езери и зъ жамежъками, на сюй стороне на передсельи села Вересницкого, на сюи стороне Воронине от замку...» Гэты сапраўды па-княскі шчодры дарунак князёў Астрожскіх Прэабражэнскай царкве: сад з пасекай, сенакосы і іншыя ўгоддзі каля вёскі Верасніца пацверджаны ўласнаручным запісам князя па асаблі-ва паважанай мясцовай святыні — старажытнейшым Евангеллі, затым неаднаразова аспрэчваўся. Аб гэтым на працягу ўсяго XVIII ст. рабіліся адпаведныя запісы на польскай мове.

Тураўскае пергаментнае Евангелле — выдатны помнік кніжнага мастацтва. Яно напісана ўставам — асаблівым дакладным і прыгожым пісьмом, якое адрозніваецца строгай геаметрычнасцю малюнка і каліграфічнасцю. Старонкі рукапісу ўпрыгожаны ініцыяламі старавізантыйскага тыпу. Яны размаляваны чырвонай, сіняй і зялёнай фарбамі. Арнаментальным упрыгажэннем з'яўляецца таксама канцоўка, што складаецца з некалькіх фігур.

Пры перапісе тэксту ўжыты не толькі звычайнае чарніла, але і кінавар, выкарыстаны ў загалоўках.

Да ліку самых старажытных помнікаў адносяцца каменныя крыжы. Паданні трывала звязваюць іх паходжанне з перыядам хрысціянізацыі Тураўшчыны. Крыжы гэтыя быццам бы самі прыплылі ўверх па цячэнню Прыпяці і затым аказаліся ўзнесенымі сярод палёў у паўднёва-заходняй частцы горада. Народ здаўна называў гэтыя крыжы «голымі» ў адрозненне ад каменных крыжоў у вёсках Верасніца і Пагост, над якімі былі ўзведзены часоўні. Тураўскія каменныя крыжы маюць вышыню звыш 2 метраў і шырыню нямногім менш метра. Больш падрабязную характарыстыку даць ім немагчыма, паколькі, з'яўляючыся і па сённяшні дзень прадметам асаблівага шанавання веруючых, яны схаваны ад вачэй пад тоўстым пластом са шматлікіх вышываных ручнікоў. У мінулыя часы пакланіцца крыжам прыплывалі людзі з усёй Прыпяці. Лічылася, што крыжы гэтыя цудадзейныя, бо вылечваюць хворых. Асабліва шмат людзей збіралася да каменных крыжоў на Узвіжанне. У адрозненне ад гэтых вялікіх каменных крыжоў на Барысаглебскім могільніку пры пахаваннях здаўна знаходзілі крыжы малыя. Яны выразаліся з чырвонага мясцовага каменя і па велічыні былі з далонь. Такія крыжы пападаліся даволі часта, і гэта дае магчымасць меркаваць, што іх выраблялі ў Тураве або недзе паблізу яго...

Ю. А. Лабынцаў

З кніг «У глыбінным Палессі», «Старая казка Палесся»

ДЗЯДЫ РАСКАЗВАЛІ

А булі ў Погосці і туркі, даўно-даўно. Нам про іх дзеды росказвалі, а ім іхніе дзеды. Тур, шо з того конца поўз село до Сцвігі цягнецца, того так зовуць, што ў ём турок утопіўся. Ехаў по тонкому лёду на коне, праваліўся да ўтопіўся. Глуміліся туркі над нашымі людзьмі. Людзі хаваліся од іх по зарэччу, у лесі, дзе прыходзілосо. Ек уполету, то і ў долінах хаваліса, дзе капелюшніку багато. Залезе чоловек у доліну, голову з воды вусуне, шоб дыхаць можно було, а голову не бачно, бо капелюшына зверху прыкрывае. От одзін раз поўцекалі людзі од туркоў,

з села, хавающца, дзе хто. Которые то ў Дзедовой доліні, шо коло панского поля, под капелюшнік похаваліся. Седзяць да пережыдаюць, покуль туркі з села пойдуць. Аж некі чоловек ідзе поўз берэг да по-нашому нашых людзей гукае: «Куліно-о-о, Марыно-о-о, ходзі, пошлі-і-і!» А ў водзе екраз нека Куліна й седзела. Поверыла на еты голос, вулезла да до того чоловека. Мокра ўся. Подышла, аж бачыць, шо то турок — чорны, з вусамі, з шаблею, только ў нашэ одзенне передзеты. Уцекаць не побегла — дожэне да шчэ зарубае. Загадаў вон ей у село йці до свое хаты. Зашлі ў ее хату, да вон загадаў еду ёму зготовіць да воды богато нагрэць, шоб ёму помуцца. Затопіла вона печ, прыставіла там нешчо, мо картоплі, мо крышаны, мо боршч, бог ёго ведае, а йшчэ воды ў веліком чугуне прыставіла, ек турок загадаў. Огонь у печэ горыць, у чугунах да горшках вода кіпіць, нешто варыцца, а Куліна коло печэ стоіць. А турок сеў на порозі, сцерэжэ жонку. Да бачыць жонка, шо голова ёго на бок похіліласа. вочы зліпліся. Задрэмаў турок. А вода ў веліком чугуне парыць моцно, кроп ужэ ў чугуне. Куліна еты чугун вілкамі с печэ вуцегла, обматала шматкою, узяла дзвома рукамі да як шамнула ўвесь кроп турку на голову! Опарыла ёго, да вон кончыўса. От так жонка турка накорміла і сама жыва осталаса.

Анастасія Рыгораўна Ліцвіненка
в. Пагост
Запісаў М. А. Саскевіч

ПРАРОЧЫ СОН КНЯЗЯ

Гэта было ўжо даўно. Там, дзе цяпер Тураў і бліжэйшыя вёскі, былі дрымучыя лясы. Рака называлася тады Струменню. Прыпяці зусім не было. Цякла Струмень там, дзе і цяпер, але была вялікая. Язда таксама была вялікай ракой, цяпер ад яе засталася невялічкая жыватачынка.

У гэты час прыйшоў князь Тур з вялікімі войскамі, і прыйшоў ён сюды таму, што былі тут вялікія выгоды — звяры, рыба, рознае птаства.

Аднойчы князь Тур лёг спаць на гары. Заснуў ён і бачыць: быццам ляжыць ён на паднятым возе, а кругом яго гарады. Ён быў тады самы хітрэйшы і не было яму з кім параіцца. Ён зразумеў, што трэба яму будаваць вялікі горад.

Князь Тур пачаў будаваць горад. І быў горад такі вялікі, што і Верасніца, і Рычоў, і Дварэц, і Азяраны, і іншыя вёскі былі пад ім. Будаваў князь Тур гэты горад не абы як: спачатку насыпаў Тур рачнога пяску тоўсты слой. Пасля пачаў паліць лес і насыпаў пласт бярозавай кары; пасля кары насыпалі бітых гаршкоў; пасля звярыных касцей. У канцы засыпалі пласт сленю — лускі з пароды язя — і ўсё засыпалі зямлёю.

Уезныя вароты былі каля Азяранаў. У асяродку горада выкапалі калодзеж, які называецца Тур-калодзеж.

Ездзіў Тур на паляванне ў тое месца, дзе цяпер Буразь. І было там балота, лясы і многа звяроў. Рубіў Тур звяроў, седзячы на кані, і пасля таго назваў гэтае месца «Буй-раз» (буйна разіў).

Пасля Тура быў князь Уладыка. Пры ім у Азяранах былі вялікія вароты, а пры варотах замок. Калі разбурылі Тураў, дык развалiліся вароты і выпаў замок. Ішла аднойчы карова, папала нагой у замок. А замок той быў дзесяць фунтаў. Там, дзе жыве Курбан, жыў Уладыка і называецца тое месца «Уладыкіна». З Уладыкінага дварца быў у Тураў насып, а праз раку Язду — мост. Пры Уладыку былі папы і ксяндзы. Аднойчы ішоў поп служыць вячэрню. На яго напалі ваўкі і з'елі... Памёр Уладыка, і пахавалі яго ў каменным гробе, які гадоў колькі назад знайшлі.

Пасля Уладыкі быў князь Комар, а пасля Комара — княгіня. Імя яе невядома. Вядома толькі тое, што была яна вялікая чараўніца. Калі на Тураўшчыне ў той час разышлася маравая пошасць, дык гэтая княгіня загадала закапаць у зямлю нямога чалавека, жывога бабра і жывога мядзведзя. Калі іх закапалі, дык зрабілася гара, якая называецца Бабруйкава гара. Пасля гэтага пошасць тая спынілася.

Прыходзілі на Тураў розныя ворагі, але чараўніца-княгіня бараніла. Прыйшло раз вялікае войска, абклала яно Тураў і застанавілася там, дзе цяпер Перадол. Княгіня звязала шчотку з свіной шчаціны і кінула. Ворагу здалося, што парос вялікі чарот; кінула яна курынае яйка, а ворагу здалося, нібыта разлілася вялікая вада. Доўга стаялі паходнікі, але не хапіла ў іх жыўнасці і харчоў. Сталі мерці яны самі і іх коні. На тым жа месцы, дзе пасвіліся коні, з'явілася лашчына — «Перадол».

Калі ў другі раз прыйшлі к Тураву ворагі, дык княгіні-чараўніцы ўжо не было, і не было каму бараніць Тураў. Тураў быў вялікі тады горад. У ім было сорак пяць цэркваў.

Непрыяцель выразаў старых і малых, і жанок, і служачых. Дзяцей пакідалі ў калодзеж, але вада перарабілася на малако. Гэтым малаком карміліся дзеці, выраслі, і ад іх зноў завёўся народ.

Адзін жа чалавек забраўся ў буслава гняздо і сядзеў там, пакуль не прайшла ўся бяда.

За гэта яго празвалі «Бусліны». Другі чалавек забраўся ў яму, сядзеў там ды еў вяленую рыбу; яго і яго патомкаў празвалі «Сядуны».

Пасля разбурэння горада епіскопія перабралася ў Пінск, з Пінска ў Бабруйск, і дваццаць пяць гадоў судзіўся Тураў, каб адсудзіць епіскопію сабе назад.

На Тураўшчыне ёсць лекавыя камяні. Адзін стаіць у Верасніцы, другі ў Пагосце, трэці быў на Казаргаці, але яго перанеслі на другі канец Турава, каля Шата. Прыплылі яны з Кіева ўверх па рацэ.

Каля Верасніцы была рака, цяпер няма яе: па гэтай рацэ хадзілі ганчакі; ідзе ганчак, на ганчаку — народ. Вось бачыць чалавек адзін, што плыве нешта супраць вады, вельмі падобнае на чалавека. Ударыў ён ляскай па камені, растапіўся камень, але не разваліўся, а чалавека таго сагнула, скруціла — і памёр ён скора. Я сам бачыў гэты камень і прыкметна тое месца, дзе раскалоўся ён і зросся.

Адна жанчына ў Рычове аслепла. Раз бачыць яна ва сне, што трэба ёй ісці да каменя, абскабліць яго і выпіць з вадой. Яна прачнулася, зрабіла так і скора пасля гэтага паздаравела.

ТУРАЎСКІЯ САРКАФАГІ

Меў тураўскі князь трох сыноў і пяцёра дачок. Падраслі сыны, князь вырашыў раздаць ім у спадчыну княства. Старэйшаму — Тураў з землямі, сярэдняму — Пінск, маладзейшаму — Дубровіцу. А што рабіць з дочкамі? Сватаюцца князі розныя: полацкі, мінскі, чарнігаўскі, навагрудскі, смаленскі, віленскі, магілёўскі...

Склікаў князь баярскую раду.

— За каго аддаваць дочак? — пытаецца.— Аддам замуж — пасаг патрэбен з княства... Параднюся з аднымі князямі, а іншыя на нашы землі не будуць вока мець.

Моцна задумалася рада. Пасля вынесла прысуд: заставацца князёўнам у дзеўках, а каб вельмі не сумавалі, аддаць у манастыр.

Князёўны, нічога пра гэта не ведаючы, сваволілі пад наглядам служанак у лесе. Старэйшай — Паланеі — было дваццаць гадоў, малодшай — Луцэі — чатырнаццаць. Былі ўсе князёўны прыгожыя, чарнабровыя і стройныя. Дзівіліся людзі, мясцовыя і прыезджыя, на прыгажосць небывалую тураўскіх князёвен.

У гаі князёўны вянкі плялі, надзявалі адна адной ды ў люстэрка вады глядзеліся. Карагоды з вясковымі дзеўкамі водзілі. Іх галасы разносіліся далёка за раку, гукі песень напеўных. Сюды ў гай прыйшоў князь і паведаміў князёўнам волю баярскай рады. Выслухалі яны прысуд і ціха ў нямым паклоне схіліліся. А як князь пайшоў, горка заплакалі, кідаючы вянкі ў Прыпяць.

Сціхлі гоман, песні і смех сясцёр. Шмат дзён яны плакалі і радзіліся, пасля вырашылі на Купалле шукаць папараць-кветку. На Купалле, калі ўсе паснулі і ля палаца засталася толькі варта, князёўны паціху пракраліся з палаца і пайшлі на бераг Прыпяці.

На чоўне пераплылі Прыпяць і падаліся ў балотны хмызняк. Чым далей ідуць, тым горш робіцца. Праводзяць іх у цемры вочы драпежнікаў, чуюцца стогны, галёканне. А як да багны падышлі, тут і зусім блага стала: з купін зрываюцца, у багну правальваюцца. Але ўпарта ўперад ідуць. Зайшлі ў такую глушэчу, дзе яшчэ не ступала нага чалавека, дзе толькі совы крычаць, вадзяныя гады малако з балотных глечыкаў п'юць ды вадзянік барадой багну калыша. І тут самай малодшай з іх зрабілася страшна. Схапіла яна сясцёр за рукі, і тым стала боязна. Кінуліся яны наўцёкі. Доўга праз балота прабіраліся, у багне гразнулі, адзенне аб хмызняк на шматкі раздзіралі, у рэчках балотных купаліся. Нарэшце выбраліся на бераг возера.

На ім русалкі, за рукі ўзяўшыся, карагод водзяць. У святле месяца іх мокрыя целы бліскаюць, з валасоў доўгіх кроплі вады сцякаюць.

— Сёстры нашы прыйшлі! — закрычалі русалкі.

Да князёвен падбеглі, іх распранулі і ў карагодзе закружылі. Пасля ў возера пацягнулі. Скочылі князёўны ў возера, а вада сцюдзёная... Маўчаць князёўны, а русалкі рагочуць, пад ваду клічуць. Падплыў стары з барадой, мохам абросшай, пытаецца:

— Вы да нас жыць прыйшлі? Ці што шукаеце?

— Папараць-кветку шукаем,— кажуць князёўны.

— Дайце ім кветку,— сказаў вадзяны і знік.

Возера захвалявалася, князёвен і русалак хвалі на бераг выкінулі.

Зноў у карагодзе кружаць сёстры. Цяпер іх ад русалак не адрозніць.

Перанеслі русалкі князёвен цераз возера і па зыбуне павялі, тыя нічога пад нагамі не чуюць. Убачылі яны на балоце кветкі агністыя і давай іх рваць. Сарвуць кветку, а з яе чорная мазута плыве. Засмуціліся русалкі, плачуць:

— Нашу прыгажосць нішчыце!



Месячнай ноччу з вады выходзяць русалкі...

Цякуць слёзы ў русалак, зліваюцца ў струмень, і вось ужо ўтварылася крынічка на балоце. Князёўны нічога не бачаць і не чуюць, толькі кветкі рвуць.

Праспяваў балотны певень — зніклі русалкі, пабляклі кветкі ў руках князёвен. Ужо не здаюцца яны самацветамі — звычайная папараць. Толькі на самым версе каменьчыкі бліш-чаць.

Агледзеліся князёўны — балота наўкол, непадалёк азёрца масла чорнага, крынічка цячэ, а яны голыя... Сцюдзёна зрабілася. Ступіла маладзейшая князёўна ў маслянае азёрца ногі пагрэць — і чуе шэпт:

— Уцякай хутчэй!

Пабеглі князёўны. Адшчыкнула каменьчык зверху сястра старэйшая — пацямнела адразу, хмары надышлі, бліснула маланка, пярун ударыў, лівень лінуў, і папаўзлі з балота гады шэрыя да князёвен.

Гарыць каменьчык. Бягуць сёстры...

Згубіла каменьчык Паланея — стала зусім цёмна, не відаць, куды бегчы.

Адшчыпваюць сёстры ад кветак каменьчыкі, асвятляюць сабе шлях. Паабрывалі і пагублялі ўсе каменьчыкі з папараць-кветак. Тут ім гады ногі абвілі: не могуць князёўны далей бегчы. Толькі Луцэя бяжыць. Пачуўшы крыкі сяцёр, спынілася і да іх вярнулася. А тых, скручаных па руках і нагах гадзюкамі, багна паглынае.

Доўга бегала вакол сяцёр Луцэя, плакала і галасіла, аж пакуль нейкі гад шэры з купіны ёй на грудзі не ўскочыў і кругом стана не абвіўся. Паваліласа тады Луцэя, скруцілі і яе гадзюкі балотныя...

Апоўдні спахапіліся ў княжацкім палацы. Сталі ўсюды князёвен шукаць... Толькі праз тыдзень дружыннік Базыль, закаханы ў старэйшую князёўну, дабраўся ў глухамань балот, знайшоў яе ў багне. Выцягнуць яе з багны не здолеў, вярнуўся назад. Дружыннікі з князем вырвалі з твані князёвен, у якіх балотныя гадзюкі павыпівалі кроў...

Галосіць, млее княгіня. Засумаваў князь. Закрыўся ў пакоях, нікога да сябе не пускае. Потым загадаў:

— Рабіць князёўнам каменныя дамавіны!..

Здалёку прывезлі прыгожы камень. Шэсць тыдняў рабілі майстры дамавіны. Князёўны са змяіным ядам у целах ляжалі ў палацы нібы жывыя...

Жывая святыня Турава

У XII ст. жыхары старажытнага Турава заклалі мураваны храм у цэнтры горада. Невядома, як склаўся яго лёс, да нас дайшлі толькі рэшткі падмурка выдатнага помніка гісторыі і духоўнай культуры. Зусім другі час на календары, але няма сумнення, што на гэтым памятным месцы, святасць якога адзначылі продкі заснаваннем храма, павінен

быць і будзе збудаваны новы сучасны храм. На працягу многіх гадоў мясцовыя жыхары і шматлікія арганізацыі збіраюць ахвяраванні на яго.

Свяшчэнныя руіны, якія захаваліся на працягу стагоддзяў,— гэта своеасаблівы «камень веры», на якім узраджаецца сёння гістарычна першая праваслаўная епархія на тэрыторыі Беларусі — Гомельская, якая называлася ў далёкія часы Тураўскай. Руіны храма XII ст.— падмурак старажытнай царквы — сталі сімвалам узнаўлення патаптаных праў праваслаўя на беларускай зямлі.

Відавочна, што падмурак храма, якому налічваецца дзевяць стагоддзяў, не можа служыць асновай для рэканструкцыі храма. Ён разбіты трэшчынамі, нахілены ў розных напрамках і не вытрымае сцен новага будынка. І ўсё ж свяшчэнныя камяні павінны быць захаваны, каб людзі маглі дакрануцца да іх, да жывой святыні, «адкуль пайшла і стала ёсць» Беларуская праваслаўная царква. Якім жа быць храму?

Доктар гістарычных навук П. Ф. Лысенка прапанаваў стварыць архітэктурна-гістарычны музей, пабудаваць у баку ад гістарычнага месца новы праваслаўны сабор, устанавіць помнік Кірыле Тураўскаму і ўзнаіць абаронныя вежы і ўчастак сцяны. Над падмуркам старажытнага храма мяркуецца пабудаваць павільён, у якім па суседству з захаванымі руінамі размесціцца экспазіцыя музея. Па прапанове доктара гістарычных навук прафесара Л. Д. Побаля, павільён мог бы мець купалавідную форму, у цэнтры магчыма аднаўленне аднаго з мяркуемых варыянтаў храма XII ст. Ва ўсіх выпадках планы прадстаўнікоў акадэмічнай навукі, заснаваныя на падкрэсліванні гістарычнай і культурнай каштоўнасці археалагічнай жамчужыны Тураўскага гарадзішча, маюць на ўвазе будаўніцтва новага праваслаўнага сабора ў баку ад святога месца. Духоўная, рэлігійная каштоўнасць рэшткаў старажытнага храма не прымаецца ў разлік.



Праваслаўная Усесвяцкая царква ў Тураве



Ільінская царква ў Тураве (малюнак пачатку XX ст.)

Па праекце групы архітэктараў, якую ўзначальвае М. І. Лук'янчык, новы праваслаўны храм павінен быць узведзены на месцы помніка XII ст., руіны якога будуць знаходзіцца ў крыпце новага сабора, даступныя наведванню вернікаў, турыстаў, паломнікаў. Тут будзе размешчана таксама экспазіцыя архітэктурных каштоўнасцей. Над музеем у крыпце будзе размешчаны сабор, дзе тыя, хто пажадае выканаць набажэнства, прыдуць да гэтага ўнікальнага для Беларусі комплекса.

Мітрапаліт Філарэт неаднойчы ўказваў, што сваё вялікае гістарычна-палітычнае значэнне Тураўская зямля набыла стараннямі Царквы, дзякуючы ў першую чаргу святому Праваслаўю. Захаванне святыні XII ст., якой з'яўляюцца рэшткі Тураўскага храма, мае для Царквы асабліва вялікае значэнне, так як зерне памёршае дае жыццё новаму парастку, так на гэтых старажытных «камянях веры» ўзнаўляецца старадаўняя Тураўская епархія... Рашаючым тут павінна быць жаданне народа Тураўскай зямлі, які раней за другіх вырашыў узрадзіць духоўную, гістарычную і культурную славу свайго сівога горада. Што будзе пабудавана на старажытных «камянях веры» — павільён ці сабор?.. Пакуль святыня знаходзіцца ў зямлі.

А. А. Петрашкевіч

Святы і будні Турава

...Русь здаўна называлі кандовай, гэта значыць моцнай, трывалай, зрубленай з карабельнага сасновага лесу... Менавіта кандовым можна назваць і пабудаваны амаль цалкам з такога ж мачтавага сасновага лесу Тураў, генетычны код якога яшчэ не парушаны. Яго цесляры-ўмельцы — прамыя пераемнікі, спадчыннікі самых старажытных традыцый майстроў Русі. Асноўная частка дамоў гарадка зрублена ў архаічнай будаўнічай манеры, многія з іх звонку нічым не фарбаваны і не абіты. Усё гэта прыдае нязвыклы, нейкі казачны каларыт асобнаму паселішчу, вуліцы і, канечне ж, усяму гарадку. Вызначэнне «проста вялікая вёска» ніяк не падыходзіць Тураву. Справа ў тым, што амаль менавіта так і выглядалі нашы старажытныя гарады ў самую пачатковую пару іх гісторыі. Гэта здаецца неверагодным, але скрозь стагоддзі Тураў захаваў у многіх сваіх рысах аблічча першых славянскіх гарадоў. Не, зусім не сумнае ўражанне выклікае ў жыхароў сучасных буйных гарадоў з іх бетанаванымі небаскробамі гэты ціхі, утульны, вельмі багаты сотнямі самых розных драўляных пабудоў, дзівосны Тураў.

Пры ўсёй сваёй знешняй «вясковасці» паселішча тураўляніна гарадское, гарадскога тыпу. Для нас уяўляе найбольшую цікавасць класічны яго варыянт, што атрымаў у Тураве найбольшае распаўсюджанне, але цяпер, натуральна, моцна відазменены. У сваім чыстым выглядзе такія паселішчы існавалі амаль да 20-х гадоў нашага стагоддзя. Іх цэнтральная частка — прасторная хата з сенцамі і кухняй, уваход у якую быў зроблены з сенцаў. Каля хаты размяшчаліся амбар, або клець, павець для дроў, або паветка, і хлеў для свіней. Гумно гараджаніна, а таксама жывёльны двор будаваліся воддаль ад жылля ў спецыяльна для таго адведзеных зручных месцах. Некалі такія пабудовы складалі як бы самастойную вуліцу.

Хата тураўляніна рубілася ў асноўным з сасновых бёрнаў, радзей з альховых. Яе даўжыня ў сярэднім складала 5—6 метраў. Накрывалася яна жытняй саломай пад стрэшку. У хаце паблізу ад дзвярэй, што вялі ў сенцы, прыбівалася вялікая дошка ад столі да падлогі, да якой мацаваліся тры полкі. На ніжняй, празванай воднік, ставілася вядро з вадой.

На Прыпяці. Гравюра XIX ст.

На сярэдняй — захоўваліся міскі, лыжкі і соль. На верхняй, празванай паліцай,— стаялі гаршкі. Ад водніка цераз усю хату да покуці ставілася шырокая вялікая лава, якая мела свой працяг, але меншага размеру. Хата абагравалася печчу, што служыла і ачагом для прыгатавання ежы. Кухонны інвентар уключаў чыгуны, скавароды, гліняныя гаршкі, такія ж місы, драўляныя лыжкі, сіта, рэшата, драўляную ступу, іншы раз медныя або чыгунныя казаны...

У святочны дзень, апрануўшы ўсё лепшае, тураўляне выходзілі ў горад, каб паслухаць мясцовых і прышлых музыкантаў, паглядзець паказ батлейкі — лялечнага тэатра, што змяшчаўся ў аб'ёмнай скрынцы, якая служыла адначасова і сцэнай. Невялікая трупа батлейкі, якая налічвала 2—3 чалавекі, паказвала гледачам самыя разнастайныя спектаклі, што суправаджаліся ігрой на скрыпцы. Вельмі любімымі былі ў асяроддзі гараджан сляпыя спевакі-лірнікі, якія выконвалі духоўныя песні. Меладычная ігра і галасы спевакоў часта гучалі ў Тураве, непадалёку ад якога, у вёсцы Сляпцы, знаходзілася своеасаблівая «школа» лірнікаў, якія расходзіліся адсюль на сотні вёрст навокал. Зараз ліру мы чуем толькі на канцэртах ансамбляў народнай музыкі або фальклорных калектываў, папасці на якія бывае няпроста,— настолькі вялікая колькасць жадаючых. Між іншым, калі асабліва пашанцуе, можна ўбачыць і сапраўдных лірнікаў, якіх засталіся адзінкі. Некалькі гадоў назад мне давялося слухаць іх спеў пад акампанемент ліры ў невялікіх гарадах і мястэчках Заходняй Украіны, адкуль яны, магчыма, іншы раз заходзяць і на Беларускае Палессе. Але гэта «апошнія магікане», апошнія лірнікі. Іх мастацтву ў далейшым суджана сцэнічнае жыццё са стратай вялізнай колькасці элементаў народнай вакальнай культуры, цалкам узнавіць якую, на жаль, немагчыма.

Ю. А. Лабынцаў

Думкі на Туравай гары

Стаю на вяршыні Замкавай гары, якую ў народзе называюць Туравай



Замкавая гара сёння

гарою, на паўночна-заходняй ускраіне Турава. З поўначы перада мною Прыпяць, з паўночнага ўсходу віецца пасяродвялікага балота рэчка Язда, з поўдня падступаюць пад гару гарадскія будынкі.

Удалечыні, вышэй па плыні, злучаецца з Прыпяццю рака Случ, а ніжэй, за маўклівымі лясамі, што ледзь прыкметна цямнеюць за блакітным далягляда м,— рака Сцвіга. Шырокае міжрэчча і ёсць тое, што мы называем Тураўшчынай.

Яшчэ ў самыя раннія, самыя старажытныя часы нашай гісторыі Тураў ператварыўся на працягу даволі нязначнага часу з пасёлка дрыгавічоў у сталіцу княства з вялікай тэрыторыяй, у буйны палітычны, эканамічны і культурны цэнтр, роўны па сваім значэнні Полацку.

У летапісныя часы Турава гара была, зразумела, значна вышэйшай. Вятры і дажджы на працягу стагоддзяў рабілі сваю разбуральную справу. Гара паступова асядала, схілы абсыпаліся летам, апаўзалі з расталым снегам вясною. Цяпер агульная плошча замчышча дасягае двух з чвэрцю гектараў.

Даўжыня гары з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход — 260 метраў. Шырыня з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад — 180 метраў. Вышыня — сем з паловай метраў. У асноўных месцах вышыня пляцовак замчышча над летнім узроўнем вады ў Прыпяці дасягае дзесяці метраў.

Доўга стаю на Туравай гары і любуюся цудоўным краявідам, які рассцілаецца ўнізе. Тут можна шмат аб чым падумаць, памеркаваць, уявіць сабе, як выглядала гэтае месца ў мінулым.

Далёка раскінулася зялёная пойма Прыпяці. Перад самым замчышчам ходзіць унізе задумлівы бусел. Пад яго чырвонымі нагамі ярка зелянее густая сакавітая трава. У высокім блакітным небе плывуць белыя воблакі, вялікія і малыя. Дзівоснымі формамі яны нагадваюць то дзікіх звяроў, то драпежных птахаў, то суровыя твары фантастычных воінаў, то нейкіх пачварных істот. Вось праплылі над маёй галавой цьмяныя, няроўныя расплыўчатыя абрысы казачнага замка. Можа, таго самага, што ўзвышаўся калісьці на гэтай гары?

І мне пачынае здавацца, быццам перамясціліся эпохі і сам я апынуўся раптам у далёкім-далёкім мінулым

і знаходжуся не ў дваццатым, а ў дзесятым ці адзінаццатым стагоддзі. І з душэўным хваляваннем адчуваю, як знікае ўяўленне аб часе.

Перада мною ўсё тая ж Прыпяць, але асноўнае рэчышча яе куды шырэй і паўнаводней, і ўся сучасная пойма знаходзіцца пад вадой не толькі вясною, як цяпер, але і заўсёды, і рака падступае пад самую Тураву гару, на якой узвышаецца драўляны замак з тоўстых дубовых бярвенняў. І плывуць па рацэ ўсё тыя ж чорныя прасмоленыя «чайкі», адна за адной, толькі не з падвешаным маторам, а на вёслах, і сядзяць у «чайках» усё тыя ж здаровыя, дужыя тураўцы. Адны з іх у зрэбных даматканых кашулях, а другія зусім голыя да пояса.

Куды ж яны плывуць у сваіх вастраносых «чайках»? Можа, у Кіеў? А можа, яшчэ далей уніз па Дняпры, па вялікім водным шляху «з варагаў у грэкі», у Чорнае мора, да цёплых візантыйскіх берагоў, разам з кіяўлянамі, разам з іншымі саюзнікамі?

Хто ведае!..

А за маёй спіной — магутныя сцены з байніцамі і такія ж магутныя вежы, з якіх так зручна аглядаць і ўсю пойму Прыпяці, і цёмна-зялёную сцяну далёкіх лясоў, і шырокія прасторы лугоў і палёў. І стаяць на вежах вартавыя дазорцы, пабліскваючы на сонцы шаломамі, і пільна ўглядаюцца ўдалечыню. Ці не набліжаюцца з паўднёвага ўсходу хазары або печанегі, а потым полаўцы, а яшчэ пазней — татары? Ці не клубіцца пыл пад нагамі ў незлічоных варожых коннiках? Ці не плывуць па рацэ чаўны і лодкі з незнаёмымі воінамі? А за сценамі, пасярод дзядзінца, і на плошчы, і на вузкіх вуліцах кіпіць жыццё. Дзівоснае, казачнае для нас жыццё зіхаціць усімі сваімі яркімі фарбамі і колерамі ў самых разнастайных праявах. І па зялёнай сакавітай траве пад гарою ходзіць, як і сёння, сур'ёзны задумлівы бусел...

Мы ўсе арганічна звязаны з нашай бурнай, складанай і нялёгкай эпохай, поўнай вялікіх гістарычных змен і пераўтварэнняў, значных адкрыццяў у навуцы і тэхніцы. Мы звязаны з ёю ўсёй сваёй сутнасцю, але як прыемна апынуцца на нейкі час у атмасферы далёкага мінулага, адчуць подых гісторыі, ход далёкіх падзей, што цяпер здаюцца раптам



З Замкавай гары адкрываецца захапляючы від на запрыпяцкія далі

блізкімі і нібыта зусім нядаўнімі.

Удала было выбрана для горада гэтае прыгожае месца, зручнае і выгоднае ў стратэгічных адносінах. Прыродныя ўмовы рабілі яго непрыступным. Турава гара панавала над Прыпяццю з усімі яе затокамі і пратокамі, над заліўнымі лугамі і палямі, над усім наваколлем. Тураўскі замак быў акружаны валамі і ровам з вадою, які злучаўся з аднаго боку з вялікім балотам і рэчкаю Яздай, а з другога — са Струменем, пратокай Прыпяці.

Рэшткі рова захаваліся да нашых дзён. Сучасная вуліца Карла Лібкнехта каля Замкавай гары раней называлася Роў, а Калгасную вуліцу старыя жыхары і цяпер яшчэ называюць Вал.

Замак размяшчаўся на двух узгорках, штучна насыпаных людзьмі. Узгорак, на якім я стаю, вышэйшы і шырэйшы, другі — меншы і ніжэйшы. На плоскай і роўнай вяршыні асноўнай гары знаходзіўся княжацкі дзядзінец.

Спусціўшыся з Замкавай гары, выходжу на Красную плошчу. Так называецца з даўніх часоў прасторная і няроўная, акаймаваная невялікімі хаткамі пясчаная плошча, што раскінулася перад Замкавай гарой з захаду.

Красная плошча! Старажытная назва, якая захавалася з далёкага мінулага!

...Ісці трэба цераз балота на паўночна-заходняй ускраіне Турава, недалёка ад Замкавай гары. Мясцовасць гэтую тураўцы так і называюць — Балота.

Знаходзяцца могілкі на беразе Язды, маленькай рачулкі з няпэўнымі, топкімі берагамі, метрах у двухстах пяцідзесяці ад Турава, на невялікім прыўзнятым месцы, абкружаным з усіх бакоў балотам. Цяпер Язду выправілі, паглыбілі, ператварылі ў канал. Астравок мае авальную форму, ён падобны на яйка.

Тут, недалёка ад Замкавай гары, якраз насупраць, існаваў у X—XII ст. невялікі манастыр з кафедрай тураўскіх епіскапаў. У тыя часы гэта быў нароўні з Полацкам галоўны і найстарэйшы цэнтр перапіскі кніг на Беларусі. У ім было напісана ў XI ст. Тураўскае евангелле, знойдзенае ў Тураве ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Захавалася дваццаць старонак гэтага найстаражытнейшага помніка. Паводле падання, у манастыры на астраўку жыў Кірыла Тураўскі...

Вясной, у час паводкі, балота ператвараецца ў возера і зліваецца з Прыпяццю, але астравок ніколі не затапляецца. Старажытнае гарадзішча! Адно з тых так званых круглых балотных гарадзішчаў, якія характэрны для Тураўшчыны і добра вядомы археолагам.

Палессе, легендарнае мора Герадота, які быццам бы наведаў гэтыя мясціны дзесьці ў сярэдзіне V ст. да н. э... Магчыма, самая сярэдзіна яго, самае глыбокае месца і ёсць славутае Князь-возера — рэшткі мора. Тураўскае княства ў цэнтры Палесся — адно з старажытных папярэднікаў беларускай дзяржавы, сталіцамі якой у розныя часы на пачатку нашага тысячагоддзя былі Полацк, Смаленск, Тураў. Тураў і Смаленск у XI ст. трапілі ў залежнасць да кіеўскіх князёў, Полацк застаўся адзіным цэнтрам Белай Русі — Полацкага княства. Пасля яго культурнага росквіту ў XII ст. і затым распаду пачалося фарміраванне новай беларускай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага, сталіцай якой вялікі князь Міндоўг зрабіў Наваградак.

Тураўскае княства ў перыяд феадальнай раздробленасці раздзяліла-

ся на некалькі ўдзельных княстваў — Тураўскае, Пінскае, Слуцкае, Клецкае і іншыя — і страціла сваё значэнне. У гэты час хутка рос Пінск, ён апярэджваў у сваім гаспадарчым развіцці Тураў. Татара-мангольскае нашэсце мала закранула яго, асноўны напрамак крывавага шляху Батыя прайшоў больш на поўдзень, хоць не выключана, што не мінула яно і Тураў, і менавіта тады, як сведчыць паданне, быў закіданы немаўлятамі славуты калодзеж Тура, пасля чаго на працягу сямі гадоў з яго струменіла жаночае малако...

Наваградак аб'яднаў у XII—XIV ст. вялікія суседнія княствы — Полацкае, Турава-Пінскае і Смаленскае, гэта была магутная беларуская дзяржава, якая не без падстаў да XVII—XVIII ст. прэтэндавала на першынство ў славянскім свеце, пакуль у 1654 г. Масква не пачала ажыццяўляць свае даўнія планы аб захопе Беларусі і пад сцягам абароны аднавернікаў распачала кровапралітную вайну, якая забрала больш паловы насельніцтва — трэба лічыць, лепшую палову... Тураўшчына, старажытная і легендарная, у каторы раз пасля найвялікшага росквіту ў XII ст. перажывала яшчэ большы заняпад і спусташэнне... Яшчэ не існавалі многія, буйнейшыя і вядомыя сёння беларускія гарады і вёскі; там, дзе яны ўздымуцца, шумелі непраходныя лясы ды шамацела рудая асака — а Тураў гаманіў, працаваў, змагаўся. Не было яшчэ вёсачак Зарэчча і Бярэжжа, на месцы якіх з'явіўся з цягам часу раённы цэнтр, сучасныя Жыткавічы: паўнаводнай і суднаходнай была рэчка Глініца (Жэзна, Вішаўна, Беражанка, або Жыткаўка), што ціха струменіць да Прыпяці з возера Чырвонага, Князь-возера, ці Жыд, ад якога і пайшло, відавочна, найменне рэчкі і затым горада — а ў Тураве кіпела жыццё...

Першае пісьмовае ўпамінанне аб Жыткавічах адносіцца да 1500 г. у Метрыцы Літоўскай. У «Выроку (рашэнні) паміж панам Войцэхам Кучуковічам і князем Сямёнам Міхайлавічам Слуцкім аб маёнтку Жыдкавічы» разбіраецца скарга Войцэха Кучуковіча, маршалка гаспадарскага. Бацька князя, Міхайла Слуцкі, адняў у бацькі Войцэха Кучуковіча, Яна Кучуковіча, маёнтак Жыдкавічы. Сямён Слуцкі даводзіць, што Ян Кучуковіч ніколі не валодаў маёнткам. У адказ Сямён Кучуковіч прад'яўляе сведчанні 22 баяр, якія пад прысягай пацвердзілі, што Ян Кучуковіч сапраўды валодаў маёнткам і сяляне плацілі яму даніну. Рашэнне было адназначным: прысудзіць маёнтак Жыдкавічы ў вечнае карыстанне Сямёну Міхайлавічу Кучуковічу і яго дзецям, князю Слуцкаму забаранялася ступаць на тэрыторыю маёнтка... «Кароль падпісаў і пячатку прывесіў. Пісана ў Вільні 10 кастрычніка 1498 г.»

У першай трэці XIV ст. абрываецца старажытная дынастыя тураўскіх князёў, горад пераходзіць ва ўладанне князя Свідрыгайлы. Князь Гедымін аддаў Тураўскую зямлю ва ўладанне свайму сыну Нарымунту. З XV ст. Тураў належаў буйным феадалам князям Глінскім.

У 1507 г. феадалы, якія шукалі саюзу з Масквой і нярэдка адкрыта пераходзілі на бок рускай дзяржавы, узнялі паўстанне пад кіраўніцтвам Міхала Глінскага.

Міхал Львовіч Глінскі (1470—1534 гг.), прадстаўнік знакамітага княжацкага роду, вёў сваё паходжанне ад татараў, што з канца XIV ст. з'явіліся на беларускіх землях. Зямельныя ўладанні Глінскіх знаходзіліся ў асноўным на Палессі. Тураў быў іх родавым маёнткам. Свае маладыя гады Міхал правёў у Еўропе на службе ў саксонскага курфюрста Альбрэхта, потым пе-

«Пагоня» — дзяржаўны герб Вялікага княства Літоўскага. Малюнак 1575 г.

райшоў на службу да імператара Святой Рымскай імперыі Максіміліяна I. На яго баку Міхал ваяваў у Італіі, вызначыўся ваенным талентам і смеласцю. Удзячны імператар надаў свайму ўлюбёнцу тытул князя Святой Рымскай імперыі. Пасля 12-гадовай службы ў Еўропе князь Міхал вярнуўся на радзіму і хутка стаў прыкметнай фігурай у вялікакняжацкім акружэнні. Паступова Глінскі становіцца першым дарадцам вялікага князя Аляксандра, ён быў практычна кіраўніком дзяржавы.

Пасля смерці Аляксандра і ўвакняжання яго брата Жыгімонта і Міхал Глінскі страчвае ўплывовасць пры двары. Абгавораны сапернікамі, у першую чаргу асабістым ворагам трокскім кашталянам Янам Заберазінскім, дворны маршалак трапляе ў няміласць да новага гаспадара. Славалюбства не дазваляла яму адыгрываць другарадныя ролі ў вышэйшай палітыцы. Каб мець вяршэнства на палітычным Алімпе Вялікага княства, Глінскі вырашыў выступіць супраць вялікага князя і раздзяліць краіну. Ён пачаў збіраць вакол сябе сваякоў і сяброў, усе яны былі ўплывовымі, багатымі людзьмі. Брат Міхала, Васіль Глінскі, берасцейскі ваявода, другі брат, Іван — ваявода кіеўскі. Хіліліся да Глінскага князі Друцкія, Мсціслаўскія.

Міхал задумаў узнавіць Вялікае княства Літоўскае ад Літвы да Русі, адрадзіць кіеўскую манархію. Разумеючы, што без моцнага знешняга саюзніка не абысціся, Міхал Глінскі пайшоў на перамовы з Масквой. У час вайны паміж Вялікім княствам і Маскоўскай дзяржавай, якая пачалася ў 1507 г., Васілю III было выгадна «ўзбунтаванне» на пагранічных тэрыторыях свайго супраціўніка. Гэта давала Масковіі дадатковыя шансы на перамогу. Дзеля аслаблення магутнага заходняга суседа маскоўскі ўрад пайшоў на змову з Глінскім. Змоўшчыкі дамовіліся аб стварэнні пад рукой Масквы самастойнай дзяржавы, на чале якой вырашылі паставіць Міхаіла Глінскага.

Цэнтрам выступлення стаў горад Тураў. Адсюль князь Міхал са сваім атрадам пайшоў да Мазыра, як паведамляе летапіс, «Мазыр узяў ды сваіх людзей там пасадзіў». Далей летапісец занатаваў, што «прысталі таксама да яго князі Друцкія і князь Міхал Мсціслаўскі з замкамі сваімі, той з Друцкім, а гэты з Мсціслаўскім, так жа і аршанцы. Крычаў, Гомель паддаліся яму»... Сумесна з маскоўскім войскам атрады Глінскага ўзялі ў аблогу Мінск.

Вялікі князь Жыгімонт мусіў рыхтаваць для барацьбы з мяцежнікамі ўрадавае войска. Супрацьстаяць яму атрады Глінскага не маглі. Яны пачалі адыходзіць да Оршы. Там былі сканцэнтраваны асноўныя сілы маскоўскага войска. Пры набліжэнні да Оршы ваенных злучэнняў Жыгімонта рускія палкі сумесна з людзьмі князя перайшлі Днепр, ухіліўшыся ад бітвы. Здарылася гэта супраць волі Міхала Глінскага.

Беларуска-літоўскі летапіс XVI ст. «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» гаворыць, што Глінскі меў намер выйсці на бітву з ліцьвінскімі харугвамі ды «апошняга шчасця свайго і перамогі ў той бітве хацеў дамагчыся. Агітаваў гетманаў маскоўскіх, каб да бітвы поле далі, абяцаючы ім пэўную ды пышную перамогу, калі будуць паводле яго рады паступаць».

Але камандаванне маскоўскім войскам не прыняло ўгавораў Глінскага. Яно заключыла мірнае пагадненне з Жыгімонтам, па якім Глінскім і іх блізкім паплечнікам гарантаваўся свабодны выезд з Вялікага княства ў Маскву. Улюбёнец лёсу Міхал Глінскі бясслаўна, як здраднік, пакінуў Бацькаўшчыну, далейшае яго жыццё было бясслаўным і незайздросным...

Паўстанне ў 1508 г. пацярпела паражэнне, Тураў быў адданы гетману Канстанціну Астрожскаму.

Канстанцін Іванавіч Астрожскі нарадзіўся ў 1460 г. Гэта быў найбольш праслаўлены і вядомы ў свой час военачальнік, мужны абаронца краю, незаслужана забыты ў апошнія стагоддзі.

Род Астрожскіх ідзе з Турава, у канцы XIV ст. галоўнай рэзідэнцыяй іх быў Астрог — горад на Валыні. Змагаўся з татарскімі рабаўнікамі, затым вызначыўся ў барацьбе з маскоўскімі заваёўнікамі. На яго магіле (памёр К. І. Астрожскі ў 1530 г.) зроблены надпіс, які сведчыць, што вышэйшы гетман — гэтую пасаду галоўнага начальніка войска Канстанцін Астрожскі атрымаў у 37 гадоў — 63 разы перамагаў ворага. А 8 верасня 1514 г. у бітве пад Оршай з маскоўскім войскам, якое ўтрое пераўзыходзіла сілы абаронцаў, Канстанцін Астрожскі фактычна выратаваў Вялікае княства Літоўскае ад захопнікаў. Аб гэтай слаўнай перамозе даведалася ўся Еўропа, у Нюрнбергу была выпушчана спецыяльная лістоўка, дзе апісвалася бітва пад Оршай. Яна ўвайшла ў хрэстаматыі па ваеннай гісторыі як узор умелай тактыкі бою з намнога мацнейшымі сіламі ворага. У Еўропе Астрожскага называлі Ромулам, Спіцыонам, другім Ганібалам...

Князі Астрожскія, якія валодалі горадам з 1508 па 1620 г., вымушаны былі яшчэ раз будаваць на Замкавай гары ўмацаваны замак — апошні, рэшткі якога захаваліся да мінулага стагоддзя і апісваліся вядомым падарожнікам П. Шпілеўскім — ад нашэсця ваяўнічых крымскіх татар пад вадзіцельствам хана Гірэя, якія неаднаразова — у 1502, 1521 гг. нападалі на Тураў.

З канца XV ст. крымскія татары не раз урываліся на тэрыторыю сучаснай Беларусі. У 1497 г. яны забілі непадалёку ад Мазыра мітрапаліта кіеўскага і ўсяе Русі Макарыя. У час вайны 1500—1503 г. паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай Іван III неаднаразова інструктаваў Менглі-Гірэя, каб крымскія загоны накіроўваліся ў бок Слуцка, Турава, Пінска... з мэтай аслабіць усходнія межы Вялікага княства Літоўскага. Карыстаючыся тым, што асноўныя сілы княства ваявалі ў гэты час з Масквой, крымчакі пастаянна спусташалі беларускія землі... Восенню 1502 г. яны перайшлі Прыпяць і пачалі ваяваць за землі каля Турава і Пінска. Славуты слуцкі князь Сямён Алелькавіч перахапіў крымчакоў за 6 міль ад Бабруйска і ўшчэнт разбіў іх, вызваліўшы вялікі палон.

У канцы XVI ст. у гісторыі Турава, як і ўсёй Беларусі, наступілі яшчэ больш змрочныя часы. У 1569 г. адбылося аб'яднанне Польскага каралеўства з княствам Літоўскім — Люблінская ўнія. Польскія паны змаглі ажыццявіць сваю даўнюю мару — захапіць беларускія і ўкраінскія землі. Тураў увайшоў у склад Рэчы Паспалітай, непасрэд-

ным уладальнікам горада стаў польскі кароль, а жыхары яго аднесены ў разрад казённых сялян. Брэсцкая царкоўная ўнія, прынятая ў 1596 г., стварыла ўмовы для шырокага распаўсюджвання каталіцызму на Беларусі, праваслаўныя брацтвы трапілі ў цяжкія ўмовы. У такім прыгнечаным становішчы былі тураўскія брацтва і школа, якая існавала пры манастыры... Тут знаходзіўся найбольш даўні ачаг вінаградарства на Беларусі: захавалася распараджэнне аб укрыцці вінаграднай лазы на зіму ў Тураўскім манастыры, якое адносіцца да XVI ст. У далёкім, закінутым богам і людзьмі краі, дзе праваслаўная царква валодала бязмежнай уладай над душамі людзей, не ўсе вернікі былі богабаязнымі. Так, галоўны Літоўскі трыбун прысудзіў сваім Дэкрэтам ад 22 снежня 1671 г. Вікенція Сярвіля і Івана Блоцкага да выгнання і ўплаты 2730 злотых за ўзброены напад на тураўскі Барыса-Глебскі манастыр [Пінскага павета], захоп грошай і дакументаў і нанясенне пабояў людзям Пінскага епіскапа Маркіяна Белазора...

З XV ст. Тураў знаходзіўся ў складзе Трокскага, з 1566 г.— Берасцейскага ваяводства. Горад складаўся з асноўнай часткі і двух прадмесцяў — Заяцелля і Запясочча.

Славутая Замкавая гара... Толькі вельмі маляўнічай фантазіяй можна ўявіць сабе на ёй знакамітую тураўскую вежу, на дзядзінцы Замчышча. Гэта было абарончае збудаванне Тураўскага замка, якое адносілася да тыпу валынскіх вежаў. Узведзена яна ў другой палове XIII ст. з цэглы на вапнавым растворы, круглая, дыяметр унутры — каля 11 м, падзелена на некалькі баявых ярусаў. Разбурана ў 1830 г.

Тут жа, на Замчышчы, знаходзіўся помнік дойлідства XII ст.— Тураўская царква, рэшткі якой выяўлены М. Каргерам пад час археалагічных раскопак у 1962—1963 гг. Сцены яе, складзеныя з плінфы, захаваліся на ўзроўні 0,3—0,5 м, яны даюць падставу меркаваць аб яе архітэктуры: 6-слуповы 3-апсідны храм, апсіды ўпрыгожаны плоскімі пілястрамі, падлога — з паліваных плітак. Слупы ў сячэнні крыжовыя, у паўднёва-заходняй частцы — круглая вежа з вітымі ўсходамі.

Гасціны двор існаваў у Тураве ў XVIII—XIX ст., стаяў на гандлёвай плошчы паблізу замка. Гэта было прамавугольнае двухпавярховае збудаванне замкнёнай кампазіцыі з унутраным дваром і двухсхільным дахам. Памер яго — 43×21 м. На кожным паверсе знаходзілася па 36 крам і 12 складскіх памяшканняў.

На Чырвонай плошчы — як у Маскве! — у гонар вызвалення сялян ад прыгоннай залежнасці ў 70-я гады мінулага стагоддзя быў узведзены помнік цару-«вызваліцелю» Аляксадру II, разбураны рэвалюцыйна настроенымі тураўлянамі, падбухторваемымі бальшавікамі, у 1918 г. Тут планавалася ўстанавіць таксама помнік Кірыле Тураўскаму, пачаўся збор сродкаў па падпісцы, але грымнула імперыялістычная вайна... Помнік быў устаноўлены толькі праз 80 гадоў, вясной 1993 г., калі рухнула таталітарная камуністычная сістэма.

У 1595 г. успыхнула буйное антыфеадальнае паўстанне, якое ўзначаліў Севярын Налівайка. Ачаг яго быў на Украіне, потым ахапіла значную частку Беларусі. Паўстанцы рухаліся ўздоўж Прыпяці, захапілі Тураў, Давыд-Гарадок, Пінск, грамілі на шляху маёнткі феадалаў, «почали творить шкоду великую, замкам и панам». Сяляне аказвалі ім усялякую дапамогу і падтрымку, перапраўлялі праз рэкі і балоты артылерыю, гаціліпераправы. Цэлыя сем'і ўліваліся ў рады паўстанцаў. Але паўстанне было жорстка заду-

шана, вясной 1596 г. Налівайка пайшоў на Валынь.

Задушыўшы антыфеадальныя выступленні ў канцы XVI — пачатку XVII ст., польскія магнаты, шляхта з яшчэ большым стараннем прыгнечвалі беларускі народ. На Украіне ў гэты час усё большы аўтарытэт і сілу набіраў Багдан Хмяльніцкі, ён узначаліў вызваленчую барацьбу, якая ахапіла і Беларусь. У яго войску былі беларускія атрады, мешчанін з Турава Пракоп Цэўка з'яўляўся «палкоўнікам Тураўскім». Хмяльніцкі ўзняў запарожскіх казакаў на барацьбу супраць шляхты, прыход казацкіх атрадаў на Беларусь паклаў пачатак паўстання супраць паноў. Паўстанцы грамілі маёнткі і каталіцкае духавенства, замкі, касцёлы.

Каб задушыць непакорнасць сялян і хваляванні, што адбываліся пад уплывам прызываў Багдана Хмяльніцкага, правіцелі Рэчы Паспалітай у 1649 г. накіравалі ў Беларусь карную экспедыцыю пад кіраўніцтвам Януша Радзівіла. Яго войска рухалася ў напрамку Пінск — Тураў — Мазыр — Рэчыца. Першы ўдар Радзівіл, злучыўшы свае сілы пад Нобелем з атрадам Мірскага, абрушыў на Тураў. Горад, які ў той час налічваў усяго 3 тысячы жыхароў і меў вельмі мала актыўных абаронцаў, не скарыўся і не папрасіў літасці. Барацьба была нягоўнай. Тураў быў абкружаны, і, нягледзячы на выключную мужнасць і гераізм тураўцаў, палякі ўварваліся ў горад, на вуліцах пачалася зверская разня... Па загаду Радзівіла амаль усё насельніцтва Турава было знішчана, горад разрабаваны і спалены. Расправіўшыся з Туравам, Радзівіл накіраваўся ў бок Мазыра, адзначаючы свой шлях крывёю. Так Януш Радзівіл змагаўся за незалежнасць Вялікага княства Літоўскага супраць Багдана Хмяльніцкага, супраць Масквы... Хмяльніцкі ў час перагавораў з каралеўскімі пасламі ў Пераяслаўлі гнеўна гаварыў: «Льецца кроў людская, войска літоўскае выразала Мазыр і Тураў».

Восенню 1655 г. да Турава на рачных суднах прыбыло рускае войска на чале з Дзмітрыем Валконскім. Змучаныя тураўцы выйшлі ім насустрач. Але рускія войскі хутка вымушаны былі пакінуць Тураў. Жыхары яго зноў апынуліся пад пятой польскіх феадалаў. Рамёствы і гандаль зусім прыйшлі ў заняпад, прыгонная залежнасць яшчэ больш узмацнілася, сялянскія надзелы памяншаліся. Выступленні сялян супраць шляхты не спыняліся. На Палессі дзейнічаў атрад паўстанцаў пад кіраўніцтвам Рыгора Чорнага, у які ішлі беднякі з Пінска і Турава. Паўстанцы грамілі панскія маёнткі, забівалі іх уладальнікаў, знішчалі дакументы аб прыгоннай залежнасці сялян. Яны змагаліся не толькі супраць панскага прыгнёту, але і супраць уласных эксплуататараў, гарадской знаці, якая дзейнічала заадно з панскімі феадаламі.

Толькі ў выніку другога раздзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г. Тураўшчына была канчаткова далучана да Расіі. Часткай Тураўскага маёнтка ў гэты час валодаў граф, маршалак галоўнага Літоўскага трыбуна Іван Салагуб, а другая частка, якая належала казне, была передана ва ўзнагароду за шчырую службу генералу Селябіну. У Тураве ў той час налічвалася каля пяцісот дамоў, было сем цэркваў і сінагога.

Паўстанне К. Каліноўскага не ахапіла край, хоць хвалі яго, глухія звесткі аб змагарах за лепшую долю супраць іншаземных прыгнятальнікаў даходзілі і сюды. Старажылы ўспамінаюць, што ў тутэйшых непраходных лясах і балотах хаваліся рэшткі разбітага ў 1864 г. войска паўстанцаў.

...Палову пасяўных плошчаў у

XVIII ст. займала жыта, на другім месцы было проса, для вырабу адзення была неабходнасць у ільне і канаплях. Аснову дабрабыту памешчыцкага маёнтка па-ранейшаму складала прыгонная праца сялян. У канцы XVII ст. баршчына дасягала 4—6 дзён у тыдзень з валокі зямлі. Расшырэнне ворыўных плошчаў і адработных павіннасцей, павелічэнне колькасці членаў у сялянскіх сем'ях — усё гэта прыводзіла да яшчэ большага збяднення насельніцтва Тураўшчыны. Эканоміка і ўзровень жыцця насельніцтва краю асабліва пагоршыліся ў пачатку XVIII ст. Гэта было звязана з працяглымі войнамі, паўстаннямі, разарэннямі, якія прыносілі польскія і рускія заваёўнікі. Тармазіў узнаўленне і развіццё эканомікі сацыяльны і палітычны лад Рэчы Паспалітай, прыгонная залежнасць сялян. У канцы XVIII ст. колькасць жыхароў краю не дасягала ўзроўню першай паловы папярэдняга стагоддзя. У гэты час у глыбінях феадальна-прыгоннай сістэмы ўжо назіраліся зародкі новых, капіталістычных адносін — павышалася таварнасць гаспадаркі, пачала ўжывацца наёмная праца, усё больш расслойвалася сялянства. Тураўскі фальварак быў ліквідаваны, землі раздадзены сялянам пры ўмове аплаты грашовага чыншу. Змяніліся павіннасці сялян — утварыліся пасады егераў, ляснічых, асочнікаў. Раней яны лічыліся вольнымі, цяпер ахоўвалі лес і ўгоддзі, здабывалі дзічыну і павінны былі таксама плаціць чынш. Перавод сялян на грашовы аброк даў ім некаторую магчымасць больш вольна распараджацца сваёй працай і яе вынікамі. Назіраўся далейшы рост рамёстваў, развіццё таварна-грашовых адносін і пашырэнне ўнутранага рынку.

Іншаземныя захопнікі — мангольскія, польскія, рускія, крымскія і іншыя — на працягу стагоддзяў рабавалі край, у шматлікіх войнах і карных экспедыцыях нішчылі людзей і прыродныя рэсурсы, смакталі кроў з прыгнечанага народа... Насельніцтва галадала, пакутавала, мёрзла і гібела — магнаты толькі багацелі. У 1793 г. англійская акцыянерная кампанія Пітта і Форстэра купіла ў Салагуба лясныя ўгоддзі, па-драпежніцку высякала лес і адпраўляла яго па Прыпяці, Дняпры і Заходняму Бугу за мяжу. Пра злачынства даведаліся ў Пецярбургу, у 1800 г. выйшаў спецыяльны ўказ імператара Паўла I, які прадпісваў ліквідаваць дагавор і ўзяць маёнтак у казну.

Па імянным царскім указе ад 6 верасня 1795 г. у краі была заснавана паштовая сувязь. Паштовая дарога прайшла ад Мазыра да Давыд-Гарадка праз Жыткавічы (8 коней, 4 паштальёны), Тураў (тое самае) і далей праз Ленін (тое самае).

Новую бяду і разарэнне прынесла краю Айчынная вайна 1812 г. Голад, запусценне абязлюджвалі цэлыя мясцовасці. Калі ў пачатку XX ст. засяляліся перасяленцамі з паўночных раёнаў Украіны бязлюдныя прасторы ў пойме Прыпяці, у многіх месцах былі прыкметны закінутыя палі, барозны, зарослыя лесам і хмызнякамі, сляды паселішчаў, абгарэлыя бярвенні і вуголле.

На пасяджэнні кабінета міністраў па рапарце Барклая дэ Толі аб цяжкім становішчы сялян Мінскай губерні 31 ліпеня 1817 г. адзначалася, што сяляне плаваюць па Прыпяці не для гандлю, а для збору міласціны. Ад'ютант, які вяртаўся з м. Тураў у Мазыр, быў абкружаны чаўнамі, з якіх крычалі яму: «Хлеба, хлеба, мы паміраем з голаду». Яму расказвалі, што народанасельніцтва ў тым краі за апошнія пяць гадоў паменшылася амаль на тры чвэрці, і прычына таму — голад.

У сярэдзіне XIX ст., асабліва пасля пракладкі ў 1886 г. чыгункі,

на месцы вёсак Бярэжжа і Зарэчча пачаў расці пасёлак Жыткавічы, у 20 вярстах на захад жыла сваім ціхім жыццём шматлюдная вёска Ленін, а ля сініх вод Князь-возера мірна лавілі рыбу карэнныя палешукі, ціхмяныя насельнікі Дзякавіцкай воласці — «народ некрасивый, но честный»...

Рэформа 1861 г. не задаволіла сялян. Нават пры чытанні Маніфеста многія былі ўпэўнены, што гэта — несапраўдны Маніфест, чытальнік падкуплены памешчыкам, яны скажаюць «Положение 19 февраля». Даверам карысталіся тыя чытальнікі, якія знаходзілі ў Маніфесце такія месцы, якія адпавядалі надзеям і спадзяванням сялян, асабліва неафіцыйныя, «правільныя» чытальнікі, звычайна беглыя салдаты, разначынцы. Усё часцей узнікала незадавальненне, пратэст супраць Маніфеста. Звычайна гэта насіла пасіўны характар — нявыхад на баршчыну, адказ плаціць аброк, падпісваць устаўныя граматы. Выступленні сялян выказваліся таксама ў захопе зямель, якія належалі памешчыку, лясоў і лугоў, самавольных парубках і пакосах. Так было і ў Ленінскай, і ў іншых воласцях.

Зямля ў Мінскай губерні была вельмі дарагой: сяляне вымушаны былі плаціць за дзесяціну 79 р. 20 к., з іх 20 % — налічнымі грашыма, у той час як рыначны кошт дзесяціны — 18 р. Сяляне не спяшаліся выкупляць зямлю. У Мінскай губерні па стане на 1 студзеня 1863 г. было падпісана ўсяго 8 Устаўных грамат — 2 %, а ў Мазырскім уездзе — ніводнай. Устаўныя граматы прымушалі падпісваць сілком, з дапамогай войск. Зямля сялянам, адведзеная для выкупу, замянялася памешчыкамі горшай, неўрадлівай.

У Мазырскі ўезд з Мінска быў накіраваны чыноўнік Крошынскі для абследавання становішча сялян. Ён вымушаны быў прызнаць, што «...у маёнтках князя Вітгенштэйна сяляне даведзены да апошняга разарэння і прадстаўляюць самае сумнае відовішча... у лахманах, разадраных рубішчах».

Многія памешчыкі няправільна ўстанаўлівалі баршчыну, прымушалі адрабляць па 7—9 дзён у тыдзень з двара.

Пасля зямельнай рэформы сяляне атрымалі за выкуп найбольш неўрадлівыя, далёкія ўчасткі. Лепшую зямлю памешчыкі пакінулі сабе. Аб гэтым сведчаць наступныя даныя па Жыткавіцкай воласці (Волости и важнейшие селения Европейской России, 1886 г.): зямлі ў валоданні сялянскіх абшчын налічвалася 16 214 дзес., ворыўнай — 11 730, а ў прыватных асоб — 68 566. За збор грыбоў і ягад у лесе, лоўлю рыбы ў возеры, за выпас жывёлы і сенажаць сяляне плацілі памешчыку, куплялі спецыяльны білет, або, па дамоўленасці, адраблялі ў гаспадарцы.

Найбольш буйны землеўладальнік на Палессі князь Пётр Львовіч Вітгенштэйн валодаў 7800 дзесяцін зямлі ў маёнтку Ленін, а ўсяго ў яго налічвалася 669,5 тыс. дзесяцін. Паводле купчай крэпасці 1876 г., маёнткам Людзяневічы валодала жонка падпалкоўніка Наталля Пятроўна Уварава, у яе налічвалася 30 830 дзесяцін зямлі. Трымала ў вёсцы карчму, якая давала 500 руб. у год.

Пасля сялянскай рэформы 1861 г. утворана Дзякавіцкая воласць з цэнтрам у сяле Дзякавічы, у склад якой уваходзіла 11 навакольных вёсак. Старастай быў выбраны Тарас Казлякевіч, пісарам працаваў Мацвей Рудзько. Абавязкі валаснога суддзі на працягу больш дзесяці гадоў выконваў Якаў Жураўлевіч. Тут у пераважнай большасці жылі людзі ўсе з чатырма прозвішчамі: Чэркас, Жураўлевіч, Рагалевіч і

Кудзелька, адпаведна і хутары, пасяленні былі — Чэркасы, Жураўлі, Кудзелічы, назвы якіх захаваліся да сённяшняга дня...

Адкрываліся лаўкі і крамы, у якіх дробныя купцы, гандляры-яўрэі гандлявалі прадметамі сялянскага побыту. Пры правядзенні рэформы ў 1861 г. на в. Дзякавічы былі выдзелены 42 надзелы. У 1886 г. у валасным цэнтры налічвалася 59 двароў, пражывала 632 чалавекі абодвух полаў, размяшчалася валасное ўпраўленне. Старажылы ўспаміналі, што яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя вакол вёскі былі відны рэшткі высокага драўлянага плоту ад нежаданых гасцей і звяроў. Насельніцтва займалася лоўляй рыбы, вырошчваннем жывёлы на продаж. Купцы Хінічы і Гіршы арэндавалі возера Жыд, ці Чырвонае. Ва ўрочышчы Майсееўка працаваў вадзяны млын. Ёсць звесткі, што на пачатку стагоддзя ў Дзякавічах існавала рэвалюцыйная арганізацыя меншавіцкай накіраванасці. Актыўны ўдзел у ёй прымаў Павел Ахрамовіч, жыхар в. Пласток.

У 1905 г. прадпрымальнік немец Леттэ пачаў пракладку вузкакалейкі Старушкі — Беркуноў (цяпер Пасталы). Каб сплаўляць лес, быў пракапаны канал, у Пасталах пабудаваны лесапільны завод. З пачаткам імперыялістычнай вайны Леттэ вымушаны быў пакінуць справу і паспешна выехаць у Германію. У савецкі час завод стаў нацыянальнай уласнасцю, ён атрымаў назву «Праца», быў уключаны ў аб'яднанне «Лесбел» і хутка зноў пачаў выдаваць паліматэрыялы для патрэб рэспублікі.

В. Р. Феранц

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн.: Беларусь, 1979.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мінск, 1940.

Вішнеўскі А. Ф., Літвін А. М. Тураў. Мн.: Беларусь, 1980.

Забытая слава. Кароткі агляд ваеннай гісторыі Беларусі. «Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862)». Госиздат БССР, 1959.

Туров древний и современный. Мн.: Полымя, 1981.

Памятная книжка Минской губернии (1889, 1895, 1898 гг.).

1000 вопросов и ответов из истории Белоруссии. Народная газета, №№ 99, 100 (1993 г.).

«Стагоддзе Мінскай губерні», 1893 г.

Материалы Национального архива Беларуси, ф. 694, оп. 3, д. 3444; д. 9, оп. 2091.

Материалы Туровского краеведческого музея.

Астрожскі Канстанцін

Канстанцін Астрожскі—наш слаўны зямляк, палкаводзец, якім мог бы ганарыцца любы народ... Паходзіў ён са знатнага роду тураўа-пінскіх удзельных князёў. Прозвішча ўтворана ад назвы горада Астрога (на Валыні), якім валодаў адзін з яго продкаў. Канстанцін меў таксама землі на Беларусі — частку атрымаў як пасаг за жонкай, слуцкай князёўнай Аляксандрай, іншыя — у якасці ўзнагароды за ратную службу.

Нарадзіўся Канстанцін каля 1460 г. (дакладная дата невядома). У 1497 г. стаў гетманам. Польскі храніст Стрыйкоўскі так апісаў гэту падзею: «... гетман літоўскі, Пётр Белы, старац, паважаемы дваром і любімы народам, будучы на смертным одры, сказаў журботнаму Аляксандру (тагачаснаму вялікаму князю літоўскаму): «Князь Астрожскі Канстанцін можа замяніць мяне айчыне, будучы ўпрыгожаны вартасцямі рэдкімі».

Здольнасці Канстанціна ўжо тады былі добра вядомы, пасада, на якую яго прызначылі, з'яўлялася адной з найвышэйшых у княстве. Вышэйпрыведзеную характарыстыку пацвердзіў праз некалькі стагоддзяў рускі гісторык М. М. Карамзін: «...сей муж имел весьма скромную наружность, малый рост, но великую душу...»

У 1499 г. войскі маскоўскага вялікага князя Івана III парушылі перамір'е і абрынуліся на землі Вялікага княства Літоўскага, захапілі Сяргейск, Мшчэнск, Бранск, Пуціўль. Толькі пасля гэтага Васілій III афіцыйна аб'явіў вайну княству. Войска сабралі толькі да канца вясны. Астрожскі павёў яго супраць захопнікаў. Рашучая бітва адбылася 7 ліпеня каля невялічкай, але бурнай і глыбокай рэчкі Ведраш. Сілы былі няроўныя. Войска Вялікага княства Літоўскага налічвала 30 тыс. воінаў, маскоўскае — толькі конніцы 40 тыс., ды яшчэ пяхоту. Бітва была адчайная. Перамаглі воіны Івана III. Яны захапілі гарматы, абоз і больш за 5000 палонных, сярод якіх былі князі, знатныя баяры. К. Астрожскі быў паранены. Вялікі маскоўскі князь прапанаваў яму перайсці на службу да сябе. Гетман адмовіўся. Тады яму прыгразілі пажыццёвым зняволеннем. Астрожскі вымушаны быў даць згоду. Яго накіравалі ваяводай у Волагду. На новай службе «... великие битвы надь татарами одерживалъ и выигрывалъ». Аднак увесь час імкнуўся вярнуцца на радзіму. Такая магчымасць з'явілася толькі ў 1507 г. Вялікім князем літоўскім і каралём польскім у гэты час быў Жыгімонт I. Князя прызначаюць гетманам Вялікага княства Літоўскага.

Першымі адчулі на сабе яго руку татары. Яны пачалі цярпець адно паражэнне за другім. У 1512 годзе 6-тысячнае войска пад кіраўніцтвам гетмана ўшчэнт разбіла 25-тысячнае войска крымчакоў.

Тым часам новы маскоўскі вялікі князь Васілій III арганізаваў супраць Літвы і Польшчы кааліцыю. У яе ўвайшлі маскоўскае княства, Свяшчэнная Рымская імперыя, Данія, Валахія, Саксонія, Брандэнбург, Тэўтонскі рыцарскі ордэн. 30 мая 1514 г. маскоўскія раці выступілі ў паход. Захапілі Смаленск, пачалі пустошыць землі Беларусі. Аднак былі ўшчэнт разбіты ў бітве пад Оршай войскам, якім кіраваў К. Астрожскі. Перамога гэта атрымала велізарнае міжнароднае значэнне. Варожая кааліцыя распалася. Нават крымскія татары два гады не рашаліся нападаць на Вялікае княства Літоўскае. Пад час далейшых ваенных дзеянняў былі вызвалены ўсе землі і гарады, якія захоплены маскоўскім войскам (за выключэннем Смаленска).

Свой аўтарытэт і славу пераможцы Астрожскі выкарыстаў для падтрымкі праваслаўя. Ён адбудаваў разбураныя храмы ў Вільні, фундаваў будаўніцтва новых. Матэрыяльна дапамагаў Францыску Скарыне ў наладкаванні друкарні ў Вільні.

Аднак хутка прыйшлося зноў браць зброю ў рукі. Крымскія татары ўзнавілі набегі. Зноў палілася кроў, запалалі гарады і вёскі. 24-тысячнае татарскае войска было знішчана Канстанцінам Астрожскім практычна цалкам. Загінуў і Малай — сын Крымскага хана, які ўзначальваў набег.

У 1530 г. ва Усходняй Еўропе ўспыхнула эпідэмія. Сярод яе ахвяр быў і князь Канстанцін Астрожскі. Памёр ён у Вільні, пахаваны ў Кіева-Пячорскай лаўры.

Усё жыццё Канстанціна Астрожскага было аддадзена вернаму служэнню радзіме, няспыннай барацьбе з яе ворагамі. Гэта пра яго сказаў М. М. Карамзін: «В самом деле, никто не служил Литве и Польше усерднее Острожского, брата россиян в церкви, но страшного врага их в поле. Смелый, бодрый, славолюбивый, сей вождь одушевил полки Литовские, знатнейшие паны и рядовые воины охотно шли с ним в битву».

М. К. Багадзяж

ВЕДОМОСТЬ
О ПОТАШНОМ ЗАВОДЕ В КАЗЕННОМ ИМЕНИИ ТУРОВЕ И АССИГНОВАНИИ ОНОГО ЗА 1831-Й Г.

Завод состоит ... в имении Турове, строение деревянное, в длину 81, в ширину 54 аршина; в нем котлов медных 2, печей 4, из них одна для люстрования, другая для сушения поташа, 3 и 4 и при них по 2 чугунных котла для огревания двух строений, в коих помещается 50 корыт, наливающихся водою...

По инвентарю 1815 г. предложено выделывать поташа 80 шифунтов, из коих каждый содержит весу российских 500 фунтов... Выделка поташу продолжается по новому устройству поташного завода... В протекшем 1831 г. выделано поташа 49 шифун. 422 фунт. Ввиду недостатка употребляющегося для поташа лесу производство поташа перенесено в ... фольварок Переров, с наименованием Манькова Буда, где начались работы с 10 числа минувшего декабря.

...В течение одного прошлого года сделано поташа 905 пудов 35 фунтов.

К составлению поташа употребляется пепел из поваленных деревьев разного твердого рода собственных лесов казенного имения Туров... При отправлении сего состоит мастер 1, подмастерья 1 да 24 крестьянина из казенного имения Туров; новых изобретений к поташности не открыто, а руководствуются стародавними...

Завод устроен покойным графом Соллогубом. Завод перенесен, как выше известно, управляющим казенного имения Туров коллежским советником Матвеем Томиличем.

НАРБ, ф.299, оп.2, д.931, лл.108—110

ПАДЕНИЕ ПРИБЫЛЕЙ В КАЗЕННЫХ ИМЕНИЯХ И РАЗОРЕНИЕ КРЕСТЬЯН

Ревизия имения Турова [1836 г.]

... Имение Турово всемилостивейше пожаловано было в 50-летнее владение принцу Евгению Виртенбергскому, а потом по высочайшему указу с 12 апреля 1826 г. обращено в казенное ведомство. На отдачу того имения в 12-летнее содержание вызывались желающие, но таковых не явилось, а потому для управления имением с утверждения Минского гражданского губернатора определен тамошнею казенною палатою администратором дворянин Неслуховский.

...Получено было от уездного предводителя о последствиях ревизии его отношение, в котором он изъяснил, что ... причины уменьшения с имений Турово против инвентаря доходов сверх неудобств и потерей, происходящих от частых залитий полей водою, суть: а) большое и несоразмерное с хозяйством назначение по инвентарю на засевы полей количество семян, от чего, а равно и по недостатку семян, положенной пропорции засеваемо не было; в) невозвращение при поступлении в казну имения прибылей на хлеб...; с) неимение по фольваркам с давнего времени нужного числа скота; д) упадок цен на продукты и лесные изделия; е) невозможность по неограниченности числа рабочих выготовить определенное инвентарем количество смолы и дегтя; 4) евреи, в имении Турово проживающие, навязывают крестьянам водку на кредит и потом стесняют их безвременным сысканием долгов и забором за то скота и прочего имущества; 5) многие из крестьян по причине дождливых лета и осени лишились рабочего скота от падежа и не имеют на продовольствие достаточного запаса...

17 отделение департамента Государственных имуществ, сообразив вышеизложенное, находит, что за поверкою всех действий администратора Неслуховского по управлению имением Турово через особо назначенных на месте чиновников и за необнаружением при том со стороны Неслуховского злоупотреблений ко вреду казны, остаток, недопоступивший в 1826, 1827 и 1828 г. суммы 30 940 руб. 75 коп. с четвертью сер. со счетов сложить...

Начальник отделения
Старший бухгалтер
Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі, т. II (1772—1903 гг.), 1940.

1845 г. июля 11 дня Минский Губернский комитет для рассмотрения и составления Инвентаря помещичьего имения рассматривал представленный при отношении Мозырского уездного предводителя дворянства от 16 февраля сего года за № 210.

Инвентарь имения Люденевичи, в котором значится имение сие принадлежит к вотчинничеству помещика Антона Павлова Еленского.

Положено Мозырского уезда, в расстоянии от Минска 224, Мозыря 105, торгового местечка 14 и от пристани 16 верст.

К сему имению принадлежат деревни Забродочье и Загорбящи.

В сем имении по последней 8-й переписи числится крестьян мужского пола 321, женского 330; а по инвентарю показано: на лиц мужского пола 336, женского 291, в том числе способных к работам мужского 169, женского 120 душ. Дворов: тяглых 91, огородников 7.

Имущество крестьян следующее: лошадей 6, волов 290, коров 214, овец 617, свиней 260, пчел 402 улья, яловнику 431.

Общее пространство сего имения 26 554 1/3 десятины.

Распределение земель: у помещика имеется пашенной 620 2/3, сенокосной 536, под лесами 21 511 десятин, наделено для крестьян на один двор одна треть и на каждое однотягловое семейство, имеющего одного работника и одну работницу пашенной 20 1/2, сенокосной 4 1/2 десятины. Итого у крестьян усадебной 30 1/2, пашенной 2911, сенокосной 641 десятина.

Примечание. 1. На каждый крестьянский двор, в котором два тягла, кроме усадебной земли, наделено двойное количество пашни и сенокосов, в котором три тягла наделено три раза больше против одного тягла. 2. Семьи огородников на каждый двор наделены усадебной землей одну треть пашни и полторы сенокосной десятины.

Почва земли большей частью боровая, отчасти чернозем и песчаная в незначительном количестве.

Средний урожай на простопольной земле от 3 до 4, а на унавоженной от 6 до 8 зерн.

Качество сенокосов три части болотного, а четверть мурожная, при хороших урожаях собирается с морга мурожного сена от 150 до 200, болотного от 100 до 150 пудов.

Пастьба скота предоставлена крестьянам без ограничения в имении.

Средства крестьян для постройки и починки домов и хозяйственных строений... дерево крестьяне получают из лесных владений помещика без ограничения.

Отопление из владений помещика дрова без ограничения.

...Повинности крестьян главные пригон в неделю с однотяглового подъемного семейства полным участком с упряжью сгон в год с каждой рабочей мужского и женского поладу души по шесть дней.

Добавочные повинности для строительных работ... с каждого двора по шести дней.

Подводы для доставки экономических продуктов каждый крестьянский двор обязан отбыть подорожную повинность на расстояние 150 вёрст.

Сторожевство отбывается крестьянами по очереди мужчинами... с зачетом исполняющего эту повинность в барщину.

Ночной патруль содержится крестьянами по очереди.

Данина или вещественные сборы каждый тяглый крестьянин с каждого двора своего обязан дать владельцу курицы две, яиц двадцать, веревок шесть саженей, с каждой рабочей женщины по два фунта грибов...

Возраст рабочих рабочими считаются от 17 до 55, а женщины от 15 до 50 лет.

Оценка рабочего дня от 7 1/2 до 17 1/2 коп. серебром.

Означенный инвентарь прошнурован, скреплен членами, утвержден печатью комитета.

Гражданский Губернатор
Губернский прокурор
Члены от дворянства...

1862 г. января 6

РАПОРТ УПРАВЛЯЮЩЕМУ СЛУЦКИМИ ИМЕНИЯМИ ГЛАВНОМУ УПРАВЛЕНИЮ ИМЕНИЯМИ КН. ВИТГЕНШТЕЙНА...

Крестьяне... в настоящее время не желают приступать к заключению каких-либо добровольных соглашений. Но есть надежда на то, что в скором времени по примеру других волостей изменят свое мнение и сами потребуют соглашений. Так именно было в Лахвенских и Ленинских имениях...

Управляющий *К. Вагнер*

1862 г. января 31

ПИСЬМО УПРАВЛЯЮЩЕГО СЛУЦКИМИ ИМЕНИЯМИ КН. ВИТГЕНШТЕЙНА ГЛАВНОМУ ЛЕСНИЧЕМУ О ПОРУБКЕ ЛЕСА...

Честь имею ознакомить вас с копией указания, данного панам старшим лесничим лесных дач Лахвенской и Ленинской, чтобы в интересах князя-владельца были приняты меры к удержанию крестьян от самовольного пользования (лесными угодиями). Все это относится к... им. Ленинскому, а именно: Вильча, Микашевичи и Сенкевичи...

Управляющий *К. Вагнер*

У 1889 г. у Жыткавіцкай воласці, як відаць з «Справочной книги-спутника по Минской губернии», налічвалася 38 мясцовасцей: 11 вёсак, 6 засценкаў, 7 маёнткаў, 6 сёл (сюды адносяцца і Жыткавічы), чыгуначная станцыя, 3 фальваркі, 4 хутары; у Ленінскай воласці — 53 мясцовасці: 20 вёсак, 3 засценкі, 8 маёнткаў, лясная варта, лясніцтва, 2 мызы, мястэчка, 5 сёл, 5 урочышч, 3 фальваркі, 4 хутары; у Тураўскай воласці — 61 мясцовасць: дварэц (Тураўшчына), 29 вёсак, 9 маёнткаў, мястэчка, аколіца, прадмесце, 9 сёл, 10 урочышч; у Тураве — Ільінская і Прэабражэнская цэрквы, ваенна-прызыўны участак (Тураўскай, Жыткавіцкай і Ленінскай воласцей), ваенна-конскі участак (Станавы прыстаў трох воласцей — у Леніне). У кожнай воласці адкрыта народнае вучылішча. У Дзякавіцкай воласці — 16 мясцовасцей: 9 вёсак, маёнтак, 2 засценкі, 2 сялы, урочышча, фальварак...

УСТАВНАЯ ГРАМОТА

имения Люденевичи, принадлежащего помещику Антонию Павлову Еленскому Минской губернии Мозырского уезда 3 мирового участка

Составлена в 1862 г.

1) Имение Люденевичи состоит из Люденевичской волости с двумя сельскими обществами:
Забродочского сельского общества в деревне Забродочье
Загорбашского сельского общества в деревне Загорбашье
Дедовке

2) В каждом сельском обществе состоит дворов:
Забродочского сельского общества в деревне Забродочье 44
Загорбашского сельского общества в деревне Загорбашье 25
Дедовке 10
Итого 79

По инвентарю, утвержденном бывшим в 1845 г. Комитетом, состоит в пользовании крестьян земли:
в деревне Забродочье 1293 десят. 1212 саж.
Загорбашье 679 десят. 912 саж.
Дедовке 391 десят. 2880 саж.
Итого 2364 десят. 2004 саж.
и по настоящей Уставной грамоте на основании Высочайше утвержденного журнала Главного Комитета об устройстве сельского состояния 2 августа сего 1862 г.:
в деревне Забродочье 1177 десят. 1200 саж.
Загорбашье 639 десят. 1200 саж.
Дедовке 322 десят. 1200 саж.
Итого 2139 десят. 1200 саж.
Из них собственно под крестьянской усадебной оседлостью:
в деревне Забродочье 29 десят. 800 саж.
Загорбашье 16 десят. 600 саж.
Дедовке 6 десят. 160 саж.
Итого 52 десят. 160 саж.

Вышепоказанное, состоящее ныне в пользовании крестьян количество земли средним числом на один крестьянский двор по 25, а на двутягловый по 39 дес. 1200 саж. предоставляется им в полное пользование...

Находящиеся в деревнях колодцы и водопои остаются в общем пользовании крестьян и помещика.

Из находящихся при деревне в общем пользовании выгонов выделяется для крестьян согласно ст. 42 местн. Полож. на всякий участок по 1000 саж., а остальная часть выгона остается в непосредственном распоряжении помещика.

Пастбища предоставляются крестьянам на отведенных землях; если же они пожелают пасти свой скот в лугах и лесах, это может быть дозволено не иначе как по добровольному их с помещиком договору.

Рыбная ловля, как не составляющая главного средства существования крестьян, и за пользование оной крестьяне не были обложены особой повинностью... таковая ловля принадлежит исключительно владельцу.

Топливо... доставляется крестьянами из владельческих лесных дач, из валежника и сухостойных деревьев или по добровольному крестьян с помещиком договору.

Собирать во владельческих лесах разного рода ягод, грибов, возделывание луба, лучины, дерева на хозяйственные снаряды, а также разведение вредного для лесов пчеловодства не дозволяется крестьянам без особого договора с помещиком. Если же добровольного договора в отношении пчеловодства не состоится, то крестьяне до 19 февраля 1864 г. обязаны вынести свои пчелы из помещичьих лесов.

Производить охоту в лесах помещика не дозволяется крестьянам.

...На основании 157 ст. Мест. Полож., разделяя рабочие дни на летние и зимние, назначается на летнее полугодие мужских упряжных 84, пеших 9 и женских 93 дня, а на зимнее мужских упряжных 56, пеших 4 и женских 62 дня. При переходе крестьян на оброк принимается общая ценность повинностей с того участка, полагая оценку упряжного 12 и женского или пешего 8 коп.; причитается всего за 156 дней упряжных и 204 пеших 35 руб. 4 коп., и за причислением к тому дани курицами и яйцами, а также веревками по оценке в 26 коп., причитается всего 35 руб. 20 коп., и на одну десятину падает по 89 с дробью копеек.

Сроки для перехода крестьян из барщины к оброку назначаются такие же, что и для платежа оброка и согласно 196, 199 ст. Местного Положения.

Из числа земельного оброка относится на десятину усадебной земли 7 р. 20 к., так как она на основании 112 и 113 ст. Местного Положения причислена к 1-му разряду. Вследствие сего повинность за пользование всею усадебной оседлостью крестьян составляет в год:

в деревне Забродочье	211 р. 20 к.
в деревне Загорбашье	120 р.
в деревне Дедовке	48 р.
Итого	379 р. 20 к.

и выкупная сумма всю усадебную оседлость кроме выгона:

в деревне Забродочье	3520 р. 70 к.
в деревне Загорбашье	2000 р. 40 к.
в деревне Дедовке	600 р. 16 к.
Итого	6121 р. 26 к.

(Копию настоящей Уставной грамоты для сохранения в волостном управлении получил Люденевичский волостной старшина Илья Таненя, а за него неграмотного по его просьбе расписался волостной писарь Иван Рай).

Копию настоящей Уставной грамоты получил 18 февраля 1863 г. поверенный делами помещика Антона Еленского дворянин Федор Кунарицкий.

НАРБ, ф. 1595, оп. 2, д. 1916, лл. 92—107.

* * *

ДЕЛО О ВЫКУПЕ ЗЕМЕЛЬ КРЕСТЬЯНАМИ МОЗЫРСКОГО УЕЗДА, ИМЕНИЯ ЛЯХОВИЧИ, ПОМЕЩИКА ЛЕНКЕВИЧА

В Мозырскую Поверочную Комиссию

От помещика *Владислава Викентьева Ленкевича*

Сведения, требуемые § 25 Высочайше утвержденным 9 апреля 1863 г. и циркуляром... от 13 мая 1864 года № 135.

...Имение Ляховичи досталось отцу моему Викентию Ленкевичу от графа Александра Ходкевича по купчей крепости в Минской Губернской Палате совершенной, а по кончине

его досталась нам, сыновьям, в наследство, а именно мне и братьям моим Грациану и Собеславу Викентьевым Ленкевичам...

Почва земли крестьянской песчана и супесчана. Высевается озимая рожь, ячмень, овес, горох, гречиха, просо, конопля и картофель. Земля в наем за деньги не отдается, а обыкновенно и ложится хлебом, отдавая половинную оного с погноя, а одну третью с простополя.

Крестьяне имеют средства зарабатывать по найму на рыбной ловле и при выделке смолы и других лесных изделий...

НАРБ, ф.1595, оп.2, д.1917, л.47

ИМЕННОЙ СПИСОК КРЕСТЬЯН ИМЕНИЯ ЛЮДЕНЕВИЧИ

Название селений и хозяйств Люденевичской волости

Забродочского сельского хозяйства

Деревня Забродочье

1. Иван Ханеня (умер в 1864 г.)
2. Сидор Щур
3. Иван Цишков
4. Филип Щур
5. Павел Баран (умер в 1862 г., его сыновья Григорий и Николай)
6. Никифор Костюк
7. Арон Костюк
8. Артем Костюк
9. Яков Знайден
10. Мина Костюк
11. Семен Гарбуза
12. Павел Ширай
13. Григор Ширай
14. Семен Леонов Гарбуза
15. Василь Гарбуза
16. Степан Ханеня
17. Семен Якимов Гарбуза
18. Есип Гарбуза
19. Матвей Пупенко
20. Иван Пупенко
21. Дмитрий Пупенко
22. Иван Якимцов
23. Прокоп Щур
24. Тимох Савич
25. Аникей Лагун
26. Алексей Лагун
27. Яков Костюк
28. Антон Костюк
29. Григорий Миснич
30. Тимох Быстренко
31. Григорий Гарбуза
32. Григорий Костюк
33. Иван Костюк
34. Федор Друк
35. Яков Быстренко
36. Евсей Гарбуза
37. Яков Гарбуза
38. Окула Савич
39. Моисей Савич
40. Григор Савич
41. Василь Гулюта
42. Максим Гарбуза
43. Мартин Балич
44. Федор Балич

Загорбашского сельского общества

Деревня Загорбашье

1. Федор Друк
2. Степан Цирипка
3. Иван Цирипка
4. Стефан Цирипка
5. Яков Друк
6. Андрей Зынович
7. Мартин Друк
8. Алексей Пинчук
9. Тимох Алексиевич
10. Борис Щур
11. Иван Алексиевич
12. Роман Друк
13. Улас Щур
14. Василь Цирипка
15. Потап Щур
16. Данило Щур
17. Данило Байковский
18. Михаил Щур
19. Филип Щур
20. Кирило Цирипка
21. Илья Ханеня
22. Григор Кот
23. Семен Кот
24. Иван Попаревич
25. Леонтий Друк

Деревня Дедовка

1. Иосиф Щур
2. Антон Попаревич
3. Моисей Цирипка
4. Филип Швец
5. Иван Редченя
6. Сидор Попаревич
7. Лелья Таненя
8. Григор Кудич
9. Григор Баран
10. Филип Баран

Повинности. Летних (мужских) упряжных — 47, пеших — 3, женских — 60; зимних (мужских) упряжных — 36, пеших — 2, женских — 38; постоянный оброк — 22 р. 2 к.* А всего — упряжных дней (летних) 4196, пеших — 315, женских — 5142; упряжных (зимних) — 3068, пеших — 184, женских — 3278 дней. Постоянного оброка — 1892 р. 60 к.

...По разбору Комиссией заявления крестьян, что назад тому 9 или 10 лет снесена деревня Простодворцы и построен фольварок Селко... оказалось, что деревня эта снесена окончательно в 1855 г., в чем удостоверили Комитет метрическая выписка, вследствие чего Комиссия постановила отказать крестьянам в возврате земель бывшей деревни Простодворцы, так как таковые были в распоряжении помещика ранее 1857 г.

По заявлению крестьян деревни Забродочье, что у них отобраны 6 лет тому назад и присоединены к фольварку Селко сенокосы урочища Гумнище и Боличье... и около 4 лет назад отобраны также сенокосы в урочище Высокий остров, Грабовское и около Горок, и равно, что от крестьян деревни Загробашье отобраны сенокосы тоже года 4 назад в урочище Мостище. Комиссия в присутствии Чиновника Палаты Ревякина делала дознание и оказалось, что действительно все вышеименованные урочища, пахотные и сенокосные, отобраны у крестьян от 1858 г. по 1860 г., причем оказалось, что часть сенокосов в урочище Мостище отобрано около 1855 г., а потому Комитет на основании Циркулярного распоряжения Главного начальника края от 18 октября 1863 г. постановил: возвратить крестьянам деревни Забродочье урочища Гумнище и Боличье с сенокосами, а равно сенокосы Высокий остров, Грабовское и около Горок, болотное урочище Мостище в том размере, каком существовали у крестьян до отбора помещиком в 1855 г.

Из Протокола Поверочной комиссии Мозырского уезда Минской губернии 1865 г. сентября месяца 20 дня

НАРБ, ф.142, оп.1, д. 874, лл. 1—8.

Декабря 30 дня 1869 г.

ВЫКУПНОЕ ПРОИЗВОДСТВО МОЗЫРСКОЙ ПОВЕРОЧНОЙ КОМИССИИ ПО ИМЕНИЮ ЛЕНИН ПОМЕЩИКА КНЯЗЯ ПЕТРА ЛЬВОВИЧА ВИТГЕНШТЕЙНА... ЛЕНИНСКОЙ ВОЛОСТИ, ПОЛУСТЕВИЧСКОГО СЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА, СЕЛЕНИЙ ПОЛУСТЕВИЧИ И ТИМОШЕВИЧИ

Из выкупного дела видно: выкупной акт составлен 5 мая 1869 г. и тогда же объявлен крестьянам и поверенному помещика.

В имении по выкупному акту приобретают землю в собственность 83 ревизские души мужского пола, в том числе записанных по ревизии в крестьянах 83. Выкупается крестьянами, согласно их желанию, полный надел, а именно 425 дес. 1462 саж. обложенной платежом земли. Необложенной платежом 410 дес. 152 саж., в том числе в общем пользовании 52 дес. 1762 саж.

...Поверочной комиссией установлены основные разряды крестьянских участков и по соображении с особыми местными выгодами и невыгодами участки эти окончательно отнесены к 10 основному разряду с понижением на 10%, по которому выходит ежегодного выкупного платежа на каждую десятину 54 коп., а за все 425 дес. 1762 саж. обложенной повинностью земли 224 руб. 89 3/4 коп., что по капитализации из 6% составит выкупной ссуды 3831 руб. 29 коп.

Главное выкупное учреждение. Отделение V. С.-Петербург

Главное выкупное учреждение от 6 июня 1873 г. за № 16208 сообщило Государственному банку разрешение по имению Ленин Мозырского уезда Минской губернии, помещика свиты его императорского величества генерал-майора князя Петра Львовича Витгенштейна, состоящему из местечка Ленин и с.с. Ельно и Сукачева, выкупной ссуды 2726 р. 62 к. сроком с 1 февраля 1870 г., и о том, что на погашение этой ссуды причитается крестьянам вносить в казну ежегодно в течение 49 лет со срока разрешения ссуды выкупной платеж по 163 р. 60 к. Что касается помещика, то ему, на основании Высочайшего повеления от 26 мая 1871 г. Главным выкупным учреждением назначено было за земли, отошедшие крестьянам м. Ленин и сел. Ельно, заложенных в С.-Петербургской сохранной казне, взамен выкупной ссуды,

* С каждого хозяина.

особое вознаграждение в размере 7323 р. 43 к. для зачета оных в оплату долга по займам из С.-Петербургской сохранной казны; по с. Сукачеву расчет с помещиком был приостановлен до разрешения вопроса о том, какой расчет следует производить с князем Витгенштейном по имениям, которые по ведомостям С.-Петербургской сохранной казны не значатся заложенными в оной...

НАРБ, ф. 242, оп. 2, д. 63, л. 19.

ДЕЛО
канцелярии Минского губернатора по предложению Министра Внутренних Дел о разрешении Генерал-майору Готовскому купить имение Еленского и дом в гор. Вильно

Началось 30 января 1876 г.
Кончено 31 января 1876 г.

Министерство
Внутренних Дел Господину Начальнику Минской губернии

Канцелярия
Министра
28 января 1876 г.

При Люденевичском 2-х классном народном училище:

а) устроить образцовый практический сад и огород, для которого училищу отведена 1 десятина вполне удобной земли; на первое время потребуется лишь дать удобрение и обзавестись необходимым набором инструментов, все это обойдется около 70 руб.

б) организовать столярное и корзиночное ремесла, для занятия коими в училище имеется отдельная комната; остается только приобрести необходимые инструменты, нанять поурочно мастера-столяра и командировать одного из учителей корзиночного ремесла. На все это необходимо приблизительно 200 руб.

НАРБ, ф. 324, оп. 1, д. 248, лл. 7—7 об.

Школьная сеть Житковичской вол., Мозырского уезда, Минской губ. (1908 г.)

Наименование селений	Число всех жителей обоего пола	Число детей 8, 9, 10 и 11 лет обоего пола	Наименование школы	Число учащихся обоего пола	При введении всеобщего обучения	Число учителей
1. с. Житковичи	2084	190	Житковичское народное	160	190	2
2. д. Пуховичи	1408	128	Пуховичское земское	44	128	1
3. д. Белев	995	90	Белевское земское	57	91	1
4. уроч. Ямица	16	1				
5. с. Люденевичи	1427	130	Люденевичское 2-х классное мужское	102	109	2
			Люденевичское женское	42	78	1
6. д. Загорбатье	614	48				
7. х. Селко	97	9				
8. д. Дедовка	312	29				
9. х. Боровая	94	9				
10. х. Коромка	20	2				
11. х. Белое	94	9				
12. х. Лагвощи	42	4				
13. х. Бронислав	140	13				
14. х. Кольно	760	76				
15. х. Млынок	220	20				
16. д. Ляховичи	654	60				
17. д. Гребень	265	26				
18. д. Рудня	279	26				

Сведения о проектируемых новых школах	Предварительное число учащихся	Предварительное число учителей
Дедовецкая	40	1
Кольновская	96	2
Ляховичская	60	1
Гребенская	66	1

Сведения о селениях, остающихся вне школьных районов	Число детей 8, 9, 10 и 11 лет обоего пола
х. Бронислав	13
х. Лагвощи	4
х. Белое	9

Школьная сеть Ленинской вол., Мозырского уезда, Минской губ.

Наименование селений	Число всех жителей обоего пола	Число детей 8, 9, 10 и 11 лет обоего пола	Наименование школ	Число учащихся обоего пола	При введении всеобщего образования	Число учителей	Селения, обслуживаемые этими школами	При введении всеобщего обучения	Число учителей
1. м. Ленин	980	90	Ленинское 2-х классное мужское	85	96	2	м. Ленин им. Ленин	190	2
2. им. Ленин	68	6							
3. с. Милевичи	702	64	Милевичское земское	43	64	1	с. Милевичи	128	1
...10. д. Грабов	263	24							
11. д. Березняки	370	34						91	1
12. д. Большие Стеблевичи	126	11							
13. д. Малые Стеблевичи	194	18						109	2
14. д. Полустевичи	243	22							
15. д. Залютичи	414	37							
16. д. Иовичи	137	12							
17. д. Гричиновичи	611	56							
...21. д. Юркевичи	345	31							
22. д. Гулевичи	287	26							
23. д. Сукачевичи	163	15							
25. д. Тимошевичи	214	19							
26. д. Ельно	90	8							
...29. д. Вильча	250	23							
30. х. Хорлин	44	4							

Сведения о проектируемых новых школах	Предварительное число учащихся	Предварительное число учителей
Стеблевичская	51	1
Березняковская	31	1
Залютинская	49	1
Гричиновичская	56	1
Юркевичская	57	1

Сведения о селениях, остающихся вне школьных районов	Число детей 8, 9, 10 и 11 лет обоего пола
д. Ельно	8
д. Сукачевичи	15
д. Вильча	23
х. Хорлин	4
д. Тимошевичи	19

БГА, ф. 324, оп. 1, д. 575, л. 13 об.

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМСКИХ УЧИЛИЩАХ... *ЗА 1910* г.

Название земского или субсидируемого земством училища: Житковичская волость — Пуховичское (открыто 1 октября 1905 г., число учащихся — мальчиков 47, девочек 4, помещение наемное); Белевское (открыто 1 октября 1907 г., число учащихся — мальчиков 58, девочек 7, помещение наемное); Житковичское (открыто в 1872 г., число учащихся — мальчиков 117, девочек 23, помещение собственное); Дяковичская волость — Ветчинское (открыто 1 октября 1905 г., число учащихся — мальчиков 38, девочек 2, помещение наемное).

Рэйкі пралеглі праз Жыткавічы

ГОСПОДИНУ МИНСКОМУ ГУБЕРНАТОРУ

16 июня 1884 г.

Распоряжением г. Министра путей сообщения от 13 сего июня я назначен начальником работ по постройке Лунинец-Гомельской дороги.

Вступив ныне в отправление соединенных с этим назначением обязанностей, я имею честь донести о сем до сведения Вашего превосходительства и вместе с тем прошу не отказать в благосклонном содействии Вашем при исполнении возложенного на меня поручения, а также сделать распоряжение, дабы местные власти вверенной Вам губернии оказывали всякое законное содействие как мне, так и лицам, кои будут командированы мною к производству работ...

Начальник работ инженер *Серебряков*

НАРБ, ф. 1477, оп. 1, д. 1684, л. 155.

РАСКЛАД О ФАБРИЧНО-ЗАВОДСКИХ ПОМЕЩЕНИЯХ (1896 г.)

Какие фабрики и заводы и кому принадлежат (ценность помещений)

Винокуренный завод:
Левандовской, им. Чистая Лужа (7000 р.)
Мельницы водяные:
Священника Беляковского, д. Млынок (500 р.)
Пом. Семенова, с сукновальней, д. Сторожовцы (2200 р.)
Его же, д. Семурадцы (2000 р.)
Лейбы Райхмана и Ошера Гобермана, д. Хочень (1000 р.)
Камилии Ковалевской, с. Рычев (600 р.)
Кн. Радзивилла, д. Бережцы (500 р.)
1-го Мозырского лесничества, д. Хлупин (450 р.)
Левандовской, с. Житковичи (400 р.)
Ее же, д. Рудня (400 р.)
Ее же, д. Млынок (400 р.)
Причта Погостской церкви, с. Погост (1000 р.)
Пом. Агаркова, д. Ветчин (400 р.)
Пом. Богуша, х. Млынок (300 р.)
Его же, д. Слепцы (500 р.)
Причта Озеранской церкви, с. Озераны (500 р.)
Мельницы ветряные:
Григория Комара, д. Малый Малешев (500 р.)
Ивана Дедовца, д. Запесочье (500 р.)
Шендера Мельчука, с. Озераны (750 р.)
Леонтия Ридецкого, с. Рычев (600 р.)
Дв. Антона Ярмолинского, им. Дяковичи (500 р.)
Самойла Ляховца, д. Дуброва
Ицки Энштейна, д. Дяковичи

НАРБ, ф. 353, оп. 1, д. 3801, лл. 35, 39

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМСКИХ УЧИЛИЩАХ... *ЗА 1910* г.

Название земского или субсидируемого земством училища: Житковичская волость — Пуховичское (открыто 1 октября 1905 г., число учащихся — мальчиков 47, девочек 4, помещение наемное); Белевское (открыто 1 октября 1907 г., число учащихся — мальчиков 58, девочек 7, помещение наемное); Житковичское (открыто в 1872 г., число учащихся — мальчиков 117, девочек 23, помещение собственное); Дяковичская волость — Ветчинское (открыто 1 октября 1905 г., число учащихся — мальчиков 38, девочек 2, помещение наемное).

Рэйкі пралеглі праз Жыткавічы

ГОСПОДИНУ МИНСКОМУ ГУБЕРНАТОРУ

16 июня 1884 г.

Распоряжением г. Министра путей сообщения от 13 сего июня я назначен начальником работ по постройке Лунинец-Гомельской дороги.

Вступив ныне в отправление соединенных с этим назначением обязанностей, я имею честь донести о сем до сведения Вашего превосходительства и вместе с тем прошу не отказать в благосклонном содействии Вашем при исполнении возложенного на меня поручения, а также сделать распоряжение, дабы местные власти вверенной Вам губернии оказывали всякое законное содействие как мне, так и лицам, кои будут командированы мною к производству работ...

Начальник работ инженер *Серебряков*

НАРБ, ф. 1477, оп. 1, д. 1684, л. 155.

РАСКЛАД О ФАБРИЧНО-ЗАВОДСКИХ ПОМЕЩЕНИЯХ (1896 г.)

Какие фабрики и заводы и кому принадлежат (ценность помещений)

Винокуренный завод:
Левандовской, им. Чистая Лужа (7000 р.)
Мельницы водяные:
Священника Беляковского, д. Млынок (500 р.)
Пом. Семенова, с сукновальней, д. Сторожовцы (2200 р.)
Его же, д. Семурадцы (2000 р.)
Лейбы Райхмана и Ошера Гобермана, д. Хочень (1000 р.)
Камилии Ковалевской, с. Рычев (600 р.)
Кн. Радзивилла, д. Бережцы (500 р.)
1-го Мозырского лесничества, д. Хлупин (450 р.)
Левандовской, с. Житковичи (400 р.)
Ее же, д. Рудня (400 р.)
Ее же, д. Млынок (400 р.)
Причта Погостской церкви, с. Погост (1000 р.)
Пом. Агаркова, д. Ветчин (400 р.)
Пом. Богуша, х. Млынок (300 р.)
Его же, д. Слепцы (500 р.)
Причта Озеранской церкви, с. Озераны (500 р.)
Мельницы ветряные:
Григория Комара, д. Малый Малешев (500 р.)
Ивана Дедовца, д. Запесочье (500 р.)
Шендера Мельчука, с. Озераны (750 р.)
Леонтия Ридецкого, с. Рычев (600 р.)
Дв. Антона Ярмолинского, им. Дяковичи (500 р.)
Самойла Ляховца, д. Дуброва
Ицки Энштейна, д. Дяковичи

НАРБ, ф. 353, оп. 1, д. 3801, лл. 35, 39

Ст. Житковичи, 21 октября 1895 г.

ЕГО ПРЕВОСХОДИТЕЛЬСТВУ ГОСПОДИНУ ГУБЕРНСКОМУ ФАБРИЧНОМУ ИНСПЕКТОРУ ФИЛЬГАБЕРУ

И. А. Гольперин, ... ввиду того, что он не состоит владельцем сего завода, а является лишь временным арендатором завода для распиловки на нем закупленного в Житковичских лесных дачах леса и по договору своему с владельцем, засвидетельствованному у Гомельского нотариуса г. Лукина 4 ноября 1872 г., он не принял на себя обязанностей уплаты каких бы то ни было повинностей...

При этом считаю нужным довести до вашего сведения, что бывший владелец сего завода гомельский помещик Александр Оскарович Патон и что последний в прошлом году продал сей завод купцам Вильнеру, Бергеру и Фельдману, которые в настоящее время владеют заводом и доверенное лицо которых проживает в Житковичах.

Адрес поверенного Вильнера и К°: Ст. Житковичи. Пол. ж. д., Ицк Брегман.

По доверенности И. А. Гольперина, арендующего Житковичский лесопильный завод,— Давид Берман.

ГОСПОДИНУ СТАРШЕМУ ФАБРИЧНОМУ ИНСПЕКТОРУ МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ

12 мая 1898 г.

... Рабочие у меня работают поденно и при каждом востребовании рабочего получают свою заработанную сумму, причем каждодневно вписывается в табельную ведомость... Работа производится у меня в следующем порядке. В одних сутках работают две смены: первая смена начинается с 12 час. ночи до другого дня 12 час, в течение которой рабочие имеют отдых для завтрака 3/4 часа от 7 ч. до 7 ч. 45 мин. утра. После окончания работы они освобождаются на отдых на 12 час. Другая смена работает от 12 час. утра до 12 час. ночи, рабочие тоже имеют отдых 3/4 часа для ужина с 7 ч. до 7 ч. 45 мин. вечера. Плату получают в летнее время по 60 коп. за одну смену, за исключением смазчиков машин, которые получают по 80 коп. за смену. Всего работает на каждой смене 25 человек. Сверх урочных часов у меня не работают и не требуется оной... Заведующий находится всегда на заводе, он именуется Иван Васильевич Лошкарев...

Заведующий заводом *Арон Берман*

АДМИНИСТРАЦИЯ ИМ. ЧИСТАЯ ЛУЖА Р. И. ЛЕВАНДОВСКОЙ

25 мая 1899 г.

Настоящим честь имею сообщить, что Чистолужский № 160 винокуренный завод, отстоящий от ст. Житковичи Полесской ж. д. в 5 верстах, принадлежавший Р. И. Левандовской, действие свое в 1898 г. прекратил.

Поверенный

ГОСПОДИНУ СТАРШЕМУ ГУБЕРНСКОМУ ИНСПЕКТОРУ МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ

12 апреля 1900 г.

На отношение № 1549 от 7 апреля честь имеют сообщить, что Житковичский лесопильный завод перешел во владение помещицы Р. И. Левандовской, собственницы лесов, в коих находится завод. Ввиду того, что упомянутый завод еще не действует и отстраивается после пожара и не действовал полностью до пожара, правила внутреннего порядка не введены...

С совершенным почтением *И. Барановский*

Сентября 20 дня 1900 г.

Владелец фабрики или завода	Число рабочих мужчин	Уплачено рабочим за 1899 г.	Выработано товара на сумму
Романия Ивановна Левандовская	15	2893 руб. 11 коп.	16 122 руб. 65 коп.

Заведующий заводом *Арон Берман*

НАРБ, ф. 311, оп. 1, дд. 39, 231.

ЗАБАСТОВКА РАБОЧИХ ЛЕСОПИЛЬНОГО ЗАВОДА В ИМ. ДЯКОВИЧИ МОЗЫРСКОГО УЕЗДА

Из рапорта Мозырского уездного исправника Минскому губернатору

1913 г. марта 14

Секретно

8-го сего марта пристав 3 стана вверенному моему надзору уезда частным путем получил сведения, что рабочие лесопильного завода, расположенного в им. Дяковичи, Генриха и Рихарда Лаутербахов, требуя увеличения платы, прекратили работу на полсутки, почему пристав отправился на место. 9 марта управляющий заводом Герман Августович Блейль показал, что 4 марта холостые рабочие, работающие поденно не в самом здании завода, а на плацу его по уборке лесного материала (прекратили работы), в числе 27 чел., требуя добавки заработной платы.

Всех рабочих на заводе бывает ежедневно от 150 до 200 чел. О происшествии этом администрация завода никому не заявляла и сведения получены частным путем. Дознание по сему предмету мною возвращено для дополнения опросом рабочих, бастовавших и не бастовавших, на предмет установления вины главных зачинщиков. О чем в. п. имею честь донести.

Исправник *Хотянович*

НАРБ, ф. 91, оп. 40, д. 2, л. 22

ПАНЩИНА В XX ВЕКЕ

...Рабочий с лошадью или парою волов в летнюю пору получает в зачет карточку на 60 коп., пеший мужчина — на 20—25 коп., а в страдную пору — 30 коп, женщины и подростки от 15 до 20, а зимой и осенью все рабочие не получают свыше 15 коп. Так как земля крестьянская очень плохая, а сенокосных пространств сравнительно много, в имениях Огарково и Ленино крестьяне только и живут скотоводством и держат сравнительно много скота, а потому и отбывают повинности за право прогона и пастьбы по непролазным болотам.

Северо-Западный край, № 107, 1 июня 1913 г.

СПИСОК ФАБРИК, ЗАВОДОВ И ИНЫХ ПРОМЫШЛЕННЫХ ЗАВЕДЕНИЙ, РАСПОЛОЖЕННЫХ В МОЗЫРСКОМ УЕЗДЕ [1914 г.]

Наименование фабрики, завода...	Где расположена фабрика, завод... (наименование местности)	Имя, отчество и фамилия владельца	Кем, кому и когда выдано распоряжение на постройку
Мукомольная мельница	им. Ленин Ленинской волости	Федор Степанович Огарков	Стройотдел Минского губернского правления, 16 декабря 1903 г., № 133 г., Огаркову
Винокуренный завод	ст. Житковичи	Романия Ивановна Левандовская	Не имеет

Винокуренный завод	им. Чистая Лужа Житковичской волости	Станислав Иосифович Левандовский	Минского губернского правления, 7 января, 1895 г., № 33
Паровая мельница	с. Люденевичи Житковичской волости	Каролина Казимировна Добасевич	То же от 4 мая 1907 г., №№ 136 и 490
Лесопильный завод с мельницей и сукновальней	им. Турово	Даниил Людвигович Норейко	Не имеет
Паровая мельница	с. Переров	Иван Казимирович Масло	Не имеет
Паровая мельница	д. Хвоенск	Адам Данилович Якубовский	Минского губернского правления от 8 февраля 1911 г.
Лесопильно-бочарный завод	ур. Постолы	Генрих и Рихард Лаутербахи	Не предъявлено (разрешение от 30 сентября 1914 г.)

НАРБ, ф. 299, оп. 5, ф. 2260

Палеская быль

...Далёка ад гэтых мясцін, у горадзе Шклове Магілёўскай губерні, пражывала ў раскошы багатая памешчыца Крывашэіна. Балі, падарожжы, паляванні... Усё гэта патрабавала шмат грошай. Ручаёк іх цурчаў адсюль, з глыбіні Палесся, дзе былі ўладанні Крывашэінай. Пад кіраўніцтвам і наглядам управаўляючых нанятыя рабочыя валілі лес, вывозілі і прадавалі яго за мяжу, тым больш што чыгунка ў 1886 г. прайшла праз Жыткавічы. Лесу было столькі многа, быў ён такі густы і бязмежны, што здавалася, канца яму не будзе.

Прыйшоў час выдаваць замуж дачку. Тэрмінова спатрэбіліся грошы. Дзе іх узяць? Пакуль нарыхтуюць лесу, вывязуць, прададуць... Справа не церпіць. Між тым ціснулі даўгі, якіх Крывашэіна паспела набыць вельмі многа — жыць хацелася шыкоўна...

У дакладной запісцы старшага натарыуса Мінскага акружнога суда ад 31 ліпеня 1910 г. у Мінскае губернскае праўленне пералік даўгоў займае восем старонак — амаль 30 заемадаўцаў. Найбольш буйны — у забеспячэнне пазычаных грошай у сталічнага купца Уладзіміра Арсеньевіча Пятрова, 112 000 рублёў, у тым ліку 45 875 руб. з разліку 12 працэнтаў гадавых тэрмінам на адзін год, выплата якіх павінна быць закончана 15 сакавіка 1907 г., 66 125 руб.— папярэдняга доўгу з ростам таксама 12 працэнтаў, тэрмін выплаты заканчваўся тады ж... Ёсць даўгі 500—1000 рублёў, а большасць — дзесяткі тысяч. Між тым толькі адзін доўг выклікаў ужо па закону канфіскацыю маёнтка, як тое было ў суседняй вёсцы Людзяневічы.

На руках у Пятрова даўгавая распіска: не выплаціць Крывашэіна праз два гады доўг — землі яе, што на Палессі, пераходзяць ва ўласнасць пецярбургскага купца. Грошай у Крывашэінай, каб аддаць доўг, няма. Давялося тэрмінова прадаваць свае ўгоддзі, каб разлічыцца з Пятровым. Ва ўсіх газетах былі змешчаны аб'явы аб распродажы зямель: «урадлівыя, багатыя, з лясамі і лугамі»...

Першымі кінуліся сюды ў 1908 г. людзі з Паўночнай Украіны, з Валынскай, Жытомірскай губерняў, дзе нястача і галеча вылівалася праз

Винокуренный завод	им. Чистая Лужа Житковичской волости	Станислав Иосифович Левандовский	Минского губернского правления, 7 января, 1895 г., № 33
Паровая мельница	с. Люденевичи Житковичской волости	Каролина Казимировна Добасевич	То же от 4 мая 1907 г., №№ 136 и 490
Лесопильный завод с мельницей и сукновальней	им. Турово	Даниил Людвигович Норейко	Не имеет
Паровая мельница	с. Переров	Иван Казимирович Масло	Не имеет
Паровая мельница	д. Хвоенск	Адам Данилович Якубовский	Минского губернского правления от 8 февраля 1911 г.
Лесопильно-бочарный завод	ур. Постолы	Генрих и Рихард Лаутербахи	Не предъявлено (разрешение от 30 сентября 1914 г.)

НАРБ, ф. 299, оп. 5, ф. 2260

Палеская быль

...Далёка ад гэтых мясцін, у горадзе Шклове Магілёўскай губерні, пражывала ў раскошы багатая памешчыца Крывашэіна. Балі, падарожжы, паляванні... Усё гэта патрабавала шмат грошай. Ручаёк іх цурчаў адсюль, з глыбіні Палесся, дзе былі ўладанні Крывашэінай. Пад кіраўніцтвам і наглядам управаўляючых нанятыя рабочыя валілі лес, вывозілі і прадавалі яго за мяжу, тым больш што чыгунка ў 1886 г. прайшла праз Жыткавічы. Лесу было столькі многа, быў ён такі густы і бязмежны, што здавалася, канца яму не будзе.

Прыйшоў час выдаваць замуж дачку. Тэрмінова спатрэбіліся грошы. Дзе іх узяць? Пакуль нарыхтуюць лесу, вывязуць, прададуць... Справа не церпіць. Між тым ціснулі даўгі, якіх Крывашэіна паспела набыць вельмі многа — жыць хацелася шыкоўна...

У дакладной запісцы старшага натарыуса Мінскага акружнога суда ад 31 ліпеня 1910 г. у Мінскае губернскае праўленне пералік даўгоў займае восем старонак — амаль 30 заемадаўцаў. Найбольш буйны — у забеспячэнне пазычаных грошай у сталічнага купца Уладзіміра Арсеньевіча Пятрова, 112 000 рублёў, у тым ліку 45 875 руб. з разліку 12 працэнтаў гадавых тэрмінам на адзін год, выплата якіх павінна быць закончана 15 сакавіка 1907 г., 66 125 руб.— папярэдняга доўгу з ростам таксама 12 працэнтаў, тэрмін выплаты заканчваўся тады ж... Ёсць даўгі 500—1000 рублёў, а большасць — дзесяткі тысяч. Між тым толькі адзін доўг выклікаў ужо па закону канфіскацыю маёнтка, як тое было ў суседняй вёсцы Людзяневічы.

На руках у Пятрова даўгавая распіска: не выплаціць Крывашэіна праз два гады доўг — землі яе, што на Палессі, пераходзяць ва ўласнасць пецярбургскага купца. Грошай у Крывашэінай, каб аддаць доўг, няма. Давялося тэрмінова прадаваць свае ўгоддзі, каб разлічыцца з Пятровым. Ва ўсіх газетах былі змешчаны аб'явы аб распродажы зямель: «урадлівыя, багатыя, з лясамі і лугамі»...

Першымі кінуліся сюды ў 1908 г. людзі з Паўночнай Украіны, з Валынскай, Жытомірскай губерняў, дзе нястача і галеча вылівалася праз

край. Там і прозвішчы сяляне амаль цэлымі вёскамі мелі — Галячанка, што ад слова галота, голь... Густыя, амаль непраходныя лясы, поўныя дзічыны, вялікая колькасць балот і азёр здзівілі, уразілі бязлесных украінцаў. Таннасць зямлі — мужыкі па 20 капеек з сям'і — 8 рублёў назбіралі, грошы па тых часах немалыя, і паехаў дзед Сцяпан у сталіцу губерні.

У прыёмнай акруговага суда сядзеў судовы віслявусы адстаўны генерал, відаць, сакратар суда. Па-

ВЕДАМАСЦЬ

маёнткаў Мінскай губерні, Мазырскага ўезда, якія належаць прадажы з публічнага торгу за нядоімкі пазямельных аброкаў (служаць для паступлення ў Мазырскае казначэйства)

Землеўладальнік	Маёнтак, які належыць продажу	Колькасць нядоімак, за якія маёнтак павінен быць прададзены (руб.)
Крывашэіна Марыя Пятроўна, жонка сапраўднага стацкага саветніка	м. Людзяневічы	Па дзяржаўнаму Па земскіх пазямельнаму зборах 363 р. 31 к. 2058 р. 59½ к.

НАРБ ф. 299, оп. 2, д. 145, л. 79

20 руб. дзесяціна — задавальняла іх. Там, на Украіне, свае вузкія палоскі яны прадалі па 200 руб. за дзесяціну.

Ледзь паспелі разлічыцца сяляне за зямлю, як у Крывашэінай выйшаў тэрмін выплаты доўгу Пятрову. І купец, усведамляючы сваю правату, падаў скаргу на яе ў акруговы суд у Мінск, адмаўляючыся ўжо ад грошай Крывашэінай.

Устрывожыліся, задумаліся перасяленцы. Адсудзіць Пятроў зямлю — і вольны будзе выгнаць іх адсюль, з крыху ўжо абжытых мясцін. Куды дзенешся? На Украіне, на радзіме, свой кавалачак страцілі, прадалі, каб разлічыцца за гэтую няўтульную зямлю, і тут такая навала.

— Трэба пісаць прашэнне ў акруговы суд, у Мінск,— вырашылі сяляне. Каго паслаць з лістом ад народу? Доўга не спрачаліся: найбольш адукаваны, самы дасціпны сярод іх, вядома, Сцяпан Феранц. Ён ужо аднойчы — усе ведаюць — судзіўся з панам, праўда, прайграў, але законы яму знаёмыя. Яму і ехаць па справе абшчыны. Сабралі чаў расказваць дзед Сцяпан яму сваю крыўду.

— Ваша справа — нуль! — перабіў яго генерал.— Можаш ісці...

Выйшаў дзед Сцяпан на вуліцу, збіты з панталыку. «Як гэта — нуль? Чаму ён выгнаў мяне? Можа, хабару чакае — то скулу яму ў бок!»

Дзед Сцяпан рашуча вярнуўся назад.

— Я вымушаны буду скардзіцца на высачайшае імя.

— На каго ж?

— На вас, ваша сіяцельства. Чаму вы не выслухалі мяне, не разабраліся ў сутнасці справы? Мы купілі зямлю, апрацавалі яе, жывём там з сем'ямі — наша праўда! А адсудзіць Пятроў яе, выганіць нас — куды дзецца?

Спадабалася чыноўніку рашучасць і смеласць дзеда Сцяпана.

— Ах, трын-трава, пірагі з макам! Салдат?.. Ну дык слухай. Справы вашы сапраўды кепскія. Заўтра пачнецца суд. У вас ёсць купчыя на гэту зямлю? А калі, як ты гаворыш, ёсць, то трэба заўтра абавязкова прадставіць іх суду. Але ці паспееш ты вярнуцца?..

На цягніку — каля 300 вёрст да Жыткавіч — дзед Сцяпан у тую ж ноч прыехаў дамоў. На дарогу мужыкі яму сабралі яшчэ па 10 капеек з двара. Забраў у сялян купчыя паперы і да раніцы выехаў назад у Мінск.

Паспеў. Суд толькі пачаўся. Доўга разглядалі судовыя кручкатворцы купчыя. Ці правільна аформлены, ці сапраўдныя? На шчасце, усё аказалася ў парадку. Крывашэіна, да таго ж, гатова заплаціць доўг, праўда, са спазненнем у некалькі месяцаў — за гэта можна спагнаць з яе працэнты, а зямлю, здаецца, трэба пакідаць за ёю...

— Вы пакінеце сялян на месцы, калі зямлю прысудзім вам? — спытаў у Пятрова суддзя.

— Ніяк не. Я маю намер вырошчваць там лес на прадажу...

Суд прысудзіў зямлю Крывашэінай.

З радаснай весткай вяртаўся дзед Сцяпан дамоў. Зямля — іхняя. Карчуй лес, выпальвай пні, калупай сахой баразну, сей збожжа — цяжкая работа, але ці прывыкаць селяніну? Галоўнае — ёсць свая зямля, будзе і кавалак хлеба...

Прайшлі гады. З Градаўскіх хутароў, раскіданых па лесе, вырасла вёска. У 1938 г. хутары звезлі ў адну вуліцу, спланаваную і добраўпарадкаваную. Дзед Сцяпан быў яшчэ жывы, хата пад старой ліпай аказалася якраз на месцы, амаль у цэнтры новай вёскі.

Града

Неабсяжныя прасторы калгасных палеткаў, на якіх зрэдку захаваліся дубы — не асілкі-волаты, што магутнымі шатамі падпіралі неба, а найбольш слабыя і чэзлыя... На асушаных былых балотах добра родзіць жыта і авёс.

Старажылы яшчэ памятаюць, якія былі непраходныя і густыя лясы. Палеская тайга... Працякала рака — старое русла Скрыпіцы, якую перасяленцы засталі ўжо амаль перасохшай. Берагі яе і былое рэчышча і цяпер прыкметны ў многіх месцах, ёсць урочышчы «Скрыпіца», «За рэчкай». Часта сустракаліся сляды «гаспадарання» мядзведзя, шмат шкоды рабіў ён бортнікам. Што прывяло сюды людзей? Нястача, беднасць...

Жылі не на вельмі вялікай адлегласці адсюль, кажуць, на валах дабіраліся за тры ці чатыры дні — на Украіне, на тэрыторыі сучаснай Жытомірскай вобласці, украінскія пасяляне. Мелі зямлю, але калі кожны раз дзяліць яе на сыноў, а тыя на сваіх сыноў, то ўрэшце рэшт застануцца шматлікія маленькія лапікі, як пісаў Кандрат Крапіва, «не больш квадратнага лапця». Цесна, зямлі мала. Як жыць?..

І тут з'явіліся аб'явы ў газетах: «У Мінскай губерні ... прадаецца зямля, угоддзі — лес і балота». Паслалі украінцы сваіх хадакоў — сапраўды, не дорага, лес — дрэвыволаты. Для бязлесных украінцаў кожнае дрэўца было нібы цудам, а тут — дрымучыя лясы...

Скрыпелі колы, марудна цягнуліся нагружаныя няхітрым скарбам вазы. Дарог ніякіх, лес ды там-сям заросшыя рудой асакой балоты. Сапраўды, зверу тут раздолле.

Прыехалі на месца, якое не мела нават адпаведнай назвы. Землямеры ўжо размецілі надзелы — 30, 40 дзесяцін. Каму трапіла балота, каму больш лесу, а каму азярына. Але ніводнага лапіка прыгоднай пад ворыва зямлі. Каб згрузіць скарб з воза на новым месцы, трэба было спачатку высекчы ў хмызняку прагаліну, зрабіць з галін будан, і ў гэтае часовае жыллё перанесці дзяцей, рэчы. Добра — лета было, пачатак яго, і яшчэ выгада — будаўнічага матэрыялу навокал больш чым трэба.

Паступова наступалі перасяленцы на лес, расшыралі пляцоўкі, карчавалі пні, палілі галіны і сеялі жыта. Будавалі хаціны — кожны на сваім надзеле. У асенняй цемры рэдка праблісне ўдалечыні агеньчык, выюць ваўкі, глуха шуміць лес...

Між тым, відаць было, і тут жылі калісьці людзі. У некаторых месцах прыкметны сляды даўніх барознаў, якія зараслі хмызняком, вуголле. Знаходзілі рэшткі старадаўняй зброі. Не так даўно ў выніку меліярацыі знікла тарфянае, а калісьці лясное, вельмі маляўнічае возера каля вёскі. У даўнія часы яно было значна большым і глыбокім, на старадаўніх картах значылася як Турвозера. Паводле падання, каля яго адбылася бітва паміж тураўцамі і іншаземнымі захопнікамі. Рэшткі разгромленага непрыяцеля перапраўляліся праз возера, і ў час пераправы военачальнік захопнікаў апынуўся ў вадзе і згубіў сваю залатую зброю. Залатая шабля, напэўна, і цяпер недзе ляжыць у торфе. У час рыцця сіласнай ямы на высокім беразе колішняга рэчышча Скрыпіцы адкапалі гліняны кацёл, а ў другім месцы, калі бралі торф у нізіне, знайшлі старадаўні човен, трапляліся таксама гліняныя і каменныя ядры, а ў перадваенны час, капаючы агарод, выграблі каменную сякеру...

Ад таго, што відны былі сляды барознаў, град, і пайшла назва вёскі — Града.

Браніслаў

Прыгожыя, маляўнічыя мясціны захаваліся ў ваколіцах вёскі Браніслаў да гэтага часу. Лес — дык сапраўдны лес, балота — дык балота. Ціхая Случ струменіць свае неглыбокія воды, стогадовыя дубы ахоўваюць спакой лясных палян... У вёсцы і ў яе ваколіцах і сёння можна сустрэць рэшткі земляных насыпаў, ці валаў. Гэта старадаўнія ўмацаванні, гарадзішча: насыпы падыходзілі да самага берага Скрыпіцы, у сярэдзіне — роўны шырокі пляц, дзе размяшчаюцца цяпер грамадскія будынкі. У адным яго баку была круглая падвышаная пляцоўка, дзе відны вуголле, сляды даўніх пабудоў.

Расказваюць, што недзе ў канцы XVIII ці ў пачатку мінулага стагоддзя вясковы пастушок Бронюсь з в. Лагвошчы пагнаў пасвіць статак кароў і заблудзіўся ў лесе. Куды каровы, туды і ён. Раптам лес расступіўся, адкрылася вялікая паляна, якую абкружалі высокія пясчаныя насыпы, а ў сярэдзіне — закінутыя, бязлюдныя пабудовы, вялікі свіран.

Знайшоў Бронюсь дарогу назад, расказаў дарослым аб тым, што бачыў у лесе. Прышлі сюды пасяляне, агледзелі пабудовы — моцныя, складзеныя з тоўстых смалістых бёрнаў. Побач — рэчка, багатыя ўгоддзі. Гэта памешчык з вёскі Белае за 15 кіламетраў адсюль трымаў тут калісьці жывёлу. У памяці старажылаў захаваліся прозвішчы першых пасяленцаў вёскі — Браніслаў Наумовіч, Некрашэвічы.

Ёсць і другая легенда. Расказваюць, што Браніслаў два стагоддзі назад — вёсачка на беразе рэчкі Скрыпіцы з 5—6 хат, прыземістых, з маленькімі вокнамі, крытымі чаротам. У мясцовага памешчыка былі дачка і сын — сына звалі Браніславам, дачку Мар'янай. Калі прыйшоў час дзяліць зямлю паміж дзецьмі, памешчык аддаў угоддзі на беразе Скрыпіцы сыну, а другую частку — дачцэ. Так пайшла назва вёскі Браніслаў і хутара Мар'янаўкі, які існаваў да 1938 г. Сярод лясоў і балот хаваліся таксама хутары Гноішча, Капліца, Свірнішча і іншыя. Браніслаў і Мар'янаўка былі ўпісаны ў прыход Людзяневіцкай царквы ў 1855 г. У «Справаздачы свяшчэн-

нікаў Мазырскага павета Мінскай епархіі» за гэты год адзначана: «Сялянскае саслоўе займаецца хлебаробствам. Рэлігійны духоўны стан можна прызнаць здавальняючым. Школы няма, таму граматнасць не распаўсюджана»... А ў «Справаздачы аб царкоўна-прыходскіх школах Мінскай епархіі за 1890/91 навучальны год» ёсць звестка: «У Людзяневіцкім прыходзе працуе школа пісьменнасці ў хутары Браніслаў, адкрыта ў 1889 г. Навучае мешч. К. Ляшкевіч, з узнагародай 16 руб. за вучэбны час. Навучэнцаў у школе 7 хлапчукоў».

Сяляне Браніслава і навакольных вёсак мелі невялікія надзелы зямлі — 4—5 дзесяцін на сям'ю. Выпасы і сенакосы агульныя, дзяліліся па жэрабю. Знаходзіліся яны далёка ад вёскі — ва ўрочышчы Ліпа, ля возера Белае. Вакол — дрымучыя лясы, непраходныя балоты... На іх месцы ў пачатку XX ст. з'явіліся хутары Гноішча, Свірнішча, Капліца, Рагавік, Рапачоў, Града і іншыя.

Вёска Браніслаў складалася фактычна з трох вёсак, якія з цягам часу зліліся ў адну. Цэнтральная частка яе, уласна Браніслаў, якая нібы атрымала назву ад імя пастушка Бронюся. Другая вёска — Свірнішча, дзе стаялі тыя самыя свіраны. Капліца — там размешчаны вясковыя могілкі з капліцаю...

Князь-Бор

Маляўнічы, светлы дубовы гай падступае да самай вёскі. Магутныя ствалы з шэрай, нібы літой карой падпіраюць, здаецца, само неба. Такое ўражанне, нібы І. Шышкін пісаў у гэтай дуброве сваю вядомую карціну «Дождж у дубовым лесе». За гаем — нізіна, зараснікі лазы — і шырокія прырэчныя лугі з азёрамі і старыцамі, з магутнымі дубамі-асілкамі, не раз адзначанымі маланкамі, напалову сухімі, але надзвычай жывучымі. Сцяжынка выводзіць на бераг ракі. Тут ціхая лясная Случ улiваецца ў паўнаводную Прыпяць...

Ніколі не бачылі ў вочы мясцовыя сяляне ўладальніка дубровы М. Агаркава, і бытавала думка, што такі багаты чалавек, які валодае землямі вялікай часткі Палесся, павінен быць не ніжэй чым княжацкага роду. Дуброву, ці бор, называлі Княжацкім — Князь-Борам.

У 1924 г. у час лесанарыхтовак дуброву часткова высеклі. На чыстых плошчах жыхары суседняй вёскі Вільча мазолістымі рукамі стварылі ворыва. Каб бліжэй быць да зямлі, сяляне адзін за другім перабіраліся жыць на цаліну. Хутар, а затым вёску на яго месцы называлі, як і дуброву, Князь-Борам.

Расказваюць, што яшчэ М. Агаркаў паставіў сцерагчы бор лесніка, якога звалі Вільманам. Ён пасяліўся ў зацішным лясным месцы — урочышча і цяпер завуць Агаркавым — і сумленна вартаваў багацці магната. Аднойчы цёмнай ноччу бандыты ўварваліся ў хату лесніка. Шукалі золата. Нічога не знайшлі, усю сям'ю лесніка забілі...

Пачыналіся трыццатыя гады. У Вільчы і Князь-Боры створаны калгас «Чырвоны памежнік». Арганізатарам яго ў Князь-Боры быў Рыгор Швец. Паступова расла і мацнела гаспадарка. У вёсцы адкрыўся клуб, дзе вечарамі, у святы гаманілі калгаснікі, пабудавана пачатковая школа.

...Вайна ўсё парушыла. З'явіліся немцы і ў гэтым ціхім і далёкім кутку Палесся, дзе на многія кіламетры навокал — лясныя прасторы. Зручна было партызанам, было дзе хавацца і мірным жыхарам ад аблаў карнікаў. Цудам уцалела вёска ў той час, калі суседні Поўчын быў спалены разам з жыхарамі, згарэлі і многія іншыя вёскі.

Аднойчы карнікі сустрэлі непадалёку ад Князь-Бора павозку. Гаўрыла Канапацкі вёз свайго параненага сына Андрэя дамоў з партызанскага атрада, каб вылечыць. З імі была 60-гадовая жонка Гаўрылы Канапацкага Ефрасіння.

Фашысты скінулі Андрэя з воза, на яго вачах білі і калолі штыкамі бацьку, пакуль ён не сканаў, мёртваму загналі ў рот кол. Потым забілі Андрэя. Ефрасінні Канапацкай удалося збегчы, яна і расказала, як загінулі яе муж і сын. Яе расказ знаходзіцца ў жудасным дакументацыі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусі.

А ў пачатку ліпеня 1944 г. князьборцы радасна сустракалі чырвонаармейцаў: на прырэчных прасторах быў выкінуты дэсант. На Балонні каля Прыпяці прызямліліся самалёты. Князь-Бор стаў сапраўдным вайсковым лагерам. Жанчыны варылі салдатам бульбу, пяклі дранікі, яшчэ з вечара рыхтавалі снеданне на многа чалавек. У вяскоўцаў упершыню за некалькі гадоў прасвятлелі твары...

Працалюбівыя, энергічныя людзі жывуць у Князь-Боры — нашчадкі тых, хто ў далёкія гады асвойваў цяжкі куток палескай зямлі, абрабляў зямлю, ствараў калгасы... Маляўнічыя месцы ў міжрэччы Прыпяці і Случы паланілі сэрца беларускага пісьменніка В. Казько, які вырас у Вільчы. Ён і цяпер жыве пераважна тут у вёсцы. У Вільчы напісаў многія свае творы. Месцам дзеяння рамана «Неруш», які перакладзены на многія мовы народаў СССР і за мяжой, В. Казько выбраў менавіта Князь-Бор. Многія героі рамана, дэталі падзей, апісаныя ў кнізе, напамінаюць тыя, што былі калісьці ў сапраўднасці... Пра вёску, быў час, забылі. Але апошнім часам да яе праклалі выдатную дарогу, там знаходзяцца жывёлагадоўчыя памяшканні калгаса «XX партз'езд». Верыцца, што ўздыхне вёска на поўныя грудзі, ажывіцца і будзе існаваць каля старадаўняга бору, непадалёку ад паўнаводнай Прыпяці, яшчэ доўга-доўга...

В. Р. Феранц

Бераг правы, бераг левы...

Вільча — невялікая, надзвычай маляўнічая вёска ў глыбіні Палесся... Размешчаная на самым краі раёна, вобласці, а раней і краіны — вось ён, левы бераг Случы, рэчка нават у самым вусці нешырокая і зусім неглыбокая, уброд няцяжка перайсці ў любым месцы, і правы бераг — польскі... За цягам часу не ўсе вяскоўцы сёння ведаюць, што Вільча размяшчалася калісьці на тым, правым беразе, і яна была б за мяжой, калі б інакш склаліся абставіны. Прайшло з таго часу амаль паўтары сотні гадоў...

ЖУРНАЛ МИНСКОГО ГУБЕРНСКОГО ПО КРЕСТЬЯНСКИМ ДЕЛАМ ПРИСУТСТВИЯ

Декабря 30 дня 1869 г.

Решение состоялось единогласно.

Слушали: выкупное производство Мозырской поверочной Комиссии по имению помещика Князя Петра Ивановича Витгенштейна Мозырского уезда, 2 мирового участка Ленинской волости Ситницкого сельского общества, селений Ситница, Микашевичи и Вильча.

...Поверочной Комиссией установлены основные разряды крестьянских участков и по соображению с особыми местными выгодами участки эти окончательно отнесены к 10-му основному разряду с понижением в дер. Ситнице на 10 %, Микашевичах на 20 % и в Вильче с повышением на 10 %, по которому выходит ежегодного выкупного платежа в Ситнице 54 коп., Микашевичах 48 коп. и в Вильче 70 коп...

...В Присутствие поступила жалоба от крестьян всех трех деревень 10 июня, т. е. в срок. 1. В прошениях своих просители излагают: а) крестьяне деревень Ситница и Микашевичи, что

новой комиссией повышена плата за землю против платы, назначенной прежней комиссией; у них отобраны земли в урочище Пестов, а взамен предоставлены пустки, которых однако не дано, ибо на них поселены крестьяне дер. Вильча; б) крестьяне дер. Вильча жалуются на высокую оценку земель, на отдачу помещику под пристань более десятины пахотной земли, на возвращение помещику сенокосов и пастбищных полей, предоставленных им первой комиссией и отобранных у них при переселении их в 1859 г... Губернское Присутствие нашло, что заслуживают внимания следующие жалобы крестьян ...2. дер. Вильчи по отобранию у них в 1859 г. при переселении земель. Из протокола прежней Комиссии оказывается, что Комиссия определила прирезать им 63 дес., основываясь на том, что по инвентарю у них было земли больше именно на такое количество и Комиссия настоящего состава в протоколах объясняет, что она пришла к заключению, что цифра инвентаря 1845 г. не может служить основанием по увеличению крестьянам надела, такое заключение нельзя признать достаточно основательным, так как оно не опирается на тщательное расследование, сколько именно было у крестьян дер. Вильчи земли до переселения... При разборе претензии крестьян дер. Вильчи комиссия руководствовалась не только одним инвентарем, но и экономическими планами, по каким можно видеть... всех 25 хозяев, живших в дер. Вильча до переселения, следовательно, не представлялось никакой надобности определять прежнее количество земли, бывшей в пользовании 3 хозяев (ибо 2 остальные двора переселены еще в 1855 г.). Из рассмотрения плана комиссия вполне убедилась, что хозяева дер. Вильчи при переселении не были обижены, а потому и следовало оставить за ними гораздо меньшее количество угодий, чем то, которое дано им ныне...

* * *

...Ниже Ленино на Случи находятся только деревушка Морщиновичи и село Вильча, последнее лежит в 3-х верстах от Припяти и служит пристанью, на которой вяжутся плоты из дерева, сплавляемого сюда поодиночке.

Судоходство по Случи непостоянно и ограничивается движением нескольких судов малого размера, нагруженных преимущественно солью; что же касается сплава, то в весеннее время он не встречал бы никакого затруднения, если бы мост у м. Ленина был лучше устроен. Этот мост составляет причину, что сплавляемый лес вяжется в большие плоты только у села Вильча...

Паскардзіліся сяляне, што іх пакрыўдзілі пры перасяленні вёскі ў 1859 г. з правага берага на левы, і выйшла, што атрымалі яны больш, чым мелі. Не варта скардзіцца, а то і апошняе аднімуць... Чаму ж узнікла такая пільная патрэба перасяляцца? Старажыл Вільчы 90-гадовы П. А. Кулакевіч расказвае:

— На маёй памяці і зімы былі не такія, і вёсны. Былі зімы марозныя, снежныя, а паводкі — морам разліваліся і Прыпяць, і Случ... Амаль штогод вясной Случ у час паводкі затапляла палі і агароды вёскі, саму Вільчу. Таму і вымушаны былі вільчанцы перасяліцца на левы, больш вышэйшы бераг Случы.

Адбылося гэта, як сведчаць дакументы, у 1859 г. Перасяліліся сяляне з усім скарбам, нават сваю Міхайлаўскую царкву перанеслі. Толькі ненамнога лягчэйшым было жыццё і на левым беразе...

У Звестках аб населеных месцах Цэнтральнага статыстычнага камітэта МУС, складзеных паліцэйскім ураднікам Абрамавым таксама 4 мая 1896 г., указваецца, што ў вёсцы Вільчы няма ні школы, ні магазіна, ні майстэрні, ёсць толькі ветраны млын. Не бывае ярмарак, базараў. Указана таксама, што ў трох вярстах ад вусця Случы ёсць фальварак Вільча, у якім налічваецца два дваровыя месцы і 10 чалавек насельніцтва, а ў чатырох вярстах ад вусця і ў двух вярстах ад Случы знаходзіцца хутар Вільча на зямлі ўладальніка маёнтка Ленін Агаркава, у якім жыве 11 чалавек.

Звесткі пра Вільчу змешчаны ў XIII томе «Геаграфічнага слоўніка Польскага каралеўства і іншых славянскіх краін» (Варшава, 1893, с. 452): «Вільча — вёска над ракой Случ, у 3 вярстах ад яе вусця, Мазырскі павет. У вёсцы ёсць права-

Центральный статистический комитет М. В. Д.

№ 76

1. Подробное название поселения или поселка	Вильча
2. Какого рода это поселение...	Деревня на земле крестьянского общества Ленинской волости Ситницкого сельского общества
...5. При какой воде расположено	При сплавной реке Случи
6. Сколько в поселении занятых постройками дворовых мест	Дворовых мест 6, на них жилых дворов 18
7. Сколько в поселении всех наличных жителей, как взрослых, так и детей	Мужского пола 81 Женского пола 82 Итого 163
...9. Имеются ли в поселении церкви, костелы, школы, больницы	Не имеется
Подпись лица, составляющего ответы	Волостной старшина *Труханович*
Мая 4 дня 1896 г.	

слаўная царква. Насельніцтва займаецца галоўным чынам рыбалоўствам і сплавам лесу. У Вільчы лес звязваюць у так званыя «плыты», каб сплаўляць яго да Прыпяці. Мясцовасць багатая на дары прыроды, хоць і адасобленая ад бліжэйшых навакольляў. Даўняя ўласнасць князёў Радзівілаў»...

Яшчэ адно цікавае паведамленне змешчана ў артыкуле Тарановіча «Старасветчына Мазыршчыны ў матэрыяльных помніках» («Наш край», 1928 г., № 8—9, с. 38). Каля вёскі Вільча стаіць каменны крыж, які быццам бы пастаўлены на магіле нейкага шведскага князя, забітага ў час руска-шведскай вайны. Крыж гэты, сівы ад даўнасці, з ледзь прыкметнымі літарамі-знакамі і сёння стаіць, глыбока асеўшы ў зямлю, на старых могілках у Вільчы.

...Так і жыла, ціха і спакойна, як цячэ вада ў Случы, вёска ў глыбіні Палесся, у 4-м стане Мазырскага ўезда Мінскай вобласці. Падзеі, што адбываліся ў свеце, былі далёка, і сюды не даходзіла нават іх рэха. Людзі мірныя і працавітыя, адно слова — беларусы, і нават ураднік рэдка наведваўся ў Вільчу. Жылі, працавалі, нараджалі дзяцей, паміралі... Ніяк не адазвалася на даўнім укладзе жыцця і восень 1917 г. Толькі калі вясной наступнага года дзялілі землі буйнога земляўладальніка М. Агаркава, ажывіліся вільчанцы — вырашалася іх кроўнае, балючае пытанне.

А потым — завіхурыла так у свеце, што не магло не закрануць ніводнага чалавека. Палякі, белыя і зялёныя, булак-балахоўцы... Паволі заціхалі буры грамадзянскай вайны, і ўціхамірыліся, нарэшце, на левым беразе Случы, на якой у 1921 г. прайшла дзяржаўная граніца з панскай Польшчай. Вільча становіцца прымежнай вёскай, на самым беражку краіны — некалькі дзесяткаў крокаў — і чужы бераг, варожая на той час краіна... У вёсцы размясцілася 8-я застава 18-га Жыткавіцкага пагранічнага атрада. У памяці вяскоўцаў захаваліся ўспаміны пра баявыя, трывожныя будні заставы. Вялікую дапамогу аказвалі сяляне пагранічнікам у затрыманні парушальнікаў граніцы, байцы прымалі актыўны ўдзел у палявых работах, культурных мерапрыемствах, у арганізацыі калгаса «Чырвоны памежнік». Жыццё Вільчы на той час апісана ў кнізе Івана Шапавалава «Бальшавікі Палесся», у нарысе Навума Перкіна «Штрыхі майго пакалення»...

На святы, 1 Мая, 7 Лістапада, калгаснікі навакольных вёсак — Грады, Браніслава, Загацця — збіраліся ў Вільчы на мітынг. Ішлі з чырвонымі сцягамі, з песнямі, усе

абавязкова павінны быць абутымі. Гэта была дэманстрацыя перад польскім берагам калгаснага ладу, шчаслівага жыцця, дабрабыту... На супрацілеглы бераг выходзілі такія ж сяляне — польскія — глядзелі, дзівавaліся, дзеці залазілі на дрэвы. Некаторыя бачылі сваіх родзічаў і знаёмых, перагаварваліся, крычалі: «Ну як вы там жывеце?..» У іншыя гады сялян на польскім баку разганяла паліцыя.

П. А. Кулакевіч памятае першага старшыню Браніслаўскага сельсавета, у склад якога ўваходзіла Вільча, Васіля Ранчынскага, старшыню арцелі «Чырвоны памежнік» Архіпа Цырыбка, ён быў родам з Дзедаўкі, арганізатараў і актывістаў калгаса Сцяпана Кулакевіча, Рыгора Шчура, Сцяпана Канапацкага. Праз некаторы час «Чырвоны памежнік» узначаліў ПіліпАнуфрыевіч Кулакевіч. А ў 1932 г. яго без прад'яўлення абвінавачванняў арыштавалі, праз некаторы час без суда і следства аб'явілі прыгавор і накіравалі на лесапавал на далёкую Калыму. Вярнуўся на радзіму ён толькі пасля перамогі над фашысцкай Германіяй, перажыўшы сталінскія лагеры, высылку, ваеннае ліхалецце, палон...

Быў час, калі Вільча з рання да позняга вечара поўнілася дзіцячымі галасамі. У цяжкі пасляваенны час у вёсцы, у памяшканнях былой пагранічнай заставы, размяшчаўся дзіцячы дом. Колькі людзей, якія праславілі вёску працоўнымі здабыткамі, выйшла адсюль!..

Пасляваенны час вёскі па-мастацку вобразна і таленавіта апісаны у многіх творах вядомага беларускага пісьменніка, выхаванца Вільчанскага дзіцячага дома Віктара Казько.

Аб чым сведчыць геаграфічная назва Вільча? Вядомы вучоны-тапаніміст, кандыдат філалагічных навук А. Ф. Рагалёў мяркуе так. Асноўная частка назвы (віл), відавочна, суадносіцца з коранем слова «віла» — «роў, разгалінаванне на дзве часткі», «месца сутокаў дзвюх рэчак» (Е. А. Черепанова. Народная географическая терминология Черниговско-Сумского Полесья.— Сумы, 1984); гэта слова ў гаворках мае таксама значэнне «развілак дарог»; у рускіх гаворках «вилки» — «міжрэчча», «вилюга, вилюшки» — «звіліна ракі» (Э. М. Мурзаев. Словарь народных географических терминов.— М., 1984). Такім чынам, Вільча — гэта месца пасялення побач з сутокамі дзвюх рэчак — Прыпяці і Случы. Случ, якая працякае ўдотык да крайніх хат вёскі, выгінаецца тут накшталт лацінскай літары S, таму назва яе можа азначаць таксама «месца паблізу звіліны, выгіну, лукавіны ракі».

...Ідуць гады. Даўно несуднаходнай стала Случ. Але па-ранейшаму ціха, нібы сарамліва нясе яна сваю небагатую даніну, карычняватую пасля прамысловых Слуцка, Салігорска, Мікашэвіч ваду спакойнай, нібы сумнай і пакрыўджанай Прыпяці. Вільча — апошняе пасяленне на Случы, адсюль да славутай калісьці палескай ракі ўсяго некалькі кіламетраў звілістага, перарытага ірвамі шляху. А людзі ў Вільчы, як і многа гадоў назад, нараджаюцца і паміраюць, гаруюць і весяляцца, працуюць — жывуць...

С. А. Кулакевіч, В. Р. Феранц
НАРБ, ф. 577, воп. 18, с. 866, лл. 37—38; ф. 1290, воп. 11, с. 1318, л. 873.
Материалы по истории и статистике России, 1864 г.

знаходзіўся ў Жыткавічах. Сапёрная рота рыхтавала пазіцыі на лініі Гарадзяцічы — Вятчын — Старушкі — Брынёў — Дарашэвічы. 2 верасня абарону каля в. Хлупін яшчэ трымалі 7 і 9-я роты і палкавая школа. Каля Хлупінскай Буды — 8-я рота 64-га палка.

28-м жніўня датаваны апошні дакумент штаба 66-га стралковага палка ў Жыткавічах. У канцы дня штаб размяшчаўся ўжо ў Мышанцы, каля Петрыкава. А 4 верасня камандзір брыгады з Калінкавіч аддаў загад на адступленне войск да Петрыкава, на р. Убарць... У гэты дзень польскія войскі поўнасцю акупіравалі раён. Акупацыя працягвалася да лета 1920 г. У ліпені белапалякі зноў перайшлі ў наступленне, але Чырвоная Армія вытрымала яго і пачала выгнанне акупантаў з Беларусі. Начоперсавет Шапашнікаў і ваенком Клім у аператыўнай зводцы палявога штаба Рэўваенсавета рэспублікі 15 ліпеня паведамлялі, што «на лунінецкім напрамку часці Чырвонай Арміі вызвалілі г. Слуцк і ст. Жыткавічы, у раёне р. Прыпяць вядуць наступленне на Тураў»...

І. Я. Краўцоў, супрацоўнік Цэнтральнага ваенна-марскога музея ў г. С.-Пецярбург

Успамінае ўдзельнік грамадзянскай вайны, актыўны барацьбіт за ўстанаўленне савецкай улады на Жыткаўшчыне Б. М. Гельфанд. Улетку 1919 г. у Мазыры быў створаны зводны інтэрнацыянальны атрад, у якім налічвалася звыш 300 байцоў рознай нацыянальнасці — кітайцы пад камандай камуніста Ван-Фу-ліна, мадзьяры, падраздзяленне немцаў-спартакаўцаў. Мы, добраахвотнікі, прыбылі з Рэчыцы і адразу ўліліся ў атрад. Накіравалі нас на польскі фронт, у раён вёскі Перароў. Адсюль толькі што адступілі белапалякі. Плылі па Прыпяці на бронепараходзе, уся «браня» якога — укладзеныя ўздоўж бартоў мяшкі з пяском. Ён служыў шпіталем. Быў яшчэ кацер.

Неяк раніцай камандзір батальёна Банчак аб'явіў, што патрабуюцца добраахвотнікі ў разведку. Я вызваўся разам з другімі байцамі. У баявым ланцугу ішоў крайнім. Спераду перадалі, што рухаецца атрад польскіх кавалерыстаў. Двум апошнім нам загадалі вярнуцца і перадаць даныя разведкі камандзіру. Я бег паўз дарогі, таварыш — па полі. Нечакана ўслед нам ударыў кулямёт, таварыш быў паранены. Я дабег у Перарове да штаба, даклаў камандзіру. Хутка атрад пайшоў у наступленне. Палякі вялі інтэнсіўны агонь з узвышша, са званіцы. Мы ішлі ў атаку з крыкам «ура!», але свайго голасу я не чуў...

Белапалякі не вытрымалі, пабеглі. Мы ўварваліся ў іх акопы. Я ўзяў сабе ў якасці трафея нямецкі карабін са штык-нажом. Наступленне працягвалася, мы рушылі далей.

Хутка ўвайшлі ў Тураў. У канцы дня на ўзгорку каля царквы, на беразе Прыпяці, хавалі забітых. Раненых адправілі ў тыл. Параненым быў і камандзір нашага атрада Я. Калюжны.

Зарыва на Палессі

...Старшынёй Дзякавіцкага валвыканкома, утворанага восенню 1917 г., быў выбраны Пятро Быкаў, старшынёй валземаддзела Марцін Чэркас. У 1919 г., калі Жыткаўшчыну акупіравалі белапалякі, Марцін Чэркас арганізаваў партызанскі атрад, які налічваў 28 чалавек. Партызаны рабілі засады на дарогах, нападалі на абозы. Восенню 1919 г. яны перагарадзілі дарогу каля в. Вятчын, далі бой белапалякам і захапілі частку абозу са зброяй і харчаваннем. Атрад Чэркаса трымаў сувязь з партызанамі славутага дзеда Талаша, які дзейнічаў па-суседству, у Петрыкаўскім раёне.

18 ліпеня 1920 г. сфарміраваны Тураўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які ўзначаліў Ілья Нікалаеў. У Жыткавічах старшынёй рэўкома быў абраны Міна Мялешка. Узнаўленне савецкай улады, як і пасля выгнання немцаў, праходзіла ў складанай абстаноўцы. Ва ўсім Мазырскім уездзе гойсалі бандыцкія шайкі, якія тэрарызавалі насельніцтва. Пераадольваючы непамерныя цяжкасці, у пагранічнай воласці жыццё паступова ўваходзіла ў нармальную каляіну. Пачалася ўборка ўраджаю і пастаўка хлеба для Чырвонай Ар-

міі і галадаючых гарадоў. Была арганізавана ахова лясоў і населеных пунктаў...

Восенню, у пачатку кастрычніка 1920 г., М. М. Тухачэўскі ў размове па прамым провадзе з Глаўкомам рэспублікі С. С. Каменевым дакладваў, што 30-я брыгада адышла на лінію Ленін — Хотлін, 29-я брыгада — Хотлін да вусця Случы, 28-я брыгада — у раён Турава. 24-я брыгада грузілася ў раёне ст. Брынёў для адпраўкі на фронт.

12 кастрычніка 1920 г. быў заключаны папярэдні мір з Польшчай, 18 кастрычніка закончыліся баявыя дзеянні, хоць гэта яшчэ не азначала поўнага і канчатковага міру на змучанай войнамі Беларусі. З патуральніцтва ўрада Пілсудскага ў Польшчы быў сфарміраваны і ў канцы кастрычніка на Палессе былі перакінуты бандыцкія фарміраванні Булак-Балаховіча і Савінкава.

...Фронт першай сусветнай вайны на доўгі час спыніўся непадалёку адсюль, у балотах каля Пінска. У прасторных абшарах вакол Прыпяці ў неспакойныя гады пасля кастрычніцкага пераваротy 1917 г. групаваліся тыя, каго ваеннае ліхалецце раскідала па свеце, нібы бязроднае насенне. Каго тут толькі нельга было сустрэць у той час! І белыя, і чырвоныя, і зялёныя... Расказваюць, ішлі неяк надвячоркам позняй восенню ўздоўж Градаўскіх хутараў двое невядомых. Спыніліся заначаваць у пералеску. А раніцай знайшлі аднаго з іх забітым, здрадніка-спадарожніка і след прастыў... Побач чырванела пяцікутная зорка. Людзі вырашылі, што загінуўшы быў бальшавіком, а забойца, мусіць, у нечым не згадзіўся з ім, і ён жорстка расквітаўся. Пахавалі небараку тут, каля дарогі, а тое ўрочышча ў ваколіцах в. Града і цяпер завецца Бальшавік.

Занесла сюды, дзе блізка праходзіла мяжа з панскай Польшчай, і вядомага авантурыста, здрадніка і неўтаймаванага «палкаводца» Станіслава Булак-Балаховіча, які за нядоўгі час пры савецкай уладзе з штаб-ротмістра царскай арміі стаў палкоўнікам, узначаліўшы ім самім створаны полк. У час, калі Петраграду пагражала асаблівая небяспека, перайшоў на бок Юдзеніча, які тым не менш хутка аддаў загад арыштаваць Булак-Балаховіча «за беззаконныя дзеянні». Прайдзісвет здолеў збегчы з-пад аховы і ў лютым 1920 г. сам арыштаваў былога камандуючага, забраў усю касу разгромленай інтэрвенцыі. Юдзеніча ледзь удалося выратаваць замежным стаўленікам.

Задачу звяржэння савецкай улады Булак-Балаховіч ажыццяўляў сумесна з заклятым ворагам новай Расіі Барысам Савінкавым. Ім удалося сабраць «рускую народную добраахвотную армію» колькасцю каля 20 тысяч чалавек — 3 дывізіі, брыгада, кавалерыйскі полк, полк данскіх казакоў, асобная сотня камандуючага, авіяэскадрылля, браняпоезд, 2 батарэі. Гэтая зборная дружына складалася ў асноўным з савецкіх ваеннапалонных і партызанскіх атрадаў — мясцовага насельніцтва. З войскам Булак-Балаховіча ў паход супраць Саветаў выступіў з Польшчы і Савінкаў. Узначальваемы ім «Рускі палітычны камітэт» у дамоўленасці з польскім генштабам ставіў сваёй задачай адцясніць савецкія войскі з тэрыторыі Беларусі і стварыць там буржуазна-дэмакратычную рэспубліку на чале з Савінкавым. Калі выступленню будзе садзейнічаць поспех, рушыць далей, на Маскву... Польшча рабіла выгляд, што, згодна з мірным пагадненнем, не мае ніякіх адносін да арміі Булак-Балаховіча.

Удар прыйшоўся па граніцы непадалёку ад Турава. Тут, у навакольных вёсках вакол старажытнага горада, размясцілася армія Булак-

Балаховіча. Штаб знаходзіўся ў Кажан-Гарадку. 2 лістапада 1920 г. сюды прыбыў вядомы англійскі дыпламат і разведчык Сідней Рэдлі, каб каардынаваць дзеянні «арміі». Усе балахоўскія падраздзяленні напярэдадні выступлення былі сканцэнтраваны ў Тураве, балоцістая мясцовасць Палесся была выбрана «бацькам» для будучых аперацый.

У Тураве, які знаходзіўся ў нейтральнай зоне, Булак-Балаховіч размясціў свой шматлікі і надзвычай стракаты штаб, які складаўся з рускіх і польскіх афіцэраў, саветнікаў, вялікай свиты сяброў — сабутыльнікаў, іх жонак і палюбоўніц. Рассяліць такую араву ў маленькім мястэчку было цяжка. Балахоўцы выганялі местачкоўцаў на вуліцу з хат, якія ім падабаліся. Самы вялікі дом у Тураве заняў сам камандуючы. Яго багата абставілі мэбляй, нарабаванай у насельніцтва. Камандзіру ахоўнай роты часта даводзілася пускаць у ход прыклады, плёткі.

Выгляд пасёлка быў дзіўным і надзвычай каларытным. Уражала незвычайнасць ваенных абозаў, дзе ляжалі горы чамаданаў, скрыні і кошыкі, коўдры, статуэткі, посуд і безліч вузлоў.

Насілле і самавольства ў мястэчку прымалі ўсё большыя маштабы. П'яныя афіцэры і салдаты ператварыліся ў садыстаў. На іх шляху не было ніякай перашкоды, бо, як пісала ў тыя дні газета «Звязда», «у самім штабе дзень і ноч стаіць бясконцае п'янства, бесшабашны разгул. Сюды сілай прыводзяцца мясцовыя дзяўчаты. Уся жаночая палавіна Турава хавалася ў склепах і на гарышчы, але і адтуль выцягвалі балахоўскія «малайцы»...

«Бацька» глядзеў на ўсё гэта скрозь пальцы. Ён лічыў карысным адпусціць лейцы сваім ваякам перад рашаючай бітвай. 5 лістапада 1920 г. Булак-Балаховіч падпісаў загад, у якім паставіў задачу разбіць часці Чырвонай Арміі ў раёне Мазыра, Оўруча і Жлобіна.

6 лістапада армія Балаховіча рушыла ў наступленне ўздоўж Прыпяці, 10 лістапада войскі «бацькі» занялі Мазыр, а праз дзень — Калінкавічы.

7 лістапада ў Тураве Булак-Балаховіч урачыста перадаў вызваленую ад бальшавікоў тэрыторыю Беларускаму Палітычнаму Камітэту, які быў створаны ў пачатку кастрычніка ў Варшаве. У склад камітэта ўваходзілі П. Аляксюк, В. Адамовіч, І. Міткевіч і інш. Па прапанове БПК С. Булак-Балаховіч аб'яўляе сябе начальнікам беларускай дзяржавы і выдае некалькі загадаў і актаў: аб'яўляе аб роспуску ўрадаў БНР — В. Ластоўскага ў Каўнасе, А. Луцкевіча ў Варшаве і савецкага ў Мінску, аб'яўляе незалежнасць Беларусі, сябе — галоўнакамандуючым усімі ўзброенымі сіламі Беларусі, П. Алексюка — прэм'ер-міністрам урада. Абураны палітычнай здрадай Балаховіча, Б. Савінкаў са сваімі расійскімі атрадамі хацеў ісці далей на Маскву, каб падняць рускіх сялян, але яго спыніў не па гадах энергічны М. Тухачэўскі.

Армія Балаховіча развальвалася на вачах. Запозненымі былі спробы стварыць беларускую армію з мясцовых жыхароў. «Беларускі народзе! — звяртаўся «бацька» ў сваіх лістоўках.— Пасля многапакутных вякоў няволі і здзеку набліжаецца найвялікшы гістарычны момант у нашым гаротным жыцці. Адбудова дарагой нашай Бацькаўшчыны, адраджэнне нашыя старыя хвалы мінуўшчыны... Дык гей, беларускі народзе! Усе як адзін у шэрагі нашай арміі пад штандар нашага правадыра бацькі Булак-Балаховіча. Адзавісь на магутны кліч сыноў сваёй Бацькаўшчыны. Ачнісь, Беларусь...» Але гэта былі дарэмныя намаганні...

Рэгулярныя часці Чырвонай Ар-

міі сцягваліся пад Мазыр і Калінкавічы, і хутка пачаўся разгром войска Булак-Балаховіча. Армія Булак-Балаховіча пакацілася назад праз тыя месцы, дзе яшчэ нядаўна наступала. 26 лістапада вызвалены Жыткавічы. «Галоўнакамандуючы» кінуўся ў Мікашэвічы, дзе паміж пасёлкам і Сінкевічамі размяшчаліся польскія войскі. Там ён знайшоў збаўленне. Астаткі арміі рухаліся ў бок Турава, дзе яны рассеяліся ў баях і сутычках з чырвонаармейцамі.

Тухачэўскі ў размове па прамым провадзе з С. С. Каменевым 24 лістапада 1920 г. далажыў, што аперацыя супраць Булак-Балаховіча ў асноўным закончана... 25 лістапада Шапашнікаў і Клім дакладвалі ў Рэўваенсавет рэспублікі, што ў раёне Прыпяці нашы часці пасля кароткага бою рассеялі атрад Балаховіча ў 400 штыкоў і 150 шабель і занялі в. Млынок, у 22 кіламетрах на паўднёвы ўсход ад м. Тураў. Захоплена 40 палонных, 3 кулямёты, 4 скрынкі снарадаў, коні. Наступленне нашых войск працягваецца...

Ад булак-балахоўцаў Жыткавічы і Тураў вызваляў кавалерыйскі атрад будзёнаўцаў на чале з Фёдарам Авер'янавічам Барысавым. Ва ўспамінах аб тым далёкім і легендарным часе ён расказвае аб сустрэчы з вядомым партызанам часоў грамадзянскай вайны Васілём Ісакавічам Талашом, які падрабязна азнаёміў яго з размяшчэннем гарнізонаў балахоўцаў і параіў, як лепш правесці атрад па балотах і лясах.

Удар па ворагу быў нанесены раптоўны. Бандыты ў паніцы ўцякалі з Жыткавіч, распаўсюджваючы панічныя слухі аб нападзе на іх вялікай колькасці будзёнаўцаў. На другі дзень кавалерыйскі атрад разграміў бандытаў і ў Тураве.

— Я добра бачыў Булак-Балаховіча,— расказваў Ф. А. Барысаў.— Бандыт галопам нёсся на пародзістым кані і аглядваўся ў наш бок. Я стрэліў наўздагон... Конь падае, а генерал ляціць убок. Ад'ютанты падхапілі яго пад рукі і пасадзілі на запаснога каня. Цудам удалося выратавацца бандытам, праскочыўшы праз граніцу.

З вялікай радасцю і бязмежным пачуццём удзячнасці сустракалі працоўныя раёна Чырвоную Армію. «Я ніколі не забуду,— піша тав. Барысаў,— моманту ўступлення атрада ў вёску Верасніца, калі ўсё насельніцтва вёскі выйшла нам насустрач...»

Ва ўсіх вёсках воласці праводзіліся мітынгі і сходы, на якіх прымаліся патрыятычныя рэзалюцыі. Вось адна з іх: «Мы, сяляне вёскі Пагост, сабраўшыся 7 снежня 1920 г. на сход, пастанавілі падтрымліваць уладу рабочага класа і сялянства да апошняй кроплі крыві і па першым закліку ўстаць на яе абарону».

У Тураве быў створаны валваенрэўком нейтральнай паласы, які ўзначаліў Ф. Барысаў.

Хоць раён быў вызвалены ад белапольскіх акупантаў 26 лістапада, савецкая ўлада ў вёсках канчаткова ўстанавілася ў пачатку снежня. У тэлеграме начрэўарма 16 Мазырскаму рэўкому ад 4 снежня 1920 г. указваецца аб арганізацыі ва ўездзе 4 валрэўкомаў, у тым ліку Тураўскага, а ў дакладзе аб дзейнасці Тураўскага рэўкома за год яго існавання значыцца дата 7 снежня. Старшынёй валрэўкома быў прызначаны Ф. А. Барысаў, членамі рэўкома выбраны І. І. Сушчыкаў, П. І. Ценц, П. С. Кузьміных. Валасная камячэйка, у склад якой уваходзіла шэсць чалавек, займалася харчразвёрсткай, сачыла за выкананнем гужпадатку. Узначальваў яе С. Казлоўскі. Камсамольская ячэйка налічвала 19 чалавек, сакратаром яе быў выбраны былы матрос У. А. Дырэктарэнка. У Тураве былі адкрыты два клубы, народны дом

(загадчык клуба І. Шаліткоўскі), гарнізонны клуб, школа палітграматы. Арганізаваны аддзел народнай адукацыі, ужо ў 1921 г. у воласці працавала 26 школ, пры 18 школах адкрыты хаты-чытальні...

Рэгулярныя часці Чырвонай Арміі восенню 1920 г. дайшлі да Азяран, тэрыторыя ад Азяран да в. М. Малешаў была аб'яўлена нейтральнай зонай, у якой па мірным дагаворы не павінны знаходзіцца войскі. Вызначанай граніцы ў 1921 г. не было, выкарыстоўваючы гэта, палякі рабілі шматлікія вылазкі і налёты на савецкую тэрыторыю, рабавалі сялян, забівалі актывістаў, забіралі жывёлу. Вось толькі адно са шматлікіх паведамленняў у Мазырскі рэўком: 26 чэрвеня польскія салдаты захапілі на папасе 34 галавы буйной рагатай жывёлы, якая належала сялянам... 27 чэрвеня — дойны статак у 160 кароў. Калі сяляне звярнуліся да польскага каменданта ў Радзілавічах, той большасць з іх арыштаваў, а жывёлу не аддаў. Такі ж выпадак быў у в. Хільчыцы, дзе польскія салдаты, якія знаходзіліся ў в. Луткі, захапілі жывёлу грамадзян Хільчыц. Відавочна, што былым гаспадарам было не да спадобы, што побач будуецца новае жыццё з незразумелым укладам. У Буразі па ініцыятыве членаў Тураўскага рэўкома Мартына Рабцэвіча, Рамана Разановіча, Паўла Пашкевіча была арганізавана камуна. І палякі помсцілі сялянам...

Ахова часовай граніцы была ўскладзена на конны атрад у колькасці 750 шабляў, сфарміраваны ў Гомелі ў канцы 1920 г. У конным страі атрад выступіў на Тураў, 20 снежня прыбыў да месца прызначэння. Камандаваў атрадам Ф. Барысаў. 17 мая на агульным сходзе камячэйкі быў арганізаваны атрад асобага прызначэння і жанаддзел. Тураўская валасная партыйная ячэйка 16 кастрычніка 1921 г. злучана з ячэйкай 161-га батальёна войск ВЧК. Сакратаром бюро ячэйкі выбраны Я. Сівакоў, членамі бюро — Грумскіс і Дырэктарэнка. Чырвоныя коннікі, не ведаючы спакою, ачышчалі тэрыторыю Тураўскай і Жыткавіцкай валасцей ад бандфарміраванняў, якіх шмат развялося тут у неспакойны час грамадзянскай вайны. Пасля Рыжскага дагавору быў сфарміраваны атрад па ахове граніцы, пачынаючы ад Валынскай губерні, па лініі Тонеж — Тураў — Верасніца — Ленін. Начальнікам атрада быў прызначаны Рабінер, ваенкомам — Сухачоў. Арганізоўваліся заставы і конныя раз'езды. Жыццё паступова пераходзіла на мірныя рэйкі, хоць яно ўздоўж граніцы заўсёды было трывожным і неспакойным.

* * *

У Леніне жыццё ішло сваёй чаргой. Мястэчка ўдалечыні ад буйных цэнтраў было яшчэ больш глухім кутком Палесся, чым Жыткавічы і Тураў. Тым не менш у Леніне спрадвеку жыў надзвычай вольны бунтарскі дух, рэвалюцыйныя настроі адсюль разыходзіліся па ўсім краі, даходзілі да Вільні, дзе жыло многа выхадцаў з Леніна. Іх можна было сустрэць у марксісцкіх гуртках у Пецярбургу і ў Мінску, у Гомелі і ў Пінску. Ленінцы знаёміліся з работамі К. Маркса і Ф. Энгельса, маладога Уладзіміра Ульянава. З іх выходзілі відныя рэвалюцыянеры, як І. Я. Кыдышка-Кічышка, браты Сямён і Уладзімір Федаровічы, Б. Ф. Дубровін і іншыя. На вуліцы Падліпенскай (сучасная Рэвалюцыйная) у хаце А. І. Чопчыц знаходзілася да лістапада 1917 г. канспіратыўная кватэра бальшавікоў, аб чым сведчыць мемарыяльная дошка. Ёсць вусныя паведамленні, што рэвалюцыянеры — выхадцы з Леніна — сустракаліся і размаўлялі з У. І. Ульянавым, у прыватнасці,

у 1895 г. у Вільні. Хутка пасля гэтага ён выбраў сабе сусветна вядомы псеўданім Ленін, і ленінцы ўпэўнены, што менавіта назва іхняга мястэчка падказала яго Уладзіміру Ільічу[1]. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ва ўсім свеце не было такой геаграфічнай назвы, толькі ў Германіі адна вёска, якая пісалася як «Лехнін»...

З успамінаў А. В. Жыбурт, сястры Сямёна і Уладзіміра Федаровічаў: «У нашай сям'і, дзякуючы ўплыву Уладзіміра і Сямёна, рэвалюцыйны дух быў надзвычай моцным і ўпэўненым. Яшчэ хлапчукамі Сямён разам з Уладзімірам, малодшым братам, выконвалі даручэнні Б. Ф. Дубровіна, які быў звязаны з падпольшчыкамі Вільны, дастаўляў у Ленін палітычную літаратуру. Рэвалюцыйную работу ў Леніне вялі Гірш Штамбок, адвакат Шмелькін, Ф. М. Міцкевіч, В. С. Пракаповіч, Сідар Чопчыц, Уладзімір Чопчыц, Ксенія Чопчыц, Цыклін і многія іншыя. Выконваючы заданне рэвалюцыйнай арганізацыі, Уладзімір і Сямён аб'ездзілі ўсю Беларусь і Літву.

Вясной 1913 г. братоў арыштавалі. У маі быў суд, кожны атрымаў па восем гадоў катаргі са ссылкай у Сібір. Сямён быў непаўналетні, катаргу яму замянілі чатырма гадамі турмы. Шмат астрогаў зведаў ён за чатыры гады, быў у вядомых «Бутырках». І толькі ў снежні 1916 г. выйшаў з турмы ў Ніжнім Ноўгарадзе.

У армію, як палітычна ненадзейнага, яго не прызвалі, адправілі на будаўнічыя работы ў прыфрантавую зону. Штаб часці знаходзіўся ў Лунінцы, дзе была моцная бальшавісцкая арганізацыя. Тут 15 студзеня 1917 г. Сямён Федаровіч стаў членам партыі бальшавікоў. А ў маі яго мабілізавалі. Ён служыў у Мінску ў 37-м стралковым палку. Хутка Сямён Васільевіч быў выбраны старшынёй рэвалюцыйнага камітэта палка. У краіне ішла падрыхтоўка да ўзброенага паўстання. Не заставаліся ўбаку і бальшавікі Палесся...

25 кастрычніка 1917 г. Мінскі гарадскі камітэт РСДРП(б) накіраваў Сямёна Федаровіча ў Мазыр. У Леніне і вёсках воласці праходзілі дэманстрацыі і мітынгі. З хуткасцю маланкі данеслася вестка аб перамозе сацыялістычнай рэвалюцыі ў Петраградзе, устанаўленні савецкай улады ў Мінску. 26 кастрычніка 1917 г. (8 лістапада па н. ст.) — гэта быў чацвер — савецкая ўлада была ўстаноўлена ў Ленінскай воласці. На наступны дзень пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі ў Петраградзе быў створаны Ленінскі валасны рэвалюцыйны камітэт і іншыя органы савецкай улады. Дэпешу аб гэтым паслаў у Мінск С. В. Федаровіч.

Увечары 26 кастрычніка Сямён разам з таварышамі з'явіліся ў Грычынавічах. Гэта была вельмі ажыўленая, радасная сустрэча.

Уладзімір Федаровіч быў вызвалены з сібірскай катаргі пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Па шляху дамоў у Маскве яго мабілізавалі ў армію. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі ўдзельнічаў у баях за Крэмль. Па стане здароўя ён хутка быў дэмабілізаваны. Прыехаў у Грычынавічы, актыўна ўдзельнічаў ва ўсіх мясцовых падзеях, быў членам вясковага камітэта беднаты».

З успамінаў А. У. Купрыяновіч, дачкі актыўнага барацьбіта за савецкую ўладу на Леніншчыне У. В. Федаровіча

Жылі мы на пачатку стагоддзя ў Грычынавічах, у самай глыбіні Палесся, дзе пачынаецца найвялікшае балота Палесся — Грычын. Тады ў нашым краі мядзведзя можна было сустрэць хутчэй, чым пачуць якую-небудзь навіну. Нават да мястэчка Ленін, самага буйнога ў гэтым кутку, няблізкі шлях, каля 15 вёрст цяжкай, амаль непраходнай дарогі. У мястэчку тады дзейнічала бальшавіцкая арганізацыя. Многія ленінцы вызначаліся надзвычайнай актыўнасцю, палітычнай свядомасцю і адукаванасцю. Адным з такіх бальшавікоў-ленінцаў быў мой бацька Уладзімір Васільевіч Федаровіч. Ён выконваў многія даручэнні арганізацыі.

...У канцы лета 1919 г., на світанку, у хату ўварваліся белапалякі. Перапалоханыя дзеці ўзнялі плач, кінуліся хавацца. Белапалякі здзекаваліся, білі прыкладамі цяжарную маці. Бацьку вывелі на вуліцу, у садзе пачалі допыт.

— Дзе Сямён і іншыя актывісты савецкай улады? Дзе дакументы?

Бацька маўчаў. Яму выкручвалі рукі, да непрытомнасці білі калючымі галінамі дзікай грушы, якая расла каля хаты. Аблівалі вадой, каб апрытомнеў, і зноў здзекаваліся... Нічога не дабіўшыся, бацьку кінулі звязаным на воз і павезлі ў Ленін, затым адправілі ў Лунінец, у турму.

Потым бацьку, як расказвалі вачавідцы, адвезлі ў в. Навіна — цяпер Цубы Салігорскага раёна. Бацька спрабаваў уцячы, але, знясіленага, яго хутка дагналі белапалякі і тут, у памешчыцкім садзе, расстралялі...

Успаміны Х. Г. Фель, жыхаркі мястэчка Ленін Ленінскай воласці Мазырскага павета

Жылі мы на вуліцы Падліпенскай (цяпер вуліца Рэвалюцыйная). Заселена яна была ў асноўным рабочымі і рамеснікамі. Не дзіўна, што тут заўсёды панаваў бунтарскі дух, рэвалюцыйны настрой... У 1917 г. я была яшчэ дзяўчынкай, але добра запомніла дзень 25 кастрычніка. Здавалася, усе жыхары Леніна выйшлі на дэманстрацыю, каб вітаць савецкую ўладу, якая — гэта было ўжо вядома — устанавілася ў Петраградзе. Людзі ішлі па цэнтральнай вуліцы да маёнтка (яго называлі Белы дом) буйнога памешчыка-землеўладальніка Агаркава. Чырвоныя сцягі, у многіх на рукавах — чырвоныя стужкі. Такая ж стужка і ў мяне. Мяне вядзе за руку старэйшая сястра. Іграе духавы аркестр. Тут і там чуецца мелодыя «Інтэрнацыянала». Наперадзе ішоў настаўнік Букчын. Адкрыў мітынг другі настаўнік — Лец. Многія выступалі, і лейтматыў усіх выступленняў адзіны: людзі выказвалі радасць і задавальненне ад таго, што збылася шматвяковая мара... Усе былі ўпэўнены — гэта наша ўлада, здабылі яе рэвалюцыянеры-ленінцы.

Савецкую ўладу ў Леніне ўзначаліў Б. Ф. Дубровін, ураджэнец суседняй в. Грабаў. Члены рэўкома: К. Р. Міхалковіч і І. Я. Кыдышка-Кічышка (28 кастрычніка 1919 г. І. Я. Кыдышка-Кічышка за мужнасць і храбрасць быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга).

...Час быў трывожны і неспакойны. Савецкая ўлада на тэрыторыі Ленінскага павета трымалася з кастрычніка 1917 па люты 1918 г. Беларусь акупіравалі немцы. Гэта быў цяжкі, змрочны час, калі, здавалася, старое вярнулася назад у яшчэ больш суровым выглядзе. Колькі зверстваў, расстрэлаў, пакут вытрымалі ленінцы — аб гэтым цяжка расказваць...

Б. Ф. Дубровін



К. Р. Міхалковіч

У Германіі ўспыхнула рэвалюцыя, і акупанты вымушаны былі спешна пакінуць Беларусь і іншыя захопленыя імі землі. 6 снежня 1918 г. у воласці зноў узнаўляецца савецкая ўлада. Яна трымалася да 15 жніўня 1919 г. Старшынёй рэўкома ў той час быў Р. П. Лаўрэнцьеў, сакратаром валкамячэйкі — А. А. Фёдараў.

З 16 жніўня 1919 г. да 18 ліпеня

1920 г. над краем уладарылі белапалякі. Яны даўно мелі апетыт на гэты кавалак беларускай зямлі.

Да 18 сакавіка 1921 г. ненадоўга — у каторы раз — зноў устанаўліваецца ўлада Саветаў, пакуль згодна Рыжскаму дагавору паміж СССР і панскай Польшчай Ленін надоўга апынуўся пад уладай двухгаловага польскага арла. Старшынёй рэўкома ў 1920—1921 гг. быў С. М. Страх, членамі рэўкома — К. С. Корж і М. У. Мініч.

Перамовы ў Мікашэвічах

Восень 1919 г. Савецкая краіна перажывала надзвычай цяжкі час. Дзянікін набліжаўся з поўдня да Масквы, Юдзеніч штурмаваў пралетарскі Петраград... Усе сілы Чырвонай Арміі — там, на гэтых рашаючых франтах. А на захадзе між тым белапалякі захапілі амаль усю Беларусь, значную частку Украіны. Становішча для краіны Саветаў у каторы раз за гады пасля рэвалюцыі стала крытычным.

Савецкі ўрад на чале з У. І. Леніным надаваў надзвычай важнае значэнне падпісанню міру з Польшчай. З 9 кастрычніка па 12 снежня 1920 г. у п. Мікашэвічы Ленінскай воласці, што ў 10 км ад Леніна, адбыліся перамовы паміж дэлегацыямі Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа і дэлегацыяй Польскага таварыства. Абмяркоўвалася пытанне аб абмене заложнікамі і ўзаемнай рээвакуацыі грамадзян абедзвюх краін. Па ініцыятыве расійскай дэлегацыі 30 кастрычніка былі падпісаны дэкларацыі аб неўжыванні ў будучым сістэмы заложніцтва. 2 лістапада заключана пагаджэнне аб адпраўцы ў Польшчу польскіх заложнікаў, 9 лістапада — аб узаемнай перадачы грамадзянскіх палонных.

Польскую дэлегацыю на перамовах узначальваў старшыня Польскага таварыства Чырвонага Крыжа Віленскай акругі Міхаіл Касакоўскі-Корвін, дэлегацыю Расіі — Юліян Юзэфавіч Мархлеўскі, вядомы польскі рэвалюцыянер і публіцыст. У лістападзе 1919 г. ён вёў таксама неафіцыйныя перамовы з прадстаўніком «начальніка» Польшчы Пілсудскага Бермерам аб магчымых умовах часовага перамір'я на польска-савецкім фронце.

14 снежня абедзве дэлегацыі пакінулі Мікашэвічы.

У. У. Баярын, В. Р. Феранц

СВЕДЕНИЯ СТ. ФАБРИЧНОГО ИНСПЕКТОРА МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ О ЗАБАСТОВКЕ В МЕСТ. ЖИТКОВИЧИ МОЗЫРСКОГО У.

1917 г., июль месяц, Минская губ., Мозырский у., мест. Житковичи

Имя, отчество и фамилия владельца завода	М. С. Берман, лесопильный завод, заведение производства VII группы
Число рабочих в заведении	25
Число принимавших участие в забастовке	25
Продолжительность забастовки	12 дней (с 12 по 24 июля)
Число потерянных рабочих дней	300 дней
Требования бастующих	1) Увеличение заработной платы на 10—50 проц. 2) Отмена сверхурочных работ 3) Учреждение примирительной камеры
Результаты забастовки	Все требования удовлетворены

ГА Минской обл., ф. 311, д. 248, л. 67.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ ДЬЯКОВИЧСКОГО ВОЛОСТНОГО ЗЕМЕЛЬНОГО КОМИТЕТА МОЗЫРСКОГО У. МИНСКОЙ ГУБ. О ПОРЯДКЕ ПОЛЬЗОВАНИЯ ЗЕМЛЕЮ, ЛУГАМИ, ЛЕСАМИ И ОЗЕРАМИ

9 июля 1917 г.

Волостной земельный комитет в заседании своем под председательством П. О. Махнача и кандидатов: П. Б. Буноса, М. С. Кривальцевича и Д. О. Мироновича, постановил:

1) У нас должна быть демократическая республика, всему трудящемуся народу «земля и воля», земля должна быть без всякого выкупа, землю должен получить тот, кто ее будет обрабатывать своим трудом.

2) Все земли, луга, леса, помещичьи и церковные, должны быть учтены земельным комитетом, владельцу дается комитетом столько земли, сколько он может обработать сам своими собственными руками; остальную землю комитет распределяет между неимущими и малоземельными классами для обсеменения; все земли должны быть засеяны.

3) Признавая, что в названной волости в настоящем году возникало много пожаров, пагубных нашему государству, комитет постановил: выбрать немедленно в каждом обществе по 4 чел., для охраны от пожаров лесов и лугов; таковые должны принимать самые энергичные меры к тушению.

4) Пастьба скота на сенокосах, собирание грибов, ягод, рыбная ловля, охота, размещение пчельников, собирание сушняка, нематериального валежника, сучьев — комитет постановил пользоваться бесплатно.

5) Так как в некоторых обществах происходит массовая порубка материального леса, комитет постановил: организовать в каждом обществе контроль, состоящий из 3-х чел. ... Так как капиталисты уничтожают леса, как крупные, так и мелкие, комитет постановил: не допускать порубки леса со стороны спекулянтов, если таковые не имеют официальных бумаг и разрешения от волостного земельного комитета.

6) Хотя до организации земельных комитетов помещики продавали сенокос по указанию волостных исполнительных комитетов, земельный комитет постановил: помещики не должны взыскивать у крестьян остальные деньги — взыскивает земельный комитет и представляет их в государственное казначейство...

9) Бедным дать участки сенокоса бесплатно...

12) Так как озеро есть общенародное достояние, то ловить рыбу позволяется всем бесплатно, но с разрешения земельного комитета. Ловить рыбу не для наживы, а для домашнего обихода.

Настоящее постановление верно, что и удостоверяется.

Председатель — *П. Махнач*
Секретарь — *Г. Маланин*

Крестьянская газета № 11, 19 июля 1917 г.
(Великая Октябрьская Социалистическая революция в Белоруссии. Госиздат, 1957).

У тыя незабыўныя гады

У 1920 г. я даведаўся, што на свеце існуе летазлічэнне, каляндар. Было мне тады восем гадоў — позняе па паняццях цяперашняга часу адкрыццё... Але ці вінавата ў гэтым толькі «палеская глуш», якой па волі лёсу стаў славуты калісьці горад Тураў, месца майго нараджэння?

Дагэтуль помню, як людзі ў салдацкіх шапках і шынялях разбівалі сякерамі чыгуннага цара (здаецца, Аляксандра II), што стаяў на плошчы. Адвальваліся вялікія кавалкі, асколкі даляталі да нас, шурпатыя, зярніста-бліскучыя.

Тураў стаяў убаку. Да чыгункі больш за дваццаць вёрст. Прыпяцкая абалона, лясы і балоты. Але дарогі вайны не толькі не абміналі, а, здаецца, скрыжоўваліся тут. Даўгавата стаялі ў мястэчку немцы, тады прыйшлі і яшчэ прыходзілі белапалякі, лютавалі балахоўцы, не

забыліся пра нас нават гайдамакі. Страшэнны вір круціў і круціў наша богам пакінутае мястэчка. І аднак жа мы, хлапчукі, бегалі дзе толькі можна было, прагна глядзелі і слухалі, невядома для якіх мэт збіралі сотні і тысячы патронаў розных калібраў. Не раз, робячы свае небяспечныя вылазкі, патраплялі на забітых. Больш каля рачулкі, што вілася па мяжы селішча, упадаючы затым у Прыпяць.

Ноч, калі мястэчка заняло бандыцкае воінства Булак-Балаховіча, запомнілася як бясконцая жудасная цемра. Змрок чужога склепа, шэпт у цішыні і раптам — крыкі, прарэзлівыя жаночыя крыкі недзе наверсе, тупат, стрэлы і зноў крыкі. Балахоўцы пераўзышлі ўсіх астатніх налётчыкаў, усіх іншых няпрошаных гасцей. Ночы і дні няспыннага разбою і п'янага гвалтавання. Аднойчы на які момант гэта заціхла, і от — зганяюць людзей на месца, дзе павінна адбыцца публічнае пакаранне «злачынца». Натоўп ідзе, як на ўласную смерць, на лузе яго спыняюць, ставяць паўкругам, і тады ўсе бачаць, як выводзяць на сярэдзіну маладога шаўца Залмана, «падпольшчыка». Нешта каля яго чытаюць урачыста-пагрозліва, каб ведалі грамадзяне, як трэба ахоўваць закон і парадак. Але... злачынца не расстрэльваюць,— разыгралі фарс міласэрнасці.

Балахоўцы, што занялі нашу хату, пілі, елі ды яшчэ наладжвалі дзеля забавы перастрэлкі з балахоўцамі-суседзямі. Добра помню песню асуджаных, якую спявалі нашы «кватаранты»: «Погибли ребята, погибли ребята, погибли ребята в двадцатом году». Вечарамі яны варажылі, каб ведаць свой сумны заўтрашні дзень. Палілі паперу на донцы талеркі і па ценях на сцяне чыталі свой лёс: забіты, паранены, некага цягне за сабой конь... Адзін з кампаніі не ўдзельнічаў ні ў п'янках і гульнях, ні ў варажбе — маўчаў ды ўсё чытаў. Пазней аказалася, што быў ён у змове з маім старэйшым братам і, калі балахоўцы пакідалі мястэчка, схаваўся, каб дачакацца Чырвонай Арміі.

Помню парад балахоўскай банды. Іграў духавы аркестр, Булак-Балаховіч сядзеў на кані. Конь быў цёмны, гарачы, усё станавіўся на заднія ногі, паказваючы публіцы свае тонкія пярэднія ногі з жоўтымі лентамі-абмоткамі ніжэй каленяў. На што спадзяваўся гэты карцінны бандыцкі генерал?

Як пачалося адступленне балахоўцаў, сядзелі мы ўдваіх з сябрам пад мостам, абдумваючы, што б гэта зрабіць, каб узарваць мост. Патронаў поўныя кішэні, але што з таго?

Дачакаліся мы Чырвонай Арміі, каб больш ужо не разлучацца з ёю. Перад гэтым была цішыня. Але якая звонкая летняя цішыня спадзяванняў! Дождж трошкі пакапаў і заціх у чаканні. Тады пачулася цоканне капытоў... З таго часу памятаю незвычайны смак баклажанных кансерваў, імі нас частавалі чырвоныя коннікі.

Н. С. Перкін

З успамінаў старэйшага жыхара г. Жыткавічы, камсамольца 20-х гадоў, ветэрана вайны і працы М. І. Савіча.

Моладзі ў 20-х гадах падрастала ў вёсцы шмат — дарослых амаль не было, забрала вайна. Актыўны, баявы быў хлопец Павел Жогаль. Ён і арганізаваў моладзь у ячэйку, слова «камсамол» было новым, як і ўсё кругом. Мне, малалетку, спачатку давяралі самыя простыя даручэнні: паклікаць каго, прынесці, падаць... Сама дзейнасць камсамольцаў была напоўнена актыўнасцю, высокай свядомасцю, энтузіязмам. Вялі вялікую культурна-прасветніцкую работу. Агітавалі здаваць дзяржаве лішкі прадуктаў, а самі ў сваіх дварах, часта насуперак бацькам, падмяталі

ўсё падчыстую. На святы вывешвалі ўсюды чырвоныя флагі, забаранялі працаваць, а хто выязджаў у поле — таго штрафавалі. У буднях баявога камсамольскага жыцця фарміраваўся характар, гартавалася воля і шліфаваліся ідэалы...

Я быў сірата — маці памерла, калі мне было пяць гадоў, бацька загінуў на імперыялістычнай вайне. Але горкага сіроцтва не адчуваў, мяне выхоўвалі як роднага дзед з бабай. Вучыўся чатыры гады ў царкоўна-прыходскай школе. Хата Емяльяна Матоха, у якой была першая ў Бялёве школа, і цяпер стаіць у вёсцы.

У 1928 г. ўпершыню пачулі сяляне незнаёмае слова «калгас». Дзед навучыў мяне добра валодаць сякерай, і ў час будаўніцтва калгасаў нашай будаўнічай брыгадзе з 12 вяскоўцаў было надзвычай многа работы. Запрасіў нас дапамагчы ў Марохарава старшыня суседняга калгаса імя Леніна Сідар Агіевіч. Дамы і грамадскія будынкі, зробленыя ў тыя далёкія гады брыгадай пад кіраўніцтвам майго дзеда Антона Савіча, і па сённяшні дзень можна сустрэць у навакольных вёсках.

У сярэдзіне 30-х гадоў я працаваў у раённай арганізацыі «Калгасбуд». Работы было многа: у раёне налічвалася, памятаю, 46 калгасаў, у кожным вялося будаўніцтва, і трэба было нейкім чынам арганізаваць работу планава. Пешкі, па бездарожжы, па ледзь праходных гацях пабываў у кожным хутары, якія было вырашана хутка ліквідаваць. Я ніколі не баяўся цяжкасцей — ні на рабоце, ні потым на вайсковай службе, таму што быў загартаваны нялёгкім дзяцінствам у гады страшэннай разрухі пасля пераваротаў, рэвалюцый, грамадзянскай вайны, што прабушавалі над Палессем. Колькі прайшло гадоў, а я і цяпер памятаю тую небывалую спустошанасць гаспадаркі, галечу і беднасць сялянства. Палескі мужык і без таго жыў заўсёды бедна, не бачыў свят, забіты работай на сваім як звычайна невялікім, малаўрадлівым кавалачку зямлі, а тут яшчэ пранеслася такая бура!.. Мала радасці было і ад таго, што сяляне атрымалі па ленінскім дэкрэце, як тады гаварылі, уласныя надзелы: іх трэба было з цягам часу дзяліць паміж сынамі, а тыя — паміж сваімі сынамі, і так далей... Таму не дзіўна, што для многіх сялянскіх сем'яў выйсце бачылася ў калектыўнай гаспадарцы.

М. І. Савіч

Тое, што запомнілася...

З успамінаў Т. П. Русага[1], старшыні Тураўскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта ў снежні 1918 г.

Вясной 1917 г. я служыў на крэйсеры «Багатыр». Мы стаялі ў Гельсінгфорсе. Там у сакавіку я быў прыняты ў члены РКП(б). Напярэдадні кастрычніцкіх падзей карабель знаходзіўся ў Кранштаце, мы, матросы, часта бывалі ў Петраградзе. Там давялося чуць выступленне У. І. Леніна.

Па карабельным радыё мы адразу даведаліся, што ў Петраградзе адбылася рэвалюцыя. На крэйсеры ў той дзень быў выбраны ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Ён перагледзеў штат карабля, найбольш рэакцыйна настроеныя афіцэры былі перададзены рэўтрыбуналу. Праз некаторы час атрымалі загад камандуючага марскімі сіламі рэспублікі П. Дыбенкі накіраваць частку асабовага саставу ў распараджэнне камандавання ствараемай Дняпроўскай флатыліі. Камандуючы флатыліяй Палупанаў накіраваў мяне з групай землякоў у Мазыр, адтуль я трапіў на радзіму, у Тураў.

Хутка воласць акупіравалі немцы. Сядзець спакойна дома, падпарадкоўвацца захопнікам

[1] *Русы Т. П.* нар. у 1889 г., памёр у 1965 г.

ўсё падчыстую. На святы вывешвалі ўсюды чырвоныя флагі, забаранялі працаваць, а хто выязджаў у поле — таго штрафавалі. У буднях баявога камсамольскага жыцця фарміраваўся характар, гартавалася воля і шліфаваліся ідэалы...

Я быў сірата — маці памерла, калі мне было пяць гадоў, бацька загінуў на імперыялістычнай вайне. Але горкага сіроцтва не адчуваў, мяне выхоўвалі як роднага дзед з бабай. Вучыўся чатыры гады ў царкоўна-прыходскай школе. Хата Емяльяна Матоха, у якой была першая ў Бялёве школа, і цяпер стаіць у вёсцы.

У 1928 г. ўпершыню пачулі сяляне незнаёмае слова «калгас». Дзед навучыў мяне добра валодаць сякерай, і ў час будаўніцтва калгасаў нашай будаўнічай брыгадзе з 12 вяскоўцаў было надзвычай многа работы. Запрасіў нас дапамагчы ў Марохарава старшыня суседняга калгаса імя Леніна Сідар Агіевіч. Дамы і грамадскія будынкі, зробленыя ў тыя далёкія гады брыгадай пад кіраўніцтвам майго дзеда Антона Савіча, і па сённяшні дзень можна сустрэць у навакольных вёсках.

У сярэдзіне 30-х гадоў я працаваў у раённай арганізацыі «Калгасбуд». Работы было многа: у раёне налічвалася, памятаю, 46 калгасаў, у кожным вялося будаўніцтва, і трэба было нейкім чынам арганізаваць работу планава. Пешкі, па бездарожжы, па ледзь праходных гацях пабываў у кожным хутары, якія было вырашана хутка ліквідаваць. Я ніколі не баяўся цяжкасцей — ні на рабоце, ні потым на вайсковай службе, таму што быў загартаваны нялёгкім дзяцінствам у гады страшэннай разрухі пасля пераваротаў, рэвалюцый, грамадзянскай вайны, што прабушавалі над Палессем. Колькі прайшло гадоў, а я і цяпер памятаю тую небывалую спустошанасць гаспадаркі, галечу і беднасць сялянства. Палескі мужык і без таго жыў заўсёды бедна, не бачыў свят, забіты работай на сваім як звычайна невялікім, малаўрадлівым кавалачку зямлі, а тут яшчэ пранеслася такая бура!.. Мала радасці было і ад таго, што сяляне атрымалі па ленінскім дэкрэце, як тады гаварылі, уласныя надзелы: іх трэба было з цягам часу дзяліць паміж сынамі, а тыя — паміж сваімі сынамі, і так далей... Таму не дзіўна, што для многіх сялянскіх сем'яў выйсце бачылася ў калектыўнай гаспадарцы.

М. І. Савіч

Тое, што запомнілася...

З успамінаў Т. П. Русага[1], старшыні Тураўскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта ў снежні 1918 г.

Вясной 1917 г. я служыў на крэйсеры «Багатыр». Мы стаялі ў Гельсінгфорсе. Там у сакавіку я быў прыняты ў члены РКП(б). Напярэдадні кастрычніцкіх падзей карабель знаходзіўся ў Кранштаце, мы, матросы, часта бывалі ў Петраградзе. Там давялося чуць выступленне У. І. Леніна.

Па карабельным радыё мы адразу даведаліся, што ў Петраградзе адбылася рэвалюцыя. На крэйсеры ў той дзень быў выбраны ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Ён перагледзеў штат карабля, найбольш рэакцыйна настроеныя афіцэры былі перададзены рэўтрыбуналу. Праз некаторы час атрымалі загад камандуючага марскімі сіламі рэспублікі П. Дыбенкі накіраваць частку асабовага саставу ў распараджэнне камандавання ствараемай Дняпроўскай флатыліі. Камандуючы флатыліяй Палупанаў накіраваў мяне з групай землякоў у Мазыр, адтуль я трапіў на радзіму, у Тураў.

Хутка воласць акупіравалі немцы. Сядзець спакойна дома, падпарадкоўвацца захопнікам

[1] *Русы Т. П.* нар. у 1889 г., памёр у 1965 г.

У СМУТНЫ ЧАС РЭВАЛЮЦЫЙ

мы не маглі. Арганізавалі падпольную барацьбу, рабілі засады, нападалі на ворага, праводзілі рэвалюцыйную агітацыю сярод насельніцтва. У склад партызанскага атрада ўваходзіла каля 50 найбольш актыўных змагароў: Арсень Котаў[1], Сцяпан Сулкоўскі, Іван Галец, Максім Бруй, Арцём Рабірох[2], Цярэнцій Сядзельнік[3], Трафім Базылевіч, Самуіл Санец, Антон Балбуцкі, Васіль Котаў, Пятро Балбуцкі, Аляксандр Мамонаў, Антон Хілінскі, Фама Багай, Міхаіл Чорны, Еўдакім Шылко, Міхаіл Вянгура, Сцяпан Міцюрыч[4] і іншыя. Мяне выбралі камандзірам атрада, Іван Галец быў маім намеснікам, Сцяпан Сулкоўскі — сувязны.

Ноччу 18 снежня 1918 г. партызанскі атрад увайшоў у Тураў. Паўстанцы занялі пошту, памяшканне ўправы. Зноў пачаў працаваць ваенна-рэвалюцыйны камітэт, узначаліць які даручылі мне. Раніцай 19 снежня ў Тураве было аб'яўлена аб узнаўленні савецкай улады. Не ўсім гэта падабалася, багацеі паслалі ганцоў у Жыткавічы, каб паведаміць нямецкім уладам аб паўстанні ў Тураве.

25 снежня вораг напаў на нашу заставу каля вёскі Боркі. У складзе заставы быў Сцяпан Міцюрыч. Ён потым расказваў: «Мы размясціліся каля маста. Вечарэла. У змроку заўважылі некалькі падвод, якія рухаліся з Жыткавіч. На іх сядзелі нямецкія салдаты. Трэба было папярэдзіць сваіх у Тураве, але як? У нас не было нават каня, каб паслаць нарочнага. Зрабілі некалькі стрэлаў. Думалі, іх пачуюць у Тураве. Ворагі адкрылі па нас агонь. Я накіраваўся па лёдзе ў бок Турава, каб прывесці падмогу, але немцы перагарадзілі дарогу. Хутка яны аказаліся ў Тураве. Бой там працягваўся звыш двух гадзін»...

Немцы ўварваліся ў Тураў. Як маглі, мы абараняліся. Куля трапіла мне ў плячо. Сілы былі няроўныя. Частка нашага атрада загінула ці трапіла ў палон, другая частка адступіла ў бок Століна. Савецкая ўлада ў Тураве была ўзноўлена на 8 дзён, але мы паказалі народу, што можна змагацца, нельга сядзець, склаўшы рукі.

Цяжка склаўся лёс тых, хто трапіў у палон. Цярэнцій Сядзельнік расказваў: «Схапілі нас разам з Андрэем Бялко, Савеліем Нямшэвічам, Іванам Гальцом, Сцяпанам Сулкоўскім — усяго 14 чалавек — і пасля жорсткіх допытаў і здзекаў адправілі спачатку ў Жыткавічы, потым у Мазыр. Па дарозе здзекі працягваліся, нас запрэглі ў сані і прымусілі цягнуць у Жыткавічы нарабаванае дабро... У Мазыры нас чакаў суровы прысуд — усіх да расстрэлу. Выратаваліся цудам, у той дзень, калі нас павінны былі расстраляць, пачалося наступленне Чырвонай Арміі»...

Зноў узнавіў работу Тураўскі рэўком 3 студзеня 1919 г. Я тады ляжаў пасля ранення ў бальніцы ў цяжкім становішчы, была зроблена небяспечная аперацыя, урачы наогул не спадзяваліся, што выжыву. Узначаліў рэўком наш баявы сябра Сцяпан Сулкоўскі.

Я крыху акрыяў і зноў прыступіў да работы. Апісвалі, абмяралі і дзялілі паміж сялянамі зямлю памешчыка Нарэйкі. А хутка — новая акупацыя, прыйшлі белапалякі, не давалі спакойна жыць і балахоўцы. Я зноў трапіў на фронт, у тую ж Дняпроўскую флатылію. Хутка ў складзе Прыпяцкага атрада на кацеры «Даратэя» вызваляў Тураў — на гэты раз канчаткова, назаўсёды...

З успамінаў П. М. Дудзіча, старажыла вёскі Браніслаў

...Дарог амаль не было. Зімой яшчэ выручалі зімнікі на сенажаці, у навакольныя вёскі, у бліжэйшае сяло Людзяневічы. А ўлетку дарогі і сцяжынкі ў некаторых напрамках зусім губляліся ў зараснікаў, у балоце. Пісьмаў не атрымлівалі, газет у вочы не бачылі. Толькі і даведваліся пра якія навіны ў свеце, калі прыязджаў ураднік, зборшчык падаткаў або нарочны з павесткай таму ці другому хлопцу ў войска, і калі вяртаўся зрэдку ў родныя мясціны салдат — ён тады быў самым ганаровым і дасведчаным чалавекам...

Сам я двойчы служыў «цару і айчыне», удзельнічаў у двух войнах: у руска-японскай, калі ў 1903 г. быў прызваны ў армію, і ў 1914 г. Не адзін я прызываўся тады, але вярнуліся нямногія...

Прыйшоў у родныя мясціны толькі ў канцы 1917 г. У Браніславе пра рэвалюцыю ў Петраградзе хадзілі цьмяныя чуткі, усё заставалася па-ранейшаму. Колькі хадакоў прыходзіла да мяне, распытвалі, раіліся, быццам я быў членам урада, мог чым дапамагчы... Але вясной 1918 г. відны ўжо былі зрухі. Памешчыцкія землі падзялілі паміж сялянамі, тое ўрочышча і цяпер носіць назву Прырэзы.

...Цяпер, здаецца, і не бывае такіх снежных зім, блакітных вёснаў з вялікай паводкай, радасных, шчодрых восеней... Шырока разліваліся Прыпяць і Случ, затаплялі ўсё навокал, як бяскрайняе мора. Асабліва вялікай паводка была вясной 1917 г. Яна затапіла ўсе палі

[1] *Котаў А. Ф.* Нар. у 1891 г., загінуў у 1918 г.

[2] *Рабірох А. Р.* нар. у 1893 г., памёр у 1969 г.

[3] *Сядзельнік Ц. П.* нар. у 1895 г., памёр у 1973 г.

[4] *Міцюрыч С. К.* нар. у 1895 г., памёр у 1973 г.

і дарогі, ускраіны вёсак... Каля ўрочышча Фёдарава Горка і цяпер можна бачыць роўныя паралельныя старыя канавы — былыя барозны закінутага поля, якія размыла вялікая вясновая вада ў той год. Здаецца, яна змыла ўсё старое...

Вясной 1921 г. дзяржаўная граніца з Польшчай прайшла па Случы, паўз Лагвошчы, кіламетры за 2—3 ад Браніслава.

У Браніславе больш разумныя сяляне разумелі, што настаў такі час, калі трэба вучыць сваіх дзяцей. Без навукі цяпер нікуды... Нанялі настаўніка — Уладзіміра Паўлавіча Акінчыца. Навучаліся дзеці ў хаце Івана Дзмітрэнкі.

У 1922 г. агульнымі намаганнямі пабудавалі школу. Шмат сіл прыклалі для яе адкрыцця Рыгор Ранчынскі і Іван Кананучанка — збіралі сродкі сярод сялян, дзеці якіх будуць навучацца ў школе, вывозілі лес, збіралі салому для даху. А на кастрычніцкія святы 1935 г. у Браніславе адкрыта новая школа, у якую хадзілі вучні з навакольных вёсак. Гэта быў вялікі будынак — сем класаў, піянерскі пакой, спартыўная зала, сталоўка, майстэрня, два пакоі для настаўнікаў. У старым будынку школы быў размешчаны радзільны дом і фельчарска-акушэрскі пункт. У ваеннае ліхалецце немцы разабралі школу, бярвенне выкарыстоўвалі на бліндажы і ўмацаванні на чыгунцы.

У Лагвошчах, дзе жыло шмат палякаў, дзейнічала школа на польскай мове, быў адкрыты нацыянальны Дом культуры. Дорага абышлося гэта лагвашчанцам: у выніку абвінавачвання ў нацыяналізме, у сувязях з замежжам у 1937 і 1938 гг. з вёскі забралі ўсіх мужчын, звыш сарака чалавек, вярнуўся ў 1949 г. толькі Алесь Рудніцкі.

Працавала школа і ў Градзе. У вёсцы жылі пераважна перасяленцы з Украіны, размаўлялі яны на ўкраінскай мове, і школа была ўкраінскамоўная. У 1931 г. адкрыты дзіцячы сад-яслі. Школа згарэла ў маі 1944 г., доўга на тым месцы быў курган, на якім выворвалі крэйду, школьныя рэчы; неяк восенню жанчыны капалі бульбу і выграблі медны пазелянеўшы школьны званок.

Пагранічнікі дапамагалі ладзіць жыццё, арганізоўваць і ўзмацняць савецкую ўладу, вялі вялікую асветніцкую работу. З іх дапамогай быў адкрыты ў Браніславе магазін. Камбед, які ўзначальваў Сцяпан Марчанка, абараняў інтарэсы беднякоў. Малазямельным, шматдзетным сялянам была прырэзана зямля, яны атрымлівалі матэрыяльную дапамогу. У Градзе старшынёй камітэта беднаты быў абраны першы на вёсцы камуніст Пятро Галячанка.

На пясчаных пагорках у Браніславе пагранічнікі ў 1931 г. пабудавалі дзве цагляныя сіласныя вежы, круглыя сцены якіх захаваліся да гэтага часу.

У 1922 г. створаны Браніслаўскі сельскі Савет, цэнтр якога знаходзіўся ў Браніславе. Жыхары вёсак Браніслаў, Града, Князь-Бор, Загацце, Лагвошчы абралі сваіх прадстаўнікоў у сельскі орган савецкай улады. Узначаліў савет Уладзімір Паўлавіч Акінчыц, сакратаром быў выбраны Андрэй Рыгоравіч Ранчынскі. У 1925 г. у Браніславе створана камсамольская арганізацыя, якую ўзначаліў Андрэй Дзмітрук. Першыя камсамольцы — Васіль Кананучанка, Ганна Кананучанка і іншыя былі надзвычай актыўнымі, нястомнымі агітатарамі і прапагандыстамі новага ладу.

Адкрыта аддзяленне сувязі, сяляне атрымлівалі газеты і часопісы. У 1931 г. у Браніславе пабудавалі клуб. У ім мелася бібліятэка, быў радыёпрыёмнік, набор настольных гульняў. У хаце А. Р. Ранчынскага з 1929 г. размяшчаўся медыцынскі пункт.

...Ішоў час, новыя напрамкі ў жыцці і ў сялянскай гаспадарцы бралі верх. У краіне разгортвалася масавая калектывізацыя, і ўжо ў канцы 1929 г. у Браніславе быў створаны калгас, які назвалі «Прамень камуны». Узначаліў яго дваццаціпяцітысячнік, рабочы аднаго з гомельскіх заводаў Фількенштэйн.

У 1936 г. калгас наведаў старшыня Савета народных камісараў Беларусі А. Р. Чарвякоў. Ён размаўляў з людзьмі, распытваў пра іх справы, цікавіўся патрэбамі, клопатамі. Надоўга засталася ў памяці людзей сустрэча з шчырым, разумным чалавекам — кіраўніком Урада Беларусі.

З успамінаў І. Г. Ахрамовіча, старажыла вёскі Пухавічы

Пачатак стагоддзя... У вёсцы налічвалася каля ста гаспадарак. Бедныя сем'і мелі менш чым дзесяціну зямлі, багацейшыя — 2—3 дзесяціны. У Івана Макарэвіча напрыклад, на 12 душ сям'і была толькі адна дзесяціна. Падрасталі сыны, надзел дзяліўся — урэшце зямлі заставалася, казалі тады, як толькі лапцем ступіць...

Кожны кавалачак зямлі даводзілася адваёўваць цаной неверагодных намаганняў у балота. Конь ды саха, барана, сявенька — неразлучныя спадарожнікі селяніна. Лучына ў курнай хаце — чаго, а смалістых пнёў хапала... Першы трактар пабачылі ў 1929 г., калі пачалі арганізоўвацца калгасы.

У маленькіх хацінах жыло, здаралася, па 20 і болей чалавек. Драўляная падлога лічылася раскошай. У такой цеснаце панавалі хваробы, часта здараліся пажары. 1910 год я таму

У СМУТНЫ ЧАС РЭВАЛЮЦЫЙ

і запомніў, што тады згарэла звыш 50 двароў — уся вуліца Замосцішча. Людзі пачалі рассяляцца па хутарах, пераязджаць у суседнія вёскі — Ляхавічы і іншыя.

Святам было, калі некалькі раз у год, звычайна перад святамі — Вялікаднем, Тройцай, Калядамі прыязджалі з Жыткавіч гандляры — яўрэі. Яны мянялі сельскагаспадарчыя прадукты на цукар, хусцінкі, тканіну.

Некалькі больш багатых сем'яў утрымлівалі для сваіх дзяцей настаўніка. Фельчара не было, ад усіх хвароб лячылі вяскоўцаў мясцовыя знахаркі. Раз у год прыязджаў з Жыткавіч доктар. Плацілі яму прадуктамі — мукой, аўсом, хто мог — грашыма. Дзяцей рэгістравалі ў вёсцы Манастыр, якую пры савецкім ладзе пераіменавалі ў Чырвонае Возера.

У 1929 г. 12 чалавек арганізавалі калгас. Сярод іх — Васіль Гаўрылавіч Макарэвіч, Даніла Іванавіч Ахрамовіч, Фёдар Мікітавіч Купрацэвіч, Піліп Пятровіч Аліфяровіч. Старшынёй арцельцы абралі Івана Андрэевіча Аліфяровіча, бухгалтарам — найбольш адукаванага Міну Іванавіча Макарэвіча.

Калі б нават жартам сказалі ў той час, што на месцы тых непраходных балот будуць прасторныя палі, уздымуцца новыя саўгасы, будуць пасвіцца тысячныя статкі жывёлы — дальбог, ніхто не паверыў бы...

З успамінаў І. І. Гальца, актыўнага змагара за савецкую ўладу на Тураўшчыне

Люты 1917 г. не прынёс у Тураў ніякіх істотных змен. Раней галавой воласці быў зажыточны селянін з Пагоста Макей Літвінка — цяпер тураўскі гандляр Арцём Матох, пісарам уладкаваўся Мікалай Машынскі. Былы земскі начальнік Міткевіч пераехаў у Жыткавічы, працаваў там страхавым агентам — і ўсе змены... Некаторыя пагаравалі, паплакалі па цару-бацюхну, але хутка заспакоіліся. Памешчык Нарэйка ў гэты час паспешна прадаваў свае землі, ворыва і сенажаці, акрамя лясных угоддзяў, і ўсё за золата.

Паступова вярталіся ў мястэчка салдаты-франтавікі, яны прыносілі нібы свежы вецер, новыя ідэі і апошнія весткі аб падзеях у краіне. Я таксама сустрэў люты простым салдатам і ніяк не ўспрыняў гэтую падзею, а ў кастрычніку быў старшынёй камітэта салдацкіх дэпутатаў у адной з часцей Румынскага фронта.

У пачатку студзеня 1918 г. я быў ужо ў Тураве. Хутка воласць акупіравалі немцы. Сабраліся мы, франтавікі — Тарас Русы, Сямён Котаў, Пятро Балбуцкі, Сцяпан Сулкоўскі, задумаліся — што рабіць: ісці з захопленай тэрыторыі ці пачынаць барацьбу на месцы. Вырашылі застацца...

Я быў прызначаны ваенным камісарам воласці. Вясной 1919 г. Тураўшчыну занялі белапалякі, мы адышлі ў бок Мазыра. 29 чэрвеня Тураў быў вызвалены, а восенню ў мястэчка прыйшло контррэвалюцыйнае войска царскага генерала Булак-Балаховіча. У гэты час бандыты захапілі і замучылі нашага таварыша Івана Шылко, які быў накіраваны ў Тураў на разведку...

20 снежня 1920 г. у Тураве быў зноў створаны рэўком, а праз два тыдні яго ўзначаліў старшыня ваенна-рэвалюцыйнага камітэта нейтральнай зоны Фёдар Авер'янавіч Барысаў. Яго члены — Ценц, Коцік, Шульман, ваенком Сухачоў. Для аховы парадку ў мястэчку і воласці быў створаны асобны атрад, якім камандаваў Рабінер. Я быў прызначаны загадчыкам райана. Толькі ў 1921 г. мы прыступілі да мірнага жыцця.

З успамінаў В. П. Казлова

Памятаю 1914 год. Ваенных падзей на Тураўшчыне не адбывалася, але вайна адчувалася і тут. Адзін за другім прыходзілі ў хаты пахавальныя лісты. Вярталіся з вайны людзі — хто без рукі, хто без нагі, кантужаныя, прытручаныя газам. Некаторыя паміралі дома. У 1915 г. па галоўнай вуліцы мястэчка вадзілі аўстрыйскіх ваеннапалонных на работу, на будаўніцтва драўлянага маста праз Прыпяць каля вёскі Крэмнае. Салдаты былі ў зялёных касках з гарбатымі «шышкамі» зверху, у зялёнай вопратцы.

Набліжаўся 1917 г. У лютым праляцела вестка аб тым, што скінулі цара. Кожны ўспрыняў яе па-свойму. Адны аплаквалі цара, другія радаваліся. Усім хацелася нечага новага, лепшага. Памятаю, як тураўцы абмяркоўвалі падзеі. Гаварылі, што цяпер трэба нешта рабіць, ладзіць новае жыццё, але як і хто гэта павінен рабіць — было невядома і незразумела.

Жыццё між тым станавілася яшчэ больш цяжкім. Нельга было нічога купіць і прадаць. Пайшлі новыя грошы — «керанкі». Яны не мелі ніякага кошту, напрыклад, карабок запалак каштаваў 1000 рублёў. У ход пайшла залатая манета, і той, хто яе меў, нажываўся.

Памятаю, на плошчы сабралася многа людзей. Нейкі чалавек крычаў, што ёсць такая сіла, якая можа рэвалюцыю давесці да канца. Але дзе яна?.. З мітынгу сяляне накіраваліся да валасной управы, захапіўшы з сабой багры. З шумам і гвалтам пачалі здзіраць са сцен царскія партрэты.

Лета 1917 г. вызначылася тым, што многія з маіх родзічаў хварэлі тыфам і памерлі. Увосень прыйшоў з вайны бацька. Ён таксама захварэў тыфам і доўга ляжаў. Не на жарт усхваляваліся тураўскія памешчыкі Нарэйка і Кавалеўскі, пачалі прадаваць сваю зямлю. У каго было золата, той пашыраў зямельныя надзелы. А пасля вестак аб кастрычніцкіх падзеях у Петраградзе найбольш рашуча настроеныя жыхары Турава, падбухторваемыя бальшавікамі і іншымі партыйцамі-рэвалюцыянерамі, ушчэнт разбілі помнік імператару Аляксандру II, які быў устаноўлены ў цэнтры старажытнага горада, на Чырвонай плошчы, у 80-х гадах мінулага стагоддзя з нагоды вызвалення сялян ад прыгоннай залежнасці царом, як яго называлі, вызваліцелем. На другі дзень мы хадзілі з бацькам паглядзець на варварства раз'юшанага натоўпу... Доўгія гады, яшчэ ў пасляваенны час стаяў пастамент, пакуль яго не знеслі і забудавалі старадаўнюю плошчу, узвялі дзіцячы садок.

У мястэчку быў створаны рэвалюцыйны камітэт. Вясной 1918 г. пачалі дзяліць палі і сенажаці. Здавалася, настала нарэшце добрая, «свая» ўлада. А потым улады пачалі мяняцца адна за другой, што і ўсачыць цяжка... Немцы, палякі, балахоўцы, чырвоныя... Калі прыйшлі балахоўцы, яны рабавалі, што бачылі, асабліва яўрэйскае насельніцтва — забівалі, гвалтоўнічалі, адбіралі золата, выганялі людзей з хат. Яны запомніліся сваімі бесчалавечнымі адносінамі галоўным чынам да яўрэяў, а белапалякі — да ўсяго насельніцтва.

...У ліпені 1920 г. мы былі ў Рыдчы, у чатырох кіламетрах ад Турава. Аднойчы ў другой палове дня з-за Прыпяці, адкуль даўно чуліся гукі бою, загрымелі гарматы. Чырвоная Армія пачала наступленне. Палякі занялі абарону, на званіцы царквы ў іх быў назіральны пункт з кулямётам. Да захаду сонца ішоў бой, мы хаваліся дзе маглі. А ноччу ў Тураў увайшлі чырвонаармейцы.

Ішлі ў першых радах

Лёс матроса

Пайшоў Павел на вайсковую службу — як камень боўтнуў у Прыпяць... Спачатку прыйшло некалькі лістоў — быццам трапіў на флот, будзе служыць на вялікім караблі, а пакуль знаходзіцца ў запасным экіпажы (фурманка такая, ці што?), асвойвае спецыяльнасць баталера. А потым — ні гуку. Адкуль было ведаць аднавяскоўцам, якія шырэй Прыпяці вады не бачылі, што Павел Кочка на сваім крэйсеры «Святлана» скародзіць воды Балтыйскага мора, нібы на чаўне па возеры каля Прыпяці — сёння Гельсінгфорс, праз некалькі дзён — Маанзунд, і ў бязмежным моры-акіяне не да пісьмаў...

Ішоў 1904 год. Непрыкметна, у нялёгкіх матроскіх буднях прайшоў год, як Павел Кочка служыў на крэйсеры. Выдатна навучыўся страляць з сваёй 10-дзюймовай гранаты. А наперадзе была Цусіма, хоць ніводны матрос на Балтыцы і не ведаў пра яе існаванне.

Водгукі далёкай вайны даходзілі і да Верасніцы, у войска забралі некалькі вясковых хлопцаў. Ваенная канцылярыя працавала дакладна, і праз некалькі год прыйшла сумная вестка: загінуў матрос Павел Рыгоравіч Кочка за веру, цара і айчыну... Паплакалі родныя, засталася ўдавой маладая жонка, справілі ў царкве адпяванне і пачалі паціху забываць матроса. Да Мар'і пасватаўся ўдавец з Малешава, яна згадзілася — не век векаваць адной. Але аднойчы адчыніліся дзверы старой бацькоўскай хаты, заходзіць Павел... Ніхто веры не дае. Мар'я, як сказалі, што Павел вярнуўся, пакрыўдзілася: не стройце смешак, ужо адпелі ў царкве мужа...

...Другі дзень працягваўся цяжкі, кровапралітны бой рускай эскадры з японскімі караблямі ў Цусімскім праліве. Снарад за снарадам пасылаў Павел Кочка ў шэрыя здані няўлоўных японскіх суднаў, але ўсё больш прабоін атрымлівала і «Святлана». Прыйшоў яе апошні час, знік пад вадой геройскі крэйсер... Усяго чатырнаццаць матросаў з яго падабралі пасля заканчэння пабоішча японцы. У непрытомнасці апынуўся на борце чужога карабля і Павел

Кочка. Доўгай чарадой пацягнуліся змрочныя дні палону. Па ўсіх спісах лічыўся ён загінуўшым, і ў Верасніцу пайшоў пахавальны ліст.

Нярэдка паліцыя рабіла ў доме вобыскі, але нічога не знаходзіла: забароненыя кнігі мы хавалі ў тайніку пад падлогай. Пад вокнамі шмыгалі шпікі і паліцэйскія. Часта арыштоўвалі то аднаго, то другога хлопца, накладвалі штраф за парушэнне рэжыма або за смелыя выказванні. Мы плацілі штраф з агульнай касы, і ўсё працягвалася па-ранейшаму. Дапамагаў нам тады і МАПР. Шмелькін — стары і разумны чалавек — шмат у чым дапамагаў нам і словам, і справай. Расказваў, вучыў, раіў...

Даведка з Брэсцкага абласнога дзяржаўнага архіва

«У дакументах за 1933 г. ёсць звесткі аб існаванні ў Ленінскай гміне райкома Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі Ленін-Палосцевічы. 13 лютага 1933 г. у час разгрому паліцыяй райкома КПЗБ былі арыштаваны жыхары в. Палосцевічы Дзмітрый Варабей, Якаў Горбат, Адам Таболіч і Андрэй Табула — члены райкома КПЗБ.

Тады ж была ліквідавана ячэйка КПЗБ у в. Цімашэвічы Ленінскай гміны і былі арыштаваны жыхары гэтай вёскі Іосіф Раманоўскі, Якаў Бакуновіч і Канстанцін Бакуновіч, якія ўваходзілі ў склад ячэйкі...»

...17 верасня даўняя мара прыгнечаных беларусаў збылася. Вуліца, па якой уваходзіла ў Ленін Чырвоная Армія, называецца 17 верасня. Гэта была вялікая радасць ленінцаў, успаміны аб доўгачаканым хвалюючым дні ніколі не забывалі тыя, каму давялося перажыць яго. На вызваленай тэрыторыі былі створаны часовыя кіраўніцтвы — сялянскія камітэты. Важную ролю ў наладжванні новага жыцця адыгралі члены камуністычнай партыі. На

Слухачы ільнаводчых курсаў у Леніне, 1938 г.

дапамогу ім у вызваленыя раёны Заходняй Беларусі накіроўваліся савецкія, партыйныя і камсамольскія работнікі з усходніх раёнаў.

Сакратаром Ленінскага райкома партыі ў тыя неспакойныя, трывожныя гады адразу пасля яго арганізацыі працаваў Х. Д. Кавалёў, старшынёй райвыканкома — У. І. Чопчыц, затым Д. В. Гальбецкі (перад вайною на гэтай пасадзе знаходзіўся К. П. Ярыга), сакратаром райкома камсамола — К. П. Ярыга, начальнікам аддзела ўнутраных спраў — Н. А. Сахараў, райваенкомам — К. С. Быкаў, 15 верасня 1940 г. адбылася камсамольская канферэнцыя, выбраны райком ЛКСМБ і бюро райкома, у склад якога ўвайшлі Д. П. Куракін, К. П. Ярыга, А. А. Купчанка, І. М. Гаравы, А. М. Сушкевіч, В. В. Пыльскі, Е. І. Бузіна. Сакратаром РК ЛКСМБ быў выбраны А. А. Купчанка, намеснікамі — І. М. Гаравы і А. М. Сушкевіч. На ўліку ў раённай камсамольскай арганізацыі стаяла 208 камсамольцаў.

НА АДНОЎЛЕНАЙ ЗЯМЛІ

(З успамінаў Г. Р. Кудрэвіч, дэпутата Вярхоўнага Савета СССР у 1940—1947 гг.)

...Бацька ўзяў сем гектараў зямлі з выплатай за яе тэрмінам на 50 гадоў. Напэўна, толькі да пачатку 80-х гадоў разлічыўся б. З гэтай зямлі і пачаліся ўсе нашы беды. Трэба было працаваць на зямлі-карміцельцы, як тады гаварылі, бы той чорны вол, каб атрымаць хоць якую аддачу. Сем гектараў — гэта добры кавалак. Абрабіць, засеяць, сабраць ураджай... Дзень і ноч гаравалі бацька з маці, каб разлічыцца. Быў на той час конь, дзве каровы, сякая-такая іншая жыўнасць. Ды дзяцей — куча. Без догляду, бо бацька і маці з раніцы да позняй ночы на зямлі. Без медыцынскай дапамогі памяралі яны, мала пражыўшы на свеце. Сястрычка, тры маленькія браты памерлі адзін за адным. Ледзь выжыла пасля доўгай хваробы і я. А вясной 1930 г. пакінуў чатырох сірот ва ўзросце ад 14 да 3 гадоў і бацька... І пайшлі мы па свеце шукаць сваёй долі... Старэйшая, Насця, нанялася ў служанкі, а я пайшла ў заробкі да мясцовага багацея — за 30—50 грошаў у дзень жала, палола, зграбала сена, выбірала лён. Крыху вучылася ў польскай школе, але больш даводзілася прапускаць заняткі, чым сядзець за партай. Асабліва цяжкім выдаўся 1932 г. Здох конь, за ім — амаль уся астатняя жывёла. Зямлю абрабляць не было чым, а трэба было выплачваць падатак, вяртаць пазыку банку.

...І вось — 1939 год, доўгачаканае вызваленне Заходняй Беларусі. Паспешліва адступалі польскія пагранічнікі і паліцэйскія, зрэдку адстрэльваліся, рабілі завалы на дарогах. Хлебам-соллю сустракалі сяляне чырвонаармейцаў. Пачыналася новае жыццё.

Хутка пасля вызвалення мне сказалі, што мяне выбралі дэпутатам народнага сходу, які павінен быў адбыцца ў Беластоку. 28 кастрычніка сабраўся народны сход, які абмяркоўваў наступныя пытанні: аб дзяржаўнай уладзе, аб уваходзе Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. На сходзе прысутнічала 929 дэпутатаў з розных раёнаў Заходняй Беларусі.

У Дэкларацыі, прынятай народным сходам 29 кастрычніка, было запісана: «Беларускі народны сход, выказваючы волю і жаданне народаў Заходняй Беларусі, аб'яўляе на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі ўстанаўленне Савецкай улады. З гэтага часу ўся ўлада на тэрыторыі Заходняй Беларусі належыць працоўным у асобе Саветаў дэпутатаў працоўных».

На заключным пасяджэнні народнага сходу шляхам тайнага галасавання была выбрана Паўнамоцная камісія прадстаўнікоў Заходняй Беларусі з 65 чалавек. У камісію разам з іншымі ўвайшла і я.

У Маскве нас цёпла сустракалі члены Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, працоўныя горада.

Пазачарговая 5-я сесія Вярхоўнага Савета СССР у Крамлі 2 лістапада 1939 г. прыняла закон аб уз'яднанні Заходняй Беларусі з Савецкай Беларуссю і ўключэнні яе ў склад Саюза ССР.

Фатаграфаваліся з членамі ўрада, пабывалі ў Маўзалеі У. І. Леніна. З гасцявых трыбун Маўзалея віталі дэманстрацыю і парад войск у свята Кастрычніцкай рэвалюцыі. Сустракаліся з рабочымі заводаў і фабрык сталіцы, знаёміліся з іх жыццём і бытам.

12—14 лістапада 1939 г. у Мінску праходзіла пазачарговая 3-я сесія Вярхоўнага Савета БССР, на якой быў зацверджаны Закон аб прынятні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Вярнуліся на радзіму. Паўсюдна праходзілі мітынгі, сходы, сустрэчы з сялянамі, на якіх я расказвала аб прынятых законах, аб сваіх уражаннях, аб тым, што пачынаецца новае, свабоднае жыццё.

У пачатку снежня 1939 г. быў створаны Ленінскі раён у складзе Пінскай вобласці. Ад-

міністрацыйным цэнтрам яго стаў пасёлак Ленін. Пачаліся першыя выбары ў Вярхоўны Савет БССР. Я была вылучана кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР і 21 сакавіка 1940 г. выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР ад Ленінскай выбарчай акругі. У гэты час я стала членам ЛКСМБ. Працавала ў аддзеле кадраў Ленінскага раённага Савета працоўных. Затым вучылася ў Століне ў сельскагаспадарчай школе. Хутка пачалася вайна...

...Не заходзілі нават жабракі

З успамінаў К. І. Трафімовіча, селяніна в. Грычынавічы былой Заходняй Беларусі

Рака Случ, граніца з СССР — зусім побач, а якая сцяна паміж нашай вёскай Грычынавічы і суседнімі Новымі Залюцічамі — вёскай савецкай Беларусі. Тут, на самым краі польскіх крэсаў усходніх — беспрасветная галеча, жабрацтва, і ніякага, здавалася, прасвету наперадзе. Пражыў дзень — і добра... Зямлі мала, і тая неўрадлівая — пясок, пустазелле нават не хоча расці. Каб зарабіць капейчыну, наймаліся на самыя цяжкія работы ў лес. Валілі дрэвы, звозілі бярвенне — за тыдзень некалькі злотых налічыць дзесятнік. Захварэе хтосьці — уся надзея на шаптуху. І хварэлі, і паміралі вельмі часта, асабліва дзеці... Бяспраўе поўнае, нават за словы «я — беларус» можна было чакаць пакарання, у лепшым выпадку — заплаціць штраф. Штрафы былі на кожным кроку, куды б ні ступіла абутая ў лапаць сялянская нага: сарвеш ягаду ў панскім лесе — штраф, зловіш рыбу — штраф, скажаш нешта супраць існуючых парадкаў — таксама штраф... Гэта — акрамя незлічонай колькасці падаткаў: за каровы і за комін, за яблыньку каля хаты і за курку...

Прыйшоў я неяк да папа, каб узяць даведку аб нараджэнні — патрабавала для нечага мясцовая ўлада. Поп паглядзеў на мяне:

— Трынаццаць злотых за даведку.

Заплаціў. Поп раскрыў свой памінальнік, каб адзначыць даведку, спахмурнеў яшчэ больш і сказаў:

— Два гады ў царкве не спавядаўся... Мусіш плаціць штраф — чатыры злотыя...

Прыйшлося і тут плаціць, адрываць апошняе ад сям'і.

Аднойчы прыехаў у вёску нейкі дробны чыноўнік, старанна аглядаў сялянскія агароды. У майго суседа заўважыў некалькі каліў тытуню. Тут жа вырваў іх з коранем, патаптаў, а сусед заплаціў вялікі штраф: у панскай Польшчы на тытунь быў устаноўлены строгі акцыз.

Амаль штогод здараўся вясной голад — абыйдзеш паўвёскі і ні кавалачка хлеба не выпрасіш. Нават жабракі не заходзілі ў вёску, ведалі, што ім тут не пададуць, бо няма чаго...

Векапомны час

...Успамінаю лета 1939 г. У Леніне каля аптэкі ўстаноўлены гучнагаварыцель. Вакол сабраліся людзі, слухалі выступленне Гітлера — многія разумелі нямецкую мову. Натоўп на гэты раз не разганялі польскія ўлады, яны самі былі ўстрывожаны небяспекай, якая насоўвалася з захаду. Што чакала ўсіх — ніхто не ведаў, але было зразумела, што амбіцыі фашыстаў датычаць Польшчы...

І вось 1 верасня пранеслася трывожная вестка: Гітлер знянацку напаў на Польшчу. Што для браніраваных армій агрэсара малая і слабая краіна? 17 верасня наступіла пахмурным ранкам, шэрым небам. Да бацькі прыйшоў незнаёмы чалавек, яны доўга аб нечым размаўлялі. Я бачыў, як мясцовы стражнік сяржант Пацоха сеў на падводу і спешна паехаў у бок Мікашэвіч. Мы яшчэ ні аб чым не здагадваліся.

Хутка па той бок граніцы пачалося ажыўленне. Мы з сябрамі назіралі за ёй з акна гарышча. Гэта быў наш любімы занятак — глядзець, як блізка, за Случчу ідзе зусім іншае жыццё, на калгасных палях працуюць дзівосныя трактары... Выяснілася, выглянула сонца. Да самай ракі падыйшлі людзі ў цывільным адзенні, папрасілі прыслаць з нашага боку войта. Але ён яшчэ з вечара некуды знік. Спыталі папа Максімюка, але ён адмовіўся падыйсці. Урэшце на лодцы праз граніцу адправіўся на ўсходні бок стараста. Апоўдні ён вярнуўся. Усе былі зацікаўлены — у чым

справа, а хутка стала ўсё зразумела: уброд пешшу, на конях і на лодках Чырвоная Армія фарсіравала Случ. Коннікі пачалі абходзіць пасёлак, пяхота накіравалася па вуліцы Вялікай да цэнтра мястэчка.

З радаснымі воклічамі мы зляцелі з гарышча. Да цэнтра спяшаліся, здавалася, усе да аднаго местачкоўцы, ад малых да старых. Такога ажыўлення, радасці, хвалявання я не прыпомню... Людзі віталі чырвонаармейцаў, абдымалі іх, у многіх на твары былі слёзы шчасця. Распытвалі, расказвалі аб сваіх крыўдах... Здавалася, з гэтага дня назаўсёды знікла пагроза карычневай фашысцкай чумы.

У Леніне пачалося новае жыццё. Ішло вялікае будаўніцтва, не хапала рабочых рук, якіх раней было шмат лішніх. Адкрылася народная бібліятэка, часта адбываліся публічныя чыткі газет. Усе дзеці пайшлі вучыцца ў школу, а хутка была арганізавана і вячэрняя школа для працуючай моладзі. Працавалі бальніца, сталовая, пякарня, адкрыўся рынак. У каго не было жылля, давалі яго бясплатна — многія палякі пакінулі Ленін і выехалі за Захад. Атрымала невялікую хату і наша сям'я. Усё стала не так, як раней, і дзіўна, людзі хутка прывыклі да змен, па-другому ўжо і не ўяўлялі сваё жыццё. Савецкая ўлада стала сваёй, роднай.



А. А. Купчанка, К. П. Ярыга і А. М. Сушкевіч

Сапраўдным аўтарытэтам карысталіся камсамольцы. Уступіць у рады ЛКСМБ было справай няпростай, патрабаванні вельмі высокія. З вялікай павагай мы адносіліся да камсамольцаў Л. і М. Рабіновічаў, Ш. Шустэрмана, А. Купчанка.

...Прайшоў год, дзевяць месяцаў і чатыры дні... У першыя дні вайны многія местачкоўцы былі прызваны ў Чырвоную Армію. Усё часцей пачалі з'яўляцца ў небе варожыя самалёты, у сярэдзіне ліпеня пачулася артылерыйская кананада... Пачалося адступленне, эвакуацыя раёна. Многія жыхары Леніна хацелі адправіцца на ўсход, але за Случ нікога не пускалі.

Аднойчы ўначы каля Леніна быў высаджаны нямецкі дэсант. Упершыню людзі ўбачылі немцаў. Яны расстралялі ў Юркевічах камсамольцаў Дзяніса Таболіча і Рамана Радкевіча, ранілі міліцыянера, нарабілі панікі... Аднаго фашыста ўдалося ўзяць у палон, яго адправілі ў нашу вайсковую часць.

Фашысты ўварваліся ў Ленін апоўдні. Рукавы закасаны, у руках аўтаматы, нахабныя, крыклівыя... Стралялі курэй, разрабавалі ўсе магазіны. Уварваліся і ў нашу хату, хапалі ўсе лепшыя рэчы, прадукты. Калі б пачалі супраціўляцца, не даваць — не было сумнення, што хтонебудзь паласнуў бы чаргой з аўтамата, некалькі разоў пагражальна наводзілі яго на маці і бацьку... З хаты баяліся выйсці, есці не было чаго, плакалі малыя сястрычкі. Толькі ўвечары наступнага дня маці адважылася адпусціць мяне да дзеда па хлеб. На вуліцах — дзіўная, трывожная цішыня, ніводнага чалавека. Раптам у доме Шымана Шустэрмана пачуліся крыкі, адчыніліся дзверы, два паліцаі выцягнулі за ногі змардаванага, акрываўленага хлопца. Па

вуліцы прыкладамі падштурхоўвалі ледзь жывога другога камсамольца, Шымана Бейгельмана. Хутка каля гміны пачуліся стрэлы. Хлопцаў, добра мне знаёмых, забілі... Каля новай камендатуры стаяў вартавы. На мяне ўставілася чорная зрэнка аўтамата — здавалася, у любое імгненне фашыст можа націснуць на курок, і жыццё скончана... Так, пад пастаянным прыцэлам, ішлі з гэтага часу дні і ночы ў акупіраваным Леніне.

Каля сінагогі тырчалі два паліцаі. Ісці паўз іх было небяспечна, прыйшлося схавацца за плотам і чакаць, пакуль яны не адыйдуць. Праехаў на веласіпедзе немец у трусах і ў ботах. На вуліцы Падліпенскай паказаўся абоз. Нехта выглянуў у акно, і адразу прагрымеў стрэл. Афіцэр падышоў да шамеса і паказаў месца ў вуглу двара, дзе загадваў спаліць усе свяшчэнныя кнігі. Шамес быў у жаху, ён не мог зразумець — як можна нішчыць святыні. Афіцэр раззлаваўся, выцягнуў з кабуры наган і стрэліў паверх галавы свяшчэнніка. Выбеглі дочкі шамеса, ухапілі старога пад рукі і павялі ў сінагогу, і хутка пачалі выносіць адтуль бярэмкі кніг. Шамес з цяжкасцю плёўся за імі...

Я пайшоў дамоў. Каля разбуранага маста здалёку ўбачыў паліцаяў. Потым пачуліся стрэлы. Я заскочыў у хату свайго сябра Менты Мігдаловіча. Хлопец быў вельмі ўзрушаны — на яго вачах толькі што забілі яшчэ аднаго нашага знаёмага.

— Я бачыў, як да маста нехта бег,— расказаў сябар.— Потым назваў Айзіка Брадоцкага. За ім гналіся два паліцаі і стралялі на хаду. З другога боку маста выскачылі другія паліцаі, Брадоцкі, не раздумваючы, скочыў у ваду, і тут яго з двух бакоў возера расстралялі...

Стала вядома, што немцы замардавалі ў першыя дні акупацыі і іншых камсамольцаў — Кусю Галінсона, Ізраіля Гельфанда, Мінкеса. Айзіка Брадоцкага выцягнулі баграмі з возера. Бацькам дазволілі пахаваць забітых, але гітлераўцы распранулі іх, акрамя Брадоцкага, рэчы забралі. Воз з целамі камсамольцаў прымусілі цягнуць на могілкі самім. Пахавалі ўсіх разам, без ніякіх ушанаванняў — гэта строга забаранялася.

Ленін ператварыўся ў адзін вялікі лагер. Усе ўваходы і выхады ў мястэчка былі закрыты. Людзей імкнулія ператварыць у рабоў, у жывёлу — так помсцілі каты жыхарам пасёлка за адну толькі яго назву...

Позняй восенню 1941 г. Гарадзецкія, якія жылі на вуліцы Глухой,— старая жанчына з унукамі, сын якой Давід і зяць Навум ваявалі ў Чырвонай Арміі, збіралі на папялішчах дровы. Сусед-здраднік вырашыў выслужыцца перад уладамі, данёс, што тут жыве сям'я чырвонаармейцаў, да таго ж траціць дровы, якія належаць цяпер акупантам. Увечары ў хату ўварваліся гітлераўцы, пачалася жудасная расправа. Забілі старую Гарадзецкую, малодшага сына, дачку Хаю і яе пяцігадовых хлопчыкаў — блізнят... Спачатку дзяцей распранутымі выгналі на вуліцу, пад дождж і снег, пакуль вылюдкі рабавалі дабро ў хаце. Закончыўшы, па-зверску забілі і хлопчыкаў, стралялі разрыўнымі кулямі, падкідваючы іх угару. Трупы дарослых і малых Гарадзецкіх, каб напалохаць людзей, пакідалі на адной, потым на другой вуліцы.

Трагічны лёс быў і ў паважанага ў мястэчку яўрэя Нахмана Алейніка. Калі ў хату ўварваліся гітлераўцы, яму ўдалося выскачыць на двор. Старога чалавека дагналі, збілі, паласнулі нажом па шыі. Родныя перанеслі яго ў дом, ён вельмі пакутаваў. Потым зайшлі тыя ж немцы, на вачах у жонкі і дзяцей адзін з іх стрэліў у галаву Алейніка...

А самае страшнае адбылося

14 жніўня 1942 г. У гэты дзень выгнанні з ўсяго Леніна выганялі людзей яўрэйскай нацыянальнасці, адводзілі іх партыямі на ўскраіну пасёлка і расстрэльвалі з аўтаматаў і кулямётаў. Кроў цурчэла ручаём, рукі катаў былі ў ёй па локці... Яны ў той трагічны дзень забілі звыш двух тысяч чалавек. У 1980 г. на магіле ахвяр фашызму ў Леніне, на месцы іх расстрэлу, устаноўлены помнік. Ушанавана таксама памяць сямі камсамольцаў, якія першымі загінулі пры акупацыі, Нахмана Алейніка, сям'і Гарадзецкіх, старшыні Ленінскага выканкома, партызана У. І. Чопчыца і яго дачкі Наталлі, ахвяр карнай экспедыцыі фашыстаў у лютым 1943 г.

Б. Г. Ліфшыц

Мой родны кут — Палессе

ПАДАРОЖ ПА СЛУЧЧЫНЕ

6—12 ліпеня 1927 г.

...Сярод вялікіх Палескіх балот распаложана вялізнае возера, якое мае назву «Князь-Жыд». У старадаўнія часы яно займала безумоўна значна большы прастор. Згодна гіпотэзы Эгіхвальда, Князь-возера нібы з'яўляецца рэшткаю Герадотава мора. Калі паглядзець на сучасную тапаграфію мясцовасці, то можна заўважыць, што пашырэнне яго было магчыма больш за ўсё на поўдзень, паўночны захад і захад аж да ракі Случы, з якою яно, мусіць, злучалася. Грэцкі гісторык Герадот успамінае, што народ будзіны, або вудзіны, жывуць над вялікім возерам (морам), у якое ўліваюцца чатыры вялікія ракі: Оар, Сюргіз, Лік і Танаж. Лічаць, што першая з іх — Гарынь, Сюргіз — Стыр, Лік — Случ... Гадоў 15—18 назад, калі абшарнік Манжалей праводзіў канаву праз урочышча Булёва, былі знойдзены тры лодкі звычайнай велічыні, у невялікай адлегласці адна ад адной. Калі іх адкапалі і далі прасохнуць, то ад датыкання да іх рукой яны рассыпаліся ў парахню.

Застанаўліваючыся на самой назве возера «Князь-Жыд», трэба адзначыць, што гэта назва мае за сабой даўнасць не болей як 400 гадоў, узнікла яна, мусіць, у палове XVI ст., а калі і раней, то ў афіцыйных паперах не ўжывалася. Усюды сустракаецца назва «Жыцкае возера», што, безумоўна, гаворыць за яго старажытнасць. Гэтая назва, мусіць, стварылася ад слова «жыць-жыцё», а апошняя назва «Князь-Жыд» шчыльна звязана з народнымі паданнямі, якія дагэтуль жывуць сярод акаляючага насельніцтва... Дагэтуль у паўночнай частцы возера недалёка ад Дзякавіч знаходзіцца неглыбокае месца, якое носіць назву Замак. На гэтым месцы знаходзяцца рэшткі паляў, а таксама цэглы старажытнай формы. Гэтае месца невялікае, яно зарасло чаротам, знайсці яго могуць толькі вопытныя рыбакі.

...16 ліпеня раніцай мы адправіліся ў вёску Дзякавічы. Дарога ішла спачатку мешаным лесам, а потым сасновым. Сярод лесу ўсюды сустракаюцца хутары. На адным з хутараў мы ўбачылі, што бабы зажыналіжыта, чаго каля Слуцка яшчэ не рабілі. Вярстах у пяці ад вёскі Князь-возерская, дзе разыходзяцца дзве дарогі — адна направа ў Дзякавічы, другая ў Пагібельку, стаіць стары цікавы дуб, які ў рост чалавека разыходзіцца на дзве часткі, а потым прыблізна праз аршын зноў зрастаецца ў адно дрэва, зрабіўшы ў сабе як бы вакно. Недалёка ад дуба ў самым куце сярод дарог знаходзяцца пяць курганаў. Большы з іх мае 55—60 крокаў у акружнасці і $1^1/_2$ аршын вышыні. Ад курганаў прыблізна ў $^1/_2$ вярсты ад засценка Пагібелька два кругавідныя валы з выхадамі на дарогу. Знаходзяцца яны адзін ад другога на адлегласці 15—20 крокаў.

Ад курганаў мы павярнулі да Дзякавічаў. Ехалі лесам, дзе зрэдку бачылі кусты азалеі пантыйскай, якая па-мясцоваму завецца «божае дрэўка»... Па дарозе часта бачылі жанчын, якія палолі проса. Вёска Дзякавічы надта старажытная. У ёй ёсць шмат тыповых палескіх будынкаў... У вёсцы многа азяродаў і буслоў. Амаль кожны гаспадар мае некалькі пар азяродаў з буслами, якія сядзяць у гнёздах на невысокіх палескіх будынках, адкуль можна рукой дастаць яйцы з гнязда. Буслы так зрадніліся, што зусім не баяцца людзей. У сяле ёсць старасвецкія могілкі, ад якіх амаль няма ніякага знаку, апрача велізарных тоўстых дубоў і 2—3 старэнькіх крыжыкаў. У вёсцы ёсць пошта, сельсавет, школа і фельчарскі пункт. Кааператыў знаходзіцца сярод вёскі.

З Дзякавіч пайшлі ў Пасталы, каб пабачыць лесапільны завод, адзін з лепшых па абсталяванні ў БССР... За Дзякавічамі пачынаюцца прыгожыя лясы, дзе сустракаецца шмат дубоў і грабаў, ёсць цэлыя дубовыя гаі. У гэтых лясах сустракаецца шмат сіваваронак.

14 жніўня 1942 г. У гэты дзень выгнанні з ўсяго Леніна выганялі людзей яўрэйскай нацыянальнасці, адводзілі іх партыямі на ўскраіну пасёлка і расстрэльвалі з аўтаматаў і кулямётаў. Кроў цурчэла ручаём, рукі катаў былі ў ёй па локці... Яны ў той трагічны дзень забілі звыш двух тысяч чалавек. У 1980 г. на магіле ахвяр фашызму ў Леніне, на месцы іх расстрэлу, устаноўлены помнік. Ушанавана таксама памяць сямі камсамольцаў, якія першымі загінулі пры акупацыі, Нахмана Алейніка, сям'і Гарадзецкіх, старшыні Ленінскага выканкома, партызана У. І. Чопчыца і яго дачкі Наталлі, ахвяр карнай экспедыцыі фашыстаў у лютым 1943 г.

Б. Г. Ліфшыц

Мой родны кут — Палессе

ПАДАРОЖ ПА СЛУЧЧЫНЕ

6—12 ліпеня 1927 г.

...Сярод вялікіх Палескіх балот распаложана вялізнае возера, якое мае назву «Князь-Жыд». У старадаўнія часы яно займала безумоўна значна большы прастор. Згодна гіпотэзы Эгіхвальда, Князь-возера нібы з'яўляецца рэшткаю Герадотава мора. Калі паглядзець на сучасную тапаграфію мясцовасці, то можна заўважыць, што пашырэнне яго было магчыма больш за ўсё на поўдзень, паўночны захад і захад аж да ракі Случы, з якою яно, мусіць, злучалася. Грэцкі гісторык Герадот успамінае, што народ будзіны, або вудзіны, жывуць над вялікім возерам (морам), у якое ўліваюцца чатыры вялікія ракі: Оар, Сюргіз, Лік і Танаж. Лічаць, што першая з іх — Гарынь, Сюргіз — Стыр, Лік — Случ... Гадоў 15—18 назад, калі абшарнік Манжалей праводзіў канаву праз урочышча Булёва, былі знойдзены тры лодкі звычайнай велічыні, у невялікай адлегласці адна ад адной. Калі іх адкапалі і далі прасохнуць, то ад датыкання да іх рукой яны рассыпаліся ў парахню.

Застанаўліваючыся на самой назве возера «Князь-Жыд», трэба адзначыць, што гэта назва мае за сабой даўнасць не болей як 400 гадоў, узнікла яна, мусіць, у палове XVI ст., а калі і раней, то ў афіцыйных паперах не ўжывалася. Усюды сустракаецца назва «Жыцкае возера», што, безумоўна, гаворыць за яго старажытнасць. Гэтая назва, мусіць, стварылася ад слова «жыць-жыцё», а апошняя назва «Князь-Жыд» шчыльна звязана з народнымі паданнямі, якія дагэтуль жывуць сярод акаляючага насельніцтва... Дагэтуль у паўночнай частцы возера недалёка ад Дзякавіч знаходзіцца неглыбокае месца, якое носіць назву Замак. На гэтым месцы знаходзяцца рэшткі паляў, а таксама цэглы старажытнай формы. Гэтае месца невялікае, яно зарасло чаротам, знайсці яго могуць толькі вопытныя рыбакі.

...16 ліпеня раніцай мы адправіліся ў вёску Дзякавічы. Дарога ішла спачатку мешаным лесам, а потым сасновым. Сярод лесу ўсюды сустракаюцца хутары. На адным з хутараў мы ўбачылі, што бабы зажыналіжыта, чаго каля Слуцка яшчэ не рабілі. Вярстах у пяці ад вёскі Князь-возерская, дзе разыходзяцца дзве дарогі — адна направа ў Дзякавічы, другая ў Пагібельку, стаіць стары цікавы дуб, які ў рост чалавека разыходзіцца на дзве часткі, а потым прыблізна праз аршын зноў зрастаецца ў адно дрэва, зрабіўшы ў сабе як бы вакно. Недалёка ад дуба ў самым куце сярод дарог знаходзяцца пяць курганаў. Большы з іх мае 55—60 крокаў у акружнасці і $1^1/_2$ аршын вышыні. Ад курганаў прыблізна ў $^1/_2$ вярсты ад засценка Пагібелька два кругавідныя валы з выхадамі на дарогу. Знаходзяцца яны адзін ад другога на адлегласці 15—20 крокаў.

Ад курганаў мы павярнулі да Дзякавічаў. Ехалі лесам, дзе зрэдку бачылі кусты азалеі пантыйскай, якая па-мясцоваму завецца «божае дрэўка»... Па дарозе часта бачылі жанчын, якія палолі проса. Вёска Дзякавічы надта старажытная. У ёй ёсць шмат тыповых палескіх будынкаў... У вёсцы многа азяродаў і буслоў. Амаль кожны гаспадар мае некалькі пар азяродаў з буслами, якія сядзяць у гнёздах на невысокіх палескіх будынках, адкуль можна рукой дастаць яйцы з гнязда. Буслы так зрадніліся, што зусім не баяцца людзей. У сяле ёсць старасвецкія могілкі, ад якіх амаль няма ніякага знаку, апрача велізарных тоўстых дубоў і 2—3 старэнькіх крыжыкаў. У вёсцы ёсць пошта, сельсавет, школа і фельчарскі пункт. Кааператыў знаходзіцца сярод вёскі.

З Дзякавіч пайшлі ў Пасталы, каб пабачыць лесапільны завод, адзін з лепшых па абсталяванні ў БССР... За Дзякавічамі пачынаюцца прыгожыя лясы, дзе сустракаецца шмат дубоў і грабаў, ёсць цэлыя дубовыя гаі. У гэтых лясах сустракаецца шмат сіваваронак.

Лесапільны завод у Пасталах пад назвай «Труд» з'яўляецца сапраўдным культурным гарадком сярод глухога лесу. Пры заводзе ёсць два пасёлкі — адзін для рабочых, другі — для адміністрацыі і культурных устаноў (кіно, пошта, летні сад, клуб, сталоўка, кааператыў). Завод пабудаваны ў 1912 г. немцамі Нейбургамі. Ёсць пяць станкоў простастаўных і адзін наземны — самы магутны. Рэжуць на ім магутныя дубы на тонкую фанеру, прычым так гладка, што і габляваць не трэба. Простастаўныя станкі рэжуць дошкі рознай таўшчыні. Ёсць бачарнае аддзяленне з цыліндрычнымі машынамі для апрацоўкі клёпак. Прадукцыя завода — дошкі, брусы, матэрыял для ўпакоўкі яблык, махоркі і інш., а таксама бандарная і паркетная... Катлы і машыны завода знаходзяцца ў каменным аднапавярховым будынку, а станкі — у драўляным, прычым гэты будынак не мае ніводнай бэлькі і ключа, усё пабудавана з дошак, якія пераплятаюцца паміж сабою ў складаную сетку па нямецкім узоры. Завод мае два рухавікі, адзін з іх запасны, на другім працуюць. Рухавікі магутныя, нямецкія, Гофманаўскай фірмы.

Рабочых на заводзе штатных 120 чалавек, але на сезонныя работы прыходзяць людзі з навакольных вёсак, іншы раз да 1000 чалавек. Норма выпрацоўкі на заводзе — 125 % даваеннага часу. Сярэдняя аплата за норму — 55 руб., але рабочыя выганяюць за 80—90 руб. «На заводзе ажно рамкі трашчаць», па выразу рабочага, з якім мы вялі гутарку... Завод працуе паводле планаў Лесбелу, пад кіраўніцтвам якога знаходзіцца. Рабочыя ганарацца, што ў час разрухі яны зберагліі завод у цэласці.

Асвятленне ўсюды электрычнае. У пасёлку ёсць двухкамплектная школа. Дроў такая маса, што рабочыя не хочуць браць з заводу адходаў, прыгодных для апалу, іх даводзіцца паліць або гаціць імі грэблі і балота. Заводское жыццё выклікае ўтварэнне розных арганізацый, ёсць моцная партячэйка, камсамольская і піянерская арганізацыі. Сярод партыйцаў праводзіцца ваенізацыя, мы самі бачылі, як вярталіся з ваеннага абучэння рабочыя, распяваючы песні, а дзятва бегла за імі, страляючы з пугачоў.

... Закусіўшы ў рабочай сталоўцы, мы накіраваліся ў напрамку на Буды. Прыблізна ў 1—1,5 вярсты ад заводу за лесам знаходзіцца новы пасёлак — Чырвоны Кастрычнік. Пасёлак ужо адбудаваны, мае прыемны выгляд. З пасёлка відаць ужо і Буды, былы маёнтак генерала Манжалея, зяця вядомага Вітгенштэйна. Гэта быў спачатку саўгас, які дрэнна вёў гаспадарку, чаму цяпер і расфарміраваны. Сад маёнтка, прыкладна ў 5 дзесяцін, здадзены ў арэнду прыватнай асобе за 311 руб. у год. Сад абсаджаны з бакоў белай акацыяй. У ім сустракаюцца італьянскія арэхі, морва, ліственніца і іншыя дрэвы. Ёсць шмат ягадных кустоў, асабліва смародзіны. Арэндатары не маюць садоўніка і не клапоцяцца аб упарадкаванні саду. Пры Будах ёсць невялікі кааператыў, які бойка гандлюе.

Мікіцінскі, Р. Пяцэвіч, П. Ажэўскі
Наш край, 1928 г., № 3.

КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ

...Прафесар П. А. Туткоўскі, на падставе сваіх доследаў, прызнае, што выдатных выкапняў тут (Мазырская акруга) няма, але ёсць значныя запасы вельмі неабходных мінеральных матэрыялаў, сырцу.

Так, паводле доследаў прафесара Туткоўскага (Геологический очерк Минской губ. Вып. 1, Киев, 1926 г.), перадледніковыя безвалунныя суглінкі падсцілаюць больш маладыя адклады на тэрыторыі акругі, а на паверхню выходзяць пераважна на плошчы, паўночнай мяжой якой з'яўляецца р. Прыпяць, а з поўдня і ўсходу лінія праз в. Букчу Тураўскага раёна — в. Дуброву Лельчыцкага раёна да р. Прыпяць. Выхады на паверхню іх і неглыбокае заляганне ёсць... у Тураўскім раёне ў ваколіцах в. М. Малешаў (буры), у ваколіцах м. Тураў, в. Заяцелле, Дварэц, Чэрнічы, Пагост, Сляшцы, Сямурадцы, Старажоўцы (суглінак вільготны, цёмна-буры, сухі — светла-буры), на правым беразе Прыпяці каля в. Перароў (суглінкі таго ж тыпу, што і каля Турава, толькі з дамешкай мергелю), каля в. Азяраны на правым беразе рэчкі Сцвігі, на ўсходзе ад тае ж вёскі (буры). Апрача гэтага, на тэрыторыі Тураўскага раёна шэры перадледніковы суглінак сустракаецца каля мястэчка Тураў, в. Запясочча, Азяран, Перарова (праслойкі).

У Жыткавіцкім раёне суглінкі выходзяць у Браніслаўскім сельсавеце каля в. Лагвошчы, ва ўрочышчы Чарноцін на плошчы да 1 дзес., на глыбіні 1 арш. ад паверхні, ва ўрочышчы Выган на плошчы 15 дзес. на глыбіні 0,5 арш. (шэры, сіняваты, сухі, цёмна-шэры), каля х. Грады (навокал хутара) залягае на плошчы 0,5 дзес. (буры, безвалунны), каля в. Браніслаў ва ўрочышчы Адзёр (на захад ад вёскі ў 2 км) на плошчы 1 дзес. (жоўты), ва ўрочышчы Глінішча (у 2 км ад вёскі на паўднёвы захад) на плошчы 3 дзес. (сухі, цёмна-шэры, сыры, сіняваты), таксама выхад суглінкаў ёсць каля завода «Труд» (б. Пасталоўскі) на поўнач ад завода, у 1,5 км...

А. Крукоўскі.

Наш край, 1928, № 8—9.

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

«У ТУРАВЕ — БЫЦЦАМ-ТО Ў ПАЛЯСЦІНЕ...»

Пасля рэвалюцыі ў вёсках раёна адкрываліся школы, хаты-чытальні і іншыя адукацыйныя і культурна-асветныя ўстановы. У сельскую мясцовасць накіроўваліся агітбрыгады, мастацкія калектывы, якія на месцах растлумачвалі палітыку савецкай улады. Да такіх калектываў належаў вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам вядомага беларускага культурнага дзеяча, першага народнага артыста БССР Уладзіслава Галубка.

Шлях калектыва У. Галубка пралягаў праз Жыткавіцкі раён. Летам 1925 г. трупа тэатра гастралявала ў Мазырскай акрузе. Пасля выступлення ў Мазыры і Нароўлі вандроўныя артысты наведалі Петрыкаў і Тураў. У гэтых населеных пунктах вобласці тэатру прыйшлося затрымацца крыху большы час з мэтай вядзення антырэлігійнай прапаганды. У Петрыкаве, дзе дзень і ноч гулі званы і тысячныя працэсіі цягнуліся па мястэчку з абразамі і ўсялякаю немаччу, антырэлігійныя п'есы ставіліся тэатрам бясплатна. Такую карціну рэлігійнага дурману артысты ўбачылі і ў Тураве.

— У Тураве быццам-то ў нейкай Палясціне,— піша У. Галубок.— Каля царквы зусім сярэднявечча. Бясконца вялізны хвост баб, яны чарадой ідуць да царквы, несучы ў руках запаленыя свечкі, затыкнутыя ў мёд, які знаходзіцца ў пасудзінцы. Іх прымае поп, ачышчае шклянкі ад мёду, благаславіўшы на дарогу. Гудуць званы, калышыцца перад царквой сялянскі люд...

У Тураве больш як дзе артыстамі тэатра Галубка вялася антырэлігійная прапаганда, ставіліся бясплатныя спектаклі, перад якімі праводзіліся гутаркі супраць рэлігіі. Гэта дало свой плён. Сяляне, нават старыя, пасля спектакляў выказвалі вялікае задавальненне ад усяго таго, што бачылі і чулі, сардэчна запрашалі артыстаў да сябе ў вёскі.

Пасля Петрыкава і Турава трупа пабывала ў Жыткавічах. У час гастроляў часта бывала так, што пасля заканчэння спектакля музыкантамі трупы разам з артыстамі даваўся канцэрт.



План Турава (А. Крукоўскі, 1926 г.)

Часам усё гэта завяршалася агульным вяселлем, ператваралася ў гулянку з танцамі і спевамі. Сярод удзельнікаў вясковай мастацкай самадзейнасці вялася работа па прапагандзе тэатральнага мастацтва.

В. Яцухна.

З МАТЭРЫЯЛАЎ ТУРАЎСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

У XVI ст. на Тураўшчыне налічвалася каля 80 цэркваў і два саборы. У 1913 г.— 17 цэркваў, 4 часоўні, касцёл, 3 сінагогі, 5 малітвеных дамоў. У 1980 г., у год тысячагоддзя Турава, на ўвесь Жыткавіцкі раён была адкрыта адна Усесвяцкая царква ў старажытным горадзе над Прыпяццю.

Да 1917 г. пісьменнымі ў Тураве былі пісар суда Ануфрый Чорны, валасны пісар Машынскі, Пятро Сулкоўскі, Шостак. Валасны старшыня Літвінка не мог нават распісацца. Сельскагаспадарчую школу закончыў сялянскі хлопец Максім Бруй. У савецкі час Максім Емяльянавіч, закончыўшы БДУ імя У. І. Леніна, быў адзіным чалавекам з вышэйшай адукацыяй (настаўніцкай). Да рэвалюцыі вышэйшую адукацыю мелі памешчыкі Нарэйка (Дзямідаўскі ліцэй) і Кавалеўскі (навучаўся ў Польшчы).

Перад рэвалюцыяй у Тураве была бальніца з адным лекарам і трыма чалавекамі абслугоўваючага персаналу.

У Тураве працаваў цагельны завод Нарэйкі, які выпускаў у год каля 50 тыс. цэглы, млын, піларама, бандарны цэх, заводзік па вырабу свечак. Лесараспрацоўкі вялі пераважна нямецкія прамыслоўцы з Данцыга. Памешчыку Кавалеўскаму належалі землі ў Верасніцы і Буразях (230 га ворыва і звыш 100 га лесу). Князь Радзівіл валодаў 40 000 га лесу.

У 1926 г. у Тураве пражывала 5393 чалавекі (на тысячу жыхароў — 55 рамеснікаў). Да 1939 г. насельніцтва гарадскога пасёлка ў выніку войнаў, масавых рэпрэсій павялічылася ўсяго на 46 чалавек.

У 1940 г. у Тураўскай МТС налічвалася 11 трактараў.

У 1960 г. перад расфарміраваннем Тураўскага раёна, у ім налічвалася 39 школ, у якіх працавала 298 настаўнікаў, 44 бібліятэкі, кніжны фонд якіх складае каля 70 тыс. кніг, 42 клубы, 8 кінаўстановак, музей.

Працоўная ўмова паміж батраком Струкам Янам Уласавым і грамадзянамі в. Азяраны Тураўскага р. Мазырскай акр. для пасьбы скаціны (60 галоў). Тэрмін — з 23.IV. па 8.XI. ст.ст. (ад Юр'я да Міхайлы) 1926 г. Аплата — 30 руб. або 25 пудоў жыта (па 15 ф. за галаву).

Працоўная ўмова паміж батраком Баланчуком Анісімам Васілёвым і гр. х. Старац Рычоўскага с. с. Тураўскага р. Кучаноўскім Янам Антосевым для пасьбы скаціны ў ліку 15 ш. Плата — 47 руб. або 27 руб. і адна новая пара ботаў, картовы фрэнч, сарочка, штаны.

Выхадных дзён 3. Тройца, Пятроў дзень (12.VII. н. ст.) і Спас (19. VIII. н. ст.).

Грошы пастух атрымлівае пасля Міхайлы — «Калі хто аддасць»...

Кніга працоўных умоў Тураўскага Райпрафсавету, 1927.

Юры лічыцца абаронцам жывёлы. Ён мае сілу над ваўкамі і кіруе імі.

На Юр'я да ўсходу сонца знахары «зацінаюць» жывёлу ад ваўкоў на ўсё лета. Калі знахары не паспеюць да ўсходу сонца абыйсці ўсіх гаспадароў, жывёла іх застаецца не заговоранай і ёй пагражае быць задранай ваўкамі... Расказвалі, што бачылі, як воўк ездзіў верхам на папоўскай карове і не чапаў яе толькі таму, што яна была загавораная на Юр'я.

На Юр'я не працуюць, «каб скаціна не пала і каб град не пабіў пасевы»...

«Наш край», 1929, № 8—9.

АКТ
ПА АБКЛАДАННЮ ПРАМПАДАТКАМ ПУХАВІЦКАЙ РЫБАЛОЎНАЙ АРЦЕЛІ

1929 г. студзеня 20 дня

Мною, фінінспектарам Клазам, праверaны кнігі ўчоту лоўлі рыбы Пухавіцкай рыбалоўнай арцелі «Труд». Кнігі правяраліся ў прысутнічанні старшыні арцелі т. Макарэвіча.

Пры чым высветліў, што вядзецца прыбыткова-выдатковая кніга па ўчоту рыбы, як апраўдацельныя дакументы, маюцца акты аб улове рыбы кожнага дня.

Кніга вядзецца з падчысткамі і памаркамі, што дае магчымасць усумніцца аб паказанні звароту. За кастрычнік месяц улоў рыбы складаецца з наступнага:

I сорту — 1976 кг × на продажную цану 53 коп. за 1 кг = 1047 р. 28
II сорту — 616 кг × 35 коп. = 215 р. 60
III сорту — 1769 кг × 22 коп. = 389 р. 18

а разам зварот за кастрычнік складае 1652 р., за лістапад — 1610 руб., але самы сезон для лоўлі рыбы, па словах т. Макарэвіча,— гэта студзень, люты і сакавік месяцы.

Фінінспектар *Клаз*
Старшыня арцелі
Філіял ГА у Мазыры, ф. 52, оп. 1, д. 744, л. 1

На заходнім рубяжы

Кароткая біяграфія. 18-ы пагранічны атрад створаны ў лютым 1925 г. з асобных часцей АГПУ. 7 снежня 1927 г. уручаны баявы Чырвоны Сцяг. З кастрычніка 1942 г.— 18-ы пагранічны полк войск НКУС СССР.

Месца дыслакацыі. Мястэчка Жыткавічы Палескай вобласці. Пагранічныя заставы на тэрыторыі Жыткавіцкага і Тураўскага раёнаў: Мілевічы, Залюцічы, Перавессе, Нова-Ленін, Сукачы, Мочкаўка, Лапаціна Гара, Вільча, Малешаў, Хільчыцы. Пагранічныя камендатуры: Юркевічы, Тураў...

Узнагароды. За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання і праяўленне пры гэтым доблесці і мужнасці 18-ы пагранічны полк 23 лютага 1943 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

За мужнасць і гераізм асабовага складу 18-га пагранічнага палка пры ўзяцці горада і крэпасці Познань 5 красавіка 1945 г. узнагароджаны ордэнам Суворава III ст.

Камандаванне атрада: з сакавіка 1921 да лістапада 1926 г.— А. М. Кавалёў, да сакавіка 1928 г.— І. І. Стабін, да мая 1934 г.— В. І. Якушаў, да лістапада 1937 г.— І. М. Бартышунус, да лютага 1939 г.— Ф. С. Пакаў, да ліпеня 1941 г.— М. Р. Аканін.

Камандзіры пагранічных камендатур: Юркевіцкая — І. І. Рубін (1931—1935 гг.), Б. А. Саколік (1935—1941 гг.); Тураўская — У. В. Кляпацкі (1930—1932 гг.), Р. М. Смірноў (1932—1939 гг.)...

Мытня на савецка-польскай мяжы на ст. Жыткавічы. Начальнік мытні ў 30-я гады — капітан М. І. Крэс.

* * *

...1921 год. Па Рыжскаму мірнаму дагавору Жыткавіцкі раён стаў пагранічным. Дзяржаўная граніца паміж СССР і буржуазна-панскай Польшчай прайшла на тэрыторыі раёна па рацэ Случ. На левым, нашым беразе ракі ўстаноўлены чырвона-зялёны слуп з надпісам «СССР». На супрацьлеглым беразе — такі ж слуп, толькі малінавабелы, на якім чыгунная шыльда, а на ёй біблейская белая птушка раскінула ў бакі драпежніцкія лапы з выпушчанымі кіпцюрамі. За бела-малінавым слупам ужо іншы, чужы свет...

Адна з пагранічных застаў знаходзілася з 1922 г. у в. Вільча. Нампаліт Вільчанскай заставы ў 1929—1930 гг. Іван Еўдакімавіч Шапавалаў быў не толькі адукаваным, шчырым вайскоўцам, але і таленавітым пісьменнікам. У 1936 г. у выдавецтве «Палесдрук» выйшла яго кніга «Бальшавікі граніцы», прысвечаная арганізацыі дзяржаўнай мяжы на тэрыторыі раёна, будням пагранічнай заставы, арганізацыі калгаса ў вёсцы. Мясціны, апісаныя ў аповесці, вельмі нагадваюць ваколіцы Вільчы, прататыпамі герояў яе з'яўляюцца мясцовыя жыхары, прозвішчы многіх з іх — найбольш распаўсюджаныя ў вёсцы — Кулакевіч, Шчур, Круковіч, Рагалевіч.

...Начальнік заставы Лунгін атрымлівае заданне ад камандавання атрада пабудаваць заставу і забяспечыць бяспеку граніцы. Пачаліся баявыя будні. Лунгін знаёміцца з

I сорту — 1976 кг × на продажную цану 53 коп. за 1 кг = 1047 р. 28
II сорту — 616 кг × 35 коп. = 215 р. 60
III сорту — 1769 кг × 22 коп. = 389 р. 18

а разам зварот за кастрычнік складае 1652 р., за лістапад — 1610 руб., але самы сезон для лоўлі рыбы, па словах т. Макарэвіча,— гэта студзень, люты і сакавік месяцы.

Фінінспектар *Клаз*
Старшыня арцелі
Філіял ГА у Мазыры, ф. 52, оп. 1, д. 744, л. 1

На заходнім рубяжы

Кароткая біяграфія. 18-ы пагранічны атрад створаны ў лютым 1925 г. з асобных часцей АГПУ. 7 снежня 1927 г. уручаны баявы Чырвоны Сцяг. З кастрычніка 1942 г.— 18-ы пагранічны полк войск НКУС СССР.

Месца дыслакацыі. Мястэчка Жыткавічы Палескай вобласці. Пагранічныя заставы на тэрыторыі Жыткавіцкага і Тураўскага раёнаў: Мілевічы, Залюцічы, Перавессе, Нова-Ленін, Сукачы, Мочкаўка, Лапаціна Гара, Вільча, Малешаў, Хільчыцы. Пагранічныя камендатуры: Юркевічы, Тураў...

Узнагароды. За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання і праяўленне пры гэтым доблесці і мужнасці 18-ы пагранічны полк 23 лютага 1943 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

За мужнасць і гераізм асабовага складу 18-га пагранічнага палка пры ўзяцці горада і крэпасці Познань 5 красавіка 1945 г. узнагароджаны ордэнам Суворава III ст.

Камандаванне атрада: з сакавіка 1921 да лістапада 1926 г.— А. М. Кавалёў, да сакавіка 1928 г.— І. І. Стабін, да мая 1934 г.— В. І. Якушаў, да лістапада 1937 г.— І. М. Бартышунус, да лютага 1939 г.— Ф. С. Пакаў, да ліпеня 1941 г.— М. Р. Аканін.

Камандзіры пагранічных камендатур: Юркевіцкая — І. І. Рубін (1931—1935 гг.), Б. А. Саколік (1935—1941 гг.); Тураўская — У. В. Кляпацкі (1930—1932 гг.), Р. М. Смірноў (1932—1939 гг.)...

Мытня на савецка-польскай мяжы на ст. Жыткавічы. Начальнік мытні ў 30-я гады — капітан М. І. Крэс.

* * *

...1921 год. Па Рыжскаму мірнаму дагавору Жыткавіцкі раён стаў пагранічным. Дзяржаўная граніца паміж СССР і буржуазна-панскай Польшчай прайшла на тэрыторыі раёна па рацэ Случ. На левым, нашым беразе ракі ўстаноўлены чырвона-зялёны слуп з надпісам «СССР». На супрацьлеглым беразе — такі ж слуп, толькі малінавабелы, на якім чыгунная шыльда, а на ёй біблейская белая птушка раскінула ў бакі драпежніцкія лапы з выпушчанымі кіпцюрамі. За бела-малінавым слупам ужо іншы, чужы свет...

Адна з пагранічных застаў знаходзілася з 1922 г. у в. Вільча. Нампаліт Вільчанскай заставы ў 1929—1930 гг. Іван Еўдакімавіч Шапавалаў быў не толькі адукаваным, шчырым вайскоўцам, але і таленавітым пісьменнікам. У 1936 г. у выдавецтве «Палесдрук» выйшла яго кніга «Бальшавікі граніцы», прысвечаная арганізацыі дзяржаўнай мяжы на тэрыторыі раёна, будням пагранічнай заставы, арганізацыі калгаса ў вёсцы. Мясціны, апісаныя ў аповесці, вельмі нагадваюць ваколіцы Вільчы, прататыпамі герояў яе з'яўляюцца мясцовыя жыхары, прозвішчы многіх з іх — найбольш распаўсюджаныя ў вёсцы — Кулакевіч, Шчур, Круковіч, Рагалевіч.

...Начальнік заставы Лунгін атрымлівае заданне ад камандавання атрада пабудаваць заставу і забяспечыць бяспеку граніцы. Пачаліся баявыя будні. Лунгін знаёміцца з

Пагранічнікі 18-га Жыткавіцкага атрада — дэлегаты 3-га Пленума Мазырскага акружкома камсамола 8 кастрычніка 1928 г.: Лёва Перчык, Пятро Панамароў, Рыгор Маргуноў, Якаў Фядулаў (адзін невядомы)

насельніцтвам вёскі, у якой віруе жыццё — кулакі, беднякі, стварэнне калгаса, усё пераблыталася ў клубок супярэчнасцяў 1920-х... Багацеі пускаюць розныя плёткі, агітуюць беднату не ўступаць у калгас. Абстаноўка ўскладняецца суседствам панскай Польшчы. Нярэдкія тут госці з-за кардону, і нашы сяляне пры выпадку не адмовяцца наведаць замежных сваякоў... На ўчастку заставы нярэдка чуваць стрэлы. Падпалены будынак сельскага Савета, спалена гумно бедняка Кірылы Базуна, які першым уступіў у калгас.

Многія эпізоды аповесці ўзяты з жыцця даваеннай Вільчы і непасрэдна пагранічнай заставы; рэчаіснасць часта была не менш гераічнай і захапляючай, чым апісана ў мастацкім творы.

* * *

Вольны ад службы час І. Е. Шапавалаў цалкам аддаваў літаратурнай рабоце, зарэкамендаваўшы сябе як самабытны, таленавіты пісьменнік і паэт. Ён вучыўся ў літаратурным аб'яднанні Чырвонай Арміі і Флота, затым — у літаратурным інстытуце імя М. Горкага. У 27-гадовым узросце І. Е. Шапавалава прынялі ў Саюз пісьменнікаў СССР, білет № 1583 падпісаў А. М. Горкі. У верасні 1939 г. у Маскве быў адкрыты часопіс «Пагранічнік», і І. Е. Шапавалава запрасілі на пасаду загадчыка літаратурнага аддзела.

І. Е. Шапавалаў пісаў вершы, апавяданні, нарысы, прысвечаныя пагранічным будням. Ён любіў гэтую неспакойную, трывожную, але высакародную, рамантычную службу. Пісьменніка нездарма называлі песняром граніцы. Яе вартавым ён прысвяціў кнігі вершаў «Товарищ» і аповесць-паэму «Ян Рэндзя» з эпіграфам «Чэкістам-пагранічнікам Жыткавіцкага пагранічнага атрада ВАДПУ БССР прысвячаю».

У наступныя гады ў выдавецтвах

Пагранічнікі Малешаўскай заставы, 1930 г.

рэспублікі выходзяць кнігі І. Е. Шапавалава «Дзяржынцы», «Час набліжаецца», зборнік апавяданняў «Ненадуманыя рассказы», аповесць «Бальшавікі граніцы», якія ў многім аўтабіяграфічны. За кароткі час твор быў перавыдадзены двойчы, ён стаў любімай кнігай не толькі пагранічнікаў, але і ўсіх савецкіх людзей. І. Е. Шапавалаў напісаў таксама лібрэта оперы «Пограничники» (музыка А. Туранкова). Ён прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі рускай секцыі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Закончыў другую частку кнігі «Бальшавікі граніцы», яна павінна была выйсці ў Мінску ў чэрвені 1941 г.

Загінуў І. Е. Шапавалаў, як і жыў, на граніцы, якую так любіў. У першы дзень вайны ён выехаў у раён Брэста, дзе першымі прынялі бой з гітлераўскай армадай яго баявыя сябры.

26 чэрвеня батальённы камісар І. Е. Шапавалаў выводзіў на перафарміраванне ў тыл пагранічнікаў з разгромленых застаў. У лесе каля Барысава на калону аўтамашын наляцела авіяцыя ворага. Шапавалаў загадаў усім разбегчыся па лесе, і стаяў, назіраючы, як выконваецца загад. Побач упала бомба...

Сведкай гібелі Шапавалава стаў К. М. Сіманаў. У кнізе «Розныя дні вайны» ён пісаў: «Палкоўнік-пагранічнік раптам сказаў, што сёння забіла аднаго пісьменніка.

— Там, у ляску, дзе мы стаялі...— Ён назваў прозвішча Шапавалаў. І я ўспомніў батальённага камісара — пагранічніка, які заходзіў да нас у клуб пісьменнікаў. Успомніў машыну, пагранічніка побач з ёй і зразумеў, што быў сведкай гэтай смерці»...

Імя І. Е. Шапавалава ўвекавечана на мемарыяльнай дошцы Цэнтральнага Дома літаратара ў Маскве.

* * *

...Банда дыверсантаў у колькасці пяці чалавек прарвалася з-за кардона ў раёне вёскі Вільча, расказвае былы баец пагранічнага атрада В. І. Якушаў. Яна аказала ўзброенае супраціўленне пагранічнікам.



Будынак Мілевіцкай пагранічнай заставы, 1938 г.

Бой працягваўся каля дзвюх гадзін. Адзін з бандытаў быў паранены, астатнія схаваліся ў лесе. На чацвёртыя суткі банду дагналі ў трох кіламетрах ад вёскі Азяраны і поўнасцю знішчылі. У пошуках банды вызначыліся калгаснікі вёскі Боркі.

На адной з застаў Юркевіцкага сельскага Савета банда вырашыла захапіць пагранічны нарад. Яна нелегальна перайшла дзяржаўную граніцу і каля назіральнай вышкі зрабіла засаду. Да вышкі падышоў нарад. Адзін з пагранічнікаў узняўся на вышку, а другі, яго прозвішча Чыгер,— застаўся на зямлі. Ён быў схоплены бандай і падвергнуты жорсткім катаванням. Ворагі патрабавалі выдаць план аховы ўчастка дзяржаўнай граніцы. Патрыёт трымаўся стойка і не выдаў дзяржаўнай тайны. Камандаванне атрада патрабавала выдаць Чыгера. Яго перадалі нашаму камандаванню мёртвым...

Вялікую дапамогу пагранічнікам аказвалі актывісты, вясковыя камсамольцы, адным з важакоў якіх быў Андрэй Арэшка. Іх нярэдка выклікалі на заставу па трывозе, як сапраўдных вартавых граніцы.

— Бывае, толькі заснеш пасля працоўнага дня,— успамінаў А. М. Арэшка,— стук у акно. Ведаеш — парушэнне граніцы. Хуценька апранаешся — і бягом на заставу. Памятаю адзін выпадак. Трое невядомых перайшлі граніцу. Адзін быў забіты ў перастрэлцы з пагранічнікамі, двое другіх накіраваліся ў напрамку вёскі Поўчын.

Каля Поўчына дыверсантаў дагналі. Зноў завязалася перастрэлка. Паранены пагранічнік, але і адзін з ворагаў замоўк, забіты. Застаўся апошні... Адчуўшы, што планы яго канчаткова парушаны, ён вырашыў прабівацца назад у Польшчу. Пераплыў возера Белічы. Відаць, прыняў яго за Случ, думаў, што ўжо ў Польшчы. Зайшоў у хату вільчанца Сямёна Шчура.

— Дзе я знаходжуся? — спытаў дыверсант па-польску.

Добра, што селянін валодаў мовай. Ён адразу скеміў, хто перад ім, і адказаў — у Польшчы. Прапанаваў распрануцца, абсушыцца. Вораг заспакоіўся, расслабіўся. Шчур тым часам паведаміў аб няпрошаным госці на заставу. Дыверсанта затрымалі. За смеласць і кемлівасць камандаванне пагранічнага атрада ўручыла Сямёну Шчуру імянны сярэбраны гадзіннік, ён быў узнагароджаны Граматай ЦВК.

Не раз аказваў дапамогу пагранічнікам камсамолец Іван Яфімавіч Кулакевіч. Неяк ён пасвіў кароў у хмызняку. Нечакана заўважыў незнаёмага чалавека, які, на дзіва, пачаў пераапранацца раптам у жаночае адзенне. Іван Кулакевіч кінуўся на заставу. «Толькі б паспець»,— непакоіла думка. Пагранічны нарад прыбыў хутка, парушальнік граніцы быў затрыманы...

Аднойчы на заставе прагучаў сігнал трывогі: двое парушальнікаў прабраліся праз граніцу. І нібы пад ваду зніклі: ніякіх слядоў, цішыня і спакой навокал. Дзень і другі... Аказалася, ворагі сапраўды «зніклі пад вадой» — двое сутак ляжалі ў вадзе ў азярыне каля Случы, чакалі, пакуль заціхне трывога, супакояцца

пагранічнікі. Нарэшце, здалося ім, настаў час вылазіць, але далёка не прайшлі, пагранічны нарад быў пільны...

Камсамолец Рыгор Пугачоў пасвіў коней. Нечакана ён заўважыў незнаёмага — відаць па ўсяму, парушальніка граніцы. Спрабаваў затрымаць яго, але той стрэліў, параніў камсамольца. Рыгор паспеў паведаміць пагранічнікам аб тым, што праз граніцу прабраўся вораг. Яго затрымалі. Рыгор Пугачоў лячыўся ў пагранічным шпіталі, пасля выздараўлення яму быў уручаны каштоўны падарунак ад камандавання Беларускай ваеннай акругі.

Аднойчы піянер Браніслаўскай школы Уладзімір Трусаў сустрэў у лесе незнаёмых людзей. Ён паведаміў аб іх на заставу. Парушальнікаў граніцы хутка арыштавалі. Уладзімір Трусаў за смеласць і знаходлівасць быў узнагароджаны пуцёўкай у Артэк.

В. Р. Феранц

* * *

Дворкін М. С., начальнік контрразведкі 18-га пагранічнага атрада, старшы лейтэнант. Нарадзіўся ў 1905 г. Закончыў школу МУС у Маскве. У ліпені 1931 г. праследаваў парушальніка граніцы, які кіраваўся на тэрыторыю Польшчы. Відавочна, гэта быў мясцовы чалавек, які добра ведаў наваколле. Парушальнік завёў пагранічніка, які ўжо насцігаў яго, у гіблае месца, адкуль выбрацца было нельга. М. С. Дворкін загінуў... Пахаваны М. С. Дворкін у двары пагранічнага атрада на вуліцы Фрунзе ў Жыткавічах. На магіле ў 1969 г. ўстаноўлены абеліск.



Магіла М. С. Дворкіна на в. К. Маркса ў Жыткавічах

Курсам калектывізацыі

...Аптымістычным, напоўненым падзеямі на лепшую будучыню быў час пасля трывог і неспакою грамадзянскай вайны, 20-я гады... Збылася спрадвечная мара сялян, яны атрымалі па ленінскаму дэкрэту зямлю. Старанна і шчыра абробленая, яна — свая зямелька! — плаціла небывалай шчодрасцю, палі каласіліся, як ніколі... Многія спрабавалі гаспадарыць па-новаму, і плён іх намаганняў быў відавочным.

Ідэя калектыўнай апрацоўкі зямлі, агульнага вядзення гаспадаркі, сумеснага выканання найбольш цяжкіх работ здаўна жыла ў сялянстве. Без прымусу, націску зверху ў кастрычніку 1922 г. у былым маёнтку памешчыцы Левандоўскай у Буйкавічах была створана першая ў раёне камуна, якую сяляне назвалі «Ленінскі шлях». Узначаліў камуну камуніст І. М. Кісялёў.

У выступленні на VIII з'ездзе ва-

пагранічнікі. Нарэшце, здалося ім, настаў час вылазіць, але далёка не прайшлі, пагранічны нарад быў пільны...

Камсамолец Рыгор Пугачоў пасвіў коней. Нечакана ён заўважыў незнаёмага — відаць па ўсяму, парушальніка граніцы. Спрабаваў затрымаць яго, але той стрэліў, параніў камсамольца. Рыгор паспеў паведаміць пагранічнікам аб тым, што праз граніцу прабраўся вораг. Яго затрымалі. Рыгор Пугачоў лячыўся ў пагранічным шпіталі, пасля выздараўлення яму быў уручаны каштоўны падарунак ад камандавання Беларускай ваеннай акругі.

Аднойчы піянер Браніслаўскай школы Уладзімір Трусаў сустрэў у лесе незнаёмых людзей. Ён паведаміў аб іх на заставу. Парушальнікаў граніцы хутка арыштавалі. Уладзімір Трусаў за смеласць і знаходлівасць быў узнагароджаны пуцёўкай у Артэк.

В. Р. Феранц

* * *

Дворкін М. С., начальнік контрразведкі 18-га пагранічнага атрада, старшы лейтэнант. Нарадзіўся ў 1905 г. Закончыў школу МУС у Маскве. У ліпені 1931 г. праследаваў парушальніка граніцы, які кіраваўся на тэрыторыю Польшчы. Відавочна, гэта быў мясцовы чалавек, які добра ведаў наваколле. Парушальнік завёў пагранічніка, які ўжо насцігаў яго, у гіблае месца, адкуль выбрацца было нельга. М. С. Дворкін загінуў... Пахаваны М. С. Дворкін у двары пагранічнага атрада на вуліцы Фрунзе ў Жыткавічах. На магіле ў 1969 г. ўстаноўлены абеліск.



Магіла М. С. Дворкіна на в. К. Маркса ў Жыткавічах

Курсам калектывізацыі

...Аптымістычным, напоўненым падзеямі на лепшую будучыню быў час пасля трывог і неспакою грамадзянскай вайны, 20-я гады... Збылася спрадвечная мара сялян, яны атрымалі па ленінскаму дэкрэту зямлю. Старанна і шчыра абробленая, яна — свая зямелька! — плаціла небывалай шчодрасцю, палі каласіліся, як ніколі... Многія спрабавалі гаспадарыць па-новаму, і плён іх намаганняў быў відавочным.

Ідэя калектыўнай апрацоўкі зямлі, агульнага вядзення гаспадаркі, сумеснага выканання найбольш цяжкіх работ здаўна жыла ў сялянстве. Без прымусу, націску зверху ў кастрычніку 1922 г. у былым маёнтку памешчыцы Левандоўскай у Буйкавічах была створана першая ў раёне камуна, якую сяляне назвалі «Ленінскі шлях». Узначаліў камуну камуніст І. М. Кісялёў.

У выступленні на VIII з'ездзе ва-

ласнога Савета ён прывёў такія даныя: у гаспадарцы налічваецца 32 рабочых і служачых. На аднаго рабочага даводзіцца 6 дзесяцін ворнай зямлі. Усяго ж яе маецца 196 дзесяцін, 42 галавы буйной рагатай жывёлы, 7 коней і 6 валоў. Сяляне Буйкавіч агульнымі сіламі абраблялі 110 гектараў ворыва, яны мелі 1500 гектараў сенажацяў і выпасаў. У іх было чатыры пары коней, на першым часе — сем кароў, вазы, плугі і іншы інвентар. Вяскоўцы на прыкладзе ўпэўніваліся ў перавазе такога вядзення гаспадаркі, адзін за другім далучаліся да таварыства. Камуна папаўнялася, буйнела. У 1924 г. на палях камуны з'явіўся адзін з першых у раёне трактароў.

Такая ж камуна ў той час была створана ў былым памешчыцкім маёнтку ў Людзяневічах і Сялку. Тут сяляне заўсёды вызначаліся актыўнасцю і баявітасцю. У Дзяржаўным архіве Расійскай федэрацыі ў Маскве ёсць запіс ад 28 ліпеня (11 жніўня) 1917 г.: «Захоп сялянамі маёнтка Людзяневічы ў Жыткавіцкай воласці Мазырскага ўезда зямлі і луга, якія належалі памешчыку» (ДА Расійскай Федэрацыі, ф. 406, с. 116, л. 182).

У сярэдзіне 20-х гадоў на тэрыторыі Рудненскага сельсавета быў створаны першы ў раёне калгас «Савецкая Беларусь». У сакавіку 1928 г. у Ляхавічах шэсць маладых сем'яў аб'ядналіся перад веснавой сяўбой і арганізавалі калектыўную гаспадарку, якую назвалі «Беларускі камунар». У гэты перыяд у многіх вёсках узніклі прасцейшыя забеспячальна-збытавыя калектывы — Вятчынскае малочнае і Людзяневіцкае жывёлагадоўчае таварыствы, Доўгадуброўская масларобчая і Пухавіцкая рыбаводчая арцелі, у вёсках каля Чырвонага возера — яно называлася ў той час яшчэ па-старому Князь-возера — ствараліся меліярацыйныя таварыствы. Усяго на той час у Жыткавіцкім раёне налічвалася 36 кааператыўных арганізацый.

Кааператары дапамагалі сялянам збываць атрыманую прадукцыю, выконваць працаёмкія работы, набываць неабходныя машыны і механізмы, будаваць памяшканні. Яны выраблялі многія неабходныя тавары штодзённага ўжытку для насельніцтва. Сельская гаспадарка на тэрыторыі раёна развівалася з дапамогай дзяржавы, але без націску і насілля.

Заканчваўся 1929 год. Ранейшаму размеранаму жыццю, спрадвечнаму побыту надыходзіў канец, але ніхто аб гэтым не здагадваўся... У вёсцы Бялёў ужо быў арганізаваны калгас «III Інтэрнацыянал», у Белым і Баравой — «Дзень ураджаю», у Пагосце — «Савецкая Беларусь», у Рычове — «Чырвоны рубеж», у Азяранах — «Першае Мая», у Верасніцы — «Пуцілавец» і іншыя калектыўныя гаспадаркі.

Доўгімі асеннімі і зімовымі вечарамі 1929—1930 гг. у вёсках праходзілі шматлюдныя сходы, шумныя і не заўсёды памяркоўныя, мірныя. Партыйныя і савецкія работнікі, актывісты, агітатары растлумачвалі сялянам сутнасць калектыўнай гаспадаркі, пераконвалі ў перавагах новага жыцця, але часта яны не знаходзілі разумення... Задача ўскладнялася яшчэ і тэмпамі, патрабаваннем улад закончыць калектывізацыю як мага хутчэй, і тады замест добраахвотнасці ўступалі ў сілу зусім другія меры — прымусу і насілля. Абагульнялі часта ўсё — хатнюю маёмасць, птушку, агароды... А каб прадаставіць маладым калектыўным гаспадаркам неабходныя памяшканні, інвентар, жывёлу, па камандзе «зверху» найбольш старанныя, а таму больш-менш заможныя сем'і аб'яўляліся кулацкімі, іх высялялі на Усход, у Сібір і ў іншыя далёкія мясціны.

Мяжа па жыцці

Успамінае Р. С. Феранц, ветэран калгаснага руху, ганаровы калгаснік калгаса «XX партз'езд».

У канцы дваццатых гадоў неспакойна і трывожна стала на вёсцы. Амаль штодня прыязджалі ўпаўнаважаныя, агітатары, адно слова не зыходзіла з вуснаў: калектывізацыя... Што гэта такое, якую карысць прынясе селяніну — ніхто не ведаў. Перасуды, здагадкі, гарачыя спрэчкі не сціхалі іншы раз да раніцы... Але было зразумела адно: другога шляху няма, з вясны трэба нешта рабіць — пачынаць новае жыццё...

Шмат намаганняў па з'яднанню сялян прыкладаў камітэт беднаты. Узначальваў камбед спачатку Кірыла Голад, потым Пятро Галячанка,— свае, вясковыя людзі. Галячанка быў першым камуністам на вёсцы, уступіў у партыю яшчэ ў грамадзянскую вайну. На яго глядзелі як на прадстаўніка ўлады з Масквы, аўтарытэт камуніста быў тады надзвычай высокі...

Патрабаваўся рашучы, рызыкоўны крок. Камусьці трэба было першаму падаць заяву... Доўга раіліся мы — Андрэй Маркевіч, Архіп Паўлюк, Аляксандр Кос, Андрэй Тарлецкі. І вырашылі — будзем да канца разам, што будзе, тое і будзе...

Вясной з вёскі выселілі пяць сямей, якіх аб'явілі кулацкімі. Якія яны былі «кулакі», мы ведалі добра: такія ж гарапашнікі, як і ўсе астатнія, толькі, магчыма, крыху больш старанныя і працавітыя... Мы адносіліся да сярэдзіны, толькі да ніжняй яе часткі: ва ўсіх шмат дзяцей, мала зямлі, у кожнага ёсць карова, а ў каго і цялушка і конь. Не асабліва разбагацееш.

У канцы мая 1930 г. выехалі разам засяваць зямлю, пакінутую выселенымі сялянамі. Камітэт беднаты нарэзаў яе адным кавалкам разам з нашымі надзеламі, астатнім, хто яшчэ раздумваў, адвялі зямлю далей, у ваколіцах вёскі. Пасеялі тады бульбу і ячмень. Назаўсёды запомнілася першая баразна, якую я праклаў вясковай раніцай на арцельным полі...

Закончылася пасяўная. Да нас далучыліся Сяргей Прапольскі, Павел Бондар, надзвычай шчырыя працаўнікі Рыгор і Ганна Дзяткоўскія, муж і жонка. Улетку на сенажаць выйшла ўжо 25 арцельцаў. А ўвосень, пасля заканчэння палявых работ, абагульнілі жывёлу, сельгасінвентар, конскую вупраж.

Новае жыццё ладзілася, справа спорылася. Многія ўвачавідкі ўпэўніліся, што працаваць у грамадзе, арцеллю выгадней, лепш — калі да работы ўсе адносяцца сумленна, шчыра. Калгас назвалі «Чырвоная Града». Узначаліў яго пасля года існавання Архіп Паўлюк — непісьменны, але добрасумленны, працавіты чалавек вялікай фізічнай сілы. А было нам тады ўсім — каму 25, каму нямнога больш за 30 гадоў... Былі і нежанатыя, як Андрэй Маркевіч — вылучэнец з сям'і: бацька аднаасобнік, а сын — калгаснік.

Працавалі весела, дружна. Асаблівы размах набывала спаборніцтва. Адна брыгада, каб абысці другую, гатова была працаваць ноч, круглыя суткі. Не лічачыся ні з цяжкасцямі, ні з часам — усё на карысць агульнай справе.

Р. С. Феранц

Такі будавалі далёка ад вёскі, у полі. Там узводзілі таксама кароўнікі і цялятнікі, каб бліжэй быў выпас, не вазіць далёка гной і менш пераганяць жывёлу. Палі ўручную абкопвалі канавамі для сцёку вады.

Шчыравалі старанна, ахвотна, намнога больш, чым на ўласных надзелах да калектывізацыі. Здавалася — цяжкасці нядоўгія, на першым часе, пакуль не станеш цвёрда на ногі. Каб іх хутчэй пераадолець, трэба яшчэ больш напружанасці, самаадданасці ў рабоце. Потым будзе лягчэй... Які прыўзняты настрой панаваў кожны дзень на калгасным полі, упэўненасць у заўтрашнім дні, заўзятасць у працы былі ў арцельцаў! Песні, жарты, напал спаборніцтва, здавалася, не ведалі ніколі стомы... А якой падзеяй стаў першы трактар на палях калгаса, за рулём якога сядзеў наш вясковец Аляксандр Галячанка.

Поспехі па тым часе былі немалыя і ў раслінаводстве, і ў жывёлагадоўлі. У 1941 г. гаспадарка была вылучана ўдзельніцай ВДНГ СССР. Увосень лепшыя калгаснікі збіраліся ехаць у Маскву, але не давялося... Пачалася вайна, калгаснікаў чакалі новыя выпрабаванні.

Успамінае Г. Ц. Макарэвіч, ветэран вайны і працы

...Вялікі Відошын, Малы Відошын, Паломісты Лес, Сцяпанаў Чарцеж, Грэчышча, Воўчая Галава, Дзям'янава, Прышчыкаў, Дзянісаў, Цімахоў, Хільманаў, Дзярэнча — магчыма, не поўны пералік хутароў, што туліліся ў лясах, на палях на месцы сучаснай вёскі Відошын. Калі ствараліся калгасы, напэўна, найбольш вялікай праблемай было — дзе размясціцца калгасу, яго абагульненай маёмасці, куды паставіць жывёлу. Таму патрэбна было некага аб'явіць кулаком, пазбавіць уласнасці і выслаць далёка за межы рэспублікі, каб перадаць яе калектыўнай гаспадарцы. А разам з гэтым запалохаць тых, хто пакуль не спяшаўся запісвацца ў члены калгаса... Такімі першымі «кулакамі» сталі ў хутары Смальчукоў Іван Агіевіч, у Плоскіх — Рыгор Агіевіч, у Купішчах — Васіль Юхневіч, Адам Аліфяровіч, у Воўчай Галаве — Міна Купрацэвіч, у Хрэпялёскім — Сцяпан Юхневіч і Максім Макарэвіч.

Што ж гэта былі за кулакі? Усе яны перш за ўсё былі мнагадзетныя. І, як правіла, усе члены вялікай сям'і былі працаздольныя, таму што бацькі не аддзялялі жанатых сыноў ад сябе. У такой вялікай сям'і бацька быў як брыгадзір, і яго слова было законам для іншых.

Рэпрэсіраваныя сем'і ў кароткі тэрмін былі высланы ў Котлас і на Салаўкі, а іх маёмасць перайшла ў калгас імя Варашылава, які стварылі на хутары Пласток. Але відошынцы праз год звярнуліся да кіраўніцтва Ляхавіцкага сельскага Савета з просьбай арганізаваць свой асобны калгас. Старшынёй Ляхавіцкага сельсавета ў той час быў Фёдар Міхайлавіч Купрацэвіч, а яго намеснікам — Піліп Пятровіч Аліфяровіч. Партыйную ячэйку Савета ўзначальваў Васіль Андрэевіч Чарнагалоў. Настаўнічаў у Ляхавіцкай пачатковай школе камсамолец Уладзімір Іванавіч Агіевіч, будучы вучоны, крытык і літаратуразнаўца.

Пасля агульнага сходу насельніцтва, што жыло на хутарах вакол Відошына, было прынята рашэнне стварыць новы калгас. Сход адбыўся напярэдадні святкавання 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, і калгас атрымаў назву «Чырвоны Кастрычнік». Старшынёй калгаса абралі М. Р. Макарэвіча, а рахункаводам — І. М. Макарэвіча. Брыгадзірам паляводчай брыгады стаў М. І. Купрацэвіч, загадчыкам калгаснай фермы — В. Ц. Макарэвіч, брыгадзірам рыбалавецкай брыга-

ды — Ц. К. Макарэвіч. Лепшыя калгаснікі — Мікалай Агіевіч, Мікалай Купрацэвіч, Сямён Купрацэвіч, Васіль Макарэвіч, Мікалай Макарэвіч, удава Марыя Макарэвіч.

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» набіраў сілу. З яго палеткаў збіралі 180-пудовыя ўраджаі азімага жыта, добра радзіла бульба. Раслі аб'ёмы жывёлагадоўчай прадукцыі. Прыбытак давалі лён і каноплі.

У 1937 г. выйшла пастанова ўрада аб сцягванні хутароў у калгасныя вёскі. Так у 1938 г. з'явіліся новыя вёскі Марохарава, Дуброва, Пласток, Відошын, Сяменча, Навуць, якія сталі цэнтрамі калгасаў — імя Леніна, «Новае жыццё», імя Варашылава, «Чырвоны Кастрычнік», «Камсамолец», «Чырвоная Навуць».

Каб надаць справе больш сур'ёзны характар, падрыхтавалі спіс новай групы сялян на высяленне. У 1938 г. былі рэпрэсіраваны Адам Аліфяровіч, Карп Агіевіч, Мікалай Агіевіч, Платон Ляшкевіч, Міхаіл Ляшкевіч, Канстанцін Максімчык, Гаўрыла Саноцкі, Канстанцін Бародзіч, Андрэй Давідовіч, Карл Арлоўскі, Юзік Традчык, Дарафей Клепусевіч, Станіслаў Камінскі, Баляслаў Карчэўскі, Ігнат Дудзіч, Дарафей Макарэвіч і многія іншыя.

Заканчвалася сцягванне хутароў у калгасныя вёскі. Мацнеў калгас «Чырвоны Кастрычнік», гаспадарка ўдзельнічала ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве, за высокія паказчыкі была ўзнагароджана двума веласіпедамі. Першай удзельніцай выстаўкі стала перадавая даярка Ганна Мікалаеўна Макарэвіч.

У раённай газеце «Прымежны камунар» ад 15 сакавіка 1931 г. пісалася, што ў калгасе 27 коней, 20 галоў маладняку жывёлы. Пад веснавую сяўбу вывезена на палі 225 пудоў угнаенняў. Для пасеву абагулілі 226 пудоў насення, што склала 75 працэнтаў плана...

Успамінае ветэран калгаснага руху, ганаровы калгаснік калгаса імя Леніна А. М. Купрацэвіч

1928 год. Снежань. Напярэдадні новы год, але не аб ім размовы па вечарах на хутарах, што ва ўрочышчы Сяменча. Падоўгу палае на прыпечку смольная лучына. І размовы пры святле яе ідуць пра тое, што мясцовыя камсамольцы рашылі аб'яднацца ў арцель.

— Глядзі ты іх,— гаворыць убелены сівізною дзед,— па-новаму рашылі жыць...

— Кажуць, што ў арцель тую сваю жывёлу трэба весці. Нізашто,— катэгарычна заяўляе бабуля.

А камсамольцы сапраўды настойліва гаварылі пра тое, каб беднякі аб'ядноўваліся ў арцель. Маўляў, лягчэй будзе жыць. Не ўсе гэтаму верылі. Абзавяліся сваёй зямлёй, сваёй жывёлай — толькі і жыць цяпер. Усё гэта дала ім савецкая ўлада. А зараз аддавай зямлю, жывёлу...

Яшчэ больш было спрэчак, калі ў апошнія дні снежня калгас быў арганізаваны. Імя яму далі — «Камсамолец». Арганізатарамі яго былі камсамольцы Селівестр Цімашчэня, Максім Акунец, Пётр Савасценя. А ўступіла ў калгас дзесяць сем'яў.

Першыя калгаснікі прывялі на арцельны двор сваю жывёлу. Андрэй Антонавіч Мусік — двух валоў, Пётр Рыгоравіч Акунец — каня, Адам Васільевіч Макарэвіч — вала. Іншыя прывезлі сані і калёсы.

Першую сяўбу калгаснікі правялі ў 1929 г. Пасеялі азімае жыта на плошчы 25 гектараў. У гэтым жа годзе ў калгас улілося яшчэ некалькі сем'яў хутаран. Свае хаты, раскіданыя па хутарах, звезлі ў вёску. Так стварылася вёска Сяменча. У 1933 г. у калгасе была адкрыта школа.

Першым старшынёй, які ўзначаліў калгас «Камсамолец», быў Селівестр Цімашчэня. Затым гэтую пасаду займалі Андрэй Мусік, Майсей

Мацюкевіч, Аляксандр Агіевіч.

У гады Вялікай Айчыннай вайны многія жыхары вёскі Сяменча змагаліся на франтах і ў партызанскіх атрадах. Чатырнаццаць вяскоўцаў аддалі жыццё за радзіму.

Назву «Камсамолец» калгас насіў да 1960 г., затым ён быў рэарганізаваны ў аддзяленне саўгаса «Жыткавічы».

Успамінае С. Р. Карась, ветэран вайны і працы, ганаровы калгаснік калгаса «Савецкая Беларусь»

У нашым Азяранскім калгасе сем вёсак, адзін калгас — «Савецкая Беларусь». Калісь гэты калгас быў у адным Пагосце, а першая калектыўная гаспадарка ў сельсавеце арганізавана ў 1929 г. у Азяранах, называлася яна калгас «Нацыянальны», таму што ў ёй працавалі мясцовыя яўрэі. Памятаю, адзін яўрэй баранаваў поле, седзячы вярхом на кані. Але хутка азяранскі калгас распаўся, у пачатку масавай калектывізацыі калектыўныя гаспадаркі былі створаны ў кожнай з сямі вёсак. У Пагосце арцель арганізавана ў 1931 г. Першым старшынёй быў Ігнат Саскевіч. Мужыкі ў калгас уступалі неахвотна, толькі праз год пачаўся масавы запіс — хто ўступаў пасля пакутлівага разважання, хто пад прымусам высокіх налогаў на аднаасобнікаў. Часта мяняліся старшыні. Адзін з іх, Сцяпан Карась, памёр у мазырскай бальніцы. Пасля яго быў Лазарчук Васіль Якаўлевіч, затым Андрэй Кузьміч. Калгас быў бедны. Здаралася, не хапала бульбы разлічыцца з калгаснікамі, замест яе выдавалі буракі. Коні дохлі з голаду зімою.

У 1933 г. старшынёй быў выбраны жыхар Турава Марцін Міхейшын, 1908 г. нараджэння, камуніст. Вось ён і паставіў калгас на ногі. Арганізаваў рыбалавецкую брыгаду, рыбу прадавалі ў Жыткавічах і мелі сякую-такую капейку. На выручаныя грошы куплялі коней, збрую, плугі, бароны. Была ў калгасе конеферма. Коні гладкія, чыстыя, з добрай збруяй. Іншы раз Міхейшын забярэцца раніцой на сенавал у канюшні, пакуль нікога яшчэ няма, і цікуе, хто як корміць коней, даглядае іх. Калі заўважыць нядбайнасць, прагоніць з пасады ездавога. Сам станавіўся за плуг, каб паказваць, як трэба араць. Цаніў добрых работнікаў. Вытрабаваў з турмы брыгадзіра цяслярнай брыгады Якава Торчыка, якога пасадзілі за тое, што адмовіўся плаціць занадта высокі налог, а таксама механіка Сінкевіча — на таку загінуў калгаснік, які ў абедзенны перапынак у адсутнасць механіка рэзаў сабе сечку і трапіў у прывад. Міхейшын быў старшынёй да 1937 г., затым працаваў у Тураве. У вайну быў пакінуты для падпольнай работы ў Тураве, схоплены фашыстамі і расстраляны.

Перад вайной ў калгасе было больш двухсот коней — 30 пар цяглавых, якімі вывозілі лес на лесанарыхтоўцы, і па 20 пар у кожнай з трох брыгад. Ворыва было 300 га, сенажаці — 560 га. На жніво, ворыва, сенакос выходзіла з кожнай брыгады па 150 душ. От было людзей у калгасе!.. Удзень жанчыны сажнуць жыта, ездавыя да вечара звязуць снапы і за ноч узаруць поле. Застанецца толькі лапінка пожні з трактарам МТС на ёй, якому прыдзецца вяртацца ў Тураў з-за непатрэбнасці. Гною ўносілі шмат, так хлявы падчысцяць, што адна чорная зямля застанецца. І ўраджаі былі неблагія, калі 18, калі 25 цэнтнераў зерня з гектара, проса — да 45, бульба радзіла 120—270 цэнтнераў, а ў першай брыгадзе адзін год было 300. Адзін працадзень налічвалі за 40 сотак ворыва, 75 забаранаваных, 33 скошаных сотак. Жанчыны выпрацоўвалі за год па 200 працадзён, ездавыя — па 250. Больш налічвалі



І. К. Рак («Новае жыццё», Тураў)

М. А. Дарошка («Пуцілавец», Верасніца)

К. А. Купрацэвіч (13-ы Кастрычнік, Дварэц)



К. Е. Балбуцкі («Перамога», Запясочча)



А. І. Паўлюк («Чырвоная Града»)



В. Ф. Рымашэўскі

тым, хто быў у штаце — конюху 30 працадзён у месяц, брыгадзіру — 37,5, старшыні — 50. На працадзень атрымлівалі зерня не менеі 2,5 кг, бульбы — ад 6 да 11 кг. Давалі і проса, і буракі, і капусту, і гуркі, і моркву. Навязуць восенню ў іншы ўраджайны год — поўныя двары, нямa куды дзяваць... Бульбу сваю калгаснікі вазілі на лодках-дубах па Прыпяці ў Мазыр прадаваць. На грошы сяляне былі небагатыя, багата іх ішло на Дзяржаўны заём.

У 1939 г. калгас «Савецкая Беларусь» быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве, атрымаў прэмію — грузавы аўтамабіль. Брыгадзіры Аляксей Саскевіч, Сямён Карась і Пётр Мурашка ўзнагароджаны сярэбранымі медалямі і прэміяй па 500 руб., старшыня калгаса Панцялей Тарасюк, будучы праслаўлены партызанскі камісар,— малым залатым медалём і прэміяй 2000 руб., а звеннявая па ільну — Ульяна Бабарыка — вялікім залатым медалём і прэміяй 3000 руб.

З 1939 г. старшынёй калгаса быў Мікіта Казак, чалавек гаспадарлівы, справядлівы. Жыццё стала — толькі жыць і жыць. Але ў ноч з 23-га на 24-е чэрвеня 1941 г. вёску бамбіў ужо нямецкі самалёт...

Да канца 1930 г. у Жыткавіцкім раёне налічвалася звыш 40 калектыўных гаспадарак. Прыкладна столькі ж было і ў Тураўскім раёне. Быў сабраны першы ўраджай, многія з тых, хто сумняваўся, змог ўвачавідкі пераканацца ў перавазе ці ў загане новага вядзення гаспадаркі. Толькі іншага шляху не было...

У пачатку 30-х гадоў калектывізацыя разгарнулася з новай сілай. На VI з'ездзе саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Жыткавіцкага раёна, які адкрыўся 26 лютага 1931 г. у памяшканні клуба чыгуначнікаў, адзначалася, што 33 працэнты гаспадарак ступілі на шлях калектывізацыі. На з'ездзе была пастаўлена задача ахапіць калектывізацыяй у 1931 г. не менш 50 працэнтаў сялянскіх сем'яў,

усебакова падрыхтавацца да вясенняй пасяўной кампаніі, правесці яе з бальшавіцкімі тэмпамі, хутка, якасна, па-ўдарнаму.

Рэзалюцыя з'езда была выканана. На 30 жніўня 1931 г. у дзесяці сельскіх саветах Жыткавіцкага раёна калектывізацыяй было ахоплена 55 працэнтаў сялянскіх гаспадарак, восенню налічвалася 52 калгасы. А ў 1933 г. аб'яднана было ўжо 98 працэнтаў усіх сямей у Жыткавіцкім і Тураўскім раёнах. Праз Случ глядзелі на новае, часта незразумелае жыццё сяляне Ленінскай гміны, якія знаходзіліся пад прыгнётам панскай Польшчы...

Многія калектыўныя гаспадаркі з пачатку арганізацыі дабіваліся дзякуючы самаадданай напружанай працы, без адпачынку і выхадных, значных поспехаў. У калгасы верылі, аддавалі ім усе свае сілы... У калгасе вёсак Белае і Баравая «Дзень ураджаю» з 40 сем'яў за 1930 год было атрымана 21 015 рублёў прыбытку. Сярэдні заробак кожнага члена калгаса склаў за год 240 рублёў. Многія калгаснікі вучыліся на розных курсах, імкнуліся працаваць па новых, перадавых метадах.

Высокія ўраджаі зерневых і іншых культур атрымлівалі штогод у азяранскім калгасе «Першае мая». Прыклад арцельцаў вымусіў уступіць у калгас самых няверуючых аднаасобнікаў. «Першае мая» разам з іншымі калгасамі раёна быў неад-



Е. К. Пятрычыц,



М. А. Мацюкевіч,

наразовым удзельнікам ВДНГ у Маскве.

Акрамя дадзеных архіўнага дакумента, у Жыткавіцкім раёне ў пачатку 30-х гадоў былі таксама арганізаваны калгасы: «Новае Палессе» (х. Парасля), «Чырвоны партызан» (Падлубенне), імя Тэльмана (нямецкая калонія на Харлінскіх хутарах), «Максім Горкі» (Хісцецкі бор), «Беларускі Камунар» (Ляхавічы), «2-я пяцігодка» (Вятчын), «Прагрэс» (Вятчынская Рудня), 17-ы партз'езд (Людзяневічы), імя Куйбышава (Вязаў лес), «Камінтэрн» (Грэбень), 2-я пяцігодка (Боркі), «Авангард» (Дзякавічы), «Палескі партызан» (Буда), «Чырвонае Лутоўе», «Новае Палессе» (Хвойка), «Першае Мая» (Юркевічы), «Чырвоны ўдарнік» (Сукачы), імя Кірава (Залюцічы), імя Калініна (Мілевічы), імя Чарвякова (Гулевічы).

ЗВЕСТКІ
АБ ХОДЗЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПА ЖЫТКАВІЦКАМУ РАЁНУ Ў РАЗРЭЗЕ КАЛГАСАЎ ПА СТАНУ НА 1 ЛЮТАГА 1931 г.

№№	Назва калгасаў	Лік гаспадарак	З іх сямей			
			батракоў	беднякоў	серадняко ў	зажыточных
	Жыткавіцкі п/с					
1.	VI з'езд Саветаў	10	—	—	10	
2.	Озет (вул. Леніна)	29	3	12	14	
3.	Бальшавік (вул. Камуністычная)	17	—	2	15	
4.	Пралетарый (вул. Кастрычніцкая)	18	—	7	9	1

	Жыткавіцкі с/с					
5.	Надубава-Чарацянка	42	—	7	35	
6.	Чырвоны Кастрычнік (Востранка)	15	—	8	7	
7.	1-е жніўня (Жнівеньскія хутары)	7	—	4	2	1
8.	Ім. Будзённага (Кажановічы)	17	—	1	16	
9.	Чырвоная Навуць	29	1	8	20	
10.	ОГПУ (Палянка)	14	—	9	5	
11.	«Чырвоная Подаўж»	14	—	1	13	
	Рудненскі с/с					
12.	Савецкая Беларусь (Рудня)	25	—	8	17	
13.	Чырвоны маяк (Найда)	15	1	1	13	
14.	Ленінская Беларусь (Буйкавічы)	25	8	2	1	1
15.	Заветы Леніна (Кольна)	10	—	3	7	
16.	Камінтэрн (Грэбень)	13	—	2	11	
17.	Чырвоная ніва (Найда)	27	—	14	10	
18.	Астражанка (Востранка)	12	—	3	9	
	Пухавіцкі с/с					
19.	Чырвоная ніва (Замошша)	11	1	5	4	1
20.	Новае жыццё (Дуброва)	20	—	6	12	2
21.	Ленін (Марохарава)	23	6	6	11	
22.	Чырвоны Кастрычнік (Відошын)	22	2	4	14	2
23.	13-ы Кастрычнік (хутары Марохарава)	12	—	1	9	2
24.	Варашылаў (Пласток)	17	—	3	11	3
25.	Чырвоны Бераг (Пухавічы)	16	1	5	10	
26.	Сталін (Пухавічы)	48	—	19	27	2
27.	Камсамолец (Сяменча)	18	1	8	7	2
28.	Фрунзе (Ляхавічы)	23	1	11	11	
29.	Беларускі камунар (Ляхавічы)	26	5	7	13	1
	Бялёўскі с/с					
30.	III Інтэрнацыянал (Бялёў)	60	5	31	24	
31.	Чырвоная Яміца (х. Яміца)	12	2	5	5	
32.	Зорка	12	1	5	6	
33.	Чырвоны змагар	5	—	2	3	
	Людзяневіцкі с/с					
34.	Чырвонае Сялко	12	—	4	8	
35.	Новае жыццё	32	—	23	9	
36.	Чырвоная Бярэзіна	20	4	9	7	
37.	Камуна «1-е Мая»	12	2	9	1	
38.	Чырвоная Дзедаўка	12	2	4	6	
39.	Палескі гігант (Доўгая Дуброва)	24	1	10	13	
40.	Калініна (Калінаўка)	20	1	14	3	2
41.	Молатава (Сялко)	47	—	10	2	1
	Браніслаўскі с/с					
42.	Прамень камуны (Браніслаў)	44	7	19	17	1
43.	Чырвоная Града	6			6	
44.	Доўгае	14	—	7	7	
45.	Зорка	10	—	3	7	
46.	Чырвоны памежнік (Вільча)	40	7	9	24	
47.	Дзяржынскі (Лагвошчы)	14	1	6	5	2
	Юркевіцкі с/с					
48.	Сукачы	8	—	1	6	1
49.	Перамога (Юркевічы)	7	2	2	3	
50.	Дзень ураджаю (Белае)	25	—	10	14	1
51.	Нова-Ленін	15	—	3	12	

ФДА ў г. Мазыры, ф. 52, воп. 1, с. 430, л. 9.

Калгасы, арганізаваныя з пачаткам калектывізацыі ў Тураўскім раёне

«Пуцілавец» (Верасніца). Старшыня — М. А. Дарошка.

«Чырвоны дазор» (Малешаў).

«VI з'езд Саветаў» (Любавічы).

«Перамога» (Запясочча). Старшыня — К. Е. Балбуцкі.

«Новае жыццё» (Тураў). Старшыня — І. К. Рак.

«Чырвоная Тураўшчына» (Буразь).

«Зорка» (Вароніна).

«Бальшавік Палесся» (Поўчын).

«13-ы Кастрычнік» (Дварэц). Старшыня — Д. Р. Сырамаха, пра якога ў 1936 г. Кандрат Крапіва напісаў нарыс «Дзяніс Сырамаха».

Імя Варашылава (Хачэнь).

«Чырвоны рубеж» (Рычоў).

«III рашаючы» (Рыдча).

«Прагрэс» (Беражцы).

«Новы шлях» (Хільчыцы).

Імя Калініна (Старажоўцы). Старшыня — І. М. Бабарыка.

«Праўда» (Сямурадцы). Старшыня — М. М. Гром.

«Кастрычніцкая перамога» (Хваенск). Старшыня — А. К. Ільеня.

«Дзень ураджаю» (Бечы).

«Чырвоны сцяг» (Буда).

«Чырвоны Кастрычнік» (Перапоў і Перапоўскі Млынок). Старшыня — Ц. Я. Саўчын.

«Ленінскі шлях» (Хлупін). Старшыня — Т. Я. Чыжык.

«Новы шлях» (Хільчыцы).

«Першае мая» (Азяраны).

«Савецкая Беларусь» (Пагост).

Для падрыхтоўкі кіруючых кадраў маладых калектыўных гаспадарак у Жыткавічах у 1931 г. адкрыліся раённыя калгасныя школы. На курсах навучаліся рахункаводы, бухгалтары, загадчыкі жывёлагадоўчых ферм. Праходзілі спецыяльныя курсы старшыні калгасаў. У райвыканкоме быў утвораны раённы зямельны аддзел (райза). У яго штаце — спецыялісты сельскай гаспадаркі, аграномы, ветэрынары, заатэхнікі, бухгалтары.

Да 1931 г. адносіцца ўтварэнне машынна-трактарных станцый у Жыткавічах і ў Тураве. У Жыткавічах МТС узначаліў А. М. Міхалюк. Затым на гэтай пасадзе былі М. П. Уласевіч, У. І. Борталь, С. І. Грыщук, у пасляваенны час — Я. Х. Цярушкін, С. І. Грыщук, С. П. Галаў. Для ўмацавання калгасаў пры іх адкрыты палітаддзелы, якія дзейнічалі на правах райкомаў партыі, мелі друкаваныя органы. Начальнік палітаддзела пры Жыткавіцкай МТС М. Р. Гарбуноў праводзіў вялікую арганізацыйную работу. Выпускалася газета «За бальшавіцкія калгасы». Старшынёй створанага ў 1931 г. райкалгассаюза быў прызначаны 25-тысячнік Фінкельштэйн.

У Жыткавічах у сярэдзіне 30-х гадоў працаваў радыёвузел магутнасцю 50 ват. Былі радыёфіцыраваны вёскі Рудня і Людзяневічы. У раёне налічвалася каля 800 радыёкропак. Перад вайной радыёфіцыравана ўжо каля 30 населеных пунктаў, радыёкропак павялічылася да 3,5 тысяч. Свае радыёвузлы працавалі ў некаторых найбольш багатых калгасах.

Пры Жыткавіцкай МТС былі адкрыты курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў і вадзіцеляў аўтамабіляў. Кіравалі імі Р. Л. Пугачоў і Р. П. Каўнацкі. У 1933 г. адбыўся першы выпуск, пасведчанні трактарыстаў і шафёраў атрымалі А. К. Агіевіч, А. І. Макарэвіч, С. М. Глушчэня, І. В. Паляшчук, М. Д. Бандзюк, К. Ф. Дземідзюк, Д. А. Бандзюк І. М. Клеўжыц, Ф. М. Макарэвіч, С. М. Крутаў, К. Ф. Швораб, Ф. З. Савасценя, М. І. Воўк, А. Л. Гамолка, К. Л. Аношка, І. І. Страха, М. З. Папок, Е. Ачапоўскі, І. Д. Купрацэвіч, І. Друк.

Праз некаторы час на курсы была набрана група дзяўчат. Выдатна спраўляліся з новай работай, якая да гэтага часу лічылася прывілеяй мужчын, Кацярына Жогаль, Вольга Ачапоўская, Вера Забродская, Ганна Крукоўская, Маруся Марчанка і іншыя, большасць з іх — камсамолкі.

Многія калгасы з самага пачатку дзейнасці дзякуючы стараннасці і працавітасці ўсіх членаў дабіваліся значных поспехаў у атрыманні высокіх ураджаяў сельскагаспадарчых культур. У калгасе «Дзень ураджаю» у Белым і Баравой першапачаткова налічвалася 40 сем'яў. У першы ж год свайго існавання сельгасарцель атрымала звыш 2 тыс. руб. прыбытку, сярэдні заробак кожнага калгасніка склаў 240 руб., на працадні атрымана збожжа, бульба, караняплоды. Сем калгаснікаў закончылі курсы, набылі спецыяльнасці. Да 1935 г. практычна ўсе аднаасобныя гаспадаркі на тэрыторыі калгаса былі калектывізаваны.

Вялікіх поспехаў дабіваліся земляробы калгаса «Першае Мая» у Азяранах. Высокія ўраджаі, багаты працадзень, дружная работа на калгасных палетках былі яскравым прыкладам перавагі калектыўнага вядзення гаспадаркі і 35 апошніх сямей, якія вагаліся, вялі аднаасобнае жыццё, уступілі ў калгас. За значныя поспехі ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі калгас «Першае Мая» на працягу 1939—1940 гг. быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве.

Важнай падзеяй у жыцці калгаснікаў з'явілася рашэнне ўрада Беларусі ў 1937 г. аб ліквідацыі хутароў і будаўніцтве сучасных добраўпарадкаваных вёсак. У 1938 г. у асноўным было закончана ссяленне шматлікіх хутароў, дзе людзі жылі на сваіх надзелах паасобку. Калгаснікам была аказана дапамога пры будаўніцтве, выдзяляліся будаўнічыя матэрыялы, цэгла, драўніна, а таксама грашовы крэдыт на тэрмін 10 гадоў.

Узніклі новыя вёскі — Града, Марохарава, Відошын, Хвойка, Вязаў лес, Сяменча, Дуброва, Навуць, Хісцецкі бор, Пласток, Вятчынская Рудня і іншыя.

Але пры знешніх здабытках і поспехах сялянства па-ранейшаму заставалася ў галечы і беднасці, поўным бяспраўі. Неімаверна высокія падаткі, прымусовая дзяржаўная пазыка, абавязковае страхаванне маёмасці і жывёлы, бяспашпартная сістэма ў вёсцы, праца за часта нішто не вартыя працадні, здача ўсёй вырашчанай прадукцыі за бясцэнак дзяржаве зводзілі ні на што плён работы калгаснікаў, ставілі іх у поўную залежнасць ад дзяржавы. А тыя, хто меў аўтарытэт і ўплыў, былі даўно ліквідаваны «як клас» праз абкладанне цвёрдым падаткам, высылку, суд, расстрэл...

В. Р. Феранц

Старшыня камуны

Кісялёў Іван Міхайлавіч (н. у 1888 г.) — актыўны арганізатар калектывізацыі, кіраўнік першай камуны «Ленінскі шлях» у Буйкавічах. Быў рэпрэсіраваны, рэабілітаваны. На працягу амаль паўстагоддзя — на розных адміністрацыйных пасадах у гаспадарках раёна.

Памёр у 1970 г.

Першая сусветная вайна выгнала сям'ю Кісялёвых з роднага Палесся



І. М. Кісялёў

ажно за Волгу. Там перажылі і ліхалецце грамадзянскай, вярнуліся назад — шляху за Случ няма. Дзяржаўная мяжа... Так па волі лёсу спыніліся ў Буйкавічах. Пачыналася новае, мірнае савецкае жыццё. У былым памешчыцкім маёнтку «Белая Лужа» ў 1922 г. сяляне вырашылі стварыць камуну. Іван Кісялёў у вяскоўцаў лічыўся даволі адукаваным, галоўнае — вопытным чалавекам, які аб'ездзіў свет, многа бачыў. Яму прапанавалі ўзначаліць камуну. Назвалі яе «Ленінскі шлях».

7 кароў, 4 кані, 3 вазы, 2 плугі, 110 гектараў ворыва ды 500 сенажаці — уся камуна. Галоўнае — жылі дружна, з светлай верай у лепшае будучае, і гэта загладжвала нялёгкія працоўныя будні. Праз год у камуне налічвалася 30 гаспадарак, набылі трактар. Абагульнена было ўсё — жывёла, нават хатняя птушка, інвентар, прадметы хатняга ўжытку. Свае дзіцячыя яслі, сталоўка — для сваіх дарма, для жыхароў іншых вёсак за грошы.

Прайшло некалькі гадоў. Норм выпрацоўкі не існавала, працавалі на сумленне. А яно, як вядома, у кожнага чалавека рознае. Хто больш шчыруе, хто лайдачыць — аддзяка адна. Старшыня камуны ўсё больш задумваўся — несправядлівасць такой арганізацыі працы відавочная. І ў 1929 г. на агульным сходзе было вырашана распусціць камуну...

Час быў ужо не той, Івана Кісялёва за падрыў дзяржаўнай справы арыштавалі. Выключылі з партыі, аддалі пад суд. Мера пакарання — прымусовыя работы на карысць дзяржавы. Але кола рэпрэсіі рабіла толькі першыя абароты, Іван Міхайлавіч адбываў пакаранне ў сваёй вёсцы Кольна, ва ўрочышчы Казённы лог, вазіў сіламі ўсёй сям'і лес.

У раёне пачыналася шырокая калектывізацыя. Патрабаваліся людзі з вопытам і ведамі Кісялёва. Абвінавачванне яго траціла сілу — калгасы ствараліся на другой аснове. Івана Міхайлавіча апраўдалі, узнавілі ў партыі, накіравалі на работу старшынёй калгаса «Надубава-Чарацянка», непадалёку ад Жыткавіч.

Калгас лічыўся адным з лепшых у раёне. Калгаснікі тут надзвычай старанна шчыравалі, таму мелі сякія-такія прыбыткі. Не раз пра «Надубава-Чарацянку» пісалі ў цэнтральнай прэсе. Аднойчы прыслалі ў вёску нарачнага — Івана Міхайлавіча тэрмінова выклікаюць у Мазыр. Гэта магло ў той час азначаць адно — арышт... Прыйшла, значыць, чарга. Старшыня калгаса сабраў рэчы для турмы, развітаўся з жонкай і дзецьмі, паехаў... Але, на шчасце, памыліўся. У абласным цэнтры падзякавалі за старанную работу, уручылі каштоўны падарунак — патэфон.

У армію з пачаткам вайны Івана Міхайлавіча не прызвалі па ўзросту. Пагнаў на ўсход калгасную жывёлу, там, у стэпах Сталінградскай вобласці, працаваў у сельскай гаспадарцы. А вясной 1944 г. вярнуўся, сустрэў сям'ю, якую не бачыў тры доўгія гады, вельмі сумняваўся — ці жывыя?.. Усе былі ў партызанах. Старэйшы сын Макс — вядомы ў партызанскім атрадзе № 109 як мужны баец.

Іван Міхайлавіч Кісялёў у пасляваенны час працаваў загадчыкам раённай нарыхтоўчай канторы, старшынёй калгасаў «III Інтэрнацыянал» і «Заветы Леніна», дырэктарам Людзяневіцкага цагельнага завода. Да апошніх гадоў жыцця не ведаў спакою, загартаваны ад першай камуны жыццём, нялёгкай сялянскай працай.

В. В. Нікановіч

ЗАПИСЬ В КОЛХОЗ

...Наступило тягостное молчание. Лунгин медленно обводил присутствующих взглядом, и только старик Демьян не опустил своих глаз.

— На меня не гляди, начальник,— заговорил он с легкой усмешкой.— Меня можешь без разглядывания писать. Я, правда, стар, но силы еще есть. Бирюком жить — пожил, довольно...

— Пиши и меня,— подняв голову, обратился к Лунгину Григор Калманович.

— Григор! Со света сживу! В избу не пущу. Да что же это такое? Товарищ начальник...

Параска с неожиданным проворством соскочила с печи и растрепанная, с расстегнутой на груди сорочкой со сбившимся платком, подбежала к столу.

— Это куда ж ты, начальник, народ подбиваешь? Ты сегодня здесь, завтра хвостом накрылся — нет тебя, а куда ты его тянешь с шестерыми-то детьми? Григор! Ты ума тронулся? Куда ты свою дурную голову суешь? Ты был там? Видел? Да как же ты...

Она кричала громко, визгливо, размахивая руками. В эту минуту женщина была страшной. Но Калманович повторил Лунгину:

— Пиши, говорю... А тебя я бы поучил, кабы людей не было.

Пыл Параски сразу остыл. Она как-то осела, стала даже будто меньше ростом. Голос из визгливого превратился в тихий, жалобный.

— Что ж ты делаешь, ирод ты несчастный! Куда ты свою голову суешь? — На глазах женщины показались слезы. Всхлипывая, она пошла шатающейся походкой к полатям.

— Не плачь, тетка Параска, тебе же лучше будет,— объяснял Лунгин.— Ну, а остальные?

Поднялся Кирилл Базун. Он чинно вышел из-за стола, встал против висящей в углу богоматери, перекрестился и торжественно произнес:

— Меня пиши, товарищ начальник!

Лунгин не сдержал улыбки.

— Ты что ж, Кирилл, в колхоз с богом идешь?

— А кто его знает, товарищ начальник, есть ли он бог, нету ли? Коли есть — поможет, молитву мою приняв. Нету — что ж? Оно тоже не повредит. Рука от этого же не отвалится, а на душе спокойней. Написал, что ли?

— Написал.

— Ну, помоги, господи.— И Кирилл еще раз широко перекрестился.

— Антихристовым делом занялся, а у бога помощи просишь,— снова всхлипнула на печи женщина.

— Ты, тетка Параска, про антихриста зря перед сном вспоминаешь. Коли человек жизнь свою правильно поставить хочет, не антихристово это дело, а Христово. И люди верные нас на это дело зовут. В газетах теперь про это печатают, а ты говоришь — антихристово дело!

Он взмахнул шапкой, что-то хотел сказать еще, но раздумал и пошел на прежнее место.

Лед был разбит. Лунгин спокойно взглянул в бесцветные глаза Конопатского.

— Ну, а тебя, Герасим, писать?

— Можно писать.

— Ты подумай хорошо, чтоб не сказал потом — подумать не дали.

— Я всегда спервоначалу подумаю, а потом говорю. Сказал — пиши, значит — пиши. Может и плохо, а хуже не будет в колхозе. Своего хлеба мне до рождества не хватает, а мясо — когда женился, последний раз только и ел...

— А тебя, Степан?

Щур засуетился.

— Мне — только бы не первому... А от людей я никогда не отстану. Ты сам, начальник, мою жизнь ведаешь...— Он заерзал на полатях, зачем-то привстал, потом сел опять и стал сворачивать цигарку.

— Ну, вот,— Лунгин удовлетворенно окинул взглядом присутствующих.— Стало быть, товарищи, начало колхозу мы сегодня положили. Будем РИК просить, чтобы нам землемера выслали...

— В добрый бы час,— вырвалось у Базуна.

— Часы все одинаковые, Кирилл, не бойся.

— Это ты не скажи, товарищ начальник. Час на час не приходится...

— Уж начали, так поскорее бы!

Конопатский запахнул изношенный тулуп, нахлобучил засаленный, без звезды, красноармейский шлем и, попрощавшись, первый вышел из избы. Когда он был еще в сенях, от освещенного окна на улице шарахнулась какая-то фигура, притаилась за углом избы. Конопатский, выйдя в темноту, не заметил ее и широко зашагал к своему хутору...

И. Е. Шаповалов
(Из книги «Большевики границы»)

З 1931 г. выдаюцца раённыя газеты «Прымежны Камунар» у Жыткавіцкім раёне і «Чырвоная Тураўшчына» ў Тураўскім — органы райкомаў партыі і раённых выканкомаў дэпутатаў працоўных. «Чырвоная Тураўшчына» ў 1938 г. выходзіць пад назвай «Ленінскія заветы», а «Прымежны Камунар» з ліпеня 1944 г.— «Ленінскі шлях». У Ленінскім раёне неўзабаве пасля вайны выйшаў першы нумар газеты «Сталінец», якая з ліпеня 1956 г. стала называцца «Ленінскай праўдай». Яе апошні нумар выйшаў 16 студзеня 1960 г.

З красавіка 1962 г. Жыткавіцкая раённая газета стала міжраённай і атрымала назву «Новае Палессе», а праз год ёй вернуты статус раённай.

За актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных раёна, мабілізацыі іх на паспяховае рашэнне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і ў сувязі з 50-годдзем з дня выхаду першага нумара Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 21 лютага 1981 г. жыткавіцкая раённая газета «Новае Палессе» ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Па старонках раённых газет

ПРЫМЕЖНЫ КОМУНАР

Ліквідаваць непісьменнасць сярод дапрызыўнікаў

Чырвонай арміі патрэбны пісьменныя байцы, а ў Ляхавіцкім с/совеце з дапрызыўнікаў 1910 г. з 47 асоб маецца пісьменных толькі 60 %, астатнія яшчэ непісьменныя. Не так даўно ў Ляхавіцкім с/совеце была сазвана нарада дапрызыўнікаў, на якой было пастаўлена пытанне аб ліквідацыі непісьменнасці, да кожнага непісьменнага прымацавалі настаўніка або аднаго пісьменнага, які павінен ліквідаваць яго непісьменнасць.

Савасценя
5 лютага 1932 г.



штодзённы
БЮЛЮТЭНЬ
газэты
„ПРЫМЕЖНЫ КАМУНАР"
№ 5 22 Сакавіка 32 г.

Пралетарыі ўсіх краёў злучайцеся!

УДАРНІК БАЛЬШАВІЦКАГА СЕВУ

Мабілізаваць унутраныя насенныя рэсурсы

ПАСТАНОВА Бюро РК КП(б)Б аб правядзеньні пяцідзёньніка рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі

На падставе пастановы ЦК КП(б)Б аб рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Аб'явіць з 25-га сакавіка па 1-е красавіка ўдарны 5-цідзёньнік распаўсюдж- і страхавых фондаў, як сваіх так і для стварэньня міжкалгаснай і міжраённай сацыялістычнай узаемадапамогі.

3. Яшчэ раз папярэдзіць старшынь калгасаў, с-с. і

Усе сілы, усю энэргію — на барацьбу за насеньне

На данным этапе падрыхтоўкі да сяўбы важнейшым вучасткам рароты зьяўляецца арганізацыя і збор насенных фондаў.

ЦК Усе КП(б) і СНК СССР выразна паказалі, што **„цэнтральнай задачай на вёсцы ў бліжэйшыя тыдні зьяўляецца стварэньне насенных калгасных фондаў"**.

Аднак гэтай важнасьці стварэньню насенфондаў ня прыдалі шэраг с/саветаў, партячэек і калгасаў. Замест таго, каб ўжо скончыць засыпку насенных і страхавых фондаў, дык яшчэ на сёньняшні дзень маецца шэраг калгасаў у якіх насенфонды створаны на 30—40 процантаў. Узяць хаця-бы калгасы „Новае Жыць

З В О Д К А

заемкі насенфондаў на 20/III-32 г. у процантах

Штодзённы бюлетэнь газеты «Прымежны камунар», 1932 г.

Назва сельсавет.	Авёс	ячм.	грэч.	проса	лён	каноплі	бульб.	пшан.
Жыткавіцкі м-с	61,0	59,0	127	233	33,3	22	53,0	—
Жыткавіцкі с-с	70,5	54,0	190	220	49,0	31	84,0	—
Ляхавіцкі .	59,0	85,0	100	250	24,0	18	101	70,0
Юркевіцкі .	85,2	229	112	150	15,0	10	52,0	—
Людзяневіцкі.	87,9	115	119	375	46,0	9	65,0	80,0
Браніслаўскі.	87,7	100	117	176	32,8	16	62,0	110
Рудзянскі .	119	100	100	181	50,0	10	100	150
Білёўскі .	67,0	70,0	72	210	64,0	14	97,0	—
Вятчынскі .	125	87,0	233	550	50,0	—	66,0	—
Разам	71	99,0	116	218	36,5	23	75,5	84

Старшыня калгасу садзейнічае разбазарванню памол-збора

Калгас імя Молатава Браніслаўскага с/совета мае ветраны млын, у які з 11/V-31 г. па 1/I-32 г. паступіла 108 пуд. памольнага збору. Ніводнага фунта з гэтых 108 пуд. не было здадзена дзяржаве, усе яны былі скарыстаны на месніцкія патрэбы па ініцыятыве старшыні калгасу Марчанкі М., які свядома падтрымлівае гэтыя спажывецка-рвацкія настроі. Ён кажа: «Памольны збор у мяне не з'яўляецца лішкамі і я лічу патрэбным задаволіць ім калгаснікаў у першую чаргу», і «задавальняе». Партячэйцы, секцыі РСІ трэба бязлітасна ўдарыць па рвацкіх настроях Марчанкі і падобных яму рвачах.

Н. Корж

5 лютага 1932 г.

Першы сакратар ЦК КП(б)Б т. Гікала ў Жыткавічах

10 сакавіка ў Жыткавічы прыбыў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гікала. Тав. Гікала наведаў МТС, дом соцкультуры, прыняў удзел у паседжанні бюро РК КП(б)Б, дзе выступіў з прамовай па дакладу аб становішчы на свінагадоўчай ферме комуны «Совецкая Беларусь».

15 сакавіка 1932 г.

Выгнаць кулацкага агента Аніськовіча з калгасу

Быўшы старшыня калгасу «Дзяржынскага» Аніськовіч увесь час вёў разлагацельскую работу ў калгасе, за што зняты з працы і судзімы, але застаўся ў калгасе і зараз падрывае працу. Старшынёй калгасу «Дзяржынскі» прысланы з Паўночнага Каўказу калгаснік-ударнік т. Роднеў. Аніськовіч здаваць справы новаму старшыні не хоча і настройвае калгаснікаў супраць Роднева, падрывае яго аўтарытэт... Адначасова Аніськовіч у калгасе што хоча тое і робіць. Нядаўна забіў два калгасных кабаны без ведама праўлення калгаса і ніхто не ведае, дзе дзелася сала і мяса.

Патрэбна зараз жа выгнаць кулацкага агента Аніськовіча з калгасу.

Назірацель

1 красавіка 1932 г.

Ганаровае званне «Буксірная брыгада імя Сталіна» мы апраўдалі

Наша буксірная брыгада імя Сталіна, папрацаваўшы ў калгасе «Чырвоны памежнік» з 24 па 27 мая, заданне перавыканала. Брыгадай за тры дні ўзарана 33,45 га замест 26 га па заданню, забаранавана 26,07 га замест 22 га па заданню. Трэба было вывезці гною 341 воз, вывезен 341. Мы не толькі разгарнулі спаборніцтва ў сваёй брыгадзе, але выклікалі на спаборніцтва брыгады «Чырвонага памежніка»...

Брыгадзір буксірнай брыгады *Ганчароў*

15 красавіка 1932 г.

За такія адносіны да працы да адказнасці

У калгасе «Чырвоная Града» з вясны арганізаваны дзетяслі. Загадчыкам ясляў прызначана т. Васкабойнік. Але за час іх існавання не бачна, што яны ёсць. Дзеці кожны дзень дома, іх даглядаюць мацеры, дзеці, дзе хочуць, там і ходзяць. А хто ў яслях, той кожны дзень галодны. Калі яны просяць хлеба, Васкабойнік адказвае: «Твой бацька яшчэ не зарабіў».

Крапіва
1 жніўня 1932 г.

ЧЫРВОНАЯ ТУРАЎШЧЫНА

Трактары МТС ужо за работай

Калона МТС з трактараў «Інтэрнацыянал» уздымае красную баразну. 10 красавіка ўжо ўзнята 2 гектары цаліны на палях Краменскага калгасу.

Трактарысты з'яўляюцца ўдарнікамі. Заключаны соцдагаворы паміж брыгадамі.

10 красавіка 1932 г.

Пастанова калегіі народнага камісарыяту фінансаў БССР «Аб перадачы перадавому раёну па мабілізацыі сродкаў у 1-м квартале пераходнага сцягу НКФ БССР»

За лепшае і датэрміновае перавыкананне плану мабілізацыі сродкаў (116,9 прац.) за першы квартал 1932 г., за стварэнне фінансавага актыву і разгортванне масавай работы на фінансавым фронце, за бальшавіцкія тэмпы працы ўсіх грамадзянскіх арганізацый раёну, Калегія НКФ БССР пастанаўляе:

1. Пераходны Чырвоны Сцяг НКФ БССР перадаць Тураўскаму раёну...

Народны Камісар Фінансаў БССР
16 красавіка 1932 г.

Вопыт яўрэйскай сямігодкі ў астатнія школы раёну

Піонеры і школьнікі яўрэйскай сямігодкі дабіліся значных поспехаў у выкананні фінплану.

Створанае школьнае агенства ахваціла піянераў і вучняў старэйшых груп ашчадкасай на 100 прац., у малодшых групах на 75 прац. Школьнай касай сабрана ўкладаў каля 500 руб. Падпіска на пазыку складае 600 руб.

Біндзер
8 мая 1932 г.

Дастаўляюць пошту на поле, на ўчастак работ

Рычоўскае паштовае агенства перабудавала сваю работу і наладзіла хуткую дастаўку карэспандэнцый і газет калгаснікам на поле, на вытворчыя участкі.

14 мая ў 2 гадз. дню 5 лістаносцаў былі адпраўлены па кольцам на поле для раздачы калгаснікам газет. Лепшы лістаносец Кулік завярбаваў на полі падпішчыкаў на газету «Чырвоная Тураўшчына» на 5 руб. 30 кап.

Паштовы агент *Гурын*
16 мая 1932 г.

ЯК «ЧАЦВЁРКА» АПАРТУНІСТЫХ ПАДРЫВАЛА БАЯЗДОЛЬНАСЦЬ ЖЫТКАВІЦКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Абследаванне становішча Жыткавіцкай партарганізацыі ў сувязі з заявай «14» таварышаў райпартактыву выявіла, што парткіраўніцтва раёна праводзіць класава-вытрыманую лінію партыі, і што партарганізацыя паспяхова выканала асноўныя гаспадарча-палітычныя

кампаніі, аб чым сведчыць выкананне плану хлебанарыхтовак на 125 працэнтаў (за гэта раён атрымаў прэмію), нарыхтовак бульбы (звыш сустрэчнага плану на 1 тыс. тон) на 80 працэнтаў, план мабілізацыі сродкаў у асобным квартале выкананы на 122 працэнтаў. Ёсць значныя дасягненні ў галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі. На 1/I 1931 года раён калектывізаваны на 35 працэнтаў агульнай колькасці сялянскіх двароў. Слаба праходзяць нарыхтоўкі ільна-валакна (на 1/I 1931 г. план выкананы толькі на 27 працэнтаў), сена і саломы.

За апошні год партарганізацыя выросла на 64 чал., з якіх 26 чал. рабочыя і батракі.

Усё гэта гаворыць аб тым, што Жыткавіцкі РК КП(б)Б і фракцыя РВК з задачамі кіраўніцтва гаспадарча-палітычным жыццём раёна справіліся, і што Жыткавіцкая партарганізацыя здольна выконваць дырэктывы партыі па сацыялістычнаму будаўніцтву.

Але ж, нягледзячы на гэта, у снежні 1930 г. Жыткавіцкі РКК атрымаў заяву ад «14» членаў партыі райпартактыву з патрабаваннем замены партыйнага і савецкага кіраўніцтва раёна, змены сакратара РК КП(б)Б т. Лабанка і старшыні РВК т. Рашала. Матывамі змены былі: «празмернае адміністраванне ў рабоце з боку старшыні РВК т. Рашала, ігнараванне раённых работнікаў і ўстаноў, грубасць і заціск крытыкі з боку сакратара РК т. Лабанка і т. Рашала. Група «14» патрабавала тэрміновага склікання райпартактыву «для прыняцця мер».

Высвятленне сутнасці справы паказала, што кіраўніцтва Жыткавіцкага раёна, у прыватнасці тт. Лабанок і Рашал, праводзяць на справе генеральную лінію партыі, што ў рабоце РК і РВК ёсць шэраг дасягненняў. Устаноўлена і тое, што ў т. Рашала былі выпадкі праяў грубасці, няма дастатковага ўмення разгарнуць ініцыятыву паасобных работнікаў савецкага і кааперацыйнага актыву. З боку т. Лабанка таксама наглядаюцца выпадкі грубасцяў, недастаткова чуткі падыход да вырашэння асабістых пытанняў членаў арганізацыі. Зразумела, што гэта не спрыяла разгортванню крытыкі і таварыскай спайцы райпартактыву.

Арганізатарамі і кіраўнікамі групы «14» былі т. Крылавіцкі, член партыі з 1929 г., служачы, былі нам. старшыні Мазырскага акруговага малочнага саюзу, атрымаўшы суровую вымову з папярэджаннем за нежаданне ехаць у раён, т. Шафран — член партыі з 1927 г., рабочы, былы загадчык Мазырскага акрфа; т. Рубанчык — член партыі з 1925 г., былы інструктар Мазырскага РВК, атрымаўшы суровую вымову за падробку грашовых дакументаў, і т. Ліс, член партыі з 1924 г., рабочы, дырэктар райбанка. Гэтыя таварышы пад кіраўніцтвам Крылавіцкага збіралі нарады «чацвёркі», у яго кабінеце абгаворвалі пытанні «звяржэння» партыйнага і савецкага кіраўніцтва раёна. Калі была складзена заява на імя РКК, у якой патрабавалі тэрміновай змены сакратара РК т. Лабанка і старшыні РВК т. Рашала, яны сталі вербаваць сабе прыхільнікаў. Хадзілі па хатах райпартактыву, ездзілі ў вёскі да сакратароў партячэек, лавілі ад'язджаючых партыйцаў ў цягніках, а тых, хто абяцаў падпісаць заяву і не падпісваў, «чацвёрка» абзывала «палітычнымі прастытуткамі і здраднікамі»... На аб'яднаным паседжанні бюро РК і прэзідыуму РКК пры разборы справы «14» завербаваныя рабочыя (з 10—8 чалавек, што падпісалі заяву) адразу адмовіліся ад подпісаў і да канца выкрылі кіраўнікоў групы.

На пасяджэнні тт. Крылавіцкі, Шафран і іншыя з «чацвёркі» заявілі аб партыйнай вытрыманасці ў праводзімай лініі тт. Лабанка і Рашала і сваю дзейнасць прызналі антыпартыйнай і памылковай. Але гэтага мала. Трэба сказаць, што кіраўнікі групы «14» з'яўляюцца правымі апартуністамі, па-ўпадніцку настроенымі. Яны, арганізуючы групу ўнутры партарганізацыі, свядома падрывалі яе баяздольнасць, перашкаджалі выкананню гаспадарча-палітычных кампаній, гралі на руку класаваму ворагу. «Чацвёрка» гэтага не сказала, яна прызнала свае памылкі толькі па «форме», пакідаючы за сабою «права» зноў пачаць антыпартыйную барацьбу. Гэтыя таварышы нанізвалі розныя дробязі і замест выпраўлення асабістых недахопаў у тт. Лабанка і Рашала шляхам самакрытыкі карысталіся антыпартыйнымі метадамі групаўшчыны, таму што з'яўляліся правымі апартуністамі...

Жыткавіцкая партарганізацыя павінна з факту арганізацыі групы «14» зрабіць адпаведныя палітычныя вывады на аснове рашучай барацьбы з правым апартунізмам як галоўнай небяспекай на даным этапе, «левымі» загібамі і прымірэнцамі. На грунце разгорнутай самакрытыкі партарганізацыя і ў далейшым будзе паспяхова будаваць сацыялізм.

Партыйны работнік, 1931 г., № 3—4

БЛІСКУЧЫЯ ВЫНІКІ ЗДЗЕЛЬШЧЫНЫ

У калгасе «Савецкая Беларусь» у гэтым годзе ўся работа праводзіцца на аснове здзельшчыны. Дзякуючы здзельнай працы і сталых норм выпрацовак тэмпы і зацікаўленасць калгаснікаў працаваць па-ўдарнаму значна ўзраслі. Калі ў мінулым годзе праполка ільну і агародных культур марудна цягнулася, а уборка сенажацей нават і ў жніўні не была скончана, дык у гэтым годзе атрымліваюцца добрыя вынікі.

Брыгада касцоў з 14 чалавек на чале з брыгадзірам Кацюбінскім за адзін дзень 27.VI скасіла 8,8 га сенажаці, а гэта значыць што згодна ўстаноўленай ў калгасе нормы выпрацоўкі (на 1 га патрэбна 3—4 касцы, у залежнасці ад якасці сенажаці) патрэбна было, калі лічыць нават 3 касцы на гектар, паставіць 27 касцоў. Праўленне калгаса, прымаючы пад увагу, што гэта праца адносіцца да цяжкіх (адзін дзень залічваецца 1,25 працадня), запісала ў працоўную кніжку кожнаму касцу па 2,41 працадня.

Таксама брыгада на ўборцы сена ў ліку 16 асоб убрала і склала ў стагі сена з 5 га, а згодна нормы выпрацоўкі патрэбна было паставіць 25 калгаснікаў: палову на цяжкую працу (мятаць стагі), а палову на сяраднюю працу. Брыгада гэта працавала па-ўдарнаму і выканала гэтую працу акуратна. 8 калгаснікам, якія працавалі на цяжкай працы, запісалі па 1,95 працадня, а 8 астатнім — па 1,56 працадня. Такіх прыкладаў можна прывесці больш... Толькі дзякуючы здзельшчыне ідзе масавы прыліў у калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Калгас своечасова скончыў праполку ільну, проса і агародных культур, убраў канюшыну і заканчвае ўборку сенажаці.

Шляхі калектывізацыі, 1931, № 14.

ЯЎРЭІ-БЕДНЯКІ БУДУЮЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

На адлегласцях некалькі дзесяткаў метраў ад чыгункі можна заўважыць новыя, толькі што адбудаваныя будынкі. Гэтыя будынкі належаць яўрэйскай сельскагаспадарчай арцелі «Озет».

Арцель складаецца з 19 сямей і 9 адзіночак яўрэяў, існуе другі год і мае даволі значныя дасягненні. Адбудаваны кароўнік на 240 кароў, канюшня, свіран, каменная сіласная вежа, якая поўнасцю засіласавана, таксама на скотным двары пабудавана цэментная і дубовая студні.

Арцель мае жывёлагадоўчы напрамак. Зараз маецца 62 каровы, 3 бугаі, 5 падцёлкаў і 24 цялёнкі. Акрамя гэтага, у асабовым карыстанні калгаснікаў маецца 15 кароў. Усе лішкі малака здаюцца ў сталоўку спажывецкай кааперацыі. Коней калгас мае 17 штук. Зямля ў ліку 100 га атрымана ад лішэнцаў.

Арцель «Озет» у першы год свайго існавання сабрала пасеў: аўсянага сіласу 1,5 га, гародніны 4 га. Засеяна азімага жыта 13 га, пры гэтым 9 га засеяна радавой сеялкай. У гэту вясну пасеў яравых культур значна пашыраецца.

На першых парах арцель забяспечана інвентаром. Маецца вазоў на жалезным хаду 22, плугоў адналемешных 6, двухлемешны плуг, барон «зігзаг» 7, акучнікаў 3, саламарэзка з конным прывадам, сенакасілка, агародная сеялка і палольнік... Адзін з калгаснікаў, знаёмы з садаводчай справай, бярэцца развесці сад і ягаднік.

Акаляючае сялянства зараз упэўнілася, што і яўрэі-беднякі могуць працаваць на сельскай гаспадарцы. Кулакі толькі гадзінамі сыкаюць на яўрэйскую арцель: «Каб не яўрэі, дык бедняку засталося б больш зямлі»,— гавораць яны.

Але бядняцка-серадняцкія масы сялянства не вераць кулацкай хлусні, адносяцца да яўрэяў-калгаснікаў як да працоўных, якія змагаюцца за новае жыццё.

Снытко Юрка
Шляхі калектывізацыі, 1931, № 8.

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЎБЯРЭМ УРАДЖАЙ

Выкананне плана сяўбы другой бальшавіцкай вясны патрабавала вялікай напружанасці. Раён узяў быў бальшавіцкія тэмпы ў правядзенні гэтай кампаніі і, нягледзячы на спробы кулацкіх элементаў сарваць намечаныя планы сяўбы, закончылася пераможна. План веснавой сяўбы па раёну на 15 чэрвеня быў ужо выкананы 8 тысяч 936,9 га, што складае задання 100,8 працэнта, а па тэхкультурах план выкананы на 152,4 працэнта.

Лепшымі змагарамі за сяўбу з'явіліся калгасы імя Леніна і імя Варашылава, якія першымі да тэрміну скончылі сяўбу і перавыканалі пасяўныя планы. Калгас імя Леніна за лепшую ўдарную работу прэміраваў 8 калгаснікаў-ударнікаў: Майшука Несцера, Юхневіча Мікіту, Цяржно Марыну, Ахрамовіч Ганну і інш.

Раён, скончыўшы паспяхова веснавую сяўбу, зараз жа пераключыўся на правядзенне праполкі і ўборкі ўраджаю. Маючы на ўвазе, што толькі ўкараненне на ўсіх работах здзельшчыны, правільны ўлік працы і сацспаборніцтва забяспечваюць своечасовае і поўнае выкананне ўборачных работ, асветнікі Жыткавіцкага раёна былі мабілізаваны на работу ў калгас з 15 чэрвеня па 1 ліпеня, а асветнікі-камсамольцы — да 10 ліпеня.

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

У калгасах «Надубава Чарацянка», «Пралетары», «Бальшавік», «Кастрычнік», «Савецкая Беларусь» і інш. складзены планы ўборачнай кампаніі, выпісаны працоўныя кніжкі і г. д.

Калгасы на грунце ўнядрэння здзельшчыны прыступілі да ўборкі сенажаці і канюшыны з паловы чэрвеня. Калгас «Надубава Чарацянка» скончыў уборку канюшыны, прыступіў да сенажаці. Калгас «Савецкая Беларусь» на 25 чэрвеня ўбраў 75 вазоў сена.

Але разам з дадатнымі бакамі ёсць і недахопы. У раёне лічыцца 3 тысячы 664 гаспадаркі, з якіх на 10/VI калектывізавана 1 тысяча 285 гаспадарак, што складае 35 працэнтаў, прычым у Вятчынскім сельсавеце з ліку 343 гаспадаркі калектывізавана ўсяго толькі 70. У гэтым сельсавеце зусім адсутнічае масавая работа па арганізацыі прыліву ў калгасы.

МТС, якая зараз мае ўсяго 16 трактараў, не можа поўнасцю абслужыць раён. Для рамонту трактараў адсутнічаюць запасныя часткі, таму разабраны адзін трактар і яго часткі выкарыстоўваюцца для рамонту астатніх. Недастатковая колькасць камплектаў прылад для трактараў (усяго 7 камплектаў), якая з'яўлялася недахопам у вясновую сяўбу, можа паўтарыцца і восенню. Адчуваецца недахоп уборачных машын, асабліва ільнацерабілак.

Шляхі калектывізацыі, 1931, № 14.

З СТАТЫСТЫЧНА-ЭКАНАМІЧНАГА ДАВЕДНІКА «РАЁНЫ БССР». МЕНСК, 1936 г.

Жыткавіцкі раён. Насельніцтва на 1.I.1933 г.— 28,5 тыс. чал. (Жыткавічы — 2,9). Сельсаветы: Бялёўскі (22 населеныя месцы, 166 гаспадарак, 892 жыхары), Браніслаўскі (17, 37, 202), Вятчынскі (17, 242, 1267), Дзякавіцкі (28, 165, 808), Жыткавіцкі (41, 383, 1926), Князь-Азерскі (адлегласць да райцэнтра 70 км) (13, 94, 509), Людзяневіцкі (42, 175, 1015), Ляхавіцкі (цэнтр сельсавета ў в. Пухавічы) (70, 117, 637), Рудненскі (150, 89, 423), Юркевіцкі (31 населенае месца, 57 гаспадарак, 325 жыхароў).

Дзве электрастанцыі — Жыткавіцкая (60 квт) і пры лесазаводзе «Пасталы» (40 квт). У 1933 г.— 21 прадпрыемства (валавая прадукцыя — 1235 тыс. р.), у тым ліку саюзных і рэспубліканскіх — 6, прамкааперацыі — 13, калгасных — 6, іншых — 8, хімічных — 5, дрэваапрацоўчых — 3, абутковых — 3, харчовых — 11, саматужных — 2... Цэнзавых прадпрыемстваў — 4 (2 саюзных і рэспубліканскіх і 2 — РВК). Важнейшыя галіны — цагельная і лесапільная. Галоўныя прадпрыемствы: цагельны завод «Чырвоны прымежнік» (з 1932 г., 29 рабочых), лесазавод «Труд» (з 1932 г., 57 рабочых), Жыткавіцкі лесазавод (з 1926 г., 23 рабочыя), абодная арцель «Ясень» (з 1926 г., 43 рабочыя), леспрамгас (з 1930 г., 415 рабочых). Сельская гаспадарка — зерневая, усяго угоддзяў — 157140 га, у тым ліку ворыва — 15766 га, сенажаць — 25 209 га, агароды — 488 га, сады — 38 га, лес — 84 300 га, балоты — 1431 га. Саўгасаў — 2, калгасаў — 17, іншых сельгаспрадпрыемстваў — 14 (на 1.I.1935 г.). Усіх гаспадарак — 3919. МТС — 1, трактараў — 21, абслугоўваемых калгасаў — 40 (85,5 % плошчаў пасеваў калгасаў) (у саўгасах — 6 трактараў). Бядняцка-серадняцкіх гаспадарак — 81,6 % (на 1.7.1935 г.).

Пасяўныя плошчы пад ураджай 1935 г.: усяго — 17 102 га (калгасы — 11 176 га, аднаасобнікі — 3431 га); у тым ліку: збожжа — 11 661 га (7738 і 2677 га), лён — 714 га (465 і 145 га), канапля — 185 га (137 і 47 га), бульба — 3371 га (1966 і 489 га), гароднінныя — 286 га (64 і 73 га), сіласныя — 28 га, караняплоды — 56 га. Малочна-таварных ферм — 47, свінагадоўчых — 21, авечкагадоўчых — 9, конегадоўчых — 3, усяго — 80. Колькасць жывёлы (на чэрвень 1935 г.): буйной рагатай — 18 005 (7250 кароў), свіней — 9125, авечак і коз — 7650, коней — 3180 (2621 рабочых), з іх у дзяржаўна-кааператыўным сектары адпаведна 312 (116), 153, 65 і 204 (185), у калгасах 6877 (1875), 1045, 496 і 2395 (1917), у калгаснікаў 7943 (3732), 6457, 6158 і 9 (8), у аднаасобнікаў 2873 (1527), 1470, 931 і 572 (511). Колькасць работнікаў: 2631 (цэнзавая прамысловасць — 136), прадпрыемствы кааперацыі — 131, рыбная прамысловасць — 78, будаўніцтва — 50, саўгасы — 98, МТС — 39, лясная гаспадарка — 1204, транспарт — 10, сувязь — 79, камунальная і жыллёвая гаспадарка — 31, гандаль — 172, грамадскае харчаванне — 15, падрыхтоўка кадраў — 9, асвета — 281, ахова здароўя — 50, культурна-асветніцкія ўстановы — 9, крэдыт — 25, установы па абслугоўванню сельскай гаспадаркі — 15, дзяржаўнае кіраванне і суд — 101, кіраванне апаратам народнай гаспадаркі — 18. Гандаль: колькасць магазінаў — 61, ларкоў — 6 (у тым ліку адпаведна дзяржаўных 18 і 2, спажыўкааперацыі 42 і 4).

Асвета і культура: пачатковых школ 37 (выкладчыкаў — 60, вучняў — 1996), няпоўных сярэдніх 11 (72 і 1947), сярэдняя (16 і 611). Дзіцячых садоў 5 (254 месцы). Дамоў сацкультуры, 1, хат-чытальняў 11. Лазня калгаса адна (40 тазікаў).

Ахова здароўя: бальніца адна (у райцэнтры) на 47 ложкаў. Амбулаторый (пры бальніцы і асобна) 4, кансультацыя 1, фельчарскі пункт 1, меддактараў 5, зубдактараў 1, фельчараў 2, акушэрак 3, сясцёр 9. Газета «Прымежны камунар» — орган РК КП(б)Б і РВК, тыраж 3,3 тыс.

Тураўскі раён. Насельніцтва на 1.I.1933 г.— 27,7 тыс. чал. (Тураў — 4,5). Сельсаветы: Букчанскі (19 населеных месцаў, 167 гаспадарак, 842 жыхары), Верасніцкі (6, 117, 842). Азяранскі (11, 90, 517), Пераройскі (5, 194, 1031), Рычоўскі (10, 106, 561), Тонежскі (10, 232, 1190), Тураўскі 1-ы (гандлёвая частка) (1, 399, 2157), Тураўскі 2-гі (сельгас. частка) (11, 516, 2844).

Электрастанцыя адна (Тураўская, 75 квт). 18 прадпрыемстваў (валавая прадукцыя — 435 тыс. р.). Галоўныя прадпрыемствы: цагельны завод «1-е Мая» (з 1930 г., 21 рабочы), дрэваапрацоўчая арцель (з 1932 г., 49 рабочых), шавецкая арцель «Чырвоны панчошнік» (з 1930 г., 21 рабочы), леспрамгас (з 1930 г., 602 рабочыя), хімлясгас (з 1933 г., 124 рабочыя). Усяго сельгасугоддзяў 182 970 га, у тым ліку ворыва — 10 790, сенажаць — 21 873, балоты — 29 160 (у тым ліку тарфяныя 2209), агароды — 743, сады — 72. Саўгасаў — 2, калгасаў — 36, іншых сельгаспрадпрыемстваў — 10. Усіх гаспадарак — 3380. МТС — 1, трактараў — 16 (у саўгасах — 1 трактар).

Пасяўныя плошчы пад ураджай 1935 г.: усяго — 12 425 га (калгасы — 9535 га, аднаасобнікі — 2125 га, дзяржаўна-кааператыўны сектар — 333 га). Галоўная культура — збожжавыя (8838 га) і бульба (1967 га). 34 малочна-таварныя фермы, 26 — свінагадоўчых, 2 — конегадоўчых. 53 магазіны (16 дзяржаўных і 37 — спажыўкааперацыі), тры ларкі.

24 пачатковыя школы (38 выкладчыкаў, 1288 вучняў), 12 няпоўных сярэдніх (70 і 2122), сярэдняя (20 і 776). Тры дзіцячыя сады на 158 месц. Дом сацкультуры і 9 хат-чытальняў. Бальніца на 40 ложкаў, здраўпункт і фельчарскі пункт, меддактараў — 5, зубдактараў — 1, фельчараў — 5, акушэрак — 3, сясцёр — 6.

Па старонках раённых газет

ПРЫМЕЖНЫ КОМУНАР

Тав. Гікала — дэлегат Усебеларускага з'езду калгаснікаў-ударнікаў

Сход калгаснікаў калгасу «Надубава Чарацянка» абраў дэлегатамі Усебеларускага з'езду калгаснікаў-ударнікаў сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікала і калгасніцу-ударніцу Кірбай Марыну. Адначасова на гэтым жа сходзе дэлегатам на раённы злёт калгаснікаў-ударнікаў калгаснікі абралі сакратара РК КП(б)Б тав. Багданава.

5 лютага 1933 г.

Усе калгасы павінны мець сваё насенне

Мы, калгаснікі-ударнікі кляймім пазорам калгасы «Асо», «Максім Горкі», «Чырвоная Навуць», «Чырвоны ўдарнік», «Чырвоны Бераг», «13-ы Кастрычнік», «Чырвоная ніва», «Новае жыццё» Ляхавіцкага с/с і «Чырвонае Палессе», якія ганебна зрываюць засыпку насеннага фонду, чым дапамагаюць класаваму ворагу кулаку ў яго шкоднай дзейнасці, накіраванай супраць паспяховага правядзення веснавой пасяўной кампаніі. Мы патрабуем ад гэтых калгасаў не пазней 15 сакавіка поўнасцю засыпаць насенныя фонды.

30 лютага 1933 г.

Вучні прымаюць удзел у збору попелу

Для лепшай падрыхтоўкі да веснавога севу школа хут. Сялко Людзяневіцкага с/с арганізавала вучнёўскія брыгады. Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі, школа сабрала 320 кілаграмаў попелу.

Тулупаў
20 сакавіка 1933 г.

Аднаасобнікі в. Браніслаў рыхтуюцца да севу

32 аднаасобныя гаспадары в. Браніслаў нядрэнна падрыхтаваліся да севу. Насенныя страхавыя фонды поўнасцю засыпаны і ачышчаны. З кожнага аднаасобніка ўзяты падпіскі аб іх захаванні. Попел збіраецца кожнай гаспадаркай. Інвентар, збруя ўжо адрамантаваны і ўпаўне гатовы да севу.

Дудзіч
5 красавіка 1933 г.

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

У штодзённай працы ўжываць беларускую мову

Радавыя міліцыянеры і кам. склад міліцыі нашага раёну справы вядуць на беларускай мове. А гутараць паміж сабой і сялянствам выключна на расейскай мове. Нават пам. паліт. т. Асіпенка не толькі праводзіць работы па беларусізацыі, але ўсю працу праводзіць на расейскай мове. Тав. Асіпенку, як паліт. кіраўніку, патрэбна самому авалодваць беларускай мовай і дабіцца, каб і ўсе міліцыянеры карысталіся беларускай мовай у штодзённай працы.

Свой
15 красавіка 1933 г.

Глушыцель пралетарскай крытыкі Маркевіч павінен быць сурова пакараны*

Брыгадная газета — штодзёнка калгасу «Чырвоная Града» па-бальшавіцкі змагаясь за выкананне трэцяга рашаючага года пяцігодкі, адзначала лепшых ударнікаў соцыялістычных палёў і ганьбіла лодыраў, якія імкнуліся затрымаць сеў. Так, у 10 № газеты быў занесены ў адстаючыя (на чорную дошку) лодыр Маркевіч А. Даведаўшыся, што яго «недатыкальная» асоба змешчана на чорнай дошцы, з'явіўся на калгасны двор, дзе была змешчана газета, і тут жа парваў яе на кускі. Такім чынам газета № 10 не выйшла ў свет, яна «канфіскавана» глушыцелем пралетарскай крытыкі. Змешчаны матэрыял у гэтым № калгаснікі не мелі магчымасці прачытаць — пра пасевы тэхкультур, пра лепшыя прыклады ў працы асобных калгаснікаў.

15 чэрвеня 1933 г.

Чаму закрыты ДСК?

У в. Лагвошчы маецца нацыянальны ДСК. Але ДСК у апошні час пастаянна закрыты. Справа ў тым, што яго загадчык пераведзены на працу настаўніка. Такое становішча павінна быць зараз жа знішчана. У в. Лагвошчы ёсць усе магчымасці для працы ДСК. Насельніцтва вёскі патрабуе тэрміновага адкрыцця ДСК, каб мець магчымасць павышаць свой культурны ўзровень.

10 кастрычніка 1933 г.

Калгаснікі «Чырвонага Маяку» дапамагаюць Чырвонай Арміі

Калгаснікі «Чырвоны Маяк» Руднянскага с/совету разгарнулі работу па збору бульбы для пасеву саўгасу пагранатрада. Член праўлення калгасу Гайдзель Язэп аддаў для гэтага 6 пудоў бульбы, Некрашэвіч Янка 4 пуды, Некрашэвіч Радзіон 4 пуды і інш. Агулам калгаснікі «Чырвонага Маяку» сабралі 746 кілаграмаў бульбы.

20 красавіка 1934 г.

ЧЫРВОНАЯ ТУРАЎШЧЫНА

Асмальваюцца свіныя скуры

Грамадзяне в. Верасніца — члены і кандыдаты партыі Кочка Пятро, Блоцкі Гаўрыла, Блоцкі Рыгор і Блоцкі Сямён, якія добра ведаюць пастанову ўрада аб забароне асмальвання і ашпарвання свіных скур, праводзілі растлумачальную работу сярод насельніцтва аб гэтай

---

* *Андрэй Фёдаравіч Маркевіч*, 1908 г. нараджэння, адлучэнец (адлучыўшыся ад сям'і, нежанаты, без маёмасці ўступіў у калгас), ветэран вайны і працы, франтавік, заслужаны калгаснік калгаса «XX партз'езд». На працягу амаль паўстагоддзя вызначаўся надзвычайнай шчырасцю і адданасцю ў грамадскай рабоце, у 1973 г. быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

пастанове, а апошнім часам самі пабілі сваіх кабаноў і паабсмальвалі свіныя скуры.

Парт'ячэйцы патрэбна праверыць гэты факт і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у злачынстве таварышоў.

Б. С. Я.
7 снежня 1932 г.

Разгортваецца гандаль таварамі шырспажыву

Разгортвае гандаль таварамі шырспажыву леспрамгас. Зараз леспрамгасам арганізован спецыяльны склад для продажу тавараў, неабходных для шырокага спажывання працоўнага насельніцтва.

Склад знаходзіцца ў м. Тураве на Чырвоным пляцы № 4, у двары. Праз зноў арганізаваны склад леспрамгасу прадаюцца: дранка, палоззе, вобад, вугаль і інш.

К. і *Б.*
11 студзеня 1933 г.

Так забяспечваюць калгас насеннем

Прыклад, як трэба забяспечваць калгас недастаючым насеннем, паказвае ўдарніца-калгасніца з в. Пагост Яраш Л. У калгасе не хапала насення агародніны: буракоў, гуркоў, морквы, цыбулі. І тав. Яраш, каб дапамагчы праўленню, пайшла ў падворны абход па вёсцы збіраць насенне для калгаснага агароду. Сабрана 700 грамаў насення буракоў, 220 грамаў гуркоў, 50 грамаў морквы і 8 кілаграмаў цыбулі.

Калгаснік
29 сакавіка 1933 г.

Першы трактарыст

Вёска, дзе жыў Андрэй Лявонавіч Гамолка, заблудзілася сярод лесу. Толькі за агародамі крыху адступіліся меднаствольыя сосны, пакінуўшы месца невялікаму лугу. Тут, у лагчыне, і зграбаў сена Андрэй Лявонавіч. Працаваў стары паляшук лёгка і спрытна. Відаць было, што работа яму ў радасць.

— Гэта што, паглядзелі б, які ён быў у маладосці,— залюбавалася мужам Кацярына Аляксандраўна.— Далёка не кожны мог за ім управіцца.

Часта ўспамінаў той нялёгкі час і Андрэй Лявонавіч. Прыгадваў 1929 год...

Было гэта на зыходзе зімы. Аднойчы прыехала ў Бялёў «вялікае начальства» з Жыткавіч. Сяляне ўжо ведалі: калгас ствараць будуць. На сход у школу прыйшлі і старыя, і малыя. Уважліва слухалі, што гаварылі прадстаўнікі з раёна, згодна ківалі галовамі. Але калі ім прапанавалі запісвацца ў калгас, адгукнулі-ся нямногія. Андрэй Гамолка першым праціснуўся да стала:

— Пішыце!

— А дзе бацькі?

— Даўна памерлі... З дзесяці гадоў батрачу, чужую жывёлу пасу.

— А колькі табе зараз?

— Семнаццаты.

У той дзень у «III Інтэрнацыянал» — такую назву далі гаспадарцы — уступілі каля трыццаці чалавек. Сярод іх было нямала такіх, хто, як і Андрэй, увогуле не меў свайго прыстанішча. Старцыня Ілья Ульянавіч Альвінскі пасяліў іх у вялікі пусты дом, выдзеліў кухарку.

Андрэй с нецярпеннем чакаў вясны: нарэшце ён будзе араць сваю зямлю! Першы дзень пасяўной быў, як свята. А позна ўвечары здарылася бяда. Хлопцы ўжо клаліся спаць, калі вокны асвяціліся блізкім зарывам. Усе падхапіліся: канюшня гарыць, а там дванаццаць калгасных коней!

Калі падбеглі бліжэй да палаючага будынка, пачулі крыкі:

— Хапай калгаснікаў ды кідай у агонь...

Хтосьці паспеў выклікаць на дапамогу атрад пагранічнікаў, бандытаў схапілі. Але яшчэ не раз даводзілася калгаснікам абараняць сваё дабро.

Андрэй Гамолка, хлопец баявы, вясёлы, адным з першых уступіў у камсамол. А потым яго, Ілью Страху, Емяльяна Ачакоўскага, Паўла Жогаля — самых актыўных камсамольцаў паслалі на курсы трактарыстаў у Жыткавічы. Пасля вучобы прыкацілі яны ў родны калгас на трактарах. Паглядзець на дзівосныя машыны збеглася ўся вёска. «Няўжо ж яны самі і сеяць, і араць умеюць»? — распытвалі Андрэя.

Ён вельмі ганарыўся сваёй прафесіяй. Мяняліся маркі трактароў, у гаспадарку прыходзіла ўсё больш дасканалая тэхніка. Але нязменнай была любоў да яе Андрэя Лявонавіча Гамолкі. 46 гадоў працаваў ён трактарыстам...

І. М. Хвошчанка

Жыццё як жыццё

Пра Сцяпана Кузьміча Рака ў Тураве ходзяць цэлыя легенды. І не дзіва — дзядзька быў тут калісьці першым трактарыстам. А ў вёсцы Малешаў, куды ён заехаў сваім «сталёвым канём», супраць яго хадзілі жанкі з белым флагам. «Не дамо нашы загоны араць»,— крычалі яны. Пасталі ўпоперак дарогі — і ні праехаць, ні прайсці. Злез ён з трактара, парасціхаў жанок — каго ўгаворам, а каго і лёгкім пінком — і паехаў далей. А жанкі за ім следам...

Прагнаў Сцяпан адну баразну, вяртаецца назад, а на баразне баба ляжыць з паднятымі кулакамі і гарланіць. «Вось дурніца,— падумаў Сцяпан.— Расклалася сваёй шырокай малешаўскай спадніцай»...

Спыніў трактарыст «каня», вылаяўся без асаблівай злосці:

— Каму я гавару, асвабадзі дарогу! — Аж ускіпеў ад злосці. Падбавіў халасты газ, а потым рушыў трактар уперад. А баба як ляжала ў баразне, так і ляжыць...

— Нелюдзь,— закрычалі жанкі, што стаялі непадалёк,— паспрабуй расчавіць! Мы цябе з тваім трактарам расчавім.

Зубамі кола наехаў на шырокую спадніцу жанчыны. Сцішыў трактар, падышоў да бабы і спытаў, быццам жартам:

— Я цябе не прышчыкнуў? Хочаш знаць — я зараз пайду падсілкуюся.

І пайшоў. Пакуль абедаў, баба змаркатнелася ляжаць. Падняцца не можа: шкада спадніцы, каб не парвалася. А дома ж і свінні галодныя і куры. Ды і зямля сырая.

— Ох, даражэнькі, ці ж ты не чалавек! — Узмалілася жанчына, убачыўшы Сцяпана.— Адпусці... Больш ніколі не стану супраць твайго трактара.

Так Сцяпан Рак змагаўся з праціўнікамі калектывізацыі.

...Было гэта пасля вайны. Праз канаву за ўзгоркам ляжала кладка. Але што за кладка! Паглядзеў Сцяпан уважліва — аж сэрца зайшлося: «Фардзон» ляжаў у канаве замест кладкі, цінай яго зацягло, іржа паела... У вайну немцы сілай прымушалі людзей ехаць на поле. Яны і затапілі трактар у канаве.



С. К. Рак

Паклікаў хлопцаў, выцягнулі трактар. «Дарма, дзядзька, час траціць будзем. Ён увесь прагніў ужо»,— гаварылі яны.

Але не паслухаў хлопцаў Сцяпан. Прынёс газы і пачаў адшароўваць іржу. Ночы не дасыпаў — каля трактарца ўсё вазіўся. Не хапала якой часткі ў машыне, ішоў прасіць у механіка. Той разводзіў рукамі: «І новыя часткі пагробіш, і час патраціш, і нічога з гэтага трактара не будзе»...

Але ж дамогся свайго стары трактарыст, завёўся трактар. Твар у дзядзькі Сцяпана ў той дзень зззяў ярчэй за сонца... «А, што ў гэтым такога! Было, было...»

Аднойчы пазвалі Сцяпана Рака ў праўленне. Там было многа народу. З прэзідыума прачыталі: «Ганаровае званне «Заслужаны калгаснік калгаса «Новае жыццё» прысвойваецца аднаму з першых трактарыстаў калгаса Раку Сцяпану Кузьмічу». На яго доме прыбілі таблічку з такім надпісам. Дзядзька Сцяпан шырока, як заўсёды, усміхнуўся...

У. Ф. Лаўнікоўіч

За рулём — дзяўчаты

Іх было васемнаццаць — першых у раёне дзяўчат, якія селі за руль трактара. Сярод іх — Маша Марчанка, Аня Крукоўская, Вера Забродская... Быццам учора гэта было. Прадвесне. Ціхі вечар. На ганку пачуліся крокі — у хату зайшоў старшыня калгаса «Прамень камуны». Прывітаўся, пагаварыў з маці аб тым-сім, потым сказаў:

— Я, шчыра кажучы, да Веры... Хочам накіраваць яе на курсы трактарыстак. Адпускай, маці, дачку.

— Ды што ты, старшынька!.. Пабойся бога. Дзе ж гэта бачна — дзяўчыну ды на трактар?

— Такі час настаў. А ты, Вера, згодна?

— Вядома, згодна,— шчокі дзяўчыны запунцавелі.— Толькі ці спраўлюся?..

У 1937 г. Вера Забродская была залічана на курсы трактарыстак пры Жыткавіцкай МТС. Вясной яна ўжо арала на трактары зямлю ў родным калгасе, сеяла яравыя. Але ўбіраць ураджай не давялося: дзяўчыну накіравалі вучыцца на шафёра. Паехала ажно ў Горкі, у сельскагаспадарчы інстытут. Тэхніка стала яе любоўю. За рулём палутаркі адчувала сябе больш смела і ўпэўнена, чым на танцах або на вячорках. Прастор, хуткасць, штодзень — новыя ўражанні!

Сустрэўся ёй аднойчы на дарозе салдат — пагранічнік Іван Сурмач — радавы пагранічнай заставы, што размяшчалася тады недалёка ад Браніслава, на Лапацінай гары. І завіхурыла хлопца і дзяўчыну вясна... У Івана канчаўся хутка тэрмін службы, вырашылі пажаніцца. А першы дзень іх сумеснага жыцця выпаў на 22 чэрвеня 1941 г. Нават развітацца не давялося. 18-ы пагранічны атрад хутка прыняў бой. Іван прапаў без весткі...

Трывога не пакідала вяскоўцаў, якія апынуліся пад каваным ботам акупантаў, ні днём, ні ўначы. Аднойчы загрукалі ворагі ў дзверы хаты. «Што рабіць?» Рашэнне прыйшло імгненна: схапіла бляшанку з газай, плюхнула ў твар.

— Тыф! — сказала Вера, адчыніўшы дзверы.

Гітлераўцы адхіснуліся. Яны маглі б тут жа застрэліць дзяўчыну, падпаліць хату, дзе пасялілася зараза. На гэты раз пашанцавала, усё абышлося...

Але гора не мінула сям'ю Забродскай. За сувязь з партызанамі фашысты расстралялі брата Андрэя. Загінуў муж сястры, сама яна засталася цяжка хворай пасля ваеннага ліхалецця. Доўга верылася, што вернецца Іван, але надзеі з кожным го-

Курсанты-трактарысткі пры Жыткавіцкай МТС разам з выкладчыкамі, 1937 г. У першым радзе першая злева — В. М. Забродская

дам заставалася ўсё менш... Вось ён, глядзіць з фотаздымка — прыгожы, адкрыты твар, глядзіць быццам вінавата: не прыйшоў... Для Веры Нікадзімаўны Забродскай ён застаўся назаўсёды маладым, адзіным, любімым. А яна чакае яго больш паўстагоддзя...

В. Р. Феранц

Па старонках раённых газет

ПРЫМЕЖНЫ КОМУНАР

Працавалі ўдарна

Калгаснікі калгаса «Прамень Комуны» у час першага выезду ў поле паказалі значную арганізаванасць. На выездзе прынялі ўдзел усе калгаснікі. За гэты дзень калгаснікі ўзаралі пад пасеў 142 га плошчы, вывезлі гною 80 вазоў, пасеяна пшаніцы 2 га.

Пасля работы, павячэраўшы, калгаснікі наладзілі свой калгасны аркестр.

У дружнай калгаснай сям'і весела жыць і працаваць.

Краўчук.
29 сакавіка 1934 г.

Арганізаваць прыліў у калгасы

За апошнія два гады ў нашым раёне зусім малы прыліў у калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэта тлумачыцца адсутнасцю належнай работы па ўцягненню ў калгас. Вясной гэтага году некаторыя калгасы нашага раёну прынялі 318 гаспадарак. Да такіх адносяцца: «III Інтэрнацыянал», «Комінтэрн», імя Сталіна, «Комунар Беларусі», «Чырвоная Дзедаўка» і другія. Аднак гэта зусім нязначная колькасць аднаасобнікаў у параўнанні з колькасцю застаўшыхся па-за калгасамі, і горш усяго тое, што пасля веснавой сяўбы прыліў у калгасы па раёну амаль што спыніўся.

Разгортванне масавай работы і рашучай барацьбы супраць рэштак кулацкіх элементаў далі свае станоўчыя вынікі па Вятчынскаму сельсовету, у якім за апошні час у калгас «2-я Пяцігодка» ўлілося 73 гаспадаркі.

Яшчэ 2200 аднаасобнікаў знаходзяцца па-за калгасамі. І асабліва вялікая колькасць аднаасобнікаў маецца ў Людзяневіцкім, Руднянскім і Вятчынскім сельсоветах.

26 жніўня 1934 г.

Прыходзіць заможнасць

У 1932 годзе на працадзень прыпадала: зернавых 1 кіло 100 грам, бульбы 1,6 кіло. У 1933 годзе зернавых на працадзень ужо атрымліваюць 2 кіло 415 грам, бульбы 2,2 кілаграма, а ў гэтым годзе калгаснікі калгаса «Чырвоны Памежнік» ужо атрымалі па 4 кіло зернавых і 6 кілаграмаў бульбы.

Калгас ужо выхаваў не адзін дзесятак ударнікаў. Да такіх мы можам аднесці Танчынскага Кузьму, Канапацкага Нікіфара, Кулакевіча Ілью, Кулакевіча Сяргея...

Сям'я Канапацкага Андрэя з трыма працаздольнымі выпрацавала 613 працадзён.

Е. Энштэйн
7 кастрычніка 1934 г.

Івашкевіч разбазарвае працадні

Па ўстаноўленай у калгасе «Большэвік» норме за выцярабленую 0,11—0,12 га ільну аплачваецца 2 працадні. Гэтай нормы не прытрымліваўся брыгадзір чацвёртай брыгады Івашкевіч Барыс. Ён залічваў жанчынам за выцярабленую плошчу 0,03—0,05 га па 2 працадні, а сваёй жонцы, якая зусім лён не церабіла, таксама залічыў працадні.

Праўленне аднак да гэтых злоўжыванняў брыгадзіра Івашкевіча ніякіх мер не прыняло.

З-чы
7 кастрычніка 1934 г.

Сабралі 60 рублёў

На сходзе калгаснікаў калгаса «Чырвоная Града» прапрацавана адозва Іспанскай секцыі МОПР. Тут жа на сходзе ў карысць Іспанскім рэвалюцыянерам сабрана 60 рублёў.

Актыўна ўдзельнічалі ў зборы сродкаў Клімчук, Мілічэнка, Пігін, Галіцкі і інш.

Бурачок Іван
20 снежня 1934 г.

Арганізавалі гурток

Работнікі пагранатрада арганізавалі пры Людзяневіцкім ДСК ваенны гурток. У гурток запісаліся 35 чалавек. Заняткі наведвае не толькі запісаўшаяся моладзь, але і старыкі. На занятках вывучаецца вінтоўка, граната і г. д.

Коўзун
17 кастрычніка 1935 г.

Кінафільм «Чапаеў» у палескіх калгасах

З 14 лютага па 3 сакавіка г. г. прадэманстравана кінакарціна «Чапаеў» у 13-ці палескіх калгасах Ляхавіцкага і Вятчынскага сельсоветаў. Карціну праглядзелі 2785 гледачоў. Яны ўсе вельмі задаволены.

5 сакавіка 1936 г.

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

У нарсудзе

Лагун Гардзей Ярмолавіч з Людзяневіцкага сельсовета ў 1935 годзе абкладзен у індывідуальным парадку сельскагаспадарчым падаткам, як кулак. На працягу ўсяго 1935 года ён злосна сабатаваў і не выконваў абавязковых плацяжоў. Не выплаціў падатку, самаабкладання і культзбор.

18 сакавіка г. г. Жыткавіцкім народным судом разгледжана гэта справа. Лагун за злосны сабатаж у выплаце абавязковых плацяжоў прыгавораны на пяць год пазбаўлення волі, з канфіскацыяй усёй маёмасці. Лагун зараз знаходзіцца пад вартай.*

22 сакавіка 1936 г.

Масавыя гульні і танцы

18 жніўня ў клубе калгаса «Прамень Камуны» Браніслаўскага сельсовета адбыўся сход калгаснікаў, прысвечаны вялікаму ўсенароднаму святу — Дню совецкай авіяцыі. Больш двухсот калгаснікаў на сходзе праслухалі даклад пагранічніка тав. Салаўёва, які расказаў ім аб магутнасці нашай совецкай авіяцыі, аб яе вялікіх дасягненнях, атрыманых пад кіраўніцтвам большавіцкай партыі і асабіста таварыша Сталіна.

На вечары калгаснікамі былі наладжаны масавыя гульні і танцы.

21 жніўня 1939 г.

Закончылі апрацоўку ільну

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» поўнасцю закончыў апрацоўку ільну.

Лепшыя ўзоры стаханаўскай работы на апрацоўцы ільну паказалі калгасніцы Макарэвіч Оля, Купрацэвіч Марыя. Гэтыя калгасніцы з паложанай нормы 2 кілаграмы штодзённа выпрацоўвалі па 4—6 кілаграмаў.

А. Агіевіч
1 снежня 1939 г.

ЧЫРВОНАЯ ТУРАЎШЧЫНА

Выратаваць маладняк ад знішчэння

У калгасе «Новы шлях» на праўленні і на агульным сходзе распрацавалася пастанова партыі і ўрада аб развіцці жывёлагадоўлі, дзе прысутнічалі калгаснікі і аднаасобнікі. Была вынесена пастанова — захаваць у добрым стане маладняк. Але класавы вораг павёў сваю агітацыю за зрыў гэтага мерапрыемства.

Член праўлення калгаса і сельсовета Журко Акуліна, якая павінна весці барацьбу за захаванне жывёлы, стала на шлях знішчэння яе. Як толькі ацялілася карова, Журко зарэзала цяля. Гледзячы на члена сельсовета, пачалі рэзаць цялят Журко Антон, Казак Ігнат.

Мы — калгаснікі — патрабуем суровай кары над ворагамі, якія зрываюць жывёлагадоўлю.

Сігнальны
4 сакавіка 1934 г.

---

* Цвёрдае абкладанне — дзяржаўная палітыка на вёсцы ў гады калектывізацыі, накіраваная на знішчэнне сялянскіх гаспадарак і сялян, не згодных з лініяй абагульнення. Тыя, хто не ўступалі ў калгас, абкладваліся цвёрдым заданнем (здаць у вызначаны тэрмін устаноўленую колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі), выканаць якое, як правіла, было немагчыма. Калі ж удавалася з вялікай цяжкасцю, з дапамогай сваякоў і родзічаў справіцца з заданнем, гаспадарка абкладвалася новым, больш высокім падаткам. У выніку — рэпрэсіі, арышт, высылка, суд... Так у раёне была знішчана вялікая колькасць гаспадарак, асуджаны і расстраляны дзесяткі сялян.

Не дадзім кулацкаму «парыкмахеру» ніводнага зерня

Мы, піонеры калгаса імя Калініна, аб'явілі бой кулацкім «стрыгункам», на ўсіх участках калгасных пасеваў пабудавалі вышкі, на якіх устанавілі піонерскія дазоры.

2 ліпеня мы злавілі двух злодзеяў, якія рвалі калгасны гарох. Гарох у злодзеяў мы адабралі і перадалі ў калгас. Але праўленне калгаса нам не дапамагае: мы патрабавалі ад праўлення злоўленых злодзеяў Матарас Мар'ю і Рабірох Домну перадаць суду для прыцягнення да судовай адказнасці, але праўленне чамусьці зацягвае гэту справу...

Тхарук
8 ліпеня 1934 г.

За абман дзяржавы — да адказнасці

Старшыня калгаса «Дзень Ураджаю» Лябедчанка займаецца ашуканствам дзяржавы. Ён імкнецца здаць збожжа дзяржаве самай горшай якасці, сырое і не ачышчанае.

Перад адпраўкай збожжа на прыёмачны пункт горшае збожжа — засмечанае, вільготнае — кладуць на дно, прыкрываючы яго зверху сухім, ачышчаным зярном.

7 жніўня калгас прывёз на прыёмачны пункт больш за 100 кіло такога жыта, але на прыёмачным пункце махінацыя Лябедчанкі была выкрыта, жыта было забракавана, а Лябедчанку на гэты раз не ўдалося ашукаць дзяржаву.

Гэта не адзіночны факт. Такіх прыкладаў у яго практыцы было многа.

Бачыўшы
21 жніўня 1934 г.

Няхай новыя гіганты рэюць над совецкай зямлёй

Мы, работнікі Перароўскага лесанарыхтоўчага ўчастка, з вялікім жалем сустрэлі паведамленне аб гібелі агітсамалёта «Максім Горкі», яго экіпажа і лепшых сыноў нашай радзімы, адабраем пастанову партыі аб пабудове трох гігантаў, замест загінуўшага аднаго. Уносім для гэтага двухдзённы заработак, што складае 200 рублёў.

Мацюшонак М. М.
6 чэрвеня 1935 г.

Курсы конюхаў

З 1-га студзеня 1936 года ў Тураве пачынаюць працаваць месячныя курсы старшых конюхаў. Усяго на курсах будзе займацца 40 чалавек.

2 студзеня 1936 г.

Абязбольванне родаў у Тураве

Упершыню 23 лютага вопыт абязбольвання родаў праведзен у тураўскай бальніцы пад кіраўніцтвам галоўурача т. Лапцейкі. У гэты дзень без болі нарадзілі калгасніцы сельгасарцелі «Новае жыццё» Квяткоўская Наталка і Балбуцкая Матруна. Рожаніцы адчуваюць сябе добра. Балбуцкая Матруна на другі дзень ужо хадзіла.

1 сакавіка 1936 г.

Сход хатніх гаспадынь Турава

Вечарам 4 сакавіка адбылася нарада хатніх гаспадынь Турава. На гэтай нарадзе выступіла старшыня Чырвонага крыжу Мазырскай Акругі тав. Сычова А. аб арганізацыі брыгад хатніх гаспадынь у барацьбе за чыстую кватэру, хату, двор. Арганізавана 10 брыгад.

8 сакавіка 1936 г.

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

Першая раённая алімпіяда калгаснай мастацкай самадзейнасці

2—3 мая ў Тураве адбылася першая раённая алімпіяда калгаснай мастацкай самадзейнасці. У алімпіядзе прынялі ўдзел 17 розных гурткоў: харавы, фізкультурны і драматычны. Усяго прыняла ўдзел у алімпіядзе 102 чалавекі.

7 мая 1936 г.

Лепшыя трактарысты

Трактарысткі Балбуцкая Мар'я і Дудзіч Ноня заключылі соцыялістычны дагавор, у якім узялі на сябе абавязак не даць прастою ніводнай мінуты трактару і сэканоміць гаручае.

Балбуцкая і Дудзіч уключыліся ў спаборніцтва трактарыстаў Тураўскай МТС. На 5 жніўня яны на сваім трактары № 21 узаралі 115 га і сэканомілі гаручага 434 кілаграмы.

10 жніўня Балбуцкай і Дудзіч уручан Пераходны чырвоны сцяг партыйнай арганізацыі і профкома МТС.

З. К.
12 жніўня 1936 г.

«ЛЕНІНСКІЯ ЗАВЕТЫ»[1]

З кожным годам павялічваецца аплата працадня калгаснікаў нашага раёна. Сям'я калгасніка сельскагаспадарчай арцелі «Новы шлях» Птушкі Нікалая Ігнатавіча на выпрацаваныя працадні 1938 г. атрымала 1984 кілаграмы збожжа, 7168 кілаграм бульбы, 1139 рублёў грашыма.

Шруб Іван
14 лютага 1939 г.

Радыёфікацыя калгасаў

За студзень — люты месяц гэтага года Тураўскім радыёвузлом радыёфіцыраваны тры калгасы. У сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны пуцілавец» установлена 15 радыёточак, у калгасе «Новы шлях» — 8 і 4 радыёточкі ў калгасе «6-ы з'езд Саветаў». Акрамя гэтага ў 11 калгасах раёна ўстаноўлены эфірныя радыёпрыемнікі.

3 сакавіка 1939 г.

Што давялося перажыць...

Лінкевіч Вера Раманаўна (н. у 1924 г. у в. Юркевічы) — доктар медыцынскіх навук, прафесар. У 1952 г. закончыла Мінскі медыцынскі інстытут, працавала ўрачом-гінеколагам. У 1960 г. абараніла кандыдацкую, а 1970 г.— доктарскую дысертацыю. Загадвала кафедрай акушэрства і гінекалогіі Беларускага інстытута ўдасканальвання ўрачоў, цяпер — прафесар гэтай кафедры. Аўтар 178 навуковых работ, 4 манаграфій.

Крыху сцішылася, адыйшла вёска пасля жахаў калектывізацыі і раскулачвання, страшэннага голаду ў 1932 г. Але, пачынаючы з 1937 г., зноў рэдкая раніца ў Юркевічах не пачыналася з плачу і крыку, як галосяць па нябожчыку. Значыць, зноў

В. Р. Лінкевіч

[1] Газета «Чырвоная Тураўшчына» з студзеня 1938 г. пачала выходзіць пад назвай «Ленінскія заветы».

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

Першая раённая алімпіяда калгаснай мастацкай самадзейнасці

2—3 мая ў Тураве адбылася першая раённая алімпіяда калгаснай мастацкай самадзейнасці. У алімпіядзе прынялі ўдзел 17 розных гурткоў: харавы, фізкультурны і драматычны. Усяго прыняла ўдзел у алімпіядзе 102 чалавекі.

7 мая 1936 г.

Лепшыя трактарысты

Трактарысткі Балбуцкая Мар'я і Дудзіч Ноня заключылі соцыялістычны дагавор, у якім узялі на сябе абавязак не даць прастою ніводнай мінуты трактару і сэканоміць гаручае.

Балбуцкая і Дудзіч уключыліся ў спаборніцтва трактарыстаў Тураўскай МТС. На 5 жніўня яны на сваім трактары № 21 узаралі 115 га і сэканомілі гаручага 434 кілаграмы.

10 жніўня Балбуцкай і Дудзіч уручан Пераходны чырвоны сцяг партыйнай арганізацыі і профкома МТС.

З. К.
12 жніўня 1936 г.

«ЛЕНІНСКІЯ ЗАВЕТЫ»[1]

З кожным годам павялічваецца аплата працадня калгаснікаў нашага раёна. Сям'я калгасніка сельскагаспадарчай арцелі «Новы шлях» Птушкі Нікалая Ігнатавіча на выпрацаваныя працадні 1938 г. атрымала 1984 кілаграмы збожжа, 7168 кілаграм бульбы, 1139 рублёў грашыма.

Шруб Іван
14 лютага 1939 г.

Радыёфікацыя калгасаў

За студзень — люты месяц гэтага года Тураўскім радыёвузлом радыёфіцыраваны тры калгасы. У сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны пуцілавец» установлена 15 радыёточак, у калгасе «Новы шлях» — 8 і 4 радыёточкі ў калгасе «6-ы з'езд Саветаў». Акрамя гэтага ў 11 калгасах раёна ўстаноўлены эфірныя радыёпрыемнікі.

3 сакавіка 1939 г.

Што давялося перажыць...

Лінкевіч Вера Раманаўна (н. у 1924 г. у в. Юркевічы) — доктар медыцынскіх навук, прафесар. У 1952 г. закончыла Мінскі медыцынскі інстытут, працавала ўрачом-гінеколагам. У 1960 г. абараніла кандыдацкую, а 1970 г.— доктарскую дысертацыю. Загадвала кафедрай акушэрства і гінекалогіі Беларускага інстытута ўдасканальвання ўрачоў, цяпер — прафесар гэтай кафедры. Аўтар 178 навуковых работ, 4 манаграфій.

Крыху сцішылася, адыйшла вёска пасля жахаў калектывізацыі і раскулачвання, страшэннага голаду ў 1932 г. Але, пачынаючы з 1937 г., зноў рэдкая раніца ў Юркевічах не пачыналася з плачу і крыку, як галосяць па нябожчыку. Значыць, зноў

В. Р. Лінкевіч

[1] Газета «Чырвоная Тураўшчына» з студзеня 1938 г. пачала выходзіць пад назвай «Ленінскія заветы».

ноччу некага забралі, і так яно і было: небарака быў па сутнасці ўжо нябожчыкам, асірацела яшчэ адна сям'я... Не мінуў горкі лёс і нашу невялікую, вельмі дружную і працавітую сям'ю. Магчыма, нам толькі крыху больш пашанцавала.

...Надзвычай вялікім аўтарытэтам карыстаўся бацька ў вяскоўцаў, у яго былі сапраўды «залатыя» рукі. З 14 гадоў ён рос сіратою. Дзядуля Фядот памёр ад запалення лёгкіх, пакінуўшы 13 дзяцей, старэйшы з якіх быў бацька. Дзядуля так і не паспеў пабудаваць сваёй хаты, жыць не было дзе. Тады бацька агораў сваю першую хаціну, дзе і тулілася вялікая сям'я. Праз некаторы час ён жаніўся, насуперак волі бацькоў маці, якіх не задавальняў бядняк... Але маладыя былі поўнымі сіл і надзей, цяжкасці іх не палохалі. Удалечыні ад вёскі расчысцілі лес, зрабілі ворыва, пабудавалі хату. У бацькі былі вуллі, мы збіралі грыбы, ягады, побач цякла рэчка Случ. Працавалі ад цямна да цямна, у хаце быў пэўны дастатак. Але аднойчы, калі я, шасцігадовая, цяжка захварэла, а навокал ні душы, няма ніякай дапамогі, бацька вырашыў — так далей жыць нельга, трэба ісці да людзей... І пабудаваў такі ж самы дом у Юркевічах.

Ішлі тыя самыя трывожныя, неспакойныя гады. Забралі ўжо нашых суседзяў Адама Башкевіча, Карнея Гарбуза, Піліпа Кулакевіча і многіх іншых. Гэта былі маладыя, поўныя сілы, найбольш паважаныя людзі. П'яніц, абібокаў звычайна не забіралі.

Некаторых, у тым ліку і бацьку, пасцігаў іншы лёс. Адбіралі пашпарт — і ў 24 гадзіны чалавек павінен быў пакінуць вёску, сяліцца ён мог не бліжэй як за 100 кіламетраў адсюль. Спачатку бацьку абклалі «цвёрдым налогам», які ён ледзь выплаціў. Не паспеў разлічыцца — новы налог, выплаціць які было немагчыма. І ў той самы дзень бацьку пад канвоем адправілі ў Жыткавічы, адтуль — у Бабруйск. Без пашпарта на работу ўладкавацца немагчыма. Потым сяк-так узялі на цяжкую работу ў лесе на смолзавод.

А мы засталіся ў Юркевічах на вуліцы — дом наш разбурылі, выгналі і з хлява, дзе мы туліліся. Прыняла нас бабуля ў сваёй маленькай хаціне — там жыў яшчэ і дзядзька, у яго сям'я — пяць чалавек. Мама пайшла на работу на лесанарыхтоўку, мы збіралі ягады, грыбы і здавалі іх нарыхтоўшчыкам. Так і жылі. Брата Мірона бацька забраў да сябе, там, у лесе, ля вогнішча, варылі есці, брат хадзіў у школу ў бліжэйшую вёску і ў лесе рыхтаваў урокі...

Вельмі цяжкі лёс выдаўся цёці Ані, сястры маці. Чопчыцы жылі на хутары, у іх было чацвёра сыноў, меншаму, Сашы, 10 гадоў. Цімафей Чопчыц трапіў у спіс раскулачваемых. Праз вёску іх вялі пад канвоем, ішлі пешшу, у лапцях, а на возе — лазовае лыка. Мама плакала, хацела падысці развітацца з сястрой, але яе груба адштурхнулі.

У Котласе дзядзька з сынамі Адамам, Мікалаем і Уладзімірам працавалі на лесанарыхтоўках, у 50-градусны мароз усе загінулі. Некалькі сутак нябожчыкі знаходзіліся ў тайзе, дзікія звяры знявечылі іх твары. Сяк-так пахавала іх цётка, узяла Сашу і з вялікай цяжкасцю дабралася да Юркевіч. Жыла, хаваючыся, то ў аднаго, то ў другога сваяка. Нкусаўцы даведаліся, што вярнуўся «небяспечны элемент», «вораг народа», яе шукалі. Апошнюю ноч цётка правяла ў нас. Раніцай суседзі сказалі, што ідуць пагранічнікі з сабакамі, абшукваюць кожную хату. Цётка з Сашам пабеглі ў бок узгорка, дзе ў ямах зімою захоўвалі бульбу. Следам кінуўся сабака, за ім беглі чырвонаармейцы з вінтоўкамі. Небарак выцягнулі з ямы... Не далі нават апрануцца, а была ўжо

позняя восень, зямля стыла ў інеі.

Адправілі ў Жыткавічы, адтуль зноў у Котлас. Па дарозе цётка Аня памерла. Пра лёс Сашы мы доўга нічога не ведалі. З'явіўся ён пасля вайны, усе грудзі ў ордэнах і медалях... Слёзы душылі яго, калі расказваў, як ён жыў. Ваяваў Аляксандр Чопчыц мужна і адчайна, нібы помсціў некаму за бацьку, маці, братоў, і сам не верыў, што застанецца жывы. Цяпер ён, маёр у адстаўцы, жыве ў Адэсе. А колькі такіх, як Саша, загінула заўчасна, не прынёсшы ніякай карысці радзіме... Быў раскулачаны і загінуў недзе брат мамы Іван Максімавіч Малочка. Уся яго сям'я таксама згінула невядома дзе. І ён, і Цімафей Чопчыц былі пасмяротна рэабілітаваны.

...Успамінаю сям'ю Якубоўскіх. Бацькоў забралі, трое дзяцей — 4, 8 і 10 гадоў — засталіся на беразе ракі, усю ноч праплакалі там. Раніцай іх забраў стрыечны брат маці, Мікалай Атліванаў. Яны пайшлі ў школу. Як дзецям «ворагаў народа» ім не давалі не толькі чаю, але і кіпеню. На кожным кроку знявага, пагарда, здзек...

А быў яшчэ страшэнны голад у 1932 г. Як мухі, гінулі людзі, асабліва касіла смерць дзяцей; трупы ляжалі ўсюды, на вуліцы, на лясных дарогах, ля вогнішчаў; бывала, смажыць чалавек грыб, і падае без прытомнасці тварам прама ў агонь. Цягнуліся страшныя абозы бежанцаў з Украіны, шлях іх абазначаўся вялікімі слязамі, шматлікімі трупамі... Мы харчаваліся лісцем дрэў — найбольш «смачнай» і каштоўнай лічылася ліпа, елі верас, кару... Да ўсяго гэтага давяла людзей родная савецкая ўлада, і можна толькі дзіву даваццца, што шматпакутны, гаротны, добры наш народ не здрадзіў ёй, не пракляў, а заставаўся верным і паслухмяным...

В. Р. Лінкевіч

З ДЗЁННІКА В. З. КАРЖА

«7 верасня 1941 г. З раніцы былі ў дзвюх вёсках — Мілевічах і Залюцічах, на былой савецка-польскай граніцы. Якую жудасць наводзяць гэтыя вёскі! Ні ў адным доме не знойдзеш мужчыну, адны толькі дзеці і жанчыны. Калі спытаеш: «Дзе тата?» або «Дзе муж?»,— атрымліваеш адзін адказ: «Даўно забралі».— «За што?» — таксама адзін адказ: «Не ведаю, ні ў чым не быў вінаваты. Проста злыя людзі нагаварылі,.. а таварышы не разабраліся і забралі».

Я прыйшоў да вываду, што столькі праціўнікаў у Савецкай улады не было і не магло быць, а інакш яна не трымалася б і не мела б такіх поспехаў, якіх дасягнула. Гэта сапраўды «шпіёнаманія». Іншы раз усякаму дурню дазваляюць вырашаць лёс чалавека. Гэты дурань уяўляе больш, чым думае галавой. Падпісвае пратаколы допытаў, і вырашаецца лёс цэлага сямейства. Абвінавачваны ідзе ў турму, на высылку або знішчаецца. У выніку сям'я, ведаючы, што ён зусім не вінаўны, больш не верыць Савецкай уладзе. Хоць, між іншым, ведае: сама ўлада для працоўнага — свая, савецкая... А чаму ўсё наадварот робіцца — не зразумець...

Адзін прайдоха, гора-кіраўнік, нягоднік, падхалім, які гоніцца за танным аўтарытэтам, вырашае лёс чалавецтва, а другая свалата, якая сядзіць недзе вышэй, падпісвае гэтую бяздушную паперу. Паспрабавалі б яны заваяваць Савецкую ўладу, папрацаваць у тыле ворага, тады б даведаліся, хто з'яўляецца апорай Савецкай улады, як трэба шкадаваць свой народ — самы каштоўны капітал...».

«Правда», 7 верасня 1989 г.

Хто лёг у падмурак...

Бяляй Ганна Іванаўна нарадзілася ў 1925 г. у вялікай сялянскай сям'і, у якой налічвалася 15 дзяцей, Ганна — чатырнаццатая... Бацька ў 1937 г. быў рэпрэсіраваны. З 1941 г.— на фронце. Прайшла ў якасці медыцынскай сястры ўсю вайну. Ганаровы донар СССР. Да выхаду на пенсію працавала медыцынскай сястрой у Тураўскай бальніцы. Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны другой ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй» і іншымі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Ганаровы ветэран 48-й арміі.

Г. І. Бяляй

1933 год... На ўсё жыццё запомніўся той страшны год. Калі існуе такі выраз — людзі гінулі, як мухі, то ён — менавіта пра той час. Страшэнны голад, калектывізацыя, раскулачванне, пачатак «апрычніны» нкусаўцаў — усё гэта 1933 год... Вось маці дастае з патаемнага месца жменьку мукі, дабаўляе молатыя жалуды або кару дрэва, лебяду, пячэ хлеб. Пах яго апетытны, і колер прыемны, толькі ў рукі ўзяць нельга, развальваецца ад дотыку, а смак — не расказаць які агідны, каб не невыносны голад, у рот не ўзяць... Такога хлеба трэба было многа, штодзень маці пякла 7—8 боханаў. Па кавалачку — нам, малодшым, цэлы — бацьку і старэйшым братам, якія ехалі ў поле, потым на абед, на вячэру. Два боханы маці раздавала жабракам, галодным, што праходзілі праз вёску. Памятаю, зайшла неяк жанчына, з Украіны, ад голаду хісталася. Маці пакарміла яе баршчом — крапіва, батва, крыху лебяды і ледзь засмажаны. Небарака прагна паела, маці дала яшчэ на дарогу лустачку хлеба. Пайшла да суседняй хаты, прысела адпачыць — і больш не ўстала...

А як хораша іграў бацька на скрыпцы! Ён зрабіў яе сам, клей варыў з смалы, струны нацягнуў з конскага воласа. Жаласліва, тужліва іграе скрыпка, мы сядзім на печы, слухаем — і плакаць хочацца... І маці хусцінкай слязу выцірае... А яшчэ бацька вельмі любіў чытаць. Быў ён дастаткова пісьменны — скончыў два класы царкоўна-прыходскай школы ў Перарове. У выхадны дзень ці ў свята бацька начэпліваў акуляры, садзіўся за стол, засланы белым абрусам, у чыстай палавіне хаты, адкрываў Біблію і чытаў уголас. Мы ўсе слухаем, і маці падыдзе, абапрэцца на сваю палку, таксама слухае... Ад яго мы ўсе навучыліся любіць і паважаць роднае слова, вучыліся старанна і ахвотна. Хваліў старэйшых братоў за поспехі настаўнік Анастас Паўлавіч Пакінька. Мяне ў свой час вучыў Пятро Сяргейчык. Калі я была ўжо ў трэцім класе, прыехала піянерважатая з Турава Геня Запясоцкая, прыняла ў піянеры, і з гэтага часу я ўжо перастала маліцца, хоць і вельмі баялася, каб бацька не пакараў за «адступніцтва», а мне не дазваляла больш рабіць гэта мая «партыйнасць»...

Бацьку амаль штодня выклікалі ў кантору калгаса — прапаноўвалі, прымушалі, прасілі ўступіць у артэль. Не раз пагражалі, і як аказалася потым — не дарма... Аўтарытэт яго, працаўніка, умельца, сярод вяскоўцаў быў вялікі, прыклад быў бы для ўсіх астатніх. Ён нічога не меў супраць калгасу, але ўступаць, як і ўсё рабіў абгрунтавана, добра падумаўшы, не спяшаўся. «Пакуль дзеці малыя,— гаварыў ён,— куды нам ў калгас... Вось падрастуць, пойдуць са мной зарабляць працадні, тады іншая справа...» Трэба было адвесці ў агульны хлеў каня і карову, а ў нас было таксама яшчэ сем авечак, адвезці ўвесь інвентар. Бацька не ўяўляў сабе жыцця без каня. Ну чым не кулак?.. Для пачатку нехта з галоты — актывістаў падпаліў хлеў, згарэла ўся жывёла, акрамя каня, з якім брат Іван быў тады ў начным. Сяк-так пабудавалі новы хлеў, пачалі на папялішчы зноў ладзіць гаспадарку. Захавалася крыху насення, дапамаглі суседзі. Жыта сушылася

на печы. Мама там звычайна шыла, цёпла і добра відаць, светла ад акна, я чытаю — я ўжо хадзіла ў школу, і маці заўсёды прасіла пачытаць. І малодшы брацік, Сярожа, з намі на печы. Раптам прыбегла суседка: ідуць да нас з вобыскам, зайшлі пяць чалавек. Усё аблазілі, што знайшлі — проса, крыху зерня ў мяшку — усё забралі. Муку, праўда, пакінулі. А на печ, дзе мы сядзелі, заглянуць не здагадаліся. Вясной пасеялі жыта і бульбу. Цётка дала цёлку, дачакаліся малака — колькі было радасці!

А там вясна, зеляніна, гародніна, кукуруза вырасла, можна жыць... Наступную зіму ўжо не так гаравалі. Пачало забывацца пастаяннае адчуванне голаду. Бацька працаваў возчыкам у Пераройскім сельпо на сваім кані. Ён гаварыў: «Вось перазімуем, нарыхтую дроў, а вясной — у калгас». Але не выйшла так, як ён планаваў. Ішоў страшны 1937 год. 25 лістапада бацьку арыштавалі. На наступны дзень Іван бачыў яго у Тураве, у будынку раённага аддзела НКУС, запытаўся, што перадаць. Бацька сказаў — цёплую вопратку, таму што была ўжо зіма, і крыху цукру. Сабралі перадачу, прывезлі — міліцыянер сказаў, што арыштаванага Ярмоленка адправілі ў Мазыр. Іван пакінуў каня ў знаёмага, пешшу пайшоў у Жыткавічы, сеў на цягнік — і ў Мазыр. Але бацьку так і не знайшоў і больш ніхто яго не бачыў. Куды толькі ні накіроўвалі мы лісты і запытанні, адусюль адказвалі: асуджаны без права перапіскі. Толькі праз многа гадоў зразумелі, што гэта азначае...

А вясной мы ўступілі ў калгас. Іван закончыў курсы рахункаводаў, а я пачала працаваць нянькай у дзіцячым садзе, ці, як тады называлі, дзіцячай пляцоўцы. Мама будзіла мяне ў 6 гадзін раніцы, і я бегла на работу на другі канец вёскі, кіламетры за тры. У ясельнай групе было 20 дзяцей. Поўзалі яны па голай падлозе без штаноў, спалі на агульных вялікіх нарах, елі за адным доўгім сталом. Харчаванне было недастатковым, большасць дзяцей з вялікімі жыватамі і крывымі — абручом — нагамі... За лета я зарабіла 120 працаднёў, у школу больш не пайшла. Маці сказала, што на зіму трэба прасці ніткі і ткаць кросны. Прыходзіў дырэктар Пераройскай школы Пушкарэвіч, прасіў маці, каб я наведвала школу, але маці гаварыла — бацьку забралі, навука ёй не патрэбна. Іван напісаў пісьмо да Лёні, ён служыў на Далёкім Усходзе, быў лейтэнантам. Лёня прыехаў і забраў мяне да сябе. Там я закончыла 7 класаў, паступіла ў медыцынскае вучылішча. Закончыла яго ў Мазыры ў 1941 г., мне тады было 16 гадоў, у школу я пайшла шасцігадовай — і хутка добраахвотна пачала прасіцца на фронт, прыпісаўшы сабе год.

Леаніда доўгі час не прымалі ў партыю, як сына ворага народа. Ён вельмі перажываў, але не адрокся ад бацькі. Паслаў пісьмо ў Маскву, адтуль прыйшло тлумачэнне: сын за бацьку не адказвае. Лёню прынялі ў рады ВК(б)П, і ён вельмі ганарыўся партыйным білетам... Ён хораша іграў на баяне, калі прыязджаў у вёску, уся моладзь збіралася каля нашай хаты, слухалі вальс «Амурскія хвалі», танцавалі... І яго, і другога брата, Рыгора, забрала хутка вайна — і не выпусціла з сваіх крывавых абдымкаў...

...Увесь час нам не давала спакою думка пра бацьку. У сярэдзіне 50-х гадоў паслалі яшчэ адно запытанне. На гэты раз прыйшоў адказ: Ярмоленка Іван Данілавіч расстраляны ў Мазыры 5 студзеня 1938 г. Абвінавачваўся ён у сувязі з панскай Польшчай, хоць мы добра ведалі — ніякіх адносін да яе бацька не меў. Значыць, віну ён не прызнаў і абвінавачванні не падпісаў, за што і быў рас-

страляны, інакш яго адправілі б у лагер. Не намнога перажыла бацьку зломленая горам і непасільнай работай маці... А мы, каму лёс наканаваў жыць — жывём, як можам, шчыра і сумленна робім сваю справу, і ніколі не забываем іх, тых, хто «каменем лёг у падмурак нашых плацін»...

Сям'я была «кулацкай»...

Пад грыфам «Сакрэтна» звыш паўстагоддзя знаходзіліся дакументы, якія расказваюць аб сям'і С. Ф. Касцюка, жыхара вёскі Дзедаўка. Гэта перапіска з райфо, сельскім саветам, райвыканкомам, міліцыяй аб прызнанні гаспадаркі «кулацкай». Вось некаторыя з іх. Звесткі райфо за 1930 г.: у гаспадарцы 7 едакоў, зямлі — 4 га, сенажацяў — 5 га, кароў — 3, 1 конь, 5 авечак, налічана падатку 31 р. 91 кап. 1931 г.: 7 едакоў, зямлі — 4 га, сенажацяў — 6,56 га, кароў — 3, 1 конь, 5 авечак, налічана падатку 912 р. 50 кап. Амаль нічога не змянілася ў гаспадарцы за год, а падатак узрос у 30 разоў...

Яшчэ ў 1929 г. была прынята пастанова ВЦВК і СНК СССР аб характарыстыцы кулацкіх гаспадарак. Гэта — гадавы даход 300 руб. на чалавека, прымяненне працы па найму або ўладанне млынам, маслабойкай, ваўначоскай і г. д. С. Ф. Касцюку 20 жніўня 1931 г. прыйшло напамінанне з сельскага Савета, што «згодна пастановы прэзідыума сельскага Савета па цвёрдаму падатку неабходна здаць да 15 верасня: сена — 2 т, саломы — 2 т, жыта — 40 пуд., пшана — 7 пуд., аўса — 15 пуд., грэчкі — 6 пуд., бульбы — 250 пуд., ільнасемя — 7 пуд., ільновалакна — 6 пуд., буйной рагатай жывёлы — 3 шт., 1 свінню, 3 авечкі, падпісацца на пазыку ў 150 руб., здаць воўны 8 фунтаў, мёду 7 пуд.».

Маецца некалькі выпісак пасяджэнняў падатковай камісіі аб прызнанні гаспадаркі кулацкай, таму што наймалі для пасьбы жывёлы пастуха і частку зямлі аддавалі ў арэнду, мелі сілу па найму. І хаця неаднаразова паступалі заявы С. Ф. Касцюка, зрабілі вопіс маёмасці, усё заставалася па-ранейшаму. «У 1930 г. было цвёрдае заданне здаць хлеба 50 пуд.,— аддаў 20 пуд., ільнасемя 2 пуды — здаў поўнасцю, сена 30 пудоў — здаў 28 пуд., адна адзінка буйной рагатай жывёлы — здаў поўнасцю, дзве авечкі — здаў дзве авечкі і г. д. Павялічыўшы зямлю для хатняга пакосу, дзе было балота і карчы, зусім не касіў, таму што ўсё згарэла, а падатак налічылі з 6 га. Не выканаў поўнасцю ўсё заданне, быў аштрафаваны на 100 руб., але такіх грошай не было, узялі адну карову і прысудзілі 6 месяцаў прымусовых работ». У заяве ўказваецца просьба да падатковай камісіі, каб паменшыць індывідуальны падатак, таму што ў сям'і толькі два чалавекі працаздольных і пяць дзяцей ва ўзросце ад аднаго да 16 гадоў.

На працягу года цягнулася гэтая перапіска, але ўсюды гаспадарку называлі кулацкай і яна абкладвалася высокім індывідуальным падаткам. І вось у адным з апошніх данясенняў начальніка міліцыі Жыткавіцкага раёна ад 23 верасня 1931 г. чытаем: «У кулака Касцюка маёмасць забралі 1 верасня і раскулачылі».

Цяжка прасачыць далейшы лёс гэтай сям'і, бо няма вопісу маёмасці, невядома, куды выселілі...

Усе дарослыя члены сем'яў, абкладзеныя падаткам у індывідуальным парадку, былі пазбаўлены выбарчых правоў, праводзілася «адчужэнне маёмасці, яны высяліліся за межы БССР». Так выселілі сям'ю Н. П. Страхі, якая складалася з дзесяці членаў: жонка 63 гадоў, сын з нявесткай і сем унукаў ад 10 гадоў да трох тыдняў ад роду. Такі ж лёс напаткаў і сем'і І. А. Мусіка з жонкай і чатырма дзяцьмі, М. Э. Ера-

мяевіча — адзінаццаць чалавек, шэсць малалетніх дзяцей. Трагічна склаўся лёс Н. Н. Малочкі, якая жыла ў Юркевіцкім сельскім Савеце. «...Муж Іван Максімавіч сасланы на Салавецкія астравы, старэйшы сын Уладзімір хворы туберкулёзам у трэцяй стадыі і знаходзіцца пры смерці. Жонка сына, Вольга, адна працуе, у яе чацвёра малалетніх дзяцей. Сельскагаспадарчы падатак налічаны ў суме 220 руб. 35 кап. Для ўплаты такой сумы патрэбна прадаць усю жывёлу, і сям'я з сямі душ пазбавіцца сродкаў да існавання... Жанчына просіць, каб паменшылі падатак напалавіну, бо ваўначоска, якая ёсць у гаспадарцы, бяздзейнічае без мужа і даходу ад яе няма». На заяве стаіць рэзалюцыя сельскага Савета, што гаспадарка абкладзена індывідуальна, скарга пакінута без вынікаў, у хадайніцтве адмоўлена.

У канцы 1931 г. падводзіліся вынікі «года вялікага пералому», барацьбы з кулацтвам. У Жыткавіцкім раёне намечана да высялення 57 гаспадарак, зацверджана акружным выканкомам 50. Гэта быў толькі першы год пакут сялянства, а колькі іх яшчэ наперадзе!..

Л. П. Патук

АКТ

12 сакавіка 1930 г.

Склалі гэты акт наступныя грамадзяне: Лісовіч Пятро Цімохаў, старшыня сельсавета, сакратар с/с Доваль, член с/с Альферка.

Аб выдатку прадуктаў і інвентару раскулачанай сям'і Малочкі Івана Максімавіча, вёскі Юркевічы, гэтага с/с, Жыткавіцкага раёна

№№ п/п	Назва прадуктаў і інвентару	Колькасць	Сума	№№ п/п	Назва прадуктаў і інвентару	Колькасць	Сума
1.	Мукі	12 п.	25 руб. 92 кап.	13.	Місак вялікіх	2 шт.	1 руб. 50 кап.
2.	Капусты	1 п.	1 руб.	14.	Чыгуноў малых	2 шт.	2 руб.
3.	Агуркоў	1 п.	1 руб.	15.	Чыгуноў вялікіх	2 шт.	2 руб. 40 кап.
4.	Сякера	1 шт.	2 руб.	16.	Сіта	1 шт.	0,80 кап.
5.	Лапата	1 шт.	0,75 кап.	17.	Дзежка	1 шт.	1 руб.
6.	Збруя		15 руб.	18.	Палатно	35 м	12 руб. 25 кап.
7.	Соль	2 п.	1 руб. 24 кап.	19.	Вілак кухонных	1 шт.	0,40 кап.
8.	Печаны хлеб	12 ф.	1 руб. 20 кап.	20.	Качарга жалезная	1 шт.	0,40 кап.
9.	Вядро	1 шт.	1 руб.	21.	Піла	1 шт.	2 руб. 50 кап.
10.	Скавароды	2 шт.	1 руб. 20 кап.	22.	Сундук	1 шт.	25 руб.
11.	Ложкі	6 шт.	0,36 кап.	23.	Вяроўка	3 м	3 руб.
12.	Місак малых	2 шт.	1 руб.				

У с я г о: 102 руб. 92 кап.

Роспісь прысутнічаючых:

СПІСАК
маёмасці, забранай у кулацкіх гаспадарак па Пухавіцкаму с/с Жыткавіцкага раёна

№ п/п	Назва маёмасці	Колькасць	Сума	№ п/п	Назва маёмасці	Колькасць	Сума
1.	Хаты	25	2900	4.	Варыўні	13	180
2.	Сараі	39	1425	5.	Гумны	11	760
3.	Амбары	24	200	6.	Коні	49	1715

7.	Валы	8	790	19.	Крупадзёрак	1	40
8.	Каровы	70	2865	20.	Жыта ў снапах	54	415
9.	Жарабяты	6	200	21.	Жыта ў зёрнах	145,2	202
10.	Цяляты	77	925	22.	Авёс у снапах	22	214
11.	Свінні	51	864	23.	Авёс у зёрнах	75,2	151
12.	Авечкі	100	347	24.	Грэчка ў снапах	14	121
13.	Вазоў	26	670	25.	Грэчка ў зёрнах	75	112,5
14.	Плугоў	23	161	26.	Пшаніца	12	24
15.	Барон	19	57	27.	Проса	125	250
16.	Саломарэзак	6	252	28.	Льняное семя	38,3	66
17.	Веялак	5	380	29.	Канаплянае семя	5,02	—
18.	Малацілак	4	720	30.	Гарох	4	—

Усяго: 17005-50

Старшыня

Сакратар

ЗВЕСТКІ
ПА ЮРКЕВІЦКАМУ СЕЛЬСАВЕТУ НА 15 САКАВІКА 1930 г.

Лік раскулачаных гаспадарак 24
Лік аднятых валоў 14
» коней 32
» кароў 78
» авечак 156
» свіней 73
» іншай жывёлы 91

на суму 19 954 р.

Лік аднятых плугоў 25
» барон 12
» саломарэзак 13
» сеялак 4
» малацілак 4
» іншага інвентару 23

на суму 2310 р.

Лік аднятых хат 26
» хлявоў 28
» гумнаў 14
» іншых будынкаў 6

ОПИСЬ
имущества гр. д. Сукачей, Юркевичского с/с, Житковичского района Еремеéвича Михаила Эммануиловича

№№ п/п	Наименование инвентаря и домашнего имущества	Количество	№№ п/п	Наименование инвентаря и домашнего имущества	Количество
1.	Жилых домов	2	19.	Одеял	7
2.	Гумно на двое дверей	1	20.	Сукно	16 м
3.	Сарай на семеро дверей	1	21.	Сало	2 пуд.
4.	Амбар	1	23.	Просо семенное	3 п.
5.	Лошадей	2	24.	Суровых ниток	15 кл.
6.	Коров	6	25.	Выделанных кож	1
7.	Телушек	2	26.	Возов железных	3
8.	Волов	2	27.	Мука	20 п.
9.	Быков	1	28.	Плугов	3
10.	Свиней старых	3	29.	Веревочных машин	1
11.	Подсвинков	2	30.	Бочка с просом	20 п.
12.	Овец	11	31.	Бочка ржи	20 п.
13.	Сундуков больших	3	32.	Бочка овса	9 п.
14.	Машин швейных	1	33.	Бочка с гречкой	40 п.
15.	Бочонки с вещами	4	34.	Семенной пшеницы	7 п.
16.	Полотно тонкое	24 кус. и 1 кус. грубого	35.	Рожь немолоченная	5 коп.
			36.	Молотилка с приводом	1
			37.	Арфа	2
17.	Намиток	22	38.	Соломорезка	1
18.	Сачков	3	39.	Хомуты	2

40.	Седелки	2	42.	Стан колес	4
41.	Ободья	4	43.	Сено в сарае	18 возов

Члены комиссий по описи имущества:
от РВК Председатель ККОВ — *Разанов*
Член комиссии от д. Юркевичи — *Володько*
Член с/с д. Сукачи — *Лавникович*

3 февраля 1930 г., д. Сукачи

ПРАТАКОЛ
пасяджэння камісіі па правядзенню конкурса на хутчэйшае і лепшае сканчэнне веснавой сяўбы і калектывізацыі ад 30.VI.31 г.

Прысутнічалі: Буцько, Буянаў, Міхалюк, Палей, Рачкоўскі, Ляўковіч, Квятняк, Занько, Ішчанка, Кубліцкі.
Слухалі: Аб размеркаванні прэміі лепшым калгаса.
Пастанавілі: За хутчэйшае сканчэнне веснавой сяўбы і калектывізацыі прэміраваць наступныя калгасы і калгаснікаў:

Чарацянка	300 р.
Чарвякоў (Гулевічы)	300 р.
Сталіна	100 р.
Калініна	100 р.
Старшынь сельсаветаў: Юркевічы—Глебкіна	50 р.
Сакратара ячэйкі КП(б)Б: Дуброва	30 р.
Старшыню Жыткавіцкага с/с — Ярмоша	30 р.
Упаўнаважанага РВК па Жыткавіцкаму с/с — Кісялюка	50 р.
Старшынь калгасаў — Кісялёва (Чырвоны маяк)	30 р.
Купрацэвіча Фёдара (калгас Сталіна)	30 р.
Васілеўскага Пятра (Калінаўка)	30 р.
Савіча Васіля (VI з'езд)	30 р.
Старшыню калгаса «Зорка»	30 р.
Ударнікам-калгаснікам (2 чал.) — к/г Чарвякова	25 р. кожнаму
Ударнікам-калгаснікам (2 чал.) — к/г Камінтэрн	25 р. кожнаму
Ударнікам-калгаснікам (2 чал.) — к/г Чарацянка	25 р. кожнаму
Ударнікам-калгаснікам (2 чал.) — к/г «Чырвоная зорка»	25 р. кожнаму
Ударнікам-калгаснікам (2 чал.) — к/г VI з'езд Браніслаўскага с/с	25 р. кожнаму

Прасіць прэзідыум РВК вынесці падзяку за добрасумленную работу ў час веснавой сяўбы спецыялістам сельскай гаспадаркі: землеўпарадкавацелям — Побалю, Воўкаву і аграному Кубліцкаму.

Сакратар Жыткавіцкага РВК — *Рубінчык*

ДА ў г. Мазыры, ф. 52, воп. I, сс. 143а, 402, 436.

Дзяніс Сырамаха

Д. Р. Сырамаха

У той час, калі малы Дзяніс Сырамаха няньчыў сваіх яшчэ меншых братоў, выціраючы насы падоламі зрэбных сарочак і кормячы поснай заціркай самага меншага з іх (маці памерла, калі яму было паўгода), Дзянісаў бацька загадзя ламаў галаву над цяжкай геаметрычнай задачай: як гэта будзе падзяліць адну дзесяціну зямлі на чатырох сыноў,

каб усім хапіла. Задача не рашалася. І ўдоўж нарэжаш — вузка выходзіць, і ўпоперак — коратка. Як ні круці, а больш як квадратны лапаць зямлі не прыходзіцца на кожнага сына. А сынам і малым ужо цесна на адной дзесяціне, і не так яшчэ цесна, як голадна. Прыйшлося ісці прасіць ласкі ў пана Нарэйкі ды ў папа Вячоркі. А яны людзі «жаласлівыя», пашкадавалі Дзянісавага бацьку:

— На табе, Рыгор, зямелькі. Працуй здароў. Мы шмат з цябе і не возьмем — два снопікі з трох.

Нічога не зробіш, пакуль не рашыў задачы, прыйшлося згадзіцца. Але ў пана і папа горлы шырокія,— і двума снапамі іх ніяк не заткнуць: пры дзяльбе яны яшчэ і з трэцяга, Рыгоравага, стараюцца ўварваць жменю-другую. А яшчэ ж цару трэба, богу таксама трэба. Гляне Рыгор — з трох нажатых ім снапоў засталася яму ўсяго толькі невялічкая жменька. Падрос крыху Дзяніс. Стаў браць яго бацька сабе на падмогу. Але і ўдвух ніяк не могуць заткнуць горла сваім «дабрадзеям».

А тым часам і гарматы загрукаталі, і паклікаў «цар-бацюшка» васемнаццацігадовага Дзяніса, і благаславіў яго поп Вячорка.

— Ідзі, Дзяніс, абараняй родную зямельку ад немца-басурмана.

Дзянісаў дзед, мікалаеўскі салдат, дваццаць год служыў «цару-бацюшку» за адну дзесяціну, а колькі прыйдзецца біцца за адну чвэрць дзесяціны, якая прыпадала на Дзянісаву долю, Дзяніс не ведаў — можа, год, а мо таксама дваццаць, а мо і зусім давядзецца палажыць недзе сваю галаву.

Але прыйшоў Кастрычнік, і не стала ні пана Нарэйкі, ні «цара-бацюшкі». І пайшоў Дзяніс Сырамаха з шашкай у руках рашаць тую самую геаметрычную задачу, над якою ламаў галаву яго бацька. Рашаючы гэту задачу, вычэрчваў ён клінком розныя геаметрычныя фігуры на чарапах дзянікінцаў, мамантаўцаў, врангелеўцаў, пілсудчыкаў. Пад Пачаевам ён амаль пяць кіламетраў поўз з сваімі сябрамі — Ліхоткіным і Кастрыкіным,— каб падкрасціся да польскага паста. І не паспелі паны ахнуць, як адзін з іх ляжаў мёртвым, а другі, звязаны конскімі папругамі, паслухмяна ішоў у штаб пад надзейнай вартай. За праяўлены гераізм у радах Чырвонай Арміі Дзяніс Сырамаха мае ганаровую грамату ад Рэўваенсавета 1-й Коннай арміі.

Як разведчык першага разраду артдывізіёна, ён разам з слаўнай Чангарскай дывізіяй прамераў неабсяжныя прасторы Савецкай краіны — ад Арла да Баку, ад Баку да Ноўгарада-Валынскага, ад Ноўгарада-Валынскага да Перакопа і далей да Севастопаля. І ўбачыў Дзяніс, што зямелькі шмат, што хопіць яе ўсім сынам Савецкай краіны, колькі б іх ні было, і што зусім не трэба ламаць галаву, як яе падзяліць. Таму Дзяніс пачаў гаспадарыць так спакойна і ўпэўнена, калі ў 1930 годзе ў вёсцы Дварэц арганізаваўся калгас і яго выбралі старшынёй праўлення.

Шосты год Сырамаха — нязменны старшыня гэтага калгаса. Заслугамі сваімі хваліцца ён не любіць, нават ледзь не забыўся ў гутарцы пра тую «дробязь», што за час свайго старшынства прэміраваны быў адзінаццаць разоў, у тым ліку экскурсіяй у Азова-Чарнаморскую вобласць, якую ён калісьці памагаў вызваляць ад ворага. За ўсе шэсць год ні адзін калгаснік не выйшаў з калгаса імя 13 гадавіны Кастрычніка, якім кіруе Сырамаха. І гаспадарка ў яго такая, якая пану Нарэйку і не снілася: 87 коней, сытых і дагледжаных; малочная ферма — 107 кароў; свіная ферма — 111 штук свіней; пчол — 24 вуллі; вялікі малады сад, які ў 1935 годзе даў прыбытку

4300 рублёў. Калгаснікам у гэтым годзе калгас даў 67 парасят, замест намечаных па плану 46.

Ураджай жыта ў сярэднім па калгасе — 15,3 цэнтнера. Для Тураўскага раёна гэта не так ужо мала. А лепшы памочнік т. Сырамахі, брыгадзір першай брыгады Субат Цімох, дабіўся па ўчастку сваёй брыгады 18,3 цэнтнера з гектара.

Дзяніс Сырамаха прыехаў у Мінск на Усебеларускую нараду ўдарнікаў у ліку іншых васьмісот дэлегатаў. Яны прыехалі з розных куткоў Савецкай Беларусі, каб разам з кіраўнікамі партыі і ўрада абмеркаваць, як найлепш змагацца за 7—8 мільярдаў пудоў збожжа для Савецкага Саюза.

...Шырокія далоні Дзяніса Сырамахі шчыльна прылягаюць адна да другой, і сусед адхіляе галаву, баючыся за свае барабанныя перапонкі. Няхай паспрабуе які-небудзь Нарэйка паткнуцца па «свае» два снапы!

Кандрат Крапіва. 1936 г.

Арыфметыка Дзяніса Сырамахі

У 30-я гады імя Дзяніса Сырамахі было шырока вядома на Тураўшчыне. Слава аб калгасе «13-ы Кастрычнік» грымела!.. На той час гэта была сапраўды буйная гаспадарка, хоць, вядома, не можа ісці ні ў якое параўнанне з дасягненнямі сучаснага калгаса «Новае жыццё», адной з лепшых гаспадарак у Жыткавіцкім раёне, у падмурак якой закладзены яшчэ Дзянісам Сырамахам камяні колішняга «13-га Кастрычніка». Як ні як, а з кожнага з 400 гектараў збіраюць штогод не менш як па 50—60 цэнтнераў збажыны, звыш 300 цэнтнераў бульбы — і гэта яшчэ не самыя высокія ўраджаі. Асобныя ўчасткі даюць да 70 цэнтнераў зерневых з гектара.

А як склаўся далейшы лёс праслаўленага Кандратам Крапівой на ўсю рэспубліку старшыні калгаса Дзяніса Сырамахі? Вось што расказвае 80-гадовы Цімафей Савіч Субат.

— Памятаю, як прыязджаў у Дварэц Крапіва. Улетку гэта было... Хадзіў па вёсцы, у праўленні калгаса сядзеў. Усё больш з начальствам, з Сырамахам знаўся, ён, мусіць, і расказаў Крапіве пра мяне. Я толькі і бачыў яго здалёк — высокі, худы...

Лёс Дзяніса Сырамахі, як і многіх іншых у той неспакойны час, склаўся незайздросна. У 1938 г. не мінула яго горкая чаша рэпрэсій. Тады ў раёне прашумела «справа Левіна», начальніка раённай ветэрынарнай службы, які быццам бы з шкодніцкіх намераў рабіў жарэбым кабылам прывіўкі, каб тыя абарціравалі. І была ў раёне цэлая «шпіёнская сетка», у якую трапіў і Сырамаха. Следчым тэрмінова спатрэбіліся «саўдзельнікі», вось і трапіў старшыня пад гарачую руку, тым больш што быў блізка Дварэц і Тураў — амаль адно і тое ж.

Вярнуўся з лагераў ён пасля адбыцця поўнага тэрміну зняволення ў 1946 г. Сям'я да гэтага часу распалася, а было ў Дзяніса пяцёра дзяцей — сын і чатыры дачкі. Хадзіў Дзяніс Рыгоравіч ніякаваты, з патухшымі вачыма, відаць, перажыў такое, што ўсякую цікавасць да ўсяго страціў... Ішоў час, пакрыху адходзіў былы вязень, быццам ажыў, пачаў працаваць у калгасе, у апошнія гады — брыгадзірам. Пражыў Дзяніс Рыгоравіч Сырамаха 82 гады, памёр у 1981 г. Хавалі яго з гонарам, усёй вёскай — як героя грамадзянскай вайны, у якога ў час арышту ў 1938 г. адабралі ганаровую грамату Рэўваенсавета 1-й Коннай арміі, праслаўленага старшыню калгаса, ганаровага калгасніка...

Ды і на долю Цімафея Субата выпала нямала. Прайшоў усю Айчынную вайну, пры штурме Дан-

цыга ў 1945 г. быў цяжка паранены, стаў інвалідам другой групы. Нямецкі метал да гэтага часу сядзіць у руцэ і ў плячы... У гады ліхалецця загінулі два малалетнія сыны — Міколка памёр ад апёкаў, калі фашысты палілі вёску. Віця, васьмі гадоў, падарваўся на міне... Многімі баявымі ўзнагародамі адзначаны цяжкі ваенны шлях ветэрана. Амаль дваццаць гадоў узначальваў паляводчую брыгаду, працаваў у жывёлагадоўлі, нямала ўзнагарод у Цімафея Савіча і за старанную працу.

І справа ветэранаў жыве. Любоў да зямлі, да сялянскай працы яны перадалі дзецям. Усе пяцёра дзяцей Дзяніса Сырамахі працуюць у родным калгасе. Тут таксама жывуць дочкі і Цімафея Субата, а малодшы сын Міхаіл узначальвае вядомы ў Жыткавіцкім раёне калгас «XX партз'езд» на другім беразе Прыпяці. Што ж, Дзяніс Сырамаха яшчэ ў далёкім 1918 г. зразумеў, «што зямелькі шмат, хопіць яе ўсім сынам савецкай краіны, колькі б іх не было, і што зусім не трэба ламаць галаву, як яе падзяліць, таму і пачаў гаспадарыць спакойна і ўпэўнена...» Задача, аказваецца, рашалася проста, і галоўнае дзеянне ў ёй — памнажэнне...

Васіль Феранц

СПРАВА АБ «ШПІЁНАЖЫ»

Пасля грамадзянскай вайны Арцём Сачыловіч выхоўваўся ў сям'і дзядзькі, бацька аказаўся па польскі бок. Хлопец рос працалюбівым, паслухмяным, вучыцца змог мала, дапамагаў дзядзьку — пасвіў скаціну, араў, убіраў хлеб... Прыйшоў час, Арцём жаніўся на вясковай дзяўчыне Парасцы, якая палюбілася яму. Паставіў хаціну, завёў кароўку, зямлю атрымаў. Дачушка Марыйка хутка нарадзілася. Жылі, радаваліся, працавалі і былі па-свойму, па сялянску шчаслівымі.

У 1933 г. больш жорсткім стаў рэжым жыцця ў прымежнай зоне. Усіх, у каго была радня па той бок граніцы, высялялі. Прыйшла бяда і ў хаціну Арцёма Сачыловіча. Куды падацца?.. І вырашылі яны з Параскай прабірацца за кардон, да бацькі.

Граніцу ўдалося перайсці непрыкметна, і хутка былі ў Мілевічах. Бацька прыняў стрыманa, і, як патрабавалася, назаўтра раніцай далажыў уладам пра гасцей з таго боку. Арцёма разам з жонкай забралі ў паліцыю, усё распыталі — адкуль прыйшлі і з якой мэтай, хто начальнік заставы, колькі там чырвонаармейцаў, куды вядуць тэлефонныя лініі, якія тавары прадаюцца ў Жыткавічах.

Арцём расказваў, што ведаў, асабліва не адкрываўся, гаварыў па-сялянску скупа. Праверка працягвалася доўга, відаць, палякі сумняваліся — ці не лазутчык. Накіравалі ў Лунінец, у гарадскую турму, але і там многа не даведаліся.

Бацька ўпрасіў улады не адпраўляць Арцёма з сям'ёй назад у Савецкі Саюз, паручыўся за сына...

Усё змянілася з прыходам Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г. 21 кастрычніка ў хаціну Арцёма Сачыловіча зайшлі трое і сказалі: «Вы арыштаваны». Ужо ўвечары Арцёма павялі на допыт. Ён не адчуваў за сабой ніякай віны, верыў у справядлівасць савецкіх органаў, але першыя пытанні насцярожылі.

— Дзе і калі вам прапаноўвалі пайсці ў Савецкі Саюз з шпіёнскім заданнем? — строга спытаў следчы.

— Ніхто не прапаноўваў, і я ніколі не хадзіў у СССР,— Арцём пачынаў хваляваца. Допыт у першы раз працягваўся нядоўга.

...Праз тыдзень Арцёма зноў выклікалі на допыт, на гэты раз ноччу.

— Падумайце пра свой лёс. Следству ўсё вядома.

— Ніколі не працаваў на польскую разведку. Не ведаю, дзе яна ёсць...

Потым яго доўга не вадзілі на допыты, падбіралі следчага — патрабавальнага і жорсткага, ва ўсіх было работы па горла. Новы следчы пачаў з месца ў кар'ер: абвініў Арцёма ў сувязях з польскай разведкай, пагражаў прымяніць больш жорсткія меры. Арцём вымушаны быў адказваць так, як патрабаваў сяржант дзяржбяспекі Камазін. Але, як вучылі навучаныя горкім вопытам сябры па няшчасцю, многа на сябе не браў.

— Якія звесткі вы паведамілі ў трыццаць чацвёртым годзе на допыце ў Грабаўскай паліцыі?

— Я паведаміў пра начальніка заставы.

— Даўно б так. А то ўпіраўся,— сяржант Камазін не хаваў задавальнення.

ГАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

Трэба было дапрасіць сведкаў — і справе канец.

«На допыце сведкі паказалі наступнае:

1. Сачыловіч Стахей, 1913 г. нараджэння, в. Мілевічы Жыткавіцкага раёна: На нашым баку пасля ўходу ў Польшчу я не бачыў Сачыловіча Арцёма.

2. Хаміцэвіч Еўдакія: Ці прыходзіў ён на савецкі бок, мне невядома.

3. Чопчыц Майсей, 1871 г., непісьменны: Пасля таго, як Сачыловіч пайшоў, я яго ні разу не бачыў. Узаемаадносіны ў мяне з ім былі нармальныя...

Толькі Іван Тарцан паказаў, нібы Сачыловіч паведамляў Пятроўскаму пра настрой людзей у вёсцы.

Аднак у абвінаваўчым заключэнні следчы капітан дзяржбяспекі Тупіцын запісаў: «Сачыловіч... прызнаў сябе вінаўным у тым, што нелегальна уцёк з СССР у Польшчу, перайшоў на бок ворага і здрадзіў Савецкай Радзіме... Дапытаныя па справе сведкі ў дастатковай меры разаблачылі Сачыловіча А. А. у зробленым ім злачынстве»...

Шытая «белымі ніткамі» справа Арцёма Сачыловіча накіроўваецца не ў суд ці ў ваенны трыбунал, а туды, дзе няма ні абароны, ні абвінавачвання — у Асобую нараду НКУС СССР. І вось яго пастанаўленне ад 27 чэрвеня 1940 г.: «Сачыловіча А. А., як сацыяльна небяспечнага элемента, зключыць у выпраўленча-працоўны лагер тэрмінам на 8 гадоў.

Начальнік сакратарыята Асобай нарады пры НКУС СССР Хват».

У спецыяльнай анкеце-мемарандуме, адказваючы на пытанне: «Ці можна вербаваць і для якой работы?» — следчы запісаў: «не рэкамендуецца, мала карысці з маларазвітасці».

Восем гадоў пакутаваў на зямлі Варкуты, на будаўніцтве Паўночна-Пячорскай дарогі селянін Сачыловіч. Прыйшоў час, вярнуўся ён на бераг роднай Случы, падышоў па знаёмай сцяжынцы да сваёй хаціны. Але не было хаты. Сям'я жыла ў Новых Мілевічах у зямлянцы, якая была выкапана на сотках жончынай сястры. Пры святле лучыны ўбачыў жонку, сваіх дзетак...

Не прайшло і двух гадоў, і зноў — душная турма, допыты, якія вымятваюць душу.

— Дзе знаходзіліся ў момант арышту ў сакавіку 1949 года?

— На агародзе...

— Кім былі завербаваны ў час пераходу дзяржаўнай граніцы?

— Завербаваны не быў.

— Вы гаворыце няпраўду!.. Мы прымусім вас прызнацца.

Следчаму Гарбунову патрабаваўся агент варожай разведкі, ён «выжымаў» тое, што яму патрэбна. Шпіянаж караўся смерцю, таму Гарбуноў стараўся з ўсіх сіл... Сачыловіч, як мог, абараняўся, ён ведаў, што за гэтымі цяжкімі абвінавачваннямі непазбежна вышэйшая мера пакарання.

12 мая 1949 г. абвінаваўчае заключэнне зацвердзіў Міністр дзяржбяспекі БССР генерал-лейтэнант Л. Цанава. Мера пакарання — высылка на пасяленне. У пратаколе аб канфіскацыі маёмасці значыцца: «бычок белы 1,5 года, цялушка чырвоная». І тут жа: «Марыя, 1931 г., Таццяна, 1940 г., Іван, 1949 г.»... Гэта — дзеці Сачыловіча.

Няма цяпер на тым месцы, каля ракі, ні людзей, якія тут жылі, ні хаткі, усё зарасло бур'яном, і толькі адно дрэва — рабіна помніць пра тое, што было. Птушкі сядаюць на яе, дзяўбуць чырвоныя сакавітыя ягады, але тут жа кідаюць іх — вельмі яны горкія на гэтым дрэве...

Анатоль Сульянаў
(З кнігі «Арыштаваць у Крамлі»)

Канвеер смерці

Каля 900 землякоў-жыткаўчан,— земляробаў, рабочых, працавітых людзей з мазолістымі рукамі — расстраляна на працягу некалькіх месяцаў 1937 і 1938 гадоў у Мазыры, на перакрыжаванні дарог у былы абласны цэнтр і Калінкавічы, ва ўрочышчах вакол Мазыра. А ўсяго тут, па апошніх звестках, адляцела 2986 жыццяў — маладых і сярэдняга ўзросту, вельмі рэдка — старэйшага, каля пяцідзесяці... Тых, у каго было наперадзе ўсё жыццё, поўных сіл і энергіі, хто мог нарадзіць дзяцей, зрабіць столькі добрага сваімі працавітымі рукамі для радзімы, сям'і, сябе, абараніць краіну ад смяротнай навалы фашызму, якая няўмольна насоўвалася і была ўжо так блізка. Яны падалі, абліваючыся крывёю, бязвінныя, з нямым пытаннем: «За што?»

За што... За сацыялізм, за ўсеагульнае шчасце, светлую будучыню

тых, каму наканавана было застацца на зямлі — без іх, незлічоных ахвяр сталіншчыны, толькі і жывым мала выпадала светлых, шчаслівых дзён...

Турма-засценак, дзе ішлі бесперапынныя допыты і здзекі над людзьмі, была абсталявана ў Мазыры ў святым месцы, у царкве. Вось як апісвае ўтрыманне ў ёй адзін з вязняў, якому цудам ўдалося выжыць, Уладзімір Рыгоравіч Невяркевіч. «Цьмянае мільганне лямпачкі, якое адкідвала на сцены злавесныя цені. Камера — крокаў пяць у даўжыню, не больш чатырох упоперак, бітком набітая людзьмі. Цені на сценах — гэта людзі, іх тут чалавек пятьдзесят, а то і шэсцьдзесят. Яны стаялі, сядзелі, ляжалі ўперамежку... На іх страшна, жудасна было глядзець — зарослыя, з ліпкімі брудныміі валасамі, у рваных лахманах, твары пачарнелыя, з завостранымі рысамі, шчокі ўпалыя. У цьмяна-цёмным святле яны былі падобныя на ажыўшых мерцвякоў. Ад жалезнай бочкі — парашы, што стаяла ў вуглу, ішоў страшны смурод, які змешваўся з цяжкім пахам поту, згніўшай саломы і сырасці... Людзі траціліразум, паміралі штодзень — ад хвароб, эпідэмій, знясілення, нечалавечых пабояў. Сюды ні разу не заглянуў доктар — зняволенымі ніхто не цікавіўся, усе яны былі асуджаны на смерць, як толькі трапілі сюды. Камера была адгароджана дошкамі вышынёй у два з паловай метры. Цэрква разбіта драўлянымі перагародкамі на шэсць камер, вокны забіты. Адсюль людзей вадзілі на допыты... Бліжэй да паўдня ў камеру зацягнулі мужыка, якога за два дні да гэтага павялі на допыт. Твар яго быў разбіты ў кроў, правае брыво глыбока рассечана, вока зацякло сіне-крывавай пухлінай. Рубашка — разарваныя лахманы, была ўся заліта крывёю. Мужык хрыпла дыхаў, з носа выляталі згусткі крыві»...

Пад кулі катаў ішлі дваццацігадовыя юнакі, як Іосіф Грабоўскі, 19-гадовая Рудніцкая Яніна разам з трыма братамі, сталыя, дарослыя сяляне з сваімі дзецьмі, Якаў Андрэевіч Верталь з Лагвошчаў разам з трыма сынамі — Вікенцієм, Вячаславам і 25-гадовым Уладзімірам, расстраляныя ў першы дзень масавага знішчэння зняволеных, 19 лістапада 1937 г., як 30-гадовая Кацярына Нікіценка з Грады, маці траіх дзяцей. Знішчаліся беларусы, украінцы і пагалоўна, усе да аднаго — палякі, нямецкія каланісты, хто нёс у вёску культуру, перадавыя метады гаспадарання. З твару зямлі знікалі цэлыя вёскі, з якіх вычысцілі, нібы жалезнай мятлой, усіх жыхароў — чым не фашысцкі генацыд? Так не стала, як праз некалькі гадоў Хатыні, вёскі Богушы на Тураўшчыне, дзе амаль усе жыхары насілі адно прозвішча Богуш, падобны лёс чакаў Лагвошчы, Рудню і многія іншыя вёскі, адкуль забралі і забілі большасць жыхароў, амаль усіх мужчын, старых і маладых. Дваццацігадовыя і трыццацігадовыя, поўныя жыцця, дужыя людзі, яны аказаліся бяссільнымі і бездапаможнымі перад нкусаўскім молахам. Братоў, бацькоў з сынамі ставілі побач, разам, забівалі ў адзін дзень усіх. Сярод іх мог быць кожны, мог быць і мой бацька, і абарваўся б наш род — у яго ў той час быў самы расстрэльны, трыццацігадовы ўзрост...

Як і кожнае злачынства, гэтае — масавае, зверскае, неразумнае — таксама мела сваіх ідэолагаў, натхняльнікаў і выканаўцаў. 30 ліпеня 1937 г. М. Яжоў вынес на разгляд сталінскага палітбюро аператыўны загад «Аб аперацыі па рэпрэсіраванні былых кулакоў, крымінальнікаў і іншых антысавецкіх элементаў». У гэтым сапраўды блюзнерскім дакументе дэтальна пералічваліся групы насельніцтва, якія падля-

галі рэпрэсіям, меры пакарання, даводзіўся парадак правядзення акцый, вядзення следства, выканання прыгавораў, а таксама каштарыс і справаздача... У раздзеле «Аб пакаранні рэпрэсіруемых і колькасці людзей, якія падлягаюць рэпрэсіям», указвалася, што ўсе яны разбіваюцца на дзве катэгорыі, лік іх з'яўляецца планавай разнарадкай і лічыцца заданнем. Як заданне па ўраджаі, па рэалізацыі дзяржаве жывёлы... Для Беларусі заданне было — 12 тысяч чалавек: 2 тысячы па першай катэгорыі і 10 па другой. Самавольнае павелічэнне намечаных паказчыкаў строга забаранялася, як і недавыкананне плана. Для гэтага павінны былі быць дастаткова аргументаваныя хадайніцтвы і падставы, якіх, як паказаў час, было дастаткова. План быў зацверджаны, палітбюро «самай чалавекалюбівай і справядлівай у свеце партыі» вызначыла тэрмін: «Пачаць аперацыю па ўсім Саюзе не пазней 5 жніўня». Спачатку ліквідаваліся тыя, хто трапляў пад першую катэгорыю, потым — пад другую. Страшэнная крывавая вакханалія пачалася... Аналагічных рашэнняў і распараджэнняў у будучым было больш чым дастаткова, каб знішчыць самую квецень нацыі, яе гордасць, розум і сілу.

Знішчаліся не толькі асобныя людзі — высякаліся цэлыя прозвішчы, усе карані. Бальшавікі баяліся «пятай калоны» ў сваёй «вольнай» краіне і браталіся з Гітлерам... Колькі праклёнаў паслана гітлераўцам, якія тварылі на нашай зямлі нечуваныя зверствы, ды то ж чужынцы, ворагі, а то «свае», бальшавікі — сталінскія «апрычнікі», у сябе, на сваёй зямлі, над сваім народам. Ніхто не ведае і ўжо не даведаецца пра тыя жудасныя здзекі, што выпалі на долю вязняў — гэта назаўсёды засталося з імі. «Падпішы»,— і ў выніку 10, а то і 20 гадоў лагераў, лесапавалу. Не ўсе згаджаліся падпісваць выдуманыя, паклёпніцкія абвінавачванні, спадзяваліся на справядлівасць — не ведалі, што ў гэтым выпадку іх чакае куды горшы лёс — куля ката...

Масавыя расстрэлы пачаліся з верасня 1937 г. Спачатку каты адвозілі людзей на знішчэнне ў далёкія ўрочышчы ў ваколіцах Мазыра — у Бярозаўку, за 20 кіламетраў ад горада, дзе 27 верасня 1937 г. адбыўся першы масавы расстрэл ахвяр сталінізму, у Гулевічы, Пеніцу, Боркі, Бабры, хоць асобныя расстрэлы тут адбываліся і раней, пачынаючы з 1933 г. Чым далей, тым больш... Потым вылюдкі перасталі саромецца, палічылі нявыгаднымі далёкія перавозкі, і з 19 лістапада расстрэлы пачаліся ў самым Мазыры.

У Мазыры расстрэльвалі не кожны дзень, такіх дзён наогул было нямнога. Масавыя расстрэлы працягваліся да 21 ліпеня 1938 г.— двойчы ў лістападзе, 1, 12, 24 і 29 снежня. У навагоднія святы ў катаў быў тыднёвы перапынак, затое 5 студзеня новага 1938 г. вывелі на смерць надзвычай вялікую, шматысячную партыю вязняў. Некалькі разоў расстрэльвалі ў студзені, у лютым, менш — у сакавіку і красавіку, ні разу — у чэрвені. Апошні, самы масавы расстрэл быў 21 ліпеня. Відаць, была зроблена грандыёзная ачыстка засценкаў, у Прыпяць сцякала цэлая рэчка крыві...

Адзін толькі год, з восені 1937 да лета 38-га... А было яшчэ жорсткае і бяссэнсавае раскулачванне ў пачатку 30-х, страшны голад у 1932 і 33-м, і новая хваля арыштаў пасля вайны — усё вытрымаў народ, заплаціўшы вельмі дарагую цану за нязбытны сацыялізм, за ўтопію...

В. Р. Феранц

Ахвяры масавых рэпрэсій — бязвінна загінуўшыя землякі ў гады сталінскага генацыду

АЗЯРАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АЗЯРАНЫ

ЛАЗАРЧУК Павел Іванавіч, у 1929 г. высланы ў Архангельскую вобл., дзе і загінуў.

ЛАЗАРЧУК Лукаш Герасімавіч, у 1929 г. высланы ў Котлас, дзе і загінуў.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Іван Іосіфавіч і яго жонка **ЛЕБЯДЗІНСКАЯ Настасся Адамаўна**, у 1929 г. высланы ў Котлас, дзе і загінулі.

КІРЭЙЧУК Мікалай Конанавіч, н. у 1881 г., у 1933 г. высланы з вёскі, лёс яго невядомы.

РАЙ Захар Мікалаевіч, н. у 1902 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ШВЕЦ Аляксей Мікітавіч, у 1929 г. высланы з вёскі і загінуў.

ЦЕРАШЧУК Павел, у 1929 г. высланы ў Котлас, дзе і загінуў.

ВЁСКА ЗНАМЕНКА

МЕЛЯШЧЭНЯ Андрэй Іванавіч, н. у 1874 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ВЁСКА ПАГОСТ

ІЛЬЕНЯ Іосіф, загінуў у 30-х гадах.

ІЛЬЕНЯ Максім і яго жонка **ІЛЬЕНЯ Параска**, высланы з вёскі ў 30-х гадах, лёс іх невядомы.

ТОРЧЫК Міхаіл Іванавіч, н. у 1881 г., расстраляны 31.1.1938 г.

ВЁСКА ЧЭРНІЧЫ

МАРКЕВІЧ Васіль Ціханавіч, н. у 1871 г., высланы ў 1929 г. і загінуў у месцы зняволення.

БРАНІСЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГРАДА

АХОЦЕНКА Аляксандр Антонавіч, н. у 1892 г., арыштаваны і высланы ў 1933 г. Зняволенне адбываў на будаўніцтве Беламорканала, далейшы лёс невядомы.

БОРДЗЮГ Кандрат, жыў непадалёку ад дзяржаўнай граніцы, быў на падазрэнні ў пагранічнікаў і арыштаваны ў ліпені 1933 г. Далейшы лёс невядомы.

ГАЛІЦКІ Луцыян Іванавіч, загінуў у 1932 г. каля граніцы.

КОС Аляксандр Лаўрэнцьевіч, ваяваў у першую сусветную вайну, быў у палоне. Старшыня мясцовага калгаса «Чырвоная Града». Арыштаваны і высланы ў 1932 г. Разам з ім высланы жонка Акуліна Міхайлаўна, дзеці Сяргей і Антаніна.

КОС Раман Лаўрэнцьевіч, член сельскага савета. Арыштаваны і высланы ў ліпені 1933 г. за невыкананне сельсаветам плана нарыхтовак.

ЛІСАВЕЦ Кацярына Васільеўна, выслана ў 1930 г. і загінула ў ссылцы. Разам з ёю былі малалетнія дзеці — Уладзімір, Аляксандр і Соф'я.

НІКІЦЁНКА Кацярына Паўлаўна, н. у 1908 г. Браты, якія жылі ў Доўгай Дуброве, хадзілі за мяжу, аднаго з іх забілі ў лесе каля Случы. Нікіценка К. П. арыштавалі за сувязь з братамі і расстралялі ў Мазыры 31.1.1938 г.

НОСАН Апанас, арыштаваны ў 1930 г. Разам з ім выслана жонка і дзеці — Аркадзь, Мікалай, Іван і Надзя.

САРОКА Лявон, н. у 1905 г., высланы ў 1933 г.

СУШЫЦКІ Васіль Іосіфавіч, н. у 1867 г. Трымаў парню, дзе гнуў абады для калёс. З году ў год абкладваўся цвёрдым падаткам, у 1937 г. раскулачаны, арыштаваны і расстраляны ў Мазыры 2.10.1937 г.

ВЁСКА БРАНІСЛАЎ

БОГУШ Юльян Адольфавіч, н. у 1899 г., жыў на х. Мар'янаўка, расстраляны 7.12. 1937 г.

БОГУШ Ганна Адольфаўна, рэпрэсіравана ў 1932 г.

БОГУШ Павел Сільвестравіч, н. у 1906 г., жыў на х. Свірнішча, расстраляны 21.7. 1938 г.

ВОЛЧАК Сцяпан Браніслававіч, н. у 1903 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ВОЛЧАК Альбін Аляксандравіч, н. у 1902 г., рэпрэсіраваны ў 1936 г.

ВОЛЧАК Васіль Яфімавіч, н. у 1902 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ВОЛЧАК Баляслаў Іванавіч, н. у 1902 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г.

ВОЛЧАК Адольф Іванавіч, н. у 1904 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г.

ГРЫЧЫНА Адам Іванавіч, н. у 1909 г., жыў на х. Гноішча, расстраляны 24.12.1937 г.

ДАБАСЕВІЧ Тэрэза Леанардаўна, н. ў 1905 г., расстраляна 19.11.1937 г.

ДУДЗІЧ Вячаслаў Паўлавіч, н. у 1905 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ДУДЗІЧ Уладзімір Мацвеевіч, н. у 1884 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ДУДЗІЧ Ігнат Мацвеевіч, н. у 1892 г., працаваў старшынёй калгаса ў Браніславе, расстраляны 16 лютага 1938 г.

ДУДЗІЧ Мікалай Пятровіч, н. у 1896 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ДУДЗІЧ Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1889 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЖУРАЎСКІ Вячаслаў Браніслававіч, н. у 1879 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ЛУКАШЭВІЧ Адам Фёдаравіч, н. у 1915 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

КАРНІЕВІЧ Іосіф Арцёмавіч, н. у 1904 г., расстраляны 1.12.1937 г.

КАМІНСКІ Станіслаў Пятровіч, н. у 1906 г., жыў на х. Гноішча, расстраляны 24.12.1937 г.

КРАЎЧУК Акім Іванавіч, рэпрэсіраваны у 1937 г.

МАЛІНОЎСКІ Сцяпан Пятровіч, н. у 1905 г., расстраляны 5.12.1937 г.

МАСЛАЎСКІ Мечыслаў Леанардавіч, н. у 1908 г., жыў на х. Мар'янаўка, загінуў 19.11.1937 г.

МАСЛАЎСКІ Леанард Рафаілавіч, н. у 1874 г., расстраляны 1.12.1937 г.

НАЎМОВІЧ Казімір Браніслававіч, н. у 1909 г., расстраляны 21.7.1938 г.

НЕКРАШЭВІЧ Якаў Фёдаравіч, н. у 1897 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

НЕКРАШЭВІЧ Сяргей Фёдаравіч, н. у 1903 г., расстраляны 1.12.1937 г.

РАНЧЫНСКІ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1913 г., расстраляны 19.11.1937 г.

РАНЧЫНСКІ Георгій Андрэевіч, н. у 1883 г., жыў на х. Мар'янаўка, расстраляны 19.3.1938 г.

РАНЧЫНСКІ Сямён Андрэевіч, н. у 1881 г., жыў на х. Мар'янаўка, расстраляны 19.11.1937 г.

РАНЧЫНСКІ Віктар Рыгоравіч, н. у 1898 г., раскулачаны і высланы ў 1931 г.

РАНЧЫНСКІ Арсень Рыгоравіч, н. у 1912 г., раскулачаны і высланы ў 1931 г.

РАНЧЫНСКІ Канстанцін Рыгоравіч, н. у 1911 г., расстраляны 5.1.1938 г.

РАНЧЫНСКІ Міхаіл Вікенцьевіч, н. у 1874 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ФЁДАРОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1902 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

РУДАКОЎСКАЯ Елізавета, разам з сынамі Іосіфам і Уладзімірам раскулачана і выслана ў 1933 г.

РУДАКОЎСКІ Іосіф Уладзіміравіч, н. у 1905 г., раскулачаны і высланы ў 1933 г.

РУДАКОЎСКІ Нікадзім Уладзіміравіч, н. у 1913 г., раскулачаны і высланы ў 1933 г.

САВІЦКІ Адам Францавіч, н. у 1887 г., расстраляны 1.12.1937 г.

СУШЧЫК Пётр Іванавіч, н. у 1903 г., расстраляны 27.9.1937 г.

СІВЫ Раман Іосіфавіч, н. у 1877 г., жыў на х. Свірнішча, расстраляны 7.12.1937 г.

СТРЫЧАК Аляксандр Карлавіч, н. у 1901 г., жыў на х. Мар'янаўка, расстраляны 1.12.1937 г.

ФЕШЧАНКА Фёдар Паўлавіч, н. у 1876 г., жыў на х. Калегава, расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА ВІЛЬЧА

КАНАПАЦКІ Мацвей Васільевіч, н. у 1892 г., рэпрэсіраваны ў 1933 г.

КАНАПАЦКІ Емяльян Іванавіч, н. у 1872 г., жыў на х. Залессе, расстраляны 2.10.1937 г.

КАНАПАЦКІ Сямён Іванавіч, н. у 1896 г., раскулачаны і высланы ў 1931 г.

КАНАПАЦКІ Фёдар Іванавіч, н. у 1906 г., раскулачаны і высланы ў 1931 г.

КАНАПАЦКІ Ігнат Мікалаевіч, н. у 1892 г., раскулачаны і высланы ў 1930 г.

КУЛАКЕВІЧ Максім Апанасавіч, рэпрэсіраваны ў 1932 г.

ТАНЧЫНСКІ Піліп Яфімавіч, н. у 1892 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ТАНЧЫНСКІ Іван Яфімавіч, н. у 1900 г., рэпрэсіраваны ў 1938 г.

ТАНЧЫНСКІ Якаў Яфімавіч, н. у 1902 г., арыштаваны ў 1937 г.

ВЁСКА ЗАГАЦЦЕ

КУЛАКЕВІЧ Іван Апанасавіч, н. у 1895 г., раскулачаны і высланы ў 1932 г.

КАНАПАЦКІ Віктар Фёдаравіч, н. у 1897 г., раскулачаны і высланы ў 1931 г., праз 3 гады вярнуўся і адразу памёр.

КАНАПАЦКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1895 г., раскулачаны і высланы ў 1933 г.

КУРЦ Іван Давілавіч, н. у 1893 г.

ТАНЧЫНСКІ Іосіф Яфімавіч, н. у 1895 г., раскулачаны і высланы ў 1933 г.

ВЁСКА КНЯЗЬ-БОР

КУЛАКЕВІЧ Іван Апанасавіч, н. у 1880 г., раскулачаны і высланы ў 1932 г.

КУЛАКЕВІЧ Якаў Сцяпанавіч, н. у 1873 г., раскулачаны і высланы ў 1932 г.

ЛІПІНСКІ Людвіг Мікалаевіч, н. у 1905 г., раскулачаны і высланы ў 1932 г.

Такое гаротнае наша жыццё...

Колькі давялося перажыць пры роднай Савецкай уладзе! Сэрца да гэтага часу абліваецца крывёй, калі ўспомніш бессардэчнасць, жорсткасць, несправядлівасць, якія тварылі над безабароннымі і бяспраў-

нымі сялянамі пад прыкрыццём чырвонага сцяга, сярпа і молата... І трэба было ўсё вытрымаць, выжыць — і не страціць веры ў Савецкую ўладу...

Мы перасяліліся сюды з Украіны ў 1909 г. Шукалі лепшай долі і, здавалася, знайшлі яе, калі па ленінскаму дэкрэту атрымалі зямлю, свабоду... Жыць бы, працаваць, мацаваць краіну мазолістымі рукамі. Але некаму не даспадобы была наша шчырая праца, вольнае жыццё — здавалася, відаць, што мала аддаём краіне, што недастаткова яшчэ зацяснуты гайкі... Мала парадаваліся зямельцы, дзеля якой столькі гора мыкалі па свеце. І пачалося з вясны трыццатага года...

Выйграў той, найбольш дальнабачны, які першым падаў заяву ў калгас. Гэта былі Андрэй Маркевіч, Рыгор Феранц, Андрэй Панчанка, Аляксандр Кос. Хутка да іх далучыўся і мой бацька, Архіп Паўлюк. Першым старшынёй гэтай невялікай арцелі стаў Аляксандр Кос. Калгас, які назвалі «Чырвоная Града», хутка рос, усё новыя сем'і далучаліся да калектыўнай гаспадаркі. І бяда была таму, хто не паспеў у час падаць заяву або здолеў жыць па тых мерках больш заможна, чым астатнія.

Ужо восенню 1930 г., напярэдадні зімы, пачулі сяляне новае і страшнае слова «раскулачванне», або «раскулачка», як тады гаварылі. Павезлі некуды на пагібель Ляўка Сароку разам з сям'ёй — тры малыя дачкі былі ў яго, Станіслава Катвіцкага, таксама з трыма дзецьмі, Апанаса Носана, Змітра Сушыцкага з трыма малалетнімі дзецьмі, Ганну Лісавец, удаву, у якой засталося чацвёра дзяцей, трохгадовая дачушка нават не даехала, казалі, да месца высылкі, памерла ў дарозе...

Якія гэта былі кулакі? Не ў кожнага была нават кашуля на змену, хлеба ніколі не елі ўдосталь, таму што ўсё чыста забіралі на хлебанарыхтоўкі. Самыя працавітыя, самыя гаротнікі... Ёсць конь і дзве каровы або два кані і карова — вось і кулак! Хто дзень і ноч шчыраваў, не ведаў ні будняў, ні свят, той жыў, вядома, крыху лепш, значыць — кулак... Лайдакі, абібокі сталі ў пашане: беднята!

Ні дня, ні ночы не бачыла Ганна Лісавец, гаравала з дзецьмі, застаўшыся без мужа. Дзень — у полі, на агародзе, ноччу да світання прала ніткі, ткала і прадавала свае няхітрыя зрэбныя вырабы, сама хадзіла ў лахманах — усё старалася выбіцца ў людзі, займець каня і карову. Расстаралася на конную малацілку — тут і раскулачванне. І паехала жанчына з дзецьмі ў свет, каб не вярнуцца больш ніколі, загінуць у невядомасці, у крыўдзе...

Знішчылі ўвесь цвет вёскі, самых шчырых, працавітых сялян. Потым быў голад у 1932 і ў 1933 г. Нямала слёз і гора дабавіў незабываемы 1937 г. Вайна, немцы спалілі вёску да апошняй хаты... І цяпер, ужо ў каторы раз, усё зноў прыходзіцца пачынаць спачатку.

А. А. Паўлюк

ВЕРАСНІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БУРАЗЬ

ДАРОШКА Рыгор Фадзеевіч, н. у 1903 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ДАРОШКА Прохар Трафімавіч, н. у 1917 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ДАРОШКА Фёдар Фёдаравіч, н. у 1893 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ДАРОШКА Якім Аляксеевіч, н. у 1886 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА ВАРОНІНА

МАЛОЧКА Трафім Мікітавіч, н. у 1901 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ВЁСКА ВЕРАСНІЦА

АРЦЮХОВІЧ Іосіф Уладзіміравіч, н. у 1903 г., расстраляны 16.2.1938 г.

БЕЛКА Іван Герасімавіч, н. у 1899 г., расстраляны 28.1.1938 г.
БЛОЦКІ Васіль Ніканавіч, н. у 1896 г., расстраляны 27.4.1938 г.
БЛОЦКІ Рыгор Іванавіч, н. у 1892 г., расстраляны 28.1.1938 г.
БЛОЦКІ Якім Рыгоравіч, н. у 1902 г., расстраляны 16.2.1938 г.
ВАШКОЎ Іван Яфімавіч, н. у 1888 г., расстраляны 5.1.1938 г.
ЖЫЛАН Арцём Іванавіч, н. у 1911 г., расстраляны 16.2.1938 г.
КАРАСЬ Мікалай Кузьміч, н. у 1907 г., расстраляны 5.1.1938 г.
МАТАРАС Марыя Фамінічна, н. у 1886 г., расстраляна 5.1.1938 г.
МАЖАКА Васіль Фядотавіч, н. у 1897 г., расстраляны 28.1.1938 г.
РЫДЗЕЦКІ Іван Яфімавіч, н. у 1878 г., расстраляны 5.1.1938 г.
ЖЫЛАН Кацярына Маркаўна, н. у 1891 г., расстраляна 5.1.1938 г.

ВЁСКА ЗАПЯСОЧЧА

БАЛБУЦКІ Сцяпан Мікалаевіч, н. у 1899 г., расстраляны 5.1.1938 г.
ГАРДЗЕЙЧЫК Рыгор Мітрафанавіч, н. у 1907 г., расстраляны 16.2.1938 г.
ЗАМЖЫЦКІ Даменік Іванавіч, н. у 1904 г., расстраляны 5.1.1937 г.

КАРАСЬ Кузьма Паўлавіч, н. у 1875 г., расстраляны 11.3.1938 г.
РУНКЕВІЧАнуфрый Васільевіч, н. у 1876 г., расстраляны 10.11.1937 г.
РУНКЕВІЧ Рыгор Васільевіч, н. у 1878 г., расстраляны 10.11.1937 г.
РУСЫ Харытон Фёдаравіч, н. у 1900 г., расстраляны 11.3.1938 г.
САНЕЦ Архіп Максімавіч, н. у 1885 г., расстраляны 29.12.1937 г.
САНЕЦ Спірыдон Міхайлавіч, н. у 1903 г., расстраляны 24.12.1937 г.
СТРУК Лявон Авакумавіч, н. у 1892 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА ЛЮБАВІЧЫ

КАДОЛІЧ Іван Мінавіч, н. у 1882 г., расстраляны 16.2.1938 г.
МАЛЬЦЭВІЧ Раман Цімафеевіч, н. у 1912 г., расстраляны 5.1.1938 г.
МАТАРАС Гардзей Савіч, н. у 1905 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА МАЛЫ МАЛЕШАЎ

БЫШ Марк Ерафеевіч, н. у 1907 г., расстраляны 29.12.1937 г.
КОМАР Нічыпар Рыгоравіч, н. у 1899 г., расстраляны 29.12.1938 г.
КОШМАН Іван Захаравіч, н. у 1912 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА ПОЎЧЫН

БАЛБУЦКІ Фёдар Пятровіч, н. у 1892 г., расстраляны 11.3.1938 г.
БЕЛКА Фама Адамавіч, н. у 1888 г., расстраляны 29.12.1937 г.
КУРБАН Цярэнцій Парфёнавіч, н. у 1897 г., расстраляны 27.3.1938 г.
САНЕЦ Архіп Нікіфаравіч, н. у 1882 г., расстраляны 24.12.1937 г.
ЧЫКІДА Фёдар Кірылавіч, н. у 1898 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ДЗЯКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БУДА

ДУБОЎСКІ Часлаў Рафаілавіч, н. у 1900 г., расстраляны 2.10.1937 г.
ДЫТМАН Эдуард Вільгельмавіч, н. у 1883 г., расстраляны 27.4.1938 г.
ЗЕЛІН Фердынанд Рудольфавіч, н. у 1875 г., расстраляны 2.10.1937 г.
КОРЗУН Франц Іосіфавіч, н. у 1894 г., расстраляны 29.12.1937 г.
КАЗЛОЎСКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1895 г., расстраляны 29.12.1937 г.
РЭМЕЗ Павел Усцінавіч, н. у 1887 г., расстраляны 2.10.1937 г.
РУНЦ Карл Іванавіч, н. у 1880 г., расстраляны 27.4.1938 г.
ФІНКЕ Герман Фердынандавіч, н. у 1879 г., расстраляны 2.10.1937 г.

ВЁСКА ВЯТЧЫН

БАРОДЗІЧ Раман Міхайлавіч, н. у 1902 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г.
БАРЫСЕВІЧ Марк Сцяпанавіч, н. у 1904 г., расстраляны 19.11.1937 г.
ВАРОНА Павел Якімавіч, н. у 1875 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г.
КАСАБУЦКІ Антон Дзям'янавіч, н. у 1894 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г.
ЧЭРКАС Павел Пятровіч, н. у 1874 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г.
ЦВІРКО Канстанцін Якубавіч, н. у 1891 г., жыў на х. Бахінь, расстраляны 24.8.1937 г.

ВЁСКА ДЗЯКАВІЧЫ

КУДЗЕЛЬКА Іван Ігнатавіч, н. у 1891 г., жыў на х. Альхова, расстраляны 27.9.1937 г.
ЧЭРКАС Аляксей Андрэевіч, н. у

1894 г., жыў на х. Альхоўка, расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА ПАСТАЛЫ

ВОТЧЫЦ Ціхан Паўлавіч, н. у 1894 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ІВАШКЕВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1911 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ІЛЕВІЧ Ігнат Адольфавіч, н. у 1900 г., расстраляны 1.12.1937 г.

КУРЦ Іван Карлавіч, н. у 1892 г., расстраляны 22.5.1938 г.

МІХАЛКОВІЧ Лявон Дзмітрыевіч, н. у 1900 г., расстраляны 16.2.1938 г.

МЛЫНЧАК Пётр Іванавіч, н. у 1896 г., расстраляны 10.11.1937 г.

РАЗАНОВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1895 г., рэпрэсіраваны ў 1938 г.

РУДАКОЎСКІ Афанасій Максімавіч, н. у 1896 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ПОНТА Карл Эдуардавіч, н. у 1897 г., расстраляны 22.5.1938 г.

СУДНІК Вячаслаў Адамавіч, н. у 1904 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ЖЫТКАВІЦКІ ГАРАДСКІ САВЕТ

БЕРТАШ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1888 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ДАВЫДЗЕНКА Мітрафан Іванавіч, н. у 1908 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ДАРАФЕЙ Анісім Ульянавіч, н. у 1905 г., жыў на х. Астравок, расстраляны 21.7.1938 г.

ДЗІДЗЮК Барыс Іванавіч, н. у 1912 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЗАЛЕЎСКІ Купрыян Антонавіч, н. у 1892 г., расстраляны 19.11.1937 г.

КАРЗО Дзмітрый Парфір'евіч, н. у 1893 г.,расстраляны 10.11.1937 г.

КАРЧЭЎСКІ Баляслаў Антонавіч, н. у 1896 г., жыў на х. Парасля, расстраляны 10.11.1937 г.

КОТ Фядос Іванавіч, н. ў 1889 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЛАХМАН Адольф Робертавіч, н. ў 1886 г., расстраляны 20.3.1938 г.

ЛОЎГАЧ Ілья Савельевіч, н. у 1904 г., санітар ветлячэбніцы, расстраляны 27.9. 1937 г.

ЛІТВІНОВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1899 г., расстраляны 16.2.1938 г.

МАСЛА Раман Казіміравіч, н. у 1898 г., расстраляны 27.9.1937 г.

МАЗЕЙКА Ціт Сідаравіч, н. у 1904 г., расстраляны 5.1.1938 г.

МАЦАР Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1876 г., расстраляны 10.11.1937 г.

МІРАНОВІЧ Данііл Гаўрылавіч, н. у 1875 г., жыў на х. Доўгае Поле, расстраляны 16.2.1938 г.

РЭВУС Ніканор Афанасьевіч, н. у 1895 г., расстраляны 2.10.1937 г.

САВІЧ Андрэй Іванавіч, н. у 1902 г., расстраляны 16.2.1938 г.

САНОЦКІ Рафаіл Цітавіч, н. у 1883 г., жыў на х. Балабанаў Лес, расстраляны 24.12.1937 г.

САЎЧЫЦ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1891 г., расстраляны 20.10.1937 г.

СЯДЛОЎСКІ Васіль Кандратавіч, н. у 1899 г., расстраляны 29.12.1937 г.

СІЁМКА Антон Ульянавіч, н. у 1881 г., цясляр, расстраляны 2.10.1937 г.

САЛЕЙНІКАЎ Адольф Сямёнавіч, н. у 1908 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЦІШКО Гаўрыл Васільевіч, н. у 1898 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ЮЗЮК Сяргей Міхайлавіч, н. у 1895 г., качагар, расстраляны 19.11.1937 г.

ЖЫТКАВІЦКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА КАЖАНОВІЧЫ

ВАНЮК Нічыпар Фёдаравіч, н. у 1893 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ВЁСКА НАДУБАВА

КІРБАЙ Казімір Юльянавіч, н. у 1908 г., расстраляны 21.7.1938 г.

НАУМОВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. у 1892 г., расстраляны 26.10.1937 г.

НАЎМОВІЧ Віктар Браніслававіч, н. у 1913 г., расстраляны 21.7.1938 г.

НАУМОВІЧ Казімір Браніслававіч, н. у 1909 г., расстраляны 21.7.1938 г.

НАУМОВІЧ Уладзімір Віктаравіч, н. у 1905 г., расстраляны 26.10.1937 г.

ВЁСКА ЧАРАЦЯНКА

АЛЬВІНСКІ Адольф Фаміч, н. у 1889 г., загінуў у месцы зняволення.

КІЯХОЎСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1893 г., расстраляны 26.10.1937 г.

КІЯХОЎСКІ Антон Антонавіч н. у 1906 г.

КІРБАЙ Казімір Юльянавіч, н. у 1917 г.

КІРБАЙ Аляксандр Юльянавіч, н. у 1916 г.

КІРБАЙ Герасім Лявонавіч, н. у 1916 г.

КЛЕПУСЕВІЧ Андрэй Валяр'янавіч, н. у 1904 г., расстраляны 26.10.1937 г.

КЛЕПУСЕВІЧ Дарафей Валяр'янавіч, н. у 1910 г., расстраляны 26.10.1937 г.

КЛЕПУСЕВІЧ Дарафей Уладзіміравіч, н. у 1905 г.

КЛЕПУСЕВІЧ Якаў Уладзіміравіч, н. у 1907 г.

КЛЕПУСЕВІЧ Якаў Валяр'янавіч, н. у 1899 г., расстраляны 26.10.1937 г.

НЕКРАШЭВІЧ Віктар Ільіч, н. у 1911 г., расстраляны 26.10. 1937 г.

НЕКРАШЭВІЧ Мікалай Пятровіч, н. у 1914 г., расстраляны 26.10.1937 г.

НЕКРАШЭВІЧ Мікалай Дзям'янавіч, н. у 1913 г.

НЕКРАШЭВІЧ Уладзімір Дзям'янавіч, н. у 1918 г.

НЕКРАШЭВІЧ Антон Васільевіч, н. у 1906 г.

НЕКРАШЭВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. у 1907 г.

НЕКРАШЭВІЧ Дзям'ян Антонавіч, н. у 1885 г.

ШЛЯГА Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1880 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ЛЕНІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

БУГАЙ Сцяпан Кірылавіч, н. у 1907 г., рэпрэсіраваны ў 1933 г.

БУГУК Рыгор Мацвеевіч, н. у 1905 г., рэпрэсіраваны ў 1933 г.

ГОРБАТ Павел Фёдаравіч, н. у 1899 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ГАЙКО Дзяніс Фёдаравіч, н. у 1898 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ГЛУШАНЬ Рыгор Дзянісавіч, н. у 1893 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ГРУДНІЦКІ Сяргей Канстанцінавіч, н. у 1903 г., расстраляны 26.3.1937 г.

ГРУДНІЦКІ Аляксандр Канстанцінавіч, н. у 1904 г., расстраляны ў снежні 1937 г.

КУРЫЛОВІЧ Яфім Фёдаравіч, н. у 1909 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КУРЫЛОВІЧ Іван Тарасавіч, н. у 1884 г., расстраляны 21.7.1938 г.

КУРЫЛОВІЧ Сямён Іванавіч, н. у 1910 г., расстраляны ў жніўні 1938 г.

КАЎБОВІЧ Якаў Іванавіч, н. у 1910 г., расстраляны ў жніўні 1937 г.

МАЦУКЕВІЧ Архіп Аляксеевіч, н. у 1890 г., рэпрэсіраваны ў 1933 г.

МЯСНІКОВІЧ Сцяпан Андрэевіч, н. у 1903 г., расстраляны 24.12.1937 г.

МІНІЧ Даніл Уладзіміравіч, н. у 1894 г., расстраляны ў жніўні 1937 г.

МІНІЧ Міхаіл Уладзіміравіч, н. у 1896 г., расстраляны ў жніўні 1937 г.

ПЕРАШЧУК Пракофій Паўлавіч, н. у 1908 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЧОПЧЫЦ Арцём Міхайлавіч, н. у 1905 г., расстраляны 16.3.1937 г.

ЧОПЧЫЦ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1902 г., расстраляны 16.3.1938 г.

ЧОПЧЫЦ Пётр Фёдаравіч, н. у 1910 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЧОПЧЫЦ Васіль Фёдаравіч, н. у 1902 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЧОПЧЫЦ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1904 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ЧОПЧЫЦ Даніл Антонавіч, н. у 1883 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЧОПЧЫЦ Сцяпан Данілавіч, н. у 1910 г., рэпрэсіраваны ў 1938 г.

ЧОПЧЫЦ Рыгор Васільевіч, н. у 1893 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЧОПЧЫЦ Якаў Міхайлавіч, н. у 1903 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЧОПЧЫЦ Сцяпан Іванавіч, н. у 1889 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

ЧОПЧЫЦ Іван Сцяпанавіч, н. у 1908 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

ЧОПЧЫЦ Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1910 г., расстраляны ў жніўні 1938 г.

ЧОПЧЫЦ Мікалай Ісакавіч, н. у 1910 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ЧОПЧЫЦ Дзяніс Ісакавіч, рэпрэсіраваны ў 1936 г.

ЧОПЧЫЦ Таццяна Андрэеўна, рэпрэсіравана ў 1936 г.

ШЧУР Прохар Цімафеевіч, н. у 1893 г., рэпрэсіраваны ў студзені 1933 г.

У «ЯЖОВЫХ» АБДЫМКАХ

З успамінаў Б. У. Альваса, былога ўпраўляючага аддзялення саўгаса «Людзяневічы»

...Набіралі моц калгасы, лепш пачалі жыць вяскоўцы. Пакрыху забываліся цяжкія гады голаду ў пачатку 30-х гадоў. На калгасных палетках збіралі немалыя ўраджаі, была даволі вялікая па тым часе жывёлагадоўчая ферма. Уздым, добры настрой у людзей і, галоўнае, вера ў заўтрашні дзень, у справядлівасць усяго, што робіцца, у «бацьку» Сталіна... Паўсюды расклеены плакаты з яго словамі: «Жыць стала лепш, жыць стала весялей...» — і, здавалася, гэта сапраўды так...

Мала хто задумваўся тады — пакуль сам не сутыкнуўся, што як дзень адрозніваецца ад ночы, так і вонкавае, адкрытае і шчырае жыццё сялян на віду ўсёй краіны мае негатыўны, змрочны, не бачны на першы погляд бок... У пачатку калектывізацыі з вёскі выселілі і выслалі найбольш працавітых, таму заможных сялян. А на дваццатым годзе Савецкай улады, калі ўжо і забыўся былы час, чамусьці «абвастрылася» класавая барацьба, зноў пачаліся арышты, суды, жорсткія прыгаворы... Зашасталі па вёсках «чорныя варанкі», і, кладучыся ўвечары спаць, ніхто не быў упэўнены, што прачнецца заўтра раніцай дома. У Лагвошчах за падазрэнне ў сувязях з загранічай, якая праходзіла блізка, забралі амаль усіх мужчын —

«патэнцыяльных ворагаў». Абязлюдзела вёска. Тое ж і ў Браніславе, Вільчы. У Людзяневічах, гаварылі, хлопец, спёкшы на вогнішчы бульбу, сказаў: «Ну і смаката! Сам Сталін еў бы...» Праз дзень ён знік назаўсёды...

Не мінаваў гэты ўдзел і мяне. Я быў старшынёй калгаса ў Градзе. Прыехалі аднойчы ноччу... Людзей заўсёды забіралі ноччу — «чэкісты» баяліся, відаць, рабіць сваю чорную справу пры сонечным святле. Трымалі спачатку ў Жыткавічах, потым перавезлі ў Мазыр. У чым была прычына арышту: двое мярзотнікаў, згаварыўшыся,— а я быў калгасным брыгадзірам, потым старшынёй, вядома, усім не дагодзіш, знойдуцца «пакрыўджаныя»,— напісалі данос. У ім быў цэлы набор бязглуздага паклёпу: незадаволены Савецкай уладай, займаецца контррэвалюцыйнай прапагандай, спявае антысавецкія частушкі... Быццам мае сувязь за мяжой. Бяздоказных абвінавачванняў, напісаных ананімна, было дастаткова, каб арыштаваць, судзіць і загубіць чалавека.

Відаць, мне пашанцавала, што следчы трапіўся спагадлівы, памяркоўны — такія былі рэдкасцю на той час. Напэўна, ён быў з сялян. Разбіраючы паклёп, разважаў: вось тут напісана, што калі ішлі ўвечары з сенажаці, спявалі частушкі... Наколькі я разумею, спяваюць раніцай, ідучы на работу, а ўвечары, стомленым, не да песень... У тыя гады, у час агульнага, усенароднага энтузіязму, сапраўды людзі жылі хоць і цяжэй, але весялей, грамадская работа была як свята, заўсёды з песнямі, у спаборніцтве. Брыгада Андрэя Маркевіча, памятаю, каб апярэдзіць суседнюю на вывазцы гною і атрымаць большы ўраджай, працавала ўначы, калі ўсе спалі. Такую справу загубілі!.. Сэнс частушкі быў такі, што сонца з раніцы грэе горача, а ўдзень будзе яшчэ цяплей, жыць хораша, а ў калгасе яшчэ лепш. З паклёпу вынікала, што жыць добра, а без калгаса было б лепш. Следчы паціскаў плячыма: ні складу, ні рыфмы, відавочна, што словы знарок перастаўлены, без сэнсу. Не пацвердзілася і падазрэнне ў сувязі з панскай Польшчай.

Адносіны да зняволеных знешне былі тактоўныя, што не перашкаджала, аднак, у час допытаў катаваць людзей, прад'яўляць самыя неверагодныя абвінавачванні. Следчы са скуры вылузваўся, каб падследны прыняў і падпісаў сфабрыкаваную ім самім версію. Самыя распаўсюджаныя абвінавачванні — прадаўся замежнай разведцы, хоць, здавалася, што было прадаваць у беднай, забітай вёсцы?..

На будынку ў турэмным двары вісела скрынка накшталт паштовай. Зняволеным гаварылі, што кожны, хто не згодны з арыштам, абвінавачваннямі і наогул пакрыўджаны ўладамі, можа напісаць пісьмо прама наркому М. І. Яжову, скрынкі так і называліся — «яжовымі». Многія клюнулі на прыманку, падрабязна апісвалі свае крыўды, спадзяючыся на справядлівы разбор справы. І хутка пасля такіх пісьмаў назаўсёды знікалі бясследна... Я адразу адчуў недавер да гэтых «яжовых» скрынак, пісаць не стаў, хоць і быў пакрыўджаны беспадстаўнымі абвінавачваннямі.

Праз некалькі месяцаў мне аб'явілі, што абвінавачванні не пацвердзіліся, саставу злачынства няма. Гэта было падобна на цуд, амаль нікому такога шчасця не выпадала... Сказалі: вось бачыце, справядліва разабраліся і адпусцілі. Але я зразумеў потым, што справа была ў другім: якраз у той час, у 1938 г., адзін сталінскі сатрап — Яжоў трапіў у няміласць, за што і быў расстраляны, і другому людаеду — Берыі, які змяніў яго, патрабавалася на нейкі час дзеля аўтарытэту спачатку крышку адпусціць лейцы на народзе...

Я вярнуўся дамоў, да сям'і. Але вельмі многія вяскоўцы назаўсёды згінулі ў турмах, у лагерах. Пакінуў сіратамі пецярых малых дзяцей Аляксандр Ахоценка. Бясследна зніклі Аляксандр Кос, яго брата Рамана арыштавалі за тое, што сяляне не выканалі плана нарыхтовак сельгаспрадукцыі, а ён быў членам сельсавета, Кандрат Бордзюг, Кацярына Лісавец... Праз дзесяць гадоў зняволення вярнуўся Мікалай Федарэнка — яму таксама пашанцавала... Арыштавалі яго за тое, што сказаў: «Каб там, у Маскве, ведалі, як мы тут гаруем!»... І ўсё ж я не расчараваўся, не адчуваў сябе пакрыўджаным, вярнуўшыся, з яшчэ большай энергіяй ўзяўся за калгасныя справы.

ЛЮДЗЯНЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЕРАЗІНА

АБАРЭВІЧ Уладзімір Данілавіч, н. у 1883 г., расстраляны 16.2.1938 г.

БАРСУК Піліп Барысавіч, н. у 1910 г., расстраляны 27.9.1937 г.

БЕЛАВУС Уладзімір Савельевіч, н. у 1893 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ВЕРАШЧЫНСКІ Адам Лявонцьевіч, н. у 1899 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ВЕРАШЧЫНСКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1878 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ПЕТРУШКЕВІЧ Баляслаў Феліксавіч, н. у 1915 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ВЁСКА ВЯЗАЎ ЛЕС

ТРУШКОЎ Афанасій Іванавіч, н. у 1904 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ВЁСКА ДОЎГАЯ ДУБРОВА

БЫСТРЭНКА Рыгор Максімавіч, н. у 1883 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ШЫРАЙ Андрэй Харытонавіч, н. у 1901 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ШЫРАЙ Трафім Харытонавіч, рэпрэсіраваны ў 1937 г.

ШЛЫК Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1903 г., расстраляны 16.12.1938 г.

ШЧУР Іосіф Лук'янавіч, н. у 1899 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ВЁСКА ЗАГОРБАШША

САЎЧЫЦ Лявон Андрэевіч, н. у 1873 г., расстраляны 29.9.1937 г.

ВЁСКА ЛАГВОШЧЫ

АНІСКОВІЧ Павел Віктаравіч, н. у 1903 г., расстраляны 24.12.1937 г.

БОГУШ Іван Антонавіч, н. у 1896 г., расстраляны 26.10.1937 г.

ВЕРТАЛЬ Якаў Андрэевіч, н. у 1872 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ВЕРТАЛЬ Вікенцій Якаўлевіч, н. у 1906 г., жыў на х. Доўгае, расстраляны 19.11. 1937 г.

ВЕРТАЛЬ Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1912 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ВЕРТАЛЬ Вячаслаў Якаўлевіч, н. у 1909 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ГЛУШЫН Рыгор Фёдаравіч, н. у 1882 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ДУТКО Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1904 г., расстраляны 5.1.1938 г.

КАТОВІЧ Андрэй Іванавіч, н. у 1886 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ЗАРУЦКІ Іван Сцяпанавіч, н. у 1905 г., жыў на х. Доўгае, расстраляны 24.12.1937 г.

КАЦУБІНСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1913 г., жыў на х. Маладзіца, расстраляны 24.12.1937 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Рыгор Маісеевіч, н. у 1905 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Павел Маісеевіч, н. у 1897 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ЛЯЎКОВІЧ Уладзімір Ніканоравіч, н. у 1907 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЛЯЎКОВІЧ Рыгор Ніканоравіч, н. у 1898 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ЛЯЎКОВІЧ Ігнат Мікалаевіч, н. у 1901 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ЛУКАШЭВІЧ Віталь Фадзеевіч, н. у 1881 г., жыў на х. Гноішча, расстраляны 28.1.1938 г.

МІЛЕВІЧ Павел Сігізмундавіч, н. у 1911 г., расстраляны 7.12.1937 г.

НЕКРАШЭВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1897 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ПЯТРОЎСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1890 г., расстраляны 19.3.1938 г.

ПЯТРОЎСКІ Мечыслаў Іосіфавіч, н. у 1888 г., расстраляны 19.3.1938 г.

РАНЧЫНСКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1910 г., расстраляны 19.2.1938 г.

РАМАНОЎСКІ Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1911 г., расстраляны 1.12.1937 г.

РУДНІЦКІ Адольф Аляксандравіч, н. у 1900 г., жыў на х. Доўгае, расстраляны 19.11.1937 г.

РУДНІЦКАЯ Яніна Аляксандраўна, н. у 1918 г., расстраляна 11.3.1938 г.

РУДНІЦКІ Іосіф Аляксандравіч, н. у 1896 г., расстраляны 19.11.1937 г.

РУДНІЦКІ Адольф Браніслававіч, н. у 1897 г., расстраляны 24.12.1937 г.

РУДНІЦКІ Іосіф Браніслававіч, н. у 1903 г., расстраляны 19.11.1937 г.

РУДНІЦКІ Вячаслаў Браніслававіч, н. у 1906 г., расстраляны 5.1.1938 г.

РУДНІЦКІ Іосіф Уладзіміравіч, н. у 1918 г., расстраляны 1.12.1937 г.

РУДНІЦКІ Карл Браніслававіч, н. у 1910 г., расстраляны 28.1.1938 г.

РУДНІЦКІ Станіслаў Аляксандравіч, н. у 1914 г., расстраляны 10.11.1937 г.

РУДНІЦКІ Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1916 г., расстраляны 19.11.1937 г.

РУДНІЦКІ Сцяпан Уладзіміравіч, н. у 1903 г., расстраляны 1.12.1937 г.

САВІЦКІ Васіль Герасімавіч, н. у 1901 г., расстраляны 19.11.1937 г.

САВІЦКІ Ігнат Вікенцьевіч, н. у 1904 г., расстраляны 24.12.1937 г.

САВІЦКІ Павел Вітольдавіч, н. у 1914 г., жыў на х. Трылессе, расстраляны 28.1.1938 г.

САВІЦКІ Павел Герасімавіч, н. у 1895 г., расстраляны 19.11.1937 г.

САНАК Казімір Іосіфавіч, н. у 1888 г., расстраляны 19.11.1937 г.

САНАК Мечыслаў Іосіфавіч, н. у 1889 г., расстраляны 19.11.1937 г.

СІНІЛА Антон Іванавіч, н. у 1896 г., расстраляны 19.11.1937 г.

СІНІЛА Дамінік Францавіч, н. у 1915 г., расстраляны 16.2.1938 г.

СІНІЛА Павел Феліксавіч, н. у 1901 г., расстраляны 7.12.1937 г.

СІНІЛА Раман Феліксавіч, н. у 1905 г., расстраляны 28.1.1938 г.

СІНІЛА Сцяпан Адамавіч, н. у 1913 г., расстраляны 16.2.1938 г.

СІНІЛА Франц Феліксавіч, н. у 1887 г., расстраляны 1.12.1937 г.

СУЛКОЎСКІ Андрэй Іванавіч, н. у 1900 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ТАРГОНСКІ Адам Антонавіч, н. у 1897 г., жыў на х. Пліты, расстраляны 24.12. 1937 г.

ТАРГОНСКІ Антон Міхайлавіч, н. у 1911 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ТАРГОНСКІ Віктар Людвігавіч, н. у 1908 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ТАРГОНСКІ Віталь Сямёнавіч, н. у 1873 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ТАРГОНСКАЯ Ганна Людвігаўна, н. у 1914 г., расстраляна 26.11.1937 г.
ТАРГОНСКІ Іван Канстанцінавіч, н. у 1896 г., расстраляны 26.10.1937 г.
ТАРГОНСКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1908 г., расстраляны 1.12.1937 г.
ТАРГОНСКАЯ Тэафілія Аляксандраўна, н. у 1899 г., расстраляна 31.10.1937 г.
ТАРГОНСКІ Канстанцін Канстанцінавіч, н. у 1894 г., расстраляны 7.12.1937 г.
ТАРГОНСКІ Кліменцій Віктаравіч, н. у 1899 г., расстраляны 26.10.1937 г.
ТАРГОНСКІ Міхаіл Станіслававіч, н. у 1900 г., расстраляны 19.11.1937 г.
ТАРГОНСКАЯ Міхаліна Іванаўна, н. у 1900 г., расстраляна 31.10.1937 г.
ТАРГОНСКІ Павел Пятровіч, н. у 1884 г., расстраляны 28.1.1938 г.
ТАРГОНСКІ Станіслаў Пятровіч, н. у 1907 г., расстраляны 19.11.1937 г.
ТАРГОНСКІ Тэафіл Цімафеевіч, н. у 1891 г., расстраляны 24.12.1937 г.
ТАРГОНСКІ Юльян Гаўрылавіч, н. у 1895 г., расстраляны 7.12.1937 г.
ТОМАЛЬ Антон Іванавіч, н. у 1911 г., жыў на х. Доўгае, расстраляны 19.11.1937 г.
ТОМАЛЬ Іван Андрэевіч, н. у 1877 г., жыў на х. Доўгае, расстраляны 19.11.1937 г.
ТОМАЛЬ Іосіф Андрэевіч, н. у 1884 г., жыў на х. Доўгае, расстраляны 19.11.1937 г.
ФІШАР Станіслаў Марцінавіч, н. у 1873 г., жыў на х. Доўгае, расстраляны 19.11. 1937 г.
ФІШАР Франц Станіслававіч, н. у 1900 г., расстраляны 19.11.1937 г.
ШВЕД Карп Якаўлевіч, н. у 1899 г., расстраляны 7.12.1937 г.
ШВЕД Мікалай Якаўлевіч, н. у 1912 г., расстраляны 29.12.1937 г.
ШКАТУЛА Казімір Іосіфавіч, н. у 1907 г., расстраляны 19.11.1937 г.
ШКАТУЛА Ганна Іосіфаўна
ХАРЫТАНОВІЧ Раман Іванавіч, н. у 1904 г., расстраляны 16.2.1938 г.
ЧОПЧЫЦ Рыгор Васільевіч, н. у 1893 г., расстраляны 7.12.1937 г.
ЧОПЧЫЦ Сяргей Васільевіч, н. у 1900 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ВЁСКА ЛЮДЗЯНЕВІЧЫ

БЫСТРЭНКА Акім Якаўлевіч, н. у 1898 г., расстраляны 23.10.1937 г.
БЫСТРЭНКА Рыгор Максімавіч, н. у 1883 г., жыў на х. Доўгая Дуброва, расстраляны 29.12.1937 г.
ВАСІЛЕЎСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1894 г., расстраляны 11.3.1938 г.
ВЕРАШЧЫНСКІ Франц Іосіфавіч, н. у 1907 г., расстраляны 24.12.1937 г.
ГАРБУЗ Іван Андрэевіч, н. у 1904 г., жыў на х. Загрэбля, расстраляны 16.2.1938 г.
ГАРБУЗ Кандрат Гаўрылавіч, н. у 1870 г., расстраляны 2.10.1937 г.
ЛОПУХ Пётр Васільевіч, н. у 1906 г., расстраляны 19.11.1937 г.
МАРКВАРТ Альберт Фрыдрыхавіч, н. у 1892 г., расстраляны 21.7.1938 г.
ПУПЕНКА Раман Рыгоравіч, н. у 1906 г., жыў на х. Загрэбля, расстраляны 29.12. 1937 г.
ТРАФІМОВІЧ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1900 г., расстраляны 16.2.1938 г.
ШЫЛА Васіль Фёдаравіч, н. у 1885 г., расстраляны 19.11.1937 г.
ШЫРАЙ Іосіф Малафеевіч, н. у 1901 г., жыў на х. Новы, расстраляны 28.1.1938 г.
ШЫРАЙ Ціт Фёдаравіч, н. у 1909 г., расстраляны 2.10.1937 г.
ХАМІЦЭВІЧ Давід Лазаравіч, н. у 1906 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ВЁСКА СЯЛКО

БОТТЭ Герман Вільгельм Леанідавіч, н. у 1893 г., расстраляны 22.5.1938 г.
ГРАБОЎСКІ Іосіф Уладзіміравіч, н. у 1916 г., расстраляны 20.3.1938 г.
ЗУМЕРФЕЛЬД Вільгельм Генрыхавіч, н. у 1907 г., расстраляны 20.3.1938 г.
ПАЎЛОВІЧ Андрэй Мартынавіч, н. у 1904 г., расстраляны 21.7.1938 г.
РЫМАШЭЎСКІ Станіслаў Клімавіч, н. у 1913 г., расстраляны 10.11.1937 г.
СТАНКЕВІЧ Пётр Якаўлевіч, н. у 1901 г., расстраляны 16.2.1938 г.
ФІНКЕ Карл Эмілевіч, н. у 1901 г., расстраляны 27.4.1938 г.
ЧАРНУШЭВІЧ Ілья Фядотавіч, н. у 1900 г., расстраляны 21.7.1938 г.
ЧАРНУШЭВІЧ Фёдар Раманавіч, н. у 1910 г., расстраляны 20.3.1938 г.

Без віны вінаватыя

На ўсё жыццё запомніў Алесь Рудніцкі дзень 3 жніўня 1938 г., калі яго арыштавалі за ... За што ж яго арыштавалі? За тое, што дзяржаўная граніца праходзіла зусім блізка ад хутара Доўгае, дзе ён жыў, што нарадзіўся палякам, урэшце, за тое, што апошні застаўся ў акрузе на свабодзе... А ён спадзяваўся, калі ўсіх падчыстую ўжо выбралі з Лагвошчаў і бліжэйшых хутараў, што лёс да яго міласцівы. Колькі гора і слёз прынёс страшны 1937 год! Амаль 50 чалавек забралі тады людзі ў сініх шапках, якія не ведалі літасці —

дзяцей на вуліцу, жонку часта ўслед за мужам,— і вярнуцца выпаў лёс аднаму толькі Алесю Рудніцкаму. Інвалід, без нагі, страціўшы сям'ю, разбіты фізічна і маральна.

— Схапілі... Прывезлі ў Жыткавічы,— з цяжкасцю вымаўляючы словы, быццам яны з каменя, расказвае Алесь Аляксандравіч.— Адтуль у Мазыр... У камеры турмы, якая размяшчалася ў былой царкве ў Мазыры — бітком набіта, не прадыхнуць, кроў, вошы, смурод... Дапытваў мяне следчы Барыс Духоўны. Кат... І сам потым трапіў у жорны таго ж молаха. «Прызнавайся!» — крычыць. «У чым?» «У тым, што калі б Польшча напала на СССР, ты стаў бы на яе бок»... Як ён здзекаваўся, як біў!.. «Падпісвай!» Падпісаў, а што рабіць... Выклікалі праз некаторы час на некалькі мінут на пасяджэнне тройкі. «Падпісаў, значыць, прызнаеш віну?» «Прымусілі падпісаць пад катаваннем, білі»... «Быў бы не вінаваты, не падпісаў бы. Дзесяць гадоў»... І вось — лагер на Калыме. Лесапавал. Што гэта такое — не раскажаш... Пабоі на кожным кроку, здзек — так ніякі гаспадар не адносіцца да скаціны, і — давай, давай норму, план... І выконвалі, нават перавыконвалі, інакш без пайкі, без хлеба — канец. Нават у такіх умовах ніхто не хацеў паміраць. Страціў нагу, нават не прыпомню — ці дрэвам прыціснула, ці перабіў вартавы...

Вярнуўся праз дзесяць гадоў. Горкім было гэта вяртанне. Быў ужо 1949 год, нават інваліда не адпусцілі да тэрміну. Разруха, мужчын у Лагвошчах зусім няма, сям'я загінула... Жыла ў вёсцы такая ж гаротніца Сцепаніда Іосіфаўна Верталь. Яе мужа, Вікенція Верталя, расстралялі па прыгавору асобай тройкі ў Мазыры ў 1937 г. Загінулі ў турмах і лагерах таксама яго бацька, Якаў Верталь, і браты Вячаслаў і Уладзімір. Бясследна зніклі ў засценках НКУС Казімір і Ганна Шкатула — брат і сястра Сцепаніды... Такое можна было сустрэць амаль у кожнай хаце ў Лагвошчах... Алесь Рудніцкі і Стэфа Верталь ужо амаль у пяцідзесяцігадовым узросце вымушаны былі пачынаць жыццё спачатку. І пражылі яго дастойна, як належыць сумленным людзям.

У 1956 г. Алесь Аляксандравіч Рудніцкі быў рэабілітаваны. Паступова справядлівасць перамагла і ў адносінах да усіх вяскоўцаў.

В. Р. Феранц

МАРОХАРАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

(рэабілітаваны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 16.1.1989 г.)

АГІЕВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1876 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

АЧАПОЎСКІ Максім Іванавіч, н. у 1896 г., жыў у в. Бялёў, расстраляны 27.9. 1937 г.

АКУНЕЦ Гардзей Антонавіч, н. у 1876 г., жыў у в. Бялёў, расстраляны 20.10.1937 г.

ГАЛАВАЧ Аляксандр Патапавіч, н. у 1873 г., жыў у в. Бялёў, расстраляны 20.10. 1937 г.

КЛЯВА Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1896 г., рэпрэсіраваны ў 1938 г.

КАЗЁЛ Дзмітрый Сямёнавіч, н. у 1888 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

МАТОХ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1882 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

РУБІС Сямён Данілавіч, н. у 1894 г., рэпрэсіраваны ў 1933 г.

ЧАРНЯЎСКІ Андрэй Міхайлавіч, старшыня першага ў сельсавеце калгаса «Зорка», затым — «Чырвоная Яміца», «III Інтэрнацыянал». Інвалід працы. Арыштаваны ў студзені 1938 г., асуджаны на доўгі тэрмін зняволення і загінуў у месцы адбыцця пакарання 9.3.1945 г. Рэабілітаваны 3.6.1957 г.

Раскулачаны і высланы ў 1929—1930 гг.

ВЁСКА МАРОХАРАВА

МАКАРЭВІЧ Іван Гардзеевіч
МАКАРЭВІЧ Марк Сцяпанавіч
КУПРАЦЭВІЧ Іван Емяльянавіч
КУПРАЦЭВІЧ Емяльян
ПРЫШЧЫЦ Іван Якаўлевіч

ВЁСКА ДУБРОВА

КУПРАЦЭВІЧ Сямён Дзмітрыевіч
КУПРАЦЭВІЧ Міхаіл
МАКАРЭВІЧ Мікалай Іванавіч
БІБІК Якім
САНЮК Фёдар Сцяпанавіч
ШАРАЕВІЧ Канстанцін

ВЁСКА ВЯТЧЫНСКАЯ РУДНЯ

АКСЁНЧЫК Пётр
МІРАНОВІЧ Мікалай Данілавіч
МІРАНОВІЧ Міхаіл Дзянісавіч
ТАНКОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч
МІРАНОВІЧ

ВЁСКА ЗАМОШША

КУПРАЦЭВІЧ Мікалай Міхайлавіч

Пад сталінскім гнётам

1930 год пачынаўся сурова і трывожна. Ён прынёс шмат новага для сялян. Калектывізацыя... Што прынясе яна людзям? Вельмі хутка давялося пазнаёміцца — што гэта такое. Першыя крокі калектывізацыі ў Пластку, як усюды ў той час — барацьба з кулакамі. Амаль на ўсіх хутарах былі выяўлены людзі, якіх аб'явілі ворагамі народа. Іх пазбаўлялі ўласнасці і высылалі далёка за межы рэспублікі, а іх маёмасць і пабудовы аддавалі ў калгас.

У «кулакі» былі залічаны Міна Купрацэвіч, Рыгор Агіевіч, Іван Агіевіч, Васіль Юхневіч, Адам Аліфяровіч. Што гэта былі за кулакі? У іх былі мнагадзетныя сем'і, бацькі не аддзялялі ад сябе сямейных сыноў. Бацька быў як старшыня, а яго словы — закон для ўсіх. Нашы пластоцкія «кулакі», як і з іншых навакольных хутароў, з усёй работай, з вясны да самай зімы, спраўляліся самі. У палескіх хутарах былога Ляхавіцкага сельсавета лічылася ганьбай для сям'і, калі гаспадар прасіў дапамогі з суседняга хутара. Працоўны дзень пачынаўся задоўга да ўсходу сонца і завяршаўся ледзь не ноччу. Апраналіся яны ў такое ж даматканае адзенне, як і іншыя сяляне, і здаралася, пара ботаў, зрэбная світка была адна на ўсіх дарослых членаў сям'і.

Рэпрэсіраваныя сем'і былі высланы з хутароў у сямідзённы тэрмін, іх маёмасць, жывёла, насенне перададзены ў калгас, які атрымаў назву імя Варашылава. Першымі яго членамі сталі Павел Ахрамовіч, Іван Купрацэвіч, браты Мікалай, Іосіф і Сямён Купрацэвічы, а таксама Фёдар Купрацэвіч з сынамі Дзмітрыем, Аляксеем і Васілём. Да іх далучыліся Міхаіл, Пятро і Мікалай Купрацэвічы, Якаў Макарэвіч, Міхаіл Агіевіч, Фёдар Агіевіч, Іван Рагалевіч. На пасаду старшыні калгаса быў прапанаваны ўдзельнік грамадзянскай вайны Іван Васільевіч Купрацэвіч, а рахункаводам — Іван Ахрамовіч.

— Першы сход праводзіў старшыня Ляхавіцкага сельскага Савета Фёдар Міхайлавіч Купрацэвіч,— успамінае інвалід Вялікай Айчыннай вайны другой групы Нічыпар Фёдаравіч Рагалевіч.— Побач сядзелі яго сястра А. М. Купрацэвіч, а таксама члены партыйнай ячэйкі В. А. Чарнагалоў, С. Я. Агіевіч, А. Я. Агіевіч, П. П. Аліфяровіч, прадстаўнік з раённых органаў НКУС. Патрабаваўся высокі працэнт ахопленых калгасным рухам. Таму нас, хутарскіх жыхароў, кожны дзень збіралі на многагадзінныя сходы, прымушалі падаваць заявы аб уступленні ў калгас тых, хто зацягваў «тэмпы» калектывізацыі.

Каб надаць справе больш рашучы характар, пасля першых рэпрэсіраваных «кулакоў» пачалі рыхтаваць на высяленне новую групу. У гэтай акцыі вельмі стараўся старшыня калгаса І. В. Купрацэвіч. Яго слова было апошнім у справе высылкі таго ці іншага чалавека. На гэты раз былі высланы Сцяпан Агіевіч, Канстанцін Купрацэвіч, Якаў Агіевіч, Міка-

лай Юхневіч, Гаўрыла Юхневіч і іншыя. Астатнія сяляне запісаліся ў калгас. Перажыўшы страшэнную галадоўку 1932—1933 гадоў, калгаснікі, хто застаўся жывы, сумленна працавалі ў гаспадарцы, паціху мацавалі яе сваімі мазолістымі рукамі.

У 1938 г. хутары пачалі сцягваць у адну вёску. Калгас быў удзельнікам ВСГ СССР.

Толькі адзін вясковец — К. Г. Бародзіч вярнуўся з далёкага Калымскага краю. Сяляне выбралі яго ў пасляваенны час старшынёй калгаса. На гэтай пасадзе ён сумленна працаваў доўгі час, шмат зрабіў для ўмацавання гаспадаркі. Сваім жыццём К. Г. Бародзіч даказаў, што ён быў чалавекам з чыстым сумленнем, як і тыя, хто загінуў у невядомасці.

А. М. Купрацэвіч

МІЛЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГРАБАВА

ПРЫШЧЫК Гаўрыл Пятровіч, н. у 1873 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ВЁСКА МІЛЕВІЧЫ

КАТОВІЧ Фядот Нікіфаравіч, н. у 1877 г., удзельнік грамадзянскай вайны, арыштаваны 24.8.1937 г. і прыгавораны да доўгага турэмнага зняволення, памёр у месцы зняволення 4.3.1942 г.

ЛІНКЕВІЧ Адам Міхайлавіч, н. у 1903 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ПАШКЕВІЧ Сцяпан Васільевіч, н. у 1900 г., жыў на х. Плоцішча, расстраляны 16.2.1938 г.

САЧЫЛОВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1890 г., жыў на х. Камень, расстраляны 29.12.1937 г.

САЧЫЛОВІЧ Сяргей Сямёнавіч, н. у 1883 г., расстраляны 13.1.1938 г. у Магілёве.

САЧЫЛОВІЧ Рыгор Сяргеевіч, н. у 1912 г., расстраляны ў 1937 г.

ТАРЦАН Нікан Максімавіч, н. у 1901 г., жыў на х. Камень, расстраляны 24.12.1937 г.

ХАМІЦЭВІЧ Анісім Лазаравіч, н. у 1903 г., жыў на х. Камень, расстраляны 28.1.1938 г.

ХАМІЦЭВІЧ Лазар Трафімавіч, н. у 1880 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ХАМІЦЭВІЧ Фёдар Лазаравіч, н. у 1915 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ВЁСКА СТАРЫЯ ЗАЛЮЦІЧЫ

ДАРАФЕЙ Анісім Ульянавіч, н. у 1905 г., жыў на х. Астравок, расстраляны 21.7.1938 г.

ДАРАФЕЙ Максім Ільіч, н. у 1900 г., жыў на х. Залюцічы, расстраляны 29.12.1937 г.

КАТОВІЧ Антон Андрэевіч, н. у 1908 г., жыў на х. Лухнава, расстраляны 21.7.1938 г.

КАТОВІЧ Павел Піліпавіч, н. у 1892 г., расстраляны 21.7.1938 г.

КАТОВІЧ Пётр Андрэевіч, г. у 1902 г., расстраляны 24.12.1937 г.

КАТОВІЧ Пётр Нікадзімавіч, н. у 1903 г., жыў на х. Абярэм'е, расстраляны 21.7.1938 г.

КАТОВІЧ Фёдар Нікадзімавіч, н. у 1894 г., жыў на х. Абярэм'е, расстраляны 29.12.1937 г.

КАТОВІЧ Харытон Андрэевіч, н. у 1873 г., жыў на х. Кісялёў, расстраляны 24.12.1937 г.

МАРХОТКА Мікалай Фёдаравіч, н. у 1903 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ВЁСКА НОВЫЯ ЗАЛЮЦІЧЫ

ДАВЫДОВІЧ Адам Арцёмавіч, жыў у в. Залюцічы, расстраляны 29.12.1937 г.

ДЗЕМІДОВІЧ Лаўрэнцій Якаўлевіч, н. у 1903 г. расстраляны 29.12.1937 г.

ДЗЕМІДОВІЧ Мікалай Герасімавіч, н. у 1895 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ДЗЕМІДОВІЧ Мікалай Маісеевіч, н. у 1894 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ДАЛМАТОВІЧ Іван Гаўрылавіч, н. у 1905 г., расстраляны 21.7.1938 г.

КАТОВІЧ Анісім Іванавіч, н. у 1893 г., расстраляны 24.12.1937 г.

КАТОВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. у 1903 г., расстраляны 21.7.1938 г.

КАТОВІЧ Якаў Іванавіч, н. у 1883 г., расстраляны 21.7.1938 г.

МІНІЧ Якаў Прохаравіч, н. у 1895 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА НОВЫЯ МІЛЕВІЧЫ

БАСАРАНОВІЧ Макар Іванавіч, н. у 1904 г., расстраляны 5.1.1938 г.

МАЦУКЕВІЧ Васіль Ігнатавіч, н. у 1890 г., расстраляны 24.12.1937 г.

НАВУМОВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1890 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЯФІМОВІЧ Міхаіл Кузьміч, н. у 1902 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЯФІМОВІЧ Пётр Антонавіч, н. у 1901 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЯФІМОВІЧ Якаў Кузьміч, н. у 1898 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ПЕРАРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА МЛЫНОК

ГАЛАВАЧ Рыгор Антонавіч, н. у 1892 г., расстраляны 1.11.1937 г.

ЛІСІЦКІ Цімафей Дзмітрыевіч, н. у 1885 г., расстраляны 11.3.1938.

ПАГРАНОЎСКІ Іван Дзянісавіч, н. у 1872 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ФЛЁРКА Мікалай Андрэевіч, н. у 1890 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА ПЕРАРОЎ

МАСЛА Андрэй Паўлавіч, н. у 1889 г., расстраляны 27.9.1937 г.

МАСЛА Фелікс Іванавіч, н. у 1901 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ФІНКЕ Герман Фрыдрыхавіч, н. у 1910 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ФІНКЕ Густаў Фрыдрыхавіч, н. у 1904 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ФІНКЕ Карл Фрыдрыхавіч, н. у 1912 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ЯРМОЛЕНКА Іван Данілавіч, н. у 1878 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА ХЛУПІН

КЕПІНГ Фрыдрых-Альберт Карлавіч, н. у 1884 г., расстраляны 2.11.1937 г.

ЦІШКОЎСКІ Пётр Мікалаевіч, н. у 1873 г., расстраляны 2.11.1937 г.

ЯРМОЛЕНКА Дзмітрый Васільевіч, н. у 1873 г., расстраляны 2.11.1937 г.

РУДНЯНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГРЭБЕНЬ

КОТ Ануфрый Навумавіч, н. у 1889 г., расстраляны 20.3.1938 г.

ВЁСКА КОЛЬНА

ЕФІМОВІЧ Рыгор Нікіфаравіч, н. у 1898 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ТАТАРЧУК Васіль Іванавіч, н. у 1886 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ВЁСКА ПАЛЯНКА

РЫМАШЭЎСКІ Віктар Антонавіч, н. у 1896 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА ПОДАЎЖ

МАКУХ Іосіф Францавіч, н. у 1880 г., расстраляны 24.12.1937 г.

НЕКРАШЭВІЧ Васіль Хрыстафоравіч, н. у 1873 г., расстраляны 24.12.1937 г.

НЕКРАШЭВІЧ Іван Хрыстафоравіч, н. у 1874 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ВЁСКА РУДНЯ

ГАЛАВАЧ Андрэй Рыгоравіч, н. у 1885 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ГАЛАВАЧ Антон Лук'янавіч, н. у 1892 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ГАЛАВАЧ Лука Мацвеевіч, н. у 1870 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ГАЛАВАЧ Рыгор Пятровіч, н. у 1893 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ГАЛАВАЧ Савелій Паўлавіч, н. у 1887 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ДРАЕР Пётр Карлавіч, н. у 1894 г., расстраляны 27.9.1937 г.

КАЖАНОЎСКІ Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1901 г., расстраляны 29.12.1937 г.

КАЗАК Іван Паўлавіч, н. у 1904 г., расстраляны 29.11.1937 г.

КАЦУБІНСКІ Мікалай Якаўлевіч, н. у 1886 г., расстраляны 1.12.1937 г.

КАЦУБІНСКІ Пётр Якаўлевіч, н. у 1892 г., расстраляны 19.11.1937 г.

КАЦУБІНСКІ Стэфан Іванавіч, н. у 1892 г., расстраляны 29.11.1937 г.

КІРБАЙ Вацлаў Вікенцьевіч, н. у 1887 г., расстраляны 1.12.1937 г.

КІРБАЙ Мікалай Вікенцьевіч, н. у 1894 г., расстраляны 27.9.1937 г.

КІРБАЙ Іван Феліксавіч, н. у 1892 г., расстраляны 19.11.1937 г.

КІРБАЙ Раман Феліксавіч, н. у 1901 г., расстраляны 7.12.1937 г.

КРУКОЎСКІ Даніл Герасімавіч, н. у 1895 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ЛЯМБОВІЧ Іван Аляксеевіч, н. у 1888 г., расстраляны 19.11.1937 г.

МАЙСТРОВІЧ Іосіф Андрэевіч, н. у 1890 г., расстраляны 19.11.1937 г.

МАЦКЕВІЧ Васіль Рыгоравіч, н. у 1889 г., расстраляны 29.11.1937 г.

МАЦКЕВІЧ Пётр Васільевіч, н. у 1903 г., расстраляны 7.12.1937 г.

РАЖАЛОЎСКІ Адам Паўлавіч, н. у 1882 г., расстраляны 27.9.1937 г.

РАЖАЛОЎСКІ Геронім Паўлавіч, н. у 1885 г., расстраляны 7.12.1937 г.

РАЖАЛОЎСКІ Мікалай Васільевіч, н. у 1899 г., расстраляны 7.12.1937 г.

САВІЦКІ Адам Францавіч, н. у 1887 г., расстраляны 1.12.1937 г.

УСЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1884 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ШЛЯГА Фёдар Іванавіч, н. у 1885 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ШЛЯХЦІН Андрэй Афанасьевіч, н. у 1882 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ШЛЯХЦІН Іван Афанасьевіч, н. у1869 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Антон Сігізмундавіч, н. у 1886 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Антон Эдуардавіч, н. у 1902 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Іван Адамавіч, н. у 1909 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Іван Аляксандравіч, н. у 1888 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1893 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Іван Флоравіч, н. у 1888 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Людвіг Эдуардавіч, н. у 1909 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Мікалай Васільевіч, н. у 1898 г., быўшы член КПЗБ, расстраляны 27.9.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Сцяпан Раманавіч, н. у 1884 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Сцяпан Людвігавіч, н. у 1904 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЮХНЕВІЧ Сямён Пятровіч, н. у 1900 г., расстраляны 1.12.1937 г.

РЫБГАС «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»

АСТАШЭЎСКІ Людвіг Іванавіч, н. у 1896 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЕРМАЛОВІЧ Вікенцій Аляксандравіч, н. у 1903 г., расстраляны 16.2.1938 г.

САВІЧ Іларыён Барысавіч, н. у 1909 г., расстраляны 7.12.1937 г.

САВІЧ Пётр Барысавіч, н. у 1914 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ХУТАРЫ

КІРБАЙ Адольф Мацвеевіч, н. у 1914 г., жыў на х. Гусельніца, расстраляны 5.1. 1938 г.

КІРБАЙ Сямён Пятровіч, н. у 1901 г., жыў на х. Гусельніца, расстраляны 27.9. 1937 г.

МАСЛА Мітрафан Казіміравіч, н. у 1884 г., жыў на х. Жукава, расстраляны 7.12.1937 г.

МАСЛА Сцяпан Амбросьевіч, н. у 1884 г., жыў на х. Ямніца, расстраляны 22.5. 1938 г.

МАСЛА Уладзімір Адамавіч, расстраляны 5.3.1933 г.

МАСЛА Юрый Фёдаравіч, расстраляны 5.3.1933 г. ва ўрочышчы Боркі каля Мазыра.

СКАРГОЎСКІ Франц Іванавіч, н. у 1910 г., жыў на х. Новы, расстраляны 29.12. 1937 г.

ФЯДКОВІЧ Сяргей Аляксеевіч, н. у 1892 г., жыў на х. Ямніца, расстраляны 22.5. 1938 г.

ЧАРНЯЎСКІ Андрэй Міхайлавіч, н. у 1882 г., жыў на х. Келі, расстраляны 27.4. 1938 г.

РЫЧОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЯРЭЖЦЫ

БЛОЦКІ Віктар Васільевіч, н. у 1890 г.

ВЯНГУРА Дзяніс Мікалаевіч, н. у 1893 г.

ГОРБ Ілья Васільевіч, н. у 1909 г.

ГОРБ Іван Канстанцінавіч, н. у 1902 г.

ГРЫБ Дзмітрый Сямёнавіч.

ЗАНКЕВІЧ Даніл Раманавіч.

ІВАНІС Піліп Канстанцінавіч.

ІВАНІС Фядот Ерамеевіч, н. у 1891 г.

КОНАНКА Дзмітрый Сідаравіч.

КОНАНКА Ілья Сідаравіч, н. у 1893 г., расстраляны 27.4.1938 г.

КУДЛАЧ Максім Іванавіч.

КУЗЕМКА Аляксей Самуілавіч, н. у 1910 г.

КУЗЕМКА Юльян Андрэевіч.

КУЛАКЕВІЧ Сяргей Міронавіч.

МАРОЗ Міхаіл Ціханавіч, н. у 1898 г., расстраляны 28.1.1938 г.

МАСЛА Фёдар Адамавіч.

РОСЛІК Іван Навумавіч, н. у 1900 г., расстраляны 2.11.1937 г.

РОСЛІК Сямён Юльянавіч.

РОСЛІК Фёдар Навумавіч, н. у 1897 г.

РУДНІЦКІ Ілья Іванавіч, н. у 1896 г.

РУДНІЦКІ Пётр Ільіч, н. у 1907 г., расстраляны 11.3.1938 г.

РУДНІЦКІ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1903 г.

СЯНЬКО Іван Сцяпанавіч.

УКОЛІН Адам Іванавіч, н. у 1889 г.

ВЁСКА РЫДЧА

БЛОЦКІ Нічыпар (Нікіфар) Раманавіч, н. у 1904 г., расстраляны 24.12.1937 г.

БЛОЦКІ Сідар Сямёнавіч, н. у 1888 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ГАРАЦКЕВІЧ Франц Эдуардавіч, н. у 1876 г., расстраляны 16.2.1938 г.

САНЕЦ Іван Якаўлевіч, н. у 1899 г., расстраляны 24.12.1937 г.

САНЕЦ Якаў Дзмітрыевіч, н. у 1877 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЧЫКІДА Нічыпар Спірыдонавіч, н. у 1883 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ВЁСКА РЫЧОЎ

БОГУШ Павел Сільвестравіч, н. у 1906 г., жыў на х. Свірнішча, расстраляны 21.7. 1938 г.

МАЛОЧКА Пётр Емяльянавіч, н. у 1912 г., расстраляны 1.12.1937 г.

МАМАЙКА Аляксей Дзямідавіч, н. у 1900 г., расстраляны 24.12.1937 г.

КАВАЛЕВІЧ-МАЖАКА Апанас Сямёнавіч, н. у 1872 г., расстраляны 2.10.1937 г.

КУЧЫН Іван Рыгоравіч, н. у 1894 г., расстраляны 2.10.1937 г.

ВЁСКА СТАРАЖОЎЦЫ

БАБАРЫКА Іосіф Самуілавіч, н. у 1903 г.
ВЯНГУРА Марк Давыдавіч, н. у 1901 г., расстраляны 29.12.1937 г.
ГАЛАТА Павел Фёдаравіч, н. у 1896 г.
КАРАСЬ Павел Арцёмавіч, н. у 1899 г., расстраляны 5.1.1938 г.
ЛЕЎКАВЕЦ Пётр Купрыянавіч, н. у 1902 г.
ЛЕЎКАВЕЦ Сямён Трафімавіч, н. у 1898 г.
САВОНАЎ Рыгор Васільевіч, н. у 1899 г., расстраляны 5.1.1938 г.
ЧОРНЫ Іван Кузьміч, н. у 1903 г., расстраляны 29.12.1938 г.

ВЁСКА СЯМУРАДЦЫ

БОБРЫК Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1898 г., расстраляны 11.3.1938 г.
ЛОЙ Дзям'ян Кузьміч, н. у 1891 г.
ЛОЙ Кацярына Якаўлеўна, н. у 1909 г.
ЛОЙ Савелій Васільевіч, н. у 1912 г.
ЛОЙ Яўхіма Кліменцьеўна, н. у 1874 г.
МАРКЕВІЧ Максім Міхайлавіч, н. у 1891 г.
ЧЭЧКА Яўхім Ерамеевіч, н. у 1864 г.
ШАКАЛЯН Сцепаніда Іванаўна, н. у 1927 г.
ЮШКЕВІЧ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1891 г.

ВЁСКА ХАЧЭНЬ

БЕЛКА Іван Аляксеевіч, н. у 1895 г., расстраляны 19.3.1937 г.
БЕЛКА Раман Аляксеевіч, н. у 1910 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
БЕЛКА Сямён Лук'янавіч, н. у 1892 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ВАШКОЎ Іван Яўхімавіч, н. у 1887 г., расстраляны 5.12.1937 г.
ГУРЫН Мікалай Адамавіч, н. у 1912 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ЖУРКО Антон Міхайлавіч, н. у 1899 г., расстраляны 21.7.1938 г.
ЖУРКО Іван Аляксеевіч, н. у 1898 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ЗАНКЕВІЧ Захар Сідаравіч, н. у 1892 г., расстраляны 31.1.1938 г.
КАЗАК Адам Іванавіч, н. у 1899 г., расстраляны 21.7.1938 г.
КАЗАК Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1887 г., расстраляны 21.7.1938 г.
КАЦЭВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1905 г., расстраляны 21.7.1938 г.
КАЦЭВІЧ Сямён Пятровіч, н. у 1884 г.
КАЦЭВІЧ Ціхан Іванавіч, н. у 1904 г., расстраляны 29.12.1937 г.
КАЦЭВІЧ Цімафей Нічыпаравіч, н. у 1884 г., расстраляны 21.7.1938 г.
ЛЯСЬКО Данііл Рыгоравіч, н. у 1900 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
МАТАРАС Іван Конанавіч, н. у 1909 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
МАРТЫНОЎСКІ Іван Макаравіч, н. у 1898 г., расстраляны 5.1.1938 г.
МАРТЫНОЎСКІ Піліп Макаравіч, н. у 1900 г., расстраляны 5.1.1938 г.
ПТУШКО Сямён Іванавіч, н. у 1907 г., расстраляны 21.7.1938 г.
РАЙ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1895 г., расстраляны 20.10.1937 г.
РАЙ Надзея Мікалаеўна, н. у 1904 г., расстраляна 5.1.1938 г.
РАЙ Уладзімір Ульянавіч, н. у 1900 г., расстраляны 20.10.1937 г.
РАЙ Ядзвіга Адамаўна, н. у 1895 г., расстраляна 5.1.1931 г.
СТУДЗЯНЕЦ Сцяпан Дарафеевіч, н. у 1892 г., расстраляны 11.3.1938 г.
СЦЯМКОЎСКІ Канстанцін Іосіфавіч, н. у 1897 г., расстраляны 5.1.1938 г.
ЧАРНУШЭВІЧ Ілья Дзям'янавіч, н. у 1864 г., расстраляны 14.10.1937 г.
ШАЎЧУК Маісей Сямёнавіч, н. у 1902 г., інструктар МТС, быўшы член ВКП(б), расстраляны 20.10.1937 г.
ЯКУБОЎСКІ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1881 г., загінуў 20.10.1937 г.

ВЁСКА ХІЛЬЧЫЦЫ

СЦЯМКОЎСКІ Мартын Іванавіч, н. у 1906 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ШРУБ Давыд Трафімавіч, н. у 1890 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ШРУБ Данііл Емяльянавіч, н. у 1914 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ШРУБ Максім Несцеравіч, н. у 1905 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ШРУБ Пракоп Рыгоравіч, н. у 1898 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ШРУБ Рыгор Арцёмавіч, н. у 1906 г., расстраляны 21.7.1938 г.
ШРУБ Сцяпан Самуілавіч, н. у 1906 г., расстраляны 21.7.1938 г.
ШРУБ Сяргей Ільіч, н. у 1907 г.
ШРУБ Фёдар Яўхімавіч, н. у 1899 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.
ШРУБ Якаў Апанасавіч, н. у 1900 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г.

* * *

Непадалёку ад Бярэжцаў, у трох кіламетрах ад Рычова была невялікая лясная вёсачка Богушы, усяго восем хат — восем моцных гаспадарак. Жылі ў ёй мірныя людзі, іх называлі шляхтай — хлебаробы і

паляўнічыя, працавітыя і сумленныя, амаль усе яны насілі прозвішча Богуш. Лёс іх вызначыла мяжа, дзяржаўная граніца, якая ў 1922 г. пралегла паўз самую вёску. Жыхары Богушаў у святы абувалі хромавыя боты, сюды прыходзіла моладзь з навакольных вёсак, танцавалі пад патэфон. Усё гэта было інкрымінавана богушцам у пачатку 30-х гадоў, у разгар барацьбы з «шпіёнаманіяй»: сувязь з замежжам, з панскай Польшчай...

У 1931 г. арыштавалі ўсіх мужчын вёскі. Праз некаторы час былі выселены жанчыны і дзеці. Лёс іх застаўся невядомы. Пакінулі толькі сям'ю Юзэфа Учкурніса.

Адным з першых быў арыштаваны Браніслаў Адамавіч Богуш. Яго расстралялі ў Жыткавічах. Рэпрэсіямі кіраваў Станіслаў Богуш, старшыня мясцовага сельскага Савета. Разам з нкусаўцамі ён арыштаваў свайго старэйшага брата Адама. Але ў свой час забралі і яго...

Пасля некалькіх гадоў зняволення і турмаў у 50-гадовым узросце 21 ліпеня 1938 г. быў расстраляны ў Мазыры Адам Адольфавіч Богуш. Лёс астатніх невядомы, але можна не сумнявацца, што большасць богушцаў загінула.

Вёска Богушы знікла з твару зямлі...

Захаваўся толькі спіс мужчын в. Богушы, якіх арыштавалі напачатку.

БОГУШ Адам Адольфавіч
БОГУШ Браніслаў Адольфавіч
БОГУШ Вікенцій Адольфавіч
БОГУШ Канстанцін Адольфавіч
БОГУШ Станіслаў Адольфавіч
БОГУШ Адам Адамавіч
БОГУШ Браніслаў Адамавіч
БОГУШ Станіслаў Адамавіч
БОГУШ Ян Адамавіч
ЛАЗІЦКІ Віктар Аляксеевіч
ЛАЗІЦКІ Мікалай Аляксеевіч
УЧКУРНІС Юзэф Іосіфавіч

ТУРАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ТУРАЎ

АКУЛІЧ Адам Адольфавіч, н. у 1887 г., жыў на х. Чырвона-Поле, расстраляны 21.7.1938 г.

БАЛБУЦКІ Раман Іосіфавіч, н. у 1884 г., расстраляны 11.3.1938 г.

БЕРАЗОЎСКІ Іван Стэфанавіч, н. у 1909 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ВЕЦІК Максім Рыгоравіч, н. у 1885 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КАПЛАН Мотэль Мееравіч, н. у 1895 г., расстраляны 11.3.1938 г.

КОШМАН Мікалай Міхайлавіч, н. у 1902 г., расстраляны 10.11.1937 г.

КУРБАН Дзмітрый Васільевіч, н. у 1864 г., расстраляны 24.8.1937 г.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Іван Васільевіч, н. у 1873 г., расстраляны 5.1.1938 г.

РАДЗІВОНАЎ Карней Кандратавіч, н. у 1875 г., расстраляны 27.9.1937 г.

РАДЗІВОНАЎ Стахей Іванавіч, н. у 1876 г., расстраляны 11.3.1938 г.

РУДНІЦКІ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1901 г., расстраляны 11.3.1938 г.

РУМАС Сямён Мікітавіч, н. у 1903 г., расстраляны 11.3.1938 г.

СТАРОБІНСКІ Алтэр-Борух Моўшавіч, н. у 1886 г., расстраляны 16.2.1938 г.

СУБАТ Барыс Пятровіч, н. у 1901 г., расстраляны 5.1.1938 г.

СТРАХ Іван Іванавіч, н. у 1870 г., расстраляны 20.10.1937 г.

ТРЫЗНА Барыс Васільевіч, н. у 1870 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ЦЮСІК Рыгор Андрэевіч, н. у 1900 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ШОСТАК Сяргей Стахеевіч, н. у 1895 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЧЫРВОНЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЛЯХАВІЧЫ

ДАВЫДОВІЧ Фёдар Пятровіч, н. у 1883 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ВЁСКА ПУХАВІЧЫ

АГІЕВІЧ Карп Андрэевіч, н. у 1905 г., расстраляны 11.3.1938 г.

АГІЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1904 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ДАВЫДОВІЧ Іван Андрэевіч, н. у 1900 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА НАВУЦЬ

БАНДЗЮК Іларыён Міхайлавіч, н. у 1893 г., расстраляны 21.10.1937 г.

ГУЛЮТА Якаў Цімафеевіч, н. у 1890 г., расстраляны 27.9.1937 г.

КІРЫЕВІЧ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1893 г., расстраляны 2.10.1937 г.

ЛЯШКЕВІЧ Платон Іосіфавіч, н. у 1898 г., расстраляны 29.9.1937 г.

МАКСІМЧЫК Канстанцін Іванавіч, н. у 1870 г., расстраляны 31.1.1938 г.

РУДНІЦКІ Віктар Лявонавіч, н. у 1908 г., расстраляны 16.2.1938 г.

СЯМАШКА Віталій Уладзіслававіч, н. у 1903 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ХУТАРЫ

АБУХОВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1890 г., жыў на х. Арэліцы, расстраляны 20.3. 1938 г.

АЛІФЯРОВІЧ Адам Міхайлавіч

КАМІНСКІ Станіслаў Пятровіч, н. у 1906 г., жыў на х. Гусішча, расстраляны 24.12.1937 г.

КАРЧЭЎСКІ Баляслаў Антонавіч, н. у 1896 г., жыў на х. Парасля, расстраляны 19.11.1937 г.

ЛЯШКЕВІЧ Міхаіл Іосіфавіч

САНОЦКІ Рафаіл Цітавіч, расстраляны 29.12.1937 г.

ЮРКЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЮРКЕВІЧЫ

ГАРБУЗ Карней Васільевіч, н. у 1901 г., расстраляны 29.12.1937 г.

КРУКОВІЧ Якаў Лук'янавіч, н. у 1910 г., расстраляны 10.10.1937 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Дзяніс Васільевіч, н. у 1903 г., расстраляны 2.11.1937 г.

МАРКВАРТ Эдуард-Герман Вільгельмавіч, н. у 1897 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ВЁСКА БАРАВАЯ

КАЛОШЫЦ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1895 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КРАЎЧЭНЯ Сафрон Ніканоравіч, н. у 1913 г., расстраляны 19.11.1937 г.

МІНІЧ Аляксандр Уладзіміравіч, н. у 1908 г., жыў на х. Баравая, расстраляны 16.2.1938 г.

СУЛКОЎСКІ Віктар Сцяпанавіч, н. у 1901 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ЯФІМОВІЧ Міхаіл Фролавіч, н. у 1910 г., расстраляны 2.10.1937 г.

* * *

Работа над устанаўленнем прозвішчаў ахвяр беззаконня і сталінскіх рэпрэсій і іх рэабілітацыяй працягваецца.

1941

1945

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Чорнай датай у гісторыі стаў сонечны летні дзень 22 чэрвеня 1941 г. Як толькі стала вядома аб пачатку вайны, пачалася перабудова жыцця на ваенны лад. Першым этапам гэтай працы была мабілізацыя прызыўных узростаў у Чырвоную Армію. З добраахвотнікаў-актывістаў, прызнаных нягоднымі для вайсковай службы, міліцыянераў, пагранічнікаў 18-га пагранатрада ствараліся знішчальныя батальёны ў Жыткавічах і Тураве, байцы якіх неслі кругласутачнае дзяжурства ў пасёлках, ахоўвалі важныя аб'екты, дзяржаўную маёмасць, падтрымлівалі грамадскі парадак, а ў сярэдзіне ліпеня прымалі ўдзел разам з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі ў абарончых баях на тэрыторыі раёна.

Асноўныя ваенныя дзеянні, дзе вырашаўся лёс начальнага перыяду вайны, праходзілі паўночней і на поўдзень ад Тураўшчыны, ад Палесся. Як сцвярджае нямецкі генерал А. Філіпі, камандаванне яшчэ з часу першай сусветнай вайны засцерагалася яго — тут, у непраходных Пінскіх балотах, восенню 1915 г. назаўсёды і безнадзейна спыніўся фронт імперыялістычнай вайны, і гітлераўскія стратэгі строілі свае захопніцкія планы так, каб абыйсці гэты небяспечны і страшны для іх край[1]. Ужо на шосты дзень вайны танкі Гудэрыяна і Гота, злучыўшыся ўсходней Мінска, замкнулі кола акружэння вакол асноўных сіл Заходняга фронту, якія дыслацыраваліся ў прыгранічных раёнах Заходняй Беларусі. У пачатку ліпеня на тэрыторыю Тураўскага і Жыткавіцкага раёнаў праз былую савецка-польскую граніцу пачалі прыбываць часці і падраздзяленні 75-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра С. І. Нядзвігіна, якія прыкрывалі левы фланг 4-й арміі.

75-я стралковая дывізія была сфарміравана ў 1927 г. у складзе 115, 28 і 34-га палкоў. Камандны састаў яе выдзелены з 25-й дывізіі імя Чапаева. Дывізія ўваходзіла ў склад Кіеўскай, затым Ленінградскай ваеннай акругі, прымала непасрэдны ўдзел у савецка-фінскай вайне. У маі 1941 г. з раёна Жыткавіч была накіравана на заходнія рубяжы краіны, у Брэсцкую вобласць, увайшла ў склад 28-га стралковага корпуса 4-й арміі. Часці дывізіі размясціліся па р. Заходні Буг, занялі абарону на поўдзень ад Брэсцкага ўмацаванага раёна. 34-ы полк (камандзір маёр Бардзееў) у чэрвені 1941 г. знаходзіўся у раёне в. Медная, 28-ы (камандзір маёр Бандарэнка) — на стыку з Кіеўскай ваеннай акругай на левым фланзе арміі, 115-ы (камандзір маёр Лабанаў) — у другім эшалоне ў лесе на ўсход ад Маларыты. Штаб дывізіі размяшчаўся ў Маларыце. Дывізіяй камандаваў генерал-маёр С. І. Ня-

[1] *Филиппи* Припятская проблема. М., Иностр. лит-ра, 1959.

дзвігін, начальнік штаба — палкоўнік Я. А. Мартыненка, камісар — палкоўнік І. С. Ткачэнка.

22 чэрвеня палкі дывізіі прынялі першы бой з гітлераўцамі. Успамінае І. С. Ткачэнка: «Я знаходзіўся ў размяшчэнні 115-га палка. Праціўнік ішоў калонамі ва ўвесь рост, наперадзе рухаліся танкі з аўтаматчыкамі... Камандзір палка Лабанаў загадаў камандзіру палкавой артылерыі адкрыць агонь. Загарэліся два танкі, адзін бранявік, трэці танк трапіў на замініраваны ўчастак дарогі і ўзарваўся. Праціўнік працягваў наступаць, адкрыў шалёную страляніну з аўтаматаў. Капітан Карчма, камандзір 2-га батальёна, хутка перастроіў баявы парадак батальёна, падцягнуў дзве спараныя зенітныя ўстаноўкі, адкрыў дружны зенітны, кулямётны і мінамётны агонь... Камандзір палка Лабанаў арганізаваў контратаку, ад нечаканага ўдару фашысты пачалі адступаць. Аднак на ўчастках другіх палкоў пасля трохгадзіннага бою супраціўленне было зломлена, і яны пачалі адыход».

Так пачалася для дывізіі вайна. Ноччу з 26 на 27 чэрвеня яна была поўнасцю абкружана. Камандаванне прыняло рашэнне прарывацца на ўсход і выйсці на Ковельскую шашу з задачай злучэння з часцямі 4-й арміі. Дывізія была разбіта на тры групы. Правую ўзначаліў Нядзвігін, сяроднюю — Ткачэнка, левую — Мартыненка. Ёй і давялося потым абараняць Ленін, Жыткавічы. Выйсці на дарогу Брэст — Ковель гэтая група не змагла, вораг насядаў, і ў напрамку Пінска выйшлі толькі асобныя падраздзяленні. Вырашана было прарывацца ў раён Сарны. 2-га ліпеня група разам з іншымі акружэнцамі, у тым ліку і з групы Нядзвігіна, прыйшла ў Сарны, па загаду штаба арміі была пагружана ў эшалон і накіравана ў раён Пінска, дзе зноў заняла абарону.

Маршал Савецкага Саюза А. І. Яроменка ў кнізе «У пачатку вайны» піша: «9 ліпеня ў 20.00 дывізія з боем пачала адыходзіць з раёна Пінска ў напрамку Лунінец і далей за р. Случ, дзе заняла абарону на вузкім участку фронта, асядлаўшы чыгунку Пінск-Жыткавічы. На р. Случ часці дывізіі адбівалі атакі праціўніка да 10 ліпеня. У гэты дзень бой ішоў да самай ночы. У выніку праціўнік спыніў праследаванне. Дывізія, адарваўшыся ад гітлераўцаў, па загаду адыходзіла ў раён р. Пціч, дзе заняла абарону на старой савецка-польскай граніцы.

28-ы полк заняў абарону ў раёне в. Ленін, 115-ы полк — у раёне Жыткавіч, 34-ы знаходзіўся ў другім эшалоне. Праціўнік шалёна атакаваў правы фланг дывізіі ў раёне в. Ленін, але атакі ворага з вялікімі стратамі да яго былі адбіты. У гэтым баю быў паранены камандзір 28-га палка Бандарэнка. Асабліва вызначыліся ў баі начальнік штаба палка А. М. Рабых, камісар палка П. В. Папета, палітрук кулямётнай роты А. П. Паўлаў і іншыя.

Хутка дывізія ўвайшла ў склад 21-й арміі...»[1]

Асабліва вызначыўся ў абароне Леніна і Жыткавіч 28-ы стралковы полк. У гады грамадзянскай вайны толькі што створаны полк ваяваў на Заходнім фронце ў складзе 15-й арміі пад камандаваннем Корка. У 20-я гады дыслацыраваўся ў Маскве, затым у Вышнім Валачку, дзе атрымаў найменне «144-ы Вышневалоцкі стралковы полк», яму быў уручаны баявы сцяг, які захоўваецца цяпер у музеі гераічнай Брэсцкай крэпасці. З 1928 па 1931 г. палком камандаваў А. М. Васілеўскі, будучы Маршал Савецкага Саюза.

Злучэннем, у якое ўваходзіў полк, камандаваў былы намеснік

[1] *А.И. Еременко.* В начале войны. М., Воениздат, 1964 г.

В. І. Чапаева Куцякоў. Як лепшай часці, палку быў аказаны гонар у 1934 г. здымацца ў кінафільме «Чапаеў». За ўдзел у здымках полк атрымаў ганаровы Чырвоны сцяг УЦВК СССР.

У 1939 г. полк перайменаваны ў 28-ы, атрымаў новы сцяг. У складзе 75-й стралковай дывізіі полк удзельнічаў у Фінскай вайне, быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У Жыткавічах напярэдадні вайны размяшчаўся 115-ы стралковы полк, у ліпені ён абараняў раённы цэнтр.

У 3 гадз. 20 мін. на пазіцыі палка ўпалі першыя варожыя бомбы. Пачаліся доўгія дні і ночы абароны перад пераўзыходзячымі сіламі ворага — ад Маларыты і Пінска да Жыткавіч, далей — у бок Петрыкава да гераічнай абароны Магілёва.

Генерал-палкоўнік Л. М. Сандалаў у кнізе «Перажытае» ўспамінае: «У Пінску Нядзвігін застаў зусім абяссіленыя часці 6-й стралковай дывізіі пад камандаваннем Папсуй-Шапкі. Нейкім цудам яны ўтрымліваліся на подступах да горада наступленне армейскага корпуса немцаў. З падыходам часцей 75-й стралковай дывізіі супраціўленне ворагу ўзмацнілася, але ненадоўга. Праз тры дні Нядзвігін даносіў камандарму: «З ліпеня аб'яднаў пад сваім камандаваннем усе сілы, якія знаходзіліся ў раёне Пінска, але з-за адсутнасці боепрыпасаў вымушаны быў 5 ліпеня пакінуць горад...»

На працягу шасці сутак воіны 28-га палка абаранялі Ленін. Побач гераічна змагаліся байцы 18-га пагранатрада. Потым жорсткія баі ішлі за Жыткавічы. Там знаходзіліся вайсковыя склады, байцы папоўнілі запасы боепрыпасаў. 18 ліпеня нашы войскі вымушаны былі пакінуць пасёлак.

Артыкул пра бой за Жыткавічы быў апісаны ў дывізійнай газеце «За Радзіму» супрацоўнікам рэдакцыі А. Васюком, які прыязджаў у размяшчэнне вайсковай часці каля в. Рудня.

Воіны, якія вызначыліся ў гэтых баях,— Аўчыннікаў, Халанскі, Рамасаў, Трафімаў, Арлоў,— былі прадстаўлены да ўрадавых узнагарод. Але іх ніхто не атрымаў...

У гэтых бесперапынных жорсткіх баях, акружэнні і прарыву з яго дывізія мела значныя страты ў асабовым саставе і матэрыяльна-тэхнічнай частцы. Для ўмацавання камандна-палітычнага саставу яе часцей па рашэнню Палескага абкома КП(б)Б было накіравана больш 100 камуністаў, партыйных і савецкіх работнікаў. Па сутнасці, імі быў укамплектаваны палітаддзел дывізіі, умацаваны партарганізацыі часцей, а ў батальёны і роты накіраваны камуністы ў якасці палітрукоў (паліткіраўнікоў)[1]. Насельніцтва раёна дапамагала воінам Чырвонай Арміі ў прыгатаванні ежы, аказвала медыцынскую дапамогу раненым, усяляк спрыяла працы ваенных шпіталяў і лазарэтаў.

Інфармацыйныя запіскі першага сакратара абкома КП(б)Б П. А. Лявіцкага ў ЦК партыі сведчаць аб тым, што знішчальны батальён Тураўскага раёна разам з часцямі Чырвонай Арміі ўдзельнічаў у абарончых баях. Праціўніку ўдалося з ходу захапіць былую прымежную вёску Хільчыцы, аднак сумеснай атакай чырвонаармейцаў і байцоў знішчальнага батальёна гітлераўцы былі выбіты з вёскі[2]. За пяць дзён баёў у жніўні ў Тураве змяніліся тры начальнікі гарнізона: Дзмітрошын, Далганаў, Плявака.

У кастрычніку 1941 г. у разбітай нямецкай машыне быў знойдзены дзённік нямецкага перакладчыка. Аўтар дзённіка знаходзіўся ў пера-

[1] НАРБ, ф. 4. вып. 33а, с. 286, л. 238.
[2] Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Документы и материалы. Т. 1, Минск, 1967, с. 60, 67.

давым атрадзе гітлераўцаў. Вось некаторыя вытрымкі з дзённіка, якія характарызуюць абстаноўку на Тураўскім напрамку.

...10 ліпеня. Сустракаем масу бежанцаў. Цэлыя сем'і на павозках жывуць пад адкрытым небам. Мы наступаем з перадавым атрадам на Луткі...

...11 ліпеня. КП перадавога атрада на вышыні 130,3. У поўнач атака рускіх з поўначы на Талмачава. Ахраненне падаўлена. КП перамясціўся назад у Кострыца. Насельніцтва вельмі рэлігійнае, хоча, калі памерці, дык з богам. У вёсках, па якіх мы праходзілі, насельніцтва выносіла сталы з вадой, хлебам, соллю, малаком, іконамі.

...13 ліпеня. Раніцай налёт рускіх самалётаў. Мой хлеў не абарона ад куль. Снарады не так цягасны, як міны. Мой твар распух. Раніцай зноў атака рускіх... Шмат раненых і забітых.

...15 ліпеня. Батарэя праціўніка паўночней Хільчыц... Мы чакаем артпадтрымкі, затым пераходзім у наступленне.

...16 ліпеня. Мы наступаем. Мэта — Тураў...[1]

Як сведчыць былы начальнік 18-га Жыткавіцкага пагранатрада М. Р. Аканін, 13 ліпеня 1941 г. камендант Тураўскай камендатуры далажыў у 18-ы пагранатрад, што каля батальёна немцаў вядуць наступленне на былыя заставы і пагранічнікі з баямі мусяць адыходзіць... На дапамогу ім накіраваны прыбыўшыя на тэрыторыю пагранатрада Старобінская камендатура пад кіраўніцтвам ст. лейтэнанта Іванова і артылерыя 75-й стралковай дывізіі. Аднак паром праз р. Прыпяць узарваны, лодак не было і пагранічнікі не змаглі пераправіцца на правы бераг. Артылерысты выявілі скапленне ворага і адкрылі агонь. На лодках немцы хацелі пераправіцца праз раку і захапіць артылерыю, але агнём з гармат былі расстраляны ва ўпор[2].

Праз два тыдні з пачатку вайны на Прыпяці каля пераправы ў Лахве з мэтай забеспячэння агнём адыходу галоўных сіл 75-й стралковай дывізіі на Жыткавічы была сканцэнтравана Пінская ваенная флатылія. Тылы яе знаходзіліся ў 20 км на ўсход ад Турава, у раёне Нароўлі. 6 ліпеня дывізія заняла абарону на ўчастку в. Чырвонае — Жыткавічы. На правым беразе Прыпяці нашых часцей не было, абарона была ўскладзена на ваенна-рачныя сілы. Атрад рачных караблёў у складзе маніторaў «Смаленск» (з 22 чэрвеня па 9 жніўня камандзір ст. лейтэнант М. Ф. Пецух, з 11 жніўня — ст. лейтэнант Ф. К. Сямёнаў), 5 бранякацераў і асобных падраздзяленняў 75-й дывізіі заняў абарону ў раёне Турава і з 7 ліпеня вёў там баі.

Пасля таго, як узнікла небяспека прарыву праціўніка з Давыд-Гарадка ў напрамку да Мазыра, перад атрадам была пастаўлена задача прарвацца ў размяшчэнне ворага для разведкі і абстрэлу жывой сілы.

15 ліпеня гітлераўцы пры падтрымцы артылерыі і мінамётаў занялі рубеж Тураў — Слепцы. Прыпяцкі атрад, узмоцнены трыма вартавымі судамі, атрымаў загад не дапусціць ворага ў раён Тураў — Пагост.

У пачатку жніўня атрад вёў баі на Пцічы, падтрымліваючы агнём падраздзяленні 75-й дывізіі, і не дапусціў праціўніка за раку. У гэты час ён падпарадкоўваўся камандаванню 5-й арміі і забяспечваў пераправу нашых войск праз Прыпяць у раёне Чарнобыля, з 22 жніўня — за Днепр. 31 жніўня караблі Прыпяцкага і Бярэзінскага атрадаў прарваліся да Кіева.

Загадам наркома ВМФ СССР 5.10.1941 г. Пінская ваенная фла-

[1] НАРБ, ф. 4, воп. 33а, с. 27, л. 17.
[2] Новае Палессе. 17.10.1968 г.

тылія была расфарміравана і раздзелена на тры атрады: Прыпяцкі, Дняпроўскі і Бярэзінскі[1].

15 ліпеня гітлераўцы захапілі Тураў і да 23 ліпеня прасунуліся да вёскі Азяраны. Шэсць з дзевяці сельсаветаў былога Тураўскага раёна было акупіравана нямецкімі войскамі.[2] Па рашэнню Палескага абкома партыі ў гэтыя дні ў раёне на базе знішчальнага батальёна быў створаны партызанскі атрад, камандзірам якога быў прызначаны начальнік райаддзела міліцыі М. І. Голікаў, камісарам — В. П. Савін. Разам з атрадам на акупіраванай тэрыторыі раёна дзейнічала аператыўная група, якую ўзначальваў работнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення НКДБ Крымаў.

Пасля захопу немцамі Турава партызанскі атрад адступіў разам з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі на правы бераг Сцвігі. Каля двух сутак партызаны прымалі ўдзел у абароне в. Азяраны. Немцам удалося прарвацца ў напрамку вёсак Пераройскі Млынок, Хлупін. Яны імкнуліся захапіць вёску Снядзін, каб злучыцца з рэгулярнымі часцямі арміі Петрыкаўскага напрамку. Група партызан зайшла ў тыл ворага на 30 км і ўзарвала два масты ў в. Хлупін і Пераройскі Млынок. Дзеянні партызан вызвалі замінку ў немцаў, што на некаторы час затрымала наступленне.

У ноч з 30 на 31 ліпеня група партызан на чале з начальнікам атрада Голікавым прабралася ў тыл ворага каля в. Рычоў, дзе прабыла два дні. Партызаны завязалі бой з пераўзыходзячай групай немцаў, чым спрыялі руху часцей Чырвонай Арміі да в. Азяраны. У той жа дзень працаўнік пачаў адыходзіць з тэрыторыі Тураўскага раёна.

Ноччу 4 жніўня тураўскі партызанскі атрад пад камандаваннем другога сакратара Тураўскага РК КП(б)Б М. М. Бяляўскага ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі на чале з капітанам Даніленка ўступіў у бой у вёсцы Азяраны з часцю праціўніка. Аперацыя была добра падрыхтавана, праведзена разведка, папярэдне ў вёсцы Пагост былі знішчаны гарматы і два кулямёты гітлераўцаў. Удар партызан і чырвонаармейцаў быў нечаканым і моцным, вораг пакінуў Азяраны і адступіў у Тураў. Але і ў горадзе затрымацца яму не ўдалося, бой працягваўся, гітлераўцы занялі абарону ў Запясоччы. Атрад хутка выбіў іх і адтуль. Адступаючы з Турава, немцы падпалілі многія будынкі, над горадам слаўся чорны дым...

Атрад папоўніўся мясцовымі жыхарамі. Амаль два тыдні ўтрымлівалі горад 60 партызан і звыш ста чырвонаармейцаў, адбівалі адну атаку за другой, неслі страты, пакутавалі, але не адступалі... Вялікую дапамогу абаронцам аказвалі мясцовыя жыхары. Упорства і мужнасць продкаў зноў ажылі ў тураўцаў, як стагоддзі назад, яны гатовы былі памерці, але не скарыцца.

15 жніўня гітлераўцы, назапасіўшы сіл, пачалі новае наступленне на Тураў. Ім удалося пацясніць абаронцаў і заняць частку горада, але не надоўга: праз некалькі гадзін партызаны і чырвонаармейцы зноў вызвалілі Тураў. 23 жніўня пачаўся апошні штурм пазіцый абаронцаў Турава. Бранякацеры, якія ноччу падышлі да горада, падпалілі яго запальваючымі мінамі. Гарэлі Чэрнічы, Слепцы, Рыдча... Чырвонаармейцы пад націскам вялікіх сіл ворага адступілі да Азяран, затым у бок Сіманавіцкага Млынка. Над раёнам згусціўся трохгадовы змрок фашысцкай акупацыі.

Толькі 17 ліпеня — амаль праз месяц пасля пачатку вайны, калі ўжо даўно заняты Мінск, вораг быў каля

[1] ЦВМА ў г. Гатчыне, ф. 19, воп. 1, с. 13.
[2] НАРБ, воп. 39а, с. 13, л. 26, л. 48—51.

Смаленска і Кіева, у глыбіні наступаючых войск працаўніка пасля ўпартых баёў каля Мікашэвіч і Леніна былі заняты Жыткавічы, якія з апошніх сіл абаранялі байцы 18-га пагранічнага атрада і падрыздзяленні 75-й дывізіі. На працягу некалькіх тыдняў жніўня немцы не маглі канчаткова захапіць і ўмацавацца ў Тураве. Палескі край не здаваўся і не хацеў падпарадкоўвацца захопнікам з пачатку і да канца акупацыі — так як было і спрадвеку.

А. М. Літвін

22 чэрвеня ў Жыткавічах

На 22 чэрвеня 1941 г. быў прызначаны сход раённага актыву. Планавалася абмеркаваць гаспадарчыя пытанні, звязаныя з заканчэннем вясенніх палявых работ і падрыхтоўкай да ўборкі ўраджаю. Удзельнікам гэтага сходу быў і я, як сакратар партыйнай арганізацыі раённага аддзела ўнутраных спраў.

Сход адкрыў другі сакратар райкома партыі І. Р. Чаўскі (першы сакратар райкома З. Я. Бярковіч знаходзіўся на ваенных зборах). Аднак абвестка дня сходу нечакана стала зусім другой: хутка стала вядома аб вераломным нападзе на краіну фашысцкай Германіі. Гэтае паведамленне ашаламіла ўсіх. Размова пайшла зусім у другім напрамку: як арганізаваць адпор ворагу? Запомніліся словы ўдзельніка грамадзянскай вайны В. А. Аўсеяса, які працаваў загадчыкам аддзела сацыяльнага забеспячэння. Ён прапанаваў успомніць вопыт той вайны, арганізаваць у раёне спецыяльны атрад і накіраваць яго на фронт. Тое ж гаварыў і арганізатар першай камуны ў раёне І. М. Кісялёў. Ён выказаў упэўненасць, што на барацьбу з ворагам уздымецца ўвесь народ, і быў, як аказалася, правы...

І. Р. Чаўскі прапанаваў усім вярнуцца на свае месцы і расказаць людзям аб тым, што здарылася. Жыццё раёна з гэтага часу пайшло зусім па іншых, ваенных рэйках...

Людзі расходзіліся са сходу з цяжкім настроем, усе разумелі, што трэба рыхтавацца да горшага. Вярнуліся ў райаддзел міліцыі і мы з начальнікам аддзела Р. М. Гуціным. Там знаходзіліся амаль усе нашы работнікі. Надвор'е было сонечным, стаяў гарачы летні дзень, і ад гэтага, ці ад палкіх прамоў міліцыянераў у памяшканні было надзвычай душна... Р. М. Гуцін ускрыў сакрэтны пакет Наркома ўнутраных спраў рэспублікі. У ім было распісана, хто накіроўваецца ў войска, а хто на «броні» пакінуты для аховы парадку ў раёне і таксама пераводзіцца на ваеннае становішча. На фронт пайшлі нашы лепшыя таварышы, развітанне з імі было горкім і цяжкім. Усе разумелі, што развітваюцца, магчыма, назаўсёды...

На вуліцы перад будынкам райаддзела сабраліся жонкі міліцыянераў, многія з дзецьмі. Усе былі ўстрывожаны, страшная вестка ўжо дайшла да іх. Былі слёзы і роспач. Там знаходзіліся таксама мая жонка, Алена Іванаўна, з трохгадовым сынам Валодзем і гадавалай дачкой Святланай. Усіх хвалявала пытанне — што чакае іх, але хто тады мог адказаць на гэтае пытанне?.. Не ведаў і я, што хутка страчу дарагіх для мяне людзей: сям'я была накіравана на ўсход, і як стала вядома потым, эшалон быў разбомблены, лёс жонкі і дзяцей так і застаўся невядомым, але не было сумнення, што ўсе яны загінулі. Такі лёс быў у многіх нашых супрацоўнікаў.

У другой палове дня я быў у райаддзеле міліцыі. Р. М. Гуцін сказаў, што прыйшло распараджэнне падрыхтаваць да эвакуацыі сем'і, а таксама вывезці дакументы і знішчыць архівы. Да вечара мы займаліся гэтай работай. Палілі паперы ў сябе, а большую частку адвезлі да кача-

гаркі райпрамкамбіната і кідалі ў полымя печы. Магчыма, нехта і звярнуў увагу на тое, што ў гарачы летні дзень валіць дым з трубы качагаркі, але людзі былі заняты сваімі трывогамі, было не да гэтага.

У раёне быў створаны знішчальны батальён. У яго ўвайшлі не прызваныя ў армію актывісты і прызнаныя нягоднымі да страявой службы, міліцыянеры, пагранічнікі 18-га пагранатрада. Байцы батальёна неслі кругласутачнае дзяжурства па гарадскім пасёлку, ахоўвалі важныя аб'екты, дзяржаўную маёмасць, падтрымлівалі грамадскі парадак. Хутка байцы гэтага батальёна склалі касцяк партызанскага атрада.

У. М. Дзербан

Горкі пыл адступлення

Вачыма салдата

Арлоў Аляксандр Іванавіч (н. 23.9.1921 г. на х. Кузькін Валгаградскай вобл.) перад вайной быў прызваны ў армію, служыў камандзірам кулямётнага аддзялення ў палку, які дыслацыраваўся ў Жыткавічах. Абараняў Пінск, Ленін, Жыткавічы... Каля Кіева цяжка паранены. Удзельнічаў у Сталінградскай бітве, затым франтавыя дарогі пралеглі праз Курск, Гомель, Варшаву да Берліна. Пасля вайны працаваў у савецкіх органах, быў дырэктарам Плотнікаўскай сярэдняй школы. Выдатнік народнай адукацыі СССР. Інвалід Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ст., Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі.

* * *

У ліпені 1941 г. п. Ленін абараняў 28-ы Чырванасцяжны полк 75-й стралковай дывізіі. На подступах да пасёлка ішлі цяжкія, кровапралітныя баі. Абарона праходзіла ў раёне вёскі Ельна па дарозе Ленін—Пінск у паўночным напрамку. 16 ліпеня немцы пацяснілі нашы войскі, і тады на выручку прыйшлі байцы 18-га пагранічнага атрада. Па праціўніку быў нанесены моцны ўдар, ён вымушаны адступіць на 4—5 кіламетраў. Калі пасля ўпорных баёў полк адступіў ад Мікашэвіч, войскі, якія абаранялі Ленін, аказаліся пад пагрозай акружэння, і ўвечары 18 ліпеня пасёлак быў пакінуты.

А. І. Арлоў, камандзір аддзялення кулямётнага ўзвода. Сакавік 1941 г.

...Полк заняў абарону на поўнач ад Леніна, дзе сыходзіліся дзве дарогі — на Пінск і на Ленін. Паміж дарогамі — балоты, зручная акалічнасць пры абароне.

Аддзяленне аўтаматчыкаў пад камандай сяржанта Аўчыннікава атрымала загад разведаць мясцовасць у паўночным напрамку. У выпадку сустрэчы з праціўнікам уступіць у бой і затрымаць яго да падыходу асноўных сіл.

Ішлі па цэнтральнай вуліцы Леніна. Будынкі савецкіх установаў былі пустымі, на кожным кроку відны сляды эвакуацыі. Зайшлі на пошту. Усюды раскіданы неадпраўленыя пісьмы. Спрабавалі пагаварыць з устрывожанымі жыхарамі, але ўсе спяшаліся, адказвалі неахвотна. На ўскраіне стаяў недабудаваны дом, справа — будынак школы. Пачынаўся лес.

Раптам з боку будоўлі грымнуў стрэл. Побач свіснула куля... Мы залеглі каля плоту. Цішыня. Нікога не відаць. Аўчыннікаў загадаў Ка-

гаркі райпрамкамбіната і кідалі ў полымя печы. Магчыма, нехта і звярнуў увагу на тое, што ў гарачы летні дзень валіць дым з трубы качагаркі, але людзі былі заняты сваімі трывогамі, было не да гэтага.

У раёне быў створаны знішчальны батальён. У яго ўвайшлі не прызваныя ў армію актывісты і прызнаныя нягоднымі да страявой службы, міліцыянеры, пагранічнікі 18-га пагранатрада. Байцы батальёна неслі кругласутачнае дзяжурства па гарадскім пасёлку, ахоўвалі важныя аб'екты, дзяржаўную маёмасць, падтрымлівалі грамадскі парадак. Хутка байцы гэтага батальёна склалі касцяк партызанскага атрада.

У. М. Дзербан

Горкі пыл адступлення

Вачыма салдата

Арлоў Аляксандр Іванавіч (н. 23.9.1921 г. на х. Кузькін Валгаградскай вобл.) перад вайной быў прызваны ў армію, служыў камандзірам кулямётнага аддзялення ў палку, які дыслацыраваўся ў Жыткавічах. Абараняў Пінск, Ленін, Жыткавічы... Каля Кіева цяжка паранены. Удзельнічаў у Сталінградскай бітве, затым франтавыя дарогі пралеглі праз Курск, Гомель, Варшаву да Берліна. Пасля вайны працаваў у савецкіх органах, быў дырэктарам Плотнікаўскай сярэдняй школы. Выдатнік народнай адукацыі СССР. Інвалід Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ст., Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі.

* * *

У ліпені 1941 г. п. Ленін абараняў 28-ы Чырванасцяжны полк 75-й стралковай дывізіі. На подступах да пасёлка ішлі цяжкія, кровапралітныя баі. Абарона праходзіла ў раёне вёскі Ельна па дарозе Ленін—Пінск у паўночным напрамку. 16 ліпеня немцы пацяснілі нашы войскі, і тады на выручку прыйшлі байцы 18-га пагранічнага атрада. Па праціўніку быў нанесены моцны ўдар, ён вымушаны адступіць на 4—5 кіламетраў. Калі пасля ўпорных баёў полк адступіў ад Мікашэвіч, войскі, якія абаранялі Ленін, аказаліся пад пагрозай акружэння, і ўвечары 18 ліпеня пасёлак быў пакінуты.

А. І. Арлоў, камандзір аддзялення кулямётнага ўзвода. Сакавік 1941 г.

...Полк заняў абарону на поўнач ад Леніна, дзе сыходзіліся дзве дарогі — на Пінск і на Ленін. Паміж дарогамі — балоты, зручная акалічнасць пры абароне.

Аддзяленне аўтаматчыкаў пад камандай сяржанта Аўчыннікава атрымала загад разведаць мясцовасць у паўночным напрамку. У выпадку сустрэчы з праціўнікам уступіць у бой і затрымаць яго да падыходу асноўных сіл.

Ішлі па цэнтральнай вуліцы Леніна. Будынкі савецкіх установаў былі пустымі, на кожным кроку відны сляды эвакуацыі. Зайшлі на пошту. Усюды раскіданы неадпраўленыя пісьмы. Спрабавалі пагаварыць з устрывожанымі жыхарамі, але ўсе спяшаліся, адказвалі неахвотна. На ўскраіне стаяў недабудаваны дом, справа — будынак школы. Пачынаўся лес.

Раптам з боку будоўлі грымнуў стрэл. Побач свіснула куля... Мы залеглі каля плоту. Цішыня. Нікога не відаць. Аўчыннікаў загадаў Ка-

валёву, Рамасаву і мне праверыць дом. Асцярожна падыйшлі, заглянулі ў сярэдзіну — нікога... Рушылі далей, прыслухоўваючыся да кожнага гуку. Ціха шумелі сосны. Лес хутка пасвятлеў, расступіўся, перад намі была невялікая вёсачка. На агародзе корпалася жанчына, па вуліцы хадзілі куры. Было відавочна, што немцаў у вёсцы няма. Аўчыннікаў загадаў:

— Рамасаў і Арлоў, пойдзеце ў вёску, распытаеце, ці былі немцы.

Мы падыйшлі да крайняй хаты, паклікалі жанчыну.

— Немцы ў вёсцы былі?

— Пакуль, дзякуй богу, не было...

Падыйшла суседка, за ёй прыбег хлапчук гадоў дванаццаці.

— Кажуць, у Леніне немцы.

— Не, у Леніне іх няма.

— А будуць? — у вачах людзей была трывога і надзея. Але што мы маглі адказаць?.. Было балюча і шкада гэтых мірных, безабаронных людзей, дзяцей.

Вярнуліся ў лес. Можна было працягваць шлях. Але мы затрымаліся, разгаварыліся. Успомнілі радзіму, родных, пакінутых недзе далёка — як яны там, што з імі?..

Раптам наперадзе, дзе дарога ў лесе рабіла паварот, заўважылі нейкі рух. Немцы!

Ворагі спыніліся на ўзлеску, агледзелі вёску. Я ўспомніў жыхароў, з якімі размаўляў у вёсцы — вось яно, пачынаецца самае страшнае...

— Нельга пусціць іх у вёску,— сказаў я.

— Не пусцім...

Фашыстаў было каля дваццаці. Разведка ці галаўная паходная застава? Вось яны выйшлі на дарогу. Аўчыннікаў скамандаваў:

— Агонь!

Застрачылі кулямёты. Немцы кінуліся назад ў лес. Пачуліся воклічы каманды, ворагі адкрылі з лесу агонь. Кулі цокалі ў дрэвы, узбівалі фантанчыкі пяску. Мы спынілі стральбу — трэба было берагчы патроны. Хутка і з боку немцаў заціхла, яны пачалі прабірацца наперад. На ўзлеску ляжала некалькі забітых гітлераўцаў.

— Хочуць падабраць сваіх,— сказаў Юдаеў.

— Як жа, падбяруць,— адказаў Халанскі і даў доўгую чаргу з аўтамата. Ворагі зноў залеглі і адкрылі шалёны агонь. Было відавочна, што мы сустрэліся з разведкай праціўніка.

Раптам ворагі спынілі стральбу. Ці не спрабуюць абыйсці нас? Аўчыннікаў загадаў агледзець правы фланг. Туды накіраваліся Рамасаў і Цімафееў. Хутка адтуль пачулася страляніна.

— Кавалёў і Арлоў, на дапамогу Рамасаву!

Спроба немцаў зайсці нам у тыл не ўдалася. Усё сціхла. Варожая разведка адступіла. Сонца хілілася да захаду:

— Пара адыходзіць,— сказаў Аўчыннікаў.

На наступны дзень асноўныя сілы ворага падыйшлі да Леніна. Пачаліся цяжкія баі па дарозе на Пінск у трох- чатырох кіламетрах ад пасёлка. Мы ў гэты час знаходзіліся ў Леніне, ахоўвалі штаб палка і высочвалі дыверсійныя групы. Праз некалькі дзён даведаліся пра подзвіг Міхаіла Радамышальскага.

На золку ворагі атакавалі роту старшага лейтэнанта Капейка, якая перакрыла шасэ. Камандзір узвода Каракуль трымаў пад абстрэлам кулямёта дарогу, а Радамышальскі з кулямётам залёг збоку крыху наперадзе. Ворагі, якія ішлі ў атаку, не заўважылі яго.

Каракуль вёў прыцэльны агонь па гітлераўцах, Радамышальскі маўчаў. Калі ворагі амаль параўняліся з ім, кулямётчык націснуў на гашэтку, расстрэльваючы іх з флан-

га амаль ва ўпор. Немцы кінуліся наўцёкі. Атака была адбіта.

Праз некаторы час праціўнік абрушыў на абарону чырвонаармейцаў лавіну артылерыйскага і мінамётнага агню. Балотная твань закідала кулямёт і разлік, Радамышальскаму здалося, што ён паранены. Правёў рукой па твары — не, крыві няма. Праверыў і падрыхтаваў кулямёт да бою. Хутка фашысты зноў паднялі ся ў атаку. І зноў, калі ворагі падыйшлі зусім блізка, Радамышальскі адкрыў агонь, гітлераўцы адступілі. За дзень было адбіта некалькі атак.

На наступны дзень фашысты вырашылі сцерці з зямлі балотны астравок з кулямётам, які не даваў ім жыцця. Радамышальскі праявіў сапраўдную салдацкую знаходлівасць: абгарнуў плашч-палаткай кулямёт і схаваўся з ім на дно першай варонкі. Снарады перамешвалі зямлю, вырывалі з каранямі дрэвы.

Калі абстрэл закончыўся, Радамышальскі выцягнуў кулямёт. У ствале «Максіма» была адтуліна, прабітая асколкам.

— Усё, адваяваліся,— сказаў другі нумар разліку.

— Нічога, заткнем дзірку, яшчэ паслужыць наш сябра,— адказаў Міхаіл.

І зноў адну за другой атаку адбівалі чырвонаармейцы. Ворагі падступалі да пазіцыі кулямётчыкаў з усіх бакоў. Радамышальскі кінуў гранату.

— Давай ленту! — крыкнуў другому нумару. Але той не адгукнуўся, ён сціскаў ленту з патронамі ў мёртвых руках... Радамышальскі выцягнуў ленту і сам адкрыў агонь, але аднаму спраўляцца было цяжка, патрон заклініла. Выправіў ленту — і зноў паліваў ворагаў агнём. Скончыліся патроны, але і ворагі больш не лезлі... Наступіў вечар. Навокал ні душы — нямала забітых немцаў ляжала ў балоце і на дарозе. Але абаронцы Леніна загінулі ўсе да аднаго.

Ноччу вораг бясконца пускаў ракеты, абстрэльваў нашы пазіцыі трасіруючымі кулямі. Прыбыло папаўненне, заняло абарону замест загінуўшых. А раніцай, калі перад чарговай атакай гітлераўцы адкрылі артылерыйскі агонь, ад аднаго з першых снарадаў адважны кулямётчык Міхаіл Радамышальскі загінуў...

Было зразумела, што немцы чакаюць падмацаванне, каб з новымі сіламі абрушыцца на нашу абарону. Начальнік штаба палка капітан Рабых вырашыў зрабіць дзёрзкую аперацыю — прабрацца ў тыл ворага і разграміць падмацаванне на маршы. Ён выклікаў Аўчыннікава і Халанскага.

— Ваша задача,— паказаў на карце,— устроіць вось тут засаду і нечаканым ударам знішчыць падмогу праціўніка. Возьмеце дзесяць чалавек. Выступайце неадкладна.

Збіраліся і рыхтаваліся ў небяспечную дарогу каля пошты ў Леніне. Праз гадзіну рушылі. Ішлі па карце. Па балоту выйшлі на дарогу Ленін—Сінкевічы, лінія фронту засталася недзе ззаду. Сабраліся разам, каб удакладніць задачу, агледзецца на мясцовасці. Раптам на дарозе паказаліся гітлераўцы. Іх было не менш сотні.

— Спазніліся,— з прыкрасцю сказаў Аўчыннікаў.— Ударым з фланга.

Халанскі запярэчыў:

— Прапусцім і ўдарым з тылу... На павароце, на самым вузкім месцы.

Аўчыннікаў згадзіўся. Ён разбіў групу на дзве часткі:

— Чацвёра са мной — з правага боку, шасцёра пад камандай Халанскага — злева. Агонь адкрываць па маёй камандзе. Кідаем гранаты і адразу — з аўтаматаў...

Прапусціўшы калону, мы выйшлі

на дарогу. Ворагі спяшаліся, ішлі, не аглядваючыся. Аўчыннікаў выцягнуў гранату, за ім — астатнія. Дзесяць узрываў грымнулі амаль адначасова. Адразу ўслед за імі мы адкрылі агонь з аўтаматаў. Гітлераўцы разгубіліся, кінуліся ў лес, некаторыя спрабавалі адстрэльвацца, але ініцыятыва была ў нашых руках. Бой працягваўся нядоўга, выратавацца ўдалося толькі некалькім фашыстам. Мы падабралі трафеі — два кулямёты, аўтаматы. Мінамёт разбілі і закінулі ў балота. Нехта заўважыў нітку сувязі ўздоўж дарогі, абарвалі яе.

Раптам пачуўся трэск матацыкла. Вырашылі ўзяць матацыкліста ў палон. Залеглі па баках дарогі.

— Страляем па калёсах, матацыкліст павінен застацца жывым.

Гітлеравец заўважыў, відаць, сляды нядаўняга бою, прытармазіў і хацеў развярнуцца назад, але тут засакаталі аўтаматныя чэргі. Матацыкл развярнула, фашыст ударыўся грудзямі аб руль і вываліўся на дарогу. Хацеў схапіцца за пісталет, але своечасова падаспелі Рамасаў і Кавалёў.

Вярталіся ўзбуджаныя, задаволеныя перамогай. Палонны гітлераўец нёс абодва трафейныя кулямёты. Перад самым пасёлкам нас абстраляў з нізкага палёту фашысцкі самалёт, але нікога не зачапіла. Вось і Ленін...

Побач з намі мужна змагаліся пагранічнікі 18-га пагранічнага атрада. Там быў і палкоўнік Аканін, камандзір атрада — чалавек суровы, але справядлівы, мужны ў баі. Старшы лейтэнант Гаршкоў даручыў мне перадаць загад камандзіра палка маёра Бандарэнка на адступленне, і я на веласіпедзе з цяжкасцю пераадолеў па пяску сем кіламетраў ад Леніна да лініі абароны. Там мяне не зразумелі пагранічнікі, якія ўтрымлівалі абарону і такога загаду не атрымалі, яны палічылі мяне за правакатара, здрадніка. На шчасце, умяшаўся палкоўнік Аканін. Назад я вярнуўся на брані танка. З жалем, болем у сэрцы пакідалі Ленін...

Адыходзім да Жыткавіч. Перад горадам каля чыгункі занялі абарону. Раніца была хмурай і халоднай, дзьмуў парывісты вецер.

Не паспелі як след замацавацца, калі на нас абрушыўся мінамётны агонь. Потым ударылі кулямёты, гітлераўцы пайшлі ў атаку. Левы фланг нашай абароны не вытрымаў і пачаў адступаць за насып. Варожыя аўтаматчыкі прарваліся на палатно чыгункі, адкрылі агонь па пазіцыях чырвонаармейцаў з фланга, яны вось-вось выйдуць да нас у тыл. Капітан Рабых загадаў:

— Знішчыць прарваўшыхся аўтаматчыкаў!

— Падрыхтаваць гранаты!—скамандаваў Аўчыннікаў.

Удар быў моцным і нечаканым для праціўніка. Ён не вытрымаў і скаціўся з насыпу. Распаленыя боем, мы пачалі іх праследаваць, углыбіліся ў лес, што было рызыкоўна. Там аказалася нечакана многа гітлераўцаў, і цяпер мы самі апынуліся ў пастцы. На нас абрушыўся шчыльны агонь, трэба было адступаць, але гэта няпроста. Гітлераўцы імкнуліся адрэзаць нам шлях да адступлення. Яны ўстанавілі кулямёт, які паліваў агнём уздоўж чыгункі, перабрацца праз яе было надзвычай складана. Халанскі кінуў у блізкіх аўтаматчыкаў гранату. Аўчыннікаў з двумя чырвонаармейцамі застаўся прыкрываць адход, Халанскі загадаў астатнім прабівацца праз насып. Нечакана мы аказаліся ў фланзе праціўніка, некалькі аўтаматчыкаў выскачылі насустрач, але нам удалося знішчыць іх — і шлях свабодны.

Полк вёў бой ужо ў горадзе. Убачыўшы нас, капітан Рабых узрадаваўся:

— А мы вас ужо пахавалі. Тры-

майце мост на дарозе ў горад з поўначы. Адыйдзеце, калі сапёры ўзарвуць яго.

— Няма боепрыпасаў.

— Там склады,— махнуў капітан рукой убок.— Бярыце, што вам трэба. Трымацца да апошняга.

....Жыткавічы гарэлі. Калі падыходзілі да моста праз Глініцу, убачылі ворагаў, якія ўзбягалі на яго. Іх было не менш пяцідзесяці. Раздумваць не было калі — хто дзе прымасціўся, адкрылі дружны агонь. Некалькі гітлераўцаў упалі з моста, іншыя кінуліся з нязручнага месца ўніз. Захапіўшыся боем, мы не заўважылі, як трое фашыстаў, якія знаходзіліся па другі бок рэчкі яшчэ да нашага прыходу, падкрадваліся да нас з тылу. На шчасце, іх заўважыў сувязны Трафімаў.

— Немцы ззаду! — крыкнуў ён.

Халанскі, не падаючы выгляду, што пачуў, спакойна сказаў:

— Разані па іх.

Я рэзка развярнуўся і выпусціў чаргу. Двое ўпалі адразу, трэці паспеў адбегчы. Калі падыйшлі да іх, адзін з упаўшых, увесь у крыві, устаў, не далёка адбег і трэці. Трафімаў павёў палонных у штаб.

Бой грымеў з усіх бакоў. Чырвонаармейцы ў многіх месцах не давалі фашыстам прыўзняць галавы. Але сілы былі няроўныя. Ворагі з'яўляліся ў розных, самых нечаканых месцах. Вось і нас пачалі абкружаць. Над галавой прасвісталі кулі. Я залёг каля плоту і адкрыў агонь. Да мяне па бульбе падпоўз Халанскі. Праз плот не пералезці. А ворагі між тым прыбліжаліся. Халанскі спрабаваў адарваць дошку ад плота, але яна не падавалася. Тады ён прыўзняўся і ўсёй сілай ударыў нагой. Дошка пераламалася. Халанскі адкінуў ніжнюю частку яе і сказаў:

— Хутчэй пралазь!

Фашысты побач. Я даў чаргу з аўтамата, паспеў заўважыць, як адзін гітлеравец упаў, і кінуўся ў дзірку за Халанскім. Прыпыніліся на другім баку хлява — нас не даганялі, толькі кулі шчоўкалі па бярвеннях зверху.

Да вечара абаранялі горад. Потым прыбег сувязны і сказаў, што атрыманы загад адступаць. Полк будзе адступаць апошнім, а наша група павінна прыкрываць яго.

— Пасля ўзрыву моста,— нагадаў сувязны.

Заходзіла сонца. Прайшло не больш пятнаццаці мінут, як апошняе падраздзяленне пакінула Жыткавічы — і магутны выбух скалануў паветра. Нібы адразу пацямнела. Мы спыніліся ў садзе, каб падрыхтавацца да маршу — даганяць полк. Раптам нехта ціха войкнуў:

— Немцы!

Яны былі зусім блізка, прабіраліся па беразе рэчкі, падыйшлі непрыкметна — і нечакана адкрылі агонь. Мы залеглі, а потом, выбраўшы зручнае месца, кінуліся ў прарыў. Вось і жыта, якое ўжо адкаласавала, але не было каму ўбіраць яго ў гэтае суровае, трагічнае лета. Падыйшлі да чыгункі. На ёй раптам з'явілася некалькі варожых салдат, якія глядзелі на нас і не разумелі — хто мы: у Рамасава на галаве нямецкая каска, у многіх у руках нямецкія аўтаматы. А змрок згушчаўся.

Некалькі імгненняў разгубленасці ворагаў было дастаткова, каб Халанскі скамандаваў:

— Наперад, за мной! — і кінуў гранату.

Гітлераўцы, хто застаўся жывым, кінуліся ўцякаць. Потым услед нам некалькі разоў стрэліла нямецкая батарэя, якая знаходзілася побач. Урону яна нам не нанесла, але калі перайшлі ўброд рэчку і спыніліся перадыхнуць і пералічыцца, я адчуў у назе боль. Разуўся — кроў у боце. Асколак засеў у назе ніжэй калена...

А. І. Арлоў

Пагранічнікі стаялі цвёрда

...9 ліпеня 1941 г. у другой палове дня нямецкая разведка колькасцю да 20 матацыклістаў, аднаго бранявіка і ўзвода конніцы ў раёне вёскі Хільчыцы сустрэлася з баявой аховай 12-й заставы. Начальнік заставы лейтэнант Чарных загадаў сустрэць яе агнём. У перастрэлцы ў той дзень, які стаў днём баявога хрышчэння атрада, было знішчана чатыры гітлераўскіх разведчыкі. Праціўнік адыйшоў, не дабыўшы даных аб абароне 18-га пагранічнага атрада. 12-я застава атрымала падмацаванне: 8 чалавек са станкавым кулямётам з 9-й заставы (начальнік заставы лейтэнант Данілаў), роту чыгуначных войск НКУС (камандзір лейтэнант Мацвіенка) у складзе 50 чалавек, батарэю 76-міліметровых пушак. У ноч на 10 ліпеня падраздзяленні занялі абарону ў раёне Хільчыц.

10 ліпеня на ўчастку 9-й заставы каля вёскі Малы Малешаў у 10 гадзін раніцы каля роты фашыстаў з мінамётамі і аўтаматамі намерваліся захапіць 9-ю заставу. У 11 гадзін старшына А. Перасунька з аддзяленнем пайшоў у разведку для ўдакладнення сіл праціўніка. Сустрэўшы наступаючую роту фашыстаў, пагранічнікі ўступілі ў бой. Праз 40 хвілін падыйшло падмацаванне з заставы. Атака была адбіта. Некалькі дзесяткаў гітлераўцаў забіта і паранена, захоплены кулямёт, вінтоўкі і аўтаматы. Страты пагранічнікаў — 2 чалавекі забіты, 3 паранены. Смерцю храбрых загінуў старшына Перасунька.

М. Р. Аканін, начальнік 18-га Жыткавіцкага пагранічнага атрада

11 ліпеня раніцай праціўнік адкрыў артылерыйскі і мінамётны агонь па заставе. Было выпушчана некалькі хімічных снарадаў. У 12 гадзін чырвонаармейцы перайшлі ў наступленне пры падтрымцы артылерыйскай батарэі і сіл Пінскай флатыліі, але сілы ворага былі значна большымі, поспеху наступленне не мела.

На наступны дзень пасля артылерыйскай падрыхтоўкі ў раёне Малога Малешава гітлераўцы атакавалі нашы пазіцыі. Некалькі атак было адбіта, але пасля жорсткага бою праціўнік заняў вёску. Па загаду камандзіра заставы пагранічнікі занялі рубеж абароны ў ваколіцы вёскі Запясочча.

Апоўдні 12 ліпеня на ўчастку заставы ў раёне Хільчыц склалася асабліва цяжкае становішча: праціўнік з боку Малога Малешава стварыў пагрозу ўдару праз Любавічы ў фланг 12-й заставы. Тураву пагражала акружэнне. Камендант Турава старшы лейтэнант Лысенкаў загадаў утрымліваць пазіцыі ў ваколіцы Хільчыц да апошняга. Цяжкі бой працягваўся двое сутак. Невядома, як бы ён закончыўся, калі б на дапамогу не падаспелі пагранічнікі з Малешаўскай заставы на чале з лейтэнантамі Дзянісавым і Мацвіенка. Немцы, панёсшы значныя страты, адступілі.

У 9 гадзін 14 ліпеня праціўнік, атрымаўшы падмацаванне, пры падтрымцы танкаў і бронемашын, а таксама артылерыі і мінамётаў прарваў абарону 12-й заставы, заняў Хільчыцы і Запясочча. Нашы войскі занялі абарону на заходняй ускраіне Турава. У баях пры адступленні, прыкрываючы нашы войскі, асабліва

К. П. Ёлкін

вызначыліся кулямётчыкі пад камандаваннем лейтэнанта Баравіка.

15 ліпеня ў 8 гадзін праціўнік значнымі сіламі, пры падтрымцы артылерыі і танкаў, перайшоў у наступленне на Тураў з паўднёвага захаду і паўночнага захаду, маючы намер выйсці да Прыпяці. Пасля пяцігадзіннага надзвычай цяжкага бою ворагу ўдалося прарваць абарону. У 14 гадзін быў атрыманы загад адступіць з Турава, заняць абарону па рацэ Сцвіга ў раёне вёсак Азяраны і Пагост. У шасціднеўных баях у раёне Хільчыц, Малога Малешава і Турава гітлераўцы страцілі да 200 салдат і афіцэраў.

Пагранічнікі пад камандаваннем старшага лейтэнанта Данілава занялі абарону ў ваколіцы вёсак Азяраны і Пагост. Па загаду начальніка атрада палкоўніка Аканіна група пагранічнікаў колькасцю 40 чалавек пад камандаваннем капітана Елкіна была накіравана ў тыл ворага ў раён вёскі Рычоў. Яна наносіла нечаканыя ўдары па ворагу, знішчала камунікацыі. Была зроблена засада каля моста праз Сцвігу. Пагранічнікі разграмілі варожую калону, знішчылі бронетранспарцёр. Але і самі ў бесперапынных жорсткіх баях панеслі вялікія страты.

З 16 па 22 ліпеня пагранічнікі Тураўскай камендатуры ўтрымлівалі рубяжы на рацэ Сцвіга. Атакі праціўніка тут поспеху не мелі, яны былі адбіты з вялікімі стратамі для ворага. Асабліва мужна дзейнічаў у час баёў каля Азяран і Пагоста каменданцкі ўзвод малодшага палітрука Нямірава. Ён атрымаў загад узарваць мост праз раку. Задачу паспяхова выканаў камандзір аддзялення сяржант Лодзін.

22 ліпеня па загаду палкоўніка Аканіна пагранічнікі пакінулі абарону па рацэ Сцвіга і далучыліся да асноўных сіл атрада ў раёне Капцэвіч. У гэты ж час вярнулася група капітана Елкіна.

У ліпені воіны 18-га пагранатрада адбівалі атакі гітлераўцаў на ўсіх участках абароны. Пагранічнікі займалі баявыя пазіцыі ў ваколіцы в. Боркі. 16 ліпеня начальнік атрада загадаў старшаму лейтэнанту Іванову ахоўваць паромную пераправу праз Прыпяць. Былі арганізаваны тры кропкі абароны каля пераправы: пад камандаваннем малодшага лейтэнанта Градабоева, лейтэнанта Іцэнка і старшыны Ігнацьева. У ноч з 17 на 18 ліпеня разведка ворага праехала на лодцы ўздоўж берага. Засада не выкрыла сябе. Удзень буйныя сілы праціўніка пачалі пераправу. На тры вялікія лодкі грузілі мінамёты і кулямёты, у кожнай змяшчалася да 30 чалавек. Калі лодкі дасягнулі сярэдзіны ракі, Іваноў скамандаваў: «Агонь!» Лодкі былі знішчаны, зброя пайшла на дно, па дакладу пагранічнікаў, удалося выратавацца толькі 7 гітлераўцам. Гітлераўцы з правага берага Прыпяці адкрылі шалёны агонь па месцы засады, адзін чалавек быў забіты і адзін паранены.

21 ліпеня пагранічны атрад у складзе каля 900 байцоў, з 12 кулямётамі і 2 зенітнымі ўстаноўкамі, да якога далучылася значная колькасць воінаў іншых падраздзяленняў, трымаў абарону на подступах да станцыі Капцэвічы.

Гісторыя 18-га Чырванасцяжнага пагранічнага атрада. Тураўскі краязнаўчы музей.

Бой каля Заброддзя

...Гэта было ў першыя, трывожныя дні вайны. У Жыткавічах па-ранейшаму размяшчаўся штаб 18-га пагранічнага атрада, хоць дзяржаўная граніца амаль два гады назад была перанесена ад Случы далёка на захад. Пагранічнікі па-ранейшаму неслі службу на сваіх заставах, дзе ў ліпені 1941 г. сустрэлі агнём ворага.

У навакольных вёсках доўгі час пасля вайны хадзілі легенды аб подзвігу пагранічнікаў пры абароне Жыткавіч — апошнім баі 17 ліпеня 1941 г., калі загінула большасць байцоў атрада. Акалічнасці таго гераічнага бою не давалі спакою вучням Браніслаўскай васьмігадовай школы, яе настаўніку А. К. Кавалёву. Хто былі героі, як склаўся для іх першы і апошні бой з гітлераўцамі і як яны загінулі — каб даць адказ на гэтыя пытанні, не раз накіроўваліся юныя следапыты піянерскага атрада імя Героя Савецкага Саюза Андрэя Кіжаватава ў паход, даследавалі месца бою, распытвалі мясцовых жыхароў.

...У Жыткавічы раніцай 17 ліпеня прыйшла вестка: немцы набліжаюцца да гарадскога пасёлка з боку Леніна, рухаюцца яны не бальшаком, а старой, закінутай лясной дарогай, якая была адзначана, відаць, на іх картах. Пагранічнікі выступілі насустрач гітлераўцам у напрамку вёскі Заброддзе. Тут, непадалёку ад яе, і адбыўся апошні жорсткі бой.

Пагранічнікі ўмацаваліся на скрыжаванні дарог каля Заброддзя, на ўзвышшы каля могілак. На прасёлачнай дарозе паказаліся ворагі. Яны нічога не падазравалі, рухаліся бяспечна і нахабна. Першы залп, трапныя чэргі з кулямёта былі нечаканымі для ворагаў. Страціўшы нямала сваіх салдат, яны пачалі шукаць укрыцця. Тады пад кіраўніцтвам камандзіра групы чырвонаармейцы кінуліся ў атаку. Але ў самы рашаючы момант кулямёт замоўк... У гушчу ворагаў кінуўся камандзір, але яго напаткала варожая куля... Сілы былі няроўныя, большасць пагранічнікаў загінула смерцю храбрых у тым баі.

Хто быў камандзірам пагранічнікаў, якія прынялі цяжкі бой каля Заброддзя? Піянеры ўстанавілі, што ў тыя дні 18-м пагранічным атрадам камандаваў палкоўнік М. Р. Аканін. Ветэран паведаміў, што менавіта ён 17 ліпеня пасылаў насустрач ворагу групу пагранічнікаў пад камандаваннем старога будзёнаўца, маёра Міхаіла Іванавіча Галаўко. Гэта пацвердзілі і мясцовыя жыхары, якія памяталі адважнага камандзіра, былі сведкамі яго апошняга бою.

Школьнікі знайшлі адрас жонкі, сына і дочак пагранічніка, якія да гэтага часу не ведалі пра яго лёс. Яны наведалі магілу, пабывалі на месцы бою. На мармуровай пліце на брацкай магіле ў цэнтры

М. І. Галаўко, П. Я. Ляонаў — камісар 18-га пагранатрада, А. В. Рэут — ветурач

Жыткавіч, дзе пахаваны чырвонаармейцы і партызаны, якія аддалі жыццё за Радзіму, з'явіўся новы радок: М. І. Галаўко. Побач яшчэ адно прозвішча героя-пагранічніка, А. В. Рэута, якое ўдалося ўстанавіць піянерам у выніку пошукаў удзельнікаў бою за Жыткавічы ў трагічным ліпені 1941 г.

В. Р. Феранц

ИЗ СООБЩЕНИЯ НАРКОМАТА ВНУТРЕННИХ ДЕЛ БССР В ЦК КП(б)Б О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ИСТРЕБИТЕЛЬНЫХ БАТАЛЬОНОВ В БЕЛОРУССИИ [1941 г.]

...По данным нашей разведки, в Житковичском районе Полесской обл. противник сконцентрировал войска до 1 мотомеханизированной дивизии. Днем 17 июля с. г. разведка противника в количестве 100 человек перешла бывшую госграницу вблизи ж. д. станции Микашевичи на нашу территорию. Часть разведки противника была окружена и уничтожена пограничным отрядом совместо с истребительным батальоном Житковичского района.

Зам. наркома внутренних дел БССР
Полковник *Мисюров*

Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 76.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ТУРАЎСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б ад 10 ЖНІЎНЯ 1941 г.

Ваенныя дзеянні ў раёне пачаліся з 6 ліпеня 1941 г. Цэнтр раёна г. п. Тураў быў заняты германскімі войскамі 15 ліпеня, пры ваенных дзеяннях раён быў акупіраваны 23 ліпеня да вёскі Азяраны ўключна.

Шэсць з дзевяці сельскіх саветаў былі заняты. 5 жніўня раён быў поўнасцю ачышчаны ад германскіх войск. У час знаходжання германскіх войск быў пастаўлены ў гарпасёлку Тураў ваенны камендант са складу афіцэраў, памочнік каменданта, ён жа — перакладчык, акрамя таго, было прызначана шэсць стараст з мясцовага насельніцтва — 4 беларусы, 2 яўрэі.

За час знаходжання немцаў на тэрыторыі раёна імі было забіта 8 чалавек. Так быў забіты 18-гадовы Міхаіл Арцюховіч, які адказаўся зняць свае боты, што спадабаліся салдату...

Пры дапамозе разведкі устаноўлена, што ў вёсцы Пагост былі выведзены з строю дзве кулямётныя кропкі праціўніка і адна гармата. Разведку праводзілі партызаны Кочка, Касянкоў і інш.

Пасля адходу часцей Чырвонай Арміі партызаны прынялі на сябе абарону в. Азяраны. Гэтая абарона працягвалася каля двух сутак, чым была затрымана разведка праціўніка. Германскія часці прарваліся ў напрамку населеных пунктаў Перароў, Млынок, Хлупін і імкнуліся захапіць вёску Снядзін, ставячы сваёй мэтай злучэнне з часцямі Петрыкаўскага напрамку з правага боку р. Прыпяць. Група партызан зайшла ў тыл праціўніка на 30 км, узарвала два масты ў в. Млынок і Хлупін, стварыўшы тым самым суматоху ў часцях ворага, і спыніла на некаторы час рух яго ў гэтым напрамку. Выставіўшы заслон, партызаны не далі магчымасці ворагу пераправіцца з левага на правы бераг Прыпяці.

...Узорны прыклад у рабоце па ўзнаўленню сувязі паказаў начальнік райаддзела сувязі т. Мазур, які ўвесь час даваў сувязь воінскім часцям. Выдатна працавала заг. Тураўскай бальніцы Качан Вольга Аляксееўна. З першых дзён яна знаходзілася на перадавой лініі, сама выносіла параненых, аказвала ім медыцынскую дапамогу.

З 30 на 31 ліпеня група партызан на чале з нач. атрада т. Голікавым прабралася ў тыл ворага, дзе прабыла два дні на ўчастку в. Рычоў, уступіла ў бой з пераўзыходзячай групай праціўніка, навяла паніку, чым аблегчыла рух часцей Чырвонай Арміі ў гэтую ноч да в. Азяраны. У стычцы было забіта тры немцы і адзін партызан т. Бурносаў. У той дзень праціўнік пачаў адыходзіць з тэрыторыі Тураўскага раёна.

У час адыходу праціўніка з тэрыторыі Тураўскага раёна была выслана разведка на чале з сакратаром партарганізацыі т. Касянковым. Па выніках праведзенай разведкі партызанскі атрад 5 жніўня раніцай увайшоў у г. п. Тураў.

Зараз атрад вядзе разведку ў напрамку Давід-Гарадоцкага і Жыткавіцкага раёнаў. Адначасова вядзецца работа па вылоўліванню дэзерціраў, нясецца ахова.

НАРБ, ф. 4, оп. 23а, д. 13, лл. 28—29.

ИЗ ОТЧЕТА ПАРТИЗАНА С. П. ШУПЕНИ В ЦК КП(б)Б О ПОДГОТОВКЕ К ВЫХОДУ В ТЫЛ И О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В СОСТАВЕ ДИВЕРСИОННОЙ ГРУППЫ В ТЫЛУ ВРАГА ЗА ПЕРИОД С ИЮЛЯ ПО 10 СЕНТЯБРЯ 1941 г.

27 ноября 1941 г.

...До 15 июля 1941 г. Туровский район находился в наших руках. 15 июля 1941 г. Туровский район был оккупирован немцами. На протяжении месяца оккупации района я пробирался с группой 5—6 чел. в занятые немцами дер. Хочень, Семурадцы, Озераны. Резали линии связи, разведывали расположение противника и доносили командованию батальона Красной Армии, находившемуся в это время под Туровом в обороне. Командовал батальоном капитан тов. Даниленко.

Примерно числа 13 августа подразделение Красной Армии вместе с нашей группой и Туровским партизанским отрядом, оттеснив противника, заняли райцентр Туров и деревни Туровского района. Продержали в своих руках райцентр около 5 дней, немцы опять заняли (его), оттеснив наши части на несколько километров. Однако немцам не удалось много продержаться. Красная Армия вместе с нашей группой и партизанами перешла в контрнаступление, и через 2 часа город был отнят. Немцы в течение короткого 2-часового пребывания расстреляли на площади города 16 чел. мирных жителей — стариков и женщин, в том числе 9-летнего мальчика. Числа 23 августа 1941 г., подтянув новые силы, немцы опять начали наступать на Туров, предварительно подожгли гор. Туров со всех сторон зажигательными минами. Я в это время находился в Турове. Подразделение Красной Армии и партизанский отряд под сильным напором и превосходством сил противника начали отходить...

В первых числах августа 1941 г. наша группа с группой Лельчицкого района и партизанским отрядом при операции по уничтожению группы противника в дер. Семурадцы убила 1 и ранила 4 фашистов, потеряв 1 партизана убитым.

Тов. Сорокин и Лорин из нашей группы захватили 2 немцев в плен и доставили Красной Армии, от которых получены ценные сведения о фашистских войсках...

Работу группа закончила 10 сентября 1941 г., после чего решили пробираться через фронт на свою сторону...

Шупеня Степан Петрович
Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 118—119.

Палессе партызанскае

Летам — восенню 1941 г. на тэрыторыі Жыткавіцкага і Тураўскага раёнаў дыслакавалася некалькі партызанскіх атрадаў і груп, у тым ліку і тыя, якія прыбылі з іншых абласцей. Гэта быў вельмі цяжкі перыяд для прыпяцкіх партызан. Якраз у гэты час гітлераўскае камандаванне, напалоханае ростам партызанскага руху, праводзіла першую буйную карную экспедыцыю пад умоўнай назвай «Прыпяцкія балоты». У гэтай аперацыі (у ліпені — жніўні 1941 г.) акрамя 1-й кавалерыйскай брыгады СС бралі ўдзел таксама часці 162-й і 252-й пяхотных дывізій. Карнікі жорстка распраўляліся з насельніцтвам вёсак, дзе былі выпадкі супраціўлення акупантам, расстрэльвалі ўсіх падазроных у падтрымцы партызан, палілі вёскі. Паводле звестак камандзіра кавалерыйскай брыгады СС, на 13 жніўня ў выніку аперацыі было расстраляна 13 788 савецкіх грамадзян.

Зразумела, што ў такіх абставінах замацавацца на акупіраванай тэрыторыі і весці якія-небудзь баявыя дзеянні партызанскім атрадам і групам, якія былі створаны на тэрыторыі Тураўскага і Жыткавіцкага раёнаў, было вельмі цяжка. Тым больш, што ніхто не ведаў, колькі працягнецца вайна. Тыя, хто заставаўся ў тыле ворага, спадзяваліся, што праз месяц-другі Чырвоная Армія збярэцца з сіламі і пяройдзе ў контрнаступленне, і тады спатрэбіцца іх дапамога ў тыле ворага. Але з кожным днём сітуацыя ўсё пагаршалася. У канцы жніўня немцы поўнасцю акупіравалі Беларусь і рушылі да-

ИЗ ОТЧЕТА ПАРТИЗАНА С. П. ШУПЕНИ В ЦК КП(б)Б О ПОДГОТОВКЕ К ВЫХОДУ В ТЫЛ И О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В СОСТАВЕ ДИВЕРСИОННОЙ ГРУППЫ В ТЫЛУ ВРАГА ЗА ПЕРИОД С ИЮЛЯ ПО 10 СЕНТЯБРЯ 1941 г.

27 ноября 1941 г.

...До 15 июля 1941 г. Туровский район находился в наших руках. 15 июля 1941 г. Туровский район был оккупирован немцами. На протяжении месяца оккупации района я пробирался с группой 5—6 чел. в занятые немцами дер. Хочень, Семурадцы, Озераны. Резали линии связи, разведывали расположение противника и доносили командованию батальона Красной Армии, находившемуся в это время под Туровом в обороне. Командовал батальоном капитан тов. Даниленко.

Примерно числа 13 августа подразделение Красной Армии вместе с нашей группой и Туровским партизанским отрядом, оттеснив противника, заняли райцентр Туров и деревни Туровского района. Продержали в своих руках райцентр около 5 дней, немцы опять заняли (его), оттеснив наши части на несколько километров. Однако немцам не удалось много продержаться. Красная Армия вместе с нашей группой и партизанами перешла в контрнаступление, и через 2 часа город был отнят. Немцы в течение короткого 2-часового пребывания расстреляли на площади города 16 чел. мирных жителей — стариков и женщин, в том числе 9-летнего мальчика. Числа 23 августа 1941 г., подтянув новые силы, немцы опять начали наступать на Туров, предварительно подожгли гор. Туров со всех сторон зажигательными минами. Я в это время находился в Турове. Подразделение Красной Армии и партизанский отряд под сильным напором и превосходством сил противника начали отходить...

В первых числах августа 1941 г. наша группа с группой Лельчицкого района и партизанским отрядом при операции по уничтожению группы противника в дер. Семурадцы убила 1 и ранила 4 фашистов, потеряв 1 партизана убитым.

Тов. Сорокин и Лорин из нашей группы захватили 2 немцев в плен и доставили Красной Армии, от которых получены ценные сведения о фашистских войсках...

Работу группа закончила 10 сентября 1941 г., после чего решили пробираться через фронт на свою сторону...

Шупеня Степан Петрович
Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 118—119.

Палессе партызанскае

Летам — восенню 1941 г. на тэрыторыі Жыткавіцкага і Тураўскага раёнаў дыслакавалася некалькі партызанскіх атрадаў і груп, у тым ліку і тыя, якія прыбылі з іншых абласцей. Гэта быў вельмі цяжкі перыяд для прыпяцкіх партызан. Якраз у гэты час гітлераўскае камандаванне, напалоханае ростам партызанскага руху, праводзіла першую буйную карную экспедыцыю пад умоўнай назвай «Прыпяцкія балоты». У гэтай аперацыі (у ліпені — жніўні 1941 г.) акрамя 1-й кавалерыйскай брыгады СС бралі ўдзел таксама часці 162-й і 252-й пяхотных дывізій. Карнікі жорстка распраўляліся з насельніцтвам вёсак, дзе былі выпадкі супраціўлення акупантам, расстрэльвалі ўсіх падазроных у падтрымцы партызан, палілі вёскі. Паводле звестак камандзіра кавалерыйскай брыгады СС, на 13 жніўня ў выніку аперацыі было расстраляна 13 788 савецкіх грамадзян.

Зразумела, што ў такіх абставінах замацавацца на акупіраванай тэрыторыі і весці якія-небудзь баявыя дзеянні партызанскім атрадам і групам, якія былі створаны на тэрыторыі Тураўскага і Жыткавіцкага раёнаў, было вельмі цяжка. Тым больш, што ніхто не ведаў, колькі працягнецца вайна. Тыя, хто заставаўся ў тыле ворага, спадзяваліся, што праз месяц-другі Чырвоная Армія збярэцца з сіламі і пяройдзе ў контрнаступленне, і тады спатрэбіцца іх дапамога ў тыле ворага. Але з кожным днём сітуацыя ўсё пагаршалася. У канцы жніўня немцы поўнасцю акупіравалі Беларусь і рушылі да-

лей на ўсход з мэтай захопу сталіцы краіны Масквы.

У пачатку верасня 1941 г. Тураўскі партызанскі атрад, як сведчыць у сваёй дакладной запісцы ў ЦК КП(б)Б член парттройкі Пінскага абкома КП(б)Б (пазней Герой Савецкага Саюза) А. Я. Кляшчоў, аб'яднаўся са Столінскім партызанскім атрадам. Да канца верасня 1941 г. запасы харчу і боепрыпасаў аб'яднанага атрада скончыліся. Было прынята рашэнне рухацца да лініі фронту.

У ноч на 30 верасня ў лесе каля в. Пільшчык Ельскага раёна атрад быў нечакана акружаны і атакаваны карнікамі. Завязаўся бой. З яго не выйшлі сакратар Пінскага АК КП(б)Б П. Г. Шапавалаў, камандзір аб'яднанага атрада І. Л. Масляннікаў і 7 чалавек партызан, астатнія вырашылі асобнымі групамі рухацца за лінію фронту.

Не замацаваўся на тэрыторыі раёна і арганізаваны па рашэнню Палескага абкома КП(б)Б 23 ліпеня 1941 г. Жыткавіцкі партызанскі атрад, створаны з актывістаў і міліцыянераў раёна. Восенню атрад (кіраўнікі У. М. Дзербан і Ц. Р. Кавалеўскі) пад націскам ворага перадыслацыраваўся на тэрыторыю Петрыкаўскага раёна. Пад час карнай экспедыцыі атрад быў рассеяны, частка яго разам з сакратаром райкома Ц. Р. Кавалеўскім выйшла за лінію фронту. Астатняя частка засталася на тэрыторыі раёна. Пазней яны ў якасці «жыткавіцкай групы» ўвайшлі ў склад атрада В. З. Каржа, які дзейнічаў з ліпеня — жніўня 1941 г. на тэрыторыі Ленінскага раёна. На тэрыторыі сучаснага Жыткавіцкага раёна ў 1941—1942 гг. дзейнічалі таксама атрады М. Ц. Шыша, атрад «Баці» — Р. М. Лінькова і атрад І. М. Чорнага, якія выконвалі заданні камандавання Чырвонай Арміі. Восенню 1941 г. у раёне Чырвонага возера дыслацыравалася арганізацыйная група Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б на чале з В. І. Казловым. У жніўні сюды прыйшоў першы на Беларусі партызанскі атрад пад камандаваннем Камарова (В. З. Каржа), які 4 ліпеня каля Пінска, на дарозе на Лагішын даў бой не чакаўшым ніякага супраціўлення захопнікам. У складзе атрада знаходзілася вядомая партыйная дзяячка, удзельніца арганізацыі партызанскага руху на Беларусі В. З. Харужая, муж якой Сяргей Карнілаў загінуў у тым першым баі. Праз некаторы час В. З. Харужая была накіравана за лінію фронту ў распараджэнне ЦК КП(б)Б.

Шырокі размах партызанскага руху на тэрыторыі раёна пачаўся з вясны 1942 г. і працягваўся да вызвалення Палесся ад захопнікаў. Неаднаразова праз тэрыторыю раёна з рэйдамі праходзілі і вялі баявыя дзеянні партызаны Пінскай і Мінскай абласцей, злучэнне ўкраінскіх партызан пад кіраўніцтвам Героя Савецкага Саюза С. А. Каўпака, якія ў снежні — лютым 1943 г. спыніліся на в. Чырвоным, трымалі там лядовы аэрадром.

Захапіўшы тэрыторыю раёна, гітлераўцы ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым. У адпаведнасці з загадзя падрыхтаванымі планамі тэрыторыя Беларусі была раздзелена на некалькі частак — акруг (гебітскамісарыятаў). Паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай, Пінскай, частка Брэсцкай абласцей былі ўключаны ў рэйхскамісарыят Украіны. Тэрыторыя раёна ўвайшла ў створаную акупантамі генеральную акругу «Жытомір», якой непасрэдна падпарадкоўваўся гебітскамісарыят у г. Петрыкаве.

Вышэйшым органам фашысцкай грамадзянскай адміністрацыі ў акрузе «Жытомір» з'яўляўся генеральны камісарыят. У яго задачу ўваходзіла прымусовае насаджэнне фашысцкіх парадкаў, арганізацыя дра-

пежнай эксплуатацыі і рабавання эканомікі і прыродных рэсурсаў, ідэалагічная апрацоўка насельніцтва ў духу нацызму і антысаветызму, падаўленне любога супраціўлення. На чале абласных камісарыятаў стаялі абласныя (гебітс) камісары. Прадстаўніком Петрыкаўскага гебітскамісарыята ў Тураве быў Ландверг Клёўзе, які спачуваў мясцоваму насельніцтву, праз сялян дапамагаў партызанам.

Усе пасады ў акругах і гебітах займалі немцы. Мясцовыя жыхары ўключаліся толькі ў органы дапаможнага мясцовага кіравання: раёнах і паветах (сельсаветах). З ліку мясцовага насельніцтва фарміравалася таксама мясцовая паліцыя — паліцыя парадку (ordnungpolizei).

Згодна з планам «Ост» гітлераўцы з першых дзён вайны прыступілі да рэалізацыі рэжыму крывавага тэрору, які яны бачылі як сродак ажыццяўлення акупацыйнай палітыкі. З асаблівай жорсткасцю немцы распраўляліся з камуністамі, камсамольцамі, савецкімі актывістамі, палітрукамі Чырвонай Арміі, работнікамі НКУС. Яны мэтанакіравана праводзілі палітыку генацыду ў адносінах беларускага насельніцтва, асабліва яўрэйскай нацыянальнасці.

Акупанты імкнуліся ўсяляк выкарыстаць эканамічныя рэсурсы захопленых тэрыторый. Яны ўвялі прымусовую працоўную павіннасць, стварылі спецыяльныя органы — ваенна-гаспадарчыя інспекцыі, пры генеральных акругах — спецыяльныя аддзелы грамадзянскай адміністрацыі. Першапачаткова захопнікі імкнуліся апіраццa на тыя гаспадарчыя адзінкі, якія былі пры савецкай уладзе — саўгасы і калгасы. Аднак пазней, зразумеўшы, што мерамі насілля і запалохвання нельга схіліць насельніцтва да супрацоўніцтва, эфектыўна выкарыстоўваць яго эканоміку, з пачатку 1942 г. вырашылі перайсці да аграрнай рэформы, ці «новага парадку землекарыстання». Сэнс яго быў у тым, што адмяняліся ўсе дзяржаўныя акты, якія адносіліся да дзейнасці калгасаў, саўгасаў і МТС. Замест калгасаў ствараліся абшчынныя гаспадаркі, а саўгасы былі аб'яўлены дзяржаўнымі маёнткамі. Усе мерапрыемствы гітлераўцаў у эканамічнай вобласці былі накіраваны на тое, каб як мага больш выкарыстаць выгады з захопленых раёнаў. У гэтым накірунку яны не спыняліся ні перад чым. З лета 1942 г. акупанты прыступілі да прымусовага вывазу моладзі на працу ў Германію. За гады вайны толькі з Тураўскага раёна было вывезена ў рабства больш 436 юнакоў і дзяўчат, а ўсяго загінула 2230 мірных жыхароў — 1360 расстраляна, 430 спалена — у асноўным старых жанчын і 205 дзяцей... Яшчэ большыя страты панеслі Жыткавіцкі і Ленінскі раёны.

Гітлераўскі план «бліцкрыга» канчаткова праваліўся пад Масквой. Вайна зацягнулася на гады. Паражэнне немцаў пад Масквой, Сталінградам, Курскам, жорсткая акупацыйная палітыка ў адносінах да насельніцтва — усё гэта вызывала супраціўленне насельніцтва мерапрыемствам акупантаў. Мэтанакіраваная дзейнасць камуністаў, камсамольцаў, прадстаўнікоў ЦК КП(б)Б, які знаходзіўся ў Маскве, па разгортванню партызанскага руху стала даваць свой плён, але ў адказ на адчувальныя ўдары і дыверсіі акупанты ўсё больш разгортвалі масавыя рэпрэсіі, карныя акцыі супраць партызан і мясцовага насельніцтва. Старых і малалетніх, непрыгодных для работы, у час іх правядзення знішчалі, расстрэльвалі і палілі, а моладзь прымусова адпраўлялі ў рабства ў Германію. У «фатэрландзе» юнакі і дзяўчаты траплялі ў розныя ўмовы: адны выкарыстоўваліся ў якасці дармавой цяглавай сілы на самых цяжкіх ра-

ботах, другім выпадала жыць і працаваць у больш-менш добразычлівых «фаміліях». Некалькі чалавек загінулі, прапалі без вестак, не вярнуліся пад бацькоўскі дах.

З развіццём партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі ствараліся падпольныя партыйныя органы, якія арганізоўвалі і накіроўвалі партызанскі рух. На тэрыторыі Жыткавіцкага раёна рашэннем Палескага і Пінскага абкомаў КП(б)Б былі створаны Жыткавіцкі, Тураўскі і Ленінскі падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, у розныя часы дзейнічалі Мінскі, Палескі, Пінскі абкомы партыі.

Партызанскія атрады, 50-я Жыткавіцкая партызанская брыгада, падраздзяленні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Ленінскага раёна ў 1943—1944 г, уяўлялі сабой нежартоўную баявую сілу і здзейснілі шэраг дзёрзкіх аперацый. Яскравы прыклад таму — вызваленне яшчэ ў верасні 1942 г. пасёлка Ленін і ўзнаўленне савецкай улады ва ўсім раёне. У лютым 1943 г. карнікі жорстка адпомсцілі мясцовым жыхарам за сваё паражэнне і бяссілле перад партызанамі Пінскага злучэння В. З. Каржа. У ноч 23 кастрычніка 1943 г. партызанскі атрад «За Радзіму» разам з партызанамі Лельчыцкай брыгады занялі Тураў, але раніцай вымушаны былі пакінуць пасёлак.

З сакавіка да лістапада 1942 г. у Жыткавічах дзейнічала партыйна-камсамольскае падполле, якім кіраваў Е. Я. Гораў. У барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінулі члены падпольнай групы І. К. Барабаш, Е. Я. і І. Е. Горавы, Ф. Дзяткоўскі, П. М. Корж, Я. С. Матвяец, І. В. Мацюнін, С. Я. Хомчанка, Р. А. Цыгікала, В. Г. і М. Г. Ярмаш, Фяцісаў.

Другая падпольная патрыятычная група ў Жыткавічах дзейнічала з ліпеня 1941 г. да вызвалення пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Кіраваў ёю Л. С. Галавач, пасля яго гібелі ў ліпені 1943 г.— М. Ф. Бандзюк. У барацьбе з ворагамі загінулі актыўныя члены групы М. П. Саўчыц, М. І. Івашкевіч, яго дочкі Марыя і Ніна.

У Тураве актыўныя ўдзельнікі антыфашысцкай падпольнай групы з кастрычніка 1941 г. па ліпень 1944 г., якой кіравалі І. Л. Хілінскі, затым А. В. Сідараў, А. Р. Багай і С. В. Царык, у 1942 г. узарвалі аўтамашыну з ворагамі, улетку 1943 г. знішчылі будынак паліцыі і камендатуры ў Тураве. Напярэдадні вызвалення гарадскога пасёлка падпольшчык П. А. Амяльчышын склаў схему абароны ворага, а Г. В. Санец перадала яе партызанам.

Дзейнічала ў гады вайны камсамольскае падполле таксама ў п. Ленін[1].

Выдавалася газета Тураўскага падпольнага райкома КП(б)Б «Ленінскія заветы».

Шмат пакут вытрымалі людзі на акупіраванай тэрыторыі. Разам з жыхарамі былі спалены вёскі Дзякавічы, Поўчын, Ельна, Буда, Бераснякі, Мілевічы, Старыя Залюцічы. Масавыя рэпрэсіі абрушваліся на людзей Леніна, Запясочча, Рудні, Вятчына і многіх іншых вёсак. Поўчын і Запясочча занесены ў жалобны спіс населеных пунктаў у Хатыні. За гады вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Жыткавіцкім раёне знішчана 1384 чалавекі. Асабліва вялікія страты панёс былы Ленінскі раён у выніку карных экспедыцый «Гортнунг» у лютым 1943 г., калі толькі ў Леніне фашысты забілі 1046 чалавек, спалілі 350 дамоў, «Марабу» ў маі 1944 г.— тады ў раёне ішлі жорсткія баі паміж карнікамі і партызанамі.

А. М. Літвін

[1] Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. БелСЭ, 1990.

Падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, партызанскія брыгада і атрады, якія былі створаны і дзейнічалі на тэрыторыі раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны

ЖЫТКАВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б
(10 жніўня 1943—6 ліпеня 1944)

Па рашэнню Палескага абкома КП(б)Б ад 23 ліпеня 1941 г. на акупіраванай тэрыторыі раёна былі пакінуты сакратар райкома партыі Ц. Р. Кавалеўскі і партызанскі атрад пад камандаваннем У. М. Дзербана. У кастрычніку 1941 г. Ц. Р. Кавалеўскі з групай партызан выйшаў за лінію фронту.

Падпольны райком створаны Палескім падпольным абкомам КП(б)Б 10 жніўня 1943 г. Сакратаром быў зацверджаны І. К. Талкачоў.

Райком базіраваўся ў 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгадзе.

Састаў падпольнага райкома КП(б)Б

Сакратар — Талкачоў Іван Кузьміч (10 жніўня 1943 — 6 ліпеня 1944 г.).

Члены райкома: Дзербан Уладзімір Міхайлавіч (10 жніўня — 6 ліпеня 1944 г.). Рагалевіч Іван Андрэевіч (10 жніўня 1943—6 ліпеня 1944 г.).

ТУРАЎСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б
(8 жніўня 1943—6 лютага 1944 г.)

У адпаведнасці з рашэннем Палескага абкома КП(б)Б ад 23 ліпеня 1943 г. у тыле гітлераўскіх захопнікаў на тэрыторыі раёна з 21 жніўня 1941 г. засталіся сакратар Тураўскага райкома КП(б)Б М. М. Бяляўскі і партызанскі атрад пад камандаваннем начальніка райаддзела НКУС М. І. Голікава.

Атрад дзейнічаў ва ўмовах пастаяннага праследавання фашысцкімі карнікамі да 23 верасня 1941 г. Затым частка партызан накіравалася за лінію фронту.

Падпольны райком партыі быў створаны і зацверджаны Палескім падпольным абкомам КП(б)Б 8 кастрычніка 1943 г. Сакратаром райкома партыі быў зацверджаны камісар асобна дзеючага партызанскага атрада «За Радзіму» П. І. Тарасюк.

Падпольны райком базіраваўся ў гэтым атрадзе (камандзір В. І. Прасолаў).

Састаў падпольнага райкома КП(б)Б

Сакратар — Тарасюк Панцялей Іванавіч (8 кастрычніка 1943—6 лютага 1944 г.).

Члены райкома: Засінец Мікалай Ільіч (8 кастрычніка 1943—6 лютага 1944 г.). Лінковіч Кірыла Навумавіч (8 кастрычніка 1943—6 лютага 1944 г.). Прасолаў Васіль Іванавіч (8 кастрычніка 1943—6 лютага 1944 г.).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Ленінскія запаветы».

ЛЕНІНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б
(канец 1942—14 ліпеня 1944 г.)

Створаны па рашэнню Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б у снежні 1942 г. Сакратаром райкома зацверджаны камандзір партызанскага атрада А. І. Дамброўскі. З 11 лютага па 25 сакавіка атрад удзельнічаў у рэйдзе па заходніх абласцях Беларусі. 25 лютага 1943 г. А. І. Дамброўскі загінуў у баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сакратаром райкома быў прызначаны Р. М. Ігнаценка, камісар партызанскай брыгады імя С. М. Будзённага, пасля эвакуацыі яго ў тыл для лячэння — П. І. Кананоўіч. Райком базіраваўся ў партызанскай брыгадзе імя С. М. Будзённага (камбрыг У. М. Антановіч, з лістапада 1943 г.— Ф. І. Шырын, камісар — Р. М. Ігнаценка, з мая 1944 г.— Р. С. Карасёў).

Састаў падпольнага райкома КП(б)Б

Сакратары — Дамброўскі Антон Іосіфавіч (снежань 1942 — 25 лютага 1943 г.), Ігнаценка Рыгор Мікалаевіч (28 сакавіка 1943 — 7 красавіка 1944 г.), Кананоўіч Пётр Іванавіч (7 красавіка—14 ліпеня 1944 г.). Члены райкома — Ягораў Сяргей Рыгоравіч (снежань 1942—16 ліпеня 1943 г.), Ігнаценка Рыгор Мікалаевіч (снежань 1942—28 сакавіка 1943 г.), Антановіч Уладзімір Маісеевіч (16 ліпеня—28 сакавіка 1943 г.), Карасёў Рыгор Сцяпанавіч (16 ліпеня 1943—14 ліпеня 1944 г.), Катовіч Павел Рыгоравіч (5 мая 1943—14 ліпеня 1944 г.), Шырын Фёдар Ігнацьевіч (8 студзеня — 14 ліпеня 1944 г.).

ЖЫТКАВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ
(1 ліпеня 1943—6 ліпеня 1944 г.)

Да стварэння падпольнага райкома камсамольскай работай у раёне (з кастрычніка 1942 г.) кіравалі інструктары ЦК ЛКСМБ, а з красавіка 1943 г.— упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па Жыткавіцкаму раёну У. С. Мясніковіч.

Падпольны райком камсамола прыступіў да работы 1 ліпеня 1943 г. Яго асноўная база знаходзілася ў 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгадзе (камандзір У. І. Гушчэня, камісары У. М. Дзербан, І. К. Талкачоў).

Састаў падпольнага райкома ЛКСМБ

Сакратары — Мясніковіч Уладзімір Сцяпанавіч (1 ліпеня 1943 — 6 ліпеня 1944 года), Галіцкі Аляксей Арсенцьевіч, сакратар па прапагандзе (1 ліпеня 1943 — 6 ліпеня 1944 года). Член райкома — Бародзіч Аляксандр Раманавіч (у лістападзе 1943 г. загінуў).

ЛЕНІНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ
(снежань 1942 — 14 ліпеня 1944 г.)

Да стварэння падпольнага райкома камсамольскую работу ўзначальваў Пінскі падпольны абком ЛКСМБ. Асноўная база райкома камсамола, створанага ў канцы 1942 года, знаходзілася ў партызанскім атрадзе В. З. Каржа і ў брыгадзе імя С. М. Будзённага (камандзіры У. М. Антановіч, Ф. І. Шырын, камісары Р. М. Ігнаценка, Р. С. Карасёў) у Ленінскім раёне.

Састаў падпольнага райкома ЛКСМБ

Сакратары — Кавалёў Аляксандр Іванавіч (снежань 1942 — 30 ліпеня 1943 г), Круковіч Дзіяна Міхайлаўна (1 жніўня 1943 — 14 ліпеня 1944 года), Чэкан Іван Архіпавіч, сакратар па прапагандзе (1 жніўня 1943 — 14 ліпеня 1944 года).

Члены райкома: Чэкан Іван Архіпавіч (снежань 1942 — 1 жніўня 1943 г.), Краўчук Серафім Андрэевіч (снежань 1942 — 9 верасня 1943 г.), Герасіменя Яўгеній Якаўлевіч (1 жніўня 1943 — 14 ліпеня 1944 г.), Лаўроў Міхаіл Пятровіч (1 жніўня 1943 — 14 сакавіка 1944 г.), Жураўлевіч Сямён Іванавіч (1 верасня — лістапад 1943 г.).

ТУРАЎСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ
(жнівень — лістапад 1941 г., 1 чэрвеня 1943 — 6 лютага 1944 г.)

У жніўні 1941 г. ЦК ЛКСМБ і Палескі абком камсамола пакінулі для падпольнай работы сакратара райкома Э. П. Шубянок з заданнем стварыць падпольны райком камсамола і ўзначаліць камсамольскую работу ў раёне. Э. П. Шубянок прыступіла да стварэння камсамольска-маладзёжнага падполля ў Тураве і іншых населеных пунктах. Дакладных даных аб яе рабоце як сакратара райкома камсамола не маецца. У канцы 1941 г. яна была схоплена гітлераўцамі.

У маі 1943 г. камсамольскай работай кіраваў упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па Тураўскаму раёну І. І. Ярмоленка.

1 чэрвеня 1943 г. Палескім падпольным абкомам камсамола быў сфарміраваны новы састаў падпольнага райкома камсамола. Асноўная база райкома знаходзілася ў асобным партызанскім атрадзе «За Радзіму» (камандзір В. І. Прасолаў, камісар П. І. Тарасюк) у Тураўскім раёне.

Састаў падпольнага райкома ЛКСМБ

Сакратары — Шубянок Энна Піліпаўна (жнівень — лістапад 1941 г.), Ярмоленка Іван Іванавіч (1 чэрвеня 1943 — 6 лютага 1944 г.), Прыкота Іосіф Андрэевіч, сакратар па прапагандзе (1 чэрвеня 1943 — 6 лютага 1944 г.).

Члены райкома: Цык Васіль Мінавіч (жнівень 1941 — 6 лютага 1944 г.), Аксененка Ілья Хрыстафаравіч (1 чэрвеня 1943 — 6 лютага 1944 г.), Нямшэвіч Міхаіл Канстанцінавіч (1 чэрвеня 1943 — 6 лютага 1944 г.), Торчык Фёдар Мікалаевіч (1 чэрвеня 1943 — 6 лютага 1944 г.), Дзянісаў Міхаіл Пятровіч (18 студзеня — 6 лютага 1944 г.), Радзько Міхаіл Пятровіч (18 студзеня — 6 лютага 1944 г.), Ваянец Кірыл Фёдаравіч (студзень 1944 г.).

Подпольные партийные и комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Минск, Беларусь, 1975.

ИЗ РЕШЕНИЙ И ПОСТАНОВЛЕНИЙ ПОДПОЛЬНЫХ ПАРТИЙНЫХ И КОМСОМОЛЬСКИХ ОРГАНОВ

...На заседании Полесского ОК ЛКСМБ от 14.09.1943 г. был рассмотрен вопрос «О составе Житковичского РК ЛКСМБ».

Постановили: 1. Житковичский РК ЛКСМБ утвердить в следующем составе: Мясникович Владимир Степанович, 1924 г., белорус, образование 6 классов, член ВЛКСМ с 1939 г., в партизанском отряде с ноября 1942 г.; Галицкий Александр Арсентьевич, 1918 г., белорус, образование 8 классов, член ВЛКСМ с 1935 г., в партизанском отряде с января 1943 г.; Бородич Александр Романович, 1918 г., белорус, образование 5 классов, член ВЛКСМ с 1940 г., в партизанском отряде с июня 1942 г.

2. Секретарем РК утвердить Мясниковича В. С., секретарем РК по пропаганде — Галицкого А. А.

На заседании ОК от 4.10.43 г. был рассмотрен вопрос об исключении из рядов ВЛКСМ бывшего секретаря Житковичского РК Коцубинского Моисея Трофимовича за невыполнение решения ОК комсомола, за измену Родине.

Комсомольская организация района насчитывает в своих рядах 97 человек. Комсомольская организация отряда «105» насчитывает 11 человек (секретарь Лавникович Виктор Федорович); комсомольская организация отряда «109» — 23 человека (секретарь Некрашевич Николай Васильевич); комсомольская организация д. Буда — 4 человека (секретарь Коваленя Елена Николаевна); комсомольская организация д. Ветчин — 2 человека (секретарь Аксенчик Николай Иванович).

Секретарем комсомольской организации Житковичского партизанского отряда был избран Некрашевич Николай Васильевич, 1916 г., родом из д. Подовж. До войны закончил Витебскую школу ревизоров, работал в Житковичском райсоюзе ревизором. В мае 1941 г. мобилизован в РККА.

...В течение сентября месяца комсомольцы отряда участвовали в 2-х боевых операциях. Особенно отличился в боях Барановский Савва, который во время боя отнял у противника миномет и открыл огонь по врагу, в результате чего было убито 6 человек и много ранено. Отличились и получили благодарность тт. Некрашевич, Киселев, Сечко, который до последнего патрона дрался с врагом, прикрывая отход своих товарищей.

...На общем собрании комсомольской организации партизанского отряда «За Родину» (Туровский РК) 8.09.1943 г. был рассмотрен вопрос «Об утверждении бюро РК КСМ». В состав бюро вошли: Ермоленко Иван И., 1923 года рождения, родился в д. Млынок, в партизанском отряде с февраля 1943 г. (избран секретарем бюро); Прикота Иосиф Андреевич, 1918 года рождения, родился в д. Мордвин Петриковского района, в партизанский отряд пришел в марте 1943 г. (избран вторым секретарем РК КСМ по пропаганде); Немшевич Михаил Николаевич, 1922 года рождения, уроженец д. Хвоенск, в партизанский отряд пришел в марте 1943 г.; Торчик Федор Николаевич, 1923 года рождения, в партизанский отряд пришел в марте 1943 г.; Аксененко Илья Христофорович.

Список подпольных комсомольских организаций Туровского района на сентябрь 1943 г.: д. Хочень — секретарь Рай, д. Сторожевцы — секретарь Акулич Н., д. Семурадцы — секретарь Мелещеня, д. Озераны — секретарь Корж, д. Борок — секретарь Ермолич, д. Слепцы — секретарь Рафалович.

В октябре 1943 года были организованы подпольные организации в д. Переров, Млынок, Буда, м. Туров.

НАРБ, ф. 4134, оп. 1, д. 1, 6—7.

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

50-Я ЖЫТКАВІЦКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Створана ў верасні 1943 г. згодна з пастановай Палескага абкома КП(б)Б на базе асобных атрадаў «1 Мая» і 2-га Жыткавіцкага.

Брыгада дзейнічала ў Жыткавіцкім, Тураўскім, Лельчыцкім раёнах.

Агульная колькасць партызан — 1094 чалавекі, у тым ліку 1029 мужчын і 65 жанчын.

Злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі: 109-ы партызанскі атрад — 25 студзеня 1944 г., «1 Мая», 105, 113, 117-ы атрады — 6 ліпеня 1944 г.

Нацыянальны састаў партызан брыгады: беларусы — 761, рускія — 159, украінцы — 71, іншыя нацыянальнасці — 103. Па партыйнасці: членаў ВКП(б) — 22, кандыдатаў — 16, членаў ВЛКСМ — 184, беспартыйных — 872.

Камандзір брыгады — Гушчэня Уладзімір Іванавіч (верасень 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Дзербан Уладзімір Міхайлавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944 г.), Талкачоў Іван Кузьміч (чэрвень — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Ціханчык Аляксандр Іванавіч (кастрычнік — снежань 1943 г.), Палознік Міхаіл Сяргеевіч (май — чэрвень 1944 г.), Асокін Аляксей Аляксандравіч (чэрвень — ліпень 1944 г.).

У ліпені 1941 г. у раёне на аснове пастановы Палескага абкома КП(б)Б ад 23 ліпеня 1941 г. з партыйна-савецкага актыву арганізаваны Жыткавіцкі партызанскі атрад. З верасня 1941 г. ён дзейнічаў сумесна з Петрыкаўскім атрадам. У час карнай экспедыцыі ворага восенню 1941 г. атрад быў рассеяны. Частка партызан пайшла за лінію фронту, астатнія засталіся на тэрыторыі раёна. У красавіку — снежні 1942 г. Жыткавіцкая група ўваходзіла ў састаў

Партызаны Палескага злучэння. Стаяць (злева направа): П. Р. Катовіч, А. Я. Кляшчоў, В. З. Корж, М. В. Семянін, Ф. Ф. Капуста, М. А. Баранаў. Сярод астатніх — М. М. Фядотаў, С. З. Корж, А. Воранаў, П. Г. Тамілаў, Ф. Удавічэнка, Севасцянчык. Пасля заканчэння блакады партызан 1 красавіка 1943 г.

атрада В. З. Каржа, затым вылучылася з яго і перадыслацыравалася ў свой раён, дзе ў маі 1943 г. быў створаны атрад «1 Мая».

Камандзіры атрада: Дзербан Уладзімір Міхайлавіч, Гушчэня Уладзімір Іванавіч, Лушчык Іван Іванавіч.

Камісары: Лісовіч Фёдар Іванавіч, Дзербан Уладзімір Міхайлавіч, Рагалевіч Іван Андрэевіч.

Начальнікі штаба: Бакуновіч Іван Пятровіч, Рагалевіч Міхаіл Аляксеевіч.

109-ы атрад

Створаны 31 ліпеня 1943 г. На дзень злучэння з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі (25 студзеня 1944 г.) у ім налічвалася 194 байцы.

Камандзір атрада: Цык Васіль Мінавіч (кастрычнік 1943 — студзень 1944 г.).

Камісары: Рыбінскі Васіль Піліпавіч (ліпень — кастрычнік 1943 г.), Бакуновіч Іван Пятровіч (кастрычнік 1943 — студзень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Некрашэвіч Мікалай Васільевіч (кастрычнік 1943 г.), Лябёдкін Аляксей Трафімавіч (кастрычнік 1943 — студзень 1944 г.).

105-ы атрад

Сфарміраваны 4 кастрычніка 1943 г. з асабовага саставу 3-й і 4-й рот атрада «1 Мая». У ім налічвалася 238 партызан.

Камандзір атрада: Зінчук Мікалай Нічыпаравіч.

Камісар: Буднік Іван Міхайлавіч.

Начальнік штаба: Лаўніковіч Віктар Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — май 1944 г.), Чэрнікаў Павел Міхайлавіч (май — ліпень 1944 г.).

113-ы атрад

Створаны 4 кастрычніка 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы Ф. І. Ефімовіча і В. І. Трапца, вылучанай са 109-га атрада. У састаў атрада ўвайшлі жыхары Браніслаўскага і Людзяневіцкага сельскіх Саветаў. У час злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў ім налічвалася 187 партызан.

Камандзір атрада: Ефімовіч Фёдар Іванавіч.

Камісар: Малькевіч Мікалай Данілавіч.

Начальнікі штаба: Караблін Васіль Піліпавіч (снежань 1943 — чэрвень 1944 г.), Палознік Міхаіл Сяргеевіч (чэрвень — ліпень 1944 г.).

117-ы атрад

Створаны 10 мая 1944 г. на базе ініцыятыўнай групы 50-й партызанскай брыгады і жыхароў Рудненскага сельскага Савета. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй (6 ліпеня 1944 г.) у атрадзе налічвалася 226 партызан.

Камандзір атрада: Сыравацкі Васіль Мікітавіч.

Камісар: Хілько Мацвей Харытонавіч.

Начальнікі штаба: Сінкевіч Мікалай Міхайлавіч (май — чэрвень 1944 г.), Лаўніковіч Віктар Фёдаравіч (чэрвень — ліпень 1944 г.).

Асобны Тураўскі атрад «За Радзіму»

Створаны ў маі 1943 г. на базе партызанскіх груп, сфарміраваных у сакавіку 1943 г. атрадам імя М. І. Кутузава Лельчыцкай брыгады. Атрад дзейнічаў у Тураўскім раёне. Злучыўся з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі 31 студзеня 1944 г. На гэты дзень у ім налічвалася 194 байцы, у тым ліку 178 мужчын і 16 жанчын.

Нацыянальны састаў: беларусы — 173 чалавекі, рускія — 16, украінцы — 4.

Партыйная прыналежнасць: 10 членаў ВКП(б), 5 — кандыдатаў, 57 — членаў ВЛКСМ, 121 — беспартыйны. Партыйнасць аднаго чалавека не ўстаноўлена.

Камандзір атрада: Прасолаў Васіль Іванавіч.

Камісар: Тарасюк Панцялей Іванавіч.

Начальнік штаба: Дваракоўскі Іосіф Міронавіч.

Асобны Тураўскі атрад

Створаны ў ліпені 1941 г. на аснове пастановы Палескага абкома КП(б)Б ад 23 ліпеня 1941 г. на базе Тураўскага знішчальнага батальёна. У канцы жніўня 1941 г. частка партызан улілася ў рады Чырвонай Арміі. У верасні 1941 г. па рашэнню партыйнага сходу атрад у саставе 30 чалавек, разбіўшыся на групы, выйшаў за лінію фронту.

Камандзір атрада: Голікаў Мікалай Іванавіч.

Камісары: Савін Віктар Пятровіч, Бяляўскі Міхаіл Малахавіч.

ПАРТЫЗАНСКІЯ АТРАДЫ ДРУГІХ АБЛАСЦЕЙ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЛІ НА ТЭРЫТОРЫІ РАЁНА

Партызанскае злучэнне Пінскай вобласці

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Пінскай вобласці пачаліся 25 чэрвеня 1941 г.

Першы партызанскі атрад у Беларусі быў арганізаваны 26 чэрвеня 1941 г. Ён створаны па рашэнню абкома партыі пад камандаваннем загадчыка фінгассектарам абкома, удзельніка антыфашысцкай барацьбы ў Іспаніі В. З. Каржа. 4 ліпеня атрад уступіў у бой з нямецка-фашысцкімі войскамі пад Пінскам.

Для кіраўніцтва баявой дзейнасцю партызан абком партыі стварыў два кіруючых партыйных цэнтры: Ленінскі і Столінскі. Ленінскі партцэнтр павінен быў ахапіць кіраўніцтвам Ганцавіцкі, Жабінкаўскі, Ленінскі, Лагішынскі і Целеханскі раёны. Аднак яго члены не змаглі перайсці лінію фронту... Атрад В. З. Каржа перайшоў з Пінскага ў Лагішынскі, затым у Ленінскі раён.

Камуністы, былыя члены КПЗБ, камсамольцы і беспартыйныя патрыёты праводзілі вялікую палітычна-масавую работу сярод насельніцтва, згуртавалі вакол сябе патрыятычныя сілы. У раёне шырылася партызанская барацьба. У красавіку 1942 г. з Кобрынскага раёна прыбыў атрад М. Ц. Шыша (потым імя М. Ц. Шыша), які аб'яднаў партызанскія групы П. П. Паталаха, С. В. Жаркова, В. Н. Сямёнава, А. А. Літвінчука. У ліпені 1942 г. у атрад улілася група Сцяпана Скаварады ў колькасці 56 чалавек.

У верасні 1942 г. атрад правёў рад аперацый у Ленінскім раёне. Абком КП(б)Б восенню аб'яднаў атрады В. З. Каржа, імя М. А. Шчорса, В. А. Васільева, імя С. М. Кірава, імя А. В. Суворава, імя С. Г. Лазо, імя М. Ц. Шыша, а таксама дыверсійныя групы А. І. Дамброўскага, І. Д. Габрова, Р. М. Ігнаценка, А. З. Драбені (5 снежня гэтыя групы аб'яднаны ў атрад, камандзірам якога быў А. І. Дамброўскі) у партызанскае злучэнне Пінскай вобласці колькасцю 1855 чалавек.

Брыгада імя Будзённага

Створана ў сакавіку 1943 г. на базе асобных атрадаў «Камарова» і А. І. Дамброўскага. Атрад «Камарова» быў расфарміраваны, з яго асабовага складу створаны новыя атрады імя К. Я. Варашылава і імя Р. І. Катоўскага.

Брыгада дзейнічала ў Ленінскім раёне.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі. 14 ліпеня 1944 г. у складзе трох атрадаў агульнай колькасцю 1078 чалавек. З іх мужчын — 964, жанчын — 106, беларусаў — 708, рускіх — 190, украінцаў — 54, другіх нацыянальнасцей — 118. Членаў ВКП(б) — 66, кандыдатаў — 67, членаў ВЛКСМ — 245, беспартыйных — 692.

Камандзіры брыгады: Антановіч Уладзімір Маісеевіч (жнівень — лістапад 1943 г.), Шырын Фёдар Ігнацьевіч (лістапад 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Ігнаценка Рыгор Мікалаевіч (жнівень 1943 — красавік 1944 г.), Карасёў Рыгор Сцяпанавіч (красавік — ліпень 1944 г.).

Начальнік штаба: Стаюхін Васіль Якімавіч (жнівень 1943 — ліпень 1944 г.).

Атрад «Камарова»

Створаны 26 чэрвеня 1941 г. па рашэнню Пінскага абкома КП(б)Б. 4 ліпеня прыступіў да баявых дзеянняў. З красавіка 1942 г. дзейнічаў у Жыткавіцкім і Ленінскім раёнах. У 1944 г. «Камарову» (В. З. Каржу) Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Камандзір атрада — Корж Васіль Захаравіч (чэрвень 1941 — сакавік 1943 г.).

Камісары: Бандаравец Мікіта Іванавіч (чэрвень 1942 — верасень 1943 г.), Меркуль Васіль Цімафеевіч (кастрычнік 1942 — сакавік 1943 г.).

Начальнікі штаба: Тамілаў Павел Пятровіч (жнівень — верасень 1942 г.), Баранаў Мікалай Максімавіч (студзень — сакавік 1943 г.).

Атрад імя П. К. Панамарэнкі

Створаны ў снежні 1942 г. на базе дыверсійных груп, якія сфарміраваны рашэннем ЦК КП(б)Б у Маскве ў верасні 1942 г. і накіраваны ў Пінскую вобласць. Да сакавіка 1943 г. дзейнічаў самастойна, затым папоўнены 7-й групай атрада В. З. Каржа і яму прысвоена імя П. К. Панамарэнкі.

Камандзіры атрада — Дамброўскі Анатоль Іосіфавіч (снежань 1942 — люты 1943 г.), Антановіч Уладзімір Маісеевіч (сакавік — жнівень 1943 г.), Зайцаў Іван Васільевіч (жнівень 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Антановіч Уладзімір Маісеевіч (снежань 1942 — сакавік 1943 г.), Ігнаценка Рыгор Мікалаевіч (сакавік — жнівень 1943 г.), Касцюкевіч Пётр Віктаравіч (жнівень 1943 — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Баброў Іван Дзмітрыевіч (снежань 1942 — люты 1943 г.), Дубовік Фёдар Фёдаравіч (сакавік — лістапад 1943 г.), Багданоўскі Глеб Аляксандравіч (лістапад 1943 — ліпень 1944 г.).

Атрад імя К. Я. Варашылава

Арганізаваны ў сакавіку 1943 года з 1, 2 і 7-й груп атрада В. З. Каржа і жыхароў Ленінскага раёна. Пры злучэнні з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 323 чалавекі.

Камандзіры атрада: Шырын Фёдар Ігнацьевіч (сакавік — лістапад 1943 г.), Некрашэвіч Іван Логвінавіч (красавік — ліпень 1944 г.).

Начальнік штаба: Стаюхін Васіль Акімавіч (сакавік — жнівень 1943 г.), Козінцаў Мікіта Якаўлевіч (жнівень 1943 — ліпень 1944 г.).

Атрад імя Р. І. Катоўскага

Сфарміраваны ў сакавіку 1943 г. на базе 3, 4 і 5-й груп атрада В. З. Каржа і жыхароў Ленінскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 402 чалавекі.

Камандзір атрада: Баранаў Мікалай Максімавіч (сакавік 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Севасцьянчык Харлампій Іванавіч (сакавік — жнівень 1943 г.), Белякевіч Аляксей Аляксеевіч (жнівень 1943 — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Тамілаў Павел Пятровіч (сакавік — красавік 1943 г.), Хасенаў Мештыбай Хасенавіч (красавік 1943 — май 1944 г.), Чарнышкоў Віктар Георгіевіч (май — ліпень 1944 г.).

Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Минск: Беларусь, 1983.

У гады вялікіх выпрабаванняў

Дзербан Уладзімір Міхайлавіч (н. у 1910 г.) напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працаваў оперупаўнаважаным Жыткавіцкага райаддзела міліцыі. З ліпеня 1941 г.— камандзір партызанскага атрада, затым камісар 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгады. Адначасова са жніўня 1943 па ліпень 1944 г.— член Жыткавіцкага падпольнага райкома партыі. У пасляваенны час працаваў у органах юстыцыі рэспублікі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі.

У. М. Дзербан

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

У час акупацыі раёна на часова захопленай ворагам тэрыторыі з ліпеня 1941 па ліпень 1944 г. ні на дзень не заціхала полымя свяшчэннай народнай вайны. Яшчэ да пачатку акупацыі райкомам партыі была праведзена вялікая работа па арганізацыі партызанскай вайны ў тыле ворага. Створана раённая партыйная група, у састаў якой увайшлі партыйныя і савецкія работнікі, актывісты Ц. Р. Кавалеўскі (кіраўнік падпольнай арганізацыі), І. Г. Саўчанка і І. Л. Раманюк. Быў сфарміраваны першы на тэрыторыі раёна партызанскі атрад колькасцю звыш 50 чалавек, большасць з якіх — камуністы і камсамольцы. Ужо ў сярэдзіне ліпеня народныя мсціўцы нагадалі аб сабе акупантам.

Восенню 1941 г. пад націскам ворага атрад вымушаны быў пакінуць тэрыторыю раёна і перабазіравацца ў Петрыкаўскі раён, а потым значная частка партызан накіравалася праз лінію фронту на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. У пачатку вясны 1942 г. пасля актыўных дзеянняў разам з партызанамі Пінскага злучэння В. З. Каржа на тэрыторыі раёна была створана асобная група, якая потым вырасла ў атрад «1 Мая». 25 верасня 1943 г. рашэннем падпольнага райкома партыі была створана 50-я Жыткавіцкая партызанская брыгада, сфарміраваная на базе атрадаў «1 Мая», 105-га, 109-га і 117-га.

На тэрыторыі раёна таксама дзейнічаў дыверсійны атрад Р. М. Лінькова, вядомага ў народзе пад прозвішчам «Баця», і атрад І. М. Чорнага, галоўная задача якога заключалася ў зборы разведданых для генеральнага штаба. Гэтыя атрады былі закінуты з Вялікай зямлі ў 1941—1942 гг. для арганізацыі дыверсій, збору разведданых у тыле ворага і падпарадкоўваліся камандаванню Чырвонай Арміі.

На тэрыторыі былога Тураўскага раёна дзейнічалі два асобныя партызанскія атрады. Праз Жыткавіцкі раён неаднаразова ў час яго акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі праходзілі з рэйдамі і наносілі значны ўрон ворагу Пінскае партызанскае злучэнне пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза В. З. Каржа і легендарнае злучэнне двойчы Героя Савецкага Саюза С. А. Каўпака.

Сумесна са штабам брыгады райком партыі падрыхтаваў тэкст партызанскай прысягі. Былі праведзены сходы ў атрадах, на якіх была прынята прысяга ўсім асабовым саставам.

Вось тэкст прысягі:

«Я чырвоны партызан, даю партызанскую прысягу перад Радзімай, сваімі баявымі таварышамі — чырвонымі партызанамі, што буду смелым, дысцыплінаваным, рашучым і бязлітасным да ворагаў Радзімы.

Я клянуся, што ніколі не выдам свайго атрада, сваіх камандзіраў, камісараў, таварышаў партызан. Заўсёды буду берагчы партызанскую тайну, калі нават мне гэта будзе варта жыцця.

Я буду да канца свайго жыцця верны сваёй Радзіме і партыі.

Калі нарушу гэту свяшчэнную клятву-прысягу, то няхай мяне напаткае суровая партызанская кара».

У сувязі з ростам партызанскіх атрадаў і ўтварэннем новых падпольны райком і камандаванне брыгады паўсюдна займаліся пытаннямі падбору і расстаноўкі каманднага і палітычнага саставу, удзялялі многа ўвагі прадуктоваму і матэрыяльнаму забеспячэнню байцоў.

У кожным атрадзе была арганізавана вучоба з асабовым саставам па баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Праводзімыя заняткі садзейнічалі выяўленню баявых і палітычных якасцей людзей, іх здольнасцей і таленту. Тыя, хто паказвалі сябе найбольш здольнымі, знаходлівымі, ра-

шучымі, гарэлі жаданнем хутчэй уступіць у барацьбу з акупантамі, вылучаліся на камандзірскія пасады.

Мы былі ўдзячны былому сакратару Палескага падпольнага абкома партыі І. Дз. Ветраву, які па нашай просьбе нярэдка дапамагаў камандзірскімі кадрамі. У кастрычніку 1943 г. штаб злучэння накіраваў на пасаду начальніка штаба Жыткавіцкай партызанскай брыгады № 50 Аляксандра Іванавіча Ціханчыка. У лістападзе таго ж года на пасаду начальніка штаба № 113 быў прысланы В. Ф. Караблін. На камандныя пасады ў нашу брыгаду былі прысланы таксама А. А. Асокін і М. Х. Хілько.

Асаблівае месца ў рабоце райкома партыі займалі пытанні прадуктовага забеспячэння атрадаў і стварэння неабходных запасаў. Гэтыя пытанні неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэннях падпольнага райкома з удзелам камандзірскага саставу брыгады і атрадаў. Перш за ўсё перад камандаваннем атрада ставілася задача здабываць прадукты ў акупантаў і іх памагатых. Але гэта не заўсёды ўдавалася. Былі распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па аказанню дапамогі насельніцтву навакольных вёсак, якое пражывала ў асноўным у лесе, у правядзенні сяўбы яравых і азімых культур. Для гэтага атрады выдзялялі коней, інвентар, а часам і насенне, а таксама спецыяльныя ўзброеныя групы партызан, якія аказвалі дапамогу насельніцтву ў сяўбе і ўборцы ўраджаю.

Нямецка-фашысцкія акупанты ўсімі сіламі імкнуліся перашкодзіць партызанам у выкананні іх мерапрыемстваў. Яны неаднаразова спрабавалі захапіць насельніцтва ў час палявых работ, цяглавую сілу, інвентар і насенне, а саміх знішчыць або ўгнаць у фашысцкае рабства.

Збожжам і бульбай было забяспечана не толькі мірнае насельніцтва, але і партызанскія атрады. У 1943—1944 гг. мы амаль не мелі недахопаў у хлебе. Праўда, расходавалі яго беражліва. Была ўстаноўлена норма расходу хлеба з разліку 700 грамаў у суткі на чалавека. У кожным атрадзе быў арганізаваны размол зерня і выпечка хлеба. А ў атрадах «1 Мая», № 105 і № 109 працавалі свае пякарні, што садзейнічала бесперабойнаму забеспячэнню байцоў хлебам.

Здараліся ў нас перабоі з соллю, якую мы здабывалі ў варожых гарнізонах. Калі соль адсутнічала, замест яе прыходзілася спажываць звычайныя мінеральныя ўгнаенні, калійную соль. Гэта вельмі непрыемны «прадукт», але ўсё ж было лепш, чым зусім несалёная страва. Праблема солі была поўнасцю вырашана, калі ў канцы 1943 г. мы наладзілі радыёсувязь з Беларускім штабам партызанскага руху і калі да нас пачалі часта прылятаць савецкія самалёты. Спачатку нам грузы скідваліся на парашутах, а калі была абсталявана пасадачная пляцоўка на адной з палян у Ляхавіцкай пушчы, яны дастаўляліся непасрэдна на зямлю ў размяшчэнне штаба брыгады. З таго часу мы сталі атрымліваць у дастатковай колькасці цэнтральныя газеты, брашуры і іншую літаратуру. Па кароткахвалевай рацыі штодзённа прымалі зводкі Саўінфармбюро, якія тут жа размнажаліся і распаўсюджваліся сярод насельніцтва.

* * *

Палескі абком КП(б)Б яшчэ да акупацыі ворагам Жыткавіцкага раёна зацвердзіў раённую партыйную тройку па кіраўніцтву партызанскай барацьбой на часова захопленай тэрыторыі. У яе ўвайшлі сакратар райкома Цімафей Раманавіч Кавалеўскі, старшыня пасялковага Савета Іван Гаўрылавіч Саўчанка

і старшыня Людзяневіцкага сельскага Савета Іван Лявонавіч Раманюк. З партыйна-савецкага актыву сфарміравалі партызанскі атрад. Звыш 50 чалавек сталі яго байцамі. Мяне прызначылі камандзірам, старшыню Браніслаўскага сельскага Савета Фёдара Іванавіча Лісовіча — камісарам, сакратара партыйнай арганізацыі гэтага сельсавета Арцёма Антонавіча Шчура выбралі сакратаром партарганізацыі атрада.

Паклапаціліся аб канспірацыйных кватэрах, сувязных. У лясах Ляхавіцкага і Рудненскага сельсаветаў стварылі прадуктовыя базы. У раённым ваенкамаце і райадддзеле міліцыі атрымалі вінтоўкі, наганы, гранаты, у лясгасе — некалькі кілаграмаў узрыўчаткі. Для большай аператыўнасці атрад раздзялілі на тры групы. Кожнай прадстаяла весці баявыя дзеянні ў вызначанай зоне: заходняй, паўночнай і ўсходняй. Усходняя група размясцілася ў лясным масіве паміж в. Яміца і Найда. Зрабілі тры курані, добра замаскіравалі іх, выкапалі крыніцы. А што далей рабіць? Вопыту арганізацыі партызанскай барацьбы ў нас не было, спытаць няма ў каго.

У канцы ліпеня правялі расшыранае пасяджэнне партыйнай тройкі. Ц. Р. Кавалеўскі расказаў, якія даныя сабраны аб абстаноўцы ў раёне. Я падзяліўся сваімі думкамі аб планах атрада на бліжэйшы час. Выступілі таксама І. В. Доваль, Г. П. Швец, камсамольцы В. І. Страха, П. Г. Жогаль. Вырашылі ўзмацніць разведку варожых гарнізонаў, сістэматычна весці назіранні за рухам гітлераўцаў па дарогах, рабіць засады.

Пачалі са знішчэння драўляных мастоў на дарогах. Рабілі завалы. На дарозе Жыткавічы — Капцэвічы знішчылі чатыры матацыклы з салдатамі, аўтамашыну з прадуктамі і некалькі павозак з ваеннымі матэрыяламі і боепрыпасамі. У пачатку жніўня з засады на дарозе Брынёў — Капцэвічы напалі на калону аўтамашын з жывой сілай, спалілі два аўтамабілі. Знішчылі каля трох кіламетраў лініі сувязі.

Нашы дзеянні наносілі ворагу не такі значны ўрон, галоўнае значэнне іх было ў іншым — партызаны ў поўны голас заяўлялі аб сабе, вучыліся ваяваць. Пакуль што ў нас мала было сіл і баявых сродкаў. Я ўжо шкадаваў, што раздзялілі атрад на групы. Як аказалася, падтрымліваць пастаянную сувязь і каардынаваць баявыя дзеянні не было магчымасці. Толькі ў канцы жніўня група П. Р. Катовіча вярнулася з заходняй зоны. Павел Рыгоравіч расказаў аб сваіх дзеяннях. За кароткі час група правяла некалькі ўдалых баёў і засад на дарогах Ленін — Юркевічы і Юркевічы — Белае, знішчыла 10 матацыклаў, некалькі павозак з боепрыпасамі, нанесла ўрон і жывой сіле ворага. У канцы ліпеня ў час засады на дарозе Юркевічы — Жыткавічы партызаны падбілі дзве легкавыя машыны і знішчылі трох афіцэраў і некалькі салдат.

Гітлераўцы з кожным днём усё больш звярэлі. Яны жорстка расправуляліся з партызанамі і іх роднымі, каго падазравалі ў сувязі з народнымі мсціўцамі. Фашысты схапілі і пасля доўгіх допытаў расстра-



І. В. Доваль

І. П. Бакуновіч



П. Р. Катовіч



Р. М. Ігнаценка



І. М. Буднік

В. А. Стаюхін

лялі партызан К. С. Касцюка, М. І. Лушчыка, М. І. Трубачкіна, В. А. Шкоду, жонку камандзіра групы І. В. Доваля і іншых. Нам стала вядома, што ворагі рыхтуюць нападзенне на атрад. Таму ў канцы жніўня 1941 г. мы былі вымушаны перабазіравацца ў суседні Петрыкаўскі раён за р. Прыпяць. Вырашылі часова аб'яднацца з Петрыкаўскім партызанскім атрадам. Але і свой раён мы не забывалі. Вялі разведку, праводзілі баявыя аперацыі, падтрымлівалі сувязь з людзьмі, якія там засталіся. У пачатку верасня група пад кіраўніцтвам П. Р. Катовіча каля в. Найда падарвала варожую аўтамашыну, на чыгункі паміж Жыткавічамі і Капцэвічамі знішчыла каля 300 метраў сувязі, спаліла цыстэрну з палівам. 18 верасня камісар атрада Ф. І. Лісовіч з сямю байцамі падпалілі склад гаруча-змазачных матэрыялаў непадалёку ад Жыткавіч. У ноч на 10 кастрычніка 13 партызан на чале з Ф. І. Лісовічам і П. Р. Катовічам знішчылі харчовы склад у Жыткавічах.

Восенню 1941 г. гітлераўцы арганізавалі карную экспедыцыю супраць нас. Раніцай 18 кастрычніка вораг дзвюма калонамі накіраваўся да нашага лагера. На світанні наступнага дня завязаўся жорсткі бой. Пад націскам пераўзыходзячых сіл ворага партызаны вымушаны былі адступіць. Гітлераўцы захапілі правіянт, падрыхтаваны на зіму, жывёлу, знішчылі зямлянкі.

Гэта былі цяжкія страты напярэдадні зімы, яны адмоўна ўплывалі на настрой людзей. Хутка нас пачалі даймаць голад і холад. Многія партызаны выказаліся за тое, каб ісці праз лінію фронту на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. Вынеслі пытанне на партыйны сход. Меркаванні раздзяліліся: адны выказаліся за тое, каб ісці на ўсход, другія настойвалі на тым, каб працягваць барацьбу ў тыле ворага. Вярнуцца ў свой раён і па-новаму разгарнуць партызанскі рух вырашылі каля 10 чалавек — камісар Ф. І. Лісовіч, кіраўнік атрада І. Л. Раманюк, камандзіры груп П. Р. Катовіч і І. В. Доваль, сакратар партыйнай арганізацыі А. А. Шчур, У. І. Гушчэня, Ф. І. Алексіевіч, А. П. Савіцкі, І. Е. Шырай, Г. П. Швец і я.

У пачатку лістапада мы перайшлі ў лясы Жыткавіцкага раёна, дзе ўсё трэба было пачынаць з пачатку. Пачалі дзейнічаць, выкарыстоўваючы свае магчымасці і ў залежнасці ад абставін. Добра было тое, што балоты замерзлі, а снег яшчэ не выпаў. Ніякіх слядоў не заставалася. У лістападзе — снежні пабывалі у многіх населеных пунктах раёна, устанавілі сувязі з патрыётамі в. Новыя Мілевічы Н. І. Катовічам і Т. Р. Сачыловічам, чле-

намі Сукачоўскай камсамольска-маладзёжнай групы Р. С. Мясніковічам, С. І. Бірулем, В. П. Мінічам і іншымі. У в. Юркевічы, Белае, Лагвошчы і Вільча мы дамовіліся са сваякамі партызан Ф. І. Лісовіча, І. Л. Раманюка, А. П. Савіцкага і Р. П. Швеца аб аказанні неабходнай дапамогі.

Не змаглі мы выйсці на сувязь з падпольшчыкамі Жыткавіч, хоць ведалі, што ў райцэнтры працягвалі дзейнічаць Мікіта Фядосавіч Бандзюк, Мануіл Ігнатавіч Івашкевіч і іншыя патрыёты, пра справы якіх мы ведалі яшчэ са жніўня 1941 г. Не дамовіліся мы з імі, і цяпер расплачваліся за свой пралік: захоўваючы канспірацыю, падпольшчыкі не адгукваліся на нашы сігналы, якія мы спрабавалі перадаць праз іншых людзей. Не было магчымасці выкарыстаць і такія каналы, як тайнікі, паштовыя скрынкі. Толькі вясной 1942 г. нам удалося устанавіць сувязь з жыткавіцкімі патрыётамі.

8 сакавіка мы выпадкова сустрэліся з атрадам генерал-маёра М. П. Канстанцінава і далучыліся да яго. Разам прыбылі ў в. Малыя Сцяблевічы. Тут спыніліся і партызаны добра узброеных атрадаў А. І. Давідовіча, В. З. Каржа, М. Н. Разанава, А. І. Патрына, якія рабілі баявы рэйд па раёнах былой Заходняй Беларусі. Там я пазнаёміўся з кіраўнікамі партызанскага падполля Мінскай вобласці

І. Е. Шырай

В. І. Казловым, Р. Н. Мачульскім, І. А. Белым.

Мы таксама прынялі ўдзел у рэйдзе па Старобінскім, Любанскім і Жыткавіцкім раёнах. Пасля гэтага наша група, якая значна павялічылася і ўмацавалася, правяла ў складзе атрада В. З. Каржа нямала баявых аперацый. Пад кіраўніцтвам Васіля Захаравіча — баявога воіна, з вялікім вопытам партызанскай барацьбы, мы адчувалі сябе больш упэўнена. Ён заўсёды прадумана і правільна выбіраў напрамак руху, рыхтаваў аперацыі так, каб несці ворагу найбольш адчувальныя ўдары з найменшымі стратамі партызан.

У Дзякавіцкім і Вятчынскім сельсаветах нашым актыўным памочнікам стаў Ігнат Рагалевіч з в. Хвойка, які стварыў патрыятычную групу з вясковых камсамольцаў. У канцы 1941 г. у Хвойку вярнуўся Фёдар Ільіч Рагалевіч, якому ўдалося збегчы з фашысцкага палону. У 30-х гадах ён быў адным з ініцыятараў стварэння калгаса ў вёсцы, з'яўляўся членам яго праўлення. Ф. І. Рагалевіч адразу пачаў наладжваць кантакты з камсамольскай групай, а неўзабаве стаў партызанскім сувязным.

Выдатна выконваў заданні партызан А. М. Чэркас. Ён пранікаў у варожыя гарнізоны і прыносіў каштоўныя звесткі аб ворагу, а ў 1943 г. стаў байцом атрада «1 Мая». Адважнымі разведчыкамі і сувязнымі былі Міхаіл Жураўлевіч з вёскі Дзякавічы, Марыя Шулерава і Марыя Гуленка з Пасталоў, Лявон Гаўрыловіч з Вятчын. Потым гэтыя людзі сталі партызанамі і праявілі сябе з лепшага боку. У в. Буда нашым сувязным з'яўляўся Аляксандр Рэхцік, які забяспечваў партызан каштоўнымі звесткамі аб ворагу.

На тэрыторыі былога калгаса «Камунар Беларусі» Ляхавіцкага сельсавета дзейнічала патрыятыч-

ная група Мікалая Фядосавіча Давідовіча. Яна праводзіла антыфашысцкую прапаганду сярод насельніцтва, сабрала ў фонд Чырвонай Арміі аблігацыі дзяржаўных пазык больш чым на 30 тысяч рублёў і 10 тысяч рублёў грошай. У вёсках Юркевіцкага сельсавета Аляксандр Васільевіч Рудакоўскі, Станіслава Іванаўна Шчурко і іншыя патрыёты здабывалі разведданыя, зброю і боепрыпасы, разбуралі дарогі, знішчалі тэлефонную сувязь, рыхтавалі папаўненне для атрада.

У Жыткавічах Мікіта Фядосавіч Бандзюк і Мануіл Ігнатавіч Івашкевіч стварылі падпольную арганізацыю, у якую ўваходзілі чыгуначнікі Лаўрэнцій Савельевіч Галавач, Міхаіл Парфёнавіч Саўчыц, дочкі Івашкевіча Марыя і Ніна, камсамольцы Іван Ханеня, Мікалай Саўчыц і іншыя. Сувязь з імі ажыццяўлялася праз Вольгу Смірнову, якая жыла на хутары Мыла, непадалёку ад Жыткавіч. У 1943 г. у арганізацыю ўступілі Людміла Асёл і Аляксандра Бандзюк, якія працавалі на чыгуначнай станцыі. Падпольная арганізацыя ў Жыткавічах праводзіла прапагандысцкую работу ў варожым гарнізоне, распаўсюджвала лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, рабіла дыверсіі на чыгунцы, перадавала партызанам зброю, прадукты харчавання, адзенне. Многія падпольшчыкі папоўнілі з цягам часу атрад.

У сярэдзіне кастрычніка 1942 г. 18 чалавек з нашай групы і 7 байцоў з атрада В. З. Каржа на чале з У. І. Гушчэняй і мной правялі рэйд па тэрыторыі Жыткавіцкага раёна. Мы здзейснілі шэраг дыверсій на дарогах. Атрад значна папоўніўся людзьмі.

У снежні 1942 г. па дамоўленасці з В. З. Каржом і оперупаўнаважаным ЦК КП(б)Б па Пінскай вобласці А. Е. Кляшчовым звыш 30 жыткавіцкіх партызан былі вылучаны са злучэння В. З. Каржа і накіраваны ў свой раён для папаўнення нашага атрада. Атрад атрымаў назву «1 Мая». Камандзірам яго стаў У. І. Гушчэня, а я — камісарам. Такім чынам быў узноўлены Жыткавіцкі партызанскі атрад, створаны ў ліпені 1941 г. Астатніх 7 з 9 арганізатараў партызанскага руху ў раёне — І. В. Доваля, П. Р. Катовіча, Ф. І. Лісовіча, І. Л. Раманюка, А. П. Савіцкага, І. Е. Шырая і Г. П. Швеца — накіравалі ў іншыя раёны вобласці для арганізацыі новых атрадаў, якія потым увайшлі ў склад Пінскага партызанскага злучэння. У другой палове 1943 г. узнік шэраг новых атрадаў, якім была аказана неабходная дапамога ў камплектаванні людзьмі, забеспячэнні зброяй.

25 верасня было вырашана стварыць брыгаду. Камандзірам яе стаў У. І. Гушчэня, камісарам — я, начальнікам штаба — А. І. Ціханчык. Атрады 50-й Жыткавіцкай брыгады дзейнічалі ў розных зонах раёна з такім размахам, каб усе камунікацыі ворага кантраляваліся. Штаб брыгады, падпольныя райкомы партыі і камсамола знаходзіліся ў атрадзе «1 Мая».

Агітатары рэгулярна праводзілі гутаркі і інфармацыі сярод байцоў і мясцовага насельніцтва, чыталі зводкі Саўінфармбюро. Толькі за 7 месяцаў баявых дзеянняў у раёне мы распаўсюдзілі 14 тысяч газет, брашур і лістовак, якія атрымлівалі з Вялікай зямлі, правялі ў населеных пунктах каля 300 гутарак і сходаў. Работа агітатараў і прапагандыстаў была небяспечнай, часта рызыкоўнай. У верасні 1943 г. група на чале з камандзірам роты А. В. Бараноўскім і сакратаром камсамольскай арганізацыі М. В. Некрашэвічам накіравалася ў Боркі, Кольна, Млынок і іншыя вёскі для правядзення масава-палітычнай работы, у прыватнасці, для азнакамлення

жыхароў з пісьмом воінаў-беларусаў. 28 верасня група, у саставе якой было каля 40 чалавек, знаходзілася ў вёсцы Кольна, дзе быў арганізаваны сход. Прысутнічалі на ім амаль усе жыхары вёскі. Раптам з'явіўся сувязны Мікалай Сінкевіч. Ён падышоў да А. В. Бараноўскага і шапнуў: «Сюды накіроўваюцца немцы, многа, канца калоны не відаць». Часу доўга раздумваць няма, трэба хутка прымаць рашэнне. І А. В. Бараноўскі спакойна заявіў: «Па прычыне неадкладнай справы сход закрываецца. Разыходзьцеся па дамах... А ты,— упаўголаса сказаў сувязному,— вазьмі некалькі чалавек і хутка правядзі разведку».

Устанавілі, што з Жыткавіч у Тураў рухаецца абоз з 50 падвод з узброенай аховай. А. В. Бараноўскі і М. В. Некрашэвіч вырашылі зрабіць засаду. Да іх групы далучыліся яшчэ 10 байцоў з Тураўскага атрада «За Радзіму». Народныя мсціўцы залеглі за хмызняком на павароце дарогі. У іх былі тры ручныя кулямёты, звыш 10 аўтаматаў, гранаты.

Ішоў дробны асенні дождж. На падводах панура сядзелі гітлераўцы. Калі калона наблізілася да месца засады, у яе сярэдзіну паляцелі гранаты. Партызаны адкрылі агонь. Фашысты, пакінуўшы павозкі, кінуліся ўцякаць пад прыкрыццё берага ракі. А. В. Бараноўскі падбег да адной падводы і заўважыў там мінамёт з камплектам мін. Ён быў вопытным вайскоўцам. Хутка ўстанавіў мінамёт і пачаў выпускаць міну за мінай па гітлераўцах. Бой быў кароткім. Партызаны знішчылі каля 20 фашыстаў, захапілі багатыя трафеі, у тым ліку 2 мінамёты, 2 ручныя кулямёты і 28 дыскаў да іх, звыш 15 тысяч патронаў.

Аднойчы ў 109-ы атрад прыйшоў са зброяй узвод «дабравольцаў» — мясцовых жыхароў, мабілізаваных гітлераўцамі для аховы камунікацый і нясення гарнізоннай службы. Гэта было вынікам агітацыйнай работы нашых сувязных. Усяго за час баявых дзеянняў 50-й брыгады да партызан перайшло з варожых фарміраванняў 390 чалавек.

У пачатку 1944 г. на тэрыторыі раёна партызаны зрабілі аэрадром, які прымаў самалёты з Вялікай зямлі. З-за лініі фронту сюды дастаўлялі зброю, правіянт, газеты. Аднойчы ноччу мы атрымалі звыш 30 цюкоў з рознымі грузамі, выкінутымі на парашутах. Там былі тол, узрыўчатка, капсулы-дэтанатары. Усё гэта нам было вельмі неабходна для «рэйкавай вайны», да якой мы тады рыхтаваліся. З Вялікай зямлі мы атрымалі 12 супрацьтанкавых ружжаў, 10 ручных кулямётаў, 65 аўтаматаў, 60 вінтовак, 65 тысяч патронаў.

Па радыё мы ўстанавілі сувязь са штабам 61-й арміі і часта выконвалі заданні па разведцы дыслакацыі ворага. На чыгуначнай станцыі Жыткавічы заўважылі скапленне варожых эшалонаў, склады з боепрыпасамі і правіянтам і перадалі гэтыя звесткі камандаванню. Праз дзень на станцыю быў зроблены налёт нашай авіяцыі. Знішчана два эшалоны гітлераўцаў, шмат тэхнікі, склады.

Фронт прыблізіўся да раёна. Усюды павялічылася колькасць непрыяцельскіх войск. Становішча брыгады значна пагоршылася, але мы працягвалі баявыя дзеянні. 22 лютага партызаны напалі на калону аўтамашын, якая рухалася з Жыткавіч на Пціч. Было знішчана 5 варожых машын, забіта 22 гітлераўцы.

Вораг адступаў пад націскам Чырвонай Арміі і ў звярынай злосці забіваў, нішчыў, разбураў усё на сваім шляху. 5 сакавіка буйное злучэнне фашыстаў накіравалася ў лес, каб разграміць нашы стаянкі разам з мірнымі жыхарамі, якія

знайшлі там прытулак. Райком партыі і камандаванне брыгады своечасова прынялі меры, каб не дапусціць карнікаў у лагер. Байцы 113-га атрада пад камандаваннем Ф. І. Ефімовіча зрабілі засаду каля в. Юркевічы. У дзве гадзіны дня паказаліся ворагі колькасцю каля двух батальёнаў. Народныя мсціўцы падпусцілі іх метраў на сто і адкрылі дружны агонь. Карнікі пачалі адстрэльвацца і займаць абарону. Ф. І. Ефімовіч падняў партызан у атаку. Фашысты пабеглі. Народныя мсціўцы праследавалі іх некалькі кіламетраў да в. Лагвошчы. Партызаны захапілі ручны кулямёт, некалькі аўтаматаў і шмат боепрыпасаў.

Вясной 1944 г. у 50-й Жыткавіцкай брыгадзе налічвалася звыш тысячы байцоў. Гэта была грозная, праверэная ў баях сіла. Да самага злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў пачатку ліпеня брыгада паспяхова вяла актыўныя баявыя дзеянні. Партызаны рабілі ўсё, каб наблізіць радасны дзень Перамогі.

У. М. Дзербан

Халодная вада Чырвонага возера

У канцы жніўня 1941 г. Мінскі падпольны абком КП(б)Б накіраваўся ў найбольш зручнае месца — на Чырвонае возера. Славіцца на Беларусі гэты цудоўны куток прыроды. Сярод лугоў і лясоў, часта цяжкадаступных зараснікаў разліўся шырокі, вокам не акінуць, плёс... Раскошныя ясені, бярозы і вербы растуць на высокіх берагах, нахіляюцца галлём да самай вады...

Яшчэ не так даўно толькі адны легенды і віталі вакол гэтага возера. Людзям туды амаль што не было доступу, бо на дзесяткі кіламетраў ішлі наўкола дрыгвяныя, гнілыя балоты. Папы актыўна падтрымлівалі ўсякія таямнічыя, рэлігійныя легенды пра тутэйшыя месцы. Гэта рабілася для таго, каб больш людзей ішло ў царкву, якая была вельмі раскошна адбудавана ў вёсцы Чырвонае Возера. Духавенства паклапацілася нават аб тым, каб была пракапана канава ад гэтай царквы праз балота да возера, а там далей — да вёсак. У дні вялікіх свят людзі сядалі ў чоўнікі-душагубкі і па канаве прыплывалі на багамолле. Гэта быў адзіны шлях, які злучаў палескія вёскі, падзеленыя Чырвоным возерам, або, як раней яго называлі, Князь-возерам. Людзі празвалі гэтую канаву «яздоўняй».

У гады першых пяцігодак былую «яздоўню» калгаснікі расчысцілі і расшырылі, яна стала магістральным і меліярацыйным каналам. Ад яе пайшлі яшчэ канавы, і дзесяткі гектараў непралазнай твані былі ператвораны ва ўрадлівую зямлю.

... Я часта бываў на гэтым возеры. Не думалася, не гадалася, што гэтая мясціна — гордасць Палесся, стане ў сорак першым годзе месцам прыпынку Мінскага падпольнага абкома партыі, адным з цэнтраў баявых дзеянняў партызанскіх атрадаў Палесся... Раён Чырвонага возера найбольш адпавядаў умовам падпольнай работы.

Я паслаў у Жыткавіцкі раён былога старшыню мясцовага калгаса Івана Рагалевіча з групай партызан, а ў Капаткевічы — Якава Бердніковіча. Неабходна было як мага хутчэй звязацца з мясцовымі камуністамі, выясніць, што яны робяць для разгортвання партызанскага руху, якая ім патрабуецца канкрэтная дапамога.

Прайшло больш двух тыдняў. З поўначы, ад возера Чырвонага пацягнула асеннім холадам. Раніцамі на апалых лісцях і траве ляжаў іней... Паступова возера мяняла сваё аблічча, вада з кожным днём станавілася ўсё больш цёмнай, сваім колерам яна нагадвала расплаўленае волава.

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Вярнуліся сувязныя. Невясёлыя звесткі прынеслі яны. Гарадскі пасёлак Жыткавічы і суседнія вёскі запоўнены эсэсаўцамі і паліцаямі. У раёне Пасталоў размясціўся буйны варожы гарнізон, там ёсць нават гарматы. Гітлераўцы ліхаманкава расшыраюць міжраённую нафтабазу, а гэта значыць, там могуць з'явіцца і танкі. З раённых работнікаў Рагалевіч нікога не знайшоў.

Па ўсяму было відаць, што фашысты рыхтуюцца да сур'ёзных аперацый супраць партызан. Былі падставы меркаваць, што яны ведаюць пра падпольны абком. Нядаўна акупанты разам з паліцэйскімі зноў пратрэслі вёскі Скоўшын, Пухавічы, Ляхавічы — якраз тыя месцы, дзе мы з'яўляліся. Гітлераўцы паставілі заслоны на ўсіх меліярацыйных канавах, якія вялі ў возера, а ў пачатку былой «яздоўні» засела група са станкавым кулямётам.

Гітлераўскія часці з'явіліся таксама ў вёсках Чырвонае Возера, Вялікі Лес, Дзякавічы. Паступова эсэсаўскімі бандамі напаўняліся бліжэйшыя хутары, заслоны на канавах перасоўваліся бліжэй да возера. Эсэсаўцы не ведалі, што нас тут зусім мала і, акрамя вінтовак, наганаў і гранат, не было другой зброі.

Варожае акружэнне ўсё больш давала аб сабе знаць. Усё цяжэй было падтрымліваць сувязь з партызанскімі атрадамі, партыйным падполлем і мясцовым насельніцтвам. Сваіх запасаў мы не мелі, становішча з кожным днём ускладнялася.

Я даў указанне рыхтавацца да бою. Нельга было пакідаць гэтыя палескія раёны.

На канавах мы паставілі свае пасты. Дзе-нідзе вырылі акопы, на адной важнай вышыні пабудавалі дзот. Сяржанта Пятрэнка накіравалі ў атрад Меркуля з заданнем прывесці групу добра ўзброеных партызан. Дзве разведвальныя групы паслалі ў Жыткавічы і Капаткевічы. Разведчыкам належала перадаць Жыткавіцкай групе, што яна абавязкова, любымі сродкамі павінна звязацца з Довалем і Дзербанам і ўзарваць нямецкую нафтабазу ў Жыткавічах.

Паліцэйскія заслоны на канавах і хутарах падходзілі ўсё бліжэй да возера, блакада сціскалася. Група на «яздоўні» зусім асмялела і наблізілася да лагера. Але фашыстам не паздаровілася. Падабраліся партызаны і гранатамі знішчылі кулямётнае гняздо. Перапалоханыя паліцаі кінуліся ў балоты, тут іх амаль усіх і перабілі... «Яздоўня» на некаторы час ачысцілася.

... Вестка аб гэтай аперацыі маланкай абляцела раёны. Па ўсіх вёсках пачалі гаварыць, што хутка партызаны разгоняць усю старобінскую і жыткавіцкую паліцыю.

Жыткавіцкая група не здолела паварушыць местачковага гарнізона, аднак яна зрабіла не менш важную справу — удалося ўзарваць Жыткавіцкую міжраённую нафтабазу, дзе за апошні час акупанты назапасілі сотні тон паліва.

В. І. Казлоў
З кнігі «Людзі асобага складу»

Атрад Камарова дзейнічае

Ішоў грозны 1941 год.

...6 ліпеня, на світанні, атрад, аддаўшы свае машыны бежанцам, накіраваўся да станцыі Мікашэвічы, што ў Ленінскім раёне... У гэтым раёне нашы патрапаныя ў напружаных баях часці вялі крывапралітныя баі з немцамі. Партызаны дапамагалі ім, рабілі засады на шляхах руху ворага.

В. З. Корж арганізаваў дзве баявыя групы на дарогу Ленін — Жыткавічы, у задачу якіх уваходзіла арганізацыя засад. Адну групу

ўзначаліў сам камандзір атрада, другую — Карасёў. Група Карасёва абстраляла калону нямецкіх аўтамашын, якіх суправаджалі матацыклісты. Забілі 7 фашыстаў, сярод іх — адзін афіцэр. Але падабраць трафеі не ўдалося. Тры машыны, якія ехалі ззаду, спыніліся, аўтаматчыкі заляглі ў кюветах і адкрылі шалёную страляніну. Прыйшлося адыйсці.

Група Каржа натыкнулася на немцаў у вёсцы Баравая і адыйшла ў глыбіню лесу, таму што шлях да месца намечанай засады пралягаў на адкрытай мясцовасці. Калі сцямнела, камандзір паслаў двух разведчыкаў у рыбгас, размешчаны недалёка ад Баравой. Там былі надзейныя людзі. Байцы вярнуліся і далажылі, што немцы з Баравой паехалі на Жыткавічы. Па дарозе абстралялі лес.

— У Баравой немцы былі ў першы раз,— расказвалі разведчыкі. Але вясковы тэлеграф без дроту ўжо паспеў разнесці па ваколіцы вельмі нядобрыя весткі пра акупантаў...

Атрад рушыў далей у лес і размясціўся ва ўрочышчы Алубка, на поўнач ад Белага возера. Да таго часу партызаны ўжо абзавяліся якой-кольвечы гаспадаркай. У атрадзе мелася 12 коней, з іх восем запрагаліся ў вазы, на якіх ляжалі прадукты, абмундзіраванне, запасныя сёдлы. Астатнімі коньмі карысталіся разведчыкі. Але сваёй базы ў атрада яшчэ не было. Для яе трэба было адшукаць зручнае месца дзе-небудзь у глыбіні лесу. Пакуль гэта не ўваходзіла ў іх планы...

... Корж з групай партызан-кавалерыстаў праехаў па вёсках Ляхавічы — Пухавічы. Гэтыя вёскі стаялі ўбаку ад вялікіх трактаў, але ў партызан былі звесткі, што туды ўжо прыязджалі гітлераўцы і спрабавалі арганізаваць паліцыю. Ахвотнікаў служыць фашыстам не знайшлося. Але хто ведае: сёння не знайшлося, а заўтра з дапамогай пагроз і абяцанняў фашыстам удасца знайсці сабе служак...

Гэты маленькі рэйд удаўся. Ён вельмі падбадзёрыў людзей. У кожным населеным пункце байцоў абкружалі жыхары ад малога да вялікага, перабіваючы адзін другога, задавалі пытанні, у якіх гучала трывога за лёс радзімы.

— Немцы брэшуць, што Маскву хутка возьмуць. Праўда гэта?

Партызаны, не скрываючы, гаварылі, што становішча на франтах нялёгкае, але Чырвоная Армія не разгромлена, як сцвярджаюць фашысты, а ўсё мацней б'е ворага, і перамога будзе за намі. Зачыталі апошнія зводкі Саўінфармбюро.

Свае гутаркі Корж заканчваў так:

— Таварышы! Мы партызаны. Вы бачыце — нас усяго восем. А колькі нас яшчэ — гэта ваенная тайна.

Слухачы ўсміхаліся і многазначна гаварылі:

— І пешых бачылі!

— Вядома, не самі ж сябе немцы на шашы страляюць.

— Вось бачыце,— падхопліваў Корж,— значыць, не баімся мы немцаў, калі сярод белага дня ездзім па зямлі, якую яны лічаць заваяванай. І прызываем вас, дарагія таварышы, дапамагаць Чырвонай Арміі і нам. Ні зярнятка, ні грама мяса, ні кроплі малака акупантам! Хавайце ўсё. Няхай не будзе сярод вас здраднікаў. А калі такія завядуцца — вось вам наша партызанскае слова: жывым ім не быць!

У Ляхавічах адбылася такая сцэна. Васіль Захаравіч выступіў перад жыхарамі, адказаў на іх пытанні, і тут да яго падыйшлі два старыя, адвялі ўбок:

— Таварыш камандзір, да вас ёсць вялікая справа,— сказаў адзін з іх.— Вельмі вялікая...

— Ну што ты цягнеш,— перабіў яго другі.— Адразу бычка за рогі... Мы хаваем калгасную жывёлу. Сто трыццаць галоў у лесе трымаем. І хлеб людзі закопваюць, як толькі змалоцяць. Так што будзьце спакойны. Дулю ад нас фашысты атрымаюць...

Разгаварыліся. Старыя аказаліся баявымі. Прапанавалі сябе пры неабходнасці ў правадніки.

— А трэба, дык і ў разведку сходзім. Нам жа менш бяспечна. Хто на нас зверне ўвагу? — гаварыў Рыгор Антановіч.

Другі стары, Рыгор Давідовіч, згодна ківаў галавой.

«Рыгоры два,— падумаў Васіль Захаравіч,— а думка ў іх адна. Такія любога фашыста правядуць»...

Дамовіліся падтрымліваць сувязь, дзе і калі сустракацца.

На досвітку, крыху адпачыўшы, партызаны накіраваліся ў свой атрад. І кожны з іх нёс у душы пачуццё ўпэўненасці у нашых выдатных людзях. Яны былі не адны...

— У вёску Баравая прыйшоў камсамолец Іван Некрашэвіч,— дакладвала сувязная Ганна Васільеўна Багінская.— Вырваўся з акружэння. Са зброяй. А малодшы брат яго Міша, што ў групе Карасёва, правадніком быў, сказаў Івану пра партызан. Іван у атрад хоча...

Сапраўды, Міша — смелы, знаходлівы хлопец, добра дапамог Карасёву. Яны сустрэліся, калі Міша вяртаўся з-пад Жыткавіч, куды праводзіў групу байцоў, якія адступалі на ўсход. Міша вызваўся давесці да тракта і групу Карасёва. І ўжо пры самым падходзе да месца засады Мішу, які ішоў метраў за сто наперадзе, схапілі нямецкія аўтаматчыкі. Калі б на іх нарваліся партызаны, справа скончылася б дрэнна. Немцаў, як потым расказваў Міша Ганне Васільеўне, было каля васьмідзесяці. Яны дапытвалі Мішу, білі, але ён гаварыў адно:

— Ішоў дахаты, заблудзіўся ў лесе. Жыву ў вёсцы Баравая.

Трымалі хлопца пяць дзён. Не дабіўшыся ад яго нічога і ўпэўніўшыся, што ён на самой справе жыве ў Баравой, адпусцілі.

Выслухаўшы Ганну Васільеўну, Корж цёпла адазваўся аб Мішы. Малайчына! З яго будзе добры разведчык. А які яго брат Іван? Трэба пазнаёміцца з ім.

— Вы можаце перадаць Івану, каб прыйшоў? — спытаў Васіль Захаравіч Багінскую.

Тая згадзілася і разам з Чуклаем пайшла ў Баравую.

Корж папярэдзіў Чуклая, каб ён ні ў якім разе не паказваўся суседзям Некрашэвічаў.

Хутка Ганна Васільеўна і Чуклай вярнуліся, разам з імі — невысокага росту, шчыльна збіты, круглатвары хлопец гадоў дваццаці пяці. Ён па-вайсковаму прадставіўся:

— Баец Чырвонай Арміі Іван Некрашэвіч!

— А дзе ж твая вінтоўка, баец?

— Вінтовак у мяне дзве, таварыш камандзір. Адна мая, другая таварыша з вёскі Лагвошчы. Разам выходзілі з акружэння. Сваю вінтоўку ён аддаў мне, а сам пайшоў дамоў. Больш я яго не бачыў. Перадавалі — жыве дома адкрыта.

— А вы таксама адкрыта?

— Не, таварыш камандзір. Толькі сястра і браты ведаюць, што я тут.

— А колькі ж вас, братоў?

— Я, Міша і Рыгор — гэтыя дома. А брат Сяргей у Асіповічах у апошні час працаваў чыгуначнікам. Пуцявы майстар. А дзе цяпер — не ведаем.

Разгаварыліся, і Корж многа даведаўся аб гэтай дружнай працоўнай сям'і. Усе ў ёй вывучыліся, цвёрда сталі на ногі. Іван перад вайной набыў спецыяльнасць бухгалтара, Вера — рахункавода, Сяргей — чыгуначніка, Рыгор — пашто-

вага работніка. Яго прызначылі начальнікам аддзялення сувязі.

— Ну што ж, выходзіць, хутка будзе ў нас цэлае аддзяленне камсамольцаў Некрашэвічаў?

— Так точна, таварыш камандзір! — радасна адказаў Іван.

Спытаў хлопца, ці далёка схаваны вінтоўкі. Іван хутка прынёс іх — дзве вінтоўкі, густа змазаныя, замотаныя ў прасціну. Было відаць, што Некрашэвіч умее захоўваць зброю. І тут жа ён атрымаў сваё першае баявое заданне: разам з Чуклаем і яшчэ трыма партызанамі ўзяць жывым і прывесці ў атрад здрадніка з вёскі Баравая...

Кіраўніцтва атрада вырашыла зрабіць агітацыйны рэйд па вёсках: расказаць насельніцтву аб палажэнні на франтах, упамянуць пра бясслаўны канец здрадніка. Пакінуўшы ў лагеры Сашу Бярковіча з радыёпрыёмнікам і некалькі чалавек аховы, рушылі ў паход. У рыбгасе «Белае» адбылася радасная сустрэча з К. І. Канушкіным, які праводзіў Веру Харужую і цяпер вяртаўся з-за фронту. З ім быў В. С. Буйніцкі. Канушкін расказаў, што яны пабывалі ў Пінскім абкоме. Работнікаў у абкоме вельмі мала: хто на фронце, хто — у тыле ворага. ЦК партыі накіроўвае ў варожы тыл многа людзей для арганізацыі партызанскай барацьбы. Значыць, вераць у партызан, лічаць іх сапраўднай сілай.

Звыш тыдня хадзілі па вёсках Ленінскага і Жыткавіцкага раёнаў. Невялікія групы з'яўляліся адначасова ў розных месцах. І людзям здавалася, што партызан — многія дзесяткі, сотні.

Немцы не замарудзілі адрэагіраваць на адкрытае і смелае з'яўленне партызан. Г. В. Багінская і Н. А. Балобіна, якія хадзілі ў разведку ў Ленін і ў Жыткавічы, данесілі, што немцаў там стала прыкметна больш.

21 жніўня ў чатырох кіламетрах ад Леніна байцы атрада зрабілі засаду. Чакалі з самай раніцы. Але машыны не з'яўляліся. Нарэшце з боку Леніна пачуўся трэск матацыкла.

«Напэўна, разведка,— падумаў Корж.— Трэба прапусціць або ўзяць без гуку».

Матацыкліст з каляскай наблізіўся. На ім было двое. Корж выскачыў на дарогу і крыкнуў:

— Хальт!

Побач з ім, быццам з-пад зямлі, выросла яшчэ байцоў дзесяць. Матацыкл спыніўся. Збянтэжаныя нечаканым нападзеннем, немцы не паспелі нават узяцца за зброю. Іх імгненна абкружылі і на матацыкле пакацілі ў кусты.

Камандзір аддаў распараджэнне:

— Засаду не здымаць. Сачыце за дарогай.

Каля дарогі прасядзелі да вечара, але так і не дачакаліся больш нікога, вярнуліся ў лагер. Там іх чакала Ганна Васільеўна. Яна расказала: людзі ў Баравой вельмі задаволены, што забралі здрадніка. Старасты напалоханы. Але сёння на світанні ў Баравую і рыбгас «Белае» прыехала каля 150 немцаў.

— Рыбгас падпалілі, я ўцякла ў чым стаю разам з выхаванцамі Мішам і Пецем...

Так Г. В. Багінская з сувязной стала байцом атрада.

... Атрад рос, ускладняліся яго задачы, і Корж прымаў меры для больш глыбокай разведкі, здабычы зброі, папаўнення байцамі. З групай 15 чалавек Васіль Захаравіч пайшоў да граніц Старобінскага раёна. На шляху яны пабывалі ў вёсках Калінаўка, Загорбашша, Дзедаўка.

У Браніславе гутарылі з сялянамі. Партызан уважліва слухалі, паведамілі, што некалькі вяскоўцаў падаліся ў паліцаі. Аб гэтым жыхары гаварылі з абурэннем, прапанавалі дапамогу партызанам.

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Атрад начаваў у сасновым бары на заходнім баку ракі Случ. Кастроў не разводзілі. Параіўшыся, вырашылі зрабіць засаду на дарозе, якая звязвала Ленін з Мікашэвічамі.

Партызаны схаваліся за дрэвамі на ўзбочыне. Хутка на дарозе з'явіўся матацыкліст. Яго знішчыў аўтаматнай чаргой афіцэр, які некалькі дзён назад прыйшоў у партызанскі атрад з акружэння. Забіты аказаўся начальнікам мікашэвіцкай паліцыі, ён спяшаўся ў Ленін з дакладной аб партызанах. Сярод папер была лістоўка, якую яны ўчора пакінулі ў Браніславе. Васіль Захаравіч зрабіў суровую вымову капітану — трэба было ўзяць начальніка паліцыі жывым. У такой справе заўсёды трэба вытрымка...

На наступны дзень, раніцай, з Цімашэвіч прыбыла група Чуклая. Іван расказаў, што ўжо некалькі разоў у гэтай вёсцы немцы спрабавалі стварыць паліцыю, але ў яе ніхто не пайшоў. Людзі запалоханы бандай, якая лютавала ў Старобінскім раёне. Нядаўна бандыты праязджалі праз вёску. Затрымалі двух чырвонаармейцаў, якія прабіраліся на ўсход, і тут жа расстралялі іх.

— Сустрэлі нас, як родных. І пакармілі, і на дарогу далі. Гавораць: «Ну, калі прыйшлі партызаны, значыць, саветы хутка будуць»,— дакладваў Чуклай.

Вярнулася і група з вёскі Беразнякі. Там немцы былі толькі адзін раз. Прызначылі старасту. Але той баіцца партызан і жыве ў райцэнтры.

Корж з нецярплівасцю чакаў Карасёва. Прайшоў дзень, а яго ўсё не было. Трывожным быў яго сон у тую ноч. Ён драмаў каля агню, калі пачуў:

— Васіль Захаравіч! Гэта я, Карасёў... Ранены.

Падняў галаву — перад ім ледзь стаіць на нагах Карасёў. Левы рукаў увесь у крыві...

Да цемры прыйшлі ў вёску Мілевічы і спыніліся ў ваколіцы. Дарогу перагароджвала рэчка Случ. Пасля нядаўніх дажджоў вада паднялася высока, пра пераправу ўброд няма чаго было і думаць. Патрэбна была лодка. З некалькімі партызанамі Корж зайшоў у крайні дом, які стаяў каля самай ракі.

Гаспадыня сустрэла іх не вельмі ласкава. На просьбу дапамагчы адказала са злосцю:

— Нікуды ён не пойдзе і ніякай лодкі ў яго няма,— відаць было па ўсяму, што і за гаспадара, і за сябе рашае яна сама.

Але гаспадар пайшоў насуперак:

— Пойдзем, таварышы-грамадзяне, ці паны, ужо і не ведаю, як да вас звяртацца...

Выйшаў у двор, у хляву ўзяў два вяслы, падняў іх на плячо і пакрочыў да ракі.

Вопытны рачнік хутка пераправіў усіх на другі бераг. Нават вяслом не пляснуў ні разу па вадзе.

— Шчасліва вам, таварышы,— сказаў селянін на развітанне і працягнуў Васілю Захаравічу вялікую загрубелую далонь.

Раніцай зайшлі ў вёску Юркевічы. Затрымалі двух толькі што прызначаных стараст. Яны вярталіся з райцэнтра, дзе атрымалі вінтоўкі. Старасты і не думалі супраціўляцца. Аддалі партызанам вінтоўкі і запэўнілі, што нічога дрэннага ніколі не зробяць людзям.

На прывал спыніліся на беразе возера Белае. Жоўты месяц плыў над вадой. Цішыню парушалі ціхія ўсплескі рыбы. Яе ў возеры было многа.

«Навошта аддаваць рыбу немцам»,— вырашылі рабочыя рыбгаса і выпусцілі карпа з прудоў у Белае.

Ужо віднелася, калі вярнуліся ў лагер.

Камандзір выклікаў да сябе Івана Некрашэвіча.

— Забірайце ў атрад сваіх братоў і сястру. Будзе трыма байцамі

больш — інакш іх расстраляюць немцы...

Ноччу папаўненне разам з Чуклаем і Іванам Некрашэвічам прыбыло ў атрад. Вясёлае гэта было шэсце. Наперадзе — малодшы, Міша, вёў на вяроўках двух авечак. Яму дапамагала Вера. Грыша нёс цяжкі вузел з вопраткай, посудам. А абое Іваны згіналіся пад цяжарам мяшкоў з крупой і мукой. Пастроіў іх Іван Некрашэвіч і далажыў:

— Таварыш камандзір, аддзяленне Некрашэвічаў прыбыло для праходжання партызанскай службы.

Корж падыйшоў да траіх ладных хлопцаў, якія стаялі навыцяжку, і да іх стройнай сястрычкі з такімі ж жывымі, як у братоў, вачыма. Кожнаму паціснуў руку, асабліва малодшаму, Мішу. У аддзяленні Некрашэвічаў ён быў самым «старым» партызанам атрада.

— У вас ёсць яшчэ адзін брат?

— Сяргей, таварыш камандзір,— адказала Вера.— Калі ён жывы, абавязкова будзе з намі.

Вера не памылілася. Вясной 1942 г. Сяргей сапраўды прыйшоў у атрад. Яго вопыт чыгуначніка потым вельмі спатрэбіўся партызанам.

Шлях атрада ляжаў на Старобіншчыну. Па яго граніцы з Жыткавіцкім раёнам знаходзілася вялікае балота, якое цягнулася да ракі Случ. Праз балоты праходзіць глыбокая канава, якая ідзе на поўнач да вёскі Даманавічы і далей.

13 верасня атрад на лодках адплыў па гэтаму каналу ў Старобінскі раён.

К. С. Корж.

З кнігі «Вся жизнь — Отчизне».

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ПІНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА ЛКСМБ Э. Б. НОРДМАНА САКРАТАРУ ЦК ЛКСМБ М. В. ЗІМЯНІНУ АБ РАБОЦЕ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ВОБЛАСЦІ З ЛІПЕНЯ 1941 г. ПА 20 КРАСАВІКА 1943 г.

26 красавіка 1943 г.

...Вядомы імёны бясстрашных камандзіраў-камсамольцаў. Некрашэвіч Іван Аляксеевіч — 1915 г. нараджэння, беларус, камандзір 1-й роты. Пад яго кіраўніцтвам пушчана пад адхон тры варожых эшалоны, адзін браняпоезд, знішчана некалькі валасных управаў. Дзесяткі разоў падраздзяленне тав. Некрашэвіча ўдзельнічала ў баях з ворагамі і заўсёды выходзіла пераможцам. Імя тав. Некрашэвіча наводзіць страх на немцаў і іх памагатых. Тав. Некрашэвіч да вайны працаваў бухгалтарам сельпо ў Жыткавіцкім раёне, член РК ЛКСМБ, у атрадзе з пачатку яго існавання.

НАРБ, ф. 63, оп. 16, с. 13, л. 2—7.

Дзяўчына з легенды

Яшчэ не пачыналася першая сусветная вайна, калі Піліп Шубянок у пошуках лепшай долі трапіў у Амерыку. Асаблівага шчасця там не знайшоў — тое ж бяспраўе беднага, а таму несправядлівасць, пагарда... Усё гэта і прывяло яго ў рады камуністычнай партыі ЗША. Адно радавала, што сустрэў на чужбіне добрую дзяўчыну, жаніўся,

Э. П. Шубянок

стварыў сям'ю. Там, у Амерыцы, і нарадзілася ў 1916 г. Энна Шубянок.

Вестка аб Кастрычніцкай рэвалюцыі даляцела за акіян. Заставацца ў такі трывожны і радасны час, калі, здавалася, там, на радзіме, збываецца спрадвечная мара працоўнага люду, Піліп Шубянок не мог. І вось ён з сям'ёй вяртаецца ў Савецкую Расію. Становіцца членам РКП(б). У Брагінскім раёне «амерыканец» арганізаваў у былым памешчыцкім маёнтку Касачова першую ў раёне камуну. Затым працаваў старшынёй калгаса «Новы свет» у вёсцы Міхнавічы.

Энна вучылася ў вясковай пачатковай школе, затым — у Брагінскай сярэдняй. У 1932 г. уступіла ў камсамол. У тыя гады моладзь, усе дзяўчаты нашай краіны захапляліся подзвігам Пашы Ангелінай, і, мусіць, пад яе ўплывам Энна паступіла на курсы трактарыстаў пры Брагінскай МТС. Хутка яна села за руль трактара ў калгасе «Новы свет».

Энергічную і ўдумлівую камсамолку накіравалі на камсамольскую работу. На абласной камсамольскай канферэнцыі Энну выбіраюць дэлегатам XIV з'езда камсамола Беларусі. Яна стала кандыдатам у члены ЦК ЛКСМБ.

Вялікай павагай і аўтарытэтам, дзякуючы свайму энтузіязму, веры ў будучыню карысталася Энна Шубянок у моладзі Тураўшчыны, куды яна была накіравана ў красавіку 1939 г. Яе намаганні былі накіраваны на тое, каб зацікавіць хлопцаў і дзяўчат, згуртаваць іх, направіць на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве. Гэта ўдавалася Энне Піліпаўне, моладзь заўсёды гуртавалася вакол яе, з ёю было цікава, весела... Жыццё здавалася святам, на чыстым небе — ні хмурынкі...

Тым больш нечакана для савецкіх людзей грымнула вайна. Па рашэнню ЦК ЛКСМБ сакратаром Тураўскага падпольнага райкома камсамола была прызначана Э. П. Шубянок. Яна ўдзельнічала ў першых баях і дыверсіях створанага ў ліпені 1941 г. партызанскага атрада, які ўзначальваў начальнік райаддзела міліцыі М. І. Голікаў. Энна Піліпаўна прыняла актыўны ўдзел у ліквідацыі Тураўскай нафтабазы, хадзіла ў разведку ў Тураў... Гарэлі вёскі, фашысты ўстанаўлівалі свой «новы парадак», які адметны быў расстрэламі, рабаваннем... У вёсцы Пагост звыш 50 чалавек сагналі да ракі і расстралялі з кулямёта. Тым больш радаснай была вестка аб тым, што ў ноч з 2 на 3 жніўня ў Тураў увайшло падраздзяленне Чырвонай Арміі, якім камандаваў капітан Даніленка. Да 23 жніўня ў Тураве была савецкая ўлада, але навокал не спыняліся баі, вораг не мог змірыцца з тым, што ў яго тыле заставалася яшчэ адна Брэсцкая крэпасць... У памяшканні райкома камсамола Э. П. Шубянок сабрала моладзь гарадскога пасёлка. Яна прызвала кожнага змагацца з праклятым ворагам, усяляла ўпэўненасць у перамогу. Членам райкома, камсамольцам-актывістам было дадзена канкрэтнае заданне. Сфарміравана камсамольскае падполле.

У Тураў дайшла газета «Праўда» за 6 жніўня, дзе быў надрукаваны Указ Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні партызан ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Там былі прозвішчы Ц. П. Бумажкова і Ф. І. Паўлоўскага, а дзесяты радок — Э. П. Шубянок, першая жанчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якая была ўзнагароджана медалём «За адвагу».

Актыўна ўдзельнічала Э. П. Шубянок у абароне Турава, перавязвала параненых. Але сілы былі няроўныя, чырвонаармейцы і парты-

заны вымушаны былі адступіць за Сцвігу. Над Тураўшчынай павісла амаль трохгадовая ноч акупацыі...

Няўдачным быў баявы шлях першага ў Тураўскім раёне партызанскага атрада. У канцы верасня скончыліся запасы прадуктаў і боепрыпасаў, камандаванне прыняло рашэнне прабівацца праз лінію фронту да сваіх. У час знаходжання партызан у лесе каля вёскі Пільшчак Ельскага раёна яны былі абкружаны гітлераўцамі, шмат людзей загінула і прапала без весткі. Але Энна Шубянок засталася жывой. Яна накіравалася ў Брагін, звязалася там з падполлем, выконвала партыйныя даручэнні. Адно такое заданне было ў Рэчыцы. Нечаканая сустрэча з паліцаем, які добра ведаў Энну Піліпаўну як актывістку-камсамолку, вучыўся з ёю ў школе, і цяпер хацеў выслужыцца перад немцамі, аказалася для камсамолкі трагічнай. Мужная патрыётка загінула.

...Перад памяццю такіх людзей, як Энна Шубянок і тысячы іншых, многія з якіх засталіся невядомымі, трэба нізка схіліць галаву. У самыя змрочныя часы акупацыі, калі не было, здавалася, ніякага праблеску пад свінцова-чорнымі фашысцкімі хмарамі, яны свята верылі ў перамогу, без ваганняў ішлі, калі патрабавалася, на смерць — але не скарыліся ворагу. Гэта аб іх гранітную цвёрдасць і непахісную смеласць і мужнасць разбілася жалезная машына гітлераўскага вермахта. Яны злажылі свае галовы, каб мы сустракалі штогод гаманлівую вясну, радаваліся сонцу, прадаўжалі жыццё — каб мы жылі...

В. Р. Феранц

ПІСЬМО ЦК ЛКСМБ І ЦК КП(б)Б З ПРАПАНОВАЙ ПРАДСТАВІЦЬ ДА ЎЗНАГАРОДЫ КАМСАМОЛЬЦАЎ, ЯКІЯ ПРАЯВІЛІ СЯБЕ Ў БАРАЦЬБЕ З АКУПАНТАМІ

гор. Гомель 26 ліпеня 1941 г.

ЦК ЛКСМБ просіць прадставіць да ўзнагароды наступных членаў ЛКСМБ, якія праявілі доблесць у вайне з фашысцкай Германіяй:

1. Шубянок Энну Піліпаўну — сакратара Тураўскага райкома ЛКСМБ, кандыдата [ў члены] КП(б)Б. Кіруючы камсамольскай арганізацыяй раёна, тав. Шубянок Э. П. у пачатку вайны адначасова працавала начальнікам шпіталя. Цяпер удзельнічае ў баявых дзеяннях Тураўскага партызанскага атрада, з'яўляецца сакратаром яго камсамольскай арганізацыі, асабіста выканала шэраг адказных заданняў камандавання па разведцы і дыверсійных актах у тыле праціўніка...

Сакратар ЦК ЛКСМБ *М. Зімянін*

Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 81.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ ЧЛЕНА ПАРТТРОЙКІ ПІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б А. Я. КЛЯШЧОВА Ў ЦК КП(б)Б АБ АРГАНІЗАЦЫІ І ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ ВОБЛАСЦІ З 22 ЧЭРВЕНЯ ПА 4 КАСТРЫЧНІКА 1941 г.

5 студзеня 1942 г.

...Да канца верасня месяца запасы харчовай базы Столінскага атрада з Тураўскім падыходзілі да канца, і было прынята рашэнне ісці на выхад да фронту... Удзень 30 верасня атрад не рухаўся, а да вечара размясціўся ў лесе, непадалёку ад в. Пільшчык Ельскага раёна. Начальнікам атрада была выдзелена разведка ў складзе 2 чал. (т. т. Нікіціна і Канаваленка), якія вярнуліся і далажылі, што ў в. Пільшчык немцаў няма. Аднак праз 15—20 мін. пасля дакладу разведкі наш атрад быў абкружаны з 4 бакоў немцамі з кулямётамі, аўтаматамі і вінтоўкамі.

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Не выйшлі з акружэння (невядома, дзе дзеліся, забіты ці ўзяты у палон) сакратар Пінскага абкома КП(б)Б тав. Шапавалаў П. Г.. старшыня Столінскага выканкома райсавета, ён і начальнік атрада, тав. Масленікаў І. Л., сакратар Тураўскага РК ЛКСМБ тав. Шубянок Э. П., 17 чал. партызан...

Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 129—130

Ля вытокаў партызанскага руху

Харужая Вера Захараўна (н. 14.9. 1903 г.) — актыўная ўдзельніца рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. У партызанскім атрадзе В. З. Каржа, першым на тэрыторыі Беларусі, знаходзілася з моманту яго арганізацыі. Разам з атрадам была на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, дзе з В. З. Каржом арганізоўвала атрад, які ў хуткім часе вырас у магутную сілу, вядомае Пінскае партызанскае злучэнне. У жніўні 1941 г. адправілася праз лінію фронту ў Маскву, дзе працавала ў апараце ЦК КП(б)Б. У верасні 1942 г. была накіравана ў варожы тыл, стварыла і ўзначальвала групу ў Віцебскім камуністычным падполлі.

Арыштавана 13 лістапада 1942 г. і закатавана фашыстамі.

З ДАНЯСЕННЯ ПАРТЫЗАНКІ В. З. ХАРУЖАЙ У ЦК КП(б)Б АБ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА В. З. КАРЖА ПІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ПЕРШЫЯ ДНІ ВАЙНЫ

6 жніўня 1941 г.

...На працягу месяца з часу заняцця гор. Пінска немцамі партызанскі атрад тав. Каржа дзейнічаў на тэрыторыі Ленінскага і Жыткавіцкага раёнаў. Да заняцця Жыткавіч немцамі атрад быў звязаны з воінскімі часцямі і дапамагаў ім у разведвальнай рабоце. Пасля адходу Чырвонай Арміі з Жыткавіч атрад застаўся на сваім месцы, ён ужо не мае сувязі з рэгулярнымі часцямі. Атрад цесна звязаны з мясцовым насельніцтвам, вядзе па меры магчымасці растлумачальную работу і карыстаецца вялікай падтрымкай вясковага актыву. З'яўленне партызан у вёсцы, у мясцовасцях, занятых немцамі, вызывае вялікае натхненне ў сялян. Калгаснікі вельмі ахвотна забяспечваюць партызан прадуктамі, інфармуюць аб бягучых падзеях, аб руху і дзеяннях немцаў, паказваюць дарогу, папярэджваюць аб пагрозе...

Атрад за месяц свайго існавання... два разы — да і ў час адступлення (Чырвонай Арміі) з пас. Ленін — уступіў у непасрэдную баявую сутычку з ворагам. Першы раз аперацыя закончылася няўдала. Група, якая мела заданне знішчыць нямецкую разведку, з-за неасцярожнасці сутыкнулася з гэтай разведкай несвоечасова і зусім нечакана для сябе. Немцы захапілі правадніка групы — мясцовага камсамольца, які ішоў наперадзе, і такім чынам група не змагла выканаць баявое заданне. Па звестках, атрыманых атрадам потым, ён змог вярнуцца з палону, прыйшоў у сваю вёску.

Другая аперацыя аказалася больш удалай. Партызаны напалі на перадавую калону веласіпедыстаў, ішоўшых наперадзе вялікіх сіл нямецкай арміі, якія рухаліся з Леніна ў Жыткавічы, абстралялі яе, забілі афіцэра і некалькі салдат, вызвалі вялікі перапалох у калоне, прымусілі яе павярнуць назад і на цэлыя суткі затрымалі рух нямецкіх войск на гэтай дарозе...

У сучасны момант атрад тав. Каржа складаецца з 16 адданых, смелых і баяздольных таварышаў, якія гатовы весці барацьбу з ворагам да яго знішчэння, і ўяўляе сабой моцную і баяздольную адзінку.

...Камандзір атрада Корж, які мае багаты вопыт партызанскай барацьбы, і палітрук атрада Палажэнцаў пад уплывам звестак, атрыманых па радыё (атрад у апошні час раздабыў звесткі аб разрастанні партызанскага руху), значна змянілі свой ранейшы пункт гледжання і цяпер намераны, не чакаючы адступлення, весці пастаянную актыўную барацьбу супраць ворага.

...Партызанскі атрад тав. Каржа просіць даставіць яму наступнае: 1) аўтаматычных вінтовак — 10 шт. і да іх дыскаў — 20 шт.; 2) электрадэтанатараў — 50 шт. і да іх батарэек — 100 шт.; 3) меднага дроту; 4) толу; 5) маленькую партатыўную радыёўстаноўку; 6) цёплых ватных куфаек; 7) цёплай бялізны; 8) цукру...

В. Харужая

Усенародны партызанскі рух у Беларусі... Т. 1, с. 92—94.

ИЗ СООБЩЕНИЙ ФАШИСТСКОЙ ПОЛИЦИИ БЕЗОПАСНОСТИ И СД НА ОККУПИРОВАННОЙ ТЕРРИТОРИИ СССР О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПАРТИЗАН В БЕЛОРУССИИ

Из сообщения № 25 6 июня 1942 г.

С осени 1941 г. в Мозырском округе начали действовать 3 партизанские группы.

Первая из них, наиболее многочисленная и боеспособная, в середине мая 1942 г. располагалась севернее и северо-восточнее Житковичского района... В апреле месяце 1942 г. партизаны этой группы сожгли лесопильный завод в дер. Постолы. Партизаны контролируют лесной массив площадью в 13 тыс. га. Эта группа медленно, но уверенно расширяла свои действия на юг от Постолы и к середине мая 1942 г. расположилась в районе Князь-Озера. Этот район еще более недоступный... Так что 12 тыс. га леса Бечинского лесничества стали недоступны для немцев.

Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 373.

ИЗ ДНЕВНИКА ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА ПЕТРОВИЧА* ПИНСКОЙ ОБЛ. О БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОТРЯДА С 22 ИЮНЯ ПО 8 НОЯБРЯ 1942 г.

...12 сентября 1942 г. соединенными силами 3 отрядов (отряд Петровича, отряд им. Шиша, отряд Комарова) разбит гарнизон противника районного мест. Ленин. Вся подготовка к операции в отношении разведки проведена командованием [партизанского отряда] Петровича. Ответственный за операцию зам. командира п[артизанского] о[тряда] им. Шиша Паталах. От п[артизанского] о[тряда] Петровича командовали группами: 1) Воронов, 2) Одынец П., 3) Монаков, 4) Шуляк, 5) Кубасов. Всего в бою участвовало 150 партизан, из них 50 чел. из п[артизанского] о[тряда] Петровича...

В бою погиб партизан Феденков Михаил, тяжело ранены ком[андир] взвода Одынец П. и боец Ермаков Алексей.

НАРБ, ф. 4119, оп. 1, д. 3, л. 25.

КАНФІДЭНЦЫЯЛЬНА

Імперскае ўпраўленне шляхоў зносін, Мінск
У Галоўнае ўпраўленне шляхоў зносін Усходу ў Варшаве
Данясенне аб надзвычайных здарэннях за 18—19 верасня 1943 г.

12 гадз. 03 мін. Лунінец — Калінкавічы (535,8 км). Поезд наскочыў на міну. Разбіты паравоз і 2 вагоны. Усяго быў 171 узрыў пуці, 24 міны знойдзены аховай.
13 гадз. 45 мін Старушкі — Сінкевічы (583,9 км). Узарвана міна.
20 гадз. 25 мін. Мікашэвічы — Дзедаўка (526,1 км). Было 6 узрываў пуці.

Партызанскія напады выклікалі поўнае спыненне руху Лунінец — Калінкавічы на 18 гадзін...

З кнігі «Партызанская барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

ИЗ ОТЧЕТА КОМАНДОВАНИЯ ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА А. И. ДАЛИДОВИЧА ШТАБУ СОЕДИНЕНИЯ ПАРТИЗАНСКИХ ОТРЯДОВ МИНСКОЙ И ПОЛЕССКОЙ ОБЛАСТЕЙ О БОЕВЫХ ДЕЙСТВИЯХ ОТРЯДА С 7 ИЮЛЯ 1941 г. ПО 3 НОЯБРЯ 1942 г.

Не ранее 1 января 1943 г.

...С 1 марта 1942 г. по 20 марта 1942 г. отряд участвовал в походе в Западную Белоруссию, в Житковичский район... Наш отряд принимал участие в бою в дер. Дяковичи с полицейскими.

* Подпольная кличка *А. П. Савицкого.*

1 апреля 1942 г. отряд совместно с другими отрядами участвовал в операции по разгрому [гарнизона в дер.] Постолы, где был полицейский участок. Убито полицейских 12 чел., ранено 8 чел. Нашим отрядом захвачен 1 станковый пулемет, 5 винтовок и патроны.

Командир отряда *Далидович*
Комиссар отряда *Боровик*
Нач. штаба *Лескин*

Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 501.

ПРАТАКОЛ № 1
ПАСЯДЖЭННЯ ЛЕНІНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б ПІНСКАЙ ВОБЛ. АБ УСТАНАЎЛЕННІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ВЫЗВАЛЕНЫХ ПАРТЫЗАНАМІ СЕЛЬСАВЕТАХ, АРГАНІЗАЦЫІ БАЯВЫХ ГРУП З НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ РАЁНА І АБ ПЛАНЕ РАБОТЫ РАЙКОМА НА СНЕЖАНЬ 1942 г.

17 снежня 1942 г.

На пасяджэнні прысутнічалі: Дамброўскі, Ягораў, Ігнаценка.

1. Слухалі: Тав. Дамброўскага аб устанаўленні Савецкай улады ў сельсаветах раёна, вызваленых* партызанамі, і арганізацыі іх работы.

Пастанавілі: На ўсёй тэрыторыі Ленінскага раёна ў сельсаветах, вызваленых ад нямецкіх акупантаў, устанавіць Савецкую ўладу і ўзнавіць работу сельсаветаў, для чаго правесці сесіі дэпутатаў сельскіх саветаў з парадкам дня: узнаўленне Савецкай улады на вёсцы і задачы сельскіх саветаў.

2. Слухалі: Арганізацыя баявых груп ў населеных пунктах (дакладвае Ягораў).

Пастанавілі: Арганізаваць у кожным населеным пункце баявыя групы як рэзерв партызанскіх атрадаў. Усю работу па арганізацыі баявых груп ускласці на камандзіраў, ваенкомаў і парторгаў (атрадаў), якія знаходзяцца на тэрыторыі Ленінскага раёна.

3. Слухалі: Інфармацыю тав. Дамброўскага аб зацверджанні плана работы РК КП(б)Б на снежань 1942 г.

Пастанавілі: Зацвердзіць план работы райкома на перыяд з 15 па 31 снежня 1942 г.

Сакратар Ленінскага РК КП(б)Б *А. Дамброўскі.*
Усенародны партызанскі рух... Т. 2, с. 56.

ИЗ ОТЧЕТА ПИНСКОГО ПОДПОЛЬНОГО ОБКОМА КП(б)Б СЕКРЕТАРЮ ЦК КП(б)Б Л. К. ПОНОМАРЕНКО О БОЕВОЙ МАССОВО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ РАБОТЕ, РОСТЕ ПАРТИЗАНСКИХ ОТРЯДОВ И РЕЗЕРВНЫХ ГРУПП С 25 ЯНВАРЯ ПО 1 АПРЕЛЯ 1943 г.

1 апреля 1943 г.

...24 марта с. г. группой партизан отряда Васильева между ст. Житковичи и Микашевичи пущен под откос воинский эшелон, шедший с запада на восток с военными грузами (крытые вагоны). В результате крушения разбит паровоз и 39 вагонов. Движение приостановлено на 2 суток. Наши потери в этих боях составляют убитыми 30 чел. и ранеными 9 чел. В этом числе пропал без вести секретарь Ленинского подпольного РК КП(б)Б Домбровский Антон Иосифович...

Немецкими извергами за это время сожжено в Ленинском районе 30 населенных пунктов, в Житковичском — 9...

Секретарь комсомольской организации дер. Гричиновичи Ленинского района 19-летняя Чопчиц Наталья Владимировна вместе со своим отцом и матерью, невооруженные, попав в окружение к немцам, бросились на гитлеровца-автоматчика и задавили его. Подбежавшие другие гитлеровцы убили Наташу, ее отца и мать.

...22 марта, в результате проводимой работы по разложению гарнизона гор. Слуцка, немцами обезоружен и отправлен на Ломжу «добровольческий» отряд Родионова. В этот же день один из «добровольцев», будучи пьяным, на улице стал кричать: «Ленинский район

* У дакументе «акупіраваных».

жил, живет и будет жить с партизанами». Подбежавший к нему другой «доброволец» заявил: «Так ты выступаешь против Гитлера?».

Тогда первый бросил в него гранату, убил предателя и бросился бежать, но был настигнут гитлеровцами...

Пинский подпольный обком КП(б)Б — *А. Клещов*
В. Корж

Всенародное партизанское движение... Т. 1, с. 241.

ИЗ ИСТОРИИ ТУРОВСКОГО ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА «ЗА РОДИНУ» ПОЛЕССКОЙ ОБЛ. И РАЗГРОМА ПОЛИЦЕЙСКОГО УЧАСТКА В ДЕР. СЛЕПЦЫ 25 МАЯ 1943 г.

Не позднее 16 февраля 1944 г.

...В дер. Слепцы располагался полицейский участок в составе 18 полицейских. Отряд к этому времени ограничил действие туровского гарнизона [противника] тем, что немцы и полиция более чем на 8 км не выезжали от гарнизона, а поэтому было решено начать нападение внезапно на противника там, где он расположил свои силы. В ночь на 25 мая, после получения данных разведки, отряд выступил для нападения на полицейский участок дер. Слепцы. Операция совершилась удачно. Полицейский участок был разогнан. Было убито 3 полицейских и взято 3 трофейные винтовки.

Командир партизанского отряда «За Родину» — *Прасолов*
Комиссар партизанского отряда «За Родину» — *Тарасюк*
Нач. штаба — *Двораковский*

Всенародное партизанское движение... Т. 2, с. 354.

ИЗ ИСТОРИИ ТУРОВСКОГО ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА «ЗА РОДИНУ» ПОЛЕССКОЙ ОБЛАСТИ...

Не ранее 16 февраля 1944 г.

...Перед партизанским отрядом [за] весь период его деятельности стояла задача: не допускать никакого движения и работ по судоходной р. Припять. Эту задачу отряд с честью выполнил. Не только не было сплава леса по реке, но ни один, даже бронированный, катер не мог пройти ни вверх, ни вниз по течению. 10 мая немцы решили 2 катерами прорваться из Турова в гор. Мозырь. Об этом узнал партизанский отряд. Подобрав удобное место для обстрела в с. Переров, встретили эти катера ружейно-пулеметным огнем. Один катер вышел из строя, второй, бронированный, взявший его на буксир, увел в обратном направлении. На катере было убито 8 фрицев. Для защиты тыла засады был выброшен 1 взвод на дорогу Туров — Переров.

Командир партизанского отряда «За Родину» — *Прасолов*
Комиссар партизанского отряда «За Родину» — *Тарасюк*
Нач. штаба — *Двораковский*

Всенародное партизанское движение... Т. 2, с. 553—554.

ИЗ ИСТОРИИ ПИНСКОГО ПАРТИЗАНСКОГО СОЕДИНЕНИЯ ОБ ОРГАНИЗАЦИИ И БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПАРТИЗАНСКИХ ОТРЯДОВ ПИНСКОЙ ОБЛ. С ФЕВРАЛЯ ПО 9 НОЯБРЯ 1942 г.

25 сентября 1944 г.

...Организация отряда Домбровского

Основной костяк отряда состоял из 2 групп (Домбровского и Игнатенко), направленных ЦК КП(б)Б в БССР для организации партизанских отрядов и перешедших через линию фронта в октябре 1942 г. Эти группы тт. Коржом и Клещевым были остановлены в Ленинском

Група партызан атрада Б. Дамброўскага. У цэнтры — камандзір атрада

районе, из них создан партизанский отряд Домбровского (командир отряда Домбровский, комиссар Игнатенко).

Таким образом, в ноябре 1942 г. в Пинское соединение вошло 7 партизанских отрядов — Комарова, им. Кирова, Васильева, им. Шиша, им. Щорса, им. Чапаева, Домбровского — с общим количеством свыше 2 тыс. вооруженных партизан.

Разгром гарнизона противника [в] мест. Ленин

Первой серьезной операцией, проведенной соединением отрядов, был разгром гарнизона [в] мест. Ленин 12 сентября 1942 г.

Гарнизон противника в мест. Ленин состоял из 16 жандармов и 40 полицейских... Райцентр Ленин расположен в стороне от железной дороги и других гарнизонов противника. В мест. Ленин находился единственный в Ленинском районе немецкий гарнизон и участок полиции. В течение 1941 г. и начале 1942 г. немцы и полиция мест. Ленин активно действовали по вылавливанию бежавших из плена и продвигавшихся на восток глухими местами болот Гричина бойцов и командиров Красной Армии. В местечке и окружающих хуторах у полиции и жандармерии имелась агентура, которая способствовала вылавливанию бежавших военнопленных. Более тысячи советских граждан было расстреляно фашистскими палачами в мест. Ленин. Своей активной деятельностью и агентурой гарнизон в мест. Ленин, расположенный вблизи к местам дислокации партизанских отрядов, серьезно препятствовал отрядам в распространении влияния на окружающее население. В тюрьме мест. Ленин находилось свыше 50 арестованных советских активистов...

Ко дню нападения (в ночь с 11 на 12 сентября 1942 г.) установлено, что: а) немецкая ортскомендатура занимает 3 здания: в одном размещен офицерский состав (4 офицера), в 2 других — казарма солдат (12 чел.). Здания расположены рядом, одно из них каменное. Полицейский участок (40 полицейских) расположен в одном из деревянных зданий в соседстве с ортскомендатурой. Здание райуправы ежесуточно охранялось 4 полицейскими. Часть полицейских ночевала в собственных квартирах в мест. Ленин.

Охрана ночью: часовой у помещения ортскомендатуры, часовой у помещения полицейского участка и часовой у здания райуправы. Через каждые 2 часа по улицам местечка проходит патруль — 2 солдата с собакой. Маршрут патруля установлен. Раз в 7 дней для ортскомендатуры из Житкович приходили 2 автомашины с продуктами и охраной (8—9 немцев). Вооружение гарнизона: 6 пулеметов, несколько автоматов, остальные — винтовки. Укрепления и окопов нет.

Нападение на гарнизон осуществлялось отрядом Петровича, отрядом Комарова и отрядом им. Шиша. Всего для нападения на гарнизон направлено 150 партизан с вооружением:

9 ручных пулеметов, 7 автоматов, остальные — винтовки. Ответственный за операцию — зам. командира партизанского отряда им. Шиша тов. Паталах.

Для нападения на объекты выделено 5 групп (2 казармы, помещение офицеров, полицейский участок и райуправа). 3 группы должны были расположиться на вероятных отходах противника, 2 группы направлены на засады на грунтовых дорогах Синкевичи — Ленин и Микашевичи — Ленин с целью не допустить подхода подкреплений противника. Все группы обеспечены проводниками по объектам.

Начало операции — 1.00 12 сентября 1942 г. Сигнал — красная ракета. Подход к мест. Ленин из лагеря партизанского отряда Петровича ночью лесом в 20.00 11 сентября 1942 г. Каждый командир группы проинструктирован о целях и задачах группы. Сигнал отхода — зеленая ракета.

В 6 час. 55 мин 12 сентября 1942 г. начался бой на участке ортскомендатуры, где часовой обнаружил залегшую цепь партизан. Часовой быстро был снят и после 10-минутного боя организованное сопротивление оказывали только немцы в кирпичной казарме. Из остальных помещений часть немцев выбежала на улицу и отстреливалась. В каменное здание было брошено 8 гранат, здание загорелось, и ни один немец оттуда выпущен не был. В уличном бою выбежавшие немцы из других зданий были перебиты, часть пытавшихся бежать и укрыться в огородах была перебита группами, расположенными на (путях) вероятных отходов немцев.

К 7.45 12 сентября 1942 г. в основном бой был закончен, велась редкая перестрелка с разбежавшейся полицией. К 10.10 12 сентября 1942 г. дан сигнал отхода. Отход был проведен в направлении на Хоростов. Когда группы при отходе достигли окраины местечка, со стороны Житкович подошло подкрепление — 8 автомашин «литовцев», с которыми произошла дальняя перестрелка (на расстоянии 1200—1300 м). Дальнейшее преследование «литовцы» прекратили. К 12.00 12 сентября 1942 г. отряд «литовцев» из мест. Ленин выбыл.

Задача по разгрому гарнизона решена полностью. Результат боя: 1) районные немецкие власти изгнаны из мест. Ленин; 2) уничтожено 3 здания военного значения; 3) из тюрьмы выпущены арестованные советские активисты — 48 чел.; 4) убито немцев — 14, полицейских — 3, ранено — 2 немца, остальные полицейские сбежали в Микашевичи; 5) райцентр Ленин освобожден от немцев и полиции. Подобраны трофеи: 1 станковый пулемет, 18 винтовок, взяты из имения свиньи, коровы, а также масло. Остальные продукты розданы населению.

В результате разгрома мест. Ленин весь Ленинский район был освобожден от гарнизонов противника и немецких властей и явился основной базой дислокации и роста партизанских отрядов. Партизаны прошли серьезную проверку в бою с гарнизоном и практику взаимодействия нескольких групп, ведших бои на разных участках...

Командир партизанского соединения Пинской обл.
Герой Советского Союза генерал-майор *Корж*
Нач. штаба соединения *Федотов*

Всенародное партизанское движение... Т. 2, с. 640—644.

Я была ў гета...

З успамінаў былой партызанкі
Л. Л. Менкінай

...Ужо каторы месяц мы пакутавалі ў гета. Праўда, маё становішча было крыху лепшым: гітлераўцы набралі брыгаду швачак з насельніцтва засценка, каб тыя шылі і рамантавалі для іх адзенне, мяне прызначылі старшай, як бы інструктарам шавецкай справы — да вайны я закончыла індустрыяльны тэхнікум. З вокнаў майстэрні мы бачылі, як ворагі адпраўлялі людзей на расстрэл, чулі іх перадсмяротныя крыкі і плач, потым да нас прывозілі і скідалі бярэмкі вопраткі, якая яшчэ захоўвала цеплыню цел толькі што забітых людзей... І ўсе ведалі, што такі ўдзел можа быць кожны дзень і ў нас, швачак. Бачылі мы і здрадніцтва, і агідную чалавечую сквапнасць, і сапраўдныя патрыятычныя ўчынкі...

Калі вылюдкі забілі бацькоў 9-гадовай Раі Клігер, дзяўчынку ўдалося выхапіць з самых рук катаў, яе хавалі жанчыны пасёлка як самае дарагое, хоць ведалі, чым рызыкуюць, калі аб гэтым даведаюцца ворагі. Потым яўрэйскае дзіця-сірату адправілі ў партызанскі атрад, а адтуль самалётам — на Вялікую зямлю.

Доўга заставацца ў Леніне было

немагчыма. Усе ў пасёлку ведалі, што я была камсамолкай, актывісткай, працавала ў райвыканкоме. І вось з дапамогай сувязных я знайшла дарогу ў партызанскі атрад імя Чапаева. Там таксама шмат шыла — для партызан, і гэта давала задавальненне, усведамленне таго, што раблю патрэбную для нашых людзей справу. Шыла з парашутнага шоўку маскхалаты, бялізну, рамантавала вопратку.

У атрадзе не было сцяга. Я ведала, дзе ў Леніне можна здабыць чырвоны матэрыял, сказала аб гэтым камандзіру. Ён даручыў мне пайсці ў Ленін і прынесці матэрыял для сцяга.

Калі наблізілася да мястэчка, людзі сказалі, што немцы толькі што выехалі ў Мікашэвічы, можна ісці смела. На Лахаўскай вуліцы сустрэла многа знаёмых, яны абдымалі мяне і плакалі. Многіх я бачыла ў апошні раз... У атрад я прынесла кавалак новага шаўковага матэрыялу. Пад гэтым сцягам партызаны здзейснілі шмат слаўных баявых спраў.

Узняліся як адзін...

У пачатку лета 1941 г. я працаваў над дыпломным праектам у лесатэхнічнай акадэміі ў Ленінградзе. Назаўсёды запомніўся спякотны летні дзень, калі пачуліся першыя, пакуль далёкія ўзрывы нямецкіх авіябомб. Не верылася, што пачалася вайна... Нас, студэнтаў, накіравалі кожнага па месцу пастаяннага жыхарства. З цяжкасцю ўдалося дастаць білет і выехаць на радзіму, у Рэчыцу, дзе я працаваў раней на дрэваапрацоўчым заводзе начальнікам вытворчага аддзела.

У Віцебску трапілі пад бамбёжку. Днямі знаходзілі прытулак у лесе, рухаліся ноччу. З цяжкасцю дабраліся дамоў. Завод працаваў з поўнай нагрузкай, выконваў ваенныя заказы, адначасова вывозілі каштоўнае абсталяванне на ўсход. Напружаная работа працягвалася да 23 жніўня, пакуль горад не акупіравалі гітлераўцы. Група актывістаў, каля ста чалавек, пайшла ў лес. Пачаліся суровыя партызанскія будні...

Першыя баявыя дзеянні былі няўдалымі, наш атрад разграмілі і рассеялі наступаючыя нямецкія часці. Частка людзей накіравалася праз лінію фронту да Чырвонай Арміі. Нас засталося ў тыле ворага не больш 10 чалавек. Старшым групы быў прызначаны Макар Турчынскі.

У лістападзе мяне накіравалі ў разведку ў Рэчыцу. Калі вярнуўся, не застаў нікога на месцы... Што здарылася, я не ведаў, але зразумела было, што адбылося нешта дрэннае. Доўга шукаў таварышаў, потым вырашыў накіравацца ў бок Жыткавіцкага раёна, на радзіму, у Людзяневічы.

З снежня 1941 г. я жыў у вёсцы як акружэнец, такіх людзей было нямала. Паступова мне ўдалося сабраць некалькі аднадумцаў, якія таксама імкнуліся змагацца з ворагам. Гэта былі Уладзімір Гарбуз, Ігнат Кузьмінскі, Іван Пархоменка, яшчэ некалькі чалавек. Яны распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі зброю, наладзілі сувязь з партызанамі і выконвалі іх заданні.

Да камандзіра партызанскай групы Гушчэні накіраваўся сувязны Іван Пархоменка. А ў лютым 1942 г. я сам пайшоў на сустрэчу з партызанскім камандзірам ля возера Белае. Атрымаў заданне стварыць падпольную групу не толькі ў Людзяневічах, але і ў Жыткавічах. Для гэтага трэба было ўладкавацца ў гарадскім пасёлку на работу. Пайшоў да бургамістра Бараноўскага. Той накіраваў мяне як інжынера на ўзнаўленне мельніцы ў Жыткавічы. Даручылі калектыў — 20 чалавек, якія такім чынам уратаваліся ад

адпраўкі ў Германію. Многія з гэтых людзей выконвалі потым мае заданні ў падпольнай групе. Вясной я ўпершыню сустрэўся з кіраўніком групы Е. Горавым. Ён трымаў сувязь праз А. Кірбай і іншых сувязных з групай «Баці». Вялікую дапамогу аказваў нам начальнік разведкі атрада Баці капітан Чырвонай Арміі Вераб'ёў. Наша падпольная група тады аб'ядналася з гораўскай, у нас была агульная мэта і адны і тыя ж задачы. Кіраўніком падполля ў Жыткавічах стаў Е. Гораў. Падпольшчыкі распаўсюджвалі газеты і лістоўкі, перадавалі ў атрад Баці звесткі аб дыслакацыі ворага, руху эшалонаў на чыгункі, атрымлівалі магнітныя міны і ўстанаўлівалі іх на цягнікі. Тры такія міны ўстанавіў я сам, яны ўзарваліся ў дарозе і нанеслі вялікі ўрон ворагу. Спалілі гарадскую ўправу, сенную і зерневую базы, дом здрадніка Германа. Амаль ва ўсіх аперацыях падпольшчыкаў удзельнічаў М. П. Корж, які па заданню камандавання працаваў у гарадской управе і праводзіў вялікую, вельмі неабходную работу для атрада Баці. Потым нам удалося прыцягнуць на свой бок сотню казакоў, якія былі раскватараваны ў Жыткавічах.

Мы рыхтаваліся да разгрому Жыткавіцкага гарнізона. Атрымалі з атрада зброю, узрыўчатку. Гораў схаваў боепрыпасы ў стог сена, але яго высачыла суседка і данесла фашыстам. Горава, а потым многіх іншых схапілі...

І. І. Гарбуз

Лангверт Аўгуст Клёўзе

З успамінаў І. Д. Вятрова, былога першага сакратара Палескага падпольнага абкома КП(б)Б, камандзіра злучэнняў партызанскіх атрадаў Палескай вобласці

Вятроў Іван Дзмітрыевіч (н. 26.9. 1905 г.) — дзяржаўны дзеяч Беларусі, арганізатар і кіраўнік партызанскага руху ў гады вайны. З жніўня 1943 г. упаўнаважаны ЦК КП(б)Б, сакратар Палескага абкома КП(б)Б, камандзір Палескага партызанскага злучэння. У пасляваенны час — пракурор БССР, затым міністр юстыцыі рэспублікі. Аўтар кнігі «Братья по оружию» (1965 г.), у якой шмат увагі ўдзяляе баявым дзеянням Палескага злучэння на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, расказвае аб інтэрнацыянальнай рабоце партызан у час вайны.

У Тураве, дзе размяшчаўся варожы гарнізон, памочнікам каменданта па гаспадарчай частцы быў оберлейтэнант Аўгуст Клёўзе. Ён добра адносіўся да насельніцтва, быў даволі спагадлівым і лічыўся «нядрэнным немцам». Родам ён быў з Судэцкай вобласці, добра валодаў чэшскай мовай, крыху гаварыў па-руску.

У ліпені 1943 г. у партызанскі атрад «За Радзіму», якім камандаваў В. І. Прасолаў, а камісарам быў сакратар падпольнага райкома партыі П. І. Тарасюк, з Турава прыйшла ўрач Н. А. Тачыліна (Іванова). Яна паведаміла некаторыя падрабязнасці пра Аўгуста Клёўзе, якія сведчылі ў яго карысць. Вырашана было паспрабаваць далучыць яго да антыфашысцкай барацьбы. Падрыхтавалі пісьмо памочніку каменданта з прапановай супрацоўніцтва. Такіх пісем было напісана нават тры: адно — самім В. І. Прасолавым, другое — Н. А. Тачылінай, якая заставалася ў атрадзе, а трэцяе напісаў на сваёй мове Юла Вранскі, чэшскі патрыёт, які даўно ваяваў у радах народных мсціўцаў. Аўгусту Клёўзе прапанавалі сустрэцца з камандзірам партызанскага атрада. М. І. Засінец, намеснік В. І. Прасолава, перадаў пісьмо нашаму сувязному ў Тураве В. Я. Ахраменка, на кватэры якога жыў Клёўзе. Ахраменка быў ветэрынарным урачом і па заданню партызан працаваў у немцаў па спецыяльнасці. Аўгуст вельмі любіў коней і верхавую язду, на прагулкі ён звычайна браў Ахраменку. У час адной з такіх прагулак

ён і ўручыў нямецкаму афіцэру партызанскія пісьмы. Аўгуст сказаў, што падумае, а праз некалькі дзён згадзіўся на сустрэчу.

Сустрэліся Аўгуст Клёўзе і В. І. Прасолаў у лесе каля вёскі Хачэнь. Аўгуст мог упэўніцца, што партызаны — не бандыты, гэта сіла, з якою трэба лічыцца, добра ўзброеныя, дысцыплінаваныя воіны...

Аўгусту Клёўзе цяжка было вызваліцца ад убітых яму ў галаву нацысцкіх ідэй. Партызаны адносіліся да яго насцярожана. Спачатку не давалі ніякіх даручэнняў, В. І. Прасолаў стараўся пераканаць яго ў немінучым разгроме гітлераўцаў, які сапраўды быў блізка і толькі сляпы не бачыў гэтага.

З цягам часу Клёўзе стаў сапраўдным антыфашыстам, ён шмат у чым дапамагаў партызанам, а таксама часцям 23-й Чырванасцяжнай стралковай дывізіі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, якая восенню 1943 г. вызваліла частку раёна, і тут фронт надоўга спыніўся. Дзякуючы яму партызаны былі дасведчаны аб становішчы спраў у тураўскім гарнізоне, ведалі аб многіх карных экспедыцыях, якія рыхтавалі гітлераўцы.

Аднойчы Аўгуст Клёўзе перадаў, што ў Тураў прыбыў карны атрад лікам каля трох тысяч салдат і афіцэраў з загадам прачасаць лясы левабярэжжа Прыпяці. Антыфашыст, які ноччу прыйшоў на сустрэчу, паведаміў план дзеяння экспедыцыі, паказаў на карце раён, які намячаўся для прачосвання. Мы адразу пакінулі гэтую тэрыторыю, забралі з сабой таксама мясцовае насельніцтва. Экспедыцыя карнікаў была безвыніковай. Другі раз Клёўзе паведаміў, што ў Тураў рухаецца механізаваная калона немцаў. Мы ў сваю чаргу расказалі яму, якія дарогі будзем мініраваць — у якім напрамку пасылаць калону. Вынік аперацыі быў выдатны. Калона наскочыла на партызанскія міны, пры ўзрыве якіх шмат было знішчана варожай тэхнікі, загінула нямала жывой сілы.

Аўгуст дапамагаў нам уладкоўваць на работу партызанскіх сувязных і падпольшчыкаў, выручаў з бяды людзей, якія трапілі ў лапы жандармерыі, забяспечваў соллю не толькі партызан, але і жыхароў партызанскай зоны. Праз сувязных кожны раз паведамляў, у якую вёску і колькі солі завезена. А соль у тыя часы цанілася надзвычай дорага, яе здабыча была не менш важнай, чым захоп зброі, боепрыпасаў.

Соль ад Клёўзе паступала таксама ў штаб партызанскага злучэння і ў падпольны абком партыі. Аднойчы камандзір 50-й Жыткавіцкай брыгады У. І. Гушчэня прывёз мяшок солі — лепшага падарунка і жадаць мы не маглі. Лангверт перадаваў муку, абутак, у Чэрнічы дастаўлена для нас пара коней...

Аднойчы ён расказаў пра сябе — да 1933 г. быў членам Камуністычнай партыі, паўгода сядзеў у турме.

Сувязь лангверта з партызанамі не магла застацца незаўважанай гітлераўцамі. Аднойчы Клёўзе пабываў у штабе партызанскага злучэння, расказаў камандаванню важныя звесткі аб абароне Турава. Калі Аўгуст вяртаўся ў гарадскі пасёлак, яго высачыла і схапіла жандармерыя. Накіравалі для следства ў Петрыкаў, потым, былі звесткі, у Брэст, і як склаўся далейшы лёс патрыёта, невядома. Я і іншыя ветэраны-партызаны заўсёды з удзячнасцю успамінаем гэтага мужнага чалавека.

Лёд Чырвонага возера

Каля месяца прастаялі партызанскія атрады ў Ляхавічах і суседніх вёсках на возеры Чырвоным. Пульс жыцця лядовага аэрадрома асабліва адчуваўся ў рыбацкай ха-

У партызанскай вёсцы. 1943 г.

ціне на беразе возера, дзе бесперапынна неслі вахту сігналышчыкі, палілі кастры, заўсёды напагатове стаялі верхавыя коні і вупражкі, а таксама ў хаце, у якой размясціліся радысты са сваёй станцыяй. Тут нярэдка збіраліся беларускія і ўкраінскія партызаны, мясцовыя жыхары, тут можна было пачытаць свежую газету, даведацца пра апошнія навіны з Вялікай зямлі, атрымаць любую даведку. У адну з зорных студзеньскіх начэй усіх чакала асабліва вялікая радасць: прыбыло адразу шэсць вялікіх транспартных самалётаў. Дух займала, калі яны пры пасадцы ўключалі магутныя пражэктары, вырульвалі на лёдзе і станавіліся ў рад. Лётчыкаў уздымалі на ўра, яны хадзілі сярод партызан як сапраўдныя героі, прадстаўнікі іншага, далёкага свету. Тады мы атрымалі надзвычай многа боепрыпасаў, зброі, іншых патрэбных грузаў. Прыбылі карэспандэнты цэнтральных газет, кіна- і фотахранікёры, рэпарцёры... У зваротны шлях самалёты забралі з Ляхавіч многа хворых і параненых.

Да нас прыбыў дэпутат Вярхоўнага Савета В. А. Бегма. Ён прывёз ордэны і медалі, ва ўрачыстай абстаноўцы ўрадавыя ўзнагароды ўручылі тым, хто вызначыўся ў баях з акупантамі. На лядовым аэрадроме быў таксама карэспандэнт «Правды» А. Корабаў.

Усе назапашвалі боепрыпасы, набівалі імі поўныя сумкі, кішэні. Мы не толькі стаялі, адпачывалі на Чырвоным, наадварот, рабілі разведку, здзейснілі не адзін дзёрзкі рэйд і налёт на варожыя гарнізоны. Размяшчэнне аэрадрома на возеры Чырвоным, а не на Белым, як планавалася спачатку, было ўдалым ва ўсіх адносінах. Ён сыграў надзвычай вялікую ролю ў партызанскай барацьбе, дазволіў нам адпачыць, сабрацца з сіламі, папоўніцца людзьмі, боепрыпасамі і зброяй, адаслаць параненых і хворых, каб з новай сілай біць ненавіснага ворага...

Мы разам з партызанскім камісарам С. В. Рудневым увесь гэты месяц жылі ў Ляхавічах у хаце М. П. Цімашчэні. З гэтай хацінай, з вёскай Ляхавічы ў мяне звязана шмат успамінаў. Там, на беразе возера Чырвонага, пакінулі мы брацкую магілу, у якой пахавалі сваіх баявых сяброў...

...У вёсцы Пухавічы, на месцы лядовага аэрадрома, установлена мемарыяльная дошка, на якой выбіты словы: «З 3 студзеня па 4 лютага 1943 г. тут дзейнічаў партызанскі аэрадром партызанскага злучэння С. А. Каўпака».

С. А. Каўпак
З кнігі «Успаміны, нарысы, артыкулы»

Пасланцы з Вялікай зямлі

Пасля жорсткіх баёў 16—20 снежня 1942 г. у вёсцы Глушкавічы, пастаянных сутычак з карнікамі, актыўнай дыверсійнай работы партызанскае злучэнне Каўпака мела патрэбу ў папаўненні зброяй, боепрыпасамі, умацаванні матэрыяльнай базы. Партызаны неслі страты, часта вялікія і непапраўныя. У шпіталі знаходзілася больш 100 паране-

ных, якіх патрабавалася эвакуіраваць. Трэба было арганізаваць прыём самалётаў з Вялікай зямлі, але ва ўмовах пастаянных баёў, праследавання ворагам гэта зрабіць было немагчыма. Камандаванне прыняло рашэнне перабазіравацца ў Жыткавіцкі раён.

Новы 1943 г. пачынаўся марозны і снежны. Колы замянілі санямі, рух аблегчыўся і паскорыўся. Праз некалькі працяглых начных маршаў партызаны перабраліся праз Прыпяць і хутка ўвайшлі ў Ляхавічы. Тут размясціўся штаб злучэння і частка войска, астатнія — у Пухавічах. Непадалёку іскрыліся на сонцы абшары льду возера Чырвонага. На ім і вырашана было падрыхтаваць партызанскі аэрадром.

За дзень напружанай працы ачышчана шырокая лядовая паласа. Лёд выпрабоўвалі, выраўнівалі — павінны прыляцець цяжкія транспартныя самалёты. Для абслугоўвання аэрадрома накіравалі роту І. У. Дзегцярова.

Наступіла ноч. Уздоўж пасадачнай паласы загарэліся вогнішчы. Стаяў моцны мароз, людзі ціснуліся да кастроў, пад якімі раставаў лёд і шыпелі ў вадзе галавешкі. У баку ад вогнішчаў стаялі спецыяльна прызначаныя «слухачы», каб своечасова пачуць гул самалёта. Прайшла ноч, самалёта не было... Кастры патушылі, на іх месцы засталіся чорныя плямы, бачныя здалёку. На наступную ноч вырашылі паліць вогнішчы ў скрынях, пастаўленых на сані — раніцай іх можна дацягнуць да берага і схаваць.

В. І. Бугрымовіч

Але самалёт зноў не прыляцеў, і на наступную ноч яго не было... Па радыё перадавалі, што самалёты выляталі, але не знаходзілі ўмоўных сігналаў і вярталіся. Маразы з кожным днём мацнелі, цяжка было вытрымаць усю ноч на возеры, якое прадзімаў халодны вецер, але людзі не гублялі надзеі на сустрэчу з пасланцамі з Вялікай зямлі. Камендант лядовага аэрадрома Васіль Бугрымовіч пастаянна трымаў яго ў парадку і поўнай гатоўнасці.

Нарэшце 15 студзеня «слухачы» закрычалі: «Гудзе!» Гул самалёта нарастаў. П. П. Вяршыгара выпусціў у зорнае неба дзве ракеты. Самалёт пачаў зніжацца, праляцеў над кастрамі, развярнуўся і пайшоў на пасадку. Сціхлі маторы, лётчыкі ступілі на лёд і адразу трапілі ў абдымкі партызан. Радасці нашай не было мяжы: савецкія лётчыкі з таго боку фронту, дзе Савецкая ўлада, свае, родныя... Прыскакаў на кані С. А. Каўпак. Размовы, роспыты, свежыя газеты, доўгачаканыя зброя і боепрыпасы — было чаму радавацца.

Хутка разгрузілі самалёт, уладкавалі параненых. Да раніцы самалёт узляцеў і хутка знік у марозным небе. На наступную ноч ён прыляцеў зноў, потым пачалі прылятаць па 2—3 самалёты, іншы раз і чатыры. З Вялікай зямлі прыслалі шмат зброі, нават супрацьтанкавыя ружжы, дастатковую колькасць боепрыпасаў, шмат іншых надзвычай патрэбных нам грузаў. Мы адправілі ўсіх параненых, злучэнне стала больш моцным, мабільным і баяздольным.

27 студзеня прыляцеў чарговы самалёт, але з ім здарылася бяда. Самалёт зрабіў пасадку і пачаў падрульваць да апошняга кастра. Вяр-

шыгара свяціў ліхтарыкам, паказваючы напрамак. Раптам самалёт павярнуў направа, прама на касцёр, там была вялікая трэшчына, якая нядаўна прайшла праз усё возера. Вяршыгара забег наперад, уключыў чырвонае святло ліхтарыка і пачаў махаць ім, але машына павольна набліжалася да небяспекі. Самалёт праваліўся праз лёд, вінты і шасі паламаліся... Падбег Каўпак, агледзеў месца здарэння і сказаў: «Паднімем!»

Прывезлі бярвенні, дошкі. Ля самалёта завіхалася рота аэрадромнага абслугоўвання. Пад крыламі на лёдзе выкладвалі клеткі, падважвалі машыну і зноў падкладвалі бярвенні. Вада залівала лёд і замярзала. Работа не спынялася і ноччу. Прыляцеў інжынер, прывёз новыя вінты.

Стаяла сонечнае, яснае надвор'е, калі ў небе з'явіліся два «юнкерсы» і сталі кружыць над вёскай і возерам. Мы адкрылі стральбу з усёй зброі, але адзін самалёт усё ж скінуў з вялікай вышыні бомбу. Яна ўпала далёка, а «юнкерс», відаць, пашкоджаны, рэзка знізіўся і знік за возерам. Другі скінуў бомбы на Ляхавічы, разбурыў некалькі хат. Асколкам быў паранены наш камандзір аддзялення Данскі.

Хутка работы па выратаванню самалёта закончылі, яго адкацілі да берага. Прымацавалі вінты, накрылі машыну белым парашутам.

— Ноччу паляцім,— сказалі лётчыкі.

Але апоўдні зноў прыляцеў «юнкерс». Ён кружыў над пустым возерам, кулямётнымі чэргамі падпаліў рыбацкую хатку на беразе. Белы дым працягнуўся над лёдам, а варожы самалёт спікіраваў на нашу бездапаможную машыну, якую выдаваў цень на снезе. Адна з бомб упала пад самым яе носам, самалёт загарэўся...

Самалёты дастаўлялі партызанам зброю, медыкаменты, газеты і часопісы, абмундзіраванне і абутак, забіралі цяжкапараненых. Атрыманыя з Вялікай зямлі газеты «Правда», «Известия», «Красная Звезда», «Комсомольская правда» распаўсюджваліся па ўсяму партызанскаму злучэнню, перадаваліся ў навакольныя населеныя пункты і гарадскі пасёлак Жыткавічы. З іх людзі чэрпалі інфармацыю аб перамогах Чырвонай Арміі.

Вялікую прапагандысцкую работу праводзілі агітатары Рыгор Кароўчанка, Мікалай Жогла, Аляксандр Бажэнка, Васіль Грамак і многія іншыя. Рэгулярная сувязь з Масквой давала магчымасць партызанам паспяхова весці баявыя аперацыі. Амаль кожную ноч камендант лядовага аэрадрома Васіль Іванавіч Бугрымовіч прымаў самалёты. За гэты час у Маскву было адпраўлена больш 300 параненых. Захоўваць аэрадром у добрым стане партызанам дапамагала моладзь вёсак Ляхавічы і Пухавічы, якая затым улівалася ў рады народных мсціўцаў. Сярод іх — Аляксей Глушчэня, Фёдар Цімашчэня, якія сталі кавалерамі ордэна Леніна. Арсень Каток узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі. Аляксей Малаў атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Ордэна Айчыннай вайны ўдастоены Віктар Давідовіч, які мае таксама баявыя ўзнагароды Чэхаславакіі.

Партызаны размясціліся ў вёсках Ляхавічы, Пухавічы, Пласток, Відошына, Сяменча, Марохарава і іншых населеных пунктах Ляхавіцкага, Бялёўскага і Жыткавіцкага сельскіх саветаў, дзе да таго часу партызаны ўжо аднавілі савецкую ўладу. Старшынёй Ляхавіцкага Савета быў партызан М. Ф. Давідовіч.

Камандаванне партызанскага злучэння распрацавала план разгрому нямецкага гарнізона ў в. Сосны суседняга Любанскага раёна.

У ноч з 7-га на 8-е студзеня 1943 г. з вёсак Сяменча, Ляхавічы і Пухавічы, дзе дыслацыравалася партызанскае злучэнне, выехалі на баявую аперацыю 600 байцоў. Яны завязалі бой з фашысцкімі карнікамі. Там назаўсёды засталіся 83 варожыя салдаты і афіцэры. Партызаны захапілі 150 цэнтнераў зерня, 250 галоў буйной рагатай жывёлы.

У пачатку лютага наша партызанскае злучэнне С. А. Каўпака накіравалася ў напрамку Пінска, Брэста і далей у Заходнюю Украіну.

А. М. Купрацэвіч

Курс на Князь-возера

У студзені 1943 г. на Чкалаўскім аэрадроме ў Маскве рыхтаваліся да вылету два самалёты са славутага авіяпалка Грызадубавай. У далёкі тыл адпраўляліся камандзір будучага партызанскага атрада А. М. Грабчак, я, радысты Валодзя Седашоў і Вася Ганчароў, партызаны І. В. Мароз і П. Б. Галдобін. Месцам прызначэння было возера Чырвонае ў Беларусі, ці інакш — Князь-возера.

Зіма ў той год выдалася суровая. Возера было скавана моцным лёдам. Яно служыла партызанам аэрадромам. Самалёт робіць разварот. Унізе мільгаюць тры агні. Гучыць сігнал «ці-ці-ці». Усе мы падыходзім да адкрытага люка, развітваемся. Гук сірэны — пайшоў.

Я скокнуў апошнім. Ветрам мяне аднесла, прызямліўся ў баку ад пляцоўкі. У паветры расчапіўся рамень ППШ і аўтамат паляцеў уніз.

Пакуль я ўпраўляўся з парашутам, мяне ўжо шукалі партызаны. Першым падышоў Коля Багалюбаў. Сустрэча была радаснай, тым больш, што мы былі землякамі. Коля ўспомніў, што мы працавалі разам да вайны.

Хутка мы былі на камандным пункце аэрадрома. С. А. Каўпак і С. В. Руднеў моцна паціснулі мне рукі, распытвалі, што новага ў Маскве.

Начальнік разведкі злучэння Каўпака, ён жа начальнік партызанскага аэрадрома, Пятро Вяршыгара падабраў выкінутыя грузы. Майго аўтамата сярод падабраных грузаў не аказалася, я стаў хвалявацца. Каўпак і Руднеў заспакоілі, што аўтамат знойдзецца. Назаўтра сапраўды знайшлі яго.

З аэрадрома мы пайшлі да вёскі Ляхавічы, дзе дыслацыраваўся партызанскі атрад С. А. Каўпака. Першым сустрэў нас Мікалай Давыдовіч. Да вайны ён працаваў старшынёй калгаса, а цяпер быў прызначаны старшынёй ачышчанага ад немцаў сельсавета. Ён размясціў нас па хатах.

Раніцай да нас прыйшло многа людзей. Усё чакалі, калі мы з імі пагаворым. Першымі ў атрад прыйшлі Аляксей Малоў, Фёдар Цімашчэня, Віктар Давыдовіч, Пётр Ахрамовіч, Мусік, Аляксей Глушчэня з вёскі Ляхавічы, Фёдар Рагалевіч, Мікалай Жураўлевіч, Сяргей Кудзелька, Фядот Кудзелька з Дзякавіч.

...Цёпла праводзілі нас партызаны злучэння Каўпака; жыхары вёскі Ляхавічы. Мы трымалі кірунак на паўднёвы захад. Наперадзе быў рэйд. А аэрадром на возеры прымаў новых пасланцоў Вялікай зямлі. Князь-возера працавала супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Н. Падкарытаў,
былы камісар партызанскага злучэння Героя Савецкага Саюза Грабчака.

* * *

Шыш Мікалай Цімафеевіч з першых дзён вайны — на фронце. Па распараджэнню ЦК КПБ быў адазваны для арганізацыі на Палессі партызанскага руху. Ужо ў жніўні

1941 г. ім была створана баявая група з 20 чалавек, хутка яна прыняла баявое хрышчэнне. У красавіку 1942 г. на базе асобных груп М. Ц. Шыша, М. І. Герасімава і В. В. Ціхаміpава быў створаны партызанскі атрад, камандзірам якога стаў Шыш.

У чэрвені 1942 г. у час бою, калі ўжо ён закончыўся перамогай партызан, нечаканы стрэл абарваў жыццё адважнага партызанскага камандзіра. Камандаванне атрадам прыняў М. І. Герасімаў. Праз дзень пасля гібелі М. Ц. Шыша, 27 чэрвеня, партызанскаму атраду было прысвоена яго імя. У 1943 г. атрад быў ператвораны ў партызанскую брыгаду.

...Зімой 1943 г. ішла цяжкая блакада партызан у Ленінскім раёне. Барацьба не спынялася і ў гэты суровы час. Байцы атрада імя М. Ц. Шыша хадзілі ў разведку, ставілі міны на рэйках. Зімовым вечарам група Пятра Паталаха вярталася на базу. Нечакана наткнуліся на карнікаў. Завязаўся бой. У ім загінулі Пятро Паталах, Цараў, Пячны...

* * *

Засінец Мікалай Ільіч (н. у 1913 г.) працоўны шлях пачаў у сельгасарцелі «Шлях сацыялізму». З 1937 г. працаваў старшынёй сельскага Савета, намеснікам дырэктара Ельскай машынна-трактарнай станцыі. З пачатку вайны знаходзіўся ў Чырвонай Арміі, з баямі выходзіў з акружэння. З ліпеня 1942 г. ваяваў у партызанскім атрадзе «За Радзіму», які дзейнічаў на тэрыторыі Тураўскага раёна. Быў палітруком роты, потым намеснікам камандзіра атрада па разведцы. Пра яго смеласць і мужнасць пры правядзенні баявых аперацый сярод партызан хадзілі легенды. М. І. Засінцу належыць вялікая роля ў наладжванні сувязі з лангвертам Аўгустам Клёўзе, які нямала зрабіў карыснага для партызан.

Пасля вызвалення тэрыторыі Тураўскага раёна М. І. Засінец выбіраецца сакратаром райкома Камуністычнай партыі Беларусі, а затым загадчыкам аддзела райвыканкома па калгаснаму і сельскаму будаўніцтву. З 1951 па 1961 г. працуе старшынёй калгаса «Новае жыццё».

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I ст., Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр 19.1.1966 г.

* * *

Лісовіч Фёдар Іванавіч (н. 14.8. 1916 г. у в. Гулевічы Жыткавіцкага р.) — адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Палессі. З 1933 г. знаходзіўся на савецкай рабоце. З пачатку вайны — у партызанах, спачатку быў байцом, потым камісарам атрада. У ліпені 1943 г. прызначаны камісарам, а ў маі 1944 г.— камандзірам партызанскай брыгады імя С. М. Кірава. Адначасова з канца 1942 г. да вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў з'яўляўся сакратаром Лунінецкага райкома КП(б)Б. Пасля вайны Ф. І. Лісовіч працаваў на адказных гаспадарчых пасадах у Мінскай і Брэсцкай абласцях. Яго імем названа вуліца ў Лунінцы.

Памёр 30.8.1972 г.

* * *

Шырын Фёдар Ігнацьевіч (н. 9.5. 1907 г.) — арганізатар і адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў раёне. Працаваў брыгадзірам, старшынёй сельсавета ў Слуцкім раёне, удзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь, затым — у фінскай вайне. У чэрвені 1941 г. узначаліў знішчальную групу па барацьбе з нямецкімі дыверсантамі,

Ф. І. Шырын

якая затым улілася ў атрад В. З. Каржа, быў камандзірам роты. Да красавіка 1943 г. з'яўляўся намеснікам В. З. Каржа, затым камандзірам атрада імя Варашылава Пінскага партызанскага злучэння, камандзірам брыгады імя Будзённага, якая дзейнічала ў Ленінскім раёне, атрады яе дыслацыраваліся ў ваколіцах в. Грычынавічы.

Ф. І. Шырын узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр у 1980 г.

* * *

Уладзімір Гушчэня нарадзіўся ў 1903 г., паспеў яшчэ прыняць удзел у грамадзянскай вайне. У 1924 г. дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі. Былога чырвонаармейца выбралі старшынёй Рудненскага сельскага савета. Чатыры гады працаваў у Людзяневічах на такой пасадзе, потым быў прызначаны дырэктарам Жыткавіцкай МТС.

У. І. Гушчэня

— Самы цяжкі, суровы і трывожны час давялося перажыць у першыя месяцы акупацыі,— успамінаў У. І. Гушчэня.— Атрымаў назначэнне памочніка камандзіра ўзвода ў групе Катовіча. Многія пакінулі атрад у цяжкую зіму 1941 г., засталіся найбольш стойкія, смелыя. Былі дні, калі ледзь маглі рухацца ад голаду і холаду, але не здаваліся...

Прайшло нямнога часу, і У. І. Гушчэня, які не раз вызначаўся ў баях, узначаліў спачатку партызанскі атрад, а потым стаў камандзірам брыгады. Гісторыя партызанскай барацьбы на Жыткаўшчыне — гэта ў асноўным дзейнасць 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгады пад камандаваннем У. І. Гушчэні. Усіх баявых спраў, што на рахунку гэтай па-сапраўднаму баявой часці, не пералічыць, пра іх даволі сказана тут... Немалая заслуга ў гэтым належыць яе камандзіру, генералу без звання У. І. Гушчэні. За баявыя подзвігі ён быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны I ст., баявымі медалямі.

У пасляваенны час былы партызанскі камандзір працаваў старшынёй Жыткавіцкага райвыканкома, затым — намеснікам старшыні.

Памёр У. І. Гушчэня ў 1955 г.

У час выпрабаванняў

У пачатку 20-х гадоў бацька Фёдара Ефімовіча купіў на самым беразе Случы хутар. Распрацаваў тры гектары зямлі, пабудаваў гаспадарчыя памяшканні. На яго шчасце, а можа, і на гора, яны ў хуткім часе аказаліся на тэрыторыі савецкай Беларусі... У 1930 г. Іван Ефімовіч уступіў у калгас, здавалася, старанна шчыраваў на грамадскай рабоце, але родзічы жылі ў Старых Мілевічах, у буржуазнай Польшчы,



Ф. І. Ефімовіч

і сям'ю вывезлі далей ад граніцы, у Рагачоўскі раён. Таксама працавалі ў калгасе, але цёмнай ноччу 1937 г. без ніякай віны схапілі бацьку, судзілі тройкай і, як потым стала вядома, расстралялі ў Магілёве. Толькі ў 1990 г. Іван Ефімовіч быў пасмяротна рэабілітаваны...

Магло стацца, што такі страшны лёс напаткаў бы і старэйшага сына — Фёдара. Але ён у гэты час знаходзіўся ў Мурманску, працаваў на будоўлі спачатку вучнем маляра, затым маляром. Перад вайной вярнуўся ў Беларусь, быў заняты на будаўніцтве аэрадрома ў Бабруйску. А ў маі 1941 г. Фёдара Ефімовіча прызвалі ў Чырвоную Армію.

Вялікая Айчынная вайна застала яго ў раёне станцыі Рось Ваўкавыскага раёна, дзе ён у складзе сваёй вайсковай часці знаходзіўся на будаўніцтве ваеннага аэрадрома. У першы дзень вайны перажылі налёт нямецкай авіяцыі. Пачаліся доўгія кіламетры адступлення. Вялікія страты часць панесла ў час бамбёжкі каля Зэльвы. Адыход на ўсход быў адрэзаны, рухаліся асобнымі групамі, нярэдка па аднаму, як даводзілася...

Восенню 1941 г. Фёдар Іванавіч разам з невялікай групай байцоў дабраўся да сваёй роднай вёскі, у якой гаспадарылі акупанты. Хутка ўстанавіў сувязь з партызанамі атрада В. З. Каржа, якія часта наведваліся ў Мілевічы, выконваў іх заданні. Зімой ужо трымаў сувязь з групай П. Р. Катовіча. Пазнаёміў Фёдара з Паўлам Рыгоравічам ужо на той час актыўны падпольшчык Рыгор Пракаповіч. Дапамагала яму Наталля Прышчык і іншыя вяскоўцы. Яны інфармавалі партызан аб становішчы ў Леніне, Мікашэвічах, Мілевічах. А 17 чэрвеня 1942 г. Ф. І. Ефімовіч пайшоў у партызаны. Яго накіравалі ў разведку. Вопыт падпольнай работы ў яго быў, В. З. Корж быў задаволены разведчыкамі. Але ў канцы 1942 г. атрад пакінуў раён, ён накіраваўся да Хорастава. Засталася група ў складзе сямі чалавек — Фёдар Ефімовіч, Уладзімір Дзербан, Уладзімір Гушчэня, Мікалай Зінчук і іншыя. Лічыліся ў складзе атрада В. З. Каржа, але дзейнічалі самастойна. Група хутка павялічвалася, у ёй налічвалася ўжо звыш 40 чалавек. Камандаваў У. І. Гушчэня, Фёдар Ефімовіч узначальваў разведку.

Самы жудасны час перажылі ў пачатку 1943 г.— блакада, лютасць карных атрадаў... Колькі мірных жыхароў тады загінула! Разведчыкі па-ранейшаму выконвалі свае задачы, інфармавалі камандаванне аб дыслакацыі ворага. Аднойчы каля вёскі Замошша сустракалі дэсант з Вялікай зямлі, дзве дзяўчыны прызямліліся ўдачна, адна загінула... Яны даставілі рацыю, боепрыпасы. У выніку блакады атрад вельмі папоўніўся, людзі гарэлі жаданнем змагацца з праклятым ворагам. Улетку 1943 г. былі створаны новыя атрады — 109-ы, які ўзначаліў Васіль Цік, і 105-ы, якім камандаваў Мікалай Зінчук. Фёдар Ефімовіч у той час змагаўся ў атрадзе «1 Мая».

У ліпені 1943 г. атрад «1 Мая» знаходзіўся ў лясах каля Мілевіч. Неабходна было перад вызваленнем Беларусі ўзмацніць удары па ворагу, актывізаваць разведку. Камандаванне атрада накіравала Фёдара

Ефімовіча, Васіля Трапца і Уладзіміра Мархотку ў раён Браніслаўскага і Людзяневіцкага сельсаветаў для арганізацыі барацьбы і разведкі. Да партызан далучаліся сяляне з Градy, Вільчы, Людзяневіч, Браніслава і іншых вёсак. Жыхар вёскі Доўгая Дуброва Салавец прыйшоў з кулямётам Дзегцярова і вялікім запасам патронаў. Ён вызначыўся у час дыверсіі на чыгунцы — заклаў міну пад рэйкі, пусціў пад адхон варожы эшалон, але сам не паспеў адыйсці на небяспечную адлегласць... А ў лістападзе 1943 г. група была ператворана ў 113-ы партызанскі атрад, камандзірам якога прызначаны Ф. І. Ефімовіч. У. В. Мархотка узначаліў першую роту, камандзірам другой роты быў прызначаны афіцэр Чырвонай Арміі Казімір Кірбай, ураджэнец вёскі Сялко. Атрад налічваў 180 чалавек.

Ф. І. Ефімовіч не раз удзельнічаў у баявых аперацыях, паказваў узоры мужнасці і гераізму. У час бою ён знаходзіўся на самым небяспечным участку, звычайна ў першай роце атрада, якой камандаваў У. В. Мархотка.

— Разведка ўстанавіла,— успамінае Ф. І. Ефімовіч, што ў Браніславе спынілася на ноч вялікая калона крытых грузавікоў фашыстаў. Нельга было ўпусціць такі зручны момант. Па дарозе на Мікашэвічы мы зрабілі засаду. На досвітку пачулі гул матораў, паказаліся грузавікі. Першыя два партызаны падбілі з супрацьтанкавых ружжаў, яны загарэліся. Па астатніх адкрылі агонь з аўтаматаў і вінтовак. Гітлераўцы пачалі адстрэльвацца, нямала з іх знайшло тут свой канец... На выручку сваім заспяшаліся немцы з Браніслава, ударылі гарматы, і мы адступілі ў глыбіню лесу ў бок Загацця. Пасля гэтай аперацыі, у ходзе якой фашысты панеслі значны ўрон, яны паставілі ўздоўж дарогі шыльды з надпісам «Партызаны», праязджаючы кожны раз, абстрэльвалі лес...

Марознай лютаўскай ноччу 1943 г. партызаны пад камандаваннем Ф. І. Ефімовіча зрабілі засаду на чыгунцы на перагоне Браніслаў — Калінаўка. З боку Мікашэвіч ішоў цягнік з жывой сілай ворага. Ударылі з супрацьтанкавага ружжа па паравозу, пашкодзілі яго, адкрылі моцны агонь з усіх відаў зброі па вагонах. Дзесяткі гітлераўцаў знайшлі тут свой канец...

Ф. І. Ефімовіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Разам з ім змагалася ў партызанскім атрадзе яго жонка, Надзея Антонаўна.

Пасля вайны Ф. І. Ефімовіч працаваў старшынёй Жыткавіцкага гарпасялковага савета, узначальваў калгас імя Калініна ў Дзедаўцы, там, дзе ваяваў...

Памёр Ф. І. Ефімовіч 17 сакавіка 1993 г.

В. В. Ніканoвіч

Не стаяў убаку...

У першыя дні вайны мяне разам з іншымі вяскоўцамі прызвалі ў армію. Воінскі эшалон кіраваўся на фронт. Але праз некаторы час быў атрыманы загад: актывістаў, кіраўнікоў гаспадарак, міліцыянераў — усіх, хто добра ведае мясцовасць, карыстаецца аўтарытэтам у насельніцтва, зняць з эшалона, вярнуць



І. А. Рагалевіч

назад і пакінуць у тыле ворага для разгортвання фронту партызанскай барацьбы.

З Дзякавіцкага сельсавета было вернута 9 чалавек. Двое няўстойлівых, маральна слабых праз некаторы час пакінулі нас, старшы групы Буякевіч здаўся паліцыі... Разам з А. А. Чэркасам, былым сакратаром райаддзела міліцыі, мы сабралі рэшткі групы і перайшлі на тэрыторыю суседняга Любанскага раёна, дзе далучыліся да атрада А. І. Патрына. Потым вярнуліся ў свой раён, у атрад Камарова. Восенню 1941 г. наша група была на сустрэчы партызан каля возера Чырвонае з В. І. Казловым, А. Бондарам, які ў адной з сутычак з паліцаямі быў тады паранены ў нагу, І. Бельскім — арганізатарамі і кіраўнікамі партызанскага руху на Палессі. Яны паставілі нам задачы на бліжэйшы час, далі многа каштоўных парад. Наша група паступова расла, хутка ў ёй налічвалася 32 чалавекі. Мала было зброі, і мяне разам з чатырма іншымі партызанамі накіравалі для сувязі з атрадам, які дзейнічаў на тэрыторыі суседняга Любанскага раёна. Знайшлі некалькі разрозненых партызанскіх груп, дамовіліся аб сумесных дзеяннях, устанавілі з імі сувязь. Па шляху назад непадалёку ад Чырвонага возера наткнуліся на засаду...

У гэты час партызанскім атрадам кіраваў У. М. Дзербан, у будучым — камісар Жыткавіцкай партызанскай брыгады... Быў пакладзены пачатак арганізаванай, мэтанакіраванай партызанскай барацьбы. Асобныя групы аб'ядноўваліся ў атрады з вайсковай арганізацыяй і дысцыплінай. Нямала баявых аперацый было здзейснена народнымі мсціўцамі. Разгромлены нямецкія гарнізоны ў Пасталах, Кузьмічах, Нова-Леніне, Старобіне. Нярэдка арганізоўвалі засады, рабілі дыверсіі на дарогах, узрывалі фашысцкія цягнікі і аўтамашыны.

...Сям'я — а было ў мяне чацвёра малых дзяцей — знаходзілася ў вёсцы Буда. Шмат гора выпала на яе долю, многае давялося перажыць жонцы, Праскоўі Васільеўне... Немцам было вядома, што я ў партызанскім атрадзе, і яны, як было прынята ў нелюдзяў, імкнуліся адпомсціць за бацьку дзецям, а магчыма, выкарыстаць іх у якасці прынады. Жыццё сям'і знаходзілася пад пастаяннай пагрозай. За ёю сачылі — ці не з'яўлюся раптам я?.. Гітлераўцы вырашылі схапіць жонку з дзецьмі. Які лёс чакаў іх — было вядома. Але Праскоўю Васільеўну своечасова папярэдзілі добрыя людзі. Некаторы час яна хавалася ў чужых людзей, потым узяла двух меншых і накіравалася да нас у атрад. Большых пакінула разам з сваёй маці ў Будзе. Там і напаткала іх смерць, у час чарговай карнай экспедыцыі ў пачатку 1943 г. схапілі разам з іншымі жыхарамі вёскі, накіравалі ў Вятчын і спалілі жывымі з усімі вяскоўцамі... У агні загінулі таксама два браты і дзве сястры Праскоўі Васільеўны Рагалевіч. Сэрца поўнілася пачуццём яшчэ большай нянавісці да гітлераўцаў. Набліжаўся доўгачаканы час вызвалення, і мы рабілі ўсё магчымае, каб ён наступіў як мага хутчэй...

І. А. Рагалевіч

З ХАРАКТАРЫСТЫКІ РАГАЛЕВІЧА І. А., КАМІСАРА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА «1 МАЯ» ЖЫТКАВІЦКАЙ БРЫГАДЫ

...З пачатку арганізацыі партызанскага руху ў раёне І. А. Рагалевіч аказваў актыўную дапамогу ў фарміраванні партызанскіх атрадаў. Удзельнічаў у разгроме 12 варожых гарнізонаў, партызанамі пад яго непасрэдным кіраўніцтвам забіта звыш 100 немцаў і паліцаяў, праведзена вялікая колькасць дыверсій на чыгункі. На баявом рахунку І. А. Рагалевіча — 14 эшалонаў з тэхнікай і жывой сілай ворага, у выніку дыверсій на чыгункі забіта звыш 500 гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Асабіста І. А. Рагалевічам узарвана адзінаццаць варожых аўтамашын, знішчана 5 км кабельнай сувязі. З 10 жніўня 1943 г.— член Жыткавіц-

кага падпольнага райкома партыі. Праводзіў вялікую палітычна-масавую і агітацыйную работу сярод насельніцтва... Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Камандзір брыгады *У. І. Гушчэня*
Начальнік штаба *А. І. Ціханчык*
12 ліпеня 1944 г.

* * *

Языковіч Фёдар Міхайлавіч (н. 5.2. 1903 г.) да вайны — другі сакратар Палескага абкома КП(б)Б, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі. З лютага 1943 г. першы сакратар Палескага абкома, камандзір Палескага партызанскага злучэння, якое не раз праводзіла паспяховыя баявыя аперацыі ў Жыткавіцкім раёне. На тэрыторыі раёна, у пяці кіламетрах ад ст. Старушкі, Ф. М. Языковіч загінуў у баі 7 красавіка 1943 г.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Чырвонага Сцяга. Яго імем была названа партызанская брыгада. На месцы гібелі Ф. М. Языковіча на раз'ездзе Брынёва Жыткавіцкага раёна ў 1963 г. устаноўлена мемарыяльная дошка: «Тут 7 красавіка 1943 г. 125-я і 210-я партызанскія брыгады вялі бой па разгрому варожага эшалона. У баі гераічна загінуў сакратар Палескага падпольнага абкома КП(б)Б, камандзір Палескага партызанскага злучэння Ф. М. Языковіч».

Выпрабаванне трываласці

Нарадзіўся Аляксандр Паўлавіч Карнейчык напярэдадні Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў сялянскай сям'і. У 1928 г. закончыў пачатковую школу, і бацька, Павел Антонавіч, удзельнік першай сусветнай вайны, заявіў: «Хопіць, сынок, з цябе чатырохкласнай адукацыі! За работу бярыся, маці хворая»... Саша працаваў нароўні з бацькам з вясны да восені на полі, узімку — на лесанарыхтоўках.

Жыццё юнака некалькі перайначылася, калі ў 1930 г. сям'я ўступіла ў калгас. У калектыўнай працы адчуў хлопец цягу да актыўнага грамадскага жыцця. У 1932 г. ён ужо камсамолец, а ў 1935 г. працуе рахункаводам Бобрыцкага сельсавета. Хутка яго пасылаюць на курсы ў Гомель. Ішоў 1936 г. «Суцэльная» калектывізацыя, раскулачванне, непасільныя падаткі на аднаасобныя гаспадаркі...

Памятным для Аляксандра Паўлавіча быў 1940 г. Яго прынялі ў члены партыі, выбралі намеснікам старшыні Капаткевіцкага райвыканкома. Летам гэтага года ён закончыў трохмесячныя вайсковыя курсы, яму прысвоілі званне малодшага палітрука. Але аднойчы выказаў думку, якая не супала з думкай кіраўніка раённай партыйнай арганізацыі, за што трапіў у турму — без суда.

— Праўда, сакратар Палескага абкома партыі Пётр Адамавіч Лявіцкі заступіўся,— успамінае А. П. Карнейчык.— Вызвалілі, папрасілі прабачэння. А ўжо ішла вайна. Фронт набліжаўся да Палесся...

— Магчыма, немцы хутка будуць тут,— сказаў П. А. Лявіцкі.— Цябе, мясцовага камуніста, мы пакідаем у тыле ворага для арганізацыі партызанскай барацьбы. Гэта партыйнае даручэнне...

У пачатку жніўня 1941 г. Аляксандра Карнейчыка тэрмінова выклікалі ў райваенкамат.

— Вось два чырвонаармейцы, вазьмі 15—20 чалавек мясцовых. Трэба ўзарваць лесапільны завод «Смычка», на якім гітлераўцы наладзілі распілоўку лесу.

Заданне было выканана, узарваны не толькі лесазавод, але і нямецкі склад боепрыпасаў, што знаходзіўся побач. Гэта было першае партызанскае зарыва...

Дырэктар МТС Аляксандр Апанасавіч Жыгар, настаўнік Капаткевіцкай сярэдняй школы Мікалай Іосіфавіч Гардзіенка і Аляксандр Паўлавіч Карнейчык сабралі 37 чалавек аднадумцаў, запраглі некалькі фурманак і рушылі ў лес. Правялі

сход. Камандзірам атрада выбралі Гардзіенку, камісарам — Жыгара, сакратаром партарганізацыі і старшыной атрада — Карнейчыка. Народныя мсціўцы знянацку нападалі на невялікія групы ворага, выводзілі са строю тэхніку праціўніка.

У сярэдзіне студзеня 1942 г. у памяшканні былога лясгаса сабраліся каля 40 чалавек падпольшчыкаў. Быў створаны партызанскі атрад. Камандзірам стаў Анатоль Цімафеевіч Міхайлоўскі, камісарам — Аляксандр Апанасавіч Жыгар, начальнікам штаба — Аляксандр Паўлавіч Карнейчык. Да восені 1942 г. атрад вырас у грозную сілу. Камандаванне Мінскага злучэння даручыла яму правесці разведку і падрыхтаваць аператыўны план па знішчэнню чыгуначнага моста цераз раку Пціч. Літаральна ў ходзе бою пад аркай моста было закладзена 30 пудоў узрыўчаткі. Грымнуў выбух, захісталася зямля... На 27 сутак была паралізавана дарожная магістраль на гэтым участку чыгункі.

У канцы 1942 г. у атрадзе ўжо налічвалася каля 1000 байцоў. У студзені 1943 года на яго базе была створана 125-я партызанская брыгада. У саставе камандавання яе знаходзіўся А. П. Карнейчык — начальнік штаба, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. А хутка было створана Палескае партызанскае злучэнне, камандаваў ім сакратар падпольнага абкома партыі Фёдар Міхайлавіч Языковіч. Штаб злучэння знаходзіўся ў зоне 125-й брыгады.

7 красавіка 1943 г. партызаны рыхтавалі чарговую аперацыю на чыгунцы паміж станцыямі Брынёва і Старушкі Жыткавіцкага раёна. Аляксандр Паўлавіч успамінае:

— На світанні выйшлі да чыгуначнага палатна ў намечаным месцы. Па плану два невялікія атрады павінны былі знішчыць нямецкія дзоты злева і справа, а два атрады, большыя па колькасці байцоў, атакаваць і захапіць варожы эшалон. У тыле, у 300 метрах ад чыгункі, размясціўся камандны пункт, на якім знаходзіўся камандзір злучэння... Развіднела. Ідзе першы эшалон. Прапускаем і тут жа чуем з захаду стук колаў наступнага цягніка. Нешта не заладзілася ў падрыўнікоў, вымушаны былі прапусціць і яго... Нарэшце падклалі міны пад рэйкі, але пакуль корпаліся на чыгуначным палатне, машыніст і ахова заўважылі партызан, цягнік спыніўся метраў за дзвесце ад месца аперацыі. Немцы, выскокваючы з вагонаў, пачалі займаць абарону за насыпам. Нечакана збоку ўдарыў кулямёт з дзота, якога пры выбары месца засады ніхто не заўважыў. Бой складваўся для партызан няўдала з самага пачатку... Каб лепш разабрацца ў сітуацыі, я выпаўз на высечаную паласу лесу, і раптам заўважыў, што ззаду мяне паўзе Языковіч.

— Фёдар Міхайлавіч, тут небяспечна...

— Я ўпершыню ў сапраўдным баі,— адказаў камандзір злучэння.— Хачу ўсё бачыць сам...

Праз некаторы час я страціў з поля зроку камандзіра. А пасля бою пранеслася цяжкая вестка: «Языковіч загінуў». З болем у сэрцы пахавалі мы свайго камандзіра. Адбыўся жалобны мітынг. Я адкрываў яго. Слова для выступлення было дадзена Кірылу Трафімавічу Мазураву. На магіле камандзіра партызаны пакляліся яшчэ мацней біць ворага... І ўсё ж абставіны гібелі Ф. М. Языковіча былі незразумелымі і дзіўнымі, сярод партызан доўга хадзілі пра гэта супярэчлівыя размовы.

...Прайшло некалькі месяцаў баёў, трывог, перамог і няўдач... У кастрычніку 1943 г. Карнейчыка нечакана выклікалі ў штаб партызанскага злучэння. Там яго чакалі людзі з асобага аддзела. Тут жа

арыштавалі, прад'явілі недарэчнае абвінавачванне ў забойстве Языковіча. Хутка, без суда, аб'явілі прыгавор: дзесяць гадоў пазбаўлення волі «за здраду Радзіме»... Роўна дзесяць гадоў адбыў былы партызанскі камандзір на лесапавале ў Горкаўскай вобласці. Вярнуўся ў 1953 г., уладкаваўся на работу ў Жыткавіцкі леспрамгас. Падаў апеляцыю. У 1959 г. А. П. Карнейчык быў рэабілітаваны...

І. Ф. Карповіч

Камісар

Хвалі з ціхім плёскатам набягаюць на бераг і знікаюць, як і прыйшлі — ніадкуль і нікуды. Хвалі — як дні хуткацечнага жыцця, толькі пражытыя дні пакідаюць след на зямлі добрымі справамі, успамінамі...

Панцялею Тарасюку было дванаццаць гадоў, меншаму брату — восем, калі памёр бацька, а хутка і маці. Хлапчукі, круглыя сіроты, пайшлі па багатых людзях батрачыць. Усяго хапіла — і выспяткаў, і лаянкі, і папрокаў за кавалак хлеба. Не было толькі пяшчоты, і ніколі не было сытасці.

Калі Панцялей падрос, пагосцкія плытагоны, вядомыя па ўсёй Прыпяці сваім майстэрствам гнаць лес па рацэ, прынялі яго ў свой круг. Зімой, у вольны ад работы час, хлопец хадзіў у вячэрнюю школу. У 1936 г. калгас паслаў яго на курсы па падрыхтоўцы малодшых аграномаў. Калі вярнуўся, выбралі старшынёй калгаса.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны П. І. Тарасюк быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі партызанскай барацьбы з захопнікамі. Немцы хутка адчулі сілу народнага гневу. Для ліквідацыі партызан прыйшлося адцягнуць з фронту значныя вайсковыя сілы з артылерыяй, танкамі і авіяцыяй. Бой быў жорсткі і кровапралітны. Нямногія з партызан засталіся ў жывых. Сказаўся недахоп зброі і боепрыпасаў, ды і вопыту не было. Немцы пачалі жорсткую расправу з сем'ямі партыйных і савецкіх актывістаў.

Кантужаны, стомлены, Панцялей Іванавіч прыйшоў у Пагост дамоў, да сям'і і тут жа быў схоплены паліцаямі, дастаўлены ў Тураў, у камендатуру. Сярод паліцаяў аказаўся знаёмы, ён дапамог Тарасюку ўцячы з камендатуры.

У Пагост Панцялей Іванавіч прыбег амаль без сіл. Быў канец сакавіка. Прыпяць, ужо свабодная ад лёду, разлівалася па пойме. Не марудзячы, Тарасюк пасадзіў у лодку жонку і дзяцей, пераехаў раку і схаваўся у лугавых пратоках. А раніцай гарэла хата Панцялея Іванавіча, паліцаі шнырылі па рацэ на лодках у пошуках уцекачоў.

Скончыўся запас прадуктаў. Па начах нават ля агню холадна. Цяжка бацьку з маці слухаць, як плачуць галодныя дзеці. Старэйшаму — 6 гадоў, малодшы — на руках у маці, а ўсіх чацвёра. І Панцялей Іванавіч адважыўся ісці ў вёску Сіманавіцкі Млынок, што на шляху з Турава ў Лельчыцы. Добрыя людзі дапамагалі харчамі і адзеннем.

Зімой 1942 г. з-за Дняпра выйшла на Палессе партызанскае злучэнне С. А. Каўпака. З новай, яшчэ большай сілай успыхнуў партызанскі рух на Палессі. Улетку 1942 г. на Палессі ўжо дзейнічала партызанскае злучэнне Сабурава, а да пачатку 1943 г. П. І. Прасолаў на Тураўшчыне падрыхтаваў вялікую групу моладзі, якая рвалася ў бой супраць акупантаў. З Прасолавым Панцялей Іванавіч сустрэўся ў штабе злучэння Сабурава, дзе знаходзіўся тады Палескі падпольны абком партыі. Узрадзіўся зноў на Тураўшчыне партызанскі атрад «За Радзіму», разгромлены восенню 1941 г. Камандзі-

рам яго быў прызначаны Прасолаў, камісарам — Тарасюк. У пачатку 1943 г. у атрадзе налічвалася 125 актыўных штыкоў.

...Разведка данесла, што па Прыпяці ў бок Турава рухаюцца нямецкія кацеры з грузам. Было вырашана ўстроіць каля вёскі Перароўскі Млынок засаду. Некалькі гадзін працягваўся бой. Адзін кацер быў пашкоджаны кулямётчыкам Сцяпанам Торчыкам, другія павярнулі назад.

Вялікую дапамогу партызанам аказвалі мясцовыя жыхары, якія лічылі нас, сваіх абаронцаў, за родных. Я. А. Козел у Перароўскім Млынку схаваў скрынку з патронамі і сем вінтовак, потым перадаў усё у партызанскі атрад. Л. А. Мінчук пякла хлеб для партызан, збірала ў вяскоўцаў і перадавала ім прадукты, мыла бялізну.

Шмат баявых старонак упісаў атрад у гісторыю партызанскага руху на Палессі. На яго баявым рахунку — 11 пушчаных пад адхон варожых эшалонаў, дзесяткі знішчаных аўтамашын. Партызанскі рух на Тураўшчыне рос, мацнеў, усё больш адчувальнымі станавіліся ўдары народных мсціўцаў па акупантах. Восенню 1943 г. Мазырскі падпольны абком партыі стварыў Тураўскі падпольны райком КП(б)Б, сакратаром яго быў зацверджаны П. І. Тарасюк. Пачаўся новы, больш адказны этап работы — арганізоўваць і кіраваць партызанскай барацьбой ва ўсім раёне. Тысячы людзей аддалі сваё жыццё за вызваленне сваёй зямлі ад фашысцкай нечысці. З цеплынёй успамінаў Панцялей Іванавіч сваіх баявых таварышаў камандзіра разведкі атрада Мікалая Засінца, адважных падрыўнікоў Аляксандра Махнача, Хмяльніцкага, сувязных у Тураве Аляксандра Ахраменку, Надзею Меляшчэню, Марціновіча...

В. Р. Феранц

Нас вадзіла маладосць...

Чопчыц Анатоль Данілавіч (н. 28.4. 1923 г. у Леніне) працаваў у калгасе «Нова-Ленін», у 1939 г. уступіў у камсамол. У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў актыўны ўдзел у падпольнай камсамольскай арганізацыі, якая была створана ў навакольных вёсках, потым быў байцом партызанскага атрада, змагаўся з ворагам на фронце. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, медалямі «За адвагу», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» другой ступені і інш.

...Не пашанцавала нам: жылі на правым беразе Случы, які ў 1921 г. стаў тэрыторыяй панскай Польшчы. Многія ленінцы, якія толькі некалькі месяцаў пражылі пры савецкай уладзе, не маглі мірыцца з польскімі ўладамі і пераходзілі граніцу. Сярод іх быў і мой бацька, Чопчыц Даніл Антонавіч, з сям'ёй. Жылі ў куранях, абраблялі зямлю, паціху будаваліся — так узнікла вёска Нова-Ленін.

Наступіў 1929 год. Уступілі, як і ўсе, у калгас «Нова-Ленін», які толькі арганізаваўся. Бацька адвёў на грамадскі двор каня, дзве каровы, аддаў воз і збрую. Хоць сям'я была далёка не заможнай, малодшыя маглі вучыцца ў школе. Але добрае жыццё скончылася ў 1937 г. Тады бяда хадзіла па свеце, не абмінула яна і Нова-Ленін. Людзі з НКУС арыштавалі бацьку, старэйшага брата Сцяпана, які працаваў майстрам па сплаву лесу на Случы, забралі амаль усіх да аднаго мужчын вёскі. Праз многа гадоў давялося дабіцца праўды. Бацьку расстралялі без віны

А. Д. Чопчыц

ў той самы трагічны год, Сцяпана крыху пазней. Было яму толькі 28... Школу давялося кінуць, трэба было самому думаць, як карміць сям'ю. Работа была цяжкая, часам непасільная, а было мне тады 14 гадоў... У такім становішчы апынуліся і мае сябры — Дзмітрый Чопчыц, Уладзімір Мясніковіч, Іван Бугук, Фёдар Чопчыц, Сцяпан Курыловіч і іншыя.

У 1939 г. мы ўступілі ў камсамол. Калі б бацькі нашы сапраўды вінаваты ў чым — хіба нас прынялі б у камсамол?.. Я ніколі не трымаў крыўды на савецкую ўладу. Калі прыйшла бяда, без ваганняў стаў на яе абарону. За родную ўладу аддаў жыццё і мой брат Мікалай. Ён загінуў пры абароне Гомеля ў 1941 г. Трывога за лёс радзімы была вышэйшай за свае асабістыя крыўды...

У першыя дні вайны нас, камсамольцаў, накіравалі з калгасным статкам на ўсход. Дарога была цяжкай і небяспечнай, і адыйсці далёка не змаглі, недзе за Петрыкавам вайскоўцы прынялі жывёлу, мы накіраваліся назад. Сярод нас былі хлопцы з Сукачоў, Лагвошч. Перабраліся каля Перарова праз Прыпяць. Каля Людзяневіч упершыню сустрэлі немцаў. Іх было пяцёра, узброеных аўтаматамі. Нас спынілі, адвялі ў лес. Доўга аб чымсьці спрачаліся паміж сабой, потым адпусцілі. Відаць, адзін настойваў — расстраляць, другія не згаджаліся. Як мы зразумелі, гэта была нямецкая разведка...

Пачалося трывожнае жыццё на акупіраванай ворагам зямлі. Побач Ленін, дзе стаяў гарнізон немцаў і паліцаяў, непадалёку чыгунка, партызаны не раз рабілі там дыверсіі, праходзілі праз нашу лясную вёску, знаходзілі прытулак. Ворагі лютавалі ў Леніне. Асабліва вылучаўся камендант паліцэйскага гарнізона. Ніхто не вяртаўся, хто трапляў у камендатуру. Праз некаторы час з'явіліся карныя атрады, на першым часе — з самых заклятых ворагаў савецкай улады, паліцаяў, якія насілі не белыя, а жоўтыя павязкі на рукаве.

У красавіку 1942 г. Уладзімір Мясніковіч прапанаваў мне пайсці ў Новыя Мілевічы да яго знаёмага Рыгора Пракаповіча. Пракаповіч, як аказалася потым, меў сувязь з партызанскім атрадам. Разам з намі быў і Дзмітрый Чопчыц. З цемры падыйшоў узброены чалавек. Мы не ведалі — хто гэта, прыціхлі... Незнаёмы сказаў, што ён з атрада Камарова, Мікалай Зінчук. Ён у той вечар даў нам першае баявое заданне.

На выкананне яго мы ўзялі таксама свайго сябра Уладзіміра Мініча. Пераплылі Случ каля Моршчынавіч. Там гучала музыка, у паліцаяў была нейкая вечарынка. Дачакаліся, пакуль усё сціхла.У цемры нанасілі саломы да будынка паліцэйскай школы, падпалілі... З-за рэчкі назіралі, як гарэла школа. Пачалася страляніна, але мы былі ў небяспецы.

Праз некаторы час такім самым чынам мы — Дзмітрый Чопчыц, Мікалай Мініч і я — падпалілі будынак, дзе размяшчалася паліцыя, у Лагвошчах. Разбурылі і падпалілі мост паміж Ленінам і Юркевічамі, пашкодзілі тэлефонную сувязь. Перадавалі партызанам звесткі аб дыслакацыі варожых гарнізонаў у вёсках.

...Трэба было даведацца, якія сілы размешчаны ў Леніне на вуліцы Лахаўскай — там былі жандармерыя, казармы нямецкіх салдат і афіцэраў, паліцыя. Я ішоў павольнай, нібы стомленай паходкай, і ўсё разглядваў, прыкмячаў. Раптам дарогу перагарадзіў паліцай з жоўтай павязкай на рукаве. Я ведаў яго — Сяргей Герман. «А, бальшавік!.. Прыйшоў разведаць»,— п'яным го-

ласам закрычаў здраднік і з усяе сілы ўдарыў у пах. Я ўпаў. Азвярэлы паліцай пачаў біць мяне ботамі. «Уцякай, хлопец!» — крычалі людзі, якія сабраліся навокал. Перасільваючы боль, мне ўдалося вылучыць зручную хвіліну і кінуцца наўцёкі. Прыйшоў не дамоў, а да сябра, Уладзіміра Мясніковіча. Там быў і Аляксандр Чопчыц. Ён сказаў:

— Уцякай, Анатоль, пакуль не позна. Дома паліцаі ўсё ператрэслі, цябе шукаюць...

Мы з Уладзімірам падаліся ў партызанскі атрад, дарогу куды добра ведалі. А праз некаторы час да нас далучыўся і наш выпрабаваны сябра Дзмітрый Чопчыц. Уладзімір Мясніковіч у 1943 г. быў прызначаны сакратаром Жыткавіцкага падпольнага райкома камсамола. Атрад «1 Мая» у той час размяшчаўся непадалёку ад Новых Мілевіч. У яго прыходзіла шмат людзей з ленінскай зоны. Сярод іх былі мае знаёмыя Іван Бугук, Барыс Бугай, Уладзімір Мініч, Мікалай Мініч, Іван Лушчык, Гаўрыл Мясніковіч, Казімір Герман, Віктар Лаўніковіч, Іван Бакуновіч і многія іншыя.

Партызанскія будні былі нялёгкімі і суровымі. Не абыходзілася без страт. У час блакады партызанскага атрада ў лютым 1943 г. у Нова-Леніне карнікі схапілі нашага сябра Казіміра Германа. Ён быў паранены. Ворагі прывязалі яго за ногі да каня, цягалі па вуліцы, пакуль ён не памёр... Смерцю храбрых загінуў у 1943 г. пры выкананні баявога задання і наш слаўны таварыш Мікалай Мініч. Сваіх баявых сяброў я не забуду ніколі...

Не раз пры выкананні баявых заданняў вызначаліся Іван Рэхцік, Сцяпан Бандзюк, Андрэй Саско і іншыя. Блакіравалі дзоты, узрывалі на дарогах аўтамашыны, закладвалі міны пад рэйкі, знішчалі лініі сувязі...

Усе баявыя дзеянні атрада цяжка пералічыць. Партызаны змагаліся мужна, самааддана. У атрадзе былі людзі многіх нацыянальнасцей — беларусы і рускія, украінцы і грузіны. Гэта была моцная, адзіная сям'я, таму мы і перамаглі.

Потым ваяваў у радах Чырвонай Арміі, у складзе другога Беларускага фронту, у 73-й дывізіі. Вызвалялі Польшчу, потым 48-я армія была перакінута на ліквідацыю ўсходне-прускай групіроўкі немцаў. Пад Кенігсбергам загінуў баявы сябра Б. С. Бугай, з якім я два гады назад прабіраўся ў партызанскі атрад, я быў паранены. Вярнуўся на радзіму толькі ў 1948 г. Рукі смуткавалі па мірнай працы, і работы ім было столькі, што адпачынку не ведалі на працягу дзесяцігоддзяў.

А. Д. Чопчыц

ХАРАКТАРЫСТЫКА
НА ПАРТЫЗАНА АТРАДА «1 МАЯ» 50-Й ЖЫТКАВІЦКАЙ БРЫГАДЫ ТАВ. А. Д. ЧОПЧЫЦА, 1922 г. НАРАДЖЭННЯ, БЕЛАРУСА, АДУКАЦЫЯ 5 КЛАСАЎ

За час знаходжання ў партызанскім атрадзе праявіў сябе смелым, дысцыплінаваным, маральна ўстойлівым таварышам.

У партызанскім атрадзе з кастрычніка 1943 г. па 6 ліпеня 1944 г.

На баявым рахунку мае: пушчаных пад адхон 2 варожых вайсковых эшалоны з жывой сілай і боепрыпасамі, пры гэтым знішчаны 2 паравозы, 4 класных вагоны з жывой сілай, 5 вагонаў з боепрыпасамі.

Знішчана з засад 8 фрыцаў і 4 паліцэйскія. Узарвана на мінах 6 фрыцаў.

Падарвана за 10 выхадаў 6 рэльсаў, 7 разоў удзельнічаў у блакіраванні дзотаў.

З 6 ліпеня 1942 г. быў партызанскім сувязным.

За баявыя заслугі камандаваннем атрада прадстаўлены да ўрадавай узнагароды.

Камандзір брыгады *Гушчэня*
5.8.44 г. Начальнік штаба брыгады *Асокін*



Набліжаецца радасны дзень вызвалення нашай роднай Беларусі.

Шалёнымі контратакамі вораг імкнецца затрымаць наступленне савецкіх войск, але гэтыя атакі не прыносяць ягоным войскам жаданага поспеху, а толькі павялічваюць іх страты.

Слаўныя партызаны і партызанкі!

Дапамагайце Чырвонай Арміі!

Ачышчайце совецкую зямлю ад фашысцкай пагані!

Біце нямецкіх захопнікаў да поўнага іх знішчэння!

Смерць нямецкім акупантам!

Зак. 59—100000 Выданне ЦК КП(б) Беларусі, 1942 г.

Лістоўка, якую распаўсюджвалі партызаны

* * *

У верасні 1943 г. у размяшчэнні партызанскага атрада «За Радзіму» была арганізавана падпольная тыпаграфія, узноўлены выпуск раённай газеты «Ленінскія заветы» — органа падпольнага Тураўскага райкома КП(б)Б. Рэдактарам газеты быў прызначаны І. Пакінька, члены рэдкалегіі — Ф. Гук, А. Богуш, Ф. Міцюрыч, Д. Зямлянік. Кожны нумар з вялікай цікавасцю сустракалі партызаны, дзе знаходзілі матэрыялы аб баявых справах таварышаў, становішчы на фронце, жыцці тыла. Распаўсюджвалася газета і ў Тураве. У многім дзякуючы агітацыі са старонак газеты была сарвана нарыхтоўка сельскагаспадарчых прадуктаў восенню 1943 г.: з 300 т хлеба і 500 т бульбы акупанты вывезлі толькі 24 т хлеба.

Баявая маладосць

З успамінаў былой партызанкі атрада «За Радзіму», супрацоўніцы тураўскай падпольнай раённай газеты «Ленінскія заветы» Ф. Я. Гук

...Даваенны Тураў — маляўнічы гарадок у глыбіні Палесся, раённы цэнтр. Мураваныя будынкі грамадскага цэнтра, вымашчаныя брукам тратуары, вялікая колькасць зеляніны, маляўнічая наберажная Прыпяці. З году ў год мацнеў тураўскі калгас «Новае жыццё». Летнімі вечарамі з парку чуліся гукі аркестра... Усё гэта абарвалася ў адзін дзень.

22 чэрвеня на Чырвонай плошчы Турава адбыўся шматлюдны мітынг. Тут сабраліся калгаснікі, рабочыя і служачыя прадпрыемстваў і ўстаноў. На мітынг мы прыйшлі ўсім сваім калектывам рэдакцыі і друкарні раённай газеты «Ленінскія запаветы» (тады я працавала карэктарам у рэдакцыі). Прамоўцы гаварылі аб пакутах і страшным горы, якія нясе фашызм нашаму народу.

На другі дзень вайны, 23 чэрвеня, мы, камсамольскія актывісты, сабраліся ў кабінеце першага сакратара райкома камсамола Энны Піліпаўны Шубянок.

Гаварыла яна, як заўсёды, проста і шчыра, крыху ўзрушана, кожнае яе слова захапляла, глыбока кранала сэрцы ўсіх нас.

«Цяпер наша жыццё павінна быць падпарадкавана адной мэце — барацьбе за перамогу над ворагам. Да гэтага нас кліча партыя. Я ўпэўнена, што камсамол Тураўшчыны не падвядзе»...

Быў выпрацаваны дэталёвы план дзеянняў, кожная камсамольская арганізацыя атрымала канкрэтнае даручэнне.

Хутка ў Тураў пачалі прыбываць першыя параненыя. Сярод іх было многа маракоў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, якія аказалі жорсткае супраціўленне ворагу. У памяшканні сярэдняй школы, што знаходзілася на горцы, каля Запясочча, быў разгорнуты шпіталь. Пасля рабочага дня, з вечара і да раніцы, мы дзяжурылі ў шпіталі, дапамагалі

перавязваць параненых. І Энна Піліпаўна была з намі, працавала нароўні з усімі, не ведаючы стомы.

Хутка рэха вайны дакацілася і да Турава. Чуваць была артылерыйская кананада, снарады і бомбы рваліся на подступах да раённага цэнтра. Памятаю, 5-га ліпеня мы выпусцілі апошні нумар раёнкі, дзе быў надрукаваны зварот партыі да савецкага народа. Дапазна працавала друкарская машына, мы выкарысталі ўвесь запас паперы, каб размножыць зварот для ўсіх жыхароў раёна.

А ўвечары камуністы і камсамольцы сабраліся ў райкоме партыі. Дамоў ужо не вярнуліся. Мы сталі байцамі партызанскага атрада «За Радзіму». Мне ішоў тады дзевятнаццаты год.

Камандзірам атрада быў прызначаны начальнік Тураўскага раённага аддзела міліцыі Мікалай Іванавіч Голікаў. У кіраўніцтва ўваходзілі таксама В. П. Савін і П. І. Тарасюк.

Нас, дзяўчат-камсамолак, было ў атрадзе трое: першы сакратар райкома Энна Піліпаўна Шубянок, старшыня райкома Чырвонага Крыжа Геня Запясоцкая і я. Нароўні з мужчынамі мы пераносілі цяжкасці партызанскіх будняў, выконвалі любыя даручэнні. Партызаны паяўляліся ўсюды, у самых нечаканых для праціўніка месцах, смела ўступалі ў барацьбу з гітлераўцамі і іх прыхваснямі — паліцаямі. Разбуралі камунікацыі і сродкі сувязі ворага, рабілі засады, адным словам — зямля гарэла пад нагамі акупантаў.

...У адзін са жнівеньскіх дзён 1941 г. раніцай на досвітку былі бясшумна зняты варожыя пасты, камендатура закідана гранатамі і ўвесь нямецка-паліцэйскі гарнізон знішчаны. Партызанская конніца ўступіла ў Тураў. Былі захоплены трафеі — зброя, боепрыпасы.

У той час фашысты ўсюды трубілі аб сваёй хуткай перамозе. Але смелая вылазка народных мсціўцаў натхніла людзей, узняла іх на барацьбу з гітлераўцамі. Мы расказалі жыхарам райцэнтра праўду, распаўсюдзілі свежыя лістоўкі з апошнімі зводкамі Савецкага Інфармбюро аб становішчы на франтах, аб жорсткіх баях, якія вяла тады Чырвоная Армія за кожную пядзю савецкай зямлі. На плошчы ля будынка райвыканкома сабралася шмат людзей. Перад народам выступілі камандзір атрада, камісар, а таксама Энна Піліпаўна Шубянок. Яны заклікалі ўсіх на барацьбу з захопнікамі.

Памятаю, як у час мітынгу да камандзіра атрада праціснулася старэнькая бабуля: «Скажы, сынок, значыць, жыве наша Савецкая ўлада?». «Так, жыве і будзе жыць!»,— адказаў камандзір.

Наш атрад папоўніўся многімі добраахвотнікамі з Турава і навакольных вёсак. Праўда, доўга ўтрымліваць раённы цэнтр у сваіх руках нам не прыйшлося. Гітлераўцы кінулі сюды карны атрад. Завязаўся бой, але сілы былі няроўныя. Партызаны вымушаны былі адступіць.

Азвярэлыя фашысты спалілі Тураў, расстралялі многіх яго жыхароў, у тым ліку і майго бацьку. Карнікі не шкадавалі ні старых, ні малых. Не было такой сям'і, дзе б не было забітых, а некаторыя сем'і былі знішчаны поўнасцю.

Атрад адступіў за Азяраны. З болем у сэрцы мы глядзелі на пылаючы Тураў. Былі спалены і многія вёскі раёна, расстраляны сотні жыхароў.

Не раз яшчэ наш атрад уступаў у адзінаборства з нямецка-паліцэйскімі гарнізонамі на тэрыторыі Тураўскага, Лельчыцкага і Ельскага раёнаў. Але кола блакады сціскалася ўсё тужэй. Фашысцкія карныя атрады праследавалі нас ўсюды. Без падрыхтаванай матэрыяльнай базы атраду прыходзілася вельмі цяжка.

Мы кожны дзень траціліі баявых таварышаў.

Памятаю наш апошні бой ля вёскі Рэмязы Ельскага раёна. Стаяла глыбокая восень, пачаліся замаразкі. Вечарэла. Пасля доўгага пераходу атрад спыніўся на ўзлеску, каб адпачыць, абсушыцца ля кастра. І раптам мы трапілі пад перакрыжаваны агонь. Усе зразумелі — нас акружылі. Камандзір атрада распарадзіўся: «Прабівацца ў адзін бок — праз балота, а потым сабрацца па сігналу трох выстралаў з вінтоўкі».

Не ведаю, якім цудам я выбралася з гэтага пекла. Мокрая, знясіленая, я ледзь цягнула ногі. Нарэшце пачуліся тры стрэлы. Я павярнула ў той бок. На лясной палянцы стаяла невялікая група людзей. Адзін з іх аддзяліўся і пабег мне насустрач. На ўсякі выпадак я ўзялася за карабін, але хутка пазнала: гэта быў камандзір атрада Мікалай Іванавіч Голікаў.

— Жывая? — усклікнуў ён, і дапамог мне зняць мокры ранец.

Сярод прысутных Энны Піліпаўны не было. Некалькі дзён пошукаў нічога не далі. Больш нікога мы не знайшлі. Напэўна, яна падалася ў другі бок.

Камандзір атрада прыняў рашэнне: дзейнічаць такой групай небяспечна і пакуль няма сэнсу. Было вырашана ўсім перайсці ў падполле. Мне было прапанавана вярнуцца на Тураўшчыну і там працягваць падпольную работу.

— Я веру,— сказаў тады Мікалай Іванавіч Голікаў,— што прыйдзе час і мы сустрэнемся з вамі ў новым атрадзе «За Радзіму», які ў хуткім часе будзе зноў створаны на Тураўшчыне.

І сапраўды, яго словы збыліся. Праз год тут ужо дзейнічаў атрад «За Радзіму» пад камандаваннем Васіля Іванавіча Прасолава, які стаў гразой для фашысцкіх захопнікаў.

Для падпольнай работы ў Тураве быў вельмі цяжкі час. Кожны дзень навісала пагроза арышту і расправы. Я цяжка захварэла на тыф. Тады мяне прытуліла добрая, спагадлівая жанчына — Ксенія Казёл. Толькі дзякуючы яе клопатам я без ніякай медыцынскай дапамогі ўстала на ногі. Добрым словам хочацца ўспомніць Лізавету Андрэеўну Радзівонаву, Фядору Міхайлаўну Ласко, у сем'ях якіх мне таксама давялося жыць, Івана і Вольгу Хілінскіх і многіх іншых. Рызыкуючы сваім жыццём, яны своечасова папярэджвалі мяне аб небяспецы, дапамагалі чым маглі, дзяліліся апошнім кавалкам хлеба. Такія якасці ў нашых людзей праяўляюцца ў час выпрабаванняў.

Ранняй вясной 1943 г. была наладжана сувязь з новым атрадам «За Радзіму». Актыўна дапамагаў мне ў гэтым наш смелы і кемлівы сувязны Валодзя Марціновіч з в. Дварэц. Кожнае заданне хацелася выканаць як мага лепш, я ведала, што сваім сціплым укладам мы набліжаем Перамогу. Калі навісла пагроза арышту, я была адазвана ў атрад.

І вось наступіў для нас доўгачаканы, радасны дзень. У студзені 1944 г. атрад сустрэўся з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі.

Ф. Я. Гук

НЯМЕЦКІ ПАСЛУГАЧ БЫЎ, ЯК СУКА

З апавяданняў Ігната Булавы з-пад Турава

Вось і вясна прыйшла, і цёпла стала. І зазелянела ўсё. І рэчка пры лесе ачысцілася ад лёду. І ўсё навокал падчысцілася, падхарашылася, паспрытнела, палягчэла, павесялела. І фрыц, худы і доўгі як жэрдка, надумаўся пазграбнець на вясну. Што ж,— падумаў ён сабе,— пакуль прыйдзецца ў вясновым наступленні, пра якое кажа фюрэр, лыткі стуліць навек, дык хоць

тыдняў са два пабыць чалавекам. А вядома, што такое па-нямецку быць чалавекам. Вось і пачаў ён рабіцца нямецкім чалавекам.

А трэба сказаць вам, што за зіму ён стаў вельмі падобным на валачашчага сабаку. На яго галаве распладзілася вошай гэтулькі, колькі за дзень злятае брахні з языка ў Гебельса. З яго шыі кароста звісала шышкамі. Ён чухаўся, дзёр і грэў у прасмердлых анучах абмарожанае вуха. А цяпер прыгрэўся на сонцы, выпарыў з галавы вошы, чысцей прыадзеўся і атрымаў нейкі чын пры каменданце ў нашым мястэчку, бо ранейшых чыноў мы там ніводнага за зіму не пакінулі.

І вось у новым чыне ён, з веснавой прычыны, прыглядзеўся да дачкі местачковага старасты Сымона Пшыкуна. А гэта Пшыкуноўна ходзіць як загладуха, пакручваецца перад кавалерам і спадзяецца, што той возьме яе за жонку. І Пшыкун стаў дагаджаць фрыцу. Адпаіў яго, адкарміў і зяцем сваім зрабіў. Дык гэты зяцёк тыдняў два нешта як у мяду плаваў у Пшыкуновай лагодзе, а потым павёз маладую жонку ў Германію. Ехала кампанія. Напіліся і нажэрліся, чаго Пшыкун даў на дарогу, а пасля загаўкалі сваю песню ды спіхнулі Пшыкуноўну з поезда пад мост.

Неўзабаве водпуск яго скончыўся і ён вярнуўся і сказаў, што маладая жонка ўжо ў Германіі. Пшыкун рады, а фрыц таксама рады, што стаў чалавекам — пасыцеў на Пшыкуновым хлебе, блішчаць стаў.

Тут мы ў адну ціхую ночку наскочылі з атрадам і камендант толькі айкнуў і канцы. Паліцэйскія таксама. А фрыца і старасту Пшыкуна жывымі ўзялі. У нас у атрадзе мы яму сказалі, што ведаем, як яго дачка жыве ў Германіі. У адзін момант ён узненавідзеў фрыца і выў як сука. Як сука ён і здох разам са сваім фрыцам ад нашай кулі.

«Звязда», чэрвень 1944 г.

З першага дня вайны

Корж Васіль Захаравіч (Камароў) (н. 1.1. 1899 г. у в. Хорастава Ленінскай вол.) — адзін з арганізатараў і актыўных удзельнікаў партызанскага руху на Палессі. Генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза (1943 г.). Удзельнічаў у партызанскай барацьбе супраць белапалякаў у гады грамадзянскай вайны, змагаўся ў складзе інтэрнацыянальнай брыгады ў Іспаніі, дзе ўзначальваў інтэрнацыянальны атрад рэспубліканцаў і быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі. Перад вайной працаваў у Пінскім абкоме КП(б)Б, 22 чэрвеня 1941 г. прыступіў да фарміравання партызанскага атрада, які ў пачатку ліпеня даў першы на Беларусі бой гітлераўцам каля Пінска. Шмат баявых аперацый партызанскі атрад В. З. Каржа здзейсніў на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, дзе ён базіраваўся восенню 1941 г., неаднаразова заходзіў для выканання заданняў у наступныя гады, калі вырас у буйное Пінскае партызанскае злучэнне пад камандаваннем партызанскага генерала. За баявыя заслугі В. З. Корж узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, Айчыннай Вайны I ст., медалямі. У пасляваенны час працаваў намеснікам міністра лясной гаспадаркі рэспублікі, узначальваў калгас «Партызанскі край» у роднай вёсцы.

Памёр В. З. Корж 5.5.1967 г.

В. З. Корж

Да вечара 22 чэрвеня 1941 г. у Пінску быў у асноўным сфарміраваны партызанскі атрад, усім партыйным і савецкім работнікам раздадзена зброя. Атрад налічваў каля 60 чалавек. Сярод іх былі Сяргей Карнілаў, загадчык ваеннага аддзела Пінскага гаркома КП Беларусі, Вера Харужая, інструктар абкома, Бярковіч, сакратар Пінскага гаркома ЛКСМБ, Рыгор Карасёў, дырэктар абласной нарыхтоўчай канторы... Гэтыя таварышы з'яўляліся баявым ядром партызанскага руху на Піншчыне.

28 чэрвеня мы накіравалі на тракт Пінск — Лагішын групу на чале з Карасёвым і Куньковым для аховы горада і разведкі. Каля в. Падбалоцце заўважылі рух варожых танкаў. Партызаны залеглі ў рове і адкрылі

дружны агонь. Камандзір аддзялення Салохін звязаў некалькі гранат і кінуў іх пад танк. Ён закруціўся на адным траку і спыніўся, другі танк павярнуў назад. Партызаны захапілі першыя трафеі.

У ноч на 4 ліпеня разведка заўважыла рух варожай кавалерыі з Лагішына на Пінск. Было прынята рашэнне затрымаць фашыстаў на подступах да горада, даць магчымасць эвакуіравацца грамадзянам, хто яшчэ не паспеў гэтага зрабіць. Атрад выйшаў у раён в. Галева, на поўнач ад Пінска, частка байцоў размясцілася на вясковых могілках, частка — у садзе маёнтка Заполле. Калі разведка ворага колькасцю да эскадрона з'явілася з боку в. Іванікі, партызаны адкрылі агонь. Было забіта 17 гітлераўцаў. Фашысты ў паніцы кінуліся пад прыкрыццё дрэў саду, але там іх сустрэла засада. Атрад гранатамі і бранябойнымі кулямі знішчыў дзве танкеткі з экіпажамі. У тым баі загінуў камандзір аддзялення Сяргей Карнілаў. Наш слаўны баявы таварыш Іван Чуклай вынес яго з поля бою, але раны Сяргея былі смяротнымі.

На Пінск, лёс якога быў ужо вырашаны, ад Брэста коцілася лавіна варожых танкаў і бронемашын. Атрад накіраваўся ў Столінскі раён, адтуль — у Ленінскі. У раёне Мікашэвіч сустрэліся з атрадам Сахарава, які складаўся ў асноўным з мясцовых жыхароў. На сумесным пасяджэнні нашых атрадаў было вырашана рухацца ў напрамку Леніна, рабіць засады, знішчаць ворага. Але хутка Сахараў памяняў сваё рашэнне і накіраваўся на ўсход услед за рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі. Прыйшлося працягваць барацьбу сваімі сіламі.

У канцы ліпеня 1941 г. мы вырашылі звязацца з Цэнтральным камітэтам КП(б)Б. За лінію фронту была накіравана група з чатырох чалавек на чале з Верай Харужай. Больш з ёю я не сустрэўся...

У Жыткавіцкім раёне паміж вёскамі Пясчанікі і Баравая бесперапынна рухаліся варожыя машыны. Мы пачалі знішчаць іх. Адначасова рабілі засады на розных участках дарогі. 5 жніўня напалі на аўтамашыну і знішчылі ў ёй 15 гітлераўцаў, захапілі 10 вінтовак з боепрыпасамі. Праз некалькі дзён на дарозе паміж Ленінам і Жыткавічамі партызаны разгромілі групу варожых матацыклістаў. Гэтая дарога, як і іншыя, знаходзілася пад нашым кантролем. Праз некаторы час мы ліквідавалі валасную ўправу і паліцэйскі ўчастак у в. Баравая. Былі знішчаны паліцэйскія гарнізоны ў в. Забродзе і ў іншых вёсках Ленінскага і Жыткавіцкага раёнаў.

...12 лістапада ў 6 гадзін раніцы, калі было яшчэ зусім цёмна, атрад заняў пазіцыю каля Забродзя, абкружыўшы вёску з усіх бакоў. У перадранішнім змроку бачны хаты.

Я падышоў да хаты паліцая і моцна загрукаў у дзверы.

— Хто там? — пачуўся хрыплы голас.

— Камендант Шульц,— грозна адказаў адзін з нашых партызанаў Нордман.

Я выступаў у ролі перакладчыка «каменданта»:

— Пан камендант хоча пагаварыць з табой.

«Камендант» выкрыкваў асобныя нямецкія словы. Загрукаў засоў, дзверы адчыніліся. У дом увайшлі двое нашых байцоў, Данілевіч і Быкаў. Паліцэйскі, напэўна, здагадаўся, хто мы, рэзкім рухам збіў лямпу і накінуўся на аднаго з партызан. Але я хутка апамятаўся, захапіў здрадніка моцным прыёмам і выцягнуў на двор... Аперацыя ў Забродзі закончылася, ніводнаму паліцаю не ўдалося скрыцца.

...У бесперапынных рэйдах, засадах, сутычках і баях з акупантамі прайшла зіма. Шмат баявых апера-

цый мы здзейснілі ў Любанскім, Старобінскім, Слуцкім, Ленінскім, Жыткавіцкім раёнах. 2 красавіка 1942 г. разам з групай быўшага камандзіра кавалерыйскай дывізіі генерала Канстанцінава разграмілі гарнізон у в. Пасталы.

Яшчэ ў лютым 1942 г. у Драгічынскім раёне быў створаны партызанскі атрад на чале з М. Ц. Шышам, М. І. Герасімавым і Д. К. Удовікавым. М. Ц. Шыш загінуў у чэрвені 1942 г., атраду было прысвоена яго імя, камандаванне было даручана М. І. Герасімаву. У Ленінскім раёне мы пачалі дзейнічаць сумесна. Найбольш удачнай аперацыяй, у якой удзельнічалі разам з нашым атрады Пятровіча і Шыша, быў разгром варожага гарнізона ў Леніне 12 верасня 1942 г. Групамі штурму камандавалі Шырын, Герасімаў і Паталах.

Штаб атрада падтрымліваў пастаянную сувязь з суседзямі. Іх прадстаўнікі знаходзіліся ў нас, а нашы — у другіх атрадах. Калі ўзнікла думка нападзення на гарнізон у Леніне, я запрасіў да сябе камандзіраў атрадаў, якія дзейнічалі побач. Прыбылі В. А. Васільеў і камісар гэтага атрада І. В. Зібараў, М. І. Герасімаў з Д. К. Удовікавым, А. П. Савіцкі з Ф. І. Лісовічам, камандзіры асобна дзеючых атрадаў.

Я праінфармаваў іх аб тым, якая абстаноўка ў вобласці, якімі сіламі валодае вораг, што ён робіць для барацьбы з партызанамі, потым расказаў пра фашыстаў, што заселі ў раённым цэнтры Ленін і твораць там нечуваныя зверствы. Мястэчка размешчана ўбаку ад чыгункі і другіх гарнізонаў ворага. Звыш тысячы савецкіх грамадзян расстраляны ў гэтых месцах. У турме пакутуюць многія савецкія грамадзяне. Трэба адпомсціць ворагам за забітых, вызваліць зняволеных...

Вырашылі, што нападзенне на гарнізон зробяць атрады Камарова (В. З. Каржа), Пятровіча (А. П. Савіцкага) і імя Шыша (М. І. Герасімава) — усяго каля 150 чалавек. У іх на ўзбраенні — 9 ручных кулямётаў, 7 аўтаматаў, астатнія з вінтоўкамі. Агульнае кіраванне аперацыяй было даручана П. Г. Паталаху — намесніку М. І. Герасімава. Усе сілы партызан разбілі на пяць баявых груп. Адну групу размясцілі на шляху верагоднага адходу немцаў, другую паслалі ў засаду з боку Сінкевіч і Мікашэвіч, каб не даць ворагам прыслаць падмацаванне. Пачатак аперацыі — сігнал чырвонай ракеты.

...Гарачы бой разгарэўся каля самой камендатуры. Вартавы заўважыў партызан, выстраліў. Яго хутка знішчылі і кінуліся наперад. Асноўнае супраціўленне аказалі ворагі, якія ўмацаваліся ў цаглянай казарме. Яе атакавалі байцы на чале з начальнікам штаба атрада Д. К. Удовікавым. Гітлераўцы сустрэлі іх

Мемарыяльны знак на месцы разгрому партызанамі пад кіраўніцтвам В. З. Каржа фашысцкага гарнізона ў в. Ленін

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ



З. І. Нікіценка, камендант партызанскай зоны пасля ўзнаўлення Ленінскага раёна ў 1942 г.

шчыльным агнём, нельга было прыўзняць галавы. Партызаны залеглі, прыціснуліся да зямлі.

Камандзір роты Юрый Самаркін заўважыў, што бліжэй да будынка — «мёртвая зона», там можна схавацца. Але раней трэба пераадолець гэтыя некалькі пякельных дзесяткаў метраў. Юрый счакаў хвіліну, прыўзняўся і кінуўся наперад. Цяпер ён быў у адноснай небяспецы.

За ім прабраўся Удовікаў — іх прыкрывалі партызаны агнём ручнога кулямёта. У Юрыя была вінтоўка і наган, у камісара — аўтамат, гранаты. Адну ён кінуў у акно. Зазвінела шкло, пачуўся выбух. Гэта выкарысталі партызаны і кінуліся наперад.

Бой у казарме быў надзвычай цяжкім. Партызаны схапіліся ўрукапашную, цяснілі ворага — чакалі стрэлу ці ўзрыву гранаты за кожным вуглом...

Праз гадзіну бой закончыўся. Згарэлі будынкі камендатуры, паліцэйскага ўчастка, раённай управы, маслазавода. Партызаны вызвалілі 48 савецкіх людзей, якія былі прыгавораны да смерці. Многія з іх працягвалі барацьбу з захопнікамі ў партызанах.

Разгром варожага гарнізона ў Леніне дазволіў ачысціць ад немцаў увесь Ленінскі раён, стварыць асноўную базу для партызанскіх атрадаў. Савецкая ўлада на тэрыторыі раёна існавала з верасня 1942 да студзеня, а ў многіх вёсках — лютага 1943 г.

У канцы 1942 г. у раён нашага партызанскага краю прыбыло злучэнне С. А. Каўпака. Украінскія партызаны фарсіравалі Прыпяць, выйшлі да Князь-возера і размясціліся ў прыбярэжных вёсках. Штаб Каўпака знаходзіўся ў Ляхавічах. Упершыню адбылася наша сустрэча з Каўпаком і яго баявымі сябрамі. У в. Н. Мілевічы па прапанове Сідара Арцёмавіча адбылося пасяджэнне прадстаўнікоў партызанскіх атрадаў, дзе разглядаліся пытанні аб расчыстцы аэрадрома на возеры, сувязі і каардынацыі баявых дзеянняў. А потым С. А. Каўпак, рухаючыся на Карпаты, наведаў наш штаб у в. Хорастава.

Дыслакацыя буйных партызанскіх сіл на Піншчыне, адкрыццё партызанскага аэрадрома, актывізацыя дзеянняў партызан вымусіла гітлераўцаў адазваць з фронту значныя сілы і, узмацніўшы іх танкамі і самалётамі, арганізаваць буйнамаштабную карную акцыю.

11 лютага пачалося наступленне ворага на Ленін, Морач, Сітніцкія хутары. Партызаны занялі абарону. Атрады імя Шыша і імя Чапаева стрымлівалі карнікаў каля Беразняковў і Цімашэвіч, атрад Дамброўскага — у раёне в. Грычынавічы... Сілы былі няроўныя, у нас не хапала боепрыпасаў, мы вымушаны былі адысці. У ноч на 13 лютага атрады Дамброўскага, імя Шыша і імя Чапаева занялі абарону ў раёне вёсак Хорастава — Чаланец, але ў ворага была такая значная перавага ў сіле, што весці баі мы не маглі, і пачалі падрыхтоўку да адступлення ў Лагішынскі і Целяханскі раёны... У адным з жорсткіх баёў каля Выганоўскага возера смерцю храбрых загінулі сакратар падпольнага Ленінскага райкома КП(б)Б Дамброўскі, начальнік штаба Баброў, палітрук Шырай...

В. З. Корж

У блакадныя дні

Яфімовіч Уладзімір Іванавіч (н. 28.10. 1926 г. у в. Новыя Мілевічы) вучыўся ў школе і адначасова працаваў у калгасе ў Бабруйскім раёне, куды была выслана сям'я. У гады вайны актыўна супрацоўнічаў у падпольнай газеце «Палеская праўда». Ваяваў у складзе II Прыбалтыйскага фронту. Пасля вайны — рэдактар газеты палітаддзела Ленінскай МТС, затым на працягу 30 гадоў быў рэдактарам Камянецкай раённай газеты Брэсцкай вобласці.

Дзяды і прадзеды нашы жылі ў Леніне і ў Мілевічах, а бацькам у старых, перанаселеных вёсках месца ўжо не было, дакладней, не было зямлі. Давялося шукаць яе, здабываць на другім беразе Случы — раскарчоўвалі лес, абраблялі на хутарах свае лапікі, так і жылі. Паступова з хутароў утварылася вёска, хат каля ста — Новыя Мілевічы, былі яшчэ Новы Ленін, Новыя Залюцічы. У гэтых, у новых, зусім па-другому склаўся лёс — прыйшоў час, калі старыя вёскі засталіся па той бок мяжы, а мы трапілі на савецкі бок, у лепшую, шчаслівую долю... Сем'і былі ў сялян надзвычай вялікія, напрыклад, у бацькі налічвалася 14 дзяцей — 13 хлопцаў і дзяўчына. Як іх пракарміць? Да вялікіх вёсак, дзе былі крамы, доктар, школа — дзесяткі кіламетраў. Уся надзея — на зямлю, ды на свае рукі, на сваё здароўе. А зямля была добрая, урадлівая, яна выдатна ўгнойвалася, жывёлы трымалі многа. У шэсць гадоў я ўжо касіў, хадзіў за плугам, палоў лён, пілаваў дровы. Бацька браў мяне на рэчку лавіць рыбу, выбіраць мёд з борцяў.

У. І. Яфімовіч. 1944 г.

Бацька ўступіў у калгас. Але працаваць у арцелі давялося нядоўга, хутка ўсіх нас, як і многіх іншых вяскоўцаў, перасялілі з берага Случы за 200 кіламетраў на ўсход, завезлі пад Рагачоў — блізка за граніцай, бачыце жывуць сваякі...

На новым месцы нас сустракалі з духавым аркестрам, чамусьці прынялі за бежанцаў з Іспаніі, дзе тады ішла грамадзянская вайна. Пасялілі ў доме, гаспадара якога раскулачылі і выслалі ў Сібір. Гэта быў проста надзвычай працавіты селянін... Бацька там, у высылцы, і памёр, маці ўвесь час хварэла. Я працаваў у калгасе, пасвіў цялят і адначасова вучыўся ў школе. Да вайны паспеў закончыць пяць класаў.

...Вайна. Ворагі рваліся да Бабруйска, дзень і ноч навокал грымелі баі. Калі яны сцішыліся, маці сабрала мяне ў далёкую дарогу на радзіму. «Пабачыш, што там робіцца, калі можна будзе, забярэш нас адсюль... Я, можа, ужо не перазімую...»

Праз пяць дзён я быў у Новых Мілевічах. Зайшоў да сваякоў у Ленін. Мяне схапілі немцы, прыняўшы за партызана. Цудам удалося выратавацца: дзед сабраў подпісы ўсіх вяскоўцаў, якія пацвярджалі, што я сапраўды тутэйшы, быў пакрыўджаны бальшавікамі... Жыў у Леніне ў дзядзькі Максіма, непадалёку ад горкі, і штодзень назіраў, як фашысты расстрэльвалі каля яе мясцовых жыхароў, найбольш яўрэяў, часта — палонных чырвонаармейцаў ці партызан.

Маці так і не ўдалося прывезці ў Новыя Мілевічы. Паблізу Старых Дарог была ўстаноўлена граніца, каб перайсці яе, трэба было атрымаць дазвол недзе ў Мінску. Больш я не бачыў маці. Ужо потым даведаўся, што яна памерла праз год,

як я вярнуўся на радзіму. У канцэнтрацыйным лагеры ў Парычах загінуў малодшы брат Коля.

Потым жыў у Новых Мілевічах, у сястры Фёклы. Муж яе, Рыгор, загінуў, пакінуўшы пяцёра малалетніх дзяцей і я стаў за гаспадара ў вялікай сям'і сястры. Да нас часта заходзілі партызаны, немцы ў партызанскую зону да часу баяліся з'яўляцца. У Новых Мілевічах знаходзілася партызанская камендатура.

Я пісаў вершы пра партызанскія справы, пра жыццё ў партызанскай зоне. «Песня пра Івана Чуклая» пасля вайны не раз друкавалася ў родных паэтычных зборніках, газетах і часопісах. Набліжалася другая ваенная зіма. Было зразумела, што калі мароз скуе балоты і непраходныя дарогі, фашысты паспрабуюць пакараць партызанскую вёску. Партызанская камандаванне вырашыла стварыць новую базу, па сутнасці, пабудаваць новую вёску. Вышлі з піламі, сякерамі, заступамі ўсе вольныя ад службы партызаны, сяляне, старыя і малыя. Крыху больш як за тыдзень у глухім лесе вырасла сапраўдная вёска. Яе абкружылі траншэямі, у кожнай з вялікіх зямлянак з печамі магло змясціцца дзесяць сямей.

Бяда набліжалася. Раніцай 11 лютага 1943 г. пачалася аблава. У карнікаў былі самалёты, танкі, гарматы. Следам ішлі падводы з мабілізаваным мірным насельніцтвам для вывазу нарабаванага дабра... За некалькі гадзін перад уступленнем у вёску карнікаў Новыя Мілевічы апусцелі. Мы закапалі частку пажыткаў у хляве, дзе была мяккая зямля, частку захавалі ў гурбах снегу — спадзяваліся, што хутка вернемся. Я запрог каня, пасадзіў у сані дзяцей — і ў лес. На ўскраіне вёскі ўжо чуліся стрэлы і выбухі. Пачалася завіруха, адразу замятала след, падводы, а іх сабраўся цэлы абоз — ледзь рухаюцца, трэба ўвесь час расчышчаць дарогу. Да лясной вёскі дабраліся за поўнач. Плачуць дзеці, мычаць галодныя каровы. Нарэшце размясціліся ў зямлянках, запалілі печы — дым валіць у памяшканне, вочы не расплюшчыць...

Раніцай завея сцішылася. Стала вядома, што карнікі знаходзяцца ўсяго ў якіх трох кіламетрах адсюль, у Старых Мілевічах — расстрэльваюць, паляць, рабуюць... Зусім блізка бяда. Што рабіць? Партызаны заспакойваюць — не бойцеся, не пусцім ворага, іншыя раяць — падавайцеся далей у лес. Прыбегла жанчына са Старых Мілевіч, якая цудам выратавалася, са слязамі расказала пра тое, што адбылося ў вёсцы. Раптам пачуўся крык: «Людзі, уцякайце!.. Немцы!»

З боку Новых Мілевіч былі бачны клубы чорнага дыму. У глыбокім лесе сустрэлі людзей са Старых Залюціч. Нас прынялі як родных. Пераначавалі. Раніцай я прачнуўся, выйшаў з будана, глянуў на дарогу, па якой мы прыйшлі сюды — і застыў у жаху: па ёй з двух бакоў ланцугом падыходзілі карнікі. Ужо бачны іх злосныя і потныя твары... Я закрычаў — не памятаю, што,— і кінуўся ў хмызняк. За мной пабегла старэйшая дачка сястры Наташа. Бег доўга, потым трое сутак блукаў па лесе адзін, пакуль не сустрэў людзей са Старых Мілевіч.

У партызанскім атрадзе потым давялося перажыць не адну блакаду, але самая страшная была тая, першая, калі расстрэльвалі і гналі нас, бяззбройных, як дзічыну. Хварэў тыфам... Заўсёды, як мог, змагаўся з ворагам дасціпным словам, жартам, частушкай, вершам. З ліпеня 1943 г. пачаў працаваць у рэдакцыі і друкарні газеты падпольнага Пінскага абкома партыі «Палеская праўда». Не раз, калі не хапала паперы, газету і лістоўкі друкавалі на бяросце.

Потым было вызваленне, і я добраахвотнікам пайшоў на фронт.

ХАТЫНСКІ НАБАТ

...Нахлынула зграя лавінай.
Успомню — сэрца баліць.
Пакуты і слёзы нявінных
Жанчын і дзяцей не забыць.
Душыў іх у ярасці дзікай
Раз'юшаны вораг, як звер.
Жахлівыя стогны і крыкі
Я чую яшчэ і цяпер.
Хапалі шалёныя каты
Усіх — і старых, і малых —
Палілі ў цэрквах і хатах,
Закопвалі ў ямах жывых.
Я думаў аб гэтай часіне,
Аб блізкіх і родных сваіх —
І доўга шукаў у Хатыні
На комінах прозвішчы іх.
Хадзіў між параненых соснаў,
Да могілак вёсак прыйшоў.
На іх — сярод надпісаў сотняў —
Знаёмыя назвы знайшоў:
Мілевічы, Леніна, Морач...
Спустошылі родны мой кут
Пажары. Крывавае мора
Ды попел пакінулі тут...

Уладзімір Яфімовіч

Узрыў на чыгунцы

Аляксандр Давідовіч, 18-гадовы юнак з Дзякавіч, прыйшоўшы ў атрад, быў залічаны ў падрыўную групу. Першае баявое хрышчэнне было ўдалым. Каля вёскі Юркевічы партызаны замініравалі дарогу. На лясной дарозе паказалася аўтамашына з ворагамі. Раздаўся моцны выбух... Уцалелых фашыстаў скасілі трапныя стрэлы партызан, нікому не ўдалося ўцячы. Падабралі трафеі — зброю, боепрыпасы і зніклі ў лесе.

Праз некалькі дзён Аляксандр разам з баявымі сябрамі замініраваў дарогу каля вёскі Бялёў. Былі знішчаны дзве варожыя машыны і бронетранспарцёр. Трафеі былі вялікімі, Давідовіч узяў з кабуры забітага афіцэра надзвычай зручны парабелум, з якім прайшоў амаль усю вайну.

Аляксандр Давідовіч змагаўся ў атрадзе «1 Мая» 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгады. Восенню 1942 г. падрыўнікам была даручана арганізацыя дыверсіі на перагоне Жыткавічы — Мікашэвічы. Подступы да чыгункі пільна ахоўваліся, былі абсталяваны дзоты, стаялі вышкі з кулямётамі. Адзін за другім хадзілі ўздоўж насыпу патрулі... Закласці міну было надзвычай цяжка.

Чакаць давялося доўга, пачыналася світанне. Нарэшце пачуўся далёкі стук цягніка — на ўсход ішоў вайсковы эшалон. Напярэдзе паравоза былі прымацаваны пустыя платформы. Як толькі яны мінулі закладзеную міну, Аляксандр рвануў шнур. Пачуўся аглушальны выбух, вагоны пачалі спаўзаць пад адхон... Навакольле асвяцілася полымем пажарышча.

Калі адышлі на небяспечную адлегласць, пералічыліся — няма аднаго таварыша... Кіраўнік групы загадаў: вярнуцца і знайсці яго. Хто пойдзе? Разам з двума другімі партызанамі вярнуцца да чыгункі вызваўся Аляксандр. Пад не сціхаючым агнём ворага накіраваліся назад. Непадалёку ад чыгункі знайшлі параненага таварыша і вынеслі яго да сваіх.

Падрыўнікі атрымалі загад узарваць чыгуначны мост праз р. Случ. Партызаны ведалі, што мост пільна ахоўваецца, абсталявана некалькі дзотаў. Трэба было спачатку разведаць абстаноўку, спланаваць аперацыю. Разведчыкі агледзелі мясцовасць, падзяліліся сваімі меркаваннямі. Прыступілі да аперацыі...

Як аказалася потым, ворагі чакалі партызан: адзін з разведчыкаў неасцярожна кінуў акурак, і патруль падабраў яго.

Падрыўная група, у якой налічвалася 27 чалавек, была сустрэта агнём. Узрыўчатку закладвалі ў надзвычай цяжкіх умовах, адно

ратавала — непагода, цёмная ноч... Ворагі абкружылі партызан.

Мост узарвалі, але прабіцца з акружэння пасля жорсткага бою ўдалося мала каму...

В. Р. Феранц

У тыле ворага

Набліжалі Перамогу

У 1940 г. 75-я стралковая дывізія пасля цяжкіх баёў з белафінамі была пераведзена ў склад асобай Беларускай ваеннай акругі. Штаб дывізіі размясціўся ў Мазыры, а 115-ы полк, дзе я служыў камандзірам роты,— у Жыткавічах.

У трывожны перадваенны год усё ў нашым вайсковым жыцці было як звычайна. Баявыя і страявыя заняткі, вучэнні, палітычная падрыхтоўка... Надзвычай урачыста праводзіліся ў раённым цэнтры святы, спартыўныя спаборніцтвы, масавыя гулянні. Дапазна іграў ваенны духавы аркестр. Але абстаноўка ў свеце была неспакойнай. У Заходняй Еўропе палала другая сусветная вайна. Усе разумелі, што мірны дагавор паміж Германіяй і СССР не гарантуе бяспекі, а мы, ваенныя, адчувалі гэта надзвычай востра...

2 мая 1941 г. на світанні полк быў падняты па трывозе. Пасля нядоўгіх збораў рушылі на захад. Ішлі ноччу, а днём адпачывалі ў лясах.

На месцы новай дыслакацыі прыступілі да ўмацавання агнявых абараняльных пазіцый уздоўж дзяржаўнай граніцы. Усё рабілася ў тайне. 115-ы стралковы полк быў выведзены ў другі эшалон і размясціўся ў двух кіламетрах на ўсход ад Маларыты.

З кожным днём усё больш адчувалася, што хутка грымне вайна. Над нашай тэрыторыяй часта ляталі самалёты немцаў, не раз на граніцы гітлераўцы стваралі канфліктныя сітуацыі. І вось наступіла світанне трагічнага 22 чэрвеня 1941 г. На нас знянацку абрушылася артылерыйская падрыхтоўка. Агонь бушаваў каля дзвюх гадзін. Дывізія панесла значныя страты, яшчэ не ўступіўшы ў бой. І ўсё ж большай частцы войск удалося выйсці з-пад агню. Мы занялі падрыхтаваныя пазіцыі і ўступілі ў няроўны бой.

Байцы і камандзіры стаялі насмерць. Усе спадзяваліся, што восьвось падыдуць рэзервныя часці і мы пагонім фашыстаў. Але з кожным днём надзеі заставалася ўсё менш... Над Брэстам трывожна клубіліся хмары чорнага дыму. У небе ўвесь час кружыліся нямецкія самалёты.

Дывізія трымала абарону да 1 ліпеня. Тады было прынята рашэнне прарывацца з варожага акружэння. Рэшткі злучэння пайшлі ў апошнюю атаку... Кулямётным агнём, гарматамі, штыкамі ўдалося пацясніць ворага, вырвацца з акружэння. Адыходзілі на ўсход, увесь час мелі сутычкі з ворагам. Мінулі Пінск, а праз некалькі дзён прыйшлі да Жыткавіч. Тут папоўніліся рэзервамі. Фашысты былі побач, і хутка ўступілі з імі ў бой за гарадскі пасёлак. Потым зноў адступалі... З болем у сэрцы пакідалі Жыткавічы, і ніхто не ведаў, што чакае нас наперадзе...

Адыходзілі з баямі. У раёне Лоева фарсіравалі Днепр, потым Дзясну. Дывізія была накіравана на абарону Чарнігава, дзе так і не ўдалося замацавацца. Адступленне працягвалася, увесь час неслі цяжкія страты. Аднойчы мне давялося камандаваць батальёнам, у якім налічвалася ўсяго восем байцоў...

Мы прыкладвалі ўсе намаганні, каб выйсці з акружэння. І ўвосень ужо амаль дайшлі да лініі фронту. Аднак перайсці яго не змаглі... Быў канец лістапада. Наступалі ха-

ратавала — непагода, цёмная ноч... Ворагі абкружылі партызан.

Мост узарвалі, але прабіцца з акружэння пасля жорсткага бою ўдалося мала каму...

В. Р. Феранц

У тыле ворага

Набліжалі Перамогу

У 1940 г. 75-я стралковая дывізія пасля цяжкіх баёў з белафінамі была пераведзена ў склад асобай Беларускай ваеннай акругі. Штаб дывізіі размясціўся ў Мазыры, а 115-ы полк, дзе я служыў камандзірам роты,— у Жыткавічах.

У трывожны перадваенны год усё ў нашым вайсковым жыцці было як звычайна. Баявыя і страявыя заняткі, вучэнні, палітычная падрыхтоўка... Надзвычай урачыста праводзіліся ў раённым цэнтры святы, спартыўныя спаборніцтвы, масавыя гулянні. Дапазна іграў ваенны духавы аркестр. Але абстаноўка ў свеце была неспакойнай. У Заходняй Еўропе палала другая сусветная вайна. Усе разумелі, што мірны дагавор паміж Германіяй і СССР не гарантуе бяспекі, а мы, ваенныя, адчувалі гэта надзвычай востра...

2 мая 1941 г. на світанні полк быў падняты па трывозе. Пасля нядоўгіх збораў рушылі на захад. Ішлі ноччу, а днём адпачывалі ў лясах.

На месцы новай дыслакацыі прыступілі да ўмацавання агнявых абараняльных пазіцый уздоўж дзяржаўнай граніцы. Усё рабілася ў тайне. 115-ы стралковы полк быў выведзены ў другі эшалон і размясціўся ў двух кіламетрах на ўсход ад Маларыты.

З кожным днём усё больш адчувалася, што хутка грымне вайна. Над нашай тэрыторыяй часта ляталі самалёты немцаў, не раз на граніцы гітлераўцы стваралі канфліктныя сітуацыі. І вось наступіла світанне трагічнага 22 чэрвеня 1941 г. На нас знянацку абрушылася артылерыйская падрыхтоўка. Агонь бушаваў каля дзвюх гадзін. Дывізія панесла значныя страты, яшчэ не ўступіўшы ў бой. І ўсё ж большай частцы войск удалося выйсці з-пад агню. Мы занялі падрыхтаваныя пазіцыі і ўступілі ў няроўны бой.

Байцы і камандзіры стаялі насмерць. Усе спадзяваліся, што восьвось падыдуць рэзервныя часці і мы пагонім фашыстаў. Але з кожным днём надзеі заставалася ўсё менш... Над Брэстам трывожна клубіліся хмары чорнага дыму. У небе ўвесь час кружыліся нямецкія самалёты.

Дывізія трымала абарону да 1 ліпеня. Тады было прынята рашэнне прарывацца з варожага акружэння. Рэшткі злучэння пайшлі ў апошнюю атаку... Кулямётным агнём, гарматамі, штыкамі ўдалося пацясніць ворага, вырвацца з акружэння. Адыходзілі на ўсход, увесь час мелі сутычкі з ворагам. Мінулі Пінск, а праз некалькі дзён прыйшлі да Жыткавіч. Тут папоўніліся рэзервамі. Фашысты былі побач, і хутка ўступілі з імі ў бой за гарадскі пасёлак. Потым зноў адступалі... З болем у сэрцы пакідалі Жыткавічы, і ніхто не ведаў, што чакае нас наперадзе...

Адыходзілі з баямі. У раёне Лоева фарсіравалі Днепр, потым Дзясну. Дывізія была накіравана на абарону Чарнігава, дзе так і не ўдалося замацавацца. Адступленне працягвалася, увесь час неслі цяжкія страты. Аднойчы мне давялося камандаваць батальёнам, у якім налічвалася ўсяго восем байцоў...

Мы прыкладвалі ўсе намаганні, каб выйсці з акружэння. І ўвосень ужо амаль дайшлі да лініі фронту. Аднак перайсці яго не змаглі... Быў канец лістапада. Наступалі ха-

лады. Я ведаў, што на акупіраванай ворагам тэрыторыі дзейнічаюць партызанскія атрады, падпольшчыкі. Вырашыў шукаць іх. Распытваў мясцовых жыхароў, але яны глядзелі на мяне з падазрэннем, другія — як на дзівака.

Шлях па захопленай ворагам тэрыторыі быў надзвычай цяжкім і небяспечным. Фашысты ўстанавілі свой парадак, кожнага падазронага, чужога адразу хапалі, паўсюдна праводзіліся масавыя расстрэлы савецкіх грамадзян. Нярэдка даводзілася хавацца, уцякаць, услед ляцелі кулі... Начаваў у лясах, у палях, у саломе, часта галадаў, недасыпаў і ўрэшце захварэў. Але не здаваўся. Цяпер мой шлях ляжаў у Жыткавічы, дзе з часоў службы былі добрыя знаёмыя і сябры.

Сядзець склаўшы рукі я быў не намераны. Дайшлі чуткі, што на балоце Булеў Мох, вакол возера Чырвонае, базіруюцца партызаны. Як устанавіць з імі сувязь? Пакуль раздумваў над гэтым, падпольшчыкі самі знайшлі мяне. У адзін з чэрвеньскіх вечароў 1942 г. нехта пастукаў у акно. Я выйшаў на вуліцу.

— Ну што, таварыш лейтэнант, доўга будзеш адлежвацца на печы? — спытаў незнаёмы.

«Правакатар ці сапраўды падпольшчык?» — думаў я. Але незнаёмы загаварыў шчыра і даверліва:

— Я таксама вырваўся з акружэння, паранены. Мікалай Корж, лейтэнант інжынерных войск... Мяне тут многія ведаюць.

Я адчуў давер да гэтага чалавека, але быў асцярожным.

— Што трэба ад мяне? І адкуль вы ведаеце, хто я?

— Тут не схаваешся, усё вядома... Так што думай, дзе цяпер месца афіцэра Чырвонай Арміі.

У душы я быў рады, што спатрэбіўся і падпольшчыкі звяртаюцца за дапамогай. Мікалай Корж сказаў, што праз некалькі дзён прыйдзе зноў, і калі я згодны ўступіць у барацьбу, дасць заданне. За гэты час я і сам даведаўся, што змог, пра начнога госця, сумненні мае развеяліся.

Мікалай Корж з'явіўся нечакана, прыйшоў з боку рэчкі, калі я быў на дварэ.

— Адсюль добра відаць чыгуначны мост праз Глініцу,— сказаў ён.— Лічы, колькі праходзіць паяздоў, з якімі грузамі. Звесткі будзеш класці ў тайнік,— і ён паказаў дупло ў старой вярбе. Потым даў свежую зводку Саўінфармбюро, сказаў, каб перапісаў у некалькіх экземплярах і распаўсюдзіў у пасёлку.

Аднак ворагі пачалі падазрона адносіцца да мяне. Анойчы прыйшоў паліцай і загадаў ісці з ім у жандармерыю. Па дарозе я складаў розныя планы ўцёкаў, аднак зручнага выпадку не выпала. Прывялі да каменданта Дрынкеля. Побач на падлозе сядзела вялікая аўчарка. Дрынкель, не падымаючы галавы ад папер, пачаў допыт: дзе служыў, у якім званні, партыйнасць, навошта прыйшоў у Жыткавічы... Я ўсё расказаў, пра што можна было: служыў тут, у Жыткавічах, таму і вярнуўся. Добраахвотна здаўся ў палон доблеснай германскай арміі, таму што не хацеў ваяваць супраць яе, і мяне адпусцілі з лагера ваеннапалонных, а больш ісці няма куды — бацька арыштаваны бальшавікамі і расстраляны, маці памерла... Дрынкель выслухаў праз перакладчыка, сказаў «гут» і пажадаў, каб я цяпер шчыра дапамагаў германскай арміі.

У гэты час у раёне ўжо актыўна дзейнічалі падпольныя групы. Паблізу возера Белае, у Баравой і Людзяневічах, стварыў падпольную камсамольска-маладзёжную арганізацыю былы інжынер прамкамбіната І. І. Гарбуз. У яе склад уваходзілі Ігнат Кузьмінскі, Уладзімір Гарбуз, Іван Пархоменка, Іван Хомчанка і іншыя патрыёты. Юркевіцкай групай

кіраваў Е. Я. Гораў, работнік лясніцтва. Сярод яе актыўных удзельнікаў былі Павел Кірбай, Яўгенія Мацвеявец, Васіль Рыбалка, Аліма і Паліна Кірбай, Сцяпан Татур, Фёдар Дзяткоўскі. Дапамагаў бацьку, выконваў рызыкоўныя заданні сын Е. Я. Горава Ігар.

З цягам часу, калі кіраўніцтва падпольнай барацьбой патрыётаў узяло на сябе камандаванне 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгады, абедзве групы былі аб'яднаны ў Жыткавіцкую падпольную арганізацыю. Е. Я. Гораў жыў у Жыткавічах, потым у гарадскі пасёлак прыехаў і ўладкаваўся на работу па ўзнаўленню млына і І. І. Гарбуз.

З дапамогай сувязной Алімы Кірбай патрыёты ўстанавілі сувязь з партызанскім атрадам Баці — Р. М. Лінькова, які па заданню камандавання Чырвонай Арміі займаўся разведкай у глыбокім тыле ворага. Падпольшчыкі аказвалі вялікую дапамогу партызанам, выконвалі іх заданні і даручэнні.

Менавіта па заданню Р. М. Лінькова Мікалай Корж працаваў у пашпартным стале раённай управы. Выкрадаў бланкі дакументаў, пашпарты і перадаваў у атрад праз сувязнога, жыхара вёскі Відошын А. М. Купрацэвіча.

Напярэдадні 25-й гадавіны Вялікага Кастрычніка Мікалай Корж назначыў мне сустрэчу ў лесе. Ён перадаў свежыя экземпляры газеты «Правда», загадаў, каб мы перад святам распаўсюдзілі зводку Саўінфармбюро. Мікалай Корж сказаў, што рыхтуецца сапраўдны фейерверк (будзе фашыстам святочны падарунак!..). І сапраўды, у ноч з 6 на 7 лістапада быў спалены склад сена, пушчаны пад адхон эшалон. Бургамістру была закладзена міна, але, на жаль, яе знайшлі да таго, як яна ўзарвалася...

Мікалай Корж устанавіў сувязь з паліцэйскай часцю, якая размяшчалася ў Жыткавічах. Многія паліцаі пад яго агітацыяй пачалі дапамагаць падпольшчыкам, а потым перайшлі да партызан. Сярод іх І. В. Мацюшын, І. К. Барабаш, Р. А. Цыгікала, В. Я. Назаранка, І. Г. Фяцісаў і іншыя.

4 снежня 1942 г. фашысты затрымалі Ігара Горава, знайшлі ў яго данясенне ў партызанскі атрад аб дыслакацыі ворага. Зрабілі вобыск у Е. Я. Горава, знайшлі ўзрыўчатку, міны, лістоўкі... У горадзе пачаліся павальныя вобыскі і арышты. Было загадана тэрмінова вывесці да партызан усіх падпольшчыкаў з Жыткавіч. Але падзеі развіваліся імкліва, бяда каціласа стрымгалоў...

Гітлераўцы прыехалі да дома, дзе я жыў. Мне ўдалося непрыкметна выскачыць праз акно на супрацьлеглым баку, блізка была рэчка, хмызнякі... Хутка я стаў байцом злучэння легендарнага партызанскага камандзіра, двойчы Героя Савецкага Саюза С. А. Каўпака.

Р. М. Кароўчанка,
былы член Жыткавіцкай падпольнай арганізацыі, начальнік штаба палка 1-й Украінскай партызанскай дывізіі С. А. Каўпака.

У глыбокім тыле

У жніўні 1942 г. у раёне базы партызанскага атрада Р. М. Лінькова, вядомага ў народзе як Баця, каля возера Чырвонае прызямліўся з парашутам капітан Чырвонай Арміі І. М. Банаў (псеўданім — Чорны). Ён быў прызначаны намеснікам Р. М. Лінькова па разведцы. Яго задача была — збіраць разведданыя для Генеральнага штаба аб дыслакацыі ворага ў гэтай зоне Беларусі, руху па чыгункі ў бок Калінкавіч і Баранавіч. Прыняўшы ў снежні 1942 г. атрад Р. М. Лінькова, капітан І. М. Чорны планамерна і эфектыўна вёў баявую разведку. Ужо вясной 1943 г. ні адзін эшалон не праходзіў не заўважаным праз раён дзеяння атрада, ні адна перадыслакацыя ворага не заставалася сакрэтнай для савецкага камандавання. Даныя, якія здабывалі

разведчыкі з дапамогай насельніцтва, вызначаліся сапраўднасцю і аператыўнасцю.

І. М. Чорны быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Звыш 500 воінаў-разведчыкаў і мірных жыхароў, партызан, што актыўна дапамагалі ім, атрымалі высокія ўрадавыя ўзнагароды. Значную частку баявых дзеянняў атрад І. М. Чорнага правёў на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна і ў пасёлку Жыткавічы, дзе была створана баявая падпольная арганізацыя, якая здолела нанесці вялікія страты акупантам.

...Узрыў клуба ў Мікашэвічах быў падрыхтаваны і праведзены бездакорна. Сувязныя, якія выклікалі Івана Канапацкага ў лес для інструктажу, падазрэнняў у фашыстаў не выклікалі. Даверам у немцаў карыстаўся і сам Канапацкі, інакш яму не даверылі б работу ў клубе.

Узрыўчатку дастаўляў у Мікашэвічы Прышкель. Перавозіў яе ў выдаўбанай дошцы днішча вазка. За раз ён прывозіў каля дзесяці кілаграмаў узрыўчаткі, і яму патрабавалася ўсяго тры рэйсы, каб даставіць увесь груз у двор Канапацкага. Там тол хавалі ў розных месцах — у бур'яне, пад кучамі смецця, у сене. У клуб Іван Канапацкі насіў узрыўчатку шашкамі па 400 грамаў у кармане штаноў, паверх апранаў паліто, і нічога не было відаць. Насіў ён не тайком, па начах, а раніцай або ўдзень, калі на вуліцах пасёлка было многа людзей. Яго ні разу не спыніў патруль для праверкі дакументаў. А калі б і спынілі, знайшлі ўзрыўчатку, ён мог бы сказаць, што знайшоў яе на вуліцы і нясе здаць у камендатуру.

Не выклікала падазрэнне і тое, што Канапацкі ўвесь час вазіўся з праводкай — гэта ўваходзіла ў яго абавязкі. Ён непрыкметна працягнуў два правады ў падпол клуба, дзе быў тол, вывеўшы іх на агульны рубільнік.

Узрыў у Мікашэвіцкім клубе прызначылі на 7 лістапада. Так вырашылі адзначыць гадавіну Кастрычніка. Але 4 лістапада стала вядома, што партызаны В. З. Каржа ўзарвалі мост праз раку Лань, перабілі ахову, знішчылі састаў з авіябомбамі, разбурылі вялікі ўчастак чыгункі. Фашысты, як заўсёды, помсцілі мірным жыхарам, яны накіравалі ў навакольныя вёскі карны атрад і нараду ў Мікашэвічах адклалі. Хутка пасля зверскай расправы над людзьмі атрад карнікаў у складзе шасцідзесяці пяці чалавек размясціўся для адпачынку ў Мікашэвічах. Нарада па пытаннях барацьбы з партызанамі была прызначана на 17 лістапада.

З Германіі для ўдзелу ў нарадзе прыбыло шэсць важных чыноў, дзесяць жандармаў аховы, прысутнічаў увесь мясцовы гарнізон, звыш васьмідзесяці чалавек. Перад пачаткам нарады планавалася паглядзець новую кінахроніку. У семнаццаць гадзін фашысты ўселіся ў зале.

За некалькі хвілін да гэтага Канапацкі выглянуў з будкі, паманіў паліцая і папрасіў дапамагчы — праводка няспраўная і як бы не сарваць сеанс. Фашысцкі халуй залез у будку.

— Я выйду, праверу, а ты хвілін праз пяць уключы гэты рубільнік,— сказаў Канапацкі.

Паліцай усё зрабіў правільна. Роўна праз пяць мінут ён падняў у паветра клуб разам з акупантамі і іх памагатымі і ўзарваўся сам. Сіла ўзрыву была такая вялікая, што ў навакольных дамах павыляталі вокны. Загінула каля паўтары сотні фашыстаў і іх прыслужнікаў. Засталіся цэлымі толькі некалькі ворагаў, якія ў гэты час не знаходзіліся ў клубе, выйшлі пакурыць...

І. М. Банаў (Чорны)
З кнігі «Данные были достоверными»

* * *

Канапацкі Іван Барысавіч (н. у 1919 г. у Вільчы) працаваў у калгасе «Чырвоны памежнік», закончыў вучылішча кінамеханікаў. У пачатку вайны вярнуўся ў Вільчу, трымаў сувязь з партызанамі, выконваў заданні кіраўнікоў партызанскай барацьбы ў сельсавеце Лісовіча і Шчура. Па іх заданню ўладкаваўся на работу ў Мікашэвіцкі клуб і 17 лістапада 1942 г. узарваў яго разам з ворагамі.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ст., баявымі медалямі. Выдатнік кінематаграфіі СССР.

Памёр у 1974 г.

З іскры — полымя...

Корж Мікалай Паўлавіч (н. у 1920 г. у в. Кажановічы) перад вайной закончыў вайсковае інжынернае вучылішча. Часць, у якой ён служыў, у першыя дні вайны трапіла ў акружэнне, М. П. Корж вярнуўся ў Жыткавічы, стаў актыўным удзельнікам Жыткавіц-

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

М. П. Корж, 1941 г.

кага падполля. Калі навісла пагроза арышту, разам з кіраўніком падполля І. І. Гарбузам пайшоў у партызанскі атрад І. М. Чорнага. Фашысты схапілі і расстралялі сям'ю падпольшчыка — бацьку і маці, дзвюх сясцёр. На фронце загінуў і брат Пятро. М. П. Корж застаўся жывым адзін з сям'і. У партызанах Мікалай Корж змагаўся з ворагам на пасадзе камандзіра дыверсійна-разведвальнай групы атрада Героя Савецкага Саюза палкоўніка Р. М. Лінькова. Пасля вайны закончыў Мазырскі педагагічны інстытут, працаваў настаўнікам у школах раёна. Узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ст., медалямі.

Ішоў 1942 год, над Беларуссю згусціліся змрочныя, свінцовыя хмары акупацыі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны ў крыві кавалася Перамога, але доўгім быў да яе шлях па вогненных дарогах вайны...

У Жыткавічах камуністы, камсамольцы, беспартыйныя не скарыліся ворагу. У канцы лета другога года вайны патрыёты арганізавалі падпольную групу, якой кіраваў былы інжынер Юркевіцкага лясніцтва Е. Я. Гораў. У самы змрочны час акупацыі яны ўступілі ў няроўную барацьбу з ворагам. Падпольшчыкі змагаліся з акупантамі зброяй і словам. Узрывалі эшалоны, якія накіроўваліся на фронт, збіралі разведданыя аб дыслакацыі акупантаў і перадавалі ў партызанскі атрад І. М. Чорнага, які дыслацыраваўся на тэрыторыі раёна і па заданню камандавання Чырвонай Арміі вёў разведку ў тыле ворага.

Галоўная задача атрада І. М. Чорнага, у адрозненне ад атрада Баці, была не дыверсія, а разведка. Патрабавалася стварыць агентуру з мясцовых жыхароў, сістэматычна назіраць за рухам варожых эшалонаў з фронту і на фронт, кантраляваць усе дарогі ў раёнах Жыткавіч, Мікашэвіч, Лунінца, Баранавіч, Пінска і Брэста.

...Камандзір разведвальнай групы ўважліва вывучаў раён будучых дзеянняў. Блакітная пляма на карце — возера Чырвонае, на захад — дужка Белага, рыскі вялікага Булева балота, дзе размяшчаўся атрад Р. М. Лінькова. Вёскі Мілевічы, Юркевічы, Залюцічы, Белае... Што іх чакае там, у тыле ворага, дзе кожны крок звязаны з вялікай рызыкай і бяспекай?

Цёмнай жнівеньскай ноччу самалёт выляцеў на захад. Мінулі лінію фронту і доўга ляцелі ў чорнай бездані над варожай тэрыторыяй. Унізе ўбачылі спецыяльна раскладзеныя вогнішчы.

Радаснай была сустрэча, шмат пытанняў, расказаў аб перажытым... Р. М. Лінькоў і І. М. Чорны адышлі ўбок.

— На месцы мы знаходзімся мала. Цяпер вы будзеце гаспадарамі на Булевом балоце. З'яўляюцца тут партызаны В. З. Каржа, будзеце трымаць з імі сувязь, але стыхія гэтага чалавека — рэйды, бясконцыя стычкі з ворагам, напады на гарнізоны... Перш-наперш устанавіце сувязь з Матрунай Міцкевіч з Новых Мілевіч. Яна пякла нам хлеб, цяпер вам будзе дапамагаць. Жанчына добра ведае людзей у навакольных вёсках, параіць самых надзейных, выпрабаваных...

На гэтым камандзіры развіталіся.

Матруна Міцкевіч — зграбная рухавая жанчына, якая з маленства прывыкла да нялёгкай сялянскай працы. Яна ахвотна дапамагала партызанам і, калі завітаў да яе І. М. Чорны, жанчына не здзівілася позняму госцю. Яны доўга размаўлялі. Матруна расказвала аб парадках, якія ўстанавіла «новая ўлада» ў навакольных вёсках, аб тым, як наязджаюць часам з Жыткавіч і здзекавающца над людзьмі фашысты і іх памагатыя — паліцаі. Кіруе імі начальнік Жыткавіцкай паліцыі Герман, яго правая рука — звераваты Кацубінскі.

— Але ёсць людзі, якія не сядзяць склаўшы рукі,— расказвала Матруна Міцкевіч.— Я заўважаю, што нешта робяць супраць немцаў Ілья Прышкель з Юркевіч, Павел Кірбай з рыбгаса «Белае»...

Гэтыя людзі былі сапраўднымі патрыётамі, якія ахвотна згадзіліся дзейнічаць разам. Яны ўключылі ў састаў сваёй падпольнай групы інжынера лесапільнага завода «Жыткавіцкі» Іосіфа Гарбуза. Ён сказаў, што ведае ў Жыткавічах людзей, якія шукаюць сувязь з партызанамі, а пакуль дзейнічаюць самастойна, шкодзяць ворагам як могуць. Гэта былы рабочы Юркевіцкага лясніцтва Сцяпан Татур, былы лейтэнант Чырвонай Арміі Мікалай Корж і іншыя. Кіруе імі ляснічы з Юркевіч інжынер Ермалай Гораў.

Хутка партызаны І. М. Чорнага сустрэліся з жыткавіцкімі падпольшчыкамі. Ім былі дадзены інструкцыі, пастаўлены задачы па збору разведданых на станцыі Жыткавічы і ў гарнізоне горада, арганізацыі дыверсій. У Жыткавічах тады знаходзіліся немалыя сілы — атрад

палявой жандармерыі ў колькасці 150 чалавек, звыш 50 паліцаяў. Ворагі мелі некалькі лёгкіх гармат, 20 кулямётаў, шмат аўтаматаў і вінтовак.

Сувязь падпольшчыкаў з партызанамі было дамоўлена трымаць праз «паштовыя скрынкі» ў вызначаных месцах, а таксама з дапамогай сына Горава 14-гадовага Ігара.

Патрыёты атрымалі ад партызан 2 міны і 5 запальваючых шашак, лістоўкі, а таксама свежы нумар газеты «Правда». Усё гэта было выкарыстана па прызначэнню. Гораў паступіў на работу ў Жыткавіцкі лесапункт. Разам з Каржом і Гарбузам яны ўзарвалі два варожыя эшалоны, падпалілі склад на станцыі. Усюды раскідвалі лістоўкі, а Ігар Гораў даўмеўся прыклеіць «Правду» на будынак жандармерыі. Жыхары Жыткавіч акрыялі, многія падаліся ў партызаны, супраціўленне ворагу расло і шырылася. Падпольшчыкі прасілі ў І. М. Чорнага яшчэ ўзрыўчаткі, але ім пакуль было адмоўлена. Галоўная задача была — збор разведданых, а на Вялікую зямлю штодзень перадаваліся важныя звесткі аб ворагу, аб руху эшалонаў, дыслакацыі часцей у яго тыле. Была складзена карта горада і раёна з указаннем гарнізонаў, колькасці ў іх сіл і ўзбраення.

Устрывожаныя і напалоханыя дзейнасцю падпольшчыкаў, у Жыткавічах лютавалі ворагі. Яны схапілі і расстралялі былога старшыню райвыканкома Бортэля, які нядаўна вярнуўся дадому з акружэння. Цэнтральныя вуліцы ўмацавалі калючым дротам, на ўсіх дарогах немцы і паліцаі паставілі ўзмоцненыя пасты. Сувязь партызан з падпольшчыкамі была спынена, але трэба было абавязкова сустрэцца з імі. Дарослага адразу затрымалі б. Вырашылі паслаць у Жыткавічы кемлівага хлопчыка з Залюціч Колю Лаўніковіча. Коля знайшоў Горава і перадаў яму запіску з заданнем. Потым ён не раз наведваўся ў Жыткавічы, падпольшчыкі перадавалі яму важныя звесткі, і юны патрыёт акуратна і хутка дастаўляў іх партызанам.

Павел Кірбай па-ранейшаму працаваў на возеры Белым і на сажалках рыбгаса. Іншы раз сюды прыязджалі немцы і паліцаі, забіралі рыбу. Але нехта данёс ворагам, што ён часта сустракаецца з партызанамі. І аднойчы яны ўварваліся ў хату Кірбая. У Паўла ў пограбе быў схаваны пісталет. Ён ускочыў у падпол, схапіў зброю і пачаў страляць у няпрошаных гасцей. Тыя ад нечаканасці разгубіліся і кінуліся хавацца. Павел апынуўся каля акна, выбіў раму і пабег у бок лесу. Узнялася страляніна, куля трапіла ў плячо, але лес быў блізка...

У Жыткавічах падпольшчыкі расшыралі дыверсіі, патрабавалі больш мін і ўзрыўчаткі. Група значна вырасла. У яе састаў увайшло многа новых людзей — мясцовыя хлопцы Мікалай Ярмаш, Васіль Ярмаш, былыя акружэнцы — лейтэнант Чырвонай Арміі Рыгор Кароўчанка, лётчык Віктар Назаранка, Фёдар Дзяткоўскі, Іван Хомчанка і многія іншыя. Дапамагаў падпольшчыкам Іван Мацюнін, намеснік камандзіра сотні казакаў.

Аднойчы Мікалай Корж, які па заданню партызан служыў у нямецкай управе, даставаў бланкі пашпартаў, неабходныя даведкі, прынёс на работу газету, атрыманую з Вялікай зямлі. Потым ён выйшаў з памяшкання, а газета засталася ў паліто. Дзяўчаты з управы выцягнулі яе, прачыталі, а калі Мікалай вярнуўся, у захапленні пачалі хваліць яго — яны прымалі хлопца зусім не за таго... Корж быў незадаволены сваёй няўважлівасцю і гэтымі непатрэбнымі нікому пахваламі, але нічога не зробіш, надалей трэба быць больш пільным...

4 снежня ворагі наляцелі ў хату Горава з вобыскам. Відаць, нешта пранюхалі, а хутчэй за ўсё атрымалі ад некага данос. Гораў трымаў дома ўсё, што перадавалі яму з атрада. У хаце нічога не знайшлі, а калі выйшлі на двор, Кацубінскі звярнуў увагу, што да стога ў двары пратаптана сцяжынка, а сена некранутае. Пачалі разворочваць стог, і на снег паляцелі магнітныя міны, шашкі толу, лістоўкі...

Горава прама тут, на двары, пачалі па-зверску збіваць, потым пацягнулі ў жандармерыю. Забралі і Ігара. Ён быў не родным сынам Ермалая Яфімавіча, сапраўднае яго прозвішча —



Е. Я. Гораў



Ігар Гораў

В. П. Ярмаш

Дыверсійная група партызанскага атрада Р. М. Лінькова. Сядзіць у цэнтры М. П. Корж. 1944 г.

Лісуцін, але хлопец ніколі не адчуваў, што ён пасынак. Яны і загінулі разам, і магіла іх невядома...

Мацюнін паспеў папярэдзіць Мікалая Каржа і Іосіфа Гарбуза. Яны здолелі выйсці з Жыткавіч, прыйшлі на другі дзень у атрад. Але ворагі схапілі бацьку, маці і дзвюх сясцёр Каржа, Елізавету і Веру, усю сям'ю Гарбуза і пасля жорсткіх допытаў расстралялі. На фронце каля Ленінграда, на Ладазе, у 1944 г. загінуў і брат Пятро.

Амаль усе падпольшчыкі хутка даведаліся аб арыштах. Яны накіроўваліся ў Юркевічы або Белае, дзе часта былі партызаны. Трэба было абысці ўсе навакольныя вёскі, сабраць тых, хто застаўся, і прывесці ў атрад — было відавочна, што пасля арыштаў у Жыткавічах будзе арганізавана аблава ў партызанскую зону.

Жэня Мацвеявец знаходзілася ў гэты час у атрадзе. Яе і вырашылі паслаць у Юркевічы і іншыя вёскі. І. М. Чорны папярэдзіў, каб была асцярожнай, час небяспечны, не выключна, што па дарозе можна сустрэць ворагаў... У тоўстай шубцы і валёнках, закутаная ў вялікую хустку, Жэня знікла ў вячэрнім змроку. За ноч яна абышла ўсе вёскі, усім, каго сустракала, сказала вызначанае месца сустрэчы.

Стомленая 30-кіламетровай дарогай, Жэня на наступны дзень прыйшла дамоў, у Белае, дзе жыла яе старэнькая маці, і заснула. Тут і застала яе карная экспедыцыя. А падпольшчыкі з Жыткавіч былі ўжо далёка.

Ворагі доўга дапытвалі патрыётаў. Потым вывелі за горад і расстралялі — Е. Я. Горава і яго сына Ігара, Жэню Мацвеявец, Васіля Ярмаша, Дзяткоўскага і іншых.

...У Жыткавічах лютавалі ворагі. Каб даведацца, што там творыцца, вырашылі яшчэ раз паслаць у горад Колю Лаўніковіча. На гэты раз абышлося няўдачна. Кацубінскі, які раней сустракаў хлопца і не чапаў яго, раптам закрычаў: «Партызан!» Выхапіў наган і пачаў страляць па разведчыку. Ён быў, як заўсёды, п'яны, і гэта выратавала маленькага разведчыка. Коля ледзь уцёк і з цяжкасцю вярнуўся назад.

Зімой 1943 года была арганізавана карная экспедыцыя ворагаў. Карнікі набліжаліся з боку Лунінца. У бой з імі ўступілі партызаны злучэння В. З. Каржа і атрада Р. М. Лінькова. І. М. Чорны працягваў збіраць і перадаваць праз лінію фронту звесткі аб ворагу. Развед-

чыкі, якія мелі ўжо сувязь амаль з усімі гарадамі і станцыямі былой Заходняй Беларусі, першымі даведаліся і перадалі на Вялікую зямлю, што немцы накіроўваюць на фронт новыя танкі «тыгр», разведалі іх тактыка-тэхнічныя даныя.

У лес ішлі цэлыя вёскі, і партызаны давалі змучаным людзям прытулак, дзяліліся з імі апошнім. То тут, то там прарываліся карнікі, баі не сціхалі іншы раз цэлымі днямі. Але ворагі так і не «выкурылі» разведчыкаў І. М. Чорнага з Булева балота. Яго не раз бамбілі і абстрэльвалі з гармат, але забірацца глыбока не адважваліся. А ў пачатку сакавіка яны знялі блакаду.

З правалам Е. Я. Горава і яго групы разведвальная работа ў Жыткавічах не спынілася, замест загінуўшых прыйшлі новыя людзі. На месца Горава быў прызначаны Уладзімір Майсеенка. Разведчыкі цяпер дзейнічалі больш спакойна і асцярожна, арганізацыя была разгалінаваная, добра прадуманая. Звесткі з месцаў сцякаліся ў Жыткавічы, адтуль — у атрад на Булевым балоце і далей па рацыі — на Вялікую зямлю. Разведданыя былі надзвычай важнымі, заўсёды праверанымі.

Амаль два гады дзейнічаў на тэрыторыі Жыткаўшчыны атрад І. М. Чорнага. На працягу ўсяго гэтага часу разведчыкі атрымлівалі актыўную дапамогу з боку мясцовага насельніцтва, трымалі цесную сувязь з патрыётамі-падпольшчыкамі. Калі пачалася вядомая аперацыя «Баграціён» па вызваленню Беларусі ад фашысцкай нечысці, атрад І. М. Чорнага па тылах ворага накіраваўся далей на захад, Польшчу, затым у Прусію, каб працягваць сваю разведвальную работу.

І. М. Банаў (Чорны)
З кнігі «Данные были достоверными»

Актыўныя ўдзельнікі Жыткавіцкай падпольнай групы пад кіраўніцтвам Е. Я. Горава

Гораў Ермалай Яфімавіч, ляснічы Юркевіцкага лясніцтва. У пачатку вайны арганізаваў падпольную групу ў Юркевічах, у якую ўваходзілі Аліма, Павел і Паліна Кірбай, Ігар Гораў, Сцяпан Татур, Яўгенія Мацвеявец, Фёдар Дзяткоўскі, Васіль Рыбалка, Іван Хомчанка. Праз Аліму Кірбай юркевіцкія падпольшчыкі трымалі сувязь з атрадам Р. М. Лінькова. У 1942 г. яны склалі ядро жыткавіцкага падполля. Разам з ім змагаўся і загінуў 16-гадовы сын Ігар.

Гарбуз Іосіф Іосіфавіч, выпускнік Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі. Арганізаваў падпольную групу ў Людзяневічах, у якую ўвайшлі Уладзімір Гарбуз, Ігнат Кузьмінскі, Іван Пархоменка і інш. Трымаў сувязь з атрадам Гушчэні, які даў заданне І. І. Гарбузу звязацца з Е. Я. Горавым і ўкараніцца ў Жыткавічах.

Кароўчанка Рыгор Міхайлавіч, камсамолец, закончыў Маскоўскае ваеннае вучылішча імя Вярхоўнага Савета РСФСР, камандзір роты 115-га стралковага палка, які дыслацыраваўся ў Жыткавічах. З пачатку вайны з баямі адступаў на ўсход, трапіў у акружэнне, вярнуўся ў Жыткавічы. Пасля правалу ў падполлі быў камандзірам роты ў злучэнні С. А. Каўпака, затым начальнікам штаба батальёна і палка.

Назаранка Віктар Якаўлевіч, камсамолец, былы лётчык, закончыў Чкалаўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча. Быў збіты каля Харкава, трапіў у палон. Стварыў антыфашысцкую групу, у якую ўвайшлі актыўныя члены падполля Іван Мацюнін, Іван Барабаш, Рыгор Цыгікала, Цімафей Фяцісаў, Ганчарук і інш. Мацюнін, Барабаш і Фяцісаў загінулі ў партызанах.

Ярмаш Мікалай Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1915 г. у в. Востранка. Працаваў да вайны на будаўніцтве ваенных аб'ектаў у раёне Баранавіч. Загінуў у партызанах на тэрыторыі Любанскага раёна. Разам змагаўся яго брат Васіль Ярмаш, расстраляны фашыстамі пасля правалу групы Е. Я. Горава.

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

У майскую ноч

З успамінаў В. Я. Назаранкі, актыўнага ўдзельніка Жыткавіцкага падполля

— Патрэбны «язык»,— І. М. Чорны нервова зацягнуўся дымам цыгарэты.— Немцы, адчуваецца, нешта задумалі супраць нас, а што?.. Без «языка» не варочайцеся,— дадаў палкоўнік непрывычна жорстка.

Звычайна падрыўнікі ў разведку не хадзілі. Экстранны выпадак... Нашу групу ўмацавалі людзьмі М. П. Каржа і І. І. Гарбуза — гэта былі вопытныя дыверсанты, людзі адважныя і мужныя.

Выйшлі на чыгунку паміж Жыткавічамі і Старушкамі. Заляглі ў фіялетавым вясеннім змроку. Час быццам спыніўся. Цішыня, недзе далёка чуецца перастук колаў вагонаў, які быццам стаіць на месцы. Нельга ні закурыць, ні словам перакінуцца: метрах у двухстах нямецкая танкавая часць. Вячэраюць... Разведчыкі толькі праглынулі сліну.

Час дзейнічаць. Падышлі ўшчыльную да чыгункі, перайшлі яе. Ноч — быццам чарніла. Наперадзе цёмнай плямай зачарнеў бліндаж. Бліснуў агеньчык. Ля ўваходу вартавы. Зняць яго вызваўся М. П. Корж. Часавы ўпаў бясшумна.

Лейтэнант Віктар Штурман, старшы групы захопу, першым уварваўся ў бліндаж: «Хендэ хох!» Афіцэры гулялі ў карты. Адзін схапіўся за зброю, і тут жа ўпаў, скошаны з аўтамата. Штурман кіўнуў: узяць старэйшага па званню. Барабаш, Мацюнін, Кароўчанка і Гарбуз забралі ва ўсіх палявыя сумкі і зброю. Выходзячы апошнім, кінуў у бліндаж гранату.

Начная цішыня ўзарвалася. Застракаталі аўтаматы, праз некаторы час заквакалі мінамёты. Разведчыкі былі ўжо па другі бок насыпу, яны згубіліся ў начной цемені, разрывы мін былі далёка...

Наступная аперацыя была не такой удалай. Разведчыкаў абкружылі ў хаце, патрабавалі здацца, потым падпалілі хату. Барабаш і Мацюхін да апошняга працягвалі бой, згарэлі, але не скарыліся ворагу...

Сцяг брыгады

Восень 1944 г. у спаленую вёску прыйшла з холадам і бясхлеб'ем. Мужчыны на фронце, жанчыны з дзецьмі туліліся ў сырых зямлянках. Не было солі, не было хлеба, не было на чым выткаць зрэбнага палатна з таго лёну, які вырас на папялішчы... Але калі жыхары в. Града выйшлі на ўрачысты мітынг, прысвечаны 27-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, над іх галовамі ўзняўся палымяны чырвоны сцяг. Той самы пераходны сцяг, якім калгас «Чырвоная Града» быў узнагароджаны перад вайной за поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве.

...Кіпучыя трыццатыя гады, поўныя працоўнага энтузіязму і натхнення... Хто мог тады параўнацца з дваццацігадовай Надзяй Альвас і ў працы, і ў песні? Надзея Іванаўна працавала ў паляводстве, і брыгада, якую ўзначальваў яе муж, Браніслаў Уладзіміравіч, пастаянна выходзіла пераможцай у сацыялістычным спаборніцтве. У 1939 г. брыгада была ўзнагароджана пераходным Чырвоным сцягам, яго ўручаў калгасу райвыканком. Гэта была заслужаная ўзнагарода; такіх ураджаяў пшаніцы, лёну, буракоў і іншых культур не бачылі да гэтага часу земляробы.

...Наступіў трывожны і страшны 1941 год. Вёска затаілася, прыціхла. Калі стала відавочна, што хутка прыйдуць фашысты, Надзея Іванаўна ноччу вынесла сцяг брыгады з калгаснай канторы.

— Загарнула сцяг у стары шынель, у якім Браніслаў прыйшоў некалькі гадоў назад са службы ў Чыр-

вонай Арміі,— успамінае Надзея Іванаўна.— Пакунак ноччу закапала ў агародзе: думала, хутка вернуцца нашы. Там ён захоўваўся да позняй восені.

Тым часам рашэннем райкома партыі Б. Альвас, Лісовіч, А. Шчур, І. Раманюк былі пакінуты на акупіраванай тэрыторыі для арганізацыі ў тыле ворага партызанскай барацьбы. Надзея Іванаўна стала іх сувязной. Сустракала і праводзіла партызан, якія накіроўваліся на заданне, перадавала ім звесткі пра ворага, перапраўляла ў атрад прадукты.

Позняй восенню першага года вайны вырашыла перахаваць сцяг. Чырвонае палотнішча адсырэла ў зямлі. Жанчына надумалася замураваць яго ў комін.

— Перш чым замураваць, маці хацела прасушыць сцяг на печы, а тут раптам з вобыскам наляцелі паліцаі,— расказвае Ніна Браніславаўна, цяпер настаўніца Людзяневіцкай сярэдняй школы, а тады — чатырохгадовая дзяўчынка.— Маці паспела згарнуць палотнішча, кінула на ложак, а зверху пасадзіла мяне. Было так страшна, што я не магла нават заплакаць... Паліцаі перавярнулі ўсё ў хаце і на двары — шукалі партызан. Але ў той дзень якраз нікога не было... На мяне ніхто не звярнуў увагі.

А напярадзе чакалі новыя трывогі. Перад самым вызваленнем спалілі Поўчын — партызанскую вёску ў пяці кіламетрах ад Грады. Разам з жыхарамі. Такі лёс чакаў і Граду — тут вельмі часта знаходзілі прытулак партызаны. Надзея Іванаўна перахавала сцяг у пустую ржавую бочку з-пад газы, потым закапала яго ў скрыні разам з самымі неабходнымі рэчамі ў хмызняку за вёскай.

Немцы спалілі вёску да апошняй хаты. Людзей сагналі ў калгасную канюшню. Ніхто не спадзяваўся выйсці з яе жывым... На ўсё жыццё перад вачыма Надзеі Іванаўны засталося жудаснае відовішча, будынак, абліты газай, поўныя адчаю вочы дзяцей. У самую апошнюю хвіліну людзей усё ж выпусцілі. А вёска была ўся ў агні...

В. Р. Феранц

Трывожная маладосць

З успамінаў А. Р. Багая, актыўнага ўдзельніка Тураўскага камсамольска-маладзёжнага падполля

Раніца 22 чэрвеня 1941 г. выдалася ціхай і сонечнай. Людзі займаліся сваімі звычайнымі нядзельнымі нішнімі справамі. Сонца было ўжо даволі высока, калі спакой летняга дня парушыў нізкі гул самалётаў, якія прайшлі над Туравам некуды на ўсход. Нешта чужое, варожае чулася ў гэтым гуле. Некаторыя заўважылі на крылах самалётаў чорныя крыжы. Трывога пасялілася ў сэрцы, але мы яшчэ не ведалі маштабаў бяды, што навісла над краінай.

Апоўдні стала вядома — вайна. Паведамілі аб гэтым па радыё, і ўжо а другой гадзіне дня ў Тураве адбыўся шматлюдны мітынг, арганізаваны райкомам партыі. Было аб'яўлена аб пераходзе раёна на ваенны рэжым.

...10 жніўня ў памяшканні райкома партыі была праведзена апошняя нарада членаў райкома і камса-

А. Р. Багай



А. В. Сідараў

мольцаў-актывістаў. Мне было даручана падтрымліваць пастаянную сувязь з Туравам і партызанскім атрадам праз былога начальніка пашпартнага стала Бакуна. Ужо была закончана эвакуацыя ўстаноў і савецкіх органаў, праведзена ў поўным аб'ёме мабілізацыя. Доўгая абарона Турава парушыла планы гітлераўцаў, таму яны надзвычай лютавалі ў гарадскім пасёлку на працягу ўсёй акупацыі.

Ворагі захапілі Тураў, пачаліся жорсткія расправы над мірнымі жыхарамі. Яўрэяў зганялі да берага Струменя і расстрэльвалі з кулямётаў. Дзесяткі трупаў тураўцаў ляжала на вуліцах і ў дварах дамоў. Фашысты забаранялі хаваць іх. У вёсцы Рыдча расстралялі 90 мужчын і падлеткаў. Цудам засталіся жывымі і змаглі выбрацца з груды нежывых цел Пятро Бруй, Цярэнцій Ерамейчык, Канстанцін Бруй...

1 кастрычніка мы ўпершыню сабраліся на сход у доме І. Л. Хілінскага. Сярод прысутных былі Сцяпан Царык, Вольга Хілінская, сястра нашага кіраўніка, Васіль Міцюрыч і я. Быў пакладзены пачатак камсамольска-маладзёжнаму падполлю ў Тураве. У Івана Хілінскага ўстанавілі лямпавы батарэйны прыёмнік БНН-9, з дапамогай якога мы прымалі зводкі Саюінфармбюро і распаўсюджвалі іх у гарадскім пасёлку. Напярэдадні XXIV гадавіны Вялікага Кастрычніка падпольная група папоўнілася новымі членамі. У яе склад увайшлі Пятро Амяльчышын, Іван Балбуцкі, Фёдар Крывы, Уладзімір Ляўковіч, Ганна Катлярчук, Юлія Царык, Мікалай Царык. Кіраўніком прызначаны М. П. Іваноў (гэта быў псеўданім Андрэя Васільевіча Сідарава, былога работніка Лельчыцкага райаддзела міліцыі, якога лёс у цяжкія гады выпрабаванняў закінуў на Тураўшчыну). І. Л. Хілінскі зрабіў справаздачны даклад, паставіў задачы кожнаму падпольшчыку, галоўная мэта якіх была — біць праклятых захопнікаў.

Мне было даручана арганізаваць праслухоўванне па радыё святочнай перадачы з Масквы, падрыхтаваць лістоўкі і распаўсюдзіць іх сярод насельніцтва. 8 лістапада Андрэй Сідараў і Іван Балбуцкі прымацавалі адну такую лістоўку на лісце з вучнёўскага сшытка каля школы на вуліцы Кірава, другую — непадалёку ад камендатуры.

Кожны член групы меў свой участак для падпольнай работы. За Мікалаем Івановым і Сцяпанам Царыкам была замацавана вуліца Вароўскага, якая найбольш захавалася пасля пажару Турава 21 жніўня 1941 г., за Іванам Хілінскім — Набярэжная, за Васілём Міцюрычам — вуліца Леніна, за Вольгай Хілінскай — Рычоўская, мне была даручана работа на Сялянскай вуліцы.

Некалькі разоў арганізоўваліся камсамольскія сходы, прысвечаныя бягучым надзённым справам. Гэта былі своеасаблівыя сходы без прамоў і доўгіх дакладаў. Пад выглядам вячорак мы збіраліся ў хаце таго ці іншага таварыша, абмяркоўвалі, што зроблена, ставілі задачы на будучае і хутка расходзіліся.

На той час група была вельмі слаба ўзброена — налічвалася ўсяго дзве гранаты, наган і 300 патронаў. У красавіку І. Л. Хілінскі ўстанавіў сувязь з партызанскім атрадам В. З. Каржа, удалося здабыць зброю. Было дамоўлена аб адпраўцы ў партызанскі атрад моладзі з Турава.

Першае мая адзначылі лістоўкамі-плакатамі, у якіх расказвалася праўда аб становішчы на фронце, выказвалася цвёрдая ўпэўненасць у нашай хуткай і непазбежнай перамозе. Акупанты занепакоіліся, пачалі шукаць падазроных людзей. Арыштавалі Ганну Салаўёву, жонку партызана яшчэ часоў грамадзянскай вайны, які ў 1941 г. дабравольцам пайшоў у Чырвоную Армію, Івана

Партызаны атрада «Савецкая Беларусь» М. А. Скавінскі, у падполлі Турава — кіраўнік падпольнай медыцынскай групы, А. В. Сідараў — кіраўнік Тураўскай падпольнай камуністычнай групы з лістапада 1941 г. да кастрычніка 1942 г., В. М. Кірас — камсорг роты разведкі. 1943 г.

Балбуцкага, маладога хлопца з Запясочча. Іх расстралялі ў Жыткавічах. Пачаліся масавыя вобыскі, шукалі радыёпрыёмнік, зброю. Мне было даручана вынесці радыёпрыёмнік ад І. Л. Хілінскага і схаваць яго ў надзейным месцы. Каля будынка райпрамкамбіната я ледзь не натыкнуўся на паліцаяў, якія рабілі вобыск, але радыёпрыёмнік удалося схаваць каля памяшкання праўлення калгаса ў агародзе. Там ён праляжаў у кучы гною каля тыдня, пакуль не сціхлі павальныя вобыскі і аблавы, потым мы перанеслі яго ў лес за Прыпяць. 25 мая разам з І. Л. Хілінскім, П. А. Амяльчышыным і М. П. Івановым схавалі радыёпрыёмнік у дупле дрэва ва ўрочышчы Шкабароў. Некалькі разоў мы яшчэ слухалі і запісвалі радыёперадачы, але сховішча аказалася ненадзейным, прыёмнік знайшоў лясны аб'ездчык і паспяшаўся заявіць аб гэтым у камендатуру.

Гэты час быў адзначаны ўдачнай аперацыяй падпольшчыкаў на чале з Ф. П. Крывым. Яны ўзарвалі аўтамашыну з фашыстамі, некалькі ворагаў загінула, яшчэ больш было паранена.

Па заданню кіраўніцтва І. Л. Хілінскі і С. В. Царык з дапамогай Некрашэвіча ўстанавілі сувязь з жыткавіцкімі падпольшчыкамі. Да гэтага часу мы былі ўжо звязаны з падпольнымі групамі ў многіх вёсках раёна. У пасёлку Хваенск дзейнічала група моладзі і камсамольцаў, у якой Міхаіл Нямшэвіч меў радыёпрыёмнік БІ-234. У ім не хапала некаторых дэталяў і лямп, мы з В. С. Міцюрычам дапамаглі дабыць іх, а таксама дрот, батарэйкі. Калі мы страцілі свой прыёмнік, радыё падпольшчыкаў Хваенска нас вельмі выручала, мы працягвалі слухаць і запісваць апошнія навіны з Масквы і распаўсюджваць іх сярод насельніцтва. Шмат дапамагаў нам у гэтай небяспечнай рабоце старажыл Турава К. В. Жук.

У жніўні 1942 г. пачаўся масавы вываз моладзі ў Германію на работу. Патрыёты-ўрачы М. А. Скавінскі, Захарава, Аканаў аб'явілі ў раёне каранцін з выпадку быццам масавых захворванняў інфекцыйнымі хваробамі і змаглі ўпэўніць нямецкія ўлады ў тым, што людзей адпраўляць з Турава нельга.

У верасні 1942 г. адбыўся апошні сход камсамольска-маладзёжнай групы перад адыходам асноўнага ядра яе ў партызанскі атрад. У лес падаліся І. Л. Хілінскі, М. П. Іваноў і іншыя. Мне разам з С. В. Царыкам было даручана кіраўніцтва групай,

якая пакуль заставалася ў Тураве. Сувязь з партызанамі мы трымалі праз Г. В. Санец з Вароніна і К. Буду з Поўчына. Сувязь з атрадам, дзе змагаўся І. Л. Хілінскі, ажыццяўлялася з дапамогай яго старэнькай маці С. А. Хілінскай. Праз яе Іван перадаваў нам лістоўкі, «Правду», зброю. Гэта была надзвычай добрасумленная і смелая жанчына, якая шмат дапамагала нам і раней у падпольнай рабоце, ва ўсім падтрымлівала сына. А ў сярэдзіне лютага 1943 г. яна прынесла ад партызан радасную вестку аб разгроме ворага ў Сталінградзе. На гэтую падзею мы адклікнуліся тым, што сабралі ў пачатку вясны ў доме І. Ф. Багая на вуліцы Інтэрнацыянальнай агульны сход моладзі і камсамольцаў Турава, на якім заклікалі ўзняцца ўсіх на свяшчэнную барацьбу з ворагам. Р. Ф. Царык выступіў з інфармацыяй аб становішчы на фронце і аб рэзалюцыі V Пленума ЦК КП(б)Б аб арганізацыі ўсенароднай барацьбы з захопнікамі. С. В. Царык і П. А. Амяльчышын прапанавалі план уходу моладзі разам з сем'ямі ў партызанскі атрад. Да лета 1943 г. звыш 150 тураўцаў папоўнілі рады народных мсціўцаў.

У чэрвені 1943 г. я сустрэўся з М. П. Івановым непадалёку ад Поўчына. Расказаў аб сваіх справах, адчытаўся аб выкананай рабоце. У гэты час выявіў жаданне перайсці да партызан паліцай Пятро Атаманаў (сапраўднае яго прозвішча Гайдаманаў). Што ж, адказаў сябра, трэба праверыць яго, даць адказнае заданне, а там будзе відна. Так і зрабілі. Даручылі Атаманаву ўзарваць камендатуру. З гэтым небяспечным заданнем ён справіўся паспяхова. Былі паранены тры паліцаі і перакладчык, які праз некалькі дзён памёр. Знішчаны цэлы склад зброі. Адначасова з узрывам камендатуры прагучаў выбух і на мосце праз Струмень паміж Туравам і Запясоччам, ён быў значна пашкоджаны. Пятро Атаманаў разам з сям'ёй пайшоў у партызанскі атрад і зрабіў там яшчэ нямала добрых спраў. Галоўнае, што быў паказаны добры прыклад іншым «ваякам» паліцэйскага гарнізона Турава.

Многія паліцаі задумваліся, усё больш людзей, якія ў выніку цяжкіх абставін апынуліся ў стане ворагаў, выказвалі жаданне перайсці да партызан. Пасля адпаведнай праверкі іх прымалі ў атрадах. Нарэшце восенню 1943 г. накіравалася да партызан цэлае паліцэйскае падраздзяленне ў колькасці 35 чалавек са зброяй на чале з камендантам Пятром Крэсам.

А ў канцы 1943 г., калі заставацца ў Тураве было вельмі небяспечна, накіравалася ў партызанскі атрад імя Чкалава і асноўная група тураўскіх падпольшчыкаў. Для сувязі з намі ў Тураве засталіся В. Л. Хілінская, Г. Ф. Катлярчук і яшчэ некалькі чалавек.

Набліжаўся доўгачаканы час вызвалення роднай зямлі ад фашысцкай нечысці. М. П. Іваноў праз сувязных перадаў загад камандавання — скласці план варожых умацаванняў вакол Турава. Мы даручылі адказнае заданне нашаму выпрабаванаму сябру П. А. Амяльчышыну. Ён паспяхова выканаў гэтую работу, хутка схема абароны праз Г. В. Санец была перададзена ў партызанскі атрад імя Чкалава, адтуль яна трапіла камандаванню Чырвонай Арміі, якая знаходзілася ўжо недалёка ад Турава, і была вельмі карыснай у час наступлення нашых войск і вызвалення Турава.

Шмат гераічных учынкаў здзейснілі члены падпольнай камсамольскай групы ў партызанскіх атрадах і ў радах Чырвонай Арміі. Многія з іх загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У тым, што зроблена за час акупацыі ў Тураве, выключна вялікая доля належыць

кіраўніку групы А. В. Сідараву. Ён змог згуртаваць моладзь Турава, накіраваць яе на добрыя патрыятычныя справы, унесці свой уклад у разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Спіс найбольш актыўных членаў Тураўскай падпольнай камсамольска-маладзёжнай групы, якая дзейнічала з жніўня 1941 па чэрвень 1944 г.

Хілінскі Іван Людвігавіч, кіраўнік падпольнай камсамольска-маладзёжнай групы з 31 кастрычніка 1941 г. да 7 лістапада 1942 г. Трымаў сувязь з падпольшчыкамі Жыткавіч.

Хілінская Вольга Людвігаўна, адна з першых членаў групы, пасля таго, як кіраўніцтва яе пайшло ў партызанскі атрад, трымала з ім цесную і ўсебаковую сувязь.

Сідараў Андрэй Васільевіч (Іваноў Мікалай Пятровіч), кіраўнік падпольнай камсамольска-маладзёжнай групы (разам з І. Л. Хілінскім) да 6 кастрычніка 1942 г.

Багай Акім Рыгоравіч, кіраўнік падпольнай камсамольскай групы з кастрычніка 1942 г. да снежня 1943 г. Складаў план барацьбы групы, арганізоўваў праслухоўванне радыё, адказны за складанне і распаўсюджванне лістовак.

Міцюрыч Васіль Сямёнавіч трымаў сувязь з камсамольцамі Азяран, Хваенска, Слепцаў.

Царык Сцяпан Васільевіч, адзін з кіраўнікоў групы, актыўны яе член.

Амяльчышын Пятро Адамавіч, адзін з кіраўнікоў групы, як былому вайскоўцу, яму было даручана складанне схемы абароны Турава перад наступленнем Чырвонай Арміі.

Балбуцкі Іван Рыгоравіч, адказны за складанне і афармленне лістовак, іх распаўсюджванне. Загінуў улетку 1943 г. у партызанскім атрадзе.

Крывы Фёдар Паўлавіч, як былы вайсковец, кіраўнік многіх дыверсійных аперацый.

Ляўковіч Уладзімір Фёдаравіч, актыўны ўдзельнік падпольнай работы. Загінуў у 1944 г. на фронце.

Буда Кірыл Максімавіч, сувязны атрада імя Чкалава брыгады «Савецкая Беларусь».

Санец Ганна Васільеўна, сувязная з в. Вароніна, праводзіла там вялікую прапагандысцкую і арганізацыйную работу.

Хілінская Соф'я Антонаўна, маці актыўных падпольшчыкаў Івана, Вольгі і Міхаліны Хілінскіх, сувязная, памочнік і дарадчык тураўскіх патрыётаў.

Катлярчук Ганна Фамінічна, член падпольнай камсамольска-маладзёжнай групы да дня вызвалення Турава, гаспадыня явачнай кватэры на вуліцы Інтэрнацыянальнай.

Нямшэвіч Міхаіл, спецыяліст па радыё, прымаў зводкі Саўінфармбюро, трымаў сувязь з падпольшчыкамі Хваенска. Загінуў у 1944 г.

Міхейшын Мартын, прысланы ЦК КП(б)Б для разгортвання ўсенароднай барацьбы ў раёне. Закатаваны фашысцкімі вылюдкамі ўлетку 1942 г.

Царык Мікалай, гаспадар явачнай кватэры на вуліцы Вароўскага, актыўны ўдзельнік дыверсійнай групы Ф. П. Крывога. Памёр у 1945 г.

Царык Юлія Іванаўна, адказная за работу сярод моладзі на ўскраіне Турава.

Царык Рыгор Фядотавіч, адказны за работу па дэмаралізацыі паліцаяў Тураўскага гарнізона.

Саша, вайсковец, родам з Алма-Аты (прозвішча невядома), актыўны член падпольнай камсамольска-маладзёжнай групы. Працаваў у Тураве сапожнікам, удзельнік многіх дыверсій. Разам з І. Л. Хілінскім пайшоў у партызанскі атрад, загінуў пры выкананні баявога задання.

Місюк Міхаіл трымаў сувязь з камсамольцамі в. Хачэнь, трымаў сувязь з партызанамі Пінскага злучэння. Загінуў на явачнай кватэры,

калі І. Л. Хілінскі і Саша накіроўваліся ў партызанскі атрад.

Хілінская Міхаліна Людвігаўна, член групы да дня вызвалення Турава, здабывала дакументы для падпольшчыкаў, займалася прапагандай у акупацыйных установах, распаўсюджвала лістоўкі.

Праз усе выпрабаванні

Галавач Аляксандр Уладзіміравіч (н. у 1923 г. у в. Млынок) у першыя дні вайны з'яўляўся адным з арганізатараў Коленскай падпольнай камсамольскай арганізацыі, потым — байцом 109-га партызанскага атрада 50-й Жыткавіцкай брыгады. У пасляваенны час — на педагагічнай рабоце: настаўнік, загадчык райана, дырэктар школ раёна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ст., медалямі «За адвагу», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені, «За доблесную працу», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і інш.

На трэці дзень акупацыі раёна ў Кольна прыбыла вялікая група гітлераўцаў устанаўліваць «новы парадак». Усіх жыхароў сагналі ў цэнтр вёскі. Прадстаўнік нямецкай камендатуры пачаў знаёміць з гэтым «новым парадкам»: камуністам — смерць, за захаванне зброі, радыёапаратуры, укрыццё ваеннапалонных — расстрэл...

— Камуністы, актывісты і іх сем'і, яўрэі — усім выйсці наперад! — загадаў немец.

Ніхто не выйшаў. На плошчы ў той дзень не было Івана Міхайлавіча Кісялёва — аднаго з арганізатараў савецкай улады ў раёне, кіраўніка першай камуны ў вёсцы Буйкавічы, а затым — калгаса «Новае жыццё», адной з лепшых гаспадарак у той час на Жыткаўшчыне. Іван Міхайлавіч карыстаўся вялікім аўтарытэтам і павагай у вяскоўцаў.

— Дзе Кісялёў? — дапыталіся акупанты, якім паспелі далажыць пра актывіста.

Маўчанне. Магчыма, немцы хацелі прызначыць яго старастам. Тады прапанавалі ў прадстаўнікі «новай улады» Уладзіміра Жалезку. Той адмовіўся. Ён не меў крыўды на савецкую ўладу, хоць і быў раскулачаны, нацярпеўся несправядлівасці. Тады вызваўся быць старастай Севярны — чалавек нячысты на руку, несумленны. Такім жа быў і Голуб — адзіны, хто запісаўся ў паліцаі. Немцы ўчынілі ў Кольна пагром, нарабавалі дабра і прадуктаў і вярнуліся ў Жыткавічы. «Новы парадак» пачаўся...

Правай рукой раённага бургамістра ў гэтым краі стаў Фрыдрых Маркварт — былы лясны майстар, які незадоўга перад вайной прыехаў у Кольна. Акупантаў ён сустрэў радасна, з уздымам, але ўмеў ладзіць і з мясцовым насельніцтвам.

Не пайшлі на сход і коленскія камсамольцы — Макс Кісялёў, тады яшчэ вучань, сын старшыні калгаса, Аляксандр Галавач, студэнт педінстытута, Дзмітрый Кароткі, рабочы лясгаса. У іх была свая задума — змагацца, наколькі магчыма і чым магчыма, з ворагам.

Доўга думалі, узважвалі свае магчымасці, абмяркоўвалі кожнага з моладзі вёскі — каго можна прыцягнуць у камсамольскую падпольную групу. І ў пачатку жніўня яна была сфарміравана. У яе ўвайшлі Яфім Ханеня, Мікалай Налівайка, Лукаш Мароз, Аляксандр Жалезка, Сяргей Татарчук, сёстры Ніна і Оля Ламан, Браніслава Жалезка, Ніна Кісялёва. Былі ў групе і людзі старэйшага ўзросту — настаўнікі, паважаныя вопытныя людзі Ф. Т. Наумовіч і Г. Я. Ханеня.

Пачыналі з малога. Пасля першага наведвання немцамі вёскі мы пазрывалі іхнія аб'явы і загады, а на іх месцы напісалі крэйдай: «Смерць фашыстам!»

Дзмітрый Кароткі ўстанавіў сувязь з партыйным падполлем. Ён, як высветлілася потым, быў спецыяльна пакінуты ў акупіраваным раёне для арганізацыі барацьбы з ворагам.

Аднойчы Дзмітрый сказаў сябрам:

— Трэба прабрацца праз Прыпяць, знайсці ў Хваенску свайго чалавека і перадаць яму неабходныя звесткі.

Выканаць заданне разам з Кароткім вызваўся Макс Кісялёў. Гэта было нялёгкае, рызыкоўнае падарожжа па занятай ворагам тэрыторыі. Калі хлопцы вярнуліся ў Кольна, здраднік данёс ворагам, што яны — камсамольцы, займаюцца шкоднай дзейнасцю супраць новага парадку... Кісялёва і Кароткага арыштавалі. Два тыдні дапытвалі іх у турме — білі, пагражалі расстрэлам. Толькі па хадайніцтву Фрыдрыха Маркварта хлопцаў выпусцілі, папярэдзіўшы, што ў наступны раз расплата будзе суровай.

Складанасць была ў тым, што вёска знаходзілася на бальшаку, паміж Жыткавічамі і Туравам, дзе размяшчаліся буйныя гарнізоны гітлераўцаў. Па дарозе пастаянна сноўдаліся ворагі, немцы і паліцаі. Лес — далёка, намнога бліжэй — чыгунка, якая ўзмоцнена ахоўвалася. Часта з'яўляліся ў месцах збору людзей Гаўрыл Ханеня, Аляксандр Галавач, Макс Кісялёў, Фёдар Наумовіч. У хаце цёткі Хвядорыхі збіралася моладзь на вячоркі, і там заўсёды прысутнічалі камсамольцы.

Збіралі зброю. Восенню 1941 г. здабылі 4 вінтоўкі, 10 скрынак патронаў, 6 гранат. Усё гэта схавалі ў надзейным месцы ва ўрочышчы Печкі, дзе яшчэ хлапчукамі гулялі «ў вайну». Калі настаў час падпольшчыкам ісці ў партызанскі атрад, зброя вельмі спатрэбілася. Хлопцы з'явіліся ўзброенымі, настроенымі рашуча, па-баявому...

Бліжэй да восені вяскоўцы пачалі збіраць і дзяліць ураджай, які паспеў на калгасных палях. У гэты час пачалі ўздымаць галаву паліцаі, памагатыя акупантаў. Здраднік, мясцовы жыхар, крычаў: «Кісялёвы, камуністы, нічога не атрымаюць!» Падаўся ў паліцаі Фёдар Налівайка.

У канцы кастрычніка Яфім Ханеня, Сяргей Татарчук, Дзмітрый Кароткі, Аляксандр Галавач, Макс Кісялёў і Гаўрыл Ханеня абарвалі паміж Скрыпіцай і Прыпяццю шэсць пралётаў тэлефоннай сувязі паміж Жыткавіцкім і Тураўскім гарнізонамі. Асаблівай смеласцю і рызыкоўнасцю ў выкананні аперацыі вызначаўся Мікалай Налівайка. Па яго ініцыятыве камсамольцы-падпольшчыкі выламалі шлюзы ў саджалках рыбгаса «Чырвоная Зорка» і выпусцілі рыбу, якую акупанты намерваліся выкарыстаць для сваіх мэт. Вартаўніка папярэдзілі: «Будзеш служыць ворагам, жывым не застанешся». У тую ж ноч яны ўзламалі зернясховішча ў «Чырвонай Зорцы», раздалі зерне насельніцтву і спалілі склад.

Аднойчы, у канцы 1941 г., Фёдар Зінкевіч, які працаваў на чыгунцы, паведаміў, што немцы разгромлены пад Масквой. У Жыткавічах з'явіліся эшалоны з раненымі і абмарожанымі немцамі. Радасная вестка хутка абляцела навакольныя вёскі.

Зімой 1942 г. камсамольска-маладзёжная група значна павялічылася, расла колькасць дыверсійных дзеянняў і палітычных мерапрыемстваў. У арганізацыю былі залічаны новыя таварышы: Фёдар Татарчук, Мікалай Драбовіч, Адам Ляўковіч, Іван Касцюк, Антон Галавач, Уладзімір Галавач, брат і сястра Аляксандр і Браніслава Жалезка. Хлопцы звязаліся з камсамольцамі вёскі Чарацянка Сяргеем Альвінскім, Аляксандрам Кузьміным, Васілём Волкам, сёстрамі Зінай і Лідай Масла. Гэта былі надзейныя людзі, якія рабілі нямала шкоды ворагам, імкнуліся дзейнічаць яшчэ больш актыўна, рашуча. Агульнымі намаганнямі збіралі звесткі аб ворагах і перадавалі іх у партызанскі атрад, распаўсюджвалі лістоўкі, здабывалі зброю. Дарафей Масла перавозіў лі-

стоўкі і іншыя дакументы ў рулі веласіпеда.

У Буйкавічах і Пасецы дзейнічалі Сяргей Прыкота, Мікалай Баброў, Вячаслаў Некрашэвіч. Яны трымалі сувязь з падпольшчыкамі вёскі Вадапойла Антонам Гулюта, Мікалаем Некрашэвічам, Насцяй Рагавіцкай і іншымі.

Пастаянную сувязь падпольшчыкі Кольна трымалі з патрыётамі Жыткавіч. Там жыла вялікая і дружная сям'я Зінкевічаў. Шура Зінкевіч да вайны была актывісткай-камсамолкай, у 1941 г. уступіла ў партыю. Браты Фёдар і Сяргей працавалі на чыгунцы і дапамагалі падпольшчыкам арганізоўваць дыверсіі. Яны перадавалі ў атрад шмат карыснай для партызан інфармацыі. Шура Зінкевіч накіроўвала людзей у партызанскі атрад, выконвала заданні камандзіра партызанскага атрада У. І. Гушчэні і У. М. Дзербана. Ёй удалося ўладкаваць на работу да бургамістра Бараноўскага пляменніцу Раю. Аднойчы Рая паклала ў кішэню бургамістру папярэджанне, што партызаны адпомсцяць здраднік у. Адважнай падпольшчыцы ўдалося выкрасці з гарадской управы пішучую машынку. Яна схавала яе ў кошык, засыпала сухімі грушамі, а потым перадала машынку ў партызанскі атрад. А ў жніўні 1943 г. з дапамогай Шуры і Раі Зінкевічаў Фіра Маліноўская, Галя Масла і Валя Мукель вынеслі з будынка лясгаса яшчэ адну машынку «Ундэрвуд».

Вясной 1942 г. я сустрэўся ў Жыткавічах са сваім былым аднакласнікам Мікалаем Каржом. Ён тады працаваў у гарадской управе і прымаў актыўны удзел у падпольнай партыйнай групе Е. Я. Горава, якая была звязана з атрадам Баці (Ліньков а). Мікалай Корж аказаў вялікі ўплыў на нашу групу — даваў заданні, перадаваў лістоўкі, газету «Правда». Раіў актывізаваць дзейнасць, але быць асабліва асцярожным. А ў лістападзе 1942 г. група Горава была выкрыта, шмат патрыётаў было арыштавана і расстраляна. Мікалаю ўдалося выратавацца, але яго бацьку, маці і дзвюх сясцёр фашысты загубілі...

Вясной 1942 г. Дзмітрый Кароткі накіраваўся ў Перароў, спадзяючыся ўстанавіць сувязь з партызанскім атрадам. З выпадку свята на вуліцы вёскі было многа народу. Дзмітрый уступіў у размову з людзьмі, пачаў расказваць ім праўду аб становішчы на фронце, агітаваць за аказанне супраціўлення акупантам. Усё гэта назіраў здраднік, які далажыў аб камсамольцы паліцаю Шведу. Той па-зверску, з-за вугла забіў патрыёта. Дзмітрый Кароткі загінуў, але справа, за якую ён аддаў сваё маладое жыццё, жыла...

У вёсцы Перароўскі Млынок пабываў Гаўрыл Ханеня. Яму расказалі сяляне, што сюды нярэдка наведваюцца партызаны па шляху на выкананне задання і назад, іх разведка часта бывае ў навакольных вёсках. Было вядома, што ў партызанскай зоне знаходзіцца ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б А. М. Бялянчык, які да вайны працаваў у Жыткавічах, ведаў братоў Масла. У пачатку вайны А. М. Бялянчык не паспеў эвакуіраваць сям'ю, цяпер яна жыла пад штомінутнай пагрозай арышту ў Жыткавічах. Жонка партызанскага кіраўніка прасіла братоў наладзіць сувязь з Тураўскім партызанскім атрадам, з А. М. Бялянчыкам. Праз Юльяна Грамадскага, жыхара вёскі Хлупінская Буда, інфармацыя была перададзена ў партызанскі атрад. Хутка Дарафей Масла вывеў жонку і дзяцей А. М. Бялянчыка ў вёску Чарацянка, адкуль партызаны перавезлі іх за Прыпяць у атрад.

А пакуль камсамольцы-падпольшчыкі працягвалі барацьбу, на якую былі здольны. Здабывалі соль для

партызан, муку. Гэтыя надзвычай важныя ў той час прадукты я некалькі разоў перапраўляў у лес. Вялі вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу. Распаўсюджвалі лістоўкі і газеты, якія зімой 1941 г. сувязныя перадавалі з Чырвонага возера, дзе быў партызанскі лядовы аэрадром С. А. Каўпака.

А ў маі 1942 г. я сустрэўся з камандзірам партызанскага атрада «За радзіму» В. І. Прасолавым. Распрацавалі план далейшай работы, дамовіліся аб тым, што частка падпольшчыкаў пойдзе ў атрад. Хутка сталі партызанамі Макс Кісялёў, Мікалай Наліваўка, Сінкевіч. Праз некаторы час яшчэ адна група накіравалася ў атрад. Улетку амаль уся камсамольска-маладзёжная група стала партызанскай. У Тураўскім атрадзе «За радзіму» амаль палова партызан была з Жыткавіцкага раёна. Было вырашана стварыць асобны Жыткавіцкі атрад № 109, які пачаў адлічваць свае баявыя справы з 31 ліпеня 1943 г.

У тыле — як на фронце

У лістападзе 1943 г. у атрад № 105 прыбылі жыткавіцкія падпольшчыкі Іван Ханеня і Мікалай Саўчыц. Заставацца ў горадзе яны больш не маглі. Іх падпольнай работай кіраваў Лаўрэнцій Савельевіч Галавач. Пасля таго як у ліпені 1943 г. ён пайшоў ў партызанскі атрад, астатнія таварышы заставаліся ў Жыткавічах і працягвалі працаваць пад яго непасрэдным кіраўніцтвам праз паштовыя скрынкі, асабістыя сустрэчы ў явачных месцах. Дачка М. І. Івашкевіча Марыя, увайшоўшы ў давер да шэфа-начальніка, працавала машыністкай і выконвала нашы заданні.

Пры адной з сустрэч у жніўні 1943 г. Л. С. Галавач папрасіў Марыю раздабыць для атрада пішучую машынку. Марыя паабяцала выканаць просьбу. Пры наступнай сустрэчы Лаўрэнція Галавача з Мануілам Івашкевічам у канцы жніўня апошні паведаміў, што машынка ўжо ёсць і схавана ў надзейным месцы. Хутка яна была перададзена нам.

Як жа ўдалося Марыі выканаць наша заданне? У жандармерыі, дзе працавала, было некалькі пішучых машынак, якія знаходзіліся ў адным пакоі. Дастаткова было ў канцы работы пакінуць акно незачыненым на засаўку, каб ноччу ўзяць машынку са стала. Марыя так і зрабіла. У адзін са жніверьскіх дзён яна непрыкметна пакінула незачыненым акно, што знаходзілася з боку агароду, і паведаміла аб гэтым Івану Ханені і Мікалаю Саўчыцу. Як малярам, ім выдаваліся пропускі для руху па гораду і наведвання нямецкіх устаноў. Выбраўшы зручны момант, калі дзяжурны жандармерыі сядзеў на ганку з боку вуліцы пры ўваходзе ў памяшканне, яны падышлі да памяшкання, адчынілі акно і забралі пішучую машынку.

Выявіўшы прапажу машынкі, гітлераўцы спачатку ўзрушыліся, але зрабіўшы допыт работнікаў канцылярыі, вартавых і іншых асоб, як бы супакоіліся. Але гэта толькі так здавалася, а на самай справе яны сур'ёзна заняліся пошукамі. Паколькі каля акна, праз якое была ўкрадзена машынка, працавалі Марыя Івашкевіч і яе сяброўка, на іх упала падазрэнне.



Л. С. Галавач

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Гітлераўцы ўстанавілі за імі назіранне. Затым падаслалі да сям'і Івашкевічаў свайго агента. Але і яму не ўдалося ўстанавіць нічога падазронага, Івашкевічы працавалі надзвычай асцярожна. Тады здраднік пачаў шукаць іншыя шляхі. Ён падышоў да пляменніцы Мануіла Ігнатавіча Мілы Асёл, якая сябравала з яго дачкамі. Прыкідваючыся партызанскім сувязным нейкага атрада, ён павёў з Мілай асцярожную размову, пры гэтым папярэдзіў яе аб пільнасці, прасіў нічога нікому не расказваць, чым выклікаў да сябе яе схільнасць. Міла Асёл, не будучы дастаткова вопытнай у справе канспірацыі, прагаварылася яму, што яна і сям'я Мануіла Івашкевіча таксама маюць сувязь з партызанамі. Больш таго, яна пахвалілася, што партызаны далі ім вельмі важнае заданне і прыгатавалі для гітлераўцаў добрыя «падарункі». Справа ў тым, што Марыя Івашкевіч атрымала заданне ўзарваць жандармерыю разам з гітлераўцамі, а самой з сям'ёй пайсці ў атрад. Яна рыхтавалася да сур'ёзнай аперацыі разам з бацькам і сястрой, аб чым стала вядома і Міле Асёл.

Правакатару больш нічога і не трэба было. Ён тут жа паведаміў сваім гаспадарам у жандармерыю. А на наступны дзень раніцай да Мануіла Івашкевіча ўварваліся гітлераўцы. Яны акружылі яго двор і пачалі вобыск, перапорвалі шомпаламі ўсю сядзібу, патрабавалі выдаць партызанскія міны і ўсё іншае. Не дабіўшыся станоўчых вынікаў, гітлераўцы пачалі збіваць Мануіла Івашкевіча і яго сям'ю прыкладамі. Мануіл Ігнатавіч, не вытрымаўшы здзекаў фашыстаў, выхапіў з рук аднаго з палачоў нямецкі аўтамат, намерыўся паласануць чаргой па ворагу. Ударыў па галаве гітлераўца і звaліў яго з ног. На патрыёта навaліліся, павалілі на зямлю, скруцілі і надзелі наручнікі. Затым арыштавалі ўсю яго сям'ю: жонку Вольгу Адамаўну, дачок Марыю, Ніну, Надзею, малалетняга сына Аляксея, малодшага брата Барыса, які таксама дапамагаў Мануілу ў рабоце, пляменніцу Мілу Асёл.

Трое сутак дапытвалі гітлераўцы вязняў у засценках гестапа, але нічога не дабіліся. Мануіла Ігнатавіча замучылі да смерці, астатніх вывезлі ў канцлагер у Брэст, адкуль удалося вярнуцца жывымі толькі жонцы Мануіла Вользе Адамаўне, дачцы Надзеі, Барысу і Міле Асёл.

Пасля арышту сям'і Мануіла Ігнатавіча Івашкевіча, з якой былі звязаны жыткавіцкія падпольшчыкі, над імі навісла смяротная небяспека. Частка падпольшчыкаў, якім пагражала небяспека, пайшлі ў партызанскія атрады «1-е Мая», № 105 і № 109. Тыя, на якіх не падала падазрэнне, заставаліся ў Жыткавічах і працягвалі работу ў падполлі. Гэта М. Ф. Бандзюк, А. І. Марчанка, М. І. Саўчыц, І. М. Ханеня, К. Е. Бандзюк, М. П. Саўчыц, У. А. Шулякоўскі і іншыя.

У. М. Дзербан

Медыкі ў баявым страі

З успамінаў К. С. Захаравай, члена падпольнай медыцынскай групы ў Тураве

У жніўні 1941 г. наша 6-я армія трапіла ў акружэнне. Муж быў смяротна паранены, а я трапіла ў палон. Працавала ў лагерным лазарэце, дзе былі ўрачы-патрыёты, яны выдавалі некаторым байцам і афіцэрам спецыяльныя пропускі на выхад з лагера. Удалося атрымаць такі пропуск і мне. І вось з лета 1942 г. я на волі. Нямецкія ўлады накіравалі мяне на работу ў Тураў. Там у гэты час была эпідэмія дызентэрыі. Мне даручылі весці амбулаторны прыём хворых. Праз Пятра Пракоф'евіча Палубца я даведалася, што ў Тураве існуе падпольная група медыцынскіх работнікаў. Мне вельмі хацела-

ся прыняць у ёй удзел, аказваць актыўнае супраціўленне ворагу, але гэта ўдалося не адразу. Паступова я пазнаёмілася з Мікалаем Скавінскім, фельчарам Жураўскім, настаўнікам С. Дзялендзікам з Вароніна, яны і прыцягнулі мяне да справы. Аб'явілі Тураў і многія навакольныя вёскі небяспечнымі ў адносінах да інфекцыйных хвароб, быццам там лютуе не толькі дызентэрыя, але і тыф, іншыя небяспечныя захворванні. Былі складзены па ўсёй форме адпаведныя акты, якія афіцыйна пацвярджалі сур'ёзнасць становішча. На многія вёскі быў накладзены каранцін без тэрміну, галоўным чынам у Азяранскім і Рычоўскім сельсаветах. Восенню 1942 г. фашысты масава вывозілі моладзь у Германію, але з Тураўшчыны забралі тады ў выніку нашай работы мала людзей.

Акупацыйныя ўлады сілком прымушалі моладзь запісвацца ў паліцыю. Перад гэтым хлопцы павінны былі прайсці медыцынскую камісію. У размове я старалася выведаць настрой кожнага, і калі адчувала, што чалавек імкнецца зусім да другога, знаходзіла ў яго кучу «хвароб» і выбракоўвала. Гітлераўцам, відаць, здалося гэта падазроным, і яны больш не накіроўвалі да мяне кандыдатаў у паліцаі.

Я даведалася, што з партызанамі трымаюць сувязь Якаў Лукашэнка, настаўніца Г. Санец. Яны сустракаліся з прадстаўніком атрада «За Радзіму» ў Поўчыне Кірылам Максімавічам Буда. Лукашэнка ў лютым накіраваў мяне да яго, каб я змагла пайсці ў партызаны, але Буда ў той раз не дапамог, ён быў асцярожным, мяне не ведаў, словы мае яго не пераканалі. Не ўдалася і другая спроба. У Азяранах нас разам з Хілінскай, Тачылінай і Каралёвай затрымалі паліцаі, абшукалі, нічога не знайшлі і павезлі назад у Тураў. Сур'ёзных улік супраць нас не было, але заставацца ў Тураве было небяспечна. 31 мая мяне выклікалі ў жандармерыю. Было зразумела — адтуль я ўжо не выйду. Лукашэнка накіраваў мяне зноў да Буды ў Поўчын, дзе на гэты раз чакалі партызаны. Я набіла сумку медыкаментамі і асцярожна, па-за хатамі накіравалася да Прыпяці. Хутка мяне сустракалі ў партызанскім атрадзе за Пераровам.

Такая нам выпала доля

Ярмоленка Іван Іванавіч (н. у 1923 г. у в. Перароўскі Млынок) пасля заканчэння сямігодкі працаваў бухгалтарам у мясцовым калгасе «10-ы з'езд Саветаў», быў сакратаром камсамольскай арганізацыі. З пачатку акупацыі раёна прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з ворагам, быў удзельнікам падпольнай камсамольскай групы, затым — у партызанскім атрадзе «За Радзіму». Баец, намеснік камісара атрада па камсамолу і адначасова — сакратар падпольнага Тураўскага райкома камсамола. Пасля вызвалення раёна — першы сакратар Тураўскага РК ЛКСМБ, затым — на гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ст., медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» I ст., «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Трывожны час наступіў у жніўні 1941 г., калі часці Чырвонай Арміі пакінулі Тураў. Перад гэтым нас, вясковых камсамольцаў, выклікалі ў Тураў, дзе ў памяшканні райкома камсамола далі наказ першы сакратар РК КР(б)Б Г. Л. Дворкін, сакратар райкома камсамола Э. П. Шубянок.

— Вы застаецеся ў тыле ворага.

І. І. Ярмоленка

Адказнасць за гонар камсамола будзе яшчэ больш высокай. Не на спакойнае жыццё застаецеся. Змагацца ў тыле намнога цяжэй, вялікія выпрабаванні чакаюць вас... Біце праклятых захопнікаў усюды, дзе можна, як можна і чым можна...

Разам са сваімі сябрамі Максімам Голадам, Васілём Пацуком, Арцёмам Паўлючанцом і іншымі мы рыхтаваліся да нялёгкай, рызыкоўнай барацьбы. Практычныя парады і дапамогу аказвалі нам на той час старшыня Перапоўскага сельсавета А. А. Радзіёнаў, парторг калгаса А. Я. Радавец. Мы схавалі ў надзейным месцы ўсе калгасныя дакументы, а таксама адзіны ў вёсцы радыёпрыёмнік РПК-9. Яго ўзяў на захаванне Сяргей Герман, які ведаў, чым рызыкуе. Часта мы слухалі перадачы з Масквы. Патрэбны былі навушнікі, і я накіраваўся да свайго знаёмага Міхаіла Нямшэвіча, які працаваў у Тураве на радыёвузле. Нямшэвіч здабыў нямецкія навушнікі, і часта хто-небудзь з нас вечарамі сядзеў ля прыёмніка, слухаў перадачы з Масквы, запісваў апошнія навіны.

Аднойчы ноччу немцы разам з паліцаямі наляцелі з вобыскам. Усё ў хаце перавярнулі, але нічога не знайшлі. Тады, заспакоены, я забраў радыёпрыёмнік да сябе. Калі выйшла са строю адна з лямп, Нямшэвіч здабыў яе ў немцаў, а батарэйкі мы са сваімі сябрамі Трафімам Шведам навучыліся рабіць самі. Дапамагаў трымаць радыёпрыёмнік у спраўнасці і ўмелец Ілья Аксененка, да вайны — ветэрынарны работнік у калгасе. Мы хавалі яго ў печы, дзе зрабілі спецыяльную нішу, замазалі яе і замаскіравалі, а ў комін вывелі антэну, далей працягнулі яе ў саламяным даху, зазямленне — пад печчу. Прыёмнік уключалі ў печы адвёрткай праз спецыяльную адтуліну, а слухалі праз навушнікі з доўгім дротам у пакоі або гарышчы хаты. Лістоўкі мы перадавалі праз сваіх надзейных сяброў — камсамольцаў Рыгора Касцянка, Васіля Пацука, Трафіма Шведа і іншых у Хваенск, Хлупін, Чэрнічы, Пагост, дзе яны распаўсюджвалі іх сярод насельніцтва.

На барацьбу з ворагам паўставалі не толькі дарослыя, але і падлеткі. Сувязнымі, на якіх не падала падазрэнне, былі мой малодшы брат Сярожа і яго сябрук Саша Масла. Яны хадзілі з вёскі ў вёску, перадавалі патрэбныя нам звесткі, а калі мы былі ўжо ў партызанах, прыходзілі да нас у лес. Аднойчы ўвечары Сярожа вяртаўся з партызанскага атрада і суседка-здрадніца падказала паліцаям, што хлопец звязаны з партызанамі... Ворагі схапілі яго, адправілі ў Тураў, доўга дапытвалі, патрабавалі адказаць, дзе я, і паказаць дарогу ў атрад. Сярожа нічога не адказаў, тады яго да раніцы зачынілі ў падвале. А ноччу хлопца вызваліў вартавы — паліцэйскі Андрэй Лой, і яны разам прыйшлі ў атрад. Лой — са зброяй, ён стаў добрым партызанам. Пасля вызвалення ён пайшоў у Чырвоную Армію, мужна ваяваў на фронце, быў узнагароджаны трыма баявымі ордэнамі.

Восенню 1941 г. у вёску вярнуліся некалькі вяскоўцаў-акружэнцаў — Іосіф Прыкота, Іван Лісавец. Гэта былі мужныя людзі, якія мелі вопыт барацьбы з ворагам і многа ў чым маглі дапамагчы нам, маладым і нявопытным, якія імкнуліся ўсёй душой змагацца, але часта не ведалі, як лепш гэта ажыццявіць.

Да зімы мы ўжо мелі сувязь з Лельчыцкім партызанскім атрадам, атрымлівалі адтуль заданні — правесці групу на дыверсію, сабраць неабходныя звесткі аб ворагу.

Хутка пасля гэтага і мы са сваімі сябрамі — Пятром Голадам, Васілём Пацуком, Іосіфам Прыкотам, Іванам Лісаўцом, Ільёй Аксёнчыкам, Максімам Голадам — падаліся да парты-

зан. Усенародная барацьба з ненавісным ворагам шырока разгортвалася ў краі. Спачатку мы дзейнічалі, як маглі, самастойна. Рабілі дыверсіі на дарогах і ў вёсках раёна, нападалі на групы захопнікаў. Падпалілі каля Прыпяці склад з лесам і лесаматэрыялам. Перапынялі плыты на рацэ і знішчалі іх. Рабілі засады, забівалі паліцаяў.

Нашым дарадчыкам і памочнікам, як і ў нядаўнія школьныя гады, быў дырэктар Перароўскай школы Трафім Іванавіч Шліхтаў. А ўлетку 1943 г. ён разам з жонкай Ганнай Іванаўнай і малалетнімі дзецьмі прыйшоў да нас у атрад. Як і ў школе, мы і цяпер многаму ў яго вучыліся — смеласці, дабрыні, жыццёвай мудрасці... Група расла, мацнела, набіралася сілы і баявога вопыту. Паступова вырас партызанскі атрад, які атрымаў назву «За Радзіму». Камандзірам атрада стаў Васіль Іванавіч Прасолаў, вайсковец, вопытны баявы афіцэр. Старшынёй калгаса «Перамога» да вайны працаваў Панцялей Іванавіч Тарасюк. У нас ён быў прызначаны камісарам атрада.

Аднойчы група, у саставе якой знаходзіўся і я, пасля выканання баявога задання ў лесе паміж Перапровам і Хваенскам натыкнулася на немцаў. У сутычцы адзін паліцай, Скрыгалоўскі, быў забіты, адзін паранены. Мы даведаліся, што забітага будуць хаваць у Хваенску, і спадзяваліся, што пры гэтым пажадае прысутнічаць сам камендант Стокалас з Азяран. Вось зручны выпадак разлічыцца з нямецкім прыхваснем! Зрабілі засаду. Але з камендатуры ніхто не прыехаў на пахаванне — не вельмі, відаць, шанавалі там сваіх паслугачоў. Усё ж абстралялі паліцаяў, якія вярталіся з могілак, ранілі, здаецца, некалькіх. У мяне была на той час паляўнічая стрэльба — зброя не вельмі прыгодная для бою з ворагам. Тут я разжыўся вінтоўкай. Наогул з узбраеннем у атрадзе справа была дрэннай. Людзей прыходзіла многа, іншы раз даводзілася адпраўляць на некаторы час назад па той прычыне, што іх не было чым узброіць. Добра, калі папаўненне прыходзіла са сваёй зброяй, а калі не... Былі выпадкі, калі на баявую аперацыю накіроўвалася дзесяць чалавек, а ўзброенымі былі 5—6, астатнія здабывалі зброю ў баі.

Ніхто не сумняваўся: трэба як можна актыўней біць ненавісных ворагаў, змагацца за сваю зямлю — і гэтым набліжаць Перамогу. Мяне, як хлопца адукаванага — скончыў перад вайной бухгалтарскія курсы — хутка прызначылі пісарам атрада. У штабной рабоце я мала што разумеў, але неабходнасць прымусіла навучыцца, неабходныя веды і навыкі прыходзілі з часам.

У пачатку 1943 г. у атрад улілося вялікае папаўненне моладзі з навакольных вёсак, работы было шмат. З вёскі Перароў прыйшлі Андрэй Чарнушэвіч, Раман Лябедчанка, Іван Масла, Рыгор Літвін, з Хлупінскай Буды — Іосіф Дваракоўскі, кадравы афіцэр Чырвонай Арміі, які застаўся тут з акружэння. Гэтага вопытнага вайскоўца прызначылі начальнікам штаба, я стаў камандзірам аддзялення. Камандзірам першай роты быў прызначаны Іосіф Прыкота, другой — Аляксандр Махнач, медсястрой у атрадзе з'яўлялася яго сястра Міла. Часта служылі побач цэлыя сем'і. З вёскі Кольна аднойчы прыйшлі ў атрад Налівайкі — Мікалай, будучы адважны партызан, яго маці, сястра Оля, а таксама пляменнік Мікалая Алік. Да вайны таксама ў Кольна старшынёй калгаса працаваў Іван Кісялёў. Сям'і актывіста не было жыцця ў вёсцы, і вось усе яны — сын Кісялёва Макс, дачка з дзіцём, маці прыйшлі да нас.

Не здзіўляліся мы, калі ў атрадзе з'яўляліся перабежчыкі. Аднойчы вартавыя прывялі трох чалавек у

«мышыным» нямецкім абмундзіраванні. Гэта былі служачыя медыцынскай службы гітлераўцаў, мабілізаваныя ў варожую армію — татарын Агліул Галіматулін, чуваш Рыгор Кірылаў і рускі Васіль Падаруеў. Яны прыйшлі не з пустымі рукамі — захапілі з сабой кулямёт і дзве вінтоўкі. Перабежчыкі вельмі спатрэбіліся ў атрадзе, усім знайшлася справа.

У ліпені 1943 г. у атрадзе пабываў сакратар падпольнага абкома камсамола А. Д. Рудак. Ён наладжваў камсамольскую работу, цікавіўся справамі і баявым жыццём моладзі. У атрадзе налічвалася звыш 80 камсамольцаў. Я быў прызначаны сакратаром падпольнага Тураўскага райкома камсамола і адначасова намеснікам камісара атрада па камсамолу. Правялі агульны камсамольскі сход пад кіраўніцтвам А. Д. Рудака, выбралі аргбюро камсамольскай арганізацыі. У яго ўвайшлі Іосіф Прыкота, Ілья Аксененка, Міхаіл Дзянісаў, Фёдар Торчык, Міхаіл Якубоўскі, Трафім Швед, Міхаіл Нямшэвіч, Васіль Цык, Кірыл Ваянец, а таксама я.

З ліку камсамольцаў было створана сем баявых дыверсійных груп па 3—5 чалавек. У кожнай з іх знаходзіўся член бюро камсамола. Асаблівую ўвагу вырашана было звярнуць на работу ў вёсках, там таксама заставалася моладзь, галоўным чынам дзяўчаты. У многіх вёсках былі створаны камсамольскія падпольныя арганізацыі. Сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі ў Хлупіне быў Рыгор Касцянка, у Перарове — Міхаіл Швед, у Хваенску — Сяргей Скрыгалоўскі, у Знаменцы — Міхаіл Меляшчэня, у Сямурадцах — Іван Гром, у Вароніна — Галіна Санец, у Хачэні — Надзея Рай, у Рычове — Рыгор Рыдзецкі, у Бярэжцах — Андрэй Горб, у Дварцы — Васіль Жыткавец, у Пагосце — Фёдар Торчык. Члены падпольных камсамольскіх груп распаўсюджвалі лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, збіралі зброю, накіроўвалі ў атрад надзейных людзей, якія імкнуліся змагацца з ворагам. У атрад ішлі не толькі хлопцы, але і дзяўчаты. Выдатна зарэкамендавалі сябе многія камсамолкі — Таццяна Сямёнава, Вольга Каралёва і іншыя.

Партызаны не давалі спакою ворагам ні ўдзень, ні ўначы. Аднойчы фашысты на катэрах накіраваліся з Турава ў Мазыр. Каля Перарова партызаны пад камандаваннем В. І. Прасолава сустрэлі ворага, шчыльным ружэйна-кулямётным агнём накрылі катэры. Рэшткі гітлераўцаў вымушаны былі вярнуцца ў Тураў. Вызначыліся ў гэтым баі Фёдар Андык, Андрэй Чарнушэвіч, Раман Лябёдчанка, Іван Масла, Васіль Пацук.

Побач з намі дзейнічаў 109-ы партызанскі атрад, якім камандаваў Васіль Цык. У гэтым атрадзе базіравалася бюро Жыткавіцкага падпольнага РК ЛКСМБ. Сакратаром яго быў выбраны Мікалай Некрашэвіч.

Хутка з Вялікай зямлі да нас дайшоў загад штаба партызанскага руху аб узнагароджанні партызан, якія найбольш вызначыліся, ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Медаль «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені атрымаў і я разам з іншымі баявымі сябрамі.

Улетку 1943 г. намеснікам камандзіра атрада па разведцы і контрразведцы быў прызначаны М. І. Засінец. Мы разам з ім наладжвалі гэтую важную і адказную работу. Падабраў найбольш смелых адчаянных байцоў, з якімі можна было ісці на самае адказнае заданне,— Рыгора Бабра, Міхаіла Дзянісава і іншых. З дапамогай мясцовых дзяўчат Надзеі Рай з Хачэні, Надзеі Тачылінай з Турава наладзілі сувязь з нямецкім лангвертам Аўгустам Клёўзе. Ён гаварыў: ва ўсіх нас адна кроў, славянская, мы — браты...

У канцы 1943 г. падпольная камсамольская арганізацыя была створана ў Букчы. Яе ўзначаліла Кацярына Шкудун. Пасля вызвалення раёна яна працавала ў Тураўскім РК ЛКСМБ. Сакратаром Тонежскай камсамольскай арганізацыі быў Кавалеўскі, у Сіманавіцкім Млынку падпольшчыкамі кіравала Ульяна Жураўская. З цягам часу зона дзеяння партызанскага атрада пашыралася, восенню 1943 г. народныя мсціўцы зрабілі рэйд у Заходнюю Беларусь. Прапагандысцкае значэнне рэйду было надзвычай вялікае. Але і не абыходзілася без страт. Цёмнай асенняй ноччу група Мікалая Хмяльніцкага накіроўвалася ў вёску Хільчыцы. У ваколіцы вёскі наткнуліся на засаду, у перастрэлцы Мікалай загінуў... Ворагі доўга здзекаваліся з цела нашага баявога таварыша, але потым нам удалося пахаваць партызана з воінскай пашанай непадалёку ад яго роднай вёскі.

Сакратаром камсамольскай арганізацыі ў Хільчыцах быў прызначаны Мікалай Клімовіч. Ён трымаў цесную сувязь з падпольшчыкамі Турава, якіх да гэтага часу ўзначальваў Акім Багай. Разам з падпольшчыкамі партызаны восенню 1943 г. здзейснілі дзёрзкую аперацыю ў Тураве. Удзельнічаў у ёй і атрад з Лельчыцкага раёна. Наступленне на пасёлак вялі з трох бакоў трыма ўдарнымі групамі, нават прымянілі партызанскую артылерыю. 20 кастрычніка вызвалілі амаль увесь пасёлак, немцы і паліцаі ўцякалі да парома праз Прыпяць, але частка ворагаў умацавалася каля школы, выбіць іх адтуль мы не змаглі. Захапілі бургамістра, важныя дакументы, зброю. Пакінулі Тураў пераможцамі, гітлераўцам былі нанесены немалыя страты.

У маі 1943 г. у атрадзе знаходзіўся камандзір Паўднёва-Прыпяцкага партызанскага злучэння А. М. Бялянчык. Нам была пастаўлена задача рыхтавацца да вялікай аперацыі на чыгункі, выйсці ў раён станцыі Старушкі і чакаць сігналу. Да адказнай аперацыі рыхтаваліся асабліва старанна. Увесь атрад быў разбіты на тройкі, у якіх прызначаны старшы групы. Падрыхтаваны сродкі для ўзрыву рэек — дынаміт, толавыя шашкі, бікфордаў шнур. Узрыўчатку закладвалі на месца стыку рэек, разбурэнне было значнае. Асобныя групы прызначаліся для знішчэння сродкаў сувязі і ўмацаваных кропак праціўніка ўздоўж чыгуначнага палатна.

Пр[illegible] всех стран, соединяйтесь!
ТУРОВСКИЙ РАЙОННЫЙ КОМИТЕТ
КОММУНИСТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ (больш.) БЕЛОРУССИИ
№ [illegible] „2" Марта 1944 г.
Удостоверение
Предъявитель сего т. Ермоленко Иван Иванович
[illegible] 1905 г.р.
работает Секретарем Туровского РК КП(б)Б
Полесской области.
действительно по 1-е Июля 1944 г.
Секретарь Туровского РК КП(б)Б (БЕЛЯНСКИЙ)

Пасведчанне І. І. Ярмоленка

Незадоўга да вызвалення раёна ў нашых месцах з'явіліся значныя сілы ворага — перабазіраваліся венгерскія дывізіі, якія ваявалі на баку Гітлера. Мы часта нападалі на дарогах на праціўніка, не давалі яму спакою. Аднойчы разам з Фёдарам Андыкам, Васілём Пацуком і Максімам Голадам каля моста непадалёку ад вёскі Млынок паставілі на дарозе супрацьтанкавую міну. На яе наехала павозка з гарматай, раздаўся выбух.

Вайна набліжалася да пераможнага канца. Не ўсе дачакаліся радаснага дня Перамогі. На яе алтар усклалі сваё маладое жыццё мае баявыя сябры — Трафім Швед, Васіль Пацук, Мікалай Налівайка, Мікалай Хмяльніцкі, Рыгор Літвін і многія іншыя. Мы, хто застаўся жы-

вым, заўсёды помнім іх, яны жывуць у нашых сэрцах... Ваявалі на фронце і ў партызанскіх атрадах і пяцёра маіх братоў і сясцёр. Леанід быў кадравы вайсковец, камандзір танкавага батальёна. Загінуў у Венгрыі ля возера Балатон 25 красавіка 1945 г. У гэтыя ж апошнія дні вайны, 23 красавіка, загінуў і другі брат Рыгор. Усю вайну прайшла медыцынскай сястрой на фронце сястра Ганна. Яна — ганаровы донар СССР, мае шмат баявых узнагарод.

У канцы 1943 г. я разам з іншымі баявымі таварышамі — Панцялеем Тарасюком, сакратаром падпольнага райкома партыі, Фёдарам Торчыкам і Літвінкам па заданню партызанскага камандавання накіраваўся праз лінію фронту для ўстанаўлення сувязі з Чырвонай Арміяй. Ішлі па занятай ворагам тэрыторыі ад адной партызанскай базы да другой, нам давалі праваднікоў. Так прайшлі Лельчыцкі, Ельскі раёны, а ў Хойніцкім былі ўжо нашы. Упершыню за доўгія гады акупацыі дыхнулі свабодай... Тады вызначыўся і састаў Тураўскага райкома партыі, вызваленне тэрыторыі якога было ўжо не за гарамі. Панцеляймон Тарасюк прызначаўся другім сакратаром райкома, Мікалай Засінец — трэцім, а першым сакратаром прыслалі Міхаіла Бяляўскага. Ён працаваў тут і да вайны. Мяне прызначылі сакратаром райкома камсамола.

У ліпені 1944 г. Тураўскі раён быў канчаткова вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пачаліся не менш лёгкія, чым партызанскія будні, але радасныя і натхняльныя клопаты па ўзнаўленню гаспадаркі...

Партызан-інтэрнацыяналіст

Віктару Давідовічу не было і 18 гадоў, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. У 1942 г. ён стаў партызанскім сувязным, збіраў для народных мсціўцаў звесткі аб руху варожых грузаў праз чыгуначную станцыю Жыткавічы. Затым уступіў у партызанскі атрад. Разам з ім у атрадзе ваявалі сябры-камсамольцы з Ляхавіч — А. Малоў, Ф. Цімашчэня, П. Ахрамовіч, А. Мусік, А. Глушчэня, К. Мулюк.

Зімой 1943 г., аб'яднаўшы свае сілы, беларускія і ўкраінскія партызаны паспяхова праводзілі баявыя аперацыі. Віктар Давідовіч стаў актыўным байцом дыверсійнага атрада. У складзе яго прымаў удзел у глыбокім рэйдзе ў тыл ворага па тэрыторыі акупіраваных Беларусі і Украіны. Знішчаючы на сваім шляху варожыя камунікацыі, дыверсійны атрад пайшоў на Валыншчыну. Там, у лясах пад Ковелем, партызаны вясной 1944 г. злучыліся з наступаючымі часцямі Савецкай Арміі. Віктар Давідовіч быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ст. У ліку іншых байцоў яго паслалі вучыцца ў спецыяльную дыверсійную школу, а праз некалькі месяцаў Віктар зрабіў свой першы парашутны дэсант у тыл ворага на тэрыторыю Чэхаславакіі. Група дэсантнікаў папаўнялася на чэхаславацкай зямлі яе сынамі. Была ўстаноўлена сувязь са славацкімі партызанамі. Група расла і хутка была ператворана ў інтэрнацыянальную брыгаду. Віктар Давідовіч быў прызначаны камандзірам узвода. У інтэрнацыянальнай брыгадзе ваявалі прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей: чэхі, славакі, рускія, украінцы, беларусы, палякі, венгры, французы. Пры падтрымцы мясцовых партызан брыгада паспяхова граміла гітлераўскія гарнізоны, вызваляла населеныя пункты. Гітлераўцы кінулі супраць яе вялікія сілы. На дапамогу народным мсціўцам прыйшлі савецкія войскі, якія ў пачатку вясны прарвалі фронт фашыстаў і ўступілі на зямлю Чэхаславакіі. Так у другі раз Віктару

Давідовічу давялося сустракаць Савецкую Армію...

У 1948 г. В. М. Давідовіч вярнуўся на Палессе, у родныя Ляхавічы, уключыўся ў актыўнае мірнае будаўніцтва. Брыгада, якую ўзначальваў Віктар Мікалаевіч, дабівалася самай высокай у калгасе «Зара» ўраджайнасці зерневых і бульбы. За дасягнутыя высокія паказчыкі В. М. Давідовіч двойчы быў удзельнікам ВДНГ СССР. У 1981 г. у дом Давідовічаў прыйшла радасная вестка — урад ЧССР узнагародзіў Віктара Мікалаевіча Зоркай Чэхаславацкага партызана і медалём Паўстання Чэхаславакіі...

А. М. Купрацэвіч

Подзвіг сувязнога

У суседніх вёсках гаспадарылі гітлераўцы, але ў Граду з восені 1943 г. яны наведваліся рэдка. Тут пачыналася партызанская зона. Гэта быў трывожны час. Амаль кожную ноч партызаны з атрада № 113, якім камандаваў Фёдар Ефімовіч, накіроўваліся на заданне. Шлях да чыгункі з лесу, што цягнуўся па паўночным беразе Прыпяці, ляжаў праз Граду. Адсюль — яшчэ сем кіламетраў.

У вёсцы партызанскія дыверсійныя групы сустракаў Васіль Бордзюг. Часта праводзіў іх да чыгункі.

Тры доўгія гады жыў побач з небяспекай партызанскі сувязны. Займаўся звычайнай сялянскай справай, каб пракарміць вялікую сям'ю, а ноччу чакаў прывычнага стуку ў шыбу...

...З дня на дзень чакалі вызваленя, ужо чутна была з-за Прыпяці далёкая кананада гарматных стрэлаў. Партызаны актывізавалі свае баявыя дзеянні. Узляцеў у паветра чыгуначны мост праз Случ, і на некалькі дзён спыніўся рух фашысцкіх эшалонаў.

Усё больш звярэлі ворагі. У маі 1944 г. фашысцкія карнікі спалілі Граду і схапілі партызанскага сувязнога Бордзюга.

У вёсцы Рудня некалькі дзён працягваўся допыт партызанскага сувязнога камуніста Бордзюга. Дзе размешчаны асноўныя сілы партызан? Якія планы атрада? Дзе і калі чакаецца наступная іх аперацыя? Ні на адно з гэтых пытанняў не адказаў патрыёт, нікога не выдаў. Яго не зламалі катаванні і здзекі вылюдкаў. Маўчаў ён і тады, калі ламалі рукі, выкалвалі вочы... Мужнага партызанскага патрыёта закатавалі да смерці.

А праз некалькі дзён, змучаныя доўгімі гадамі нямецкай няволі, жыхары раёна радасна сустракалі Чырвоную Армію.

...У Рудні, у брацкай магіле, разам з закатаванымі патрыётамі Мікалаем Германам і Надзеяй Масла з вёскі Сялко пахаваны адважны партызанскі сувязны В. Е. Бордзюг.

В. Р. Феранц

В. Е. Бордзюг

Незабыўнае гора

У Ганны Маркаўны Ярмоленка свой рахунак вайне — яна забрала двух яе сыноў. Сільвестр загінуў пры абароне Севастопаля, Радзівон — пры фарсіраванні ракі Одэр у Германіі ў 1945 г.

Лёс Ганны Маркаўны складваўся няпроста. Было ў яе жыцці ўсё: і

цяжкасці, і гора, і радасць... У 1918 г. выйшла замуж за Ігната Ярмоленку, які вярнуўся з нямецкага палону і жыў у вёсцы Хлупін. Жылося цяжка, прыгнятала беднасць. З'явіліся дзеці, бацькі мужа неўзабаве аддзялілі маладую сям'ю, выдзеліўшы ёй невялікі кавалак зямлі. А тут — калектывізацыя. Калгас назвалі «Ленінскі шлях» і былі ўпэўнены, што менавіта такім шляхам ідуць да лепшага жыцця...

Не шкадавалі Ганна і Ігнат, што аддалі ў калгас свой небагаты набытак — каня, сельгасінвентар. Працаваць у грамадзе было весялей, цікавей. Ганна Маркаўна была перадавой калгасніцай. Старшыня М. Я. Касцянка не раз дзякаваў руплівай жанчыне за стараннасць у працы. Ігнат Сафронавіч таксама паказваў сябе з лепшага боку. Неўзабаве яму даверылі ўзначаліць паляводчую брыгаду.

Падрасталі, сталелі дзеці. Ганарыліся Ганна і Ігнат старэйшым сынам Сільвестрам. Пасля заканчэння сямігодкі ён паступіў на курсы бухгалтараў і праз год вярнуўся ў родную гаспадарку. Радзівон, Мікалай і Алімпія вучыліся ў школе.

Мірнае жыццё затуліла чорным крылом вайна. Вёска апусцела. Ганна Маркаўна вельмі перажывала за Сільвестра, які служыў у пагранічных войсках.

Пацягнуліся доўгія дні акупацыі, поўныя трывог, роспачы і чакання. Фашысты і паліцаі не раз рабавалі вёску, адбіралі ў людзей жывёлу, маёмасць. Тым большай была радасць вызвалення. Але ў Ганны Маркаўны яна была скрозь слёзы. Не чуваць ніякіх звестак пра Сільвестра. Мікалай трапіў у Германію — яго, як і іншых вяскоўцаў, фашысты схапілі ў лесе і пагналі ў няволю на чужыну. Неўзабаве на фронт пайшоў Радзівон.

Выплакваючы вочы, трох сыноў чакала Ганна Маркаўна. Адгукнуўся толькі Мікалай, паведаміў, што служыць у Чырвонай Арміі.

Сэрца маці сціскалася ад болю, спадзявалася на лепшае. Здаралася, што прыходзілі ў хаты пахавальныя лісты, а потым жывымі вярталіся мужчыны, якіх лічылі загінуўшымі. Але не, цуда не было, і мацярынскае шчасце не ўсміхнулася Ганне Маркаўне. Хто загінуў, сумленна абараняючы Радзіму, не ўстане... У самаадданай працы на калгасных палетках, у хатняй гаспадарцы забывала Ганна Маркаўна гора, знаходзіла суцяшэнне. Лёс адмераў ёй вялікае жыццё — дзевяць дзесяткаў гадоў... Дзеці, Мікалай і Алімпія, дагледзелі маці да глыбокай старасці. А яна ніколі не забывала сваіх загінуўшых сыноў, і хоць даўно былі выплаканы ўсе слёзы, ніколі не адпускаў сэрца боль па іх.

А. А. Ярмоленка

Бацькоўскі наказ

— Ты пяты сын, якога адпраўляю служыць у Чырвоную Армію,— сказаў на развітанне Фядот Цітавіч Панчэня.— Служы сумленна, з гонарам нясі званне чырвонаармейца.

У верасні 1939 г. Максім Панчэня стаў байцом славутай 25-й чапаеўскай дывізіі. Хутка чапаеўцы прынялі першы няроўны бой з фашысцкімі полчышчамі... Да 24 ліпеня трымалі яны абарону на поўдні краіны, прыкрывалі напрамак на Адэсу, да Чорнага мора. Сілы былі няроўныя, рады абаронцаў раставалі. Максім Панчэня аказаўся ў тыле ворага. Быў створаны конны атрад чырвонаармейцаў, вымушаны змагацца з ворагам партызанскім метадам.

У канцы кастрычніка атрад быў разгромлены. Многіх раненых, у тым ліку Максіма, падабралі мясцовыя жыхары ўкраінскай вёскі, вылечылі. Тады баец падаўся праз лінію фрон-

ту да сваіх. Ён не ведаў, што яго бацьку і старэйшага брата Стахея забілі гітлераўцы за тое, што пяць сыноў змагаюцца ў радах Чырвонай Арміі.

Радавы Панчэня ваяваў у 2-м асобным танкавым корпусе. Быў камандзірам машыны сувязі штаба палка. Баявы шлях яго пралёг праз Беларусь, Літву, Заходнюю Прусію да Кёнігсберга. Тры разы быў паранены, дзень Перамогі сустрэў у шпіталі. Туды і дайшла сумная вестка з дому: тры браты — Арцём, Мацвей і Мікалай загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны...

Максім Фядотавіч Панчэня выканаў наказ бацькі, ваяваў сумленна, адважна. Аб гэтым сведчаць яго баявыя ўзнагароды — ордэн Вялікай Айчыннай вайны II ст., два ордэны Чырвонай Зоркі, два медалі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга».

Д. Т. Панчэня

Выстаялі, перамаглі...

Чым успаміналася Надзі дзяцінства? Што запомнілася? Беспрасветная галеча — сямёра дзяцей у Андрэя Меляшчэні, Надзя — восьмая, апошняя, здавалася, павінна быць самай любімай. Ды не да пяшчот было бацьку: сам батрак, сваёй зямлі — кот наплакаў, даводзілася з раніцы да позняга вечара гнуць спіну і на сваім лапіку, і ў мясцовых багацеяў, каб пракарміць сям'ю. На чужых людзей працавала і Надзя, як крыху падрасла.

У чатырнаццаць гадоў Надзя, спакусіўшыся па прыкладу сябровак жыццём у горадзе, вырашыла шукаць свой лёс. З невялікім вузялком і грашыма, сабранымі на білет, маці праводзіла яе на шлях і доўга глядзела ўслед, не заўважаючы слёз, пакуль постаць дзяўчыны не знікла ў далечыні.

Надзя ўладкоўвалася санітаркай у адной з бальніц Мінска. Да работы яна была прывычная з дзяцінства, і праз некаторы час заслужыла павагу ўсіх работнікаў. Ішлі гады, Надзя стала камсамолкай. Пачала хадзіць у вячэрнюю школу. Яна марыла стаць медыцынскай сястрой.

І вось у адну з чэрвеньскіх начэй на Мінск пасыпаліся бомбы... У бальніцы з'явіліся першыя раненыя. Неўзабаве Мінск быў захоплены ворагам. Эвакуіраваць раненых не ўдалося. З імі засталіся многія ўрачы, медперсанал. Засталася і Надзея. Раненых хавалі пад іншымі прозвішчамі, падраблялі гісторыі хвароб і па меры выздараўлення непрыкметна выпісвалі з бальніцы. Дзе яны цяпер, ці жывыя тыя, каго выратоўвала Надзя — Слава і Грыша з Масквы, Андрэй і Ваня з Краснадара, Сяргей Багданаў...

Аднойчы ўрач Стома папярэдзіў патрыётку, што аб яе дзейнасці стала вядома немцам і яны вось-вось могуць прыйсці за ёю. Сапраўды, неўзабаве жандары і з'явіліся, але Надзі ў бальніцы ўжо не знайшлі.

Праз некаторы час Надзя з вялікай цяжкасцю прабралася ў свае родныя мясціны. Усё, што яна бачыла на сваім шляху да дому, тое ж яна ўбачыла і ў сваёй вёсцы: рабаванне насельніцтва, здзекі, расстрэлы...

Камандзір разведкі атрада «За Радзіму» Мікалай Засінец уважліва выслухаў расказ Надзі, яе гарачую просьбу прыняць у партызанскі атрад. «Такая не падвядзе... Людзей у атрадзе хапае, а вось сувязных, разведчыкаў вельмі мала»,— думаў Мікалай Ільіч.

— Давай дамовімся так, Надзежда,— сказаў ён.— Нам патрэбны свае людзі тут, на месцы...

Пасля доўгай размовы Надзя, падумаўшы, згадзілася.

...Аднойчы Клёўзе паведаміў Надзі аб карнай экспедыцыі, якую акупанты рыхтуюць супраць партызан.

Часу заставалася вельмі мала. Была ноч. Трэба было спяшацца. Да ракі Сцвіга Надзя даімчалася на кані і, пакінуўшы яго ля броду, пешшу дабралася да партызанскага лагера. Яна не спазнілася. Яшчэ на досвітку атрад зняўся са сваёй стаянкі і, зрабіўшы марш у некалькі дзесяткаў кіламетраў, апынуўся ў іншым месцы.

Немцы збіліся з ног, шукаючы таго, хто меў сувязь з партызанамі, перадаваў ім пра ўсе намеры фашыстаў. На падазрэнні была і Надзя.

Аднойчы ў хату сястры, дзе жыла Надзя, уварваліся гестапаўцы і паліцаі. Шэсць дзён амаль без перапынку катавалі партызанку. Выкручвалі рукі, заганялі пад пазногці іголкі, білі па галаве... Нічога не сказала Надзя катам. Потым яе, знявечаную, выкінулі на вуліцу, палічыўшы мёртвай. Пахавае хто-небудзь. Людзі падабралі непрытомную разведчыцу, выхадзілі...

На ўсё жыццё засталася Надзея Андрэеўна інвалідам. Пашкоджана вока, знявечаны рукі... Але на ўсё жыццё засталася гордасць — выстаяла, перамагла.

А. А. Губанаў

Не мінуў ні адзін бой...

У 1920 г. Мірон Акунец прыбыў на пабыўку з арміі. Дапамог бацьку і цёткі, бацькавай сястры, прывезці дроў, накасіць сена, але галоўнае — паспеў за гэты кароткі час пазнаёміцца з добрай дзяўчынай, Маланняй з суседняй вёскі Відошын, і ажаніцца... Дэмабілізаваўся праз два гады, а дома ўжо сынок падрастае, Іванка. Колькі радасці ў маладой сям'і, толькі ніхто не ведаў, які лёс чакае іх — тых, хто нарадзіўся ў 20-я гады...

Актыўна ўдзельнічаў Мірон Акунец у стварэнні калгаса «Беларускі камунар» у Ляхавічах. Восенню 1939 г. яго зноў прызвалі ў армію — у вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь. Вярнуўся, пачаў працаваць лесніком. Хутка і вайна грымнула. І зноў Акунец у арміі. Каля Бабруйска ішлі жорсткія баі, паранены, ён трапіў у палон. Колькі іх там загінула, у бабруйскім канцлагеры, гэтага ўжо ніхто ніколі не ўстановіць... Замучылі фашысцкія вылюдкі ў тым лагеры і землякоў Мірона, з якімі разам ваяваў і трапіў у палон — Андрэя Савасценю, Васіля Акунца, Даніла Юхневіча, а самому яму пашанцавала, змог збегчы і напалову жывым дабрацца дамоў...

Доўга адыходзіў ад лагерных пакут Мірон Васільевіч, і калі крыху стаў на ногі, знайшоў дарогу да партызан, дапамагаў ім і звесткамі аб ворагу, і прадуктамі. Набліжаўся час вызвалення раёна ад фашысцкай навалы. З ліпеня 1944 г. Мірон Акунец — на вайне. У складзе І Беларускага фронта дайшоў да Варшавы. Тут 14 студзеня 1945 г. напаткала яго варожая куля, цяжка паранены, стары салдат ужо не мог трымаць зброю. Вайна для яго закончылася... Вярнуўся сын Іван — скалечаны, страціўшы здароўе, хутка і памёр у бацькоўскай хаце. Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў і другі сын, радавы Аляксей Акунец. Дажываць век за сыноў давялося самому Мірону Васільевічу, і выдаўся ён доўгі, напружаны, плённы...

А. М. Купрацэвіч

У працы і ў барацьбе

У час паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 г. мяне прызвалі на вайсковую службу. Паўсюдна былі мітынгі, простыя людзі радасна сустракалі чырвонаармейцаў. Але не ўсім да спадобы быў наш прыход. 26 верасня мяне паранілі

ў час нязначнай сутычкі з польскімі экстрэмістамі. Пяць месяцаў ляжаў у шпіталі, нага так і засталася пашкоджанай. Да вайсковай службы я быў прызнаны не годным.

Вярнуўся на радзіму. Зноў мірная работа на будаўнічых рыштаваннях. Нядоўга яна працягвалася — грымнула вайна. Кожны сумленны савецкі чалавек знаходзіў у барацьбе з ворагам сваё месца. Калі ў 1942 г. у нашым краі ўпершыню з'явіліся атрады С. А. Каўпака, у размове з партызанамі я даведаўся, што ім патрабуюцца людзі, знаёмыя з сапёрнай справай. Я адразу згадзіўся ўступіць у рады народных мсціўцаў. Так стаў старшым мінёрам 4-га батальёна ў атрадзе Краляўца.

Дзейнічалі мы тады на тэрыторыі Украіны. Першая баявая аперацыя — узрыў моста на шашы паміж Кіевам і Іванкавам, непадалёку ад Чарнобыля. Шмат аперацый ажыццявілі на чыгунцы. Даходзілі з рэйдамі да Карпат. Вярнуліся зноў у Беларусь. Тут я даведаўся, што і мая жонка падалася ў партызаны — цяпер яна повар у адным з атрадаў 150-й Капаткевіцкай брыгады імя Языковіча. Неяк разгаварыліся з камандзірам атрада, і ён сказаў:

— Калі ёсць жаданне, можаш перайсці да беларускіх партызан. Няма розніцы — дзе біць ворагаў. А там, магчыма, ты прынясеш больш карысці...

Мяне прызначылі камандзірам роты Палескага партызанскага злучэння, якім камандаваў Ветраў. Хутка падраздзяленне сталі ставіць у прыклад іншым па стану дысцыпліны, актыўнасці, колькасці і выніках баявых аперацый. Дзейнічалі мы на тэрыторыі Гомельскай, Палескай, Брэсцкай абласцей.

Восенню 1943 г. трэба было перайсці чыгунку Пінск — Брэст. Немцы даведаліся пра наш паход і падрыхтаваліся да сустрэчы. Дарогу ўмацавалі, дзень і ноч адзін за другім па насыпу хадзілі патрулі. Я з трыма байцамі накіраваўся на разведку. Доўга назіралі за чыгункай. Заўважылі, што найбольш пільна немцы ахоўваюць участкі дарогі праз лес, хмызняк. Тады вырашылі прабівацца ў полі, дзе нас менш чакаюць, і пад шум цягніка рыўком праскочыць чыгунку. Так і зрабілі, без ніводнага стрэлу прыбылі да месца. Адсюль мы зрабілі некалькі аперацый на чыгунцы. Напалі на ахову, разбілі бліндаж, потым заклалі некалькі толавых шашак і на значнай адлегласці знішчылі рэйкі. Рух быў спынены больш як на суткі.

Пра ўдалы паход далажылі камандзіру партызанскага злучэння Сікорскаму. Ён выклікаў мяне, распытаў пра абставіны аперацыі, падзякаваў і сказаў, што прадставіць мяне да ўзнагароды. Вясной 1943 г. мне ўручылі ордэн Вялікай Айчыннай вайны I ступені, а яшчэ праз некаторы час — ордэн Чырвонай Зоркі. За паспяховае выкананне баявых аперацый быў узнагароджаны таксама медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені.

Заканчвалася вызваленне Беларусі. Спецыялістаў, кіраўнікоў-гаспадарнікаў дэмабілізоўвалі. Я папрасіў, каб мяне накіравалі на работу ў родныя мясціны. Прызначылі начальнікам дарожнага аддзела аблвыканкома Палескай вобласці. Потым мяне перавялі на работу ў Калінкавічы. Там выклікаў камандуючы фронтам К. К. Ракасоўскі і сказаў:

— Хутка мы пойдзем далей на захад. У Жыткавічах да вайны быў ваенны гарадок. Накіроўвайцеся туды, арганізуйце работу па ўзнаўленню і рамонту гарадка, каб пасля вайны было дзе размясціць вайсковую часць.

Войскі набліжаліся да Жыткавіч. Ужо вызвалены Петрыкаў. Вось мы ўжо ў Чарацянцы. Ноччу я падыйшоў з боку вёскі да ваеннага гарад-

ка — тут я ведаў усе дарогі. Абыйшоў памяшканні, зазірнуў у былую сталовую. Усё разбурана, загаджана, многія будынкі замініраваны. Знайшоў тут 10 авіябомб, якія няцяжка было прымусіць узарвацца і ўсё знішчыць навокал. Трэба было тэрмінова прыступіць да размініравання. Спецыялістаў не было, пасля вызвалення Жыткавіч войскі рушылі далей на захад. Трэба было дзейнічаць самому. Паставіў вартаўніка, каб ніхто з пабочных не зайшоў на тэрыторыю гарадка. Узяў малаток, стамеску, і з пяці гадзін раніцы да позняга вечара абясшкодзіў 184 міны. На наступны дзень у раённым аддзеле міліцыі, які толькі што адкрыўся, мне далі людзей, агульнымі намаганнямі абясшкодзілі і авіябомбы, тады мы здабылі і з вялікай перасцярогай прывезлі ў міліцыю амаль паўтары тоны толу.

...У 1959 г. міністр абароны СССР аб'явіў у Савецкай Арміі конкурс на лепшы ваенны гарадок. Надзвычай стараліся воіны-ракетчыкі, і ў выніку наш гарадок быў прызнаны лепшым у Беларускай ваеннай акрузе.

М. І. Савіч

ИЗ ОТЧЕТА КОМАНДОВАНИЯ 50-Й ЖИТКОВИЧСКОЙ ПАРТИЗАНСКОЙ БРИГАДЫ ПОЛЕССКОЙ ОБЛ. ШТАБУ ПОЛЕССКОГО ПАРТИЗАНСКОГО СОЕДИНЕНИЯ О БОЕВОЙ И МАССОВО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ РАБОТЕ ЗА ПЕРИОД С 1 ЯНВАРЯ ПО 1 МАЯ 1944 г.

Не ранее 1 мая 1944 г.*

Партизанский отряд «1 Мая»

Боевая работа отряда

Диверсионными группами отряда пущено под откос 10 воинских эшелонов противника. При крушении повреждено паровозов — 10, вагонов с живой силой — 10, вагонов с боеприпасами — 16, вагонов с продовольствием — 11, платформ с техникой — 22, цистерн с горючим — 8. Один эшелон с живой силой, техникой и горючим, шедший с запада на восток, сгорел полностью...

На минах подорвана 1 мотодрезина. Сорвано ж.-д. рельсов 136 шт., снято полевого кабеля 1 тыс. м, снято двухлинейного кабеля 55 м, порвано телефонной связи 2740 м, сорвана катушка усилителя. Подорвано на пехотных минах 33, ранено 9 немецких солдат и офицеров. Пущена под откос 1 немецкая автомашина, на минах разбито 4 повозки, из засад убито 7 немецких солдат.

Партийно-политическая работа

С личным составом проведено 10 собраний по разным вопросам боевой деятельности... В населенных пунктах, обслуживаемых отрядом, проведено 27 собраний по вопросам текущей политики, проработке газетных материалов, читке сводок и [по] сельскохозяйственным вопросам.

Партизанский отряд 105-й

Боевая работа отряда

За истекшие месяцы, с 1 января по 1 мая 1944 г., отрядом сделано следующее: пущено под откос 10 вражеских воинских эшелонов с живой силой и техникой. В результате крушения выведено [из строя] 10 паровозов, обстреляно 2 вражеских эшелона, один из них — при совместном действии с группой [партизан] 225-й бригады. В результате обстрела 2 паровоза выведены из строя. Подорвана 1 автодрезина. На минах и путем обстрела уничтожено 47 автомашин. Обстреляна 1 вражеская воинская повозка. Подорвано 190 м ж.-д. полотна, поймано 2 немецких «языка».

* Датируется по времени окончания отчетного периода.

Партийно-политическая работа

За истекший период проведено с личным составом отряда 8 собраний по вопросам боевой деятельности, положению на фронтах, прорабатывались приказы тов. Сталина, постановления и обращения партии и правительства. С населением района проводились беседы по сохранению населения от угона в немецкое рабство, проводились доклады и беседы о текущей политике и международном положении, сообщались сводки Совинформбюро, а в немецкие гарнизоны забрасывались газеты, брошюры, листовки и сводки Совинформбюро...

Партизанский отряд 113-й

Боевая работа отряда

За истекшие 4 месяца, с 1 января по 1 мая 1944 г., сделано следующее: диверсионными группами отряда пущено под откс 11 вражеских воинских эшелонов с живой силой и техникой. При крушении повреждено 11 паровозов, 16 вагонов с живой силой и техникой, при этом убито 4 и ранено 17 немецких солдат и офицеров. На минах подорвано 5 автомашин, при этом убито 7, ранено 2 немецких солдата и офицера.

Группами отряда сделано 10 засад, в результате чего уничтожено автомашин — 9, тягачей — 1, плавающих автомашин — 1, повозок — 7, при этом убито — 60, ранено — 1 гитлеровских солдат и офицеров, взято в плен — 5. В этих боях отряд добыл: винтовок — 19, пулеметов — 3, автоматов — 1, пистолетов — 1. На р. Припять из засады уничтожен немецкий буксир, при обстреле убито 8 и ранено 2 немца. Уничтожена 1 тыс. м полевой связи противника...

Командир 50-й бригады *Гущеня*
Комиссар *Толкачев*
Нач. штаба *Осокин*

Всенародное партизанское движение... Т. 3, с. 299—300.

РАСПОРЯЖЕНИЕ КОМАНДИРА ПИНСКОГО ПАРТИЗАНСКОГО СОЕДИНЕНИЯ В. З. КОРЖА КОМАНДОВАНИЮ БРИГАДЫ им. С. М. БУДЕННОГО ОБ ОХРАНЕ ВЕСЕННЕГО СЕВА В НАСЕЛЕННЫХ ПУНКТАХ ЛЕНИНСКОГО РАЙОНА ПИНСКОЙ ОБЛ.

17 апреля 1944 г.

Обеспечьте охраной весенний сев граждан дер. Малые [Стеблевичи], Большие Стеблевичи, Ельно, Ленин и др. Делайте засады и усильте разведку.

Командир Пинского партизанского соединения
генерал-майор *Комаров*

Всенародное партизанское движение... Т. 3, с. 241.

ИЗ СПРАВКИ ОПЕРАТИВНОГО ОТДЕЛА БШПД «ПАРТИЗАНСКОЕ ДВИЖЕНИЕ В БЕЛОРУССИИ В 1944 г. И ОБЩИЕ ИТОГИ БОРЬБЫ С НЕМЕЦКИМИ ЗАХВАТЧИКАМИ ЗА ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ»

Не ранее 5 июля 1944 г.

...Партизанские бригады Гущени и Павловского, взаимодействуя с частями 61-й армии, оказали помощь в овладении районными центрами Копаткевичи и Житковичи. Пинское соединение партизанских отрядов захватило и удерживало грунтовую дорогу на участке Житковичи-Ленин-Старобин, заняло переправы по р. Случь, в районе южнее Старобина и Грабова.

Нач. оперативного отдела БШПД
полковник *Брюханов*

Всенародное партизанское движение... Т. 3, с. 510.

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

З ДЗЁННІКА НАЧАЛЬНІКА ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ імя С. М. БУДЗЁННАГА ПІНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ В. Я. СТАЮХІНА

17.5.44 г.

Заставы атрадаў імя Панамарэнкі і імя Катоўскага знаходзяцца ў Сцяблевічах. У 20 гадзін далажылі даныя разведкі атрада імя Панамарэнкі: «Праціўнік на раніцу 18 мая рыхтуе размініраванне дарогі Мікашэвічы — Ленін шляхам баранавання. З Жыткавіцкага раёна ў Мікашэвічы прыбыло каля 700 немцаў і ўласаўцаў, якія рыхтуюцца да наступлення на партызан Ленінскага раёна. Павялічваюцца гарнізоны ў Старобінскім і Слуцкім раёнах. На ўзбраенні немцаў ёсць танкі і артылерыя. Відаць па ўсяму, праціўнік рыхтуе наступленне на сілы злучэння...».

20 ч. 30 мін.

Партызанскаму атраду імя Панамарэнкі выслаць адну роту па дарозе Мікашэвічы — Сцяблевічы ў раён 5-ці кіламетраў ад Мікашэвіч з задачай перашкодзіць размініраванню.

Партызанскаму атраду імя Катоўскага выслаць узвод у раён новага цагельнага завода, не дапусціць размініравання «конкі».

Падраздзяленням быць на ўказаных месцах у 2.00 18.5.44 г., весці баявую разведку. У выпадку паяўлення праціўніка ўступіць у бой да падходу асноўных сіл.

18.5.44 г. У 3.00 праціўнік сілаю да 1000 чалавек, з артылерыяй, танкамі і конніцай выступіў з Мікашэвіч на Леніна. Ворагі ішлі па ўзбочыне, па праезджай частцы дарогі былі пушчаны бароны на коннай цязе.

У 8.00 група разведчыкаў атрада Панамарэнкі сустрэла баявую ахову немцаў у раёне Тарасава хутара (2 км на паўднёвы захад ад Ельна). На паўднёвым баку канавы заўважаны танкі. Разведчыкі абстралялі немцаў у 10.00 каля 1 км ад Ельна.

У 11.00 рота пад камандаваннем Якава Рагожына каля Ельна завязала бой з праціўнікам, які ахоўваў узнаўляемыя масты, разбураныя напярэдадні партызанамі.

У 15.00 немцы адышлі ад Ельна да Тарасава хутара, абстраляўшы Ельна з гармат.

Да вечара праціўнік знаходзіўся на перакрыжаванні дарог Мікашэвічы — Ельна і Ленін — Ельна. На міне, якая засталася некранутай пры баранаванні, узарвалася група салдат. Танкі далей паўднёвага берага канавы не пайшлі. Масты на восьмым і дзевятым кіламетрах былі ўзноўлены, ноччу працягвалася будаўніцтва моста на адзінаццатым кіламетры. Вораг спыніўся на начлег пры дарозе. Партызаны тры разы абстралялі лагер праціўніка. У 9.00 узвод Мікалая Барадачова абстраляў праціўніка ў Леніне з засады на могілках.

19.5.44 г. Асноўныя сілы немцаў рушылі па дарозе Мікашэвічы — Ленін. Значная частка праціўніка засталася ахоўваць дарогу шляхам пастоў і патрулявання.

20.5.44 г. Асноўны загад штаба злучэння: «Камандзіру брыгады імя Будзённага т. Шырыну. Заняць абарону па дарозе Бераснякі — Цімашэвічы. Кантраляваць і прачосваць лес з тым, каб не дапусціць пранікнення праціўніка ў нашу зону. Замініраваць участкі дарогі Ленін — Старобін».

21.5.44 г. Штаб брыгады знаходзіўся непадалёку ад Залюціч. Праціўнік спыніўся ў вёсцы Морач. Стала вядома, што на нашых мінах узарваліся дзве варожыя машыны, якія патруліравалі дарогу Мікашэвічы — Ленін.

22.5.44 г. Рота атрада імя Катоўскага абстраляла групу немцаў пры вяртанні іх у Ленін. Фашысцкія самалёты скідаюць парашуты з боепрыпасамі і прадуктамі каля Залюціч. Відаць, праціўнік не разлічваў на працяглыя баі, і дарога назад у гарнізон яшчэ больш небяспечная...

24.5.44 г. Разведка ўстанавіла, што асноўныя сілы праціўніка пачалі рухацца назад у гарнізон. Сіламі рэзерва брыгады (каля 100 чалавек) устроілі засаду на поўдзень ад Замоціч. У баі было забіта звыш 10 немцаў і ўласаўцаў. На міне ўзарвалася адна гармата. Астатнія тры гарматы ворагі развярнулі і адкрылі агонь па партызанах. Адступілі ў лес. Паранены два чалавекі.

Стала вядома, што на дарозе Іёвічы — Мілевічы ўзарвалася восем партызанскіх мін, ворагу нанесены значны ўрон.

25.5.44 г. Рота Грыгарэнкі з партызанскага атрада імя Катоўскага ўступіла ў бой на поўнач ад Леніна. Гэта быў апошні бой. Праціўнік усімі сіламі адступіў у Мікашэвічы. Асноўная яго мэта — злучыцца са сваёй групіроўкай у Старобінскім раёне — дасягнута не была. Яшчэ некалькі разоў узрываліся міны. Усяго, па нашых падліках, з 18 па 25 мая вораг страціў 75 чалавек забітымі, каля 50 параненымі. Узарваліся на мінах дзве аўтамашыны і адна гармата. Гэта была апошняя карная экспедыцыя гітлераўцаў. Партызаны захапілі трафеі — 20 вінтовак і аўтаматаў, 7 павозак. Нашы страты — 4 чалавекі загінула, 7 — паранена.

...1.7.44 г. у 13.00 узвод Барадачова з атрада імя Катоўскага ўступіў у бой з галоўным атрадам ворага, які рухаўся з Мікашэвіч. У кароткім баі забіта 7 і паранена 9 варожых салдат.

2.7.44 г. Раніцай група адступаючых немцаў выйшла да Случы каля вёскі Ананчыцы, другая група з Мікашэвіч дасягнула Залюціч. Некалькі варожых салдат падарвалася на міне. Апоўдні немцы адцяснілі ад Случы ўзвод атрада імя Варашылава, які ахоўваў пераправу і пачалі перапраўляцца на правы бераг. Асобныя групы ворага спрабавалі прайсці углуб раёна, але іх сустракалі агнём партызанскія заставы.

У баі за пераправу з 10 да 14 гадзін выведзена са строю 60 варожых салдат і афіцэраў, падбіта 8 машын.

Атрады брыгады займаюць наступныя рубяжы: імя Варашылава — Яскавічы, Морач, Беразнякі, імя Катоўскага — на паўночны захад ад Залюціч, Іёвічы, Палосцевічы; імя Панамарэнкі — Сцяблевічы, Ельна. Працягласць рубяжа — каля 30 кіламетраў.

З засады абстраляна нямецкая разведка ў кіламетры ад Леніна, якая накіроўвалася ў в. Палосцевічы. Група мінёраў пад камандай Гуляева падарвала нямецкі танк.

Для мініравання дарог арганізавана пяць груп (старшыя груп Ісхакаў, Лукашоў, Патронаў, Міроненка). На дарозе Грабаў — Мілевічы ўзарвалася 56 мін. Узята ў палон 15 немцаў. Трафеі: станкавы кулямёт, ротны мінамёт, тры ручныя кулямёты, боепрыпасы...

(Матэрыялы Ленінскага народнага музея)

ЗВЕСТКІ АБ АХВЯРАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗЛАЧЫНСТВАЎ ПА ЖЫТКАВІЦКАМУ РАЁНУ ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Назва сельсавета	Забіта мірных жыхароў			Угнана ў рабства	Назва сельсавета	Забіта мірных жыхароў			Угнана ў рабства
	усяго	жанчын	дзяцей			усяго	жанчын	дзяцей	
1) Жыткавіцкі гар. пас. савет	150	83	40	139	6) Бялёўскі с/савет	38	12	7	73
2) Юркевіцкі с/савет	113	66	48	—	7) Дзякавіцкі с/савет	702			17
3) Людзяневіцкі с/савет	60	11	2	42	8) Ляхавіцкі с/савет	117			133
4) Рудненскі с/савет	56	32	15	53	9) Браніслаўскі с/савет	25	17	2	90
5) Жыткавіцкі с/савет	29	11	2	23	10) Вятчынскі с/савет	81	38	20	27

З АКТА ПА ЎСТАНАЎЛЕННЮ І РАССЛЕДАВАННЮ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА

...У ліпені 1941 г. нямецкія вылюдкі зайшлі на кватэру Яфіма Бажана ў Жыткавічах па вуліцы Пралетарскай, 49, схапілі яго, вывелі на вуліцу і пачалі збіваць гумавай плёткай і прыкладамі, потым выстралілі ў галаву з нагана. Жонка Бажана, Марыя Міхайлаўна, упала на труп і пачала плакаць, тады фашысты пачалі па-зверску збіваць яе разам з дзіцём.

Адразу пасля акупацыі раёна фашысты пачалі планамерна знішчаць яўрэйскае насельніцтва. Звыш 10 чалавек расстралялі ў Жыткавічах у жніўні 1941 г. Праз некалькі месяцаў 12 чалавек забілі ў Пралетарскім завулку. Расстралялі спачатку дарослых, дзеці з крыкам пачалі разбягацца, ім стралялі ўслед, пакуль усіх не забілі. На наступны дзень расстралялі яшчэ 37 яўрэяў.

У снежні 1941 г. захопнікі сагналі 70 чалавек яўрэяў — дзяцей, старых і жанчын — да загадзя выкапанай ямы і ўсіх расстралялі. У гарадскім пасёлку немцы ўзялі на ўлік тых, хто меў спецыяльнасць — шаўцоў і прымусілі іх шыць вопратку і абутак, а калі яны выканалі работу, усіх расстралялі, папярэдне распрануўшы і разуўшы. Хеве Габерман з 5-гадовым дзіцём удалося ўцячы з месца расстрэлу. На наступны дзень яе схапілі і пасля нечуваных здзекаў забілі яе, а потым дзіця...

У лютым 1942 г. фашысты схапілі грамадзянку Гарбуз за тое, што яе муж быў у партызанах. Яна спрабавала ўцячы, яе злавілі і павялі на расстрэл. Па дарозе Гарбуз увесь час збі-

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

валі, і калі яна заявіла, што савецкая ўлада была, ёсць і будзе, яе тут жа расстралялі з аўтамата. У час чарговай акцыі ў гэты месяц расстралялі 50 мірных жыхароў. Грудных дзяцей падкідалі ўгару і стралялі на ляту... У Юркевіцкім сельскім савеце нямецка-фашысцкія захопнікі і іх памагатыя зачынілі ў хляву сялян Рыгора Барысавіча Мычко, Уладзіміра Адамавіча Малочка, Адама Слацвінскага, Сідара Касака, Еву Данілаўну Шчур, Сцяпана Гарбуза, Навума Лаўніковіча і падпалілі, усе згарэлі жывымі...

У Бялёўскім сельскім савеце 23 чэрвеня 1942 г. ворагі схапілі чатырох мужчын і жанчыну, якіх падазравалі ў сувязі з партызанамі, па-зверску мучылі і здзекваліся з іх на працягу амаль чатырох дзён — збівалі, выкалалі вочы. Паўжывых іх выкінулі на вуліцу, дзе яны памёрлі. 4 жніўня 11 чалавек завялі ў хату Савы Козіча ў Бялёве і расстралялі з аўтаматаў. У хаце было двое дзяцей, яе падпалілі і дзеці згарэлі жывымі разам з забітымі.

У жніўні 1942 г. фашысцкія каты вялі па вуліцы Энгельса жыхароў Жыткавіч Фаму Міхайлавіча Сергавіцкага і Барыса Міхайлавіча Ярашэвіча. Усю дарогу іх жорстка збівалі, а потым расстралялі...

Вера Іванаўна Саўчыц збіралася замуж. У дзень вяселля ў хату ўварваліся немцы і паліцаі. Яны забралі прадукты і гарэлку. Веру Саўчыц, яе бацькоў і многіх гасцей забілі.

У 1942—1944 гг. па вуліцы Першамайскай у Жыткавічах быў размешчаны лагер для савецкіх ваеннапалонных. Лагер — два вялікія хлявы амаль без даху, абнесеныя калючым дротам. Становішча іх было надзвычай цяжкім. Зімой многія з іх знаходзіліся пад адкрытым небам на марозе, вопратку і абутак фашысты і іх памагатыя забіралі. Кармілі вотрубамі раз у дзень, хлеба ніколі не давалі... Штодзень не менш чым 10 чалавек гінула ад холаду, хвароб, голаду, расстрэлаў і пабояў. Памёршых і загінуўшых доўга не хавалі. Перадаваць ежу небаракам было катэгарычна забаронена. Нягледзячы на забарону, жыхары гарадскога пасёлка ўсякімі спосабамі стараліся дапамагчы ваеннапалонным...

Старшыня Жыткавіцкай раённай надзвычайнай камісіі *Талкачоў*
Упаўнаважаны Жыткавіцкай раённай надзвычайнай камісіі *Шустэрман*
Старшыня Жыткавіцкага райвыканкома *Гушчэня*
Адказны сакратар Жыткавіцкай раённай надзвычайнай камісіі *Некрашэвіч*

* * *

...У жніўні 1942 г. у в. Яміца заехаў начальнік Жыткавіцкай паліцыі Кацубінскі. Зайшоў у хату Афанасія Міхайлавіча Жогаля. Невядома, што там адбывалася, але неўзабаве пачуліся стрэлы. Кацубінскі выйшаў з хаты і падпаліў яе. Афанасій Міхайлавіч Жогаль і яго жонка Агаф'я Іванаўна загінулі. Па дарозе назад Кацубінскі ў Бялёве забіў Васіля Іванавіча Страху... 4 жніўня 1942 г. вылюдкі з Жыткавіцкай жандармерыі сагналі звыш 100 чалавек на могілкі ў Бялёве. 11 найбольш моцных мужчын вывелі з натоўпу і павялі па дарозе на Брынёў. Ва ўрочышчы Царкоўнае Поле па іх адкрылі агонь з кулямёта. 10 чалавек было забіта, цудам застаўся жывым Сцяпан Ачапоўскі. У гэты ж дзень у сваёй хаце вылюдкі забілі сям'ю Козела. Саву Аляксеевіча і Марту Рыгораўну расстралялі, хату падпалілі і ў полымі жывымі згарэлі іх дзеці — Валодзя трох гадоў і Аня — 1 год. У двары сваёй хаты фашысты забілі Рыгора Кузьміча Купрацэвіча.

Людзі хаваліся ад ворагаў у лесе. Усіх, каго знаходзілі, расстрэльвалі. У лютым 1943 г. забілі 5 мірных жыхароў з Бялёва. У чэрвені расстралялі сямігадовых дзяўчынак Олю і Ніну Баран. У лесе загінулі таксама мірныя жыхары Вольга Іванаўна Козел, Конан Дзмітрыевіч Жогаль.

Старшыня камісіі па расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопніках па Бялёўскаму сельсавету *П. С. Ачапоўскі*
Члены камісіі: *Папроцкая, Савасценя, Савіч, Агіевіч, Сакула*

* * *

У сакавіку 1943 г. немцы і паліцаі ўварваліся ў Ляхавічы. Пачаліся масавыя расправы над мірнымі жыхарамі, безабароннымі дзецьмі, жанчынамі, старымі. На адной з вуліц вёскі жыла бабуля Акуліна Чышчэня, якой было 94 гады. У той дзень мароз быў каля 30°. Старую распранулі і разулі, выгналі на мароз. З ёй быў 6-гадовы Саша Савасценя. Доўга здзекаваліся

вылюдкі з старой і хлопчыка — трымалі на марозе, білі, потым загналі ў хлеў і спалілі жывымі. Потым падпалілі вёску, у агні згарэла 47 чалавек. Валодзя Акунец, якому было 7 гадоў, некалькі разоў выскокваў з агню, але яго кідалі назад. 6 чалавек расстралялі... У Пухавічах карнікі ўчынілі расправу над яўрэямі. 13 чалавек прымусілі распрануцца на марозе, выкапаць яму, потым паставілі на краю ямы, фатаграфавалі, а праз некаторы час адкрылі агонь з кулямёта. Жывых дабівалі штыкамі і прыкладамі.

У той жа дзень загінула 13 яўрэяў. Асабліва здзекаваліся вылюдкі над 7-гадовым Меерам Меднікам...

Старшыня камісіі па расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкімі захопнікамі па Ляхавіцкаму сельсавету *М. В. Мусік*
Члены камісіі: *Купрацэвіч, Івінская*

* * *

...Цяжка пералічыць шкоду і ўсе страты, якія нанеслі нямецка-фашысцкія акупанты гаспадарцы Юркевіцкага сельсавета. Грамадскія будынкі, маёмасць, жывёла, цэлыя вёскі — усё знішчана. У Юркевічах разбурана і спалена 130 сялянскіх гаспадарак, у Гулевічах — 46, у Мілевічах — 63, у Нова-Леніне — 35, у Сукачах — 56, у Баравой — 40, у вёсцы Белая — 16, усяго 442 гаспадаркі. Рыбгас «Белае», Юркевіцкі леспрамгас і лясгас, пошта, бальніца, клубы, школы, помнік У. І. Леніну... Асаблівы боль ад непапраўных страт загінуўшых мірных жыхароў. Мы налічваем 113 чалавек, якіх расстралялі, замучылі, спалілі фашысцкія вылюдкі, але, магчыма, спіс гэты яшчэ не поўны... Яшчэ не вярнуліся тыя, хто быў угнаны ў нямецкую няволю, і невядома, ці вярнуцца яны. Кожны дзень прыносіць новыя гаротныя звесткі...

Ц. І. Базун, старшыня калгаса «Чырвоная ніва», в. Мілевічы.
10 студзеня 1945 г.

* * *

У студзені 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі арыштавалі 10 чалавек яўрэяў у Кажановічах. Іх вывелі на край вёскі, прымусілі распрануцца, выкапаць у мёрзлай зямлі яму. Спачатку забілі на вачах бацькоў дзяцей, паскідалі мёртвыя цельцы ў яму, потым расстралялі дарослых...

У красавіку быў арыштаваны за сувязь з партызанамі былы супрацоўнік міліцыі Мікалай Якаўлевіч Чарнагалоў. Яго кінулі ў турму ў Жыткавічах, некалькі дзён не давалі есці, потым выклікалі на допыт. Доўга здзекаваліся, білі. Чарнагалоў нічога не сказаў фашыстам. Яго вывелі на расстрэл. Следам бегла жонка Чарнагалова Марыя, яе гналі прэч, білі прыкладамі, а калі падала, забівалі нагамі. На вачах Марыі немцы расстралялі Мікалая Якаўлевіча Чарнагалова з вінтовак. Марыя пасля гэтага пайшла ў партызанскі атрад, каб помсціць за мужа...

У лістападзе 1942 г. падпольшчык Мікалай Паўлавіч Корж, які па заданню разведгрупы Лінькова (Баці) працаваў у нямецкай жандармерыі ў Жыткавічах, вымушаны быў пад пагрозай арышту пайсці ў партызанскі атрад. Фашысты, каб адпомсціць, схапілі ўсю яго сям'ю — бацьку і маці, сясцёр Веру і Лізу. Усю маёмасць разрабавалі. Па дарозе ў Жыткавічы жорстка здзекаваліся з арыштаваных. Праз некаторы час іх вывелі на расстрэл. Рукі былі звязаны ззаду, дзяўчат і іх бацькоў увесь час білі... На месцы расстрэлу прымусілі распрануцца, расстралялі з вінтовак...

У 1944 г. фашысты абкружылі вёску Ацкаванае. Ім удалося схапіць партызана Уладзіміра Адамавіча Шакаляна. Яго доўга дапытвалі, дзе знаходзіцца партызанскі атрад. Партызан маўчаў. Ворагі доўга здзекаваліся з яго, адрэзалі вушы, нос, праткнулі шомпалам шчокі, потым жывым закапалі ў зямлю. Вёску Ацкаванае, жыхары якой аказвалі дапамогу партызанам, спалілі датла... У красавіку 1944 г. карнікі ўварваліся ў вёску Надубава. Маладых хлопцаў і дзяўчат, усяго 23 чалавекі, адабралі для адпраўкі на работу ў Германію, астатніх адпусцілі, вёску спалілі*...

Старшыня камісіі Жыткавіцкага сельсавета *Жук*
Члены камісіі *Зубко, Ханеня, Ярмош, Матох, Юнчыц*

* Вёска Надубава, як і Хатынь, не ўзнавілася, цяпер нават цяжка знайсці тое месца, дзе стаялі паўстагоддзя назад яе хаты...

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

* * *

...У жніўні 1943 г. паліцаі ўчынілі аблаву на мірных жыхароў Браніслава. Схапілі 14 чалавек. Сярод іх быў паважаны вясковец, член ВКП(б) Мікалай Іванавіч Кананучанка. Над ім вылюдкі здзекаваліся асабліва жорстка. Ён быў ужо амаль не жывы, калі арыштаваных на падводах і пешшу накіравалі ў Жыткавічы. Там М. І. Кананучанка расстралялі... 10 чалавек з навакольных вёсак вывезлі ў Жыткавічы і забілі ў чэрвені 1944 г. 9-гадовага Славу Дабравольскага забілі разам з бабуляй Хрысцінай Латоцінай. Хлопчык ўхаваўся ад накіраваных аўтаматаў за старую: «Ой, бабуля, я баюся», і прагрымелі чэргі... Марыя Паўлаўна Грыва, 20-гадовая дзяўчына з Капліцы, хавалася ў лесе ў будане. Ворагі наткнуліся на яго і падпалілі, будан згарэў разам з Марыяй.

Выпадкова трапіў у засаду ў лесе Захар Яфімавіч Танчынскі, яго тут жа расстралялі.

18 сакавіка 1944 г. фашысты схапілі ў Свірыішчах Марыю Зіноўеўну Дабравольскую і Марыю Адамаўну Астроўскую. Завезлі іх у Надубава-Чарацянку, хацелі згвалціць. Дзяўчаты не даліся: «Лепш памерці». Вылюдкі забілі 18-гадовых дзяўчат, абоіх Марый, і жыхары Надубава-Чарацянкі пахавалі іх у адной магіле, як сяцёр...

Члены камісіі *А. Дудзіч, М. Ардынскі, У. Флар'яновіч, А. Хахлова, Е. Рымашэўская*

ЗВЕСТКІ АБ АХВЯРАХ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ ПА ТУРАЎСКАМУ РАЁНУ ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Тураўскі с/с	— 128 чал.	Рычоўскі с/с	— 83 чал.
Тураў горад	— 670 чал.	Верасніцкі с/с	— 33 чал.
Запясоцкі с/с	— 241 чал.	Перароўскі с/с	— 93 чал.
Азяранскі с/с	— 144 чал.		

Тураўскі раён быў акупіраваны ў жніўні 1941 г. 18 жніўня адбылася першая крывавая расправа над мірнымі жыхарамі Турава. Некалькі соцень людзей у гэты дзень былі накіраваны пад узброенай аховай у вёску Рыдча. Там аддзялілі ўсіх мужчын у колькасці 96 чалавек, вывелі іх за вёску і паклалі на зямлю тварам уніз. Потым па шэсць чалавек паднімалі для расстрэлу, расстрэльвалі шасцёра эсэсаўцаў. Стралялі ў спіну, у патыліцу. Жывымі засталіся чатыры чалавекі з 96, адзін паранены... Пасля экзекуцыі фашысты вярнуліся ў Тураў і падпалілі пасёлак. Усіх, хто спрабаваў тушыць агонь, забівалі. У той дзень загінула каля 80 чалавек. Тых, хто ўцякаў, даганялі, таксама забівалі... Праз два дні фашысты зноў учынілі разню ў Тураве. Каля 160 чалавек, сярод якіх большасць былі жанчыны і дзеці, адвялі ў вёску Старажоўцы, там частку людзей расстралялі на могілках, а частку спалілі жывымі ў вялікім хляве. Асабліва жорсткія расправы над мірнымі жыхарамі праводзіліся ў тыя дні ў Запясоччы і ў другіх вёсках раёна. Фашысты спалілі вёскі Чэрніцы, Слепцы, Пагост, Сямурадцы, людзей выгналі ў адкрытае поле і расстралялі з кулямётаў, усяго больш за 100 чалавек.

Жыхаркам вёскі Перароўскі Млынок Аўдоцці Абрамаўне Касцянка, якой было 57 гадоў, і 40-гадовай Антаніне Рыгораўне Баран карнікі адрэзалі грудзі, вывернулі рукі і ногі, потым пасадзілі на кол.

Жыхара вёскі Рычоў Афанасія Гаўрылавіча Рыдзецкага, якому было амаль 80 гадоў, паставілі да сцяны, кулямі прашылі рукі і ногі, калі ён упаў і страціў прытомнасць, аблілі вадой і зноў працягвалі здзекі, пакуль стары не сканаў... Вахмістр жандармерыі Віллі Шмідт да смерці закатаваў жыхара Хачэні Міхаіла Місюка, адрэзаў яму вушы, нос, выкалаў вочы, выкруціў рукі. У Рыдчы фашысты ўчынілі зверскую расправу над мірнымі жыхарамі, забілі 96 чалавек. Пятро Бруй, паранены ў плячо, цудам выбраўся з вёскі, адпоўз у лес і застаўся жывым... У гэты дзень у Рыдчы загінула 96 чалавек. 16 ліпеня 1943 г. карнікі разрабавалі і спалілі вёскі Хлупін, Хлупінская Буда, Хваенск, Азяраны, Бечы, Бечынская Буда, Перароў, Перароўскі Млынок. У Тураўскай жандармерыі замучана за час вайны 175 чалавек. Месцам масавых расстрэлаў яўрэяў было ўрочышча Казаргаць...

3 жніўня 1943 г. у час бою каля Хільчыц фашысты захапілі параненага партызана Мікалая Хмяльніцкага, жыхара вёскі Малы Малешаў. Фашысцкі кат Готфільд Бітц у час допыту нанёс яму звыш 115 удараў штыком, паламаў рукі і ногі. Цела Хмяльніцкага кінулі ў балота. У кастрычніку таго ж года фашысты замучылі да смерці 18-гадовага Раеўскага, нанеслі яму 13 штыкавых ран.

У лютым 1944 г. карнікі спалілі вёску Бярэжцы, у красавіку — Поўчын разам з 124 яе жыхарамі, затым — Рычоў, Хачэнь, Старажоўцы, Сямурадцы, Слепцы. У Тураве быў канцлагер, дзе трымалі людзей для выканання цяжкіх работ на будаўніцтве ўмацаванняў. Умовы ў ім былі невыносныя...

У Тураўскім раёне фашысцкімі вылюдкамі забіта, спалена, замучана 1785 мірных жыхароў, 436 угнана ў рабства, разрабавана і спалена 3930 будынкаў.

Філіял Гомельскага ДА у г. Мазыры, ф. 310, оп. 1, дд. 9, 19, лл. 1—79, 1—64.

РЕЕСТР УЩЕРБА, ПРИЧИНЕННОГО НЕМЕЦКО-ФАШИСТСКИМИ ЗАХВАТЧИКАМИ И ИХ СООБЩНИКАМИ ГОСУДАРСТВЕННЫМ, КООПЕРАТИВНЫМ И ОБЩЕСТВЕННЫМ ОРГАНИЗАЦИЯМ, ПРЕДПРИЯТИЯМ, УЧРЕЖДЕНИЯМ И ГРАЖДАНАМ СССР

Житковичский горпоселковый Совет

Райпромкомбинат	— 409 041 руб.
Райзаготскот	— 183 218 руб.
Райисполком	— 1 179 250 руб.
Райкомхоз	— 1 084 722 руб.
Районо	— 6 734 835 руб.
Райздравотдел	— 1 861 139 руб.
Леспромхоз	— 27 165 048 руб.
Житковичский РК КП(б)Б	— 76 383 руб.
Житковичская МТС	— 373 750 руб.

Всего по горсовету нанесен ущерб в сумме 45 016 637 руб.

Житковичский с/совет

Колхоз им. Буденного (д. Кожановичи) Общая сумму ущерба за годы оккупации составила	4 308 188 руб.
Колхоз им. Куйбышева (д. Оцкованое)	— 1 554 886 руб.
«Большевик» (Житковичи)	— 4 991 507 руб.
«Пролетарий» (Житковичи)	— 4 532 811 руб.
«Надубово-Черетянка»	— 7 777 548 руб.

Ущерб по Житковичскому с/совету составил 23 940 770 руб.

Филиал ГА Гомельской области в г. Мозыре, ф. 52, оп. 3, д. 1, лл. 5—10.

У бяссільнай злосці

Нямецка-фашысцкае камандаванне групы армій «Цэнтр» пры адступленні з тэрыторыі Беларусі распрацавала падрабязны план разбурэння народнай гаспадаркі рэспублікі, у першую чаргу чыгунак і ўсіх збудаванняў на ёй, які ажыццяўляўся з нямецкай пунктуальнасцю. Усё астатняе — маёмасць калгасаў і прадпрыемстваў, насельніцтва, жылы і вытворчы фонд, заводы, фабрыкі, МТС былі дашчэнту разрабаваны і разбураны за трохгадовае панаванне на акупіраванай тэрыторыі... Вялікую цікавасць прадстаўляюць данясенні начальніка штаба 408-га інжынернага батальёна і камандзіра 511-га інжынернага батальёна пры 2-й арміі камандзіру 2-й інжынернай брыгады пры групе армій «Цэнтр» аб разбурэнні і ўзрыве чыгуначных ліній, мастоў і збудаванняў на іх на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна.

Штаб 408-го инженерного батальона Перевод с немецкого 29.7.1944 г.

Касается: донесения о взрывах ж/д линий Старушки — Лунинец...

Ссылка: приказ командира 511-го инженерного батальона при 2-й армии

Командиру 511-го инженерного батальона при 2-й армии

Вследствие военных действий противника 24.7.1944 г. штабом 408-го батальона были утеряны все данные, необходимые для составления отчета о произведенных разрушениях на ж/д линиях. В связи с этим отчет о разрушениях был составлен на основании данных дневных сообщений, сохранившихся в 511-м инженерном батальоне.

1. Ж/д линия Старушки — Лунинец

Заградительной ротой на этом участке явилась 4-я рота 408-го батальона под командованием ст. лейтенанта Шмитца. Приказ о начале разрушений на ж/д участке должен был отдать XXII армейский корпус. Последний поручил отдачу приказа на начало разрушений на участке ж/д от ст. Старушки до ст. Житковичи 102-й пехотной дивизии.

Станция Старушки была взорвана 2 и 3.7.1944 г. 73-й инженерной ротой и 4-й ротой 408-го инженерного батальона. Оставалось лишь время для разрушения важнейших ж/д сооружений, ж/д колеи от станции Старушки до км 495. Она не могла быть взорвана, так как ж/д насыпь служила дорогой для отступающей дивизии.

4.7.1944 г. 4-й ротой 408-го инженерного батальона была взорвана ж/д колея на участке от км 495 до км 505. Станция Житковичи полностью не была разрушена, так как слишком затянулась погрузка и приказ о приступлении к взрывам поступил очень поздно.

Отдача приказа о приступлении к взрывам на ж/д участке Житковичи — Микашевичи XXII армейским корпусом была поручена также 102-й пехотной дивизии. Так как по ж/д полотну отступали наши войска, после их прохождения оставалось время лишь на подрыв важнейших ж/д сооружений, что и было сделано 5 и 6.7.1944 г. 4-й ротой 408-го инженерного батальона.

Размеры произведенных разрушений занесены в прилагаемый перечень дорог...

Из донесения командира 511-го инженерного батальона при 2-й армии командиру 2-й инженерной бригады при группе армий «Центр». Секретно!

2.7.1944 г. Станция Старушки. ...Всего взорвано 3777 м рельс и 7 стрелок.

3.7.1944 г. Взорвано 15 стрелок, водокачка, водонапорная башня, водонапорная колонка. Сожжено здание диспетчерской службы.

Ж/д линия Старушки — Лунинец. Взорваны мосты: км 493 — разрушено 2,5 м 7-метрового моста; км 494 — разрушено 2,5 м 6-метрового моста; км 495 — разрушено 2 м 6-метрового моста.

4.7.1944 г. Разрушено 2610 м фронтовой и отечественной колеи.

5.7.1944 г. Станция Житковичи. Взорвано 40 стрелок, 5 кранов, водонапорная станция, насосная установка, центральный пункт, 2 погрузочно-разгрузочные платформы, поворотный круг, сожжено паровозное депо.

Взорваны мосты: 510 км, 512 км, 516 км, 518 км, 520 км; мосты разрушены на 3—4 м при длине от 12 до 15.

6.7.1944 г. Взорваны мосты: 522 км, 523 км, 524 км, 527 км, 530 км, 531 км. Размеры разрушений мостов нельзя установить...*

Станция Дедовка. Взорваны 2 стрелки и здание станции, сожжена погрузочно-разгрузочная платформа...

Командир батальона майор *Нивелингер*

НАРБ, ф. 4683, оп. 3, д. 967, лл. 120, 123—125, 130.

Подготовил *В. И. Лемешонок*

* 5.7.1944 г. эта территория была занята войсками 55-й Мозырской стрелковой дивизии 1-го Белорусского фронта.

Загінуўшыя і прапаўшыя без весткі ўдзельнікі антыфашысцкага падполля, асобы, якія садзейнічалі падпольнаму і партызанскаму руху, мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору

АЗЯРАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АЗЯРАНЫ

ВІННІК Мікалай Рыгоравіч (1889 г.)
ГОЛАД Дзмітрый Якаўлевіч (1902 г.)
КАВАЛЬЧУК Васіль Яфімавіч (1929 г.)
КІРАЙЧУК Антаніна Якаўлеўна (1892 г.)
КІРАЙЧУК Мікалай Фёдаравіч (1887 г.)
КІРАЙЧУК Міхаіл Паўлавіч (1929 г.)
КІРАЙЧУК Пракоп Іванавіч (1889 г.)
КЛІМОВІЧ Вера Паўлаўна (1900 г.)
КЛІМОВІЧ Марыя Архіпаўна (1908 г.)
ЛЕБЯДЗІНСКІ Люша Рыгоравіч (1918 г.)
РАФАЛОВІЧ Дзмітрый Макаравіч (1923 г.)
РАФАЛОВІЧ Мікалай (1886 г.)
РАЕЎСКІ Рыгор Пятровіч (1927 г.)
САСКЕВІЧ Ганна Яфімаўна (1873 г.)
ШВЕЦ Ефрасіння Паўлаўна (1885 г.)
ЮХНЕВІЧ Васіль Сямёнавіч (1888 г.)

ВЁСКІ БЕЧЫ І БЯЧАНСКАЯ БУДА

АКУЛІЧ Анатолія Трафімаўна (1938 г.)
АКУЛІЧ Віктар Архіпавіч (1932 г.)
АКУЛІЧ Ганна Максімаўна (1932 г.)
АКУЛІЧ Хрысціна Андрэеўна (1904 г.)
БАЛБУК Кандрат Іванавіч (1826 г.)
БЫХАН Герасім Антонавіч (1925 г.)
КАСЮК Іван Сяргеевіч (1922 г.)
ЛІСІЦКІ Антон Сяргеевіч (1924 г.)
ЛОЎГАЧ Ілья Пятровіч (1891 г.)
ЛЯЎКОВІЧ Цімафей (1891 г.)
МЕЛЯШЧЭНЯ Ефрасіння (1907 г.)
МУРАШКА Д. І. (1905 г.)
МУРАШКА Марыя Міронаўна (1926 г.)
РАК Таццяна Васільеўна (1911 г.)
ТРУХАНАВЕЦ Франц Кірылавіч (1928 г.)
ХАЛАДОВІЧ Васіль Сямёнавіч (1932 г.)
ХЛЯБЦЭВІЧ Алёна Мікалаеўна (1912 г.)
ХЛЯБЦЭВІЧ Віктар Мікалаевіч (1913 г.)
ХЛЯБЦЭВІЧ Мікалай Іванавіч (1915 г.)
ХЛЯБЦЭВІЧ Пётр Мікалаевіч (1910 г.)
ЯКУБОЎСКАЯ Ганна Іванаўна (1909 г.)
ЯКУБОЎСКІ Іосіф (1908 г.)
ЯКУБОЎСКАЯ Соф'я Якаўлеўна (1914 г.)
ЯРЭМІЧ Аляксей Антонавіч (1924 г.)
ЯЎХІМОВІЧ Міхаіл Іванавіч (1910 г.)

...Гэта здарылася ў маі 1942 г. У ваколіцах вёскі Хваенск прызямліўся дэсант Чырвонай Арміі ў складзе васьмі чалавек. На ноч дэсантнікі размясціліся ў клубе. З Азяран прыбыла папярэджаная кімсьці група паліцаяў. Старшы паліцай патрабаваў у дэсантнікаў дакументы. Адзін з іх палез у кішэню быццам за дакументамі, выхапіў наган і стрэліў. Усхапілася страляніна. Двое дэсантнікаў загінула. Паліцаі разбегліся, іх таксама загінула некалькі чалавек.

Забраўшы загінуўшых таварышаў, дэсантнікі пакінулі вёску. Жыхар Хваенска Андрэй Голад пахаваў забітых на беразе возера. А праз некаторы час тут, у клубе, здарылася яшчэ адна трагедыя.

У ліпені 1943 г. фашысты спалілі Хваенск, засталіся толькі чатыры хаты і клуб. Клуб быў замініраваны. У лютым 1944 г. у вёску ўвайшоў атрад Чырвонай Арміі. Сапёры пачалі размініраваць клуб. Ім дапамагалі мясцовыя жыхары. Размініравалі калідор, увайшлі ў залу, і тут раздаўся аглушальны выбух, потым другі... Загінулі два чырвонаармейцы і сяляне М. К. Нямшэвіч, М. І. Дзягцярык, А. С. Чарнушэвіч...

А. А. Ярмоленка

ВЁСКА ХВАЕНСК

ІЛЬЕНЯ Дзмітрый Кірылавіч (1896 г.)
ЛІС Сямён (1886 г.)
ЧАРНУШЭВІЧ А. В. (1916 г.)
ЧАРНУШЭВІЧ Іван Міхайлавіч (1924 г.)
ЧАРНУШЭВІЧ Рыгор (1910 г.)
ШВЕЦ Лідзія (1910 г.)

ВЁСКА ПАГОСТ

БАБАРЫКА Арцём Карпавіч (1925 г.)
БАБАРЫКА Еўдакія Паўлаўна (1898 г.)
БАБАРЫКА Мікалай Карпавіч (1940 г.)
ГАЛОТА Васіль Іванавіч (1884 г.)
ГАЛОТА Міхаіл Васільевіч (1923 г.)

ЗОХНА Трафім Рыгоравіч (1880 г.)
ЗОХНА Фёдар Трафімавіч (1909 г.)
ЗОХНА Цімафей Трафімавіч (1886 г.)
ІЛЬЕНЯ Аляксандр Кірылавіч (1908 г.)
ІЛЬЕНЯ Аляксандр Фёдаравіч (1902 г.)
ІЛЬЕНЯ Аляксей Раманавіч (1880 г.)
ІЛЬЕНЯ Васіліна Васільеўна (1898 г.)
ІЛЬЕНЯ Васіль Дзмітрыевіч (1895 г.)
ІЛЬЕНЯ Галіна Стэфанаўна (1942 г.)
ІЛЬЕНЯ Кузьма Захаравіч (1886 г.)
ІЛЬЕНЯ Мікалай Дзмітрыевіч (1937 г.)
ІЛЬЕНЯ Мікіта Тарасавіч (1884 г.)
ІЛЬЕНЯ Міхаіл Якаўлевіч
ІЛЬЕНЯ Пелагея Стэфанаўна (1900 г.)
ІЛЬЕНЯ Праскоўя Адамаўна (1896 г.)
ІЛЬЕНЯ Надзея Іванаўна (1920 г.)
КАЛЬЦОЎ Клім Самуілавіч (1876 г.)
КАРАСЬ Антон Якімавіч (1887 г.)
КЛІМОВІЧ Аляксей Стахеевіч (1892 г.)
КЛІМОВІЧ Сцяпан Антонавіч (1870 г.)
КЛІМОВІЧ Фёдар Сяргеевіч (1884 г.)
КУЗЬМІЧ Аляксандр Мікітавіч (1897 г.)
КУЗЬМІЧ Васіль Фёдаравіч (1870 г.)
КУЗЬМІЧ Мікалай Емяльянавіч (1887 г.)
КУЗЬМІЧ Міхаіл Конанавіч (1904 г.)
КУЗЬМІЧ Рыгор Пятровіч
ЧЭЧКА Пётр Піліпавіч (1927 г.)
ШРУБ Пракоп Стэфанавіч (1904 г.)
ШЧАРБІНА Надзея Іванаўна (1920 г.)
ЯКУБОЎСКАЯ Марына Адамаўна (1908 г.)
ЯРМОЛІЧ Стэфан Паўлавіч (1902 г.)
ЯРАШ Іван Мікітавіч (1909 г.)

ВЁСКА ЧЭРНІЧЫ

БАЗЫЛЕВІЧ Сцяпан (1900 г.)
МАРКЕВІЧ Рыгор Захаравіч, н. у 1899 г., загінуў у 1944 г.
МАРКЕВІЧ Архіп Якаўлевіч (1882 г.)
МАРКЕВІЧ Дзмітрый Аляксеевіч (1881 г.)
МАРКЕВІЧ Дзмітрый Іларыёнавіч (1927 г.)
МАРКЕВІЧ Ігнат Анісімавіч (1886 г.)
МАРКЕВІЧ Марына Паўлаўна (1922 г.)
МАРКЕВІЧ Мікалай Сяргеевіч (1918 г.)
МАРКЕВІЧ Мікалай Харытонавіч (1920 г.)
МАРКЕВІЧ Сяргей Андрэевіч (1882 г.)
МАРКЕВІЧ Сяргей Іванавіч (1915 г.)
МАРКЕВІЧ Фёдар Пракопавіч (1900 г.)
МАРКЕВІЧ Харытон Барысавіч (1825 г.)
МАРКЕВІЧ Юлія Емяльянаўна (1891 г.)
КАЦЭВІЧ Кірыл (1884 г.)
КАЦЭВІЧ Фёдар Іванавіч (1883 г.)
РУНКЕВІЧ Андрэй Ігнатавіч (1885 г.)
ПАШЭВІЧ Дзяніс (1885 г.)
САПАНОВІЧ Парфён (1910 г.)
КУЗЬМІЧ Рыгор Пятровіч (1906 г.)
КУЗЬМІЧ Яўхім Кузьміч (1928 г.)
КУЗЬМІЧ Мікалай Васільевіч (1876 г.)
ЛАЗАРЧУК Алёна Сяргееўна (1870 г.)
ЛЕЎКАВЕЦ Марына Стэфанаўна (1917 г.)
ЛЕЎКАВЕЦ Настасся Іванаўна (1917 г.)
ЛЕЎКАВЕЦ Пракоп Макаравіч (1870 г.)
ЛІЦВІНКА Андрэй (1884 г.)
МАРКЕВІЧ Барыс (1870 г.)
МЕЛЯШЧЭНЯ Іван (1914 г.)
ПАНЧЭНЯ Радзівон Станіслававіч (1931 г.)
ПАНЧЭНЯ Фядот Ціханавіч (1889 г.)
ПАНЧЭНЯ Стахей Фёдаравіч (1906 г.)
РАМАНОЎСКІ Васіль Сцяпанавіч (1889 г.)
РАМАНОЎСКІ Кірыл Сцяпанавіч (1880 г.)
РАМАНОЎСКАЯ Марта (1896 г.)
САСКЕВІЧ Ганна Герасімаўна (1896 г.)
САСКЕВІЧ Ганна Фёдараўна (1928 г.)
САСКЕВІЧ Захар Цітавіч (1898 г.)
САСКЕВІЧ Іван Міхайлавіч (1936 г.)
САСКЕВІЧ Любоў Герасімаўна (1940 г.)
САСКЕВІЧ Іван Якаўлевіч (1920 г.)
САСКЕВІЧ Мікалай Ігнатавіч (1928 г.)
САСКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч (1928 г.)
САСКЕВІЧ Сямён Ермалаевіч (1904 г.)
САСКЕВІЧ Фёдар Васільевіч (1896 г.)
САСКЕВІЧ Ціт Іванавіч (1870 г.)
САСКЕВІЧ Якаў Іванавіч (1884 г.)
ТОРЧЫК Міхаіл Дзям'янавіч (1909 г.)
ТОРЧЫК Нічыпар Якімавіч (1884 г.)
ТОРЧЫК Павел Іванавіч (1870 г.)
ТОРЧЫК Трафім Сямёнавіч (1884 г.)
ТОЎКАЧ Вольга Іванаўна (1922 г.)
ЯКУШЭВІЧ Міхаіл Апанасавіч (1902 г.)
ЯКУШЭВІЧ Дзяніс Антонавіч (1885 г.)
ЯКУШЭВІЧ Фёдар Рыгоравіч (1885 г.)
ЯКУШЭВІЧ Ілья Андронавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

Адпраўлены ў Германію на прымусовыя работы і загінулі:

КУЗЬМІЧ Лізавета Васільеўна, н. у 1887 г.
САСКЕВІЧ Ульяна Фёдараўна, н. у 1923 г.
ЧЭЧКА Пётр Захаравіч, н. у 1923 г.

ВЁСКА ЗНАМЕНКА

КАСЮК Антон Якаўлевіч (1929 г.)
МЕЛЯШЧЭНЯ Фядора Лук'янаўна (1903 г.)

БРАНІСЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БРАНІСЛАЎ

АРДЫНСКАЯ Ганна Севярынаўна, н. у 1904 г., расстраляна ў 1943 г. у час карнай экспедыцыі фашыстаў.

АСТРОЎСКІ Адам Іванавіч, н. у 1898 г., расстраляны ў 1944 г. за сувязь з партызанамі.

АСТРОЎСКАЯ Марыя Адамаўна, н. у 1926 г., расстраляна ў 1943 г.

ГРЫВА Марыя Адамаўна, н. у 1923 г., загінула ў 1944 г.

ДАБРАВОЛЬСКАЯ Марыя Зіноўеўна, н. у 1926 г., загінула ў 1943 г.

ДАБРАВОЛЬСКІ Вячаслаў Рыгоравіч, н. у 1937 г.,загінуў у 1943 г.

ДУДЗІЧ Соф'я Адамаўна, загінула ў 1944 г.

ДЗМІТРЭНКА Вольга Іванаўна, н. у 1930 г.

ЗАБРОЦКІ Андрэй Нікадзімавіч, н. у 1900 г., сувязны, расстраляны ў 1943 г. у Жыткавічах за сувязь з партызанамі.

КАЗЛОЎСКАЯ Марыя Станіславаўна, н. у 1928 г., загінула ў 1944 г.

КАНАНУЧАНКА Мікалай Іванавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1941 г.

ЛАТОЦІНА Хрысціна Абрамаўна, н. у 1887 г., загінула ў 1943 г. у час карнай экспедыцыі фашыстаў.

МАЛІНОЎСКАЯ Яўгенія, 1908 г.

МАСЛАЎСКАЯ Алена Леанардаўна, н. у 1926 г., расстраляна ў 1943 г. за сувязь з партызанамі, пахавана ў в. Сітніцкі Двор Лунінецкага р.

ТРУСАВА Хрысціна Фёдараўна, н. у 1886 г., загінула ў 1941 г.

ФЕДАРЭНКА Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1909 г., загінуў у 1941 г. у в. Залюцічы.

ШЫРЧАНКА Мікалай Міхайлавіч.

Эстафета герояў

Шырчанка Мікалай Міхайлавіч (н. у 1905 г. у в. Браніслаў) працаваў у сельскай гаспадарцы, з 1935 г.— пуцявым абходчыкам 7-й Калінкавіцкай дыстанцыі пуці. На апошніх кіламетрах чыгункі краіны, на мяжы з панскай Польшчай, неаднаразова праяўляў выключную пільнасць і мужнасць. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 лістапада 1939 г. за самаадданую працу на чыгунцы першым у раёне ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў жніўні 1941 г.

У надзвычай маляўнічым, па-свойму экзатычным кутку Палесся, здаецца, назаўсёды пасяліліся цішыня і спрадвечны спакой. Яго будзіць толькі час ад часу гудок цягніка перад мостам праз Случ, у далёкіх ужо 30-х — апошнім рубяжом краіны. Супрацьлеглы бераг ракі — іншы раён і другая вобласць, а паўстагоддзя назад — чужая краіна. Граніца з панскай Польшчай... Жылі там такія ж простыя беларускія сяляне, толькі выпаў ім другі лёс. Раней аралі побач зямлю, жылі аднымі інтарэсамі, а цяпер — за кардонам; здаецца, не ворагі, але і не свае...

Чужая краіна ў некалькіх сотнях крокаў ад апошняга чыгуначнага паста, таму трэба быць асабліва пільным усім — ад пагранічніка да калгасніка. Рэдкі дзень або ноч на блізкай адсюль пагранічнай заставе Лапаціна Гара не гучаў сігнал трывогі. Мікалай Міхайлавіч Шырчанка, абходчык чыгуначнага пуці каля моста праз Случ, быў таксама заўсёды насцярожаным і ўважлівым да таго, што робіцца на граніцы.

— Як толькі заўважыш што-небудзь падазронае,— не раз гаварыў начальнік пагранічнай заставы,— адразу дай нам вестку.

...Была цёмная вясенняя ноч 1938 г. Нехта ціхенька пастукаў у дзверы паста. Мікалай Міхайлавіч прыслухаўся. Нясмелы стук паўтарыўся.

— Чужы,— падумаў чыгуначнік.— Свой стукаўся б упэўнена. Што рабіць?..

Погляд упаў на сякеру ў вуглу. Рашэнне прыйшло імгненна. Чым не зброя? Мікалай Міхайлавіч узяў сякеру, прыставіў яе падпаху, тапарышчам наперад. Рэзка адчыніў дзверы.

— Рукі ўверх! — грозна скаман-

М. М. Шырчанка

даваў чыгуначнік. Вочы незнаёмага ўставіліся на магутную рулю «зброі», бегчы не было куды...

Гэта быў не першы чужаземец, затрыманы М. М. Шырчанкам або з яго дапамогай. Чыгуначнік дзейнічаў заўсёды смела, рашуча. А восенню 1939 года жыхароў Браніслава ўсхвалявала навіна: за пільнасць пры ахове чыгункі, праяўлены гераізм і мужнасць пры затрыманні небяспечнага лазутчыка М. М. Шырчанка ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Ён быў адным з першых у раёне, удастоеных такой высокай узнагароды.

— Мне тады было восем гадоў,— успамінае сын мужнага чыгуначніка Вячаслаў Шырчанка.— Памятаю, як віншавалі вяскоўцы бацьку, разглядвалі ордэн з сілуэтам правадыра. Гэта было свята ўсёй вёскі. Людзі ўмелі радавацца... У той неспакойны час парушэнні граніцы былі нярэдкімі. Аднойчы я пас кароў у лесе. Навокал цішыня, спакой, але якім ён мог быць падманлівым... Нечакана падышоў незнаёмы чалавек, прыкурыў ад агеньчыку. Потым спытаў, як прайсці да Людзяневіч, Жыткавіч. Я паказаў прыкладны напрамак, а калі незнаёмы знік у гушчары, кінуў кароў і стрымгалоў пабег на заставу. Хутка лазутчыка затрымалі.

Ганаровы чыгуначнік быў на відавоку, удзельнічаў у многіх нарадах, злётах перадавікоў... Грымнула вайна. Лепшых, найбольш надзейных людзей райком партыі пакідаў у тыле для арганізацыі партызанскай барацьбы. М. М. Шырчанка быў вопытны чыгуначнік, да таго ж мясцовы, ён не эвакуіраваўся на ўсход, такія людзі былі патрэбны для арганізацыі дыверсій на дарозе ў тыле ворага.

...Быў светлы дзень канца жніўня. Сеялі азімае жыта. Многія партызаны ў той пакуль спакойны час займаліся ў вольны час мірнай сялянскай працай. Напярадзе была зіма, усе разумелі, што яна будзе цяжкай, да яе трэба рыхтавацца загадзя.

— Бацька араў зямлю,— расказвае Вячаслаў Мікалаевіч,— калі ў вёсцы з'явіліся немцы. Нехта падказаў, дзе шукаць ордэнаносца, камуніста... Яго схапілі там, на полі. Доўга дапытвалі, а потым расстралялі. Невядома, дзе ён пахаваны...

Справа старога, заслужанага чыгуначніка жыве. Яе працягваюць сыны, усе — чыгуначнікі. Старэйшы, Уладзімір, страціў здароўе на чыгунцы, інвалід. Адам і Мікалай — дарожныя майстры, Аляксандр і Вячаслаў — брыгадзіры на чыгунцы. Працуюць гэтак жа старанна і сумленна, як некалі бацька. Героямі з ордэнамі Чырвонай Зоркі на грудзях вярнуліся з Афганістана ўнукі героя-чыгуначніка воіны-інтэрнацыяналісты стрыечныя браты Мікалай і Аляксандр Шырчанкі. Мікалай Вячаслававіч узначальвае раённы савет воінаў-інтэрнацыяналістаў, вядзе вялікую грамадскую работу. Такая сям'я — у ёй няма абыякавых, тут не могуць працаваць ці ваяваць не інакш, як па-геройску.

В. Р. Феранц

ВЁСКА ВІЛЬЧА

КАНАПАЦКІ Ілья Якаўлевіч, н. у 1901 г.

КАНАПАЦКІ Гаўрыл Антонавіч, н. у 1876 г., закатаваны фашыстамі ў красавіку 1944 г.

КАНАПАЦКІ Андрэй Гаўрылавіч, н. у 1914 г., да вайны працаваў старшынёй Юркевіцкага сельпо. Закатаваны фашыстамі ў красавіку 1944 г.

КАНАПАЦКІ Пётр Мацвеевіч, н. у 1931 г., падарваўся на міне ў сакавіку 1944 г.

ВЁСКА ГРАДА

БОРДЗЮГ Васіль Емяльянавіч, н. у 1912 г., сувязны, закатаваны фашыстамі 10.5.1944 г. у в. Рудня Жыткавіцкага р.

ГАЛЯЧАНКА Міхаіл Мікітавіч, н. у 1905 г., прапаў без вестак.

ПАЎЛЮК Людвіг Архіпавіч, н. у 1927 г., **ТАРЛЕЦКІ Віктар Андрэевіч**, н. у 1926 г., загінулі 12.5.1944 г. пад абвалам зямлі.

ВЁСКА ЗАГАЦЦЕ

КУЛАКЕВІЧ Яфім, н. у 1904 г.

ВЕРАСНІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВЕРАСНІЦА

АРЦЮХОВІЧ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1915 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКАЯ Яўгенія Якімаўна, н. у 1931 г., загінула ў 1941 г.

БЛОЦКІ Мікалай Якімавіч, н. у 1928 г., загінуў у 1941 г.

БЛОЦКІ Аляксей Піліпавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1941 г.

БЕЛКА Кірыл Стахеевіч, н. у 1909 г., загінуў у 1941 г.

ВАШКОЎ Нікіфар Пятровіч, н. у 1875 г., загінуў у 1941 г.

ВАШКОЎ Міхаіл Цімафеевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г.

ВАШКОЎ Рыгор Антонавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1942 г.

КАРАЛЕЦ Пётр Іванавіч, н. у 1879 г., загінуў у 1944 г.

ЛАЗОЎСКАЯ Прося Кірылаўна, н. у 1910 г., загінула ў 1942 г.

МАЖАКА Дзмітрый Марцінавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1941 г.

МАЖАКА Таццяна Фёдараўна, н. у 1936 г., загінула ў 1941 г.

ПРАХАРЭНКА Піліп Васільевіч, н. у 1916 г., загінуў у 1941 г.

РЫДЗЕЦКАЯ Вольга Адамаўна, н. у 1930 г., загінула ў 1941 г.

САНЕЦ Герта Абрамаўна, н. у 1912 г., загінула ў 1941 г.

САНЕЦ Уладзімір Ціханавіч, н. у 1938 г., загінуў у 1941 г.

САНЕЦ Віктар Ціханавіч, н. у 1934 г., загінуў у 1941 г.

САНЕЦ Алёна Ціханаўна, н. у 1940 г., загінула ў 1941 г.

САНЕЦ Мелаха Яўхімаўна, н. у 1907 г., загінула ў 1941 г.

ТАРАСЮК Адарка Мацвееўна, н. у 1875 г., загінула ў 1943 г.

ЧЭЧЫК Арон Абрамавіч, н. у 1870 г., загінуў у 1942 г.

ЧЭЧЫК Стася Хаімаўна, н. у 1871 г., загінула ў 1942 г.

ВЁСКА ЛЮБАВІЧЫ

ДАРОШКА Рыгор Фёдаравіч, н. у 1879 г., загінуў у 1941 г.

ВЁСКА МАЛЕШАЎ

ВАРВАНОВІЧ Іван Піліпавіч, н. у 1929 г., загінуў у 1942 г.

ВАРВАНОВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1868 г., загінуў у 1942 г.

КАДОЛІЧ Мікалай Пятровіч, н. у 1926 г., загінуў у 1943 г.

КАДОЛІЧ Васіль Пятровіч, н. у 1930 г., загінуў у 1943 г.

КЛІМОВІЧ Іосіф Кандратавіч, н. у 1889 г., загінуў у 1943 г.

КОМАР Пётр Фёдаравіч, н. у 1900 г., загінуў у 1943 г.

КОМАР Кацярына Фёдараўна, н. у 1920 г., загінула ў 1941 г.

СЕРГІЕВІЧ Іван Сямёнавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1941 г.

ШАЎЧУК Мікалай Рыгоравіч, н. у 1925 г., загінуў у 1943 г.

ШАЎЧУК Апанас Сямёнавіч, н. у 1893 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА ЗАПЯСОЧЧА

Да вайны ў Запясоччы налічвалася каля 300 двароў, пражывала 1200 чалавек. У першыя дні свайго гаспадарання ў раёне захопнікі, раз'юшаныя ўпартасцю мясцовых жыхароў у абароне Турава, у жніўні 1941 г. спалілі вёску — звыш 250 хат, расстралялі семдзесят чалавек...

Запясочча занесена ў жалобны спіс загінуўшых вёсак у Хатыні.

БАЛБУЦКІ Андрэй Мікалаевіч, загінуў у 1941 г.

БАЛБУЦКІ Іван Трафімавіч, загінуў у 1943 г.

БАЛБУЦКІ Павел Іванавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1943 г.

БАЛБУЦКІ Пётр Еўдакімавіч, загінуў у 1943 г.

БАЛБУЦКАЯ Соф'я Еўдакімаўна, н. у 1894 г., загінула ў 1943 г.

БАЛБУЦКІ Трафім Прохаравіч, н. у 1864 г., загінуў у 1943 г.

БАЛБУЦКАЯ Ульяна.

БУДА Васіліса Маісееўна, н. у 1876 г., загінула ў 1943 г.

БУДА Лявонцій Ільіч, н. у 1874 г., загінуў у 1943 г.

БУДА Таццяна Лявонцьеўна, н. у 1902 г., загінула ў 1943 г.

БУДА Марыя Прохараўна, н. у 1887 г, загінула ў 1943 г.

БАЗЫЛЕВІЧ Павел.

БАЗЫЛЕВІЧ Хрысціна Мікалаеўна, н. у 1899 г., загінула ў 1943 г.

БАБАРЫКА Ульяна Усцінаўна, н. у 1914 г., загінула ў 1944 г.

БЕРДЫЧАВЕЦ Ігнат.

ГАРШКАЛЕП Еўдакія Міхайлаўна, н. у 1912 г., загінула ў 1943 г.

ГАРШКАЛЕП Уладзімір Барысавіч, н. у 1939 г., загінуў у 1943 г.

ГАРШКАЛЕП Іван Рыгоравіч, загінуў у 1943 г.

ГАРШКАЛЕП Ніна Барысаўна, н. у 1941 г., загінула ў 1943 г.

ГАРШКАЛЕП Марыя Іванаўна, н. у 1914 г., загінула ў 1943 г.

КОТ Арцём Абрамавіч, н. у 1892 г., загінуў у 1943 г.

КОТ Андрэй Іванавіч, н. у 1892 г., загінуў у 1943 г.

КОТ Фёдар Андрэевіч.

КУРБАН Вольга Трафімаўна, н. у 1894 г., загінула ў 1943 г.

КУРБАН Ефрасіння Прохараўна, н. у 1891 г.

КУРБАН Зінаіда Іванаўна, н. у 1892 г., загінула ў 1943 г.

КУРБАН Іван Максімавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1942 г.

КУРБАН Марыя Абрамаўна, н. у 1900 г., загінула ў 1943 г.

КУРБАН Павел Апанасавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1943 г.

КУРБАН Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1909 г, загінуў у 1943 г.

КУРБАН Фёдар Абрамавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1943 г.

КАРАСЬ Міхаіл Герасімавіч.

КОМАР Пракофій Фёдаравіч, н. у 1928 г., загінуў у 1943 г.

МАТОХ Кацярына Сцяпанаўна, н. у 1923 г., загінула ў 1943 г.

МАТОХ Яўхім Сцяпанавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1943 г.

МАЛОЧКА Мікалай Максімавіч, н. у 1937 г., загінуў у 1943 г.

МАЛОЧКА Несцер Дзямідавіч, н. у 1894 г., загінуў у 1943 г.

МАЛОЧКА Пётр Трафімавіч, загінуў у 1943 г.

МАЛОЧКА Сцяпан Максімавіч, н. у 1864 г., загінуў у 1943 г.

МАЛОЧКА Фядосся Максімаўна, н. у 1934 г., загінула ў 1943 г.

МАРУСІЧ Дзмітрый Данілавіч, н. у 1864 г., загінуў у 1943 г.

МАРУСІЧ Ульяна Іванаўна, н. у 1902 г., загінула ў 1943 г.

ПАШЭВІЧ Ганна Мікалаеўна, н. у 1938 г., загінула ў 1943 г.

ПАШЭВІЧ Кацярына Анісімаўна, н. у 1894 г., загінула ў 1943 г.

ПАШЭВІЧ Фядора Мікалаеўна, н. у 1936 г., загінула ў 1943 г.

РУСЫ Емяльян Іванавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1944 г.

РУСЫ Фёдар Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1942 г.

РУСЫ Іван Якаўлевіч, н. у 1879 г., загінуў у 1943 г.

РУСЫ Канстанцін Сцяпанавіч, н. у 1938 г., загінуў у 1943 г.

РУСАЯ Надзея Сцяпанаўна, н. у 1939 г., загінула ў 1943 г.

РУСАЯ Марыя Васільеўна, н. у 1912 г., загінула ў 1943 г.

РУСАЯ Таццяна Сцяпанаўна.

САНЕЦ Аксіння Антонаўна, н. у 1919 г., загінула ў 1944 г.

САНЕЦ Валянціна Сцяпанаўна, н. у 1924 г., загінула ў 1942 г.

САНЕЦ Ефрасіння Антонаўна, н. у 1929 г., загінула ў 1943 г.

САНЕЦ Мелання Мітрафанаўна, н. у 1896 г., загінула ў 1943 г.

САНЕЦ Мелання Яўхімаўна, загінула ў 1943 г.

САНЕЦ Павел Васільевіч, н. у 1874 г., загінуў у 1943 г.

САНЕЦ Антон Еўдакімавіч, н. у 1903 г., загінуў у 1943 г.

САНЕЦ Фама Іванавіч.

САНЕЦ Марыя Антонаўна, н. у 1937 г., загінула ў 1943 г.

САНЕЦ Фядора Міхайлаўна, н. у 1899 г., загінула ў 1943 г.

СЯДУН Аляксандр Дзянісавіч, н. у 1884 г., загінуў у 1943 г.

СТРАХ Антон Канстанцінавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

СТРАХ Мікалай Антонавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г.

СТРУК Варвара Сцяпанаўна, н. у 1938 г., загінула ў 1942 г.

СТРУК Ганна Сцяпанаўна, н. у 1939 г., загінула ў 1942 г.

СТРУК Лідзія Сцяпанаўна, н. у 1940 г., загінула ў 1944 г.

СТРУК Марыя Сцяпанаўна, н. у 1936 г., загінула ў 1944 г.

СТРУК Антон Мікалаевіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

СТРУК Іван Спірыдонавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1941 г.

СТРУК Ірына Дзмітрыеўна, н. у 1923 г., загінула ў 1943 г.

СЯДЗЕЛЬНІК Якаў Дзям'янавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г.

ЦАРЫК Марына.

ЧЫКІДА Марыя Іванаўна, н. у 1914 г., загінула ў 1943 г.

ЧЫКІДА Ніна Іванаўна, н. у 1940 г., загінула ў 1943 г.

ЧЫКІДА Ніна Барысаўна, н. у 1940 г., загінула ў 1943 г.

ЧЫКІДА Уладзімір Барысавіч, н. у 1937 г., загінуў у 1943 г.

ЧЫКІДА Пракофій Данілавіч, н. у 1864 г., загінуў у 1943 г.

ШАЎГЕНЯ Акім Рыгоравіч, н. у 1910 г., загінуў у 1942 г.

ШАЎГЕНЯ Яўхім Рыгоравіч, н. у 1899 г., загінуў у 1943 г.

ШВЕД Іван Міхайлавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1943 г.

Палеская Хатынь

Трагічны лёс Хатыні і дзесяткаў іншых вёсак Беларусі раздзяліла і вёска Поўчын. 24 красавіка 1944 г. карнікі абкружылі яе, сагналі ўсіх людзей — жанчын і дзяцей, старых і маладых — у адну хату, закідалі гранатамі, расстралялі з кулямётаў, падпалілі... 123 чалавекі загінулі ў агні ў той страшны дзень. Толькі пацвярым удалося вырвацца з пекла, створанага фашысцкімі нелюдзямі: Курбан Матроне Міхайлаўне і Курбан Пелагеі Мартынаўне, якая, параненая, вынесла з агню дваіх дзяцей — сваю дачку Ніну, немаўля, якому было толькі 6 месяцаў, і чужую чатырохгадовую дзяўчынку Надзею Чыкіду, бацькі якой засталіся ў агні.

На месцы трагедыі ў 1955 г. мясцовыя жыхары М. І. Дарошка і Г. І. Калоська ўзвялі часовы помнік. Вялікую работу па ўшанаванню памяці загінуўшых, устанаўленню іх імён правялі да 35-годдзя вызвалення Беларусі піянеры Запясоцкай васьмігадовай школы пад кіраўніцтвам настаўніцы Т. І. Чорнай. Яны сустракаліся з відавочцамі трагедыі, удзельнікамі вайны, знатнымі людзьмі раёна. Калгаснік А. П. Шчыкатовіч зрабіў мемарыяльныя дошкі з імёнамі загінуўшых.

9 мая 1978 г. у вёсцы Поўчын ва ўрачыстай абстаноўцы быў устаноўлены помнік ахвярам расправы фашысцкіх карнікаў над мірнымі жыхарамі «Смуткуючая маці».

Я — таксама з вогненнай

Успаміны П. М. Курбан

...Вёска наша, Поўчын, цяпер невялікая, усяго некалькі дзесяткаў двароў. Да вайны яна была куды большай! Навокал — непраходныя лясы і балоты, зараснікі лазы. Як прыйшлі немцы, Поўчын стаў партызанскай вёскай. Рэдка з якой хаты не пайшлі ў партызаны бацька ці брат, муж ці сын. І мой муж, Іван Курбан, таксама быў у лесе. Мы, жанчыны, пяклі для іх хлеб, адмывалі бінты, збіралі і перадавалі адзенне — дапамагалі, чым маглі.



Помнік вяскоўцам у в. Поўчын, якія спалены жывымі 24 красавіка 1944 г.

...Трагедыя адбылася на золаку 24 красавіка 1944 г., калі ўжо зусім мала заставалася да вызвалення. Узыходзіла сонца... Шмат хто ў той дзень бачыў яго ў апошні раз. Немцы на вулках вёскі з'явіліся нечакана. На шасці вялікіх лодках прыплылі па Прыпяці, з Турава. Даведаліся, відаць, што партызаны ў гэты час знаходзіліся на чыгунцы недзе ля Мікашэвіч. Так і падумалася тады, сэрца падказала: чакай бяды.

Немцы з перакладчыкам хадзілі ад хаты да хаты, стукалі ў вокны. «Усім на сходку». Я пытаюся ў маці:

«Можа, мне не ісці?» Мне было 23 гады, на руках — шасцімесячная дачушка Нінка. Мама кажа: «Не, трэба, мусіць, ісці і табе. Каб яны нічога не зрабілі з табой, пакуль мы будзем на тым сходзе».

Спавіла я Нінку, апранулася. І пайшлі — мама, бабуля, два маіх меншыя браты. На вуліцы шматлюдна, усюды гоман. У цэнтры вёскі стаяла вялікая хата Сцяпана Бруя, па-вясковаму — Кондзеля. «Заходзьце, усе заходзьце, будзем пачынаць сход!» — крычаць немцы з ганку. У вялікім, неперагароджаным пакоі людзей — яблыку няма дзе ўпасці.

Хто стаяў бліжэй да вокнаў, бачылі, як адышлі немцы ад хаты. Два афіцэры нядоўга спрачаліся: адзін штосьці даказваў і паказваў рукой у бок Прыпяці, другі тыкаў пальцам на перапоўненую хату. Настаяў на сваім другі. Пачуліся словы каманды — зазвінелі разбітыя вокны, у хату паляцелі гранаты. Прама ў гушчыню людзей. Грукат, полымя, крыкі, кроў... Кроў на столі, на сценах, і страшэнны нечалавечы крык і енк дзесяткаў людзей...

Многія кінуліся да вокнаў, дзвярэй. А насустрач ім — свінцовы дождж. І я паімкнулася туды з немаўляткам на руках. Дарогу перагарадзіў немец. Колькі прайшло часу, а я і цяпер, калі б давялося, пазнала б яго: сутулены, чорны, твар перакошаны злосцю.

Адхінулася назад — па нежывых ужо спатыкалася, падала. Дым з'явіўся пад столлю,— хату падпалілі з двух бакоў, абліўшы газай. Убачыла печ. Пачала Нінку туды запіхваць — думаю, усё згарыць, а печ застанецца, можа выратуецца дзіцятка. Спрабавала ўціснуцца ў пограб, а там усё людзьмі забіта, толькі і яны не ўратаваліся. А дым усё гусцее, ужо агонь ліжа сцены.

Не памятаю, як я па трупах вяскоўцаў да акна дабралася і ўзлезла на падаконнік. У мяне на руках яшчэ адна дзяўчынка — выпадкова заўважыла яе, жывую, і не магла не падхапіць дзіця. Адпаўзлі мы, адкаціліся ў дыме метраў за пяцьдзесят, там вялікі пень стаяў, схавалася за яго. Прывалілася я да пня і, здаецца, прытомнасць страціла. А дзеці — побач. Нінка на каленях заварушылася, ачнулася я. Быццам не сваімі вачыма гляджу навокал: дзе я, што са мной? Рука прастрэлена, кроў... Паступова пачала прыгадваць, што адбылося — ці гэта са мной было, ці з кімсьці?.. Побач чужая дзяўчынка — Надзейка Чыкіда. Ёй было чатыры гады, я добра ведала яе бацькоў, жылі побач. Стала Надзя маёй другой дачкой.

Перавязала, як магла, руку, падхапіла дзяцей і пабегла куды вочы глядзяць, абы далей ад гэтага жаху. А куды далей? Вядома, у лес, у гушчар.

...Ёсць такая кніга — «Я з вогненнай вёскі». Унук Лёнік чытаў мне гэтую кніжку. Плакала я, слухаючы горкую споведзь людзей, зноў усё перажывала, успомнілася ўсё... Я з дочкамі таксама з вогненнай...

Побач з месцам былога страшнага вогнішча ў Поўчыне ўзведзены помнік: маці прыціскае да грудзей цела падлетка, якое бяссільна спаўзае ўніз. Мне так і здаецца — гэта я з дачкою...

Жыхары в. Поўчын, спаленыя 24 красавіка 1944 г.

АРДЫНСКАЯ Вольга Данілаўна (32 гады)
АРДЫНСКАЯ Юлія Юзефаўна (11 гадоў)
АРДЫНСКАЯ Надзея Юзефаўна (10 гадоў)
АРДЫНСКАЯ Ганна Піліпаўна (40 гадоў)
АРДЫНСКАЯ Марыя Паўлаўна (20 гадоў)
БРУЙ Рыгор Мікалаевіч (66 гадоў)
БРУЙ Домна Парфёнаўна (64 гады)
БРУЙ Мікалай Рыгоравіч (8 гадоў)
БРУЙ Марыя Сцяпанаўна (60 гадоў)

БРУЙ Ганна Цярэнцьеўна (8 гадоў)
БРУЙ Марыя Абрамаўна (33 гады)
БРУЙ Мікалай Дзям'янавіч (6 гадоў)
БРУЙ Ніна Дзям'янаўна (4 гады)
БЕЛКА Ганна Емяльянаўна (50 гадоў)
БАЛБУЦКАЯ Пелагея Дзмітрыеўна (38 гадоў)
БАЛБУЦКАЯ Алена Міхайлаўна (37 гадоў)
БАЛБУЦКАЯ Лідзія Паўлаўна (8 гадоў)
БАЛБУЦКАЯ Марыя Васільеўна (3 гады)
БАЛБУЦКАЯ Кацярына Аляксандраўна (4 гады)
БАЛБУЦКАЯ Марта Рыгораўна (29 гадоў)
БАЛБУЦКІ Ціт Савіч (29 гадоў)
БАЛБУЦКІ Сяргей Цітавіч (8 месяцаў)
БАЛБУЦКАЯ Домна Піліпаўна (50 гадоў)
БАЛБУЦКІ Міхаіл Фёдаравіч (16 гадоў)
БАЛБУЦКІ Канстанцін Фёдаравіч (12 гадоў)
БАЛБУЦКАЯ Еўдакія Фёдараўна (9 гадоў)
БАЛБУЦКІ Васіль Фёдаравіч (6 гадоў)
БАЛБУЦКІ Ілья Фёдаравіч (1 год)
БАЛБУЦКАЯ Ульяна Аляксееўна (20 гадоў)
БАЛБУЦКІ Сямён Фёдаравіч (20 гадоў)
БЛОЦКАЯ Пелагея Дзмітрыеўна (38 гадоў)
БЛОЦКАЯ Яўгенія Ігнатаўна (5 гадоў)
БУДА Дар'я Мікалаеўна (27 гадоў)
БУДА Уладзімір Кірылавіч (7 гадоў)
БУДА Еўдакія Кірылаўна (5 гадоў)
БУДА Ганна Кірылаўна (4 гады)
БУДА Аляксандр Кірылавіч (1,5 года)
ВЕЦІК Іван Аўдзеевіч (34 гады)
ВЕЦІК Аляксандра Мітрафанаўна (32 гады)
ВЕЦІК Ганна Іванаўна (5 гадоў)
ВЕЦІК Марыя Іванаўна (2 гады)
КУРБАН Варвара Паўлаўна (36 гадоў)
КУРБАН Іван Кузьміч (14 гадоў)
КУРБАН Матрона Кузьмінічна (10 гадоў)
КУРБАН Сяргей Кузьміч (4 гады)
КУРБАН Мікіта Міхайлавіч (44 гады)
КУРБАН Іван Мікітавіч (8 гадоў)
КУРБАН Фядора (60 гадоў)
КУРБАН Кацярына Емяльянаўна (20 гадоў)
КУРБАН Домна Сцяпанаўна (17 гадоў)
КОХНА Яўгенія Аляксееўна (60 гадоў)
ЛУЗАЙ Таццяна Лявонцьеўна (60 гадоў)
ЛУЗАЙ Праскоўя Савічна (26 гадоў)
ЛУЗАЙ Еўдакія Андрэеўна (8 гадоў)
ЛУЗАЙ Іван Андрэевіч (5 гадоў)
ЛУЗАЙ Уладзімір Андрэевіч (3 гады)
ЛУЗАЙ Ганна Анісімаўна (18 гадоў)
РУСАЯ Соф'я Данілаўна (20 гадоў)
РУСЫ Сцяпан Данілавіч (17 гадоў)
РУСЫ Васіль Максімавіч (80 гадоў)
РУСЫ Васіль Іосіфавіч (18 гадоў)
СЯДЗЕЛЬНІК Маісей Сямёнавіч (13 гадоў)
СЯДЗЕЛЬНІК Ефрасіння Сямёнаўна (11 гадоў)
СЯДЗЕЛЬНІК Цярэнцій Сямёнавіч (20 гадоў)
СЯДЗЕЛЬНІК Сямён Іванавіч (56 гадоў)
САНЕЦ Яфім'я Парфёнаўна (55 гадоў)
САНЕЦ Малання (10 гадоў)
САНЕЦ Марыя Паўлаўна (27 гадоў)
САНЕЦ Мікалай Фёдаравіч (5 гадоў)
САНЕЦ Валянціна Фёдараўна (3 гады)
САНЕЦ Аляксандр Фёдаравіч (7 месяцаў)
САНЕЦ Фядора Піліпаўна (45 гадоў)
САНЕЦ Марыя Іванаўна (3 гады)
САНЕЦ Акім Іванавіч (1,5 года)
САНЕЦ Харыціна Міхайлаўна (32 гады)
САНЕЦ Наталля Андрэеўна (12 гадоў)
САНЕЦ Настасся Архіпаўна (18 гадоў)
САНЕЦ Уладзімір Іванавіч (45 гадоў)
САНЕЦ Аксіння Аляксандраўна (41 год)
САНЕЦ Вольга Андрэеўна (18 гадоў)
САНЕЦ Пётр Іванавіч (19 гадоў)
САНЕЦ Праскоўя Паўлаўна (34 гады)
САНЕЦ Парфён Іванавіч (34 гады)
САНЕЦ Іван Парфёнавіч (13 гадоў)
САНЕЦ Надзея Парфёнаўна (4 гады)
САНЕЦ Марыя Парфёнаўна (3 гады)
САНЕЦ Ксенія Парфёнаўна (6 месяцаў)
ГАРДЗЕЙЧЫК Наталля Данілаўна (19 гадоў)
ДЗЕДАВЕЦ Ганна Абрамаўна (23 гады)
ДАМАШКЕВІЧ Марыя Рыгораўна (19 гадоў)
ЖУК Пелагея Пятроўна
КАРАЛЕЦ Настасся Фёдараўна (34 гады)
КАРАЛЕЦ Яфім'я Паўлаўна (12 гадоў)
КАРАЛЕЦ Фёдар Паўлавіч (10 гадоў)
КАРАЛЕЦ Міхаіл Паўлавіч (8 гадоў)
ЛЕБЯДЗІНСКАЯ
ЛЕБЯДЗІНСКІ Трафім Раманавіч (20 гадоў)
МАРУСІЧ Ганна Паўлаўна (19 гадоў)
ПЯШЭВІЧ Мікалай Яфімавіч
ПАДДУБНАЯ Ганна Савічна (16 гадоў)
СОБАЛЬ Марыя Ціханаўна (12 гадоў)
СОБАЛЬ Хіма Ціханаўна
СОБАЛЬ Міхаіл Ціханавіч (7 гадоў)
СОБАЛЬ Уладзімір Ціханавіч (4 гады)
СТРУК Еўдакія Сцяпанаўна (25 гадоў)
СТРУК Марыя Іванаўна (12 гадоў)
СТРУК Сцяпан Іванавіч (7 гадоў)
СТРУК Іван Іванавіч (5 гадоў)
СТРУК Алена Лявонцьеўна (28 гадоў)
СТРУК Міхаіл Паўлавіч (2 гады)
ЗОСЯ
СУЛІМ Агаф'я Мітрафанаўна (42 гады)
СУЛІМ Надзея Лявонцьеўна (13 гадоў)
СУЛІМ Валерый Лявонцьевіч (4 гады)
ТОРЧЫК Якаў Пятровіч (30 гадоў)

ТОРЧЫК Пелагея Піліпаўна (28 гадоў)
ТОРЧЫК Віктар Якаўлевіч (3 гады)
ЧЫКІДА Данііл Спірыдонавіч (61 год)
ЧЫКІДА Настасся Прохараўна (27 гадоў)
ЧЫКІДА Уладзімір Арцёмавіч (5 гадоў)
ЧЫКІДА Ніна Арцёмаўна (4 гады)
ЧЫКІДА Ганна Сідараўна (19 гадоў)
ШВЕД Еўдакія Іванаўна (24 гады)

ДЗЯКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

«Мы любілі Радзіму...»

«...Тут 6 сакавіка 1943 г. нямецка-фашысцкімі вылюдкамі былі жывымі спалены жыхары вёскі Дзякавічы (старыя, жанчыны, дзеці) — 651 чалавек».

Жалобны надпіс на мармуровай пліце мемарыяльнага комплекса ў Дзякавічах на месцы, дзе ў гады мінулай вайны ў полымі, у страшных пакутах загінулі вяскоўцы, заўсёды ляжаць жывыя кветкі. Тут навечна пасяліліся цішыня і смутак... «Людзі добрыя, помніце: мы любілі Радзіму і вас, дарагія. Мы згарэлі жывымі ў агні. Не забудзьце, не забудзьце...» Тыя ж словы, што болем сэрца выпалены на халодным камяні ў Хатыні. Дзякавічы — яшчэ адна вёска на шматпакутнай беларускай зямлі — жалобная сястра Хатыні...

І памяць людская не забывае.

...У канцы лютага і пачатку сакавіка 1943 г. пасля паспяховых дзеянняў партызан злучэння Камарова (В. З. Каржа), якія ўзнавілі савецкую ўладу ў Ленінскім раёне і не давалі спакою гітлераўцам у суседніх раёнах, шэрагу ўдачных аперацый жыткавіцкіх атрадаў, смелага і ўпэўненага рэйда С. А. Каўпака па камунікацыях ворага нямецка-фашысцкія захопнікі асабліва лютавалі. Карныя атрады змагаліся не столькі з народнымі мсціўцамі, колькі з безабароннымі мірнымі жыхарамі. Помсцілі слабым, здзекаваліся над невіноўнымі...

— З сакавіка карны атрад з'явіўся ў Дзякавічах,— успамінае сведка трагедыі Антаніна Цімафееўна Рагалевіч.— Фашысты ўстанавілі навокал вёскі кулямёты, людзей выганялі з хат на мароз, а самі сяліліся на іх месца ў цяпло. На працягу некалькіх дзён прачэсвалі лес, разбуралі курані тых, хто хаваўся ў іх, расстрэльвалі ўсіх, каго захапілі. Так былі «апрацаваны» урочышчы Азяры, Высокі Рог, Пакадзіна.

Наступіла пятніца 6 сакавіка. Раніцай гітлераўцы аб'явілі: усім збірацца на сход. Тым, хто прыйшоў, загадалі разам з рэчамі грузіцца на вазы, з дзецьмі, жывёлай — усіх будуць перасяляць далей ад небяспечнай партызанскай зоны.

Помнік вяскоўцам у в. Дзякавічы, якія спалены жывымі

— Плакалі дзеці, рыкалі каровы,— расказвае Ганна Арцёмаўна Жураўлевіч, якая цудам засталася жывой пасля зверскай расправы гітлераўцаў над мірнымі жыхарамі.— Гвалт стаяў над вёскай... Па загаду камандзіра карнага атрада рушылі ў дарогу. Немцы нават пасадзілі некалькіх дзяцей да сябе на вазы. Хутка незвычайнае шэсце выцягнулася за вёску. Пачыналася вялікае балота, бегчы не было куды. Людзей перапынілі, пачалі адбіраць маёмасць. Усіх павярнулі назад у вёску, загналі ў будынкі — хату, хлеў і гумно. Каля вазоў засталіся возчыкі і некалькі дзяцей. Вакол шчыльным ланцугом стаялі ўзброеныя карнікі. Усе зразумелі, што іх чакае смерць...

Дзверы і вокны забілі дошкамі, і хутка з'явіўся агонь... Страшэнны лямант, крыкі, плач стаяў над наваколлем, ад якога, здавалася, павінна было здрыгануцца неба, але не скаланулася сэрца вылюдкаў... Людзі ў роспачы кідаліся да вокнаў і дзвярэй, але іх сустракалі кулі і агонь. Тых, каму ўдавалася выскачыць з полымя, забівалі прыкладамі і штыкамі, кідалі назад у агонь.

Дзеці спрабавалі уцякаць, беглі ў розныя бакі, іх лавілі і кідалі ў агонь. 9-гадовы Мікалай Агіевіч некалькі разоў выскокваў з полымя, але выратавацца яму не ўдалося... Фашысты смяяліся, некаторыя былі з фотаапаратамі і фатаграфавалі... Марыі Рагалевіч было 10 гадоў. Яе пратыкнулі штыком і неслі па вуліцы.

Хлеў з людзьмі абклалі саломай і сенам, падпалілі...

Адначасова вылюдкі ўтварылі зверскую расправу і над жыхарамі вёскі Буда. Усіх, каго захапілі ў той дзень,— старых, жанчын, дзяцей, многія з якіх босыя і распранутыя, павялі па дарозе ў бок Вятчын. Там усіх загналі ў хлеў і падпалілі. 80-гадовай Марыі Сямёнаўне Акунец удалося выбрацца з агню, але яе дагналі, забілі штыкамі і нежывую кінулі назад у вогнішча. Жывым застаўся Міша Купрацэвіч. Але далёка ўцякчы ён не змог. Вылюдкі выкалалі яму вочы і кінулі ў полымя... Буда ў гэты час гарэла, як Дзякавічы і Вятчын.

Некалькім чалавекам ўдалося ўратавацца ад агню і забегчы ў суседнюю хату. Яны схаваліся пад печ. Але немцы знайшлі іх там, падпалілі і гэтую хату, усе загінулі...

— Людзей, якія засталіся на вазах, адправілі са скарбам дзякаўчан у Вятчын,— расказвае Ганна Сяргееўна Жураўлевіч, якая была ў той дзень за возчыка.— Фашысты намерваліся зрабіць такую ж расправу над людзьмі і там. Але 7 сакавіка спалілі ў памяшканні лясніцтва разам з жыхарамі толькі вёску Буду.

З акта расследаванняў злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры акупацыі Жыткавіцкага раёна

У час блакіроўкі партызанскіх зон немцы ўварваліся ў в. Дзякавічы Жыткавіцкага раёна і аб'явілі ўсяму насельніцтву, каб яны падрыхтаваліся да пераезду на Украіну, абяцаючы ім, што там яны атрымаюць добрыя зямельныя ўчасткі. Калі насельніцтва сабралася, тады нямецка-фашысцкія вылюдкі і іх памагатыя адабралі ў грамадзян усю маёмасць, а ўсё насельніцтва ў колькасці 336* чал. было сагнана ў адзін хлеў, дзе ўсе былі зажыва спалены.

ЦДА Расіі, ф. 7021, оп. 91, л. 273.

...У той страшны дзень загінулі амаль усе жыхары Дзякавіч. Але вёска, якая раздзяліла трагічны лёс Хатыні, не загінула. Яна ўзрадзілася з попелу, адбудавалася, стала яшчэ большай і прыгажэйшай. Удзячныя вяскоўцы не забылі тых, хто завяшчаў ім новае, лепшае жыццё...

...Спісы загінуўшых 6 сакавіка 1943 г. у Дзякавічах у свой час, па гарачых слядах, не былі складзены. Засталіся толькі наступныя звесткі.

ВЁСКА ДЗЯКАВІЧЫ

АХРАМОВІЧ Праскоўя (2 чалавекі)
БЕРДНІКОВІЧ Васіль Яўхімавіч (2 чалавекі)
БЕРДНІКОВІЧ Даніл Яўхімавіч (3 чалавекі)
БЕРДНІКОВІЧ Іван Яўхімавіч (3 чалавекі)
БУЙКА Васіль Якаўлевіч (5 чалавек)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Агрыпіна Пятроўна (6 чалавек)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Ганна Сямёнаўна (6 чалавек)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Праскоўя Раманаўна (2 чалавекі)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Надзея
ЖУРАЎЛЕВІЧ Міхаіл Мацвеевіч (4 чалавекі)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Дар'я
ЖУРАЎЛЕВІЧ Соф'я Андрэеўна (3 чалавекі)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Ганна Пятроўна (4 чалавекі)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Аўронія Кузмінічна (5 чалавек)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Лявон (5 чалавек)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Адам (6 чалавек)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Праскоўя Рыгораўна (2 чалавекі)
МІРАНОВІЧ Пелагея (5 чалавек)
КУДЗЕЛЬКА Пётр Зіноўевіч (2 чалавекі)

* Так у дакументе. 6 сакавіка 1943 г. у Дзякавічах загінуў 651 чалавек.

КУДЗЕЛЬКА Фёдар Мінавіч (5 чалавек)
КУДЗЕЛЬКА Надзея Мікалаеўна
КУДЗЕЛЬКА Міхаіл Навумавіч (7 чалавек)
КУДЗЕЛЬКА Васіль Мінавіч (2 чалавекі)
КУДЗЕЛЬКА Стэпа Пятроўна (3 чалавекі)
КУДЗЕЛЬКА Праскоўя Іванаўна
РАГАЛЕВІЧ Клаўдзія Васільеўна (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Дзмітрый Фёдаравіч (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Іван Фёдаравіч (4 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Арына (7 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Якаў Рыгоравіч (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Ермалай Дзмітрыевіч (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Арына Якаўлеўна (6 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Праскоўя Іванаўна (4 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Павел (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Сямён Васільевіч (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Матруна (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Праскоўя Фёдараўна (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Іван Фёдаравіч (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Аляксей Емяльянавіч (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Фёдар (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Матруна Барысаўна
РАГАЛЕВІЧ Каленік Аляксеевіч (7 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Ганна Міхайлаўна (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Грыпіна Іванаўна (6 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Сяргей Дзмітрыевіч (7 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Гардзей (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Аўдоцця Фёдараўна (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Таццяна Якаўлеўна (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Фёдар Васільевіч (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Мікалай Іванавіч (7 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Ганна Рыгораўна
РАГАЛЕВІЧ Хрысціна Аляксееўна (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Фёдар Цітавіч (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Арцём (6 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Сцепаніда (3 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Марыя (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Варвара
РАГАЛЕВІЧ Анастасія Міхайлаўна
РАГАЛЕВІЧ Ганна Цімафееўна (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Мірон Фёдаравіч (4 чалавекі)
ЧЭРКАС Мікалай Фёдаравіч (5 чалавек)
ЧЭРКАС Мікалай Апанасавіч (2 чалавекі)
ЧЭРКАС Вольга Ігнатаўна (4 чалавекі)
ЧЭРКАС Праскоўя Іванаўна (4 чалавекі)
ЧЭРКАС Праскоўя Антонаўна (10 чалавек)
ЧЭРКАС Пётр Яўхімавіч (4 чалавекі)
ЧЭРКАС Піліп Міхайлавіч (6 чалавек)
ЧЭРКАС Праскоўя Пятроўна (6 чалавек)
ЧЭРКАС Ганна (5 чалавек)
ЧЭРКАС Аляксей Мікалаевіч (2 чалавекі)
ЧЭРКАС Міхаіл Міхайлавіч (6 чалавек)
ЧЭРКАС Канстанцін Апанасавіч (2 чалавекі)
ЧЭРКАС Ганна Рыгораўна (3 чалавекі)
ЧЭРКАС Фёдар Рыгоравіч (6 чалавек)
ЧЭРКАС Іосіф (6 чалавек)
ЧЭРКАС Ганна (5 чалавек)
ЧЭРКАС Кацярына Фёдараўна (3 чалавекі)
ЧЭРКАСАнуфрый Міхайлавіч (2 чалавекі)
ЧЭРКАС Хрысціна Гардзееўна (5 чалавек)
ЧЭРКАС Матруна Ляонцьеўна (2 чалавекі)
ЧЭРКАС Арына Пятроўна (5 чалавек)
ЧЭРКАС Аляксандр Мікітавіч (2 чалавекі)
ЧЭРКАС Іван (6 чалавек)
ЧЭРКАС Аксіння Герасімаўна (5 чалавек)
ЧЭРКАС Раман (2 чалавекі)
ЧЭРКАС Ганна Кандрацьеўна
ЧЭРКАС Надзея (4 чалавекі)
ЧЭРКАСАнуфрый Міхайлавіч

У 1941 г. у Жыткавічах пакараны смерцю жыхары в. Дзякавічы за сувязь з партызанамі і ўдзел у партызанскім руху:

КУДЗЕЛЬКА Фёдар Мініч (1893 г.)
КУДЗЕЛЬКА Сямён Фёдаравіч (1918 г.)
НЕРОНСКАЯ Хося (1906 г.)
НЕРОНСКІ Гірш (1933 г.)
РАГАЛЕВІЧ Антон Міхайлавіч (1909 г.)
РАГАЛЕВІЧ Аляксей Якаўлевіч (1925 г.)
РАГАЛЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч (1911 г.)
ЧЭРКАС Любоў Яўхімаўна (1905 г.)
ЧАРНАГАЛОЎ Міхаіл Сямёнавіч (1893 г.)
ШЫЛЬКРЭТ Еха (1875 г.)

У 1943 г. на станцыі Кацэвічы расстраляны жыхары в. Дзякавічы як партызанскія сем'і:

ЖУРАЎЛЕВІЧ Яўтенія Васільеўна (1918 г.)

ЖУРАЎЛЕВІЧ Таццяна Васільеўна (1940 г.)
ЧЭРКАС Ганна Якаўлеўна (1930 г.)
ЧЭРКАС Міхаіл Якаўлевіч (1933 г.)
ЧЭРКАС Ульяна Іванаўна (1912 г.)
ЧЭРКАС Лідзія Піліпаўна (1933 г.)
ЧЭРКАС Паўліна Піліпаўна (1936 г.)
ЧЭРКАС Уладзімір Піліпавіч (1939 г.)
ЧЭРКАС Міхаіл Піліпавіч (1939 г.)
ЧЭРКАС Васіль Піліпавіч (1941 г.)

У 1944 г. у час блакады расстраляны жыхары в. Дзякавічы ва ўрочышчах Смолнава, Слідзіха, Каноплішчы:

БЕРДНІКОВІЧ Домна Данілаўна (1922 г.)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Аляксандр Фёдаравіч (1940 г.)
КАКОЦКІ Адам Міхайлавіч (1912 г.)
КУДЗЕЛЬКА Вольга Іванаўна (1937 г.)
КУДЗЕЛЬКА Усціна Фёдараўна (1910 г.)
КУДЗЕЛЬКА Паўліна Пятроўна (1937 г.)
КУДЗЕЛЬКА Алена (1892 г.)
РАГАЛЕВІЧ Іосіф Рыгоравіч (1899 г.)
РАГАЛЕВІЧ Ганна Іванаўна (1908 г.)
ЧЭРКАС Арына Фёдараўна (1929 г.)
ЧЭРКАС Усціна Паўлаўна (1919 г.)

У 1944 г. вывезены на ст. Старушкі, расстраляны і кінуты ў стары калодзеж жыхары в. Дзякавічы:

ВАСІЛЕНКА Ніна Міхайлаўна (1941 г.)
ВАСІЛЕНКА Уладзімір Міхайлавіч (1941 г.)
ВАСІЛЕНКА Максім Андрэевіч (1932 г.)
ВАСІЛЕНКА Генадзь Андрэевіч (1938 г.)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Ніна Іванаўна (1940 г.)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Георгій Мікалаевіч (1939 г.)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Вольга Цітаўна (1941 г.)
ПРАЦЭНКА Уладзімір Сямёнавіч (1939 г.)
РАГАЛЕВІЧ Валянціна Пятроўна (1939 г.)
ЧЭРКАС Марыя Максімаўна (1894 г.)
ЧЭРКАС Іван Карпавіч (1888 г.)

ВЁСКА БУДА

7 сакавіка 1943 г. былі вывезены ў в. Вятчын і спалены ў памяшканні лясніцтва:

АГІЕВІЧ Мікалай Пятровіч
АГІЕВІЧ Ганна
АГІЕВІЧ Іван Пятровіч
АГІЕВІЧ Надзея Пятроўна
АГІЕВІЧ Іосіф Пятровіч
АГІЕВІЧ Таццяна Парфёнаўна
БАРТАШЭВІЧ Фаня
БЕЛАГАЛОВІК Паўліна
БЕЛАГАЛОВІК Іван Іванавіч (6 чалавек)
БЕЛАГАЛОВІК Вольга (6 чалавек)
БАРТАШЭВІЧ Соф'я
БУЯКЕВІЧ Лідзія Піліпаўна
ВАЛЫНЕЦ Рыгор
ДУБОЎСКАЯ Соф'я (2 чалавекі)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Марк Адамавіч (3 чалавекі)
КАВАЛЕНЯ Фёдар Іванавіч (2 чалавекі)
КАВАЛЕНЯ Марыя Аляксееўна (4 чалавекі)
КАВАЛЕНЯ Агаф'я Сямёнаўна
КАЗЛОЎСКІ Іосіф (8 чалавек)
КАЗЛОЎСКІ Аўгусцін Адамавіч (4 чалавекі)
КАЗЛОЎСКІ Аўгусцін Іванавіч
КАЗЛОЎСКІ Іван Аўгусцінавіч
КАЗЛОЎСКАЯ Лідзія Аўгусцінаўна
КАЗЛОЎСКАЯ Альвіна
КАЗЛОЎСКАЯ Міхаліна Іосіфаўна
КАЗЛОЎСКІ Сігізмунд Іосіфавіч
КАЗЛОЎСКІ Станіслаў
КАЗЛОЎСКАЯ Сцепаніда
КАЗЛОЎСКАЯ Люся
КАЗЛОЎСКІ Адам
КАВАЛЕНЯ Марыя Аляксандраўна
КАВАЛЕНЯ Вольга Уладзіміраўна
КАВАЛЕНЯ Уладзімір Міхайлавіч
КАВАЛЕНЯ Павел Васільевіч
КАВАЛЕНЯ Надзея
КАВАЛЕНЯ Міхаіл Васільевіч
КАВАЛЕНЯ Іван Васільевіч
КРАСНІЦКІ Пётр
КОРЗУН Ганна Ануфрыеўна
КОРЗУН Браніслава Францаўна
КОРЗУН Рамуальд Францавіч
КОРЗУН Валянцін Францавіч
ЛУЧЫНОВІЧ Вольга
ЛУЧЫНОВІЧ Валянціна Уладзіміраўна (2 чалавекі)
ЛУЧЫНОВІЧ Павел Дзімітрыевіч (5 чалавек)
ЛАГУН Анастасія Фёдараўна (5 чалавек)
МАЖЭЙКА Антон
МАЖЭЙКА Настасся (5 чалавек)
ПАПКО Аляксандра
ПУЗЕВІЧ Міхаіл Арцёмавіч (2 чалавекі)
ПУЗЕВІЧ Альбіна Данілаўна
ПУЗЕВІЧ Арына
РАГАЛЕВІЧ Настасся Максімаўна (5 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Мікалай Адамавіч (2 чалавекі)
РАГАЛЕВІЧ Надзея Фёдараўна (7 чалавек)
РАГАЛЕВІЧ Надзея Савельеўна
РАГАЛЕВІЧ Ульяна Васільеўна (4 чалавекі)
РАМАНОВІЧ Вольга Уладзіміраўна (3 чалавекі)

РАМАНОВІЧ Тамара Уладзіміраўна
РАМАНОВІЧ Валянціна Уладзіміраўна
РАМАНОВІЧ Вольга Уладзіміраўна
РАМАНОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч
РАМАНОВІЧ Марыя Міхайлаўна
РАМАНОВІЧ Роза Міхайлаўна (4 чалавекі)
РАМАНОВІЧ Сабіна (4 чалавекі)
РУБІС Ганна Максімаўна (2 чалавекі)
РУБІС Марыя Піліпаўна (2 чалавекі)
РУБІС Уладзімір Сямёнавіч (2 чалавекі)
РЭМЕЗ Адам Паўлавіч (2 чалавекі)
РЭХЦІК Паўліна Міхайлаўна (6 чалавек)
РЭХЦІК Васіль
СУДНІК Вінцюс Антонавіч (3 чалавекі)
СУДНІК Вікторыя Антонаўна (3 чалавекі)
СУДНІК Адольф (3 чалавекі)
СЛЕСАРЭВІЧ Адольф (3 чалавекі)
СУДНІК Тэрэза (5 чалавек)
ЧЭРКАС Міхаіл Аляксеевіч (10 чалавек)
ЧЭРКАС Антаніна Карпаўна
ЧЭРКАС Хрысціна
ШАУР Альберціна
ФІНЬКО Соф'я Карлаўна (4 чалавекі)
ФІНЬКО Вольга
ФІНЬКО Ягор (3 чалавекі)
ЮХНЕВІЧ Арына Іванаўна (8 чалавек)
ЯРМОЛІНСКІ Савацей (2 чалавека)
ЯРМОЛІНСКАЯ Амілія (2 чалавекі)
ЯРМОЛІНСКАЯ Марыя (2 чалавекі)
ЯРМОЛІНСКАЯ Сабіна Карлаўна (2 чалавекі)
ЯРМОЛІНСКАЯ Ганна
ЯРМОЛІНСКАЯ Ванда (2 чалавекі)
ЯРМОЛІНСКАЯ Ганна (2 чалавекі)

ВЁСКА ВЯТЧЫН

АКСЁНЧЫК Леанід Іосіфавіч (1912 г.)
АКСЁНЧЫК Вольга Рыгораўна (1916 г.)
АКСЁНЧЫК Яўгенія Лявонаўна (1938 г.)
АКСЁНЧЫК Аўдоцця Паўлаўна (1880 г.)
АКСЁНЧЫК Надзея Фёдараўна (1940 г.)
АКСЁНЧЫК Іван Піліпавіч (1926 г.)
АСІПЕНКА Мікалай Іванавіч (1908 г.)
АСІПЕНКА Мікалай Дзмітрыевіч (1938 г.)
АСІПЕНКА Марыя Дзмітрыеўна (1941 г.)
АСІПЕНКА Міхаіл Дзмітрыевіч (1938 г.)
АСІПЕНКА Параска Рыгораўна (1889 г.)
АСІПЕНКА Валерый Нічыпаравіч (1924 г.)
БАНДАРЭВІЧ Валянціна Данілаўна (1926 г.)
БУЯКЕВІЧ Цімох Міхайлавіч (1874 г.)
БУЯКЕВІЧ Ульяна Цімафееўна (1913 г.)
БУЯКЕВІЧ Адам Максімавіч (1874 г.)



Помнік вяскоўцам у в. Вятчын, закатаваным фашысцкімі вылюдкамі ў сакавіку 1943 г.

БУЯКЕВІЧ Еўдакія Мікітаўна (1878 г.)
БУЯКЕВІЧ Міхаіл Мацвеевіч (1937 г.)
БУЯКЕВІЧ Аўронія Іванаўна (1890 г.)
БУЯКЕВІЧ Вольга Ігнатаўна (1940 г.)
БУЯКЕВІЧ Алеся Мікалаеўна (1924 г.)
БУЯКЕВІЧ Лідзія Піліпаўна (1935 г.)
БУЯКЕВІЧ Марыя Піліпаўна (1913 г.)
БУЯКЕВІЧ Яўгенія Сямёнаўна (1940 г.)
БУЯКЕВІЧ Кацярына Іванаўна (1870 г.)
БУЙКО Віктар Навумавіч (1938 г.)
ВАРАБЕЙ Трафім Рыгоравіч (1882 г.)
ВАРАБЕЙ Еўдакія Кандрацьеўна (1890 г.)
ВАРАБЕЙ Мікалай Трафімавіч (1904 г.)
ВАРАБЕЙ Марыя Іванаўна (1895 г.)
ГАЎРЫЛОВІЧ Максім Ігнатавіч (1890 г.)
ГАЎРЫЛОВІЧ Павел Іванавіч (1880 г.)
ГАЎРЫЛОВІЧ Еўдакія Дзям'янаўна (1860 г.)
ГАЎРЫЛОВІЧ Міхаіл Савіч (1870 г.)
ГАЎРЫЛОВІЧ Агаф'я (1870 г.)
ГАЎРЫЛОВІЧ Фёдар (1938 г.)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Фядора (1936 г.)
ЖУРАЎЛЕВІЧ Фёдар Мікалаевіч (1866 г.)
КАСАБУЦКАЯ Валянціна Міхайлаўна (1914 г.)

КАСАБУЦКІ Сяргей Цімафеевіч (1932 г.)
КАСАБУЦКІ Анатоль Цімафеевіч (1942 г.)
КАСАБУЦКІ Пётр Цімафеевіч (1890 г.)
КАСАБУЦКАЯ Матруна Якімаўна (1909 г.)
КАСАБУЦКІ Міхаіл Пятровіч (1926 г.)
КАСАБУЦКІ Мікалай Пятровіч (1929 г.)
КАСАБУЦКАЯ Алена Пятроўна (1931 г.)
КАСАБУЦКАЯ Валянціна Пятроўна 1933 г.)
КАСАБУЦКАЯ Лідзія Мікалаеўна (1939 г.)
КАСАБУЦКІ Адам Дзмітрыевіч (1872 г.)
КАСАБУЦКІ Уладзімір Адамавіч (1912 г.)
КАСАБУЦКАЯ Таццяна Іванаўна (1880 г.)
ЛЬВОВІЧ Іосіф Беркавіч (1880 г.)
ЛЬВОВІЧ Голда Хаімаўна (1880 г.)
МІРАНОВІЧ Іосіф Яўхімавіч (1905 г.)
МІРАНОВІЧ Алеся Маркаўна (1893 г.)
МІРАНОВІЧ Алёна Пятроўна (1929 г.)
МІРАНОВІЧ Аляксей Гаўрылавіч (1882 г.)
МІРАНОВІЧ Аўроння (1870 г.)
МІРАНОВІЧ Фёдар Пятровіч (1910 г.)
МІРАНОВІЧ Алёна Сямёнаўна (1932 г.)
МІРАНОВІЧ Павел Антонавіч (1880 г.)
МІРАНОВІЧ Надзея Фёдараўна (1940 г.)
ПАПКО Андрэй Макаравіч (1911 г.)
ПАПКО Вольга Данілаўна (1922 г.)
ПАПКО Андрэй Максімавіч (1874 г.)
СТАХІЕВІЧ Аўроння Васільеўна (1880 г.)
ФЯДОСАЎ Сцяпан Іванавіч (1890 г.)
ФЯДОСАЎ Леанід Паўлавіч (1884 г.)
ЦВІРКО Сяргей Іванавіч (1893 г.)
ШКРЭБЛІК Іосіф Яўхімавіч (1902 г.)
ШКРЭБЛІК Міхаіл Мікітавіч (1904 г.)
ШКРЭБЛІК Яўхім'я Тарасаўна (1901 г.)
ШКРЭБЛІК Іван Міхайлавіч (1938 г.)
ШКРЭБЛІК Марыя Максімаўна (1920 г.)
ШЧУР Кірэй Пятровіч (1879 г.)
ЧЭРКАС Іван Цітавіч (1903 г.)
ЧЭРКАС Алёна Іванаўна (1907 г.)
ЧЭРКАС Васіль Іванавіч (1926 г.)
ЧЭРКАС Лідзія Іванаўна (1932 г.)
ЧЭРКАС Яўгенія Іванаўна (1930 г.)

АКТ 1944 г. 15 снежня

Мы, што ніжэй падпісаліся, камісія Вятчынскага с/савета, члены камісіі Бандарэвіч Д. Я., Шчур Ульяна, Івінскі В. С., Мірановіч і Буякевіч, склалі акт аб тым, што з пачатку вайны 1941 г. да прыходу Чырвонай Арміі 6 ліпеня 1944 г. нямецкімі варварамі знішчана людзей в. Вятчын:

ГАНАБАРОЦЬКА Ганна Раманаўна, н. у 1920 г.

КОДАРАЎ Рыгор Іларыёнавіч, н. у 1908 г.

КАРШУНОЎ Іван Васільевіч, н. у 1918 г.

ЛІФАНАЎ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1921 г.

МАКАРЫН М. А.

МАЛЧАНАЎ Іван Васільевіч, н. у 1925 г.

ПАДГОРНЫ Мікалай Лявонцьевіч, н. у 1912 г.

Магіла партызан у в. Пухавічы, якія загінулі на возеры Чырвонае зімой 1943 г.

РЫЖКОЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1922 г.

* * *

ІВАНОВА Зоя Ягораўна, н. у г. Іванава Маскоўскай вобл., разведчыца, загінула у 1942 г. каля в. Навуць.

ВЁСКА РЫЧОЎ

АХМЕДШЫН Султан, загінуў 1.7.1944 г.

АДЗІНОКАЎ Фёдар Іванавіч, загінуў 3.7.1944 г.

БАРЫСЕНКА Раман Іванавіч, загінуў 1.7.1944 г.

БЫКАЎ Маркел Аляксандравіч, н. у 1901 г., загінуў 2.7.1944 г.

ВАСЬКО Адам Астапавіч, загінуў 3.7. 1944 г.

ВЯРЭНІЧ Лук'ян Іванавіч, загінуў 2.7. 1944 г.

ВАЛАЎ Мікалай Паўлавіч, загінуў 1.7. 1944 г.

ВАРОНІН Аляксандр Іванавіч, загінуў 4.7.1944 г.

ВАРОНІН Фёдар Дзмітрыевіч, загінуў 25.11.1943 г.

ГЕРАШЧАНКА Іван Мацвеевіч, н. у 1925 г.

ГЛЕБАЎ Васіль Мітрафанавіч, загінуў 4.7.1944 г.

ГАНЧАРЭНКА Клім Сцяпанавіч, загінуў 30.6.1944 г.

ГАРДЗІЕНКА Аляксандр, загінуў у 1944 г.

ГЕРАШЧАНКА Дзмітрый Адамавіч, н. у 1906 г., загінуў 2.7.1944 г.

ЖУРАЎСКІ Герасім Мікалаевіч, загінуў 1.7.1944 г.

ЗАРЭЦКІ Іван Антонавіч, загінуў 1.7. 1944 г.

ЗМУШКА Пётр Кандрацьевіч, загінуў 2.7.1944 г.

ІЛЬЯШ Пётр Аляксандравіч, загінуў 1.7.1944 г.

КАЎКРАК Павел Харытонавіч, загінуў 3.7.1944 г.

КОЛБІК Міхаіл Барысавіч, н. у 1923 г.

КАЛЕСНІК Якаў Аляксеевіч, загінуў 3.7.1944 г.

КАРАЛЁЎ Павел Пятровіч, загінуў 30.6. 1944 г.

КАСЦЯКОЎ Іван Свірыдавіч, н. у 1899 г., загінуў 1.7.1944 г.

КАЧАРГІН Канстанцін Васільевіч, загінуў 4.7.1944 г.

КУЗНЯЦОЎ Іван Фёдаравіч, загінуў 4.7.1944 г.

ЛАТКІН Міхаіл Міхайлавіч, загінуў 30.7.1944 г.

МАКАРАНКА Міхаіл Мацвеевіч, загінуў 1.7.1944 г.

МАСКАЛЕНКА Іван Кузьміч, загінуў 7.7.1944 г.

МУСОЕЎ Саліхман Авязьевіч, загінуў 1.7.1944 г.

НОСЕЛЬ Віктар Аляксеевіч, н. у 1924 г., загінуў 10.6.1943 г.

НЕСЦЕРАЎ Аляксей Сямёнавіч, загінуў у чэрвені 1944 г.

ПАЛЯНІЧАНКА Аляксандр Паўлавіч, загінуў 2.7.1944 г.

ПАЛЯКОЎ Афанасій Дзмітрыевіч, загінуў у чэрвені 1944 г.

РАГАВЕЦ Рыгор Афанасьевіч, загінуў 3.7.1944 г.

РЫХМАН Моўша, загінуў у ліпені 1944 г.

САПОЖНІКАЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1918 г., загінуў 1.7.1944 г.

САЛАМАХІН Дзмітрый Кузьміч

СТРАХАЎ Барыс Мікалаевіч

СТРАЛКОЎ Рыгор Антонавіч, загінуў 4.7.1944 г.

СУХАЎ Павел Рыгоравіч, загінуў 7.7. 1944 г.

СЯЧЫН Сяргей Ільіч, загінуў 1.7.1944 г.

ТРОШКА Карп Андрэевіч, загінуў 2.7. 1944 г.

ТУПІЦКІ Уладзімір Гаўрылавіч, загінуў 2.7.1944 г.

ТУПІЦКІ Васіль Гаўрылавіч

УДАВЕНКА Мікалай Кузьміч, загінуў 1.6.1944 г.

ХОРЫН Васіль Ільіч, загінуў 3.7. 1944 г.

ЧОТКІН Іван Ігнацьевіч, загінуў 1.7. 1944 г.

ШАБУШЫН Пётр Карпавіч, загінуў 1.7.1944 г.

ШЫШАЕЎ Міхаіл Аляксеевіч, загінуў 27.6.1944 г.

ГОРАД ТУРАЎ І ТУРАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

АБУХАЎ Іван Іванавіч, ст. лейтэнант.

АГАФОНАЎ Аляксей Іванавіч, н. у 1925 г., рад., загінуў 26.11.1943 г.

АГЕБІЯ Іон Паўлавіч, рад.

АВЕРЫН, мал. лейтэнант.

АНФЁРАЎ Васіль Сямёнавіч, рад., загінуў у красавіку 1944 г.

АЛЕКСІЕВІЧ І. Ф.

АЛІЕЎ Цеймур Малідавіч, рад., загінуў 9.7.1944 г.

АЛІМПІЕЎ Ягор Арыёнавіч, загінуў 7.7.1944 г.

АЛЯКСЕЕЎ Сцяпан Іванавіч.

АНТАНЮК Дзям'ян Пятровіч.

АНТОНЕНКА Іван Трафімавіч, рад., загінуў 3.7.1944 г. Перапахаваны з вёскі Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

АФАНЯГІН Сяргей Пятровіч, рад., загінуў 23.12.1943 г. Перапахаваны з в. Княжацкая Слабада Лельчыцкага р.

БАЙКОЎСКІ Макар Цімафеевіч, рад.

БАРШЫН Мікалай Канстанцінавіч, ст. лейтэнант, загінуў 8.2.1944 г.

БАРЫНАЎ Сяргей Аляксеевіч, рад., загінуў 4.7.1944 г.

БЕЙ Васіль Пятровіч, рад., загінуў 6.7. 1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

БЕКБУЛАТАЎ Абдухадыр, рад., загінуў 30.1.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

БЕРЫЯ Габрыя Арызеевіч, рад., загінуў 30.7.1944 г.

БЕЛАВЕЦКІ Барыс Мікалаевіч, партызан, загінуў у 1942 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

БЛАБЕНКА Іван Ерамеевіч.

БОЙКА Пётр Кузьміч, рад., загінуў 4.7.1944 г.

БРЫЦІК Максім Сяргеевіч, рад., загінуў у красавіку 1944 г.

БЯЛОЎ Сцяпан Георгіевіч.

БЯРКЕНАЎ Абдуламан.

ВАРАБ'ЁЎ Віктар Трафімавіч.

ВАРАКІН Іван Захаравіч, сяржант, загінуў 26.4.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ВАРФАЛАМЕЕЎ Іван Васільевіч.

ВІДАЗАЛАШВІЛІ Міхаіл Ягоравіч, рад., загінуў 3.7.1944 г.

ВЯРЭМЕНКА Сцяпан Ільіч, рад., загінуў 19.5.1944 г.

ГАЛАВІН Павел Аляксандравіч, рад., загінуў 29.11.1943 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ГАРБАЧОЎ Павел Іванавіч.

ГАРШКОЎ Мікалай Міхайлавіч, рад., загінуў 3.7.1944 г.

ГЛЮЗ Павел Міхайлавіч, загінуў 26.3. 1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ГОШКА Ануфрый Пятровіч.

ГРУЗДЗЕЎ Рыгор Іванавіч, рад., н. у 1923 г., загінуў 22.6.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ГРАБЕННІКАЎ Аляксей Яфімавіч, сяржант, загінуў 16.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ДАДЫШАЎ Юрый Абдулаевіч, сяржант, загінуў у красавіку 1944 г.

ДВОРАК Сцяпан Аляксандравіч, рад., загінуў 1.7.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

Я. А. Алімпіеў

І. З. Варакін

А. Я. Грабеннікаў

С. А. Дворак

ДЖАБАРАЎ Мусін, рад., загінуў 21.2. 1944 г.

ДУБЯНСКІ Пётр Андрэевіч, рад., загінуў 3.7.1944 г.

ДУЛУБ Іван Дзям'янавіч, рад., загінуў 29.5.1944 г.

ДЗЯТЛОЎСКІ Маісей Іванавіч, рад., загінуў 4.7.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ЖБАНКОЎ Георгій Аляксеевіч, капітан, загінуў 6.4.1944 г.

ЖОРЫН Андрэй Андрэевіч, рад., загінуў 3.7.1944 г.

ЖЫЛЬСКІ Марк Міхайлавіч, рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЗАХОДЗІН Аляксандр Фёдаравіч, рад., загінуў 13.2.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ЗІНОЎЕЎ Дзмітрый Іванавіч, загінуў у красавіку 1944 г.

ЗІРАНІН Іван Лявонцьевіч.

ЗЯЛЁНСКІ Даніл Фёдаравіч, капітан, загінуў 30.6.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ІВАНОЎ Якаў Якаўлевіч.

ІЁЎЧЫК Даніла Фёдаравіч, рад., загінуў 6.7.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ШТАМАЎ І. О.

КАПІЦА Іван Іванавіч, н. у 1923 г., рад., загінуў 13.4.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

КАСАНАЎ Ісаак Алімпіевіч, н. у 1898 г., рад., загінуў 13.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

КАЦІН Мікалай.

КАШЭНІН Іван Іванавіч, сяржант.

КЕЛХЛОРАЎ Кардаш Мусілавіч, рад., загінуў 2.7.1944 г.

КІРЫЛАЎ Васіль Рыгоравіч, лейтэнант, загінуў 3.4.1944 г.

КІТАЕЎ Васіль Якаўлевіч.

КУЗНЯЦОЎ Аляксандр Ціханавіч, сяржант.

КУЗЬМЯНОК Адам Герасімавіч, рад., загінуў 3.7.1944 г.

КУЛАГІН Мікалай Фёдаравіч, н. у 1915 г., рад., загінуў 11.2.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

КУЛІПАНАЎ Фёдар Дзмітрыевіч, н. у 1923 г., загінуў 22.4.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

КРАСНАЖОН Фёдар Іосіфавіч, рад., загінуў 30.6.1944 г.

ЛЕБЕДЗЕЎ Іван Андрэевіч, сяржант.

ЛІЗУН Васіль Цімафеевіч, н. у 1919 г., рад., загінуў 16.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ЛІТВІНЕНКА Цімафей Аляксеевіч, рад., загінуў 1.7.1944 г.

ЛІШГАН Васіль Андрэевіч, рад., загінуў 30.6.1944 г.

ЛЯГІН Пётр Канстанцінавіч, н. у 1907 г., рад., загінуў 2.2.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ЛЯОНАЎ Уладзімір Пятровіч, рад.

МАЖАРЫН Пётр Цімафеевіч, рад., загінуў 2.7.1944 г.

МАКАРЭВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, загінуў у красавіку 1944 г.

МАРТЫНЕНКА Дзмітрый Апанасавіч, рад., загінуў 28.5.1944 г.

МАХНЫДАЎ Дзмітрый.

МАЧАЛОЎ Сяргей Сямёнавіч, сяржант.

МІХАЙЛАЎ Аляксандр Васільевіч, н. у 1910 г., ст. лейтэнант, загінуў 8.2.1944 г.

МІХАЛЕНКА Васіль Мікалаевіч, рад.

НАВІНКА Трафім Трафімавіч, рад., загінуў 4.7.1944 г.

ОЛДАШ Уладзімір Сцяпанавіч, рад., загінуў 6.7.1944 г.

ПАДАБЕД Мікалай Уладзіміравіч, рад., загінуў 4.2.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ПАНАМАРЭНКА Дарафей Іванавіч, рад., загінуў 13.5.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ПОЛАЗАЎ Рыгор Фёдаравіч, сяржант, загінуў 15.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ПУГАЧОЎ Навум Уладзіміравіч, н. у



М. Ф. Кулагін

І. А. Раманоўскі

М. Г. Сомаў

М. Я. Старыкаў

1923 г., рад., загінуў 31.1.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ПУГАЧ Рыгор Паўлавіч, н. у 1902 г., капітан, загінуў 28.4.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

РАЗУВАЕЎ Іван Васільевіч, загінуў 3.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

РАМАНОЎСКІ Іван Аксёнавіч, рад., загінуў 31.1.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

РАК Яфім Лук'янавіч, рад., загінуў 28.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

САЛДАТАЎ Сахтула, сяржант, загінуў 31.1.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

САЛЬНІКАЎ Апанас Васільевіч, сяржант.

СВЯРДЛОЎСКІ Аляксандр Рыгоравіч, мал. лейтэнант, загінуў 5.4.1944 г.

СІМАКОЎ Васіль Рыгоравіч, ст. лейтэнант, загінуў 19.3.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

СІМАНАЎ Іван Васільевіч, сяржант, загінуў 3.2.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

СІТАЎ Шаміль Сейтавіч, ст. лейтэнант, загінуў 30.6.1944 г.

СОМАЎ Міхаіл Георгіевіч, н. у 1902 г. ст. лейтэнант, загінуў 23.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

СТАРЫКАЎ Мікалай Яфімавіч, сяржант, загінуў 30.6.1944 г.

СУЛЕЙМАНАЎ Алігайда, рад.

СУСЕНІН Якаў Аляксеевіч, н. у 1914 г., сяржант, загінуў 18.2.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

СЦЯПАНАЎ Рыгор Сямёнавіч, сяржант, загінуў у красавіку 1944 г.

СЫЗІН Іван Аксенцьевіч, сяржант, загінуў 30.6.1944 г.

СЯМЁНАЎ Васіль Пятровіч, ст. лейтэнант, загінуў 4.4.1944 г.

СЯРОЎ Уладзімір Іванавіч, мал. лейтэнант, загінуў 3.4.1944 г.

ТРАЦЦЯК Фёдар Андрэевіч, рад., загінуў 1.7.1944 г.

ТРАНЕНКА Сямён Анісімавіч, рад., загінуў у маі 1944 г.

ТУРЖЫКНЕЛІ Анісім.

ЦІМОШЧАНКА Васіль Паўлавіч, рад., загінуў 8.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ЦЮРЫКАЎ Ягор Іванавіч, старшына, загінуў 5.7.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ТАМІЛКА Уладзімір Пятровіч, рад., загінуў 12.1.1944 г.

ТКАЧОЎ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1923 г., рад., загінуў 4.2.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ТУРНІЯЗАЎ Іса, н. у 1920 г., рад., загінуў 31.1.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ТУШЫНСКІ Рыгор Сямёнавіч, рад., загінуў 4.2.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

УВАРАЎ Павел Максімавіч.

УКРАІНЕЦ Мікалай Пятровіч, н. у 1924 г., сяржант, загінуў 1.7.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

УСАЧОЎ Іван Раманавіч, рад., загінуў 24.4.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

УСЬКОЎ Дзмітрый Васільевіч.

ФЕДУЛАЕЎ Аляксандр Мікалаевіч.

ФЯДОТАЎ Васіль Сямёнавіч, н. у 1900 г., загінуў 2.7.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ХАЕЎСКІ Самуіл Зіноўевіч, капітан, загінуў 30.6.1944 г.

ХВАСТОЎ Рыгор Ціханавіч, маёр, загінуў 5.4.1944 г.

ХРАМЦОЎ Іван Міхайлавіч, рад., загінуў 24.10.1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ЦЫПЛУХІН Уладзімір Сцяпанавіч, загінуў 16.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ЧАПУРНЫ Пётр Іванавіч, загінуў 19.2. 1944 г. Перапахаваны з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ЧАРАНКЕВІЧ Мікалай Канстанцінавіч, лейтэнант, загінуў 30.6.1944 г. Перапахаваны



Я. А. Сусенін
І. А. Сызін
М. І. Ткачоў

з в. Іванава Слабада Лельчыцкага р.

ЧАРНЯЎСКІ Іван Дзям'янавіч, рад., загінуў 26.6.1944 г.

ЧМЕЛЬ Іван Іванавіч, старшына, загінуў 12.1.1944 г.

ШАЎЧЭНКА Рыгор Радзівонавіч, сяржант.

ШАШНІН Мадаш Агандавіч.

ШУЛЬГА Рыгор Сямёнавіч, рад., загінуў 17.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ШЫНВІН Васіль Мацвеевіч, сяржант.

ШЧЫНІН Васіль Мацвеевіч, сяржант, загінуў 15.4.1944 г. Перапахаваны з в. Сіманавіцкі Млынок Лельчыцкага р.

ЮХНЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, рад., загінуў 26.6.1944 г.

ВЁСКА ВЕРАСНІЦА

ГУБІКАЎ Леанід.

ГАЛІУЛІН Раскат Імамутдзінавіч, н. у с. Кузяк Бузаўязскага р., Башкірыя. Загінуў 26.6.1944 г.

ПЕРАСУНЬКА А. С., старшына, начальнік пагранічнай заставы ў Верасніцы, загінуў у ліпені 1941 г.

ЧАРНУХА Мікалай Паўлавіч, н. у 1923 г. у с. Людвінавічы Кралевіцкага раёна Сумскай вобл. Загінуў 24.12.1942 г.

ШАМІШ Міхаіл, партызан.

Шэсць чалавек невядомых.

ВЁСКА ВІЛЬЧА

ВОЛАХАЎ Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1915 г. на ст. Карыноўская Краснадарскага краю. Прызваны Варашылаўградскім РВК у 1936 г., матрос Дняпроўскай ваеннай флатыліі, загінуў 8.7.1944 г. у баі каля вусця р. Случ.

ПАНЬКІН Дзмітрый Антонавіч, н. у 1913 г. Прызваны Тарбееўскім РВК Мардовіі, матрос Дняпроўскай ваеннай флатыліі, загінуў 8.7.1944 г. у баі каля вусця р. Случ.

Кароткі і жорсткі бой адбыўся паміж савецкім і фашысцкім катэрамі 8 ліпеня 1944 г. на Прыпяці, каля вусця Случы, калі Дняпроўская флатылія пасля вызвалення Турава накіроўвалася ў бок Пінска. Жыхары Вільчы чулі выбухі і кулямётныя чэргі, потым усё сціхла. А бліжэй да вечара ў вёску прыйшлі маракі. Папрасілі дошак, цвікоў, палатна. На высокім беразе Прыпяці пахавалі сваіх загінуўшых сяброў — воінаў



Магіла маракоў Дняпроўскай ваеннай флатыліі А. С. Волахава і Д. А. Панькіна ў в. Вільча

2-й брыгады рачных караблёў Дняпроўскай флатыліі. На магіле ўстанавілі сціплы драўляны абеліск. Просты надпіс — А. С. Волахаў, Д. А. Панькін. А потым удалося ўстанавіць месца нараджэння герояў, звязацца з роднымі.

Ішоў час, дажджы змылі надпіс. Рачнікі заўважылі, што вада падмывае бераг, магіла маракоў у небяспецы, ледзь прыкметны прозвішчы герояў. У 1969 г. вяскоўцы беражна перавезлі астанкі Волахава і Панькіна ў Вільчу і пахавалі іх на вясковых могілках. Пад цагляным абеліскам з Чырвонай зоркай ляжаць героі-маракі. Памяць людская захавала для нашчадкаў іх імёны.

М. А. Сарока

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

ЮРКЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

БЫКОЎСКІ Фёдар Васільевіч, р., загінуў 20.6.1942 г.

ГЕРМАН Казімір Іванавіч, н. у 1923 г., партызан, загінуў 17.2.1943 г.

ЗУЕЎ Аляксандр Іванавіч, н. у в. Яльсіціна Яраслаўскай вобл., сяржант, загінуў 26.6.1944 г.

КАЛАЧ Барыс Адамавіч, н. у в. Ястрэбля Ельскага р. Гомельскай вобл., партызан, загінуў 23.12.1942 г.

КОРБУТ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1923 г., партызан, загінуў 1.10.1943 г.

НІКІТАНАЎ Сяргей Піліпавіч, сяржант, загінуў 26.6.1944 г.

ПАШАЙ Іван Іванавіч, н. у г. Камсамольск Данецкай вобл., сяржант, загінуў 26.6.1944 г.

ПРОХАРАЎ Іван Паўлавіч, н. у 1923 г. у г. Саратаў, лейтэнант, загінуў 16.1.1944 г.

СЯМЁНАЎ Васіль Лявонцьевіч, ураджэнец в. Доўгае Старобінскага р. Мінскай вобл., сяржант, загінуў 31.7.1943 г.

СЕРЖАНТ Уладзімір Пятровіч, н. у 1910 г. у Калмыкіі, загінуў 26.6.1944 г.

Брацкая магіла воінаў Чырвонай Арміі і партызан у в. Юркевічы



Магілы партызан ва ўрочышчы Каланное

СМЫКАЎ Іван Іванавіч, рад., загінуў 31.7.1943 г.

ПАХАВАНЫ ВА ЎРОЧЫШЧЫ КАЛАННОЕ НА ТЭРЫТОРЫІ МІЛЕВІЦКАГА СЕЛЬСКАГА САВЕТА

БІРУЛЯ Сяргей Раманавіч, партызан, загінуў у 1943 г.

КРЫСАЎ Леанід, ваеннапалонны, загінуў у 1944 г.

СЦЯПАНАЎ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.

ТРАМБАЧОЎ, ваеннапалонны, загінуў у 1943 г.

ШАРАМЕТАЎ Уладзімір, н. у 1921 г., загінуў у разведцы ў 1943 г.

ВЁСКА ЛЮДЗЯНЕВІЧЫ

КАКАУЛІН Аляксандр Паўлавіч, н. у 1911 г. у Шабалінскім р. Кіраўскай вобл., сяржант, загінуў 21.2.1942 г.

ПЕРУНОЎ Аляксандр Ільіч, н. у 1908 г., лейтэнант, загінуў 9.7.1944 г.

РЫНДЗІН Іван Іванавіч, н. у 1916 г., ст. сяржант, загінуў 8.7.1944 г.

* * *

КРАЎЧАНКА Мікалай Васільевіч, н. у 1915 г. у г. Краматорск, лейтэнант, камандзір сапёрнага падраздзялення. Загінуў у ліпені 1946 г. пры разміняванні маста каля в. Рудня Коленская. Пахаваны ў в. Палянка.

ІВАНОЎ, лейтэнант, родам са Сталінградскай вобл., акружэнец. Схоплены гітлераўцамі ў 1941 г. у Марохараўскім с/савеце і расстраляны.

Партызаны, загінуўшыя і пахаваныя на тэрыторыі Дзякавіцкага сельскага Савета

ВЁСКА ДЗЯКАВІЧЫ

ДАСТАНКА Васіль Цітавіч, н. у 1925 г., партызан атрада імя Сільніцкага брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Загінуў 7.4.1944 г. (падарваўся на міне).

ЖУРАЎЛЕВІЧ Мікалай Піліпавіч, н. у 1926 г., загінуў у чэрвені 1944 г. пры размініраванні дарогі.

ІВАНОЎ Георгій Іванавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1944 г.

ІВАНОЎ Міхаіл Канстанцінавіч, партызан, загінуў у снежні 1943 г.

ІВІНСКІ Станіслаў Міхайлавіч, н. у 1900 г., загінуў у красавіку 1944 г.

КУЛАК Аляксандр Маркавіч, н. у 1911 г., партызан атрада А. Неўскага брыгады імя П. К. Панамарэнкі, загінуў 18.6. 1944 г.

КУБЫШКІН Міхаіл Савельевіч, н. у 1916 г., загінуў 21.5.1944 г.

КУДЗЕЛЬКА Дзяніс Мікалаевіч, н. у 1911 г.

КУДЗЕЛЬКА Сямён Фёдаравіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

КУРЫНОЙ Уладзімір Іванавіч. Перапахаваны ў брацкую магілу ў в. Хвойка.

КУПРАЦЭВІЧ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1923 г., загінуў 6.5.1944 г.

ЛАГУН Міхаіл, загінуў у 1944 г.

ЛЮБЧАНКА Міхаіл Пятровіч, загінуў 20.3.1944 г.

МЯЛЕШКА Уладзімір Трафімавіч, н. у 1922 г., загінуў у чэрвені 1944 г.

РАГАЛЕВІЧ Яўген Цімафеевіч, н. у 1927 г., загінуў у 1944 г.

РАГАЛЕВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1926 г., загінуў у 1944 г.

РАГАЛЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

РАГАЛЕВІЧ Аляксей Якаўлевіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г.

РАЗГАВОРАЎ Васіль Фёдаравіч, загінуў 13.2.1944 г.

ВЁСКА ХВОЙКА

ЖУРАЎЛЕВІЧ Ціт Андрэевіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

КАКАЦКІ Адам Міхайлавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

МІРАНОВІЧ Аляксей Гаўрылавіч, н. у 1894 г., загінуў у 1944 г.

РАГАЛЕВІЧ Мікалай Аляксеевіч, н. у 1925 г., партызан атрада «1 Мая». Загінуў у 1944 г.

РАГАЛЕВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

РАГАЛЕВІЧ Віктар Андрэевіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г.

РАКОВІЧ Даніла Васільевіч, н. у 1903 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА ЛУТОЎЕ

ЖУРАЎЛЕВІЧ Іван Сямёнавіч, н. у 1892 г., загінуў у 1943 г.

ЖУРАЎЛЕВІЧ Сямён Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.

ЧЭРКАС Міхаіл Пятровіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

ВЁСКА ПАСТАЛЫ

ДЫРДА Марта Іосіфаўна, н. у 1905 г., сувязная партызанскага атрада «За Радзіму» брыгады імя Кірава. Схоплена фашыстамі і расстраляна ў чэрвені 1942 г.

ДУШАНІН Сяргей Васільевіч, н. у 1924 г., у 1942 г. пайшоў у партызанскі атрад. Восенню 1943 г. цяжка паранены, пры вывазцы на Вялікую зямлю самалёт, на якім ён ляцеў, быў збіты.

Гэты дзень мы набліжалі як маглі...

Радавы вялікай Перамогі

Струк Міхаіл Сямёнавіч (н. у 1922 г. у в. Запясочча) у пачатку чэрвеня 1941 г. прызваны ў Чырвоную Армію. 1418 дзён правёў на франтах Вялікай Айчыннай вайны зенітчыкам, потым разведчыкам у 49-й асобнай разведроце Лужскай ордэна Леніна стралковай дывізіі. За мужнасць і адвагу ў барацьбе супраць гітлераўцаў узнагароджаны вышэйшымі знакамі салдацкай доблесці — ордэнамі Славы трох ступеняў, медалямі «За абарону Ленінграда», «За ўзяцце Варшавы», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

...Радавы Струк ляжаў у сваім акопчыку, вёў назіранне за пярэднім краем. На дне хлюпала балотная твань, навокал — трыснёг, чэзлы хмызняк. У гітлераўцаў пазіцыі больш выгадныя, на вышыні. Усё мокрае, не сціхае дождж... Побач прыціх Сцяпан Вярыга.

— У такі дождж добра ісці ў пошук,— парушыў цішыню Струк.— Немцы не любяць непагоду, адсіджваюцца ў бліндажах.

— Сапраўды, добрая ідэя...

Камандзір разведроты лейтэнант Кротаў ухваліў ініцыятыву. І на наступную ноч Струк, Вярыга і Бурматаў накіраваліся ў тыл ворага. Выявілі кулямётны разлік, без шуму знішчылі яго. Да раніцы вярнуліся да сваіх, захапіўшы нямецкага назіральніка разам са зброяй.

Такія вылазкі рабіліся ўсё часцей. Сваімі пошукамі ў варожым тыле, каштоўнымі звесткамі, якія яны прыносілі адтуль, разведчыкі заваявалі аўтарытэт і павагу байцоў сваёй часці. Але галоўныя выпрабаванні былі наперадзе. Рыхтавалася вялікае наступленне, нашы войскі былі гатовы да прарыву абароны.

М. С. Струк

Да пошуку ў тыле ворага перад пачаткам грандыёзнай аперацыі разведчыкі рыхтаваліся асабліва старанна.

— Групу павяду я сам,— сказаў лейтэнант Кротаў.— Старшым у прыкрыцці будзе сяржант Вярыга... Усім адпачываць да вечара. Здаць дакументы і ўзнагароды.

Мяла завіруха. Праз міннае поле паўзлі па-пластунску — у маскхалатах, непрыкметныя, як прывіды... Вось і нямецкая траншэя. Прыгнуўшыся, Струк ішоў першым. Было ціха і спакойна, але, як заўсёды на вайне, небяспека на кожным кроку. Раптам разведчык наткнуўся на гітлераўца, відаць, гэта быў сувязны са штаба. Ён на імгненне разгубіўся, не мог зразумець, хто перад ім — свае ці рускія, але гэтага было дастаткова, каб без шуму знішчыць ворага. Сувязнога адцягнулі ўбок, закідалі снегам. Прытаіліся побач... Чакалі не дарма — па ходу траншэі пад раніцу спяшаўся некуды гітлераўскі афіцэр. Звязалі, затыкнулі рот... На дзень захаваліся ў глыбокім яры, абдумвалі, як вярнуцца да сваіх. Але бліжэй да вечара разведчыкаў выкрылі. Давялося трымаць бой.

Варожая куля раніла лейтэнанта Кротава. Камандаванне групай прыняў сяржант Вярыга. Ён загадаў:

— Струк з Бурматавым разам з лейтэнантам і палонным прабівайцеся да сваіх. Мы вас прыкрыем...

Вось і нейтральная паласа. Байцы з траншэі машуць рукамі — сю-

ды! Дапамаглі артылерысты, адкрылі агонь па варожых пазіцыях.

Яшчэ рывок...

І тут разрыў варожай міны балюча ўдарыў Струка. Спачатку не паверыў: «Няўжо паранены?..» Таварышы панеслі яго па траншэі, і Міхаіл думаў: «Добра, што «языка» ўзялі... Хутка наступленне».

Наступленне пачалося без яго. Міхаіл Струк ляжаў у гэты час у шпіталі ў Ленінградзе, бачыў, як радаваліся змучаныя блакадай ленінградцы, любаваўся святочным феерверкам у гонар вялікай падзеі...

Дагнаў свой полк у канцы мая ўжо на эстонскай зямлі. І зноў крочыў па вогненных дарогах вайны на захад — праз усю Прыбалтыку, праз Польшчу. Ваяваў на Вісле, вызваляў Данцыг...

— На правым беразе ракі Пяр не дае жыцця дот,— сказаў камандзір дывізійнай разведкі маёр Шуленін.— Вам даручаецца знішчыць яго...

Глыбокай ноччу разведчыкі ціха перайшлі ўжо па ледзяной вадзе раку. Праслізнулі першую траншэю, наткнуліся на бліндаж, дзе адпачывалі ворагі. М. Струку і С. Бурматаву ўдалося знішчыць іх амаль без шуму. Другая група праз некаторы час закідала гранатамі дот і заняла значную частку траншэі ворага. Уверх узвілася ракета — і вось ужо стралковы батальён займае пазіцыі праціўніка. Хутка ў наступленне пайшлі іншыя часці дывізіі.

На грудзях М. С. Струка заззяў ордэн Славы II ст.

У студзені 1945 г. выйшлі да Вісла. Наперадзе былі жорсткія баі на фінішы вайны, фарсіраванне шырокай ракі, на супрацьлеглым беразе якой добра ўмацаваўся вораг.

Разведчыкам было загадана перабрацца на варожы бераг, ля горада Граўдзенец, удакладніць даныя аб варожай абароне, захапіць «языка». Задача была надзвычай цяжкай. Рака, пакрытая тонкім лёдам, увесь час асвятлялася ракетамі, на кожным кроку — палонкі...

Ужо непадалёку ад берага трапіў ў ваду і назаўсёды знік камандзір узвода разведчыкаў лейтэнант Насардзінаў... Камандаванне прыняў старшы сяржант Шубін. Непрыкметна ўдалося прабрацца ў разваліны дома на беразе, схавацца ў іх. Цэлы дзень назіралі разведчыкі за ворагам — усё заўважалі, фіксавалі. Нанеслі на карту лінію абароны, удакладнілі агнявыя кропкі.

А ноччу па дарозе назад зрабілі засаду: патрабаваўся «язык». З-за павароту паказаліся трое фашыстаў. Па сігналу Шубіна Міхаіл Струк наваліўся на аднаго — аглушыў, засунуў у рот шапку. Ён аказаўся обер-лейтэнантам, які даў потым каштоўныя звесткі. Бурматаў з да-

З успамінаў кавалера ордэна Славы трох ступеняў М. С. Струка

...Ішлі баі за вызваленне эстонскага горада Койвіста. Мясціны там лясістыя, балоцістыя, месцамі зусім як у нас, на Палессі. Удзень мы, разведчыкі, звычайна адпачывалі, а ноччу — цяжкая, небяспечная работа...

Камандзір разведвальнай роты старшы лейтэнант Андрэеў выклікаў камандзіра аддзялення сяржанта Тукаленку. Разгарнуў карту.

— Загадана прабрацца ў тыл ворага, даведацца, ці заняты праціўнікам вось гэтыя хутары, узяць «языка»... Людзі ў вас надзейныя, упэўнены, задачу выканаеце.

У вячэрнім змроку восем разведчыкаў, сярод якіх і я, зніклі ў лесе. Лінія абароны тут была замацавана слаба, але глыбока эшаланіраваная, вораг знаходзіўся на кожным зручным месцы, узвышшы. Тукаленка назначыў мяне старшым групы прыкрыцця. Ішлі ціха, асцярожна, як толькі можна ўначы. Нечакана ў цемры наткнуліся на групу немцаў. Гэта былі сувязісты, якія правяралі ці цягнулі нітку. Што рабіць? Ворагі не заўважылі нас, але рухацца далей нельга. Начны ж час надзвычай дарагі... Тукаленка даў сігнал — і трое нямецкіх салдат без шуму знішчаны. Чацвёртага звязалі, затыкнулі рот кляпам і пакінулі пад аховай аднаго разведчыка, каб па дарозе назад забраць у якасці «языка».

Летняе світанне ранняе, а тут, на поўначы, яшчэ святлей. Ужо ружавеў край неба, калі

выйшлі да першага хутара. Ціха... Тукаленка раздзяліў нас на дзве групы. Сам з трыма байцамі пайшоў у абход будынка з аднаго боку, а мяне, С. Бурматава і В. Красненка накіраваў у другі. Раптам з таго боку, дзе быў Тукаленка, застракатаў кулямёт. Мы залеглі, але нашу групу ворагі, здаецца, не заўважылі...

— Красненка, прыкрывай, а мы са Сцяпанам закідаем фашыстаў гранатамі,— прыняў я рашэнне.

Падпаўзлі бліжэй, разам кінулі ў акно па гранаце. Кулямёт замоўк... Кінуліся да будынка, і тут кулямёт раптам ажыў зноў. Але было позна. Я дасягнуў ужо акна за вуглом, ускочыў і наваліўся на ворага. Ударыў цаглінай па галаве, той страціў прытомнасць... Не паспеў аддыхацца, як адчуў у сябе на шыі чужыя халодныя пальцы. Гэта, як аказалася, другі кулямётчык, які апрытомнеў пасля выбуху гранаты, накінуўся ззаду на мяне. Цяжка прыйшлося б, калі б на дапамогу своечасова не прыйшлі Бурматаў і Красненка.

Камандзір дывізіі, калі ўручаў мне ордэн Славы I ступені, сказаў:

— Малайчына, салдат... Адкуль родам?

— З Палесся... Вёска Запясочча, на Прыпяці.

— Жадаю табе салдацкага шчасця!..

Прышпіліў ордэн да прапыленай, прасоленай потам гімнасцёркі, моцна паціснуў руку...

памогай іншых разведчыкаў звязалі другога, а трэцяга гітлераўца давялося прыкончыць...

* * *

Імя простага сялянскага хлопца з Запясочча займае ганаровае месца сярод тых, хто ў жорсткіх бітвах заваяваў вялікую Перамогу, як названа і яго родная гаспадарка. Партрэт М. С. Струка змешчаны ў галерэі герояў у Мінску ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Доўгі час пасля вяртання ў калгас Міхаіл Сямёнавіч Струк працаваў у калгасе «Перамога», дзеля якой рабіў усё, што мог, у гады вайны, не шкадаваў жыцця, здароўя...

В. Р. Феранц

Зорка Героя

Кот Васіль Андрэевіч (н. 8.3.1916 г. у в. Найда) з 1937 г. у Чырвонай Арміі, закончыў ваенна-палітычнае вучылішча. Служыў на Далёкім Усходзе. Вызначыўся ў час баёў з японскімі мілітарыстамі пры штурме вострава Шумшу: прыняў камандаванне дэсантам, калі камандзір быў паранены і забяспечыў выкананне баявой задачы, за што ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Служыў на розных пасадах у паліторганах Савецкай Арміі да 1962 г., палкоўнік у адстаўцы.

...У начной цішыні тэлефонны званок прагучаў асабліва рэзка. Была пятая гадзіна. Васіля Кота тэрмінова выклікалі ў палітаддзел. Старшага лейтэнанта гэта не здзівіла — ішла вайна з Японіяй, і ён даўно быў гатовы па загаду ўступіць у бой.

Начальнік палітаддзела выглядаў стомленым, відаць, ад бяссоннай ночы.

— Мы сфарміравалі асобны дэсантны атрад,— сказаў ён.— Камандзіру атрада Шутаву патрэбны замполіт. Справа тэрміновая, дэсантнікі гатовы да выступлення... Вас вырашана прызначыць камісарам атрада.

Праз паўгадзіны Васіль Кот разам з маёрам Шутавым знаходзіліся ў камандуючага абарончым раёнам генерал-маёра Гнячко. Ён ведаў абодвух афіцэраў па сумеснай службе на Камчатцы, у Хабараўску.

— Задача дэсантнага атрада,—

В. А. Кот

сказаў генерал-маёр,— высадзіцца на востраў Шумшу, захапіць плацдарм і ўтрымліваць яго да падыходу асноўных сіл.

...Шумела Ахоцкае мора, разгойдвала дэсантнае судна. Старшы лейтэнант Кот знаходзіўся у кубрыку сярод салдат, тут у яго было многа знаёмых.

Раніцай 16 жніўня дэсант наблізіўся да Шумшу. Востраў маўчаў, але там прытаіліся вялікія сілы самураяў. Да берага заставалася каля двухсот метраў, калі на караблі абрушыліся залпы японскай артылерыі, шквальны кулямётны агонь. Амаль адначасова з мысу Лапатка ўдарыла наша артылерыя.

Да берага заставалася зусім блізка.

— За мной! — скамандаваў зампаліт і першым апынуўся ў вадзе. За ім рынуўся ўвесь дэсантны атрад, і хутка байцы ўступілі ў бой з японцамі. Умацаваўшыся ў камяністых шчылінах, яны трымаліся да апошняга, як ні імкнуліся самураі скінуць дэсант назад у мора... Шутаў манеўраваў агнём, канцэнтраваў яго на скапленнях ворага. Але хутка ён быў паранены. Яшчэ большая адказнасць легла на палітрука.

На левым фланзе не даваў падняць галавы японскі кулямётчык, які ўмацаваўся ў дзоце. Туды дабраўся Васіль Кот, з'арыентаваўся і паслаў у абход сапёраў з задачай узарваць дзот. Калі прагрымеў выбух, узняўся на ўвесь рост:

— Уперад, за мной!..

Варожая куля скасіла камандзіра роты аўтаматчыкаў старшага лейтэнанта Іназемцава. На чале роты стаў зампаліт. Ён падняў байцоў у атаку і паступова прабіваўся наперад. Асабліва цяжкае становішча склалася ў час наступлення на вышыні 165 і 171. Самураі ўвялі ў бой каля дваццаці танкаў.

Узоры мужнасці і гераізму ў барацьбе з танкамі праявілі многія байцы і камандзіры дэсанта. Камандзір узвода лейтэнант Велбавец падбіў тры варожыя танкі, старшы сяржант Барсукоў — два. Бессмяротны подзвіг здзейсніў парторг роты супрацьтанкавых ружжаў старшы сяржант Чарапанаў. Ён знішчыў два танкі, трэці, падпалены ім, працягваў рухацца і весці агонь па нашай пяхоце. Тады Чарапанаў са звязкай гранат кінуўся пад танк...

Апусцілася цёмная курыльская ноч. Бой сціх. Васіль Андрэевіч знаходзіўся ў акопах, гутарыў з байцамі, ставіў задачу на заўтра, падбадзёрваў, даваў парады. Раніцай дэсанту прыйшло падмацаванне. Наступленне ўзнавілася. Дзве гадзіны працягваўся бой за галоўныя вышыні востраваа, і вось старшы сяржант Бугранаў узняў на адной з іх чырвоны сцяг, хутка была ўзята і другая... А раніцай 19 жніўня японцы ўзнялі белы флаг...

У пасляваенны час Васіль Андрэевіч працягваў служыць на Далёкім Усходзе, затым у Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акрузе.

Жыхары вёскі Найда ганарацца сваім земляком-героем. Паважаюць яго і на Далёкім Усходзе, Васіль Андрэевіч Кот з'яўляецца ганаровым грамадзянінам горада Паўднёва-Курыльска.

А. М. Маісееў

Маці герояў

Твар Матроны Іванаўны Кот у густой сетцы маршчын заўсёды свяціўся дабрынёй, спагадлівасцю, шчырасцю... Маршчыны — ад чаго яны? Ад доўгага жыцця — больш ста гадоў пражыла жанчына на зямлі, ад гора, якое выпала на яе долю, шчасця і бясконцых жыццёвых турбот...

Калі ў 1980 г. на зыходзе лета, у дзень стогадовага юбілею Матроны Іванаўны сабраліся сыны, якія засталіся жывымі, шматлікія ўнукі

і праўнукі, родныя і блізкія за святочным сталом і папрасілі расказаць аб перажытым, жанчына разгубілася. Здаецца, няма чаго асабліва і расказаць... Жыццё як жыццё. Усяму было месца — і добраму, і ліхому. Кожная падзея ў ім неадрыўна звязана з жыццём краіны. Батрацкая доля бацькі — беднага селяніна, якому выпала жыць і гараваць у Найдзе, сярод балот, пустак... 19 гадкоў было, калі прыехалі сваты. Нічога не пыталіся ў дзяўчыны, выпілі кварту гарэлкі — і аддалі замуж. Добра — муж, Андрэй, быў добры, спагадлівы чалавек. Дзесяцярых дзяцей нарадзіла яму, праўда, жывымі засталіся не ўсе, усяго васьмёра. І для гэтых лёс выпаў вельмі розны... Надоўга перажыла Матрона Іванаўна свайго мужа Андрэя Сямёнавіча.

...Так было. Неўраджаі, паводкі, падаткі амаль штогод на нішто зводзілі плён гаротнай працы сялян. Рэвалюцыя, свая зямля, потым — калектывізацыя... А хутка грымнула вайна. Пра яе Матрона Іванаўна наогул не хацела ніколі ўспамінаць: столькі гора яна прынесла!

Іван мог застацца дома — яго, актыўнага камсамольца, райком партыі пакідаў ў тыле для арганізацыі партызанскай барацьбы, але хлопец настаяў на сваім, дабіўся накіравання на фронт. Адным з першых у Найдзе камсамольцаў быў і Павел. Ён таксама прызваны ў Чырвоную Армію ў першыя дні вайны. Апранулі салдацкія шынялі Алесь, Кірыл, Рыгор і Міхаіл.

— Іван і Алесь так і не вярнуліся.— Матрона Іванаўна даўно выплакала ўсе слёзы.— Але для мяне яны заўсёды жывыя. Давялося мне дажываць век за іх...

Васіль быў кадравым вайскоўцам, ён служыў палітруком на Далёкім Усходзе. Вайна дала аб сабе знаць яму пазней за ўсіх, у жніўні 1945 года, калі Чырвоная Армія граміла мілітарысцкую Японію. Па подзвіг Героя Савецкага Саюза Васіля Кота даведалася ўся краіна, ён — ганаровы грамадзянін горада Паўднёва-Курыльск.

Не доўга пражылі параненыя, страціўшыя здароўе на вайне, Павел і Міхаіл... Такая выпала ім доля — за іх, загінуўшых і памёршых, усе сілы, усю жыццёвую энергію аддаюць Васіль, Кірыл і Рыгор. Васіль Андрэевіч Кот — часты госць у роднай вёсцы. Скідае кіцель палкоўніка з Залатой Зоркай Героя, апранаецца ў цывільнае — і нічым не адрозніваецца ад вяскоўцаў: тыя ж размовы, тыя ж клопаты, тое ж жыццё...

А. К. Бігайдараў

Генерал артылерыі

Пяцюшкін Фёдар Іванавіч (н. у 1902 г. у в. Дзедаўка) з 1924 г. на вайсковай службе, якой аддаў амаль 30 гадоў. Прайшоў шлях ад чырвонаармейца, курсанта артылерыйскага вучылішча да генерал-маёра артылерыі. Вызначыўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, удастоены шасці баявых ордэнаў, многіх медалёў.

Памёр 28.6.1958 г.

Іван Пятровіч Пяцюшкін жыў у Дзедаўцы побач з чыгункай, працаваў стрэлачнікам, кандуктарам. Работа па тых часах відная, ганаровая... У вёсцы добра ведалі вялікую і дружную сям'ю чыгуначніка. Пасля падзей 1905 г. Пяцюшкіна як нядобранадзейнага звольнілі з работы. Купіў участак каля Людзяневіч, каня, пачаў працаваць на зямлі. А калі грымнула першая сусветная вайна, не паглядзелі ўлады на добранадзейнасць, прызвалі ў армію Івана Пяцюшкіна. Стаў селянін салдатам, артылерыстам, даслужыўся да ўнтэрафіцэра. Там, у акопах, і падарваў здароўе, вярнуўшыся з фронту, не доўга пражыў. У першы год пасля рэвалюцыі працаваў намеснікам старшыні Жыткавіцкага Валрэўкома, але хутка памёр. Усе клопаты аб сям'і, аб гаспадарцы леглі на

плечы старэйшага сына Фёдара. Маці таксама не было. Ужо ў 10 гадоў наймаўся ён на работу да кулакоў — летам працаваў, а зімой вучыўся ў царкоўна-прыходскай школе ў Людзяневічах.

У 1923 г. Фёдара Пяцюшкіна выбіраюць старшынёй сельсавета ў Людзяневічах. А праз год яго прызвалі ў армію. Як і бацька, ён стаў артылерыстам, служыў у Бабруйску ў 5-й асобнай артдывізіі. Актыўнага, адукаванага хлопца прыкмецілі і там. Хутка яго выбралі сакратаром камсамольскай ячэйкі, быў членам партбюро. На XII з'ездзе КП(б) Беларусі з'яўляўся дэлегатам з правам рашаючага голаса.

Чарадой пайшлі вайсковыя будні. Служба давалася Фёдару лёгка, ён служыў ахвотна, заўсёды быў у форме. Закончыў артылерыйскую школу, затым Мінскае артылерыйскае вучылішча, стаў камандзірам узвода. Ад гэтай першай ступенькі яго шлях пралёг праз дзесяткі пасад і званняў, праз усю вайну да камандуючага артылерыяй корпуса і намесніка камандуючага артылерыяй акругі. Вайна застала маёра Пяцюшкіна ў Беларусі, недалёка ад граніцы. У першы ж дзень яе давялося прыняць баявое хрышчэнне. Колькі такіх баёў было наперадзе!.. Пад Масквой і на Ленінградскім фронце, каля Сталінграда, у Крыму. Вызваляў Данбас, змагаўся на Дняпры, удзельнічаў у Севастопальскай аперацыі, потым была Літва, Усходняя Прусія, Кёнігсберг...

З БАЯВОЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ НА КАМАНДУЮЧАГА АРТЫЛЕРЫЯЙ 13-ГА ГВАРДЗЕЙСКАГА СТРАЛКОВАГА КОРПУСА ГВАРДЫІ ПАЛКОЎНІКА ПЯЦЮШКІНА Ф. І.

...За час знаходжання на фронце з 22.06.1941 г. праявіў сябе смелым, валявым, добра ведаючым сваю справу артылерыстам. Пастаянна знаходзіцца ў часцях, выхоўваючы асабовы састаў у духу мужнасці і гераізму.

Тав. Пяцюшкін Ф. І. да прарыву ўмацаванай паласы праціўніка на Перакопе ўмела арганізаваў вывучэнне сістэмы абароны праціўніка і размяшчэнне яго ўмацаваных кропак на пярэднім краі. У час прарыву ўмела кіраваў артчасцямі корпуса па разбурэнню пярэдняга краю праціўніка і знішчэнню яго агнявых сродкаў, чым садзейнічаў хуткаму руху нашых часцей наперад. У баях па прарыву ўмацаванага вала Перакопска-Ішуньскіх пазіцый праявіў сябе выключна мужным, храбрым, валявым афіцэрам... У час наступальных баёў па вызваленню ад нямецкіх захопнікаў Літоўскай ССР і выхаду на дзяржаўную граніцу СССР артылерыйскімі часцямі корпуса толькі за кастрычнік было знішчана 1800 нямецкіх салдат і афіцэраў, 233 кулямёты, 10 мінамётных батарэй, 20 гармат рознага калібру, спалены 31 танк праціўніка, 4 бронетранспарцёры, разбурана 18 дзотаў і назіральных пунктаў, 14 бліндажоў. Артылерыйскім агнём знішчаны 19 батарэй ворага, 30 мінамётных разлікаў, 16 гармат і 70 кулямётаў. Рассеяна пры контратаках да 4 батальёнаў нямецкай пяхоты...

...Займаемай пасадзе камандуючага артылерыяй корпуса адпавядае. Дастойны прысваення чарговага воінскага звання «генерал-маёр артылерыі».

Камандуючы 13-ым гвардзейскім стралковым корпусам Герой Савецкага Саюза генерал-лейтэнант *Лапацін.*

31 кастрычніка 1944 г.

Зусім нямнога заставалася да выхаду на дзяржаўную граніцу. Артылерысты падрыхтаваліся на сваіх пазіцыях да атакі нашых войск: прыстрэляны гарматы, вызначаны арыенціры, праведзена разведка варожых умацаванняў. І вось прагучаў умоўны сігнал — час пачынаць артпадрыхтоўку. Тысячы снарадаў узарвалі цішыню світання.

— Малайцы, артылерысты,— камандуючы корпусам генерал Лапацін не скрывае задавальнення. Хутка ў атаку пайшла пяхота...

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Праз некалькі дзён войскі корпуса выйшлі на дзяржаўную граніцу. На грудзях камандуючага артылерыяй з'явілася яшчэ адна ўзнагарода — ордэн Кутузава II ст.

У Літву корпус прыбыў у сярэдзіне ліпеня 1944 г. 16 жніўня гітлераўскія войскі перайшлі ў контрнаступленне. Артылерыстам прыйшлося нялёгка. Камандаванне праціўніка склала план акружэння савецкіх войск з прарывам на Шаўляй. Артылерысты корпуса стрымлівалі націск праціўніка на ўчастку Кяльме — Шаўляй. Ворагу цаной вялікіх страт удалося некалькі прасунуцца наперад, але захапіць Шаўляй ён не змог. У гэтых жорсткіх баях у другой палавіне жніўня 1944 г. артылерысты корпуса знішчылі дзесяткі варожых танкаў, самаходных установак, мінамётаў, бронетранспарцёраў, палявых гармат і іншага ўзбраення. Ф. І. Пяцюшкін за ўмелае камандаванне артылерыяй у гэтых баях быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

...Жорсткія баі ішлі ва Усходняй Прусіі. Вораг ператварыў у крэпасць кожны дом, кожнае скрыжаванне вуліц. Асабліва быў умацаваны Кёнігсберг. Ворагі былі ўпэўнены, што горад-крэпасць вытрымае любы націск савецкіх войск. Але артылерыя, у тым ліку і часці пад камандаваннем генерал-маёра Пяцюшкіна, змаглі разграміць умацаванне, скарыць ворага, і 9 красавіка 1945 г. Масква салютавала доблесным войскам, якія авалодалі горадам і крэпасцю Кёнігсбергам. За выдатныя баявыя дзеянні 13-му гвардзейскаму стралковаму корпусу была прысвоена ганаровая назва «Кёнігсбергскі». Ф. І. Пяцюшкін быў узнагароджаны ордэнам Суворава II ст. Ён заззяў як адзнака мужнасці і гераізму побач з ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, баявымі медалямі.

Звыш 30 гадоў праслужыў у Чырвонай Арміі Фёдар Іванавіч Пяцюшкін. Не раз быў паранены і кантужаны ў гады вайны. Здароўе было слабым. Таму ў пасляваенны час не давялося выбрацца на радзіму, у Дзедаўку, з якой звязана было столькі ўспамінаў... Памёр Ф. І. Пяцюшкін ва ўзросце 56 гадоў. Пражыў ён багатае, яркае жыццё воіна, якое без рэшты было аддадзена служэнню радзіме.

Салдацкая доблесць

Пятро Урманчэеў нарадзіўся ў суровы час грамадзянскай вайны, бацькоў не памятаў — быў сапраўдным сынам вуліцы, беспрызорным. Начаваў у падвалах, жабраваў... Лёс закінуў яго ў цёплы горад Ташкент, там трапіў Пятро ў дзіцячы дом. Гэта быў першы яго дом, дах над галавой...

Пачаў працаваць у авечкагадоўчым саўгасе, потым паступіў на фельчарскія курсы. Але хутка грымнула вайна... У першы ж дзень яе Урманчэеў панёс у ваенкамат заяву з просьбай накіраваць на фронт. Просьбу не задаволілі — некаму трэба працаваць і ў гаспадарцы, тым больш ў такой важнай галіне. Юнак піша яшчэ адну заяву, потым зноў... Толькі зімой 1942 г. дабіўся свайго. Хутка ў новенькай вайсковай форме Урманчэеў вучыцца ў Маскоўскім артылерыйскім вучылішчы. Вайна

П. І. Урманчэеў

для яго была напярадзе — цяжкія баі, горыч адступлення... Гэта потым ужо з пераможнымі баямі шлях адважнага артылерыста пралёг праз Беларусь, Літву і Латвію да Кёнігсберга.

...Гарачы бой ішоў на беразе Нёмана. Разведчыкі трапілі ў акружэнне, становішча здавалася бязвыхадным. Урманчэеву пад агнём ворага ўдалося непрыкметна праскочыць праз варожыя пазіцыі, даць вестку сваім. Дапамога прыйшла ў самы крытычны момант, калі сілы разведчыкаў былі ўжо на сыходзе... На гімнасцёрцы Урманчэева з'явілася зорка салдацкай славы. А на подступах да Кёнігсберга, калі разведчык захапіў у палон трох фашыстаў, на грудзях адважнага воіна разам з іншымі баявымі медалямі заззяў другі ордэн Славы.

В. Р. Феранц

Абаронца Брэсцкай крэпасці

Зноў і зноў паўстае ў памяці ціхі, светлы вечар 21 чэрвеня 1941 г. Надзвычай ціхі і надзвычай светлы... Так заўсёды бывае перад навальніцай... У ленінскім пакоі закончылася лекцыя пра міжнароднае становішча. Ішлі апошнія гадзіны мірнага жыцця. Брэсцкі гарадскі ваенны камісар маёр Заборкін, пад начальствам якога служыў пісар Андрэй Дрынеўскі, не хацеў верыць

А. І. Дрынеўскі

гэтай цішыні, ён душой адчуваў яе падманлівасць. І паляк, які пераплыў Буг надвячоркам, сцвярджаў: немцы рыхтуюцца да нападу на краіну. Заборкін пазваніў у Мінск, у штаб ваеннай акругі. «Правакацыя»,— адказалі адтуль.

А на золку зямля скаланулася ад выбухаў, страляніны, агню... Першым разам з іншымі найбольш важнымі аб'ектамі горада пад бомбы і артылерыйскія снарады трапіў ваенкамат. Байцы, якія ахоўвалі яго, разам з работнікамі камісарыяту кінуліся да складаў ваеннага гарадка, узброіліся і занялі абарону.

Грымела, палала агнём неба ў баку крэпасці. Што там робіцца, ці трымаюць нашы абарону? Заборкін загадаў байцам Дрынеўскаму і Сяргееву дабрацца да цытадэлі, разведаць і дакласці баявую абстаноўку. Шлях ляжаў паўз чыгуначны вакзал, дзе дагаралі разбітыя вагоны. Удалечыні на рагу вуліцы паволі прасунуўся танк — наш ці варожы?.. Вось і крэпасць. Кінуліся пад яе магутныя скляпенні... Фарты ўздоўж Мухаўца заходзіліся ад страляніны і выбухаў — значыць, трымаецца крэпасць, не здаецца! З паўднёвага боку было адносна спакойна. Дзе камандзіры, у каго распытаць пра абстаноўку?

— Часу раздумваць не было,— успамінае Андрэй Іванавіч.— Каля Холмскіх варот фашысты падняліся ў чарговую атаку. Лішнія два нашы штыкі аказаліся вельмі дарэчы. А праз некаторы час, калі атака была адбіта, вярнуцца ў горад мы ўжо не змаглі. Засталіся ў крэпасці, раздзялілі лёс яе абаронцаў.

Страцілі лік дням, пакрыліся сажай і дымам, але не здаваліся. Больш за смерць, якая кожную хвіліну была побач, мучыла смага... Колькі адбілі атак, у якія казематы не забіраліся — вось ён, вораг, і зноў бой... Потым аказалася, што правёў А. І. Дрынеўскі ў крэпасці

больш месяца. Больш месяца жорсткіх баёў у няроўных умовах, больш месяца бясконцага паядынка з ворагам і смерцю...

У канцы ліпеня кантужаны воін аказаўся ў палоне. Прыгналі ў лагер у Бяла-Падляску. Там былі тысячы такіх небарак. Але пакорна, без дзеяння чакаць канца Дрынеўскі не хацеў. Ледзь толькі крыху акрыяў ад кантузіі, спрабаваў бегчы. Групу адчайных чырвонаармейцаў узначаліў лейтэнант Іваноў. Іх фашысты дагналі з сабакамі на беразе Буга, дзе ўцекачы спыніліся, каб перадыхнуць перад небяспечнай перапраўвай. Да вечара здзекваліся ворагі над уцекачамі, як маглі: прымушалі бясконца трымаць рукі ўгару, ледзь адпусціў — удар палкай, цкаванне сабакі...

Затым былі лагеры ў крэпасці Дэмблін, у Сандаміры. Там загінулі дзесяткі, сотні тысяч ваеннапалонных. Але Андрэю Дрынеўскаму наканавана было выжыць. І толькі ў лістападзе 1944 г. пабег з катаржных падземных работ быў больш удалым. Уся каманда, каля 80 чалавек, па камандзе ваенурача Раманава напала на ахову, перабіла яе і знікла ў гарах. Шлях ляжаў у Швецыю. Дапамагалі простыя людзі, кармілі, паказвалі дарогу. Да вясны дабраліся да роднай зямлі, зусім блізка ішлі ўжо баі.

Цяжка было паверыць, што, прайшоўшы пекла абароны Брэсцкай крэпасці, вытрымаўшы нечалавечыя здзекі ў палоне, застаўся жывым... Такому лёсу можна пазайздросціць. У палоне Андрэй Іванавіч страціў слых, у армію яго не прызвалі. Спатрэбілася спецыяльнасць бухгалтара, якую ён атрымаў перад вайной у Гомельскім фінансавым тэхнікуме. Больш сарака гадоў працаваў у розных установах раёна. Пакінуў аб сабе добры ўспамін просты хлопец з Тураўшчыны, заслужаны, паважаны чалавек, якому выпаў такі нялёгкі і такі шчаслівы лёс — выстаяць, выжыць, перамагчы...

В. Р. Феранц

На пярэднім краі

На ўсё жыццё запомніўся той асенні дзень 13 кастрычніка 1941 г. Тады каля горада Калініна камандзір разліку самаходнай гарматы малодшы сяржант Мірон Белка прыняў свой першы бой. Абаронцаў была жменька. Вораг неадступна насядаў — блізка была жаданая мэта — Масква, да якой гітлераўцы рваліся ўсёй сваёй сляпой сілай.

— Не адну шалёную атаку адбілі,— успамінаў Мірон Якаўлевіч.— Лік ім даўно страцілі, і лічыць не было часу... Усё менш заставалася абаронцаў рубяжоў на подступах да Масквы, але і націск ворага станавіўся слабейшым.

Ужо потым, калі развеялі навалу ад сталіцы, атрымаў артылерыст свой першы баявы ордэн Чырвонай Зоркі.

Да граніц Беларусі, вызваленне якой пачалося восенню 1943 г., Мірон Якаўлевіч прыйшоў ужо баявым афіцэрам, камандзірам узвода. Потым была Заходняя Украіна, Польшча... Батарэя пад камандаваннем старшага лейтэнанта Белкі першай з артылерыйскіх падраздзяленняў фарсіравала Віслу. Там ішлі надзвычай жорсткія баі: перад Чырвонай Арміяй ляжала Германія,

М. Я. Белка

фашысты абаранялiся з фанатызмам асуджаных. Хелм, Варшава, Лодзь, Познань — польскія гарады, якія вызваляў воін-артылерыст з Тураўшчыны, за якія аддалі жыццё столькі сяброў.

Да канца вайны грудзі Мірона Белкі ўпрыгожвалі два ордэны Славы, Айчыннай вайны II ст., чатыры баявыя медалі. Яшчэ адзін медаль — «За працоўную адзнаку» — першую мірную ўзнагароду старшыня Верасніцкага сельскага савета Мірон Якаўлевіч Белка атрымаў у 1949 г. за поспехі ва ўзнаўленні разбуранай вайной гаспадаркі.

Потым Мірон Белка доўгі час узначальваў калгас «Новае жыццё». Гаспадарка пад яго кіраўніцтвам дасягнула небывалага росквіту, быў закладзены падмурак тых поспехаў, якімі «Новае жыццё» славіцца і сёння. А ў 1965 г. у выдавецтве «Ураджай» выйшла кніга М. Я. Белкі «Шчасце працай ствараецца», у якой старшыня перадавога на Гомельшчыне калгаса расказваў аб сваім вопыце і вопыце тураўскіх земляробаў. *В. Р. Феранц*

Служылі два таварышы

Яны раслі разам у вёсцы Хлупін у далёкія перадваенныя гады, разам хадзілі ў школу ў Перароў. Насілі аднолькавыя палатняныя торбачкі з падручнікамі праз плячо, абуты ў такія ж лапці. Былі нават падобныя адзін на другога — рослыя, хударлявыя — Рыгор Касценка і Рыгор Жогаль...

Перад вайной Рыгор Касценка закончыў курсы настаўнікаў у Тураве, Рыгор Жогаль пачаў працаваць рахункаводам у родным калгасе. Жыццё ім бачылася шырокае, неагляднае, шчаслівае... Але планы хлопцаў, іх бязвоблачнае юнацтва парушыла вайна. Пачаліся доўгія дні і ночы акупацыі.

Фашысты ў першыя дні, як прыйшлі на Тураўшчыну, схапілі бацьку Рыгора Касценкі — камуніста, старшыню калгаса «Ленінскі шлях» Мірона Яфімавіча Касценку і пасля доўгіх здзекаў расстралялі ў Перарове.

У 17-гадовага юнака была адна дарога — у партызаны. Маладога кемлівага хлопца, які добра ведаў мясцовасць, накіравалі ў разведку. У студзені 1944 г., калі Чырвоная Армія падышла да Турава, Рыгор Касценка правёў праз Прыпяць на выгадныя рубяжы вайсковае падраздзяленне. Тады юнак атрымаў сваю першую баявую ўзнагароду — медаль «За адвагу».

Вясной 1945 г. Рыгор Касценка ўдзельнічаў у кровапралітных баях за сталіцу Венгрыі Будапешт. Гэта былі надзвычай цяжкія баі, у якіх палеглі тысячы савецкіх салдат. Мог сярод іх быць і радавы Касценка, але салдацкі лёс яго быў міласцівы... На грудзях яго быў ужо другі медаль — «За баявыя заслугі», а пасля баёў за Вену — яшчэ адзін «За адвагу».

Цяжкімі ваеннымі дарогамі ішоў у гэты час сябар Касценкі — Рыгор Жогаль. Ён таксама ваяваў у партызанскім атрадзе, потым — радавым у 117-м стралковым палку. Пачатак 1944 г. быў надзвычай цяжкім для нашых войск: вораг неаднаразова спрабаваў уклініцца ў фланг фронту, але яму гэта так і не ўдалося. У ліпені пры ўзаемадзеянні з Дняпроўскай флатыліяй 117-ы стралковы полк вызваліў горад Тураў. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях за родны горад, Рыгор Жогаль быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Не мінулі яго варожыя кулі, быў паранены. Потым удзельнічаў у вызваленні Пінска, Брэста. У баях пад Варшавай зноў вызначыўся, быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У гэты час старшы лейтэнант Жогаль ка-

мандаваў ужо ротай, а ў канцы вайны быў камандзірам батальёна. Баявы шлях яго ляжаў да Кёнігсберга, напярадзе быў Берлін... У кровапралітных баях за сталіцу гітлераўскай Германіі Рыгор Жогаль быў узнагароджаны ордэнам Славы III ст.

Вярнуліся сябры пасля вайны — замест вёскі Хлупін, спаленай 12 ліпеня 1943 г., засталі толькі папялішча...

Рэдка, не ўсе вярталіся дамоў такія ж франтавікі. Вазілі лес, будаваліся. Пакрыху ўзнаўлялася вёска. Праз некалькі гадоў Рыгор Касценка стаў працаваць інструктарам Тураўскага РК КПБ, потым яго выбралі старшынёй роднага калгаса. Гаспадарка з кожным годам расла і мацавалася, неаднаразова яе працаўнікам уручаўся пераходны Чырвоны сцяг РК КПБ і райсавета дэпутатаў працоўных. Але ўсё часцей давалі аб сабе знаць франтавыя раны. Давялося перайсці на больш спакойную, не такую адказную работу. Завочна закончыў Мінскі педагагічны інстытут, стаў працаваць настаўнікам. Прайшлі гады... Усе тры дачкі Рыгора Міронавіча пайшлі па бацькавай дарозе, працуюць настаўніцамі.

Рыгор Жогаль да 1952 г. працаваў рахункаводам у калгасе, потым — рабочым у лясгасе, завочна вучыўся ў Полацкім лясным тэхнікуме. Апошні час узначальваў брыгаду леснікоў. Вырасціў разам з жонкай Вольгай Міхайлаўнай пяцёра дзяцей...

А. А. Ярмоленка

Вогненнымі дарогамі

Тая аперацыя партызан — узрыў чыгуначнага маста на рацэ Убарць каля вёскі Шчабядзіха восенню 1943 г. увайшла ў зводку Саюзінфармбюро. Макет яе дэманструецца ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Кіеве. Адным з арганізатараў і актыўным удзельнікам дзёрзкай аперацыі быў Фёдар Міхайлавіч Цімашчэня — у той час малады, але ўжо вопытны партызан, камсамольскі важак.

Партызаны ў выніку доўгіх назіранняў за чыгункай прыкмецілі, што заўсёды перад тым, як прайсці цягніку, немцы пускаюць дзеля перасцярогі дрызіну. Падрыхтавалі такую ж дрызіну. Выкацілі на рэйкі, а ў ёй — 150 кілаграмаў авіябомб, вялікая колькасць узрыўчаткі. Калі дрызіна ўзышла на мост, спрацавала ўзрыўное прыстасаванне, моцны выбух скалануў наваколле. Мост разбурыўся. На два тыдні быў спынены рух варожых эшалонаў па чыгунцы.

20-гадовы Фёдар Цімашчэня на той час меў ужо вялікі стаж партызанскай барацьбы. Пачыналася яго баявая біяграфія ў першыя месяцы вайны, калі ў раён Чырвонага возера была дэсантавана разведгрупа Чырвонай Арміі пад камандаваннем М. Лінькова (Баці). Фёдар, камсамолец з вёскі Ляхавічы, пазнаёміўся з разведчыкамі, ахвотна выконваў іх даручэнні, хадзіў на сувязь з партызанамі атрада В. З. Каржа. Хутка ён стаў паўнапраўным байцом — народным мсціўцам. Маладога, актыўнага партызана прыкмецілі, прызначылі памочнікам камісара атрада па камсамолу, а потым — камсоргам батальёна.

— Зімой 1943 г.,— расказвае Ф. М. Цімашчэня,— на лядовым аэрадроме возера Чырвонае прызямлілася група байцоў пад камандаваннем былога начальніка пагранічнай заставы А. М. Грабчака са спецыяльным заданнем для арганізацыі дыверсіі ў тыле ворага. Патрабаваліся мясцовыя жыхары, якія добра ведалі раён. Я вызваўся ўвайсці ў склад дыверсійнай групы. Разам са мною былі прызначаны пад

камандаванне А. М. Грабчака Віктар Давідовіч, Аляксей Малаў, Аляксей Глушчэня, Аляксандр Мучнік і Пятро Ахрамовіч. Шлях ляжаў у Тураўскі раён, затым далей на Украіну, у Жытомірскую вобласць...

Кожны пераход дыверсійнай групы даваўся нялёгка, часта з баямі — ужо блізка была Чырвоная Армія, вораг лютаваў. Жорсткую блакаду вытрымалі партызаны ў раёне Ковеля. У цяжкіх баях страцілі нямала баявых сяброў, але ўрон ворагу быў нанесены вялікі. Сведчанне гэтаму — Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні А. М. Грабчаку звання Героя Савецкага Саюза. Фёдар Цімашчэня быў узнагароджаны ордэнам Леніна. У прадстаўленні да ўзнагароды запісана: у баях з ворагам праявіў выключную мужнасць і гераізм, пры яго непасрэдным удзеле пушчана пад адхон 12 варожых эшалонаў...

...Толькі ў 1946 г. вярнуўся былы партызан, воін Чырвонай Арміі на радзіму, у родныя Ляхавічы. Трэба было пачынаць усё спачатку — прывыкаць да мірнай працы, будавацца, ладзіць новае жыццё... Фёдар Міхайлавіч быў не адзін, хто ўсе сілы аддаў Перамозе, але і ён унёс дастойны ўклад для яе набліжэння. На працягу ўсёй акупацыі трымаў сувязь з партызанамі Міхаіл Іванавіч Цімашчэня — стары бацька Фёдара. Змагаліся на фронце браты Андрэй і Арсень. У промнях вялікай Перамогі ёсць іскры баявой доблесці і вялікай, дружнай сям'і Цімашчэняў.

В. Р. Феранц

Воіны і партызаны — землякі, якія загінулі і прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны

АЗЯРАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АЗЯРАНЫ

АЛІФЕРАВЕЦ Кузьма Фёдаравіч, н. у 1894 г., загінуў 9.12.1941 г. у Германіі. Пахаваны ў г. Россбах.

БАЛБУЦКІ Васіль Антонавіч, н. у 1907 г., загінуў у палоне ў 1942 г.

БАЛБУЦКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1912 г., загінуў 22.8.1944 г. у Польшчы. Пахаваны ў Беластоцкім ваяв., в. Калінава.

БАЛБУЦКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1926 г., загінуў у красавіку 1945 г. каля г. Варшава.

БАКУН Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1911 г.

ВІННІК Мікалай Мікалаевіч, н. 21 чэрвеня 1921 г., памёр ад ран 5.2.1945 г. у Германіі, у прав. Брандэнбург.

ЖУРАЎСКІ Павел Якаўлевіч, н. у 1900 г.

КАВАЛЬЧУК Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1898 г., загінуў зімой 1943 г.

КІРАЙЧУК Іван Паўлавіч, н. у 1911 г., загінуў 15.10.1944 г.

КІРАЙЧУК Іван Іосіфавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1942 г. пад Сталінградам.

КІРАЙЧУК Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1918 г., загінуў 8.3.1944 г. каля г. Нарва.

КІРАЙЧУК Карней Іосіфавіч, н. у 1924 г., загінуў 13.1.1945 г. каля г. Варшава.

КІРАЙЧУК Пётр Васільевіч, н. у 1919 г., прапаў без вестак.

КІРАЙЧУК Пётр Васільевіч, н. ў 1923 г., прапаў без вестак.

КІРАЙЧУК Фёдар Паўлавіч, н. у 1923 г., загінуў 21.7.1944 г. у Польшчы, пахаваны ў Хелмскім ваяв., п. Апалін.

КІРАЙЧУК Юрый Емяльянавіч, н. у 1901 г., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

КЛІМОВІЧ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1924 г.

КЛІМОВІЧ Сямён Іванавіч, н. у 1907 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

КУЛЕШ Еўдакім Сцяпанавіч, н. у 1913 г., загінуў 4.01.1945 г. у Польшчы. Пахаваны ў в. Ракувек Сувальскага у.

КУЛЕШ Мікалай Васільевіч, н. у 1919 г., прапаў без вестак.

КУЛЕШ Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1909 г., загінуў у палоне.

КУЛЕШ Сцяпан Нічыпаравіч, н. у 1902 г., загінуў у снежні 1941 г.

КУРАНДА Сяргей Рыгоравіч, н. у 1921 г.

ЛАЗАРЧУК Іван Паўлавіч, н. у 1905 г., прапаў без вестак у 1945 г.

ЛАЗАРЧУК Яўхім Паўлавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1941 г., пахаваны ў г. Бабруйску.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Аляксандр Сідаравіч, н. у 1904 г., загінуў у 1945 г.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1921 г., загінуў 21.07.1941 г.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1918 г., загінуў у верасні 1944 г.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак у 1945 г.

ЛЕБЯДЗІНСКІ Яўген Васільевіч, н. у 1923 г., загінуў 14.02.1944 г., пахаваны ў в. Кастромка Апосталаўскага р. Днепрапятроўскай вобл.

ЛОЎГАЧ Іван Піліпавіч, н. у 1909 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ЛОЎГАЧ Максім Захаравіч, н. у 1918 г., загінуў у верасні 1944 г.

ЛОЎГАЧ Сямён Піліпавіч, н. у 1900 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ЛОЎГАЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1922 г.

ЛОЎГАЧ Якаў Максімавіч, н. у 1922 г., загінуў у верасні 1944 г.

МАРКЕВІЧ Сяргей Васільевіч, н. у 1906 г., загінуў у 1941 г.

МІНЧУК Іван Міхайлавіч, н. у 1922 г.



І. М. Балбуцкі

М. Р. Бакун

І. І. Кірайчук

М. І. Кірайчук

К. І. Кірайчук

Ф. П. Кірайчук

Ю. Е. Кірайчук



Е. С. Кулеш

ПАНКАВЕЦ Барыс Іванавіч, н. у 1925 г.

РАФАЛОВІЧ Міхаіл Максімавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1945 г.

САСКЕВІЧ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1901 г., прапаў без вестак у 1944 г.

САСКЕВІЧ Іван Пятровіч, н. у 1914 г., загінуў у 1941 г., пахаваны ў г. Тула.

САКОВІЧ Іван Ільіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г. пад Кіевам.

САКОВІЧ Міхаіл Ільіч, н. у 1909 г., загінуў у 1943 г.

САПАНОВІЧ Максім Пятровіч, н. у 1904 г.

ФІРЫСОВІЧ Міхаіл Осіпавіч, н. у 1905 г.

ФІРЫСОВІЧ Фёдар Якаўлевіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак у 1945 г.

ШВЕЦ Аркадзь Дзям'янавіч, н. у 1914 г., загінуў у Беластоку.

ШВЕЦ Мікалай Андрэевіч, н. у 1902 г.

ШВЕЦ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1922 г.

ШВЕЦ Пётр Андрэевіч, н. у 1909 г., загінуў у 1945 г.

ЯКАРЭВІЧ Элля Давыдавіч, н. у 1906 г., загінуў 2.05.1945 г. у Берліне.

ЯКУШЭВІЧ Ілья Андрэевіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г. у г. Столін.

ЯРЭМІЧ Міхаіл Парфёнавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы.

ВЁСКА ПАГОСТ

БОБРЫК Фама Маісеевіч, н. у 1918 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

БАБАРЫКА Іван Карпавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1943 г.

БАБАРЫКА Андрэй Карпавіч, н. у 1913 г., загінуў у красавіку 1944 г. каля г. Бранск.

БАЛБУЦКІ Іосіф Савіч, н. у 1917 г., загінуў у 1941 г.

ГАЛОТА Андрэй Васільевіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г.

ГАЛОТА Дзмітрый Васільевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ГЕРМАН Мікіта Рыгоравіч, н. у 1906 г., загінуў у 1941 г.

ЗОХНА Андрэй Фёдаравіч, н. у 1905 г., загінуў у 1942 г.

ЗОХНА Васіль Трафімавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1941 г.

ЗОХНА Іван Дзмітрыевіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.



Е. П. Лазарчук

А. М. Лебядзінскі

М. М. Лебядзінскі

Е. В. Лебядзінскі

І. П. Саскевіч

Ф. Я. Фірысовіч

ЗОХНА Ігнат Цімафеевіч, н. у 1913 г., загінуў у 1945 г.

ЗОХНА Міхаіл Трафімавіч, н. у 1902 г., загінуў 17.03.1945 г. у Германіі.

ІЛЬЕНЯ Аляксей Раманавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1941 г. у Эстоніі.

ІЛЬЕНЯ Іван Мікітавіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г.

ІЛЬЕНЯ Кузьма Захаравіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г.

ІЛЬЕНЯ Мікалай Кузьміч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

ІЛЬЕНЯ Мікіта Кірылавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1941 г.

ІЛЬЕНЯ Міхаіл Мікітавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

КАРАСЬ Антон Якімавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1941 г.

КАРАСЬ Ігнат Максімавіч, н. у 1918 г., загінуў 31.12.1941 г. у лагеры ваеннапалонных у г. Канатоп.

КАРАСЬ Кузьма Максімавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г.

КАРАСЬ Мікалай Антонавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1942 г.

КАРАСЬ Рыгор Дзмітрыевіч, н. у 1922 г., загінуў 9 ліпеня 1942 г., пахаваны ў Лівенскім р. Арлоўскай вобл.

КАРАСЬ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г.

КУЗЬМІЧ Андрэй Конанавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1943 г. каля Жытоміра.

КУЗЬМІЧ Аркадзій Яфімавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г.

КУЗЬМІЧ Пётр Фёдаравіч, н. у 1912 г., загінуў у 1945 г.

КУЗЬМІЧ Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1922 г., загінуў у 1942 г.

ЛАЗАРЧУК Васіль Якаўлевіч, н. у 1903 г., загінуў у 1943 г. пад г. Варшава.

ЛЕЎКАВЕЦ Апанас Макаравіч, н. у 1918 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы.

ЛЕЎКАВЕЦ Кузьма Іванавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1941 г.

ЛЕЎКАВЕЦ Маісей Макаравіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ЛІТВІНКА Іван Сямёнавіч, н. у 1925 г., загінуў 22 кастрычніка 1944 г., пахаваны ў в. Гарбасен Сувальскага ваяв.

ЛІТВІНКА Іван Якаўлевіч, н. у 1922 г., загінуў у 1943 г.

МУРАШКА Павел Міронавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г.

МУРАШКА Сцяпан Лявонцьевіч, н. у 1903 г., загінуў у 1944 г.

ПАШЭВІЧ Іван Іосіфавіч, н. у 1924 г., загінуў 15 кастрычніка 1944 г.

ПАШЭВІЧ Мікіта Сямёнавіч, н. у 1897 г., загінуў у 1944 г.

ПАНЧЭНЯ Васіль Тарасавіч, н. у 1915 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ПАНЧЭНЯ Міхаіл Фядотавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1945 г. у Берліне.

ПАНЧЭНЯ Сцяпан Паўлавіч, н. у 1906 г., загінуў у красавіку 1944 г.

РАМАНОЎСКІ Захар Кірылавіч, н. у 1920 г., партызан, загінуў у Лельчыцкім р.

РАМАНОЎСКІ Пётр Кірылавіч, н. у 1914 г., партызан, загінуў у Лельчыцкім р.

САСКЕВІЧ Васіль Паўлавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

САСКЕВІЧ Іван Паўлавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1945 г.

САСКЕВІЧ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1945 г. ва Усходняй Прусіі.

САСКЕВІЧ Павел Пракопавіч, н. у 1897 г., загінуў 21 кастрычніка 1944 г., пахаваны ў в. Шацкі Варшаўскага ваяв.

САСКЕВІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1893 г., загінуў у 1943 г.

САСКЕВІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1942 г.

САСКЕВІЧ Якаў Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1942 г.

САСКЕВІЧ Яфім Пракопавіч, н. у 1910 г., прапаў без вестак.

ТОРЧЫК Апанас Нічыпаравіч, н. у 1918 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ТОРЧЫК Іван Прохаравіч, н. у 1922 г., загінуў 7 кастрычніка 1944 г. у Латвіі, пахаваны ў в. Найбадзі.

ТОРЧЫК Макар Паўлавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1944 г.

ТОРЧЫК Мікіта Раманавіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г.

ТОРЧЫК Міхаіл Дзям'янавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г.

ТОРЧЫК Рыгор Нічыпаравіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Аляксей Раманавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Сцяпан Васільевіч, н. у 1901 г., прапаў без вестак.

ЧАРНУШЭВІЧ Якаў Фёдаравіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г.

ЧЭЧКА Іван Захаравіч, н. у 1921 г., загінуў у 1944 г. у г. Багуслаў.

ЧЭЧКА Пётр Піліпавіч, н. у 1924 г., прапаў без вестак.

ФІЛАТАЎ Пётр Нічыпаравіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

ЯКУБОЎСКІ Аляксей Адамавіч, н. у 1906 г., прапаў без вестак.

ЯКУБОЎСКІ Мікалай

ЯКУБОЎСКІ Трафім Адамавіч, н. у 1900 г., прапаў без вестак.

ВЁСКА ЧЭРНІЧЫ

БАБАРЫКА Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1914 г., прапаў без вестак у 1941 г.

ЕРАМЕЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1942 г. у Ленінградскай вобл.

ЖУРАЎСКІ Емяльян Якаўлевіч, н. у 1907 г., загінуў у жніўні 1944 г. каля г. Брэст.

ЗАНКЕВІЧ Іван Пятровіч, н. у 1926 г., загінуў у 1945 г. на р. Одэр.

ЗАНКЕВІЧ Кірыл Дзмітрыевіч, н. у 1906 г., загінуў у 1945 г.

ЗАНКЕВІЧ Маісей Сцяпанавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1945 г.

ЗАНКЕВІЧ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1914 г., загінуў у 1943 г. у в. Санадураўка Растоўскай вобл.

ЗАНКЕВІЧ Рыгор Гаўрылавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1942 г.

КУЗЬМІЧ Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1922 г., прапаў без вестак.

МАРКЕВІЧ Архіп Мартынавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1944 г.

МАРКЕВІЧ Дзям'ян Дзям'янавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

МАРКЕВІЧ Іван Аляксандравіч, н. у 1924 г., загінуў 4.02.1945 г.

МАРКЕВІЧ Іван Апанасавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1945 г. у Будапеште.

МАРКЕВІЧ Кірыл Пракопавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1941 г. каля г. Магілёў.

МАРКЕВІЧ Макар Арцёмавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

МАРКЕВІЧ Міхаіл Лук'янавіч, н. у 1916 г., загінуў у студзені 1944 г.

МАРКЕВІЧ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1921 г., загінуў у палоне ў снежні 1941 г.

МАРКЕВІЧ Піліп Фёдаравіч, н. у 1914 г., загінуў у 1944 г.

МАРКЕВІЧ Павел Мітрафанавіч, н. у 1913 г., загінуў у канцлагеры ў пачатку 1914 г. у г. Магілёў.

МАРКЕВІЧ Павел Трафімавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

МАРКЕВІЧ Рыгор Паўлавіч, н. у 1909 г., загінуў 13.10.1944 г. каля г. Варшава.

МАРКЕВІЧ Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

МАРКЕВІЧ Сямён Лук'янавіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак у 1944 г.

МАРКЕВІЧ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак.

МАРКЕВІЧ Якаў Міхайлавіч, н. у 1925 г., памёр ад ран 7 сакавіка 1945 г. у Польшчы, пахаваны ў в. Балебен Ольштынскага ваяв.

МАРКЕВІЧ Сяргей Пятровіч, загінуў у 1945 г. на р. Одэр.

МЕЛЯШЧЭНЯ Мартын Іванавіч, н. у 1911 г., загінуў 13.10.1944 г.

МЕЛЯШЧЭНЯ Сяргей Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ПАШЭВІЧ Максім Адамавіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г.

ПАШЭВІЧ Ціт Лук'янавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

РУНКЕВІЧ Кірыл Андрэевіч, н. у 1915 г., загінуў у чэрвені 1944 г.

САПАНОВІЧ Антон Васільевіч, н. у 1918 г., загінуў у палоне ў 1943 г.

САПАНОВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1916 г., загінуў у 1941 г. пад Арлом.

САПАНОВІЧ Ілья Маісеевіч, н. у 1908 г., загінуў у красавіку 1944 г.

САПАНОВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак у 1944 г.

САПАНОВІЧ Нікан Васільевіч, н. у 1909 г., загінуў у 1945 г. пад Берлінам.

САПАНОВІЧ Яўхім Паўлавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

СТАХОЎСКІ Сцяпан Антонавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г.

СТОКАЛАС Рыгор Лявонцьевіч, н. у 1911 г., загінуў у лагеры ваеннапалонных у 1944 г. у г. Дружба Сумскай вобл.

А. М. Маркевіч

М. А. Пашэвіч

Н. В. Сапановіч

ТОЎКАЧ Герасім Кірылавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1941 г.

ТОЎКАЧ Іван Кірылавіч, н. у 1907 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ТОЎКАЧ Сямён Кірылавіч, н. у 1899 г., загінуў у верасні 1944 г.

ТОЎКАЧ Васіль Кірылавіч, н. у 1911 г., загінуў 15.10.1944 г. пад Варшавай.

ЯКУШЭВІЧ Дзяніс Пракопавіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г.

ЯКУШЭВІЧ Ілья Мінавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1941 г. каля г. Арол.

ЯКУШЭВІЧ Рыгор Іванавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г. каля г. Варшава.

ЯКУШЭВІЧ Іван Фаміч, н. у 1910 г., прапаў без вестак.

ЯФІМОВІЧ Данііл Іванавіч, н. у 1909 г., загінуў у лістападзе 1943 г.

ВЁСКА ЗНАМЁНКА (СЛЕПЦЫ)

АКУЛІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1912 г., загінуў у 1945 г.

АКУЛІЧ Павел Максімавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г. у Літве, каля г. Алітус.

Павел Акуліч, па успамінах старэйшага брата Антона, быў актыўным, энергічным камсамольцам. Закончыў пяць класаў у Тураве і паступіў на курсы загадчыкаў жывёлагадоўчай фермы, працаваў у мясцовым калгасе «Чырвоны баец». У Калінкавічах вучыўся на агранома, служыў у Брэсцкай крэпасці. Закончыў вайсковую школу малодшых камандзіраў у Літве, у г. Прэна, і працягваў служыць на граніцы каля г. Алітус. Хутка пачалася вайна, у якой Павел Акуліч прапаў без вестак, засталася аб ім толькі памяць...

АКУЛІЧ Сяргей Васільевіч, н. у 1910 г., загінуў 17.03.1944 г.

БЫХАН Рыгор Дзямідавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1944 г. пад Ленінградам.

БЫХАН Ягор Лявонцьевіч, н. у 1917 г., прапаў без вестак.

ЗОХНА Мікалай Мацвеевіч, н. у 1918 г., загінуў у 1942 г.

ЗАБЕЛІЧ Іван Максімавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1945 г. пад г. Белая Царква.

ЗАБЕЛІЧ Андрэй Рыгоравіч, н. у 1889 г., загінуў 3.04.1945 г. каля г. Кюстрын.

ЗАБЕЛІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак.

ЗАБЕЛІЧ Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1922 г., загінуў 25.04.1945 г.

ЖУРАЎСКІ Антон Піліпавіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак.

МЕЛЯШЧЭНЯ Ерамей Фёдаравіч, н. у 1913 г., загінуў у 1942 г.

МЕЛЯШЧЭНЯ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1941 г.

МЕЛЯШЧЭНЯ Фёдар Максімавіч, н. у 1909 г., загінуў 22.07.1944 г. у Польшчы. Пахаваны на ст. Руды Люблінскага ваяв.

МЕЛЯШЧЭНЯ Цімафей Адамавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1944 г.

МУРАШКА Васіль Міронавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

МУРАШКА Ілья Сазонавіч, н. у 1904 г., загінуў 17.02.1945 г. у Польшчы. Пахаваны ў г. Тухель.

МУРАШКА Кірыл Ільіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г. у в. Вароны.

ЛЕЎКАВЕЦ Васіль Цімафеевіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак.

СЛЕСАРЧУК Міхаіл Іванавіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак.

ЧАРНУШЭВІЧ Сямён Адамавіч, н. у 1917 г., прапаў без вестак.

ЯРЭМІЧ Антон Пятровіч, н. у 1906 г., загінуў у 1944 г. у Эстоніі.

ЯРЭМІЧ Пётр Антонавіч, н. у 1906 г., загінуў 17.09.1944 г.

ЯРЭМІЧ Сцяпан Макаравіч, н. у 1919 г., загінуў у сакавіку 1944 г. у г. Луга Ленінградскай вобл.

ВЁСКА ХВАЕНСК

АКУЛІЧ Ігнат Цімафеевіч, н. у 1903 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

АНДЫК Васіль Рыгоравіч, н. у 1908 г., партызан, загінуў у 1943 г.

ДЗЯГЦЯРЫК Зіновій Іванавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1944 г.

ДЗЯГЦЯРЫК Міхаіл Іванавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1943 г.

ІЛЬЕНЯ Раман Васільевіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г.

ІЛЬЕНЯ Пётр Аўрамавіч, н. у 1924 г., прапаў без вестак.

ЛЕЎКАВЕЦ Нікіфар Васільевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1943 г.

ЛЕЎКАВЕЦ Рыгор Якаўлевіч, н. у 1912 г., загінуў у 1942 г. пад г. Варонеж.

НЯМШЭВІЧ Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1943 г.

САСКЕВІЧ Нічыпар Яфрэмавіч, н. у 1897 г., загінуў у 1944 г., пахаваны ў г. Калінкавічы.

САСКЕВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1910 г., партызан, загінуў у 1943 г.

СКРЫГАЛОЎСКІ Лук'ян Нічыпаравіч, н. у 1908 г., партызан, загінуў у 1943 г.

СКРЫГАЛОЎСКІ Ануфрый Іванавіч, н. у 1923 г., прапаў без вестак.

СКРЫГАЛОЎСКІ Антось Нічыпаравіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

СКРЫГАЛОЎСКІ Дзмітрый Рыгоравіч, н. у 1924 г., партызан, загінуў у 1943 г.

Н. В. Леўкавец

А. Ц. Чарнушэвіч

А. М. Чарнушэвіч

СКРЫГАЛОЎСКІ Канстанцін Ягоравіч, н. у 1924 г., прапаў без вестак.

СКРЫГАЛОЎСКІ Сцяпан Мікалаевіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г.

СЛЕСАРЧУК Андрэй Кірылавіч, н. у 1902 г., загінуў 2.11.1942 г. Пахаваны ў в. Серп Баранцінскага р. Смаленскай вобл.

ЧАРНУШЭВІЧ Арцём Цярэнцьевіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Іван Кірылавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1941 г. у г. Калінкавічы.

ЧАРНУШЭВІЧ Іван Фаміч, н. у 1922 г., прапаў без вестак.

ЧАРНУШЭВІЧ Мікалай Трафімавіч, н. у 1910 г., прапаў без вестак.

ЧАРНУШЭВІЧ Антон Рыгоравіч, н. у 1920 г., загінуў 22.07.1941 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Антось Маісеевіч, н. у 1924 г., партызан, загінуў у 1943 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Сяргей Ільіч, н. у 1924 г., партызан, прапаў без вестак.

ШВЕЦ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1921 г., прапаў без вестак.

ШВЕЦ Анатоль Паўлавіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак.

ШВЕЦ Павел Апанасавіч, н. у 1924 г., партызан, загінуў у 1943 г.

ШВЕЦ Антось Паўлавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1943 г.

ШВЕЦ Іван Пракопавіч, н. у 1905 г., прапаў без вестак.

ШВЕЦ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1943 г. пад г. Варонеж.

ШВЕЦ Пётр Сямёнавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г.

ШВЕЦ Сяргей Апанасавіч, н. у 1927 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА БЕЧЫ

АЛІФІРАВЕЦ Адам Міхайлавіч, н. у 1906 г., памёр у шпіталі 23.09.1944 г.

АЛІФІРАВЕЦ Аляксандр Мацвеевіч, н. у 1920 г., загінуў у красавіку 1944 г.

АЛІФІРАВЕЦ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1908 г., загінуў у верасні 1941 г.

АЛІФІРАВЕЦ Ілья Міхайлавіч, н. у 1906 г., загінуў у верасні 1944 г.

АНДЫК Ніканор Іванавіч, н. у 1912 г., загінуў 10 жніўня 1944 г.

ВЯЧОРКА Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1922 г., партызан, загінуў у 1944 г. у Лельчыцах.

ДРАНЕЦ Адам Трафімавіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г. у Карпатах.

ДУДЗІЧ Міхаіл Баляслававіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

КАЗЛОЎСКІ Аляксандр Браніслававіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г.

КАЗІНЕЦ Цімафей Іванавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1942 г.

ЛЫСЕНКА Фёдар Іосіфавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1944 г.

МАРЦІНКЕВІЧ Ануфрый Фёдаравіч, н. у 1912 г., загінуў у 1942 г.

МАСЛА Назар Пятровіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г.

МАСЛА Мікалай Пятровіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г.

МАСЛА Якаў Пятровіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

РАЖАЛОЎСКІ Антон Данілавіч, н. у 1907 г., загінуў у Брэсце ў 1941 г.

РАЖАЛОЎСКІ Ігнат Дарафеевіч, н. у 1924 г., загінуў 16 ліпеня 1944 г. у Валынскай вобл.

РАЖАЛОЎСКІ Ігнат Уладзіміравіч, н. у 1898 г., загінуў 20.10.1944 г. у Польшчы. Пахаваны ў в. Ціслава Варшаўскага ваяв.

РАЖАЛОЎСКІ Павел Міхайлавіч, н. у 1900 г., загінуў 21.10.1944 г. у прыгарадзе Варшавы. Пахаваны ў п. Караліна-Сіроцк.

ТОРЧЫК Філат Сцяпанавіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г.

ТРУХАНАВЕЦ Уладзімір Васільевіч, н. у 1903 г., загінуў у 1944 г.

ТРУХАНАВЕЦ Кузьма Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

ТРУХАНАВЕЦ Павел Міхайлавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

ЦІШКОЎСКІ Пётр Андрэевіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

ЮХНЕВІЧ Іван Купрыянавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

ЯКУШЭВІЧ Фёдар Апанасавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

ВЁСКА БЯЧАНСКАЯ БУДА

БЕК Іван Кірылавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1942 г.

БЕК Мікалай Кірылавіч, н. у 1917 г., прапаў без вестак.

КАЛЕСНЫ Міхаіл, н. у 1922 г., прапаў без вестак.

ПАШКОЎСКІ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г.

РАЙ Уладзімір Васільевіч, н. у 1909 г., прапаў без вестак.

ЦЯРЭНЯ Іван Усцінавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1945 г.

ЦЯРЭНЯ Васіль Усцінавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г.

ЦЯРЭНЯ Яўген Васільевіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г.

ХАЛАДОВІЧ Адам Сямёнавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1943 г.

ШОСТАК Аўсей Канстанцінавіч, н. у 1904 г., загінуў у 1943 г.

ЯКУБОЎСКІ Адам Мікалаевіч, н. у 1913 г., загінуў у 1942 г.

ЯКУБОЎСКІ Павел Іванавіч, н. у 1917 г., загінуў у 1943 г.

ЯКУБОЎСКІ Пётр Адамавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г.

ЯКУБОЎСКІ Міхаіл Васільевіч, н. у 1909 г., загінуў у верасні 1944 г.

ЯКУБОЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1943 г. на Волхаўскім фронце.

ЯКУБОЎСКІ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1917 г., загінуў у маі 1944 г.

ЯРЭМІЧ Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1910 г., партызан, загінуў у 1944 г. ва ўрочышчы Казаргаць каля Турава.

БРАНІСЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БРАНІСЛАЎ

АРДЫНСКІ Уладзімір Мартынавіч, н. у 1923 г., партызан 113-га атрада Жыткавіцкай партызанскай брыгады. Загінуў 10.5. 1944 г.

АСІПЧУК Павел Піліпавіч, н. у 1911 г., прызваны ў Чырвоную Армію да вайны, прапаў без вестак.

АСІПЧУК Мікалай Пятровіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

АКІНЧЫЦ Аляксандр Юльянавіч, н. у 1916 г., прапаў без вестак.

БАРЫСАВЕЦ Павел Антонавіч, н. у 1916 г., загінуў 22.8.1944 г. у Польшчы. Пахаваны ў в. Бравая Кракаўскага ваяв.

БЕЛАВУСАЎ Васіль Міхайлавіч, н. у 1921 г., прапаў без вестак.

БЕЛАВУСАЎ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г. у Варшаўскім ваяв.

БОГУШ Адам Сільвестравіч, н. у 1913 г., загінуў у 1942 г.



Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, у в. Браніслаў

ВЫСОЦКІ Іосіф Пятровіч, н. у 1909 г., загінуў у 1944 г.

ВОЛЧАК Анатолій Сцяпанавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1945 г. ва Усходняй Прусіі.

ВОЛЧАК Антон Іванавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1945 г.

ГРЫЧЫНА Аляксандр Іванавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

ГАРБАР Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1922 г., загінуў пад Кіевам у 1941 г.

ГАРБАР Маісей Сцяпанавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1941 г. у палоне ў Германіі, у канцлагеры Фалькенаў.

ГАРБУЗ Мірон Іванавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1942 г.

ДАБРАВОЛЬСКІ Ціхан Рыгоравіч, прызваны ў Чырвоную Армію да вайны, загінуў у 1941 г.

ДАБРАВОЛЬСКІ Рыгор Рыгоравіч, н. у 1911 г., загінуў у 1942 г.

ДАБРАВОЛЬСКІ Зіновій Рыгоравіч, н. у 1895 г., загінуў у 1942 г. у палоне у г. Жытомір.

ДАБРАВОЛЬСКІ Вячаслаў Зіноўевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г. у г. Арол.

ДЗЕМЯНЧУК Мікалай Данілавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1941 г. у Літве, пахаваны ў м. Картэна.

ДУДЗІН Арсень Ігнатавіч, н. у 1928 г., загінуў у 1945 г.

ЕФІМОВІЧ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

ЖУРАЎСКІ Эдуард Вячаслававіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г. у Латвіі.

ЖАЛЬЧУК Васіль Пятровіч, н. у 1921 г., загінуў у першыя дні вайны.

ЗАБРОЦКІ Вячаслаў Нікадзімавіч, н. у 1908 г., прапаў без вестак.

ЗАБРОЦКІ Леанід Нікадзімавіч

ЗАБРОЦКІ Вячаслаў Мікалаевіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

КАМІНСКІ Віктар Іванавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1941 г. каля Брэста.

КАТВІЦКІ Пётр Іосіфавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1945 г. пад Варшавай.

5 лютага 1945 г.

З франтавым прывітаннем друг і таварыш Катвіцкага Пятра Іосіфавіча Бандзюк Цярэнцій, родам з Жыткавіч. Добры дзень, дарагая мамаша. Паведамляю вам, што я атрымаў пісьмо, якое вы пісалі майму франтавому сябру Пятру. Вы пішаце, што жывеце добра... Што ж, мамаша родная, сын ваш Пятро забіты на пераправе пярэдняй лініі абароны немцаў 14 студзеня 45 г. Прамое пападанне, куля трапіла ў грудзі. Ён быў байцом храбрым і адважным, тады на полі бою за радзіму загінула шмат таварышаў. Што ж, шкада Пятра, ды нічога не зробіш... Перадайце прывет усім яго таварышам, прывет вам ад мяне. Да пабачэння.

Бандзюк Ц. І.

КАТВІЦКІ Адольф Адамавіч, н. у 1910 г., прапаў без вестак.

КАТОВІЧ Фёдар Адамавіч, н. у 1917 г., прапаў без вестак у 1944 г.

ЛУКАШЭВІЧ Віктар Віктаравіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

МІХАЛЬЧАНКА Васіль Цярэнцьевіч, н. у 1904 г., загінуў у 1941 г.

МІХАЛЬЧАНКА Міхаіл Цярэнцьевіч, н. у 1907 г., загінуў у красавіку 1944 г.

МІХАЛЬЧАНКА Уладзімір Цярэнцьевіч, н. у 1923 г., загінуў у 1942 г. у раёне г. Волагда.

МАЛІНОЎСКІ Антон Пятровіч, н. у 1904 г., прапаў без вестак.

НЕСІН Уладзімір Іванавіч, н. у 1914 г., партызан, загінуў у 1944 г. у в. Юркевічы.

ПІСКУН Рыгор Канстанцінавіч, н. у 1902 ., загінуў у 1943 г.

РАНЧЫНСКІ Аркадзь Сцяпанавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г. у Прыбалтыцы.

РАНЧЫНСКІ Мікалай Мацвеевіч, н. у 1916 г., загінуў 14.10.1944 г. на р. Вісла.

РАНЧЫНСКІ Ананій Рыгоравіч, н. у 1922 г., загінуў у 1941 г.

РАНЧЫНСКІ Аляксандр Мацвеевіч, н. у 1909 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

РАНЧЫНСКІ Іван Паўлавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

РАНЧЫНСКІ Яўгеній Паўлавіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак.

СУЛКОЎСКІ Пётр Фёдаравіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.

ТАНКОВІЧ Юльян Ульянавіч, прызваны ў Чырвоную Армію ў 1941 г., маёр, загінуў у 1944 г. Пахаваны ў в. Карасёва Мінскага р.

ТКАЧУК Антон Васільевіч, загінуў у 1945 г.

ТКАЧУК Андрэй Емяльянавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

ТКАЧУК Іван Емяльянавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1941 г.

УЛАДЗІМІРАЎ Дзяніс Рыгоравіч.

ХРУШЧОЎ Андрэй Сяргеевіч, працаваў дырэктарам Браніслаўскай школы, загінуў у пачатку вайны.

ХАМЕНКА Васіль Міхайлавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1941 г.

ХАМЕНКА Зіновій Міхайлавіч, н. у 1902 г., загінуў у першыя дні вайны.

ШЧУР Трафім Пятровіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г.

ФЕДАРЭНКА Дзмітрый Мікалаевіч, загінуў у 1943 г.

ФЛАР'ЯНОВІЧ Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1922 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА ВІЛЬЧА

ДУДЗІЧ Аркадзь Пятровіч, н. у 1914 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы, пахаваны ў г. Гданьск.

КАНАПАЦКІ Мірон Міхайлавіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак.

КАНАПАЦКІ Павел Ігнатавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1941 г.

КАНАПАЦКІ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

КАНАПАЦКІ Іван Ігнатавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

КАНАПАЦКІ Яфім Ігнатавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.

КАНАПАЦКІ Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

КАНАПАЦКІ Іван Фёдаравіч, н. у

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, у в. Вільча

КАНАПАЦКІ Прохар Мікалаевіч, н. у 1904 г., загінуў у 1942 г.

КАНАПАЦКІ Адам Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1941 г.

КАНАПАЦКІ Якаў Андрэевіч, н. у 1915 г., загінуў у 1944 г.

КАНАПАЦКІ Пётр Андрэевіч, загінуў у 1944 г.

КАНАПАЦКІ Цярэнцій Дзянісавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

КАНАПАЦКІ Іван Сцяпанавіч, н. у 1925 г., прапаў без вестак.

КУЛАКЕВІЧ Міхаіл Піліпавіч, н. у 1918 г., загінуў у лютым 1944 г.

КУЛАКЕВІЧ Герасім Ануфрыевіч, н. у 1897 г., прапаў без вестак.

КУЛАКЕВІЧ Савелій Якаўлевіч, н. у 1915 г., загінуў у 1941 г.

КУЛАКЕВІЧ Цярэнцій Савельевіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы, у Варшаўскім ваяв.

КУЛАКЕВІЧ Сяргей Іванавіч, н. у 1921 г., прапаў без вестак.

ТАНЧЫНСКІ Захар Яфімавіч, н. у 1910 г., партызан, загінуў у 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1942 г.

ШАЎРЭЙ Іван Андрэевіч, н. у 1885 г., загінуў у 1943 г.

ШАЎРЭЙ Васіль Іванавіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак.

ШЧУР Уладзімір Ільіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

ШЧУР Васіль Сямёнавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1941 г.

ШЧУР Пётр Аляксеевіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак.

ВЁСКА ГРАДА

АХОЦЕНКА Мікалай Антонавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1941 г. каля Мінска.

БЕЛАШЫЦКІ Павел Дзям'янавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1943 г. у Смаленскай вобл.

П. М. Канапацкі

А. І. Канапацкі

П. А. Канапацкі

М. П. Кулакевіч

Г. А. Кулакевіч

С. Я. Кулакевіч



С. І. Кулакевіч

В. І. Шаўрэй

БУРАЧОК Іван Якаўлевіч, н. у 1913 г., да вайны — настаўнік мясцовай школы. Ст. лейтэнант, парторг танкавага палка. Загінуў 6.11.1943 г. пры вызваленні Кіева.

ГОЛАД Васіль Кірылавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1941 г. пад Брэстам.

ГОЛАД Пётр Кірылавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г.

ГАЛЯЧАНКА Герасім Пятровіч, загінуў у 1941 г.

ГАЛЯЧАНКА Васіль Аляксеевіч, н. у 1903 г., артылерыст, загінуў у Берліне 5.5.1945 г. Адначасова з пахавальным лістом прыйшло паведамленне аб узнагароджанні ордэнам Чырвонай Зоркі.

ДЗЕМЯНЧУК Мікалай Данілавіч, н. у 1917 г., загінуў у Прыбалтыцы ў 1941 г.

ДЗЕМЯНЧУК Сяргей Паўлавіч, н. у 1907 г., загінуў каля Брэста ў 1944 г.

ДЗЕМЯНЧУК Сяргей Дзямідавіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г.

ДЗЯТКОЎСКІ Аляксандр Лявонцьевіч, загінуў у 1945 г. у Польшчы.

КЛІМЧУК Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1910 г., працаваў настаўнікам Градаўскай сямігадовай школы, прапаў без вестак.

МАЙСТРЭНКА Павел Іванавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1942 г.

МЕЛЬНІЧЭНКА Трафім Мартынавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

НІКІЦЕНКА Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.

У. І. Шчур

П. А. Шчур



Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, у в. Града

С. Д. Дземянчук

П. І. Майстрэнка

Т. М. Мельнічэнка

М. І. Прапольскі

ПЫШНЯК Мікалай Аляксандравіч, н. у 1906 г., загінуў у красавіку 1945 г. Пахаваны ў в. Цындорф у Аўстрыі.

ПРАПОЛЬСКІ Іосіф Якаўлевіч, н. у 1920 г., служыў у пагранічных войсках, загінуў у 1941 г.

ПРАПОЛЬСКІ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

ФЕШЧАНКА Уладзімір Іванавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

ФЕДАРЭНКА Антон Трафімавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1944 г.

ФЕДАРЭНКА Васіль Мікітавіч, н. у 1918 г., служыў і ваяваў у Літве, загінуў у 1941 г.

ФЕДАРЭНКА Васіль Аляксеевіч, н. у 1908 г., загінуў у маі 1945 г.

ЦЫРЫБКА Мікалай Апанасавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы.

Імёны на абеліску

На бетонных плітах абеліска — трыццаць два прозвішчы землякоў-воінаў, якія аддалі жыццё за Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Для вяскоўцаў яны — не салдаты і партызаны, а сыны, бацькі, браты... Абеліск загінуўшым землякам узведзены ў цэнтры вёскі Града. Прайшло паўстагоддзя, як іх няма, а памяць пра іх жыве. У паўсядзённых справах, у нашых сэрцах, ва ўспамінах... Яшчэ — у пісьмах, што захаваліся з ваеннай пары. Пажоўклая бумага, выліняўшыя няроўныя радкі. Даўно няма ў жывых тых, хто выводзіў іх у кароткія хвіліны паміж баямі, але яны размаўляюць сёння з намі, як жывыя, і, здаецца, праз дзесяцігоддзі мы чуем іх галасы...

«...Я — артылерыст, — піша з фронту Васіль Аляксеевіч Галячанка, прозвішча якога значыцца на абеліску.—Увесь час на перадавой. Сёння выйшлі з бою, імкліва рухаемся на Захад, думаю, што ў пачатку будучага года вайна скончыцца. Значыць, хутка сустрэнемся».

Пісьмо датавана 24 лістапада

А. Т. Федарэнка

В. А. Федарэнка

У. І. Фешчанка

А. А. Кулакевіч



Надмагільная пліта на брацкай магіле ў Кіеве, дзе пахаваны старшы лейтэнант І. Я. Бурачок

1943 г. Ужо шмат месяцаў салдат на фронце. Часта піша дахаты. Заклапочанасць і трывога аб сям'і, аб справах у калгасе адчуваецца ў кожным яго пісьме. Сам на перадавой, дзе кроў, небяспека, смерць, а думкі патомнага селяніна-калгасніка — дома, у гаспадарцы, у сям'і.

«Знаходзімся непадалёку ад Варшавы,— паведамляе франтавік у пачатку снежня.— Фашыстаў душым, як злодзеяў (слова «злодзеяў» падкрэслена двойчы). Вольга, укладзі ў канверт ліст тытуню і прышлі мне. Чым мацнейшага. Вазьмі ў каго з суседзяў».

Амаль у кожным пісьме з фронту — паклоны сваякам і суседзям, роспыты: як справы, як ідзе пасяўная, ці слухаюцца і дапамагаюць маці дзеці.

І вось апошняе пісьмо, датаванае 5 мая 1945 г.:

«Я ў Берліне! Вайна закончылася! Я жывы! ...Хутка абдыму вас, мае родныя, да восені буду дома. Быў у самым воўчым логаве, у рэйхстагу».

Больш пісьмаў не было. Не давялося сустрэцца салдату з жонкай, дзецьмі... Дзе склаў ён галаву, выжыўшы ў многіх кровапралітных баях, дзе пахаваны?..

Улетку 1945 г. Вольгу Ільінічну Галячанку, жонку загінуўшага ў апошнія дні салдата, выклікалі ў ваенкамат, уручылі пасведчанне аб узнагароджанні гвардыі радавога Васіля Аляксеевіча Галячанкі ордэнам Чырвонай Зоркі. Дзесьці на вуліцах Берліна ў апошнія гадзіны вайны разам са сваім гарматным разлікам зрабіў ён свой апошні подзвіг, і ўзнагарода прыйшла пасля яго смерці...

Жыве ў вёсцы Надзея Пятроўна Бурачок. Выхавала дзвюх дачок, якія часта наведваюць маці. Часта бярэ яна ў рукі пісьмы, напісаныя нампалітам танкавага батальёна старшым лейтэнантам Іванам Якаўлевічам Бурачком. Вочы засцілаюць слёзы, і нельга прачытаць апошняга прывітання, але яна ведае яго напамяць...

Ён быў вясковым настаўнікам.

І. Я. Бурачок

В. А. Галячанка

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

І зараз жывуць у вёсцы людзі, якіх Іван Якаўлевіч калісьці вучыў. Калі ж спатрэбілася, стаў кадравым байцом. У 1939 г. у горадзе Глухаў закончыў танкавае вучылішча. З першых дзён вайны лейтэнант Бурачок — палітрук танкавай роты на фронце.

...Здарылася так, што восенню 1943 г. ён вызваляў сваю родную вёску Альшаны, што на Чарнігаўшчыне. Нашы войскі пайшлі далей, на Захад, дзе ў дыме пажарышчаў чакаў часу вызвалення старажытны Кіеў, а Бурачок на некалькі гадзін заехаў дадому. Тут, на радзіме, яго чакала страшная вестка: перад самым адыходам, некалькі дзён назад, немцы расстралялі і спалілі жывымі 280 яго землякоў, мірных жыхароў вёскі. Сярод іх былі яго маці і сястра Саша...

— Я адпомшчу ім! — сказаў Іван Якаўлевіч на развітанне вяскоўцам і адразу ж паехаў даганяць сваю часць.

Наглядзеўшыся за доўгія гады вайны на зверствы акупантаў на захопленай імі савецкай зямлі, Бурачок быў упэўнены, што ў партызанскай Беларусі, якую ўжо тры гады таптаў сваім падкаваным ботам вораг, няма ў жывых ні жонкі, ні маленькіх дачок. Але ўсё ж ён пісаў і пісаў пісьмы наўздагад, спадзеючыся, што іх усё ж хто-небудзь прачытае — ці жонка, калі яна жывая, ці хто з радні. Да вызвалення Беларусі заставалася больш як паўгода.

Так яно і было. Пісьмы знайшлі адрасата — Надзею Пятроўну Бурачок — усе адразу пасля вызвалення раёна ў ліпені 1944 г., калі той, хто з такой любоўю, цяплынёй, а часам з адчаем пісаў іх, даўно ўжо загінуў. Толькі тут, у вёсцы, ніхто нічога аб гэтым не ведаў.

Апошняе пісьмо было напісана 10 кастрычніка 1943 г.: «За мяне не хвалюйцеся. Апошнімі днямі ўсё былі баі. Цяпер — зацішша, і я пішу пісьмо... Закончу вайну, абавязкова знайду вас, калі вы жывыя. Чакайце мяне — разаб'ём немцаў, і я вярнуся, прыеду да вас адразу ж. Я вырашыў: каб не было больш вайны, застануся служыць ваенным». Гэтай мары франтавіка якраз суджана было збыцца: няма больш вайны, а ён так і застаўся ваенным, загінуўшы 6 лістапада пры вызваленні Кіева. Застаўся ў памяці маладым, прыгожым...

Пахаваны І. Я. Бурачок у брацкай магіле ў Кіеве. Брацкую магілу наведала старэйшая дачка героя Аляксандра Іванаўна — таксама, як і бацька, настаўніца. Гэта яна пасля доўгіх пошукаў, пісьмаў, запытанняў у архівы, у школы Кіева ўстанавіла месца пахавання і падрабязнасці апошняга бою.

Некалькі гадоў назад, у выніку доўгіх пошукаў, удалося ўстанавіць, што 3 красавіка 1945 г. у далёкай Аўстрыі пад вёскай Цындорф склаў галаву радавы Мікалай Пышняк. Яго сын, Уладзімір Мікалаевіч, расказвае, што былі і доўгі час захоўваліся пісьмы бацькі, але недзе згубіліся. Уладзімір Мікалаевіч увесь час плануе паехаць да магілы бацькі, схіліць галаву перад яго памяццю.

У Брэсце, у трагічным 1941 г., загінуў Уладзімір Голад. Усім ім, героям Брэста, узведзены велічны мемарыял. Толькі, напэўна, сціплы абеліск на радзіме, дзе значыцца прозвішча і імя яго, усё ж больш дарагі для родных. На гэтым абеліску таксама прозвішча брата — Пятра Голада, які загінуў у адным з баёў з ворагам у партызанскім атрадзе.

...У кожнага з трыццаці двух загінуўшых — свой лёс і свая трагедыя. Яны хацелі жыць, працаваць, гадаваць дзяцей і араць зямлю, але выпала ім іншая доля.

Васіль Феранц



Э. І. Курц

М. Ф. Шчур

ВЁСКА ЗАГАЦЦЕ

ГЛУШАНЬ Васіль Міхайлавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1942 г.

КАНАПАЦКІ Антон Рыгоравіч, загінуў у 1943 г.

КУЛАКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1941 г.

КУЛАКЕВІЧ Сяргей Яфімавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1945 г. пад Кёнігсбергам.

КУЛАКЕВІЧ Адам Антонавіч.

КУРЦ Эдуард Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1943 г.

САВІЦКІ Міхаіл Пятровіч.

СЕВЕРАНЧУК Кірыл Яфімавіч, н. у 1907 г., загінуў у 1941 г.

ТАНЧЫНСКІ Пётр Іосіфавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы.

ТАНЧЫНСКІ Якаў Паўлавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1945 г.

ШЧУР Яфім Рыгоравіч.

ШЧУР Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1923 г., загінуў у 1942 г.

ВЁСКА КНЯЗЬ-БОР

КУЛАКЕВІЧ Дзямід Якаўлевіч, н. у 1908 г., прапаў без вестак.

КАНАПАЦКІ Іван Пятровіч, н. у 1921 г., загінуў у 1942 г.

КАНАПАЦКІ Дзям'ян Емяльянавіч, н. у 1900 г., загінуў у снежні 1941 г.

КАНАПАЦКІ Іосіф Пятровіч, н. у 1910 г., загінуў у 1941 г.

КАНАПАЦКІ Якаў Пятровіч, н. у 1921 г., загінуў у першыя дні вайны.

КУЛАКЕВІЧ Якаў Васільевіч, н. у 1918 г.

КУЛАКЕВІЧ Сямён Рыгоравіч, н. у 1907 г., прапаў без вестак.

КУЛАКЕВІЧ Пётр Якаўлевіч, н. у 1911 г., загінуў у снежні 1944 г. у Літве.

СУЛКОЎСКІ Пётр Міхайлавіч, н. у 1925 г., загінуў каля г. Ленінград у 1941 г.

ХАРЫТАНОВІЧ Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1945 г.

ШЧУР Васіль Платонавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1945 г.

ВЕРАСНІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВЕРАСНІЦА

АРЦЮХОВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

АРЦЮХОВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.

АРЦЮХОВІЧ Іван Уладзіміравіч, н. у 1911 г., загінуў у лістападзе 1941 г.

АРЦЮХОВІЧ Міхаіл Уладзіміравіч, н. у 1900 г., загінуў у красавіку 1944 г.

АРЦЮХОВІЧ Юлій Мікалаевіч, н. у 1908 г., загінуў у 1941 г.

БЛОЦКІ Апанас Кірылавіч, загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Аляксей Сцяпанавіч, н. у 1920 г., загінуў у кастрычніку 1944 г.

БЛОЦКІ Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.

БЛОЦКІ Даніл Сямёнавіч.

БЛОЦКІ Дзям'ян Дзмітрыевіч, н. у 1923 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы.

БЛОЦКІ Гардзей Дзмітрыевіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Дзмітрый Фёдаравіч, загінуў у 1941 г.

БЛОЦКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1926 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Дзмітрый Міхайлавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1944 г. у Малдавіі.

БЛОЦКІ Кірыл Піліпавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1943 г.

БЛОЦКІ Кірыл Кузьміч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Ігнат Марцінавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1941 г.

БЛОЦКІ Дзмітрый Ануфрыевіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

А. М. Арцюховіч

І. У. Арцюховіч

Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, у в. Верасніца

БЛОЦКІ Мікалай Стахеевіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Міхаіл Васільевіч, н. у 1896 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Міхаіл Данілавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1914 г., загінуў у 1942 г.

БЛОЦКІ Мірон Сцяпанавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1943 г.

БЛОЦКІ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1907 г., загінуў у 1941 г.

БЛОЦКІ Пракоп Дзмітрыевіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Павел Міхайлавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г.

БЛОЦКІ Пётр Кірылавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1942 г.

БЛОЦКІ Павел Іосіфавіч, н. у 1902 г., загінуў 4.8.1943 г.

БЛОЦКІ Пётр Іванавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1945 г.

БЛОЦКІ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Сцяпан Мікалаевіч, загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Сава Яўсеевіч, н. у 1902 г., загінуў у жніўні 1943 г.

БЛОЦКІ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

БЛОЦКІ Навум Піліпавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1943 г.

М. І. Блоцкі

Г. Д. Блоцкі

В. Р. Вашкоў

В. М. Жылан

П. П. Кочка



П. В. Каралец

БЕЛКА Даніл Антонавіч, загінуў у 1945 г.

БЕЛКА Дзяніс Антонавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1941 г.

БЕЛКА Захар Стахеевіч, н. у 1897 г., загінуў у 1944 г.

БЕЛКА Ігнат Сямёнавіч, н. у 1903 г., загінуў у 1945 г.

БЕЛКА Мікалай Якаўлевіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

БЕЛКА Трафім Дзмітрыевіч, н. у 1903 г., загінуў у 1944 г.

БОБКА Васіль Пятровіч, н. у 1914 г., загінуў у 1945 г.

БОБРЫК Ілья Фёдаравіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г.

БОБРЫК Іван Фёдаравіч, н. у 1922 г., загінуў у красавіку 1944 г.

БОБРЫК Фёдар Андрэевіч, н. у 1907 г., загінуў у 1942 г.

БОБРЫК Сцяпан Нічыпаравіч, н. у 1920 г., загінуў у красавіку 1944 г.

БОХНА Цімафей Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у красавіку 1945 г.

БОХНА Пётр Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1943 г.

БОХНА Мікалай Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Адам Васільевіч, н. у 1921 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Васіль Рыгоравіч, н. у 1923 г., загінуў 3.3.1945 г.

ВАШКОЎ Васіль Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Дзмітрый Рыгоравіч, н. у 1912 г., загінуў у маі 1945 г.

ВАШКОЎ Нікіфар Міхайлавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Максім Рыгоравіч, н. у 1923 г., загінуў у 1942 г.

ВАШКОЎ Пётр Паўлавіч, н. у 1895 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Павел Яўхімавіч, н. у 1917 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Сямён Паўлавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Трафім Рыгоравіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г.

ВАШКОЎ Фёдар Андрэевіч, н. у 1911 г., загінуў у красавіку 1945 г. у Польшчы.

ГАНАНАЙКА Васіль Сцяпанавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1944 г.

ГАНАНАЙКА Іван Васільевіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

ГАНАНАЙКА Мікалай Васільевіч, н. у 1922 г., загінуў у верасні 1944 г.

ГАНАНАЙКА Максім Сцяпанавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1944 г.

ГАНАНАЙКА Мікіта Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў у красавіку 1943 г.

ДАРОШКА Іван Сямёнавіч, н. у 1909 г., загінуў 24.1.1945 г.

ДАРОШКА Макар Аляксеевіч, н. у 1906 г., загінуў у 1942 г.

ДАРОШКА Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1911 г., загінуў у студзені 1943 г.

ДАРОШКА Міхаіл Кірылавіч, н. у 1923 г., загінуў 17.3.1945 г.

ДАРОШКА Рыгор Прохаравіч, н. у 1910 г., загінуў у 1942 г.

ДАРОШКА Фёдар Якаўлевіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Якім Якаўлевіч.

ДАБРАДЗЕРАВЕЦ Максім Іванавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

ДАБРАДЗЕРАВЕЦ Нікан Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў у кастрычніку 1941 г.

ДАБРАДЗЕРАВЕЦ Тарас Кандратавіч.

ДАБРАДЗЕРАВЕЦ Цімафей Іванавіч, загінуў у красавіку 1945 г.

ЖЫЛАН Васіль Мікітавіч, загінуў у 1945 г.

ЖЫЛАН Канстанцін Іосіфавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

КРЫВАНОС Андрэй Пятровіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г.

КРЫВАНОС Якаў Яўсеевіч, н. у 1905 г., загінуў у студзені 1944 г.

КАВАЛЕЦ Васіль Яўхімавіч, н. у 1913 г., загінуў у красавіку 1945 г.

КУХАРЧУК Іван Цімафеевіч, н. у 1924 г., загінуў у 1945 г.

КУЛЯВЕЦ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г.

КУЛЯВЕЦ Піліп Васільевіч, н. у 1909 г., загінуў у 1943 г.

КАРАЛЕЦ Кірыл Пятровіч, н. у 1914 г., загінуў у 1944 г.

КАРАЛЕЦ Мацвей Іванавіч.

КАРАЛЕЦ Сцяпан Афанасьевіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

КАРАЛЕЦ Сцяпан Мацвеевіч, н. у 1914 г., загінуў у 1944 г.

КУЛАКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1943 г.

КОШМАН Рыгор Дзям'янавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1945 г.

ЛОБАН Адам Пятровіч.

ЛОБАН Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

ЛОБАН Рыгор Фёдаравіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г.

МАСАЛЫГА Васіль Лявонавіч.

МАЖАКА Стахей Марцінавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

МАЖАКА Міхаіл Васільевіч, н. у 1917 г., загінуў у 1944 г.

ПЯТРЫЧЫЦ Васіль Лявонавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г.

ПЯТРЫЧЫЦ Іван Лявонавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1944 г.

ПЯТРЫЧЫЦ Фёдар Сямёнавіч, н. у 1903 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХАРЭНКА Іван Аляксандравіч, н. у 1903 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХАРЭНКА Мікалай Рыгоравіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХАРЭНКА Піліп Васільевіч.

ПРАХАРЭНКА Сцяпан Васільевіч, н. у 1915 г., загінуў у 1942 г.

ПРАХАРЭНКА Стахей Карнеевіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХАРЭНКА Рыгор Аляксандравіч, н. у 1894 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХАРЭНКА Фядот Фаміч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХАРЭНКА Фёдар Антонавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХАРЭНКА Яўсей Карнеевіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

РЫДЗЕЦКІ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1910 г., загінуў у лютым 1945 г.

РЭЗ Васіль Антонавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1945 г.

ТАЧЫЛА Адам Міронавіч, н. у 1920 г., загінуў 27.7.1941 г.

ТАЧЫЛА Міхаіл Якаўлевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ШАКАЛЯН Антон Фёдаравіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

ШЧАКАТОВІЧ Віктар, н. у 1924 г., партызан, загінуў у сакавіку 1944 г.

Віцю Шчакатовічу ў той цяжкі год споўнілася семнаццаць. Час выбіраць жыццёвую дарогу. Яна была прызначана юнаку самой гісторыяй, лёсам: ішоў 1941 год...

Ён быў у сваім гарачым парыве помсціць ворагу не адзін. Побач знаходзіліся сябры — вясковыя хлопцы Андрэй Блоцкі, Васіль і Андрэй Вашковы. Яны ўстанавілі сувязь з групай разведчыкаў Андрэя Сідарава, якія не раз з'яўляліся у Верасніцы. Хлопцы перарэзалі тэлефонную сувязь паміж Туравам і Давыд-Гарадком, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро і партызанскія лістоўкі ў Тураве. Здабывалі зброю, боепрыпасы, медыкаменты і перадавалі іх партызанам. Разведвалі размяшчэнне агнявых кропак праціўніка.

У пачатку 1944 г., калі фронт наблізіўся да Турава, камандаванню тэрмінова патрэбны былі разведачныя даныя аб абароне праціўніка. Як іх здабыць? На дапамогу прыйшлі партызаны. Разведчыкі праніклі ў тыл ворага і разам з народнымі мсціўцамі прыступілі да выканання задання. Партызаны прывялі чырвонаармейцаў да Верасніцы, дзе размяшчалася варожая часць. Асобную хату займаў афіцэр — важны гітлераўскі чын. Разведчыкі ўслед за Віцем Шчакатовічам, які ведаў тут кожны кусцік, падпаўзлі да хаты, прытаіліся. На парозе з'явіўся салдат з кацялком у руцэ і накіраваўся ў цэнтр вёскі.

— За вячэрай пайшоў,— здагадаліся разведчыкі.— Самы раз наведацца да афіцэра.

Імкліва зайшлі ў хату — афіцэр спачатку нават няўцяміў, хто перад ім. Саша Ведзянееў тузнуў фашыста:

— Зброю, дакументы — на стол!

Праз некалькі хвілін разведчыкі з «языком» былі ўжо за вёскай, у небяспечным месцы. Ранні зімовы змрок схаваў іх.

Віця Шчакатовіч разам са сваімі баявымі сябрамі ўдзельнічаў у ды-

В. В. Шчакатовіч

версіях на чыгунцы. У першы ж выхад ім удалося пусціць пад адхон варожы цягнік. Выходзілі і на ракадную шашу, і не раз узляталі ў паветра грузавыя і легкавыя аўтамабілі акупантаў.

А ў канцы сакавіка жыццё адважнага хлопца Віці Шчакатовіча абарвалася.

Партызаны вярталіся з чарговага задання, набрылі ў лесе на сваю былую стаянку. Тут іх і абкружылі карнікі, якія сачылі за пакінутым лагерам. Частка партызан кінулася на прарыў, іх прыкрывалі Андрэй Блоцкі і Віця Шчакатовіч. Скончыліся патроны, засталося некалькі гранат. А фашысты ўжо зусім блізка. Хлопцы адступілі ў гушчар, але раптам Андрэй упаў. Віктар не мог пакінуць таварыша на полі бою на здзеку ворагам, ён падхапіў параненага і пачаў выносіць яго. І тут кулямётная чарга ва ўпор ударыла Віктару Шчакатовічу ў грудзі... Яшчэ, прыхіліўшыся да дрэва, ён выпусціў па ворагу апошнія патроны, і гэта было апошняе, што зрабіў Віця за сваё нядоўгае жыццё, якое адмераў яму лёс.

Віктар Шчакатовіч быў непрыкметным, спакойным хлопцам, магчыма таму ў яго роднай Верасніцы мала хто ведае пра адважнага партызана. Доўга не ведала пра лёс сына і яго маці, калгасніца мясцовага калгаса...

Р. В. Рудовіч

ВЁСКА БУРАЗЬ

ВАЛЮШЫЦКІ Андрэй Прохаравіч, н. у 1921 г., загінуў у 1945 г.

ВАЛЮШЫЦКІ Андрэй Арцёмавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г. у Пінскім р.

ВАЛЮШЫЦКІ Апанас Бенядзіктавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1946 г.

ВАЛЮШЫЦКІ Сцяпан Цітавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

ВАЛЮШЫЦКІ Уладзімір Лук'янавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Аляксандр Пятровіч, н. у 1906 г., загінуў у 1945 г.

ДАРОШКА Іван Якаўлевіч, н. у 1909 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Іосіф Піліпавіч, н. у 1898 г., загінуў 14.12.1944 г.

ДАРОШКА Іван Іванавіч, н. у 1904 г., загінуў у 1942 г.

ДАРОШКА Іван Мацвеевіч, н. у 1921 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Ілья Іванавіч, н. у 1906 г., загінуў у палоне ў 1942 г.

ДАРОШКА Іван Ільіч, н. у 1926 г., загінуў 17.3.1945 г.

ДАРОШКА Кірыл Фаміч, н. у 1919 г., загінуў у 1943 г.

ДАРОШКА Рыгор Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1942 г.

ДАРОШКА Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Сцяпан Пятровіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Кірыл Якімавіч, н. у 1919 г., загінуў у палоне ў 1942 г.

ДАРОШКА Пётр Іванавіч, н. у 1899 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

ДАРОШКА Фёдар Якімавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Фёдар Гаўрылавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Тарас Мікалаевіч, н. у 1901 г., загінуў у 1943 г.

ДАРОШКА Фёдар Савіч, н. у 1923 г., загінуў у 1941 г.

ДАРОШКА Фёдар Мікітавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Яўхім Фёдаравіч, н. у 1904 г., загінуў у 1944 г.

ДАРОШКА Яўхім Яўхімавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г.

КУСІК Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1941 г.

ПРАХАРЭНКА Фёдар Маісеевіч, н. у 1926 г., загінуў у 1945 г.

СЫРАМАХА Васіль Марцінавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1942 г.

ТАЧЫЛА Андрэй Ільіч, н. у 1925 г., загінуў у 1945 г.

СЫРАМАХА Сяргей Гаўрылавіч, н. у 1913 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

СЯДЗЕЛЬНІК Маісей Паўлавіч, н. у 1905 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

СЯРГЕЙЧЫК Васіль Андрэевіч, н. у 1913 г., камісар, прапаў без вестак у 1941 г.

СЯРГЕЙЧЫК Міхаіл Андрэевіч, н. у 1898 г., рад., загінуў 21.2.1945 г.

СЯРГЕЙЧЫК Пётр Андрэевіч, н. у 1915 г., палітрук, загінуў у маі 1942 г.

СЯРГЕЙЧЫК Павел Іванавіч, н. у 1908 г., рад., загінуў у сакавіку 1944 г.

СЯРГЕЙЧЫК Сава Фаміч, н. у 1906 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

СЯРГЕЙЧЫК Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1925 г., загінуў 25.7.1944 г.

ТУНЕЎ Лявон Абрамавіч, н. у 1905 г., загінуў у канцлагеры Масюкоўшчына каля Мінска.

ФІЛІН Дзмітрый Андрэевіч, н. у 1913 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ФЛЕЙТМАН Ісак Вульфавіч, н. у 1908 г., рад., загінуў у верасні 1942 г.

ФЛЕЙТМАН Рыгор Вульфавіч, н. у 1909 г., капітан, інвалід I гр., памёр ад ран.

ФЛЕЙТМАН Ісак Ісакавіч, загінуў 13.4.1945 г.

ФРЫДМАН Якаў Аронавіч, н. у 1917 г., рад., загінуў 12.4.1945 г.

ХІЛІНСКІ Антон Людвігавіч, н. у 1898 г., тэхнік-лейтэнант, загінуў у красавіку 1942 г.

ХМЯЛЕЎСКІ Васіль Савіч, н. у 1910 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ХМЯЛЕЎСКІ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1898 г., рад., загінуў у красавіку 1945 г.

ЦАРЫК Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1910 г., рад., загінуў у 1945 г.

ЦАРЫК Андрэй Пракопавіч, н. у 1921 г., рад., загінуў у студзені 1944 г.

ЦАРЫК Георгій Фядотавіч, н. у 1922 г., рад., загінуў 15.7.1944 г.

ЦАРЫК Іван Іванавіч, н. у 1921 г., працаваў трактарыстам у калгасе «Новае жыццё». Служыў у г. Луга, рад., загінуў у верасні 1944 г.

І. І. Чарнушэвіч



І. І. Царык

ЦАРЫК Мікіта Васільевіч, рад., загінуў 18.3.1942 г.

ЦАРЫК Сямён Аляксандравіч, н. у 1914 г., прапаў без вестак.

ЦАРЫК Якаў Паўлавіч, н. у 1908 г., загінуў у ліпені 1944 г.

ЦЮСІК Гаўрыл Трафімавіч, н. у 1918 г., лейтэнант, загінуў 31.8.1942 г.

ЦЮСІК Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1921 г., рад., загінуў 6.7.1941 г.

ШПІЛОЎСКІ Павел Мікалаевіч, рад., загінуў 17.1.1945 г.

ЧАПЛІЕЎСКІ Якаў Дзмітрыевіч, рад., загінуў 17.4.1942 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Арцём Цярэнцьевіч, н. у 1919 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Дзмітрый Мікітавіч, н. у 1901 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Іван Кірылавіч, н. у 1922 г., сяржант, загінуў у сакавіку 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Іван Фаміч, н. у 1922 г., рад., загінуў у сакавіку 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Тарас Ільіч.

ЧАРНУШЭВІЧ Канстанцін Цітавіч, рад., загінуў 30.7.1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1919 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Міхаіл Тарасавіч, н. у 1921 г., лейтэнант, загінуў у верасні 1943 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Піліп Антонавіч, н. у 1912 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Раман Якаўлевіч, рад., загінуў 23.11.1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Рыгор Мікалаевіч, н. у 1921 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Сцяпан Гаўрылавіч, н. у 1893 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЧАРНУШЭВІЧ Якаў Фёдаравіч, рад., загінуў 16.1.1945 г.

ЧОРНЫ Аляксандр Антонавіч, н. у 1925 г., загінуў 8.7.1944 г.

ЧОРНЫ Аляксандр Пятровіч, н. у 1921 г., рад., загінуў у жніўні 1941 г.

ЧОРНЫ Васіль Піліпавіч, н. у 1913 г., рад., загінуў у сакавіку 1944 г.

ЧОРНЫ Гардзей Іосіфавіч, н. у 1914 г., ст. сяржант, загінуў у сакавіку 1944 г.

ЧОРНЫ Іван Міхайлавіч, н. у 1917 г., загінуў у жніўні 1941 г.

ЧОРНЫ Іван Сямёнавіч, н. у 1905 г., рад., загінуў 25.1.1945 г.

ЧОРНЫ Піліп Міхайлавіч, н. у 1910 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

ЧОРНЫ Фёдар Піліпавіч, н. у 1903 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

ЧОРНЫ Трафім Рыгоравіч, н. у 1914 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЧОРНЫ Якаў Антонавіч, н. у 1911 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

ЧОРНЫ Яфім Іванавіч, н. у 1918 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЧЫКІДА Арцём Данілавіч, н. у 1916 г., сяржант, загінуў 22.8.1942 г.

ЧЫКІДА Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1926 г., рад., загінуў у лютым 1945 г.

ЧЫКІДА Андрэй Іванавіч, н. у 1927 г.

ЧЫКІДА Віктар Іванавіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак у 1942 г.

ЧЫКІДА Іван Карпавіч, н. у 1893 г., расстраляны за сувязь з партызанамі ў 1942 г.

ЧЫКІДА Іван Паўлавіч, н. у 1917 г., старшына, загінуў 1.5.1944 г.

ЧЫКІДА Іван Пракопавіч, н. у 1904 г., рад., загінуў у сакавіку 1944 г.

ЧЫКІДА Іван Фёдаравіч, н. у 1925 г., рад., загінуў у снежні 1944 г.

ЧЫКІДА Канстанцін Васільевіч, н. у 1915 г., загінуў у верасні 1944 г.

ЧЫКІДА Кузьма Пятровіч, н. у 1925 г., рад., загінуў 9.10.1944 г.

ЧЫКІДА Пракоп Іванавіч, н. у 1898 г., рад., загінуў у кастрычніку 1944 г.

ЧЫКІДА Сямён Кірылавіч, н. у 1908 г., загінуў у студзені 1942 г.

ЧЫКІДА Сямён Піліпавіч, н. у 1911 г., рад., загінуў 31.3.1942 г.

ЧЫКІДА Сямён Нічыпаравіч, н. у 1913 г., рад., загінуў у кастрычніку 1941 г.

ЧЭРНІКАЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

ЧЭЧЫК Якаў Міронавіч, н. у 1914 г., старшы сяржант, загінуў у кастрычніку 1941 г.

ШАЎГЕНЯ Апанас Іванавіч, н. у 1910 г., рад., прапаў без вестак у сакавіку 1944 г.

ШАЎГЕНЯ Васіль Апанасавіч, н. у 1910 г., загінуў у чэрвені 1945 г.

ШВАРЦМАН Цоля Аронавіч, н. у 1926 г., загінуў 17.4.1945 г.

ШКУРКО Сава Пракопавіч, н. у 1909 г., рад., загінуў у лістападзе 1943 г.

ШКУРКО Рыгор Іванавіч, н. у 1899 г., рад., загінуў у сакавіку 1944 г.

ШКУРКО Уладзімір Іванавіч, н. у 1916 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ШЛЯПЕНКА Самуіл Рыгоравіч, н. у 1922 г., лейтэнант, камандзір узвода, загінуў у лютым 1942 г.

ШЛЯПІНТОХ Аброш, н. у 1903 г., рад., загінуў у кастрычніку 1942 г.

ШТУКАР Пётр Іванавіч, н. у 1921 г., старшы лейтэнант, загінуў 12.12.1944 г.

ШУЛЬГА Рыгор Барысавіч, н. у 1923 г.

ШУСТЭРМАН Якаў Мацвеевіч, н. у 1911 г., рад., загінуў у кастрычніку 1941 г.

ШЧАКАТОВІЧ Архіп Антонавіч, н. у 1902 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ШЧАКАТОВІЧ Віктар Уладзіміравіч, н. у 1925 г., загінуў 4.4.1944 г.

ШЧАКАТОВІЧ Яфім Антонавіч, н. у 1916 г., рад., загінуў у сакавіку 1944 г.

ШЫФМАН Лёва Лейзеравіч, н. у 1906 г., рад., загінуў у кастрычніку 1941 г.

ШЫФМАН Омер Рувімавіч, рад., загінуў у студзені 1943 г.

ЮНЧЫЦ Сцяпан Яфімавіч, н. у 1912 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

ЮНЧЫЦ Якаў Архіпавіч, н. у 1908 г., загінуў у студзені 1942 г.

ЯРАШ Ігнат Паўлавіч, н. у 1920 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЯРАШ Іван Трафімавіч, рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ЯРАШ Максім Міхайлавіч, лейтэнант, загінуў 30.3.1942 г.

ЯРАШ Міхаіл Макаравіч, н. у 1904 г., рад., загінуў у снежні 1944 г.

ЯРАШ Міхаіл Сямёнавіч, рад., загінуў 7.11.1943 г.

ЯРАШ Павел Іванавіч, н. у 1922 г., рад., загінуў у кастрычніку 1944 г.

ЯРАШ Трафім Міхайлавіч.

ЧЫРВОНЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Удзельнікі кастрычніцкага перавароту і грамадзянскай вайны

КУПРАЦЭВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1919 г.

КУПРАЦЭВІЧ Адам Міхайлавіч, н. у 1897 г., загінуў у 1919 г.

МАКАРЭВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1899 г., загінуў у 1920 г.

МАКАРЭВІЧ Мікалай Паўлавіч, н. у 1889 г., загінуў у 1918 г.

МАКАРЭВІЧ Міна Цітавіч, н. у 1902 г., пагранічнік, загінуў у 1925 г.

ЧЫРЭЦ Андрэй Маісеевіч, н. у 1898 г., загінуў у 1917 г.

ВЁСКА ЛЯХАВІЧЫ

АГІЕВІЧ Мікалай Ігнатавіч, н. у 1920 г., рад., прапаў без вестак.

АКУНЕЦ Васіль Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у Германіі 3.2.1945 г.

АКУНЕЦ Аляксандр Стахеевіч, н. у 1920 г.

АКУНЕЦ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1923 г., загінуў 9.3.1943 г.

ЛІХАЛЕЦЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

АКУНЕЦ Ігнат Пятровіч, н. у 1919 г., загінуў у 1940 г. на фінскай вайне.

АКУНЕЦ Аляксандр Васільевіч, н. у 1917 г., маёр, загінуў у Чэхаславакіі ў 1945 г.

АКУНЕЦ Міхаіл Якаўлевіч, н. у 1906 г.

АКУНЕЦ Максім Якаўлевіч, н. у 1925 г.

АКУНЕЦ Васіль Якаўлевіч, загінуў 19.1.1945 г., пахаваны ў г. Гольвандэн ва Усходняй Прусіі.

АКУНЕЦ Васіль Антонавіч, н. у 1924 г., рад.

АКУНЕЦ Анісім Якаўлевіч, н. у 1920 г.

АКУНЕЦ Піліп Аляксеевіч, н. у 1922 г., рад.

АКУНЕЦ Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1915 г., рад., прапаў без вестак.

АКУНЕЦ Іван Барысавіч, н. у 1896 г., рад.

АКУНЕЦ Іосіф Фёдаравіч, н. у 1918 г., загінуў у снежні 1943 г.

АКУНЕЦ Фёдар Барысавіч, н. у 1914 г.

АКУНЕЦ Дарафей Фёдаравіч, н. у 1903 г., загінуў у верасні 1944 г.

АКУНЕЦ Анісім Якаўлевіч, н. у 1889 г., загінуў у красавіку 1944 г.

АКУНЕЦ Іван Адамавіч, н. у 1922 г., загінуў 5.12.1944 г. у Латвіі.

АХРАМОВІЧ Пётр Андрэевіч, н. у 1916 г., загінуў 27.4.1945 г. у Германіі.

АХРАМОВІЧ Іван Клімавіч, н. у 1907 г., загінуў у верасні 1944 г.

АХРАМОВІЧ Сяргей Іванавіч, н. у 1920 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ГЛУШЧЭНЯ Цімафей Апанасавіч, н. у 1907 г., рад., загінуў у 1945 г. у г. Сувалкі.

ГЛУШЧЭНЯ Аляксандр Апанасавіч, н. у 1926 г., загінуў 18.4.1945 г. Пахаваны ў в. Альт-Гранне ў Германіі.

ГЛУШЧЭНЯ Іосіф Піліпавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1944 г.

ГЛУШЧЭНЯ Рыгор Васільевіч, н. у 1907 г.

ДАВІДОВІЧ Данііл Герасімавіч, н. у 1909 г., загінуў у красавіку 1945 г.

ДАВІДОВІЧ Ігнат Аляксеевіч, н. у 1915 г. рад., прапаў без вестак.

ДАВІДОВІЧ Тарас Іванавіч, н. у 1919 г.

ДАВІДОВІЧ Пётр Аляксеевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ДАВІДОВІЧ Ціхан Васільевіч, н. у 1920 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ДАВІДОВІЧ Уладзімір Васільевіч, н. у 1920 г.

ДАВІДОВІЧ Ціхан Фёдаравіч, н. у 1920 г.

ДАВІДОВІЧ Андрэй Антонавіч, н. у 1922 г.

ДАВІДОВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1922 г.

ДАВІДОВІЧ Самуіл Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў у палоне 19.12.1941 г.

ДАВІДОВІЧ Васіль Пятровіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак.

ДАВІДОВІЧ Пятро Рыгоравіч, н. у 1921 г., рад., прапаў без вестак.

ДАВІДОВІЧ Лаўрэнцій Самойлавіч, н. у 1919 г.

ДАВІДОВІЧ Пётр Мікалаевіч, н. у 1919 г., загінуў у 1941 г.

КАТОК Ціхан Васільевіч, н. у 1918 г.

КІРБАЙ Дзмітрый Эдуардавіч, н. у 1901 г.

КУПРАЦЭВІЧ Міхаіл Радзівонавіч, н. у 1908 г.

КУПРАЦЭВІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

КУРЫЛЕЦ Цярэнцій Аляксеевіч, н. у 1915 г.

КУРЫЛЕЦ Раман Мікалаевіч, н. у 1900 г.

КУР'ЯНОВІЧ Іван Мікітавіч, н. у 1884 г.

МАКАРЭВІЧ Раман Данілавіч, рад., загінуў 25.11.1944 г. Пахаваны ў Ліепайскім р. у Латвіі.

МАКАРЭВІЧ Адам Данілавіч, н. у 1920 г.

МАКАРЭВІЧ Іосіф Васільевіч, н. у 1917 г.

МАКАРЭВІЧ Тарас Васільевіч, н. у 1921 г.

МУЛЮК Ігнат Аляксеевіч, н. у 1910 г.

МУСІК Арцём Антонавіч, н. у 1902 г.

МУСІК Васіль Антонавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1944 г.

МУСІК Аляксандр Маркавіч, н. у 1924 г.

МУСІК Аляксандр Іванавіч, н. у 1922 г.

САВАСЦЕНЯ Фёдар Мікалаевіч, камандзір аддзялення, загінуў 20.3.1945 г. у Польшчы.

САВАСЦЕНЯ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1913 г., памёр у 1944 г. у шпіталі ў Ленінградзе.

САВАСЦЕНЯ Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1907 г., загінуў у палоне у 1942 г.

САВАСЦЕНЯ Васіль Міхайлавіч, н. у 1900 г.

САВАСЦЕНЯ Пётр Сямёнавіч, н. у 1913 г., маёр, загінуў у студзені 1943 г.

САВАСЦЕНЯ Сава Іванавіч, н. у 1920 г.

СІНІЛА Адольф Ануфрыевіч, н. у 1922 г.

СТРАХА Міхаіл Сяргеевіч, н. у 1900 г., загінуў у 1945 г.

СТРАХА Васіль Сяргеевіч, н. у 1911 г., загінуў у 1943 г.

СТРАХА Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1910 г., загінуў 12.4.1945 г. Пахаваны на могілках каля в. Грымнітц у Германіі.

СТРАХА Піліп Сяргеевіч, загінуў у жніўні 1944 г.

СТРАХА Аляксей Іосіфавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

СТРАХА Андрэй Сямёнавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

СТРАХА Іосіф Сцяпанавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1945 г.

ЦІМАШЧЭНЯ Андрэй Іосіфавіч, н. у 1916 г.

ЦІМАШЧЭНЯ Аляксей Іванавіч, н. у 1905 г.

ЦІМАШЧЭНЯ Пётр Пятровіч, н. у 1900 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1912 г., загінуў 24.4.1945 г. у Германіі.

ЧАРНАГАЛОЎ Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1903 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Аляксандр Раманавіч, н. у 1917 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1890 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Макар Ягоравіч, н. у 1913 г., загінуў 23.4.1945 г. у Германіі.

ЧАРНАГАЛОЎ Іларыён Канстанцінавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Мірон Цімафеевіч, н. у 1909 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1916 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Лука Іванавіч, н. у 1909 г., загінуў 7.9.1944 г. у Румыніі.

ЧАРНАГАЛОЎ Дзмітрый Сямёнавіч, н. у 1919 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Фёдар Васільевіч, н. у 1918 г., загінуў 12.2.1943 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Сямён Герасімавіч, н. у 1908 г., загінуў 5.10.1941 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Аляксандр Пятровіч, н. у 1924 г., загінуў 19.3.1945 г. у Польшчы.

ШВОРАБ Карней Фёдаравіч, н. у 1909 г.

ЭСМЕНТОВІЧ Сцяпан Раманавіч, н. у 1910 г.

ЭСМЕНТОВІЧ Раман Сцяпанавіч, н. у 1913 г.

ЭСМЕНТОВІЧ Ян Раманавіч, н. у 1911 г.

ВЁСКА ПУХАВІЧЫ

АГІЕВІЧ Аляксандр Нікіфаравіч, н. у 1899 г., загінуў у 1941 г. пад Масквой.

АГІЕВІЧ Павел Давыдавіч, н. у 1909 г., загінуў у верасні 1944 г.

АГІЕВІЧ Ціхан Піліпавіч, н. у 1920 г., загінуў 4.1.1942 г.

АГІЕВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1940 г. у Карэліі ў час фінскай вайны.

АГІЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1924 г., рад., памёр у шпіталі 9.4.1945 г.

АГІЕВІЧ Іван Канстанцінавіч, н. у 1918 г., загінуў у студзені 1944 г.

АКУНЕЦ Арцём Іванавіч, н. у 1902 г., загінуў 22.6.1944 г. Пахаваны ў п. Сарвалі Выбаргскага р.

АЛІФЯРОВІЧ Аляксандр Адамавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1943 г.

АЛІФЯРОВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1920 г., рад., памёр у шпіталі 1.5.1945 г.

АЛІФЯРОВІЧ Адам Мікалаевіч, н. у 1920 г., загінуў 2.2.1943 г.

АЛІФЯРОВІЧ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1924 г., памёр у шпіталі ў Мінску 30.1.1945 г. Пахаваны на вайсковых могілках.

АЛІФЯРОВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1918 г., загінуў у час блакады Ленінграда ў 1942 г.

АЛІФЯРОВІЧ Карней Дзмітрыевіч, н. у 1895 г.

АХРАМОВІЧ Антон Іванавіч, н. у 1909 г., рад., загінуў у 1944 г.

АХРАМОВІЧ Мікалай Ісакавіч, н. у 1923 г., загінуў 22.9.1944 г.

АХРАМОВІЧ Іван Серафімавіч, н. у 1926 г., загінуў 10.3.1945 г. у Польшчы.

АХРАМОВІЧ Навум Фёдаравіч, н. у 1902 г.

БІБІК Кірыл Сямёнавіч, н. у 1908 г., загінуў у студзені 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1924 г., рад., загінуў у 1945 г.

Помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, у в. Пухавічы

КУПРАЦЭВІЧ Пётр Піліпавіч, н. у 1922 г., загінуў у Польшчы ў 1945 г.

КУПРАЦЭВІЧ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1909 г., рад., загінуў 21.10.1944 г. у Польшчы.

КУПРАЦЭВІЧ Пётр Адамавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Ціхан Міхайлавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Ціхан Сямёнавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1941 г.

КУПРАЦЭВІЧ Павел Мікалаевіч, н. у 1922 г., загінуў у студзені 1942 г.

КУПРАЦЭВІЧ Сцяпан Дзянісавіч, н. у 1913 г., загінуў 19.9.1942 г.

КУПРАЦЭВІЧ Трафім Радзівонавіч, загінуў у 1943 г. каля Сталінграда.

КУПРАЦЭВІЧ Трафім Пятровіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Пахом Рыгоравіч, н. у 1902 г.

КУПРАЦЭВІЧ Іосіф Аляксандравіч, н. у 1919 г., загінуў у верасні 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Гаўрыл Якаўлевіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г. пад Варшавай.

КУПРАЦЭВІЧ Елісей Дзянісавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

КУПРАЦЭВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1922 г., загінуў у 1941 г. у Бранску.

КУПРАЦЭВІЧ Іван Андрэевіч, загінуў 22.4.1945 г. у Германіі.

КУРЫЛЕЦ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1921 г., загінуў у лагеры ваеннапалонных у Бабруйску.

МАКАРЭВІЧ Андрэй Васільевіч, н. у 1899 г., загінуў у 1944 г.

МАКАРЭВІЧ Сідар Пятровіч, н. у 1918 г., загінуў 20.2.1945 г. у Польшчы.

МАКАРЭВІЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

МАКАРЭВІЧ Фёдар Герасімавіч, н. у 1900 г.

МАКАРЭВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1921 г., лейтэнант, загінуў у красавіку 1944 г.

МАКАРЭВІЧ Панкрат Васільевіч, н. у 1900 г., загінуў у 1941 г. Пахаваны ў в. Хвашчаватка Варонежскай вобл.

МАКАРЭВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1908 г., удзельнік фінскай вайны, загінуў у 1944 г. у Польшчы.

МАКАРЭВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1919 г., працаваў на Днепрапятроўскім ваенным заводзе, загінуў у час бамбёжкі завода.

МАКАРЭВІЧ Кузьма Пятровіч, н. у 1902 г., рад., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

МАКАРЭВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1923 г., рад., памёр у шпіталі 17.5.1946 г. Пахаваны ў п. Чкалаўск Калінінградскай вобл.

МАКАРЭВІЧ Мітрафан Андрэевіч, н. у 1909 г., загінуў у Сталінградзе ў 1943 г.

МАКАРЭВІЧ Канстанцін Сцяпанавіч, н. у 1906 г., загінуў 17.11.1944 г. у Польшчы.

МАКАРЭВІЧ Емяльян Андрэевіч, н. у 1910 г., загінуў у 1941 г.

МАКАРЭВІЧ Васіль Іванавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1944 г.

МАКАРЭВІЧ Андрэй Максімавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1943 г. у Ленінградзе.

МАКАРЭВІЧ Яўхім Паўлавіч, н. у 1911 г., загінуў у снежні 1941 г.

МАКАРЭВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1903 г., сяржант, загінуў у 1939 г. пад час паходу ў Заходнюю Беларусь.

МАКАРЭВІЧ Мацвей Мікалаевіч, н. у 1926 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы.

МАКАРЭВІЧ Якаў Міхайлавіч, н. у 1921 г., загінуў у снежні 1944 г.

МАКАРЭВІЧ Аляксандр Міхедавіч, н. у 1921 г., рад., прапаў без вестак.

МЕДНІК Сіман Аронавіч, н. у 1905 г.

МЕДНІК Месель Аронавіч, н. у 1903 г.

ШАРАЕВІЧ Макіян Фёдаравіч, н. у 1912 г. Пасля вызвалення раёна працаваў старшынёй калгаса ў Пухавічах, у 1945 г. прызваны ў Чырвоную Армію, загінуў у Польшчы.

ЮХНЕВІЧ Кузьма Васільевіч, н. у 1919 г., вучыўся у Мазырскім настаўніцкім інстытуце. Загінуў у 1944 г. пры пераправе праз р. Заходняя Дзвіна.

ЮХНЕВІЧ Данііл Васільевіч, н. у 1906 г., загінуў у лагеры ваеннапалонных у г. Магілёў.

ЮХНЕВІЧ Карп Трафімавіч, н. у 1905 г., загінуў 28.4.1945 г. у Германіі.

ЮХНЕВІЧ Яўхім Фёдаравіч, н. у 1893 г., загінуў у 1941 г. у раёне Брэста.

ВЁСКА ВІДОШЫН

АГІЕВІЧ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1921 г., загінуў 19.4.1945 г. у Германіі.

АГІЕВІЧ Прохар Сямёнавіч, н. у 1914 г., узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КУПРАЦЭВІЧ Іван Іосіфавіч, н. у 1915 г., бранябойшчык, загінуў у красавіку 1943 г.

КУПРАЦЭВІЧ Трафім Сямёнавіч, н. у 1908 г., загінуў 14.1.1945 г. каля Варшавы.

КУПРАЦЭВІЧ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1925 г., загінуў 2.4.1945 г. у Германіі, у г. Аўрыт.

КУПРАЦЭВІЧ Іван Мікалаевіч, н. у 1924 г., загінуў 1.8.1941 г. у Ленінградзе.

МАКАРЭВІЧ Адам Мікалаевіч, н. у 1907 г., загінуў у красавіку 1945 г.

МАКАРЭВІЧ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1921 г., загінуў у Ленінградскай вобл.

МАКАРЭВІЧ Рыгор Васільевіч, н. у 1908 г., загінуў 26.7.1945 г. пры размініраванні ў Віцебскай вобл.

МАКАРЭВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1921 г., загінуў 29.12.1941 г. у лагеры ваеннапалонных у Брэсце.

МАКАРЭВІЧ Фама Васільевіч, н. у 1913 г., партызан, загінуў 2.3.1944 г. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.



І. М. Савасценя

А. М. Страха

А. С. Страха

А. М. Макарэвіч

МАКАРЭВІЧ Піліп Цітавіч, н. у 1906 г., загінуў у сакавіку 1943 г.

МАКАРЭВІЧ Мікалай Мінавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г.

ПРЫШЧЫЦ Канстанцін Яўхімавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г.

ПРЫШЧЫЦ Адам Яўхімавіч, н. у 1923 г., загінуў 1.10.1944 г. у Карпатах. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медалём «За абарону Сталінграда».

ЧАРНАГАЛОЎ Андрэй Міхайлавіч, партызан, загінуў у сакавіку 1943 г.

ЧАРНАГАЛОЎ Гаўрыл Міхайлавіч.

ВЁСКА СЯМЕНЧА

АГІЕВІЧ Піліп Пятровіч, н. у 1917 г., загінуў у 1945 г.

АКУНЕЦ Кузьма Барысавіч, н. у 1903 г., рад., загінуў 14.1.1945 г.

АКУНЕЦ Іосіф Фёдаравіч, н. у 1918 г., сяржант, загінуў у 1943 г.

КОСАК Андрэй Кірылавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Іван Андрэевіч, н. у 1904 г., загінуў у 1945 г. у Германіі.

МАКАРЭВІЧ Міхаіл Адамавіч, н. у 1921 г., рад., загінуў у 1943 г. пад Сталінградам.

МАКАРЭВІЧ Тарас Васільевіч, н. у 1920 г.

МАКАРЭВІЧ Іосіф Васільевіч, н. у 1918 г.

САВАСЦЕНЯ Ілья Мікалаевіч, н. у 1914 г., загінуў 14.10.1943 г.

САВАСЦЕНЯ Сава Іванавіч, загінуў у снежні 1943 г.

СТРАХА Міхаіл Сяргеевіч, н. у 1900 г.

СТРАХА Аляксей Міхайлавіч, н. у 1924 г., загінуў 22.4.1945 г. у Германіі.

СТРАХА Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1912 г., рад., загінуў у 1945 г.

САВІЧ Іван Канстанцінавіч.

ВЁСКА ПЛАСТОК

АГІЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1919 г.

АГІЕВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1921 г.

КУПРАЦЭВІЧ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1923 г., загінуў 27.10.1944 г. пад Варшавай.

КУПРАЦЭВІЧ Пётр Радзівонавіч, н. у 1897 г., загінуў у красавіку 1944 г.

КУПРАЦЭВІЧ Мікалай Пятровіч, н. у 1919 г.

КУПРАЦЭВІЧ Піліп Дзмітрыевіч, н. у 1913 г., загінуў у 1945 г.

МАКАРЭВІЧ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1926 г., загінуў 28.4.1945 г. у Германіі.

РАГАЛЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1901 г.

РАГАЛЕВІЧ Сямён Рыгоравіч, н. у 1922 г., загінуў 2.1.1943 г. у Растоўскай вобл.

ВЁСКА НАВУЦЬ

АБУХОВІЧ Казімір Паўлавіч, н. у 1919 г., рад., загінуў у 1944 г.

АНОШКА Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1896 г., загінуў у 1941 г.

БАНДЗЮК Іларыён Міхайлавіч, н. у 1913 г.

А. Е. Прышчыц

Г. М. Чарнагалоў

К. Б. Акунец (злева) са сваім франтавым сябрам, аднавяскоўцам П. А. Акунцом

ЗАНЬКО Рыгор Андрэевіч, н. у 1907 г.
ІВАНОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у лютым 1944 г.
МАСЛА Віктар Цімафеевіч, н. у 1925 г.
МАСЛА Мікалай Васільевіч.
МАСЛА Іван Сцяпанавіч, н. у 1911 г.
МАСЛА Данііл Паўлавіч, н. у 1922 г., загінуў 22.1.1945 г. у Калінінградскай вобл.
СВЯТОШЧЫК Васіль Ільіч, загінуў у 1945 г. у Польшчы.
ЯНОВІЧ Аляксандр Цімафеевіч, н. у 1897 г., загінуў 6.2.1945 г. Пахаваны ў Тукумскім р. у Латвіі.

ВЁСКА ХІСЦЕЦКІ БОР

БАНДЗЮК Данііл Фёдаравіч, н. у 1913 г., рад., загінуў у студзені 1944 г.
САЎЧЫЦ Іосіф Пятровіч, н. у 1913 г., загінуў у 1941 г. у Брэсце.
ХІЛЬМАН Васіль Кірылавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1945 г. у Польшчы. Пахаваны ў в. Ракавіц Паморскага ваяв.
КАРЧЭЎСКІ Пётр Браніслававіч, н. у 1924 г., загінуў 21.1.1945 г. ва Усходняй Прусіі.

Запомнім іх маладымі...

Дзе вы, сябры майго далёкага маленства, як склаўся ваш лёс, у якіх месцах, у якіх далёкіх краях склалі вы сваю галаву? Вельмі мала засталося іх, выпускнікоў Жыткавіцкай сярэдняй школы № 1 1940 года. Усіх памятаю, яны нібы жывыя стаяць у мяне перад вачыма... Шлю пісьмы ў архівы і музеі, звязваюся з аднапалчанамі, па крышках збіраю весткі пра баявы шлях і лёс сваіх сяброў. З Масквы паведамілі, што Іван Васільевіч Макарэвіч з першых дзён вайны змагаўся ў раёне Брэсцкай крэпасці і загінуў там, памёр ад цяжкіх ран. 2 красавіка 1945 г. загінуў у Германіі, у горадзе Аўрыт, Аляксей Мікалаевіч Купрацэвіч. Праз некалькі дзён на подступах да Берліна быў забіты Міхаіл Рыгоравіч Агіевіч. Аддаў за радзіму таксама сваё маладое жыццё Адам Яўхімавіч Прышчыц...

У 1941 г. Адаму Прышчыцу яшчэ не споўнілася 18 гадоў, аднак ён так настойліва ірваўся на фронт, што Жыткавіцкі ваенком Раманаў нарэшце здаўся:

— Што з табой зробіш... Будзеш вучыцца ў вайсковым вучылішчы.

Праз некалькі месяцаў паскоранай вучобы ў Растоўскім артылерыйскім вучылішчы — выпуск і накіраванне ў 901-ы артылерыйскі полк камандзірам агнявога ўзвода. Наперадзе было лета 1942 г., Сталінград, Курская дуга... З Галоўнага ўпраўлення Міністэрства абароны краіны па ўліку афіцэрскага саставу паведамілі: «Прышчыц Адам Яўхімавіч загінуў у баях на фронце на гары Губцы, на чэхаславацка-польскай граніцы, 1 кастрычніка 1944 г. За праяўлены гераізм і адвагу ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ст., медалямі «За адвагу», «За абарону Сталінграда».

Камандзір дывізіёна 773-га артылерыйскага палка І. А. Сініцкі, баявы сябра А. Я. Прышчыца, даслаў ліст, у якім вельмі хораша адзываўся аб нашым земляку. «З Адамам нас звязвала моцная дружба,— пісаў І. А. Сініцкі.— Сустрэліся мы ўпершыню летам 1942 г. у раёне горада Ізюма. Адама Прышчыца прызначылі камандзірам 2-га агнявога ўзвода... Цяжкія баі ішлі на Паўднёва-Заходнім фронце. Фашысты рваліся да Волгі і на Каўказ.

Баявое хрышчэнне Адам Прыш-

чыц атрымаў у баі каля вёскі Вішанькі, на Украіне. Яго ўзвод знішчыў 10 варожых танкаў, шмат іншай тэхнікі, чым даў магчымасць стралковым часцям дывізіі выйсці з акружэння.

Затым былі абарона на Паўночным Данцы, Доне, адступленне ў глыб Калмыцкага стэпу, баі ля ракі Церак і ў перадгор'ях Каўказа. Мы служылі з А. Я. Прышчыцам у адным дывізіёне. У пачатку 1943 г. пачалося наступленне і вызваленне Мінеральных Вод, Кубані. Затым нас у саставе дывізіі перакінулі на І-ы Украінскі фронт у раён горада Кіева... У баях на Кубані Адам Яўхімавіч быў прыняты ў члены партыі. Я даў яму рэкамендацыю.

У ліпені 1944 г. наш 773-ці артполк 317-й стралковай дывізіі перайшоў ў наступленне ў Карпатах. Мяне цяжка паранілі. Пасля працяглага лячэння толькі ў лістападзе змог вярнуцца ў полк. А. Я. Прышчыца ў жывых ужо не застаў. Ён загінуў у баях у Карпатах паміж гарадамі Самбур і Турку ў выніку прамога пападання ў траншэю снарада.

Франтавыя таварышы расказвалі мне, што ў той дзень, 1 кастрычніка 1944 г., Адам увесь час знаходзіўся на назіральным пункце, кіруючы агнём сваёй батарэі. Калі батарэя ворага «прыстралялася» на НП, ён загадаў разведчыкам і сувязістам пакінуць яго аднаго і перайсці ў акопы, працягваў весці і карэктыраваць агонь па праціўніку...»

А. М. Купрацэвіч

ЮРКЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЮРКЕВІЧЫ

АСАВЕЦ Рыгор Раманавіч, н. у 1922 г., загінуў 3.10.1942 г. каля г. Ленінграда.

БАШКЕВІЧ Адам Канстанцінавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1944 г.

БАШКЕВІЧ Сяргей Канстанцінавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

БАШКЕВІЧ Іван Канстанцінавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1943 г.

БЕРНАТ А., н. у 1928 г., школьнік-піянер, закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў снежні 1941 г., калі нёс у партызанскі атрад хлеб, выпечаны сялянамі.

БАРЫСЕВІЧ Васіль Піліпавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

БАРЫСЕВІЧ Сяргей Барысавіч, н. у 1900 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

БАРЫСЕВІЧ Мацвей Барысавіч, н. у 1895 г., загінуў у красавіку 1944 г.

БАРОЎСКІ Ігнат Іванавіч, н. у 1907 г., загінуў у красавіку 1944 г.

БАШКЕВІЧ Аляксандр Мікітавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1943 г.

БІРЧЫКАЎ Андрэй Трафімавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1941 г.

ВАТКЕВІЧ Адам Канстанцінавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1942 г.

ВЯЗАРКА Васіль Сямёнавіч, н. у 1922 г., загінуў 12.10.1945 г. на Одэры.

ВЯЗАРКА Фёдар Сямёнавіч, н. у 1925 г., загінуў 24.4.1945 г. у Германіі.

ГАРБУЗ Даніл Сцяпанавіч, н. у 1895 г., загінуў у палоне ў верасні 1943 г.

ДАВЫДОВІЧ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

ДАЛМАТОВІЧ Васіль Сямёнавіч, н. у 1900 г., загінуў у лютым 1943 г. пад Ленінградам.

ДАЛМАТОВІЧ Пётр Фёдаравіч, н. у 1906 г., загінуў 17.2.1943 г. Пахаваны ў в. Рыленка Дубровенскага р. Віцебскай вобл.

ДАЛМАТОВІЧ Максім Фёдаравіч, н. у 1902 г., загінуў у 1942 г.

ДУБІЦКІ Навум Аляксеевіч, н. у 1901 г., загінуў у 1943 г.

ДЗЕМІДОВІЧ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1925 г., загінуў 28.10.1944 г. у Польшчы.

ЖЫТКЕВІЧ Аляксандр Давыдавіч, н. у 1897 г., загінуў 13.12.1941 г. у канцлагеры Масюкоўшчына каля Мінска.

ЕРМАКОВІЧ Лявонцій Рыгоравіч, н. у 1888 г., загінуў у жніўні 1944 г.

ЕРМАКОВІЧ Фёдар Лявонцьевіч, н. у 1922 г., загінуў у красавіку 1944 г.

КАНАПЛЯНІК Дзяніс Якаўлевіч, н. у 1917 г., загінуў у 1942 г.

КАНАПЛЯНІК Сцяпан Іванавіч, н. у 1917 г., загінуў у 1945 г.

КАРПУК Якаў, н. у 1901 г., партызан, загінуў у снежні 1941 г. у Жыткавічах.

КАРПУК Сцепаніда Васільеўна, н. у 1902 г., партызанская сувязная, загінула ў снежні 1941 г. у Жыткавічах.

КЛІМОВІЧ Барыс Якаўлевіч, загінуў у жніўні 1941 г.

КЛІМОВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. у 1922 г., загінуў у красавіку 1944 г.

КЛІМОВІЧ Фёдар Ігнацьевіч, н. у 1919 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

КУРЫЛА Аляксандр Бенядзіктавіч, н. у 1909 г., загінуў у 1945 г.

ЛІСОВІЧ Мікалай Пятровіч, н. у 1921 г., загінуў у 1944 г. у Латвіі, пахаваны каля в. Башкань Янаўцкай вол.

ЛАЗУТА Яўхім Сцяпанавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1943 г.

ЛАЗУТА Міхаіл Якаўлевіч, н. у 1922 г., загінуў у лютым 1942 г.

ЛАЗУТА Яўхім Паўлавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Міхаіл Адамавіч, н. у 1919 г., загінуў 31.1.1945 г. у Польшчы.

ЛАЎНІКОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г. каля г. Ленінграда.

ЛАЎНІКОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1917 г., загінуў 1.3.1944 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Андрэй Мікалаевіч, н. у 1922 г., загінуў 22.3.1944 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Міхаіл Навумавіч, н. у 1914 г., загінуў у верасні 1941 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Даніл Міхайлавіч, н. у 1912 г., загінуў у кастрычніку 1941 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Якаў Міхайлавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Аляксей Несцеравіч, н. у 1902 г., загінуў у верасні 1944 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Гаўрыл Андрэевіч, н. у 1891 г., загінуў у кастрычніку 1941 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Барыс Рыгоравіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г. каля г. Рыга.

ЛАЎНІКОВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1894 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1915 г., загінуў у 1945 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Дзяніс Адамавіч, н. у 1917 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ЛАЎНІКОВІЧ Сцяпан Адамавіч, н. у 1914 г., загінуў 18.9.1945 г. у Германіі.

ЛІСОВІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1916 г., загінуў у 1944 г.

ЛІСОВІЧ Аляксандр Кірылавіч, н. у 1915 г., загінуў у лютым 1943 г.

ЛІСОВІЧ Адам Кірылавіч, н. у 1908 г., загінуў 6.3.1944 г.

ЛІСОВІЧ Міхаіл Кірылавіч, н. у 1903 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ЛІНКЕВІЧ Адам Міхайлавіч, н. у 1921 г., загінуў у 1942 г.

МАЛОЧКА Адам Піліпавіч, н. у 1903 г., загінуў у ліпені 1943 г.

МАЛЬКЕВІЧ Павел Данілавіч, н. у 1921 г., загінуў 8.2.1945 г. у Польшчы.

МАРХОТКА Пётр Міхайлавіч, н. у 1890 г., памёр 1.5.1945 г. у шпіталі ў Германіі.

МАРЦІНОЎСКІ Дзяніс Васільевіч, н. у 1902 г., загінуў у верасні 1941 г.

МАЦВЕЯВЕЦ Яўгенія Сцяпанаўна, падпольшчыца, н. у 1923 г., расстраляна ў лютым 1943 г. у Жыткавічах.

МІХАЛЕВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1911 г., загінуў 2.2.1945 г. у Польшчы.

МІХАЛЕВІЧ Несцер Іванавіч, н. у 1915 г., загінуў у лістападзе 1941 г.

МЫЧКО Уладзімір Барысавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1944 г.

МЫЧКО Нікадзім Васільевіч, н. у 1927 г., загінуў 12.2.1945 г. на Одэры.

МЫЧКО Іван Піліпавіч, н. у 1905 г., загінуў у 1943 г. на Курскай дузе.

МЫЧКО Васіль Барысавіч, н. у 1924 г., загінуў у красавіку 1945 г. пры фарсіраванні р. Одэр.

МЫЧКО Фёдар Васільевіч, н. у 1922 г., загінуў у ліпені 1941 г.

ПІКІН Павел Канстанцінавіч, н. у 1917 г., загінуў у 1942 г.

РАДКЕВІЧ Назар Паўлавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

РАДКЕВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1898 г., загінуў 22.4.1945 г. у Германіі.

РАДКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1919 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

РАДКЕВІЧ Сцяпан Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

РАМАНОВІЧ Васіль Васільевіч, н. у 1915 г., загінуў у 1945 г.

РАМАНОВІЧ Несцер Лявонавіч, н. у 1891 г., загінуў 3.5.1945 г.

РАМАНОВІЧ Сяргей Лявонавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1942 г.

РАМАНОВІЧ Якім Міхайлавіч, н. у 1891 г., загінуў у 1945 г.

РАМАНОВІЧ Фёдар Якімавіч, н. у 1916 г., загінуў у ліпені 1941 г.

РАМАНОВІЧ Рыгор Якімавіч, н. у 1922 г., загінуў 12.3.1944 г.

РАМАНОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1922 г., загінуў у верасні 1941 г.

РАМАНОВІЧ Максім Васільевіч, н. у 1919 г., загінуў у красавіку 1944 г.

РАМАНОВІЧ Сцяпан Мікалаевіч, н. у 1915 г., загінуў у красавіку 1944 г.

СТАХІЕВІЧ Васіль Андрэевіч, н. у 1921 г., загінуў у жніўні 1944 г.

ТАБОЛІЧ Рыгор Піліпавіч, н. у 1897 г., загінуў у 1942 г.

ТРАФІМОВІЧ Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1902 г., загінуў у 1945 г.

УКРАЖЭНКА Мікалай Юр'евіч, н. у 1915 г., загінуў у 1944 г. у Польшчы.

УМІНСКІ Фёдар Адамавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

УМІНСКІ Павел Адамавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1942 г.

ЦІМАШЧЭНЯ Аляксей Іванавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1941 г.

ВЁСКА БАРАВАЯ

ДУДЗІЧ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1918 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ЖУК Казімір Вікенцьевіч, н. у 1919 г., загінуў у студзені 1945 г.

КОРБУТ Марк Сцяпанавіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

МАЙСЮК Павел Раманавіч, н. у 1917 г., загінуў у 1941 г.

МАЙСЮК Юрый Раманавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1941 г.

СТАХІЕВІЧ Максім Харытонавіч, н. у 1906 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

СТАХІЕВІЧ Іван Харытонавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1942 г. каля г. Севастопаль.

СТАХІЕВІЧ Рыгор Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у красавіку 1945 г. у Германіі.

СУДНІК Сцяпан Вікенцьевіч, н. у 1924 г., загінуў 21.1.1945 г. у Прусіі.

СУЛКОЎСКІ Сільвестр Мікалаевіч, н. у 1897 г., загінуў у студзені 1944 г.

СУЛКОЎСКІ Віктар Мікалаевіч, н. у 1905 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

СУЛКОЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1911 г., загінуў 26.2.1945 г. у Літве.

СУЛКОЎСКІ Еўстафій Іванавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1941 г.

ХАРЫТАНОВІЧ Уладзімір Раманавіч, н. у 1926 г., памёр у шпіталі 30.9.1945 г.

ЦЫРЫБКА Іван, н. у 1905 г., сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942 г. каля Жыткавіч.

ВЁСКА БЕЛАЕ

КІРБАЙ Уладзімір Карлавіч, н. у 1912 г., загінуў 9.1.1944 г.

КІРБАЙ Аляксандр Ігнатавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1941 г.

КОРБУТ Мікалай Паўлавіч, н. у 1923 г., загінуў у сакавіку 1943 г.

Коля Корбут вырас у вёсцы Белае, на беразе маляўнічага возера. Ён з дзяцінства пранікся прыгажосцю роднага краю, і таму было надзвычай балюча бачыць, як яго руйнуе вораг, топча яе сваім тупым каваным ботам... Коля са сваімі сябрамі Уладзімірам Радзівонавым, Алімай Кірбай устанавілі сувязь з тымі, хто не сядзеў склаўшы рукі, з першых дзён акупацыі ўступіў у барацьбу з ворагам. Камсамольцы сталі сувязнымі групы Р. М. Лінькова (Баці). Перадавалі ў атрад звесткі аб ворагу, праводзілі людзей у атрад.

Хутка акупанты даведаліся, што хлопцы і дзяўчаты Белага трымаюць сувязь з партызанамі. Заставацца ў вёсцы было нельга, і Уладзімір Радзівонаў з Мікалаем Корбутам пайшлі ў партызаны.

Хлопцы сталі баявымі разведчыкамі. Аднойчы камандзір групы даў заданне Мікалаю Корбуту адправіцца ў Людзяневічы, сустрэць там сувязнога і ўзяць у яго разведвальныя даныя. Трэба было мінаваць некалькі прапускных пунктаў, прайсці ўсю вялікую вёску, дзе на кожным кроку пагражала небяспечная сустрэча з ворагам... Ён прыстроіўся да калоны возчыкаў, якія вярталіся ў вёску з лесу. У Людзяневічах сустрэўся з сувязным, узяў даныя і пачаў такі ж рызыкоўны шлях назад. Ужо перад самым лесам сустрэў ворагаў. Лес быў блізка, аўтаматныя чэргі, што затахкалі ўслед, не прынеслі шкоды.

Але другі раз здарылася бяда. Паміж вёскамі Людзяневічамі і Сялко Мікалай Корбут сустрэўся з вялікай групай немцаў і паліцаяў, якія хацелі захапіць патрыёта жывым. Мікалай адстрэльваўся, але фашысцкая куля абарвала маладое жыццё. Доўгі час ворагі забаранялі вяскоўцам хаваць партызана...

МАРХОТКА Фёдар Пятровіч, н. у 1927 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ПРАКАПОВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1941 г.

ПРЫЛУЦКІ Андрэй Іпатавіч, н. у 1911 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ПРЫЛУЦКІ Іван Сцяпанавіч, н. у 1913 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ПРЫЛУЦКІ Канстанцін Фролавіч, н. у 1906 г., загінуў у жніўні 1944 г.

ПРЫЛУЦКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1914 г., загінуў у маі 1944 г.

ПРЫЛУЦКАЯ Ганна Фёдараўна, н. у 1911 г., партызанская сувязная, расстраляна ў снежні 1943 г. у Жыткавічах.

ПЯТРОЎСКІ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1901 г., загінуў у 1944 г.

ПЯТРОЎСКАЯ Ніна Мікалаеўна, н. у 1925 г., падпольшчыца, загінула ў 1942 г. у Жыткавічах.

РАДЗІВОНАЎ Фёдар Мікалаевіч, н. у 1910 г., загінуў у кастрычніку 1941 г.

РАДЗІВОНАЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1918 г., загінуў у сакавіку 1944 г. у Літве.

РУНКЕВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1907 г., загінуў у 1942 г.

САЛАВЕЙКА Лаўрэнцій Дзмітрыевіч, н. у 1902 г., загінуў 6.11.1944 г.

СКАРГОЎСКАЯ Марыя Лук'янаўна, н. у 1920 г., партызанская сувязная, загінула ў снежні 1941 г. у Жыткавічах.

ЯРОШЫК Сяргей Адамавіч, н. у 1920 г., загінуў у верасні 1944 г.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Вайна ўскаласіла на сваіх крывавых палях доўгачаканую перамогу, але з вольнай беларускай зямлі яшчэ доўга не выветрываўся едкі пах пораху, радасць вызвалення была настоена на горы і слязах... 5 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Тураў, 6 ліпеня — Жыткавічы. Фронт імкліва пакаціўся на захад, і праз некалькі дзён ужо не было чуваць гарматных выбухаў. Людзі пасля трохгадовай змрочнай ночы акупацыі пачалі на папялішчах ладзіць мірнае жыццё. Не было цягла, інвентару, хлеба, кармоў для жывёлы — усё патрабавалася здабываць з неймавернымі цяжкасцямі, абыходзіцца без самага надзённага. І не хапала працоўных рук — колькі людзей загінула на франтах і ў партызанскіх атрадах, спалена і расстраляна мірных жыхароў, колькі знаходзілася на палях бітваў, і адразу пасля вызвалення пачалася новая мабілізацыя... Горыч ад тых велізарных страт не забылася, неймаверны ўрон дае адчуваць сябе і сёння, праз 50 гадоў пасля вайны.

Зямля, асабліва шырокія палі ў ваколіцах Турава, дзе на працягу амаль чатырох месяцаў, пачынаючы з сакавіка 1944 г., спынілася няўстойлівая лінія фронту, была густа засмечана зброяй, мінамі і снарадамі, і мірныя жыхары, асабліва дасціпныя дзеці, нярэдка гінулі ўжо пасля вызвалення, пад мірным небам. Смертаносныя сляды вайны сустракаюцца ў цярплівай зямлі і да нашага часу — плуг не-не ды і чыркне аб праіржавеўшы і ад таго яшчэ больш небяспечны снарад ці міну. Так загінуў больш чым праз 30 гадоў з дня перамогі наш слабуты зямляк, хлопец з в. Бярэжцы Міша Мароз, які нарадзіўся пасля вайны і яна, здавалася, не павінна была ніякім чынам закрануць яго...

Вясной напярэдадні вызвалення сяляне засявалі хто як мог лапікі бульбы і зерневых, голад ужо не пагражаў. Райкомы партыі, выйшаўшы з падполля, адразу пачалі арганізоўваць узнаўленне калгасаў, што існавалі да вайны. У Ленінскім раёне яшчэ вясной, да вызвалення, партызанскія падраздзяленні разам з баявымі задачамі атрымлівалі заданні садзейнічаць сяўбе ў вёсках, ахоўваць мірныя работы на палях. Былыя партызанскія важакі станавіліся на чале мірнага будаўніцтва, узначальвалі райкомы партыі і райвыканкомы. Сярод іх былі партызанскі генерал В. З. Корж, былы камандзір 50-й Жыткавіцкай брыгады У. І. Гушчэня, прызначаны старшынёй РВК у Жыткавічах, і першы сакратар райкома партыі І. К. Талкачоў, камандзіры і камісары партызанскіх атрадаў Ф. І. Яфімовіч, П. Р. Катовіч, Р. М. Ігнаценка — кіраўнікі Ленінскага раёна, М. М. Бяляўскі і А. А. Жыгар — Тураўскага раёна і многія іншыя. Ад мабілізацыі вызвалены былыя парты-

Мінулі баявыя будні... Былыя воіны і партызаны на мірнай гаспадарчай рабоце (злева направа): В. І. Прасолаў, камандзір партызанскага атрада «За Радзіму», П. І.Тарасюк, камісар, М. І. Засінец, намеснік камандзіра атрада па разведцы, М. А. Якубоўскі, партызан, Р. І. Бабёр, разведчык.

заны, перад якімі ставілася задача ўздымаць на вызваленай зямлі сельскую гаспадарку, ладзіць калгасы, арганізоўваць школы. Сярод іх быў першы пасля вайны загадчык райана У. А. Галавач, галоўны ўрач Жыткавіцкай райбальніцы Я. І. Маўшовіч, праслаўлены ў будучым старэйшы ў рэспубліцы старшыня калгаса «1 Мая» М. А. Якубоўскі, які на працягу больш 30 гадоў кіраваў гаспадаркай, тройчы ўзнагароджаны ордэнам Леніна, шэрагам іншых баявых і працоўных ордэнаў і многія іншыя. У жніўні 1944 г. пачала выходзіць Жыткавіцкая раённая газета «Ленінскі шлях», якая вяла невясёлую, але аптымістычную хроніку мірнага жыцця: у вёсках рыхтуюцца да адкрыцця школ, на палі калгаса імя Дзяржынскага выйшаў першы адрамантаваны трактар, калгаснікі прыступаюць да сяўбы азімых, у многіх гаспадарках выкарыстоўваюць на палявых работах непрадукцыйных кароў (іншы раз у плуг запрагаліся восем жанчын), у калгасныя засекі засыпаецца насенная бульба... Да вайны ў Жыткавіцкім і Тураўскім МТС налічвалася каля 60 трактароў, цяпер не было ні аднаго, будынкі станцый знішчаны. Рабіліся ўсе захады для таго, каб узнавіць дзейнасць МТС і аказваць дапамогу калгасам. Сяляне недалічвалі звыш 30 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы ў грамадскім і прыватным сектары, 8 тыс. коней. З першых дзён пасля вызвалення сяляне пачалі атрымліваць адчувальную дапамогу ад дзяржавы — насенне, інвентар, жывёлу. У 1945 г. з Германіі па рэпатрыяцыях пачала паступаць буйная рагатая жывёла так званай нямецкай — чорна-белай пароды, коні.

Першы сакратар Тураўскага райкома партыі М. М. Бяляўскі на раённым справаздачным сходзе 28 ліпеня 1946 г. гаварыў: «З дня вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пабудавана 2495 дамоў і падрыхтавана 283 зрубы, адноўлена 38 калгасных пабудоў, 7 культурна-бытавых памяшканняў, пабудавана 10 калгасных цагельных заводаў, якія выпусцілі 257 тыс. штук цэглы-сырцу, і два раённых заводы — 272 тыс. штук цэглы. Працуюць 22 будаўнічыя брыгады»...

Людзі перад вызваленнем жылі ў лесе, з прыходам Чырвонай Арміі выходзілі з лясных буданоў, ладзілі зямлянкі, прыстасоўвалі для жылля ўцалелыя хлявы. Гэтаму ў значнай меры садзейнічала тое, што бясплатна выдзяляліся будаўнічыя матэрыялы, лес, сяляне атрымлівалі доўгатэрміновыя крэдыты. Толькі ў 1947 г. было выдзелена звыш 1400 тыс. руб. крэдытаў. Паступова людзі перасяляліся з зямлянак у хаты. Да 1950 г. будаўніцтва ва ўсіх трох раёнах было ў асноўным закончана. Асабліва добра наладжана справа ў Марохараўскім сельсавеце, старшыня якога А. І. Купрацэвіч, былы франтавік, за высокія тэмпы будаўніцтва жылля ў сельсавеце ў 1949 г. быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Становішча ў вёсках крыху па-

ляпшалася па меры прыходу ўцалелых франтавікоў, але вярталіся нямногія. Былыя воіны займалі найбольш адказныя і нялёгкія пасады — старшынь калгасаў і сельсаветаў, брыгадзіраў, настаўнікаў. Вялікая патрэба была ва ўсім, асабліва ў солі, газе, вопратцы, посудзе. Разбураная прамысловасць не магла ў першыя пасляваенныя гады задаволіць патрэбы насельніцтва, людзі выходзілі з становішча хто як мог — ткалі зрэбную тканіну, абменьвалі соль на гародніну ў тых небарак, якіх гнаў голад з Украіны. Усе сілы і час забірала калгасная работа, якая амаль не аплачвалася. Асабліва пакутавалі салдацкія і партызанскія ўдовы з дзецьмі, для якіх і будаўніцтва жылля, і сяўба — у апошнюю чаргу. Дапамогу ад дзяржавы на першым часе многія з іх не атрымлівалі. Мізэрная плата за калгасную працу да 1966 г. была выключна працаднямі, якія ніколькі не важылі — у іншыя гады на працадзень выдавалі 50—100 г зерня, крыху больш — бульбы, некалькі капеек. Патрэбнасць у грашах у нейкай меры мог забяспечыць толькі рынак у раённым цэнтры, кожная капейка была на ўліку...

Адразу пасля вызвалення раёна адкрываліся школы. У Жыткавіцкім раёне ў 1944 г. было 26 настаўнікаў, з іх толькі чацвёра мужчын — інвалідаў і хворых, вызваленых ад прызыву ў армію. Вучні, іншыя з якіх ішлі ў першы клас у 10—11-гадовым узросце, сядалі за лавы ў прыстасаваных класах ва ўцалелых хатах і хлявах, пісалі вуголлем на самаробных дошках, у сшытках, зробленых са старых газет, нямецкай абгортачнай паперы.

Немцы спалілі ў Жыткавічах пабудаваны перад вайной прыгожы і прасторны раённы Дом культуры, у агні загінула вялікая бібліятэка. Пасля вызвалення раённага цэнтра ў маленькім пакоі часовай чыгуначнай станцыі была адкрыта невялікая бібліятэка. Вялікі аматар сваёй справы бібліятэкар М. І. Вазнюк збірала ў людзей па кніжцы, узнаўляла бібліятэчны фонд. Праз некаторы час бібліятэка папоўнілася літаратурай, прысланай з Мінска. У Юркевічах, Браніславе, Людзяневічах і Ляхавічах былі арганізаваны хаты-чытальні. Выканком райсавета дэпутатаў працоўных 12 красавіка 1946 г. пастанавіў: знайсці больш зручнае памяшканне для раённай бібліятэкі; забяспечыць бібліятэку трыма лямпамі і 20 літрамі газы на месяц, рэгулярнае атрыманне харчавання па ўстаноўленых нормах работнікам бібліятэкі.

У жніўні 1946 г. рашэннем райвыканкома прадугледжвалася будаўніцтва новага памяшкання пад РДК, дзе запланавана размясціць бібліятэку. На гэта выдзялялася 500 тыс. рублёў. Новы Дом культуры планавалася адкрыць у жніўні 1947 г., але ён быў адкрыты толькі ў канцы 1948 г. У раённай бібліятэцы ў гэты час налічвалася звыш 5 тыс. кніг.

У Ленінскім раёне, утвораным Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 15 студзеня 1940 г., у заходняй яго частцы, далучанай да БССР у верасні 1939 г., пачынаючы з 1948 г. арганізоўваліся калгасы: у п. Ленін — «17 верасня», у В. Сцяблевічах — імя Калініна (старшыня А. М. Бакуновіч), у Палосцевічах — імя Кірава (старшыня У. А. Верабей), у Цімашэвічах — імя Чапаева, у Грычынавічах — імя Будзённага (старшыня Б. П. Пракаповіч), у Н. Залюцічах — «Зара» (старшыня А. П. Басарановіч), у Ст. Мілевічах — «Чырвоны Кастрычнік» (старшыня А. Г. Мацукевіч), у Грабаве — «Маяк сацыялізму» (старшыня А. І. Прышчык), у Беразняках — «Сцяг камунізму» (старшыня С. С. Басарановіч). У 1944 г., яшчэ да пачатку калектывізацыі, для дапамогі сялянскім гас-

падаркам у Ленінскім раёне была створана МТС, дырэктарам якой быў прызначаны М. М. Конышаў, затым — Я. В. Рагожын. Пры МТС працавалі курсы трактарыстаў. Зямля, наогул малаўрадлівая ў гэтым кутку, давала малую аддачу на старанне сялян — было мала жывёлы і не хапала гною, аб мінеральных угнаеннях нават не чулі. Збіралі па 6—8 ц з гектара збожжа, да 60 ц — бульбы. Краіна адчувала вялікую патрэбу ў натуральным каучуку і гуме, таму значныя плошчы адводзіліся пад кок-сагыз. У сакавіку 1953 г. камсамольцы і моладзь калгаса «Новае жыццё» звярнуліся да ўсіх маладзёжных калектываў вобласці ўдзельнічаць у сацыялістычным спаборніцтве за атрыманне найбольшага збору кок-сагызу. Гэтая культура, якая была не прыгодная да прыродных умоў Палесся, да сярэдзіны 50-х гадоў выведзена з палёў.

З дакладу старшыні Жыткавіцкага райвыканкома т. Анціпенкі на 12-й сесіі райсавета народных дэпутатаў «Аб рабоце выканкома райсавета за 1949 г.»:

«...Мясцовая прамысловасць раёна складаецца з райпрамкамбіната, арцелей «Яднанне», «Перамога», «Пагранічны цагельнік», «30 гадоў БССР». Да апошняга працавалі райхарчкамбінат і прамкамбінат райспажыўсаюза, якія цяпер ліквідаваны. У раёне ёсць прамысловасць саюзнага і рэспубліканскага значэння — леспрамгас, вытворчы участак Палескага хімлясгаса, маслапром, рыбгасы «Белае», «Чырвонае Палессе» і «Чырвоная Зорка», а таксама новае прадпрыемства Рудня-Грэбень, на базе якога будзе пабудавана міжраённая электрастанцыя. Па пяцігадоваму плану прамысловасць Жыткавіцкага раёна павінна даць валавую прадукцыю за 1949 г. у суме 2 млн. 451 тыс. 890 руб. Фактычна за 1949 г. выпуск прадукцыі склаў 2 млн. 91 тыс. 868 руб.— 89 % да плана...

Асноўнае значэнне ў рабоце мясцовай прамысловасці мае райпрамкамбінат. Усе цэхі выканалі і перавыканалі планавыя заданні года. План выпуску валавой прадукцыі арцеллю «Яднанне» за 1948 г. выкананы на 39 %. Арцель выпускае прадукцыю нізкай якасці, асабліва шавецкі і сапожны цэхі. Арцель інвалідаў «Перамога» выканала план на 80 %. План лесанарыхтовак леспрамгасам на год — 59 тыс. кубаметраў драўніны. Выканаць план дапамагаюць калгасы, якія пасылаюць сваіх людзей на лесанарыхтоўкі. Вытворчы ўчастак хімлясгаса выканаў план за 1949 г. на 140 %.

Будаўніцтва торфапрадпрыемства Рудня-Грэбень разлічана на тры гады. Праводзіцца набор на работу людзей.

У калгасах «Заветы Леніна», «Чырвоная Яміца», «Камінтэрн», ім. Жданава атрымана ўраджайнасць 13—18 ц зерневых і 5—7 ц тэхнічных культур з гектара. Гадавы план работы МТС выкананы ў поўным аб'ёме.

Выкананне плана здачы пагалоўя жывёлы калгасамі раёна: коні — план 1450 галоў — здадзена 1420, буйная рагатая жывёла — план 7700—7295, з іх кароў — 100, здадзена 597, авечкі — план 2400—2384, свінні — план 1400—1276, птушка — план 9000—8400.

Пасяўныя плошчы пад ураджай 1950 г. складаюць 10 662 га...

У раёне маецца 12 хат-чытальняў, дзве сельскія бібліятэкі і 7 на прадпрыемствах.

Дрэнна працуе аддзел кінафікацыі (заг. аддзела т. Гітэльман). Калі ў райцэнтры карціны дэманструюцца параўнальна нядрэнна, то на перыферыі — нікуды не варта.

У раёне маецца 54 школы, з іх сярэдніх 1, няпоўных сярэдніх 10, пачатковых 43. У 1948/49 г. у шко-

лах навучалася 5230 вучняў, на паўторны курс пакінута 718. Лепшыя школы па вучэбна-выхаваўчай рабоце — Людзяневіцкая сямігадовая (дырэктар Кулінш), Дзякавіцкая сямігадовая (дырэктар Мятлушка).

У гарадскім пасёлку маецца бальніца — стацыянар на 55 ложкаў, паліклінічнае аддзяленне, венкабінет, тубкабінет, пункт хуткай дапамогі, жаночая кансультацыя. Адкрыты дзіцячыя яслі на 25 месц. Працуюць Людзяневіцкае і Руднянскае лекаб'яднанне па 10 ложкаў кожнае, медыцынскія ўчасткі — Юркевіцкі, Вятчынскі, Пухавіцкі і фельчарска-акушэрскія пункты: Браніслаўскі, Бялёўскі, Дзякавіцкі. Функцыянірующь малярстанцыя і санстанцыя...»[1].

У 1949 г. пачалося будаўніцтва торфапрадпрыемства «Руднянскае Грэбень», узводзіліся жылыя дамы, грамадскія памяшканні. На месцы былых багнаў і непраходных балот пачалася фрэзерная здабыча торфу. У 1976 г. пасёлак торфаздабытчыкаў названы Грабянёўскім. Акультураныя торфараспрацоўкі і матэрыяльна-тэхнічная база перададзены саўгасу «Жыткавічы». Пачалося таксама будаўніцтва вузкакалейкі Лельчыцы — Тураў.

У першыя пасляваенныя гады у в. Буда пачаў працаваць цагельны завод, у в. Грабаў — смалакурны, у в. Цімашэвічы працаваў леспрамгас. У Леніне быў арганізаваны райпрамкамбінат. У в. Сцяблевічах пачатковая школа была арганізавана яшчэ ў час акупацыі, у 1943/44 навучальным годзе. Пасля вызвалення раёна дзеці займаліся па чарзе ва ўцалелых хатах вёскі. У 1947 г. адной з першых у раёне пры актыўным удзеле настаўніка У. У. Баярына, былога партызана-каўпакаўца, была пабудавана школа. Да сярэдзіны 50-х гадоў школы пабудаваны ва ўсіх найбольш буйных вёсках раёна, у Леніне ў 1983 г. узведзены новы тыповы трохпавярховы будынак школы. У 1993 г. у вёсцы пабудаваны сельскі Дом культуры, стары будынак клуба перададзены мясцовай абшчыне ЕХБ пад малітоўны дом.

Вялікую работу па ахове здароўя насельніцтва ў пасляваенныя гады праводзіла Л. М. Загорац. З 1947 г. з часу адкрыцця ў Леніне фельчарска-акушэрскага пункта загадчыцай яго працуе Г. І. Баярына. На яго аснове была адкрыта бальніца і сельскі радзільны дом. Загадчыцамі ФАПаў у тыя цяжкія гады працавалі ў в. Цімашэвічах Т. П. Кецка, у Ст. Мілевічах — Н. М. Выхадцава.

Адбудоўваўся разбураны вайной старажытны Тураў. Да сярэдзіны 50-х гадоў быў у асноўным узноўлены жылы фонд пасёлка, былі здадзены ў эксплуатацыю некалькі шматкватэрных дамоў. Пачалося будаўніцтва аўтамабільнай дарогі Азяраны — Лельчыцы. Адкрыты КБА, кафэ, некалькі магазінаў і універмаг. З 1967 г. працуе АТС, у 1970 г. пабудавана новая трохпавярховая школа № 2. У 1975 г. уступіла ў дзеянне аўтастанцыя, на старадаўняй Чырвонай плошчы пабудаваны дзіцячы сад. Прыняла хворых сучасная бальніца, актыўны ўдзел у будаўніцтве якой прыняў урач Волкаў. У 1983 г. у цэнтры Турава ўзведзены сучасны будынак гарсавета.

9 студзеня 1952 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР быў ліквідаваны гарадскі пасёлак Ленін Ленінскага раёна Пінскай вобласці, які страціў за гады вайны большую частку насельніцтва і практычна ўвесь жылы фонд (адміністрацыйны цэнтр Ленінскага раёна ў пасляваенны час знаходзіўся ў гарадскім пасёлку Мікашэвічы). Ленін быў уключаны ў склад Сцяблевіцкага сельскага Савета. Стара-

[1] Тураўскі краязнаўчы музей.



На таку калгаса «Новае жыццё». 1950 г.

даўняе паселішча, вядомае мястэчка, населенае ў асноўным яўрэйскімі рамеснікамі і гандлярамі, самая ўскраіна Польскіх крэсаў дасягнула найбольшага развіцця менавіта ў час польскага гаспадарання — і хутка зусім заняпала (цяпер тут знаходзіцца цэнтральная сядзіба саўгаса «Ленінскі»).

8 студзеня 1954 г. была скасавана Палеская вобласць з цэнтрам у г. Мазыры і перададзена ў склад Гомельскай вобласці. Мілевіцкі і Ленінскі сельскія Саветы на той час Брэсцкай вобласці перайшлі ў склад Жыткавіцкага раёна. 17 красавіка 1962 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета рэспублікі ліквідаваў Ленінскі і Тураўскі раёны, далучыўшы іх часткова да Жыткавіцкага раёна — Верасніцкі, Азяранскі, Перароўскі, Рычоўскі сельскія Саветы, а таксама гарадскі пасёлак Тураў з падначаленымі пасялковаму Савету населенымі пунктамі.

19 лістапада 1971 г. гарадскі пасёлак Жыткавічы быў пераўтвораны ў горад раённага падпарадкавання.

Жыткавіцкая электрастанцыя магутнасцю 57 кВт дала першы ток у лютым 1955 г. Тады ж былі перададзены ў эксплуатацыю электрасеці даўжынёй каля 8 км. Электрыфікаваны вуліцы Маркса, Чкалава, Леніна, Энгельса, Фрунзе, Дзяржынскага, Свярдлова і часткова Камсамольская ў Жыткавічах. У 1960 г. электрычнасць даваў энергацягнік і дызель «Шкода» агульнай магутнасцю 1320 кВт. Уступіла ў дзеянне ЛЭП-35 Жыткавічы — Тураў працягласцю 25 км у 1962 г., пабудавана ЛЭП-110 да Петрыкава, раён быў падключаны да Беларускай электрычнай сістэмы. А ў 1967 г. поўнасцю закончана электрыфікацыя раёна.

У 1959 г. на базе Жыткавіцкага райпрамкамбіната, які адлічваў сваю біяграфію з 1930 г., быў створаны раённы камбінат бытавога абслугоўвання.

Да 50-х гадоў адносіцца эканамічны ўздым шырока вядомых цяпер калгасаў Тураўшчыны — «Новае жыццё» (г. п. Тураў), імя Жданава (в. Верасніца), «Перамога» (в. Запясочча), «Савецкая Беларусь» (в. Пагост), а таксама «III Інтэрнацыянал» (в. Бялёў), імя Леніна (в. Мароха-раў) і іншых. Шчырая праца калгаснікаў яшчэ першага пакалення, загартаваных у полымі нядаўна адгрымеўшай вайны, дбайнае кіраўніцтва гаспадаркі здольнымі кіраўнікамі калгаснай вытворчасці, такімі, як М. Я. Белка, А. С. Сяргейчык, І. Ф. Сулкоўскі, М. А. Якубоўскі, М. І. Засінец — у большасці ветэранамі калгаснай вытворчасці, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, з году ў год давалі істотны плён. У вялікай пашане была кукуруза, многія гаспадаркі збіралі ўраджай зялёнай масы па 700—800 ц з гектара. Асабліва высокія ўраджаі ўсіх сельскагаспадарчых культур атрымлівалі на ўрадлівых тураўскіх чарназёмах, большая частка якіх вёснамі затаплялася вадой Прыпяці. У 60-х гадах рэкорднымі ўраджаямі зерневых лічылася да 30 ц з гектара, бульбы — каля 150 ц, буракоў — 300 ц. З году ў год гэтыя лічбы павышаліся, і цяпер нормай стаў, напрыклад, ураджай збожжа 50—60 ц з гектара, а галоўны аграном калгаса «Перамога» Н. Мельнікава імкнецца атрымаць да 100 ц. У 1992 г. у калгасе «Перамога» атрымана 59 ц з гектара зерневых, 230 ц бульбы, «1 Мая» — адпаведна 56 і 190 ц, «Новае жыццё» — 58 і 140 ц. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых у раёне склала 37 ц з гектара, бульбы — 134 ц.

Ураджай 1993 г. амаль поўнасцю быў знішчаны ў выніку стыхійнага бедства, паводкі і буры, але ў лепшых гаспадарках яго змаглі часткова выратаваць, забяспечыць сябе на наступны год насеннем.

Тураўшчына — гераічная зямля з незапамятных часоў, стала калыскай герояў і ў навейшай гісторыі. Менавіта тут вырас адзіны ў раёне поўны кавалер ордэна Славы М. С. Струк. У 1966 г. першай у раёне было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы галоўнаму аграному тураўскага калгаса «Новае жыццё» М. С. Ісаевай. Адзначана Залатой Зоркай ударная праца лепшых калгаснікаў-тураўцаў С. І. Марусіч, А. М. Тачыла, М. В. Рудэнка. Цяжка пералічыць ардэнаносцаў Тураўшчыны, адзначаных высокімі ўрадавымі ўзнагародамі.

У 60-я гады, калі ў сялян упершыню з'явіліся грошы, якія яны хоць у мізэрнай долі пачалі атрымліваць за сваю працу ў калгасе, узнялося значэнне і роля ў жыцці сельскага працаўніка спажывецкай кааперацыі. У першыя гады савецкай улады ў мястэчку адкрылі свае прыватныя крамы прадпрымальнікі-гандляры Старобінскі, Шуб, Грэнадзёр і Чуднер, працаваў дзяржаўны кааператыўны магазін. У 1926 г. створана Жыткавіцкае спажывецкае таварыства, першым старшынёй яго быў Гурскі.

Мясцовыя таварыствы былі арганізаваны ў Людзяневічах, Вятчыне, Пухавічах і Юркевічах; і да 30-га года гандаль поўнасцю быў у руках спажыўкааперацыі. У 1967 г. тавараварот таварыства дасягнуў 12,9 млн. рублёў, узросшы за апошнія гады больш як у чатыры разы. Была пастаўлена задача зачыніць апошнія чатыры лаўкі на даму, перавёўшы іх у спецыяльна пабудаваныя будынкі.

Вялікае значэнне для гаспадарак Тураўскай зоны мела адкрыццё ў 1985 г. маста праз р. Прыпяць даўжынёй звыш 1 км. Ранейшая паромная пераправа затрымлівала зносіны і забірала шмат часу ў сельскіх працаўнікоў. Дарога да Турава стала нібы намнога карацейшай.

У 50-х гадах у калгасах і саўгасах распачаліся меліярацыйныя работы, якія вяліся на балотах, хмызняках уручную — капалі канавы, высякалі расліннасць. Пасяўныя плошчы і сенажаці паступова расшыраліся, а ў 60—70-х на Палессе прыйшла вялікая меліярацыя. Работы вяліся магутнай тэхнікай за кошт дзяржавы.

На меліяраваных плошчах вакол возера Чырвонае на базе аддзялення саўгаса «Жыткавічы» у 1974 г. на плошчы 5600 га быў створаны новы саўгас «Чырвоны бор», які ўзначаліў вядомы ў раёне кіраўнік сельскагаспадарчай вытворчасці, узнагароджаны ордэнам Леніна, М. У. Кунько, у 1982 г.— саўгас імя Аляксіеўскага. Комплекс работ на будаўніцтве новых саўгасаў выкананы пінскім трэстам «Галоўпалессеводбуд».

У 1980 г. пачалося будаўніцтва і праз два гады выдаў першую прадукцыю Жыткавіцкі маторабудаўнічы завод Міністэрства авіяцыйнай прамысловасці СССР, які ўваходзіць у Рыбінскае авіяцыйнае маторабудаўнічае аб'яднанне. Завод выпускае запчасткі, турбастартэры, масляныя насосы, тавары народнага спажывання для краін садружнасці і на экспарт за рубеж.

З торфабрыкетнага завода ў п. Грабянёўскі штогод адгружаецца каля 100 тыс. тон торфабрыкету для патрэб арганізацый і насельніцтва раёна. Вытворчае аб'яднанне «Жыткавічлес» нарыхтоўвае 250 тыс. кубічных метраў драўніны. У Тураве адразу пасля вайны быў адкрыты кансервавы завод. Пасля карэннай рэканструкцыі і расшырэння ён дае 1300 тыс. умоўных шклянак гароднінных і садавінных кансерваў, плануецца павелічэнне яго магутнасцей у 1,6 разу. На тэрыторыі раёна знаходзіцца тры рыбгасы — «Белае», заснаваны памешчыкам М. Агаркавым яшчэ ў пачатку стагоддзя, які ў 1992 г. паставіў дзяржаве 973 т рыбы, «Чырвоная Зорка» — 312 т і «Чырвонапалескі» — 139 т.

Пашыраюцца і забудоўваюцца гарадскія пасёлкі Тураў і Жыткавічы. У 1980 г. было ўрачыста адсвяткавана 1000-годдзе найстаражытнейшага горада Беларусі, устаноўлены мемарыяльныя знакі ў гонар юбілея, новыя помнікі на брацкіх могілках воінаў і партызан, загінуўшых пры вызваленні Турава, стэла ў памяць мірных жыхароў, закатаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Цэнтр старажытнага горада ўпрыгожыў сучасны будынак пасялковага Савета, рэстаўрыравана гасцініца, пабудаваны новы уні-



Пасёлак Чырвонае

Вёска Града, цэнтральная сядзіба калгаса «XX партз'езд»

вермаг. 11 мая 1993 г. у дні славянскай культуры на старажытнай Замкавай гары адкрыты помнік Кірыле Тураўскаму.

Распрацаваны генеральны план забудовы раённага цэнтра і асобных вёсак. У Жыткавічах па генплану тыпавымі шматпавярховымі жылымі дамамі забудаваны мікрараёны № 2, Азёрны, аб'екты бытавога прызначэння. 9 мая 1993 г. у райцэнтры ў скверы каля чыгуначнага вакзала адкрыты помнік работы скульптара Ю. А. Платонава на брацкай магіле воінаў і партызан, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Зачапіла сваім злавесным крылом Жыткавіцкі раён чарнобыльская бяда. Найбольш забруджанымі аказаліся вёскі Ленінскага сельскага савета — Грычынавічы, дзе забруджанасць дасягае 7,95 кюры на 1 кв. м, Буда — 5, В. Сцяблевічы — 4,7 кюры, гэта значыць, 2,7 % тэрыторыі раёна. Тэрыторыя іншых вёсак Ленінскага, Юркевіцкага, Людзяневіцкага, Браніслаўскага сельскіх Саветаў, Жыткавіцкага гарадскога Савета аказалася ў зоне забруджанасці ад 1 да 5 кюры на 1 кв. км — 45 %. Для тых, хто аказаўся ў забруджанай радыенуклідамі зоне, будуецца жыллё ў чыстай зоне. Узведзена па 50 дамоў у в. Сяменча, Азяраны, Дуброва, Мілевічы, 150 — у в. Бялёў, 20 — у Дзякавічах, 10 — у Градзе, а таксама жылыя дамы ў Жыткавічах. Будаўніцтва жылля для перасяленцаў працягваецца, шырока вядзецца таксама будаўніцтва жылых дамоў і катэджаў у вёсках раёна, у Жыткавічах і Тураве.

Кожны час адметны сваімі клопатамі і праблемамі, і ўжо чарнобыльская навала адступае на другі план пад цяжарам новых задач і турбот працаўнікоў вёскі. Распад СССР выклікаў шэраг праблем, пра якія яны раней і не здагадваліся. Нават кожная пасяўная і ўборачная кампаніі натыкаюцца на такія матэрыяльныя і тэхнічныя цяжкасці, што правядзенне іх можа прыраўноўвацца да сапраўднага працоўнага подзвігу... Тым не менш хлебаробы, жывёлаводы, спецыялісты сельскай гаспадаркі імкнуцца не здаваць сваіх рубяжоў, слава пра якія здаўна ішла па рэспубліцы.

В. Р. Феранц, В. В. Нікановіч

Працай залечвалі раны

Яшчэ грымелі баі...

У 1944 г., яшчэ да вызвалення раёна, я быў прызначаны загадчыкам райана. Адразу пасля вызвалення раёна былі адкрыты сярэдняя школа ў Жыткавічах, пяць няпоўных сярэдніх — у Людзяневічах, Браніславе, Кольна, Бялёве, Пухавічах і пяць пачатковых.

На жнівеньскую параду настаўнікаў у 1944 г. прыйшло 26 чалавек, з мужчын былі І. К. Голад, Ф. Т. Наумовіч, М. І. Гаўрыленка і я. Прыпамінаю такі выпадак. Калі я праводзіў параду, мне сказалі, што на вуліцы стаіць настаўніца і саромеецца зайсці, таму што ў лапцях. Я выйшаў, прывёў яе... З дапамогай гэтых 26 настаўнікаў трэба было адкрыць у раёне 52 школы. У настаўнікі бралі ўсіх, хто быў крыху пісьменны.

Найцяжэйшым было матэрыяльнае становішча. З жардзін збівалі козлы, каб пасадзіць вучняў, фанерыну прыладжвалі пад дошку. Пісалі на старых газетах, абгортачнай паперы. Падручнікі выдавалі па адным на школу.

Для выкладання ў сярэдняй школе ў Жыткавічах знайшлі выкладчыкаў мовы, гісторыі і літаратуры, а матэматыка не было. Прышлося ехаць у Мікашэвічы Ленінскага раёна, там працавала настаўніца матэматыкі Ева Шуб. Яна згадзілася два дні ў тыдзень прыязджаць да нас і вучыць выпускныя класы.

У 1945 г. пачалі вяртацца з арміі настаўнікі-франтавікі. Сярод іх былі У. М. Некрашэвіч, С. П. Ачапоўскі, Г. І. Палівіч, М. А. Сарока, А. М. Казлоў, які ўзначаліў дзіцячы дом, і другія.

У аддзел народнай асветы ўваходзілі ўсе ўстановы культуры. Усю гэту работу вёў інспектар па культпрасветрабоце У. К. Будзішэўскі. У райцэнтры стаяў барак, які застаўся ад вайскоўцаў, яго пераабсталявалі пад клуб.

У пасляваеннай моладзі ў вучняў была вельмі вялікая цяга да вучобы, да ведаў. З выпускаў першых пасляваенных гадоў выйшла многа адукаваных, вядомых людзей...

А. У. Галавач

Былыя партызаны (злева направа): М. І. Кісялёў, І. П. Бакуновіч, А. У. Галавач, У. М. Дзербан

Незабыўная сустрэча

У 1947 г. жыхары вёскі Вялікія Сцяблевічы Ленінскага сельскага Савета вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР Якуба Коласа. Увосень народны паэт Беларусі прыехаў на сустрэчу да сваіх выбаршчыкаў. Гэта была памятная падзея для вяскоўцаў. Асабліва радаваліся вучні — яны ўбачаць пісьменніка і паэта, творы якога вывучаюць у школе. А размяшчалася школа тады ў хаце калгасніка Мікалая Васільевіча Леановіча.

Сустрэлі Якуба Коласа на вуліцы, запрасілі ў хату. Дзякуючы

асабліваму коласаўскаму ўменню размаўляць з людзьмі, сяляне хутка знайшлі агульную мову з вядомым пісьменнікам, размаўлялі з ім, як даўнія знаёмыя. У той дзень Якуб Колас пагаварыў, бадай, з кожным прысутным. Ён цікавіўся справамі калгаснікаў, гісторыяй краю. Людзі расказвалі народнаму паэту аб набалелых пытаннях, раіліся, старэйшыя дзяліліся ўспамінамі аб цяжкім лёсе, які выпаў на іх долю пры ўладзе панскай Польшчы, калі за адно толькі слова «Ленін», тым больш за чытанне твораў У. І. Леніна людзі падвяргаліся рэпрэсіям, арыштам. Вочы людзей свяціліся, калі яны расказвалі Якубу Коласу аб вераснёўскіх падзеях 1939 г., пра вызваленне роднай вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Паэт расказаў аб сваім жыццёвым і творчым шляху, аб выпрабаваннях, якія выпалі на долю беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гаворка ішла аб задачах, якія трэба будзе вырашаць, аднаўляючы разбураную фашысцкімі захопнікамі народную гаспадарку. Калі гаварыў Якуб Колас, у хаце панавала цішыня. Спакойна і свабодна лілася беларуская мова. Кожны адчуваў, што выступае чалавек, які глыбока ведае жыццё сялян, яго мінулае і сённяшняе, клопаты і трывогі.

Пасля заканчэння сходу Якуб Колас цёпла развітаўся з прысутнымі. Людзі яшчэ доўга не разыходзіліся па хатах і зямлянках. Хацелася абмеркаваць пачутае, падзяліцца ўражаннямі, сказаць добрае слова ў адрас песняра...

У. У. Баярын

Па старонках раённых газет

ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ

Будуюць кароўнікі і канюшні

У калгасах Людзяневіцкага сельсовета паспяхова ідзе будаўніцтва грамадскіх будынкаў. Тут будуюць пяць кароўнікаў і адну канюшню. Калгаснікі абавязаліся да 20 чэрвеня будаўніцтва будынкаў закончыць.

11 чэрвеня 1946 г.

Працуе піонерлагер

З першага ліпеня распачаў сваю работу піонерскі лагер у вёсцы Кольна. Першая чарга дзяцей у колькасці 120 чалавек ужо адпачывае ў лагеры.

7 ліпеня 1946 г.

Рыбгас аднаўляецца

Калектыў работнікаў рыбгаса «Белае» адразу ж пасля вызвалення раёна ад нямецкіх захопнікаў узяўся за аднаўленне рыбнай гаспадаркі. За параўнальна кароткі тэрмін з 1117 га прудоў, існаваўшых да вайны, адноўлена 937 га, адбудавана 6 прудоў. Вясной гэтага года 2 пруды былі заселены мальком карпа.

Рыбгас восенню гэтага года дасць дзяржаве 690 цэнтнераў таварнага карпа.

31 ліпеня 1946 г.

Абавязацельства будаўнікоў

Уключыўшыся ў месячнік па будаўніцтве дамоў для калгаснікаў, пражываючых у зямлянках, у калгасе «Комунар Беларусі» Ляхавіцкага сельсовета створана будаўнічая брыгада з 20 чалавек. На падвозку лесаматэрыялу штодзённа калгас пасылае 10 падвод.

За прайшоўшыя дні месячніка пабудавана 12 зрубаў дамоў. Будаўнікі абавязаліся к 25 лістапада пабудаваць 17 дамоў калгаснікаў і перасяліць усіх калгаснікаў з зямлянак у новаадбудаваныя дамы.

А. Купрацэвіч
13 лістапада 1946 г.

Пачын калгаснікаў сельгасарцелі «Чырвоная Града»

Калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоная Града» на агульным сходзе аднадушна падтрымалі прапанову члена арцелі Алдыкава аб зборы прадуктаў і грошай у фонд дапамогі сем'ям загінуўшых воінаў і інвалідаў Айчыннай вайны. Калгаснікі выбралі камісію па зборы прадуктаў і грошай. У прынятай пастанове калгаснікі звяртаюцца да ўсіх працоўных раёна падтрымаць іх пачын.

6 сакавіка 1947 г.

Бульбу — дзяржаве

Перадавыя калгасы раёна паспяхова вядуць уборку бульбы і здачу яе дзяржаве. З кожным днём павялічваецца лік калгасаў, датэрмінова выканаўшых свае абавязацельствы па бульбапастаўках.

Першымі датэрмінова выканалі план здачы бульбы дзяржаве 18 калгасаў. Сярод іх — «Чырвоная Града», «III Інтэрнацыянал», «Чырвоны калінінец» і шэраг іншых.

1 кастрычніка 1949 г.

Лісіная ферма ў калгасе

Калгаснікі сельгасарцелі «Бальшавік» Жыткавіцкага гарсовета рашылі стварыць лісіную ферму. Закончана будаўніцтва памяшканняў для ліс, двара, кухні. Днямі на ферму завезена 12 серабрыста-бурых ліс.

27 кастрычніка 1949 г.

Кінаабслугоўванне

Усе пяць кінаперасовак, якія маюцца ў аддзеле кінафікацыі, паспяхова выконваюць план кінаабслугоўвання насельніцтва. Зараз у калгасах дэманструюцца кінафільмы «Падзенне Берліна» і «Бітва за Царыцын»».

12 ліпеня 1950 г.

ЛЕНІНСКІЯ ЗАВЕТЫ

Пасадкі махоркі

Амаль усе калгасы раёна прыступілі да пасадкі махоркі. Звыш 1,5 гектара пасаджана ўжо ў сельгасарцелі «Чырвоны пуцілавец» Верасніцкага сельсовета.

Паспяхова праводзяць пасадку махоркі калгасы «Новае жыццё», «Чырвоны дазор», «Прагрэс», «Кастрычніцкая перамога» і другія.

Усяго па раёне пасаджана 37 гектараў махоркі.

Прылуцкая
29 мая 1947 г.

Прыступілі да вывучэння біяграфіі таварыша Сталіна

Прыступілі да вывучэння біяграфіі таварыша Сталіна работнікі Тураўскай пажарнай аховы. Гуртком па вывучэнні біяграфіі вялікага правадыра кіруе намеснік начальніка пажарнай аховы па палітчастцы т. Федасенка.

Заняткі гуртка наведваюць усе байцы пажарнай аховы. Імі ўжо вывучаны жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна да 1912 года.

Чорны
3 чэрвеня 1947 г.

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Калі ж будзе праведзена аблава на ваўкоў?

За 9 месяцаў 1947 г. у нашым раёне на пастбішчах з'едзена ваўкамі больш 30 галоў коней, каля 90 штук авечак і многа іншай дамашняй жывёлы. А ў калгасе «Перамога» Запясоцкага сельсавета меліся факты паядання ваўкамі авечак з аўчарніка.

Правядзенне аблавы райзаготканторa ўскладае на саюз паляўнічых, а саюз паляўнічых — на райзаготканторy.

Цікава, калі ж будзе праведзена аблава на ваўкоў?

В. Якаўлеў
26 кастрычніка 1947 г.

Першыя кубаметры лесу, дастаўленыя па чыгунцы

Соцыялістычнае спаборніцтва на будаўніцтве Тураўскай вузкакалейнай чыгункі, пачаўшаеся ў чэрвені 31 гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, набывае размах...

На Хваенскім участку ўступілі ў строй першыя 6 кіламетраў чыгункі. Па ёй пачалася дастаўка драўніны на Хваенскае возера. Першыя 800 кубаметраў лесу даставіў на сваім цягніку машыніст Сцяпан Чарнушэвіч.

А. Піскароў
18 лістапада 1948 г.

СТАЛІНЕЦ

На жніве

Ва ўсю шыр разгарнулася жніво ў Ленінскім сельсавеце. Жанчыны, ледзь толькі ўзнімецца сонца, з сярпамі ў руках ідуць у поле. Дзяўчаты, падросткі і дзеці дапамагаюць маткам убіраць збожжа. Адны з іх вучацца жаць, другія — зносяць снапы і стаўляюць у бабкі, збіраюць калоссе.

З-за адсутнасці гумнаў, якія спалены фашысцкімі варварамі, снапы сціртуюцца на полі. Адначасова са жнівом сяляне здаюць сена дзяржаве і рыхтуюцца к малацьбе.

Іваноў Барыс
4 жніўня 1945 г.

Першая партыя цэглы

Ленінскі цагельны завод 6 красавіка выпусціў першую партыю цэглы ў колькасці 1000 штук. Выпушчаная прадукцыя добрай якасці. У будучым завод будзе штодзённа выпускаць 3000 штук цаглін, што ў значнай ступені задаволіць узросшыя патрэбы працоўных раёна.

Паўлаў
9 мая 1946 г.

Малапрадуктыўныя каровы — цяглавая сіла

Веснавая сяўба ў раёне прымае ўсё большы размах. За апошнюю пяцідзёнку з 10 па 15 красавіка пасеяна 458 гектар яравых культур.

У сельсоветах, дзе адчуваецца недахоп цяглавай сілы, на палявых работах скарыстоўваюцца малапрадуктыўныя каровы. Напрыклад, у Цімашэвіцкім сельсавеце працуе на сельскагаспадарчых работах 50 кароў. Першымі пачалі працаваць на каровах сяляне вёскі Цімашэвічы Максім Маркулевіч, Мікалай Раманоўскі, Ольга Купрыяновіч. Працуюць на каровах і сяляне вёскі Залюцічы гэтага ж сельсавета. Усяго па сельсавету пасеяна 25 гектар зернавых.

Р. Паўлаў
17 красавіка 1947 г.

Няма ні адной зямлянкі

30-годдзе Кастрычніка працоўныя раёна азнамяноўваюць вялікімі дасягненнямі ў правядзенні месячніка па адбудове сямей, пражываючых у зямлянках. У выніку напружанай працы ў раёне на 1 лістапада ні адной сям'і не засталося у зямлянках.

Гэтымі днямі адсвяткавалі навасэлле калгаснікі сельгасарцелі імя Леніна Анна Бакуновіч, Паліна Круковіч і іншыя. Разам з другімі перасялілася ў свой уласны дом і калгасніца сельгасарцелі імя Молатава Параска Філановіч, муж якой загінуў у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Н. Пашук
2 лістапада 1947 г.

Коратка

Па ініцыятыве тэхнарука т. Ерафеева Ленінскі райпрамкамбінат асвоіў выраб бухгалтарскіх лічыльнікаў.

Днямі пачнецца іх масавая вытворчасць.

14 ліпеня 1948 г.

Ад першай зацяжкі...

Якубоўскі Міхаіл Аляксандравіч (н. у 1923 г. у в. Пагост), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан атрада «За Радзіму», у пасляваенны час на працягу больш як 40 гадоў — вядомы і старэйшы у рэспубліцы кіраўнік калгаснай вытворчасці, спачатку — старшыня калгаса «6-ы з'езд Саветаў» у Любавічах, з 1950 па 1986 г.— імя Жданава.

Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны II ступені, Дружбы Народаў, баявымі і працоўнымі медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Памёр 18.1.1994 г.

...Упершыню я закурыў, калі мне было сямнаццаць гадоў. Памятаю, быў сонечны жнівеньскі дзень. Прыпяць, кацер, у борт якога трывожна б'е рачная хваля... Калі б яшчэ ўчора хто з вяскоўцаў прапанаваў: «Закуры, Міхась»,— з агідаю адвярнуўся б, а тут раптам сам папрасіў:

— Дай, дзядзька, і мне закурыць...

Аляксей Ільеня — пажылы, змораны чалавек — моўчкі працягнуў капшук з тытунём. Мы былі аднавяскоўцамі, а цяпер — вязнямі на нямецкім кацеры. Задымілі разам, я — не толькі ў першы, але, магчыма, і ў апошні раз... Перад намі стаяў з аўтаматам на шыі, з перакрыжаванымі чалавечымі касцямі і чэрапам на рукаве гітлеравец. Ён з выглядам пераможцы, з відавочным задавальненнем назіраў, як дагарае вёска Пагост. Гэта справа яго рук і падобных яму «герояў»...

— Расстраляюць нас,— уздыхнуў Ільеня.

А ў мяне ад нязвыклага моцнага тытуню закружылася галава, насунуліся ліхаманкавыя ўспаміны... Вось маці — нямецкі афіцэр моцна ўдарыў яе ў твар, потым штурхнуў у склеп. Пачаў туды ж заганяць сясцёр Надзю і Вольгу, і тады я не вытрымаў, выскачыў з канапель, куды схаваўся, калі ўбачыў гітлераўцаў. Хацеў абараніць маці і сясцёр, кінуцца ў бойку за іх, але ворагаў было шасцёра, яны схапілі мяне, пацягнулі да кацера. Там аказаўся і Аляксей Ільеня.

М. А. Якубоўскі

— Брата майго, Змітрака, забілі... Ён пачаў хату тушыць, дык паласнулі з аўтамата. І жонку яго з двума дзецьмі застрэлілі. А што з намі зробяць? Таксама, відаць, расстраляюць...

Акупанты ўпершыню з'явіліся ў Пагосце 13 ліпеня 1941 г. Жыхары хаваліся ў лесе. Тады ўсе выратаваліся, ворагі толькі абрабавалі вёску, спалілі некалькі хат і накіраваліся назад у Жыткавічы. Людзі вярнуліся і жылі, як раней пры савецкай уладзе. Убралі багаты ў тым годзе ўраджай, склалі спісы і збіраліся размеркаваць яго паміж калгаснікамі. І тады наляцелі, як гурганы, пачуўшы здабычу, гітлераўцы і паліцаі.

Да берага Прыпяці прысталі кацеры, абстралялі вёску з мінамётаў. Потым на бераг сышлі ворагі — іх было вельмі шмат, не адна сотня. З боку Жыткавіч па дарозе на Пагост мірных, бяззбройных людзей «атакавалі» конныя...

Афіцэр на кацеры, дзе сядзеў я з Ільеняй, чагосьці чакаў. Да берага прыгналі жанчын, але на кацер іх не саджалі. Афіцэр убачыў, што ў натоўпе няма мужчын, і загадаў матарысту адплываць. У кацер ускочыла яшчэ некалькі салдат, і кацер пачаў разварочвацца на рацэ.

Адплылі кіламетры два. Афіцэр падышоў да нас...

— Раус! — загадаў ён Аляксею і паказаў за борт.

Ільеня ў першую сусветную вайну быў у палоне ў Германіі, крыху ведаў нямецкую мову. Ён пачаў прасіцца:

— Пан, фюнф кінд...

— Раус!..— зароў гітлеравец.

Адзін фашыст усхапіў Аляксея і штурхнуў за борт. Затрашчалі аўтаматныя чэргі.

Цяпер мая чарга... Пакуль увага гітлераўцаў была скіравана на Ільеню, я непрыкметна падкраўся да другога борта і скочыў у ваду. Момант быў зручны, я нырнуў, цячэнне несла мяне ў адзін бок, кацер кіраваўся ў другі. У вадзе чутна было, як распорвалі ваду аўтаматныя чэргі, але мне неверагодна пашанцавала, смерць прайшла міма, толькі горача дыхнула ў твар... Куля трапіла ў шчаку, моцна запякло. Я зноў нырнуў, і ворагі падумалі, што мне «капут». Кацер паплыў далей. Я з цяжкасцю дабраўся да берага, выбраўся на сухое месца, разарваў на шматкі кашулю і сяк-так перавязаў рану. Да гэтага часу відны сляды, куды ўвайшла і выйшла куля.

У Бечанскім лесе я сустрэў свайго былога настаўніка Атліванава. Ён параіў дабрацца да Перарова — там жыве фельчар. Я так і зрабіў. Фельчар апрацаваў рану, перавязаў. Калі яна загаілася, я стаў разведчыкам у мясцовым партызанскім атрадзе.

Надышоў радасны час вызвалення старажытнай тураўскай зямлі. Фронт пайшоў далей на захад, а мне сказалі ў ваенкамаце:

— Год твой яшчэ не прызыўны. Да таго ж, у цябе дзве сястры-сіраты. Прымай калгасны атрад, камандуй.— Мяне прызначылі старшынёй калгаса ў вёсцы Любавічы Тураўскага раёна.

Кім камандаваць? Старыя ды жанчыны, яшчэ дзеці. Адно выратоўвала — небывалая самаадданасць людзей у працы, шчырасць у любой даручанай справе, энтузіязм, радаснае ўсведамленне таго, што яны жывуць на вызваленай роднай зямлі. Гэта быў працоўны подзвіг, не менш значны, чым ваенны...

У 1950 г. дробныя калгасы ў Любавічах, Малым Малешаве і Верасніцы аб'ядналі, назвалі яго імя Жданава (цяпер «1 Мая»). Цэнтр яго вырашана было зрабіць у Верасніцы, і ўзначаліць яго давялося мне. Больш сарака гадоў быў на гэтай неспакойнай пасадзе. Калгас за гэты час дасягнуў вялікіх поспехаў ва

ўсіх галінах сельскагаспадарчай вытворчасці. Дабіліся гэтага людзі сваёй шчырай, сумленнай працай. Я заўсёды імкнуўся быць справядлівым да іх, і яны, здаецца, разумелі гэта і плацілі тым жа...

Хвалі Чырвонага возера

Гамолка Мікалай Іванавіч (н. 11.3. 1922 г.), вядомы беларускі пісьменнік. Закончыў Жыткавіцкую сярэднюю школу і паступіў вучыцца на філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. У гады вайны — у Чырвонай Арміі. У 1947 г. пачаў працаваць рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР, затым — літаратурным работнікам рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», загадчыкам аддзела газеты «Чырвоная змена». З 1967 г.— адказны сакратар часопіса «Бярозка», адказны сакратар камісіі па Дзяржаўных прэміях Савета Міністраў БССР. Першыя вершы надрукаваў у 1937 г. Аўтар двух зборнікаў вершаў — «Зварот шчасця» і «Б'юць куранты», рамана «Шосты акіян», аповесцей «Лета ў Калінаўцы», «Добры дзень, школа!», «Лясная крэпасць», «Сокалы — сакаляняты», «Дзяўчына ішла па вайне», «Партызанскія сёстры». Творы М. Гамолкі неаднаразова выдаваліся на рускай і іншых мовах.

Памёр у 1992 г.

Дзяцінства маё прайшло ў надзвычай маляўнічай, прыгожай мясцовасці на беразе Чырвонага возера. Маці памерла, калі мне было два гады, і бацька пераехаў сюды, у вёску Найду. У памяці захавалася — падвода, нагружаная сялянскім скарбам, паволі валюхаецца па вузкай і змрочнай дарозе, а абапал — лясы, лясы...

Неўзабаве я пайшоў вучыцца ў пачатковую школу ў Найдзе. Навучаў дзяцей прыветлівы і чулы настаўнік Рыгор Мультан. У чацвёртым класе я напісаў сачыненне, якое настаўніку вельмі спадабалася, і ён, на маю вялікую радасць, адзначыў, што гэта амаль сапраўднае мастацкае апавяданне.

...Памятаю калектывізацыю, суровыя і горкія дні. Хоць бацька і запісаўся ў калгас, на яго наклалі «цвёрдае» заданне. Аднойчы ранкам

М. І. Гамолка

у двор заехала дзве падводы, якія суправаджаў упаўнаважаны раённага НКУС. Панятыя вынеслі з кладоўкі жыта, яго было пудоў 15, пудоў 10 проса, для сям'і ў пяць чалавек не пакінулі ніводнага гарца збожжа. Жыць давялося на адной бульбе...

У 1934 г. зноў прыйшло ў хату няшчасце. Па паклёпу мясцовых незычліўцаў быў арыштаваны бацька. Забіралі яго ноччу, пры вобыску распатрашылі ўвесь матчын куфар, абшарылі ўсе закуткі. Аднаму з «чэкістаў» спадабаліся бацькавы новыя, нядаўна купленыя штаны, і ён непрыкметна ўпіхнуў іх у свой партфель.

Мы надта трывожыліся за лёс бацькі. Ён быў чужым у гэтай вёсцы, некаторыя сяляне непрыхільна адносіліся да яго. Мачыха, Агрыпіна Фёдараўна, кожны тыдзень насіла ў Жыткавічы перадачы для бацькі, плакала, гаравала. Праўда, усё абышлося. Разбор бацькавай справы паказаў, што абвінавачванні, як кажуць, былі шыты белымі ніткамі. Праз чатыры месяцы яго адпусцілі, але жыць у роднай вёсцы болей не мог, паехаў на заробкі ў Бабруйск, працаваў цеслем на дрэваапрацоўчым камбінаце, а потым на гідролізным заводзе. Тым часам я вучыўся ў Брынёве, дзе закончыў сем класаў. Потым бацька забраў мяне ў Бабруйск, там я вучыўся ў восьмым класе.

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Яшчэ ў Брынёве я пачаў пісаць вершы, дасылаў іх у «Піянер Беларусі». Адзін з іх — «Вясёлы сад» быў надрукаваны. У Бабруйску ў акружной газеце «Камуніст» змясцілі два мае вершы. «Прабіўся» я і на старонкі рэспубліканскай газеты «Чырвоная змена», там таксама апублікавалі адзін верш.

Цяжка жылося з бацькам у горадзе. У магазінах было пуста, каб атрымаць бохан хлеба, даводзілася станавіцца ў чаргу ў тры гадзіны ночы. У свеце было неспакойна, у Іспаніі ішла вайна, у краіне драпежнічаў НКУС.

Завяршаў вучобу я ў Жыткавічах. Паэтычнай працы з таго часу не пакідаў ніколі. Усё часцей друкавалі мае вершы абласная і рэспубліканскія газеты. У 1938 г. у Мазыры адбыўся творчы семінар маладых пісьменнікаў, запрасілі і мяне. Там я пазнаёміўся з Ус. Краўчанкам і Іванам Мележам.

У раённай газеце «Чырвоны памежнік» змяшчалі мае допісы аб школе, аб цікавых падзеях у роднай вёсцы. Толькі вершы рэдакцыя раёнкі ігнаравала, што ні дасылаў, на старонках газеты не з'яўлялася. Надта крыўдаваў я з гэтай прычыны. Улетку 1938 г. у час школьных канікул напісаў цэлы цыкл вершаў. «Ну, думаю, пашлю ў раёнку, не можа быць, каб і цяпер не спадабаліся». Адказу не было, дарэмна я з нецярпеннем чакаў кожны нумар газеты — вершы як скрозь зямлю праваліліся. Але месяцы праз два на маё імя нечакана прыйшоў важкі пакет. Гляджу — з Мінска. Адкрыў пакет — і нямала здзівіўся. У ім ляжалі тыя вершы, што я дасылаў у «Чырвоны памежнік». Загадка праяснілася, калі прачытаў ліст. Адразу кінуўся ў вочы подпіс: «З прывітаннем Якуб Колас». Ого, аказваецца, рэдакцыя маімі вершамі патрывожыла народнага паэта...

У 1939 г. паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт на філалагічны факультэт. Тут, у Мінску, пазнаёміўся з Міколам Аўрамчыкам і Аляксеем Коршакам. Часта збіраліся разам, чыталі свае вершы, дэкламавалі забароненыя вершы С. Ясеніна і Ул. Дубоўкі. Ва універсітэце была актыўная група маладых літаратараў. Мы арганізавалі выпуск рукапіснага часопіса «Першыя крокі», выйшла з маім удзелам два нумары. А восенню 1940 г. мяне прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. Трапіў у войскі хімабароны, у якіх праслужыў усю вайну аж да 1946 г.— спачатку салдатам, потым атрымаў афіцэрскае званне, камандаваў узводам.

Пасля вызвалення Беларусі прыехаў у Мінск. Прывёз у выдавецтва сваю першую кнігу вершаў «Зварот шчасця». Яна была адрэдагавана Максімам Лужаніным і выйшла ў свет у 1946 г.

Вярнуўся да бацькоў у Найду. Цяжкае тут было жыццё ў тыя гады. Аднаўляўся калгас, паступова абжываліся людзі. Вярталіся з арміі дэмабілізаваныя воіны.

Вёска Найда невялікая, налічвала каля ста двароў. Але з яе нямала выйшла людзей, якія ў нечым вызначыліся, праславілі свой край. Вярнуўся Васіль Кот, Герой Савецкага Саюза. Геройскае званне ён атрымаў на вайне з Японіяй, у час вызвалення Курыльскіх астравоў.

Вярнуўся ў вёску і мой сябра Дзмітрый Туравец. Ён не засядзеўся на бацькавых харчах, паехаў у горад, праз некаторы час ужо працаваў сакратаром Брэсцкага абкома партыі.

З вёскі шмат выйшла настаўнікаў. Мой школьны сябрук Рыгор Мікітавіч Туравец доўгі час настаўнічаў у раённым цэнтры, атрымаў званне заслужанага настаўніка БССР. Рыгор Дзмітрыевіч Хамлюк пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта стаў юрыстам,

жыве і працуе ў Мінску. Выйшла з Найды шмат іншых выдатных, старанных працаўнікоў.

Пражыў я ў вёсцы крыху больш чым паўгода і таксама паехаў у Мінск. Паступіў на работу ў Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, працаваў рэдактарам дзіцячай рэдакцыі. Рэдакцыю ўзначальваў Алесь Якімовіч, працаваў там таксама ў той час Янка Маўр. Ён рыхтаваў кнігу «Ніколі не забудзем» — аб подзвігах беларускіх дзяцей у барацьбе з фашызмам. Мне вельмі падабаўся дзядзька Маўр сваёй прастатой і мудрай, са скептычным ухілам, гаворкай.

Пад уплывам аўтарытэту Янкі Маўра, відаць, у мяне зарадзілася жаданне пісаць для дзяцей. Першыя апавяданні з'явіліся на старонках газеты «Зорька». Хутка размахнуўся на аповесць «Лета ў Калінаўцы», якая пачала друкавацца ў гэтай газеце. Вершы пісаў ужо менш. Нешта мной было згублена пры пераходзе ад ваеннай тэматыкі на мірную...

Маскоўскі «Детгиз» уключыў аповесць «Лета ў Калінаўцы» ў свой план. Потым я паспрабаваў напісаць твор аб школьным жыцці. Не надта спадзяваўся на ўдачу. Школьных аповесцей нават ва ўсесаюзнай літаратуры было небагата, а ў беларускай зусім адсутнічалі. Калі аповесць, якую я назваў «Добры дзень, школа!», была завершана, я звярнуўся да Янкі Маўра, каб ён прачытаў і даў ацэнку твору. Можна зразумець, як я хваляваўся, чакаючы яго прысуду. Вопытны пісьменнік вельмі ўважліва паставіўся да рукапісу маладога літаратара. Яна была густа адзначана яго паметамі, напісаў Янка Маўр заключэнне-рэцэнзію. Ён ухваліў твор, старанна пералічыў памылкі і недакладнасці. Але заспакоіў, што гэта толькі яго думкі, а недахопы можна лёгка выправіць.

Калі я працаваў ужо ў рэдакцыі часопіса «Бярозка», нехта прапанаваў аднойчы, каб часопіс надрукаваў што-небудзь з фантастыкі. Новых прыметных твораў з гэтага жанру было мала нават у Маскве. Неяк падумалася: а калі самому паспрабаваць напісаць што-небудзь? Рэдакцыю часта наведвалі вучоныя, мы многа гаварылі пра навуковыя праблемы, у тым ліку і пра космас, які тады быў далёкі, недасягальны... Прыкладна праз паўгода твор быў гатовы. Я сумняваўся — ці справіўся з задачай? Палёты ў космас, касманаўты — усё было новае, не толькі, здавалася, з фантастыкі, а — з казкі...

Аповесць, якую я назваў «За вялікую трасу», прапанаваў газеце «Сталинская молодежь». Тут жа яе перадрукавалі газеты «Советская молодежь» у Рызе, «Советский патриот» у Петразаводску, кіраўскае «Комсомольское племя». Праз год у часопісе «Маладосць» была надрукавана другая частка аповесці пад назвай «Цытадэль неба». У 1959 г. дзве аповесці пад назвай «Шосты акіян» выйшлі асобнай кнігай. Цікава, што ўсе падзеі касмічнай эры, якая пачалася 4 кастрычніка 1957 г., развіваліся ў многім так, як было паказана ў маім навукова-фантастычным рамане...

А мяне ў гэты час ужо цікавілі і хвалявалі подзвігі савецкіх людзей у нядаўняй вайне. Напісаў аповесць «Дзяўчына ішла па вайне», амаль цалкам заснаваную на рэальных фактах. Поспех яе ў чытача падахвоціў мяне да далейшай распрацоўкі ваеннай тэматыкі. Доўга і старанна працаваў над аповесцю «Лясная крэпасць». Сюжэт яе мне падказаў настаўнік з г. Старыя Дарогі М. Залескі. Ён партызаніў у час вайны каля Чырвонага возера, і я палічыў сваім абавязкам расказаць аб незвычайным выпадку, які меў месца ў гады вайны. Ды і назва мясцін на-

гадвае пра гэта — Міткавічы, гэта, безумоўна, Жыткавічы, Буян-возера — вядомае Чырвонае, Князь-возера...

Новай, вышэйшай ступенню ў асваенні ваеннай тэматыкі лічу аповесць «Сокалы-сакаляняты». Працаваў я над ёй не адзін год. Твор высока ацаніў і падтрымаў Віктар Казько, станоўча адгукнулася на яго крытыка, кніга выйшла ў Маскве.

Да майго 60-годдзя ў выдавецтве «Юнацтва» у 1982 г. выйшлі ў двух тамах «Выбраныя творы».

На маім рабочым стале ляжыць раман «Голуб у акне» — аб жыцці старшакласнікаў, першай любові і аб подзвігах на вайне. Адным з важных фактараў стварэння цікавага твора лічу сюжэт. Імкнуся, каб ён быў напружаны, старанна прадуманы і распрацаваны, каб кожная падзея падавалася ў непаўторным, жывым гучанні.

След на зямлі

Сяргейчык Аляксандр Сямёнавіч (н. 7.3. 1923 г. у Тураве), у чэрвені 1941 г. закончыў сярэднюю школу, з першых дзён вайны — у арміі. Вучыўся ў Омскім і Цюменскім ваенных вучылішчах, з жніўня 1942 г.— на фронце. Ваяваў на Сталінградскім, Стэпавым, 2-м Прыбалтыйскім, Ленінградскім, Забайкальскім франтах начальнікам разведкі дывізіёна, камандзірам батарэі гвардзейскіх мінамётаў. З 1956 г.— старшыня калгаса «Перамога», які пад кіраўніцтвам А. С. Сяргейчыка стаў адной з перадавых, высокарэнтабельных гаспадарак рэспублікі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1975 г.

Успамінамі аб А. С. Сяргейчыку дзеліцца яго дачка, доктар біялагічных навук Святлана Сяргейчык.

А. С. Сяргейчык

...Прыпяць, славутая палеская рака, на беразе якой у старажытным Тураве нарадзіўся бацька, бывае рознай у розныя поры года, у тое або іншае надвор'е. Яна бывае іскрыставясёлай і пахмурна-шэрай, непрыветлівай, халоднай і блакітнай, пяшчотнай, як рукі маці... Разліваецца шырока, бязмежна і зноў уваходзіць у свае берагі. Такім шырокім, поўнасцю аддадзеным людзям, як Прыпяць у веснавое разводдзе, уяўляецца і жыццё бацькі, якога ведалі, любілі, паважалі на Тураўшчыне. Малы адрэзак часу адвёў яму няўмольны лёс, але пражыў яго Аляксандр Сямёнавіч Сяргейчык, як належыць...

Я памятаю бацьку добрым і спагадлівым, незадаволеным і хмурым, але ніколі не памятаю недаступным і абыякавым да людзей, да справы, на якой згарэла яго неспакойнае сэрца. Ён любіў сваю сям'ю, маці, нас, пяцярых дачок, і мы стараліся ніколі не засмучаць яго. Старанна, на выдатна вучыліся, кожная атрымала вышэйшую адукацыю, знайшла сваё месца ў жыцці, прыносіць карысць людзям. Ала стала кандыдатам біялагічных навук, Ларыса — настаўніцай музыкі, Ірына і Таццяна — урачамі-педыятрамі, я абараніла доктарскую дысертацыю па пытаннях экалогіі і аховы навакольнага асяроддзя.

Бацька не вельмі ахвотна ўспамінаў сваё мінулае, ваеннае ліхалецце, дзе спаўна перажыў цяжкасцей, якія таксама ўкарацілі яго век. Ведалі мы з скупых яго расказаў, што ў чэрвені 1941 г. ён закончыў сярэднюю школу ў Тураве. Узрост быў непрызыўны, але жаданне зма-

гацца з ворагам вельмі вялікае, і вось учарашні школьнік на лодцы па Прыпяці кіруецца туды, дзе грымяць баі... Бацьку накіравалі вучыцца спачатку ў Цюменскае пяхотнае, потым у Омскае зянітнае мінамётна-артылерыйскае вучылішча.

Лёс наканаваў яму прайсці ўсю вайну, ад першага да апошняга дня, удзельнічаць у разгроме мілітарысцкай Японіі. Хто злічыць, колькі разоў смерць датыкалася да яго. Камсамольскі білет быў прабіты куляй. Камандзір батарэі легендарных «кацюш» капітан Сяргейчык ваяваў пад Масквой і абараняў Сталінград, удзельнічаў у бітве на Курскай дузе, змагаўся з ворагамі на Украіне і вызваляў Беларусь — Міншчыну, Магілёўшчыну, Гродзеншчыну. Потым была Прыбалтыка, а восенню пераможнага 1945 г.— Японія. Кожная веха ваенных дарог адзначана баявымі ўзнагародамі і крывёю, смерцю таварышаў. За іх, загінуўшых, ён жыў... На фронце ўступіў у рады Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пасля дэмабілізацыі ў 1947 г. працаваў у Тураўскім райкоме КПБ, а ў 1956 г. узначаліў адзін з самых адстаючых калгасаў — «Перамога». Які гэта быў калгас? Хілыя хаткі з саламянымі стрэхамі, ні дарог, ні механізацыі, ні аднаго камбайна. Жывёлагадоўля была занядбаная, ураджай зерневых нават на ўрадлівых тураўскіх землях ледзь дасягаў 15 ц з гектара. Усё трэба было пачынаць, як кажуць, з нуля, а галоўнае — пераламаць настрой у людзей, натхніць іх, прымусіць паверыць у свае сілы, магчымасці, у заўтрашні дзень.

Узнаўленне разбуранай народнай гаспадаркі патрабавала ад Аляксандра Сямёнавіча не меншай самаадданасці і мужнасці, чым у гады вайны. Усе свае сілы, усё сумленне бацька аддаваў людзям. Яго працоўны дзень пачынаўся задоўга да ўзыходу сонца, а заканчваўся звычайна далёка за поўнач. Ён да дробязей унікаў ва ўсе справы, кожны вечар падлічваў вынікі працоўнага дня з запісной кніжкай у руках, вучыў людзей, рыхтаваў кадры. Дзесяць гадоў запар не карыстаўся адпачынкам, ён ні на дзень не мог знізіць тэмпы працы. У адным з лістоў да мяне ён пісаў: «Дарагая дачушка! Сёння нядзеля, але я на рабоце. Падняўся ў 5 гадзін раніцы, пайшоў правяраць ферму. Зімоўка будзе цяжкай. Акрамя таго, што мала кармоў, панеслі вялікія страты ад паводкі. Шмат загінула сена на лугах. Вады намнога болей, чым вясной, і ўзровень яе не зніжаецца».

Па ініцыятыве бацькі ў калгасе пачалі замест працаднёў плаціць грошы. Валавы збор зерня дасягнуў 1609 т, ураджайнасць — 44 ц з гектара, вытворчасць малака па валу — 1273 т. Даход гаспадаркі склаў 1,5 мільёна рублёў. Людзі з дапамогай калгаса будавалі новыя дамы, адкрыліся сярэдняя школа, бібліятэка.

У «Перамозе» пачалося новае жыццё, але бацьку, які заклаў падмурак яго, мала заставалася жыць, працаваць, хваляваща... Ён перажываў, калі была непагадзь і не ўбіраўся хлеб, калі разлівалася Прыпяць і затапляла пасевы, калі нехта неахайна, нядобрасумленна выканаў сваю работу, калі не ўдавалася дастаць новы перспектыўны гатунак... Ён не мог не «гарэць» на рабоце. Такі ў яго быў характар, такі гарт. Ордэны Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга, два залатыя і два сярэбраныя медалі ВДНГ СССР і іншыя ўрадавыя ўзнагароды адзначылі яго працоўныя дасягненні. Але нельга вытрымаць доўга і жыць з пастаянным паскарэннем, заўсёды ў імклівым руху. І на 52-м годзе жыцця сэрца не вытрымала, бацькі не стала...

Памяць аб ім — налітае зернем

золата каласоў, чысціня чалавечых душ, поспехі гаспадаркі, вера землякоў у лепшае будучае. Я быццам бачу бацьку на вясновым світанні, у полі... Шчаслівы чалавек, які чэсна выканаў свой абавязак на зямлі і пакінуў на ёй добры, прыкметны след.

Па старонках раённых газет

ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ

За лепшае выкарыстанне зямель

Калгаснікі калгаса «II пяцігодка» Вятчынскага сельсовета ў гэтым годзе рыхтуюцца сустрэць вясну лепш мінулагодняга. Дружна ідзе ачыстка сенажацей ад кустарнікаў. За адзін дзень членамі сельгасарцелі ачышчана ад кустарнікаў звыш 15 гектараў сенажацей. У ачыстцы прымала ўдзел каля 100 чалавек.

М. Я. Міpановіч
7 студзеня 1951 г.

Інкубатарная станцыя

Уступіла ў строй Жыткавіцкая інкубатарная станцыя. Устаноўлены два інкубатары на 34 тысячы яек кожны. Станцыя забяспечыць куранятамі грамадскія фермы калгасаў Жыткавіцкага і Тураўскага раёнаў.

8 красавіка 1951 г.

Будуюць калгасную электрастанцыю

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Завет Леніна» Руднянскага сельсовета завезлі ў калгас абсталяванне для электрастанцыі. Нарыхтоўваецца і падвозіцца лесаматэрыял.

Сіламі калгасных будаўнічых брыгад пабудаваны лініі электраперадачы ў вёсках Кольна, Пасека, Буйкавічы. Вядуцца работы па будаўніцтве памяшкання электрастанцыі.

Пры дапамозе электрычнага току будуць механізаваны ўсе працаёмкія работы на жывёлагадоўчых фермах калгаса, на малацьбе. Будуць асветлены грамадскія будынкі і дамы калгаснікаў.

Д. Мельнікаў
21 чэрвеня 1951 г.

Збор насення кок-сагызу

Добры кок-сагыз расце на плантацыях сельскагаспадарчай арцелі імя Калініна Людзяневіцкага сельсовета. На ўсёй плошчы ў свой час былі зроблены тры праполкі і шароўкі міжраддзяў. Старанна даглядалі расліны звенні Праскоўі Цырыбка, Марыі Алексіевіч і Елены Гулюты.

Зараз калгаснікі на плошчы 8 га прыступілі да збору насення кок-сагызу. Лепшыя калгаснікі збіраюць каля 20 кілаграмаў насення з гектара.

15 ліпеня 1951 г.

Буйны выйгрыш

Выйгрыш у 50 тысяч рублёў выпаў на сторублёвую аблігацыю Другой Дзяржаўнай пазыкі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі, якую нядаўна прад'явіў у цэнтрашчадкасу рабочы Жыткавіцкага леспрамгаса Пупенка А. М.

Многія пазыкатрымальнікі прад'явілі аблігацыі гэтай пазыкі, на якія выпалі выйгрышы у 5000 і 1000 рублёў.

21 кастрычніка 1951 г.

Зімовы паляўнічы сезон

Зімовы паляўнічы сезон у разгары. Многія паляўнічыя раёны ўжо значна перавыканалі свае сезонныя заданні па здабычы пушніны. Так, паляўнічы-прамысловік Пётр Мікалаевіч Макарэвіч з пачатку паляўнічага сезона здаў на склад райзаготканторы «Заготжыўсыравіна» 4 шкуркі выдры, 2 шкуркі лісіц, 23 белкі, 3 зайцы. Ён выканаў дагаворныя абавязацельствы на 183,3 працэнта.

А. Шчэрбакова
14 лютага 1952 г.

Новы чыгуначны вакзал

Гэтымі днямі здадзена ў эксплуатацыю новае памяшканне чыгуначнага вакзала на станцыі Жыткавічы з прыстанцыйнымі пабудовамі — кубавой, кладовай і іншымі. У памяшканні выдатна абсталяваны службовыя пакоі і зала для пасажыраў.

М. Бандзюк
29 студзеня 1953 г.

Радыё ў калгасе

Толькі ў мінулым годзе ў калгасе «Завет Леніна» пабудаваны ўласны радыёвузел, а радыё ўжо трывала ўвайшло ў быт калгаснікаў. Амаль у кожнай хаце вёсак Млынок, Кольна, Пасека, Буйкавічы ўстаноўлены радыёкропкі.

Перадачы навін калгаснага дня праводзяць агітатары — настаўнік тав. Пілевіч, радыст калгаснага радыёвузла тав. Ляўковіч В., брыгадзір шостай паляводчай брыгады Іван Ляўковіч і іншыя.

С. Кароткі
10 мая 1953 г.

Калгасы набываюць лакамабілі

За апошні час многія калгасы набылі і ўстанавілі лакамабілі. Рухаючыя сілы лакамабіля ў калгасе «Палескі партызан» выкарыстоўваюцца для апрацоўкі лесаматэрыялу. Гэта дало магчымасць значна паскорыць узвядзенне грамадскіх будынкаў. Нафтавы рухавік у калгасе імя Дзяржынскага акрамя гэтага прывёў у рух жарновы. Прыведзены ў рух генератар у калгасе «Завет Леніна» даў электрасвятло ў хаты калгаснікаў. Тут таксама працуе радыёвузел.

Днямі набыў лакамабіль калгас «1-е Мая».

30 мая 1954 г.

На цалінныя землі

Гэтымі днямі на асваенне цалінных зямель у Кустанайскую вобласць выехала з нашага раёна чарговая група моладзі ў саставе 20 чалавек. Сярод паехаўшых маладых патрыётаў два аграномы, камбайнер, трактарысты, прычэпшчыкі і другія спецыялісты.

Ад'язджаўшых цёпла праводзілі камсамольцы і моладзь райцэнтра.

Е. Межэеўскі, сакратар РК ЛКСМБ.
27 сакавіка 1955 г.

Моладзь сее кукурузу

На палях сельскагаспадарчай арцелі «Запаветы Леніна» закладваюцца асновы высокага ўраджаю ўсіх сельскагаспадарчых культур. Вялікую ўвагу хлебаробы ўдзяляюць кукурузе. Пад яе сёлета займаецца 100 гектараў лепшых зямель. Камсамольска-маладзёжныя звенні Надзежды Атліванавай і Валянціны Кароткай зрабілі ўсё неабходнае, каб добра ўгноіць і апрацаваць свае ўчасткі, паспяхова вядуць сяўбу кукурузы.

Е. Межэеўскі
19 мая 1955 г.

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Адважны піянер

Днямі пасля трэцяга ўрока вучні Пагосцкай сямігадовай школы на перапынку выйшлі пагуляць на школьны двор. Частка дзяцей выбегла на бераг ракі Сцвігі і стала там гуляць. Выпадкова вучаніца трэцяга класа Тамара Літвінка апынулася на сярэдзіне ракі і пад ёй праламаўся лёд.

Дзеці, якія гулялі каля ракі на лёдзе, не разгубіліся. Вучань шостага класа Мікалай Скрыгалоўскі кінуўся ратаваць дзяўчынку. Ён падпоўз да палонкі, дзе Тамара пачала ўжо тануць, і ўхапіў яе за руку. Каб Мікалай Скрыгалоўскі сам не праваліўся ў ваду, да яго падпоўз Іван Літвінка і ўзяў яго за другую руку.

Тамара Літвінка была выратавана ад немінучай смерці.

Марыя Кузьміч, вучаніца 6 класа.
10 сакавіка 1957 г.

Провады ветэрана

29 год сумленна працаваў кавалём Жыткавіцкай МТС Фельдман Ізраіл Айзікавіч. Днямі ўвесь калектыў МТС цёпла праводзіў на адпачынак старога рабочага. Ад імя ўсяго калектыву дырэктар МТС т. Карась уручыў ветэрану каштоўны падарунак і Ганаровую грамату. Імя старога рабочага занесена ў Кнігу пашаны машынна-трактарнай станцыі.

А. Пастоеў
17 сакавіка 1957 г.

Расце птушкаферма

У калгасе «Камінтэрн» значная ўвага звяртаецца на развіццё вадаплаўнай птушкі. У другой паляводчай брыгадзе вырошчваюцца гусі і качкі.

Трэці год запар старанна даглядае птушку кандыдат у члены КПСС Павел Голас. Ён заўсёды своечасова корміць, сочыць за захаваннем усяго птушкапагалоўя. Летась калгас атрымаў ад рэалізацыі мяса і яек звыш 10 тысяч рублёў даходу.

Вялікія планы ў павелічэнні колькасці птушкі намячаюцца на бягучы год. На кожныя 100 гектараў зерневых калгас запланаваў мець не менш 150 галоў птушкі.

А. Швец
12 сакавіка 1960 г.

Андатру перасяляюць на новыя месцы

Паўночна-амерыканскі звярок — андатра, які ўпершыню быў завезены на возера Чырвонае ў 1953 г., хутка акліматызаваўся. Зараз колькасць андатры ў нашым раёне дасягнула прамысловага ўзроўню.

Беларускае аддзяленне Усесаюзнага інстытута жывёльнай сыравіны і пушніны пачало займацца перасяленнем гэтага каштоўнага пушнога звярка ў іншыя месцы. Старшы навуковы супрацоўнік інстытута т. Самусенка перасяліў групу звяркоў у рэчку Волхва на тэрыторыі Ленінскага сельсавета.

М. Макарэвіч, андатралоў
7 лістапада 1960 г.

ЛЕНІНСКІЯ ЗАВЕТЫ

Нарада каўчукаводаў

Адбылася раённая нарада каўчукаводаў, у якой прынялі ўдзел брыгадзіры каўчукаводчых брыгад, звеннявыя, старшыні калгасаў, аграномы, кіруючыя работнікі. Даклад аб задачах каўчукаводаў па вырошчванні высокага ўраджаю кок-сагызу ў 1952 годзе зрабіў заг. аддзела сельскай гаспадаркі райвыканкома т. Скалазуб.

Каўчукаводы абмяняліся вопытам работы. У спрэчках выступілі брыгадзір калгаса імя Леніна т. Касцянка, аграном-каўчукавод т. Кіслоў, старшыня калгаса імя Маленкова т. Шруб, дырэктар МТС т. Прасолаў, брыгадзір калгаса «Новае жыццё» т. Радзіёнаў.

У нарадзе прынялі ўдзел сакратары РК КП(б)Б тт. Башлыкоў і Шчэрбін.

П. Фёдараў
17 красавіка 1952 г.

Прыезд археалагічнай экспедыцыі

У Тураў для прадаўжэння раскопак могільніка, які быў знойдзены ў мінулым годзе ля вёскі Вароніна, прыехала з Масквы археалагічная экспедыцыя на чале з кандыдатам гістарычных навук тав. Кухарэнка.

Удзельнікі экспедыцыі прыступілі да раскопак. За першыя два дні выяўлена многа розных рэчаў. Экспедыцыя разлічвае прабыць у нашым раёне каля месяца. Яна таксама правядзе раскопкі на месцы стаянак старажытнага чалавека ва ўрочышчах Казаргаць, ля вёскі Хільчыцы і інш.

Многія каштоўныя знаходкі будуць перададзены ў наш краязнаўчы музей.

П. Шчакатовіч.
28 чэрвеня 1953 г.

Вырошчванне шматгадовай пшаніцы

Брыгада Пракопа Матараса з калгаса «Новае жыццё» мінулай восенню ўпершыню на Палессі пачала вырошчваць шматгадовую пшаніцу, якую вывеў акадэмік Цыцын. Сёлета атрыманы першы ўраджай гэтай культуры.

Нядаўна калгас атрымаў з адной селекцыйнай станцыі яшчэ 10 цэнтнераў насення шматгадовай пшаніцы. Восенню яно будзе высеяна на палетках калгаса. Як паказаў вопыт, гэтая культура добра расце ў мясцовых умовах.

Ф. Папаламаў.
23 жніўня 1953 г.

Будаўніцтва новага завода

У гарадскім пасёлку Тураў пачалося будаўніцтва новага гароднесушыльнага завода. На будаўніцтва асігнавана 2,6 мільёна рублёў.

Штогод завод будзе перапрацоўваць сотні тон бульбы і гародніны. Для прадпрыемства атрымана ўжо некаторае абсталяванне — лакамабіль, сушыльныя агрэгаты.

Завод уступіць у эксплуатацыю да сезона нарыхтоўкі сельгаспрадуктаў будучага года.

В. Неўстроеў, прараб будаўніцтва.
30 жніўня 1953 г.

Дапамога мнагадзетным мацерам

Толькі за 10 месяцаў бягучага года адзінокім і мнагадзетным маці нашага раёна выплачана больш 785 тысяч рублёў. Дзяржаўную дапамогу атрымоўваюць 1158 маці.

Мнагадзетная маці, калгасніца сельгасарцелі «Новае жыццё» Аляксандра Сцяпанаўна Карась, якая нарадзіла 12 дзяцей, атрымала дзяржаўнай дапамогі больш 35 600 рублёў.

О. Чарнушэвіч.
1 лістапада 1953г.

У Маскву — на выстаўку

11 чэрвеня з нашага раёна ў Маскву на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку выехала група экскурсантаў — спецыялістаў сельскай гаспадаркі. У ліку іх дырэктар МТС тав. Бандура, аграномы калгасаў імя Сталіна, імя Маленкова, «Новае жыццё» і «Ленінскі шлях».

П. Царык.
13 чэрвеня 1957 г.

Па 1028 цэнтнераў з гектара

Вялікая ўвага сёлета ў сельгасарцелі «Перамога» была ўдзелена вырошчванню кукурузы. Старанная праца хлебаробаў прынесла добрыя плады. На ўсёй плошчы пасеваў вырашчаны добры ўраджай зялёнай масы кукурузы.

Асабліва добрая кукуруза на плошчы ў 45 гектараў. Пры падліках аказалася, што на кожным гектары ўраджай зялёнай масы ў сучасны момант складае не менш 1028 цэнтнераў.

А. Сяргейчык, старшыня калгаса
24 жніўня 1958 г.

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Ураджай высокі

У калгасе «Перамога» шырокім фронтам вядуцца ўборачныя работы. Тут убрана ўжо 110 гектараў жыта, якое на плошчы ў 74 гектары абмалочана. Сярэдні ўраджай гэтай культуры па калгасе складае 14 цэнтнераў з гектара, яшчэ лепшы намалот у брыгадзе № 2 (брыгадзір Міхаіл Кот) — з гектара атрымана па 20,4 цэнтнера.

Сярэдняя ўраджайнасць ячменю, які поўнасцю ўбраны і абмалочаны, складае па 26 цэнтнераў з кожнага гектара. Добры вырас лён. У першай брыгадзе (брыгадзір член КПСС Павел Кот) з плошчы 18 гектараў атрымана па 6 цэнтнераў ільнасемя.

В. Правілаў.
10 жніўня 1960 г.

Рэгулярная зарплата калгаснікам

У сельгасарцелі «Перамога» у пачатку бягучага года ўведзена грашовая аплата працы калгаснікаў. Праўленне арцелі склала дакладны фінансавы план паступленняў і расходаў грошай. У ім прадугледжана вялікая сума для аплаты заработкаў хлебаробаў.

За 10 месяцаў 1960 года на аплату працы калгаснікаў выдаткавана ўжо 1 мільён 400 тысяч рублёў. Заработную плату члены арцелі атрымліваюць рэгулярна.

Ф. Дарошка.
4 снежня 1960 г.

СТАЛІНЕЦ

Павялічыўся спрос на тавары

У сувязі з новым паніжэннем цэн на харчовыя і прамысловыя тавары павялічыўся тавараварот у магазінах спажывецкай кааперацыі. У першыя ж дні гандлю па новых цэнах тавараў было прададзена амаль на 20 працэнтаў больш, чым у папярэднія дні.

На калгасным кірмашы наглядаецца зніжэнне цэн на прадукты, якія прадаюць калгаснікі.

Л. Валодзін.
4 сакавіка 1951 г.

Электрыфікацыя МТС

У Ленінскай МТС вядуцца работы па электрыфікацыі машынна-трактарнай станцыі. Ужо праведзена знадворная, а таксама ўнутраная праводка ў вытворчых памяшканнях і жылых пабудовах.

Зараз устанаўліваюць рухавік, генератар і праводзяць электрычнае абсталяванне. У хуткім часе загарацца лямпачкі Ільіча ў дамах калгаснікаў вёскі Ленін.

13 мая 1951 г.

ЛЕНІНСКАЯ ПРАЎДА

Завяршылі гадавую падпіску

Паспяхова ідзе ў раёне падпіска на газеты і часопісы. 20 лістапада Цімашэвіцкае паштовае аддзяленне сувязі (начальнік тав. Цуба) поўнасцю выкарыстала даведзеныя ліміты па падпісцы на перыядычныя выданні на 1957 год.

Вялікую дапамогу па падпісцы аказалі старшыня Ленінскага сельсавета тав. Майсееў, дырэктары Цімашэвіцкай і Грычынавіцкай НСШ С. Люльеў і Л. Шчур.

25 лістапада 1956 г.

На маслазаводзе — новае абсталяванне

Ленінскі маслазавод гэтымі днямі атрымаў новае, больш дасканалае вытворчае абсталяванне — маслапрыгатавальнік магутнасцю 320 кілаграмаў смятанкі ў гадзіну, новыя сепаратары. Пачала працаваць халадзільная ўстаноўка. Наогул вытворчая магутнасць завода значна павялічылася. Цяпер ён мае магчымасць перапрацоўваць малака амаль удвая больш, чым раней.

Г. Пятровіч.
17 чэрвеня 1957 г.

Спаборніцтвы спартсменаў

25 мая ў Мікашэвічах адбыліся сустрэчы спартсменаў Ленінскага і Жыткавіцкага раёнаў. У сустрэчах удзельнічалі валейбольныя і футбольныя каманды абодвух раёнаў.

Спаборніцтва па валейболу выйграла каманда Ленінскага раёна з лікам 2:1. У сустрэчы па футболу пераможцай аказалася каманда Жыткавіцкага раёна. З лікам 2:1 жыткавіцкія футбалісты выйгралі ў гаспадароў поля.

М. Яцушкевіч.
29 мая 1958 г.

Таленавіты літаратар

Беларускі савецкі крытык і літаратуразнаўца Уладзімір Іванавіч Агіевіч нарадзіўся 13 верасня 1912 г. у в. Пухавічы ў сям'і незаможнага селяніна. Беднасць прымушала бацьку наймацца на сплаў лесу да мясцовых лесапрамыслоўцаў, шукаць іншай работы. Вясной 1930 г. бацька ўступіў у калгас. На раённых сельскагаспадарчых выстаўках яго двойчы прэміравалі як узорнага садавода і гародніка. А праз некалькі гадоў сям'я асірацела, бацька трагічна загінуў на грамадскай рабоце. Будучы вучоны і крытык У. І. Агіевіч з маленства ведаў жыццё беларускага народа, жыў яго інтарэсамі, яму блізкімі былі думкі і пачуцці простых людзей.

У 1928 г. У. І. Агіевіч закончыў сямігодку, затым паступіў на настаўніцкія курсы. З 1929 г. пачаў працаваць настаўнікам пачатковай школы ў Жыткавіцкім раёне. Актыўны ўдзел у гэты час прымаў у арганізацыі калгасаў у вёсках Ляхавіцкага сельсавета.

У 1933 г. паступіў у Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут на літаратурны факультэт. Атрымаў дыплом з адзнакай, працаваў выкладчыкам беларускай літаратуры ў Слуцкім педагагічным вучылішчы. У канцы 1939 г. паступіў у аспірантуру пры Акадэміі навук БССР. Аднак вучобу ў аспірантуры перапыніла вайна.

У кастрычніку 1941 г. У. І. Агіевіч добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію. Вясной 1942 г. быў цяжка паранены. Пасля выпіскі са шпіталю вызвалены ад вайсковай службы, працаваў вучоным сакратаром аддзялення грамадскіх навук АН БССР у Маскве. У жніўні 1944 г. разам з Акадэміяй вярнуўся ў Мінск і заставаўся на гэтай пасадзе да 1946 г. Тады ж быў прыняты членам Саюза пісьменнікаў БССР і неўзабаве залічаны на пасаду літкансультанта ў Саюзе пісьменнікаў. Пазней працаваў рэдактарам аддзела часопіса «Беларусь».

Сваю літаратурную дзейнасць пачаў у 1928 г. вершамі. Як крытык пачаў выступаць у 1940 г. Першыя артыкулы крытыка аб літаратуры звярнулі на сябе ўвагу грамадскасці.

У 1954 г. у Дзяржаўным вучэбна-педагагічным выдавецтве БССР у Мінску выйшла кніга У. І. Агіевіча «Літаратура і жыццё», у якой сабраны лепшыя крытычныя артыкулы літаратуразнаўца. Сюды ўвайшлі артыкулы праблемнага характару, нататкі аб творчасці пісьменнікаў, а таксама маладых паэтаў і празаікаў. Варта адзначыць, што Агіевіч першы ў беларускім літаратуразнаўстве

У. І. Агіевіч

выкрыў памылковасць ацэнкі паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка», якая доўгі час існавала ў літаратуры даваеннага часу.

Зборнік «Літаратура і жыццё» — гэта шчырае слова чалавека, які любіў і ведаў літаратуру, пільна сачыў за літаратурным працэсам, блізка да сэрца ўспрымаў кожны поспех і няўдачу, жыва адклікаўся на актуальныя тэмы дня. Тэматыка зборніка цікавая і разнастайная: тут крытычныя нарысы аб творчасці і паасобных творах Янкі Купалы і Якуба Коласа, М. Лынькова, П. Броўкі, А. Гурло, П. Труса і іншых пісьменнікаў, праблематычныя і аглядавыя артыкулы аб традыцыях Маякоўскага ў беларускай паэзіі, аб прозе перыяду Айчыннай вайны і пасляваеннага часу, аб маладой паэзіі. У іх адчуваецца глыбокі аналіз твораў, многа цікавых думак і назіранняў.

Прынцыпова важнае значэнне маюць таксама артыкулы зборніка «Да пытання аб традыцыях Уладзіміра Маякоўскага ў беларускай паэзіі», «У незабыўныя гады», «Разам з народам», «Адвечная песня». Вылучаюцца яго артыкулы пра пасляваенную паэзію.

Разам з І. Кудраўцавым У. Агіевіч прымаў удзел у стварэнні падручнікаў па гісторыі беларускай літаратуры для сярэдніх школ: «Кніга для чытання ў другім класе школ рабочай і сялянскай моладзі», «Кніга для чытання ў трэцім класе школ рабочай і сялянскай моладзі» (1952).

У. І. Агіевіч напісаў манаграфічны нарыс аб творчасці вядомага беларускага пісьменніка Міхася Лынькова для падручніка па літаратуры сярэдняй школы.

Пераклаў на беларускую мову аповесць М. Прыляжаевай «З табой таварышы».

Памёр У. І. Агіевіч 10 кастрычніка 1952 г.

В. С. Ганаш

Штрыхі майго пакалення

Перкін Навум Саламонавіч (н. 15.2. 1912 г. у м. Тураў) — пісьменнік, літаратуразнаўца. У 1928 г. паступіў у Гомельскі педагагічны інстытут, затым настаўнічаў у пачатковых школах на Гомельшчыне. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, перад самай вайной — аспірантуру пры гэтым інстытуце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — на фронце і ў партызанскім атрадзе. Быў двойчы паранены. У друку з літаратурна-крытычнымі артыкуламі, рэцэнзіямі пачаў выступаць з 1946 г. Быў навуковым супрацоўнікам, а ў 1963—1976 гг.— загадчык сектара інстытута літаратуры АН БССР. Доктар філалагічных навук, прафесар. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 2.10.1976 г.

...Мы, васьмёра дзяцей, засталіся без бацькі. Старэйшыя браты, якім было 14 і 12 гадоў, яшчэ не паспелі пераняць яго прафесію майстра-загатоўшчыка. Нам дасталіся ў спадчыну дзве швейныя машыны «Зінгер», вострыя нажы, малаткі ды іншы дробны інструмент. Пачалі працаваць, я таксама дапамагаў. Як ні цяжка было спярша, незвычайны час не даваў маркоціцца. Усё навакол вабіла, абнадзейвала.

Калі я стаў піянерам, то ўжо былі ў мяне свае перакананні і пачуццё сваёй грамадзянскай годнасці. Маці, якая ўсё жыццё чамусьці хінулася да «знатных» і мела вельмі асабістае ўяўленне аб прыстойнасці, не хацела, каб яе сын адступіўся ад шляхоў яго продкаў, ад традыцый іх рэлігіі і стану. А піянер не хацеў



Н. С. Перкін

адмаўляцца ад выбранага ім самім шляху. Былі ўцёкі з дому, а потым матчыны слёзы прымірэння з лёсам.

Колішняе «Высшее начальное училище» было ператворана ў сямігодку. Скончыўшы яе ў 1928 годзе, я мусіў задумацца пра далейшы шлях у жыцці. Хацелася вучыцца. Старэйшыя падаваліся ў прафтэхшколы, Магілёўскі каморніцкі тэхнікум ці ў педтэхнікумы. Я паехаў у Гомель, правучыўся там год у педтэхнікуме, але было матэрыяльна цяжка, галоўнае ж — пацягнула ў «жывое жыццё», як тлумачыў тады блізкім.

Мазырскія педкурсы спешна «пяклі» настаўнікаў для пачатковых школ. Надумаў я паскорыць свае «універсітэты». Прызначаны неўзабаве ў Жыткавіцкі раён, я ад загадчыка райана пачуў — Вільча. «Не ведаю, дзе гэта. Для мяне ўсё роўна»,— сказаў я загадчыку. Ён глянуў на мяне ўважліва-смяшліва: «Ну і добра, што не ведаеш»... Вільча — далёкая вёска на мяжы з Польшчай, казалі, што там не дужа соладка, таму не хочуць туды ехаць. Сапраўды, пагранічная застава каля самай школы, за рэчкай Случ — Польшча. Двухкамплектная школа.

Вучым дзяцей і адначасова бываем на заставе — займаемся з малапісьменнымі пагранічнікамі. Мой напарнік выкладае рускую мову, я — матэматыку. Калі абвяшчаецца баявая трывога, мы кідаемся на заставу і займаем свае пазіцыі. Цудоўныя хлопцы — пагранічнікі. Яны вельмі нас выручылі, калі праз некаторы час мы з таварышам апынуліся ў цяжкім становішчы.

Няхай даруюць мне цяперашнія вільчанцы, калі ў маім расказе нешта здасца ім крыўдным для рэпутацыі іх землякоў. Не хацеў бы, каб мяне зразумелі не так. Быў жа тады іншы час — час вялікай сацыяльнай ломкі і абнаўлення сялянскага жыцця. Ці ж дзіўна, што колішнія вільчанцы разважалі і дзейнічалі па законах свайго часу.

Востра і бурна праходзілі розныя кампаніі напярэдадні калектывізацыі. Быў я баявым і, мусіць, занадта гарачым камсамольцам. На адным са сходаў па дзяржаўных нарыхтоўках пагражаў зламаць кулацкі сабатаж, выкрыць падкулачнікаў, што ж да астатніх — не кулакоў і падкулачнікаў — сарамаціў іх за недастатковую рашучасць і актыўнасць, за нізкую класавую свядомасць. Не думаў празмерна бойкі камсамолец, што такая яго прамова можа абярнуцца для яго ліхам. У вёсцы жылі адны Канапацкія і Кулакевічы — ці так проста адкінуць кроўныя сувязі ў імя класавых крытэрыяў?

Назаўтра гаспадар кватэры, у якога мы сталаваліся, адзін з Кулакевічаў, рашуча заявіў, што болей не можа нас карміць — няма чым... Аргумент нашага гаспадара падтрымалі і іншыя. Што ж нам рабіць? «Бальшавікі не здаюцца»,— сказаў, падбадзёрваючы, камандзір заставы. І часовы выхад знайшоўся: хлопцы-пагранічнікі ўзялі нас на сваё ўтрыманне. З кожнага пайка па каліву — і нам паёк... Харчаваліся як мае быць, пакуль не дазналіся ў Жыткавічах, у атрадзе,— нельга ж парушаць воінскі строгі парадак.

Узялі нас да сябе свядомыя беднякі з акраіны вёскі. Хадзілі мы сталавацца паўз граніцу: па начах, не бачачы дарогі, натраплялі часам на сакрэт, але нас добра ведалі. Як сцямнее, глянеш у бок граніцы — нібы белаватае зарыва. Мне растлумачылі, што гэта водсвет агнёў мікашэвіцкай лесапілкі. Так блізка — а зусім іншы свет, невядомы, насцярожаны, варожы...

Настаў час, калі я востра адчуў, што трэба вучыцца. У Мінску ўжо была амаль уся наша сям'я. Браты працавалі на фабрыцы. Паехаў і я

ў Мінск улетку 1931 г. З таго часу і лічу сябе мінчанінам. Працаваў амаль два гады рабочым на фабрыцы, каля года літработнікам у БЕЛТА, адначасова давучваўся ў вячэрняй школе. У 1932 г. паступіў у Мінскі (тады «Вышэйшы») педінстытут, спярша на вячэрняе аддзяленне. Тады ж, яшчэ працуючы на фабрыцы, надрукаваў у газеце «Рабочий» нарыс пра аднаго ўдарніка. Было дужа цяжка працаваць і вучыцца адначасова, але трымаўся, здаецца, цвёрда. Ну і завяршыў вучобу, атрымаў прызначэнне ў Полацкі педтэхнікум. Там сустрэўся з Дзмітрыем Палітыкам, які выкладаў беларускую літаратуру. Праз якія тры месяцы — у канцы лістапада 1936 г.— разам пайшлі служыць. Я трапіў у артылерыйскі полк, і за год, па строгай сістэме фізічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі, стаў малодшым лейтэнантам запасу.

...Дабраўшыся да Магілёва ў канцы чэрвеня 1941 г., я папрасіўся на фронт. Нас накіравалі ў Чавусы, у лесе абмундзіравалі. Неўзабаве далі адной з груп новы маршрут — Гомель. З Нова-Беліцы недзе ў жніўні адыходзілі на Старадуб, стаялі на Куршчыне і Арлоўшчыне, трымалі фронт на Браншчыне, каля станцыі Суземка; там у кастрычніку 1941 г. трапілі ў акружэнне. Аб тых горкіх тыднях вандравання і спробах прабіцца на ўсход цяжка расказваць. Добра, што знайшлі свой бераг — пачалі партызаніць. За два гады барацьбы ў тыле ворага пабываў байцом-артылерыстам і мінёрам, камандзірам узвода, начальнікам штаба атрада, начальнікам разведкі і, нарэшце, начальнікам штаба Рагнедзінскай партызанскай брыгады Заходняга (Смаленскага) штаба партызанскага руху.

...Праз вызвалены Мінск давялося ў лістападзе 1944 г. ехаць на фронт. Што я адчуў, убачыўшы горад у руінах таго часу, ведае кожны, хто перажыў гэта. Спадзяваліся ўдзельнічаць у штурме Берліна, а прыйшлося дакалачваць курляндскую групіроўку. На Лібаўскім напрамку быў другі раз паранены (першы раз — у партызанскім баі), ляжаў у шпіталі аж да мая 1945 г. Вяртаючыся ў свой полк, па дарозе пачуў аб заканчэнні вайны...

Слава знаходзіць дастойных

Белыя лілеі

Ісаева Марыя Сцяпаўна (н. у 1910 г.) — Герой Сацыялістычнай Працы (1966 г.). У 1954—1966 гг.— галоўны аграном калгаса «Новае жыццё» Жыткавіцкага раёна. Узнагароджана ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

Кветку белай лілеі вышываюць палескія дзяўчаты на вясельных ручніках: прыгажуня ціхіх затокаў здаўна лічылася тут сімвалам спакойнага, бесклапотнага жыцця, і я не паверыла, калі Марыя Сцяпаўна на пытанне, што яе, жыхарку Поўначы, прывяло на Палессе, адказала нібы жартам, нібы ўсур'ёз:

— Вось гэтыя самыя лілеі...

Упершыню ў Тураў Марыя Сцяпанаўна Ісаева прыехала ў госці да сястры. Палессе зачаравала яе. Яблыневыя сады, цяністыя дубровы,

М. С. Ісаева

ў Мінск улетку 1931 г. З таго часу і лічу сябе мінчанінам. Працаваў амаль два гады рабочым на фабрыцы, каля года літработнікам у БЕЛТА, адначасова давучваўся ў вячэрняй школе. У 1932 г. паступіў у Мінскі (тады «Вышэйшы») педінстытут, спярша на вячэрняе аддзяленне. Тады ж, яшчэ працуючы на фабрыцы, надрукаваў у газеце «Рабочий» нарыс пра аднаго ўдарніка. Было дужа цяжка працаваць і вучыцца адначасова, але трымаўся, здаецца, цвёрда. Ну і завяршыў вучобу, атрымаў прызначэнне ў Полацкі педтэхнікум. Там сустрэўся з Дзмітрыем Палітыкам, які выкладаў беларускую літаратуру. Праз якія тры месяцы — у канцы лістапада 1936 г.— разам пайшлі служыць. Я трапіў у артылерыйскі полк, і за год, па строгай сістэме фізічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі, стаў малодшым лейтэнантам запасу.

...Дабраўшыся да Магілёва ў канцы чэрвеня 1941 г., я папрасіўся на фронт. Нас накіравалі ў Чавусы, у лесе абмундзіравалі. Неўзабаве далі адной з груп новы маршрут — Гомель. З Нова-Беліцы недзе ў жніўні адыходзілі на Старадуб, стаялі на Куршчыне і Арлоўшчыне, трымалі фронт на Браншчыне, каля станцыі Суземка; там у кастрычніку 1941 г. трапілі ў акружэнне. Аб тых горкіх тыднях вандравання і спробах прабіцца на ўсход цяжка расказваць. Добра, што знайшлі свой бераг — пачалі партызаніць. За два гады барацьбы ў тыле ворага пабываў байцом-артылерыстам і мінёрам, камандзірам узвода, начальнікам штаба атрада, начальнікам разведкі і, нарэшце, начальнікам штаба Рагнедзінскай партызанскай брыгады Заходняга (Смаленскага) штаба партызанскага руху.

...Праз вызвалены Мінск давялося ў лістападзе 1944 г. ехаць на фронт. Што я адчуў, убачыўшы горад у руінах таго часу, ведае кожны, хто перажыў гэта. Спадзяваліся ўдзельнічаць у штурме Берліна, а прыйшлося дакалачваць курляндскую групіроўку. На Лібаўскім напрамку быў другі раз паранены (першы раз — у партызанскім баі), ляжаў у шпіталі аж да мая 1945 г. Вяртаючыся ў свой полк, па дарозе пачуў аб заканчэнні вайны...

Слава знаходзіць дастойных

Белыя лілеі

Ісаева Марыя Сцяпаўна (н. у 1910 г.) — Герой Сацыялістычнай Працы (1966 г.). У 1954—1966 гг.— галоўны аграном калгаса «Новае жыццё» Жыткавіцкага раёна. Узнагароджана ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

Кветку белай лілеі вышываюць палескія дзяўчаты на вясельных ручніках: прыгажуня ціхіх затокаў здаўна лічылася тут сімвалам спакойнага, бесклапотнага жыцця, і я не паверыла, калі Марыя Сцяпаўна на пытанне, што яе, жыхарку Поўначы, прывяло на Палессе, адказала нібы жартам, нібы ўсур'ёз:

— Вось гэтыя самыя лілеі...

Упершыню ў Тураў Марыя Сцяпанаўна Ісаева прыехала ў госці да сястры. Палессе зачаравала яе. Яблыневыя сады, цяністыя дубровы,

М. С. Ісаева

велічная Прыпяць, што шырока разлілася па зялёнай роўнядзі, белыя лілеі ў яе затоках...

Жыла яна ў Архангельскай вобласці — гэта была яе радзіма. Тут «ваявала» на неўрадлівых камяністых палях у вайну, каб даць фронту ўсё, на што магла раздобрыцца няласкавая паўночная прырода. Сястра запрашала ў кожным пісьме: «Прыязджай у Тураў, знойдзем табе работу». І яна прыехала.

Нельга сказаць, каб сустрэлі Ісаеву ў калгасе з распасцёртымі абдымкамі. Яе папярэдніка звольнілі за дужа шчодры на калгаснае дабро характар, і ў яго засталося нямала прыхільнікаў. Старшыня ставіўся да яе, як кажуць, не горача, не холадна. Не спецыяліст сельскай гаспадаркі, ён не ўмешваўся ў работу агранома, прыглядаўся: а ну, пабачым, што у цябе выйдзе!

Пустазелле буяла на палях. Яго рвалі рукамі, секлі матыкамі, касілі косамі, але хутка жоўтая свірэпа зноў глушыла пасевы. Марыя Сцяпанаўна, як за ратунак, ухапілася за гербіцыды. Не адразу ўдалося прабіць для іх дарогу. Былі і ананімкі ў райком: «аграном труціць пасевы», і маўклівае супраціўленне малавераў, і нават ультыматум жанчын-ільнаводак: «альбо мы, альбо яна!» Прайшоў час і жанчын нельга было прымусіць ірваць свірэпу рукамі. Нездарма Ісаеву тут называюць «хроснай» хімпраполкі.

— У Ісаевай на палях, што ў добрай гаспадыні ў доме,— пачціва казалі пра яе.

А ў Ісаевай зноў ідэя, зноў «мэта нумар адзін» — паляпшэнне гатункаў. Не так ужо часта заглядвалі вучоныя на далёкую Тураўшчыну. А тут свае, асаблівыя ўмовы. Паспрабуй, здагадайся, які з гатункаў будзе лепшы за ранейшыя! І Марыя Сцяпанаўна шукала, выпрабоўвала, сядзела над кніжкамі, слала пісьмы на доследныя станцыі. Захапіўшыся, часам забывала пра сон і адпачынак, не маючы права забываць пра тысячы дробных, але неадкладных штодзённых спраў агранома.

І. М. Міцкевіч.

Глыбокі след

Рудэнка Мікалай Васільевіч (н. у 1924 г.) — Герой Сацыялістычнай Працы (1958 г.). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1947 г.— трактарыст, брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «Новае жыццё» Жыткавіцкага раёна. З 1967 г.— старшыня Тураўскага гарпасялковага Савета дэпутатаў працоўных, потым — механік у калгасе. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

... Мікалай Васільевіч Рудэнка працаваў другі год старшынёй выканкома Тураўскага пасялковага Савета. Пасля пасяджэння пастаяннай камісіі па сельскай гаспадарцы, дзе абмяркоўвалася пытанне аб правядзенні сяўбы, Рудэнка гаварыў:

— Высокіх, нябачных раней поспехаў дабіліся нашы хлебаробы. Толькі і 40 цэнтнераў з гектара — не мяжа, мы будзем атрымліваць удвая больш...

У той дзень у Савет зайшоў сталы чалавек, прадставіўся:

— Сырамаха.

Дзяніс Сырамаха... Прыгадаўся нарыс пад гэтай назвай Кандрата Крапівы. Кандрат Крапіва пісаў пра чалавека слаўнага лёсу, сына батрака, які змагаўся з ворагамі маладой савецкай улады ў легендарнай Чангарскай дывізіі, быў узнага-

М. В. Рудэнка

роджаны імянной зброяй. Шмат агульнага ў лёсе Дзяніса Рыгоравіча Сырамахі і Мікалая Васільевіча Рудэнкі. І галоўнае — любоў да Айчыны, вернасць роднай зямлі. Сырамаха граміў інтэрвентаў у часы грамадзянскай вайны. Мікалай Рудэнка, выпускнік фабрычна-заводскага вучылішча, з 1942 г. змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Удзельнічаў у баях на Курскай дузе, падвозіў на аўтамашыне боепрыпасы ў час правядзення Чырвонай Арміяй Беларускай аперацыі 1944 г. У гады ваеннай віхуры яго сэрца сціскалася ад болю, калі бачыў «параненыя» бомбамі і снарадамі, спаленыя вёскі і гарады Смаленшчыны і Беларусі. Рукі франтавіка сумавалі па мірнай сялянскай працы... Змагаўся з гітлераўцамі Рудэнка па-геройску. Сярод многіх узнагарод Радзімы ён асабліва цэніць першы медаль «За адвагу», які ён атрымаў за бітву на Курскай дузе.

Прыехаў Мікалай Васільевіч у Тураў пасля дэмабілізацыі ў 1947 г. Меў раненні. Згуляў сціплае вяселле з мясцовай дзяўчынай. Бацька яе загінуў ад рук акупантаў. Паставілі сваю хаціну, каля яе пасадзілі сад.

М. В. Рудэнка, як і ваяваў, працаваў у полі самаадцана, старанна. Хутка ён узначаліў трактарную брыгаду, якая дабілася выдатных паказчыкаў ў вырошчванні кукурузы. Неаднойчы ўдзельнічаў у Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР, яму было прысвоена званне «Заслужаны механізатар БССР». А ў 1958 г. на рэспубліканскай нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі Мікалаю Васільевічу Рудэнку ўручылі Зорку Героя. Ён працягваў слаўныя традыцыі Дзяніса Рыгоравіча Сырамахі, які ў перадваенныя гады з'яўляўся ўдзельнікам Усебеларускай нарады ўдарнікаў працы...

А. М. Шнып аркоў

Пахвалі пражыты дзень

Тачыла Аляксей Міронавіч (н. у 1927 г. у в. Верасніца) — Герой Сацыялістычнай Працы (1971 г.). Працаваў звеннявым механізаванага звяна калгаса «1 Мая». Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», медалямі.

...Разгортваю кніжачку, што напісаў чалавек, да якога еду, пачынаю чытаць прадмову: «Ёсць на Беларускім Палессі ў Жыткавіцкім раёне Верасніца — цэнтр калгаса імя Жданава (цяпер — «1 Мая»). Жывуць тут працавітыя людзі, якія хораша спраўлюцца са сваімі хлебаробскімі справамі...»

З гэтай кніжачкі, назва якой «Рэкорд становіцца нормай», можна даведацца, што Аляксей Міронавіч сёння сам прымае гасцей, ахвотна аказвае ім нават практычную дапамогу. Па прынцыпу: ёсць у мяне — будзе і ў вас, бярыце, скарыстоўвайце, бо мы — гаспадары на зямлі, давайце будзем гаспадарыць.

...Сядзіць перад табой звычайны чалавек, ну самы што ні ёсць звычайны, а ўзнагароджаны Зоркай Героя. Няўжо і сапраўды ён, акрамя поля, нічога больш і не бачыць вакол сябе? З аднаго боку, яно і добра, калі ёсць такія людзі, а з другога — дык і задумацца трэба... Поле полем, але ж у цябе і сям'я, і ўнукі вунь пайшлі, адзін за адным.

Тачыла пачынаў сваю працоўную кар'еру — у самым добрым сэнсе

А. М. Тачыла

гэтага слова — з вырошчвання кукурузы. Ён яе вывеў з заняпаду, яна яго — у людзі.

Сабраў неяк хлопцаў свайго звяна, сказаў:

— Папрацавалі разам, хопіць, браткі. Дзякуй вам. Ну, а цяпер пайду я...

— Куды? — насцярожыліся тыя.

— Не хвалюйцеся, далей Верасніцы не ўцяку. На суседняе поле. У вас тут справа наладжана, кукуруза вока радуе, а мне час за караняплоды ўзяцца.

Перш чым сказаць гэта, Тачыла ўсё ўзважыў, абдумаў, палічыў, што больш карысці прынясе гаспадарцы, калі пачне вырошчваць буракі. А то што ж атрымліваецца — па 200 цэнтнераў з гектара выходзіць на круг. І калі старшыня калгаса запытаў у Тачылы, колькі ж ён разлічвае атрымліваць, той ужо ведаў, што адказаць:

— Па семсот — восемсот цэнтнераў.

Сёння, калі абяцаны старшыні ўраджай даўно сабраны, Аляксей Міронавіч прыгадвае:

— Раней у нас пры вырошчванні караняплодаў былі механізаваны глебаапрацоўка, унясенне ўгнаенняў і сяўба. Догляд за пасевамі і ўборку праводзілі ўручную. Пры гэтым адзін апрацоўваў, скажам, глебу, другі ўносіў угнаенні, трэці сеяў, чацвёрты збіраў ураджай. Што ж атрымлівалася? Абязлічка. У павелічэнні ўраджайнасці ніхто асабліва не быў зацікаўлены. А мы пачалі плаціць не за апрацаваныя соткі, а па канчатковым выніку.

Пазней, трымаючы бурак вагой шаснаццаць — васемнаццаць кілаграмаў, жанчыны ківалі ў бок Тачылы:

— Галаву мае чалавек. Хто б мог падумаць, што такі бурак вырасце ў нас? А вырас!

Знатны земляроб, беручыся за новую для сябе справу, добра разумеў, што аднымі дзедаўскімі метадамі поспеху не дамагчыся. Сёння мала ўмець сеяць, араць, культываваць. Таму ён абклаўся падручнікамі па глебаводстве, аграхіміі, вывучаў фізіялогію расліны — як доктар, пэўна, чалавека. А вяршкі збіваць Аляксей Міронавіч не ўмее. Калі гаспадарыць на зямлі — дык гаспадарыць. Гэта і сіл патрабуе, і часу, і цярпення. Іншы раз папрок пачуеш ад жонкі, Ганны Дзянісаўны: «Ці табе больш трэба, чым іншым, Ляксей? Пад старасць хоць бы часцей дома быў. Сядзіш у тым полі, як грыб пад дрэвам...»

Відаць, такім, як Тачыла, і трэба больш. Поруч з ім адчулі сябе сапраўднымі гаспадарамі зямлі Пятро Міхайлавіч і Іван Васільевіч Блоцкія, Мікалай Ніканавіч Добрадзеравец, Васіль Мікалаевіч Клімовіч, зусім малады яшчэ механізатар Мікалай Міхайлавіч Жылан — аднадумцы і надзейныя памагатыя Героя.

В. Ю. Ткачоў

Адзначана «Залатой Зоркай»

Марусіч Сцепаніда Іванаўна (н. 21.12. 1928 г. у в. Запясочча) — Герой Сацыялістычнай Працы (1966 г.). У сельскай гаспадарцы пачала працаваць у 1947 г., з 1963 г.— жывёлавод калгаса «Перамога» Жыткавіцкага раёна. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР сёмага склікання. Узнагароджана ордэнам Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі.



С. І. Марусіч

Маляўнічая, песенная тураўская зямля стала калыскай для многіх герояў — вайны і мірнай працы. Тут надзвычай глыбокія карані мужнасці, адданасці справе людзей — нашчадкаў дрыгавічоў-тураўцаў... Адна з іх — Сцепаніда Іванаўна Марусіч. Жыве яна ў Запясоччы, а вёска гэтая ад Турава аддзяляецца толькі старым мастом каля сівой Замкавай гары. Тыя ж і традыцыі, і клопаты, і радасці... Нямнога іх выпала на долю Сцепаніды Іванаўны. З дзяцінства пазнала нялёгкую сялянскую працу. Бацька працаваў конюхам, маці таксама калгасніца, у паляводстве шчыравала. Дзяўчынка з малых гадоў, як магла, дапамагала маці, працавала нараўне з дарослымі. А юнацтва выпала на суровыя ваенныя гады. Цяжкім сном успамінаюцца гады акупацыі. Вызвалілі раён, і на жаночыя плечы лёг цяжар узнаўлення гаспадаркі. Памёр бацька, прама ў полі ўпаў, не вытрымала сэрца... Памерла і сястра Сцепаніды, Параска, страціла здароўе ў партызанскім атрадзе. Муж яе загінуў на фронце, засталіся сіротамі двое малых пляменнікаў Сцепаніды — Коля і Валодзя. Замяніла яна ім маці, выхавала, вывела ў людзі. Мікалай стаў палкоўнікам Савецкай Арміі, цяпер у адстаўцы, працуе начальнікам аддзела кадраў Беларускага дзяржаўнага цырка, Уладзімір усё свядомае жыццё шчыруе на нафтаправодзе «Дружба».

Працавала Сцепаніда ў тыя далёкія гады ў паляводстве, вырошчвала лён. Збірала па хатах попел, уручную падкормлівала пасевы, гэтак жа ўбіралі лён жанчыны, абівалі, расцілалі пад жнівеньскія росы, выраблялі кудзелю... Якім ён быў шаўкавістым, прыгожым — лён, вырашчаны і сабраны працавітымі жаночымі рукамі! Такіх ураджаяў, як у звяне Сцепаніды Марусіч, тады не збіралі нідзе ў раёне.

У 1950 г. Сцепанідзе Іванаўне даручылі новую справу — даглядаць цялят. І, як заўсёды, дзяўчына з душой узялася за работу. Па-другому яна не магла... Былі групы зусім слабыя, на якія не заставалася ніякіх надзей — якія з тых напаўжывых цялят выраслі каровы! Таму што Сцепаніда не лічылася ні з часам, ні з сіламі, каб захаваць і выхаваць маладняк. І траўкі збірала, каб лячыць захварэўшую жывёлу, і адвары рыхтавала, каб адпойваць. Спыніўся падзеж маладняку, адна з першых у раёне Сцепаніда Іванаўна пачала атрымліваць кілаграмовыя прывагі маладняку ў суткі. Таму нікога ў вёсцы не здзівіла ў 1966 г. навіна, калі ў газетах быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб тым, што за вялікія дасягненні ў працы С. І. Марусіч прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

В. Р. Феранц

* * *

Пераглядаючы старыя блакноты, натыкнуўся на запіс, датаваны 1977 годам: «Тураў. Жнівень. Цёплы вечар на Прыпяці. Заходзячае сонца крывавіць небасхіл. Маторка, натужваючыся, цягне ўверх па рацэ стары невялікі паром. Там, за Прыпяццю, летнія кашары калгаса «Новае жыццё». На пароме дзве запрэжаныя павозкі з пустымі бідонамі. Даяркі Надзея Самец, Марыя Румас, Ганна Занкевіч, Марыя Радзівонава, Лідзія Піткевіч і Марыя Жырчук горача, наперабой расказваюць пра сваё жыццё, працу, клопаты, надзеі і трывогі. Я слухаю іх і думаю, як мала трэба гэтым працавітым жанчынам — крыху цеплыні і ўвагі,— і яны ўжо, забыўшы пра свае жыццёвыя турботы, галасіста выводзяць над Прыпяццю палескую песню».

Тады і быў напісаны гэты верш, прысвечаны шчырым тураўскім жанчынам.

Я плыў па Прыпяці з даяркамі.
На хвалях гойдаўся паром.
І бакеншчык запальваў бакены
Над гаснучым стамлёным днём...

Даяркі ж горача расказвалі,
Як ім жывецца ў глушы...
І рукі мне свае паказвалі,
І ўсё прасілі: «Напішы».

«Пра нас ты напішы ў газету...»
«Як запражэшся раніцой...»
«Без выхадных на ферме гэтай.»
«Начальству што? Давай надой...»

Я прагна слухаў іх і думаў:
«Што ж, мая песня, ты маўчыш?
Што я зрабіў, каб меней суму
Было на тварах у жанчын?..

Што ім сказаць? Якія словы
Для іх знайсці ў сваёй душы?..»
Над Прыпяццю, надвечаровай
Крычала кнігаўка ў цішы.

А маладзіцы ўжо спявалі.
Ім да праблем не прывыкаць...
І гойдаўся паром на хвалях,
І, як жыццё, цякла рака...

Міхась Башлакоў

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ РЭСПУБЛІКІ

Сельскай гаспадаркі

Купрацэвіч Мікалай Мікалаевіч (н. 5.1.1920 г.), рос у вёсцы Дуброва круглым сіратой — бацька загінуў у час інтэрвенцыі белапалякаў, маці памерла праз два гады. Хлапчука выхоўваў дзед Сямён Купрацэвіч. Закончыў пачатковую школу — і з 13 гадоў на калгаснай рабоце... Пастух, возчык, а ў 1940 г. прызваны ў Чырвоную Армію. Усю вайну прайшоў салдат, чатыры гады — на фронце, толькі восенню 1945 г. быў, нарэшце, дэмабілізаваны...

Франтавік, герой — два ордэны Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу» і многія іншыя — быў выбраны старшынёй мясцовага калгаса «Новае жыццё». Калі ў 1950 г. гаспадарку аб'ядналі з суседнім калгасам імя Леніна, Мікалай Мікалаевіч стаў працаваць намеснікам старшыні, затым на працягу амаль 20 гадоў — загадчыкам малочна-таварнай фермы. Працоўны стаж яго склаў больш 50 гадоў.

Мельнікава Ніна Антонаўна (н. у 1944 г.), закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці аграномія, была накіравана ў калгас імя Жданава Жыткавіцкага раёна, затым працуе галоўным аграномам у калгасе «Перамога». Трымае цесную сувязь з навукоўцамі НДІ генетыкі і цыталогіі АН Беларусі, якія на палетках калгаса выконваюць вопыты, забяспечваюць гаспадарку новымі гатункамі сельскагаспадарчых культур. Н. А. Мельнікава арганізавала вядомы клуб «100 цэнтнераў», які аб'ядноўвае аграномаў рэспублікі, зацікаўленых у атрыманні 100 цэнтнераў зерня з гектара.

І молат, і серп...

1930 год памятны Мікалаю Васільевічу Сапановічу тым, што ў Млынку бурна, з крыкамі, плачам, а то і апладысментамі арганізоўвалі калгас. У цяжкасцях, сапраўдных муках ён нараджаўся... Назвалі арцель «Х з'езд Саветаў». Старшыню

М. В. Сапановіч

выбралі свайго, мясцовага селяніна, старажнага працаўніка Івана Навумавіча Козела. Тут, уздоўж рэчкі Свінавод, дзе быў калісьці вадзяны млын, ад якога атрымала назву вёска, урадлівыя землі, ёсць шмат выгод, нездарма калгас з году ў год дасягаў добрых поспехаў, быў удзельнікам ВДНГ СССР у Маскве, у якасці ўзнагароды матацыкл прыслалі са сталіцы... Мікалай вучыўся ў школе, і хоць падзеі ў вёсцы не міналі яго, з малых год дапамагаў бацьку ў полі, яшчэ не прыйшоў яго час. Ён прыйшоў тады, калі грымнула вайна. Мікалай падаўся ў партызаны. Тут, у атрадзе, гартаваўся яго характар байца, каб пасля вызвалення раёна, на фронце, ён змог праявіць сябе... У тым смяротным баі ў Польшчы, калі на пазіцыі шалёна імчаліся варожыя танкі, і трэба было цаной жыцця не прапусціць іх, Мікалай Сапановіч быў цяжка паранены, а пасля шпіталю грудзі яго ўпрыгожыла першая баявая ўзнагарода — ордэн Славы III ступені. На Одэры — другое раненне, і яшчэ адзін ордэн салдацкай доблесці быў уручаны адважнаму байцу.

Калі ў сакавіку 1947 г. салдат вярнуўся, нарэшце, на радзіму — кавалер двух ордэнаў Славы, Айчыннай Вайны, медалёў «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна» — работа знайшлася якраз пад яго байцоўскі характар. Кавалём... Ля гарачага горна, з цяжкай кувалдай і звонкім малатком Мікалай Васільевіч працаваў у калгаснай кузні звыш сарака гадоў. Колькі прылад працы, інструменту, рознога начыння выкаваў ён за гэты час — хто злічыць?.. Доўга яшчэ будуць служыць яны людзям, выкаваныя працавітымі рукамі ўмельца. Цяжкім молатам зарабіў М. В. Сапановіч не толькі званне заслужанага работніка сельскай гаспадаркі рэспублікі, але і, што значна важней, добрую памяць пра сябе ў нашчадкаў...

А. А. Ярмоленка

Народнай адукацыі

Акуліч Рыгор Паўлавіч (н. 28.10. 1912 г. у Тураве) працаваў дырэктарам школы ў Запясоччы, з чэрвеня 1941 г.— на фронце, маёр. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны II ст., Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля дэмабілізацыі — на педагагічнай рабоце, дырэктар культпрасветвучылішча ў Гродне, дырэктар рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры.

Памёр у 1994 г.

Быстрэнка Любоў Мануілаўна (н. у 1923 г. у в. Беразіна), закончыла Кащэвіцкае педвучылішча, працавала настаўніцай малодшых класаў у Кажановічах, Мілевічах, Людзяневічах. З 1952 г.— загадчыца Сялкоўскай пачатковай школы. Выхаванню дзяцей аддала 40 гадоў жыцця.

Воранава Кацярына Іванаўна (н. 25.8.1922 г.), перад вайной закончыла Цюменскае педагагічнае вучылішча, працавала ў пачатковых школах у Сібіры. Разам з мужам, які ў час вайны знаходзіўся ў шпіталі, у 1944 г. прыехала ў Тураў, працавала ў сярэдняй школе № 1. За больш як 40 гадоў педагагічнай дзейнасці атрымала прызнанне ў раёне як цудоўны знаўца дзіцячай псіхалогіі, адданы справе выхавання маладога пакалення, які смела браў на ўзбраенне навейшую методыку навучання.

Ерамейчык Ганна Яўхімаўна (н. у 1934 г.), з малых гадоў засталася сіратою — бацька загінуў на фронце, маці памерла адразу пасля вайны, засталося пяцёра малых дзяцей. У 1960 г. закончыла матэматычны факультэт Белдзяржуніверсітэта, больш 20 гадоў працавала настаў-

ніцай матэматыкі ў Хваенскай сярэдняй школе — была не толькі выдатным педагогам, але і надзейным старэйшым настаўнікам вучням. З'яўлялася дэлегатам Жыткавіцкага раёна на з'ездзе настаўнікаў Беларусі.

Памерла ў 1991 г.

Івашкевіч Валянціна Карлаўна (н. у 1924 г.), у гады сталінскіх рэпрэсій была выслана разам з сям'ёй у Пермскую вобласць, бацька расстраляны. Маці, забраўшы траіх непаўналетніх дзяцей, самавольна пакінула месца высылкі і апынулася ў Бабруйску, але хутка ўсіх адправілі назад на поўнач. Валянціна Карлаўна ў 1944 г. закончыла ў Пермі настаўніцкі інстытут і адразу пасля вызвалення Беларусі прыехала працаваць у Ельск. Была сакратаром Жыткавіцкага райкома камсамола, затым працавала настаўніцай літаратуры ў Жыткавіцкай сярэдняй школе № 2. Па дарозе маці пайшлі і дзеці — дочкі Святлана і Тамара.

Лазарэвіч Мікалай Дзмітрыевіч (н. 28.9.1928 г.), бацькоў сваіх не памятае, выхоўваўся ў дзіцячым доме. У 1947 г. закончыў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча, працаваў у школе ў Хойніцкім раёне, пасля службы ў Савецкай Арміі — настаўнікам пачатковых класаў у Градаўской, потым Юркевіцкай школах. Сваёй шматгадовай работай М. Д. Лазарэвіч яшчэ раз пацвердзіў, што галоўны настаўнік у школе — настаўнік пачатковай школы.

Лукашэвіч Васіль Пятровіч (н. 20.3.1923 г. у в. Букча), быў высланы разам з сям'ёй пасля раскулачвання ў Запарожскую вобласць. Усю вайну — на фронце, вызваляў Беларусь, Польшчу, Чэхаславакію, змагаўся на тэрыторыі Германіі. Узнагароджаны ордэнамі Славы II і III ступені, баявымі медалямі. Пасля вайны працаваў настаўнікам у Рычоўскай школе, дырэктарам Тураўскага дзіцячага дома, затым завучам і дырэктарам Рычоўскай сярэдняй школы. На працягу многіх гадоў выбіраўся дэпутатам Рычоўскага сельскага Савета.

Лаценкова Марыя Іванаўна (н. у 1931 г. у в. Запясочча), у 1952 г. закончыла Пінскае педагагічнае вучылішча, працавала настаўніцай у розных школах раёна. Завочна закончыла Мазырскі педінстытут імя Н. К. Крупскай. Навучала дзяцей на аснове самых новых метадычных рэкамендацый, аўтарам многіх з якіх з'яўлялася сама.

Ліхота Аляксандр Аляксандравіч (н. 8.5.1925 г. у г. п. Жыткавічы), закончыў Гомельскі педінстытут імя Чкалава, гісторык. Працаваў настаўнікам, дырэктарам Жыткавіцкай школы-інтэрната, з 1969 г. на працягу дзесяці гадоў — загадчык раённага аддзела народнай адукацыі, затым — дырэктар сярэдняй школы № 1.

Справу бацькі працягвае сын — Аляксандр Ліхота, дырэктар сярэдняй школы № 1 у Жыткавічах.

Маркевіч Васіль Нічыпаравіч (н. 18.8.1935 г. у в. Пагост), працаваў рахункаводам у калгасе «Савецкая Беларусь», загадваў хатай-чытальняй. З 1956 г.— настаўнік, апошнія 25 гадоў — дырэктар Пагосцкай сярэдняй школы.

Мяшкоўская Кацярына Фядосаўна (н. у 1927 г.), закончыла Мазырскі настаўніцкі інстытут. Выкладала рускую мову і літаратуру ў сельскіх школах вобласці. З 1954 г. на працягу трыццаці гадоў працавала дырэктарам Мілевіцкай сярэдняй школы. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Некрашэвіч Міхаіл Васільевіч (н. 10.8.1942 г. у в. Пасека), настаўнік фізкультуры Людзяневіцкай сярэдняй школы. Закончыў Гродзенскі фізкультурны тэхнікум. Прызёр першынства рэспублікі па лёгкай атлетыцы. Школа неаднаразова з'яў-

лялася пераможцай раённых, абласных і рэспубліканскіх аглядаў па фізічным выхаванні дзяцей. М. В. Некрашэвіч распрацаваў і змайстраваў вялікую колькасць нестандартнага абсталявання для школьных спартыўных залы і пляцоўкі. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Слесарчук Канстанцін Сяргеевіч (н. у 1930 г. у в. Азяраны), працаваў у Хваенскім леспрамгасе, пасля вайсковай службы — настаўнік у Азяранскай васьмігадовай школе. Сярод выхаванцаў К. С. Слесарчука многа майстроў спорту СССР, прызёраў абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў.

Туравец Рыгор Мікітавіч (н. 8.2. 1923 г. у в. Найда), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, старэйшы настаўнік раёна. Закончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут, працаваў у Будаўскай пачатковай школе, затым у іншых школах раёна, апошнюю чвэрць стагоддзя — настаўнікам матэматыкі ў Жыткавіцкай сярэдняй школе № 1. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і баявымі медалямі.

Памёр у 1991 г.

Шахлевіч Любоў Васільеўна (н. у 1924 г.), закончыла Баранавіцкі настаўніцкі інстытут, на працягу амаль 40 гадоў, пачынаючы ў неймаверна цяжкіх умовах адразу пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, працавала ў в. Малыя Сцяблевічы загадчыцай пачатковай школы. Назапасіла каштоўны вопыт адначасовай работы з трыма класамі, удала спалучала працэс навучання з выхаваннем дзяцей.

Чыгункі

Судоменка Аляксей Пятровіч (н. 18.4.1911 г.), у 1938 г. закончыў спецшколу цягніковых машыністаў, пачаў сваю працоўную дзейнасць на ст. Васілевічы. Член ЦК ЛКСМ



А. П. Судоменка

А. М. Сівуха

Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, машыніст вайсковых эшалонаў. Да 1946 г.— на лініі Усурыйск — Харбін. У пасляваенны час — у Жыткавічах.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, шматлікімі баявымі і працоўнымі медалямі. Ганаровы чыгуначнік СССР.

Памёр 27.6.1993 г.

Медыцыны

Сівуха Аляксей Мікалаевіч (н. 25.9.1929 г.), закончыў Мінскі медыцынскі інстытут, звыш 25 гадоў працаваў галоўным урачом Хваенскай участковай бальніцы. Не пакінуў работу і пасля выхаду на пенсію.

Прамысловасці

Лапко Аляксандр Міронавіч, дырэктар вытворчага лесанарыхтоўчага аб'яднання «Жыткавічлес», які ўнёс значны ўклад у павышэнне эфектыўнасці працы ў галіне.

Працаўнікі раёна, адзначаныя вышэйшай узнагародай — ордэнам Леніна

Акуліч Аляксей Якаўлевіч (н. у 1929 г. у в. Старажоўцы), брыгадзір калгаса імя XX з'езда КПСС. У 1965 г. дзякуючы стараннай працы хлебаробаў у брыгадзе быў атры-

маны рэкордны на той час ураджай збожжавых — 33 цэнтнеры з гектара, а таксама звыш 200 — бульбы, 450 цэнтнераў буракоў.

Бубліс Іосіф Аляксандравіч (н. у 1884 г.), удзельнік імперыялістычнай вайны, у 1917 г. выбраны старшынёй палкавога салдацкага камітэта, неаднаразова сустракаўся з М. В. Фрунзе. У 1918—1919 гг.— начальнік палкавой разведкі, узнагароджаны імянным гадзіннікам. У гады Вялікай Айчыннай вайны — на фронце. Узнагароджаны многімі баявымі ордэнамі і медалямі. У апошнія гады знаходзіўся на пасадзе старшыні Мілевіцкага сельскага Савета.

Памёр у 1970 г.

Жогаль Вольга Іванаўна (н. у 1929 г.), пачала сваю працоўную біяграфію ў цяжкія пасляваенныя гады. Доўгі час шчыравала на жывёлагадоўчай ферме калгаса «III Інтэрнацыянал», даглядала маладняк, штогод дабівалася высокіх прывагаў і поўнага захавання статка.

Катлярова Марыя Рыгораўна (н. у 1933 г.), закончыла Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, з 1958 г. працавала аграномам у калгасе «Савецкая Беларусь», затым — старшыня калгаса «Дзень ураджаю», старшыня Азяранскага сельскага Савета. Студыяй «Летапіс» пра М. Р. Катлярову ў 1986 г. зняты дакументальны фільм «Мар'іна поле».

Узнагароджана ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны».

Комар Дзмітрый Цімафеевіч (н. у 1925 г. у в. М. Малешаў), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны баявымі медалямі. У пасляваенны час — брыгадзір паляводчай брыгады калгаса імя Жданава. Брыгада штогод атрымлівала высокія ўраджаі ўсіх сельскагаспадарчых культур.

Казлоў Іван Фёдаравіч (н. у 1900 г. у Тураве) — удзельнік грамадзянскай вайны, Вялікай Айчыннай вайны. Гвардыі палкоўнік, узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай Вайны II ст., двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, баявымі медалямі.

І. Ф. Казлоў



П. А. Кот

Памёр у 1980 г.

Кот Павел Андрэевіч (н. у 1920 г. у в. Запясочча), доўгі час працаваў брыгадзірам калгаса «Перамога». Працаўнікі брыгады атрымлівалі высокія ўраджаі ўсіх сельскагаспадарчых культур, асабліва добра ўдаваліся збожжавыя, лён. Славяцца гэтымі культурамі земляробы калгаса і сёння.

П. А. Кот — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., Славы III ст., Чырвонай Зоркі, многімі баявымі медалямі, у мірны час — ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Курбан Мікалай Мікалаевіч (н. у 1929 г. у в. Запясочча), на працягу больш 40 гадоў працаваў механізатарам калгаса «Перамога», заслужаны работнік лепшай у раёне гаспадаркі.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны».

Лазарчук Іван Іосіфавіч (н. у 1929 г. у в. Пагост), працаваў трактарыстам у Тураўскай МТС, з 1957 — механізатар калгаса імя Леніна, затым «Савецкая Беларусь».

Узначальваў паляводчую брыгаду, якая адной з першых на Тураўшчыне атрымала ў сярэдзіне 70-х гадоў ураджай збожжавых звыш 50 цэнтнераў з гектара.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Петрушкевіч Аляксандр Юльянавіч (н. у 1924 г. на х. Петрушкевічы каля в. Пасека), пасля дэмабілізацыі ў 1947 г. працаваў у родным калгасе «Заветы Леніна», з 1962 г.— брыгадзір адной з лепшых паляводчых брыгад у в. Пасека.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

Рабцэвіч Іван Марцінавіч (н. у 1927 г. у в. Рычоў), працаваў у Тураўскай МТС, затым — механізатар калгаса «Перамога». З году ў год дабіваўся вышэйшай выпрацоўкі, эканоміі ГЗМ, утрымліваў тэхніку ва ўзорным стане.

Радзівонава Ганна Аляксандраўна (н. у 1941 г. у Тураве). Працоўны стаж пачала ў 1956 г. у калгасе «Новае жыццё» — працавала даяркай, цялятніцай, атрымлівала найвышэйшыя ў раёне прывагі маладняку.

Рай Леанід Міхайлавіч (н. у 1930 г.), працаваў у Тураўскай МТС, затым — механізатар, звеняваны механізаванага звяна ў калгасе імя XXII з'езда КПСС. За выдатныя поспехі ў вырошчванні кукурузы ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Рыбалка Васіль Радзівонавіч (н. у 1914 г.) — актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнік рыбнай вытворчасці ў раёне. У 1936 г. закончыў Маскоўскі тэхналагічны інстытут, служыў у арміі. З 1939 г.— тэхнічны дырэктар рыбгаса «Белае». У гады вайны — у партызанах, начальнік штаба разведвальна-дыверсійнага атрада Р. М. Лінькова (Баці). У пасляваенны час на працягу дзесяцігоддзяў узначальваў вядомы на Палессі рыбгас. Заслужаны рыбавод Беларусі.

Памёр у 1983 г.

Саскевіч Ціт Якаўлевіч (н. у 1936 г. у в. Слепцы), закончыў у 1953 г. курсы трактарыстаў пры Тураўскай МТС і ўвесь час працуе механізатарам у калгасе «Савецкая Беларусь». Звеннявы звяна па вырошчванню бульбы, майстар атрымання высокіх ураджаяў гэтай культуры.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Сулкоўскі Іван Філімонавіч (н. у 1928 г.), закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, на працягу 15 гадоў узначальваў адзін з перадавых калгасаў раёна «III Інтэрнацыянал», які за гэты час дасягнуў значных поспехаў ва ўсіх галінах сельскагаспадарчай вытворчасці.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», медалямі.

У светлыя хаты

Нялёгкае дзяцінства выпала на долю Аляксея Купрацэвіча. Бацька быў інвалідам, дастатку ў доме ніколі не было. Аляксей — старэйшы з пяці дзяцей, на яго была галоўная апора, калі пасталеў. З цяжкай сялянскай працай знаёмы з малых год, мог і касіць, і хадзіць за плугам, і сеяць... У 1937 г.,калі хлопцу было ўжо 19 гадоў, закончыў у Бялёве сямігодку. Паслалі на курсы шафёраў, і вось Аляксей Купрацэвіч — за рулём адной з першых у калгасе імя Леніна аўтамашын.

Шафёрам ён быў і ў арміі, куды прызвалі сялянскага хлопца восенню 1939 г. За рулём ЗІС-5 ён служыў і ваяваў у гады вайны каля Ленінграда. Доўгія ваенныя дарогі наматваліся на колы грузавіка. Славутая

ВЫПИСКА
ИЗ ПРИКАЗА ПО 135-МУ ОТДЕЛЬНОМУ ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНОМУ БАТАЛЬОНУ

10 мая 1943 г. пос. Морозова

№ 131

...§ 4. За образцовое несение службы и перевыполнение норм выработки на 200 % по перевозке предприятия на строящуюся трассу пос. Морозова — Черная речка шофера-красноармейца 849-го ОАТВ тов. Купрацевича награждаю личным автопортретом с надписью о награждении и объявляю благодарность.

Командир 135-го ОДСБ майор *Юмашев*.
Выписка верна: начальник капитан *Бухаев*.

«дарога жыцця» праз Ладагу была для А. І. Купрацэвіча сапраўднай дарогай жыцця, якая ў кожную хвіліну магла абарвацца назаўсёды. Разам з баявымі таварышамі-шафёрамі вазіў для жыхароў блакаднага Ленінграда прадукты, не задумваючыся, рызыкаваў, спяшаўся, аб'язджаў ледзь бачныя вялікія палонкі ў лёдзе...

А ў канцы лета 1945 г., калі адгрымелі пераможныя салюты ў Берліне, лёс закінуў воіна на Далёкі Усход, дзе разгаралася вайна з японскімі мілітарыстамі. І там ён быў за рулём аўтамашыны... Медалі «За адвагу», «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй» адзначылі баявы шлях воіна.

...Вярнуўся дамоў. Застаў на радзіме страшную галечу пасля трох гадоў «гаспадарання» акупантаў, суцэльнае пажарышча, холад і голад... Выбралі салдата старшынёй Марохараўскага сельсавета. «За што ўзяцца ў першую чаргу?» — думаў ён. Адказ падказвала жыццё: «За будаўніцтва... Выцягнуць людзей з зямлянак, пасяліць у хаты — тады прыйдзе і ўсё астатняе. Тады можна спытаць і за работу». Такі быў выбраны галоўны напрамак мірнага наступлення, і, як паказаў час, ён быў правільным.

Надзвычай дружна працавалі сяляне, і прыклад ва ўсім паказваў малады старшыня сельсавета. Дапамагла дзяржава — кожная сям'я атрымала бясплатна па 50 кубаметраў лесу, іншыя будаўнічыя матэрыялы. Адна за другой паўставалі ў Марохараве і ў навакольных вёсках новыя хаты. А ў 1949 г. газеты прынеслі радасную вестку: у гонар 30-годдзя ўтварэння Беларускай ССР за поспехі ва ўзнаўленні народнай гаспадаркі Аляксей Іванавіч Купрацэвіч узнагароджаны ордэнам Леніна. У гэты час, аднымі з першых у раёне, ужо ў асноўным былі адбудаваны ўсе вёскі сельсавета — Марохараў, Ляхавічы, Пухавічы, Сяменча, Відошын, Пласток, Дуброва, Замошша, людзі перасяліліся з зямлянак у новыя светлыя хаты...

З ордэнам Леніна

Уладзімір Міхайлавіч Радзівонаў — чалавек сціплы і просты. Ён ніколі не любіў расказваць пра сябе. Магчыма, таму ў вёсцы Баравая не кожны ведае, што вырас тут сапраўдны герой, баявыя подзвігі якога адзначаны вышэйшай урадавай узнагародай — ордэнам Леніна.

Сувязным партызанскай разведгрупы Р. М. Лінькова Уладзімір стаў улетку 1942 г., калі яму не было яшчэ васемнаццаці гадоў. У кнізе «Даныя даставерны» І. М. Лінькоў падрабязна апісвае цяжкія першыя дні на акупіраванай тэрыторыі, калі не было ні сувязі з мясцовымі жыхарамі, ні даных

аб ворагу. На кожным кроку — небяспека. І добрую паслугу разведчыкам аказаў у той час Уладзімір Радзівонаў. А хутка юнак стаў паўнапраўным байцом партызанскага атрада.

За ўзорнае выкананне заданняў, мужнасць і гераізм У. М. Радзівонаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» І ст. А вясной 1944 г. за баявыя подзвігі яму быў уручаны ордэн Леніна.

...Уладзімір Радзівонаў — баец Чырвонай Арміі. Са сваім ручным кулямётам ён быў заўсёды наперадзе, там, дзе кіпеў бой, дзе была найбольшая небяспека... Гэта здарылася ў Германіі, у самым канцы вайны. У час аднаго з жорсткіх баёў, якія ў тыя дні не сціхалі цэлыя суткі, Радзівонаў вырашыў памяняць пазіцыю. Толькі прыўзняўся над варонкай, дзе залёг са сваім неразлучным кулямётам, як моцны ўдар у грудзі пахіснуў яго, кулямётчык страціў прытомнасць. Гэта варожая куля трапіла ў ордэн Леніна, адрыкашэціла, адарвала ордэн ад планкі і засела ў грудзях. Ордэн выратаваў жыццё байцу...

Калі Радзівонаў апрытомнеў і пачаў успамінаць, як было, першая думка — дзе ордэн? Ён, адарваўшыся ад планкі, упаў у кішэню. Так і насіў яго потым, ужо ў мірны час, выпісаўшыся са шпіталя, пагнутым, са збітай эмаллю, таму яшчэ больш дарагім. Побач з ордэнамі — яшчэ два медалі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

М. І. Якубоўскі

Сямёра яго сыноў

Мікалай Іванавіч Якубоўскі належыць да тых людзей, якія душой хварэюць за справу і на якіх трымаецца сёння вёска.

У вёсцы Чэрнічы гавораць, што ў Мікалая Іванавіча Якубоўскага адкрыты характар, вялікая душа... Не ўмее ён хітрыць, кожнаму гатовы прыйсці на дапамогу. Так было, калі памерла сястра яго жонкі і засталіся сіротамі трое малых хлопчыкаў. Людзі раілі Якубоўскім аддаць дзяцей у дзіцячы дом. Але Мікалай Іванавіч не згадзіўся. Ён стаў для іх бацькам. І ў сям'і Якубоўскіх стала сем сыноў. Кожнаму знайшлося і добрае слова, і кавалачак хлеба... Сямёра яго сыноў — прадаўжальнікі справы патомнага селяніна.

М. І. Якубоўскі працуе аператарам машыннага даення на жывёлагадоўчай ферме ў Чэрнічах. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы II і III ст.

Ад школьнай парты

Двойчы лаўрэат

Ханеня Піліп Сямёнавіч нарадзіўся ў 1900 г. у Людзяневічах. У сям'і бедняка, якім быў яго бацька, з малых гадоў зведаў цяжкую сялянскую працу, горыч і нястачу. У 1918 г. юнак добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію, змагаўся на франтах грамадзянскай вайны. З гэтага часу ён назаўсёды звязаў сваё жыццё з арміяй.

аб ворагу. На кожным кроку — небяспека. І добрую паслугу разведчыкам аказаў у той час Уладзімір Радзівонаў. А хутка юнак стаў паўнапраўным байцом партызанскага атрада.

За ўзорнае выкананне заданняў, мужнасць і гераізм У. М. Радзівонаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» І ст. А вясной 1944 г. за баявыя подзвігі яму быў уручаны ордэн Леніна.

...Уладзімір Радзівонаў — баец Чырвонай Арміі. Са сваім ручным кулямётам ён быў заўсёды наперадзе, там, дзе кіпеў бой, дзе была найбольшая небяспека... Гэта здарылася ў Германіі, у самым канцы вайны. У час аднаго з жорсткіх баёў, якія ў тыя дні не сціхалі цэлыя суткі, Радзівонаў вырашыў памяняць пазіцыю. Толькі прыўзняўся над варонкай, дзе залёг са сваім неразлучным кулямётам, як моцны ўдар у грудзі пахіснуў яго, кулямётчык страціў прытомнасць. Гэта варожая куля трапіла ў ордэн Леніна, адрыкашэціла, адарвала ордэн ад планкі і засела ў грудзях. Ордэн выратаваў жыццё байцу...

Калі Радзівонаў апрытомнеў і пачаў успамінаць, як было, першая думка — дзе ордэн? Ён, адарваўшыся ад планкі, упаў у кішэню. Так і насіў яго потым, ужо ў мірны час, выпісаўшыся са шпіталя, пагнутым, са збітай эмаллю, таму яшчэ больш дарагім. Побач з ордэнамі — яшчэ два медалі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

М. І. Якубоўскі

Сямёра яго сыноў

Мікалай Іванавіч Якубоўскі належыць да тых людзей, якія душой хварэюць за справу і на якіх трымаецца сёння вёска.

У вёсцы Чэрнічы гавораць, што ў Мікалая Іванавіча Якубоўскага адкрыты характар, вялікая душа... Не ўмее ён хітрыць, кожнаму гатовы прыйсці на дапамогу. Так было, калі памерла сястра яго жонкі і засталіся сіротамі трое малых хлопчыкаў. Людзі раілі Якубоўскім аддаць дзяцей у дзіцячы дом. Але Мікалай Іванавіч не згадзіўся. Ён стаў для іх бацькам. І ў сям'і Якубоўскіх стала сем сыноў. Кожнаму знайшлося і добрае слова, і кавалачак хлеба... Сямёра яго сыноў — прадаўжальнікі справы патомнага селяніна.

М. І. Якубоўскі працуе аператарам машыннага даення на жывёлагадоўчай ферме ў Чэрнічах. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы II і III ст.

Ад школьнай парты

Двойчы лаўрэат

Ханеня Піліп Сямёнавіч нарадзіўся ў 1900 г. у Людзяневічах. У сям'і бедняка, якім быў яго бацька, з малых гадоў зведаў цяжкую сялянскую працу, горыч і нястачу. У 1918 г. юнак добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію, змагаўся на франтах грамадзянскай вайны. З гэтага часу ён назаўсёды звязаў сваё жыццё з арміяй.

Ведалі энергічнага, дапытлівага камсамольца ў 18-м пагранічным атрадзе, ён стварыў у мястэчку камсамольскую ячэйку. А потым была вучоба ў Ваенна-медыцынскай акадэміі. Пасля заканчэння яе П. С. Ханеня накіраваны ў навукова-даследчы інстытут Савецкай Арміі. Тут спаўна раскрыліся здольнасці маладога ваеннага ўрача як вучонага. Хутка яго назначаюць начальнікам санітарна-хімічнай лабараторыі. Працуючы над праблемамі лячэння заразных хвароб, П. С. Ханеня вынайшоў сродак супраць сыпнога тыфу. За распрацоўку новага прэпарата і паспяховае ўкараненне яго ў медыцынскую практыку малады афіцэр-урач быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Праз некаторы час за поспехі ў лячэнні насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны яму была ўручана Дзяржаўная прэмія краіны і другі ордэн Леніна.

У 1950 г. П. С. Ханеня распрацаваў новы прэпарат для прафілактыкі лячэння вострых форм захворвання дызентэрыяй. Ён у другі раз стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Да канца жыцця палкоўнік П. С. Ханеня працаваў у галіне ваеннай медыцыны, яго ўклад у распрацоўку новых форм прафілактыкі і лячэння розных захворванняў вельмі вялікі.

Памёр П. С. Ханеня 17.7.1981 г.

Дакладны разлік

Тры браты, усе тры сыны вясковага настаўніка з Кольна Фёдара Трафімавіча Наумовіча — Адольф, Ніл і Руслан Наумовічы — кандыдаты фізіка-матэматычных навук, дацэнты кафедры вышэйшай матэматыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Беларускай політэхнічнай акадэміі. Па шляху бацькоў ідуць і іх сыны...

У Кольна і цяпер успамінаюць старога настаўніка Фёдара Трафімавіча Наумовіча — сапраўднага чалавека і сапраўднага настаўніка... Колькі добрых спраў ён паспеў зрабіць за жыццё! І крыніцу выкапаў, і дом пабудаваў, і дрэва, ды не адно пасадзіў у вёсцы, а галоўнае, вырасціў, вывеў у людзі трох сыноў. Ды якіх сыноў! Нібы тры багатыры з вядомай казкі. Не ўзялі яны сілай, узялі іншым — здароўем, спагадлівасцю, розумам...

Мала давялося вучыцца ў свой час Фёдару Наумовічу. Царкоўнаприходскую школу не закончыў, такі час быў, грамадзянская вайна — не да вучобы. Слуцкая школа сельскай моладзі, настаўніцкі тэхнікум... Недахоп ведаў папаўняў самастойна, прага і імкненне да ведаў былі такімі прыцягальнымі, што сельскі настаўнік не ўяўляў сваіх сыноў без вышэйшай адукацыі, прычым універсітэцкай, не ніжэй. Тое, што не ўдалося самому, Фёдар Трафімавіч увасобіў у поўнай меры ў Адольфу, Нілу і Русланy...

Вясковаму настаўніку даводзілася выкладаць усе прадметы, якія толькі вывучаюць школьнікі, і хоць больш любіў ён роднае слова, яго прыродная акуратнасць, дакладнасць, шчырасць узялі верх у сынах. Усе ў матэматыкі падаліся.

— Да вайны вучыцца не паспеў,— успамінае Адольф Фёдаравіч.— У акупацыю, пакуль бацька не пайшоў у партызаны, займаўся разам з ім самавучкай. Пасля вызвалення раёна пайшоў адразу ў пяты клас. Не магу не ўспомніць добрым словам Рыгора Мікітавіча Тураўца, якому было прысвоена званне заслужанага настаўніка Беларусі... Потым была доўгая штодзённая сцяжынка ў сярэднюю школу ў Жыткавічы.

Універсітэт, аспірантура — звыш 40 гадоў жыццё Адольфа Фёдаравіча непарыўна звязана з буйнейшай

навуковай установай рэспублікі.

Дарожка ў навуку сярэдняму брату — Нілу — такім чынам была ўжо пратаптанай. І ўжо зусім было зразумелым, што прыклад са старэйшых братоў возьме і Руслан... Старэйшыя браты працуюць на кафедры вышэйшай матэматыкі універсітэта, і ўжо старэйшы сын Адольфа Фёдаравіча, Ніфант, кандыдат фізіка-матэматычных навук, выкладчык на тым самым факультэце, другі сын таксама закончыў факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, і Глеб, сын Ніла Фёдаравіча,— таксама студэнт гэтага факультэта... Больш таго, і жонкі іх — матэматыкі. Адольф і Ніл Наумовічы з'яўляюцца аўтарамі некалькіх навуковых кніг, падручнікаў і даведнікаў па матэматыцы, якія выйшлі ў рэспубліканскіх выдавецтвах і ў Маскве.

... Апусцела бацькоўская хата ў Кольна. Няма больш да каго прыязджаць сынам і ўнукам, іржа пабіла косы ў павеці, якія звінелі калісьці роснымі раніцамі ў руках братоў, што сумавалі ў горадзе па сялянскай працы. І, здаецца, апусцелі коленскія наваколлі. А яны нярэдка сняцца братам, матэматыкі таксама ў душы схільны да лірыкі, да пяшчотных пачуццяў; родны край, як калыска дзяцінства, ніколі не забываецца...

Талент служэння людзям

Ілья Паўлавічу Ермачэнку было ўжо за пяцьдзесят, калі на другі дзень вайны ён быў ужо на фронце. Яшчэ ў 1910 г. малады доктар пачаў працаваць у земскай бальніцы ў Рэчыцы. Закончыў другі Ленінградскі медыцынскі інстытут, працаваў хірургам у горадзе на Няве, потым трапіў у Беларусь, на Палессе.

Цяжкімі франтавымі дарогамі прайшоў маёр медыцынскай службы І. П. Ермачэнка тысячы кіламетраў, быў ваенным хірургам шпіталя, санітарнага цягніка. Адзначаны шэрагам ваенных узнагарод. І як толькі была вызвалена Жыткаўшчына, яго прызначаюць загадчыкам хірургічнага аддзялення раённай бальніцы. Колькі людзей, каго ён вылечыў, выратаваў, успамінаюць яго добрым словам і цяпер! І. П. Ермачэнка браўся за самыя небяспечныя, рызыкоўныя, здавалася, безнадзейныя аперацыі ўжо тады, калі толькі пачулі людзі ўпершыню пра страшныя анкалагічныя захворванні. Звыш 12 тысяч аперацый зрабіў Ілья Паўлавіч у Жыткавіцкай раённай бальніцы. Вядомасць цудадзейнага ўрача перасягнула далёка за межы раёна, хворыя імкнуліся лячыцца толькі ў яго, і ён нікому не адказваў. У 1952 г. І. П. Ермачэнку было прысвоена званне заслужанага ўрача рэспублікі.

Вялікім аўтарытэтам у пасляваенныя гады ў Жыткавіцкай раённай бальніцы карыстаўся таксама ўрач-хірург Якаў Іосіфавіч Маўшовіч.

Дарогай навукі

Ісак Якаўлевіч Маўшовіч (н. 20.5.1933 г.) закончыў сярэднюю школу ў Жыткавічах у 1950 г. Настаўнікамі ў школе ў той час працавалі адукаваныя, шчырыя людзі — М. Ц. Гушчэня, Я. З. Загальскі, Н. А. Ту-



І. П. Ермачэнка

Я. І. Маўшовіч

равец, П. К. Семянчукоў, А. Ф. Рабіннікаў, Х. М. Вяршвоўскі, М. І. Суздалеў. Яны, а таксама бацька — заслужаны ўрач, надзвычай паважаны ў раёне, Якаў Маўшовіч, з дзяцінства прывучылі да творчай працы, адказнасці за любую даручаную справу. Ісак Маўшовіч закончыў Маскоўскі станкабудаўнічы інстытут, працаваў на прадпрыемствах абароннага значэння ў розных гарадах краіны. Яго цягнула ў навуку. Абараніў кандыдацкую, потым доктарскую дысертацыі, у 1990 г. І. Я. Маўшовічу прысвоена званне прафесара. Напісаў шэраг манаграфій, звыш 150 навуковых артыкулаў, мае 27 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы.

Працуе намеснікам дырэктара — галоўным інжынерам Харкаўскага НДІ тэхналогіі машынабудавання, кіруе работамі па стварэнні навейшых тэхналогій па апрацоўцы цяжкадэфармуемых металаў і сплаваў.

Акадэмік з Грабава

Калі Фёдар Лахвіч вучыўся ў пачатковай школе ў Грабаве, хадзіў за восем кіламетраў у сярэднюю школу ў Мілевічы, дзе склаліся да таго ж не зусім добрыя адносіны з настаўніцай хіміі — хто мог здагадацца, што ў вясковым хлапчуку дрэмле магутны талент вучонага-хіміка... Нават выдатны педагог, заслужаны настаўнік рэспублікі, дырэктар Мілевіцкай школы Кацярына Фядосаўна Мяшкоўская не разгледзела яго. Праявіў сябе Фёдар яшчэ ў час вучобы на хімічным факультэце Белдзяржуніверсітэта, нездарма здольнага юнака накіравалі ў аспірантуру ў Маскву ў Інстытут арганічнай хіміі Акадэміі навук СССР. Ён паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Затым навуковая дзейнасць Фёдара Адамавіча цесна звязана з Акадэміяй навук Беларусі. Ён узначаліў лабараторыю хіміі прастагландзінаў у Інстытуце біяарганічнай хіміі, доўгі час з'яўляўся намеснікам дырэктара па навуковай рабоце. Стаў доктарам хімічных навук, прафесарам, а ў 1994 г.— членам-карэспандэнтам АН Беларусі. Вялікі ўклад Ф. А. Лахвіча ў фарміраванне і развіццё навуковых напрамкаў інстытута несумненны, асабліва па даследаванні нізкамалекулярных біярэгулятараў... Цяпер ён узначальвае ў інстытуце лабараторыю хіміі прастагландзінаў.

Ф. А. Лахвіч — вядомы вучоны ў галіне арганічнай і біяарганічнай хіміі, ён аўтар звыш 350 навуковых работ, манаграфіі, звыш 80 вынаходстваў. Работы хіміка прызнаны спецыялістамі, на іх часта спасылаюцца спецыялісты краіны і за яе межамі. Навуковае і практычнае значэнне іх пацверджана шматлікімі аўтарскімі пасведчаннямі на вынаходствы, публікацыямі ў салідных выданнях, дакладамі на навуковых форумах у краіне і за мяжой.

— Толькі адзін прыклад значэння ў народнай гаспадарцы навуковых распрацовак, праведзеных у нашай лабараторыі,— расказвае Ф. А. Лахвіч. — Актывізіруючы ўплыў на рост і развіццё раслін нават выключна нізкіх канцэнтрацый — не больш 50 міліграмаў на гектар брасінастэроідаў дазваляе павышаць на 30—40 працэнтаў або ўхіляць зніжэнне патэнцыяльнай ураджайнасці сельскагаспадарчых культур. Сінтэз прыродных біярэгулятараў і іх аналагаў адкрывае неабмежаваныя перспектывы ўжывання ў многіх галінах гаспадаркі, у медыцыне і ветэрынарыі. Гэтым і заняты сёння вучоны разам з супрацоўнікамі лабараторыі.

... Фёдар Адамавіч поўны энергіі, новых творчых задумак. Галоўныя навуковыя распрацоўкі ў яго яшчэ наперадзе. Ён сваім мазалём дабіваўся ўсяго ў жыцці. Сірочае

дзяцінства — бацька загінуў у канцы вайны на фронце, у Польшчы, калі сын яшчэ не нарадзіўся,— жыццёвыя няўзгоды і несправядлівасці прывучылі яго не спыняцца на паўдарозе, упарта імкнуцца да перамогі. Калі ж не паспее штосьці ажыццявіць, працягне справу бацькі сын, таксама хімік, аспірант, у хуткім будучым вучоны, і таксама — Фёдар.

Калі шанцуе ў жыцці

Уладзімір Дзянісавіч Сядзельнік — чалавек наогул шчаслівы: усё яму ўдаецца. Яшчэ 10-гадовым хлапчуком у гітлераўскую акупацыю пашанцавала — застаўся жывы ў вогненнай віхуры. Многія жыхары Запясочча вясной 1944 г. шукалі прытулку і сховішча ў глухой партызанскай вёсцы Поўчын, знаходзілася там і сям'я Сядзельніка. Неяк напрадвесні вырашылі вярнуцца, а Поўчын на наступны дзень карнікі знішчылі разам з жыхарамі...

У першы клас Уладзімір пайшоў пасля вызвалення ўжо ў 9-гадовым узросце, шукаў сваю долю потым у Ленінградзе, куды паехаў разам з другімі вясковымі хлопцамі ў школу ФЗН. Быў будаўніком, але цягнула да ведаў, хацеў яшчэ вучыцца. І вось Уладзімір Сядзельнік — студэнт рамана-германскага аддзялення філалагічнага факультэта МГУ. Як чалавеку шчасліваму, а галоўнае — настойліваму, працалюбіваму, яму ўсё ўдавалася, што задумана: быў пакінуты ва універсітэце — у аспірантуры на кафедры замежнай літаратуры, напісаў і абараніў кандыдацкую дысертацыю аб творчасці швейцарскага пісьменніка Германа Гессэ.

У Арэхава-Зуеўскім педагагічным інстытуце Уладзімір Сядзельнік стаў прафесарам, загадчыкам кафедры рускай і зарубежнай літаратуры. Працягвае плённа працаваць у Інстытуце сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага і цяпер, не пакідае выкладчыцкай работы. Былы вясковы хлопец з Запясочча, а цяпер — доктар філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік інстытута, вядомы літаратурны крытык, перакладчык, член Саюза пісьменнікаў СССР, выдатнік народнай асветы РСФСР. Спіс навуковых даследаванняў дасягае двухсот назваў. Уладзімір Сядзельнік выдаў кнігі «Герман Гэссе і швейцарская літаратура», «Швейцарскія варыянты», укладальнік шэрагу зборнікаў замежнай літаратуры.

У Уладзіміра Дзянісавіча Сядзельніка вялікія творчыя планы, шмат задумак, якія, трэба меркаваць, яму ўдасца выканаць — пашчаслівіцца, як заўсёды...

Ваеннай медыцыны прафесар

Ніхто не здагадваўся, ды і самому Мікалаю Кацубінскаму, напэўна, не ўяўлялася ў тыя цяжкія пасляваенныя гады, калі ён заканчваў у Жыткавічах школу і развітваўся з родным горадам, што ў яго схаваны гэты талент — медыка, вучонага, выхавацеля... Цягнула хлопца ў медыцыну, не дарма падаў дакументы ў Ленінград у Ваенна-марскую медыцынскую акадэмію імя С. М. Кірава. З адзнакай закончыў яе, служыў урачом у розных часцях Паўночнага флоту.

Мікалай Кацубінскі адчуваў, што здольны на большае, яго вабіла навука... Паступіў у ардынатуру, і хутка малады ваенны ўрач ужо выкладаў на кафедры тэрапіі акадэміі, курсантам якой быў сам.

У 1970 г. абараніў кандыдацкую, праз дзесяць гадоў — доктарскую дысертацыі. Звыш 20 гадоў М. М. Кацубінскі працуе на выкладчыцкай рабоце. Стаў прафесарам.

Галоўная тэма, над якой працуе М. М. Кацубінскі,— захворванне

крыві. Гэта цяжкія, вельмі працяглыя хваробы, якія тояць многа невядомага, складанага. Найбольш буйныя раздзелы яго навуковых даследаванняў — лейкозы, трансфузіялогія, парушэнне гемастазу пры цяжкіх траўмах і раненнях. Прафесар М. М. Кацубінскі — старшыня Ленінградскага гарадскога навуковага таварыства ўрачоў-лабарантаў, прыкладае шмат намаганняў для ўкаранення навейшых дасягненняў лабараторнай дыягностыкі ў практыку медыцынскіх устаноў. Ён апублікаваў каля 100 навукова-метадычных работ, удзельнічаў у падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў, даведнікаў. Удзельнік многіх усесаюзных навуковых з'ездаў і канферэнцый.

Палкоўнік медыцынскай службы М. М. Кацубінскі — нястомны паборнік здаровага быту і ладу жыцця. Вялікая навуковая работа не перашкаджае яму рэгулярна займацца спортам, ён пастаянны ўдзельнік традыцыйных шматкіламетровых прабегаў Ленінград — Пушкін. Калі б скласці ўсе гэтыя кіламетры разам, яны даўно дасягнулі б ад Санкт-Пецярбурга да Жыткавіч, дзе нарадзіўся ў 1932 г. вучоны.

В. Р. Феранц

Вялікае сэрца

Уладзімір Міхайлавіч Волкаў нарадзіўся ў сівым Тураве і назаўсёды застаўся адданы свайму легендарнаму, па волі лёсу занядбанаму, забытаму краю. Усе сілы, усё сваё неспакойнае і трывожнае жыццё ён аддаў Тураву, каб падняць яго з забыцця, ускалыхнуць твань застою, абудзіць пачуццё годнасці ў людзей, продкаў легендарных дрыгавічоў...

Нялёгка складваўся лёс Волкава з самага дзяцінства. Цяжкая хвароба прыкавала яго да ложка. І толькі магутная сіла волі дапамагла



У. М. Волкаў

ўстаць на ногі, перамагчы інваліднасць і стаць, як марыў, урачом, каб дапамагаць людзям, пакуты якіх ён добра разумеў. Малады ўрач-хірург пасля заканчэння медыцынскага інстытута ў 1975 г. ужо прымаў хворых у раённай бальніцы ў далёкай Сібіры. Праз некаторы час ён становіцца галоўным урачом бальніцы, потым праходзіць ардынатуру ў Краснаярску. Але яго ўвесь час цягнула на радзіму. Хоць ужо зрадніўся з Сібір'ю, палюбіў гэты суровы край, спакваля прыходзіла рашэнне вярнуцца ў Тураў.

З 1981 г. У. М. Волкаў працуе ўрачом Тураўскай бальніцы. Умовы працы былі надзвычай цяжкія — бальніца ў аварыйным стане, не хапала персаналу, стацыянар заўсёды перапоўнены, асобныя кабінеты размешчаны па ўсім пасёлку... Між тым яшчэ пяць гадоў назад у высокіх інстанцыях было прынята рашэнне аб будаўніцтве ў Тураве новай бальніцы. Тэрмін уводу, 1980 г., даўно прайшоў, а работа яшчэ і не пачыналася, усё знаходзілася на стадыі ўзгадненняў, зацверджанняў, праектаў... І калі б не энтузіязм, настойлівасць, непрымірымасць У. М. Волкава, невядома, ці не цягнулася б гэтая бюракратычная ваўтузня і сёння... У пастаянных клопатах, спрэчках, хваляваннях ён зусім падарваў свае сілы, слабае здароўе. Але бальніца ў 1988 г. прыняла хворых — гэта

была сапраўдная перамога. Немалы ўклад у яе належыць таксама тагачаснаму старшыні калгаса «Новае жыццё» М. М. Арцюшку, пісьменніку В. У. Быкаву, многім іншым сумленным людзям.

Сёння бальніца — стацыянар на 100 ложкаў, кабінеты з сучасным абсталяваннем і ўстаноўкамі, выдатныя ўмовы для хворых, шмат высокакваліфікаваных урачоў. У. М. Волкаў запрашаў на работу ў Тураўскую бальніцу добрых спецыялістаў — з усіх бакоў, сваіх знаёмых, тых, каго ведаў, з кім разам вучыўся. Многія адгукнуліся і прыехалі — муж і жонка Елісеевы, Ірына Аляксандраўна і Аляксандр Генадзьевіч Пермінавы.

Волкаў марыў стварыць на базе бальніцы дыягнастычна-курортны цэнтр. Але гэтаму не суджана было збыцца. Надарванае цяжкай работай, перажываннямі, барацьбой з медыцынскім бюракратызмам сэрца Уладзіміра Мікалаевіча не вытрымала, і ў жніўні 1989 г., пражыўшы ўсяго 39 вёснаў, ён памёр.

А бальніца ў Тураве, якой ён аддаў усе сілы і, нарэшце, жыццё,— працуе. На мемарыяльнай дошцы ля ўваходу выбіты словы: «Тут працаваў Уладзімір Мікалаевіч Волкаў, галоўны ўрач, хірург, добры чалавек. Дзякуючы яго самаадданасці пабудавана гэтая бальніца».

Колькі людзей успамінаюць добрым словам урача Волкава — чалавека з вялікім сэрцам, колькі абавязаны яму жыццём!.. Будынак бальніцы імя У. М. Волкава — сапраўдны помнік яму самому, толькі не халодны і бяздушны, а жывы, які служыць людзям добрую службу. Уладзімір Мікалаевіч быў, здаецца, чалавекам будучага наступнага веку, дзе галоўным багаццем будзе па праву лічыцца менавіта чалавек з яго радасцю і болем, перажываннямі і імкненнямі. І як чалавек, які прыйшоў у гэты супярэчлівы свет раней свайго часу, як чалавек заўтрашняга дня, У. М. Волкаў, падобна тургенеўскаму Яўгенію Базараву, таксама доктару, згарэў заўчасна, усяго сябе аддаўшы служэнню людзям...

С. А. Сяргейчык

Тэхніка — яго жыццё

Дзяцінства і юнацтва Мікалая Богдана выпала на цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады, да працы — ці сялянскай, ці рабочай, творчай — яму было не прывыкаць. Упартасцю і стараннасцю ў любой рабоце адзначана ўсё яго жыццё, менавіта гэтыя якасці прынеслі поспех, прызнанне, вядомасць...

Імкненне да вучобы, да дакладных навук і тэхнікі праявілася ў Мікалая яшчэ ў час вучобы ў Хваенскай сярэдняй школе. Закончыў яе ў 1960 г. і адразу паступіў у Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум. Адслужыў у арміі і падаў дакументы ў політэхнічны інстытут у Мінску. Ён і вызначыў далейшы лёс маладога здольнага інжынера. Мікалай Богдан два гады папрацаваў на Мінскім трактарным заводзе — быў і майстрам і інжынерам у аддзеле, і паступіў у аспірантуру БПІ. Ён увесь час адчуваў, што здольны на большае, але не хапала ведаў, яго цягнула ў навуку. У 1976 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, праз некалькі гадоў — доктарскую. Да гэтага часу ён працаваў на кафедры «Трактары» політэхнічнага інстытута, быў дацэнтам, а ў 1987 г. выбраны прафесарам.

Імя Мікалая Уладзіміравіча Богдана добра вядома ў тэхнічным асяроддзі. Ён з'яўляецца навуковым кіраўніком галіновай навукова-даследчай лабараторыі колавых трактароў, спіс яго навуковых прац перавышае 400, у тым ліку манагра-

фія, тры вучэбныя дапаможнікі, звыш 300 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы. Навуковая і творчая думка вучонага са сціплай вёскі Хваенск б'е крыніцай і знаходзіць выйсце ў новых распрацоўках, адкрыццях, вынаходствах.

П. І. Кальцоў

Карані і крона

Яны выраслі ў сям'і, дзе да адукацыі ставіліся так, як да вады і паветра, без чаго нельга жыць... З кожнай службовай камандзіроўкі бацька прывозіў у якасці падарункаў выключна кнігі, маці, маючы ўсяго адну прыстойную сукенку, пераконвала мужа набыць дочкам піяніна, каб яны маглі пайсці ў музычную школу, якая тады толькі адкрылася ў Тураве. Ніна Ігнатаўна і Аляксандр Сямёнавіч Сяргейчыкі не змаглі вучыцца ў ВНУ. Але пяць іх дачок не толькі ўсе скончылі сярэднюю школу з залатым медалём, але ўсе атрымалі вышэйшую адукацыю. Дзве сталі ўрачамі, адна — настаўніцай музыкі, дзве — вучонымі-біёлагамі: доктар біялагічных навук Святлана Аляксандраўна Сяргейчык і кандыдат біялагічных навук Ала Аляксандраўна Сяргейчык — супрацоўнікі лабараторыі экалагічнай фізіялогіі раслін Цэнтральнага батанічнага сада Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

У кнігах, напісаных імі, ёсць раздзелы, дзе даюцца практычныя рэкамендацыі, як выкарыстоўваць зялёныя насаджэнні для аздараўлення прамыслова-гарадскога асяроддзя. Бо ў адным і тым жа горадзе ў розных раёнах пераважаюць розныя тэхнагенныя забруджвальнікі. Адпаведна і трэба падбіраць найбольш устойлівыя да іх дрэвы і кусты.

С. А. Сяргейчык

Экалагічная фізіялогія раслін — надзвычай злабадзённы і мала даследаваны напрамак. Таму сёстраў-сааўтараў часта запрашаюць на міжнародныя экалагічныя сімпозіумы. Паміж Цэнтральным батанічным садам АН Рэспублікі Беларусь і Варшаўскім батанічным садам заключаны дагавор па даследаванні праблем экалагічнай фізіялогіі раслін і аптымізацыі навакольнага асяроддзя сродкамі азелянення. Святлане Аляксандраўне давялося таксама ўдзельнічаць у арганізацыі работ па экалогіі ў В'етнаме, у сумесных навуковых даследаваннях у Балгарыі...

У Тураве прайшло іх дзяцінства. Тут нарадзіліся іх бацькі і бацькі іх бацькоў. У сярэдняй школе на стэндзе выпускнікоў, якімі ганарыцца школа, вісяць іх фатаграфіі. Тут жывуць мама і сёстры, пахаваны бацька. На самым беразе Прыпяці стаіць іх дом.

— Адно з самых хвалюючых уражанняў дзяцінства — разліў Прыпяці,— прыгадвае Ала Аляксандраўна.— Незабыўнае пачуццё абнаўлення зямлі, радасць вясны, паўнату жыцця. Колькі гадоў жыву ў вялікім горадзе, а ўсё не хапае нашых палескіх прастораў...

«Часам мне здаецца, што дрэва — гэта найбольш высакародная задума прыроды. Але часам я думаю, што гэта не толькі высакародная задума, але і задума, закліканая намякнуць нам на пажаданую форму нашай душы, г. зн. такую форму, якая дазваляе, моцна трымаючыся

за зямлю, смела ўзнімацца ў нябёсы. Міралюбівая магутнасць дрэва вучыць нас дабраце і бескарыслівасці». Гэтыя словы Фазіля Іскандэра пачула я ад Святланы Аляксандраўны. Імі яна імкнецца растлумачыць мне свае пачуцці да справы, якой прысвяціла жыццё — вывучэнню жывой прыроды...

Г. Б. Пшонік

Спасціжэнне таямніцы

Буднік Уладзімір Іванавіч (н. у 1949 г. у Жыткавічах) — вядомы беларускі кампазітар. Закончыў Гомельскае музычнае вучылішча імя Н. Сакалоўскага па класу баяна, Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класу кампазіцыі прафесара А. В. Багатырова. Аўтар сімфоніі, кантаты, інструментальных твораў. Шмат увагі ўдзяляе песеннай творчасці, шырока вядомы яго песні «Пах чабаровы», «Палессе», «Белая лілея», «Святло тваіх вачэй» і іншыя. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.



У. І. Буднік

Захавалася характарыстыка вучня 3-га класа Жыткавіцкай сярэдняй школы, у якой рукою настаўніка напісана: «Любіць удзельнічаць у гуртках мастацкай самадзейнасці. Добра іграе на баяне і спявае...» Гэтым вучнем у 1959 г. быў будучы кампазітар Уладзімір Буднік.

А яна, музыка, мусіць, жыла ў ім ад самага нараджэння. Бацька, Іван Міхайлавіч, былы камісар адной з партызанскіх брыгад на Гомельшчыне, таксама цягнуўся да музыкі. Колькі помніць сябе Валодзя — у хаце заўсёды яна гучала. Граў бацька спачатку на гармоніку, потым на баяне. З усходам сонца ўстане, бывала, зробіць якую работу каля дому — і за інструмент: грае ціха, падбірае новыя мелодыі, якія спадабаліся, ці ўпэўнена, але напаўголасу гучаць песні народныя або дзён Вялікай Айчыннай...

Як толькі Валодзя крыху падрос і ўжо мог трымаць у руках гармонік, з таго часу хлопчык, здаецца, і не разлучаўся з ім. Але гармонік ёсць гармонік, не кожную мелодыю на ім дакладна сыграць можна. І тады ў рукі хлапчука трапляў бацькаў баян. Ці раз спявалі пад Валодзеў акампанемент бацькі, былыя партызаны, са сваімі баявымі сябрамі песні «Ой, бярозы ды сосны», «Кацюша», «Где же вы теперь, друзья-однополчане» і іншыя.

А паедзе летам Валодзя да дзеда Данілы ў Пухавічы, возьме дзед з сабою скрыпку самаробную, і ідуць яны спакваля на Чырвонае возера, ці, як інакш называюць яго,— Князь-возера. Да вечара яшчэ далекавата, паветра настоена на водары кветак, вады і траў, а ў гаях — салаўі на ўсе лады заліваюцца. Падыдуць да возера, прысядуць на беразе, глядзяць на блакітныя няспешныя азёрныя хвалі, а потым дзед возьме скрыпку, паперабірае для

парадку струны, як бы іх настройваючы,— і паліецца мелодыя. То імклівая, то лагодная, журлівая, пяшчотная. Зачараванае возера, зачараваныя мелодыі, зачараваныя дзед і ўнук...

Прага пазнаць таямніцу чароўных гукаў прывяла Валодзю ў Жыткавіцкую музычную школу. Праз колькі часу раённая газета пісала: «Любіць іграць на баяне вучань 5-га класа музычнай школы Уладзімір Буднік. Яшчэ васьмігадовым сціплым хлапчуком прыйшоў ён сюды па веды. Цяпер Уладзіміру 14 год, ён не толькі лепшы вучань школы, але і актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці пры раённым Доме культуры...»

Працягваў вучобу Уладзімір Буднік у Гомельскім музычным вучылішчы імя Н. Ф. Сакалоўскага. Тут ён удасканальваў сваё выканаўчае майстэрства, паглыбляў музычныя веды. Займаўся ў вучылішчы ўвесь час на «выдатна».

Прывабіла яго сваім гучаннем піяніна, і будучы кампазітар шмат працуе самастойна, каб па-майстэрску авалодаць гэтым інструментам.

На рахунку кампазітара больш 50 песень, хаця, як і ён сам заўважае, не ўсе яны раўназначныя па мастацкіх якасцях: то музыка не зусім задавальняе, то словы, то не ўсё задавальняе выканаўцаў. Але ёсць сярод іх і такія, якія з прыемнасцю спевакі ўключаюць у канцэрты, з задавальненнем іх выконваюць. Напярэдадні 8 Сакавіка трансліраваўся па тэлебачанні канцэрт заслужанай артысткі рэспублікі Ганны Радзько. Пяць песень былі ёю прапеты і ўсе пяць — кампазітара Уладзіміра Будніка. А хто ж аўтары слоў? Нашы беларускія паэты: Пятрусь Броўка, Кастусь Кірэенка, Анатоль Грачанікаў, Уладзімір Карызна... А ў само жаночае свята выпала паглядзець праграму Беларускага тэлебачання «Аўтограф». Гасцямі праграмы быў вакальна-інструментальны ансамбль «Чараўніцы». На пытанне вядучага, каго найбольш ахвотна ансамбль выконвае, хто піша спецыяльна для ансамбля, усе ў адзін голас назвалі Уладзіміра Будніка. Сярод іншых гучаць у ансамблі «фірменная» песня «Чараўніца» на словы Уладзіміра Някляева, «Дні прыгожыя» на словы Уладзіміра Карызны...

Яшчэ будучы студэнтам кансерваторыі, кампазітар працаваў артыстам-гітарыстам у тэатры імя Янкі Купалы. З 1979 г. Уладзімір Буднік — загадчык музычнай часткі тэатра. За гэты час ён паспеў добра вывучыць спецыфіку работы, напісаў музыку да некалькіх спектакляў, сярод якіх варта адзначыць «Успаміны» па п'есе А. Арбузава і «Тая, якая сама па сабе блукае» па Р. Кіплінгу. Але самай адметнай для кампазітара з'явілася работа над музыкай да спектакля «Паўлінка» па п'есе Янкі Купалы, пастаноўку якой ажыццявіў галоўны рэжысёр тэатра Валерый Раеўскі на сцэне Кіеўскага акадэмічнага тэатра імя Івана Франко.

Музыка, музыка... Так, музыка — гэта прафесія. А што ж акрамя музыкі? Сын Андрэй (які, дарэчы, ужо добра падбірае дзіцячыя песенькі на піяніна), Жыткавічы, дзе жыве маці, сёстры і брат, вёска Пухавічы ў 20 кіламетрах ад райцэнтра, землякі... Лес, грыбы, ягады... Думалася, што ўсё гэта акрамя музыкі, а аказваецца, і гэта таксама музыка!

І. У. Скурко

Шруб Павел Міхайлавіч (н. 20.2.1955 г. у в. Хільчыцы) — беларускі паэт. У 15-гадовым узросце паступіў на фізічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Пасля заканчэння яго працаваў у Полацкім політэхнічным інстытуце, затым у інстытуце ядзернай энергетыкі АН БССР. Цяпер — выкладчык у Мінскай сярэдняй спецыяльнай школе міліцыі імя М. В. Фрунзе. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пісаць



П. М. Шруб

вершы пачаў яшчэ ў школе. У 1987 г. выйшла кніга паэзіі «Лабараторыя», за якую П. М. Шруб удастоены прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Па шашы ад Жыткавіч
на Тураў
праз акно аўтобуса
да слёз
я ўглядаўся ў постаці
панурых
лютаўскіх алешын і
бяроз.
Гаварыў з дапытліваю
цёткай,
што з раёна ехала
дамоў,
і было мне цёпла
і салодка
ад вясковых прымавак
і слоў.
І нібы пачуўшы мову
гэту,
бег шпарчэй аўтобус да
жылля,
круцячы пад коламі
планету
з найхарошай назваю
Зямля...



М. П. Андык

Ад родных ніў...

— Бары і рэкі, азёры і родныя нівы нагадваюць вялікі свет музыкі, родная прырода для мяне — нібы жывы чалавек. Сярод соснаў і ялін, бяроз і дубоў адчуваю творчы непакой, імкненне ўвасобіць светлы вобраз прыроды на палатне.

Аб гэтым яскрава сведчаць творы мастака «Дубрава», «Раніца вясны», «Вечар на Прыпяці», «Восень», «Сцяжынка ў лесе», «Халодны дзень», «Ваколіца», «Над возерам»... Усё гэта творы мастака, якія часта выстаўляюцца на розных экспазіцыях. Ведаюць іх у Мінску, Гомелі, Светлагорску, у многіх другіх беларускіх гарадах, нават у Маскве. Ведаюць іх і на радзіме мастака, на Тураўшчыне.

Кожны пейзаж М. П. Андыкі прыцягвае пяшчотнасцю і напеўнасцю матываў. Вось залітыя яркім сонцам сосны, пераліваюцца

колерамі лясныя травы, над навакольлем уладараць волаты-дубы... Насычаная мажорнасць і паэтычнасць, камернасць і эпічнасць пейзажаў, якія займаюць значнае месца ў творчасці мастака, з'яўляюцца тым адметным почыркам, які прыцягвае, чаруе, захапляе.

Асабліва яркае ўвасабленне мэтанакіраваная пазіцыя аўтара знайшла ў карціне «Палессе». Неабсяжныя прасторы, дзе гаспадарыць вясна, дзе ажыў лес, дзе цягнецца да сонца маладая трава, і птушкі шчасця ў небе — буслы... Як не любіць такі край?

Міхась Пятровіч нарадзіўся ў вёсцы Перароў Жыткавіцкага раёна, што на Прыпяці, а ў творчых паездках пабываў па ўсёй краіне — Падмаскоўі, Крыме, Прыбалтыцы, Брэзінскім і Прыпяцкім запаведніках... Многія ўражанні з гэтых вандраванняў знайшлі адлюстраванне ў творах мастака, але найбольшае месца ў яго палотнах па-ранейшаму займае палеская, хоць і някідкая, але надзвычай лірычная прырода.

А. М. Шныпаркоў

«...В здравии, в красоте и крепости телесной»

Наталля Чорнагалова нарадзілася ў Жыткавічах, а пасля заканчэння ў 1976 г. Мінскага мастацкага вучылішча імя А. С. Глебава лёс закінуў яе ў славуты горад над Бугам. Тут, у Брэсце, яна знайшла прызванне ў выражэнні сваёй асноўнай мастацкай накіраванасці. Эратычныя матывы, таямніцы ў адносінах паміж мужчынам і жанчынай — галоўная тэма творчасці мастачкі, без прытворнай сціпласці раскрытая ў яе палотнах. Малюнкі кахання нараджаюцца пад пэндзлем Наталлі Чорнагаловай нібы стыхійна, не стрымліваемыя асцярожнымі падказкамі мяшчанскай цікавасці ці халоднай рэальнасці — як квітнеюць вясной сады, як пяюць птушкі...

Жывапіс Наталлі Чорнагаловай — свабодны, імправізацыйны, заснаваны ў значнай меры на інтуіцыі. Ёсць у яе творах нешта, уласцівае толькі жаночаму мастацтву. Энергічная манера пісьма, экспрэсіўныя мазкі разлічаны на непасрэднае эмацыянальнае ўздзеянне.



«З перамогай на радзіму». 1945 г. Карціна М. П. Андыка

Наталля Чарнагалова

Згушчэнні асноўнага колеру сярод нейтральнай гамы адценняў, кідкія спалучэнні фарбаў выяўляюць як бы колеравую радасць, якой прасякнута душа мастачкі.

Наталля Чорнагалова не звярае кожны свой крок з натурай, яе вобразы — гэта імправізацыя на тэму натуры, дзе безупынная дынаміка формы сугучная яе ўласным пачуццям. Таямнічы свет колеру... Раскрыць яго для сябе і гледачоў імкнуліся мастакі ўсіх часоў. Наталля робіць гэта па-свойму, адпаведна ўласнаму разуменню мастацтва, уласнаму светаўспрыманню. Яе пейзажы і нацюрморты напоўнены бязмежнай радасцю зачаравання малюнкамі прыроды, бяссмертнай сілы жыцця.

Калі глядзіш на творы Наталлі Чорнагаловай, міжволі думаеш не пра сродкі і формы яе творчасці, а дзіву даешся сіле дзёрзкага таленту — ці то пейзаж, ці партрэт, ці пяшчотны малюнак таямнічасці кахання, ці малюнак на тэму чарнобыльскай трагедыі... Сапраўдная музыка жывапісу... Не так даўно яшчэ ў нас авангард быў хоць і не забаронены, але і не прызнаны афіцыйна. А да яго даўно цягнулася творчая інтэлігенцыя, асабліва моладзь, яркай прадстаўніцай якой з'яўляецца Наталля Чорнагалова. Для жывапісу такога напрамку не знаходзілася месца ў выставачных залах. Нялёгка было прыйсці да людзей і мастачцы з Брэста. Але знайшлася сцяжынка, і людзі ўбачылі творы Наталлі Чорнагаловай. І не толькі ў Беларусі — у многіх гарадах краіны, за яе межамі, куды пайшоў шэраг купленых, падораных, а магчыма, і вывезеных нелегальна работ таленавітай зямлячкі.

Мастачка Наталля Чорнагалова — самабытны, цікавы талент. У 1988 г. адбылася яе персанальная выстаўка ў Гурзуфе, у наступным годзе — дзве персанальныя выстаўкі ў Мінску і Польшчы, у Бяла-Падлясцы, у 1990 г.— у Брэсце, выстаўка жывапісу ў Мінску.

А. В. Буйвалец

На спрыяльнай глебе

У Пагосце здаўна існавала царква ў гонар святога архідыякана Стэфана — Стэфанаўская царква. Надзвычай вялікай павагай у сялян карыстаўся святар Мікалай Галіневіч, які займаў гэтую пасаду з 1871 па 1915 г. Гэта быў вельмі паважаны, аўтарытэтны чалавек. Калі ў пачатку стагоддзя Прыпяць пачала размываць сялянскія надзелы, ён змог дабіцца ад улад сродкаў на ўмацаванне берага. Мікалай Галіневіч — сапраўдны асветнік, заступнік сялян, чалавек перадавых поглядаў, выказнік народнага сумлення...

У канцы мінулага стагоддзя ад-

крыта ў Пагосце царкоўна-прыходская школа. Божы закон выкладаў айцец Мікалай, мірскім прадметам навучала яго дачка Надзея. Усе дочкі Мікалая Галіневіча — Алена, Нона, Соф'я і Надзея — закончылі настаўніцкую гімназію.

Прайшоў час. Былыя вучні царкоўна-прыходскай школы сталі выдатнымі працаўнікамі, шчырымі калгаснікамі.

У першыя пасляваенныя гады ў хатах вёскі ўжо свяціліся электрычныя лямпачкі ад калгаснай электрастанцыі, працаваў вясковы радыёвузел. А Стэфанаўская царква ў 30-я гады была закрыта ваяўнічымі атэістамі, з яе зрэзалі купал...

У Пагосце здаўна жывуць традыцыі высокай маралі, інтэлектуальнасці, цягі да ведаў. Вялікай павагай і аўтарытэтам карыстаюцца настаўнікі, многія з якіх жылі і цяпер жывуць на вуліцы Настаўніцкай. Не дзіўна, што з вёскі выйшла нямала здольных, адукаваных людзей, вучоных. Іван Фёдаравіч Раманоўскі — кандыдат гістарычных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Бацькі яго, патомныя сяляне, вызначаліся своеасаблівай інтэлігентнасцю. Фёдар Рыгоравіч Раманоўскі працаваў паштальёнам, Іван з дзяцінства захапляўся часопісамі і кнігамі. Так выявілася ў яго цяга да гісторыі. Ён паступіў вучыцца ў Мазырскі педагагічны інстытут імя Н. К. Крупскай, з адзнакай закончыў яго, потым аспірантуру.

Дацэнтам у Ленінградскім інстытуце метадаў і тэхнікі ўпраўлення працуе кандыдат тэхнічных навук Леанід Барысавіч Леўкавец. Бацька яго загінуў у пачатку вайны, маці — малапісьменная сялянка. Леанід Барысавіч старанна вучыўся у школе, у Чырвонабярэжскім тэхнікуме механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, Ленінградскім механічным істытуце, упарта грыз граніт навукі, стаў вучоным...

У 1986 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю Васіль Сцяпанавіч Леўкавец. Ён — навуковы супрацоўнік Інстытута фізіялогіі АН Рэспублікі Беларусь. Кандыдат тэхнічных навук і пагастчанін Міхаіл Казіміравіч Саскевіч, старшы выкладчык Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы і ўсе чатыры браты Кузьмічы — Міхаіл, Мікалай, Васіль і Леанід, апошнія тры — філалагічны факультэт універсітэта. Міхаіл Пятровіч Кузьміч у 1991 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па філасофіі. Кандыдатам філалагічных навук стаў нядаўна і Леанід Кузьміч — самы малады навуковец з вёскі. Тэмай дысертацыі ён абраў фальклор усходняга Палесся, Тураўшчыны.

М. А. Саскевіч

З глыбінь народных

Штрыхі да этнаграфіі

Этнаграфія Жыткавіцкага раёна, самага вялікага і найбольш цікавага ў гістарычным, прыродным, лінгвістычным плане, адметна адрозніваецца ў розных яго кутках. Тут дзіўным чынам спалучыліся ландшафтныя, геаграфічныя, гістарычныя рарытэты: і найбольш старажытны ў Беларусі горад Тураў, і самае вялікае возера Палесся Чырвонае — славутае Князь-возера, ці возера Жыд, ад якога, відавочна, і пайшло найменне горада Жыткавічы, і мястэчка з трагічным лёсам Ленін, якое адно ва ўсім свеце носіць славутае імя з незапамятных часоў, і плантацыя рэліктавай расліны азаліі пантыйскай, ці рододэндрану жоўтага,

крыта ў Пагосце царкоўна-прыходская школа. Божы закон выкладаў айцец Мікалай, мірскім прадметам навучала яго дачка Надзея. Усе дочкі Мікалая Галіневіча — Алена, Нона, Соф'я і Надзея — закончылі настаўніцкую гімназію.

Прайшоў час. Былыя вучні царкоўна-прыходскай школы сталі выдатнымі працаўнікамі, шчырымі калгаснікамі.

У першыя пасляваенныя гады ў хатах вёскі ўжо свяціліся электрычныя лямпачкі ад калгаснай электрастанцыі, працаваў вясковы радыёвузел. А Стэфанаўская царква ў 30-я гады была закрыта ваяўнічымі атэістамі, з яе зрэзалі купал...

У Пагосце здаўна жывуць традыцыі высокай маралі, інтэлектуальнасці, цягі да ведаў. Вялікай павагай і аўтарытэтам карыстаюцца настаўнікі, многія з якіх жылі і цяпер жывуць на вуліцы Настаўніцкай. Не дзіўна, што з вёскі выйшла нямала здольных, адукаваных людзей, вучоных. Іван Фёдаравіч Раманоўскі — кандыдат гістарычных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Бацькі яго, патомныя сяляне, вызначаліся своеасаблівай інтэлігентнасцю. Фёдар Рыгоравіч Раманоўскі працаваў паштальёнам, Іван з дзяцінства захапляўся часопісамі і кнігамі. Так выявілася ў яго цяга да гісторыі. Ён паступіў вучыцца ў Мазырскі педагагічны інстытут імя Н. К. Крупскай, з адзнакай закончыў яго, потым аспірантуру.

Дацэнтам у Ленінградскім інстытуце метадаў і тэхнікі ўпраўлення працуе кандыдат тэхнічных навук Леанід Барысавіч Леўкавец. Бацька яго загінуў у пачатку вайны, маці — малапісьменная сялянка. Леанід Барысавіч старанна вучыўся у школе, у Чырвонабярэжскім тэхнікуме механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, Ленінградскім механічным істытуце, упарта грыз граніт навукі, стаў вучоным...

У 1986 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю Васіль Сцяпанавіч Леўкавец. Ён — навуковы супрацоўнік Інстытута фізіялогіі АН Рэспублікі Беларусь. Кандыдат тэхнічных навук і пагастчанін Міхаіл Казіміравіч Саскевіч, старшы выкладчык Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы і ўсе чатыры браты Кузьмічы — Міхаіл, Мікалай, Васіль і Леанід, апошнія тры — філалагічны факультэт універсітэта. Міхаіл Пятровіч Кузьміч у 1991 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па філасофіі. Кандыдатам філалагічных навук стаў нядаўна і Леанід Кузьміч — самы малады навуковец з вёскі. Тэмай дысертацыі ён абраў фальклор усходняга Палесся, Тураўшчыны.

М. А. Саскевіч

З глыбінь народных

Штрыхі да этнаграфіі

Этнаграфія Жыткавіцкага раёна, самага вялікага і найбольш цікавага ў гістарычным, прыродным, лінгвістычным плане, адметна адрозніваецца ў розных яго кутках. Тут дзіўным чынам спалучыліся ландшафтныя, геаграфічныя, гістарычныя рарытэты: і найбольш старажытны ў Беларусі горад Тураў, і самае вялікае возера Палесся Чырвонае — славутае Князь-возера, ці возера Жыд, ад якога, відавочна, і пайшло найменне горада Жыткавічы, і мястэчка з трагічным лёсам Ленін, якое адно ва ўсім свеце носіць славутае імя з незапамятных часоў, і плантацыя рэліктавай расліны азаліі пантыйскай, ці рододэндрану жоўтага,

каля вёскі Замошша, і адзіны ва ўсім былым Савецкім Саюзе Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік... Раён можна ўмоўна раздзяліць на некалькі частак, якія адрозніваюцца і этнаграфічна, і гістарычна. Уласна Жыткаўшчына, цэнтральная частка раёна з яе барамі і пяскамі, сухадольная, з роўным і пакладзістым характарам насельніцтва; легендарная Тураўшчына, у апошнія стагоддзі бязлесная, багатая, з урадлівымі землямі — бал іх самы высокі ў Беларусі, што пахне хлебам і вадой — тут Прыпяць і Сцвіга, Свінавод і Случ, Скрыпіца і Струмень, незлічоная колькасць азёр і азярын, ручаёў і крынічак, тут жыве народ баявіты, уладалюбівы, энергічны, як гэта вялося спрадвеку; Князь-азершчына — наваколлі возера Чырвонага, якія яшчэ ў недалёкім мінулым былі насычаны пахам торфу і рыбы, з яе дзікаватымі, але шчырымі, «некрасивыми, приземистыми, рыжими с небольшой растительностью, но честными и бескорыстными» людзьмі, як адзначаў славуты падарожнік В. П. Сямёнаў; Леніншчына — лясны, да апошняга часу закінуты, занядбаны, аддалены куток, паўстагоддзя назад яскрава выражаны яўрэйскі, які потым знаходзіўся пад значным уплывам Польшчы і яе ўладай да 1939 г. Пасля масавага знішчэння яўрэяў у гады мінулай вайны тут відавочна поўнае змяшэнне розных уплываў, культур і моў, як і на ўсёй Беларусі, што на працягу стагоддзяў знаходзілася на раздарожжы... Такія не толькі этнаграфічныя, але і гістарычныя паралелі вызначаны самой геаграфіяй раёна: Тураўшчына да апошняга часу была нібы адрэзана шырокай Прыпяццю, маста праз яе не існавала і зносіны былі вельмі нязручнымі; сярэдняя частка — Жыткавічы з найвялікшым дасягненнем мінулага стагоддзя — чыгункай; якая і «выцягнула» іх у статус горада; Ленін — за Случчу, таксама за значнай прыроднай перашкодай, ён здаўна больш цягнуўся да Мікашэвіч, наогул — да Польшчы.

Гістарычнае мінулае непазбежна накладвае адбітак на сучаснасць, і ролю старажытнага Турава цяжка пераацаніць у развіцці культуры і эканомікі ўсяго Палесся і Беларусі наогул. Гэта асяродак краю, і не толькі гістарычны, дзе што ні курган — то паданне, што ні азярына — то легенда, што ні найменне — то міф... Тут мае яскрава выражанае значэнне найменне кожнай мясцовасці і населенага пункта — Казаргаць і Бабруйкава Гара, Пагост і Сямурадцы, Старажоўцы і Чэрнічы, Рычоў і Азяраны, Слепцы і Князь-Бор. Амаль кожны мясцовы тапанім нясе ў сабе пэўны каларыт і мае гістарычныя, этнаграфічныя ці геаграфічныя звесткі аб пасяленні. Ніхто афіцыйна не называў і тым больш не пераймяноўваў вёскі, урочышчы, мясцовасці, тапанімы нараджаліся ў народзе самі і звычайна насілі трапнае, мілагучнае і дасціпнае гучанне — вёскі Хачэнь і Князь-Бор, Бечы і Лагвошчы, Любавічы і Бярэжцы, Пасека і Буразь, азёры Князь і Вусцечына, Плюшчын і Галоўчыцы, балоты Аблуква і Зажыддзе, Бусовішча і Расія... Яны адлюстроўваюць прыкметы навакольля, пэўныя характарыстыкі аб'екта найменя, спавіты паданнямі і ўспамінамі і практычна ніводнае найменне на Тураўшчыне не носіць патранімічнага значэння.

Тут асяродак Беларускага Палесся. Палі і сенажаці, якія да апошняга часу, да пачатку славутых меліярацыйных работ на Палессі, нідзе не былі шырокімі і прасторнымі, утварыліся на працягу апошняга стагоддзя ў выніку інтэнсіўнага засялення краю і яго актыўнага асваення; нават на месцы славутых тураўскіх урадлівых прастораў яшчэ ў мінулым стагоддзі шумелі векавыя

бары, пачатак знішчэння якіх паклала англійская кампанія прадпрымальнікаў Форстэр, што ўзяла славутыя тураўскія дубровы ў арэнду, а завяршылі акт вандалізму будаўнікі сацыялізму на карысць Днепрагэса, шахтаў Данбаса, разбуранай вайною народнай гаспадаркі СССР. Тураўшчына, у мінулым лясны край, што мела важнае значэнне ў жыцці і абароне Турава, стала своеасаблівай жытніцай вобласці, яна найбольш густа заселена і валодае значнымі людскімі рэсурсамі. Памеры населеных пунктаў значна большыя, тут знаходзяцца такія густанаселеныя вёскі, як Верасніца,— самая вялікая ў раёне, колькасць насельнікаў у якой дасягае паўтары тысячы, Малешаў, Запясочча, Азяраны. У раёне існуе тры дакладна вядомыя выселкі — Буды: Буда Бячанская — з Бечаў, Буда — з Дзякавіч і Буда — з Леніна. Ва ўмовах ляснога жыцця з пастаянным недахопам палёў, сенажацей высяленне з вёсак, пасяленне на хутарах было з'явай звычайнай і неабходнай.

У 1912 г. нехта М. І. Мігай выдаў у Пецярбургу кніжку «По родным краям», у якой дзеліцца ўражаннямі ад падарожжа па Палессі, а таксама аб наведванні Леніна. «...Праз некаторы час дарога стала больш шырокай, здалёк данесліся сабачы брэх і гоман населенага месца. Хутка паказалася вялікае мястэчка Ленін... У хаце на прыпечцы гарэла лучына. Каля агеньчыка сядзела і шыла пажылая баба, побач з ёю знаходзіліся дзяўчынка і хлопчык, чыста і клапатліва апранутыя. Хлопчык жмурыўся, разбіраў кніжку. Газы тут мала хто паліць: яе даставаць цяжка, далёка за ёю ездзіць, дый грашамі тутэйшыя мужыкі небагатыя. Затое ў лесе шмат дроў, часта трапляюцца налітыя смалой пні; такі пень, парублены і высушаны, дае багатае асвятленне на ўсю цёмную доўгую зіму.

...Хата добрая, прасторная, з моцнага тоўстага дрэва; у пярэднім вуглу некалькі танных ікон, завешаных узорыста шытымі і таннымі ручнікамі. У хаце вялікая печ, каля яе на двух шырокіх полках грувасціцца посуд, адтуль жа блішчыць самавар, які ў Палессі надзвычай вялікая рэдкасць. Хата падзяляецца на дзве часткі: жылую — з печчу, і халодную (клець), дзе складзена багацце сям'і. Двор цесна застаўлены ўсялякімі гаспадарчымі збудаваннямі, паўсюдна ляжаць няхітрыя прылады і інструменты.

Па вёсцы ходзіць жывёла: дробныя, худыя коні з клоччамі зваляўшайся шэрсці, каравёнкі туляцца ля сцен на яркім сонечным святле; побач стаіць кампанія дзіўных касматых санітараў-свіней.

Пры ўездзе ў палескую вёску — крыж з іконай, увешаны шматкамі тканіны і шытымі ручнікамі. Па павер'і палешукоў,— гэта ахвяры багам палёў і дарог. Цікавы звычай — рэшткі язычніцтва.

Вакол мястэчка і вёсак — бясконцыя балоты, на краях якіх бачны ліловыя абрысы далёкіх бярозавых гаёў. У сухія гады тут добрыя сенакосы. У мокры год амаль нічога не робіцца, бо не толькі касіць, а і хадзіць немагчыма. Па балотах накапана вялікая колькасць канаў, якія выконваюць ролю дрэнажных каналаў. Без іх абыходзіцца зусім цяжка, бо за балотамі знаходзяцца палі. Каналы прарытыя не абы-як: перш чым капаць, усё вылічваецца, вымерваецца, робяцца планы і чарцяжы. Большасць каналаў прарыта казной, іх устройваюць таксама мясцовыя гаспадары і сельскія абшчыны.

...Зімой лес увесь зрэзаны тысячамі вузенькіх санных сцяжынак, па якіх вывозіцца лясное багацце і канцэнтруецца па берагах рэк і каналаў у чаканні вясны. Як толькі ачысцяцца ад лёду водныя шляхі, незлічоныя чароды дроў, калод, шпал ру-

шацца да Прыпяці, звязаныя ў маленькія плыты ці самаплавам. Некалькі рабочых з бусакамі ідуць уздоўж рэк і праштурхоўваюць лясіну ці плыт. З Прыпяці сплаўны лес у выглядзе вялікіх плытоў плыве на поўдзень, да Херсона, ці накіроўваецца на захад, у Германію, па каналах цераз Заходні Буг і Нёман».

Гістарычныя абставіны — мяжа з панскай Польшчай, якая ў 1921 г. пралегла праз раён — абумовілі з'яўленне ў паўднёвым баку раёна на левым беразе Случы новых вёсак — Новыя Мілевічы, Новыя Залюцічы, Нова-Ленін. Іх заснавалі перабежчыкі з польскага боку, якія не мірыліся з польскімі ўладамі і імкнуліся жыць на новы, савецкі лад.

У зусім іншых умовах знаходзіліся насельнікі нізіннай Князь-азершчыны. На характар рассялення, сродкі зносін, гаспадаркі і побыт сялян гэтай мясцовасці ўплывалі вялікая колькасць балот, якія часта не замярзалі ўзімку, шырокія вясновыя разлівы, няўдобіцы. Невялікія ўчасткі зямлі, прыгоднай для ворыва, былі раскіданы на значнай адлегласці ад вёсак і адзін ад другога, асобнымі астраўкамі сярод балот і лясоў, што стварала шмат нязручнасцей пры апрацоўцы зямлі, уборцы ўраджаю. У вёсках Пухавічы, Ляхавічы, Дзякавічы на адну гаспадарку прыходзілася іншы раз па больш як дзесятку такіх астраўкоў памерам прыкладна чвэрць дзесяціны, раскіданых сярод дрыгвяністых балот. Самая неабходная рэч у такіх умовах — лодка, човен, з дапамогай якога можна было перабрацца з аднаго вострава на другі. На астравах ладзілі буданы, ці курані, якія служылі часовым жыллём, і паслядоўна апрацоўвалі адзін участак за другім. Тут збіралі ўраджай, малацілі жыта ці складвалі снапы неабмалочанымі да больш вольнага часу на высокіх памостах-адзёнках у стагі. Такія адзёнкі засцерагалі снапы ад магчымага падняцця вады, а таксама ад дзікоў і іншай лясной жывёнасці.

Вось як апісваецца Чырвонаазершчына ў вядомай кнізе «Расія» (пад рэдакцыяй В. П. Сямёнава, 1905): «...У озера Князь находится с. Пуховичи, расположено село в местности очень низменной, так что население, питающееся исключительно рыбой, весной, летом и осенью совсем отрезано от сухопутного сообщения. В последнее время здесь была устроена канализация. В Пуховичах есть деревянная Николаевская церковь.

Из других селений вокруг озера Князь можно упомянуть Дьяковичи, Ляховичи и Князь-озеро. Народ здесь некрасивый, приземистый, рыжий с небольшой растительностью, но честный и бескорыстный; говор грубый и представляет смесь малорусского, белорусского наречий и польского языка. Население усердно занимается обработкой земли и унаваживает ее благодаря обилию сенокосов и развитию скотоводства; зачастую здесь встречается по 50 и более голов скота на дворе.

Сеется рожь, греча, а больше всего садится картофеля, причем крестьяне ухаживают весьма тщательно за своими полями, пропалывая их от сорных трав. Сплошных полей здесь нет, они разбросаны по островам среди болот. Обыкновенно крестьяне берут сохи на плечи и идут на острова по бревнам, а волы идут по воде. Вспахав на острове землю и засеяв ее, они таким же способом переходят на другой остров и т. д. Все острова связаны переходами, так как лес здесь ничего не стоит. Пройдя острова, крестьяне делают шалаши и разводят огонь, не угасающий во все время их пребывания на островах. Молотится хлеб также на островах, а зимою, когда подмерзнуты болота, зерно переносится в селение — в закромы.

...На протяжении 450 верст тянутся болота, начиная от левого берега р. Случи. На границах этого болота находятся селения Князь-озеро, деревня Дьяковичи и еще четыре деревни... Вообще четверть пространства Мозырского уезда составляет непроходимая низменность, покрытая лесами и болотом. Поселения отделяют одно от другого десятки верст, они лишены иногда продолжительное время всякого с собой сообщения. Даже близ Турова на 5680 десятин земли приходится едва одна деревушка. Местность же, перерезанная рекой Ствигой, покрытая непроходимыми лесами и болотами, вовсе не заселена, так что на пространстве 90 верст в длину и до 15 в ширину нет ни одного поселения. Вообще в Мозырском уезде, на пространстве 1 460 000 десятин, находится только 362 населенные пункты...»

Тураўшчына па характарыстыцы матэрыяльнай культуры з'яўляецца адным з трох лакальных раёнаў усходняга Палесся (другія — Ніжняпрыпяцкае і Сярэдняпрыпяцкае). Сюды адносіцца ўласна Жыткаўшчына з ранейшымі воласцямі Дзякавіцкай і Ленінскай. Гэты раён мае яскрава выражаныя этнічныя рысы.

Сельскія пасяленні вулічнага тыпу, у больш населеных вёсках, як Людзяневічы, Дзякавічы, Верасніца, Малешаў, хаты стаяць надзвычай цесна, нярэдка дах да даху суседа. Найбольш распаўсюджаная планіроўка забудовы — двухкамерная (хата і сені), гаспадарчыя пабудовы — хлеў, варыўня (стопка), гумно — у асобных, не звязаных паміж сабою будынках (з раздзельнымі дахамі) у адным двары. Дахі — двухскатныя на кроквах з багата і разнастайна дэкарыраванымі франтонамі хат. Зруб — з часаных бярвёнаў, радзей — з круглых, у просты вугал (у апошнія дзесяцігоддзі большае распаўсюджанне набыў чысты, ці нямецкі, вугал), канцы звычайна аднаго, радзей — двух верхніх падоўжаных бярвёнаў — запясочніца — выступаюць прыкладна на паўметра звонку. Ніжні вянок — падруба — абавязкова дубовы. Характэрнае пакрыццё даху — салома ці трыснёг, з цягам часу іх усё часцей замяняла дранка; у месцах, дзе не расла сасна — гонта; перад вайной была распаўсюджана чарапіца, якую апошнім часам скрозь замяніў шыфер (матэрыял, забаронены для ўжывання ў якасці даху ва ўсіх культурных, развітых краінах). Абавязкова прысутнічае прызба — невысокі замёт з бярвёнаў па перыметру будынка.

Унутранае ўбранне хаты было тыповым і па-свойму урачыстым і прыгожым. Звычайна па правую руку ад уваходу размяшчалася печ — галоўны атрыбут хаты, без якой немагчыма жыццё. Гэта звычайна масіўная, так званая руская (варыстая) печ, разлічаная на ўсе выпадкі жыцця: гатаваць сняданак з блінамі і абед, сушыць грыбы, ягады і грэць хату, спаць і варыць ежу жывёле, грэцца на чаране і бавіць вольны час у свята... У кутку — вілочнік з начыннем для печы, качаргой і ўхватамі — вілкамі для гаршкоў. Побач — вядро ці цэбрык з вадой. Паліца з посудам, стол з доўгай лавай паўз сцяну — канапай з разной спінкай і вытачанымі ножкамі. Яна звычайна цягнулася да самай покуці з абразамі, убранымі вышыванымі ручнікамі, уздоўж другой сцяны — такая ж, але больш прыгожая, звычайна новая канапа. На ёй, на ложку ля супрацьлеглай сцяны, а таксама на печы спалі. Асвятленне хаты — смольнай лучынай з хваёвага карча, якая мацавалася звычайна каля печы збоку на прыпечку (камінку). Скрыні для захавання хатняга побыту, пасагу маладой, вызначаліся вытанчанай аздобай і маляўнічым роспісам з раслінным арнаментам, абру-

сы — вышытым ці намаляваным крыжыкам і яркай паліхромнай гладдзю.

Самае ўрачыстае месца ў хаце — покуць: тут стаяў чысты стол, накрыты вышываным абрусам, стаялі жывыя ці папяровыя кветкі, кніжачка бібліі, каляровыя малюнкі і фотаздымкі. Сюды ставілі сноп пасля зажынак, асвячоную ваду з царквы, у святочныя дні за гэтым сталом абедала сям'я.

У зімовы час на канапе мацавала кудзелю гаспадыня, бліжэй да дзвярэй размяшчаўся са сваім інструментам гаспадар — рэзаў лыжкі ці плёў лапці, віў вяроўкі ці крышыў тытунь. Хлопцаў і дзяўчат у доўгі зімовы вечар у хаце не ўтрымаць — яны, а таксама жанчыны сваім гуртам збіраліся ў найбольш прасторнай хаце на вячоркі, якія можна было лічыць своеасаблівым фальклорным клубам.

Заканчвалася, нарэшце, доўгая і нудная зіма — наступала вясна, якая сама па сабе — свята... Пакуль не пачалася пасяўная, летнія бясконцыя клопаты, час вадзіць карагоды. Тураўскі карагод — веснавы, з караваем на Юр'я (23 красавіка ст. стылю). Такую назву ён атрымаў ад месца бытавання, першыя запісы яго зроблены ў XIX ст. у Тураве, бытаваў і ў іншых вёсках Жыткавіцкага раёна. Карагод уключаў такія асноўныя моманты, як прыгатаванне дзяўчатамі караваю і яго ўпрыгожанне, карагоднае шэсце з ім і чырвонай тканінай па вуліцы, у полі, выкананне песні «Ідзе, ідзе карагод, усе дзевачкі напярод»... На полі дзяўчаты вадзілі кругавы карагод, а хлопцы асобна імітавалі язду на конях, спявалі песні. У валачобным абрадзе таксама прысутнічаў элемент выхаду ў поле з хлебам. Тураўскі карагод — аграрна-магічны акт («Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць»). У ім прысутнічаюць таксама ачышчальныя, засцерагальныя і ахоўныя акты. Карагод — адна з важных састаўных частак культу сонца, хлеба, зямлі, а таксама Ярылы.

Васіль Феранц

Што ні курган — то гісторыя...

Прыкладна ў VIII—IX ст. н. э. у парэччы Прыпяці рассяліліся славянскія плямёны, якія называлі сябе дулебамі, а ў летапісах яны вядомы як дрыгавічы. Цікава, што апошнія, асядаючы на тых землях, дзе пражывалі балты і фіна-угры, не стваралі асобных уласных пасяленняў, а падсяляліся да мясцовых жыхароў. Сумеснае пражыванне славянскага і неславянскага насельніцтва паскарала працэс асіміляцыі славянамі тутэйшых іншамоўных плямён. Апошнія зніклі, «растварыліся» сярод славян, але пакінулі ў славянскіх звычаях, матэрыяльнай культуры і мове «сляды» свайго існавання. Некаторыя з іх адлюстраваліся, напрыклад, у геаграфічных назвах. Узніклі вёскі вакол старажытнага Турава, трэба меркаваць, у час уздыму і росквіту самога горада і служылі своеасаблівымі «заслонамі» да яго подступаў. А да гэтага на іх месцы, на зручных, цяжкадаступных месцах былі паселішчы, гарадзішчы.

Непадалёку ад в. Чэрнічы ёсць урочышча, у даўнія часы, відавочна, селішча — Старое Сяло. Тут знаходзяць вялікую колькасць рознай па часе керамікі — ад ранняга жалезнага веку да позняга сярэдневякоўя. Позняе сярэдневякоўе — гэта якраз перыяд Тураўскага княства. Відаць, Старое Сяло сапраўды выраслa з пасялення, што існавала тут яшчэ ў апошнія стагоддзі да н. э. У X—XI стст. Старое Сяло, як можна меркаваць, было адным з абарончых пасяленняў, якія акружалі Тураў. Потым па нейкіх прычынах адбылося перасяленне жыхароў на новае

У цэнтры сучаснага Турава

суседняе месца — за паўкіламетра на поўдзень, менавіта на тое, дзе існуюць сучасныя Чэрнічы.

Згодна з паданнем, у наваколлях вёскі дзейнічаў жаночы манастыр, заснаваны ў XII ст. княгіняй Варварай. Назва Чэрнічаў, у адпаведнасці з гэтым паданнем, утварылася ад слова «чарнец» (старажытнарускае «чернець», «черенець» — манах). Калі гэта так, то становяцца ў пэўнай ступені зразумелымі прычыны перамяшчэння жыхароў са Старога Сяла ў Чэрнічы. Паселішча паступова расло вакол манастыра, яму маглі належаць навакольныя землі, сенажаці, выпасы, лясы. На манастырскіх землях, відаць, жыць было больш зручна і выгадна, таму насельніцтва Старога Сяла пацягнулася пад манастырскія сцены.

Аб чым апавядаюць назвы іншых населеных пунктаў Азяранскага сельсавета? Вёска Пагост. У старажытнарускай мове, як вынікае з кнігі «Материалы для словаря древнерусского языка» І. І. Сразнеўскага (С.-Пецярбург, 1895, т. III), слова «пагост» (погость) мела наступныя значэнні: сядзіба, стан, становішча, месца астаноўкі князёў у час аб'ездаў зямель; пасёлак побач з княжацкім станам; вёска ўвогуле. Такім чынам, першапачаткова Пагост з'яўляўся месцам для заезду гасцей (слова «пагост» мае той жа корань, што і словы «госць», «гасціць»), гасцявым дваром, пунктам для гасцявання.

У аснове назвы вёскі Бечы ляжыць літоўскае слова «бітэ» — пчала. Бечы — гэта пчалаводы, пчаляры. Відаць, жыхары вёскі населенага пункта займаліся бортніцтвам — пчалярствам. Буда Бячанская — выселкі з вёскі Бечы.

Яшчэ адным іншамоўным «следам» на тэрыторыі Азяранскага

сельсавета можна лічыць назву рэчкі Сцвігі. Данае імя першапачаткова мела форму «Мсцвіга» — гэта вынікае з параўнання назвы рэчак Сцвігі і Моствы (прыток Сцвігі). Найменне Моства складаецца з двух частак: мост — чорны і вада, літаральна — чорная вада. Назва Сцвіга (Мсцвіга) утварылася пры спалучэнні наймення Моства з фіна-ўгорскім словам «іга», якое мае значэнне «рэчка».

Каля азёр (азярын), непасрэдна каля Сцвігі і ўздоўж яе старога рэчышча сяліліся людзі, якія мелі на тым часе калектыўную мянушку азяраны, так з цягам часу вёска атрымала назву Азяраны.

Ёсць і другое меркаванне адносна паходжання наймення вёскі. У кнізе «Воспоминание о древнем православии Западной Руси» (Москва, 1867) ёсць наступнае паведамленне: «К востоку от Сторожовцев лежит село Раны, или как теперь его называют — О-се- Раны... Здесьто туровцы сразились с татарами, которые напали на Туров после разгрома Киева и от страшного побоища назвали это место Раны»...

Цікавасць выклікае найменне вёскі Слепцы (сучасная Знаменка). Тут таксама мы маем справу з абагульненай мянушкай «слепцы», ад якой утварылася геаграфічная назва. Хто такія слепцы? Як расказвае паданне, у мясцовасць, дзе сёння размешчана вёска Слепцы, па загаду тураўскіх князёў адпраўлялі тых, хто пакутаваў ад хваробы вачэй. З цягам часу быццам бы тут выросла вёска, якую назвалі Слепцы. Ёсць і больш грунтоўнае тлумачэнне паходжання назвы вёскі. У артыкуле Мікіцінскага, Р. Пяцэвіча і П. Ажэўскага «Падарожжа па Случчыне» («Наш край», 1928 г., № 2) пры апісанні вёскі Даманавічы нагадваецца наступны факт: «Сяляне вёскі адрозніваюцца сваім выглядам ад сялян іншых палескіх вёсак. Мужчыны ёсць бландзіны і брунеты. Бландзіны болей з прадаўгаватым тварам, а брунеты са скуластым смуглым тварам і трохі касымі вачыма... Ёсць яшчэ недалёка Даманавіцкае возера, каля яго знаходзіцца месца, якое завецца Татарскай далінай...». У «Толковом словаре живого великорусского языка» У. І. Даля можна знайсці прыметнік «слеповатый» у значэнні «той, у каго вузкія вочы». Ці не магла калектыўная мянушка «слепцы» ўказваць на нейкія этнаграфічныя асаблівасці жыхароў паселішча? Магчыма, тут пражывалі «тыя,- хто мае вузкія вочы» — можа цюркскія (татарскія) прышэльцы, паланёныя печанегі або полаўцы, з якімі ваявалі кіеўскія і іншыя паўднёварускія князі ў X—XII стст.

У статыстычным даведніку «Волости и важнейшие селения Европейской России.— Губернии Литовской и Белорусской областей» (С.-Пецярбург, 1886) ёсць звесткі, што Азяраны і Пагост уваходзілі ў склад Мазырскага павета Мінскай губерні. У Азяранах налічвалася на той час 38 двароў, пражывала 175 чалавек, меліся царква і млын. У 1872 г. адкрыта царкоўна-прыходская школа. У Пагосце было 65 двароў, жыў 341 чалавек, меліся дзве праваслаўныя царквы, млын.

Сямурадцы

На Тураўшчыне шырока распаўсюджана меркаванне, аснову якога складае паданне, быццам у часы Тураўскага княства ў вызначаным месцы, на поўдзень ад стольнага горада, сем княжацкіх старэйшын вырашалі лёсы тураўчан, разглядалі розныя судовыя справы, «судзілі» ды «радзілі». На гэтым «судным» месцы і ўзнікла вёска Сямурадцы — сем мудрацоў, радцаў. Запісана такая легенда і супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Гэтыя паданн-

ні, відаць, уяўляюць цікавасць толькі як прыклады вуснай народнай творчасці.

Калі падыходзіць да наймення Сямурадцы навукова, структура яго сведчыць, што яно ўзнікла першапачаткова не як абазначэнне пэўнага месца, а хутчэй за ўсё, як абагульненае найменне першых жыхароў пасялення. Сямурадцамі, відаць, спачатку называлі заснавальнікаў вёскі, яе першапасяленцаў і толькі потым — саму вёску. Але што азначала сямурадцы?

Найбольш верагодным з'яўляецца тлумачэнне геаграфічнай назвы, якая папярэднічала ўзнікненню геаграфічнага імя. Сямурадцамі, на наш погляд, называлі тых, хто жыў у мясцовасці «Сямурадзе» ці «Семірадзе». Сама гэтая мясцовасць, ці ўрочышча, знаходзілася, як можна меркаваць, у 6 кіламетрах на паўднёвы ўсход ад Турава. У часопісе «Наш край» (1928 г., № 8—9) змешчаны артыкул П. Чайкоўскага «На сямурадскіх пясках», у якім аўтар зазначаў наступнае: «Сямурадскія пяскі знаходзяцца побач з вёскай Сямурадцы — на захад ад апошняй; аддзяляюцца пяскі ад вёскі вузкім балотам, якое абступае плошчу пяскоў навакол, так што прайсці на пяскі можна толькі праз грэблю ад дарогі ў вёскі Сямурадцы і Старажоўцы з Турава. (У сухі час можна прабіцца на пяскі з боку самае вёскі цераз хмызнякі ад вясковых гародаў.) Калі кінуць агульны погляд на пяскі, можна думаць, што калісь гэта была пясчаная выспа, значнай вышыні ўзгорак сярод балота або вады. У сучасны момант дзякуючы пануючым у нашай мясцовасці паўднёва-заходнім вятрам, развеяўшым пясок амаль што ў тры стороны, мы знаходзім на месцы колішнай гары шэраг паасобных пясчаных бугроў з растучымі на іх нізкарослымі дрэвамі (хвоі, алешыны) і хмызнякамі, а паміж бугроў — шэраг котлішчаў. Галоўнае котлішча, багата зарослае дрэвамі і кустамі, знаходзіцца амаль пасярэдзіне плошчы пяскоў, а яго падковай абкружае вал пяску, канцы якога ўпіраюцца ў гароды вёскі Сямурадцы. Пяскі займаюць амаль што квадратовы кіламетр. Форму маюць прадаўгаватую, выцягнутую з захаду на ўсход. Дзякуючы таму, што сяляне вёскі Сямурадцы займаюць частку гэтае плошчы пад свае палеткі — сеюць жыта, ячмень, лубін — плошча пяскоў памяншаецца, асабліва з паўднёвага і заходняга бакоў...»

Далей у артыкуле ішла гаворка аб тым, што «сямурадскія пяскі» гэта не што іншае, як старажытнае паселішча. «Аб гэтым сведчаць тыя крамянёвыя рэчы і шмат крамянёвых сколкаў, якія знаходзяць на пясках. Крэмні, камні-нуклеусы ідуць сялянам на крэсіва. Стрэлкі, нажы, скрабкі — на забаву пастушкам...».

Мы амаль упэўнены ў тым, што «сямурадскія пяскі», пясчаны востраў сярод балот — гэта і ёсць тое самае ўрочышча «Сямурадзе», «Семірадзе», існаванне якога мы прадвызначылі, зыходзячы з геаграфічнай назвы Сямурадцы і калектыўнай мянушкі «сямурадцы». Найменне Семірадзе ўтварылася ў выніку спалучэння асноў сем- і рад-, толькі гэта зусім не азначае, што тут на пясчанай выспе сярод балота «судили да рядили» сем старэйшын. Востраў гэты людзі пакінулі яшчэ ў дагістарычныя часы, аднак назва яго, вельмі старажытная, перадавалася з пакалення ў пакаленне. Аснову «рад» мы знаходзім у слове «рада» — балота, нізінная прастора, якое фіксуецца ў «Толковом словаре живого великорусского языка» У. І. Даля.

Геаграфічную назву «Семірадзе» можна разумець, такім чынам, як вытворнае ад наймення рэчкі або возера, балота. Сама назва «Семірадзе» непасрэдна да воднага аб'-

екта, хутчэй за ўсё, дачынення не мела. Яна з'яўлялася абазначэннем мясцовасці, урочышча. Але рэканструяванае значэнне геаграфічнага імя — «чорнае балота» ці «чорная рэчка» — недвухсэнсава сведчыць аб вытоках назвы «Семіраддзе». Тых людзей, якія ў перыяд існавання Тураўскага княства ці напярэдадні гэтага перыяду пасяліліся паблізу «Семіраддзя», назвалі семірадцамі, потым — сямурадцамі (асаблівасці мясцовай гаворкі пасадзейнічалі змяненню формы наймення). Пасяленне іх стала называцца Сямурадцы.

Перапоў

Старажылы Перарова расказваюць такую легенду. Спрачаліся два браты за зямлю, ды так, што аж крычалі — «раўлі». Адзін з братоў перамог у спрэчцы, перакрычаў другога, «перапоў». Ад гэтага дзеяслова і пайшла быццам назва вёскі.

Але больш гістарычна праўдападобнай з'яўляецца наступнае паданне. Прыпяць у даўнія часы цякла ў іншым русле, там, дзе цяпер урочышча Рэчышча. Быў на гэтым месцы вялікі роў. Каля яго біў струмень, які ўяўляў небяспеку для плытагонаў. «Спераду роў»,— крычалі яны, папярэджваючы адзін другога. Так і атрымалася ад злучэння ў вымаўленні двух слоў «Перапоў».

Ці мянялася ў сапраўднасці русла Прыпяці? Па-першае, назва ўрочышча Рэчышча недвухсэнсава ўказвае на месца, дзе калісьці працякала рака. Мясцовасць тут сапраўды нагадвае старадаўняе русла. Тэрмін «перапоў» у значэнні «новае рэчышча ракі, прарыў вады, пратока» здаўна існуе ў рускіх і ўкраінскіх гаворках, у тым ліку і ў палескіх. Слова «роў» на Палессі служыць для абазначэння не толькі канавы, яра, але і вадацёкаў, ручаёў. Перапоў — прарыў вады, пратока.

Назва мясцовасці ці вёскі магла ўзнікнуць толькі ў час змянення рэчышча Прыпяці. Калі гэта было? Першае вядомае ўпамінанне аб Перарове знаходзім у «Списке русских городов дальних и близких», складзеным невядомым аўтарам у канцы XIV ст. Такім чынам, Перапоў лічыўся горадам яшчэ шэсць стагоддзяў назад. Значыць, узнікненне яго адносіцца да яшчэ больш ранняга часу. Выклікаюць цікавасць у гэтай сувязі два гарадзішчы ў ваколіцы вёскі, аб ўрочышчы Свінуха і ў трох кіламетрах на поўдзень ва ўрочышчы Акоп. Гарадзішчы належалі ў канцы першага тысячагоддзя мясцоваму балцкаму насельніцтву. Паступова мясцовасць насялялася славянамі — драўлянамі і дрыгавічамі. Змяненне рэчышча Прыпяці магло адбыцца прыкладна ў XII—XIII стст., таму што і «рэчышча», і «перапоў» — словы славянскага паходжання.

Лагвошчы

У «Геаграфічным слоўніку Польскага каралеўства і іншых славянскіх краін» (Том V.— Варшава, 1884) ёсць наступныя звесткі: «Лагавошча — вёска Мазырскага павета паміж Случчу і Скрыпіцай. Апошняя бярэ тут пачатак; 6 двароў, мясцовасць цалкам бязлюдная, нізінная, ізалявана багнамі і лясамі ад бліжэйшых наваколляў»... Што шукалі людзі сярод балот і лясоў, чым прываблівала іх гэтая мясцовасць? Можна меркаваць, што на месцы сучаснага пасялення ў мінулым існавала зімовішча, якое выкарыстоўвалася мясцовымі паляўнічымі зімой, калі наступалі маразы. Старажылы памятаюць, што ў лясах вакол Лагвошчаў вадзіліся мядзведзі. Мядзведжыя логавы быццам бы і абумовілі ўзнікненне назвы вёскі. У тураўскіх гаворках слова «логавішча» — месца, дзе жыве звер, лежня — ужыва-

ецца ў форме «логвішча». Ужыванне такой формы слова ў множным ліку для указання на лежні (логвішчы, лагавошчы, лагвошчы) і магло даць назву паселішча.

Магчыма і іншае тлумачэнне — ад слоў лагавіна, логвіна, логавішча, логвішча, якія шырока выкарыстоўваюцца на Беларускім і Украінскім Палессі для абазначэння нізіннага рэльефу, прычым не проста балоцістай нізіны, лагчыны, але і такога месца, дзе можна, напрыклад, нарыхтоўваць сена. Вёска Лагвошчы размешчана на высокай, пясчанай мясцовасці, сярод хваёвых бароў, але сенажаці тут сапраўды ёсць, галоўным чынам у бок возера Белае, да таго ж ландшафт можа з цягам часу мяняцца, і можна толькі меркаваць, якія багны і балоты былі навокал у мінулым стагоддзі, калі складаўся «Геаграфічны слоўнік Польскага каралеўства» і пакуль не пачала асушэнне палескіх балот экспедыцыя І. І. Жылінскага, не пралеглі каналы з Белага і Случы да сажалак рыбгаса, пакуль не ажыў некалі глухі край...

Ляхавічы

Ляхавічы — вёска на паўднёвым беразе Князь-возера, у Чырвоненскім сельсавеце. Згодна паданню, пасля вялікага пажару ў суседняй вёсцы Пухавічы пачалося рассяленне пухавіцкіх жыхароў на хутары. Адзін з хутароў, быццам, вырас да памераў вёскі. Так узніклі Ляхавічы.

Аднак гэта не больш, чым паданне. Дастаткова зазірнуць у геаграфа-статыстычныя дакументы XIX ст., каб упэўніцца, што гэта не так. У кнізе «Волости и важнейшие селения Европейской России. Выпуск V. Губернии Литовской и Белорусской областей» (С.-Пецярбург, 1886) адзначаецца, што ў вёсцы Ляхавічы Мазырскага павета налічваецца 44 двары, жыве 276 жыхароў, ёсць праваслаўная царква і капліца. «Список населенных мест Минской губернии», складзены ў 1909 г. В. С. Ярмаловічам, указвае, што ў Ляхавічах налічваецца 745 чалавек. Такі прырост насельніцтва для вёсачкі, якая размяшчалася ўдалечыні ад вялікіх дарог, сярод бясконцых лясоў і балот, натуральным лічыць цяжка. Відавочна, што пажар у Пухавічах абумовіў значны прырост насельніцтва суседніх Ляхавічаў. Сама ж вёска ўзнікла значна раней. У аснове назвы яе ляжыць этнічнае найменне ляхі — «палякі». Аднак пасяленне называецца Ляхавічы — відаць, не ўсё насельніцтва вёскі было «ляшскім», польскім па паходжанні, нейкія адносіны да ляхаў мелі толькі яе заснавальнікі. Магчыма, яны былі сапраўднымі ляхамі ці проста мелі прозвішчы тыпу Лях. Патомкі гэтых ляхаў і называліся ляхавічамі.

Кольна

У выпісцы з кніг гарадскіх Слонімскіх ад 6 ліпеня 1582 г. аб раздзеле ўладанняў паміж братамі — князямі Юрыем, Янам-Сымонам і Аляксандрам Алелькавічамі па запавету бацькі Аляксандр Алелькавіч атрымаў у спадчыну асобныя населеныя пункты ў Слуцкім і Мінскім паветах, а таксама ў Мазырскім павеце — воласць і замак Петрыкаў, двор Колна з мястэчкам Ленін, воласці Добра-Дзярэўскую і Юдзянаўскую (фонд князёў Радзівілаў у Нацыянальным архіве Беларусі).

Што значыць — «двор Колна»? У пісьмовых крыніцах X—XV ст. слова «двор» ужывалася ў некалькіх значэннях. Найбольш распаўсюджанае з іх у старабеларускай мове — «жылыя і гаспадарчыя пабудовы з зямельнымі ўгоддзямі, сядзіба».

На ўсходнеславянскай тэрыторыі слова «двор» набывае асабліва шырокую вядомасць у сувязі з развіц-

цём феадальнага землеўладання. Хуткі рост буйных вотчын на былых абшчынных землях у паўночна-усходняй і паўночна-заходняй Русі прыводзіў да неабходнасці стварацъ цэнтральны пункт вотчынных уладанняў — панскую сядзібу ці двор. Такі двор з'яўляўся цэнтрам кіравання і мог размяшчацца ў звычайным пасяленні, вёсцы або ў асобным зручным месцы. На тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага поруч са старымі княжацкімі дварамі, пачынаючы з XIV ст., з'яўляюцца шматлікія панскія двары па ўзоры польскіх загрод і шляхецкіх замкаў.

Такім чынам, «двор Колна» трэба лічыць верагоднай панскай сядзібай, пэўным цэнтрам вотчыннага ўладання. Можна меркаваць, што «двор Колна» ў XVI ст. быў не вёскай з панскай сядзібай, а менавіта «дваром», асобнай сядзібай гаспадара, асабняком з усімі неабходнымі гаспадарчымі прыбудовамі. Вакол гэтага панскага двара паступова выраставалі сялянскія двары, фарміравалася пасяленне. Найбольш верагодны час заснавання «двара Колна» — перыяд паміж канцом XV ст. і 60—70-мі гадамі XVI ст.

Як можна тлумачыць паходжанне наймення Кольна? У ім выдзяляецца суфікс-ьно і корань «кол». Суфікс -ьно быў прадуктыўным яшчэ ў старажытнарускі час і звычайна ўтвараў назвы — кароткія прыметнікі (усе старажытнарускія геаграфічныя назвы першапачаткова з'яўляліся прыметнікамі). З дапамогай яго ўтвораны многія геаграфічныя найменні.

Значэнне кораня «кол» можна, хутчэй за ўсё, аднесці да прымаўкі «ні кала ні двара», у якой слова «кол» азначае «дом, зямельны надзел». У рускіх гаворках «кол» — «зямельны надзел, пэўная плошча раллі, луга, пашы; вузкая палоска зямлі; група гаспадароў, якія атрымліваюць пры перадзеле зямлі адзін агульны ўчастак». Цікава, што слова «кол» у значэнні «дом, хутар, вёска» вядома ў мансійскай мове, у аварскай «коло», «кули» — хутар, у грузінскай «хула» — хацінка, у армянскай — «хул» — хаціна.

А. Ф. Рогалеў

Найда

Кажуць, першым пасяленцам вёскі Найда быў нехта Камаровіч. Ён быццам прыплыў сюды на лодцы, агледзеўся — месца спадабалася... Балоты, багна ды пратокі, што толькі на лодцы і дабірацца. Было гэта, відавочна, яшчэ пры прыгонным праве, і ўцёк гэты Камаровіч ад свайго лютага пана, магчыма, з недалёкай адсюль вялікай вёскі Камаровічы, што ў Петрыкаўскім раёне. Мясціны тут сапраўды багатыя, прыгожыя — кругом лясы, балоты непраходныя, Князь-возера блізка — можна і на звера паляваць, і рыбу лавіць. А каля возера — зручнае ўзвышша. Як сведчыць легенда, ад слова «знайсці» і пайшла назва вёскі Найда. І ўжо ў час адмену прыгоннага права налічвалася ў ёй дзесяць двароў.

Месца было нядрэннае, але жылося людзям не вельмі добра. Колькі намаганняў патрабавала адвечная адваяванне зямлі ў лесу ды балота, барацьба за само існаванне. Не дзіва, што да рэвалюцыі пісьменным быў у Найдзе толькі адзін чалавек, Васіль Краўчэня. Да яго і звярталіся ўсе вяскоўцы, калі патрабавалася напісаць паперу, прачытаць рэдкі ў вёску ліст.

Адным з першых мерапрыемстваў, праведзеных пры савецкай уладзе, было адкрыццё ў Найдзе школы. Дзеці вучыліся спачатку па хатах, а ў 1929 г. была пабудавана школа. Першымі настаўнікамі ў вёсцы былі Атліванаў, Корзун, Хільман. Перад вайной настаўнічалі М. А. Жукавец і Н. Д. Кісялюк.

У 1929 г. у Найдзе створаны калгас «Чырвоная ніва», старшынёй якога сяляне выбралі свайго вяскоўца Юхневіча. У камітэт беднаты ўвайшлі А. А. Краўчэня, Я. І. Краўчэня, Ф. Краўчэня.

Ішоў час, людзі нараджаліся, сталелі, паміралі... Найда станавілася ўсё больш вядомай не толькі ў раёне, але і далёка за яе межамі дзякуючы менавіта сваім людзям — палешукам, простым вяскоўцам, якім пры савецкай уладзе была адкрыта шырокая дарога ў свет. Само месца тут такое прыгожае, маляўнічае, якое чаруе з першага погляду. Лясы і нізіны, возера Чырвонае — цудоўны, непаўторны палескі край... Не дзіва, што Найда стала калыскай многіх талентаў.

Тут, дзе плешчацца ў берагі легендарнае Князь-возера, дзе жывуць паданні, падобныя на былі, вырас пад уражаннем легенд Чырвонага возера вядомы беларускі пісьменнік Мікола Гамолка. Памятаюць у вёсцы бацькоў пісьменніка — Івана Міхайлавіча і Агрыпіну Фёдараўну — хоць не родную маці, але надзвычай шчырую і спагадлівую жанчыну, якая замяніла Міколку родную маці.

У Найдзе нарадзіўся і вырас Герой Савецкага Саюза В. А. Кот, які праявіў узоры адвагі і мужнасці ў час вайны з мілітарысцкай Японіяй у жніўні 1945 г. Шмат гора прынесла вайна вяскоўцам. 33 чалавекі забрала назаўсёды яна з Найды. Але вёска выстаяла, даючы не раз прытулак народным мсціўцам, і ў пасляваенны час яшчэ больш вырасла, расквітнела...

Усіх людзей з Найды, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, абаранілі вучоныя ступені, займаюць адказныя пасады, цяжка пералічыць. І. М. Лукашэвіч — старшы выкладчык у інстытуце замежных моў, Р. М. Туравец — заслужаны настаўнік рэспублікі. Яго брат Дзмітрый — сакратар Брэсцкага абкома КПБ у 50-я гады. Але не толькі імі ганарацца вяскоўцы. Галоўнае — людзі з Найды, дзе б яны ні жылі і працавалі, вызначаюцца сумленнасцю, шчырасцю, адданасцю Радзіме. Звыш трохсот былых вучняў Найдзенскай пачатковай школы, большасць з іх — выхаванцы настаўніка М. А. Жукаўца, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, закончылі вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы. Многія з іх працуюць у сваім раёне, у мясцовым калгасе «Жыткавічы». Яны высока нясуць гонар працоўнага чалавека...

В. Р. Феранц

Паміж пустак, балот...

У вёсцы Бялёў і цяпер нямала старажылаў. Адным са старэйшых вяскоўцаў быў Ігнат Іванавіч Страха. Шмат падзей было на яго памяці...

— Цяпер жыць — не паміраць,— гаварыў дзед.— Аглянуся назад, успомню — лепш і не ўспамінаць... У пачатку стагоддзя ў вёсцы, абкружанай балотамі, налічвалася каля 70 хат з саламянымі стрэхамі, вузенькімі двума-трыма акенцамі. Печы без комінаў. Калі ў іх палілі, адкрывалі дзверы, каб выходзіў дым. Цемра, галеча... Вальготна жылося толькі пану Гілевічу. Лепшыя землі і лясы належалі яму, яны абкружалі з усіх бакоў паселішча. Людзі за капейкі пралівалі пот на панскіх палетках і сенажацях. Нават збіраць грыбы і ягады ў сваім лесе Гілевіч забараняў. Калі хто хацеў пайсці ў панскі лес па грыбы ці па ягады, павінен быў «зрабіць пану выгаду» — два дні ў тыдзень бясплатна працаваць на яго. Вечарамі мужчыны плялі лапці, жанчыны пралі кудзелю, ткалі палатно... Памятаю, як мой сябра Адам Жогаль жаніўся ў лапцях. У хаце Сямёна Ачапоўскага размяшчалася трох-

класнае «вучылішча». Вучыў прыезджы настаўнік па прозвішчу Пісарук. Я змог закончыць толькі адзін клас.

Часта паміралі людзі ў вёсцы. Лячэбнай дапамогі не было. Праўда, іншы раз да хворага прывозілі з Жыткавіч доктара Дуброўскага. Чым бы ні хварэў чалавек, доктар прапаноўваў яму адну расліну — гліснік.

Там, дзе цяпер знаходзіцца школа, была карчма, дзе часта сяляне прапівалі апошнія грашы.

У лістападзе 1917 г. да жыхароў вёскі дайшла вестка: няма больш цара. Неўзабаве знік некуды і пан Гілевіч. Зусім другое жыццё пачалося.

...У 1929 г. у вёсцы быў арганізаваны калгас «III Інтэрнацыянал», добра вядомы ў раёне і цяпер. Узначаліў яго камуніст Ілья Альвінскі, родам ён быў з Чарацянкі. Тады ж першы калгасны трактарыст Ілья Страха вывеў у поле нябачаную да гэтага часу машыну — трактар «Фардзон».

Грымнула вайна. Звыш 200 бялёўцаў пайшлі на фронт, у партызанскія атрады абараняць Радзіму. 70 з іх не вярнуліся.

...Больш як на тры кіламетры працягнулася галоўная вуліца вёскі Бялёў. Вёска сёння — звыш 300 двароў, каля кожнай хаты — сад. Два магазіны, сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, паштовае аддзяленне, бібліятэка...

Г. С. Ачапоўскі

Ленін

У цэнтры беларускага Палесся, на 9-м кіламетры шашы Мікашэвічы — Салігорск размешчана вёска Ленін, у мінулым ажыўленае мястэчка. Можа здацца, што гэта адзін з шматлікіх населеных пунктаў, названых у гонар У. І. Леніна. Між тым палескі Ленін — адзіная вядомая геаграфічная назва, якая існавала многія стагоддзі назад, задоўга да таго, калі свет зведаў імя У. І. Леніна.

У спісах населеных пунктаў Расійскай Імперыі, якія складаліся Геаграфічным таварыствам пры Акадэміі навук, у Еўрапейскай частцы краіны лічыцца толькі адно пасяленне ў форме «Ленін» — мястэчка ў глыбіні беларускага Палесся. Звесткі аб мястэчку Ленін маюцца ў кнізе «Волости и важнейшие селения Европейской России» (Губернии Литовской и Белорусской областей, вып. V.— С.-Пецярбург, 1886 г.), а таксама ў працы «Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. Верхнее Поднепровье и Белоруссия». Т. IX.— С.-Пецярбург, 1905 г. Згодна з гістарычнымі даведкамі 5-га тома «Геаграфічнага слоўніка», выдадзенага ў Польшчы ў 1884 г., «Ленін — мястэчка з абшчынным кіраваннем. З першай чвэрці XIX ст. стала ўласнасцю князёў Вітгенштэйнаў. Мястэчка мае 75 пасёлкаў-двароў, мост на Случы. Абшчына складаецца з 13 вясковых старастваў, 40 вёсак і налічвае 1729 сялян мужчынскага полу...»

Незайздросны лёс выпаў Леніну, як і старажытнаму Тураву: у той час, калі другія гарады раслі і прыгажэлі, мястэчка ў глыбіні Палесся ўсё больш ніякавела і занепадала... Палякі мала надавалі яму ўвагі, таму што Ленін быў на самым краю крэсаў, неаднаразова спрабавалі перайменаваць яго. Ленін быў цэнтрам Ленінскай гміны — ніжэйшай адміністрацыйнай адзінкі — Палескага ваяводства. У савецкі час хоць і існаваў з 1940 да 1961 г. Ленінскі раён, адміністрацыйным цэнтрам яго былі Мікашэвічы. Дашчэнту зруйнаваны, спалены нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Ленін з мястэчка паступова пераўтварыўся ў звычайную вёску. Фашысты знішчылі амаль усё насельніцтва, усіх да аднаго яўрэяў, якія складалі боль-

шасць жыхароў. Гэта была самая страшная трагедыя, якую давялося перажыць мястэчку за ўсю гісторыю яго існавання.

Пасля вызвалення Леніна тут не засталося ніводнай драўлянай хаты, згарэўшыя цагляныя будынкі сяляне разбіралі на печы.

...Ёсць легенда, якую нельга, аднак, лічыць даставернай: была быццам у мясцовага памешчыка дачка Лена, якая ўтапілася ў Случы, і засмучаны бацька ў гонар яе назваў пасяленне Леніна. Так і вялося ў савецкі час — гарадскі пасёлак, цэнтр раёна, а потым вёска Леніна, па другіх дакументах — Лінін, і зусім рэдка сустракалася сапраўдная назва Ленін.

З гэтым не мог змірыцца настаўнік Ленінскай сярэдняй школы, гісторык, сапраўдны патрыёт свайго краю У. У. Баярын. Якая ж назва адпавядае гістарычнай праўдзе? Уладзімір Уладзіміравіч быў упэўнены — Ленін. Доўга цягнулася барацьба энтузіяста-гісторыка з чыноўнікамі розных рангаў і ўстаноў — ад раённых да рэспубліканскіх. Краяведу ўдалося знайсці безумоўны аргумент у карысць сваёй думкі: вучні прынеслі цагліну з мясцовага завода дарэвалюцыйнага часу, які належаў землеўладальніку Агаркаву. На цагліне відаць выразны адбітак: «Н. Огарьковъ. Ленинъ». Потым прыйшлі і іншыя пацверджанні — выпіскі з архіваў Вільнюса, Кракава, з бібліятэк Масквы і Мінска. І ў лютым 1975 г. адбылася афіцыйная змена тапаніма — пасёлак зноў пачаў называцца Ленін, што адпавядала гістарычнай аб'ектыўнасці.

Хоць назва пасёлка не звязана з прозвішчам У. І. Леніна, ленінцы ганарыліся ёю.

У адпаведнасці з Рыжскім дагаворам паміж СССР і Польшчай 1921 г. Ленін да 17 верасня 1939 г. знаходзіўся пад уладай белага арла.

* * *

Мястэчка Ленін, яно і за царом так называлася, і за Польшчай. Пры панскай Польшчы не аднаму пападала за гэта.

Бывала, стрэне паліцай чалавека на дарозе, спытаецца:

— Куды ідзеш?

— Да Леніна.

Той — бац у зубы!

Перад самым прыходам Саветаў палякі замянілі назву на Саснковічы, генерал быў у іх, пагранічных войск,— Саснковіч, а то раней спрабавалі даць назву Згарэлае.

Але ніхто так не называў,— усё Ленін ды Ленін.

Так і цяпер.

«Дрэва кахання» (легенды, паданні, сказы). Мінск, 1980.

Дзякавічы

У Дзякавічах можна пачуць легенду, што ў даўнія часы вёска знаходзілася не на гэтым месцы, а прыкладна там, дзе цяпер стаіць вёска Буда. Потым па нейкіх прычынах сяляне перасяліліся на больш зручнае месца, бліжэй да Князь-возера, або Чырвонага. Гісторыя Дзякавіч неразрыўна звязана з Князь-возерам, ці возерам Жыд. Ім сяляне спрадвеку карміліся, жылі ім, на вадзе часта адчувалі сябе ўтульней, чым на зямлі. Сама назва — Князь-возера паказвае на яго велічнасць. У 1932 г., калі кацілася шырокая хваля ўсхвалення ўсяго, што звязана з бальшавікамі і іх лідэрамі, возера стала афіцыйна называцца Чырвоным, хоць і такая назва не выпадковая. Расказваюць, быццам на берагах возера адбылася ў незапамятныя часы жорсткая бітва з чужаземцамі, вада ў возеры стала чырвонай ад крыві. Сцвярджаюць яшчэ, што раней у возеры вадзілася шмат чырванапёрай, так называемай кашэрнай рыбы, якую ўжываюць у ежу

яўрэі. Таму, відавочна, возера называлася раней Жыд, з яго выцякае рэчка Жыдкаўка, ці Жыткаўка, пасучаснаму — Гніліца.

Вакол — дрымучыя лясы, непраходныя балоты. Людзі жылі на астравах, сцяжынкі і брады да якіх вядомы толькі мясцовым жыхарам. Месца было зручнае, небяспечнае, але жыццё ў такіх умовах суровае, цяжкае... Кажуць, што і перабралася сюды ўсяго чатыры сям'і — Чэркасы, Жураўлевічы, Рагалевічы і Кудзелькі, гэтыя прозвішчы і сёння найбольш распаўсюджаны ў вёсцы.

Легенду аб перасяленні сялян з Буды цяжка лічыць праўдападобнай: само слова «буда» ў беларускіх гаворках азначае «новая сядзіба, населены пункт у лесе, хата з дваровымі будынкамі, якая стаіць за паселішчам». Такім чынам, Буда, хутчэй за ўсё, сама ўзнікла з нейкага больш даўняга і буйнога паселішча. Тут да гэтага часу захаваліся сляды былога панскага маёнтка. Уладальнік яго памешчык Мазур жыў пераважна ў Адэсе, бываў тут зрэдку, а правіў сялянамі, глядзеў за панскім лесам ляснічы Шпілеўскі. Лясніцтва знаходзілася ва ўрочышчы Зімовішча. Шпілеўскі ўпершыню разбіў лясныя ўгоддзі на кварталы, правёў кварталь ныя лініі. З цягам часу ляснічы накапіў грошай і выкупіў у памешчыка лес і зямлю, а таксама маёнтак.

У 1929 г. навакопі Дзякавіч абследавалі археолагі А. С. Дубінскі і А. М. Ляўданскі. Яны выявілі гарадзішча балотнага тыпу мілаградскай і зарубінецкай культуры паміж Дзякавічамі і Будай — сярод лесу і балота, на беразе Князь-возера. Г. В. Штыхаў у 1964 г. абследаваў у ваколіцах вёскі сярэдневяковае паселішча. У краяведчай літаратуры неаднаразова адзначалася, што на востраве Чырвонага возера мелася ўмацаванне, якое з цягам часу зацягнула балота.

Дзякавічы былі заснаваны хутчэй за ўсё выхадцамі з недалёкай адсюль вёскі Чырвонае возера (Манастыр) Салігорскага раёна, якая належала князь-возерскім служыцелям культу, у прыватнасці, дзякам. Князь-возерскі дзяк, напэўна, і перасяліў сваіх людзей на вольныя месцы паблізу Князь-возера...

Слоўнік Ф. Браккаўза і І. Эфрона (1893 г.) тлумачыць, што дзякі ігралі асабліва важную ролю ў XVI ст., да якога адносіцца час засялення вёскі. Яны з'яўляліся таварышамі намеснікаў ва ўсіх справах, акрамя вайсковых, і сканцэнтроўвалі выключна ў сваіх руках усё фінансавае ўпраўленне. У XVII ст. яны складалі калі не самы відны, то самы істотны элемент. Тут трэба адрозніваць дзяка ад дзячка — асобы, якая знаходзілася на царкоўнай службе, звычайна ў якасці чытара ці спевака. Дзячкі — людзі адукаваныя, разам з духоўным званнем спалучалі абавязкі пісцоў.

К. М. Шэлехаў

Рычоў

Рычоў — у гэтым слове чуюцца словы «рыкаць» ці «крычаць»... Край надзвычай багаты легендамі і паданнямі, і адно з іх, апісанае ў «Живописной России» В. П. Сямёнова (1882 г.), сапраўды сведчыць аб тым, што назва вёскі пайшла ад слова «крык». Калі мужныя тураўцы, адбіваючы адзін з многіх нападаў на горад, прыціснулі ворагаў да ракі, тым няма было куды дзявацца, і яны ўзнялі ў роспачы жудасны крык... А праз некаторы час на гэтым зручным месцы пасяліліся людзі, выраслa вёска. Восем ці дзевяць стагоддзяў стаіць на беразе Прыпяці Рычоў — час няўмольна адлічвае яе ўзрост, а вёска не старэе — нібы маладзее...

Старажылы расказваюць, што ў мінулым стагоддзі Рычоў — невялі-

кая вёсачка, валоданне князёў Глінскіх. Вяскоўцы займаліся сплавам лесу, рыбалоўствам і земляробствам. Лес ішоў за мяжу, цяжкае жыццё сялян — у нябыт... У 1917 г. з акопаў імперыялістычнай вайны вярнуўся салдат, былы малазямельны селянін Рыгор Пятрычыц. На сходзе, які праходзіў пад кіраўніцтвам старшыні Тураўскага рэвалюцыйнага камітэта Тараса Русага, яго выбралі старшынёй Рычоўскага сельскага Савета. Сакратаром сельсавета быў прызначаны Якаў Кавалевіч. Савет стаў цэнтрам палітычнага жыцця вёскі, надзейнай апорай Тураўскага рэўкома. У склад сельсавета ўвайшлі вёскі Хільчыцы, Бярэжцы, Хачэнь, Рыдча. Адкрылася лаўка, фельчарскі пункт. Гаўрыл Аляксеевіч Котаў пачаў вучыць у школе маленькіх палешукоў... А там падаспела і калектывізацыя. У 1930 г. Рычоўскі сельсавет, які ўзначальваў Ціхан Санец, стаў саветам суцэльнай калектывізацыі. Упэўнена ўставалі на ногі калгасы «Новы шлях», «Чырвоны рубеж», «Прагрэс», імя К. Я. Варашылава, «Трэці рашаючы». У гісторыю ўвайшлі прозвішчы іх першых старшынь — Сцяпана Шруба, Сымона Пятрычыца, Сцяпана Варужэнца... Сёння Рычоў — сучасная добраўпарадкаваная вёска, цэнтр сельскага Савета.

Падарожжа ў мінулае

Усходнія славяне асвойвалі не зусім пустэльную мясцовасць. У парэччы Прыпяці яны сустрэліся з тубыльцамі, якія размаўлялі на балцкіх і фіна-угорскіх гаворках. Адносіны паміж рознымі плямёнамі былі мірнымі, таму што экалагічная накіраванасць іх гаспадарчай дзейнасці была рознай: славяне звычайна займаліся земляробствам, балты і фінаугры былі добрымі паляўнічымі, бортнікамі, спецыялізаваліся на жывёлагадоўлі. Продкі мелі цесныя ўзаемныя сувязі паміж сабой, абменьваліся прадуктамі сваёй гаспадарчай дзейнасці, гандлявалі. Не дзіўна, што дагэтуль у геаграфічных назвах мы выяўляем іншамоўныя карані. У іх яскрава праследжваюцца гістарычныя сувязі, моўныя кантакты розных народаў. У геаграфічных найменнях праяўляецца багацце розных гаворак, адлюстраваны векавы вопыт, мудрасць і душа народа, увогуле чалавечая памяць...

Аблуква (возера ў наваколлях Турава). Назва звязана з геаграфічным тэрмінам «блоква», «блуква» — нізіна, які зафіксаваны ва ўкраінскіх гаворках, «блук» — выган.

Асова, Асова града, Асовы брод, Асоўскае (балоты ў наваколлях в. Ельна, Азяраны, Рычоў, Па-



З Туравай гары ўглядаўся ў запрыпяцкія прасторы Кірыла Тураўскі

гост). У аснове найменняў ляжыць старабеларускае слова «аса», «ось» (вось) — «асіна» (грыб-асавік — «падасінавік»). Такім чынам, Асова, Асоўскае і г. д.— «балоты, парослыя асінай».

Бусовішча (балота ля в. Рычоў) — літаральна «месца, дзе выраблялiся бусы» — невялікая лодка, човен. Слова «буса» — «дзяўбаная лодка» зафіксавана ў самастойным выкарыстанні на тэрыторыі Верасніцкага і Азяранскага сельскіх Саветаў.

Балонне (мясцовасць у пойме Прыпяці, якая вясной затапляецца паводкай). Словы «балонь», «балонне» азначаюць «нізкі луг, сенажаць, даліна каля ракі» (Э. М. Мурзаев. Словарь народных географических терминов, 1984).

Белкі (балота каля в. Бярэжцы). У Жыткавіцкім раёне ўжываецца слова «белка» — «няглазкае балота, якое зарасло травой». Ад гэтага геаграфічнага тэрміна ўзнікла назва балота. Слова «белка» ў сваю чаргу суадносіцца са словам «пелька», «пелка», якое на Палессі азначае «паглыбленне круглай формы, часта з вадой», «невялікая махавая або сенажатная нізіна з вадой сярод поля». Даны геаграфічны тэрмін разглядаецца як даўняе запазычанне з балцкіх гаворак (Лаучюте Ю. А. Словарь балтизмов в славянских языках.— Ленинград, 1982).

Верацёнка (левы прыток Прыпяці). Слова «верацея» ў значэнні «ўзгорак, узвышша сярод балота» ўжываецца не толькі на Палессі, але і ў шматлікіх іншых гаворках на ўсходнеславянскай тэрыторыі, акрамя ўкраінскіх. Аднак нагаданае значэнне наўрад ці адлюстравалася ў назве возера рэчкі Верацёнка. У Беларускім Палессі словы «верацея», «вераццё» маюць яшчэ такія значэнні: «водмель», «сенажаць на беразе, якая ўтвараецца з вузкай і доўгай паласы, у якой з абодвух бакоў вузкі луг ці балота»; «нізкае месца»; «закінутае поле» (Н. И. Толстой. Славянская географическая терминология.— М., 1969). Нарэшце, нагадаем, што ў славенскай мове слова «вретье» азначае «выхад на паверхню падземнага ручая ці падземнай рэчкі».

Востранка (вёска ў Руднянскім сельсавеце, а таксама рэчка). Бясспрэчна, што назва вёскі ўтварылася ад наймення рэчкі Востранкі. У назве рэчкі корань востр-, што і ў слове «востры». Так маглі назваць рэчку з хуткім, імклівым цячэннем. Такія рэчкі на Палессі называюць Стрэлкамі. Пад такой назвай вядомы вадацёк у наваколлях вёскі Азяраны. А ў вёсцы Дуброва запісалі слова «стрэльніца» — бакавое цячэнне ракі.

Вусцечына (возера каля в. Крэмнае). Корань назвы відавочны — вусц-; аднак вусце — гэта, як правіла, «месца ўпадзення ракі ў другую раку, возера». У даным жа выпадку вусце («вусцечына») — наадварот, «выток рэчкі з возера». Такім чынам, Вусцечына — «возера, з якога выцякае рэчка, ручай».

Выдра (возера каля в. Новыя Залюцічы). У тураўскіх гаворках выдра, вудра, вудрань — «навіна, новараспрацаванае поле», у іншых беларускіх гаворках выдранка — «поле сярод лесу на месцы аблогі». Можна меркаваць, што вакол возера Выдра ў мінулым выцерабілі лес і кусты пад сенажаць, поле. З другога боку, нельга не параўнаць гэту назву з найменнямі рэчак Выдрыжа, Выдраж, Ведрыч. У іх назвах выдзяляецца корань ведр-, выдр-, які існуе таксама ў форме одр- і мае значэнне «вада», «рака». Такім чынам, не выключана, што назва возера Выдра побач з Новымі Залюцічамі з'яўляецца вельмі старажытнай, «следам» старажытнарускай эпохі.

Вятлішча (балота паблізу в. Кольна) — літаральна «месца, дзе

растуць вётлы» (у тураўскіх гаворках ветла — вярба; звычайна белая вярба).

Галава (возера паблізу г. п. Тураў). Слова галава ў Жыткавіцкім раёне вядома ў значэннях «паўвостраў на павароце рэчкі», «калена ракі». У іншых раёнах усходнеславянскай тэрыторыі «голова» — «вяршыня, выток ракі, пачатак рова», «мель, грыва, якія знаходзяцца на балоце, возеры». Адно з нагаданых значэнняў слова галава абумовіла таксама назву невялікіх азёрцаў ля вёскі Вільча — Галоўчыцы.

Глушыца (рэчка ў наваколлях Турава), Глушэц (правы прыток Сцвігі ў наваколлях в. Старажоўцы). У кнізе Н. І. Максімава «Днепр и его бассейн» (Кіеў, 1901) згадваецца слова «глушэц» — «старарэчышча, рукаў ракі, ператвораны ў заліў»; у рускіх гаворках «глушица» — «затока, заліў, глухі рукаў ракі, старое рэчышча».

Забочак (балота каля в. Бечы). Назва ўтварылася ад слова «забока», якое ў беларускіх гаворках азначае «бяссцёкавая азярына на лузе, якая ніколі не перасыхае». У рускіх гаворках забока — «луг на лукавіне ракі», «заліў, затока», «рукаў ракі», «старое рэчышча, старык» і інш.

Забегліцкае (балота каля в. Бечы). Назва звязана з беларускім геаграфічным народным тэрмінам «забега», забежніца — глухое, аддаленае месца. Аднак не выключана, што корань бег-л — у даным найменні ўказвае на былую затоку, адгалінаванне ад ракі, якое нібы «збегла» ў бок ад асноўнага рэчышча.

Зажыддзе (балота ў наваколлях в. Вятчынская Рудня). Корань жыд- у складзе назвы той жа самы, што і ў найменні Жыцкае возера (возера Жыд) — Князь-возера, возера Чырвонае ў дакументах XVI—XVII ст. Зажыддзе — балота, якое размешчана за возерам Жыд.

Расія (урочышча ў ваколіцах в. Людзяневічы, Доўгая Дуброва, Града). Гэта дзіўная назва не мае ніякага дачынення да назвы краіны. Назва Расія складаецца з двух частак — рас- (рос-) і -я і з'яўляецца даўнім «следам» тыпова фіна-ўгорскага наймення: слова «я» азначае «рэчка»; «рос», «рось» — «водмель». Такім чынам, першапачаткова Расія разумелася як «вадацёк з водмелямі».

Плюшчын (азёры побач з в. Боркі і г. п. Тураў). На гэтых азёрах расце аер. У тураўскіх гаворках гэтую расліну называюць плюшня, плюшнік. Вядома таксама расліна плюшчай (плюшчыннік). Плюшняк — «месца на балоцістых лугах, дзе расце асака, плюшчай, цыкута ядавітая».

Усечына (возера каля в. Крэмнае). Назва ўтварылася ад слова «сеч», «сеча» — месца, дзе высеклі, знішчылі лес. Відаць, калісьці высякалі лес на берагах возера, таму возера стала называцца Усечына.

Перадоль (левы прыток Прыпяці ў наваколлях Турава). У палескіх гаворках «перадол» азначае «месца, дзе доўга стаіць вада і вымакае пасеў; ніз, нізкая мясцовасць». У тураўскіх гаворках «перадол» — даліна.

Млінавіца (рэчка ў наваколлях в. Старыя Залюцічы). Назва паходзіць ад слова «млін» — млын, якое ўжываецца ў тураўскіх гаворках. Млінавіца — «рэчка, якая працякае побач з млынам».

Перавалец (возера каля в. Чэрнічы). Старажытная назва сведчыць аб тым, што возера ў мінулым было часткай нейкага воднага шляху, паколькі словы «перавал», «перавалле» ў гаворках маюць значэнне «праліў паміж двума рэчышчамі». Праліў з цягам часу ператварыўся ў возера.

Сіверскае, Келі, Залюцічы... У чатырох кіламетрах на поўдзень ад вёскі Пераройскі Млынок, у лесе,

знаходзіцца так званы Вал, або Акоп — старажытнае гарадзішча амаль што круглай формы. Найменне Вал не выпадковае: гарадзішча, якое густа парасло лесам, абкружана валам, ён найбольш захаваўся з паўночнага і ўсходняга бакоў. За гэтым валам размешчаны другі, меншы. Калісьці за ім кіпела жыццё...

Гарадзішча знаходзілася побач з рэчкай, сляды якой захаваліся ў выглядзе прадаўгаватых азёраў — Сіверскага і Мысліч. Возера Сіверскае называюць таксама Северскім. Але ніякай сувязі са словам север геаграфічная назва не мае. У назве Сіверскае (Северскае) корань сівер (север) і тлумачыцца ад слова «шывер» ці «шывер» — балота, твань, багна.

На Сіверскім возеры знаходзіцца востраў, аб якім існуе народнае паданне, апісанае ў часопісе «Наш край» (1928, № 8—9). Ехала па возеры княгіня на вялікай лодцы. Раптам лодка затанула разам з усім скарбам. Доўга ляжала яна на дне. Праз многа гадоў паказалася з вады карма. Людзі разбіралі лодку на дошкі, але большая частка яе і скарб так і засталіся на дне возера. На тым месцы ўтварыўся востраў...

Не здзіўляе наяўнасць у Прыпяцкім Палессі геаграфічных назваў, якія тлумачацца пры дапамозе ўгорскіх моў, да якіх, акрамя мансійскай, належаць таксама хантыйская і венгерская. Угорскія плямёны, роднасныя па мове сучасным венграм, хантам і мансі, абіталі тут яшчэ да VIII—IX ст. На тэрыторыі Жыткавіцкага раёна ёсць і іншыя «рэліктавыя» геаграфічныя назвы. Напрыклад, найменне вёскі Келі паходзіць ад слоў «кел», «келя» — балота, якія ў наш час ужываюцца ў рускіх гаворках Паўночнага Урала, пагранічных з мансійскай мовай, а таксама ў самой гэтай мове (Э. М. Мурзаев. Словарь народных географических терминов).

У далёкія часы на тэрыторыі сучаснага Жыткавіцкага раёна жылі балцкія плямёны, якія таксама пакінулі пэўныя «сляды» ў выглядзе геаграфічных назваў. Каля вёскі Малешаў ёсць возера Лютава, балоты Лютнае і Лютнец вядомы ля вёсак Бечы і Бячанская Буда Азяранскага сельсавета. Гэтыя назвы становяцца зразумелымі пры супастаўленні з літоўскім словам «лютынас» — балота ці месца, дзе многа крыніц. Прыцягваюць увагу ў сувязі з гэтым назвы вёсак Старыя Залюцічы і Новыя Залюцічы. Залюцічамі называлі тых, хто жыў «за лютам» — за балотам ці нізінай.

А. Ф. Рогалеў

Народная творчасць Жыткавіцкага раёна

Фальклор Жыткавіцкага раёна — арганічная і непадзельная частка беларускай народнай творчасці. Яшчэ больш агульнага ён мае з народнай творчасцю таго непаўторнага краю рэспублікі, які завецца Палессем. У ім адлюстраваны гісторыя і быт, працоўны і сацыяльны вопыт, грамадска-палітычныя, этычныя і эстэтычныя ідэалы працоўных.

Збіранне народнай творчасці тут пачалося з другой палавіны мінулага стагоддзя, але пэўныя звесткі пра народныя абрады, звычаі, мастацтва старажытнасці мы знаходзім у творах бліскучага хрысціянскага прапаведніка і мысліцеля Кірылы Тураўскага. У яго «Словах», павучаннях, прытчах, накіраваных на ўмацаванне хрысціянства і выкрыццё язычніцкіх вераванняў, дадзены выразныя малюнкі народных свят, ігрышчаў, забаў, якія, можна меркаваць, шырока бытавалі ў самім Тураве і ў наваколлі. Кірыла Тураўскі ганьбіць звычаі сваіх сучаснікаў, простых людзей, якія яшчэ пакланяліся і прыносілі ахвяры розным сілам прыроды, дрэвам, раслінам, ва-

дзе, а на русальны тыдзень наладжвалі «плясанье, бубны, сопели, гусли, пискове, игранья неподобные». Адсюль можна зрабіць вывад, што ў тыя часы актыўна бытавалі каляндарныя і сямейныя абрады і звычаі, а таксама абрадавая паэзія, якая складала непадзельную частку абрадаў, народныя танцы, інструментальная музыка.

Каляндарна-абрадавая паэзія, звязаная з працай хлебароба, з яго поглядамі на навакольны свет, у межах сучаснага Жыткавіцкага раёна прадстаўлена зімовым, веснавым, летнім цыкламі, хаця не кожны з іх у нашых матэрыялах выяўляецца з аднолькавай паўнатой. У цэнтры зімовага цыклу — калядныя песні і шчадроўкі, вядомыя і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Гэтыя песні выконваліся напярэдадні Новага года і на навагодняе свята, калі пачынаюць прыбываць дні і сонца паварочвае на лета, калі абуджаецца ў людзях надзея на будучы добры ўраджай, на дабрабыт, і гэтыя думкі і надзеі знаходзілі сваё мастацкае ўвасабленне ў малюнках дастатку і заможнасці, створаных у калядных песнях, якія былі адрасаваны гаспадару, гаспадыні, іх дзецям, і гучалі як паэтычнае пажаданне. У гурце калядоўшчыкаў, якія хадзілі ад хаты да хаты, былі пераапранутыя ў казу, каня, бусла. Яны разыгрывалі розныя сцэнкі, імправізавалі, але і тут хлебаробскі клопат быў на першым месцы. Калі «каза» скакала, спявалі:

Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць,
Дзе каза нагою,
Там жыта капою,
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам...

Вельмі паэтычныя абрады і песні веснавога цыклу, якія павінны былі наблізіць надыход цёплых дзён, забяспечыць паспяховыя палявыя работы. Невыпадкова ў гэтых песнях створаны вобразы роднай прыроды, карміцелькі-зямлі, якая абуджаецца ад зімовага спакою, поўніцца спевамі птушак. Птушкі або пчолкі павінны прынесці залатыя ключы, каб «адамкнуць зямліцу, выпусціць вадзіцу на буйное жыта». У вёсках Буразь, Азяраны, Верасніца дзяўчаты хадзілі заклікаць, або, як тут казалі, гукаць вясну за вёску, бралі з сабой ежу — хлеб, масла, сыр, яйкі і спявалі веснавыя песні, якія звычайна пачыналіся зваротам да вясны: «Гу-вясна, гу-красна, што ж ты нам прынясла?». Сярод першых веснавых песень у в. Любавічы зафіксавана адна з старажытнейшых вяснянак «Вол бушуе, вясну чуе». Але адным з цэнтральных у веснавой паэзіі і абрадах было Юр'еўскае свята, у час якога наладжвалі розныя карагоды, выконвалі песні, абыходзілі двары. Гэтым апошнім свята, вядомае амаль паўсюдна ў Беларусі, у Жыткавіцкім раёне набывае сваю адметнасць і нечым нагадвае звязанае з Вялікаднем валачобніцтва. На Юр'я пяклі бохан хлеба, клалі на века ад дзяжы, упрыгожвалі яго папяровымі кветкамі — гэта называлася карагодам, і ішлі да жыта, у поле, там вадзілі карагод, у сярэдзіне якога хто-небудзь з удзельнікаў трымаў гэты ўпрыгожаны бохан. Асноўны сэнс песень, як і абрадаў, накіраваны на забеспячэнне дабрабыту сялянскай сям'і, ураджаю на полі, плоднасці статку.

Дзе карагод ходзіць,
Там бог жыта родзіць,
А й дзе не бувае.
То там улягае.

Не толькі сваім зместам, але і формай, нават асобнымі радкамі гэтыя песні пераклікаюцца з калядным, выказваюць хлебаробскі клопат.

З песень летняга цыклу найбольшае развіццё ў Жыткавіцкім раёне атрымалі жніўныя, і ў той жа час тут амаль не зафіксаваны песні купальскія, якія ў некаторых іншых рэгіёнах Беларусі распаўсюджаны вель-

мі шырока. У жніўных песнях, як і ў калядных і веснавых, тэма хлеба, жыта, жытняга поля застаецца цэнтральнай. У гэтых творах увасабляецца прырода, паэтызуецца жніво, паэтызуецца таксама праца жней і самі жнеі: яны прыгожыя, працавітыя, маладыя, у іх сярпочкі залатыя. Але ў той жа час песні апавядаюць аб тым, што праца жней — цяжкая праца:

Ой, наш пан баран-баран,
Да не пускае дамоў зарань,
А наша ж пані авечая
Да дзержыць з ранку да вечара...
(г. п. Тураў)

У сямейнай абрадавай паэзіі вылучаюцца вясельныя песні, якія суправаджалі ўсе этапы складанага вясельнага абраду: сватанне, заручыны, прыгатаванне караваю, пасад, урачыстае застолле і інш. У залежнасці ад характару гэтых этапаў парознаму гучалі і песні: ад велічнаурачыстых у адрас жаніха і нявесты, бацькоў, гасцей, да прасякнутых сумам расставання з родным домам песень нявесты. Вельмі многа выконвалася на вяселлі і жартоўных песень. Аб'ектам жартаў былі і жаніх, і сваты, і каравайніцы, і іншыя ўдзельнікі вяселля. Асаблівасцю жыткавіцкага вяселля, якая яднае яго з больш шырокім палескім рэгіёнам і адрозніває ад вясельнага абраду паўночна-усходняй часткі рэспублікі, з'яўляецца добра распрацаваны каравайны абрад. Ён прадугледжвае і пэўны падбор каравайніц, і прыгатаванне караваю, і яго ўпрыгожванне, і дзяльбу і, натуральна, адпаведныя песні, у якіх усе гэтыя дзеянні адлюстраваны. Вось, напрыклад, як пачынаюцца дзве каравайныя песні, адна з якіх суправаджае прыгатаванне караваю, другая — упрыгожванне:

Як мы свого коровая месілі,
То ў Дунай по водзіцу ходзілі (в. Буразь)
Як мы свого ж коровая радзілі,
То ў бор по красоцкі ходзілі...
(в. Верасніца)

Каравай — сімвал багацця, дабрабыту, шчаслівага лёсу маладых, ён прыцягвае да сябе ўсеагульную ўвагу, да яго звяртаюцца ў песнях:

Караваю, мой раю,
Каля цябе добра йграю
І з скрыпкамі, і з дудкамі,
З маладымі малодкамі (в. Пагост)

У вясельных песнях чуюцца водгукі мінулых эпох і падзей, у іх часам упамінаюцца Літва, татаршчына, паншчына. Вось, напрыклад, песня, якую спявалі маладой пасля вянца:

Вязуць мяне ў татаршчыну,
Заўтра пашлюць на паншчыну
Вярэнечка за плячыма,
Слезынька перад ачыма.
У вярэньцы луста малая,
Бо не свая маці давала (Тураў).

Вялікая колькасць песень узнікала і бытавала незалежна ад абрадаў як водгук на розныя падзеі грамадскага і сямейнага жыцця народа. Лірычныя песні, не звязаныя з абрадамі, звычайна дзеляцца на некалькі сюжэтна-тэматычных груп: любоўныя, сямейна-бытавыя. Вылучаюцца таксама балады, жартоўныя песні, калыханкі і іншыя творы. Усе гэтыя сюжэтна-тэматычныя групы, жарты і жанравыя разнавіднасці і да сённяшняга дня захаваліся ў песенным рэпертуары жыхароў Жыткавіцкага раёна. Амаль у кожнай вёсцы раёна, дзе працавалі фалькларысты, яны запісвалі балады — ліра-эпічныя песні з драматычным напружаным сюжэтам, якія апавядаюць аб розных канфліктах у сям'і, але разам з тым праз прызму сямейных адносін адлюстроўвалі грамадскія з'явы, народную мараль. Вельмі распаўсюджаная тут запісаная і ў райцэнтры, і ў в. Верасніца, і ў Тураве балада — «Тапаліна», якая апавядае аб тым, як свякруха абярнула сваю нявестку ў тапаліну і пасылае сына зрубіць дрэва. Традыцыйны канфлікт свекрыві і нявесткі распрацоўваецца таксама і ў запіса-

най у в. Буразь баладзе «Да паехаў сыноньку на Украіноньку». Маці сустракае сына кубкам віна, а нявесцы дае атруту, але маладыя п'юць з двух кубкаў і паміраюць. Маці і пасля смерці хоча разлучыць маладых, хавае іх у розных кутках могілак, аднак дрэвы, што выраслі над імі, сашчапіліся голлем і тым сімвалізуюць непераможнасць сапраўднага кахання. Шырока вядома тут балада «Дачка-птушка» (в. Дварэц, Тураў), якая апавядае пра гаротную долю ў доме свёкра маладой жанчыны: не вытрымаўшы пакут, яна акідваецца зязюляй і прылятае ў бацькоўскі сад.

Увогуле ў песенным матэрыяле, запісаным у Жыткавіцкім раёне, творы эпічнага плана займаюць даволі прыкметнае месца, магчыма, большае, чым у некаторых іншых рэгіёнах рэспублікі. Апрача балад тут запісаны цікавы варыянт так званай паставой песні «Цмок» (выконвалася ў вялікі пост). Песня хрысціянізаваная, але цалкам захавала старажытную аснову, старажытныя язычніцкія вераванні і ўяўленні людзей, у прыватнасці, аб існаванні ў воднай стыхіі нейкіх пачвар, якім людзі вымушаны былі прыносіць ахвяры. Вось некалькі радкоў з яе, якія апавядаюць, што людзі

Да веровалі ў лютого цмока,
Да давалі цмоку да на дзень аброку,
Да на дзень аброку па цэлам чоловеку.
Да прышла ж чарга до самога цара —
Як самому ж іці, то некому царство
весці,
Як жону аддаці, то з некім веку
дожываці...

Да эпічных твораў трэба аднесці і запісаныя ў Тураве так званыя духоўныя вершы, у якіх адлюстраваны агульначалавечыя маральныя нормы, асуджаецца сквапнасць, чэрствасць, несумленнасць і іншыя маральныя заганы людзей. Падобныя запісы для нашага часу амаль што ўнікальныя, яны рэдка сустракаюцца ў экспедыцыйных матэрыялах і сведчаць аб устойлівасці фальклорнай традыцыі, якая данесла да нашых дзён подых мінулых стагоддзяў, нястомны пошук нашых продкаў на шляху самаўдасканалення.

Аднак у паўсядзённым песенным рэпертуары больш твораў агульнавядомых, частка з іх звязана з палескай песеннай традыцыяй, частка прыйшла з радыё і тэлебачання, з канцэртаў мастацкай самадзейнасці і іншых крыніц. Паўсюдна спяваюць «Цячэ вада ў ярок», «Каля кузні ішла», «Ой, прала б я кудзеліцу — галоўка баліць», «Ой, там на таргу, на базары», а таксама песні, якія набылі асаблівую папулярнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны «На кані вараным выязджаў партызан» (в. Буразь) і «Дзе сонца закацілася за цёмныя лясы» (Тураў). Апошняя песня запісана ў шматлікіх варыянтах і ў Беларусі, Расіі, на Украіне і ў іншых славянскіх краінах.

Актыўна бытуюць і выконваюць сваю выхаваўчую ролю калыханкі, забаўлянкі, пацешкі, іншыя дзіцячыя песенькі. Праз іх дзіця знаёміцца з навакольным светам, спасцігае прасцейшыя ўзаемасувязі паміж рэчамі і з'явамі, уваходзіць у свет прыгожага, створаны паэтычным геніем народа. Асноўныя персанажы калыханак — каток, які злавіў рыбку за хвасток, каточак, што злізаў бабчын мядочак, куры, ваўчок і інш.

Важную ролю ў фальклорным працэсе адыгрываюць узаемадзеянне рознаэтнічных фальклорных традыцый, пастаяннае і актыўнае іх узаемаўзбагачэнне. У Жыткавіцкім раёне яно праяўляецца перш за ўсё ў запазычанні і шырокім бытаванні песень суседніх народаў — украінскіх, рускіх, польскіх. У Жыткавічах ад удзельнікаў харавога калектыву элеватара была запісана ўкраінская песня «Дзе б я ні хадзіла», якая, па словах выканаўцаў, трапіла сюды з Івана-Франкоўскай вобласці, дзе яе

звычайна выконвалі на вяселлі. Ведаюць і любяць спяваць і іншыя ўкраінскія песні... Трывала замацаваліся ў рэпертуары таксама рускія і польскія песні «Уж ты, ночка, ты ноченька темная», «Выйду ль я на реченьку» (п. Ленін), «Ветерочек парус гонит» (Тураў), «Ой, там под Краковам цёмны ляс» (в. Буразь).

Сярод лірычных прыпевак, запісаных у в. Верасніца, звяртае на сябе ўвагу дасціпным гумарам, зачынам, у якім выкарыстаны традыцыйныя вобразы-сімвалы селезня і вуціцы, наступная прыпеўка:

Селязён паляцеў,
А вутаўка крачэ.
Што одного поцалую.
То чотыры плачэ.

Частушкі больш свабодныя ў сваім бытаванні, яны непасрэдна не звязаны з танцамі, тэматыка іх ахоплівае розныя бакі жыцця.

І прыпеўкі да танцаў і частушкі звычайна выконваюцца ў музычным суправаджэнні: пад гармонь, скрыпку або траістую музыку. У некаторых вёсках Жыткавіцкага раёна яшчэ і сёння жывая традыцыя народнай інструментальнай музыкі, якую падтрымліваюць адмысловыя гарманісты, скрыпачы. Запісана і апублікавана мелодыя песні, якую выконвалі на каляды, калі вадзілі казу, а таксама народныя танцы «Лявоніха», «Барыня», «Мікіта», «Кадрыль». Чакаюць сваёй расшыфроўкі і публікацыі многія іншыя зробленыя тут запісы народнай інструментальнай музыкі: «Полька», «Кракавяк», «Венгерка», «Каробачка», «Падэспань», «Гапак».

Высокага ўзроўню развіцця дасягнулі і апавядальныя жанры народнай творчасці, перш за ўсё казкі. Казачная традыцыя заўсёды падтрымлівалася таленавітымі казачнікамі, дзейнасць якіх уплывала на мясцовы рэпертуар і ў пэўнай ступені служыла эталонам выканаўчага майстэрства. У 1952 г. у г. п. Тураве былі запісаны казкі і мясцовыя паданні ад двух таленавітых казачнікаў — Ц. Я. Ерамейчыка і І. Я. Зямляніка, рэпертуар якіх фарміраваўся ў пераважнай большасці на мясцовай аснове і адлюстроўвае асаблівасці мясцовай казачнай традыцыі.

Казачная традыцыя падтрымліваецца і так званым «хатнім» расказваннем казак для дзяцей. Казкі расказваюцца і каб пазабавіць дзяцей, і каб навучыць іх дабру, міласэрнасці, справядлівасці. Гэтым мэтам найперш адпавядаюць многія казкі пра жывёл, а таксама чарадзейныя казкі, героямі якіх з'яўляюцца дзеці. З захапленнем слухаюць дзеці казкі пра прыгоды Іванкі-сыночка, маленькага рыбалова, якога, падрабіўшы голас, схапіла баба-яга і хацела загнаць у гарачую печ, але ён, дзякуючы сваёй кемлівасці, пры дапамозе гусей выратаваўся і апынуўся ў сваім двары. Гэта казка запісана ў в. Дварэц ад М. В. Лабуцкай. Шэраг казак пра дзедаву дачку і бабкіну дачку, адна з якіх запісана ў Тураве, супрацьпастаўляюць лянівую, фанабэрыстую, сквапную бабіну дачку і паслухмяную, працавітую, добрую дачку дзеда, якая за свае добрыя якасці ўзнагароджана, а бабіна дачка пакарана.

Ад казачнікаў запісаны казкі розных жанраў: чарадзейныя, авантурна-навелістычныя, сацыяльна-бытавыя, у якіх закранаюцца розныя бакі сямейнага і грамадскага жыцця, ставяцца важныя сацыяльныя праблемы. Героямі казак, якія расказваў І. Я. Зямлянік, заўсёды выступаюць разумныя, кемлівыя людзі, якія ва ўсіх адносінах стаяць вышэй сваіх супраціўнікаў. Пры гэтым падкрэсліваецца сацыяльная няроўнасць, часам сацыяльны антаганізм асноўных персанажаў казкі: супрацьпастаўлены бедны брат і багаты, селянін і гандляр і г. д. Своеасабліва распрацаваны міжнародны казачны сюжэт «Два падарункі». Бедны,

але кемлівы селянін вырошчвае зімой агуркі і вязе іх пану, за што атрымлівае ўзнагароду. Багаты, дачуўшыся аб гэтым, таксама вырашыў, дачакаўшыся лета, павезці пану агуркі... Такі ж фінал і ў казцы «Дзяльба ўзнагароды»: селянін знайшоў згублены панам гадзіннік і вяртае яго гаспадару, але замест падарунка просіць пана даць яму «сто лоз», каб «пачаставаць» карчмара, які, не меўшы ніякага дачынення да знаходкі, хацеў атрымаць палавіну панскай узнагароды.

Каля 20 казак было запісана ад Ц. Я. Ерамейчыка, які не толькі меў багаты рэпертуар, але і валодаў многімі «сакрэтамі» мастацкага выканання твораў гэтага жанру. Ён выкарыстоўваў ініцыяльныя і фінальныя формулы, трохразовыя паўторы, цікава будаваў дыялог. Вось, напрыклад, нечаканы дыялог з казкі пра злодзея, які залез на гарышча хаты селяніна і чакаў, пакуль гаспадары паснуць. Пасля вячэры селянін моліцца:

— Госпадзі, ачысці душу маю!

— Ачышчу,— кажа з гарышча злодзей.

— Госпадзі, ачысці душу сына майго!

— Ачышчу.

— Госпадзі, ачысці душу суседа майго!

— Не ўпраўлюсь,— кажа злодзей.

Але галоўным героем расказаных Ц. Я. Ерамейчыкам казак з'яўляюцца селянін або салдат, якія паспяхова пераадольваюць розныя перашкоды, выяўляючы розум, кемлівасць, сілу, смеласць і дабіваюцца лепшага жыцця. Так, салдат, карыстаючыся выпадкам, просіць у цары-цы за сваю шматгадовую бездакорную салдацкую службу старое сядло і адпаведны царскі ўказ, а потым вяртаецца ў сваю вёску і забірае панскі маёнтак, які называўся «Старое сядло».

Глыбокі сэнс закладзены ў казцы «Смерць». Селянін шукае «святога» — справядлівага, бязгрэшнага, каб разам з ім паснедаць. За такога бязгрэшнага спрабуе выдаць сябе пан, пасля поп, але селянін не згаджаецца з іхнімі довадамі, выкрывае іх. І толькі сустрэўшы смерць, згаджаецца, што яна справядлівая, бо ад яе ніхто не адкупіцца, яна забірае і бедных, і багатых.

Разнастайныя па тэматыцы і вобразах казкі заўсёды выяўляюць лепшыя якасці працоўных людзей, іх спрадвечнае імкненне да справядлівасці, крытычнае стаўленне да сацыяльнай няроўнасці, прыгнёту, іх непахісны аптымізм.

Шырока прадстаўлены ў запісах з Жыткавіцкага раёна так званыя малыя фальклорныя жанры — прыказкі, прымаўкі, загадкі, у якіх сканцэнтраваны жыццёвы вопыт, працоўны каляндар, выяўляецца мудрасць народа, яго кемлівасць, назіральнасць, здольнасць заўважыць і ўвасобіць у мастацкай форме разнастайныя ўзаемасувязі паміж рознымі з'явамі і прадметамі. У цэнтры ўвагі — праца, адносіны да яе чалавека. «Працуй, нябожа, то і бог паможа» — так ёмка сфармулявана думка аб тым, што толькі ўласнай шчырай працай чалавек можа забяспечыць свой дабрабыт. Прыказка, якая павінна стрымліваць балбатуноў, заахвочваць разважлівасць, стрыманасць: «Хто маўчыць, той двох наўчыць».

Вобразнае мысленне, багатая асацыятыўнасць адлюстраваліся ў разнастайных па тэматыцы загадках. У іх іншасказальна гаворыцца пра навакольны свет, прылады працы і яе вынікі, чалавека і яго часткі цела і г. д.: «Поўна бочка мукі, а наверсе жукі» — попел і вуголле; «Сядзіць сядуха ў сямі кажухах, а і яшчэ холадна» — цыбуля; «За двума дубамі б'юцца каты лбамі» — пілуюць дрэва. Вусная народная

творчасць раёна, фальклорнае багацце ў пераважнай большасці — жывая з'ява, важная частка нацыянальнай духоўнай культуры нашых сучаснікаў, якая патрабуе да сябе пільнай увагі.

К. П. Кабашнікаў

БАЛАДА

А ў нядзельку параненьку
Зазлаваўся сын на маці:
— Уйдзі, мамка, проч ад мяне
Будуць госці цяпер у мяне.
Будуць кумы, пабрацімы,
Шчэ блізкія суседачкі.
Пайшла маці горанькамі
Аблілася слёзанькамі
Ды шчэ маці гор не ўзыйшла,
А ўжо сына бяда нашла.
Яго жонка й ашалела,
Старша дочка памірае.
— Ой, вярніся, мамка мая,
Бо да мяне бяда зайшла.
Мая жонка й ашалела,
Старша дочка й памірае.
— Не вярнуся, мой сыночак,
Ой, хоць будзе хата гарэць,
Ой, хоць будзе хата гарэць,
То й не прыду паглядзець.
Маці слова прамаўляе —
А сынова хата гарыць.
Маці сэрцам сакрушыла,
Ды ўсё ж гэта патушыла.

Запісала *Н. М. Маркава* у 1974 г. у в. Бярэжцы Жыткавіцкага раёна ад *Н. Д. Вянгуры*

— Ой ты, Галю, ды мая Галю,
Што ж я табе сказаці маю.
Што ж табе сказаці маю,
Сем загадак адгадаю.
Ой, пайду я лугам, лугам,
Там мой мілы арэ плугам.
Ён арэ ды й паводзіць,
Ён са мною не гаворыць.
Панясу я яму есці,
Ці не скажа ён мне сесці.
Ён наеўся, ён напіўся,
Ды й на лужок паваліўся.
— Чаму, мілы, не арэш,
Чаму са мной не гаворыш?
— Ой, я ляжу ды й думаю,
Што рудую жонку маю.
— Я такая радзілася,
Чарняваму судзілася.
— Вой ты чорны ды паганы,
Ідзі к чорту ў цыганы.
А я бровы сажай ўмажу,
Чарнявую пераважу.
Не вылезлі табе вочы,
Як ты сватаў мяне ўночы.
Было сватаць табе ўдзень,
Папытацца ў людзей.
Нашы людзі не татары,
Усю праўдачку сказалі б.

Запісана ў 1932 г. у в. Пухавічы, Жыткавіцкага раёна ад *А. М. Аліфяровіч*

Чырвонае возера

(легенда)

...За царыцай Кацярынай, а можа, і яшчэ раней жыў у гэтых лясах князь. Усе лясы, рэкі і сенажаці яму належалі. За вялікія заслугі яму царыца ўсё тое падарыла. Быў князь роду знакамітага, характару цвёрдага, паўжыцця правёў ён у войску ды на граніцах чэсць царскую бараніў. Вось выйшаў час яго службы, і атрымаў ён гэты край ва ўладанне. Прыехаў князь, церам пабудаваў і жыве.

Жыве сабе князь у высокім цераме. Але, на тую бяду, дзяцей у яго шмат, ды усё дочкі, а сын адзін-адзінюткі і апошні ў родзе, як на руцэ мезенец. А любіў жа князь яго!.. Вядома, багацце меў неслічонае, і пакінуць усё тое дзеўкам без працягу свайго князёўскага кораня было для яго вялікай крыўдай. І таму князьку маладому з малых год — усякае патуранне і балаўство. А старэйшых дачок трымаў бацька ў строгасці і паслушэнстве. Прызначыў ім вялікі пасаг кожнай, і ўсё. Больш ні на якую ласку яны не маглі спадзявацца, таму што ўся бацькоўская любоў і ўвесь князёўскі маёнтак быў маладому князю.

Пачаў князёк падрастаць і зраўняўся ў краснага малайца. Як дубок, роўны, і шчокі ружовыя, валасы русыя, вочы блакітныя. Нораву быў ціхага, паслухмянага і задуменнага. Сяброў-аднагодкаў у яго не было, таму што з мужыкамі знацца яму бацька не дазваляў. Больш любіў ён у сяцёр у святліцы сядзець ды іх песні дзявочыя слухаць.

Як падышла пара яго жаніць — клапаціўся вельмі стары князь аб працягу роду,— надарыўся нечаканы выпадак. Ужо некалькі год, як усяму гэтаму быць, узяў у старога князя ў арэнду карчму — шынок па-нашаму — адзін польскі яўрэй. А стаяла карчма на скрыжаванні трох найгалоўнейшых дарог. Для карчмы тое месца было самае выгоднае, бо ростані выходзілі проста да прыстані, а прыстань — на Прыпяці-рацэ... Скора па ўсіх шляхах пайшла слава пра карчму, а яшчэ большая слава — пра дачку карчмара Сару.

І здарыўся тут выпадак маладому князьку па гэтых шляхах пуць-дарогу мець. Заехаў у тую карчму, за ганаровы стол сеў, вакол яго слугі, сакалкі. Тут і напаткала бяда шынкарскую дачку. Як зірнула на маладога князя, так і вачэй не адвядзе...

Пачаў з той пары князёк часцяком па тых дарогах ездзіць, то на паляванне, то з палявання, то на рачныя караваны глядзець ды ўсё карчомку не мінае. Сакалкі сцямілі, што князю шынкарская дачка палюбілася, і яшчэ больш яму пра яе гавораць, зманіць яе на ночку прапануюць у суседні маёнтачак. Так яно і выйшла. А як яе зманілі, тут шынкарская дачка князю і кажа:

— Жаніся са мною, тады кахаць, мілаваць буду.

Як дачуўся пра тое стары шынкар, аж за валасы ўхапіўся:

— Сарка,— крычыць,— што сабе ў галаву ўзяла? Князь цябе каханнем адорвае, а ты што? І мяне, і сябе пагубіць хочаш? Не ведаеш, што такое князь?

— Ведаю,— адказвае Сара, прыгажуня-яўрэйка.— Ведаю, што князь, што ён мяне кахае, душы не чуе, а калі кахае, значыць, і замуж возьме.

— Выкінь з галавы гэта. Дзе ты бачыла, каб светлы князь з беднай яўрэйкай ажаніўся?

— Калі кахае, дык ажэніцца...

Даведаўся пра тую няроўную любоў стары князь. Страшэнна загневаўся і ні слова не кажучы сыну загадаў сваім слугам старога карчмара схапіць і звязанага да сябе прывезці.

Карчмар у ногі князю паваліўся і са слязьмі моліць дараваць яго неразумнай дачцэ.

— Ваша князёўская міласць, вось яна, мая дачка, карайце, мілуйце, але ўсяму віна — прыгажосць яе.

Прызадумаўся стары князь, сына кліча і пытае:

— Скажы, сын дарагі, надзея мая, што ты думаеш?

— Кахаю,— на карчмара паказвае,— яго дачку Сару і жаніцца прашу вашага благаславення.

Раззлаваўся князь:

— Не будзе табе майго благаславення!

Князеньку з воч прагнаў, а карчмара загадаў у падзямелле кінуць.

Але князёк таксама свой нораў паказаў. Быў у яго невялікі маёнтачак, ад нябожчыцы-маці ў спадчыну дастаўся, золата-серабра каваны куфэрак. Завёў князёк знаёмства з розным ушлым народам і пачаў яшчэ часцей са сваёй мілай сустракацца. А каб ніхто пра тое не ведаў, пабудаваў патаемна ад бацькі, пасярод вялікага возера каменны церамок і ў ім пасяліў сваю мілую.

Хутка ён і сам на гэты астравок перабраўся, балазе, зіма стаяла, і па возеры напрасцяк санную дарогу праклалі. Сара ў хрысціянскую веру перайшла, і павінна было быць ім вянчанне па ўсяму закону. А зіма ў той год трымалася марозная, снежная. Возера лёдам скавала ды снегам занесла. А як глянула вясна з туманамі, ды адразу вятры з Дняпра падзьмулі і сонца прыпякло, крануўся ўраз усюды лёд. І на возеры ваду падняло, і пайшлі па ім гуляць тоўстыя крыгі. Вось тут церамок і разнесла. Князька ў той час там не было, ён яшчэ па саннай дарожцы пакаціў да папа дагаварвацца, каб адразу па ўсяму закону з хрышчонай яўрэйкай шлюб узяць.

Дамовіўся з папамі і едзе па веснавой бездаражы. Пад'язджае да возера, а па ім толькі хвалі ды крыгі гуляюць. Даведаўся ён ад рыбакоў, што ніхто з таго вострава і церамка жывы не выплыў. Пастаяў, пастаяў князёк, пасля ўзышоў на высокі бераг, што векавымі соснамі зарос, ды з разбегу ў возера і ўхнуў...

Дайшла пра тое вестка да старога князя. Карчмару ён загадаў камень на шыю прывязаць, у возеры ўтапіць, а сам пасумаваў, пасумаваў ды неўзабаве і памёр.

І завецца з той пары Чырвонае возера яшчэ Князь-возерам...

З глыбінь народных

У Жыткавіцкім раёне адкрыта 68 Дамоў культуры і клубаў, 60 масавых бібліятэк — філіялаў Жыткавіцкай цэнтралізаванай бібліятэкі, 50 кінаўстановак і відэазалаў, чатыры музычныя школы, Тураўскі краязнаўчы музей, народны музей у Леніне і музей партызанскай славы ў п. Чырвоным. Раённая бібліятэка была адкрыта ў 1947 г., у 1952 г. адчыніў дзверы Дом культуры ў райцэнтры на 400 месц — цэнтр культурнай работы ў раёне. Да гэтага ўсю культурна-асветніцкую работу на вёсцы і ў гарадскім пасёлку вялі настаўнікі — найбольш адукаваныя людзі. Яшчэ ў пачатку стагоддзя ў Тураве была адкрыта платная чытальная зала ад Мазырскай уездной бібліятэкі.

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці Тураўшчыны на Краснай плошчы ў Маскве

У апошнія гады ўведзены ў строй новыя будынкі аб'ектаў культуры ў Леніне, Азяранах, Рычове, у Ляхавічах. У новае памяшканне пераехала Жыткавіцкая дзіцячая музычная школа, адкрыты музей народнай творчасці ў Азяранах. Ажываюць былыя народныя абрады — «валачобнікі», «купалле», «каляды», «раздво», мерапрыемствы па ўшанаванні людзей працы, ветэранаў і інвалідаў. Сельскім працаўнікам спадабаліся конкурсныя праграмы «Іграй, гармошка», «А ну, бабулі» і іншыя. Новы ўздым атрымала мастацкая самадзейнасць. У раёне працуе 94 гурткі і калектывы мастацкай самадзейнасці, 18 сямейных ансамбляў. Знайшліся народныя ўмельцы, разьбяры па дрэве, кавалі, майстры народных промыслаў. У гуртках і калектывах мастацкай самадзейнасці занята амаль паўтары тысячы чалавек. У 1992 г. самадзейныя артысты далі каля дзвюх тысяч канцэртаў у раёне, на абласной і рэспубліканскай сцэнах.

Вядучыя калектывы мастацкай самадзейнасці — народны ансамбль «Ярок» тураўскага Дома культуры, народны ансамбль «Жытніца» з Жыткавіч, фальклорна-этнаграфічны ансамбль пухавіцкага Дома культуры, танцавальны ансамбль «Прыпяць». Шасці калектывам раёна прысвоена званне народнага. Адзін з іх — Тураўскі народны хор, створаны ў 1945 г. вялікім знаўцам і аматарам народнай творчасці, таленавітым самадзейным артыстам С. Р. Белка. У 1962 г. хору прысвоена званне народнага. Народныя калектывы працуюць таксама ў в. Дварэц і Верасніца, хор культработнікаў у Жыткавічах, сямурадскі сямейны ансамбль «Свіцязянка», фальклорныя ансамблі «Лянок» у Буразі і «Ярок» тураўскага Дома культуры.

У песні і радасць, і смутак

Сустрэліся неяк дырэктар Тураўскай дзіцячай музычнай школы І. А. Шруб і старшыня калгаса «Новае жыццё» М. М. Арцюшка, разгаварыліся пра надзённыя справы, пра тое, што памяшканню музычнай школы патрабуецца рамонт. Мікалай Мікалаевіч, які сам удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці, прапанаваў: а што, калі стварыць у вёсцы Дварэц калгасны хор? Іван Архіпавіч згадзіўся...

Першымі пачалі наведваць рэпетыцыі работнікі бухгалтэрыі калгаса. У жанчын прыгожыя, звонкія галасы. Потым да іх далучыліся жывёлаводы, будаўнікі, паляводы. Рэпертуар падбіралі разам. У яго ўвайшлі песні, што з даўніх часоў гучаць на Тураўшчыне. «Ой, у полі азёрачка», «Ой, пайду я на ту гору», «Туман ярам» — гэтыя песні гучалі ў душы І. А. Шруба, ён зрабіў іх апрацоўку і аранжыроўку. Дапамагала жонка — Галіна Кірылаўна, якая выкладае ў дзіцячай музычнай школе. Яна тонка адчувае прыгажосць народнай песні, умее данесці яе да слухача.

Калгас выдзеліў сродкі для касцюмаў. Усё больш станавілася ўдзельнікаў хору, сёння ў ім налічваецца каля 50 самадзейных артыстаў. Рэпертуар яго ўвесь час абнаўляецца і ўзбагачаецца.

У агністай віхуры танца

...Плывуць дзяўчаты ў чароўным, задуменным карагодзе, нібы бярозкі ў вясенні дзень, асветленыя сонцам... Адзін танец змяняецца другім, на сцэну ўлятаюць заліхвацкія, ганарыстыя тураўскія хлопцы, і вось ужо віруе вясёлая, агністая палеская полька. Сваё майстэрства паказваюць калгасныя жывёлаводы, спецыялісты, механізатары, рабочыя мясцовых прадпрыемстваў. На сцэне — народны ансамбль танца «Прыпяць».

Вялікі аматар танца, знаўца народнай творчасці М. К. Котаў ніколі не развітваўся з мастацкай самадзейнасцю. І калі ў 1964 г. вярнуўся ў Тураў з Казахстана, дзе працаваў механізатарам у адным з цалінных калгасаў, яму далі магчымасць ажыццявіць сваю даўнюю мару. У гарадскім пасёлку, у суседніх вёсках — Запясоччы і Верасніцы знайшліся здольныя самадзейныя артысты, зацікаўленыя ва ўзнаўленні мастацкай самадзейнасці, якой здаўна славіўся край.

М. К. Котаў хадзіў па вёсках Тураўшчыны, назіраў, прыглядваўся да ўсяго, запісваў народны фальклор. Усе рухі артыстаў на сцэне, воклічы, напал — з жыцця, з усяго бачанага, што праходзіла праз сэрца — і атрымліваўся крышталь мастацкага твора, танец — агністы, самабытны, поўны жыццёвай сілы. Танец — згустак жыцця, яго свята, увасабленне душы народа...

Многія танцы, пастаўленыя М. К. Котавым, прызнаны і адобраны вядомымі харэографамі рэспублікі. Мікалая Конанавіча запрашалі ў Мінск, у балетную трупу Дзяржаўнага хору БССР для пастаноўкі «Кондраўскай вясёлай». За пастаноўку танцаў «Полька ў два бакі» з кампазіцыі «Тураўскія вячоркі» і «Кука» М. К. Котаў стаў лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, узнагароджаны Дыпломам першай ступені. Ансамбль — лаўрэат многіх рэспубліканскіх конкурсаў і аглядаў мастацкай самадзейнасці.

У калектыве сёння налічваецца звыш 80 чалавек — здольных, нераўнадушных да прыгажосці роднага краю, да багатай народнай творчасці самадзейных артыстаў. Душа калектыву — канцэртмайстры М. Шруб і С. Страх, новы яго кіраўнік Аляксандр Пашэвіч. За час

існавання ансамбля школу танцавальнага майстэрства ў ім прайшла амаль тысяча чалавек.

«Сцвіжанка»

Людзі ў Сямурадцах песенныя, таленавітыя. Доўгі час не знаходзілася добрага арганізатара, кіраўніка. Нарэшце, сямурадскім спявачкам пашчасціла. Загадчыца клуба Г. П. Лой, сама цудоўная спявачка, змагла аб'яднаць людзей самых розных узростаў і прафесій, паказаць прыгажосць песні. Напэўна, не знойдзецца ніводнай вёскі ў раёне, дзе б не парадавалі людзей сваім самабытным цікавым выступленнем самадзейныя артысты.

Глыбокія вытокі

Паўстагоддзя назад, у цяжкія пасляваенныя гады быў створаны ў вёсцы Буразь самадзейны фальклорны ансамбль, які з цягам часу атрымаў назву «Лянок». Тады, у 1944 г., настаўнікам у пачатковую школу быў накіраваны Я. К. Дрынеўскі. У нялёгкіх працоўных буднях нявесела жылося сялянам у дашчэнту разбуранай вёсцы. Каб неяк згладзіць жыццё, упрыгожыць яго, забыць хоць на хвіліну нястачу, холад, цяжкія думкі, задумаў Якаў Кірылавіч арганізаваць мастацкую самадзейнасць.

Насенне ўпала ў спрыяльную глебу. У Буразі жылі і жывуць не толькі працавітыя, але і таленавітыя людзі, якія ніколі не разлучаюцца з трапным словам, песняй, жартам. На Кастрычніцкае свята на маленькай сцэне прыстасаванага пад клуб будынка быў дадзены першы канцэрт.

Поспех прыходзіў паступова, але трывала і надоўга, ён быў заслужаны вялікай, нястомнай творчай працай, пошукамі, працяглымі рэпетыцыямі. Гэта сапраўдная народная творчасць: амаль увесь рэпертуар «Лянка» — з народных крыніц, сабраны і запісаны ў Буразі і ў навакольных вёсках. Больш як трыста народных песень запісаў за гады існавання ансамбля Я. К. Дрынеўскі. Ён піша вершы, байкі на злабадзённыя тэмы, якія нярэдка гучаць са сцэны. Аптымізм, гумар, выдатныя арганізатарскія здольнасці — тыя адметныя якасці вясковага асветніка, якія спрыяюць поспеху «Лянка». Многія ўдзельнікі яго — Н. К. Бахно, К. К. Дарошка, Н. В. Валішыцкая — прайшлі разам з кіраўніком ансамбля ўвесь шлях ад яго стварэння да прызнання. Даяркі, паляводы, спецыялісты сельскай гаспадаркі — яны надзвычай любяць народную песню, аддаюць ёй увесь свой вольны час.

Зачараванне непаўторнасцю

Шмат гадоў самадзейны мастацкі калектыў «Ярок», які ўзяў сваю назву ад папулярнай народнай песні «Цячэ вада ў ярок», дорыць радасць і задавальненне гледачам — сельскім працаўнікам, жыхарам беларускіх гарадоў, дзе выступалі самадзейныя артысты.

Рэпертуар ансамбля складаецца ў асноўным з беларускіх народных песень. Тут і поўная жыццёвай мудрасці «Ой, пад мостам-мостам», і жартоўныя «Маладзіца гарна», «Скрыпка б і не грала», і прыпеўкі «Ой, музыкі мае», і многа іншых. Песні, якія і ў час вяселля, і ў час смутку кранаюць душу, абуджаюць у ёй патаемнае, добрае, узнёслае, песні, якія дапамагаюць жыць і працаваць...

Верасніца вяртае свае песні

Любяць у нас народныя песні. Яны не могуць не хваляваць сваёй меладычнасцю, шчырасцю, непаўторнасцю... На вялікі жаль, многія песні, якія спявалі нашы маці і бабулі, ужо забыліся, страціліся за

даўнасцю часу... Пасля вячэрняй дойкі жывёлаводы збіраліся ў ленінскім пакоі, успаміналі, напявалі родныя мелодыі. Прышлося пайсці па хатах вяскоўцаў, распытваць старых, запісваць успаміны.

Паступова ў мастацкую самадзейнасць уцягвалася ўсё больш людзей, на аснове ансамбля стварыўся хор, якім кіруе дырэктар музычнай школы В. Я. Калоська, але фальклорная група засталася. У хоры спяваюць паляводы і работнікі праўлення гаспадаркі, механізатары і рабочыя нафтаправода «Дружба», а ў фальклорным ансамблі ў асноўным — жывёлаводы.

Вялікая гэта сіла — народная песня! Не застаюцца ў баку ад яе і нашы дзеці. Разам з намі заўсёды выступае дзіцячы ансамбль «Верасок», створаны пры дапамозе ўдзельнікаў фальклорнага ансамбля. Песні, якія спявалі ў Верасніцы ў даўнія часы,— жывуць...

Жыткаўская «Жытніца»

Самы малады, але найбольш папулярны калектыў мастацкай самадзейнасці — ансамбль народнай песні «Жытніца» жыткавіцкага раённага Дома культуры. Рэпертуар яго — беларускія народныя песні, якія спявалі ў даўнія часы на Палессі, у прыватнасці, на Жыткаўшчыне, новыя песні і прыпеўкі, народжаныя ў наш супярэчлівы час. Асобны напрамак дзейнасці ансамбля — адраджэнне народных звычаяў і абрадаў. Захоўваць і развіваць народныя традыцыі, самабытную творчасць, узраджаць роднае, беларускае — мэта і напрамак дзейнасці самадзейных артыстаў. У іх майстэрстве ўпэўніліся гледачы амаль усіх вёсак раёна, а таксама суседніх раёнаў вобласці і за яе межамі. «Жытніца» — жыве, спявае, не скараецца цяжкасцям жыцця і дае зарад бадзёрасці ўсім...

Спяваюць песні земляка

Звыш 60 песень у рэпертуары харавога калектыву культработнікаў пры жыткавіцкім раённым Доме культуры, які створаны ў 1974 г. Аснову іх складаюць народныя песні, беларускія і нацыянальныя песні народаў СССР, творы беларускіх кампазітараў. Сярод іх — песні земляка, ураджэнца Жыткавіч, вядомага кампазітара Уладзіміра Будніка, які з'яўляецца частым госцем, добрым дарадчыкам і памочнікам самадзейных артыстаў.

В. Р. Феранц

З кнігай па жыцці

Бібліятэкі існавалі яшчэ ў Тураўскім княстве ў XI—XII ст., адна з іх была пры Прэабражэнскай царкве ў Тураве, дзе знаходзілася славутае Тураўскае евангелле (20 старонак Евангелля знаходзіцца цяпер у бібліятэцы АН Літвы). Бібліятэку меў і Кірыла Тураўскі, вядомы царкоўны дзеяч, пісьменнік, асветнік. Кнігі пісаліся, пазней друкаваліся выключна для патрэб духавенства, царкоўнай і свецкай знаці, бібліятэкі існавалі пры царквах, манастырах, толькі праз стагоддзі — пры навучальных установах, школах, у грамадскіх памяшканнях.

Так і на тэрыторыі сучаснага Жыткавіцкага раёна ў мінулым стагоддзі існавалі падборкі кніг, найбольш духоўнага зместу, пры Траецкай царкве ў Жыткавічах, Прэабражэнскай у Тураве, у двухкласным народным вучылішчы, была адкрыта чытальная зала ў Тураве ад публічнай бібліятэкі г. Мазыра.

Па-другому была пастаўлена бібліятэчная справа, як і наогул адукацыя народа, пасля ўстанаўлення савецкай улады, адна з галоўных і бясспрэчных заслуг якой — хуткая ліквідацыя непісьменнасці народа, развіццё навукі. Ужо ў канцы 1920 г. былі адкрыты хаты-чытальні і пра-

цавалі бібліятэкі ў в. Верасніца (ёю кіраваў Іосіф Арцюховіч), Дзякавічы (В. Жарабцоў), а таксама ў Жыткавічах і Тураве. Бібліятэкі, хаты-чытальні, народныя дамы працавалі пад лозунгам «Прэч непісьменнасць», адчуваўся небывалы народны ўздым, натхненне, практычна ў кожнай вёсцы дзейнічалі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці. Не было паперы, яе замянялі абструганыя дошчачкі, аловак — вугаль...

У 1922 г. у раёне быў адкрыты нардом з бібліятэкай (188 кніг), шэсць хат-чытальняў, сем хат-чытальняў (прымітывак), праз два гады — восем хат-чытальняў і дзевяць прымітывак. Пачалі працаваць таксама бібліятэкі-перасоўкі. У Жыткавіцкім нардоме працаваў савет, меўся свой архіў. Толькі за тры месяцы ў 1925 г. работнікамі нардома праведзена 20 масавых чытак, 10 гутарак, напісана па просьбе сялян звыш 200 пісьмаў і заяў. На базе Тураўскай хаты-чытальні ствараецца народны дом. У ім адкрыта бібліятэка, у якой налічваецца 1030 экземпляраў кніг, сем пакояў для гурткавай работы, глядзельная зала на 300 месц. Рэгулярна выпускаецца насценная газета «Чырвоны араты».

Жыткавіцкі нардом размяшчаўся на вул. Запясочнай (цяпер — Заслонава) у старым будынку пажарнай аховы. У сярэдзіне 30-х гадоў быў пабудаваны новы, вялікі і прыгожы будынак раённага Дома сацыялістычнай культуры на вул. Пралетарскай, паміж ваенным камісарыятам і раённай бальніцай. Глядзельная зала на 600 месц, шэсць пакояў для заняткаў гурткоў, бібліятэка, размешчаная ў двух вялікіх пакоях. Працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці, ставіліся спектаклі, вялася актыўная масавая і асветніцкая работа. Актыўны ўдзел у ёй прымалі пагранічнікі 18-га пагранатрада, які размяшчаўся ў Жыткавічах на вул. К. Маркса. У 1935—1937 гг. бібліятэкай загадваў Міхаіл Новікаў, работай бібліятэкі кіравала Марыя Новікава, затым — камсамолка Маргарыта Вазнюк.

Раённы Дом культуры згарэў у час вайны. У 1948 г. быў пабудаваны новы РДК насупраць чыгуначнай станцыі, на другім паверсе яго размяшчалася раённая бібліятэка, фонд якой складаў больш чым 5000 кніг. На старых выданнях і сёння стаяць штампы бібліятэк Мінска, Гомеля. Загадваў бібліятэкай у пасляваенны час Фёдар Мацароў. У 1951 г. па ініцыятыве Зінаіды Наточый была адкрыта першая ў раёне дзіцячая бібліятэка. На вёсках працавала дзевяць сельскіх і тры прыклубныя бібліятэкі, арганізавана звыш 10 перасоўных бібліятэк. Вялікую работу з насельніцтвам праводзілі ўлюбёныя ў кнігу бібліятэкары Людміла Тарлецкая, Фаіна Цвасман і іншыя.

Усё больш бібліятэк адкрывалася ў сельскай мясцовасці, іх будавалі калгасы на свае сродкі. У 1958 г. дзейнічала дзевяць сельскіх і 13 прыклубных бібліятэк, арганізавана 15 бібліятэк-перасовак. Кніжны фонд іх складаў каля 60 тыс. экземпляраў. Пасля далучэння ў 1960 г. да Жыткавіцкага раёна часткі Тураўскага і Ленінскага раёнаў у 112 населеных пунктах працавалі два Дамы культуры, музычная школа, два краязнаўчыя музеі, былі адкрыты раённая і пасялковая бібліятэкі, дзве дзіцячыя, 25 сельскіх і столькі ж прыклубных бібліятэк. Загадчыкам аддзела культуры райвыканкома працаваў І. Л. Галубіцкі, дырэктарам РДК — А. В. Макарэвіч, затым В. П. Хільман, загадчыкам бібліятэкі — Н. У. Якушэвіч.

У 1978 г. у Жыткавічах пабудаваны новы раённы Дом культуры, старое памяшканне РДК поўнасцю перададзена пад цэнтральную раённую бібліятэку, у якой быў зроблены

капітальны рамонт і поўная перабудова — абсталявана кнігасховішча, абанентная зала, аддзел камплектавання і апрацоўкі кніг, метадычна-бібліяграфічны аддзел. Новае памяшканне атрымала і дзіцячая бібліятэка. Кніжны фонд цэнтральнай раённай бібліятэкі складаў 515 тыс. кніг. У апошнія гады былі адкрыты бібліятэкі ў Кажановічах, Дуброве, Грабаве і ў мікрараёне Азёрны. У новых памяшканнях размясціліся бібліятэкі ў Азяранах, Градзе, Рычове, Чырвоным, Людзяневічах, Леніне.

Цяпер раённая ЦБС складаецца з цэнтральнай, 56 сельскіх бібліятэк — філіялаў, трох дзіцячых, гарадской і 47 бібліятэчных пунктаў. Кніжны фонд — звыш 520 тыс. экземпляраў. ЦБС абслугоўвае больш як 25 тыс. чытачоў, штогод ажыццяўляецца больш паўмільёна кнігавыдач. У бібліятэчнай сістэме працуе 82 работнікі.

Цэнтральная і дзіцячыя бібліятэкі Жыткавіч, Людзяневіцкая сельская бібліятэка выйшлі пераможцамі абласнога конкурсу «на творчую індывідуальнасць».

А. А. Ахрамовіч

Тураўскі слоўнік

У апошні час беларуская дыялектная лексікаграфія ўзбагацілася некалькімі дзесяткамі слоўнікаў, якія адлюстроўваюць лексіку народных гаворак розных рэгіёнаў Беларусі. У шэрагу лексікаграфічных выданняў «Тураўскаму слоўніку»[1], як адзначаюць многія навукоўцы і рэцэнзенты, належыць асаблівае месца.

Слоўнік складаецца з пяці тамоў. Ён уяўляе сабой поўны слоўнік традыцыйнай лексікі, якую складальнікі разумеюць як характэрную для гаворкі спрадвечную або дастаткова старую лексіку. Сюды адносяцца перш за ўсё словы, якія складаюць дыялектную лексічную аснову тураўскай гаворкі. Разам з тым у слоўнік уключаны і розныя ўласныя лексічныя набыткі гаворкі. Такі тып дыялектнага слоўніка, на думку складальнікаў, дапамагае лепш раскрыць слоўнікавы склад гаворкі як пэўнай сістэмы і з'яўляецца добрай базай для лексікаграфічных даследаванняў ва ўсходнепалескай дыялектнай зоне ў цэлым. Акрамя таго, складальнікі слоўніка ўлічылі і тую акалічнасць, што «гаворка Тураўшчыны, як і ўсе гаворкі ўсходняга Палесся, знаходзіцца на перыферыі сучаснай беларускай дыялектнай мовы, і любы іншы від даведніка па яго лексіцы мог бы даць не зусім правільнае ўяўленне аб асаблівасцях яго слоўнікавага складу» (т. 1, с. 17).

Уся лексіка падаецца ў алфавітным парадку, за выключэннем памяншальных назоўнікаў, якія прыводзяцца ў артыкулах на словы, ад якіх утвораны. Абагульнены ў адзін слоўнікавы артыкул розныя рэгулярныя і нерэгулярныя фанетычныя варыянты слоў і амонімы.

Слоўнікавы артыкул у «Тураўскім слоўніку» пабудаваны наступным чынам: загалоўнае слова, марфалагічная і стылістычная яго характарыстыка, раскрыццё семантыкі слова, ілюстрацыя кожнага значэння адным або некалькімі прыкладамі на іх ужыванне. У канцы многіх слоўнікавых артыкулаў прыводзяцца ўстойлівыя фразеалагічныя выразы, а ў асобных з іх — кароткія этнаграфічныя звесткі, звязаныя з прадметам ці з'явай. Для ілюстрацыі слоў выкарыстоўваюцца найбольш удалыя і змястоўныя сказы, у якіх адлюстравана цікавая інфармацыя аб мясцовасці, побыце, звычаях, адносінах людзей, мясцовых з'явах жыцця, а таксама прыказкі, пры-

[1] Тураўскі слоўнік // А. А. Крывіцкі, Г. А. Цыхун, І. Я. Яшкін, П. А. Міхайлаў, Т. П. Трухан. Т. 1—5.— Мн.: «Навука і тэхніка».

маўкі, прыкметы, загадкі, звычаі і г. д.

Кожны том «Тураўскага слоўніка» завяршаецца раздзелам «Тэксты», у якім змешчаны ўзоры мясцовай мовы розных жанраў: побытавыя апавяданні, легенды, звычаі, замовы і г. д. У ім выдзяляецца вялікі цыкл апавяданняў «Вяселле», у якім на мясцовай гаворцы пададзены падрабязны сцэнарый традыцыйнага тураўскага вяселля з тэкстамі абрадавых песень (звыш 100 розных вясельных песень). Запісаў іх і падрыхтаваў для слоўніка ўраджэнец в. Пагост, энтузіяст і збіральнік узораў духоўнай культуры Тураўшчыны, навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі АН РБ М. А. Саскевіч. Другі цыкл апавяданняў можна аб'яднаць умоўна пад назвай «Цётка Парулюшка расказвае...». Гэта апявяданні жыхаркі в. Старажоўцы Параскі Мікітаўны Жукоўскай, гаворка якой вылучаецца цікавым зместам, дынамізмам і сюжэтнай завершанасцю.

У пятым томе «Тураўскага слоўніка» змешчаны радзел «Анамастыка», у якім прыводзіцца значная частка сабранага матэрыялу па ўласных назвах Тураўшчыны (2095 слоў) — палёў, сенажацей, лесу, балот, узгоркаў, рэчак, азёр і г. д., а таксама прозвішчы і мянушкі жыхароў па найменні мясцовых населеных пунктаў.

У пяці тамах «Тураўскага слоўніка» змешчана 20 004 слоўнікавыя артыкулы і вялікая колькасць разнастайных устойлівых (семантычна непадзельных) словазлучэнняў. Слоўнік шырока раскрывае лексічны склад непаўторнай, арыгінальнай тураўскай гаворкі. Ён найбольш поўны і падрабязны ў сям'і падобных выданняў.

Збіранне матэрыялаў для картатэкі слоўніка адбывалася ў вызначанай усходне-палескай дыялектнай зоне, цэнтрам якой з'яўляўся Тураў. Гэты этнадыялектны мікрараён з вельмі выразнымі межамі ўключаў у сябе, акрамя гарпасёлка, 33 вёскі, і быў умоўна названы Тураўшчынай.

Мясцовыя слоўныя багацці збіраліся многімі шляхамі і спосабамі. Перш за ўсё былі выкарыстаны вядомыя навуковыя дапаможнікі для збірання лексікі — апытальнікі, праграмы і інш. У збіральніцкай справе вялікую дапамогу аказалі настаўнікі Тураўшчыны. Найбольш актыўна дапамагаў вучоным М. Е. Бруй, які даслаў у картатэку больш як 200 цікавых дыялектызмаў. Зборам лексікі таксама займаліся былы дырэктар Хільчыцкай сярэдняй школы Ф. С. Санец, настаўніца гэтай школы М. Л. Кацэвіч. Вялікая падборка экспрэсіўнай лексікі была атрымана ад М. А. Дарошкі з вёскі Верасніца. Вялікая заслуга ў тым, што пяць тамоў «Тураўскага слоўніка» ўбачылі свет, яго складальнікаў А. А. Крывіцкага, І. Я. Яшкіна і Г. А. Цыхуна, а таксама ўдзельнікаў шматлікіх экспедыцый Г. Ф. Вештарт, І. П. Кавальчука, Э. Г. Якушава, В. Д. Лабка, П. В. Садоўскага, Л. У. Выгоннай.

П. А. Міхайлаў

Вясновае ранне

...Яна прыйшла ў 1965 годзе рана, гэтая ластаўка-вясна. Растаў снег, споўз з крутых узгоркаў у копанкі і ямкі і застаўся ляжаць жабарнай вадой. Сонца адразу прыгрэла, расцяпліла гарачай, прыветнай усмешкай, дало ўладу хоць рэдкім, але цёплым дажджам.

У канцы сакавіка прагрымеў першы гром — вясенні вястун. І Уладзімір Лук'янавіч Танковіч, брыгадзір трэцяй брыгады, узрадаваўся: ранняй будзе сяўба. Ды і падрыхтаваліся да яе нядрэнна. На палі вывезена дастатковая колькасць угнаенняў, інвентар, клубні

і насенне ў поўным парадку.

І на табе! Прыпяць і Случ — родныя сёстры — нашчадрылі ў вадзе. Паводка падуладзіла лугі, сенажаці і нават палі, засеяныя азімінай. Вымакла каля 8 гектараў жытнёвых загонаў.

Затрымалася і веснавая сяўба. І ўсё ж надышоў дзень, калі, нарэшце, калгаснікі выехалі ў поле — дзесьці на другім тыдні красавіка.

Садзілі бульбу ў брыгадзе ўручную. Палі тут малыя. Не цаліна — князь-борскае поле...

Ездавыя развозілі тарфагнойныя кампосты. Іван Васільевіч Кулакевіч і Вячаслаў Міхайлавіч Астроўскі задавалі, як заўсёды, тон у рабоце. Хутка накідвалі на вазы кампост Пятро Якаўлевіч Кулакевіч, Мікіта Мацвеевіч Шчур і камсамолец Антон Кулакевіч.

Роўна, без агрэхаў распаласоўвалі глебу коннымі плугамі Уладзімір Ліпінскі і Міхаіл Жукоўскі. Штодзень кожны з іх заворваў па 60 сотак.

Добрымі тэмпамі ішла сяўба. У гэтым — заслуга і плён шчырых намаганняў усёй брыгады — Марыі Лук'янаўны Пупенка, Варвары Кандратаўны Кулакевіч, Веры Міхайлаўны Танковіч і другіх.

...Адвячоркам, калі сонца хілілася да лесу, з пахнучых лазовымі пупышкамі лугоў неслася шматгалоссе птушынага хору. Сейбіты вярталіся з поля. З комінаў віўся дым, пераклікаліся гусі, уведамляючы аб набліжэнні вечара... Прыгналі з пашы статкі цялят Рыгор Якаўлевіч Кулакевіч і Іван Пятровіч Канапацкі. Рыгор Сямёнавіч Кулакевіч выводзіў у начное калгасных коней.

Сонца ўжо зачапіла вершаліну лесу, яшчэ некалькі хвілін — і яно схаваецца за яго цёмнай сцяной. Уладзімір Лук'янавіч Танчынскі ў гэты час у апошні раз праходзіў па полі, над якім ужо згушчаўся змрок. Што было на душы ў брыгадзіра — можна здагадацца... Задаволенасць працоўным днём і клопат пра заўтрашні, пра будучы ўраджай, і радаснае ўсведамленне напружанага рытму жыцця, шчасце яшчэ адной усеабдымнай, шчодрай вясны...

У. Ф. Лаўнікоўіч

Тураўскі агеньчык

У кастрычніку 1971 г. я адкрываў для сябе Палессе. Шмат было потым розных дарог, але гэтая запомнілася асабліва. Дзень быў ціхі, крыху засмужаны. З раніцы па нізінах слаўся туман. На зялёнай азіміне лопалі крыламі, узляталі з крыкам і зноў садзіліся шэрыя чаплі. Цэлае поле чапляў!..

Аўтобус «Лельчыцы — Тураў» часта прыпыняўся, падбіраючы на лясной дарозе палешукоў з поўнымі кошыкамі грыбоў і журавін. За вокнамі шапацеў залаты лістапад. Лісце, зрываючыся з дрэў, павольна кружылася ў паветры і ціха падала на цёмную ваду канала, што струменіўся ўздоўж дарогі праз увесь Прыпяцкі запаведнік. Як хацелася мне прабегчы праз кожны масток, каб нырнуць у палескія нетры, дзе далёка-далёка, здавалася, трубіць рог князя Тура.

Ад старажытнага Турава засталося толькі гарадзішча над Прыпяццю. Я доўга стаяў на ім, парослым горкім палыном, часткова агароджаным калючым дротам (нехта ж дадумаўся зрабіць тут агароды!..) і было горка на душы. Усё думалася аб тым, чаму так нялітасцівы лёс да нашай гісторыі, да гэтага славутага некалі, а цяпер забытага богам і людзьмі гарадка, чаму мы такія бяспамятныя і раўнадушныя да свайго мінулага?..

А міма, як і ў тыя часы, ва ўсёй велічы і прыгажосці ўсё гэтак жа несла ў сінюю далеч свае воды лагодная Прыпяць... Прыпяць, ба-



Тураўскія лодкі

қены, коні, чаўны, чайкі, чароды гусей, і цішыня, незвычайная цішыня над усім гэтым хараством. Я быў зачараваны Туравам адразу і назаўсёды. Не раз затым я прыязджаў у Тураў, каб паблукаць ля Прыпяці і пастаяць у ціхім роздуме на Замкавай гары...

Я доўга блукаў па начным гарадку.
Насупраць гасцініцы Прыпяць цямнела.
І там, між лазы, на рачным астраўку
Рыбацкі агеньчык успыхваў нясмела...

Не раз я ўглядаўся ў гэты агеньчык, а на пагосце Барыса і Глеба мне ўсё мроілася вузкае акенца цеснай манаскай келлі і ў трапяткім святле дагараючай свечкі схіленая над пергаментам постаць Кірылы Тураўскага...

Ля Чэрніч павольна пераплываў праз Прыпяць тураўскі паром. Колькі цёплых успамінаў звязана з ім! У рускага паэта Юрыя Фатнева, з якім я нямала блукаў па свеце, ёсць цудоўны верш, які так і называецца «Тураўскі паром». У хвіліны настальгіі па Палессі я заўжды згадваю гэты тураўскі паром. На вялікі жаль, цяпер яго няма. Не калыхаецца больш на хвалях Прыпяці, не рыпіць засмужанай раніцай тураўскі паром. Тут, на гэтым месцы, узняўся самы доўгі і прыгожы на Беларусі мост.

Шкада, што мы не ўмеем зберагаць сваё багацце. Паром — гэта жывы голас мінулага, душа палескага краю. Чаму, скажам, галандцы так беражліва захоўваюць свае млыны? Бо гэта іх гісторыя, іх культура. Тураўскі паром — таксама наша гісторыя і наша культура. І захаваць яго для нашчадкаў — наш абавязак.

Нямала паэтычных радкоў я прысвяціў гэтай зямлі. Ды яно і зразумела: быццам той рыбацкі агеньчык, свеціць, вабіць, кліча мяне Тураў — святыня славянскай зямлі. «Днесь весна красуеться»,— напісаў некалі славуты Кірыла Тураўскі. Хай жа красуецца вясна Турава, вясна гэтага прыгожага краю ва ўсіх вяках, мінулых і наступных!..

* * *

Над Туравам грымела навальніца.
Гасцініца драўляная цякла.
І толькі заставалася маліцца,

Але была зачынена царква.
Тры дні і ночы дождж ішоў няспынна.
Шаптаў я летапісныя радкі:
«Паставіша князь Тур зело град
дзіўны...»
Цяклі, як Прыпяць, даўнія вякі...
Гісторыя плыла перад вачыма:
Знікалі княствы, гінулі князі.
І толькі,
Як і сёння на Радзіме,
Ішлі дажджы на Кіеўскай Русі.
Ішлі дажджы...
На тураўскім пагосце
Замшэў і пахіліўся стары крыж.
Мінулае...
Як мала збераглося.
Душа мая,
Ад страт цяжкіх гарчыш.
Гісторыю адкладвалі на потым,
Маўляў, хапае сённяшніх турбот.
На гарадзішчы —
За калючым дротам
Заместа града нечы агарод...
Было балюча, сорамна і прыкра...
Зноў паўтараў даўнішнія радкі:
«Паставіша князь Тур...»
Няўжо прывыклі:
На гарадзішчы — бульба і гуркі?
Таму, відаць, па ўсёй Русі вялікай
Такіх, як Тураў, мноства гарадоў:
Закінутых,
Забытых
І бязлікіх...
Біць у званы...
Але няма званоў...

Міхась Башлакоў

...Мая блакітна-зялёная зямля

Дарогамі надзеі і трывог

...Рака, затокі, суседнія старыкі, лес па той бок — усё ў тумане. Камлёў дубоў не відаць — толькі разгалістыя кроны: яны нібы па калена ў тумане. На паніклых мяцёлках чароту — цянёты з мноствам расінак. Нізка ляцела над туманам у бок нябачнага яшчэ сонца парачка крыжанак...

З кожнай гадзінай рэльеф берагоў прыкметна мяняецца. Там-сям пры вадзе стаяць дамкі. Гэта жыллё бакеншчыкаў. Усё часцей сустракаюцца людзі — рыбакі-вудзільшчыкі, касцы, а гарызонт нібы хто адсунуў далей...

Нарэшце і яго вялікасць Тураў...

Стаім на самай вяршыні старажытнага гарадзішча. Адтуль далёка відаць. І дзюны, і прырэчныя лазнякі, і абрысы няблізкага лесу... Ля падножжа гарадзішча выстраіліся старыя вербы. За вербамі паблісквае на сонцы затока. Там шмат гусей і дзяцей. І тыя, і тыя заняты купаннем. А па беражку ходзяць буслы, скубуць траву коні. Лявей чарнее парэнчамі драўляны мост. Па той бок затокі — лодка пры лодцы. Тут ці не кожны рыбак?..

Вельмі ўразіў помнік, што паблізу прыстані ў гонар тысячагоддзя заснавання Турава. Высокая белая вежа. Побач — гранітная стэла з высечанымі на ёй словамі, узятымі з летапісных крыніц, аб узнікненні горада. На стэле — колішні герб з выявай тура. Трошкі воддаль, на высокім цэментным слупе,— буслянка. Вечныя спадарожнікі чала-



На Прыпяцкай затоцы

Але была зачынена царква.
Тры дні і ночы дождж ішоў няспынна.
Шаптаў я летапісныя радкі:
«Паставіша князь Тур зело град
дзіўны...»
Цяклі, як Прыпяць, даўнія вякі...
Гісторыя плыла перад вачыма:
Знікалі княствы, гінулі князі.
І толькі,
Як і сёння на Радзіме,
Ішлі дажджы на Кіеўскай Русі.
Ішлі дажджы...
На тураўскім пагосце
Замшэў і пахіліўся стары крыж.
Мінулае...
Як мала збераглося.
Душа мая,
Ад страт цяжкіх гарчыш.
Гісторыю адкладвалі на потым,
Маўляў, хапае сённяшніх турбот.
На гарадзішчы —
За калючым дротам
Заместа града нечы агарод...
Было балюча, сорамна і прыкра...
Зноў паўтараў даўнішнія радкі:
«Паставіша князь Тур...»
Няўжо прывыклі:
На гарадзішчы — бульба і гуркі?
Таму, відаць, па ўсёй Русі вялікай
Такіх, як Тураў, мноства гарадоў:
Закінутых,
Забытых
І бязлікіх...
Біць у званы...
Але няма званоў...

Міхась Башлакоў

...Мая блакітна-зялёная зямля

Дарогамі надзеі і трывог

...Рака, затокі, суседнія старыкі, лес па той бок — усё ў тумане. Камлёў дубоў не відаць — толькі разгалістыя кроны: яны нібы па калена ў тумане. На паніклых мяцёлках чароту — цянёты з мноствам расінак. Нізка ляцела над туманам у бок нябачнага яшчэ сонца парачка крыжанак...

З кожнай гадзінай рэльеф берагоў прыкметна мяняецца. Там-сям пры вадзе стаяць дамкі. Гэта жыллё бакеншчыкаў. Усё часцей сустракаюцца людзі — рыбакі-вудзільшчыкі, касцы, а гарызонт нібы хто адсунуў далей...

Нарэшце і яго вялікасць Тураў...

Стаім на самай вяршыні старажытнага гарадзішча. Адтуль далёка відаць. І дзюны, і прырэчныя лазнякі, і абрысы няблізкага лесу... Ля падножжа гарадзішча выстраіліся старыя вербы. За вербамі паблісквае на сонцы затока. Там шмат гусей і дзяцей. І тыя, і тыя заняты купаннем. А па беражку ходзяць буслы, скубуць траву коні. Лявей чарнее парэнчамі драўляны мост. Па той бок затокі — лодка пры лодцы. Тут ці не кожны рыбак?..

Вельмі ўразіў помнік, што паблізу прыстані ў гонар тысячагоддзя заснавання Турава. Высокая белая вежа. Побач — гранітная стэла з высечанымі на ёй словамі, узятымі з летапісных крыніц, аб узнікненні горада. На стэле — колішні герб з выявай тура. Трошкі воддаль, на высокім цэментным слупе,— буслянка. Вечныя спадарожнікі чала-



На Прыпяцкай затоцы

века — буслы — стаяць на буслянцы і спакойна азіраюць нас...

Новая стаянка — паблізу прыстані «Хваенск». Мы рашылі дабрацца ажно да вёскі Буда Бячанская — самай крайняй у Жыткавіцкім раёне. Не адышлі і сотні метраў ад берагу — натрапілі на сляды колішняй вузкакалейкі. Гнілыя шпалы, кавалкі рэльсаў, з'едзеныя іржою кастылі... Па гэтай вузкакалейцы некалі падвозілі да Прыпяці дубовыя камлі. Там іх грузілі на баржы і адпраўлялі ў розныя куткі рэспублікі і за яе межы. Казалі: тыя камлі ішлі... мяснікам. На калодкі. Цяпер тут засталіся лічаныя дубы, якіх не магла спляжыць піла. Ды і яны — з выпалінамі, скалечаныя, дажываюць свой век. А вакол — пні, пні...

Мінулі Хваенск, увайшлі ў леспрамгасаўскі пасёлак. Ён здаўся нам невялікім акуратным мястэчкам. Новыя дамкі, крамы, уздоўж платоў дашчаныя тратуары (залівае вясною вуліцы), пры дамках садкі, агароды і нязменны атрыбут палескіх паселішчаў — буслянкі: на воданапорнай вежы, на комінах крамы і сталоўкі, на канторы леспрамгаса. Дзіўна, але ні на адным дрэве — а іх тут шмат — буслянак не ўбачылі. Не відаць іх было і ў дуброве, што вакол пасёлка.

З Хваенска прыбег табунок дзятвы. Праз паўгадзіны кінуліся назад — хваліцца, што бачылі тут, на беразе Прыпяці.

Распыталі ў людзей, як трапіць у вёску Буда Бячанская. Параілі: лепш ісці сцяжынаю, напрасткі — спачатку дуброваю, потым полем.

...Раптоўна дуброва абарвалася, і перад намі раскалыхвала збажыну шырокае поле. Мы ішлі сцяжынай, пратаптанай ад лесу да вёскі, якая віднелася далёка наперадзе, і радаваліся: добрае поле, дагледжанае, высокі будзе ўраджай. І ад ракі няблізка, і ў належны парадак прыведзены. Відаць, па-гаспадарску вырашалі тут меліяратары ўсе пытанні. Так думалася. А зайшлі ў вёску...

Вёска стаіць у непралазнай гразі. Па вуліцах ні прайсці, ні праехаць, пасярод — вялікае балота. Калі тут стварылі польдэр, меліяратары не пракапалі нават канаву, каб асушыць гэтае балота. З суседняй Бечы да Буды дарога праведзена, а ў самой Будзе нават ніхто рукою не паварушыў.

Некалькі мужчын з Хваенска прыехалі на матацыклах — пацікавіцца, што гэта за экспедыцыя. Пасядзелі на пяску, паківалі галовамі і сталі расказваць навіну: у запаведнік прывезлі з Белавежы зуброў.

Дзядзька з вусікамі расказваў:

— Адзін спакойна выйшаў з клеці, другі пачаў супраціўляцца. Упёрся, і ні з месца. Аднак выпхнулі. І толькі трактар, на якім у клеці везлі ўпартага зубра, адышоў трошкі, як той крутнуў галавою і кінуўся следам. Ледзь не перакуліў трактар. Паразганяў, вядома, і людзей. Звер!

— Трошкі пазней,— удакладніў другі дзядзька,— прывезлі і выпусцілі ў загародку яшчэ пяць зуброў. Нічога, прыжыліся. Нават цяля ў адной зубрыцы з'явілася.

— Мяркуюць яшчэ некалькі перасяліць. Так што і ў нас зубры жыцьмуць!

Насупраць вёскі Хлупін знаходзіцца самая ўнікальная ў Еўропе дуброва. Усім дубровам дуброва! Дрэвы высокія, магутныя. Але сярод іх віднеюцца сухастоіны. Пяць гадоў таму назад выглядала дуброва інакш... Прычын таму многа. Вельмі псуюць дубы лістагрызы — розныя пядзенікі, ліставёрткі, соўкі, шаўкапрады, дубовыя пільшчык і чаўночніца... Для іх у поймавых дубровах Прыпяці ўсе ўмовы — добрае праграванне лясоў, высокая вільготнасць, ранняе з'яўленне лісця... Стварэнне гідратэхнічных збуда-

ванняў у пойме ракі таксама адмоўна ўплывае на стан дуброў — адбываюцца гідралагічныя змены ў глебе. Пагаршэнне экалагічных умоў у выніку абвалавання Прыпяці можа паскорыць іх гібель.

...На дзюне цёпла і ціха, ніякіх камароў. Лёгкі ветрык не падпускаў іх сюды. Стракозы да цемнаты ганяліся за камарамі. Да цемнаты спявалі і салаўі. Потым стаў драць горла драч. Недзе на досвітку пачуўся парасячы квік — дзічыха прыводзіла па леташнія жалуды сваю сям'ю... Зязюля паднялася разам з сонцам і кукавала на ўсю дуброву.

Дуброва жыла сваім жыццём. Раніца толькі пачалася, а дзяцел ужо за работай — стукае. Недзе выводзіць «каленцы» салавей. Вада ў пратоцы стаячая, зялёная. З берагу на бераг праплыў бабёр. Доўга відна яго «баразна»...

Дубы тут розныя. І ў два абхваты, і ў тры. Ёсць і маладзейшыя. Нямала пасохлых. Стаяць, нібы здані... На доле — паваленыя дрэвы. Ад учарашняга дажджу і начнога туману камлі пабліскваюць россыпам расін.

На маторцы ідзём пратокамі ў Хлупін. Пагаварыць з людзьмі, пачуць, як і чым жыве тутэйшы чалавек.

Да Хлупіна ледзь прабіліся. Сапраўды, сустрэў цікавых людзей. Ніна Іванаўна Цішкоўская, загадчыца фельчарска-акушэрскага пункта.

— Сама я не тутэйшая. Трыццаць гадоў, як прыехала сюды. У вёсцы нават святла не было. Каўтун панаваў. Роды па хатах прымаць даводзілася... За трыццаць гадочкаў столькі дзяцей прыняла ад парадзіх! Лічыце, палова хлупінцаў — мае...

Мікалай Яфімавіч Касценка:

— Змалку па дрэву люблю займацца. Вокны, дзверы, сталы, канапы рабіў. І хаты ставіў. Бандарства таксама ў маіх руках было. Выштукоўваў бочкі, дзежачкі, начоўкі, цабэркі, кублы, міскі — усё, што людзі прасілі. Жлукты таксама рабіў. Ведаеце, што такое жлукта? З калоды выдзеўбаная бочка, дна не мае. Туды баба попел засыпала, бялізну замочаную кідала, зноў засыпала попелам і варам залівала. Накрые тое жлукта гадзіны на дзветры, бялізна адмокне, а тады — да вады і паласкаць пачне. Потым — пранік у рукі і давай перыць, і давай. Глядзіш, бялізна ўжо і чысцюткая... Але найболей чаўны рабіць любіў. З дубу. Вунь, бачыце, ля плоту камель метраў пяць даўжынёю? Гэта Рыгор Жогаль прывёз, сусед. Хоча, каб і яму чоўна зрабіў. Работа, праўда, марудная. Спярша тапаром здымаецца верх. Потым крае. Таксама пад шнур. Тады камель пераварочваецца. Каб тапаром ці склюдам падэшву зняць. А склюд бачылі хоць? Вялікі такі тапор: лязо з паўметра, а сам з паўпуда важыць... Потым, чалавеча, круглую сякерку, капыл, як у нас называецца, у работу пушчаю. Выдзёўбваю ўнутры — да самай падэшвы. Стануць сценкі пальцы на тры таўшчынёю — і ўсё, човен гатовы. Спускай на ваду і плыві! Такі човен гадоў трыццаць служыць... Даводзілася рабіць і з вярбы. Толькі гэта ўжо не човен, а душагубка. Выдаўбаў капылом, а каб шыршай была — грэў ваду, заліваў, распарваў і трошкі згінаў, устаўляў какоры, паўдугі такія, збіваў гваздамі і ўсё. Служыла душагубка меней — гадоў дзесяць... Лёгкая, вёрткая. Нібы качка — гайдаецца на вадзе, а не перакуліцца. Але і з дубу човен не чапкі, гэта значыць, не хісткі. Ніколі таксама не перавернецца. Чалавек пяць перавозіць можа. І супраць ветру ходкі. На чоўне спакойна мэтар дроў прывязеш... Лепей, каб дуб вужаваты буў. Цяжэй рабіць, але човен вечны!

Марыя Міхайлаўна Стаяноўская, дырэктар школы:

— Яшчэ тры гады назад нашу

школу меркавалі закрыць як неперспектыўную. Наладзіліся справы ў калгасе, заставацца пачала моладзь. Толькі летась у Хлупіне згулялі за дзесяць вяселляў. Усе маладажоны засталіся ў роднай вёсцы, не з'ехалі, як гэта было раней. Цяпер вось трэба дабівацца будаўніцтва новых школьных памяшканняў. Дзяцей жа прыбаўляецца!..

Хіма Сідараўна Касценка, пенсіянерка:

— Я размяняла ўжо дзесяты дзесятак. Гадоў багато, а жыці хочацца. Колысь умерці хацела, а тэпэр жыці хочу. Бо і хліб, і да хліба маемо. Добра жыці стало, ды нема колы... Во! — паказала рукою на вуліцу.— Па ёй, помню, люды лямкамі лодкі цягалы, а тэпэр ашвальт ляжыць. Колысь хаты вода залывала, а тэпэр і на палёх суха... Мы не палешукы! Палешукы — там, дэ ліс высокы растэ. А дэ балота — не палешукы... Ці ў школку ходыла? Два дні пайшла і кінула. Паленавалася... Затое неблагая спевуха була...

Змітро Цішкоўскі, ляснік:

— Мой абход — у абсалютна запаведнай зоне Прыпяцкага запаведніка. Участак не з лёгкіх. У маім абходзе 1050 гектараў адных толькі дуброў. За апошнія восем гадоў высахла трыццаць працэнтаў. Дзесяць — пятнаццаць працэнтаў дубу пашкоджана рознымі пядзенікамі... З браканьерамі таксама няма сіл змагацца. Лезуць, як мухі на мёд. А лесніку для барацьбы з імі, браканьерамі, нічога не даюць. Хаця б для формы выдавалі дубальтоўку ці што? Праўда, ёсць лодка з маторам. А ці на ёй угонішся за браканьерам? Ён браканьеръщь, можа, болей на сушы, чым на вадзе...

Потым расказвалі тыя, што ездзілі далей, на польдэры:

— Нібы квітнеючы палявы аазіс сярод балот і лясоў запаведніка. Талковы тут старшыня калгаса, Неўмяржыцкі...

На левым беразе Прыпяці таксама нямала дубоў, каржакаватых і моцных. Але многія ўсыхаюць. Гэта засмучала. Нашы ўнукі не змогуць пабачыць іх зялёнымі... Чым больш развіваецца цывілізацыя, тым шпарчэйшымі тэмпамі гіне прырода.

На маторцы пайшлі ў абсалютна запаведную зону. Адолелі пратоку, што злучала старык з Прыпяццю, павярнулі налева і праз нейкі час прысталі да берага, паблізу разгалістага дуба.

Хадзілі, аглядалі ўнікальную мясціну. Праўду ўчора казаў ляснік Цішкоўскі! Гадоў пяць назад усё выглядала інакш. Дубы-мерцвякі, голыя ад лісця кроны... Трапілі на выжарышча, дзе нядаўна гаспадарыў агонь. Тут некалі ландышаў было! Цяпер бярозка прарасла... Прырода пустаты не церпіць. Так і з дубровамі будзе: дубы памруць, іх месца зойме асіна, бярэзіна...

Радаваліся гонкім дубам, якіх цудам абышоў лёс суседзяў, прыгажосцю бярэзін, якія сярод непралазнага падросту зрэдку свяцілі бялюткімі камлямі. Шкадавалі асілкаў, што ад старасці палеглі долу. І зусім не маглі глядзець на дубы, якія стаяць, нібы акораныя, не варухнуўшы нават галінай. Яны ўжо ніколі не падораць лясному жыхару ценю, жолуда, лістка...

А колькі мясцін, вартых увагі мастака! Вось старая затока. Да самай вады схіляюцца старэнькія вербы. Вось і завал. Там некалі стаяла сям'я алешын. Дрэвы аджылі сваё і тут жа леглі, утварыўшы схову шчупаку, пераход лясному зверу, прыстанішча бабру і андатры. На месцы старых алешын паднялiся маладыя, з цёмна-зялёнымі кронамі. Дубы быццам берагуць невялікую затоку, іх мо з дзесяць сабралася ля вады...

Я. С. Пархута

Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік

З 292 тыс. гектараў плошчы Жыткавіцкага раёна трэцяя частка адносіцца да запаведна-ахоўваемай. Гэта Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік — адзіны на тэрыторыі былога Саюза, у якім налічваецца 794 віды флоры — 52 працэнты відаў флоры рэспублікі, 26 з іх занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, дзяржаўны біялагічны заказнік «Нізоўе Случы», Жыткавіцкі біялагічны заказнік лекавых раслін, Ленінскі паляўнічы заказнік, помнік прыроды «Насаджэнне пантыйскай азаліі».

На поўдні Жыткавіцкага раёна, дзе працякаюць рэкі Прыпяць і Сцвігa, размешчаны Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік. Гэта ўнікальны комплекс натуральных прыродных ландшафтаў, маланаселены, з негустымі дарогамі лясны куток, які спрадвеку славіцца сваімі дубровамі, вялікімі, часта непраходнымі балотамі, векавымі барамі, вялікай колькасцю рачулак і ручаёў. Унікальны край да нашага часу захаваўся амаль у спрадвечным выглядзе, хоць на працягу стагоддзяў не раз яго ўладальнікі, розныя прадпрымальнікі, проста аматары спрабавалі ажывіць, «абкультурыць» яго. З 1871 па 1898 г. балоты асушваліся Заходняй экспедыцыяй І. І. Жылінскага, а з 1900 г. пачаліся прамысловыя высечкі лясоў. Цнатлівасці ўнікальнага кутка краю была нанесена пэўная шкода. Шмат лесу было высечана заходнееўрапейскімі прамыслоўцамі. У савецкі перыяд лес адсюль сплаўляўся па Прыпяці на буйныя індустрыяльныя будоўлі, Днепрагэс. Тураўшчына стала бязлеснай, але знішчэнне прыроды не дайшло да межаў сучаснага запаведніка. Неістотны ўплыў аказала таксама шырокая меліярацыя Палесся ў пасляваенны час. Для захавання ў натуральным стане ў міжрэччы Прыпяці, Сцвігі і Убарці тыповага для Беларускага Палесся ландшафтна-гідралагічнага комплекса, аховы і ўзнаўлення рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёлы, вывучэння змен у прыродзе, якія праходзяць пры ўмяшанні ў яе чалавека, Пастановай Савета Міністраў БССР ад 3 чэрвеня 1969 г. быў створаны Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік, адзіны ў краіне такога напрамку навуковай і прыродаахоўнай дзейнасці.

Запаведнік — суцэльны лесабалотны масіў плошчай 63 342 га, які працягнуўся з захаду на ўсход на 64 км, з поўначы на поўдзень на 23 км. Ён размешчаны на тэрыторыі Жыткавіцкага, Лельчыцкага і Петрыкаўскага раёнаў, у складзе запаведніка пяць лясніцтваў: Рычоўскае, Азяранскае, Пераройскае, Сімановіцкае і Снядзінскае.

Клімат цёплы, няўстойліва вільготны. Сярэднегадавая тэмпература паветра +6,6 °С. Абсалютны максімум 38 °С, абсалютны мінімум — да 36 °С. Вегетацыйны перыяд працягваецца 203 дні, перыяд актыўнай вегетацыі — 156 дзён. Гадавая колькасць ападкаў мяняецца ў межах 300—750 мм. Зімы маласнежныя, снегавое покрыва няўстойлівае.

Рэльеф — плоская забалочаная раўніна, слаба нахіленая на поўнач. Абсалютная вышыня над узроўнем мора — 131,4 м на поўдні і 119,2 м на поўначы. На поўначы выдзяляецца пойма Прыпяці і першая надпойменная тэраса шырынёй 5—8 км, якая ўзвышаецца над поймай на 1—1,5 м. У цэнтры размешчана другая надпойменная тэраса, якая злучана з першай выразным выступам, на поўдні яна пераходзіць у водна-ледніковую раўніну.

Тэрыторыя запаведніка адносіцца да вадазбору Прыпяці, з поўначы на поўдзень працякаюць лясныя рэч-

кі і ручаі: Свінавод, Бялянка, Мутвіца, Крушынны, Лучынец, большасць з якіх выпрамлены. Балоты ў заходняй частцы запаведніка пакрыты густой сеткай асушальных канаў, злучаных з магістральнымі каналамі Бычок і Галоўны. Працягласць усёй гідраграфічнай сеткі запаведніка каля 300 км (474 м на 1 кв. км), у тым ліку 22 км натуральнай і 278 км меліяратыўнай. Аднак дрэніруючае значэнне яе амаль поўнасцю страчана, цяпер дзейнічае толькі каля 80 км натуральных вадатокаў і магістральных каналаў.

На тэрыторыі запаведніка налічваецца каля 45 азёр, найбольш буйныя з іх — Карасіна, Пупава, Плёса, Обадзь, Серабранка. Грунтовыя воды на большай частцы размешчаны на глыбіні 0,1—0,2 м ад паверхні і вельмі рэдка — глыбей.

Пойма Прыпяці і яе тэрасная частка затапляецца вясной часта на працяглы тэрмін, да двух месяцаў. У асобныя гады вадой пакрываецца 50—70 % запаведніка. Нязначны ўхіл мясцовасці, плоскі западзінны рэльеф і блізкае заляганне грунтовых вод спрыяе яе забалочанасці. Таму больш паловы тэрыторыі запаведніка занята балотамі — 30 % верхавымі, 25 % пераходнымі і 11 % нізіннымі.

У глебе пераважаюць арганагенныя адкладанні. На долю тарфяна-балотных глеб прыходзіцца 56,6 % плошчы запаведніка, перагнойна-глеевых — 4,2 %. Шырока распаўсюджаны пойменныя мінеральныя глебы — 32 %. Глебаўтваральнымі пародамі іх з'яўляюцца пяскі, супесі і суглінкі. Тыповыя для Палесся дзярнова-падзолістыя глебы сустракаюцца не часта.

Усяго ў запаведніку сустракаецца 154 глебавыя рознасці, аб'яднаныя ў 12 тыпаў глеб. Звыш 90 % іх адносяцца да глеб грунтовага і атмасферна-грунтовага ўвільгатнення.

Тэрыторыя Прыпяцкага запаведніка ўваходзіць у склад Прыпяцка-Мазырскага і Паўднёва-Палескага раёнаў Палеска-Прыдняпроўскай акругі, падзоны шыракаліста-сасновых лясоў. Пераважае раслінны тып расліннасці, лесам занята 84,5 % яго плошчы. Большай часткай гэта маладнякі (каля 30 %) і сяроднеўзроставыя насаджэнні (звыш 60 %). Усяго каля 10 % тэрыторыі пакрыта лесам, дзе перабольшваюць спелыя і перастойныя дрэвастоі.

У структуры лясных насаджэнняў пераважаюць сасновыя лясы (54 %). Значныя тэрыторыі заняты дубовымі лясамі (13,6 %), бярозавымі (10 %), чорнаальховымі (8,6 %). Сустракаецца ясень, граб, клён, ліпа, асіна, елка, розныя віды івы. 7500 га займаюць травяныя і сфагнавыя балоты, каля 500 га хмызнякі, лугі.

На пойменных дзярновых, дзярнова-карбанатных і дзярнова-ападзоленых глебах размешчаны пойменныя дубровы, у нізінах на тарфяна-балотных глебах — чорнаальховыя гаі і іўнякі, якія чаргуюцца з пойменнымі лугамі, нізіннымі балотамі і азёрамі. На высечках дубровы змяняюцца насаджэннямі бярозы бародаўчатай, асіны, ясеня. Прыродны комплекс запаведніка для ўсёй еўрапейскай часткі СНГ і Балтыі.

Незвычайны і своеасаблівы рэльеф поймы Прыпяці ў межах запаведніка. Часта сустракаюцца плата-падобныя ўчасткі з невысокімі ўзвышшамі, выцягнутымі ўздоўж ракі, яны чаргуюцца з затарфаванымі ўпадзінамі і старымі русламі рэк, па якіх раскідана каля 40 азёр старычнага паходжання, агульная плошча воднай паверхні складае звыш 100 га. У цэнтры надпойменнай тэрасы сярод балот знаходзяцца два возеры карставага паходжання плошчай 3,8 га, глыбіня якіх дасягае 10—15 м.

Флора запаведніка надзвычай

Зубры ў Прыпяцкім ландшафтна-гідралагічным запаведніку

багатая і разнастайная. Тут расце звыш тысячы відаў раслін (без мохападобных), якія належаць да 101 сямейства. Найбольшай відавой разнастайнасцю характарызуюцца сямействы складанакветных, злакавых, асокавых, гваздзіковых. У запаведніку сустракаецца 25 відаў драўняных і 32 віды кустарнікавых пародаў. Выяўлена 25 відаў раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі (арніка горная, ваўчаягада, касацікі сібірскі і бязлісты, гарлачык белы, купальніца еўрапейская, асака ценявая, сон-трава, хвошч вялікі, хахлатка полая, вадазбор звычайны і іншыя).

Жывёльны свет уяўляе вялікую цікавасць. На тэрыторыі запаведніка выяўлена 47 відаў жывёл з атрада парнакапытных, 14 — драпежных, 2 — зайцападобных, 17 — грызуноў, 6 — насякомаедных і 4 віды рукакрылых. Зарэгістравана 256 відаў птушак, сярод якіх 195 гняздуючых, 48 пралётных, 16 залётных, 27 аседлых, 6 прылятаючых на зіму. Жыве 7 відаў паўзуноў, 11 відаў земнаводных, 22 віды рыб (у Прыпяці 34 віды).

Сярод парнакапытных найбольш распаўсюджаным відам з'яўляецца кабан, колькасць якога па гадах змяняецца ад 550 да 750. Шмат ласёў (170—230 асобін), касуль (380—650). Жыве і размнажаецца зубр еўрапейскі. Зубр быў завезены сюды ў 1986 і ў 1988 гг. з Белавежскай пушчы і Прыокска-тэраснага запаведніка з мэтай узнаўлення гістарычнага арэалу, паспяхова адаптаваўся да мясцовых умоў. У 1990 г. 13 зуброў выпушчана з вальераў на волю.

Сярод драпежных у запаведніку налічваецца 120—170 асобін лісы, распаўсюджаны ласкі, гарнастаі, куніцы. Ёсць ваўкі. Радзей сустракаюцца рысь, выдра, барсук. Жывуць таксама бабры, вавёркі, вожыкі. Шмат мышападобных грызуноў. На запаведную тэрыторыю заходзяць буры мядзведзь і высакародны алень. Своеасаблівая фауна балот, дзе распаўсюджаны глухары, цецярукі, жураўлі, кулікі.

43 віды жывёлы, у тым ліку млекакормячыя (барсук, зубр, выхухаль), 37 відаў птушак (беркут, сапсан, змеяед, чорны бусел, вялікая белая чапля, шэры журавель і іншыя), амфібія (чаротавая жаба), 2 рэптыліі (балотная чарапаха і мядзянка) занесены ў Чырвоную кнігу БССР.

Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік, адзіны такога тыпу ў краіне, мае вялікую перспектыву. Тут плануецца стварэнне нацыянальнага парку «Тураўшчына».

А. У. Углянец

Палеская прыгажуня

Жыла калісьці ў тутэйшых мясцінах дзяўчына, вельмі прыгожая: вочы зялёныя, косы, як агонь... Хацелі выдаць яе замуж за багатага ды нялюбага. Пайшла дзяўчына ў лес — і не вярнулася. І там, дзе ўпалі яе залатыя валасы, выраслі незвычайныя кветкі...

Кветкі гэтыя — ярка-жоўтыя, у выглядзе парасона, з вострым салодкім пахам цвітуць кожную вясну на невысокім кустарніку з калючымі галінкамі. Кустарнік — рададэндрон жоўты, або азалія пантыйская. Незвычайная расліна — дзіва беларускай прыроды, водар кветак яе падманлівы, нектар атрутны. Яна быццам ахоўвае сябе ад чужога дотыку. Нельга перасадзіць азалію пантыйскую ў іншае месца: колькі ні спрабавалі перасяліць яе бліжэй да жылля, яна абавязкова гінула...

Кветка рададэндрону жоўтага, ці азаліі пантыйскай

Гэтая невялікая, загадкавая расліна сямейства верасковых, больш падобная на кустарнік — далёкі сваяк брусніцы. У еўрапейскай частцы СНГ гэта вельмі рэдкая расліна. Пантыйская азалія нейкім цудам захавалася яшчэ з таго часу, калі ў нашых краях быў «паўднёвы» клімат, каля вёскі Замошша. Лясная палянка ў Вятчынскім лясніцтве, дзе расце азалія, узята пад ахову дзяржавы, аб'яўлена помнікам прыроды.

Сустракаецца рададэндрон жоўты таксама на бярэжцкай лясной дачы пад Туравам.

У Прыпяцкім запаведніку можна сустрэць на азёрах і старыцах і іншыя рэлікты даледніковай эпохі, надзвычай рэдкія ў Беларусі — сальвінію плаваючую, або вадзяны папаратнік, вадзяны арэх, або чылім плаваючы, плод якога — касцянка з рогападобнымі вырастамі.

Папараць-кветка

У канцы светлай, кароткай чэрвеньскай ночы ёсць імгненне, калі перад самым узыходам сонца заціхаюць птушкі, нікне ветрык — быццам замірае прырода. У гэты, на світанні, час, кажуць, зацвітае папараць-кветка. І быццам той, хто знойдзе кветку папараці, будзе на ўсё жыццё адзначаны шчасцем, дабрабытам, радасцю.

Прыгожая легенда, падобная на быль. Ці быль, падобная на легенду?..

Папараць сапраўды цвіце. Гэта

Надзвычай багаты папаратнікам Прыпяцкі ландшафтна-гідралагічны запаведнік

асобны від папараці — вужоўнік, або змееязычнік. Названы ён так таму, што кветка, якая выходзіць з рассечаных пялёсткаў, быццам кветкавая стрэлка ад сцябла, нагадвае язык змяі. Стрэлка ў выглядзе гронкі ўся ўсаджана кветкамі-бародаўкамі.

Не гарыць змееязычнік у начы казачным агнём, не грымне гром, калі возьмеш у рукі... У народзе яго называюць разрыў-травой, і пазнаць яе можна быццам так: на якой траве ў купальскую ноч пераломіцца каса, гэта і будзе разрыў-трава.

Не ў багацці фарбаў прыгажосць папараць-кветкі — дзіўная ў сваёй рэдкасці...

Рэдка цвіце вужоўнік. Далёка не ўсе, хто нават штодзень бываюць у лесе, сустракалі вужоўнік — папараць-кветку. Каму давялося бачыць яе — таму сапраўды пашчасціла, сустрэчу з казачнай і ў той жа час звычайнай, толькі вельмі рэдкай раслінай не забыць.

А колькі яшчэ таямніц і загадак хаваюць нетры Прыпяцкага ландшафтна-гідралагічнага запаведніка!

В. Р. Феранц

Запаведнік адкрывае тайны

— Ці бачылі калі-небудзь «п'яныя дрэвы»? — у голасе Алы Літвінавай пачуліся вясёлыя ноткі.— Вунь, глядзіце...

Камель дуба нібы абліты півам, вільгаць сцякала і пенілася. У паветры стаяў спецыфічны пах.

— Такія «п'яныя» дрэвы тут не рэдкасць — дуб, асіна, вярба... Яны выкідваюць лішнюю вільгаць, адбываецца браджэнне. На пах злятаюцца насякомыя — мошкі, мушкі, матылі, жукі. Ля «п'яных» дубоў часта можна сустрэць самага вялікага

прадстаўніка нашай энтамафауны — жука-аленя...

Надвячоркам з іхтыёлагамі Вячаславам Еўдакімавым, Дзмітрыем Куніцкім і Міхасём Плюта пайшлі на лодцы пад Перапоў лавіць донкамі ярша Балона.

У Перарове двароў каля тысячы. Стаіць вёска на падвышаным беразе затокі. Асфальтаваная вуліца адначасова служыць своеасаблівай дамбай. У разводдзе вада не даходзіць да хат. Хаты — па той бок вуліцы, па гэты бок — лодкі.

У еўрапейскай частцы краіны былі вядомы два віды ярша: ёрш звычайны і ёрш-насар. У басейне Дуная жыве яшчэ так званы дунайскі ёрш. У 1974 г. чэшскія вучоныя апісалі новы від дунайскага ярша, які адрозніваўся ад звычайнага болей высокім тулавам, наяўнасцю па баках чатырох — шасці папярочных цёмных палос і трошкі нагадваў акуня. Гэта было сенсацыяй. Яго назвалі яршом Балона.

Супрацоўнік Інстытута заалогіі АН Беларусі Леанід Чумакоў аднойчы рашыў правесці адпачынак на Палессі. Часта забаўляўся з вудаю. Да іхтыялогіі Чумакоў ніякіх адносін не мае, ён займаецца глебавай энтамалогіяй, але звярнуў увагу, што яму часам трапляюць не зусім звычайныя яршы — падобныя на яршоў Балона. Мясцовыя рыбакі добра адрозніваюць іх, называюць «ёрш пад судачка», ці «бучок». Чумакоў паведаміў аб гэтым іхтыёлагам Інстытута заалогіі.

У 1984 г. на Прыпяць была арганізавана экспедыцыя, мэта якой — выявіць новы від ярша. Каля вёскі Перапоў сапраўды злавілі каля трыццаці яршоў Балона.

Вучоныя прыйшлі да вываду, што ёрш Балона не з'яўляецца дунайскім эндэмікам, як гэта лічылася раней. Знаходка новага віду ярша на Прыпяці была адкрыццём для іхтыёлагаў не толькі Беларусі, але і краіны.

...Вярталіся ноччу. У поліэтыленавай торбачцы плавала некалькі яршоў Балона. Мясцовыя жыхары нам расказалі яшчэ, што нядаўна выяўлены рэдкі для поймы від амфібіі — травяная жаба. Дзесяць гадоў працавалі тут вучоныя-біёлагі, але такая знаходка — упершыню. На жаль, травяную жабу мы не сустрэлі...

Дождж як пачаўся ўчора, калі лавілі ярша Балона, так і не сціхае. Прыпяць ажно курыць ад дажджу і туману... Краявіды між тым мяняюцца, берагі часта высокія, абрывістыя, а тады зноў — залітая вадою пойма, лазавінне, старыкі, чараты. За імі праз нейкі час паказваюцца вышэйшыя мясціны, на якіх размясціліся вёсачкі.

У дуброве каля вёскі Хваенск бачылі змеяеда. Паблізу Турава выяўлены каланіяльныя пасяленні чайкавых і кулікоў, сярод якіх рэдкі від: кулік марадунка. Да гэтага была вядома знаходка толькі аднаго гнязда. Тут — ажно пятнаццаць! У тых жа калоніях бачылі гнёзды вялікага зуйка, ці гальштучніка. Раней пра гэтую птушку ведалі вельмі мала: былі зарэгістраваны адзінкавыя сустрэчы, і вучоныя не мелі пэўных доказаў яе гнездавання на Беларусі. Там жа адзначаны і іншыя віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу БССР: кулік-сарока, малая чайка, малая крачка. У калоніях выяўлены і рэдкія віды качыных — шыраканоска і шылахвостка. Паблізу Хваенска сустрэлі белую блакітніцу. Да гэтага ў Беларусі зарэгістравана было толькі два яе гнязды. Выяўлена і самая паўднёвая кропка пражывання ў рэспубліцы трохпальцага дзятла. Яго бачылі на тэрыторыі Азяранскага лясніцтва. Сустрэлі таксама ў трох мясцінах блакітнага зімародка — у раёне стаянак «Хлупін» і «Хваенск». На Прыпяці гэта вельмі рэдкая птушка. І галоўнае: зарэгістравана некалькі сустрэч з новым

відам арнітафауны Беларусі — белашчокай крачкай... Колькі яшчэ нязведанага ў запаведніку!

Я. С. Пархута
З кнігі «Палескі дзённік»

На пароме

...Сядзелі мы ў двары ў Кадоліча, пілі бярозавік, вельмі смачны, настоены на грушах. Стаяла ў кветніку чаромха-венік: метр з нечым вышыні — і ўся ў белай квецені. На платах, на сцяне хаты была цямнейшая адмеціна: так стаяла ў повень вада. Вышэй яна была хіба што ў 1891 годзе. Людзі ведалі нораў Прыпяці, а Прыпяць ведала стойкасць людзей.

— Вы што ж — на гару перасяліліся?

— Чаму-у? У хаце. Я на ложку, жонка — на печцы. З ложка адразу ў высокія боты — і пайшоў.

— Дык вільготна ж.

— Ад сырасці грубку палілі... Шчупачок у хлеў заплыў.

— Што, байка пра сама ў печцы?

— Як-кая байка. Жыццё — байка. Рака... Сама байка... Бачыце на чым сядзім?

Сядзім мы сапраўды на крэслах-тронах, зробленых з цэльнага дубовага стаўбура: таўшчэзны пень са спінкаю.

— Ранкам выйшаў — думаў дзве калоды пчаліныя прынесла ў двор... Штурхнуў нагою, яна крутанулася — аж не... Дык вось і сядзім...

Прыпяць ведала, што рабіць.

І носяць, і носяць нас ногі... Сёння, у гэты халодны шэры ранак, яны нясуць нас на паром. Быў тут калісьці мост. Спалілі ў вайну. І вось на многія кіламетры паром застаўся адзінай ніццю, што звязвае левы бераг з правым. Едзе тэхніка, едзе розны груз, трактары, легкавушкі, машыны тэхнічнай дапамогі, аўтобусы, грузавікі з трубамі, драўнінай. І людзі, розныя людзі.

Сноўдаецца туды-сюды кацер, вядзе за сабой пяцьдзесят тон жалеза... Прычал — «прыпаромак» з ушчэнт узмачаленымі бярвёнамі.

На рацэ сіверна, над ракой шэранькі дзень і рэдкія, халодныя кроплі дажджу. Калі разварочваецца кацярок, з-пад вінта б'е бурапразрыстая вада Прыпяці, вельмі падобная на піва. Змрочная вада. І невядома, куды вязуць у такі сцюдзёны дзень малатарні, трактары з прычэпамі...

Дошкі паромныя заліты саляркай, і ўсё адно ля чыгуначных прычальных кнехтаў (такіх, як на караблі), куды не заедзе кола машыны, зелянее траўка — неўміручая сіла жыцця...

Разяваць зяпу тут не рэкамендуецца. Я, напрыклад, ледзь не застаўся без азадка, бо панесла легкавік. Добра, што паромшчык у ватоўцы, у кедах, вельмі падобны на акцёра, які іграў у «Дзецях капітана Гранта» маёра Мак-Набса (толькі што зарослы шчэццю), адцягнуў.

Паромшчык махае рукамі (узвалоквае аўтакран), гаворыць нешта дзяўчатам, уладальніцам чыстейшага палескага дыялекту і торбаў з голымі негрыцянкамі, дае нейкую параду бабульцы ў фартуху, нешта даводзіць дзядзьку, апранутаму ў сэнсе колераў проста з парыжскім густам.

Зялёны капялюх, сіні гарнітур, ліловы гальштук. Начальнік.

— Моро машын возім.

— Колькі?

— Лічылі раз, каб плаціць. Збіліса-а. Нам плоцяць па пяць капеек з машыны, і грошай нам хапае — во! Па семдзесят пяць рублёў плоцяць... Часам пытаюць: «Колькі?» Не, у нас бясплатно. У Петрыкове дзвіжэння нема. Машын дваццаць перавязуць за дзень, і ўсё. А ў нас... і ноччу часом по одной возім. Не сядзець жа. А ў нядзелю толькі вазі, толькі вазі. Мóро...

Па пяць капеек. Іх шэсць чала-

век. Калі нават лічыць толькі іхнюю зарплату, то перавозяць яны дзевяць тысяч машын у месяц. Трыста ў дзень. А ў святы?

І таму круглыя суткі і ўвесь час вольнай вады крэйсіруе паром, жартуе, рагоча, плача, заляцаецца і сварыцца на пароме жывое Палессе... Едуць дзеці і дарослыя, едуць вазы з сенам, едуць спявучыя вяселлі і слёзныя хаўтуры (і вецер развейвае чорныя стужкі на крыжах).

Паром гойдаецца ад машын. Едуць бабулі ў бурках, і дзяўчаты ў джынсах, і маладзёны ў куртках пад скуру і з кудлямі да спіны. Едуць вайсковыя. Малады хлопец заляцаецца да гожанькай цыганачкі. Едзе шафёр у клятчастым пінжаку, доўгі, як страла ягонага аўтакрана. І другі шафёр, з вусатым партрэтам за шклом (лёгкая фронда, дуля ў кішэні), з доўгімі бачкамі і тварам, падобным на дулю... І можна сабе ўявіць, што такое гэты паром у святы, на нейкі фэст (па мясцоваму «кермаш»), калі ён аж гудзе ад стракатых, як восы і чмялі, баб і мужыкоў, калі ён вясёлкавы ад дзяўчат і цыганоў.

Тут, на гэтым пароме, мацаеш пульс гэтай зямлі. Тут гарлае яе лужоная глотка, тут стукае яе няспыннае сэрца.

Вечар спускаецца на Струмень. Коні качаюцца ля хаткі бакеншчыка і ластаўкі чыркаюць ваду. Пастух на веласіпедзе гоніць пугай па мосціку (а пасля яны ўплаў плавяцца цераз Струмень на балонь) табун коней. Жарабятка, стоячы ў вадзе, смокча кабылу.

Сонца сядае ў жамчужную хмару, і водбліск ягоны ў вадзе таксама апалавы. Усё на дождж. І на дождж «цвеліцца» (гуляе) рыба. І ён прыходзіць уначы. Спачатку невялічкі, цёплы, шапоча з лістотаю і травою...

Уладзімір Караткевіч
З кнігі «Сцюдзёная вясна, або 1000 гадоў і 7 дзён»

ПАРОМШЧЫК

Начны паром сустрэў агнямі.
Трос напінаўся, трапятаў.
Над Прыпяццю, над паплавамі
Дождж непраглядны навісаў.

Паромшчык, стомлены і хмуры,
Глядзеў праз дождж на бераг той,
Дзе спаў даўно ягоны Тураў
Над закалыханай ракой.

Цыгарка пыхкала надзеяй,
Што хутка будзе цёплы дом.
А дождж скакаў, як звар'яцелы.
Рыпеў прастуджана паром.

Павольна бераг набліжаўся.
Брызент прамок. Так дзень пры дні.
«Даўно паромшчыкам?» — спытаўся.
Акурак сплюнуў: «Ад вайны...»

І я засмучана падумаў:
«Ці маю гэткую любоў?»
Па свеце столькі не вандрую,
Як ён між гэтых берагоў...

Я іншы раз на лёс з дакорам...
А што паромшчыку казаць?!
Нязлосна вылае надвор'е —
І будзе зноў пераплываць...

Міхась Башлакоў

Злучыліся берагі Прыпяці

6 лістапада 1985 г. адкрыты аўтамабільны рух па маставой пераправе праз Прыпяць.

З раніцы па шашы Жыткавічы — Тураў накіраваліся да Прыпяці аўтамабілі і трактары, упрыгожаныя чырвонымі флажкамі і транспарантамі са словамі «Дзякуй будаўнікам!». Яны выстройваліся ў калону ля новага моста: прыйшоў доўгачаканы час яго адкрыцця. Зусім маленькай здаецца старая паромная пераправа, якая столькі гадоў служыла людзям, побач з вялізнай аркай, якая з'яднала абодва берагі свавольнай Прыпяці. Не толькі два берагі ракі — дзве вёскі, Боркі і Чэрнічы, з'яднаў мост даўжынёй без некалькіх метраў 1 км.

Пяць гадоў назад прыйшлі сюды мастабудаўнікі. У любую пару года: зімой і летам, у мароз і дождж, рабілі сваю справу А. В. Меляшчэня і Ф. А. Акунец, машыніст экскава-

тара П. П. Харытановіч, машыніст бульдозера А. Д. Драбовіч, члены комплекснай будаўнічай брыгады на чале з В. І. Пахончыкам, зваршчык А. Р. Жукоўскі, бурыльшчык І. Н. Пяшэвіч, слесар І. К. Занкевіч і многія іншыя. Менавіта яны ператварылі ў жыццё смелы план аўтара праекта моста А. П. Паўлоўскага. Упершыню ў практыцы мостабудаўніцтва Беларусі тут прыменена шмат новых інжынерных рашэнняў. Колькі клопатаў, хваляванняў, напружанай працы калектываў усіх будаўнічых упраўленняў было за гэтыя пяць гадоў! Давялося нават саму Прыпяць пусціць па новым русле — мост будаваўся на беразе, на сухім месцы, потым перакрылі старое рэчышча.

Права адкрыць рух праз мост атрымалі Герой Сацыялістычнай Працы механізатар калгаса імя Жданава А. М. Тачыла, лепшыя трактарысты калгасаў «Чырвоны Кастрычнік» і «Савецкая Беларусь» Н. Р. Забеліч і Ц. Я. Саскевіч, а таксама калектывы-пераможцы рэспубліканскага і абласнога сацыялістычнага спаборніцтва — раённыя аб'яднанні «Сельгасхімія» і «Сельгастэхніка». Пад гукі марша калона машын рухаецца па мосце, якому цяпер служыць людзям...

Н. І. Ярэшка

Ваеннаслужачыя, якія загінулі ў Афганістане

АХРАМОВІЧ Георгій Данілавіч (н. 28.8. 1964 г.), рад. Працаваў у саўгасе «10 год БССР» Любанскага р. Служыў у паветрана-дэсантных войсках. Загінуў у час жорсткага бою каля населенага пункта Секандархейль 15.9.1983 г., калі выносіў з-пад агню параненага таварыша. Пахаваны ў в. Буда. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БАСАРАНОВІЧ Барыс Рыгоравіч (н. 11.9.1963 г.), рад. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182. Цяжка захварэў пры выкананні баявога задання, памёр 27.7.1983 г. Пахаваны ў в. Новыя Мілевічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ГОРБАТ Юрый Міхайлавіч (н. 26.6. 1965 г.), рад. Быў сакратаром камітэта камсамола Палосцевіцкай сярэдняй школы, вучыўся ў Жыліцкім саўгасе-тэхнікуме. Загінуў пры выкананні баявога задання 26.6.1984 г. Пахаваны ў в. Палосцевічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАЦУБІНСКІ Віктар Уладзіміравіч (н. 18.2.1965 г.), рад. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182. Быў цяжка паранены, памёр ад ран 26.10.1984 г. Пахаваны ў Жыткавічах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КІСЛЮК Анатоль Адамовіч (н. 20.5. 1964 г. у в. Лагвошчы), рад. Загінуў 20 ліпеня 1984 г. у час бою каля кішлака Хушкадара. Пахаваны ў в. Рудня. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КЛІМОВІЧ Віктар Іванавіч (н. 15.6. 1965 г), рад. Працаваў у калгасе «Савецкая Беларусь». У Афганістане ў час бою з душманамі загінуў камандзір роты. Віктар прыняў камандаванне на сябе, быў цяжка паранены.



Г. Д. Ахрамовіч



Б. Р. Басарановіч



Ю. М. Горбат



В. У. Кацубінскі

тара П. П. Харытановіч, машыніст бульдозера А. Д. Драбовіч, члены комплекснай будаўнічай брыгады на чале з В. І. Пахончыкам, зваршчык А. Р. Жукоўскі, бурыльшчык І. Н. Пяшэвіч, слесар І. К. Занкевіч і многія іншыя. Менавіта яны ператварылі ў жыццё смелы план аўтара праекта моста А. П. Паўлоўскага. Упершыню ў практыцы мостабудаўніцтва Беларусі тут прыменена шмат новых інжынерных рашэнняў. Колькі клопатаў, хваляванняў, напружанай працы калектываў усіх будаўнічых упраўленняў было за гэтыя пяць гадоў! Давялося нават саму Прыпяць пусціць па новым русле — мост будаваўся на беразе, на сухім месцы, потым перакрылі старое рэчышча.

Права адкрыць рух праз мост атрымалі Герой Сацыялістычнай Працы механізатар калгаса імя Жданава А. М. Тачыла, лепшыя трактарысты калгасаў «Чырвоны Кастрычнік» і «Савецкая Беларусь» Н. Р. Забеліч і Ц. Я. Саскевіч, а таксама калектывы-пераможцы рэспубліканскага і абласнога сацыялістычнага спаборніцтва — раённыя аб'яднанні «Сельгасхімія» і «Сельгастэхніка». Пад гукі марша калона машын рухаецца па мосце, якому цяпер служыць людзям...

Н. І. Ярэшка

Ваеннаслужачыя, якія загінулі ў Афганістане

АХРАМОВІЧ Георгій Данілавіч (н. 28.8. 1964 г.), рад. Працаваў у саўгасе «10 год БССР» Любанскага р. Служыў у паветрана-дэсантных войсках. Загінуў у час жорсткага бою каля населенага пункта Секандархейль 15.9.1983 г., калі выносіў з-пад агню параненага таварыша. Пахаваны ў в. Буда. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БАСАРАНОВІЧ Барыс Рыгоравіч (н. 11.9.1963 г.), рад. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182. Цяжка захварэў пры выкананні баявога задання, памёр 27.7.1983 г. Пахаваны ў в. Новыя Мілевічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ГОРБАТ Юрый Міхайлавіч (н. 26.6. 1965 г.), рад. Быў сакратаром камітэта камсамола Палосцевіцкай сярэдняй школы, вучыўся ў Жыліцкім саўгасе-тэхнікуме. Загінуў пры выкананні баявога задання 26.6.1984 г. Пахаваны ў в. Палосцевічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАЦУБІНСКІ Віктар Уладзіміравіч (н. 18.2.1965 г.), рад. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182. Быў цяжка паранены, памёр ад ран 26.10.1984 г. Пахаваны ў Жыткавічах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КІСЛЮК Анатоль Адамовіч (н. 20.5. 1964 г. у в. Лагвошчы), рад. Загінуў 20 ліпеня 1984 г. у час бою каля кішлака Хушкадара. Пахаваны ў в. Рудня. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КЛІМОВІЧ Віктар Іванавіч (н. 15.6. 1965 г), рад. Працаваў у калгасе «Савецкая Беларусь». У Афганістане ў час бою з душманамі загінуў камандзір роты. Віктар прыняў камандаванне на сябе, быў цяжка паранены.



Г. Д. Ахрамовіч



Б. Р. Басарановіч



Ю. М. Горбат



В. У. Кацубінскі



А. А. Кіслюк



В. І. Клімовіч

М. А. Клява



М. А. Матох

Памёр у шпіталі ад ран 29.1.1985 г. Пахаваны ў в. Пагост. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КЛЯВА Міхаіл Аляксандравіч (н. 11.4. 1964 г.), рад. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182. Загінуў 16.4.1983 г. Пахаваны ў в. Бялёў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

МАТОХ Міхаіл Аляксеевіч (н. 26.4. 1965 г.), сяржант. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182. Загінуў 23.4.1985 г. Пахаваны ў Жыткавічах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

МІХАЙЛОЎСКІ Канстанцін Канстанцінавіч (н. 19.4.1964 г.), рад. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182. Загінуў пры выкананні баявога задання 14.4.1983 г. Пахаваны ў в. Вялікія Сцяблевічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

САНЕЦ Сяргей Міхайлавіч (н. 16.10. 1965 г.). Вучыўся ў Пінскім гідрамеліярацыйным тэхнікуме. У Афганістане быў механікам-вадзіцелем баявой машыны пяхоты. 28.7.1985 г. пры выкананні баявога задання машына загарэлася. Памёр ад апёкаў. Пахаваны ў в. Верасніца. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

САЧЫЛОВІЧ Іван Іванавіч (н. 29.3. 1964 г.), рад. Закончыў Магілёўскае ГПТВ-33. Загінуў 5.6.1984 г. Пахаваны ў в. Мілевічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СТРАХА Юрый Сяргеевіч (н. 20.8. 1964 г.), рад. Ён быў апошнім, сёмым сынам у вялікай сям'і, выдатна вучыўся, марыў стаць лесніком. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Чырвоны бор», у Афганістане быў механікам-вадзіцелем БТР. 7.6.1984 г. машына ўзарвалася на душманскай міне. Пахаваны у в. Сяменча. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ХАНЕНЯ Мікалай Арцёмавіч (н. 29.4. 1962 г.), мал. сяржант. Закончыў Жыткавіцкае СПТВ-182, працаваў у РВА «Сельгасхімія». Узарваўся на душманскай міне 1.5.1983 г. Пахаваны ў Жыткавічах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ХАЦЯНОВІЧ Іван Канстанцінавіч (н. 12.9.1964 г.), рад. Служыў у Афганістане ў паветрана-дэсантных войсках, за мужнасць і гераізм пры выкананні баявых заданняў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Загінуў 27.6.1983 г. Пахаваны ў в. М. Сцяблевічы.

К. К. Міхайлоўскі



І. І. Сачыловіч

Ю. С. Страха

М. А. Ханеня

Пісьмы без штэмпеляў

...Няшмат лістоў напісаў амаль за два гады Сяргей Санец сваім бацькам у пасёлак Дружба. І таму, што не меў магчымасці, і таму, што не мог шчыра напісаць нічога з Афганістана. Кожны свой ліст пачынаў так: «Добры дзень, дарагая мамачка, мае родныя!»... Яны рана пасталелі і памужнелі, хлопцы-«афганцы», навучыліся на чужбіне глыбока і пяшчотна любіць бацькоў і родных... Нехта з аднагодкаў Сяргея напісаў дадому, што Санец служыць нібыта ў Афганістане. Матчына сэрца закалацілася, і яна ў чарговым пісьме запыталася, ці праўда гэта. Сын адказаў: «Нас сапраўды збіраліся адправіць за граніцу. Але, на ваша шчасце, а на маё засмучэнне, потым загад адмянілі». Не, такую ману інакш не назавеш, як святою! Ён выконваў свой інтэрнацыянальны салдацкі доўг, і не меншы доўг перад маці...

З першага дня службы Сяргей Санец імкнуўся як мага больш дасканала авалодаць ратнай справай, пазнаць сакрэты воінскай прафесіі. Аб гэтым сведчаць падзячныя лісты камандавання часці на адрас бацькоў: «На тактычных занятках Сяргей Санец паказаў сапраўднае майстэрства, свядомую дысцыпліну, уменне стойка пераносіць цяжкасці і няўзгоды службы. За выдатныя дзеянні на вучэннях яму аб'яўлена падзяка. Выказваю ўпэўненасць, што і ў далейшым Сяргей Санец будзе самаддана выконваць свой доўг перад Савецкай Радзімай».

Якім ён быў да таго, як стаў у салдацкі строй, узяў у рукі зброю, сеў за рычагі баявой машыны?

Са школьнай характарыстыкі Сяргея Санца за сярэднюю школу: «Паводзіць сябе спакойна, стрымана, парушэнняў дысцыпліны не мае. З даручанымі абавязкамі спраўляецца добра...»

С. М. Санец



І. К. Хацяновіч

— Я па прафесіі механізатар,— расказвае бацька героя Міхаіл Паўлавіч Санец.— Сяргей таксама змалку цікавіўся тэхнікай. Гэта і прывяло яго ў Пінскі гідрамеліярацыйны тэхнікум. Свайму прызванню не здраджваў. У вучэбным вайсковым падраздзяленні была магчымасць стаць малодшым камандзірам. Аднак ён захацеў вывучыцца на механіка-вадзіцеля баявой машыны... Любіў птушак. Аднойчы на паляванні я параніў каршуна. Крылы ў яго — больш метра ў шырыню. Сяргей аднёс птушку да фельчара. Карміў, пакуль не вылечыў... Аднойчы знайшоў мёртвага голуба і ўсё пытаўся: «Чаму ён не жывы? У яго ж адкрытыя вочы!»...

Крыху пазней захапіўся музыкай. Запісаўся ў музычную школу. Купілі яму баян. Выбіраў яго ў Тураве Сяргееў настаўнік. Цяпер на ім іграе меншая дачка Марына...

Марыя Паўлаўна, маці Сяргея, успамінае:

— Сяргей у нас быў самым паслухмяным. Вельмі любіў сястрычку. Вучыцца ў Пінск паехаў разам з трыма аднакласнікамі. Некаторы час служыў у Афганістане з аднакурснікам па тэхнікуму Сяргеем Прусам. Той двойчы прыязджаў потым да нас з Андрэем Мельнікавым, сынам старшыні калгаса «Перамога», з якім Сяргей вучыўся ў школе

і ў тэхнікуме. У Афганістане дружыў з Сяргеем Нізоўскім з Тамбова. Яны былі ў адным экіпажы. Пасля пахавання я пісала Сяргею, прасіла, каб ён расказаў, як загінуў наш Сяржа. Што ведаў, напісаў. Але вельмі прасіў, каб нічога не паведамлялі яго маці аб ім самім, бо быў у яе адзіным сынам.

З пахавальнага ліста: «Ваш сын Сяргей, верны ваеннай прысязе, 28 ліпеня 1985 г. памёр ад цяжкіх апёкаў... Да канца выканаў свой доўг воіна-інтэрнацыяналіста. За час знаходжання на тэрыторыі ДРА Ваш сын паказаў сябе добрасумленным пагранічнікам, пры правядзенні баявых аперацый праяўляў стойкасць, гераізм, бясстрашнасць. За мужнасць і знаходлівасць, праяўленыя ў ходзе баявых дзеянняў па ліквідацыі бандфарміраванняў на тэрыторыі ДРА, неаднаразова заахвочваўся камандаваннем пагранічнага атрада».

З апошняга ліста Сяргея Санца дадому: «Дарагая мамачка! Высылаю вам пасылку. Пра сябе пісаць няма чаго. Праз тры хвіліны ад'язджаем. Пасля вяртання напішу... Цалую ўсіх вас. Да пабачэння...»

— Ён больш не напісаў, і так і не пабачыўся з намі... Дзіўна, усе яго апошнія пісьмы былі як бы ніадкуль — без штэмпеляў...

Пакідаючы дом Санцоў, я міжволі думаў: «Няхай ніколі не здарыцца больш так, каб маці атрымлівалі пісьмы ад сыноў ніадкуль, без штэмпеляў. Няхай салдацкія пісьмы прыносяць ім толькі радасць і заспакаенне...».

А. М. Лісіцкі

Абпаленыя вайной

У дружнай сям'і Шырчанкаў — пяцёра дзяцей. Мікалай з дзяцінства быў да ўсяго цікаўным, а больш за ўсё любіў хадзіць з бацькам на чыгунку, дзе той працаваў абходчыкам. Імклівы бег цягнікоў, грукат колаў... Гудзела зямля, напаўнялася ляскатам наваколле, калі спяшаліся ў нязведаную далячынь цеплавозы з вагонамі. Хлопцу хацелася пабачыць далёкі свет, куды працягнуліся рэйкі...

Хутка праляцелі школьныя гады ў Браніслаўскай васьмігодцы. Акрэсліўся выбар прафесіі. Мікалай паступіў вучыцца ў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум. У 1983 г. атрымаў дыплом тэхніка-тэхнолага і накіраванне на Магілёўскі аўтамабільны завод імя С. М. Кірава. А калі наступіў час, быў прызваны на ваенную службу ў паветрана-дэсантныя войскі. Праз некалькі месяцаў ваеннай падрыхтоўкі ў адной з паўднёвых рэспублік ён папоўніў рады воінаў-інтэрнацыяналістаў у Афганістане.

...Прыбылі на месца ноччу. Навокал — страляніна.

— Было крыху страшнавата і крыўдна,— успамінае Мікалай.— Не ад таго, што страляюць, а ад немагчымасці дапамагчы тым, хто недзе недалёка ў небяспецы. Неўзабаве бой скончыўся, усё заціхла...

Пачалася служба. Не было калі сумаваць аб родных мясцінах, патрэбна было абжываць новыя. Нарабілі цэглы, пабудавалі дамы. Дапамагалі мясцовым жыхарам — і школу будаваць, і ўраджай збіраць. Аднойчы ў гутарцы з сялянамі Мікалай запытаўся ў афганца, як той адносіцца да народнай улады. «Доб-

М. В. Шырчанка

рая ўлада,— адказаў той.— Раней вады не было — зямля не радзіла. Прыйшла народная ўлада — дапамагла палі арасіць, школу пабудаваць, машыны купіць»...

Да канца службы заставалася менш двух тыдняў. Часцей успамінаўся родны дом, марылася аб хуткай сустрэчы з роднымі. І раптам — начная трывога! Пастаўлена задача — перакрыць шлях душманскаму каравану. Сапёры ішлі наперадзе. Мікалай вырашыў крыху збочыць да арыка, пераканацца, ці не хаваецца там варожая засада. Два крокі — і ўзрыў... Мікалая ў беспрытомнасці вынеслі таварышы, аказалі першую дапамогу і неадкладна адправілі ў кабульскі шпіталь. Потым ён быў дастаўлены на лячэнне ў Ленінград.

Майстэрства ваенных урачоў, клопаты медперсаналу дапамаглі яму выстаяць у барацьбе за жыццё. Мучыўся ўжо не ад болю, а ад усведамлення таго, што жыць далей давядзецца без нагі... Упарта вучыўся хадзіць на пратэзе. Паўгода бальнічнага жыцця, і ўсё самае горшае засталося ззаду...

Радзіма высока ацаніла подзвіг беларускага юнака, узнагародзіўшы яго ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Ёсць сям'я, падрастаюць дзеці. Атрымаў кватэру ў новым мікрараёне Жыткавіч Азёрным. Быў дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў.

А сэрца — баліць... Ад успамінаў аб перажытым, аб загінуўшых сябрах. Часта сустракае свайго стрыечнага брата Сашу. Ім ёсць аб чым пагаварыць, ёсць што ўспомніць.

...Мікалай Шырчанка заканчваў службу, яшчэ наперадзе быў яго подзвіг і яго трагедыя, калі малодшы брат Аляксандр прызываўся ў Савецкую Армію. Ён таксама быў накіраваны ў Афганістан.

— Быў вадзіцелем бронетранспарцёра,— успамінае Аляксандр.— Аднойчы ў самым небяспечным месцы ў гарах спынілася машына, якая ішла ззаду, заглух рухавік. Закон вайны — загінь, а таварыша выручы. Мы кінуліся да сяброў, каб дапамагчы ім выбрацца, і ў гэтае імгненне пачуўся аглушальны выбух міны...

Аляксандр Шырчанка, як і Мікалай, застаўся пасля вайны інвалідам, амаль поўнасцю страціў зрок. Як і старэйшы брат, ён таксама ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Унукі аказаліся дастойнымі свайго дзеда — заслужанага чыгуначніка ў перадваенны час, аднаго з першых у раёне кавалераў ордэна Леніна, якога ён быў удастоены за працоўныя дасягненні, мужнасць пры ахове дзяржаўнай граніцы ў 1939 г.

В. Р. Феранц

Ваеннаслужачыя, якія загінулі ў мірны час

ВЕРАСНІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВАШКОЎ Аляксандр Мікалаевіч, н. 29.1. 1967 г. у в. Верасніца, загінуў у ліпені 1986 г. у г. Краснаярск.

САНЕЦ Аляксандр Васільевіч, н. 7.2. 1971 г. у в. Вароніна, загінуў у снежні 1990 г. у Венгрыі.

СТРАХ Мікалай Пятровіч, н. у 1958 г. у в. Вароніна, загінуў у студзені 1977 г. у г. Масква.

ДЗЯКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ІВІНСКІ Іван Станіслававіч, н. у 1927 г., загінуў у ліпені 1952 г. Пахаваны на ст. Іўская Новасібірскай вобл.

ЧЭРКАС Уладзімір Мікалаевіч, н. 4 чэрвеня 1950 г., загінуў 14.9.1970 г. у Егіпце.

ЛЕНІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ЛУНЦЭВІЧ Віктар Адамавіч, н. у 1966 г. у в. Малыя Сцяблевічы, рад., загінуў 1.2.1987 г.

МАЦЮК Сяргей Фёдаравіч, н. у 1958 г. у в. Сукачы, рад., загінуў 3.10.1977 г.

МАЗУЛЕНЯ Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1971 г., у в. Грычынавічы, рад., загінуў 11.8.1992 г.

ПРАКАПОВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч,

Магілы воіна-інтэрнацыяналіста А. Ф. Прышчыка, які загінуў у Егіпце

н. у 1966 г. у в. Грычынавічы, яфрэйтар, загінуў 2.6.1987 г.

СТРАЖЭВІЧ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1949 г. у в. Цімашэвічы, сяржант, загінуў у 1969 г.

МІЛЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

БАСАРАНОВІЧ Эдуард Іванавіч, н. у 1972 г. у в. Беразнякі, загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 27.6.1991 г.

ДВОРАК Вадзім Міронавіч, н. у 1969 г. у в. Мілевічы, загінуў 20.8.1989 г.

ДАРАФЕЙ Генадзь Барысавіч, н. у 1964 г. у в. Н. Залюцічы, загінуў 9.7.1983 г.

ПРЫШЧЫК Адам Фёдаравіч, н. 10.2. 1928 г., загінуў у Егіпце 3.7.1950 г.

ЯЦУНОЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1972 г. у в. Н. Залюцічы, загінуў 12.10.1991 г.

ТУРАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ДЗЕДАВЕЦ Міхаіл Максімавіч, н. у 1955 г., загінуў 8.3.1975 г.

КОКАНАЎ Рыгор Анатольевіч, н. у 1964 г., загінуў 14.7.1991 г.

РАМАНАЎ Віктар Іванавіч, н. у 1952 г., загінуў 25.5.1972 г.

ЮРКЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ЛІСОВІЧ Анатоль Канстанцінавіч, н. 14.5.1958 г., загінуў 20.2.1978 г. у Казахстане на ўборцы хлеба.

ЛІНКЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. 22.5. 1958 г., загінуў 13.5.1979 г. у Маскоўскай вобл. Падольскага р. у аўтаварыі.

ЛАЎНІКОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. 2.9. 1958 г., загінуў 20.10.1978 г. у Гродзенскай вобл. у аўтаварыі.

МЕДЗВЯДЗЮК Віктар Мікалаевіч, н. 1.11.1953 г., загінуў 24.5.1972 г. у г. Ерупінь у Германіі ў выніку ўзрыву казармы.

РАМАНОВІЧ Віктар Васільевіч, н. 25.2.1940 г., загінуў 5.4.1977 г. у аўтаварыі.

ВЁСКА МАРОХАРАВА

АГІЕВІЧ Ціхан Пятровіч, н. у 1932 г., загінуў у 1954 г. у Туркменіі. Пахаваны ў г. Небіт-Даг.

Дзень сённяшні, дзень учарашні...

Крокі ў неўміручасць

Каля сярэдняй школы № 1 у Жыткавічах, на вуліцы Сацыялістычнай, стаіць, адліты з бронзы, Міша Мароз, юнак, якому лёс накатаваў стаць сімвалам свайго часу. Часу, калі моладзь асвойвала нязведаныя прасторы, шукала сваё месца ў жыцці, нярэдка рызыкавала жыццём... Міша быў звычайным вясковым хлопцам з Бярэжцаў, што ў ваколіцах Турава. Бацькі — простыя калгаснікі, адметнага выхавання даць не маглі, але сваімі шчырымі сялянскімі сэрцамі імкнуліся да аднаго: каб дзеці былі сумленнымі людзьмі... Такім быў і Міша Мароз — паслухмяным, сціплым, добрасумленным, такім ён і застаўся ў памяці вяскоўцаў, сяброў.

Міша нарадзіўся ў 1959 г. Ву-

Магілы воіна-інтэрнацыяналіста А. Ф. Прышчыка, які загінуў у Егіпце

н. у 1966 г. у в. Грычынавічы, яфрэйтар, загінуў 2.6.1987 г.

СТРАЖЭВІЧ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1949 г. у в. Цімашэвічы, сяржант, загінуў у 1969 г.

МІЛЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

БАСАРАНОВІЧ Эдуард Іванавіч, н. у 1972 г. у в. Беразнякі, загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 27.6.1991 г.

ДВОРАК Вадзім Міронавіч, н. у 1969 г. у в. Мілевічы, загінуў 20.8.1989 г.

ДАРАФЕЙ Генадзь Барысавіч, н. у 1964 г. у в. Н. Залюцічы, загінуў 9.7.1983 г.

ПРЫШЧЫК Адам Фёдаравіч, н. 10.2. 1928 г., загінуў у Егіпце 3.7.1950 г.

ЯЦУНОЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1972 г. у в. Н. Залюцічы, загінуў 12.10.1991 г.

ТУРАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ДЗЕДАВЕЦ Міхаіл Максімавіч, н. у 1955 г., загінуў 8.3.1975 г.

КОКАНАЎ Рыгор Анатольевіч, н. у 1964 г., загінуў 14.7.1991 г.

РАМАНАЎ Віктар Іванавіч, н. у 1952 г., загінуў 25.5.1972 г.

ЮРКЕВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ЛІСОВІЧ Анатоль Канстанцінавіч, н. 14.5.1958 г., загінуў 20.2.1978 г. у Казахстане на ўборцы хлеба.

ЛІНКЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. 22.5. 1958 г., загінуў 13.5.1979 г. у Маскоўскай вобл. Падольскага р. у аўтаварыі.

ЛАЎНІКОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. 2.9. 1958 г., загінуў 20.10.1978 г. у Гродзенскай вобл. у аўтаварыі.

МЕДЗВЯДЗЮК Віктар Мікалаевіч, н. 1.11.1953 г., загінуў 24.5.1972 г. у г. Ерупінь у Германіі ў выніку ўзрыву казармы.

РАМАНОВІЧ Віктар Васільевіч, н. 25.2.1940 г., загінуў 5.4.1977 г. у аўтаварыі.

ВЁСКА МАРОХАРАВА

АГІЕВІЧ Ціхан Пятровіч, н. у 1932 г., загінуў у 1954 г. у Туркменіі. Пахаваны ў г. Небіт-Даг.

Дзень сённяшні, дзень учарашні...

Крокі ў неўміручасць

Каля сярэдняй школы № 1 у Жыткавічах, на вуліцы Сацыялістычнай, стаіць, адліты з бронзы, Міша Мароз, юнак, якому лёс накатаваў стаць сімвалам свайго часу. Часу, калі моладзь асвойвала нязведаныя прасторы, шукала сваё месца ў жыцці, нярэдка рызыкавала жыццём... Міша быў звычайным вясковым хлопцам з Бярэжцаў, што ў ваколіцах Турава. Бацькі — простыя калгаснікі, адметнага выхавання даць не маглі, але сваімі шчырымі сялянскімі сэрцамі імкнуліся да аднаго: каб дзеці былі сумленнымі людзьмі... Такім быў і Міша Мароз — паслухмяным, сціплым, добрасумленным, такім ён і застаўся ў памяці вяскоўцаў, сяброў.

Міша нарадзіўся ў 1959 г. Ву-

чыўся ў пачатковай школе ў Бярэжцах, потым у Хільчыцкай сярэдняй школе. Як сведчаць настаўнікі, нічым асабліва не вызначаўся. Просты, сумленны, у меру старанны, у меру гарэзлівы хлопец, як большасць яго аднагодкаў. Паступіў вучыцца ў Аршанскае педагагічнае вучылішча. А калі настаў яго зорны час, не пахіснуўся, не здрадзіў, да канца, проста, як і жыў, мужна выканаў свой абавязак перад людзьмі, перад Радзімай...

...У верасні 1977 г., як звычайна, навучэнцы педвучылішча дапамагалі ўбіраць бульбу калгаснікам калгаса «Прагрэс» Дубровенскага раёна. Ціхі пагодлівы дзень не прадвяшчаў бяды. А яна была тут, побач, ляжала на мірным полі звыш 30 гадоў, з часу мінулай вайны... Артылерыйскі снарад паказаўся на палатне транспарцёра бульбаўборачнага камбайна, як звычайны камень. Ніхто не ведаў, што ён тоіць у сабе, мог так і выпасці з камбайна, як гэта было ўжо, напэўна, не раз, а мог у любую хвіліну ўзарвацца, пакалечыць людзей, што знаходзіліся на камбайне, знішчыць машыну. Міша ўзяў яго ў рукі спакойна і без боязі, як браў да гэтага камяні, але не выкінуў пагрозлівую, смяротную рэштку вайны на раллю, а панёс на край поля. Ужо нямнога заставалася да мяжы, але Міша не дайшоў. Праржавелы снарад узарваўся ў яго руках. Апошнія крокі Мішы Мароза на зямлі сталі крокамі яго ў неўміручасць...

У камсамольскім білеце Мішы Мароза зроблены запіс: «Вынес з поля баявы снарад, адвёў ад людзей бяду цаной уласнага жыцця». Ён загінуў, як салдат. І ўзнагароджаны пасмяротна баявым ордэнам Чырвонай Зоркі. Імя героя-камсамольца навечна занесена ў Кнігу гонару ЦК ВЛКСМ побач з Зояй Космадзям'янскай, Лізай Чайкінай, Сяргеем Цюленіным...



Міша Мароз

12 снежня 1981 г. у Жыткавічах адбылося ўрачыстае адкрыццё памятніка Мішы Марозу. Юнак, які толькі ўступае ў жыццё, у імклівым руху наперад, але наперадзе — змрочная, жалезная кветка ўзрыву... На пастаменце — дошка з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні героя ордэнам. Помнік адліты па праекту студэнтаў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Мікалая Патапава і Сяргея Бандарэнкі. Значная частка сродкаў на яго зароблена моладдзю вобласці ў час суботнікаў. Бронзавы бюст героя ўстаноўлены таксама ў Аршанскім педагагічным вучылішчы.

На месцы подзвігу Мішы Мароза ў Дубровенскім раёне насыпаны Курган, устаноўлена мемарыяльная пліта. На ёй высечаны словы: «На гэтым полі ў вераснёвы дзень 1977 г. стаў на шляху смерці 17-гадовы камсамолец Міхаіл Мароз, які аднёс ад людзей снарад, пагражаўшы бядой...»

Пахаваны Міша Мароз у роднай вёсцы Бярэжцы, на магіле ўстаноўлены абеліск.

У Жыткавіцкім раёне многія піянерскія дружыны і атрады насілі імя героя-камсамольца Мішы Мароза. Па Прыпяці ходзіць цеплаход «Міша Мароз». Подзвігу камсамольца прысвечана п'еса М. Саенкі «Спытай сябе».

В. Р. Феранц

ПАМЯЦІ МІШЫ МАРОЗА

«Міша Мароз»...
Плача зжоўклым лісцем бяроз
бульбянае поле.
Верасень слёзы ўшірае ветру ўкарэлым
прыполам.
Можа, нават тым ветрам калючым,
Што некаму рану ў вайну залізваў
балючую...
«Міша Мароз!»
Памяць, быццам наркоз, не замарозь
Гэтае імя ў наступным...
Каб думка далёкім нашчадкам зямлі
Ясней была і даступней:
Праз трыццаць гадоў
У касмічную эру
Рэха вайны залятала...
А колькі ж вякоў —
Не дай Бог! —
Да людзей
Рэха «атамнай» пранікала б?..
«Міша Мароз».
Я сёння асенняю рунню
на гэтыя словы падрос.

Яўген Хвалей

Тураўскі краязнаўчы музей

Музей у старажытным Тураве створаны ў 1927 г. стараннямі вялікага знаўцы роднага краю, аматара-гісторыка М. Е. Бруя. Звыш 40 год ён аддаў педагагічна-асветніцкай рабоце, вывучаў гісторыю Тураўшчыны, збіраў матэрыялы, дакументы, экспанаты для музея.

Музей размяшчаўся ў асобным памяшканні, меў звыш ста экспанатаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны Тураў быў амаль поўнасцю знішчаны. Памяшканне музея і ўсе яго матэрыялы згарэлі.

У 1950 г. прынята Пастанова Савета Міністраў БССР аб узнаўленні Тураўскага краязнаўчага музея. З 15 мая гэтага года музей зноў адчыніў дзверы для наведвальнікаў. У пасляваенныя гады ён быў філіялам Дзяржаўнага музея БССР і Гомельскага абласнога краязнаўчага музея. Але праз некаторы час зноў атрымаў самастойнасць.

Вялікі ўклад у аднаўленне музея ўнёс П. А. Шчакатовіч, які пасля вайны размясціў уцалелыя дакументы і экспанаты ў сваёй хаце. Ён вёў вялікую краязнаўчую і культурна-асветніцкую работу, быў дырэктарам музея.

У Тураўскім краязнаўчым музеі

Цяпер музей размешчаны ў старым адрамантаваным памяшканні. Некалькі гадоў назад нанава аформлена яго экспазіцыя. Яна складаецца з пяці аддзелаў: гістарычнае мінулае Тураўшчыны; этнаграфія і быт тураўчан; рэвалюцыя і грамадзянская вайна на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна; Вялікая Айчынная вайна на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна; пасляваенны перыяд; прырода краю.

Музейны фонд налічвае каля 12,5 тысячы адзінак. У экспазіцыі прадстаўлены цікавыя матэрыялы з археалагічных раскопак: кераміка, каменныя баявыя сякеры, вырабы з крэменю, жалезныя наканечнікі стрэл і коп'яў, упрыгажэнні і г. д. Экспануецца вялікая колькасць матэрыялаў прыкладнога мастацтва, адзення, прадметаў быту. Экспазіцыя аддзела Вялікай Айчыннай вайны прапануе сапраўдныя гістарычныя матэрыялы і ўзнагароды, граматы, фотаздымкі, пісьмы з фронту і г. д. У экспазіцыі аддзела гісторыі сучаснага перыяду паказана прамысловасць і сельская гаспадарка раёна, лепшыя людзі працы.

Сённяшні Тураў нельга ўявіць без яго багатага гістарычнага мінулага, якое сканцэнтравана ў краязнаўчым музеі.

В. Р. Марынкіна

Партызанскімі сцежкамі

У 1985 г. у Чырвоненскай сярэдняй школе была створана група «Пошук», а затым — музей «Партызанская слава». Першапачаткова школьнікі ставілі мэтай збор матэрыялаў аб славутым злучэнні двойчы Героя Савецкага Саюза С. А. Каўпака, якое ў лютым 1943 г. трымала аэрадром на в. Чырвоным і пакінула аб сабе вялікую і добрую памяць. Потым інтарэсы юных следапытаў значна расшырыліся, яны пачалі даследаваць партызанскі рух наогул у Жыткавіцкім раёне.

Першы вялікі і канкрэтны матэрыял для пошукавай работы дала былая партызанская разведчыца А. К. Дзямідчык. Яна расказала аб сваім баявым мінулым, паведаміла адрасы баявых таварышаў. А праз год, у маі 1987 г., школьнікі прымалі ўдзел у святкаванні 100-годдзя С. А. Каўпака на яго радзіме у г. Кацельва Палтаўскай вобласці. Новыя знаёмствы, сябры і новыя напрамкі пошукавай работы. Пачаўся абмен думкамі і матэрыяламі з такімі ж групамі на Украіне.

Юныя следапыты адшукалі некалькі першапачатковых пахаванняў партызан і ўстанавілі там знакі, удакладнілі іх перапахаванне, знайшлі родных загінуўшых партызан М. А. Падгорнага і Ганны Галабародзька. Па ініцыятыве следапытаў была ўстаноўлена мемарыяльная дошка на доме ў Ляхавічах, дзе размяшчаўся штаб С. А. Каўпака, узноўлена пліта на брацкай магіле ў Пухавічах.

У музеі «Партызанская слава» адкрыта 17 экспазіцый. На стэндзе «Іх імёны бессмяротны» — прозвішчы загінуўшых землякоў. У асобных папках, якіх каля 100, успаміны партызан-каўпакаўцаў і ветэранаў мінулай вайны, матэрыялы пошукавай работы. Шмат фотадакументаў, экспанатаў — зброя партызан, салдацкі трохвугольнік — пісьмо, чырвоная лента шапкі партызана-каўпакаўца, хлебная картка. Мадэль самалёта, які прызямляўся на лёд Чырвонага возера, медалі, сувеніры, кнігі... А вось лістоўка нямецкага камандавання з абяцаннем 10 тысяч марак, каровы і 10 дзесяцін зямлі за выдачу Каўпака. Верш партызанскага паэта А. Зарніцкага:

Ішоў Каўпак з-пад Бранска,
Паўз Гомель і на Тураў,

Сустрэча партызан-каўпакаўцаў на возеры Чырвоным. У цэнтры — С. А. Каўпак. 1964 г.

Над Чырвоным возерам зрабіў перакур.
Багата нашых хлопцаў, земляробаў, смалакураў.
Падаліся ў Войска к дзеду Каўпаку...

Звыш 130 партызан-каўпакаўцаў прыехалі ў Чырвонае ў маі 1989 г. на сустрэчу, якая была арганізавана следапытамі. Іх сустракалі, як родных... У 1991 г. прымалі ўдзел у адкрыцці мемарыяла ў Пухавічах у гонар загінуўшых партызан-каўпакаўцаў. На абласным конкурсе група «Пошук» Чырвоненскай сярэдняй школы заняла другое месца. У апошнія гады следапыты больш увагі надзяляюць гісторыі партызанскага руху ва ўсім краі.

А. А. Шэўчык

Музей у Леніне

У 1946 г. у Ленінскі раён прыехаў працаваць настаўнікам удзельнік Вялікай Айчыннай вайны У. У. Баярын. Багатая гісторыя в. Ленін і яе наваколляў, ціхая маляўнічая Случ, а галоўнае — цудоўныя, шчырыя палескія людзі — усё гэта спадабалася маладому настаўніку, стала для яго родным. Па спецыяльнасці географ, які ўвесь час выкладаў гэты прадмет, ён стаў, па сутнасці, гісторыкам — менавіта гэтага кутка Палесся. У. У. Баярын арганізаваў у Ленінскай сярэдняй школе гістарычны гурток, на працягу дзесяцігоддзяў разам з вучнямі збіраў краязнаўчы і гістарычны матэрыял, які склаў аснову будучага народнага музея. Ён быў адкрыты ў 1978 г. Вучнёўскі і гістарычны гурток пры музеі стаў сапраўднай школай патрыятызму, выхавання дзяцей на багатым гераічным мінулым Радзімы.

Вялікую ўвагу члены гуртка надзяляюць у сваёй рабоце ленінскай тэме — жыхары в. Ленін лічаць сябе ў духоўным сваяцтве з арганізатарам Кастрычніцкай рэвалюцыі У. Ульянавым, які дзіўным чынам узяў сабе псеўданім такі, як і назва вёскі. Іх намаганнямі замест бытаваўшага наймення пасёлка, а потым вёскі Леніна была вернута правільная назва — Ленін. Адзін з дакумен-

тау музея — даведка з Цэнтральнага НДІ геадэзіі і картаграфіі, у якой цвярджаецца, што «упершыню на рускіх картах абазначана мястэчка Ленін на карце Мінскай губерні ў атласе Расіі, выдадзеным у 1800 г.».

На стэндах музея звыш пяці тысяч экспанатаў, кніг, дакументаў, прысвечаных гісторыі вёскі і былога Ленінскага раёна, вызваленчаму руху, барацьбе ленінцаў за свае правы ў гады шматлікіх рэвалюцый і войнаў, польскага рэжыму, партызанскай барацьбы ў час мінулай вайны. Гурткоўцы падтрымліваюць перапіску з больш чым 200 карэспандэнтамі — у Беларусі, краінах СНД, а таксама ў ЗША, Ізраілі і ў іншых дзяржавах. У. У. Баярын у 1992 г. быў запрошаны ў Ізраіль, дзе існуе шматлікая і актыўная Ленінская абшчына — выхадцаў з былога мястэчка, узнагароджаны медалём «Йад ва-Шэм» за вялікую работу па вывучэнні гісторыі краю.

У Леніне закончана будаўніцтва спецыяльнага будынка для дакументаў і экспанатаў Ленінскага народнага музея.

*В. В. Ніканові*ч

Свята са слязамі на вачах...

...Прыйшла яшчэ адна мірная вясна. Рэспубліка ўрачыста святкавала 45-годдзе вызвалення Беларусі. Свята прыйшло і на бераг возера Чырвонае, дзе ў гады мінулай вайны ішлі баі, у ваколіцах вёсак Ляхавічы, Пухавічы, Сяменча са студзеня 1943 г. знаходзілася грознае партызанскае войска легендарнага С. А. Каўпака, на лёдзе возера дзейнічаў партызанскі аэрадром, які прымаў самалёты з Вялікай зямлі. Многія ветэраны памятаюць той суровы час, сярод іх — былыя партызаны А. М. Купрацэвіч, М. І. Савіч, А. У. Галавач.

У юбілейны год па ініцыятыве Савета ветэранаў партызанскага злучэння двойчы Героя Савецкага Саюза С. А. Каўпака на возеры Чырвоным адбылася сустрэча партызанкаўпакаўцаў. Яны прыехалі з Масквы і Тамбова, Свярдлоўска і Львова, Чэлябінска і Харкава — звыш 120 чалавек.

Пасёлак Чырвонае па-святочнаму ўпрыгожаны, на вясеннім ветры калышуцца сцягі. На ўрачыстым вечары выступілі старшыня Савета раённай арганізацыі ветэранаў вайны і працы Д. Я. Гонікман, актыўныя ўдзельнікі партызанскага руху У. М. Дзербан, Ф. І. Ефімовіч, У. Ф. Круковіч, М. І. Савіч, А. У. Галавач, Ф. М. Цімашчэня і іншыя, былыя воіны-інтэрнацыяналісты, прадстаўнікі партыйных, савецкіх, грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў, школ Марохараўскага сельскага Савета.

Адкрыў урачысты вечар сакратар ветэранаў злучэння Р. М. Кароўчанка. Уважліва слухалі ўдзельнікі ўрачыстасці пра ратны подзвіг праслаўленых каўпакаўцаў. Калі вогненны вал вайны стаў набліжацца да Пуціўля, 8 верасня 1941 г. у Спадшчанскі лес пад Пуціўлем накіравалася першая група патрыётаў. Прывёў групу партызан грамадзянскай вайны А. І. Карнееў. Праз два дні, калі фашысты ўварваліся ў ваколіцы Пуціўля, да партызан далучыўся іх камандзір — старшыня Пуціўльскага гарсавета С. А. Каўпак. Разам з ім была група беларусаў і дваццаць восем трапіўшых у акружэнне байцоў і камандзіраў 6-й паветрана-дэсантнай дывізіі. 23 верасня прыйшла ў Спадшчанскі лес і далучылася да С. А. Каўпака партызанская група С. Ф. Кірыленкі, а 18 кастрычніка ў сям'ю каўпакаўцаў уліліся байцы атрада, якім камандаваў кадравы ваенны, старшыня Пуціўльскага савета Асаавіяхім С. В. Руднеў. Так нарадзіўся аб'яднаны партызанскі атрад, камандзі-

9 мая 1990 г. Ветэраны вайны — былыя воіны і партызаны: А. А. Саўчук, У. М. Дзербан, А. М. Купрацэвіч, Ф. І. Ефімовіч, Ф. П. Дамашкевіч, М. П. Кароткі, У. А. Крэпскі

рам якога стаў С. А. Каўпак, камісарам — С. В. Руднеў, начальнікам штаба — былы дырэктар Пуціўльскай сярэдняй школы Г. А. Базыма.

Пасля ўдала праведзеных баявых аперацый восенню 1941 г. у раёне Пуціўля партызанскае злучэнне ўзяло курс на рэйдавую вайну. Яно правяло рэйды ад Пуціўля да Карпат, на зямлю Польшчы і да граніцы Усходняй Прусіі і ператварылася ў вялікую арганізаваную, добра ўзброеную сілу. У злучэнні было пяць партызанскіх атрадаў, у саставе якіх налічвалася каля тысячы байцоў, меўшых на ўзбраенні нават артылерыю і мінамёты. Тут змагаліся прадстаўнікі сарака дзвюх нацыянальнасцей нашай краіны. Партарганізацыя, якую ўзначальвалі камісар С. В. Руднеў і сакратар партбюро Я. Г. Панін, згуртавала людзей у адзіны баявы атрад. Інтэрнацыянальным па саставу было і камандаванне злучэння: камандзір С. А. Каўпак і начальнік штаба Г. А. Базыма — украінцы, камісар С. В. Руднеў — рускі, памочнік начальніка штаба Н. М. Курс — беларус.

На плошчы ля Дома культуры пасёлка Чырвонае адбыўся мітынг, прысвечаны сустрэчы з гасцямі, былымі каўпакаўцамі. Адкрыў яго дырэктар торфабрыкетнага завода М. У. Малочка. Гасцей вітала настаўніца Чырвоненскай сярэдняй школы Н. І. Іванова. Шчырыя словы ўдзячнасці за тое, што людзі не забылі тых суровых гадоў, клапоцяцца пра памяць загінуўшых, выказаў былы камісар батальёна злучэння А. Б. Няпомняшчы. Свае ўражанні аб гасціннасці палешукоў выказаў на мітынгу былы мінамётчык-каўпакавец Я. А. Мельнічэнка.

«Ой, бярозы ды сосны, парты-

занскія сёстры, вас ніколі ў жыцці не забыць...» Гэтымі словамі вядомай беларускай песні пачаў сваё выступленне на мітынгу былы партызан А. У. Галавач.

Вучаніца 8 класа Чырвоненскай сярэдняй школы, член групы «Пошук» Юля Шэўчык, павітаўшы гасцей-каўпакаўцаў, расказала аб пошукавай рабоце, якую вядуць вучні школы па ўвекавечанні памяці аб партызанскім руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Госці наведалі музей Чырвоненскай школы і выстаўку народнай творчасці, цэнтральную сядзібу саўгаса «Чырвоны Бор». Затым былыя воіны-партызаны сустрэліся з вучнямі Чырванаборскай школы. Аб значэнні партызанскага руху для перамогі над фашызмам, аб пастаноўцы выхаваўчай работы ў школе расказала гасцям дырэктар школы Н. Ф. Князева. Паміж ветэранамі вайны і піянерамі завязалася шчырая размова. Гэта быў сапраўдны ўрок міру, урок мужнасці...

Затым была хвалюючая сустрэча з Чырвоным возерам, блакітная прастора якога добра памятная ветэранам. Пакланіліся брацкай магіле, дзе пахаваны загінуўшыя зімой 1943 г. партызаны-каўпакаўцы М. А. Макарын, І. В. Малчанаў, У. М. Рыжкоў, С. І. Аляксееў, В. І. Арбузаў, М. Л. Падгорны, М. І. Ліфанаў, І. В. Каршуноў, А. Р. Галабародзька, А. А. Бывалін, Р. І. Кадораў. Адбыўся мітынг. На ім сярод іншых выступілі камісар 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгады У. М. Дзербан, воін-каўпакавец А. М. Купрацэвіч, былы партызанскі кулямётчык Р. Л. Плакса. Ля магілы схілілі галовы жонка і сястра камандзіра аднаго з каўпакаўскіх падраздзяленняў М. Л. Падгорнага, які пахаваны тут.

Удзельнікі мітынгу ўсклалі на магілу кветкі, ушанавалі загінуўшых партызан мінутай маўчання.

У вёсцы Ляхавічы ў доме Марыі Пахомаўны Цімашчэні з 3 студзеня па 2 лютага 1943 г. жылі С. А. Каўпак і С. В. Руднеў. Тут устаноўлена мемарыяльная дошка. Гаспадыня дома, 1899 г. нараджэння, моцна трымае ў сваёй памяці падзеі той суровай зімы. З хваляваннем і ўдзячнасцю наведалі патрыётку каўпакаўцы.

І. Ф. Карповіч

ПАМЯТНИК КИРИЛЛУ: 1913—1993 гг.

Журнал Совещания 30 августа 1913 г.

по обсуждению вопросов сооружения в местечке Туров храма-памятника в честь св. Кирилла, епископа Туровского и о возбуждении ходатайства о разрешении перенесения мощей Преподобного Лаврентия Туровского из города Киева в Туровский храм-памятник

Присутствовали:

Председатель совещания, епископ Минский и Туровский *Преосвященный Митрофан*
Председатель комитета, Предводитель Дворянства *А. А. Перрен*
Товарищ председателя священник *Александр Гузаревич*...

Слушали:

По открытии заседания Преосвященный Владыка предложил совещанию обсудить возбужденные Мозырским уездным Предводителем Дворянства А. А. Перреном вопросы об увековечении памяти св. Кирилла, епископа Туровского, сооружением храма-памятника на месте его святительского служения в местечко Туров и об изыскании средств на сооружение этого храма, а также о перенесении мощей Преподобного Лаврентия Туровского в этот храм.

Постановили:

1) Образованный 29 июня сего года в местечке Турове, на открытии памятника царю-освободителю, комитет для постройки храма-памятника в честь св. Кирилла оставить в том же составе...

2) Просить преосвященного владыку и г. начальника губернии камергера Высочайшего двора Алексея Федоровича Гирса принять звание Почетных членов комитета.

3) Воздвигнуть названный храм стоимостью 60 000 руб., причем 20 000 руб. отнести на местные средства, которые предполагается собрать путем сбора пожертвований в церквах и посредством подписных листов, после чего об ассигновании остальной недостающей суммы просить Синод.

...6) Изготовить проект постройки храма-памятника Его Преосвященство выразил согласие поручить епархиальному архитектору, причем образец храма-памятника должен соответствовать той эпохе, во время которой жил св. Кирилл.

7) С ходатайством о перенесении мощей Преподобного Лаврентия Туровского из города Киев в Туровский храм-памятник воздержаться до личных переговоров по этому вопросу с Митрополитом Киевским, каковые переговоры просить Его Превосходительство г. Минского губернатора не отказать принять на себя во время предстоящего посещения камергером А. Ф. Гирсом города Киева.

ЕГО ПРЕВОСХОДИТЕЛЬСТВУ А. Ф. ГИРСУ, МИНСКОМУ ГУБЕРНАТОРУ

Ваше Превосходительство, милостивый государь Алексей Федорович

Имею честь доложить Вашему Превосходительству, что при сем представлении моем г. Министру Внутренних Дел 8 сего марта Его Превосходительство изволил выразить согласие на принятие звания Почетного члена Комитета по сооружению в м. Туров храма-памятника в честь св. Кирилла, Епископа Туровского.

О чем я имею получить дополнительно официальное сообщение от Управляющего Двором Его Императорского Высочества егермейстера Шателена, по получению какового я буду просить Ваше Превосходительство исходатайствовать через г. Министра Внутренних Дел высочайшее утверждение Великого Князя в звание покровителя Туровского Комитета...

Ваш покорнейший слуга *А. Перрен*
марта 30 дня 1914 г.

КОНТОРА ДВОРА ЕГО ИМПЕРАТОРСКОГО ВЫСОЧЕСТВА ВЕЛИКОГО КНЯЗЯ АЛЕКСАНДРА МИХАЙЛОВИЧА

16 июня 1914 г.

Господину Мозырскому уездному Предводителю дворянства

По приказанию Великого Князя Александра Михайловича Контора Двора на отношение Ваше от 30 апреля с/г за № 239 имеет честь уведомить, что на принятие под Августейшее покровительство Комитета по сооружению в м. Турове Мозырского уезда храма-памятника в честь св. Кирилла, Епископа Туровского, согласие его Императорского Высочества последовало...

Управляющий конторой *Н. Веселаго*

МИНИСТЕРСТВО ВНУТРЕННИХ ДЕЛ ДЕПАРТАМЕНТ ДУХОВНЫХ ДЕЛ

губернатору

14 мая 1914 г.

Государю Императору на всеподданнейшем докладе г. Министра Внутренних Дел о проектируемой в м. Турове Мозырского уезда постройке православного храма во имя святителей Кирилла и Лаврентия во 2-й день сего мая благоугодно было начертать: «Желаю полного успеха благому делу».

О таковой высочайшей отметке считаю долгом сообщить Вашему Превосходительству.

За Министра Внутренних Дел
товарищ Министра

Его Превосходительству А. Ф. Гирсу, Минскому Губернатору

Озабочиваясь скорейшим началом разрешенного Вами в пределах Минской губернии сбора добровольных пожертвований на сооружение в м. Турове храма-памятника, ...мною ныне выработаны бланки воззвания о пожертвованиях и подписного листа. К сбору я предполагаю приступить в самом близком будущем, как только будут изготовлены в нужном количестве упомянутые бланки и листы. Между тем я затрудняюсь поручить изготовление таковых в г. Мозыре, где все типографии еврейские. Посему, представляя при сем означенные бланки, почтительнейше прошу Ваше Превосходительство, не признаете ли вы возможным изготовить этот заказ в губернской типографии, по возможности в самый короткий срок и на льготных условиях...

Ваш покорнейший слуга *А. Перрен*
Минский губернский статистический комитет

В Канцелярию Минского Губернатора

июля 21 дня 1915 г.

...По подписному листу за № 18 Комитета по сбору пожертвований на сооружение в м. Турове храма-памятника в честь св. Кирилла Туровского, присланного ... 25 марта 1915 г., поступило пожертвований один рубль.
...Деньги отправлены по назначению.

Канцелярия Минского Губернатора

С возвращением сего Минская Губернская чертежная уведомляет... что сбора по подписному листу за №№ 10 и 11 на постройку храма в м. Турове... по причине текущего характера не производилось.

И. о. начальника
27 января 1916 г.
ф. 295, оп. 1, д. 8259

«Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси...»

З прамовы Прэасвяшчэннага Пятра, епіскапа Тураўскага і Мазырскага на святкаванні 1000-годдзя праваслаўя на Беларусі 25 верасня 1992 г.

У XII — п. XIII ст. у Тураве ўзнікла адна з першых на Русі епіскапій, будаваліся храмы і засноўваліся манастыры праваслаўнай царквы, якія адыгралі станоўчую ролю ў распаўсюджванні культуры. У пераліку імёнаў славутых дзеячоў і падзвіжнікаў Беларускай Праваслаўнай Царквы пачэснае месца займае імя тураўскага іерарха Кірылы — прапаведніка і багаслова, аскета-стоўпніка, вялікага знаўцы Святога Пісання. Яго высакародная праца ў распаўсюджванні Божага Слова зрабіла яго імя дарагім кожнаму сумленнаму хрысціяніну-беларусу.

Вельмі мала захавалася звестак аб жыцці найсвячонага Кірылы, невядомы нават дакладны час яго нараджэння, свецкае імя. «Кирилл рожден и воспитан града Турова в русской стране, ... богату родителю сын». Магчыма, пасля смерці бацькоў юнак вырашыў цалкам аддаць сябе службе Богу: ён праходзіць іспыты і апранае манаскія рызы, прыняўшы пострыг і імя Кірыл у адным з тураўскіх манастыроў. Вядома цвёрдасць, нават апантанасць яго ў веры. Хутка Кірыл выказаў жаданне стаць «стоўпнікам» — замуравацца ў адной з манастырскіх вежаў. З'яўляюцца яго першыя творы. Сярод іх — «Сказание о черноризчестем чину от ветхого закона и нового» і «Поучение к печерскому игумену Василию».

Праведнае жыццё і цярпенне, аскетызм і трапяткія адносіны да Святога Слова зрабілі яго вядомым ва ўсім княстве. Калі памёр уладыка Тураўскага епіскапства, Кірыл «умолением князя и людей града того возведен был на стол епископский и митрополитом поставлен был епископом граду Турову...» Дакладна вядома, што ў 1169 г. ён быў ужо тураўскім епіскапам.

Новапастаўлены іерарх умела кіраваў епархіяй, рупіўся аб царкоўным добраўпарадкаванні, павучаў у сваіх казаннях святароў. Ён горача клапаціўся пра духоўную дасканаласць суайчыннікаў. Яго дар найбольш выявіўся ў «Словах» — казаннях, у якіх ён звычайна даваў тлумачэнне праваслаўных свят, пытанняў веры, біблейскіх тэкстаў.

Цеплыня Хрыстовай любові яшчэ нядаўна абагрэла зямлю тураўскую, яшчэ моцнымі былі пережыткі паганства. Супраць іх выступае Кірыл: праведныя хрысціяне не павінны шанаваць агонь і пакланяцца сонцу. У «Слове о книжном чтении» ён папярэджвае аб небяспецы чытання адрочаных кніг, заклікаючы чытаць кнігі святыя, рупліва наведваць царкву, дзе прамаўляе не проста чалавек, а Божы пасланец. Блажэны тураўскі іерарх заклікае народ адзначаць дні святыя «...не во пьянстве с игрищами, но идя к церкви».

Ён быў вялікім патрыётам роднага горада. У «Слове о сънятии тела Христа с креста, и о мироносицах» ён піша: «...буди покръв граду нашему от всякого зла, и заступае его от всех видимых и невидимых враг...» Хвалююць яго і надзённыя маральна-этычныя праблемы. У адказ на спробу епіскапа Феадорца раскалоць праваслаўную царкву, утварыўшы аўтакефалію, найсвяцейшы Кірыл піша рэзкую «Притчу про душу и тело».

Творы Кірылы Тураўскага ўвайшлі ў залаты фонд старажытнарускай літаратуры. Яны перапісваліся ад рукі да XIX ст., у XIV—XV стст. частка з іх была ўключана ў «Златоуст» і «Торжественник» — своеасаблівыя зборнікі-анталогіі лепшых узораў майстроў красамоўства, твораў Іаана Златавуста.

Спадчына святога тураўскага настаўніка надзвычай вялікая, канкрэтная лічба твораў да гэтага часу дакладна не вызначана. Атрымалі вядомасць яны і за мяжой. Знаўца славянскай літаратуры М. Максімаў адзначаў, што ў заходнееўрапейскіх народаў XI—XII ст. не было нічога, што пераўзыходзіла б па сваіх вартасцях «Повесть временных лет», «Словы» Кірыла Тураўскага і «Слово о полку Игореве». Даследнік С. Шамбінага, параўноўваючы «Слово о полку Игореве» са «Словом о первом вселенском соборе», набліжае чытача да здагадкі аб тым, што аўтарам «Слова о полку Игореве» мог быць найсвяцейшы епіскап Кірыл.

Невядома, калі сканаў епіскап Кірыл. Вядома толькі, што ў 1182 г. епіскапам Тураўскім стаў Лаўрэнцій. Лічыцца, што самога беларускага Златавуста ў гэты час ужо не было сярод жывых, але, хутчэй за ўсё, Кірыл пакінуў кафедру і аддаліўся ў адзін з манастыроў, верагодна, у Барысаглебскі...

Жывое слова Кірылы

У мінскім выдавецтве «Мастацкая літаратура» у 1992 г. выйшла кніга вядомага даследчыка беларускай мінуўшчыны, дасведчанага знаўцы старажытных рукапісаў і першадрукаў Юрыя Лабынцава «Напой росою благодати... Малітоўная паэзія Кірылы Тураўскага». Чытачу прапануюцца найбольш дасканалыя гімнаграфічныя паэтычныя творы — малітвы — Кірылы Тураўскага «На всю седмицу». Яны ўзнаўляюцца

паводле кнігі «Молитвы повседневные», надрукаванай у 1596 г. ў друкарні беларускага праваслаўнага брацтва ў Вільні, калі польскі кароль забараніў ужыванне ў дзяржаўным справаводстве Вялікага княства Літоўскага беларускай мовы.

Кніжка складаецца з дзвюх частак. У першую ўваходзіць тэкст аўтара на беларускай і рускай мовах, у якім ён разглядае малітоўна-паэтычную творчасць Кірылы Тураўскага.

Другая частка — фотаўзнаўленне «Молитв на всю седмицу» па іх першым выданні. Тэкст даносіць да нас жывое слова Кірылы. Мова яго царкоўнаславянская, гэта мова царкоўнай службы, мова Ефрасінні Полацкай і Францішка Скарыны. Старонкі малітваў нагадваюць аб старажытных вытоках нашай рэлігійнай свядомасці.

Аўтар разглядае малітву як пэўны славесны жанр, параўноўвае яе з літаратурай, паэзіяй, лірыкай, мастацкай творчасцю. Малітва — «гэта высокая духоўная творчасць», універсальная мова ўсіх людзей на зямлі, радасць і вера, дасканаласць і гармонія. Яна пераўтварае душу чалавека, яго жыццё, грамадства. Малітвы спрадвеку пісаліся найвялікшымі майстрамі слова, сапраўднымі творцамі. Такім быў Кірыла Тураўскі, які прысвяціў жыццё сваё малітоўнаму подзвігу ў слынным Тураве. «Дзесьці тут,— піша Ю. Лабынцаў,— карані нашай нацыянальнасці, самабытнасці, культуры. Гэта наша скарбніца, наша запаветнае багацце, тое адзінае і святое, без чаго не можа адбыцца ні асобны чалавек, ні нацыя».

Разважанні аўтара пра малітоўную творчасць Кірылы Тураўскага плённа спалучаюцца з разглядам гістарычных падзей, усведамленнем значнай іх ролі ў гістарычным развіцці. У старадаўняй Тураўскай статутнай грамаце сцвярджаецца, што ў Тураве ўзнікла адно з першых епіскапстваў у 1005 г., якому былі прыдадзены «в послушание» гарады Брэст, Пінск, Наваградак, Валкавыск, Смядынь і многія іншыя. Пачынаецца інтэнсіўнае будаўніцтва цэркваў і храмаў. Мясцовыя будаўнікі не капіравалі чужыя ўзоры, а шукалі новыя, творча фарміравалі самастойную мясцовую школу. Паводле мясцовых паданняў, у старажытным Тураве было пабудавана семдзесят пяць ці нават восемдзесят цэркваў. Побач з княскім палацам стаяў Барысаглебскі сабор, манастыр пры ім — адзін з галоўных ачагоў адукаванасці, кніжнасці, літаратуры, развіцця духоўнай культуры. Зусім невыпадкова, што менавіта ў Тураве ўжо ў XI ст. з'яўляецца пергаменнае Тураўскае евангелле.

Старажытны Тураў выдзяляўся сваім духоўным жыццём. Любілі гараджане ў святы выходзіць у горад паслухаць музыкаў, спевакоў, паглядзець паказы лялечнага тэатра. Тут нараджаліся легенды, паданні, песні, іншае фальклорнае багацце. Менавіта з гэтага падмурка бярэ свае вытокі творчая спадчына Кірылы Тураўскага. Натхняла яго не адна толькі кніжная мудрасць, падкрэслівае аўтар, «але і вунь той далёкі лес за Прыпяццю, сама рака, усё самае роднае і блізкае, што атачала яго змалку ў ціхай палескай старане»...

«Вялікі Тураўлянін» аднолькава грунтоўна засвоіў культуру грэка-візантыйскага і заходняга свету. У пакінутай спадчыне застаўся філосафам, мысліцелем, мастаком, грамадскім і рэлігійным дзеячам, красамоўцам роднай зямлі. Яго погляды на зямны і нябесны свет арганічна спалучаліся з прыгажосцю і дабрадзейнасцю. Адсюль вынікала адзінства зямнога і нябеснага, прыроды і чалавека, жыцця і культуры...

А. Кляўчэня

Зорка Кірылы Тураўскага

11 мая 1993 г.— святочны, урачысты дзень у Тураве, на ўсім Палессі. Свята славянскай пісьменнасці, якое адзначаецца ў рэспубліцы ў чацвёрты раз, і да яго аднесена значная падзея культурнага жыцця — адкрыццё і асвячэнне помніка славутаму грамадзяніну Беларусі, мудрацу і патрыёту сваёй зямлі, Кірыле Тураўскаму.

Не злічыць гасцей, якія прыйшлі ў гэты вясенні дзень на Замкавую гару, месца, дзе жыў, працаваў, ствараў свае бессмяротныя творы пісьменнік, філосаф, святар, «златавуст»... Дэлегацыя ад Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Беларусі, абласнога Савета народных дэпутатаў, суседніх Петрыкаўскага, Лельчыцкага, Столінскага, Лунінецкага раёнаў, мясцовыя жыхары, якія шануюць славутага земляка.

Помнік Кірыле Тураўскаму на Замкавай гары ў Тураве. 1993 г.

Хлеб-соль гасцям... Царкоўныя служкі на чале з мітрапалітам Філарэтам узначальваюць святочнае шэсце да Замкавай гары. Мітынг адкрывае старшыня раённага Савета народных дэпутатаў, народны дэпутат Рэспублікі Беларусь А. М. Сцепаненка.

— У кагорце вялікіх людзей,— гаворыць ён,— адно з пачэсных месцаў займае епіскап Кірыла Тураўскі, па заслугах аднесены праваслаўнай царквой да ліку святых, зорка якога ў апошнія гады шпарка ўзыходзіць на беларускім небасхіле. Яго, чалавека-мысліцеля, узгадавала гэтая зямля — зямля нашых продкаў-дрыгавічоў, ускалыхалі блакітныя воды Прыпяці. Гэта дзякуючы яму падняло парастак духоўнасці ўсходнеславянскае праваслаўе. І зусім заканамерна, што на зямлі дрыгавічоў, асобнага, самастойнага ўсходнеславянскага племені з'явіўся менавіта ён, Кірыла Тураўскі, пад лета 1130 года, бо Тураў быў мацнейшым на той час асяродкам культуры. Кірыла Тураўскі — грунтоўны асветнік старажытнай Беларусі, таго часу. Яго творчасць з'явілася адным з найвышэйшых дасягненняў літаратуры ўсходніх славян XII стагоддзя. Імя яго ля вытокаў нашага пісьменства і культуры становіцца ў адзін рад з легендарнай Ефрасінняй Полацкай...

Тураў у тыя далёкія часы з'яўляўся вельмі ўплывовым, багатым горадам і быў цэнтрам вялікага княства, якое ўключала ў сябе значную частку тэрыторыі цяперашняй Беларусі. Тураўскі князь па магутнасці і багацці не ўступаў кіеўскаму і ча-

ста аспрэчваў прэтэнзіі Кіева на ролю цэнтра. Росквіт княства праявіўся і ў культурным жыцці. Адным з найбольш вядомых і адукаваных людзей свайго часу быў Кірыла Тураўскі.

На адкрыцці помніка выступілі старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі па культурнай спадчыне і захаванні гістарычных помнікаў Ніл Гілевіч, намеснік міністра культуры У. П. Рылатка, старшыня мясцовага таварыства Кірылы Тураўскага М. М. Юрэвіч, пісьменнік Васіль Зуёнак, які назваў Кірылу «геніем духа і геніем слова».

Кірыла Тураўскі жыў восем з паловай стагоддзяў назад, але яшчэ тады заклікаў свой народ да духоўнага адзінства, да ўсведамлення, дзеля чаго чалавек прыйшоў на зямлю і які след пакіне на ёй... Ён пакінуў на беларускай зямлі надзвычай глыбокі след, багатую духоўную спадчыну, над якой непадуладны час.

Фігура Златавуста ў поўны рост установлена ля крыжа. Крыж — дакладная копія захаваных у тураўскай Усясвяцкай царкве старажытных сімвалаў, якія, паводле легенды, прыплылі сюды з Візантыі. Адразу ўзнікаюць аналогіі з сюжэтамі з Новага запавету... Кірыла Тураўскі быццам увасабляе сабой тое, што нясе людзям хрысціянства,— святло дабра, любві і праўды.

Існуе таксама эскізны праект Тураўскага храма, які плануецца пабудаваць на месцы старога, ад якога пад тоўстым слоем зямлі захаваўся толькі падмурак.

Адкрыццё і асвячэнне помніка Кірыле Тураўскаму на Замкавай гары ў Тураве (скульптар М. М. Інькоў, архітэктар М. І. Лук'янчык) — добры знак, што на Гомельшчыну, якая найбольш пацярпела ад чарнобыльскай бяды, на жамчужыну Палесся Тураўшчыну прыходзіць адраджэнне. На ёй зноў узыходзіць зорка Кірылы Тураўскага, яна будзе ззяць над Беларуссю і служыць ёй правільным, надзейным арыенцірам.

Васіль Феранц

Святкуючы дзень Ражства Хрыстова

...Разам са святіцелем Кірылам Тураўскім усклікнем у дзень Ражства: «Велика и неизреченна милость Его на роде человечестем, ею же помилованы бихом!» На вялікую Хрыстову любоў чым адкажам мы, як не любоўю; на міласэрную спагадлівасць да нас, нявартых Госпада, чым адзавёмся мы, як не пасільным учыненнем дзеяў міласэрнасці? Паслухаем яшчэ раз Тураўскага Златавуста, які не стамляўся заклікаць сваю паству: «Останемся от злых дел, изыдем любовью, сложим гневодержание, воскликнем молитвами и беззлобием, приидем милостынями к нищим...»

Пакі ўзрадуемся мы Ражству Хрыстову і ўслед святіцелю Кірылу Тураўскаму «песнями, яко цветами, Святую Церковь увенчаем и праздник сей украсим!»

Філарэт, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

1993 г., г. Мінск

Далучэнне да Кірылатураўскага руху

156 удзельнікаў, прадстаўнікі Гомеля, усіх раёнаў вобласці, навукоўцы з Мінска, Магілёва, госці з Расіі сабраліся 14 красавіка 1993 г. на канферэнцыю ў абласным грамадска-палітычным цэнтры, каб прыняць рашэнне аб стварэнні грамадскага, навукова-культурнага і асветніцкага таварыства імя Кірылы Тураўскага.

Адкрываючы канферэнцыю, адзін з найбольш актыўных ініцыятараў

стварэння таварыства — намеснік старшыні аблвыканкома Валерый Сяліцкі адзначыў, што мэта яго — вывучэнне, захаванне і прапаганда гістарычнай і культурнай спадчыны не толькі аднаго з найбольш старажытных цэнтраў Беларусі — Турава і Тураўскай зямлі, гісторыя якой мае сусветнае значэнне, але і захаванне і адраджэнне ўсёй гістарычнай і культурнай спадчыны Гомельшчыны, пацярпеўшай ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, цень якой навіс над гістарычнай непаўторнасцю Тураўшчыны. З гонарам за гістарычную спадчыну гучалі выступленні ініцыятараў Кірылатураўскага руху на Гомельшчыне, але з болем за лёс сваёй зямлі гаварылі тураўцы — В. Каралец, старшыня гарпасялковага савета, М. Арцюшка, старшыня калгаса «Новае жыццё», настаўніца М. Юрэвіч, старшыня мясцовай арганізацыі таварыства імя Кірылы Тураўскага.

Абрана праўленне таварыства ў колькасці 47 чалавек і яго прэзідыум. Старшынёй абласнога таварыства абраны Валерый Сяліцкі. Першым практычным мерапрыемствам створанага таварыства стала святкаванне дня памяці Кірылы Тураўскага, якое ўжо чатыры гады традыцыйна праводзіцца 11 мая. У гэтым годзе гэтае святкаванне было незвычайным. На месцы старажытнага гарадзішча быў адкрыты помнік Кірылу Тураўскаму.

Васіль Кушнер.

Гарачы подых Чарнобыля

Чацвёртага мая 1986 г.— больш як праз тыдзень пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС у раён паступіла афіцыйная інфармацыя аб катастрофе. Увесь гэты час людзі працавалі на палях, пад шчодрым у той год вясенніім сонцам, атрымліваючы небяспечныя дозы радыеактыўнага выпраменьвання, і ніхто не здагадваўся аб страшнай бядзе, якая адбылася не так далёка ад гэтых месц...

Пачалася работа па ліквідацыі і прафілактыцы вынікаў аварыі. Арганізаваны радыелагічныя лабараторыі ў гаспадарках і на прадпрыемствах, наладжаны кантроль за навакольным асяроддзем. Абследаваны падворным абыходам 55 населеных пунктаў, у 24 праведзена агульнае абследаванне. Правяраўся стан водных крыніц і глебы на спектральны аналіз. Устаноўлена, што па стану на 1 студзеня 1990 г. значная частка зямель раёна — звыш 28 тыс. га — забруджана цяжкімі металамі, галоўным чынам цэзіем-137, шчыльнасцю ад 1 да 5 кюры на 1 км^2. На плошчы каля 1 тыс. га — у асноўным гэта тэрыторыя саўгаса «Ленінскі» — забруджанасць дасягае шчыльнасці 5—10 кюры на 1 км^2, а ў самай аддаленай вёсцы раёна — Грычынавічах і яе наваколлях — ад 10 да 15. Раён знаходзіцца на перыядычным кантролі шчыльнасці забруджання.

Вялікія маральныя і матэрыяльныя страты давялося зноў, у каторы раз перажыць гэтаму палескаму кутку. На працягу стагоддзяў выпрабоўвала жыццё ленінскіх сялян. Яны з-за аддаленасці спрадвеку жылі ў неймавернай галечы і забітасці. Да 1939 г. знаходзіліся пад гнётам панскай Польшчы. Іх знішчалі, палілі, расстрэльвалі нямецкія карнікі ў гады мінулай вайны. І вось новая навала... Пасля прыняцця ў снежні 1991 г. закона Беларусі «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы» жыхары гэтых вёсак атрымалі шэраг ільгот і пэўную дапамогу, але гэта цяпер радуе мала...

У першыя гады пасля аварыі радыяцыйнае становішча раёна было ў многім няясным. Выказваліся супярэчлівыя думкі і меркаванні



Жыткавічы. У мікрараёне «Азёрны»

наконт магчымасці пражывання на ёй людзей, вырошчвання сельскагаспадарчай прадукцыі. 15 рублёў, якія «адшкадавала» дзяржава на кожнага чалавека, хто жыў на забруджанай тэрыторыі, у многіх вёсках то пераставалі плаціць, то зноў выдаткоўвалі. За апошнія гады з-за неспрыяльнай экалагічнай абстаноўкі пакінулі пастаяннае месца жыхарства 209 сем'яў — 775 чалавек, у асноўным з дзецьмі да 14 гадоў.

У адпаведнасці з раённай праграмай па ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС у чыстай зоне, куды не даляцеў чарнобыльскі пыл, пабудавана шэсць пасёлкаў для перасяленцаў з забруджаных раёнаў вобласці — у Дзякавічах, Азяранах, Дуброве, Леніне, Бялёве і ў Мілевічах. Там узведзена 270 жылых дамоў з комплексам абслугоўваючых будынкаў — магазінамі, амбулаторыямі, дзіцячымі садамі, інжынернымі сеткамі. Да 1993 г. у раёне ўведзена 524 аднакватэрныя жылыя дамы, завяршаецца будаўніцтва яшчэ больш чым 100 дамоў. У Тураўскім, Ленінскім, Браніслаўскім, Азяранскім і Рычоўскім сельсаветах адкрыты цэнтры радыеактыўнага кантролю прадуктаў харчавання.

Асаблівая ўвага ў раёне надаецца падрастаючаму пакаленню. Праводзіцца абавязковы медыцынскі кантроль дзяцей і падросткаў, якія жывуць на забруджанай мясцовасці ад 1 да 5 кюры на 1 км^2 і вышэй. Дзеці ўсіх школ штогод адпачываюць і аздараўляюцца ў іншых краінах і ў другіх мясцовасцях рэспублікі. Яны выязджалі ў Малдову і Расію, Башкірыю і Краснаярскі край, праводзілі лета і адпачывалі ў Прыбалтыцы і Крыме, на Нарачы і ў Тракаі.

Медыцынскай службай распрацавана і выконваецца комплексная праграма «Здароўе», разлічаная да 2000 г. Раён уключаны ў праграму па ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы. Абследавана ўсё насельніцтва на апаратуры СІЧ. Многія сельскія працаўнікі адпачывалі і мелі магчымасць паправіць здароўе ў Балгарыі, Германіі, Галандыі і іншых краінах. Для падрыхтоўкі сваіх спецыялістаў накіравана ў медыцынскія вузы 18 мяс-

цовых юнакоў і дзяўчат, 25 — у медыцынскія вучылішчы.

Жыццё працягваецца. Як і да Чарнобыля, палескія сяляне сеюць хлеб і гадуюць жывёлу, і прадукцыя іх, як сведчаць спецыяльныя абследаванні на радыеактыўную забруджанасць, не перавышае дапушчальных норм. Людзі па-ранейшаму з радаснай усмешкай сустракаюць кожны ўсход сонца. У раёне ў 1992 г. нарадзілася 729 дзяцей, што нават больш, чым у папярэднім годзе.

Хочацца спадзяваць, што працавітасць, жыццялюбства, цярплівасць людзей пры дапамозе дзяржавы перамогуць чарнобыльскую бяду...

Г. С. Рай

* * *

Чорнае дрэва ў белых снягах
з доляй сірочай,
што вам з легенды сівое птах
ціха крумкоча?

Можа, расказвае вам аб былых
часінах вясёлых,
калі багата дрэў маладых
шумела наўкола,

Калі спявалі песні жанкі,
а на змярканні
тут, у жытнёвых палях, юнакі
сустракалі каханых?

Ці, можа, аб тым жалобна крумкоча,
што сёння недзе
шчэзлі песні, вочы дзявочыя
і дрэвы-суседзі?

Чорнае дрэва, па-свойму спытай,
аб чым гаруе ён:
можа, аб тым, што ўсё не так
у княжацкім Тураве?..

А можа, пра дзівака аднаго дзяўбе,
што назло ўсім канонам
марыць зялёным убачыць цябе
ў жыце зялёным.

Павел Шруб

Халоднае лета 93-га...

Такога лета, якое выдалася ў 1993 г., не прыпомняць старажылы. Лета нібы і не было... Ішлі частыя і нудныя, быццам асеннія, дажджы, дні стаялі халодныя і непрыветлівыя. А на свята св. Пятра 12 ліпеня, здавалася, прарвалася неба, зарадзілі суцэльныя дажджы. Пачынаючы з 22 ліпеня на працягу некалькіх дзён яны ліліся бесперапынным патокам, не сціхаў ураганны вецер.

Дажджы выклікалі небывалы ўздым узроўню грунтовых вод, што асабліва небяспечна ва ўмовах раёна, дзе перавільготненасць глебы складае больш 80 працэнтаў. Шырока разліліся Прыпяць і Случ, Сцвіга і Гарынь, шматлікія іншыя рэкі і ручайкі, якіх не злічыць на Палессі, у Прыпяцкім запаведніку. У Прыпяці ўзровень вады ўзняўся больш як на 3 м. У выніку аказаліся затопленымі звыш тысячы жылых дамоў у вёсках раёна, прысядзібныя ўчасткі, дарогі, дзесяткі тысяч гектараў сельгасугоддзяў. Гэта здарылася ў той час, калі тут яшчэ не справіліся канчаткова з наступствам амаль такога ж стыхійнага бедства, якое абрушылася на раён у 1991 г. Да таго ж яго не абыйшла і чарнобыльская бяда, страшны ўрон ад якой ніколі, відаць, нельга будзе падлічыць...

Агульныя страты ад паводкі 1993 г. склалі звыш 18 млрд. рублёў. За імі — боль, гора і пакуты значнай часткі жыхароў раёна, асабліва найбольш бедных з іх, старых, інвалідаў, адзінокіх людзей. Стоячы ў вадзе, яны ратавалі ўраджай, кармы і сена, імкнуліся сабраць хоць бы насенне... У многіх гаспадарках амаль поўнасцю знішчаны пасевы бульбы, гародніны, нібы катком прыкатана збажына. Асабліва вялікі ўрон панеслі саўгасы «Случ», «Ленінскі», «Чырвоны Бор», «Жыткавічы», калгасы «XX партз'езд», «Ленінскі шлях», «Чырвоны Кастрычнік», «Шлях камунізму», «Перамога», «1 Мая».

Людзі не засталіся з бядою сам-

насам. Дзяржава выдаткавала на пакрыццё ўрону 3 млрд. руб. Добраахвотныя ахвяраванні арганізацый, прадпрымальнікаў, усіх сумленных людзей склалі звыш 1 млрд. руб. Насельніцтва атрымала грашовую кампенсацыю за знішчаныя пасевы, бясплатна і па нізкіх цэнах бульбу, кармы і фураж для жывёлы. Да зімы наступства стыхійнага бедства было ў асноўным ліквідавана.

В. Р. Феранц

КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА, НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ, КОЛЬКАСЦЬ У ІХ ГАСПАДАРАК І ЖЫХАРОЎ (1 СТУДЗЕНЯ 1994 г.)

Калгасы

«Новае жыццё» — г. п. Тураў
«Перамога» — в. Запясочча
«1 Мая» — в. Верасніца
«Шлях да камунізму» — в. Хільчыцы
Імя XXII з'езда КПСС — в. Рычоў
«Савецкая Беларусь» — в. Азяраны
«Чырвоны Кастрычнік» — в. Перароў
«Ленінскі шлях» — в. Хлупін
«III Інтэрнацыянал» — в. Бялёў
«XX партз'езд» — в. Града
«Кастрычнік» — в. Дзякавічы
«Зара» — в. Пухавічы
Імя Леніна — в. Марохарава

Саўгасы

«Чырвоны Бор» — в. Сяменча
«Жыткавічы» — п. Грабянёўскі
Імя Алексяеўскага — в. Кольна
«Людзяневічы» — в. Людзяневічы
«Случ» — в. Мілевічы
«Ленінскі» — в. Ленін

	Колькасць гаспадарак	Колькасць жыхароў	У тым ліку: працаздольныя	дзеці
Азяранскі сельскі Савет				
в. Азяраны	250	608	276	153
в. Бечы	84	174	51	25
в. Буда	28	41	10	—
в. Знаменка (Слепцы)	129	266	108	31
в. Пагост	259	54	185	59
в. Хваенск	175	377	129	63
п. Хваенск	313	716	297	146
в. Чэрнічы	169	345	129	307
Браніслаўскі сельскі Савет				
в. Града	147	374	164	119
в. Браніслаў	138	293	100	53
в. Вільча	82	177	52	40
в. Загацце	25	65	21	15
в. Князь-Бор	14	23	3	—
Верасніцкі сельскі Савет				
в. Верасніца	548	1246	580	202
в. М. Малешаў	243	625	260	120
в. Любавічы	117	283	110	40
в. Вароніна	55	133	60	19
в. Запясочча	380	946	416	173
в. Буразь	87	196	80	25
в. Поўчын	17	36	10	3

Дзякавіцкі сельскі Савет

в. Дзякавічы	267	786	195	220
в. Вятчын	322	681	81	85
в. Хвойка	116	288	175	76
в. Лутоўе	48	106	10	9
в. Буда	47	95	7	6
в. Пасталы	13	24	2	—

Жыткавіцкі гарадскі Савет

в. Ацкаванае	11	26	19	2
в. Забродцзе	32	75	23	15
в. Чарацянка	39	93	37	23
в. Кажановічы	134	308	130	90
п. Заходні	26	57	55	42

Ленінскі сельскі Савет

в. Ленін	320	893	430	265
в. Ельна	31	77	25	4
в. Буда	38	66	16	12
в. М. Сцяблевічы	42	83	22	7
в. В. Сцяблевічы	96	221	89	37
в. Палосцевічы	132	292	109	28
в. Цімашэвічы	106	184	47	18
в. Грычынавічы	195	493	201	119
в. Н.-Ленін	34	65	13	7
в. Сукачы	48	98	33	9
в. Карчаватка	35	59	19	2

Людзяневіцкі сельскі Савет

в. Людзяневічы	445	1124	509	308
в. Сялко	67	142	45	27
в. Доўгая Дуброва	66	129	49	11
в. Вязаў Лес	38	63	17	1
в. Беразіна	96	233	92	49
в. Лагвошчы	118	255	78	36
в. Дзедаўка	133	305	120	61
в. Загорбашша	65	130	34	16
в. Калінаўка	60	114	37	17
в. Пясчанікі	36	70	12	—
в. Падвосце	22	53	14	11

Марохараўскі сельскі Савет

в. Марохарава	189	485	188	122
в. Бялёў	456	1026	483	311
ст. Старушкі	36	68	23	7
ст. Брынёў	4	10	2	2
в. Дуброва	189	617	306	228
в. Замошша	30	58	23	6
в. Вятчынская Рудня	57	117	36	14

Мілевіцкі сельскі Савет

в. Мілевічы	336	962	460	248
в. Грабаў	153	378	156	66
в. Беразнякі	188	432	169	74
в. Н. Залюцічы	94	227	85	28
в. Н. Мілевічы	90	217	84	29
в. Ст. Залюцічы	93	198	75	36
в. Іёвічы	45	86	30	11

Пераройскі сельскі Савет				
в. Пераройскі Млынок	146	287	79	46
в. Хлупін	182	443	181	111
в. Хлупінская Буда	5	7	—	—
Рудненскі сельскі Савет				
в. Рудня	102	210	74	33
в. Кольна	260	654	228	194
в. Найда	98	212	86	32
в. Грэбень	109	217	74	35
п. Грабянёўскі	87	259	109	86
в. Востранка	66	134	48	23
п. Чырвоная Зорка	95	216	115	46
в. Буйкавічы	24	51	15	14
в. Пасека	42	104	47	17
в. Млынок	79	174	77	24
в. Подаўж	32	54	19	5
в. Боркі	125	304	146	48
в. Келі	12	17	3	1
в. Палянка	37	55	11	5
в. Яміца	24	38	4	—
Рычоўскі сельскі Савет				
в. Рычоў	236	568	264	107
в. Хачэнь	103	232	104	31
в. Рыдча	52	134	71	36
в. Старажоўцы	137	315	110	44
в. Сямурадцы	135	312	138	46
в. Хільчыцы	210	496	213	88
в. Бярэжцы	130	320	140	63
Чырвоненскі сельскі Савет				
п. Чырвонае	489	1652	847	494
в. Пухавічы	303	827	322	204
в. Ляхавічы	149	302	105	23
в. Навуць	50	105	48	7
в. Пласток	56	136	44	32
в. Відошын	279	221	101	43
в. Сяменча	383	1309	631	392
в. Хісцецкі Бор	34	91	36	20
Юркевіцкі сельскі Савет				
в. Юркевічы	137	312	124	44
в. Гулевічы	98	197	53	26
в. Баравая	67	165	61	41
п. Азёрны	100	234	126	97
в. Белае	9	15	4	2

Палескія абразкі

Куля

Дровы прывезлі з далёкага ўрочышча. Калісьці тут былі глухія лясныя мясціны, здавалася — край свету. А цяпер — прастора, хаты вёскі Князь-Бор можна да адной пералічыць...

Дровы распілавалі бензапілой. Секчы іх — работа нялёгкая, бадзёрая і здаровая... Палена трапіла моцнае, тоўстае. Сук у адным баку, тут трэба добра падумаць, як лепш нанесці ўдар сякерай.

З цяжкасцю яно раскалолася першы раз, другі — лягчэй. Шырокая чорная пляма выразна вызна-

чылася ў сярэдзіне цнатліва белай драўніны... Калупнуў дзюбкай сякеры — кавалак металу ў абалонцы цвёрдай шэра-чорнай іржы. Цёмная пляма разышлася па вільготнай драўніне. Куля!

Як яна трапіла сюды, няцяжка здагадацца. Не раз даводзілася чуць, як хаваліся людзі ад гітлераўцаў у лесе ў гады вайны. Карнікі палявалі, нібы за дзічынай, а куды не маглі дабрацца, шчодра палівалі навокал свінцовым агнём... Глуха стагнаў і шумеў лес...

А гэты кавалак металу вагой некалькі грамаў, прызначаны для пагібелі чалавека, трапіў у дрэва. Яно маўкліва прыняло ў сябе чыюсьці смерць...

Час чаромхавай замеці

Пругкі, парывісты вецер нёс з поўдня вільготны пах вясны. Згушчаўся, цямнеў блакітны дым далягляда ў. Быў самы сіні месяц — красавік.

Сінь непрыкметна ператварала ся ў аксаміт мая. На майскія святы зацвіла чаромха. Ноччу яшчэ вяртаўся мароз, а яна ў зацішку каля сцяны хаты ўжо зазелянела, выкінула султанчыкі суквецця ў. Чакаючы ўстойлівага цяпла, яны нібы застылі ненадоўга на старце цвіцення. На дрэвах пачалі толькі распускацца пупышкі, а чаромха — зацвіла, зашумела... Незадоўга перад гэтым да яе вярнуўся салавей.

Месячная, ясная ноч пачатку мая!.. Размытыя серабрыстым святлом акварэлі знаёмых далягляда ў, плямы дрэў на мокрым лузе, водар чаромхі — і над усім звонкія рулады, посвіст, пошчак, залівісты, нястомны спеў салаўя. І першае каханне, і першы пацалунак...

Дзіўны, непаўторны малюнак майскай ночы на мілай сэрцу Бацькаўшчыне... Хіба можна забыць усё гэта праз гады?

Вянок лета

...Чароўная, запаветная пара лета — чэрвень, які ўплятае ў яго вянок самыя яркія, самыя прыгожыя і духмяныя кветкі, краскі якіх захоўваюцца да самай восені. Зямля дыхае на поўныя грудзі. У жоўтых накідках зачаравана застылі ліпы. Ад іх ідзе роўны прыглушаны гул — працаўнікі-пчолы збіраюць сваю багатую даніну. Адцвіла акацыя... Ужо і жыта адкрасавала, з кожным днём наліваюцца, цяжэюць каласы; у гушчыні збажыны на доле ўвесь дзень не высыхае раса. Жытнёвае поле — нібы бяскрайняе мора, па ім коцяцца, пераліваюцца бясконцыя хвалі, і няма ім ні канца, ні краю... Куды яны бягуць? Ціха плывуць у небе воблакі, мяняючы колер і адценне. Вецер, які шуміць у лесе гучна і ўладарна, у полі патаемна шэпчацца з калоссем, хвалюе, пяшчотна калыша яго... Лета аднойчы раскалолася на дробныя рознакаляровыя асколкі, і з кожным днём яны танеюць, растаюць, як ледзяшы пад сакавіцкім сонцам, і становіцца іх усё менш... Пахне мёдам, спелым хлебам.

На лугах, дзе імкліва праносяцца бліскучыя стракозы, дзе ўверх-уніз хістаюцца загадкавыя матылькі, адкуль даносіцца гарачы шорхат конікаў, пахне сенам. Ад хваёвага пералеска патыхае свежым, цёплым водарам жывіцы.

З кожным днём усё гусцей настойваецца на росных лугах цішыня. Лета ўсё шпарчэй коціцца ў туманныя, вільготныя абдымкі восені...

Успамін

Тут быў светлы гай, які жыў сваім жыццём, дзе было месца ўсяму: задуменна шумелі векавыя дубы, хілілася да зямлі голле бяроз, раслі светлыя клёны і густа зелянеў арэш-

нік... Колькі было суніц, якім водарам поўнілася лясная палянка, калі зацвіталі святаяннік, валяр'ян, мята, а ў ліпені над ліпай віўся густы рой пчол.

Неяк восенню наваколле пачало напаўняцца незнаёмымі, чужымі гукамі. Гул трактароў спачатку быў далёкім, з кожным днём ён набліжаўся. Наступалі магутныя бульдозеры. Пад іх няўмольным націскам падалі векавыя дубы, трашчалі вольхі, падміналася, як запалкі, пад тракі лаза...

У тыя дні сюды часта прыходзіў старэнькі дзед — у кажуху, падпразаным вузенькім раменьчыкам, у шапцы-вушанцы, у кірзавых ботах. Ён размаўляў з трактарыстамі, якія аблюбавалі адпачынак каля гонкай развесістай ліпы. Тут, на гэтай палянцы, ён яшчэ са сваім бацькам плёў з мяккай кары ліпы лапці, збіраў ліпавы цвет на лекі, ставіў вуллі... І бульдозеры абмінулі ліпу. З кожным днём аддаляўся гул матораў. Толькі дрэва доўга яшчэ адчувала сваімі каранямі, як уздрыгвала палеская зямля.

У той год зімой старога не стала. Як успамін аб ім, як жывы помнік — дрэва, адно ва ўсім наваколлі.

...Я сядзеў каля ліпы, прыхіліўшыся спіной да мяккага шэрага ствала. Кара ў ліпы цёплая і шурпатая, як бацькоўская далонь...

Той стары быў мой бацька.

Над вечным спакоем

Непадалёку ад дарогі, сярод поля, захаваўся з незапамятных часоў астравок старых дрэў. Быццам лодка Херона ўзняла пад ветрам вечнасці свае ветразі — магутныя, каржакаватыя сосны, старыя бярозы, тры ці чатыры разгалістыя векавыя дубы. І імчыцца гэты карабель у нікуды, у вечнасць... Ледзь прыкметная, слаба наезджаная дарога вядзе сюды. Тут спачывае прах бацькоў; колькі знаёмых, сяброў, сваякоў і родзічаў назаўсёды знайшлі тут апошні прытулак... Калісьці супакоіцца тут і мая неспакойная душа.

Задуменна, сумна шумяць верхавіны соснаў над вясковым пагостам. Вецер высвістае ў голым, паніклым голлі бяроз. Толькі магутныя дубы стаяць спакойна і ўпэўнена, нішто, што адбываецца на свеце, не кранае іх, быццам не задумваюцца яны над тым, наколькі хуткацечнае жыццё.

...Зноў восень. Апалае лісце ўкрыла магільныя ўзгоркі, зраўняла іх. Усё застыла ў здранцвенні. На пагосце заўсёды ціха і самотна — ці буяе вясна ў наваколлі, ці плавіцца паветра ад ліпеньскай гарачыні, ці маркоціцца восень... Над векавечным спакоем назаўсёды спыніўся час.

Падае на ўзгоркі золата бярозы. З галін, быццам слёзы, капаюць буйныя, светлыя кроплі. І ціхай, маркотнай, невыказанай тугой сціскае сэрца...

Бязгучнасць

Пахмурнае неба апусцілася так нізка, што, здавалася, абапіралася на самыя верхавіны дрэў. Увесь дзень церушыў сухі, калючы снег. Вецер раскідваў яго, як хацеў, і да вечара так стаміўся, што ледзь дыхаў. Але дамогся свайго: разагнаў снегавыя хмары.

Ноч наступіла па-зімоваму хутка — глухая, светлая ад снегу знізу і цёмная, непраглядная ў небе. Вызарыла на мароз. У бясконцай далечыні сусвету высыпалі мільярды зорак — яркіх і ледзь прыкметных, як далёкае, загадкавае касмічнае святло.

Зоркі мільгалі, холадна пералівaліся ў недасягальнай вышыні, нібы бязгучна звінелі ў чорным небе. Знаёмыя сузор'і апускаліся ўсё ніжэй, цямнела ноч, мацнеў мароз.

Доўгая зімовая ноч, пякучы мароз...

Пад раніцу пасвятлеў, паружавеў край неба. Світанак абазначыўся задоўга да ўсходу сонца. І вось разгарэлася чырвонае полымя, пырснулі вогненныя промні. Сонца ўзышло, але яно не прынесла цяпла — наадварот, на світанні мароз памацнеў.

І такая застыла навокал цішыня! Ніводная галінка — тонкая, прамерзлая, здранцвелая — не ўскалыхнецца. Цішыня і бязмежны спакой над усім краем.

Такая цішыня, такі спакой можа быць толькі на радзіме, на сваёй вуліцы — вуліцы Дзяцінства, калі на душы суладнасць, ціхамірнасць...

Васіль Феранц

Свята вызвалення

Вось і прыйшло светлае свята, слаўны юбілей — 50-годдзе вызвалення Беларусі. Так склалася, што дзень вызвалення Жыткавіцкага раёна супадае з усенародным святам рэспублікі. З ліпеня 1944 г. быў вызвалены Мінск, а ў Жыткавічы воіны артылерыйскага дывізіёна пад камандаваннем капітана П. М. Кудзінава пасля кароткага і бязлітаснага бою ўварваліся з боку Кажановіч удзень 5 ліпеня. Імклівае і рашучае наступленне вяла 55-я Мазырская стралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка К. М. Андрусенкі. З боку Турава да Жыткавіч рухаліся часці 23-й стралковай дывізіі. Раніцай 6 ліпеня войскі дзвюх дывізій сустрэліся каля в. Кольна. У гэты дзень Саўінфармбюро паведаміла аб вызваленні горада Жыткавічы і шэрага вёсак раёна — Людзяневіч, Надубава, Дзедаўкі, Браніслава, Вільчы. Жыццё раёна з гэтага дня пайшло па іншых, мірных рэйках, хоць было яно яшчэ не раз абмыта горкімі слязамі...

50 гадоў... Як гэта многа ў параўнанні з жыццём чалавека, і як, здаецца, нядаўна былі тыя суровыя ваенныя гады. Яны заўсёды нябачнымі былі побач з намі, у нашай памяці, паўтораныя тысячу разоў у кнігах і фільмах, ва ўспамінах тых, хто перажыў вайну, прайшоў яе вогненнымі дарогамі. Як мала іх засталося! Сівыя, адзначаныя суровымі слядамі былых баёў і няўмольнага часу, яны прыйшлі ліпеньскай раніцай 1994 г. да сціплых абеліскаў і помнікаў з высечанымі прозвішчамі землякоў, равеснікаў, сяброў, якія не вярнуліся паўстагоддзя назад, сабраліся каля манументаў у Жыткавічах, Леніне, Тураве, каб успомніць яшчэ раз тыя гады і тых, каго забрала вайна. Прыехалі госці, каму дазваляе яшчэ здароўе і гады — былыя воіны, якія прымалі ўдзел у вызваленні раёна 50 гадоў назад — з розных куткоў Беларусі, з Расіі і Украіны. Сёння ўся ўвага — ім, ім — кветкі і ўсмешкі, словы ўдзячнасці і памятныя падарункі. Дзеля такога свята варта было жыць, змагацца — і перамагчы заклятага ворага. А колькі іх, былых салдат, не дажылі да пераможных салютаў 1945-га!

Здаецца, даўно выплаканы ўсе слёзы па тых, хто не вярнуўся з вайны, хто згарэў у яе полымі, загінуў у блакадных вёсках, склаў галаву ў партызанскіх атрадах, памёр у холадзе і голадзе — а ў дзень свята зноў закіпаюць слёзы ў вачах, і шарэе чырвань кветак, і заходзіцца сэрца ад жалю... Нашто, дзеля чаго былі прынесены незлічоныя ахвяры?

Нават у сне не мог прадбачыцца былым воінам і партызанам такі час, калі вялікая, магутная дзяржава, за якую яны, не шкадуючы, аддавалі кроў, жыццё, праз пяць дзесяткаў гадоў разваліцца, і на абломках яе, не маючы ўжо жыццёвых сіл, трэба ладзіць новы падмурак, пачынаць новы лад, і былыя абаронцы маці-радзімы апынуцца ў такім незайздросным становішчы.

Праект мемарыяльнага комплексу ў гонар воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія ваявалі і загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны,у Жыткавічах, цэнтры партызанскага руху на Палессі,— комплекс «Клятва» (скульптар П. Цомпель, архітэктар Ю. Казакоў)

Яны, прывыклыя да ўсяго ў жыцці, да нястачы і галечы, у якіх пражылі многія гады ў чаканні блізкага лепшага будучага, не адчайваюцца і не падаюць духам, хоць балюча крыўдна за радзіму і за тых, хто склаў галаву на вогненных рубяжах яе абароны, і ад гэтага свята са слязамі на вачах набывае прысмак горычы...

...Наступае ўрачыстая мінута маўчання, мінута памяці загінуўшых.

Успомнім усіх пайменна...

Кожны ўдзельнік урачыстасцей у дзень вызвалення раёна думкамі знаходзіцца ў тых такіх далёкіх і такіх блізкіх гадах. Кожны перажывае сваё, памятнае і балючае, што зноў і зноў паўстае перад вачамі, што не забудзецца праз усё жыццё, і нібы ўвачавідкі паўстаюць перад вачамі тыя, хто ўсклаў жыццё на алтар Перамогі.

Выстаялі, выжылі, перамаглі... Тры доўгія гады чакалі жыхары раёна гэтага гарачага ліпеньскага дня 1944 г. Дзеля яго загінуў кожны чацвёрты жыхар. У свяце вызвалення нябачнымі прысутнічаюць і пагранічнікі, склаўшыя галаву ў гарачым баі каля Забродцзя ў ліпені 1941 г., і патрыёты-падпольшчыкі Жыткавіч і Турава, і загінуўшыя партызаны атрадаў 50-й Жыткавіцкай партызанскай брыгады, і тыя, хто трымаў фронт халоднай вясной

і летам 1944 г. каля Турава. Тут — попел Дзякавіч і Поўчына, кроў мірных жыхароў, дзяцей Леніна і Ельна, пакуты блакадных зім Мілевіч і Залюціч, памяць 14 юнакоў, якія загінулі ў далёкім Афганістане...

І ўсё ж — жыццё працягваецца. Сведчаннем таму — сённяшняе свята вызвалення, якое яшчэ раз пацвердзіла непарыўную сувязь часоў, і тое, што памяць людская нічога і нікога не забывае...

В. Р. Феранц

Бягу і вяртаюся

Казько Віктар Апанасавіч (н. 23.4. 1940 г.) — вядомы беларускі пісьменнік. Выхоўваўся ў Вільчанскім і Хойніцкім дзіцячых дамах, пасля школы паехаў у Сібір, скончыў там горна-індустрыяльны тэхнікум. Працаваў у шахце, у геолагаразведцы, з 1962 г.— на журналісцкай рабоце. У 1970 г. скончыў завочна аддзяленне Літаратурнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў літсупрацоўнікам у газетах «Чырвоная Змена», «Советская Белоруссия», у аддзеле прозы часопіса «Нёман», цяпер — галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм». Першыя апавяданні надрукаваў у 1971 г., выдаў аповесці «Вісакосны год», «Здравствуй и прощай», «Суд у Слабадзе», раманы «Неруш», «Хроніка дзетдомаўскага сада». Жыве пераважна ў вёсцы, дзе выхоўваўся ў дзіцячым доме. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Жыткаўшчына. Рэчка Случ, Вільча... І не мае родныя гэта месцы, не мая бацькаўшчына. Не тут я ўбачыў свет, не тут упершыню засмяяўся і заплакаў. Магло так стацца, што зусім я не ўбачыў бы і гэтай рэчкі, і вёскі. І да таго ішло. Эвакуатарка Мазырскага дзетпрыёмніка чамусьці вырашыла, што мяне накіроўваюць у Лельчыцкі дзетдом, і ўжо ўзяла білеты да Лельчыц, а мне раптам захацелася ўбачыць, як гэтыя Лельчыцы запісаны на паперы літарамі — гэта мой дзетдом, мае літары, хтосьці недзе думаў пра мяне, пісаў на паперы маё імя... Я ўгаварыў эвакуатарку паказаць



В. А. Казько і Б. С. Ранчынскі, былы настаўнік Вільчанскай сямігадовай школы, дзе вучыліся выхаванцы дзіцячага дома

мне гэтую паперу. Яна адкрыла — вёска Вільча, Вільчанскі дзіцячы дом...

Я быццам пачуў у тое імгненне, адчуў свой лёс. Мне адразу спадабалася, як гэта гучала — Вільча... Асабліва спадабалася, што я зусім не ўяўляў сабе, што гэтае слова можа азначаць. Усё афарбавалася ў сонечныя, светлыя колеры радасці. А час якраз быў вясенні, і сонца было шмат, і цвіла белая акацыя, адно з самых любімых дрэў маіх аднагодкаў, хлопцаў саракавых гадоў. Зацвітала яна якраз у час заканчэння экзаменаў, і кветкі ў каваных калючках-шыпах не маглі не радаваць і былі такімі салодкімі...

Пад белай акацыяй, пад гарачым сонцам і прамільгнулі мае гады ў вёсцы Вільча, на рэчцы Случ. Прамільгнулі, адляцелі і ўпалі дзесьці там, удалечыні, як адзенне, з якога выраслі, але не зразумелі гэтага. Так, як часта не разумеем, што ад дзяцінства не збегчы...

У той час хацелася далей, далей, верылася, што ўсё лепшае — там, наперадзе. І мільгалі гарады. Вось ужо і Еўропа за спіною, Азія, Сібір... Але чаму ўсё часцей сціскалася сэрца, што здарылася? Здавалася б, усё добра: спецыяльнасць, работа, заробак, нявеста. А думкі і сэрца — далёка, там, у дзяцінстве...

І што там, мёдам намазана? Да чыгуначнай станцыі — пятнаццаць кіламетраў, да бліжэйшага горада — трыццаць кіламетраў. Зімой дзетдомаўская «лайба» — палутарка не заўсёды прабівалася ў раён па хлеб. Глуш, балота, мошка ды камары ўлетку. І за што любіць такі дом? Хто там у ім, бацька-маці, браты-сёстры? І выхавацелі не заўсёды былі справядлівымі. Хто не ведае, якімі горкімі бываюць крыўды ад людзей, калі, акрамя іх саміх, ні ад каго ніадкуль чакаць ласкі, добрага слова, абароны...

Доўгі і не прамы шлях дзетдомаўца да самога сябе, да таго, што называецца бацькаўшчына. У дзіцячых дамах у Беларусі ў 1945 годзе выхоўвалася амаль 27 тысяч дзяцей-сірот. Дзяржава замяніла ім бацьку з маці, а тое месца, дзе расце акацыя ці бяроза, дзе струменіць рэчка, пры ўспаміне аб якіх сціскаецца сэрца, гэта і ёсць іх бацькаўшчына...

І ў далёкай Сібіры тое, што было не вельмі прыцягальным у дзетдомаўскім вільчанскім жыцці, адпала, і праступіў другі слой, успомнілася, паўстала перад вачыма невялікая палеская вёска — мая вёска. Пятнаццаць кіламетраў да чыгункі і на кожным кіламетры драўляны масток, і на кожным мастку на прыгрэве сонца — чарапахі. І вось за апошнім мастком адкрываецца па хатцы каля возера Вільча...

Першым прачынаўся на ўсходзе сонца мой дом, дзіцячы. Была тут раней пагранічная застава, па Случы праходзіла граніца. Пагранічнікі і перадалі нам свае былыя казармы. За імі шуміць сёння сад. Саджалі мы яго пад кіраўніцтвам Мірона Апанасавіча Сарокі, дырэктара дзіцячага дома. Яго мы вельмі паважалі і вельмі баяліся. Ён быў франтавіком, хадзіў па дзетдому ў ваеннай форме, быў строгім і ніколі не ўсміхаўся. Толькі потым, у Сібіры, я зразумеў, якой трапяткой, амаль дзіцячай наіўнасцю была напоўнена яго душа...

І я ўспамінаў у Сібіры, што недзе ў балотах Палесся расце мая яблынька, якую я ўлетку пасля вячэры кожны дзень паліваў калодзежнай вадой, а прачынаючыся раніцай, бег да яе, як да жывой, замяраў палачкай, на колькі яна падрасла, і хваліўся перад хлопцамі, як і ўсе яны хваліліся сваімі яблынькамі...

Я бываў там на таёжнай рэчцы Чара, праз якую потым пралегла Байкала-Амурская магістраль, з крынічна-празрыстай халоднай вадой — і ўспамінаў сваю рэчку-невялічку Случ, дзе лавіў калісьці рыбу, успамінаў, якога акуня выпусціў, і якога ладнага шчупака мог аднойчы злавіць, ды не злавіў... Колькі даставіла гэта перажыванняў, а вось — і акунь, і шчупак, магчыма, і да гэтага часу жывуць у Случы, калі не трапілі ў сетку ці на кручок некага больш дасціпнага і лоўкага. І ад гэтага ўяўлення Случ, у якой жыла мая рыба, рабілася мне яшчэ мілейшай... Відаць, каб знайсці штосьці і па-сапраўднаму ацаніць яго, трэба спачатку згубіць...

І якім новым святлом асвяцілася для мяне і мая Случ, і Вільча — балотны, камарыны край. Як мы дружна жылі ў ім! Мы — гэта не толькі сто з лішнім дзетдомаўцаў, а і паўтары-дзве сотні вяскоўцаў. Мы, дзетдомаўцы, былі зусім не анёламі. Трашчалі ад нашых набегаў сады сялян, вытоптваліся агароды. І калі заставалі каго-небудзь з нас у садзе ці агародзе, па галоўцы не гладзілі. Але калі зімой у бездараж, а вясной у паводку, калі ў школу і то плылі на лодках, і мы заставаліся без хлеба, выхавацелі бралі мяшкі і ішлі па хатах. Вільчанцы і самі неслі па бохану, паўбохана хатняй выпечкі хлеба, адрываючы часам ад сябе. І якім салодкім, духмяным быў гэты хатні хлеб! Іншы раз з прымессю мякіны і іншымі дабаўкамі, і па гэ-

тых дамешках мы беспамылкова вызначалі, ад каго хлеб, крычалі на ўсю сталовую: дай мне Канапацкага, а я табе дам Шаўрэя... У такія дні ў сталовай не было чаго і прыбіраць, не было нават крошак. Хатні хлеб нам, пазбаўленым бацькоў, быў асабліва дарагім, ён не толькі будзіў у нас успаміны, але і нібы радніў з вёскай — з Вільчай, у якую мы трапілі не па сваёй ахвоце і марылі як мага хутчэй вырвацца адсюль, на свой, самастойны хлеб. А пакуль елі казённы і вясковы, і, як маглі, адраблялі яго. У гарачы час работ ішлі на поле, дапамагалі калгаснікам. Аралі, засявалі і сваю, дзетдомаўскую зямлю, і калгасную, касілі, палолі, вазілі сена і дровы. Тры стажкі дроў стаялі на дзетдомаўскім двары, па ліку груп, і працавалі мы на гэтых дровах, як працуюць у гарачы час уборкі, аблiваючыся потам, спяшаючыся апярэдзіць другую групу. І з лёгкай рукі дзетдомаўцаў і сёння ў Вільчы дровы складваюць не ў паляніцы, а ў стажкі. Дзякуючы дзетдому ў хатах вільчанцаў намнога раней з'явілася электрычнасць. І аднойчы засушлівым летам, калі загарэлася Еўчына хата, менавіта дзетдомаўцы патушылі агонь, не далі яму разгуляцца па вёсцы — хто тушыў, хто перашкаджаў, усе былі пры справе. І калі вільчанскім дзетдомаўцам жылося крышку лепш, сытней, чым іх аднагодкам у другіх дзіцячых дамах, дзякуй за гэта вільчанцам, калгасу, які падкідаў то бульбы, то малака. А Кулакевічы, Шаўрэі, Канапацкія, Танчынскія, Шчуры — самыя распаўсюджаныя ў Вільчы прозвішчы — не-не ды і сыпнуць у кішэню дзетдомаўца гарбузікаў, дадуць пакаштаваць мядку, бульбай-паранкай накормяць... Так і жылі, цяжка, як і ўсе тады, але і без сварак і крыўд. Была адна вялікая сям'я. Так ішлі мы, пакуль несвядома да адчування бацькаўшчыны, якую адняла ў нас вайна... І хоць ніхто і нішто не магло замяніць нам бацькоў, у Вільчы, у глухой палескай вёсцы большасць з нас змагла вярнуцца ў дзяцінства, знішчанае вайной. Але каб зразумець гэта, трэба было спачатку пакінуць Вільчу, збегчы ад дзяцінства...

Куды, у які край? Дзе ён, каб можна было сказаць і сабе, і сыну: «Вось ён, адсюль я, і лепшага месца няма на зямлі»... Як ён паглядзіць на гэтую небагатую вёску — лаза, пясок, іржавая вада не глыбокай і зусім не шырокай Случы, гэтыя дванаццаць хісткіх масткоў дарогі, якая тут і канчаецца, далей шляху няма...

Вёска хоць і на роўным месцы, на рачным плёсе адкрываецца не адразу, яна тоіцца ў садах, у вулачках і перавулках, і галоўная вуліца згінаецца вялікай дугой, паўтараючы здалёку загіб ракі.

І толькі зноў пабываўшы тут пасля доўгай разлукі, пакрысе, не адразу пачынаеш разумець, у якіх цудоўных мясцінах жыў, як мне пашанцавала з дзяцінствам. Поўдзень... Са старыц і азёр жоўта і бела выглядваюць гарлачыкі і лілеі, сярод багатырскай дубровы плавіцца да Прыпяці Случ. Паважаныя, у белых вопратках старцы-буслы з вышыні сваіх гнёзд, быццам у вечнасці і самі, без цікаўнасці і з годнасцю глядзяць у рачную ваду, быццам чытаюць старадаўнюю мудрую кнігу...

Добры дзень, Вільча, добры дзень, Случ! Добры дзень вам, буслы, дзетдом! Зажываюць, залечваюцца франтавыя раны, і няма ўжо ў Вільчы дзетдома. Раны залечваюцца і зажываюць, а франтавікі паміраюць. Няма і Мірона Апанасавіча Сарокі. Памёр ён, як і жыў, у рабоце, у імклівым руху. Была ў той дзень над Вільчай навальніца, першая сапраўдная навальніца. Сціхшыўшыся, чакалі яе векавыя дубы. Ударыў не гром — пярун, абрыну-

лася ліўнем неба на зямлю, а потым, калі дождж яшчэ не сціх, выглянула сонца, і зноў, абноўленыя, быццам напоўненыя зялёным ветрам, стаялі дубы над рэчкай... І ішлі паўз іх карміцца ў жыта чырванадзюбыя гусі, як ішлі яны і сто, і тысячу гадоў назад, не спяшаючыся, нікуды не зварочваючы, як цячэнне рэчкі, як вясковае жыццё, як ішоў, паводле падання, каменны крыж супраць цячэння па Прыпяці, і спыніўся непадалёку ад вусця Случы, дзе і ўзнікла ў хуткім часе вёска Вільча. Гэта легенда. Але адкуль, з якой легенды той магутны каменны крыж на вясковым пагосце, які стаіць тут з незапамятных часоў...

...Сустрэча з Вільчай кожны раз для мяне — свята. Сюды я спяшаюся, калі не магу больш ад тлумнага горада, ад аднастайных паўсядзённых спраў. Бягу і вяртаюся, ад сябе — да сябе, і зноў бягу, і зноў вяртаюся... Толькі туды, у Вільчу.

Віктар Казько